УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Г.П.ПАШКОЎ (галоўны рэдактар), А.І.МАЦЯЮН, А.У.РУСЕЦКІ, С.П.САМУЭЛЬ, Б.В.УЛЬЯНКА, А.К.ФЯДОСАЎ.

Гарадская камісія па стварэнні гісторыка-дакументальнай хронікі:

А.У.РУСЕЦКІ (старшыня), А.І.МАЦЯЮН (намеснік старшыні), Т.С.БУБЕНЬКА (адказны сакратар), У.В.ПЕЛАГЕЙКА, Л.К.АЛЕНСКАЯ, В.Дз.КІБІСАЎ, М.Ф.КРЫВЁНАК, М.С.РЫЎКІН, Я.А.КЛІМЯНЦЁНАК.

Арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданні гісторыка-дакументальных хронік Памяці Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар).

Рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік «Памяць»:

С.П.САМУЭЛЬ (заг. рэдакцыі), І.Б.КЛЕПІКАЎ, В.М.КНЯЗЕВА, В.І.ПЕПЕЛЯЕЎ, Н.П.РАКІЦКАЯ.

Складальнік А.І.МАЦЯЮН.

Мастак Э.Э.ЖАКЕВІЧ.

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА.

ISBN 985-11-0246-6

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 2002

© Э.Э.Жакевіч. Афармленне, 2002

Віцебск. Будынак чыгуначнага вакзала і Прывакзальная плошча.

974 г.	Першае ўпамінанне пра Віцебск у Віцебскім летапісе, складзеным віцяблянінам Стафанам Аверкам на аснове летапісу М.Панцырнага, кароткіх гістарычных запісаў Чарноўскіх і Г.Аверкі ў 1768 г.
1021 г.	Першыя летапісныя звесткі пра Віцебск (Сафійскі 1-ы летапіс).
1101 г.	Віцебск стаў цэнтрам удзельнага Віцебскага княства.
12 ст.	Будаўніцтва Благавешчанскай (Дабравешчанскай) царквы.
1245 г.	Віцебск наведаў Аляксандр Неўскі.
13 ст., канец	Датуецца першая віцебская берасцяная грамата. Знойдзена ў 1959 г. ў час земляных работ на плошчы Свабоды ў Віцебску.



Віцебск. Від на вуліцу Замкавую і Кіраўкі мост.

1320 г.	Віцебск пасля смерці князя Яраслава Васілевіча адышоў у спадчыну яго дачцы Марыі. Віцебскім князем стаў яе муж Альгерд Гедзімінавіч.
1396 г.	Аблога і штурм Віцебска войскамі вялікага князя ВКЛ Вітаўта.
1390-я гады	Віцебск атрымаў першы прывілей ад вялікага князя ВКЛ Вітаўта.
1406 г.	У пісьмовых крыніцах упамінаецца царква Успення Прасвятой Багародзіцы.
15ст.,першая чвэрць	У Віцебску існаваў францысканскі (паводле іншых звестак, дамініканскі) кляштар.
1441 г.	У грамаце вялікага князя ВКЛ Казіміра Ягелончыка, выдадзенай у Брэсце, Віцебск пазначаны сярод 15 найбуйнейшых гарадоў Вялікага княства Літоўскага.

Благавешчанская царква ў Віцебску. 12 ст.

1450 г.	У Віцебску пабудаваны першы каталіцкі касцёл (па сведчанню А.Кушнярэвіча).
1503 г., 16 ліпеня	Вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Аляксандр выдаў баярам і мяшчанам Віцебска прывілей «на некоторые права и вольности их».
1506 г. (паводле іншых звестак, у 1508 г.)	Утворана Віцебскае ваяводства з цэнтрам у Віцебску.
1597 г., 17 сакавіка	Жыгімонт III Ваза — вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы — выдаў Віцебску прывілей на магдэбургскае права.
1620 г.	Заснаваны дамініканскія кляштар і касцёл св. Міхаіла (паводле іншых звестак, кляштар існаваў у 1642—1832 гг.).

Касцёл Святой Варвары ў Віцебску. 1785 г.

1623г., 12лістапада	Паўстанне праваслаўных гараджан супраць грэка-католікаў. Забойства уніяцкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча.
1624 г.	Паводле рашэння камісарскага суда па справе аб забойстве І.Кунцэвіча Віцебск пазбаўлены магдэбургскага права.
1644 г., 25лістапада	Кароль Уладзіслаў IV вярнуў Віцебску магдэбургскае права.
1654 г.	Віцебск наведаў цар Аляксей Міхайлавіч.
1695 г.	Праз Віцебск з войскам вяртаўся з паходу пад Азоў

Віцебскі Свята-Пакроўскі кафедральны сабор (будынак былога трынітарскага кляштара). 1758 г.

1716—31 гг. (паводле іншых звестак, у1716—51 гг.)	Будаўніцтва мураваных касцёла і калегіума езуітаў.
1737—68 гг.	Будаўніцтва мураваных бернардзінскіх кляштара і касцёла св. Антонія.
1758 г.	Пабудаваны касцёл і кляштар трынітарыяў (драўляныя; закрыты ў 1832 г.).
1768 г.	Створаны Віцебскі летапіс.
1772 г.	Віцебск увайшоў у склад Расійскай імперыі.
1772—77 гг.	Віцебск — цэнтр Віцебскай правінцыі ў складзе Пскоўскай губерні.
1775 г.	Узведзены мураваны будынак Віцебскай гарадской ратушы.

Віцебскі абласны краязнаўчы музей
(будынак былой гарадской ратушы).1775 г.

1778 г.	Распрацаваны першы рэгулярны план забудовы Віцебска.
1785 г.	Пабудаваны касцёл св. Варвары (Варварынскі).
1786 г.	У Віцебску 10 289 жыхароў, 1200 двароў.
1796 г., 12 снежня	Віцебск — цэнтр утворанай Беларускай губерні, Беларускага генерал-губернатарства (да 1856 г.).
1802 г., 11 сакавіка	Віцебск стаў цэнтрам Віцебскай губерні.
1812 г., 16 ліпеня — 26 кастрычніка	Віцебск заняты французскімі войскамі.
1838 г.	Пачала выходзіць газета «Витебские губернские ведомости».
1857 г.	Адкрыта першая публічная бібліятэка.
1859 г., 3 снежня	Пачаў працаваць тэлеграф.
1860 г.	Арганізавана начное асвятленне вуліц спірташкіпінарнымі ліхтарамі.

Будынак былога губернатарскага палаца ў Віцебску.
Пачатак 19 ст.чатак 19 ст.

1863—67 гг.	Пабудаваны першы мураваны мост цераз раку Заходняя Дзвіна.
1866 г., 1 кастрычніка	Адкрыты рух цягнікоў праз Віцебск па Рыга-Арлоўскай чыгунцы.
1892—1900 гг.	У маёнтку Здраўнёва пад Віцебскам жыў рускі мастак І.Я.Рэпін.
1897 г.	Пабудавана першая электрастанцыя.
1898 г., 3 лютага	У памяшканні яхт-клуба адбыўся першы сеанс кінематографа.
1898 г., 18 чэрвеня	Пабудавана першая на Беларусі трамвайная лінія з электрычнай цягай.
1900 г.	Пачала дзейнічаць лёнапрадзільная фабрыка «Дзвіна» (з 1946 г. — дывановы камбінат).
1910 г., 1 ліпеня	Адкрыты Віцебскі настаўніцкі інстытут.
1911г., 27 кастрычніка	Адкрыта Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута.



Вучэбны корпус Акадэміі ветэрынарнай медыцыны (будынак былога сялянска-пазямельнага банка).

1912 г., 6 снежня	Пабудаваны помнік у гонар герояў вайны 1812 г.
1914 г.	Пачалі працаваць артылерыйскія майстэрні (цяпер станкабудаўнічы завод «Вістан»).
1917 г., 20 сакавіка	Створаны Віцебскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў.
1917 г., 27 кастрычніка	У Віцебску ўстаноўлена ўлада Саветаў.
1919 г., 1 студзеня	Віцебская губерня ўвайшла ў склад Беларускай ССР.
1923 г.	Адкрыта 1-я гарадская бальніца.
1924 г., 8 лістапада	Заснаваны Віцебскі ветэрынарны інстытут.
1925 г., 15 кастрычніка	Адкрыты першы гарадскі аўтобусны маршрут.
1926 г., 21 лістапада	У Віцебску адкрыўся 2-і Беларускі драматычны тэатр (цяпер Беларускі тэатр імя Якуба Коласа).
1926 г., 1 снежня	У Віцебску 98,8 тыс. жыхароў.

Віцебск. Помнік героям вайны 1812 г. Устаноўлены ў 1912 г.

1927 г., 20 сакавіка	На Віцебшчыне арганізавана радыёвяшчанне.
1929 г., 29верасня	Выйшаў першы нумар газеты «Віцебскі пралетарый».
1931 г.,7 верасня	Уведзена ў эксплуатацыю панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ.
1934 г.,7лістапада	Адкрыты новы мост цераз р. Заходняя Дзвіна (з 1974 г. імя Блахіна). Пачаў дзейнічаць аэрапорт.
1934 г.,лістапад	Адкрыта бальніца-інстытут (з 1938 г. — Віцебскі медыцынскі інстытут).
1939 г.,17 студзеня	Усесаюзны перапіс насельніцтва. У Віцебску 167,3 тыс. жыхароў.
1940 г., 19 ліпеня	У горадзе ўтвораны Чыгуначны, Кастрычніцкі і Першамайскі раёны.



Помнік М.З.Шагалу на вул. Пакроўскай.

1941 г., 5—11 ліпеня	Абарона Віцебска войскамі Чырвонай Арміі і народнымі апалчэнцамі.
1941 г., 11 ліпеня — 1944 г., 26 чэрвеня	Акупацыя Віцебска нямецка-фашысцкімі захопнікамі.
1941 г., ліпень — 1942 г., жнівень	Стварэнне і дзейнасць падпольнай групы медыкаў на чале з К.С.Акаловіч.
1941 г., ліпень — 1942 г., 22 верасня	Дзейнасць падпольнай групы Л.Д.Бярозкінай.
1941 г., ліпень — 1943 г., 5 мая	Дзейнасць падпольнай групы А.Е.Белахвосцікава.
1941 г., ліпень — 1944 г., сакавік	Дзейнасць падпольнай дыверсійна-разведвальнай групы М.Я.Нагібава.
1941 г., ліпень — 1944 г., чэрвень	Дзейнасць падпольнай групы У.А.Казлоўскага.
1941 г., жнівень — 1943 г., люты	Дзейнасць падпольнай групы Ф.К.Мехава.

Панарама Плошчы Перамогі ў Віцебску.

1941 г., жнівень — 1943 г., красавік	Дзейнасць разведвальна-дыверсійнай групы В.А.Вярбіцкага.
1941 г., лістапад — 1943 г., жнівень	Дзейнасць падпольнай групы М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова.
1942 г., студзень — 1943 г., снежань	Дзейнасць падпольнай групы Т.А.Ламаносенка.
1942 г., сакавік — 1943 г., лістапад	Дзейнасць падпольнай групы І.А.Бекішава.
1942 г., сакавік — 1943 г., лістапад	Дзейнасць падпольнай групы М.А.Журынскай.
1942 г., красавік — 1943 г., верасень	Дзейнасць падпольнай групы А.І.Ліпці.
1942 г., 1 кастрычніка — 13 лістапада	Дзейнасць падпольнай групы Героя Савецкага Саюза В.З.Харужай.

Помнік віцебскім падпольшчыкам.

1943 г.	Падпольшчыца В.Вялава ўзарвала будынак гарадской паліцыі і пашпартнага стала.
1944 г., 4 ліпеня	Праз чыгуначную станцыю Віцебск прайшоў на фронт першы цягнік.
1944 г., 10 снежня	Праведзены першы масавы суботнік па аднаўленню горада.
1944 г., снежань	Уведзена ў эксплуатацыю фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі».
1945 г.	Адноўлены станкабудаўнічы завод імя Кірава і панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ.
1946 г.	Зацверджаны генеральны план аднаўлення і рэканструкцыі Віцебска.
1947 г.	Уведзены ў строй домабудаўнічы камбінат.
1948 г., 7 ліпеня	Адбыўся першы пасляваенны выпуск настаўнікаў у Віцебскім педінстытуце.

Брацкая магіла савецкіх воінаў на грамадзянскіх могілках у пасёлку Лучоса (у межах Віцебска).

1954 г.	Узведзены новы будынак чыгуначнага вакзала.
1959 г.	У Віцебску 148,3 тыс. чалавек.
1960 г., 20 красавіка	Пачала працаваць Віцебская студыя тэлебачання.
1964 г.	Рашэннем гарвыканкома ўстаноўлена званне «Ганаровы грамадзянін Віцебска».

Беларускі акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску.

1971 г., 15 снежня	Нарадзіўся 250-тысячны жыхар горада Віцебска.
1974 г., 26 чэрвеня	На плошчы Перамогі ў Віцебску адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага комплексу ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў.
1974 г., 29 жніўня — 1 верасня	Святкаванне 1000-годдзя Віцебска. Горад узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.
1978 г., 1 верасня	Пуск 1-га віцебскага тралейбуса.
1978 г., кастрычнік	З канвеера тэлевізійнага завода сышоў першы тэлевізар «Віцязь».
1988 г., ліпень	Здадзены ў эксплуатацыю Летні амфітэатр больш чым на 5 тыс. месцаў. У Віцебску прайшоў 1-ы фестываль польскай песні.
1989 г., сакавік	Створана сумеснае савецка-германскае прадпрыемства «Белвест».

Гасцініца Віцебск.

1989 г., чэрвень	На 1-м конкурсе «Віцебская прыгажуня» перамагла Марыя Кежа — будучая Міс СССР-1990.
1989 г., снежань	Выйшаў першы нумар гарадской газеты «Віцебскі кур'ер».
1989 г.	У Віцебску 350 тыс. жыхароў. Здадзены ў эксплуатацыю Палац культуры і тэхнікі лёгкай прамысловасці.
1990 г., сакавік	З Вялікадня пачаліся богаслужэнні ў адноўленай Пакроўскай царкве.
1990 г., жнівень	Выпуск першага нумара абласной газеты «Народнае слова».
1991 г., сакавік	Выйшаў першы нумар гарадской газеты «Віцьбічы».

Помнік воінам-інтэрнацыяналістам у Віцебску на вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў.

1992 г., ліпень	У Віцебску прайшлі Шагалаўскія дні, Міжнародныя Шагалаўскія чытанні. Адкрыты помнік Марку Шагалу. Прайшоў 1-ы Міжнародны музычны фестываль «Славянскі базар».
1998 г., снежань	Адноўлена Благавешчанская царква — помнік архітэктуры 12 ст.
1999 г., люты	Праведзены рэспубліканскі перапіс насельніцтва. У Віцебску больш за 340 тыс. жыхароў.
1999 г., лістапад	У Віцебску пабудаваны Палац спорту.
2000 г., 29 снежня	На плошчы Тысячагоддзя закладзены мемарыяльны знак з пасланнем да патомкаў.
2000 г.	Ураджэнец Віцебска Ж.І.Алфёраў атрымаў Нобелеўскую прэмію ў галіне фізікі.

Да чытача

Паважаны чытач!

У цябе ў руках дзве кнігі з серыі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць», якая выдаецца па рашэнню Урада Рэспублікі Беларусь. Яны прысвечаны Віцебску — аднаму са старажытнейшых гарадоў зямлі беларускай.

У «Віцебскім летапісе» С.Аверкі (1768), які складзены на аснове матэрыялаў М.Панцырнага і ўпершыню апублікаваны А.П.Сапуновым у 1883 г., запісана: «В лето 974 года Ольга, разбив ятвягов и печенегов, переправилась через реку Двину, заночевала с войском и, облюбовавши гору, заложила деревянный замок, назвала его от реки Витьбы Витебском. Выстроила каменную церковь в Верхнем замке святого Михаила, а в Нижнем — Благовещения. Два года прожив, уехала в Киев». Не зусім зразумела, чаму і аўтары «Віцебскага летапісу», і арганізатары святкавання 1000-годдзя горада ў 1974 г. не прынялі да ўвагі той гістарычны факт, што княгіня Вольга ніяк не магла быць на віцебскай зямлі ў 974 г. Яна памерла за 5 гадоў да гэтай даты, у 969 г. Бліжэй да ісціны тыя навукоўцы, якія лічаць, што аўтары «Віцебскага летапісу» свядома ці не, але дапусцілі памылку, указаўшы 974, а не 947 год. Дарэчы, першае летапіснае ўпамінанне пра Віцебск у знакамітай «Аповесці мінулых гадоў» датуецца 1021 г.

За сваю шматвяковую гісторыю Віцебск перажыў нямала слаўных, часам драматычных, а то і трагічных падзей і дат. Быў ён і цэнтрам самастойнага Віцебскага княства, але быў і ў залежнасці ад Полацка, і ад Смаленска. З 1320 г. Віцебск уваходзіў у склад Вялікага княства Літоўскага, пазней Рэчы Паспалітай, з 1772 г. — у Расійскай дзяржаве. З 1924 г. — цэнтр Віцебскай акругі, з 1938 г. — Віцебскай вобласці БССР.

У кнізе «Памяць» адзначаецца, што значны ўклад у вывучэнне гісторыі старажытнага і сярэдневяковага Віцебска зрабілі вядомыя беларускія археолагі Г.Штыхаў, М.Ткачоў, Т.Бубенька, В.Ляўко, Л.Калядзінскі і інш.

Адметная рыса Віцебска — яго геаграфічнае становішча. Праз горад праходзілі шыротны (з «вараг у грэкі») і мерыдыяльны (з Волгі ў Варажскае мора) гандлёвыя шляхі. І ўжо ў 1229 г. Віцебск разам з Полацкам і Смаленскам падпісаў першы ў сваёй гісторыі міжнародны гандлёвы дагавор з Рыгай і Готландам. З другога боку, Віцебск заўсёды быў горадам «порубежным» — і ў далёкія часы Вялікага княства Літоўскага, і ў нашы дні. І яшчэ. Ні адна з войнаў — ці то Маскоўскай дзяржавы са сваімі за-

2[а]. Зак. 434.

ходнімі суседзямі, ці то заходніх дзяржаў з Расіяй — не абмінула гэты старажытны культурна-гістарычны цэнтр. Дзесяткі разоў Віцебск вынішчаўся, выпальваўся дашчэнту. Гінулі архітэктурныя помнікі, бясследна знікалі культурна-мастацкія каштоўнасці, вывозіліся на працу ў іншыя месцы выдатныя майстры-творцы. Але самы крывавы след у гісторыі Віцебска пакінула Вялікая Айчынная вайна 1941—45 гг. Не скарыліся, не здаліся віцябляне на літасць ворагу. Патрыятычнае падполле, дапамога партызанам, барацьба з ворагам у радах Чырвонай Арміі — такім быў адказ жыхароў горада на навязаны фашыстамі «новы» парадак. На няскоранасць народа фашысты адказвалі загубай гараджан, стварэннем гета і засценкаў гестапа, разбурэннямі гарадскіх пабудоў. Місія амерыканскага Чырвонага Крыжа, якая наведвала Віцебск адразу пасля вызвалення яго ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 г., адзначыла, што гэта мёртвы горад і каб адрадзіць яго да жыцця трэба 100 гадоў.

На шчасце, прадказанні амерыканскіх экспертаў не спраўдзіліся. Ужо да 1965 г., праз 20 гадоў пасля вайны, Віцебск пераўзышоў усе даваенныя паказчыкі ў гаспадарча-культурным развіцці. У 1974 г. за вялікія дасягненні ў развіцці народнай гаспадаркі горад быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Гісторыю Віцебска ствараліі ствараюць працавітыя, гордыя, вольналюбівыя, адданыя сваёй Айчыне людзі. Былі яны і ў старажытныя часы, і ў раннім і познім сярэдневякоўі. Успомнім паўстанне гараджан супраць уніяцкага засілля ў 1623 г. — 19 чалавек былі пакараны смерцю, горад пазбавілі магдэбургскага права, былі закрыты ўсе праваслаўныя цэрквы і г.д. Але горад не здаўся. Горад жыў, развіваўся, набіраў сілы. У 19 ст. культурнае жыццё горада складвалася пад уздзеяннем такіх вядомых дзеячаў беларускай мастацкай культуры як літаратары І.Манькоўскі, Т.Лада-Заблоцкі, А.Вярыга-Дарэўскі, К.Вераніцын, этнографы М.Нікіфароўскі, Е.Раманаў, А.Сержпутоўскі, І.Гарбачэўскі, навукоўцы З.Даленга-Хадакоўскі, І.Грыгаровіч, А.Сапуноў, архітэктары Ц.Кібардзін, К.Тарасаў, І.Фамін і інш. З Віцебскам звязаны прозвішчы такіх знакамітасцей як Г.Дзяржавін, А.Пушкін, М.Гогаль, Т.Шаўчэнка, У.Лажэчнікаў, Г.Успенскі, І.Бунін, К.Савіцкі, І.Рэпін, М.Шагал, М.Бахцін.

Віцебск сёння — гэта горад з амаль 400-тысячным насельніцтвам, адзін з буйнейшых прамысловых і культурных цэнтраў Рэспублікі Беларусь. Далёка за межамі дзяржавы горад вядомы сваім «Славянскім базарам», Шагалаўскім і Рэпінскім пленэрамі, міжнароднымі фестывалямі мастацтваў «Белая амфара», «Менестрэль», сучаснай харэаграфіі і інш. Тут знаходзяцца Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава, медыцынскі і тэхналагічны універсітэты, Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны. У горадзе працуе адзін са старэйшых тэатральных калектываў Беларусі — Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа, у апошнія гады шырокую вядомасць набыў калектыў Віцебскага лялечнага тэатра. У 1999 г. ў Віцебску адкрыты буйнейшы ў рэспубліцы лядовы Палац спорту.

Кніга «Памяць. Віцебск» выдаецца ў 2 тамах. Яна створана на аснове шматлікіх архіўных і дакументальных матэрыялаў, артыкулаў вядомых навукоўцаў, успамінаў удзельнікаў гістарычных падзей, публікацый у перыядычным друку, звестак са статыстычных і энцыклапедычных выданняў. Рэдакцыйная калегія, Віцебскі гарвыканком выказваюць самую шчырую падзяку грамадзянам, навуковым калектывам, органам выканаўчай улады, усім, хто меў дачыненне да збору, апрацоўкі і падрыхтоўкі матэрыялаў да друку. Мы асабліва ўдзячны гарадской арганізацыі Беларуска-

га фонду міру, якая перадала значную суму, сабраную ў горадзе, для выдання кнігі «Памяць. Віцебск».

Мы далёкія ад думкі, што поўнасцю выкарысталі ўсе матэрыялы пра гісторыю і сучаснае жыццё Віцебска. Такая мэта не ставілася, ды яна была б і не пад сілу невялікай грамадскай рэдакцыйнай калегіі. На жаль, не ўдалося ўстанавіць шмат якія прозвішчы людзей, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, закатаваны ў яўрэйскіх гета, прапалі без вестак у канцэнтрацыйных лагерах. Мы спадзяёмся, што знаёмства чытачоў з кнігай «Памяць. Віцебск» дазволіць ліквідаваць гэты прабел, а дасланыя імі дадатковыя матэрыялы будуць выкарыстаны ў далейшай рабоце над кнігай.

Кніга «Памяць. Віцебск» — для Вас, паважаныя віцябляне.

Чытайце, вывучайце, ведайце гісторыю сваёй маленькай Радзімы — нашага старажытнага і вечна маладога Віцебска.

Спадзяёмся, што наша выданне зацікавіць і гасцей горада.

Старшыня Віцебскага гарадскога
выканаўчага камітэта — У.В.Пелагейка.

Старшыня гарадской камісіі
доктар гістарычных навук, прафесар
рэктар Віцебскага дзяржаўнага універсітэта
імя П.М.Машэрава — А.У.Русецкі.


ВІЦЕБСК
Настрычніцкі раён
Першамайскі раён
Чыгуначны раён
Паркі і зялёныя зоны
Чыгунка

ВІЦЕБСК. ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ, ГІСТОРЫІ І МАНУМЕНТАЛЬНАГА МАСТАЦТВА



ПОМНІКІ АРХІТЭКТУРЫ

1. Жаночае епархіяльнае вучылішча (1902г.)
2. Будынак пазямельна-сялянскага банка (1917г.)
3. Трынітарскі манастыр:
   а) касцёл (1814–21гг.),
   б) манастырскі корпус (1806г.).
4. Будынак акруговага суда (канец 19ст.)
5. Ратуша (1775г.)
6. Базыльянскі манастыр:
   а) жылы манастырскі корпус (1743–85гг.),
   б) Аляксандраўская гімназія (пачатак 19ст.).
7. Палац губернатара (1772г.)
8. Будынак гандлёвых радоў (канец 18ст.)
9. Мужчынскае духоўнае вучылішча (1890г.)
10. Жылы дом галоўнага архітэктара горада Ц.В.Нібардзіна (пачатак 20ст.)
11. Будынак Маскоўскага міжнароднага гандлёвага банка (1856г.)
12. Дом грамадзянскага сходу (канец 19ст.)
13. Дом спецыялістаў (1938г.)
14. Благавешчанская царква (12ст.)
15. Насцёл св. Варвары (18ст.)
16. Саляныя склады (18ст.)
17. Мемарыял на плошчы Перамогі (1974г.)
18. Архітэктурны ансамбль: вакзал і прывакзальная плошча (1866г.)
19. Назармы Леннаранскага палка (канец 19ст.)
20. Жылы дом (канец 19–пачатак 20ст.) –Дом-музей М.Шагала

ПОМНІКІ ГІСТОРЫІ І МАНУМЕНТАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

1. Помнік героям вайны 1812г.
2. Вайсковыя могілкі
3. Магілы савецкі воінаў
4. Магіла ахвяр фашызму
5. Помнік Віцебскім падпольшчыкам
6. Памятны знак на месцы яўрэйскага гета ў гады Вялікай Айчынай вайны 1941–45гг.
7. Помнік Герою Савецкага Саюза А.Н. Гараўцу
8. Помнік У.І. Леніну
9. Помнік П.М. Машэраву
10. Помнік А.С. Пушкіну
11. Помнік М.Шагалу
12. Помнік М.П. Шмырову

ВІЦЕБСК, горад, цэнтр Віцебскай вобласці і Віцебскага раёна. Размешчаны па абодва бакі ракі Заходняя Дзвіна ў сутоках рэк Віцьба і Лучоса. За 300 км на паўночны ўсход ад Мінска. Вузел чыгунак і аўтадарог, якія ідуць сюды з Украіны, Расіі, краін Балтыі. Порт на Заходняй Дзвіне. Аэрапорт. Плошча 89,1 км^2. Насельніцтва 341,3 тыс. чал. (2002). Віцебску адміністрацыйна падпарадкаваны г.п. Руба (насельніцтва 7,8 тыс. чал., 2002). Падзяляецца на 3 раёны: Кастрычніцкі, Першамайскі і Чыгуначны.

Заснаваны ў 974 г. Назву атрымаў ад р. Віцьба. Размешчаны на заходняй ускраіне Віцебскага ўзвышша. Мяжуе з Гарадоцкім узвышшам і Суражскай нізінай на поўначы і паўночным усходзе, Лучоскай нізінай на поўдні. Падзяляецца Заходняй Дзвіной на больш раўніннае правабярэжжа і левабярэжжа з глыбокімі ярамі і лагчынамі. Абсалютныя вышыні ад 125 м (месца ўпадзення р. Лучоса ў Заходнюю Дзвіну) да 204 м (на паўднёва-ўсходняй ускраіне). Асноўныя прыродныя рэсурсы — падземныя воды і будаўнічыя матэрыялы. Для водазабеспячэння горада выкарыстоўваюцца артэзіянскія крыніцы. На кліматычныя ўмовы вялікі ўплыў аказваюць паветраныя масы з Атлантыкі, якія ў зімовы час прыносяць пацяпленне, а ў летні — халоднае надвор'е з дажджамі. Сярэднегадавая тэмпература паветра студзеня -7,8 °С, ліпеня 18 °С. Ападкаў выпадае 620 мм за год. Каля 70% з іх выпадае ў цёплы перыяд года (з красавіка па кастрычнік). Шырыня Заходняй Дзвіны ў межах Віцебска 110—150 м, даліна карытападобная, шырыня 200—300 м, схілы стромкія, вышыня 15—20 м; рэчышча прамалінейнае. Уздоўж левага берага Заходняй Дзвіны горад раскінуўся больш чым на 14 км, уздоўж правага — 16 км. Рака судаходная. Сярэдняя працягласць навігацыйнага перыяду 215 дзён.

Віцебск — буйны прамысловы і культурны цэнтр. Развіта машынабудаванне і металаапрацоўка [акцыянернае прадпрыемства «Візас», РУВП (рэспубліканскае унітарнае вытворчае прадпрыемства) «Віцебскі станкабудаўнічы завод «Вістан», РУВП «Віцебскі станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна» і інш.]; электронная [РУВП «Віцязь», ААТ (адкрытае акцыянернае таварыства) «Віцебскі прыборабудаўнічы завод», РУВП «Завод «Эвістар» і інш.]; лёгкая [РУП «Віттэкс», РУП «Фабрыка мастацкіх вырабаў «Купава», ААТ «Сцяг індустрыялізацыі», ААТ «Чырвоны Кастрычнік», ААТ «Віцебскія дываны», СП (сумеснае прадпрыемства) «Белвест», таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марка» і інш.]; хімічная (Віцебскае абласное унітарнае прадпрыемства «Вітпласт»); харчовая (ААТ «Малако», ААТ «Віцебскі мясакамбінат», ААТ «Маслаэкстракцыйны завод», СП «Вікас» і інш.); дрэваапрацоўчая і будматэрыялаў (ААТ «Віцебскдрэў», ААТ «Віцебскмэбля», ААТ «Завод зборнага жалезабетону №3» і інш.).

У горадзе дзейнічаюць Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава, медыцынскі універсітэт, тэхналагічны універсітэт, акадэмія ветэрынарнай медыцыны, Віцебскія філіялы недзяржаўнага інстытута сучасных ведаў і недзяржаўнага інстытута працоўных і сацыяльных адносін, 11 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 9 ПТВ, 43 агульнаадукацыйныя школы, ліцэй, 3 гімназіі, школа-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху і школа-інтэрнат для дзяцей з затрымкай псіхічнага развіцця, 102 дзіцячыя дашкольныя ўстановы (у тым ліку прагімназія, 2 цэнтры развіцця дзіцяці, 7 дашкольных устаноў з паглыбленым кірункам дзейнасці і 2 санаторнага тыпу), дзіцячы дашкольны дом, сацыяльны прытулак, 8 дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ, 4 вячэрнія школы, 2 вучэбна-вытворчыя камбінаты, 13 бальніц, 6 дыспансераў, 15 паліклінік і іншыя медыцынскія ўстановы. Працуюць Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я.Коласа, Беларускі тэатр «Лялька», Віцебская абласная філармонія, дзіцячыя мастацкая і 4 музычныя школы, 3 школы мастацтваў, самадзейныя музычныя і харэаграфічныя калектывы (больш за 30 маюць званне народнага). Праводзяцца шматлікія фестывалі, конкурсы, пленэры, у тым ліку «Славянскі базар у Віцебску», Музычны фестываль імя І.І.Салярцінскага, Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, фестываль гітарнай музыкі «Менестрэль» і інш. Працуюць 4 кінатэатры, 22 клубныя ўстановы, 127 бібліятэк, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, у склад якога ўваходзяць гістарычны, мастацкі, літаратурны, музей прыватных калекцый, музей-сядзіба Ілы Рэпіна (у в. Здраўнёва) і інш., выдаюцца газеты «Віцебскі рабочы», «Народнае слова», «Віцьбічы», «Віцебскі кур'ер» і інш. Дзейнічаюць абласныя аддзяленні Беларускага Саюза музычных дзеячаў, Саюзы пісьменнікаў, архітэктараў, журналістаў Беларусі, абласная арганізацыя Саюза мастакоў Беларусі. З канца 1980-х гадоў у Віцебску створаны і дзейнічаюць шматлікія грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі і рухі. У горадзе брацкія магілы падпольшчыкаў, савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, магіла ахвяр фашызму, вайсковыя могілкі. Помнікі: героям Айчыннай вайны 1812 г., на месцы лагера смерці ў Вялікую Айчынную вайну і месцы загубы падпольшчыкаў, мемарыяльны комплекс у гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў Віцебшчыны, У.І.Леніну, П.М.Машэраву, В.З.Харужай, М.П.Шмырову, воінам-інтэрнацыяналістам і інш. Помнікі архітэктуры: Віцебская царква Благавешчання (12 ст.), ратуша (16—18 ст.), базыльянскі і трынітарскі кляштары, Варварынскі касцёл (усе 18 ст.), Казанская царква (1760).

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сляды сівой даўніны

У далёкім мінулым зямля старажытнейшых продкаў віцяблян, іх першапачатковае экалагічнае асяроддзе выглядала зусім інакш, чым цяпер. За доўгую геалагічную гісторыю тут, як на ўсім Беларускім Падзвінні і Падняпроўі, адбыліся велізарныя змены. Адбіліся вынікі катастрафічных з'яў прыроды — пяціразовае нашэсце гіганцкіх скандынаўскіх ледавікоў, што працягваліся дзесяткі мільёнаў гадоў, чатырох паслялядніковых эпох, якія радыкальна змянілі аблічча Зямлі, яе клімат, рэльеф. Верагодны і касмічныя ўздзеянні. Пра гэта сведчаць помнікі геалагічнага мінулага — нямыя сведкі вялікіх катастроф, або невядомых касмічных з'яў, што адбываліся ў свеце задоўга да з'яўлення на Зямлі першых людзей, у тым ліку і засялення чалавекам прасторы «Віцебскай Беларусі».

Раней у цэнтры горада існавала таксама высокая Замкавая гара, што ўпамінаецца ў вядомай легендзе аб заснаванні Віцебска вялікай княгіняй Вольгай. Пра многае напамінаюць крутыя яры Віцьбы, стромкія берагі Дзвіны, маляўнічыя даліны Лучосы, поймы шматлікіх пратокаў гэтых гістарычных рэк і рэчак, празрыстыя крыніцы навакольля.

Больш за 3,5 тыс. вялікіх і малых азёр «сінявокай Віцебшчыны», што пакінула геалагічная эпоха, — характэрная геаграфія краю, рыбныя багацці якога здаваліся невычэрпнымі. Захаваліся рэшткі калісьці багатых дзікім зверам і птушкай бясконцых дрымучых непраходных лясоў, векавых бароў і пушчаў, што калісьці акружалі горад. Яны служылі асновай «матэрыяльна-тэхнічнай базы» першых яго жыхароў. Адсюль пачыналіся збіральніцтва ежы, лекавых траў, мёду дзікіх пчол, падсечнае земляробства. Ствалы лясных волатаў — дубоў, карабельных смалістых сосен — былі лепшым матэрыялам для абарончых збудаванняў, гарадзішчаў, замкаў, веж, іншых умацаванняў, навядзення мастоў, перапраў, будаўніцтва сродкаў тагачаснага воднага транспарту — старажытных чаўноў, платоў, стругаў. Яшчэ нямала існуе балотных абшараў з запасамі торфу і сапрапеляў, нават невялікай колькасці балотнай жалезнай руды.

І сёння здараюцца знаходкі даўно зніклых на Віцебскім Падзвінні раслін і жывёл. У даламітавых і вапнава-мелавых адкладах, размытых берагах старых рэк — Дзвіны і Лучосы, кар'ерах цагельных заводаў (Руба, Журжа і інш.) знойдзены косці маманта, шарсцістага насарога, вялікарогіх лася, аленя, зубра.

Некаторыя раёны віцебскага навакольля здзіўляюць мноствам дробных і вялікіх валуноў, якімі хтосьці нібы спецыяльна засеяў старажытную віцебскую зямлю. Камень быў распаўсюджаным матэрыялам для вытворчасці асноўных прылад працы і зброі першабытнага паляўнічага-рыбалова. Вядомы гісторык 19 ст.: А.К.Кіркор адзначае: «Камень играл важную роль в жизни человека и даже во время его младенческого состояния. Едва только человек вышел из дикости, едва началось его умственное развитие, камень является как бы спутником его жизни. Первые памятники —



Каменная сякера, якая імітуе бронзавую сякеру тыпу «пальштаб» з упорам. З раскопак на Верхнім замку.

каменные. Древнейшие гробницы — каменные».

Першае пасяленне чалавека на тэрыторыі сучаснага горада, на нашу думку, можна аднесці да эпохі каменнага веку. Яно размяшчалася ўздоўж левага берага р. Віцьба, недалёка ад вусця, на тэрыторыі колішняга Верхняга замка. Пад час археалагічных раскопак тут знойдзены каменная сякера тыпу «пальштаб» з закраінамі і каменная сякера са свідраванай адтулінай, а таксама ножападобныя крамянёвыя пласціны — рэшткі крэмнеапрацоўчай вытворчасці. Гэтыя матэрыялы адносяцца да неаліту, або ранняга перыяду бронзавага веку. Каменныя сякеры знойдзены і на тэрыторыі колішняга Дольнага замка, але ў больш позні час (12—13 ст.). Іх выкарыстоўвалі ў якасці засцярэгаў ад Перуна (або пажараў) пры збудаванні жытла.

У раннім жалезным веку рэльеф Віцебска быў зусім іншы, чым цяпер. Ён уяўляў сабой некалькі ўзвышшаў, якія знаходзіліся ў забалочанай даліне Віцьбы. На адным з такіх узвышшаў на левым беразе Віцьбы, за 100—150 м ад яе вусця, узнікла гарадзішча ранняга жалезнага веку т.зв. днепра-дзвінскай археалагічнай культуры. У пісьмовых крыніцах 16 ст. гэтая гара з-за стромкасці схілаў вядома пад назвай Ламіха (пазней Замкавая гара). Гарадзішча ўяўляла сабой гару ў выглядзе ўсечанай піраміды з роўнай пляцоўкай зверху. Памеры пляцоўкі 60 × 130 м (0,7 га). У 1928 г. вядомы беларускі археолаг А.М.Ляўданскі даследаваў культурны пласт паселішча. У культурным слоі, таўшчыня якога дасягала 1 м, знойдзены рэшткі ляпнога посуду культуры штрыхаванай керамікі і тыпу сярэдняга пласта Тушамлі, ткацкі грузік.

У Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве захоўваецца бронзавая ручка скіфскага мяча, якая была знойдзена ў Віцебску на гарадзішчы. Гэта яшчэ адзін доказ, што на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Віцебска існавала паселішча ранняга жалезнага веку (не пазней 3 ст. н.э.).

У 6—8 ст. на Замкавай гары і на Дзвінскім узвышшы, якое размешчана на левым беразе Заходняй Дзвіны, паміж вусцем р. Віцьба і Пілатавым ручаём існуюць паселішчы носьбітаў культуры тыпу верхняга пласта Банцараўшчыны. Ад гэтай пары знойдзены фрагменты посуду, гліняныя грузікі, праселкі.

Л.У.Калядзінскі.

На паўночнай ускраіне Віцебска за 3 км ад Ніжняга замка (за 1 км ад левага берага Заходняй Дзвіны) у мясцовасці Пескавацік, каля сучасных Мазурынскіх могілак, ёсць невялікае гарадзішча. З паўднёвага і ўсходняга бакоў яно акружана балотам. Некалі тут было возера і рака. Пляцоўка гарадзішча ўтварае круг дыяметрам 35 м. Уваход на гарадзішча знаходзіцца з паўночнага боку. Вышыня гары 15 м. Амаль уся пляцоўка гарадзішча пашкоджана траншэямі.

У 1972 на гарадзішчы праводзіліся раскопкі. Было даследавана 16 м^2 культурнага слоя. Яго таўшчыня складала 0,5—0,6 м. Пласт чорнага колеру, бедны на знаходкі. Знойдзена некалькі кавалкаў ляпной керамікі днепра-дзвінскай культуры, косці жывёлы і клык мядзведзя.

У наваколлі Віцебска існавала яшчэ некалькі падобных гарадзішчаў. Гарадзішча днепра-дзвінскай культуры выяўлена каля в. Баронікі на паўднёвай ускраіне Віцебска. Яно ўзвышаецца над поплавам Лучосы. Пляцоўка авальнай формы, памер 42 × 74 м. Гарадзішча абследавалі ў 1956 г. Л.В.Аляксееў, у 1965 і 1972 гг. праводзіў раскопкі на плошчы 140 м^2 Г.В.Штыхаў. Таўшчыня культурнага пласта ў цэнтры пляцоўкі 0,2—0,3 м, з

паўночнага боку бліжэй да краю 0,9 м. Гэта сведчыць пра тое, што цэнтр пляцоўкі не забудоўваўся. З краю пляцоўкі былі выяўлены ямы ад жытлаў слупавой канструкцыі. Знойдзены 2 каменныя клінападобныя сякеры, жалезны нож з гарбатай спінкай, тыповы для днепра-дзвінскай культуры і іншых культур ранняга жалезнага веку, глінянае праселка, жалезная сякера скіфскага тыпу. Вялікую цікавасць уяўляе бронзавая падвеска, якая мае аналогію сярод падобных вырабаў 5—4 ст. да н.э. Знойдзена шмат ляпной керамікі. Найбольш старажытныя жыхары гарадзішча яшчэ карысталіся каменнымі сякерамі. Гарадзішча існавала з 5 ст. да н.э. да 4—5 ст. н.э. Верагодна, у 6—8 ст. яно выкарыстоўвалася як гарадзішча-сховішча.

Пры раскопках знойдзены скарб, які складаўся з 3 драцяных бронзавых скроневых кольцаў, яны мелі па 2 трапецападобныя падвескі. Гэтыя вырабы не маюць нават прыблізных аналогій, таму не вызначана, да якога часу яны адносяцца.

За 10 км на поўнач ад Віцебска каля в. Лужасна размяшчаецца гарадзішча на краю выспы, акружанай з усіх бакоў балотам. Авальная пляцоўка памерам 50 × 45 м знаходзіцца на вышыні 19 м. Гарадзішча ўмацавана 2 валамі і равамі. Даследавалася ў 1972 і 1974 гг. Магутнасць культурнага слоя нераўнамерная. У цэнтры пляцоўкі яна складае 0,6 м, каля краёў 2,5 м. Гарадзішча мае 2 гарызонты. Адзін адносіцца да днепра-дзвінскай археалагічнай культуры, другі (верхні) да банцараўскай культуры ранняга сярэднявечча. Нераўнамернасць таўшчыні культурнага пласта пацвярджае, што гарадзішча забудоўвалася па краях пляцоўкі. Знойдзены ляпны посуд, жалезныя нажы, бронзавая трапецападобная падвеска ад жаночага ўпрыгожання і інш. Гарадзішча ўзнікла ў раннім жалезным веку (да нашай эры), а затым у 5—8 ст. выкарыстоўвалася як сховішча ў часы ваеннай небяспекі. Да гарадзішча з поўдня прымыкае селішча. Даследавана 196 м^2. Таўшчыня культурнага слоя звыш 1 м. Пры раскопках выяўлены рэшткі заглыбленага ў грунт жытла памерам 4 × 5 м з печчу-каменкай. Каля печы знойдзена шмат ляпной керамікі, гліняны тыгель для плаўкі каляровых металаў, бронзавы пінцэт. Тут жыла сям'я майстра, які займаўся бронзаліцейнай справай.

Акрамя гарадзішчаў каля вёсак Баронікі і Лужасна, у наваколлі Віцебска вядомы гарадзішчы каля вёсак Старае Сяло, Заронава,



З раскопак у Лужасна: 1—3 — бронзавыя вырабы з раскопак гарадзішча; 4 — бронзавы пінцэт 5—8 ст. з селішча; 5 — глінянае праселка для верацяна.

Мяклава. Усе яны з'явіліся ў раннім жалезным веку і належалі балцкім плямёнам днепра-дзвінскай культуры. Каля гарадзішчаў у Старым Сяле, Лужасна, Заронава, на Замкавай гары ў Віцебску знойдзены селішчы 5—8 ст. банцараўскай археалагічнай культуры. У гэты час старыя гарадзішчы сталі выкарыстоўвацца як сховішчы. Жыццё на селішчах спынілася ў канцы 8 ст. Адначасова перасталі выкарыстоўвацца ў якасці сховішчаў гарадзішчы, якія былі побач. Толькі на селішчах каля вусця Віцьбы на тэрыторыі сучаснага Віцебска жыццё працягвалася ў 9—10 ст. Магчыма, што менавіта сюды перасялілася насельніцтва з апусцелых паселішчаў. У гэты час Віцебск пачаў ператварацца ў значны па памерах горад на Заходняй Дзвіне.

Для вывучэння гісторыі насельніцтва важнае значэнне маюць раскопкі курганных могільнікаў. У наваколлі Віцебска каля в. Лятохі ў лесе ўздоўж дарогі захаваўся могільнік, які налічвае 14 курганоў вышынёй 1,5—2,5 м, дыяметрам 12—14 м. Адзін курган валападобны, мае даўжыню 70 м, шырыню 8—9 м. Каля асновы насыпу захаваліся глыбокія вузкія раўкі. Адсюль бралі грунт для насыпання кургана.

У 1923 г. 2 курганы каля в. Лятохі даследаваў А.К.Супінскі. Выяўлены рэшткі напалавіну спаленага нябожчыка. У 1965 і 1972 гг. былі даследаваны яшчэ 3 курганы. Адзін з іх быў пусты, у другіх пад насыпам знойдзена трупаспаленне. У трэцім, падоўжаным кургане, пад насыпам было выяўлена вогнішча і ляпны гаршчок банцараўскай культуры. Гэты курган датуецца 6—8 ст.

На правым беразе Заходняй Дзвіны пры ўпадзенні ў яе ручая, за 2 км ад в. Старае Сяло (Віцебскі раён) выяўлены гарадзішча і 2 групы курганных могільнікаў жалезнага веку. У 1-й групе 26 курганоў, у 2-й — 47. Насыпы круглыя, падоўжаныя і валападобныя. Даўжыня аднаго кургана 2-й групы дасягае 40 м. Вышыня самага вялікага 1,5—2 м. Археалагічны комплекс неаднаразова абследаваўся. Яшчэ ў 1819 г. курганны могільнік абследаваў этнограф Д.Хадакоўскі ў час свайго падарожжа з Украіны, Гомеля праз Віцебск у Санкт-Пецярбург, аб чым паведамляў «Русский исторический сборник» (т. 1, кн. 3, М., 1839).

У 1928 г. беларускі археолаг А.М.Ляўданскі абследаваў курганы ў лесе за 1 км ад гарадзішча. Былі знойдзены перапаленыя косці чалавека, ляпны гаршчок з чырвонай гліны і абломак другой такой жа пасудзіны банцараўскай культуры. Знойдзеныя ў фрагментах 2 пасудзіны з'яўляюцца слабапрафіліраванымі, адносяцца да 6—8 ст.

Выяўлена агнішча, абкладзенае камянямі. Побач з гарадзішчам селішча банцараўскай культуры, на якім у 9—12 ст., як устанавіў А.М.Ляўданскі, насыпаны курган.

Выключнае значэнне для вывучэння гісторыі насельніцтва Віцебшчыны мелі раскопкі курганоў 6—11 ст. каля в. Дарахі ў Гарадоцкім раёне. Былі выяўлены прыкметы археалагічнай культуры доўгіх курганоў паўночнай Беларусі.

Гэта культура полацкіх крывічоў, якія жылі ў беларускім Падзвінні і Верхнім Падняпроўі. Назва культуры паходзіць ад доўгіх валападобных пахавальных насыпаў. Пахавальны абрад у курганах — трупаспаленне. Доўгія курганы адлюстроўваюць перыяд, калі на поўначы Беларусі і суседніх тэрыторыях рассяляліся славяне, якія асімілявалі мясцовае балцкае і фіна-ўгорскае насельніцтва і ўтварылі групоўку ўсходніх славян — крывічоў. Археалагічныя звесткі пацвярджаюць, што ў доўгіх курганах пахаваны славянізаваныя балты ці славяне з моцным уплывам матэрыяльнай культуры балтаў. Гэта непасрэдныя продкі беларусаў, якія заснавалі ў 5—8 ст. паселішчы ў Віцебску і яго наваколлі. Плямёны банцараўскай культуры (назва паходзіць ад гарадзішча Банцараўшчына пад Мінскам) знаходзіліся на апошняй стадыі распаду патрыярхальна-радавых адносін. Распаўсюджанне паселішчаў з невялікімі жытламі, разлічанымі на малую індывідуальную сям'ю, — важны таму доказ. У гэты час пачаўся пераход ад радавой абшчыны да тэрытарыяльнай сельскай. У радавых калектывах адбываліся значныя змены, узнікла няроўнасць паміж асобнымі сем'ямі. У працэсе распаду першабытнага ладу прабеларускія плямёны пераходзілі ад стадыі ваеннай дэмакратыі да шматукладнага грамадства. Тут у 9—12 ст. перапляталіся 3 асноўныя сацыяльна-эканамічныя ўклады: абшчынны, рабаўладальніцкі і феадальны. Апошні паступова станавіўся пануючым. Гэтыя ўмовы грамадскага развіцця спрыялі станаўленню гарадоў. Віцебск побач з Полацкам з'яўляецца адным з найбольш старажытных гарадоў Беларусі.

Г.В.Штыхаў.

Дзядзінец і Верхні замак Віцебска ў 11—17 ст.

Дзядзінец і Верхні замак — гістарычная частка горада, размешчаная ў цэнтры сучаснага Віцебска, з поўначы абмяжоўваецца р. Віцьба, з захаду — Заходняй Дзвіной. З напольнага боку ён ахопліваецца Ніжнім замкам: з поўдня вул. Замкавай, з усходу — вул. Леніна. Знешніх прыкмет, акрамя невялічкіх узвышкаў у раёне драмтэатра і адміністрацыйных будынкаў уздоўж р. Віцьба, Верхні замак не захаваў. Помнік быў моцна пашкоджаны ў час розных будаўнічых работ, што пачаліся тут яшчэ з сярэдзіны мінулага стагоддзя.

Археалагічныя раскопкі на Верхнім замку Віцебска (на Замкавай гары) праводзіў у 1895—96 гг. А.П.Сапуноў. У 1928 г. Верхні замак абследавалі С.А.Дубінскі і А.М.Ляўданскі. Апошні сцвярджаў, што першапачатковае паселішча на Замкавай гары існавала ўжо ў дафеадальны час.

У 1958 г. расійскі археолаг Л.В.Аляксееў выявіў у архіве Ленінградскага аддзялення Інстытута археалогіі матэрыялы, звязаныя са знішчэннем Замкавай гары, а таксама яе графічную выяву канца 19 ст.

Апошнія рэлікты Замкавай гары назіралі ў час земляных работ на яе месцы ў 1960-я гады віцебскі краязнаўца М.С.Рыўкін, а на пачатку 1970-х гадоў вядомы беларускі археолаг Г.В.Штыхаў. Невялікія раскопкі на Верх-

нім замку ў 1976 г. зрабіла В.М.Ляўко. Найбольш поўныя раскопкі на гэтым помніку праводзіліся ў 1977—78 гг. пад кіраўніцтвам М.А.Ткачова, а з 1979 і па 1993 год — аўтарам.

Вынікі гэтых даследаванняў далі багатую інфармацыю па стратыграфіі культурнага пласта Верхняга замка Віцебска, яго храналогіі, даюць уяўленне пра яго ўмацаванні, планіроўку і забудову, рэчы, якімі карысталіся жыхары Верхняга замка ў мінулыя часы, і пра занятак яго насельніцтва.

Культурны пласт Верхняга замка (пласт зямлі, што ўтвараецца пад час жыцця і дзейнасці чалавека) мае таўшчыню каля 6 м, месцамі нават і больш за 8 м. Пласт гэты часам вельмі вільготны, што дае магчымасць захоўвацца ў ім рэчам з дрэва, скуры, косці. У выніку гэтага стала магчымым добра вывучыць тагачасную забудову, якая ў часы сярэднявечча была ў асноўным драўлянаю. Нават была спроба захаваць рэшткі гэтай забудовы, зрабіўшы на месцы раскопак археалагічны музей.

Верхні замак займаў месца колішняга дзядзінца Віцебска, які ў 11 ст. размяшчаўся на Замкавай гары. Замкавая гара знаходзілася за 120—200 м на ўсход ад вусця р. Віцьба на яе левым беразе. Па стану на канец 19 ст. яна мела вышыню 9—10,5 м. Каля падэшвы гэтая гара займала пляцоўку 60 × 130 м (0,7 га), якая была выцягнута ў напрамку з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад. Схілы гары былі даволі стромкія, таму, відаць, і атрымала яна сваю першапачатковую назву — Ламіха. З 9 ст. гэтая гара была аблюбавана крывічамі. Наўкола яе мелася некалькі неўмацаваных паселішчаў. Адно з іх было на мысе, ля сутокі Віцьбы і Дзвіны, астатнія былі на тэрыторыі колішняга Ніжняга замка.

У 10—11 ст. Замкавая гара была ядром, вакол якога адбывалася станаўленне Віцебска. Натуральна, што ядро горада, ці інакш дзядзінец, мела ўмацаванні. Гэта быў земляны вал, па версе якога ішоў вастракол з бярвення.

На мяжы 11—12 ст. пасля пераўтварэння Віцебска ва ўдзельнае княства яго дзядзінец пашыраецца ў заходнім накірунку, у бок Дзвіны. На Замкавай гары, якая з гэтага часу выконвала ролю княжацкага дворышча, будуецца храм Св. Міхаіла — першы каменны храм Віцебска. А пашыраны дзядзінец умацоўваецца новым абарончым валам. Гэты вал уяўляў гліністa-пясчаны насып шырынёю ка-



Тапаграфічны план Віцебска ў 12—13 ст. Гістарычныя часткі горада: А — дзядзінец, а — княскае дворышча, Б — вакольны горад, В — перадгрэдзе, Г — сельская акруга і гарадскі некропаль. Храмы: 1 — св.Міхаіла, 2 — Звеставанне, 3 — св.Параскевы Пятніцы (мяркуемае месца).



Археалагічныя раскопкі на Замкавай гары пад кіраўніцтвам А.П.Сапунова ў 1895—96 гг.

ля падэшвы да 14 м, вышынёю і шырынёю па версе каля 6 м, а ў перыметры 770 м. Унутры насып вала быў арміраваны драўлянымі перакладнымі канструкцыямі. Пад час раскопак гэтага вала ў 1978 і 1988 гг. было прасочана да 11 накатаў бярвенняў, што ўмацоўвалі насып вала. Мяркуючы па дадзеных аналізу бярвенняў, што праводзілі спецыялісты, вал гэты ўводзіўся прыкладна з 1136 па 1140 год, што прыпадае на час княжання ў Віцебску Васількі Святаславіча (1132—44). Пасля рамонтных падсыпак, што рабіліся ў 13 ст., вал віцебскага дзядзінца быў пашыраны да 25 м. Плошча дзядзінца ў 12—13 ст. дасягнула 4 га.

У 1-й палавіне 14 ст. у часы княжання вялікага князя ВКЛ Альгерда на земляным вале быў пастаўлены мур «з баштамі вынеслымі і вежамі». З 1351 г., як сведчаць пісьмовыя крыніцы, дзядзінец Віцебска атрымаў назву «Верхні замак Віцебска».

Аснову планіроўкі дзядзінца — Верхняга замка складалі вулічныя насцілы, падпарадкаваныя мясцоваму рэльефу. У 1231 г. па заходняму схілу Замкавай гары быў пракладзены драўляны вулічны насціл, які вёў, відаць, на княжацкае дворышча, згадка пра якое ёсць у пісьмовых крыніцах 2-й палавіны 13 ст. Пад час раскопак ускрыта 6 ярусаў вулічных насцілаў 13—14 ст., якія клаліся на спецыяльныя лагі з дошак, аполкаў, бярвення. Цікава адзначыць, што часам паасобныя ўчасткі вуліцы былі выкладзены з рознага матэрыялу. Так, сустракаюцца ўчасткі вуліц, выкладзеныя з адных дубовых або з адных толькі бярозавых бярвенняў. Гэта сведчыць пра тое, што кожны гаспадар перад сваёй сядзібаю сам мусіў масціць замацаваны за ім участак вуліцы. Гэта пацвярджаецца і пісьмовымі крыніцамі. Так, у грамаце літоўскага вялікага князя Аляксандра віцебскаму намесніку князю Міхаілу Жаслаўскаму за 1495 год гаворыцца, каб: «...мост мощивали, каждый человек перед своим двором». Шырыня вулічных насцілаў на Верхнім замку Віцебска ў 13—16 ст. была каля 2 м. Гэтыя насцілы былі пракладзены ў накірунку да Замкавай гары.



Віцебскі Верхні замак. Археалагічныя раскопкі 1978 г.



Бронзавы нагрудны крыж з раскопак на Верхнім замку.

У домабудаўніцтве Верхняга замка выкарыстоўвалася сасновае, яловае і ў меншай ступені дубовае бярвенне. Тэхніка ўзвядзення жытлаў і клецяў была зрубнаю, а хлявоў — слупавой і зрубнаю. Да канца 13 ст. плошча жытлаў на Верхнім замку была 16—25 м^2, а пазней — 36—42 м^2. Усе пабудовы на Верхнім замку, незалежна ад свайго прызначэння, мелі добраўпарадкаваныя падлогі з дошак ці аполкаў. Амаль усе пабудовы ставіліся на своеасаблівы фундамент. У якасці такога фундамента былі рэшткі старых пабудоў, падкладкі з абрубкаў бярвення.

Усяго на Верхнім замку Віцебска ўскрыта больш за 100 пабудоў. Гэтыя пабудовы захаваліся ў асноўным на 2—4 вянцы, зрэдку на 5—6.

У некаторых жытлах Верхняга замка захаваліся печы. Да 16 ст. яны былі ў асноўным глінабітныя. Дах зрубных пабудоў быў двухсхільны, на лямягах. У пабудовах слупавой канструкцыі вядомы быў і аднасхільны дах на сохах. Пакрыццё даху рабілася найчасцей з цёсу — «тарціц». У цэлым домабудаўніцтва Верхняга замка мела агульныя ўсходнеславянскія рысы, уласцівыя гарадам Паўночнай і Паўночна-Заходняй Русі.

У час раскопак Верхняга замка было сабрана некалькі тысяч знаходак, якія характарызуюць матэрыяльную і гаспадарчую дзейнасць насельніцтва Верхняга замка. Гэта вырабы з металу, дрэва, косці, скуры, каменю, шкла і гліны. Яны знойдзены ва ўсіх пластах, але большая частка з іх прыпадае на пласты 13 — пачатку 14 ст. Па свайму прызначэнню гэтыя рэчы прадстаўлены прыладамі працы, прадметамі вайсковай справы і хатняга ўжытку, упрыгожваннямі.

9—11 ст. датуюцца наканечнікі стрэл з чорнага металу, калачападобнае крэсіва, фрагмент сярпа і спружынных нажніц. Жалезныя рэчы канца 12 — пачатку 14 ст. ўключаюць цёсла, ювелірны пінцэт, сталярныя і касцярэзныя нажы, спружынныя і шарнірныя нажніцы, авальнай формы крэслівы, лічнік, вядзёрныя дужкі, вушкі медных катлоў, патэльні, шпількі з рухомым кальцом, паясныя спражкі, цыліндрычныя замкі, ключы,

Віцебскі Верхні замак. Унутрывальныя канструкцыі ўмацавання дзядзінца 12 ст. Раскопкі 1988 г.



Залачоная смальта. Верхні замак. Пачатак 12 ст.



Шпора. Пачатак 14 ст. З раскопак на Верхнім замку.



Ключы 13—16 ст. З раскопак Верхняга замка..



Прылады працы 12—16 ст. З раскопак на Верхнім замку.

дзвярныя ручкі, ланцугі, прабоі, скобы, клямкі, цвікі. З прадметаў вайсковай справы 13 ст. знойдзены псалія, шпоры, конскі ледаходны шып, з прадметаў узбраення — наканечнік кап'я, нож-захаляўнік, арбалетны болт, шпоры з зубчатым кальцом.

Ад вырабаў з каляровых металаў пачатку 11 ст. знойдзены вугалок ад скураной сумкі. Вырабы канца 12 — пачатку 14 ст. уключаюць бранзалеты, пярсцёнкі, гузікі, медную патэльню, фрагменты сценак ад медных катлоў.

Сярод касцяных вырабаў 9—11 ст. грузік ад вертыкальнага ткацкага станка, праколкі, іголкі і касцяная іголка, расчоскі. Прадметы канца 12 — пачатку 14 ст. уключаюць касцяны падшыпнік ад ручных жорнаў, лашчыла для апрацоўкі скур жывёл, ручкі нажоў, грабяні, гузікі, накладкі рознага прызначэння, шахматную фігурку ладдзю.

Каменныя вырабы (асялкі для заточкі прылад працы і каменныя жорны ад ручных млыноў) знойдзены ў напластаваннях амаль



Бандарныя вырабы (бандаркі, днішчы, накрыўкі) 12—14 ст.

што ўсіх часоў, але найбольш у пласце 13 — пачатку 14 ст.

Вырабы са шкла з пласта 11 — пачатку 12 ст. прадстаўлены знаходкаю кубічка залачонай смальты, ваконнага шкла заходнееўрапейскай вытворчасці, бочкападобнай залачонай пацеркі, пасярэбранай пацеркі і паласатай пацеркі. З пласта 13 — пачатку 14 ст. паходзяць шкляныя бранзалеты, у час раскопак іх сабрана каля паўтары сотні. Асноўная маса віцебскіх шкляных бранзалетаў мае ізумрудна-зялёны колер, ёсць таксама вырабы жоўтага, карычневага, фіялетавага, сіняга, блакітнага і бірузовага колеру. Існуе думка, што ў Віцебску была нават наладжана вытворчасць пэўнай часткі гэтых упрыгожванняў. Гэтым часам датуюцца і некалькі рознакаляровых па форме пацерак. Найбольшую цікавасць маюць знаходкі фрагментаў шкляного посуду сіняга шкла, распісанага белай, чырвонай і залатой фарбаю. Такі посуд у 12—на пачатку 13 ст. вырабляўся на Блізкім Усходзе, у Сірыі і Егіпце.

Драўляныя вырабы 13—17 ст. налічваюць больш за 500 знаходак. Яны прадстаўлены прыладамі працы, рэчамі хатняга начыння, дэталямі транспартных сродкаў. Так, з прылад працы знойдзены даўбежкі, валікі, пранікі, дубовыя кліны для расколвання бярвення на плашчакі. З земляробчых прылад знойдзены дубовыя рыдлёўкі і частка сахі. Апошняя з'яўляецца унікальнаю знаходкаю, бо акрамя Віцебска была знойдзена ў час раскопак Старой Ладагі.

Транспартныя сродкі прадстаўлены дэталямі гужавога, зімняга саннага і воднага транспарту. Гэта палазы і капылы саняў, калёсны вобад і спіцы да яго, вось ад воза і драбіна воза, вёслы рулявыя і грабныя, лодачны шпангоут.

Большая частка скураных вырабаў паходзіць з пласту 13 — пачатку 14 ст. Гэта абутак (поршні, чаравікі, боты), скургалантарэя (кашалькі, сумкі, рэмні, рукавіцы, паясы, ножны). З іншых скураных вырабаў знойдзены калчан, мех дуды — «валынкі», мячы для гульні. Знаходкі абутку і скургалантарэі сустракаюцца і ў пластах 14 ст.

Шырока прадстаўлена ў раскопках Верхняга замка і кераміка. Так, у час раскопак знойдзены адзін цэлы і больш за 2 дзесяткі адноўленага да поўнай формы посуду. Вядучым тыпам посуду на працягу ўсяго часу былі гаршкі. Кераміка 9 ст. была яшчэ ляпная, на пачатку 10 ст. — ужо падпраўленая на ганчарным крузе. У 10 ст. ганчарная кераміка з Віцебска была вельмі блізкай па свайму выгляду да полацкай. Гаршкі канца 12—13 ст. маюць агульнарускі тып: плаўна прафіліраваныя, з шыйкаю, арнаментаваны



Керамiка з раскопак Верхняга замка: 1 — гаршчок 13 ст.; 2 — фігурная цэгла 14—15 ст.; 3—5 — кафля 17 ст.



Рэчы з Замкавай гары, сабраныя А.М.Ляўданскім у 1928 г.: 1—3 — фрагменты ляпнога посуду 2—3-й чвэрці 1-га тысячагоддзя н.э.; 4—5 — гліняны грузік больш ранняй пары.

хваляю, лініямі і г.д. Для керамікі з Верхняга замка Віцебска характэрна пераважна складаная прафіліроўка венчыка посуду. Акрамя таго, у пластах канца 12—13 ст. на Верхнім замку знойдзены накрыўкі, патэльні, латкі, міскі.

Шэраг знаходак даюць магчымасць меркаваць пра той ці іншы занятак насельніцтва Верхняга замка ў розныя часы. Так, косці свойскіх і дзікіх жывёл сведчаць пра жывёлагадоўлю і паляванне, косці і луска рыбы — пра рыбалоўства, шкарлупкі лясных арэхаў — пра збіральніцтва. Шлак і сапло сведчаць пра металургію, знаходкі л'ячак і тыгляў — пра ювелірную справу, абзоленая поўсць — пра гарбарную вытворчасць, абрэзкі скуры — пра кравецкую справу і г.д.

Верхні замак Віцебска — каштоўная крыніца па вывучэнні матэрыяльнай культуры беларускага сярэдневяковага горада. Але яго лёс, такі багаты на гісторыю, быў драматычны. Асабліва гэта тычыцца старажытнай часткі — Замкавай гары, паступовае знішчэнне якой пачынаецца з 2-й палавіны 19 ст. Так, у 1864—68 гг. у час добраўпарадкавання тэрыторыі перад будынкам губернскага дваранскага сходу зямлю бралі з Замкавай гары ды з валоў уздоўж р. Віцьба. А ў 1880 г. частка Замкавай гары была скапана з нагоды будаўніцтва каля яе мужчынскай гімназіі. Аднак найбольшая шкода нанесена помніку стагоддзе таму, калі Замкавая гара была скапана амаль што цалкам. Падрабязныя звесткі пра гэта ёсць у архіве Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук, што ў Санкт-Пецярбургу, дзе і захоўваецца «Дело о срытии Замковой горы в г. Витебске». Згодна гэтаму дакументу, яшчэ ў 1883 г. дырэкцыя Віцебскай гімназіі выступіла з хадайніцтвам аб зрыцці Замкавай гары.

Дазвол на зрыццё Замкавай гары быў атрыманы, праўда, з той акалічнасцю, што перад гэтым будуць праведзены археалагічныя раскопкі. Раскопкі праводзіліся ў 1895—96 гг. пад кіраўніцтвам А.П.Сапунова. Даследаваннямі былі ахоплены паўночная і паўднёва-заходняя часткі пляцоўкі гарадзішча. Плошча раскопа складала больш за 400 м^2, а глыбіня яго дасягала каля 2 м. У час гэтых раскопак былі выяўлены рэшткі падмурка каменіцы, ніжні паверх якой захаваўся на вышыню да паловы ваконнага праёма, каменныя прыступкі і мошчаная цліткаю і каменем падлога. Непадалёку ад гэтага месца былі выяўлены 14 пахаванняў, зробленых па хрысці-

янскаму абраду. На ўскраі пляцоўкі, у яе паўночнай і паўднёва-заходняй частках былі ўскрыты каменныя сцены і арка, выкладзеная з цэглы. Сярод сабраных рэчаў больш чым 70 знаходак з жалеза (наканечнікі кап'я і стрэл, сякеры, нажы, замкі, ключы, спражкі, падковы, завесы, цвікі і інш.), асялкі, жорны, гліняныя грузілы, а таксама шматлікія фрагменты глінянага і шклянога посуду, каменнага і жалезнага ядра. Знойдзены косці жывёл (быка, свінні, авечкі, лася, мядзведзя) і птушак, косці і луска рыбы. Гэты матэрыял можна ў цэлым датаваць 13—17 ст. Рэшткі каменнага падмурка і выкладзеную пліткаю падлогу, відаць, можна аднесці да рэштак храма св. Міхаіла. На карысць гэтай думкі могуць сведчыць і выяўленыя пахаванні, якія звычайна рабіліся каля царквы. Каменныя сцены — рэшткі праслаў абарончай сцяны 14—15 ст., а цагляная арка, магчыма, рэшткі скляпенняў палаца кн. Альгерда.

У канцы 1960-х — пачатку 1970-х гадоў на месцы Замкавай гары быў узведзены будынак абкома партыі. Цяпер толькі невялічкія схілы ў панадворку гэтай пабудовы, у якой размешчаны мастацкі музей, яшчэ могуць нагадаць пра самую старадаўнюю частку Віцебска — Замкавую гару.

Літаратура:

Алексеев Л.В. К истории и топографии древнейшего Витебска // Советская археология. 1964. №1.

Левко О.Н. Витебск XIV—XVIII вв. Мн., 1984.



Глінянае грузіла ад вертыкальнага ткацкага станка. 9—10 ст. З раскопак на Верхнім замку.

Ткачоў М., Калядзінскі Л. Раскопкі на Верхнім замку (Віцебска) // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. №1.

Ткачев М.А., Колединский Л.В., Бубенько Т.С. Средневековый Витебск // Труды V Международного конгресса славянской археологии. М., 1987. Т. 3, вып. 16.

Штыхов Г.В. Сравнительное изучение древнейших городов Полоцкой земли и памятников их окрестностей // Древности Белоруссии. Мн., 1966. С. 238—252.

Л.У.Калядзінскі.

Гандлёва-рамесніцкі пасад Віцебска ў 10—13 ст.

У 9 ст. ў вусці р. Віцьба існавала не менш чатырох крывіцкіх паселішчаў, якія былі размешчаны на Замкавай гары; на ўзвышанай, з трох бакоў абкружанай равамі пляцоўцы на ўсход ад Замкавай гары; На двух узгорках Дзвінскага ўзвышша—востраў пры ўпадзенні р.Віцьба ў Заходнюю Дзвіну. Крывіцкае паселішча ў паўднёвай частцы Дзвінскага ўзвышша склалася ў выніку асіміляцыі балцкага насельніцтва папярэдняга часу (6—8 ст.).

Размяшчэнне крывіцкіх паселішчаў на скрыжаванні важнейшых гандлёвых шляхоў ранняга сярэднявечча прывяло да таго, што на мяжы 10—11 ст. на іх базе фарміруецца раннефеадальны горад. Узнікненне Віцебска, як і шэрагу іншых гарадоў, размешчаных на волаках (Друцк, Орша), відаць, абумоўлена імкненнем княжацкай улады ўмацаваць свой кантроль над Днепра-Дзвінскім гандлёвым шляхам.

На Замкавай гары будуецца дзядзінец, які становіцца сацыяльна-тапаграфічным і адміністрацыйным цэнтрам горада. Канцэнтрацыя гарадскога жыцця на прылягаючых паселішчах прывяла да ўзнікнення тут гандлёва-рамесных пасадаў. Працэс гэты ў залежнасці ад ступені аддаленасці пасёлкаў ад гарадскога ядра працякаў нераўнамерна. Так, у выніку паступовай засыпкі рова, які аддзяляў горад ад усходняга паселішча, у 11 ст. адбываецца іх тэрытарыяльнае аб'яднанне. Аддаленасць жа паселішчаў на Дзвінскім узвышшы ад цэнтра абумовіла адносна нізкую інтэнсіўнасць жыцця тут у 10—11 ст.

Пра шчыльнасць засялення пасадаў можна меркаваць па рэштках печаў-каменак. Іх невялікая колькасць сведчыць пра свабодную забудову. Амаль поўная адсутнасць наземных

Пярсцёнак і медальён з княжацкім знакам з Віцебскага пасада. 12 ст.



Падвеска-«канёк» 13—14 ст. з Ніжняга замка.

частак дамоў не дазваляе вызначыць тып забудовы паселішчаў. Можна толькі адзначыць, што з канца 11 ст. яна пачала набываць сядзібныя рысы. Свабодная забудова пасадаў абумовіла спецыфіку планіроўкі горада, якая насіла неўпарадкаваны характар і карэкціравалася толькі ўмовамі рэльефу мясцовасці.

На раннім этапе (10—11 ст.) існавання горада выяўлены толькі сляды рамеснай дзейнасці яго жыхароў. Пры гэтым вялікае значэнне мела размяшчэнне паселішчаў, што абумовіла першапачатковую вытворчую спецыялізацыю жыхароў. Так, тэрмічная апрацоўка металаў, звязаная з павышанай небяспекай пажараў, абумовіла развіццё на акружаным з усіх бакоў вадой Дзвінскім узвышшы бронзаліцейнай вытворчасці, якая ўзнікла тут яшчэ ў 6—8 ст. Знаходкі (шлакі, крыцы, а таксама молат для іх пракоўкі) сведчаць пра існаванне апрацоўкі чорных металаў. На аддаленым ад ракі ўсходнім пасадзе ў 2-й палавіне — канцы 10 ст. атрымалі развіццё касцярэзнае і ганчарнае рамёствы; да канца 11 ст. была асвоена апрацоўка каменю, бурштыну.

Размяшчэнне Віцебска на перасячэнні важнейшых гандлёвых шляхоў — мерыдыяльнага («з вараг у грэкі») і шыротнага (Волга-Ака-Варажскае мора) — абумовіла даволі высокую ўдзельную вагу імпарту сярод знаходак 10—11 ст. Гэта дазваляе меркаваць, што адным з галоўных заняткаў жыхароў прылягаючых да горада пасёлкаў быў дальні гандаль.

Адсутнасць абарончых збудаванняў вакол пасадаў, гандлёва-вечавай плошчы, якая выконвала ролю планіровачнага цэнтра і рэгулюемай сядзібнай забудовы, сведчыць, што да 12 ст. гандлёва-рамесны пасад як галоўная структурная частка раннесярэдневечнага горада яшчэ не сфарміраваўся.

У 12 ст. адбываецца рэзкі скачок у эканамічным развіцці пасадскіх паселішчаў, які характарызаваўся пашырэннем асартыменту прадукцыі, спецыялізацыяй вытворчасці. Культурны пласт з вялікай колькасцю рамесных вырабаў 12—13 ст. сведчыць пра разнастайную рамесную вытворчасць. Асабліва наглядна развіццё рамяства прасочваецца на арганічна звязаным з дзядзінцам усходнім паселішчы. Разам з ужо існуючымі вытворчасцямі ў 12 ст. развіваецца бронзаліцейная справа, кавальская апрацоўка жалеза, гарбарна-шавецкая вытворчасць, відаць, шкларобства. Пасад на Дзвінскім узвышшы развіваўся менш інтэнсіўна. У 12—13 ст. тут існавалі такарная апрацоўка дрэва і косці, гарбарна-шавецкая справа, ткацтва. Вытворчасці, звязаныя з тэрмічнай апрацоўкай металаў (бронзаліцейная, жалезаапрацоўчая), прыходзяць у заняпад, што, відаць, звязана з пераарыентацыяй вытворчай спецыялізацыі жыхароў пасада.

Шэраг ускосных дадзеных сведчыць аб карпаратыўнасці пасадскага рамяства. Так, існаванне на ўсходнім пасадзе Кузьмадзям'янскага завулка і аднаіменнай царквы

паказвае на існаванне карпарацыі кавалёў. Паўднёва-ўсходняя частка пасада належала шаўцам абутку і ювелірам, у дакументах 16—17 ст. упамінаецца пра жыхарства тут залатых спраў майстроў.

У сувязі з храмавым будаўніцтвам у 1-й палавіне 12 ст. ў горадзе з'яўляецца мясцовая архітэктурная арцель, існаванне якой даказаў П.А.Рапапорт. Навукоўцы лічаць, што ў 13 ст. ў Віцебску была і мясцовая школа шкларобства (заходні пасад).

Рост рамеснай вытворчасці суправаджаўся фарміраваннем унутраных рынкавых сувязей, якія аб'ядналі непасрэднага вытворцу з сельскагаспадарчай акругай. Гэтыя адносіны рэгуляваліся гарадскім рынкам, характэрнай рысай якога, пачынаючы з 12 ст., з'яўляўся храм, у распараджэнні якога знаходзіліся эталоны гандлёвых мер і права збіраць пошліны з тых, хто карыстаецца гэтымі мерамі. Будаўніцтва пад сценамі града (дзядзінца) ў 12 ст. царквы Параскевы Пятніцы і на Дзвінскім узвышшы Дабравешчанскай царквы ўказвае, з аднаго боку, на фарміраванне сваіх гандлёвых плошчаў на самастойных пасадах, з другога — на пэўную карпаратыўнасць прадстаўнікоў купецтва.

Археалагічныя дадзеныя і пісьмовыя крыніцы дазваляюць зрабіць вывад, што на рубяжы 12—13 ст. Віцебск з'яўляецца цэнтрам не толькі ўнутранага, але і знешняга гандлю. Апошні, хоць і не займаў вядучага месца ў сістэме гарадской гаспадаркі, аднак роля яго



Залаты пярсцёнак 12 ст. З раскопак на Ніжнім замку.

заставалася значнай. На працягу 13 ст. заключаецца шэраг гандлёвых дагавораў з Рыгай, у якіх Віцебск выступае як раўнапраўны ўдзельнік разам з Полацкам і Смаленскам. Гэта дазваляе гаварыць пра будаўніцтва ў Віцебску, па аналогіі з іншымі гарадамі, гандлёвага двара нямецкіх купцоў.

У 1130—40-я гады пасадскае паселішча ў паўночнай частцы Дзвінскага ўзвышша ўвайшло ў агульнагарадскую структуру як вакольны горад.

Вывучэнне схілаў пляцоўкі ва ўсходняй і заходняй частках Ніжняга замка сведчаць, што пасады амаль да сярэдзіны 14 ст. знаходзіліся пад абаронай прыродных крутых схілаў і глыбокіх запоўненых вадой яроў. Сва-

Раскопкі на Ніжнім замку ў Віцебску. 1983 г. Агульны выгляд раскопу №10.

Мураваная вежа «Нарожная» Ніжняга замка. Сярэдзіна 14 ст.



Каменная ліцейная форма для адліўкі жаночага ўпрыгожання (6—8 ст.) з раскопак Ніжняга замка ў Віцебску. 1966 г.

бодная забудова і частыя перапланіроўкі сядзіб не дазваляюць разглядаць іх у якасці своеасаблівых абарончых умацаванняў ранняе сярэдневяковага часу. Адсутнасць абарончых збудаванняў у 12—13 ст. абумовіла своеасаблівасць забудовы пасадаў.

Як і раней, забудова заставалася свабоднай, мелі месца частыя змены межаў сядзіб і іх унутранай планіроўкі. У 12 ст. ўзніклі вуліцы, што абумовіла размяшчэнне сядзібных комплексаў непасрэдна каля маставых, часта агароджа ўпіралася ў тарцы насцілаў. Стабільная і даволі шчыльная забудова ўздоўж вуліц на працягу 12—16 ст. у той жа час не выключала свабоднай забудовы аддаленых участкаў амаль да позняга сярэдневякоўя.

Супастаўленне археалагічных даных са звесткамі пісьмовых крыніц 16—17 ст. дазваляе вызначыць сапраўдныя памеры сядзібы. На заходнім пасадзе яны складалі не менеў 147—165 м^2, на ўсходнім — 156—182 м^2. Двары складаліся, як правіла, з хаты, клеці (свірна), аднаго, зрэдку двух хлявоў і лёгкага навесу для жывёлы. Часам у склад сядзібнага комплексу ўваходзілі навесы для гаспадарчых (камора) ці вытворчых патрэб. Пабудовы размяшчаліся па перыметры агароджы, утвараючы замкнуты дворык, які ў большасці выпадкаў замошчваўся. Сядзібы каля Дабравешчанскай царквы ўключалі ў лінію агароджы тыльныя бакі пабудоў, на ўсходнім паселішчы сядзібныя пабудовы размяшчаліся ў аддаленні ад агароджы.

Асноўным тыпам сядзібнага жылля з'яўляліся зрубныя дамы плошчаю 12,5—14,5 м^2. Як правіла, гэта аднакамерныя пабудовы, рубленыя ў «просты вугал» з астанцам (або ў «чашку»). Гэта адзіны спосаб рубкі, які прымяняўся да канца 13 ст. У 14 ст. з'яўляюцца дамы з «малым астаткам», якія трэба разглядаць як пераходнае звяно да з'яўлення ў канцы 14 ст. пабудоў, рубленых у «чысты вугал».

Ва ўмовах значнай вільготнасці грунту ўсе віцебскія пабудовы мелі фундаменты і дабротную дашчаную падлогу, пакладзеную на 2—3 лагі. Парогі ў пасадскіх дамах вырубаліся на ўзроўні 4—5 вянкоў.

Самай распаўсюджанай формай страхі была двухсхільная страха «ў закот». У 14 ст. з'яўляюцца чатырохсхільныя стрэхі, якія першапачаткова прымяняліся ў замкавым будаўніцтве для афармлення верху вежаў, якія ў мірны час выкарыстоўвалі ў якасці жылля. Звычайныя дамы крыліся гонтам, маляўнічую манастырскую дахоўку сталі выкарыстоўваць толькі са з'яўленнем чатырохсхільных стрэх.

Большасць пасадскіх дамоў на працягу 10—14 ст. была аднапавярховая. Не выключана, аднак, што сярод багатых дамоў былі двухпавярховыя дамы на падклецях.

Якасць узвядзення гаспадарчых пабудоў мала чым адрознівалася ад будаўніцтва жылля. Гэта абумоўлена, відаць, не толькі багаццем будаўнічага матэрыялу, але і высокімі выканаўчымі навыкамі віцебскіх цесляроў, якія не маглі выконваць работу на розных узроўнях якасці ў залежнасці ад прызначэння пабудоў.

У старажытнарускі час кожны самастойны пасад меў свой планіровачны цэнтр. Ролю такога цэнтра, як правіла, выконвала гандлёвая

плошча з царквою, да якой вялі ўсе гарадскія вуліцы. На беразе Заходняй Дзвіны ў 12 ст. гандаль ажыццяўляўся на плошчы паўночней Дабравешчанскай царквы, тут жа стаяла і карчма.

Вывучэнне планаў горада да пачатку рэгулярнай забудовы і супастаўленне іх з гістарычнымі матэрыяламі 16—18 ст. дазволілі вызначыць месцазнаходжанне гандлёвай плошчы з царквою св. Параскевы Пятніцы (пабудавана не раней 12 ст.) на ўсходнім пасадзе (сучасная пл. Свабоды).

На ўсходнім пасадзе вулічная сістэма планіроўкі аформілася ў пачатку 12 ст. і засталася нязменнай да пачатку рэгулярнай планіроўкі горада. Цэнтральная магістраль — вуліца Вялікая — злучала Завіцебную браму з Задунайскай, да яе прымыкала вуліца Прабойная, якая вяла на дзядзінец, і завулак Кузьмадзям'янскі, што ішоў за Пятніцкай царквой.

Стабільнасць межаў сядзібных комплексаў на заходнім паселішчы на працягу 2-й палавіны 12—13 ст. дае падставу лічыць, што забудова тут таксама рэгулявалася напрамкам вулічных маставых.

Існаванне на пасадах планіровачных цэнтраў з гандлёвай плошчай, узвядзенне пабудоў гарадской гаспадаркі, узнікненне сядзібнай забудовы, якая, нягледзячы на перапланіроўкі, ужо пачала падпарадкоўвацца



Наканечнікі стрэл і кап'я. 10—14 ст. З раскопак у Ніжнім замку.

законам горадаўтварэння, паказваюць, што ў горадзе ў 12 ст. мелася самакіруемая абшчына, якая з'яўлялася галоўным распарадчыкам пасадскай зямлі.

На працягу 12—13 ст. завяршаецца працэс тэрытарыяльнага аб'яднання пасадаў. Роў, які аддзяляў Дзвінскае ўзвышша, паступова быў знівеліраваны (засыпаны). У 13 ст. да горада далучаецца пасад за р. Віцьба. У пачатку 14 ст. з узвядзеннем абарончых збудаванняў вакол аб'яднаных пасадаў канчаткова афармляецца тэрыторыя сярэдневечнага Віцебска.

Т.С.Бубенька.

Палітычная гісторыя

Віцебск (у старадаўніх пісьмовых крыніцах мае яшчэ назву Видбеск, Видебеск, Витепеск, Витепско, Витепск) — адзін з нямногіх гарадоў Беларусі, радавод якіх сягае ў глыбокую даўніну. Горад займаў важнае месца на шляху з варагаў у грэкі. Таму з гэтай прычыны да 1021 г. належаў вялікім князям кіеўскім. У 1021 г. вялікі князь кіеўскі Яраслаў Мудры перадаў Віцебск разам з Усвятамі полацкаму князю Брачыславу Ізяславічу. Пасля смерці Усяслава Брачыславіча ў 1101 г. Віцебск перайшоў да аднаго з яго сыноў, пэўна, Святаслава. Святаслаў Усяславіч — сын Усяслава Брачыславіча, унук Брачыслава Ізяславіча. Упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1129 годам сярод сыноў Усяслава Брачыславіча, якіх кіеўскі князь Мсціслаў Вялікі саслаў у Царгарад. На думку даследчыка А.Е.Праснякова і польскага гісторыка Т.Васілеўскага, Святаслаў Усяславіч на пачатку 12 ст. валодаў Віцебскам, бо на далейшае Віцебскі сталец займалі яго ўнукі Усяслаў Васількавіч і Брачыслаў Васількавіч. У 1116 г. Віцебск быў узяты войскамі Давыда Усяславіча і Яраполка Уладзіміравіча, пасля чаго належаў смаленскім князям.

Васількa (Васіль) Святаславіч — князь полацкі і віцебскі, сын віцебскага (на думку А.Е.Праснякова і Т.Васілеўскага) князя Святаслава Усяславіча, унук Усяслава Брачыславіча полацкага. Упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1132 годам як князь полацкі, які дагэтуль княжыў у Ізяслаўлі. Пасля высылкі яго бацькі ў Візантыю віцебскі сталец нібыта застаўся вакантны. Між тым менавіта ў 1130—40-я гады ў Віцебску назіраецца ўздым у развіцці. Пашырана плошча дзядзінца, у 1136—40 гг. ён абнесены новым магутным абарончым валам, узведзены

Касцяны абразок з Віцебска. 12 ст.

каменныя храмы св. Міхаіла на княжацкім дворышчы, Зьвеставанне (Дабравешчанская) і св. Параскевы Пятніцы на вакольным горадзе. У 1160—62 гг. і ў 1175 г. віцебскі сталец заняў яго сын Усяслаў Васількавіч, а ў 1180—1181 гг. другі яго сын Брачыслаў Васількавіч. Ёсць думка, што ў 1130—40-я гады Васілька Святаславіч валодаў і Віцебскам. У сярэдзіне 1140-х гадоў назіраецца дынастычнае збліжэнне полацка-віцебскіх князёў з чарнігаўскімі Вольгавічамі. Гэтае збліжэнне было, як прынята на той час, замацавана шлюбам паміж Святаславам Усеваладавічам і дачкою Васількі Святаславіча.

Усяслаў Васількавіч — князь полацкі, віцебскі і друцкі, сын Васількі Святаславіча, унук Святаслава Усяславіча. Упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1116 годам. На думку В.Я.Данілевіча, Усяслаў Васількавіч да 1162 года княжыў у Віцебску. Пад гэтым годам Іпацьеўскі летапіс паведамляе, што палачане далі яму княжацкі сталец у Полацку замест Рагвалода Барысавіча, які мусіў пакінуць яго і пайсці ў Друцк. Але ў тым летапісе пад 1175 годам пра Усяслава Васількавіча зноў паведамляецца як пра князя віцебскага, бо менавіта ў гэтым годзе ўладзімірскі князь Яраполк Расціславіч, унук князя Юрыя Даўгарукага, узяў шлюб з дачкою віцебскага князя Усяслава Васількавіча. У 1178 і 1180 гг. ён зноў згадваецца як князь полацкі. У Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 1186 годам паведамляе, што ён у гэты час княжыў у Друцку. Усяслаў Васількавіч быў звязаны нейкім чынам са смаленскім князем Давыдам Расціславічам, бо некаторы час (з 1164 да 1167 гг.) ён саступіў Віцебск смаленскаму князю Давыду Расціславічу. Давыд — Глеб Расціславіч — Міхайлавіч — сын кіеўскага князя Расціслава Мсціславіча, унук кіеўскага князя Мсціслава Вялікага. Упершыню згадваецца ў Наўгародскім летапісе пад 1154 годам. У час свайго княжання ў Віцебску ў 1165 г. аддаў Раману Міхайлавічу гарады Васілеў і Красен. У 1167 Давыд Расціславіч, знаходзячыся ў Віцебску, вытрымлівае аблогу з боку дружыны Валадара Глебавіча, князя гарадзецкага. Разам з Давыдам Расціславічам у аблозе знаходзіцца і Усяслаў Васількавіч, які вымушаны быў пакінуць Полацк і шукаць ратунку ў Віцебску ад нечаканага нападу Валадара Глебавіча. Аблога скончылася для гарадзецкага князя няўдала. У 1167 г. Усяслаў Васількавіч знаходзіць часовы прытулак у Віцебску, ратуючыся ад нечаканага нападу на Полацк гарадзецкага князя Валадара Глебавіча. Усяслаў Васількавіч прымаў удзел у барацьбе за суздальскі сталец, у выніку чаго быў парушаны яго саюз са смаленскім князем, які трымаў бок праціўнікаў Яраполка Расціславіча, зяця віцебскага князя, што меў намер заняць суздальскі сталец.

На пачатку 1180-х гадоў назіраецца збліжэнне Віцебска з Чарнігавам і Ноўгарадам. У 1180 г. віцебскі сталец займае Брачыслаў Васількавіч, унук Святаслава Усяславіча, сын Васількі Святаславіча. Ён разам з наўгародцамі, палачанамі і чарнігаўцамі ўдзельнічае ў паходзе на Друцк, які трымаўся тады боку смаленскіх князёў. На баку віцебскіх і полацкіх князёў выступілі таксама лівы (жылі ў нізоўях Дзвіны) і літоўцы.

У 1186 г. ў Віцебску ўжо правіць зяць смаленскага князя Давыда Расціславіча, што выклікала незадаволенасць полацкіх і чарнігаўскіх князёў. І таму ў 1196 г. ў межах смаленскіх уладанняў адбылася жорсткая бойка, так што «патрясеся земля», паміж аб'яднанымі сіламі полацкіх і чарнігаўскіх князёў з аднаго боку і смаленскімі князямі з другога бо-

ку. Бойка скончылася на карысць полацкіх князёў, якія вярнулі сабе віцебскі сталец.

У 1209 г. зноў назіраецца збліжэнне Віцебска з уладзіміра-суздальскімі князямі. Васілька Брачыславіч аддаў сваю дачку за Усевалада Юр'евіча (мянушка «Вялікае гняздо»), дзеда Аляксандра Неўскага.

У 1229 г. ў Віцебску згадваецца князь Мсціслаў Давыдавіч — чацвёрты сын Давыда Расціславіча, які паходзіў са смаленскага дому. Ён нарадзіўся ў 1193 г., відаць, у 1220-я гады быў уладальнікам Полацка і Віцебска, бо ад імя гэтых гарадоў удзельнічаў у заключэнні гандлёвага пагаднення 1222 г. паміж Рыгаю і гэтымі гарадамі. У 1229 г. ад імя Смаленска ім быў заключаны гандлёвы дагавор з Рыгаю і Готскім берагам. У 1230 г. ён памёр, меў тытул «вялікі князь смаленскі». Затым Віцебск зноў некаторы час належаў князям з полацкага дома, бо ў 1239 г. полацкі князь Брачыслаў Ізяславіч аддаў сваю дачку Аляксандру (ці паводле гісторыка В.М.Тацішчава — Праскоўю) замуж за Аляксандра Ярасла-віча (Неўскага). Той у 1245 г. пасля перамогі над літоўскаю дружынаю каля Таржка наведаў Віцебск, дзе «поима сына своего», які, відаць, знаходзіўся тут у сваёй бабулі.

Не выключана, што ў бойцы 1242 г., якая адбылася на лёдзе Чудскага возера, бралі ўдзел віцябляне і палачане. Справа ў тым, што пасля гэтай бойкі паміж Ноўгарадам і Тэўтонскім ордэнам у мірным пагадненні, якое яны мусілі заключыць, згадваецца Латыгольская зямля з возерам Лубна, якая калісьці належала полацка-віцебскім князям і якую праз некаторы час віцебскі князь пад націскам немцаў зноў вымушаны быў саступіць.

У 1262 г. ў Віцебску згадваецца князь віцебскі і полацкі Канстанцін, княжыў у 1260-я гады. Паводле М.Карамзіна, сын князя Таўцівіла. Быў жанаты на дачцы князя Аляксандра Ярасла-віча (Неўскага) і віцебскай княжны Аляксандры (Прасковіі) Брачыслаўны — Еўдакіі. Упершыню згадваецца ў Наўгародскім летапісе пад 1262 г. з прычыны маючага адбыцца пахода наўгародцаў, палачан і літоўцаў на Юр'еў, які належаў тады Лівонскаму ордэну. «Бяшэ тогда и Константин князь витебский, зять Александров со своими мужи (дружынаю — рэд.)», — гаворыцца ў летапісе. Змяніў князя Таўцівіла, які ў свой час займаў полацкі сталец. Наступны ўспамін пра полацка-віцебскага князя Канстанціна зме-



Бярдыш 12 ст. Віцебск.

шчаны ў буле рымскага папы Інакенція IV, якая датуецца 23.5.1264 г. У ёй гаворыцца, што рускі князь Канстанцін «падараваў» нейкія землі ордэну ў сваім княстве. Хутчэй за ўсё гаворка ішла пра горад Рэжыцу (сучасны Рэзэкне ў Латвіі) і возера Лубна, што ў Латгаліі, якія пасля мірнага пагаднення паміж Ноўгарадам і ордэнам былі вернуты полацка-віцебскім князям, відаць, за іхнюю дапамогу князю Аляксандру Ярасла-вічу ў барацьбе з немцамі.

Палітычныя інтарэсы князя Канстанціна былі звязаны з інтарэсамі літоўскага князя Трайняты, праціўніка вялікага князя літоўскага Міндоўга. Пасля забойства апошняга князь Канстанцін быў пазбаўлены полацкага княжання. На яго месца заступіў князь Ізяслаў (1265), потым князь Гердзень, ці адразу Гердзень. Таму княжанне Канстанціна ў Полацку доўжылася ўсяго некалькі месяцаў у адрозненне ад княжання ў Віцебску, дзе ён мусіў прабыць як мінімум з 1262 па 1264 год.

У канцы 13 ст. ў Віцебску правіць князь Міхаіл Канстанцінавіч — сын князя Канстанціна. Ён згадваецца ў лісце рыжскіх купцоў з нагоды скаргі на літоўцаў, што ўчынілі ім прымусы. Дакумент напісаны паміж 1271—89 гг. Яраслаў Васілевіч — апошні князь з роду ўсходнеславянскіх князёў, што правілі ў Віцебску. Упершыню згадваецца ў 1318 г. з нагоды шлюбу ягонай дачкі Марыі і літоўскага князя Альгерда. «Князь віцебскі сыноў не меў, адну толькі дачку, і ён мусіў аддаць за яго (Альгерда) дачку сваю і прыняць яго ў зямлю Віцебскую», — паведамляе летапіс Быхаўца. У 1320 г. князь Яраслаў Васілевіч памёр, і Віцебскі сталец заняў яго зяць літоўскі князь Альгерд. І з гэтага часу Віцебск адыходзіць да ўладанняў вялікіх князёў літоўскіх. Аль-

герд — літоўскі князь, сын Гедзіміна, бацька 12 дзяцей, у тым ліку Ягайлы, будучага караля Польшчы, Свідрыгайлы, якому часова належаў затым Віцебск і інш. Відаць, пры ім ужо пачалі ўмацоўвацца каменнымі сценамі дзядзінец і вакольны горад Віцебска, пазней вядомыя як Верхні і Ніжні замкі. Заканчэнне гэтых работ летапіс прыпісвае княгіне Улляне, другой жонцы князя Альгерда пасля смерці князёўны Марыі. З 1345 г. віцебскі князь Альгерд стаў вялікім князем Вялікага княства Літоўскага. На Замкавай гары Віцебска меў свой палац, які, відаць, пад час раскопак ускрыў А.П.Сапуноў.

Л.У.Калядзінскі.

Рамяство і хатнія промыслы гараджан у 10—13 ст.

Характар культурнага слою з вялікай колькасцю рамесных вырабаў сведчыць пра развітую вытворчую дзейнасць жыхароў раннесярэдневяковага Віцебска. Як і ва ўсіх старажытнарускіх гарадах, яна з'яўлялася важнейшай галіной, ад якой залежаў агульны ўзровень развіцця прадукцыйных сіл.

Кавальскае рамяство. Адсутнасць слядоў гарадской металургічнай базы пры адладжанай кавальскай вытворчасці прадугледжвае, што жалеза атрымоўвалі з сельскай мясцовасці, дзе знаходзіліся залежы балотных руд. У 13—14 ст. патрэба ў сыравіне часткова забяспечвалася за кошт імпарту ў Полацкую зямлю металічнай сыравіны.

Становішча кавальскага рамяства ў Віцебску ў 10—13 ст. даследавалася з улікам вынікаў металаграфічнага аналізу даволі вялікай колькасці жалезных рэчаў.

У залежнасці ад функцыянальнага прызначэння прылад працы і інструментаў майстры тэхнічна абгрунтавана выкарыстоўвалі якасную сталь і крычнае жалеза, якое нярэдка ўтрымлівае шмат уключэнняў шлаку (у т.л. і буйных), мае неаднародную зярністасць і лакальную навугляроджанасць. Майстэрства кавалёў прасочваецца і пры вывучэнні зварных злучэнняў. У большасці зварныя швы якасныя, хоць вядома, што высокавугляродзістая сталь з цяжкасцю паддаецца зварцы з жалезам. Віцебскія кавалі прымянялі і больш складаныя спосабы злучэння стальной рабочай часткі з жалезнай асновай — тарцовую і касую наварку. Пры прыварванні да асновы ляза шырокай стальной паласы майстры праводзілі часам закалку толькі яе рабочай часткі, г.зн. практыкаваўся від мясцовай закалкі. Тэрмічная апрацоўка праводзілася кваліфікавана, з выкарыстаннем мяккіх закалачных вадкасцей ці асяроддзяў. Практыкавалася таксама закалка з адпусканнем.

У выніку рацыяналізацыі кузнечнай тэхналогіі замест высокаякасных шматслойных вырабаў, зробленых пры дапамозе працаёмкай тэхнікі зваркі, паступова ў 12 ст. стала ўкараняцца спрошчаная тэхналогія наваркі стальной рабочай часткі. Кавалі звярталіся і да складаных прыёмаў пры вырабе традыцыйных прылад працы і інструментаў. Характэрнымі ў гэтым выпадку з'яўляюцца 2 нажы, у якіх у сярэдняй частцы ляза — узорчатая паласа, звараная з тонкіх палосак жалеза і сталі, якія чаргуюцца паміж сабой і колькасць якіх у адным экзэмпляры дасягае 30. Мяркуем, што на паліраваных паверхнях нажа, апрацаваных кіслотаўтрымліваючымі вадкасцямі, узоры тыпу «зебра» выглядалі вельмі эфектна. Сякеры, знойдзеныя на Дольнім замку ў Віцебску, маюць дасканалую форму, добрую захаванасць і зроблены па рацыянальнай схеме наваркі стальных рабочых частак на жалезную аснову лёзаў.

Без спецыяльных даследаванняў хімічнага саставу жалеза і сталі немагчыма дакладна вызначыць, ці ўсе знойдзеныя на раннесярэдневяковых пасадах кавальскія вырабы з'яўляюцца прадукцыяй мясцовага рамяства. Хоць большасць прадметаў, мяркуючы па тыпалагічнай і тэхналагічнай падобнасці, магла быць выраблена ў Віцебску. Да прывазных можна аднесці вялікі (баявы?) нож і сякеру са своеасаблівай формай абуха, аналогіі якой ёсць у археалагічных матэрыялах з тэрыторыі Чэхаславакіі.

Два нажы з узорчатымі лёзамі лягчэй прызнаюць прывазнымі, але ўлічваючы знаходкі кавальскіх інструментаў і іншыя сведчанні развітога мясцовага жалезаапрацоўваючага рамяства, у т.л. значную колькасць шлакаў, нельга адмаўляць здольнасць мясцовых кавалёў рабіць вырабы па такой тэхналогіі.

Да прылад працы аднесена невялікая накавальня, якая магла выкарыстоўвацца не толькі ювелірамі, але і кавалямі для коўкі прадметаў малых памераў. Аб тым, што накавальня доўгі час выкарыстоўвалася для коў-

кі, сведчыць не толькі расплюшчаны выгляд яе рабочай паверхні, асабліва па краях, але і макраструктура металу з фармаваным зернем.

Кавальскія вырабы прадстаўлены разнастайнымі прыладамі працы, прадметамі бытавога прызначэння, зброяй і іншымі рэчамі, якія забяспечвалі гаспадарчае жыццё горада. Самую шматлікую катэгорыю складаюць універсальныя прылады працы, сярод якіх пераважаюць нажы. Да універсальных прылад належаць пружынныя і шарнірныя нажніцы і шылы. Інструменты асобных вытворчасцей прадстаўлены дрэваапрацоўчымі прыладамі: цёслы, сякеры, скоблі, цэльнаметалічныя долаты, свярдзёлы. З бронзаліцейным рамяством звязаны знаходкі пласкагубых ювелірных пінцэтаў і пласкагубых абцугоў. Асартымент сельскагаспадарчага інвентара абмежаваны сярпамі, сашніком, косамі-гарбушамі і жалезнымі акоўкамі лапат (11—13 ст.).

Бытавыя рэчы аб'ядноўваюць крэсівы (калачападобныя і прамавугольныя), святцы, замкі і дэталі дзвярных запораў. Сярод апошніх вылучана 5 тыпаў здымных замкоў і ключоў да іх і 2 тыпы нерухомых. Асобную групу складаюць ключы да замкоў індывідуальнай канструкцыі.

Зброя, рыштунак вершніка і рэчы конскай зброі складаюць невялікую, але разнастайную катэгорыю рэчавага матэрыялу: наканечнікі дзідаў рамбічнага сячэння, тронкавыя і утульчатыя наканечнікі стрэл (9 тыпаў), баявыя нажы-«засапожнікі». Рыштунак вершніка і верхавога каня складаюць шпоры з шыпам альбо рапейкай, кольцападобныя страмёны, наверша ад дзяржання кнута, цуглі, псалій, падковы, шыпы для падкоўкі коней у зімовы час, спражкі да зброі.

Вывучэнне асартыменту ўказвае ў цэлым на стабільнасць асноўных тыпаў і форм прадукцыі. Канструкцыйныя змены ў катэгорыях рэчаў звязаны з тэхналагічнымі навінкамі і з густам пакупнікоў. Павелічэнне ў 12—13 ст. асартыменту вырабаў гаворыць таксама пра серыйную вытворчасць, падпарадкаваную рынку.

Ювелірнае рамяство. Вялікая працаёмістасць і звязаная з ёй адносна нізкая прадукцыйнасць працы, складанасць вытворчасці і высокі кошт прадукцыі абумовілі пераважна вотчынны характар ювелірнага рамяства старажытнарускіх гарадоў. Аднак знаходкі кавалачкаў сыравіны, шлакаў, прылад вытворчасці, бракаваных вырабаў сведчаць пра існаванне бронзаліцейнай справы на пасадзе раннесярэдневяковага Віцебска.



Бранзалеты 12 ст. З раскопак на Верхнім замку.

У час раскопак выяўлены рэшткі 2 (на ўсходнім і заходнім пасадах) майстэрняў, гаспадары якіх займаліся ліцейнай справай. У жыллі 1-й палавіны 13 ст. выяўлена некалькі дзесяткаў кавалкаў шлаку, фрагменты дэфармаванай керамікі з нацёкамі каляровага металу, мабыць, рэшткі тыгляў, набор ювелірных упрыгожанняў з алавяніста-свінцовага сплаву. Адно з упрыгожанняў — фібула з мордамі драконаў — з-за змяшчэння створак ліцейнай формы з'яўлялася вытворчым бракам.

У жыллі ювеліра 2-й палавіны — канца 13 ст. ў зрубе і побач з ім знойдзены рэшткі керамічных тыгляў, у якіх, як вызначана хімічным аналізам, плавілася алавяністая бронза.

У розных месцах пасада за межамі пабудоў знойдзены фрагменты не менш чым 5 ліцейных формачак з мяккіх парод камянёў. Адна з іх (з пласта 6—8 ст.) прызначалася для адліўкі трохканечных месяцаў. Другая (створка двухбаковай формачкі) выкарыстоўвалася для адліўкі лапчастых прывесак. На формачцы з вапняка выразана выява будучай адліўкі, якая, верагодна, служыла загатоўкай нейкага ўпрыгожвання. Астатнія формачкі захаваліся фрагментарна.

З прылад працы, звязаных з ліццём, найбольш знойдзена тыгляў і льячак. Усе тыглі віцебскай калекцыі кругладонныя, па форме набліжаюцца да конуса, што звязана з абмежаваным доступам паветра да расплаўленага металу.

Льячкі мелі выцягнутую лыжкападобную форму, якая плаўна пераходзіла ў невялікую ручку. Іх аб'ём дасягае 18—21 см^3. Па матэ-

рыялах Ноўгарада льячкі падобнай формы былі распаўсюджаны ў 13—14 ст.

Пры буйным ліцці для плаўкі металу маглі карыстацца і звычайнымі пячнымі гаршкамі. У жыллі ювеліра (пачатак 13 ст.) знойдзены фрагменты дэфармаваных гаршкоў са слядамі моцнай тэрмічнай апрацоўкі.

Знаходкі інструментаў ювеліра абмежаваны пінцэтам, які знойдзены ў мацерыковай яме 10 ст., і невялікай кавадлай з пласта 13 ст. Апошняя магла выкарыстоўвацца ювелірамі і кавалямі для пракоўкі рэчаў малых памераў. Валоданне віцебскімі ювелірамі шматлікімі тэхналагічнымі аперацыямі дапускае выкарыстанне імі разнастайных прылад працы: малаточкаў, абцугоў, чэканаў, заціскаў, свёрдлаў, разцоў, зубіл, штампаў, паяльнікаў, валачыльных дошак і г.д.

Аналіз гатовай прадукцыі паказвае, што ў 10—11 ст. віцебскія майстры валодалі тэхнікай ліцця па васкавой мадэлі і ў каменных раздымных формах. У наступныя стагоддзі ў сувязі з тэндэнцыяй павелічэння аб'ёму вытворчасці ўпрыгожванняў на рынак ліццё ў каменных ліцейных формах становіцца пануючым, што тлумачыцца пошукам ювелірамі прыёмаў, якія патрабуюць найменшых затрат працы.

Гэтым, відаць, трэба тлумачыць і выцісканне ў 12 ст. тугаплаўкіх сплаваў на меднай аснове легкаплаўкімі — свінцова-алавяністымі. Перавага легкаплаўкіх сплаваў, тэмпература абпала якіх не перавышала 235—260°, заключалася ў тым, што рамеснік мог абыходзіцца звычайным агнішчам без выкарыстання горана са штучным выдзіманнем. У той жа час трэба адзначыць высокае майстэрства віцебскіх ювеліраў, якім была знаёма апрацоўка каштоўных металаў (золата, серабра).

У ювелірнай вытворчасці шырока карысталіся разнастайнымі ковачнымі работамі, валачэннем дроту, цісненнем, гравіраваннем, штампоўкай. Віцебскія рамеснікі дасягнулі высокага майстэрства ў спайванні тонкіх створак полых упрыгожванняў. Ім была знаёма тэхніка пазалоты вырабаў. Прадукцыя ювеліраў прадстаўлена ўпрыгожваннямі, якія ў большасці сваёй належаць да агульнаславянскіх тыпаў.

Скроневыя кольцы належаць да характэрных для полацкіх і смаленскіх крывічоў бранзалетападобных з завязанымі канцамі. Знойдзенае ў час раскопак кальцо са спіральна-загнутым канцом не можа служыць этнавызначальным для Віцебска. Сярод іншых відаў упрыгожванняў гараджанам былі да спадобы пярсцёнкі і бранзалеты. Апошнія падзяляюцца на дротавыя, вітыя, кручаныя, пласцінчатыя і лодкападобныя. Састаўной часткай многіх караляў з'яўляюцца ланцужкі: бронзавыя плеценыя з малым дыяметрам сячэння (10—11 ст.) і кароткія ланцужкі з вузкіх палосак волава (12 — 1 палавіна 13 ст.). Часткай касцюма з'яўляліся падковападобныя зашпількі-фібулы са спіральна загнутымі канцамі, цвікападобныя зашпількі з рухомым кальцом і крыжападобным навершам, гузікі, бляшкі — зашпількі «пус ейппи».

Акрамя упрыгожванняў з каляровых металаў выраблялі бытавыя рэчы: медныя патэльні, катлы і ручкі да іх, бронзавыя зашпількі для кніг, вугалкі-акантоўкі да скураных вырабаў.

Ганчарства. Мясцовае паходжанне ганчарных вырабаў не выклікае сумнення, паколькі існавала шырокая сыравінная база і нескладаная тэхналогія. Наяўнасць у старажытнейшым слоі посуду, выраблена ляпным спосабам, сведчыць пра існаванне ганчарнага рамяства як хатняга промысла.

У 1-й палавіне 10 ст. ў Віцебску, як і ў іншых гарадах Полацкай зямлі, атрымаў распаўсюджанне ручны ганчарны круг. Адбітак восі круга на адным з днішчаў сведчыць аб прымяненні прасцейшага ганчарнага круга з нерухомай воссю і падшыпнікам, які плаўна перамяшчаўся.

Аналіз ганчарнай керамічнай прадукцыі паказвае, як паступова, пачынаючы з 10 ст., змяняўся характар гэтага віду рамяства. На раннім этапе аб'ём выпускаемай прадукцыі быў невялікі. Асноўная форма посуду — таўстасценныя гаршкі з грубага цеста, якое ўтрымлівала розныя дамешкі. Стараннасць фармоўкі пасудзін, мадэліроўка складаных манжэтападобных венчыкаў, багатая арнаментацыя сведчаць пра значнае майстэрства віцебскіх ганчароў.

У 12 ст. найбольшае распаўсюджанне атрымліваюць гаршкі з даволі высокім венчыкам і мяккапрафіліраванай шыйкай. Плячук становіцца больш акруглым, максімальны дыяметр прыпадае на верхнюю частку тулава. Пасудзіна набывае ўсечана-канічную форму.

Гаршкі з простым венчыкам паступова знікаюць. Віцебская кераміка гэтага часу вельмі падобна на посуд іншых гарадоў Полацкай зямлі. Адначасова ў Віцебску з'яўляецца спецыфічны тып гаршкоў, якія мелі патоўшчаны венчык.

У 13 ст. амаль знікае посуд з высокай прафіліраванай шыйкай. Гаршкі набываюць нізкую рэзкапрафіліраваную шыйку, форма застаецца ўсечана-канічнай. З сярэдзіны стагоддзя раней вядомыя формы губляюць сваё вядучае палажэнне.

З 12 ст. асартымент посуду пашыраецца. Разам з гаршкамі ва ўжытку з'яўляюцца маленькія гаршчочкі, міскі, макацёры, карчагі. Удасканальваецца форма посуду, тэхналогія керамічнай вытворчасці. Відаць імкненне ганчароў спрасціць тэхналогію вырабу масавай прадукцыі, не выключана, што і зрабіць больш таннай. З'яўляюцца гаршкі, якія не патрабуюць ад майстра асаблівай дбайнасці пры вырабе, арнаментыка становіцца больш простай і амаль поўнасцю знікае. У цэлым кераміка 12—13 ст. губляе сваю трываласць, робіцца больш крохкай. Пошук ганчарамі найбольш рацыянальных тэхналагічных прыёмаў, які суправаджаецца, з аднаго боку, стратай якасці пры агульным павышэнні ўзроўню вытворчасці, з другога — кераміка становіцца больш таннай, — сведчанне развіцця ганчарнага рамяства пад уздзеяннем шырокага рынку, калі попыт нараджае масавую прапанову.

Будаўнічае майстэрства. Важнейшым будаўнічым матэрыялам пры ўзвядзенні пабудоў, упарадкаванні вуліц і сядзіб, пабудове абарончых умацаванняў з'яўлялася дрэва. Цяслярскае рамяство было вядома гараджанам з моманту ўзнікнення горада. Адбіткам пастаяннага ўдасканальвання майстэрства цесляроў з'яўляецца эвалюцыя домабудаўніцтва, якую ўдалося прасачыць з 11 да 18 ст.

Акрамя буйнамаштабных работ, якія, відаць, разам з манументальным будаўніцтвам складалі дзяржаўны сектар рамяства, віцебскія майстры займаліся апрацоўкай драўніны для гаспадарчых і бытавых патрэб.

Археалагічны матэрыял сведчыць пра існаванне ў 12—13 ст. такіх спецыялістаў, як бондары, разьбяры, токары. Набор інструментаў дрэваапрацоўшчыкаў уключае сякеры, цяслы, долаты, нажы, свярдзёлы, стругі. Знаходкі фрагментаў точанага посуду сведчаць пра выкарыстанне майстрамі такарнага станка.

Прадукцыя дрэваапрацоўчай вытворчасці разнастайная па асартыменту. Найбольш шматлікую групу складаюць прылады працы і драўляныя дэталі да іх, прылады для перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Да універсальнага інвентару належаць лапаты: землярыйныя, для сыпучых цел і выпечкі хлеба. Частай знаходкай з'яўляюцца граблі, дубовыя порхліцы ад ручных жорнаў, пясты ад нажных і ручных ступ.

Да даволі распаўсюджаных ударных прылад працы належаць чакмары-даўбежкі. Прымянялі ў хатнім ужытку невялікія качалкі і пранікі для мыцця бялізны і раскачвання цеста. Унікальнай знаходкай з'яўляецца частка сахі. Акрамя Віцебска ў час раскопак саха была знойдзена толькі ў Старой Ладазе.

Найбольш шматлікую катэгорыю драўляных прылад працы складаюць інструменты для прадзення і ткацтва (верацёны, матавілы, юркі, чаўнакі, дэталі вертыкальнага і гарызантальнага ткацкага стану).

Хатняе начынне прадстаўлена бандарным, точаным, разным і выдзеўбаным посудам, а таксама прыладамі працы, што выкарыстоўваюцца пры вядзенні хатняй гаспадаркі. Прадметы асабістага карыстання ці асабістай гігіены — грабяні — вырабляліся выключна з прывезенага з Каўказа самшыта. Некаторыя з іх былі ўпрыгожаны цыркульным арнаментам ці зааморфным сюжэтам. У час раскопак зрэдку сустракаюцца і драўляныя цацкі (выразаныя птушкі, рытуальныя дзіцячыя булавы), шашкі. У 1993 г. ў Віцебску быў знойдзены фрагмент лука, вырабленага з дуба. Ён адносіцца да разраду простых ці непрафесійных. Гэтая знаходка другая ў калекцыі прадметаў узбраення з сярэдневяковых помнікаў Беларусі (першыя з Полацка).

Верагодна, вырабам складаных прадметаў, у прыватнасці, такарнай апрацоўкай драўніны, займаўся вузкі круг высокакваліфікаваных рамеснікаў.

Апрацоўка косці займала значнае месца ў жыцці сярэдневяковага Віцебска. На раннім этапе развіцця горада (10—11 ст.) касцярэзнае рамяство хоць і выдзялялася ў самастойную галіну вытворчасці, аднак строгай яго канцэнтрацыі не заўважана. Найбольш прымітыўныя прадметы гараджане рабілі самі, сведчаннем служаць выяўленыя ў жылых пабудовах адходы. Павелічэнне маштабаў касцярэзнай вытворчасці на больш высокім яго тэхнічным узроўні (прымяненне такарнага станка) садзейнічала пашырэнню асартыменту вырабаў і выкарыстанню разнастайнай сыравіны. Разам з суцэльным па структуры рогам лася і аленя ў вытворчасці выкарыстоўваюць полы рог. Ён таксама лёгка паддаваўся апрацоўцы, але быў больш пругкі. Для выра-

бу дзяржанняў, плоскіх загатовак ужывалі і косці жывёл.

Асноўнымі інструментамі майстра-кастарэза былі піла з зубамі, мініяцюрныя нажы з даўжынёю ляза 4,5—7,4 см, сякера, разец, свярдзёлак. Для атрымання круглых зрэзаў выкарыстоўвалі леркі такарныя. Апошнія ўказваюць на прымяненне разьбяром прымітыўнага такарнага станка. Такарная апрацоўка косці, падобныя інструменты сведчаць пра цесную ўзаемасувязь у старажытны час апрацоўкі косці і дрэва. Падабенства тэхнікі вытворчасці касцяных і дробных драўляных рэчаў дазваляе меркаваць пра іх выраб у адной майстэрні. Гэтая традыцыя існавала амаль да 18 ст. Прадукцыя касцярэзаў па функцыянальнаму прызначэнню падзялялася на прылады працы, звязаныя з хатнімі промысламі і вырабы бытавога і культурнага прызначэння.

Асобную групу складаюць касцяныя вырабы, звязаныя з правядзеннем вольнага часу: канькі, фігуры для гульні ў косці (біты, кубік), шахматы, шашкі. Апошнія атрымалі распаўсюджанне ў Віцебску з канца 10 ст. Да касцяных упрыгожванняў аднесена падвеска ў выглядзе рыбы, якая была дэкарыравана вочкавым арнаментам (1-я палавіна 12 ст.). З культавых рэчаў асаблівую цікавасць уяўляе абразок, на якім выява евангеліста Матфея (2-я палавіна 18 ст.). Абразок быў выразаны па заказу віцябляніна, патранальным святым якога з'яўляўся Матфей.

Каменячосная справа атрымала развіццё ў Віцебску ў сувязі з будаўніцтвам храмаў: царква св. Міхаіла, Дабравешчанская і, відаць, царква Параскевы Пятніцы (разбурана ў 16 ст.). Пра час будаўніцтва апошняй можна меркаваць па рэштках будаўнічага смецця (бітая плінфа, плітка падлогі) у напластаваннях 1-й палавіны — сярэдзіны 12 ст. ва ўсходняй частцы пасада.

Архітэктурныя асаблівасці старажытнейшых храмаў Віцебска вывучаны на прыкладзе Благавешчанскай царквы і царквы архангела Міхаіла. Апошняя была патранальным храмам віцебскага княжацкага дому і, на думку Л.У.Калядзінскага, магла быць збудавана на мяжы 11—12 ст. Тэхніка кладкі змешаная: чосаныя вапняковыя блокі чарадуюцца з утопленым радам плінфы. Па знешняму выгляду храм меў рысы, уласцівыя чарнігаўскай архітэктурнай школе, якая аказала значны ўплыў на фарміраванне архітэктурнай школы Полацкай зямлі. Своеасаблівасць будаўнічых прыёмаў, якія былі выкарыстаны віцебскімі майстрамі пры ўзвядзенні Благавешчанскай царквы (1140-я гады) прывялі да думкі пра існаванне ў горадзе мясцовай архітэктурнай арцелі, якая аказала, на думку П.А.Рапапорта, уплыў нават на дойлідства Полацка. Арыгінальная будаўнічая тэхніка, якая была прыменена ўпершыню, дазволіла выказаць меркаванне, што царкву будавалі прыезджыя майстры з улікам існаваўшых у той час мясцовых архітэктурных традыцый. Гэта маглі быць будаўнікі, прывезеныя полацкімі князямі з Візантыі. Аднак сцвярджаць пра ўстойлівыя традыцыі манументальнага будаўніцтва не даводзіцца, паколькі існаванне віцебскай будаўнічай арцелі было недаўгавечным.

Манументальнае дойлідства выклікала да жыцця рамёствы, звязаныя з забеспячэннем яго будаўнічымі матэрыяламі. Даламітызаваныя вапнякі і пясчанік у наваколлі Віцебска (в. Руба) з'яўляліся сыравіннай базай для развіцця каменячоснай і каменярэзнай справы.

Рукамі віцебскіх майстроў выраблялися жорны, тачыльныя брускі. Для вытворчасці апошніх шырока выкарыстоўвалі гліністы сланец. З шэрага сланцу выраблялися і праселкі. Не выключана, што ў 12 ст. ў Віцебску была наладжана іх мясцовая вытворчасць, сведчаннем можа служыць знаходка бракаванай загатоўкі.

Хоць майстэрні па вырабу каменных пацерак не знойдзена, але ўсё ж можна рабіць здагадку пра іх вытворчасць у горадзе ў канцы 11 ст. Доказам гэтага служаць: паўфабрыкат сердалікавага ўпрыгожання, агранены ў форме прызмы; сердалікавая прызматычная пацерка з недапрасвідраваным каналам і аметыставая пацерка, перарobленая пазней у прывеску. Калі параўноўваць вытворчасць пацерак з вытворчасцю праселак, то неабходна прызнаць, што апрацоўка паўкаштоўных парод каменю (сердаліка, крышталю, аметысту) патрабавала складанага і дасканалага інструмента.

Попыт на ўпрыгожанні з каляровых металаў прывёў да неабходнасці вырабу каменных ліцейных форм, якія выразаліся на месцы. Разьба каменных форм патрабавала высокага прафесіяналізму майстра і дасканалых інструментаў.

Такім чынам, спіс рамеснікаў, звязаных з апрацоўкай каменю, да 13—14 ст. уключаў не менш 6 спецыяльнасцей: каменшчыкі, разьбяры па каменю, жарнасекі, прасельнікі, гра-

нільшчыкі пацерак, разьбяры ліцейных форм.

З канца 11 ст. гараджанам была вядома апрацоўка бурштыну. Знаходкі кавалкаў сыравіны і дробных кропелек застыўшай смалы з'яўляюцца доказам вытворчасці на ўсходнім пасадзе бурштынавых упрыгожанняў.

Шкларобства. Бясспрэчных доказаў існавання ў Віцебску вытворчасці шкла няма. Акрамя гатовай прадукцыі, якая сутракаецца ў напластаваннях 10—14 ст., выяўлена больш 10 бясформенных кавалачкаў шкла, шыхта для варкі шкла і кроплі, якія ўскосна могуць служыць доказам мясцовай вытворчасці шкляных вырабаў.

Устаноўлена, што на раннім этапе развіцця гарадскога рамяства (10—11 ст.) шкляныя ўпрыгожанні былі выключна прывазныя. Састаў шкла ўказвае на іх паходжанне з Блізкага Усходу (бісер сечаны, пранізкі шматчастковыя, лімонападобныя пацеркі і пацеркі з металічнай пракладкай). Не выключана, аднак, што частка пацерак магла быць прывезена ў Віцебск з рускіх майстэрняў, дзе існавала вытворчасць упрыгожанняў на прывазной сыравіне (напрыклад, Старая Ладага). З 12 ст. ў культурным слоі пераважаюць шкляныя ўпрыгожанні, выраблены па рускім рэцэпце з каліева-свінцова-крэмнязёмнага шкла. Сярод пацеркавага матэрыялу пераважаюць зонныя, бітрапецападобныя, бочкападобныя ўпрыгожанні. Аднак у параўнанні з папярэднім перыядам колькасць знаходак пацерак прыкметна падае і да сярэдзіны 14 ст. яны поўнасцю знікаюць.

Шырокую папулярнасць у 12—13 ст. сярод жыхароў пасада набылі шкляныя бранзалеты. Частка іх паступала ў горад з майстэрняў Полацка (жоўтыя, карычневыя), Смаленска (зялёныя), Кіева (фіялетавыя, бірузовыя, сінія) і інш. Каля 1% знойдзеных бранзалетаў — імпарт з краін Блізкага Усходу і Візантыі. Т.С.Скрыпчанка, якая вывучала віцебскія бранзалеты, адзначае, што на мяжы 12—13 ст. з'яўляюцца вырабы, для якіх характэрна чыстае высокаякаснае шкло ізумрудна-зялёнага і травяністага колераў. Аналогіі ім у іншых гарадах не выяўлены. Гэта дазволіла выказаць меркаванне аб складванні ў наваколлі Віцебска і яго акругі сваіх традыцый у шкларобстве. З'яўленне новага рэцэпта шкловарэння, на думку Т.С.Скрыпчанка, сведчыць не толькі пра наяўнасць сваёй школы, але і пра існаванне сістэмы пошуку новых рэцэптаў і іх укараненне. Узровень развіцця школы дастаткова высокі, у вырабах прыкметны мастацка-эстэтычныя пошукі.

Шкляныя вырабы віцебскага пасада прадстаўлены выключна жаночымі ўпрыгожаннямі, бранзалетамі, скроневымі кольцамі і ўстаўкамі для металічных пярсцёнкаў.

На гарадскім дзядзінцы ў слаях 11 — пачатку 12 ст. знойдзены шкельцы для шыб заходнееўрапейскай вытворчасці, фрагменты шкляного посуду з роспісам белага, чырвонага і залатога колеру. Такі посуд у 12 — пачатку 13 ст. выраблялі на Блізкім Усходзе, у Сірыі і Егіпце. Дарагі посуд, вельмі рэдкае ў той час на тэрыторыі Русі аконнае шкло, безумоўна, паходзілі з княжацкага дварца і жытлаў віцебскай знаці.

Адсутнасць на тэрыторыі пасадаў знаходак дарагога шкляного посуду, мабыць, трэба разглядаць як адзін з паказчыкаў сацыяльнага складу насельніцтва.

У 12 ст. атрымала развіццё **гарбарна-шавецкае рамяство**. Шматлікія знаходкі вялікай колькасці адходаў сыравіны, асабліва каля пабудоў сведчаць пра рамесны характар вытворчасці. Асноўнай сыравіннай базай былі скуры хатніх жывёл. Не выклікае сумнення мясцовы характар іх першапачатковай апрацоўкі, сведчаннем чаго служаць знаходкі абзоленай шэрсці, глянцавальных камянёў з пясчаніку і так званых «канькоў» — прылад для разгладжвання і глянцавання скур. У якасці скрабка для знящця мяздры, відаць, ужываліся рэбры буйной рагатай жывёлы. Інструментамі шаўца былі нажы, праколкі, шылы, бронзавыя і жалезныя іголкі. Сырамятная і цвёрдая дублёная скура ішлі на выраб поршняў і грубых мужчынскіх чаравікаў, мяккая тонкая скура выкарыстоўвалася для пашыву ажурнага жаночага і дзіцячага абутку і ботаў.

Прадукцыя гарбарна-абутковага рамяства прадстаўлена дэталямі скуранога абутку. Прастата вырабу, таннасць зрабілі поршні найбольш распаўсюджаным відам штодзённага абутку сярод гараджан. Мяккія чаравікі, аздобленыя ўзорамі, якія наносіліся разьбой ці вышыўкай, былі пераважна жаночым або дзіцячым абуткам. Аднак сустракаюцца і мужчынскія чаравікі падобнага тыпу.

Па тэхналогіі вырабу і мадэляванню наска сярод ботаў адрозніваюць 3 тыпы: вастраносы з цэльнакроеным неадразным перадам, з адцягнутым уперад і з прыўзнятым уверх наском.

Скураны абутак складае асноўную частку прадукцыі гарадскіх шаўцоў, але не вычэрпвае яе. Віцебскія гарбары выраблялі ножны, футляры, папругі, кашалькі, рукавіцы, сумкі і г.д. Да найбольш рэдкіх рэчаў трэба аднесці знаходку калчана, меха дуды-«валынкі», скураныя мячы для гульняў.

Ткацтва. Галоўнай крыніцай атрымання тканіны ў сярэднія вякі была хатняя вытворчасць, развітая ва ўсіх усходнеславянскіх гарадах. Сыравінай для прадзення і ткацтва служылі лён, каноплі, воўна. Рэшткі тканін у час раскопак не знойдзены, аднак значная колькасць прылад працы даволі поўна ілюструе стан і тэхніку прадзення і ткацтва ў сярэдневяковым Віцебску.

Найбольш старажытным і простым спосабам атрымання нітак было ручное прадзенне з дапамогай верацяна. Знаходкі ва ўсіх напластаваннях гліняных, касцяных і сланцавых праселак, фрагменты верацён, матавіла сведчаць пра шырокае распаўсюджванне ручнога прадзення амаль да позняга сярэдневякоўя. З прадметаў, якія характарызуюць гэтую галіну вытворчасці, тут сустракаюцца дэталі вертыкальнага і гарызантальнага ткацкага станка. На думку даследчыкаў, вертыкальны станок быў першапачатковай канструкцыяй. Больш прадукцыйны гарызантальны станок з'явіўся ў выніку ўдасканальвання апошняга і развіцця тэхнікі ткацкай вытворчасці. 10 ст. датуюцца найбольш раннія знаходкі дэталей вертыкальнага ткацкага станка — каменныя дыскі, дыяметрам 12 см, якія выконвалі функцыю грузіла. Аналагічныя дыскі-грузілы па матэрыялах Старой Ладагі і Белавозера датуюцца 9—10 ст. Вілкападобны чаўнок таксама прымяняўся ў вертыкальных ткацкіх станках.

Для гарызантальных станкоў выкарыстоўваліся чаўнакі некалькі іншай формы — полыя. З іншых дэталей гарызантальнага ткацкага станка трэба назваць юркі, нічэнкі, педалі. Гарызантальны ткацкі станок вядомы з 2-й палавіны 11 ст. (Мінск, Бярэсце, Полацк, Гродна і г.д.). У Віцебску гарызантальны ткацкі станок атрымаў распаўсюджанне ў пачатку 13 ст.

Агляд асноўных відаў рамёстваў паказвае, што ў 10—11 ст. гарадское рамяство мела вотчынны характар і канцэнтравалася, як прынята лічыць, пераважна на дзядзінцах. Рамесны выгляд пасада яшчэ не прасочваўся, хоць сляды рамеснай дзейнасці яго жыхароў адзначаны з 10 ст.

З 12 ст. адбываецца рэзкі якасны скачок у эканамічным развіцці горада. На разнастайную рамесную дзейнасць жыхароў указвае культурны слой з вялікай колькасцю рамесных вырабаў 12—13 ст. Развіваецца свабоднае пасадскае рамяство, якое залежыць ад кан'юнктуры рынку. Гэты перыяд характарызуецца пашырэннем асартыменту прадукцыі, рацыяналізацыяй вытворчасці; у металаапрацоўцы, ювелірным і шавецкім рамёствах ствараюцца стандарты вырабаў. Адбываецца шырокая спецыялізацыя ўнутры асобных галін вытворчасці. Сведчанне пісьмовых крыніц пра існаванне на гандлёва-рамесніцкім пасадзе «издревне» Кузьмадзям'янскай царквы, аднаіменнага завулка і Прабойнай вуліцы можна разглядаць як ускосны доказ пэўнай карпаратыўнасці рамяства сярэдневяковага Віцебска.

Т.С.Бубенька.

Гандаль у 9—13 ст.

Дзякуючы выгаднаму геаграфічнаму становішчу Віцебск даволі рана быў уцягнуты ў гандлёвыя сувязі з суседнімі тэрыторыямі. Знаходкі прадметаў немясцовага паходжання дазваляюць прасачыць асноўныя напрамкі гандлёвых шляхоў віцяблян у раннім сярэднявеччы. Храналагічна ў развіцці гандлю ў Віцебску можна выдзеліць два перыяды: 9—11 ст. і 12—13 ст.

На раннім этапе развіцця гандлю найбольш шматлікую катэгорыю імпарту складалі шкляныя пацеркі, руская вытворчасць якіх з'явілася не раней сярэдзіны 11 ст. Асноўныя раёны паступлення шкляных упрыгожванняў у Віцебск у 9—11 ст.: краіны Міжземнамор'я і Блізкага Усходу, верагодней за ўсё Візантыя, паўднёвыя раёны Усходняй Еўропы. Не выключана, аднак, што ў 8—9 ст., і асабліва ў 10 — пачатку 11 ст., пэўны працэнт пацерак мог паступаць з Ладагі і Прыладажжа, якія з'яўляліся асноўнымі раёнамі распаўсюджання бісеру на поўначы. У 11 ст. майстэрні па вытворчасці пазалочаных пацерак з'явіліся на Смаленшчыне і ў Кіеве, адкуль у Віцебск у 2-й палавіне стагоддзя мог паступаць пэўны працэнт гэтых вырабаў.

Другую катэгорыю паўднёвага імпарту складаюць каменныя пацеркі з сердаліка і горнага крышталю, аметысту, а таксама сыравіна для іх вытворчасці. Усё гэта паступала ў

горад з Сярэдняй Азіі (Басра, Багаштан, Кашмір, Харасан). Сярод імпарту 10—11 ст. з паўднёвых абласцей выдзяляецца невялікая група праселак з Валыні (г. Оўруч). Тады ж у невялікай колькасці ў Віцебск пачынаюць імпартаваць упрыгожанні з прыбалтыйскага бурштыну. Сярод прывазных рэчаў сустракаюцца і вырабы з каляровага металу, якія ўказваюць на сувязь з паўночнымі рэгіёнамі (Наўгародская зямля, Прыладажжа, Карэлія, Фінляндыя, Скандынавія): лодкападобныя бранзалеты, фібулы. Адзінкавыя знаходкі засцёжак — фібул дазваляюць разглядаць іх як прадмет імпарту з раёнаў, дзе яны з'яўляліся тыповай прыналежнасцю касцюму. У Віцебск на раннім этапе развіцця гандлю падковападобныя спіралеканечныя фібулы маглі трапіць з усходняга ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Сувязі з паўночным захадам Наўгародскай зямлі, Прыладажжам, басейнам Верхняй Волгі, дзе ў 9—11 ст. былі шырока распаўсюджаны гэтыя ўпрыгожванні, былі менш устойлівымі.

Пытанне пра месца вытворчасці бронзавых плеценых ланцужкоў невялікага памеру неадназначнае, даследчыкі лічаць, што радзіму іх трэба шукаць на Усходзе. Ібрагім-Ібн-Якуб лічыць ланцужкі прадметам імпарту з Візантыі. Э.С.Мугурэвіч мяркуе, што ў Латвію плеценыя ланцужкі пападалі па ўсходнім і паўднёвым шляхах. Відаць, гэтымі ж шляхамі яны дастаўляліся ў Віцебск.

У 11 ст. ў Віцебску былі распаўсюджаны плоскія зааморфныя падвескі ў выглядзе коніка. Яны настолькі стандартныя ў гэтым рэгіёне, что мяркуюць пра існаванне асноўнага цэнтру іх вырабу ў Смаленску ці паблізу яго. У той жа час у нізоўях Заходняй Дзвіны існаваў яшчэ адзін цэнтр вытворчасці такіх амулетаў, раён збыту прадукцыі апошняга дасягаў Полацкай і Наўгародскай зямель.

Аналіз прывазных вырабаў дазваляе вызначыць кола асноўных партнёраў Віцебска на раннім этапе развіцця гандлю. Гэта былі, як правіла, тэрыторыі, якія карысталіся Волжскім гандлёвым шляхам і заходняй веткай шляху з «грэкаў» у Варажскае мора. Дняпроўскі шлях хоць і функцыянаваў, аднак гандлёвыя сувязі з Візантыяй і паўднёвымі землямі на матэрыялах Віцебска прадстаўлены вельмі мала. Урэшце даследчыкі лічаць, што ў 9—11 ст. усходні гандлёвы шлях быў больш развіты, чым паўднёвы. Да пачатку 11 ст. для Прыбалтыкі ён таксама меў меншае значэнне.

Ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі ўнутраны гандаль меў у эканамічным жыцці Віцебска большае значэнне, чым знешні. Гарадское насельніцтва не магло забяспечыць сябе сельскагаспадарчай прадукцыяй. Таму частка неабходных запасаў ежы пастаўлялася ў горад з сельскай мясцовасці. Адтуль жа ў абмен на гатовую прадукцыю пастаўлялася і сыравіна для рамеснікаў. Паміж апошнімі і пастаўшчыкамі сельскагаспадарчай прадукцыі існаваў тавараабмен, які мог ажыццяўляцца самімі вытворцамі або пры пасрэдніцтве віцебскіх купцоў. Існаваў тавараабмен і паміж рамеснікамі розных спецыяльнасцей, асабліва ў «безманетны перыяд». Адносіны рэгуляваліся гарадскім рынкам, характэрнай рысай якога з 12 ст. з'яўляўся храм, у распараджэнні якога знаходзіліся эталоны гандлёвых мер і які меў права браць пошліны з тых, хто карыстаецца гэтымі мерамі. Будаўніцтва пад сценамі горада ў 12 ст. патранальнай царквы Параскевы Пятніцы і на Дзвінскім узвышшы царквы Дабравешчання ўказвае, з аднаго боку, на фарміраванне самастойных гандлёвых плошчаў на пасадах, з другой — на пэўную аб'яднанасць прадстаўнікоў купецтва.

Асаблівы росквіт гандлю назіраецца на мяжы 12—13 ст., калі ў сувязі з распадам старажытнарускай дзяржавы на шэраг самастойных княстваў узнікае цікавасць земляў да знешняга гандлю. Да гэтага часу немцы завязалі прамыя гандлёвыя сувязі з усходнеславянскімі гарадамі. У 1201 г. яны заснавалі Рыгу, якая стала цэнтрам гандлю рускіх гарадоў з Захадам.

На працягу 13 ст. заключаецца шэрах гандлёвых пагадненняў з Рыгаю (1211, 1229, 1264—65), у якіх Віцебск выступае як раўнапраўны ўдзельнік разам з Полацкам і Смаленскам. З гэтай нагоды можна гаварыць аб будаўніцтве ў Віцебску гандлёвага двара нямецкіх купцоў.

З гандлёвых грамат відаць, што асноўным прадметам экспарту на захад з'яўляліся воск і пушніна. Панаванне царкоўнай ідэалогіі выклікала вялікі попыт на чысты воск. Часам прадметам вывазу за мяжу служылі коні, халопы. А.П.Сапуноў сярод прадметаў экспарту ў Рыгу ў 12—13 ст. называе дзёгаць, скуры, сала, попел.

Відаць, у неўрадлівыя гады віцебская акруга была пастаўшчыком зерня ў суседнія землі (Ноўгарад, Смаленск). Падцвярджэннем гэтага можа служыць берасцяная грамата

канца 13 — пачатку 14 ст., мова якой мае сляды цокаючага паўночна-заходняга вымаўлення. У ёй гаворка ідзе аб продажы адзення і куплі ячменю.

З раёнаў паўночнага ўсходу, верагодна, з Ноўгарада, трапіла ў горад даволі рэдкая для заходняга рэгіёну шумячая падвеска ў выглядзе аднагаловага коніка. Такіх падвесак на Беларусі выяўлена яшчэ 2 (Барысаў, Маскавічы). Шкляныя бранзалеты былі запазычаны ў паўднёвых суседзяў Старажытнай Русі, з якімі ў 12—13 ст. існавалі даволі цесныя сувязі. Галоўным пастаўшчыком іх у Віцебск быў Кіеў (сінія, фіялетавыя і філігранныя вырабы). У цэлым для Віцебска характэрны суадносіны бранзалетаў кіеўскай і мясцовай вытворчасці 1:2. Транзітам праз Кіеў у горад на Дзвіне з Паўночнага Прычарнамор'я паступалі дробнакручаныя бранзалеты пячоначна-чырвонага колеру і сінія трохвугольныя ў сячэнні вырабы.

У сярэдзіне 11 ст. ў Смаленску, Кіеве, Ноўгарадзе, Старой Ладазе, Рызе і інш. узнікаюць майстэрні па вырабу шкляных пацерак, якія частку прадукцыі вывозілі. Безумоўна, нейкі працэнт упрыгожанняў асядаў ў Віцебску, які знаходзіўся на перакрыжаванні гандлёвых шляхоў. Некаторыя віды пацерак (рыбападобныя, мазаічныя, крапчатыя) трапілі сюды з Сярэдняй Азіі і паўднёварускіх гарадоў.

З Валыні ў Віцебск прывозілі шыферныя праселкі, колькасць якіх асабліва вялікая ў 2-й палавіне 12 — 1-й палавіне 13 ст. Распаўсюджанне хрысціянства вызвала прыток у горад прадметаў культу — невялікіх крыжыкаў з ружовага шыферу, вядомых у літаратуры пад назвай «карсунчыкаў», якія прывозіліся, верагодней усяго, з Кіева.

Прыбалтыка забяспечвала бурштынавай сыравінай і гатовымі вырабамі. Прыбалтыйская сыравіна жоўтага колеру, непразрыстая, паступала ў горад з Балтыйска-Прыдняпроўскай бурштынаноснай правінцыі (Пальмікенскае радовішча). Віцебск разам з Полацкам і Смаленскам былі асноўнымі цэнтрамі, з якіх бурштын паступаў у іншыя старажытнарускія гарады. Магчыма, здабыча бурштыну вялася і ў Прыдняпроўі, адсюль ён пранікаў у паўночныя раёны Русі (асабліва ў 13 ст.), калі прыбалтыйскае радовішча было захоплена тэўтонскім ордэнам. Для прыдняпроўскага бурштыну характэрны чырванаваты колер. Сярод прывазных вырабаў 12—13 ст. сустракаецца кераміка: белагліняная кераміка з зялёнай палівай з Кіева; тоўстасценныя чырвонагліняныя амфары-карчагі з віном, аліўкавым маслам з Прычарнамор'я і г.д. З Каўказа і Крыма ці Балкан прывозілі таксама самшытавыя грабяні і грэцкія арэхі. Самшыт транспартаваўся ў горад выключна Волжскім шляхам.

З арабскага Усходу, Міжземнага і Чорнага мораў у Віцебск маглі паступаць ракавіны кауры, марскія грабеньчыкі, вустрыцы. Ракавіны кауры маглі выкарыстоўвацца ў якасці плацёжных сродкаў ці як упрыгожанне: прызначэнне ракавін марскіх грабеньчыкаў не зусім высветлена. У Ваўкавыску, напрыклад, з іх выраблялiся падвескі.

З Цэнтральнай і Паўночнай Еўропы прывозілі сыравіну для ювелірнай вытворчасці (медзь, бронзу). Свінец, верагодна, паступаў з кракаўскіх і сілезскіх радовішчаў Польшчы, дзе размяшчаліся горнарудныя цэнтры. З Чэхіі ў Віцебск маглі паступаць некаторыя віды гатовай прадукцыі з жалеза. Пра існаванне ў 10—13 ст. паўночнага напрамку чэшска-рускіх гандлёвых сувязей сведчаць знаходкі манет. Мяркуюць, што сувязі ажыццяўляліся праз Вялікую Польшчу, далей па Бугу (Драгічын), Нёмане, праз Мінск—Гродна і, нарэшце, Пскоў — Вялікі Ноўгарад. Магчыма, гэтым жа шляхам тавары пападалі і ў Віцебск (пломбы драгічынскага тыпу).

Канчаткова не высветлены шляхі паступлення ў горад залатых і сярэбраных упрыгожанняў, гэта маглі быць гатовыя вырабы ці манеты або зліткі, пераплаўка якіх ажыццяўлялася на месцы. Разам з сыравінай з 2-й палавіны 12 ст. пачаўся прыток ва ўсходнерускія гарады, у т.л. і Віцебск, мастацкага начыння з Захаду. З Ніжняй Саксоніі паходзіў фрагмент пазалочанага падсвечніка ў выглядзе фігуркі жывёлы з ашчэранай пашчай (сямейства кашачых).

З пісьмовых крыніц канца 13 — пачатку 14 ст. вядома, што ў Віцебску нямецкія купцы гандлявалі таксама соллю, воўчымі футрамі і іншым таварам. Агляд імпарту 12—13 ст. указвае на асноўныя напрамкі развіцця гандлю ў гэты перыяд. Гандлёвыя сувязі з паўночна-усходняй Руссю і Прыбалтыкай ажыццяўляліся водным шляхам — Заходняя Дзвіна—Усвяча—Ловаць, асабліваe ажыўленне якога назіралася з 13 ст. Прадукцыя германскіх майстроў у падзвінскія гарады завозілася праз в. Готланд, заходнеславянскія гарады Памор'я, Рыгу. Па Дняпру ў Віцебск пранікалі смаленскія, кіеўскія і іншыя паўднёва-

рускія тавары, імпарт з Візантыі. У гэты перыяд развіваўся і паўднёва-заходні напрамак гандлю з Драгічынам, Цэнтральнай Еўропай праз Вялікапольшчу—Драгічын—Мінск—Гродна—Заходнюю Дзвіну. Пасля даволі доўгага перапынку ў 13 ст. зноў пачаў функцыянаваць Волжскі гандлёвы шлях, па якому ў горад транспартавалася прадукцыя з арабскага Усходу і Каўказа (ракавіны кауры, самшыт).

Такім чынам, у 12 ст. і асабліва 13 ст. Віцебск арыентуецца ў асноўным на гандаль з рускімі землямі (Кіеўскай, Смаленскай, Наўгародскай). Заставалася вялікай удзельная вага міжнароднага гандлю. Паступова адбываецца пераарыентацыя яго ў заходнім напрамку, што звязана, безумоўна, са спыненнем з-за мангольскага нашэсця прытоку паўднёвага імпарту. Гандлёвыя пагадненні ў 1-й палавіне 13 ст. дазваляюць вызначыць асноўных партнёраў Віцебска ў гандлі з Заходняй Еўропай. У сувязі з узрастаннем ролі гандлёвых гарадоў на Заходняй Дзвіне ў канцы 15 ст. Віцебск становіцца буйнейшым транзітным цэнтрам. У гэты ж час фарміруецца і купецтва, якое займаецца транзітнымі аперацыямі.

Т.С.Бубенька.

Віцебская берасцяная грамата

Яркім сведчаннем існавання пісьменнасці ў старажытным Віцебску з'явілася берасцяная грамата, выпадкова знойдзеная ў горадзе ў час земляных работ на плошчы Свабоды ў 1959 г. рабочым Е.Фраловым на глыбіні 3—4 м ад паверхні зямлі. Знаходка стала сенсацыяй у навуковым свеце, бо дагэтуль аналагічныя рэліквіі меліся толькі ў Ноўгарадзе (да 1961 г. — 400) і яшчэ 2 — у Пскове і Смаленску. Граматы выконвалі ролю старажытных лістоў і былі даволі распаўсюджаным сродкам зносін паміж людзьмі. Літары на бярозавай кары надрапваліся так званым пісалам — металічным ці касцяным стрыжнем з вастрыём на адным канцы і лапатачнай на другім. Яны знойдзены археолагамі на Беларусі ў культурных слаях 11—12 ст. Змест надпісаў разнастайны, але ў пераважнай большасці гэта дакументы прыватнай гаспадарчай дзейнасці: просьбы, даручэнні, абавязацельствы, спісы феадальных павіннасцей, грашовыя дакументы. Вядомы і больш цікавыя помнікі старажытнай духоўнасці, напрыклад, пісьмовае прызнанне ў каханні, ці школьныя практыкаванні наўгародскага хлапчука Анфіма.

Віцебская грамата напісана на кавалку бярозы памерам 17 х 4,5 см. Тэкст: «От Степана къ Нежилови. Оже еси продалъ порты, а купи ми жита за 6 гривень. А ли цего еси не продалъ, а посли ми лицемь. А ли еси продалъ, а добро сътворя у купи ми жита». У перакладзе гэта значыць: «Ад Сцяпана да Нежылы. Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта на 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў наяўнасці. Калі ж прадаў, то, будзь ласкаў — купі мне жыта». Грамату цяжка датаваць, бо яна знойдзена ў культурным пласце зямлі, які вельмі перамешаны. Аднак у выніку даследаванняў установлена, што яна адносіцца да мяжы 13—14 ст.

Як адзначае гісторык Л.В.Аляксееў, паходжанне граматы хутчэй за ўсё можна растлумачыць ажыўленымі ў гэты час гандлёвымі сувязямі Віцебска і Полацка з Ноўгарадам, праз пасрэдніцтва якога ішло зерне з Растова-Суздальскай зямлі ў Прыбалтыку. Дакумент носіць сляды цокаючага паўночна-заходняга дыялекту і таму, відаць, паходзіць з Ноўгарада. Яе мог напісаць чалавек, сябар якога паехаў у Віцебск па гандлёвых справах.

Што значыла тады 6 грывен? З «Рускай праўды» вядома, што за 6 грывен тады можна было купіць 300 аўчын, або 12 свіней, ці 2 кабылы, або 3 каровы. Нарэшце, за іх можна было наняць 2 парабчанкі на 12 год.

Зберагаецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі.

С.А.Кавалёў.

Духоўны свет старажытнага віцьбіча

Духоўны свет старажытнага віцьбіча быў непасрэдна звязаны з умовамі яго матэрыяльнай дзейнасці, рамесна-гандлёвай у сваёй аснове, але з пэўнымі прыкметамі і сельскагаспадарчай працы. Аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі прывяло да з'яўлення асобага тыпу грамадскай свядомасці, якая адрознівалася ад псіхалогіі славяніна-земляроба. Рамеснік адчуваў сябе больш упэўнена і незалежна на зямлі, бо разлічваў найперш на

свае рукі, прафесійныя навыкі, а ўжо потым — на знешнія абставіны. Ён усведамляў сваю сапраўдную неабходнасць, бо яго вырабы былі патрэбны людзям, а зрабіць іх на адпаведным узроўні маглі толькі некалькі чалавек. Скажам, асобым, ці наогул выключным было становішча майстра-каваля, да якога даводзілася звяртацца з просьбай зрабіць касу, сякеру, серп ці пілу. Цікавая акалічнасць: часам ён быў цесна звязаны пэўнымі адносінамі з княжацкім дваром і іншымі прадстаўнікамі знаці, іхняя зброя — таксама справа яго ўмелых рук. Няма чаго і казаць пра асаблівых умельцаў, адным з якіх быў, напрыклад, Лазар Богша, аўтар славутага крыжа Ефрасінні Полацкай. Наогул гэтых майстроў ведалі далёка навокал, яны валодалі высокім пачуццём годнасці і не саромеліся надпісаць сваё імя на тым ці іншым вырабе.

Вядома, рамеснікі мелі непасрэднае дачыненне да гандлёвай дзейнасці. Іх тавары разыходзіліся па навакольных селішчах, а нярэдка адпраўляліся з купецкімі суднамі і далей. Гэтыя людзі станавіліся заможнымі і ўплывовымі сярод супляменнікаў. Кожны з іх клапаціўся, каб зберагчы сакрэты сваёй прафесіі і перадаць спадчыну ў добрыя рукі.

Зручнае геаграфічнае становішча Віцебска на вялікім гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» прадвызначыла яго пэўны грамадска-псіхалагічны клімат. Тут гучна і зацікаўлена заўсёды сустракалі заморскіх купцоў, дзівіліся на прывезеныя імі тавары. На шматгалосым торжышчы ля берага Дзвіны вырашаліся многія важныя пытанні, заключаліся шматлікія гаспадарчыя здзелкі. У прыватнасці, абодва бакі дамаўляліся, як перапраўляць тавары з Дзвіны на Днепр, каму пастаўляць колы — фурманкі для транспарціроўкі суднаў, каго першага везці цераз волак, а хто павінен быў чакаць перавозчыкаў. Вядома, тут не абыходзілася без сутыкненняў, спрэчак.

Рост гандлёвых сувязей Віцебска не мог не прывесці да ўзрастання ў яго грамадска-палітычным жыцці купецкіх слаёў, да павелічэння іхняга дабрабыту. У 1151 г. полацкае купецтва цераз веча, якое было заўсёды добрым сродкам выяўлення яго волі, прагнала свайго князя. Няма падстаў меркаваць, што віцебскія гандляры былі больш паслухмянымі і талерантнымі. Яны былі дзецьмі свайго неспакойнага часу і творцамі сваёй небяспечнай прафесіі. Праца, спалучаная з частай рызыкай і цяжкімі падарожжамі, зрабіла іх людзьмі моцнымі і мужнымі і што самае галоўнае — адносна незалежнымі. Яны не хацелі нікому падпарадкоўвацца, бо лічылі сябе вольнымі вандроўнікамі, якія не ведалі ніякіх межаў і валодалі такімі грашыма, на якія маглі падкупіць іншага князя. Гэта былі вельмі цікавыя людзі. Яны шмат ведалі пра далёкія землі, розныя дзівосы ў іх. Гэта былі грамадзяне адносна больш эрудзіраваныя і адукаваныя, якія валодалі апрача найперш патрэбных ім матэматычных і геаграфічных ведаў таксама іншымі мовамі.

Як і ў кожным невялікім горадзе, вялікае значэнне ў Віцебску, апрача рамёстваў і гандлю, мела і сельская гаспадарка. Земляробства як галоўны занятак старажытных славян і вызначыла некаторыя важныя моманты духоўнага жыцця нашых продкаў. У ім, бадай што, галоўнае месца займаў язычніцкі аграрны культ, звязаны з ураджаем. Многія пачуцці і эмоцыі земляробаў дахрысціянскіх часоў захавалі любоўна запісаныя вучонымі-этнографамі абрадавыя, т.зв. валачобныя песні. Яны былі найперш характэрныя менавіта для паўночнай Беларусі. Нашы продкі песні выконвалі на першы дзень Вялікадня пад вокнамі хат. Іх характар быў найперш вітальна-віншавальны — імі віталі гаспадара, гаспадыню і іх дзяцей з вялікім святам вясны і выказвалі добрыя пажаданні. Нідзе больш у народнай паэзіі мы не сустрэнем такіх пранікнёных, такіх узнёслых слоў пра земляробчую працу, як у валачобных песнях. Яны былі паэзіяй зямлі, паэзіяй працы ў высокім эстэтычным праяўленні. Гэта сапраўдны мастацкі помнік земляробу, тысячам і тысячам сейбітаў і ратаяў.

Аграрны культ адбіўся пэўным чынам і на эстэтычных густах нашых старажытных віцяблян. Маюцца на ўвазе найперш матывы драўлянай разьбы, вышывак, арнаменты на кераміцы, якія захаваліся ў народным мастацтве да нашых дзён. Адным з такіх устойлівых матываў была, напрыклад, разетка. Гэты арнаментальны сюжэт адлюстроўваў ідэю аб сувязі жыватворных сонечных праменняў з пладароддзем, з ростам і цвіценнем раслінага свету. Часта маляваўся на прадметах месяц, бо згодна народных павер'яў лічылася, што ён таксама аказвае ўплыў на рост раслін. У Віцебску знойдзена каменная форма для вырабу металічных лунніц. Сярод тутэйшых археалагічных знаходак сустракаюцца і прадметы з выявай каня, напрыклад, амулеты — канькі. Гэтаму не прыходзіцца здзіўляцца, памятаючы, якую ролю адыгрываў конь у сялянскай гаспадарцы, будучы залогам шчасця і дабрабыту. Асобныя адносіны былі ў старажытных славян са сваімі памерлымі продкамі. Пахавальныя курганы, якія засталіся ад таго часу на тэрыторыі Беларусі, сведчаць,

што доўгі перыяд у славян існаваў звычай спальвання цел нябожчыкаў і пахавання попелу ад іх у агульных курганах. Вучоныя лічаць, што на тэрыторыі Віцебска таксама існаваў такі курган-некропаль. Агонь у жыцці старажытнага чалавека адыгрываў асобную ролю. Ён азначаў жыццё сярод змрочных сіл прыроды. У той жа час агонь меў ва ўяўленні нашых продкаў вялікую ачышчальную сілу. Прайсці праз яго азначала перарадзіцца, падняцца да іншых вяршынь быцця, у канчатковым выніку растварыцца ў бессмяротнасці. У 9—11 ст. пахавальны абрад змяняецца, адбываецца пераход да трупапакладання.

Такая з'ява, як фізічная смерць, была непадуладная чалавечаму розуму. Лічылася, што нябожчыкі не адыходзяць у нябыт, а пераходзяць у іншыя станы існавання і адтуль уплываюць на жыццё сваіх родзічаў. Ім былі прысвечаны абрады памінак. Тут на першы план выступала такое агульначалавечае пачуццё, як светлая памяць пра нябожчыкаў і жаданне ўтрымаць тое, што засталося ў спадчыну, што засталося пасля іх.

Паказчыкам высокага ўзроўню духоўнага жыцця нашых продкаў была пісьменнасць. Яна была распаўсюджана сярод багатых слаёў грамадства і простага народа. Пра гэта сведчаць адпаведныя знаходкі, напрыклад, графіці (надпіс) сярод рэштак фрэсак Благавешчанскай царквы, надпіс «Раство Хрыстова» на знойдзенай у 1964 г. бронзавай створцы абраза-складня. Адной з тутэйшых археалагічных знаходак з'яўляецца і праслека з надпісам: «Бабино пряслень». Была знойдзена таксама невялікая вісlая пячатка, якая, відавочна, належала князю Рурыку Расціславічу. На ёй выява хрысціянскага патрона Рурыка (хрысціянскае яго імя Васілій) святога Васілія Кесарыйскага і (на адваротным баку) святога Міхаіла (Міхаіл — хрысціянскае імя бацькі Рурыка). Знаходка нагадвае нам яшчэ важны псіхалагічны штрых пра тое, што нашы продкі, акрамя абароны з боку ўсёвідушчага і ўсялітасцівейшага Ісуса Хрыста, адчувалі патрэбу і ў дапамозе больш блізкіх чалавеку «хатніх» бажкоў, гэткіх нашчадкаў былых утульных і сціплых ідалаў, якія не вельмі пагражалі чалавеку нябеснымі карамі, але яму верылася, што дапамагалі. Таму адпаведна імя грамадзяніна тагачаснага грамадства, месца яго пражывання, роду заняткаў, ён меў у якасці свайго заступніка пэўнага святога, з якім ужо не развітваўся да смерці і якому найбольш шчыра і горача маліўся і пакланяўся.

Сістэма адукацыі была хрысціянская і ажыццяўлялася ў школах пры манастырах. Віцебск не быў выключэннем. Вялікая ўвага пры навучанні надавалася выхаванню хрысціянскай маралі, духоўнай і цялеснай чысціні.

Літаратура:

Алексеев Л.В. Полоцкая земля. М., 1966.

Левко О.Н. Торговые связи Витебска в X—XVII вв. Мн., 1989.

Штыхов Г.В. Города Полоцкой землі (IX—XIII вв.). Мн., 1978.

С.А.Кавалёў.

Дакументы сведчаць

ВЫТРЫМКІ З ЛЕТАПІСАЎ ПРА ЗАСНАВАННЕ ВІЦЕБСКА

В лето 974 Ольга, победив Ятвягов и Печенегов, переправилась через реку Двину и с войском заночевала. Понравилась ей гора, и она основала деревянный замок, назвав его, от реки Витьбы, Витебском, построила в Верхнем замке каменную церковь святого Михаила, а в Нижнем — Благовещения и, пробыв два года, отправилась в Киев.

А.П.Сапунов. Витебская старина. Витебск, 1883. Т. 1. С. 455.

«В лето 6529 (1021) поиде Брячислав князь, сын Изяславль, внук Володомиров, с вои из Полотьска на Новгород, и взя Новгород, и поим Новгородци, и имение ихь, и весь полонь и скоты, и поиде к Полотьску. И пришедшю ему к Судимире реце, великий же князь Ярослав слышать ту весть, и совокупи вся многи, из Киева в седмый день постиже ту, и победи Брячеслава, а Новгородци отпусти кь Новгороду, и полон от него остья, елико бяще Новгородския волости; в Братислав бяше к Полотьску. И отьоле призва к себе Брячеслава, и дав ему два города Вьсвясь и Витебскь, и тече ему: «буди же со мною заодны». И воеваше Брячислав с великим князем Ярославом вся дни живота своего».

Полное собрание русских летописей. Т. 9/10. Патриаршая или Никоновская летопись. М., 1965. С. 77.

В лето 6624 (1116 г.) Глеб Святославович Смоленский Повоева Дреговичи и Случеск пожег, и не каящеся о семь; пойде же Володимер противу ему ко Смоленску, со сынами своими, и Давыдом Святославовичом и Олговичи, и взя Вячеслав Владимерович Оршу, Копыль, а Давид с Ярополком взяша Витепек, о Володимер приеде с Смоленску...

... Том же лете Давыдь Ростиславовичь седе Витебьски, а Рамановичи, Вячеславлю науку, да Ростиславь Васильев и Краснь.

Полное собрание русских летописей. Т. 7—8. Летопись по Воскресному списку. СПб., 1856—59. Т. 7. С.1.

В лето 6675 (1167 г.)... Тем же лете пойде Володарь Глебович к Полотьску ратью; Василькович же Всеслав пойде противу ему, не да ему сьвкьупитися на них изнезаги, а много их изба, а инех руками изломша; Всеслав же беша Витебьску. Володарь же пойде Витебьску на Давыдам и на Всеслава, и пришед ста на реци, начашася бити о реку; Давид же тем не да ему полку, занеже ждаше брата своего Романас Смоляны. Сеже давно сдался: в полуноши бысть горем силен, яковоем бродящимься через реку, и страх нападе на воя Володарева. И рекоша дружина Володарева: «что стоищи, княже, не поеда прочь? а сетися Раман бродить, а отсюда Давыдь»; и побеже Володарь от Витьбеска. И заутра сьгляда Давыд, оже Володарь бежать, и пустило них, и не постигоши их, по лесу блудящих много изомажа; а Всеслава посла Полотьску...

Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись. М., 1962. С. 93.

— В лето 6688 (1175 г.)... Тое же зима оженился Ярополк Ростиславич, князь Володимирский, послав к Смоленску поя за ся княгиню Всеславлю дщерь князя Витебьского; веньчася с нею в Володимиро у святей Богородице, месяца февраля в 3 день, мясопустьной неделе во вторник.

Полное собрание русских летописей. Т. 2. Ипатьевская летопись. М., 1962. С. 2.

ГРАМАТА КНЯЗЯ ГЕРДЗЕНЯ, ЯКІ АД ІМЯ ПОЛАЦКАГА І ВІЦЕБСКАГА КНЯСТВАЎ ЗАКЛЮЧЫЎ МІРНЫ ДАГАВОР З РЫГАЙ І ГОТЛАНДАМ

Рыга **2 снежня 1264 г.**

Князь Герден кланяется всем тем, кто видит сию грамоту. Тие люди, што ныне живи суть, а темь, кто на после придуть, тем ведомо буди, как мир есмы творили промежи местеря и с ратманы Рижскими и с Полочаны и Видьбляны.

Тако како грамоте написано, тако им надо всею землею отступити, што есть Лотыгольская земля, как не вступатися на тую землю и с печатью, как более того на ту землю не поискывати...

Верху того Немечькому гости в Полочьскую не волно ехати и торговати, купити и продати. Такоже Полочаном и Видиблянину волно гостити в Ригу и на Готьскы берегь.

Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригою и Ганзейскими городами в XII, XIII и XIV вв. СПБ., 1857. № 2а.

ГРАМАТА РЫЖСКАГА АРХІЕПІСКАПА ДА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ СМАЛЕНСКАГА ФЁДАРА РАСЦІСЛАВІЧА З АБВІНАВАЧВАННЕМ ЖЫХАРОЎ ВІЦЕБСКА, ЯКІЯ СКАРДЗІЛІСЯ НА РЫЖАН

Каля 1281—97 гг.

Благословение от митрополита Ризького ко своему милови сынови, князю великому Фёдору, и к его детям, и ко владыче, и ко наместнику, и ко всем бояром. То буди тобе ведомо, про тую жялобу, что Витьбляне жалобилися на Рижяны, чем то хотели оправитися против у Гельмика, и их слово таково. Хотели ся темь словом оправити и рекли так пред князем Бряньским: выезжали 50-ть муж из Рига и убили человека, и узяли 10-ть берковьсков воску. И ныне я митрополит таково молвлю, как то **Витьбляне** неправдою жалобилися на Рыжяны, и ныне то есть мне ведомо, аже Рижане суть в том невповаты; и ныне я тому дивлюся, аже твои наместьник слушает всякого человека слово. А ты правде есть промеже вас и нас: гдеся тяжя почнеть, ту концяти. И ныне я молюся вам, как то люзите стояли оу той правде и оу коестном человании. Аже иметь жялобитися вас кто на Рыжаны, или Гелмика или иным, и вышлите к нам а мы правду дамы по Божьи правде.

А.П.Сапунов. «Витебская старина». Витебск, 1883. Т. 1. С. 22.

ГІСТОРЫКІ ПРА ЗАСНАВАННЕ ВІЦЕБСКА

Витебск. Время основания его неизвестно. Витебская летопись приписывает основание его св. Ольге, жене Игоря, относя это к 974 году. Но это, несомненно, домысел позднейшего книжника.

В русских летописях впервые упоминается Витебск под 1021 г., когда Ярослав отдал его и Усвят Брячиславу.

В.Е.Данилевич. Очерк истории Полоцкой земли до конца XIV ст. Киев, 1896. С. 17—18.

... От Полоцка, как главного города обширной области, зависели мелкие города этой области или пригорода, каковыми были: Минск, Борисов, Друцк, Стрежев, Усвят, Изяслав, Витебск и др.

... Есть предание о позднейших летописях, о пребывании Ольги в земле Полоцкой и даже о заложении ею Витебска, но эти рассказы не могут иметь значения и сложились в позднейшее время.

М.Довнар-Запольский. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия. Киев. 1891. С. 68.

... Кем и когда именно основан Витебск с достоверностью определить невозможно. Нарбут (польский историк) полагает, что Витебск основан в весьма отдаленную эпоху жителями г. Висби (на о. Готланде). Город Висби служил главным посредником в торговле между древнейшими городами Кривичей — Полоцком и Смоленском — с одной стороны и между Скандинавами, а потом городами славянобалтского поморья (Любек, Винета, Волын и др.) с другой... Особенно деятельно... полочане способствовали перевозке товаров с Балтийского моря в Азию: по Двине до Витебска, отсюда волоком до Днепра и по нем до Киева и далее...

А.П.Сапунов. Витебская старина. Витебск, 1883. Т. 1. С. 359—360.

Достоверных указаний о времени основания Витебска не имеется. Г.Нарбут полагает, что этот город основан в отдаленную эпоху жителями г. Висби (на о. Готланде). Гораздо вероятнее мнение Беляева (Беляев И. История Полоцка, М., 1872. — прим. ред.), по которому Витебск основан полочанами. По преданию же, записанному в летописи г. Витебска, наш город основан св. Ольгою. Название свое Витебск получил, конечно, от р. Витьбы, вьющейся между оврагами при впадении в Двину.

В летописи впервые упоминается о Витебске под 1021 г. (6529 г.) по поводу борьбы князя полоцкого Брячислава Изяславича, внука св. Владимира и Рогнеды, с великим князем киевским Ярославом. Борьба окончилась миром, по которому Ярослав уступил Брячиславу два города «Вьсвячь» (ныне Усвят) и Витебск».

Во всей вероятности города эти раньше принадлежали Полоцкому княжеству и только временно могли подпасть под власть киевских князей.

А.П.Сапунов. Витебская старина. Витебск, 1883. Т. 1. С. 559—560.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Палітычнае жыццё Віцебска ў 14—18 ст.

У пачатку 14 ст. Віцебск з'яўляўся цэнтрам аднайменнага княства, якое вылучылася з Полацкай зямлі пасля смерці князя Усяслава Брачыславіча (1044—1101), і разам з іншымі ўдзельнымі княствамі з сярэдзіны 13 ст. паступова ўцягвалася ў сферу палітычнага ўплыву Літвы. У барацьбу за віцебскае княжанне, якая ішла з пачатку 12 ст. паміж полацкімі і смаленскімі князямі, уключыліся літоўскія князі.

У 1318 г. віцебскі князь Яраслаў Васілевіч, які паводле летапісу Быхаўца меў адну дачку, аддаў яе замуж за крэўскага князя Альгерда Гедзімінавіча (1296—1377). Князёўна Марыя атрымала Віцебск у спадчыннае ўладанне яе пасаг. У 1320 г. пасля смерці Яраслава Васілевіча віцебскім князем стаў яго зяць Альгерд. Віцебск і Віцебскае княства ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ).

Вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Альгерд.

Князь Альгерд, у першую чаргу, пачаў умацаванне горада, які ператварыўся ў важны стратэгічны фарпост ВКЛ на ўсходніх рубяжах. Будаўніцтва фартыфікацыйных умацаванняў ажыццяўлялася ў адпаведнасці з навейшымі дасягненнямі, вядомымі ў Заходняй Еўропе. У даволі кароткі тэрмін з 1330 да 1351 г. вакол Віцебска ўзнімаюцца мураваныя ўмацаванні, і ён ператвараецца ў непрыступны «замак Віцебскі». Пачатае Альгердам будаўніцтва завяршыла яго другая жонка Ульяна Аляксандраўна (князёўна Цвярская), з якой Альгерд ажаніўся ў 1332 г. (паводле іншых звестак, пасля 1347 г.).

Мураванае будаўніцтва ў горадзе не абмежавалася ўзвядзеннем абарончых умацаванняў. На Верхнім замку Альгерд змураваў княжацкія палаты. Ва ўсходняй частцы Заручаўя (на месцы сучаснага аблвыканкома) для сваёй жонкі князь пабудаваў Святадухаўскую царкву; на Ніжнім замку — перабудаваў саборную Благавешчанскую царкву (іншая назва Дабравешчанская); з паўднёвага боку да храма былі дабудаваны прытворы. У час архітэктурна-археалагічных даследаванняў вакол Благавешчанскай царквы выяўлены магутны слой будаўнічага смецця 14 ст. (фрагменты плінфы, мураваныя пліты падлогі, вапна, кавалкі фрэсак), што ўказвае на значную перабудову храма.

У 1341 г. віцябляне на чале з князем Альгердам і яго сынам Андрэем (Полацкім) дапамагалі Пскову ў барацьбе супраць крыжакоў. У 1345 г. Альгерд стаў вялікім князем літоўскім, а Віцебск перадаў Андрэю Альгердавічу, князю пскоўскаму (1342 г., з 1377 г.) і полацкаму (пасля 1342 г., у 1370—80-я гады з перапынкамі). Пазней горад атрымала ў пажыццёвае ўладанне жонка Альгерда княгіня Ульяна (Юльяна). На Узгор'і яна пачала будаўніцтва драўлянай царквы св. Іаана Багаслова (1345), пры Святадухаўскім храме заснавала жаночы манастыр, дзе прыняла пострыг пад імем Марыі і жыла да сваёй смерці (памерла каля 1393).

У канцы 14 ст. Віцебскае княства разам з большасцю ўдзельных княстваў на тэрыторыі Беларусі было скасавана, функцыі ўлады перададзены намесніку вялікага князя, які прызначаўся са згоды мясцовых феадалаў у адпаведнасці з прывілеямі, выдадзенымі Віцебску і Полацку. У гэты перыяд Віцебск стаў месцам жорсткай міжусобнай барацьбы паміж сынамі і сваякамі вялікага князя Альгерда за права валодання гэтым важным стратэгічным і гандлёвым пунктам. Пасля смерці ўдавы Альгерда княгіні Ульяны вялікі князь літоўскі Ягайла прызначыў у Віцебск сваім намеснікам лоўчага Фёдара Вясну (Вёсну). Брат Ягайлы Свідрыгайла (у праваслаўі Леў, у каталіцтве Баляслаў), які марыў аднавіць віцебскае княжанне, у 1393 г. захапіў горад з дапамогай нямецкіх рыцараў. Фёдара Вясну скінулі з замкавай сцяны ў Дзвіну і ўтапілі. Свідрыгайла нядоўга правіў у Віцебску. Магутныя абарончыя ўмацаванні горада дазволілі яму адбіць штурмы кааліцыі трох князёў — Вітаўта, Скіргайлы і смаленскага Юрыя Святаславіча. Аднак пасля 4-тыднёвай аблогі Вітаўт здолеў узяць Ніжні замак. Затым ён «заточив дела в церкви мурованой в Нижнем замку, разбивал мур замку Вышнего беспрестанно». Зрабіўшы праломы ў сценах і вежах Верхняга замка, войска асаджаўшых імкнулася распачаць агульны штурм, аднак з-за недахопу правіянту віцябляне самі здалі горад.

У 1396 г. Свідрыгайла з дазволу гараджан зноў заняў Віцебск. Каб авалодаць віцебскім Ніжнім замкам яшчэ раз, князю Вітаўту давялося ажыццявіць 30-дзённую аблогу і вальны штурм. Верхні горад быў захоплены толькі з прычыны выпадковай памылкі абаронцаў, якія для эвакуацыі з замку жанчын і дзяцей несвоечасова адчынілі вароты. Пасля смерці Вітаўта (1430) барацьба за віцебскі сталец з новай сілай разгарэлася паміж Свідрыгайлам (вялікі князь ВКЛ у 1430—32) і Жыгімонтам

(Сігізмундам) Кейстутавічам (вялікі князь ВКЛ у 1432—40). У 1435 г. віцябляне ў трэці раз адчынілі гарадскія вароты Свідрыгайлу, які жорства пакараў прыхільнікаў Жыгімонта. Князёў Гальшанскіх і Міхаіла Пеструцкага ўтапілі ў Дзвіне, мітрапаліта Герасіма (раней быў смаленскім епіскапам) спалілі жывым. Герасім быў спалены на вялікім камяні на беразе Дзвіны, каля падэшвы Замкавай гары. Той камень атрымаў назву «Жыдоўскі». Жорсткае пакаранне Герасіма ўсхвалявала Літву і Русь. Жыгімонт накіраваў да Віцебска войска на чале з сынам Міхаілам (Баляслаў, нарадзіўся ў 1380-я гады, памёр у 1451 або 1452). 6-тыднёвая аблога горада была беспаспяховай. Толькі ў 1437 г. віцябляне прызналі ўладу вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча.

Храбрасць і адданасць жыхароў горада вярхоўнай уладзе заўсёды высока цанілася вялікімі літоўскімі князямі і польскімі каралямі, якія давалі Віцебску розныя прывілеі і граматы. Першая вядомая грамата вялікага князя Вітаўта, наданая гораду ў 1390-я гады, пацвярджала пэўныя нормы мясцовага права, якія ўзыходзілі да дагавораў паміж горадам і князем. У 1444 г. паводле прывілея вялікага князя ВКЛ Казіміра Ягелончыка (з 1447 кароль польскі Казімір IV) горад атрымаў права на абмежаванае самакіраванне, у тым ліку права суда згодна з магдэбургскімі законамі, права свабоднага гандлю ў межах Вялікага княства Літоўскага. Устаўная грамата 1447 г. давала дадатковыя ільготы мяшчанам, што сведчыла пра рост уплыву гараджан у палітычным жыцці дзяржавы. Прывілеі, наданыя Віцебску ў 15 ст., садзейнічалі эканамічнаму росквіту горада: павялічылася колькасць гарадскога насельніцтва, адзначалася далейшае паглыбленне спецыялізацыі рамяства і ўзнікненне рамесніцкіх аб'яднанняў, пашыраліся гандлёвыя сувязі віцебскага купецтва, паскорылася абарачэнне тавараў.

Прывілей віцебскім баярам і мяшчанам «на некаторыя правы і вольнасці іх», нададзены вялікім князем ВКЛ і каралём польскім Аляксандрам 16.7.1503 г., быў пацверджаннем папярэдняга прывілея 1444 г. Казіміра IV. Ён гарантаваў недатыкальнасць зямельных уладанняў феадалаў і мяшчан горада і Віцебскай зямлі: «...штож нам в домы церковныи, ... и в иные церкви не вступатися; и в купленины, которыи будут куплены с нашим дозволеніем, и в безотчины и в отмерщины Витебскіи теж не маем вступатися...». Віцябляне атрымалі права «самим казнити по своему праву...» . Ваявода ў Віцебск прызначаўся толькі са згоды гараджан: «по старому по их воле, и который им будет нелюб воевода, вмовят его перед нами, ино нам воеводу им инаго дати, по их воли». Паводле прывілея забараняліся самавольныя паборы ваявод; жыхары горада мелі права свабоднага перамяшчэння па тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. Прывілей Аляксандра 1503 г. неаднаразова пацвярджаўся граматамі вялікіх князёў ВКЛ, каралёў польскіх: 18.2.1509 г. Жыгімонтам I Старым, 21.2.1547 г. Жыгімонтам II Аўгустам, 28.11.1582 г. Стафанам Баторыем, 13.10.1592 г. Жыгімонтам III Вазай.

Да сярэдзіны 15 ст. Віцебск стаў адным з буйнейшых гарадоў ВКЛ і быў пазначаны ў ліку 15 найбуйнейшых гарадоў дзяржавы ў грамаце Казіміра, выдадзенай у Брэсце ў 1441 г.

Магутныя абарончыя збудаванні Віцебскіх замкаў, якія ўключалі не толькі муры, але і сістэму рэк і прудоў, надзейна абаранялі горад ад непрыяцеля. Невыпадкова (з гэтай нагоды) Віцебск на мяжы 14—15 ст. быў унесы ў спіс рускіх гарадоў дальніх і блізкіх»: «Витебск, 3 стены каменны. А реки Видба и Двина».

Другая палавіна 15 ст. для Віцебска прайшла адносна спакойна. У 1451 і 1469 гг. кароль Казімір IV інспектаваў умацаванні горада і даў гараджанам Устаўную грамату, якая рэгламентавала іх жыццё і дзейнасць, пацвярджала аўтаномію Віцебскай зямлі, правы і абавязкі грамадзян, мясцовых феадалаў і баярства. Удзел у ваенных паходах з'яўляўся адным з асноўных абавязкаў віцяблян: «А на вайну быти им с нами посполу готовый». Гэта было звязана перш за ўсё з тым, што Віцебск уваходзіў у лік памежных гарадоў, якія абаранялі Вялікае княства Літоўскае на ўсходзе.

Падчас шматлікіх аблог горада ў канцы 14 — 1-й палавіне 15 ст. мураваныя сцены віцебскай крэпасці былі моцна пашкоджаны. У канцы 15 ст. вялікі князь Аляксандр загадаў «довести витебский замок до оборонительного положения». У выніку рамонту замкавыя сцены дабудоўваюцца драўлянымі прасламі, на найбольш слабых участках яны ўмацоўваюцца глініста-земляными валамі. Пасля завяршэння працы па аднаўленню ўмацаванняў горада, з пачатку 16 ст. Віцебск быў вымушаны ўдзельнічаць у шэрагу доўгіх войнаў па-



Герб Віцебска, змешчаны ў тэксце прывілея на магдэбургскае права 17.3.1597 г.

між Вялікім княствам Літоўскім і Расіяй, якія працягваліся больш за 150 гадоў.

У час вайны 1500—03 гг., у 1502 г. рускія войскі спалілі віцебскія прадмесці. З 1506 г. Віцебск з'яўляўся цэнтрам ваяводства, утворанага на тэрыторыі былога Віцебскага княства. Была зацверджана харугва (баявы сцяг) ваяводства — зялёнага колеру з выявай Пагоні (вершніка са шчытам і паднятым над галавой мячом у белым полі). Першым намеснікам, які карыстаўся тытулам віцебскага ваяводы быў Юрый Глебавіч (у 1503—08).

У 1516 г. Віцебск вытрымаў працяглую аблогу рускімі войскамі. Мураваная крэпасць устаяла перад націскам непрыяцеля, аднак пажары поўнасцю вынішчылі драўляную частку горада. Маскоўскія ваяводы паўтарылі аблогу ў 1519 г. Ніжні замак быў захоплены, загінула шмат віцяблян. Тыя, хто ўцалеў, выратаваліся за моцнымі сценамі Верхняга замка. У 1534 г. князь Барыс Гарбаты на чале наўгародска-пскоўскай раці спустошыў навакольле Віцебска. Аднак захапіць горад яму не ўдалося. У 1535 г. рускія ваяводы Кісліца і Ляцкі планавалі летні паход на Віцебск, аднак ці адбыўся ён, звестак няма. Дакладна вядома толькі тое, што ў канцы лістапада таго ж 1535 г. наўгародска-пскоўскае войска князя Б.Гарбатага і 10 князёў «воевали Витепские места». Летам 1536 г. войска князёў Гаранскага і Барбашова спаліла віцебскі пасад, узяло ў палон многіх гараджан і жыхароў воласці.

Пачатак Лівонскай (Інфлянцкай) вайны 1558—83 гг. пагоршыў і без таго цяжкае становішча горада. Рускія войскі тройчы асаджалі Віцебск. У канцы мая 1562 г. князь А.Курбскі напаў на горад і спаліў яго прадмесці. У час аблогаў гараджане самаддана абаранялі горад. Яны стваралі дружыны і рабілі вылазкі ў стан ворага. Упершыню рускія войскі ўзялі Віцебск толькі ў 1563 г., але хутка былі выцеснены адтуль. Гэтаму асабліва садзейнічала эпідэмія моравай язвы, якая панавала ў горадзе і вынішчыла шмат людзей. Горад і замкі ўсё больш прыходзілі ў заняпад. Яшчэ ў 1559 г. па просьбе гараджан быў выдадзены ўказ, які абавязваў усіх уладальнікаў нерухомых маёнткаў несці службы «яко военную, так и лежанья в замку, с тых имений, своих служили, именьями своими головнейшими не вымовляючись».

У 1569 г. (паводле іншых звестак у 1568) у выніку аблогі значную частку Віцебска спаліла 6-тысячнае войска князёў Шарамецева, Бутурліна і Сабурава. Асабліва пацярпелі замкавыя ўмацаванні. Пра маштабы іх разбурэння можна меркаваць па звестках з «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай», якая паведамляе, што ад мураваных умацаванняў засталася адна разбурана сцяна і моцна пашкоджаная «мураваная вежа», што стаяла над Дзвіной. У даволі сціслыя тэрміны замкі былі адбудаваны. Вайна паскорыла падпісанне ў 1569 г. Люблінскай уніі, у выніку якой Вялікае княства Літоўскае і Польшча стварылі федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую. У 1578 г. ў грамаце да віцебскага ваяводы С.М.Паца кароль Стафан Баторый выказаў віцяблянам сваю падзяку за хуткае аднаўленне гарадскіх умацаванняў. Адначасова кароль пацвердзіў, што ён не мае намеру ператварыць аднаўленне ўмацаванняў у павіннасць для гараджан.

Віцебск, як і іншыя гарады Беларусі, меў сваю зладжаную сістэму арганізацыі абароны. Яна складалася з гарадскога пешага апалчэння, падзеленага на дзесяткі і сотні, коннага мяшчанства і гарнізона наёмнага войска, які звычайна размяшчаўся ў замках. Наёмнікі часцей за ўсё набіраліся ў Германіі, Італіі, Чэхіі, Венгрыі, Галандыі. Паводле пісьмовых крыніц вядомы сотні Верхняга замка, Узгорская, Задзвінская, Задунаўская, Заручайская. Згодна з каралеўскімі прывілеямі ў горадзе ў 16 ст. існавала асобая група насель-

ніцтва — «конныя мяшчане». Яны жылі ў горадзе і адначасова валодалі маёнткамі каля яго, за якія былі абавязаны служыць дзяржаве «канём». Мяшчане неслі службу «збройно» ў конным земскім апалчэнні падчас «посполитого рушенья» разам са шляхтай. У 2-й палавіне 16 ст. віцебскія конныя мяшчане «весполок с князи и бояры, шляхтаю павету Витебского, з имений своих отчызных, выслужоных и с купленых...» выстаўлялі 100 коней. У іх абавязкі ўваходзіла таксама правіць замкавыя ўмацаванні ў Віцебску, будаваць астрог, несці вартавую службу. У той жа час (1576) гараджан вызвалілі ад павіннасці рамантаваць замкавыя ўмацаванні.

17.3.1597 г. вялікі князь ВКЛ, кароль Польшчы і Швецыі Жыгімонт III Ваза (1566—1632) надаў Віцебску прывілей на магдэбургскае права. Разам з ім горад атрымаў уласны герб з выявай святога Спаса Збавіцеля, харугву, пад якую мяшчане станавіліся, «под час посполитого рушенья и потребы военное». Кіраванне горадам перадавалася магістрату, рэзідэнцыяй якога павінна была стаць віцебская гарадская ратуша (пабудавана ў 1602). Віцебску дазвалялася мець сваю пячатку, гасціны двор, штогод праводзіць кірмашы. Згодна з прывілеем на магдэбургскае права свае харугвы атрымалі ўсе рамесныя цэхі. Прывілей таксама нагадваў пра ваенную павіннасць гараджан, якая захоўвалася за імі.

У 1602 г. на Віцебск напалі запарожскія казакі на чале з атаманам Дубінай. Шмат жыхароў было забіта, але гараджане здолелі адстаяць горад і нанесці вялікія страты праціўніку. Атаман і яго бліжэйшыя паплечнікі былі схоплены і пакараны ў Заручаўскіх Валатоўках (раён сучаснай вуліцы Гогаля). Праз 3 гады віцебская мяшчанская харугва (ваенны атрад) колькасцю 500 чалавек пад камандаваннем Марка Лыткі захапіла замак Феліна (Ліфляндыя). За гэта М.Лытка быў уведзены ў шляхецтва і атрымаў прозвішча Фелінскага. У 1614 г. віцебская харугва пацярпела паражэнне ў бітве пад Глазомічамі. У тым жа годзе казакі спалілі горад. Згарэлі абодва замкі, іх аднаўленне зацягнулася на доўгія гады. У 1626 г. чарговы пажар знішчыў Верхні замак і раён Задзвіння. Пажары, казацкія набегі, якія суправаджаліся масавым знішчэннем насельніцтва, дапоўніла эпідэмія чумы, якая напаткала Віцебск у 1603 г. і забрала мноства жыццяў.

Іасафат Кунцэвіч.

Пасля абвяшчэння Брэсцкай уніі 1596 г. і ўтварэння уніяцкай (грэка-каталіцкай) царквы, ва ўмовах афіцыйнага навязвання уніі ў Віцебску пагоршылася становішча праваслаўнай царквы і яе вернікаў. Карыстаючыся каралеўскімі прывілеямі, іезуіты пачалі (з 1640) скупляць зямельныя ўчасткі для пабудовы на месцы Пятніцкай царквы іезуіцкага кляштара. Часам святыя айцы гвалтоўна захоплівалі сядзібы гараджан. Супраціўленне уніі і абарона праваслаўя ў горадзе ўзмацніліся пасля 1618 г., калі полацкім уніяцкім архіепіскапам быў прызначаны Іасафат Кунцэвіч. Энергічнае распаўсюджванне уніі І.Кунцэвічам, у тым ліку і адміністрацыйнымі сродкамі, закрыццё праваслаўных храмаў, высылка праваслаўных святароў, прызначэнне на іх месца уніяцкіх выклікалі пратэсты гараджан, іх шматлікія скаргі і звароты да вярхоўнай улады. 17.5.1621 г. кароль Жыгімонт III Ваза вымушаны быў накіраваць спецыяльную грамату віцебскаму ваяводзе, у якой загадваў «...ни в ком бы еси церквам Божим и священником кривди не чинил.. бо Мы государь и в маестате нашом всей земли Витебское выписали, иж

Забойства І.Кунцэвіча. Малюнак Зімлера. 1865 г.

старины не маем рушить, а церквам Божим и овшем ненадобе кривды чинити и стараго наданя рушить». Вялікі канцлер ВКЛ Леў Сапега ў сваім пісьме да І.Кунцэвіча 12.3.1622 г. выказаўся супраць метадаў гвалтоўнага далучэння вернікаў да уніі, супраць закрыцця праваслаўных цэркваў, патрабаваў ад архіепіскапа вярнуць храмы вернікам і пагражаў, што «... я сам прикажу распечатать и отдать церкви (православным), дабы они в тех церквах отправляли свое богослужение...». Адначасова Л.Сапега папярэджваў І.Кунцэвіча пра магчымасць паўстання: «... вы злоупотребленіем своей власти, своими поступками, противными священной воле и приказаніям Речи Посполитой, зажгли те опасные искры, которыя всем нам угрожают пагубным и всеистребляющим пожаром».

У 1622 г. ў час службы ў царкве некалькі гараджан напалі на І.Кунцэвіча і яго памочнікаў. Іх арыштавалі і зачынілі ў будынку ратушы. Узрушаныя вернікі вызвалілі нападаўшых, а архіепіскап і войт у той дзень ледзь пазбеглі расправы. Пасля гэтага Кунцэвіч распарадзіўся зачыніць усе праваслаўныя цэрквы ў горадзе. Да канца 1623 г. віцебскаму войту М.Завішу ўдавалася стрымліваць гараджан ад паўстання. Выступленне праваслаўных гараждан Віцебска супраць грэка-каталікаў адбылося 12.11.1623 г., у нядзелю пасля ранішняга богаслужэння. Званы гарадской ратушы і праваслаўных цэркваў далі сігнал аб яго пачатку. У падрыхтоўцы паўстання прымалі ўдзел праваслаўныя з Магілёва, Оршы, Полацка і Вільні, у тым ліку 2 віцебскія бурмістры, Сцяпан Пасіёра (зачыншчык забойства архіепіскапа), палачанін Пётр Васілевіч з сынам і інш. Паўстанцы рушылі ў двор архіепіскапа і падпалілі дом. І.Кунцэвіча забілі двума ўдарамі па галаве, потым цела яго пасля здзекаў кінулі ў Заходнюю Дзвіну (знойдзена праз 3 дні і перавезена ў Полацк). Уніяцкія святары і челядзь архіепіскапа былі збіты, маёмасць разрабавана, архіў знішчаны. Рымскі папа Урбан VIII заклікаў Жыгімонта III Вазу жорстка пакараць паўстанцаў. У Віцебск прыбылі каралеўскія камісары разам з войскам. Следчую камісію ўзначаліў Л.Сапега. Усіх гараджан камісары аб'явілі саўдзельнікамі паўстання; былі затрыманы і пакараны смерцю 19 чалавек, 78 чалавек збеглі і былі прыгавораны да пакарання смерцю завочна. Віцебск пазбавілі магдэбургскага права і перадалі пад юрысдыкцыю віцебскага ваяводы, разабралі ратушу, знялі званы. Гараджане страцілі ўсе прывілеі, якімі карысталіся з часоў вялікага князя ВКЛ Вітаўта; былі абкладзены павіннасцямі на карысць ваяводы і замка, абавязаны былі пакрыць страты, прычыненыя гаспадарцы архіепіскапа (3079 злотых). 16.5.1643 г. Ісафат Кунцэвіч папам Урбанам VIII прылічаны да блажэнных пакутнікаў каталіцкай царквы (22.4.1867 г. папа Пій IX абвясціў яго святым).

У 1632 г. віцябляне пачалі ўзводзіць земляныя ўмацаванні вакол Узгорскага замка. Умацаванні працягласцю 1794 м былі зроблены «на время», «из хором». Значнага рамонту патрабавалі таксама ўмацаванні Верхняга і Ніжняга замкаў. У 1638 г. скарбавы каралеўскі слуга Я.Быкоўскі адзначаў, што ўмацаванні Віцебска пасля апошніх пажараў адбудоўваліся і надбудоўваліся з дрэва. У канцы 1630-х гадоў у цэйхгаузах Верхняга замка захоўвалася ваенная амуніцыя: 5 «спраў», не зусім цэлых, 80 гакаўніц, 5 гакаўніц, «отданных ремесленникам для описи», 8 шмыгаўніц, 1 жалезны штурмак, 10 жалезных кіяў, 1

форма для адліўкі пушачных ядраў і 8 форм гакаўнічных.

За перамогу віцебскага атрада ў баі з рускімі войскамі пад Кашэвічамі (1641) кароль Уладзіслаў IV Ваза (1595—1648) у 1644 г. вярнуў Віцебску магдэбургскае права разам з правам бяспошліннага гандлю і ранейшыя прывілеі. Толькі перададзеныя уніятам цэрквы засталіся уніяцкімі. У 1644 г. была пабудавана новая гарадская ратуша.

У сярэдзіне 17 ст. Віцебск надзейна кантраляваў верхняе цячэнне Заходняй Дзвіны, з'яўляўся стратэгічным плацдармам для разгортвання наступлення ў глыб тэрыторыі Беларусі і на сталіцу Вялікага княства Літоўскага г. Вільню. Разумеючы гэта, рускае войска пад камандаваннем Шарамецева ў 1654 г. пачало замацоўваць свае пазіцыі ў Беларускім Падзвінні. Напярэдадні вайны з Расіяй Сейм Рэчы Паспалітай у тым жа годзе прыняў спецыяльную пастанову адносна абароны Віцебска, які адыгрываў вялікую ролю ў забеспячэнні бяспекі не толькі ўсходняй мяжы ВКЛ, але і Полацка, Рыгі, Вільні, Гродна. Адпаведна з рашэннем Сейма, усе мяшчане, духоўныя і свецкія жыхары горада, пасельскія мяшчане і ўсе жыхары ваяводства ў выпадку небяспекі павінны былі абараняць горад пад пагрозай страты ўсіх уладанняў і прывілеяў. «Сила Речи Посполитой», — гаварылася ў «Конституции» 1654 г., — «на замок Витебск возлагается». У сярэдзіне жніўня 1654 г. войскі ваяводы Шарамецева падышлі да Віцебска. Хутка сюды ж прыбыў атрад украінскіх казакоў на чале з Залатарэнкам. Жыхары Віцебска да таго часу заканчвалі запозненыя прыгатаванні да аблогі. Новага лесу прывезці не паспелі, таму з прычыны недахопу будаўнічых матэрыялаў разбіралі «хоромные строения» і спешна ўзводзілі вежы і астрог. Выкарыстоўвалі «хоромный лес» ад кальвінскага збору, жылога будынка пастара, вучылішча кальвіністаў і багадзельні, дамоў многіх гараджан. Пачалася цяжкая 14-тыднёвая аблога Віцебска, у якім было «всяких чинов людей ... тысячей з 10». Сярод іх мяшчанскае апалчэнне ўсіх 8 сотняў — Верхняга горада, Падзвінскай, Узгорскай, Епіскапскай («Уладычнай»); Задунаўскай, Зарэцкай («Зарачанскай»), змешанай («Зарэцкая і Верхняга горада») і «Зарэцкай Русі». Сярод абаронцаў было 42 пушкары. Усяго ўзброеных мяшчан было 4—5 тыс. чалавек.

Асаджаныя адмовіліся ад пасіўнага сядзення ў аблозе і рабілі «вылазки из города частые». Шарамецеў даносіў цару, што на яго ратнікаў «выходят пешие люди с рогатины и с топорки и бердыши». Атакі пяхоты падтрымлівала мяшчанска-шляхецкая кавалерыя. Актыўна дзейнічала гарадская артылерыя. 27 жніўня Шарамецеву было загадана «под Витебском промышлять подкопом и зажогом и зговором и разными военными промыслы, а приступать не велено, для того, чтоб в служилых людях истери не учинить». Шарамецеў неаднаразова імкнуўся пачаць перамовы з віцяблянамі, якія толькі адцягвалі час і спадзяваліся на дапамогу. Абаронцы горада выставілі «пункты», на аснове якіх можна было весці гаворку пра здачу ўмацаванняў. Гэтыя «пункты» Шарамецеў накіраваў цару. Праз некаторы час ваявода дакладаў: «Витепские, государь, сидельцы про здачю города нам, холопам твоим, отказали, а приступать без твоего государева указу не смеем, а подкопщиков немецких и русских людей никого нету, а де зажегу у нас, холопей твоих, приготовлено щиты и возы с соломою из смоляными дровами, и бочки смоляные, и зажегу некоторыми меры не уметь, потому что в день и в ночь беспрестанные дожди». З прычыны частых вылазак віцяблян пешыя стральцы, драгуны і салдаты стаялі «в шанцах... беспременно в день и в ночь». Іх падстрахоўвалі казацкія сотні. Было прынята рашэнне актывізаваць аблогу. Сюды тэрмінова накіравалі «великую пищаль верховую «Скворец» з 10 вогненнымі, 10 нараднымі ядрамі і 16 гранатамі, а таксама яшчэ адну сценабітную гармату. Над горадам загадалі «промышлять всякими промыслы накрепко, из верхового норяду снарядами стрелять и город зажигать, а где обыскав худые места и на те места велено приступать». У верасні войска Шарамецева спрабавала штурмам узяць горад, але віцябляне «отсиделись и устояли». У канцы кастрычніка 1654 г. пад Віцебск падышлі новыя царскія палкі «иноземного строю». Агульная колькасць войска дасягала 20 тыс. У Віцебску пачаўся голад, ад якога «немало людей посполитых и черни умерло». Ратуючыся ад голаду, шмат народу «из замков, с парканов и города перешло в Московское войско и присягнуло». Тым часам абаронцам не хапала нават пораху. 22 лістапада бязлітасным штурмам горад быў захоплены. Многія абаронцы Віцебска трапілі ў палон і былі раздадзены баярам. Частка шляхты, якая адмовілася прысягнуць цару, была саслана ў Казань.

Цар Аляксей Міхайлавіч.

Новыя гаспадары горада ў першую чаргу правялі інвентарызацыю гарадской маёмасці і ўмацаванняў. Апісанне горада і таго, што засталося пасля ваенных дзеянняў, захавалася ў «Сметных книгах» Віцебска за 1655 і 1665 гг. Тады ж ваявода Я.Валконскі склаў для цара «Чарцёж места Віцебска» 1664 г., які з'яўляецца унікальнай крыніцай для вывучэння архітэктуры, планіроўкі і забудовы горада 2-й палавіны 17 ст. Асобая ўвага на плане нададзена абарончым умацаванням Віцебска, працягласць якіх на той час склала больш за 3500 м.

За перыяд з 1656 па 1665 г. замкавыя ўмацаванні былі нанова адбудаваны. Цікава, што частку з іх узвялі з разабраных вежаў і сцен Суражскага замка, сплаўленых па Дзвіне. У пачатку 1656 г. пабудаваны «новый острог и 5 башен» уздоўж Віцьбы да Заходняй Дзвіны. Абарончы комплекс уключаў 28 вежаў, 4 «бычкі», 2 брамкі-форткі; 36 гармат, 128 пішчаляў заціннных, 2 шмакаўніцы. Сістэма абароны Віцебскіх замкаў уключала таксама групу сажалак: замкавую, манастырскую і мяшчанскую. У сістэму абароны Узгорскага замка ўваходзіў драўляны млын на р. Віцьба.

У 1667 г. паводле Андросаўскага перамір'я Віцебск вернуты Рэчы Паспалітай. Улічваючы гаротнае становішча гараджан пасля вайны, кароль Ян II Казімір Ваза (1609—1672) сваёй граматай ад 28.5.1667 г. вызваліў іх ад усялякіх падацей на 4 гады і дараваў вечную амністыю за 13-гадовую адданасць маскоўскаму цару. У 1676 г. Ян III Сабескі (1629—96), а ў 1697 г. Аўгуст II Моцны (1670—1733) пацвердзілі ўсе папярэднія правы і прывілеі Віцебска: «Города нашего Витебска, приравненного во всех прерогативах со столичным Вильно, все привилеи и права перед Унией оному выданные с согласия всех сословий подтверждаем...».

Канчаткова разарылі гараджан падзеі апошняй чвэрці 17 ст. У выніку пажару 16.9.1680 г. выгараў «самый город, 4 церкви, ратуша и лавки». Навадненнем 1686 г. была знесена і затоплена значная колькасць дамоў на пасадах. Пасля моцных маразоў зімой 1695—96 гг. пачаўся голад, павысіліся цэны на харчаванне.

На пачатку Паўночнай вайны 1700—21 гг., у 1701 г. ў Віцебску размясціўся генеральны штаб рускай арміі і частка яе войскаў. Аднак у ходзе ваенных дзеянняў віцябляне падтрымалі Станіслава Ляшчынскага (1677—1766), саюзніка шведскага караля Карла XII. Гэта выклікала незадаволенасць Пятра I, які загадаў спаліць горад. 28.9.1708 г. карны атрад калмыкаў на чале з капітанам Салаўёвым выпаліў горад і слабоды, зруйнаваў 4 касцёлы і 12 цэркваў. У 1719 г. Віцебск яшчэ не быў адноўлены. Пажары 1733, 1752 гг. і 2 пажары 1757 г. ў чарговы раз разарылі горад. Замкавыя ўмацаванні з таго часу больш не аднаўляліся. Зменшылася колькасць гараджан, паслабілася гандлёвае значэнне Віцебска. Кароль Аўгуст III (1696—1763) з мэтай паляпшэння развіцця гарадской эканомікі ў 1735 г. зноў пацвердзіў усе правы і прывілеі Віцебска. 12.12.1738 г. сваім прывілеем ён дазволіў заснаваць у горадзе купецкую думу і зацвердзіў яе Устаў. З гэтага часу ніводзін мешчанін «не приписавшійся к купеческой думе и не принесшій присяги, не смел торговать и продавать, под страхом лишения товара». Частка канфіскаванага тавару павінна была паступаць у каралеўскую казну, астатняе — на карысць віцебскага магістрата і купецкай думы. 17 артыкулаў Устава думы ўстанаўлівалі правілы гандлю ў горадзе. У 1760 г. кароль выдаў прывілей віцебскім рамесным цэхам і зацвердзіў іх статут. Разам з

тым цэхі былі абавязаны выконваць усе гарадскія павіннасці і ўтрымліваць прымацаваныя да іх храмы.

У 14—18 ст. у Віцебску дзейнічалі школы, заснаваныя пры праваслаўных, каталіцкіх, пратэстанцкіх храмах і манастырах. У 2-й палавіне 16 ст. на тэрыторыі Ніжняга замка побач з царквой Дабравешчання кальвіністы пабудавалі збор, багадзельню, заснавалі вучылішча. З 1639 г. ў горадзе пасяліліся езуіты, якія ў 1640—44 гг. (паводле іншых звестак у 1649) пабудавалі з дрэва касцёл. Пры касцёле адчынілася езуіцкая школа, у якой у 1646 г. выкладалі 2 магістры, існавалі класы «інфіма» і «граматыка», пазней — клас «гуманіора» (1649). У 1654—67 гг. езуіцкія касцёл і калегіум былі зачынены. Пасля 1668 г. для школы быў пабудаваны асобны будынак, з 1676 г. дзейнічала музычная бурса. У 1682 г. калегіум узначаліў рэктар (раней установа кіравалася віцэ-рэктарамі). Будынкі калегіума значна пацярпелі ад пажараў 1708 і 1752 гг. З 1756 г. (паводле іншых звестак з 1753 г.) пры езуіцкім калегіуме дзейнічала семінарыя для дзяцей збяднелай шляхты, друкарня, аптэка (з 1697).

У 1768 г. жыхар Віцебска С.Аверка склаў Віцебскі летапіс (на польскай мове; на аснове летапісу М.Панцырнага, гістарычных запісаў Чарноўскіх і Г.Аверкі).

У 1772 г. паводле 1-га падзелу Рэчы Паспалітай Віцебск далучаны да Расійскай імперыі.

Літаратура: Летопись Быховца // Полное собрание русских летописей. Т. 32. М., 1975; Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 3. СПб, 1891; Полоцкие грамоты. Вып. 3. М., 1980; Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской... Вып. 21. Витебск, 1891; Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Т. 1, 4, 5. Витебск, 1883—88; Брэжго Б. Замкі Віцебшчыны. Вільня, 1933; Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1987; Живописная Россия. 2-е изд. Мн., 1994; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1994.

Т.С.Бубенька.

Дакументы сведчаць

ПРЫВІЛЕЙ КАРАЛЯ АЛЯКСАНДРА, НАДАНЫ ВІЦЕБСКІМ ПАНЦЫРНЫМ БАЯРАМ 8.7.1503 г.

10.6.1690 г.[1]

На роках судовых земских о Светой Троицы святе рымском прыпалых и судовне на мейсцу звыклом, в замку господарском витебском отправуючых, перед нами, Самуелем Староселским, Судьею, Яном Дырмонтом Сивицким, подсудком а Львом Гурком, писаром, врадниками судовыми земскими витебскими, ставшы очевисто у суду бояре панцырные воеводства Витебского на име Корол Иванович Лях, Аниска Лешкович Козел, Захарей Уласович, Тарас Ескович, лист прывилей светобливое памети короля его милости Александра всим бояром панцырным воеводства Витебского, на речь в нем описаную ку актыкованью положывшы, просили, абы до книг земских Витебских вечыстых был уписан, который уписуючы до книг слово от слова, с початку и до конца, так се в собе мает: Александер, Божею милостью Король полскій, великій князь Литовскій, Рускій, княжа Пруское Жомойтскій и иных, наместнику Витебскому пану Юрью Глебовичу. Жаловали нам тые видбляне Федько з братею Селятиничы, Афанас Артемович а Грыдко Михалкович, а Ивашко Ескович, а Андрей Веков, Ахром Палоневич а Тимофей Муковесович, и брат его, а Борис Васкович, а Иван Александрович, а Иван Зубов, а Федко Вистевич на подвойских Витебских, штож дей они крывды им делают и новины уводят, у подводы выдают под твоих намесниковых слуг и теж дей коли выежджают на нашу службу и Подвойские дей их роздают твоим слугам у послугу и теж дей дают их до кухни в послугу и прыставляют дей их кони водить и ясли робити и лазни топить, а здавна дей того не бывало, деды их и отцы их и они сами тою службою не служывали, ниж ли дей за отца нашого Короля Его милости тыеж Подвойские почали были им тые новины уводити и отец наш писал о том до пана Ивана Ильинича, как от его млсти Витебск держал, абы ся о том доведал и естлибы то им была новина и его млсть казал то им отложити и пан Иван о том ся достаточне доведавшы и тые вси новины зася им отложыл, а казал им конем и доспехом служыти по давному и лист свой на то им дал и оны тые листы отца нашого, Короля его милости и пана, и панов Ильинича перед нами покладали и били нам чолом, абыхмо им на то наш лист дали и мы им на то сесь наш лист дали, ненадобе им всих тых верху писаных новин знати, нижли они мают нам служить конем а доспехом, как же за великого князя Витовта и Жыкгимонта и за отца нашого Короля Его милости служыли и тым бы прыка-

зал Подвойским под виною нашою, абы им во всем в том дали спокой подлуг листов отца нашого Короля Его млсти и пана Иванова Ильлинича и теж жаловали нам тые ж Витбляне, што ж дей ты крывды им чыниш и новины уводиш, кажеш дей им посощыну нашу поспол с тяглыми людьми и куницы свадебные платити и дрова па послы возити и петцов стеречы и в ловы на медведя с каждого дыму ходити и в том дей их прыдаеш и поклоны великие на них береш, а оны дей здавна, за продков нашых, ничого того не знали, про тож штобы еси о том доведался, и если то будет им новина, приказуем тобе, иж бы еси тые вси новины им отложыл и дал бы еси им в том спокой, бо мы никому не велим новин уводити, а старыны рушыти. Писан у Вильни Июля осмого дня индикта шостого. У того листу привилею печать Его Королевское милости прытиснена ест, ку тому тыми словы подписано ест: пры том был Маршалек наш Дворный пан Ян Юрьевич а подканцлерый великого князства Василей Елинскій. Который же тот лист прывилей Его Королевское милости, за покладанем и просбою вышей помененых особ, бояр панцырных до книг земских Витебских вечыстых ест уписано.

---

[1]Пад гэтай датай прывілей запісаны ў актавай земскай кнізе Віцебскага ваяводства.

Друкуецца па кн.: Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске. Вып. 2. Витебск, 1871. С. 229—231.

ПРЫВІЛЕЙ КАРАЛЯ АЛЯКСАНДРА ЎСІМ БАЯРАМ І МЯШЧАНАМ ВІЦЕБСКІМ НА НЕКАТОРЫЯ ПРАВЫ І ВОЛЬНАСЦІ ІХ

16.7.1503 г.

Сам Александр Божію милостію Король.

Чиним знаменито сим нашим листом, хто на него посмотрит, або чтучи его услышит, нынешним и потом будучим, кому будет потреб того ведати: били нам чолом вси Князи и бояре и слуги Витебскіе, и войт и мещане места Витебского, и вся земля Витебская, и поведили перед нами, штож пришодши злодеи з великого Новагорода, покрали у них церков Пречистое Богоматери, и в той церкви и привилей их украли, которыйжо они от отца нашого Короля его милости мели, и копію того привилея перед нами клали и били нам чолом: абыхмо им наш лист привилей по томуж дали; ино мы з ласки нашое за их к нам верную службу пожаловали есьмо их тим, дали им наш лист по томуж, как отец наш Король его милость дал был: штожь нам, в домы церковныи, в дом Божій светое Богородицы, и в дом Божій Светого Духа, и теж в дом Божій Благовещенія Пречистое и в иные церкви не вступатися; и в купленины, которыи будут куплены с нашим дозволеніем, и в безотчины и в отмерщины Витебскіи тежь не маем вступатися, и жон их силою замуж не давати, а который Витблянин, умирая, откажет остаток своего именія кому, и в то нам не вступатися, а и в подводы копей у городских людей и у посельских путных не брати; а холопу и робе веру не няти а о обиде исправа дати; а продков наших великих Князей судов не посуживати, чинити нам с Витибляны по испросу, а без исправы Витблянина не казнити, а своих судов, судивши, не посуживати; а вина нам прыйдет, ино нам их по вине казнити; а чолом битіе нам у Витблян прыймати через поруку, в железа их не засажаючи, а ни в которую муку, а отчин у них не отнимати; такежь и в села их куплены и в поля не вступатися и на заочное поведаніе не верити; а кто имеет нам их обмовляти, того нам Витбляном объявити, а в заставу нигде Витблян не сажати; а на войну быти им с нами поспол готовым; а по волости по Витебской воеводе нашому не ездити, а поедет в ловы, ино его по станом не дарити. А станется у котораго Витблянина татба, а доищутся татбы лицом, ино Витблянина вся татба лицом вернути; а того лицом не доищутся, которое татбы, ино истцу с татиного дому жоною его и детьми заплатити его гибель, а в том тати мы вольны; а не будет у татя чим платити татбы, ино его истцу выдати, и где его всхочет, там его денет; а сябров городских в пригон наш не гнати, а ни в подводы, а ни в ловы. Такеж и в весы Витебскіи, а ни в локоть нам не вступатися, и коли который Витблянин в весех проступил або в локти, ино Витбляном самим казнити по своему праву, а нам в то не вступатися; а у котораго Витблянина загудят воск в Ризе, або инде, а пріедет до Витебска, ино Витбляном самим казнити виноватаго, а нам в то не вступатися; а Витбляном наших рек або озер не таити, а хто потаит, ино нам тих карати а Витбляном не даритися никому. Также есьмо им и мыта отпустили по всей отчине нашой вечно, и еще пожаловали есьмо их, придали им на садибу и на выгон Койтин вор, а Михайловскій вор, а Заручевскій вор. Теж, которыи Витбляне межи собою побіются, а за Детским поеднаются, ино нам куница шерстію с міpщины; а коли о чом посворатся а выдадутся в кольце оба, то вина на нас; а выдаст ся один, а другій не выдастся, за то их нам не казнити, а за закладную куницу на нас брати по

десеть грошей, а борцу по два гроши. Такеж децковане от рубля по чотыри гроши, а на милю по грошу. А владычиному слузе и боярскому по томуж децкованіе. И теж владыце на попех Витебских зборная куница шерстію. Такеж и нам давати воеводу по старому по их воле, и который им будет нелюб воевода, а вмовят его перед нами, ино нам воеводу им инаго дати, по их воли; а пріехавши воеводе нашому первого дня к Витебску, целовати ему крест к Витбляном на том, штож без права их не казнити по вадам ни в чом; также Витбляном жити в Витебску добровольно всякому по старому, покуле хто всхочет; а которому будет Витблянину от нас насильно, а будет ему нелюбо, нам его силою не держати, ино ему путь чист, куды хочет безо всякое зачепки; а пойти ему прочь в нашу отчину в Литву не тайно, светому Благовещенію чолом ударивши и нашому воеводе объявився и своей братіи мужом Видбляном, а во своем имени волен во всем: идя прочь продаст, або откажет, нам в то не вступатися. Такеж который от насилія жаловати будет нам Видблянин на Видблянинажь, приехав в Литву и без истца, нам на него децкого з Литвы не слати, давати ему нам лист к нашому воеводе, хотябы о смертной вине, а ему судити по целованію нашим судом досмотрети права, Князи и бояры и мещаны; а осудивши его, казнити в Витебску по их праву; тежь который будет Князь, або боярин, або слуга, або мещанин, што выслужил на предках наших, великих Князех, того нам у Витблян не отнимати по грамотам тих Князей, а у местицов Витебских з города Витебска не вести вон; также которыи будут Литвин або Лях крещены были в Витебску в Рускую веру, а хто из того роду и тепере живет, того нам не рушити, права их христіанского ни в чем не ломити. А на то на все дали есьмо им сесь наш лист твердо и вечно и печать нашу казали есьмо привесити к сему нашому листу. Писан в Вильни, в лето 7011, месяца Іюля 16 день, Индикт 6. (1503). При том был Бис. Вил. Кнз. Войт: а Воев. Вил. Кан. Пан. Миколай Радивилович.

Друкуецца па кн.: Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Витебск, 1883. Т. 1. С. 34—36.

УРЫВАК З ПРЫВІЛЕЯ КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА ІІІ ВАЗА НА ВОЛЬНАСЦІ МЯШЧАНАМ КОННЫМ ВІЦЕБСКІМ

1593 г.

«...били нам чолом мещане и все посполство места нашого Витебского, абыхмо им тые вси права, волности их, од продков нашых наданые и утвержоные, листом нашым потвердили, а иж теж некоторые з них кгрунты и оселости свои на службе конной под собою маючы, с тых земль своих службу земскую военную, поспол з шляхтою, обывателми воеводства Витебского, под хоругвью повятовою служат;...»

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске... Вып. 1. Витебск, 1871. С. 317—318.

АДПІСКА ПАЛКАВОГА ВАЯВОДЫ Ю.І.РАМАДАНАЎСКАГА НА ЦАРСКІ СТАН У ВЯЗЬМУ ПРА ЗДАЧУ ВІЦЕБСКА РУСКІМ ВОЙСКАМ

Не раней 18.11.1654 г.

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичю, всеа Великия и Малыя России самодержцу, холоп твой Юшка Рамадановской челом бьет.

В нынешнем, государь, в 163 году ноября в 17 день к Витепску приступали и милостью, государь, божию и пречистые богородицы помощию и московских чюдотворцов молитвами и твоими, государя царя и великава князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя России самодержца, и сына твоего, государя нашева, благовернаго царевича князя Алексея Алексеевича счастьем, два острога до Витепки реки взяли. А в верхнем, государь, каменном городе и в деревянном заперлися шляхта и мещаня и, бився, просили у тебя, государя, милости, чтобы им твоя государская милость была против их пунктов, на чем им твой государев указ Офонасей Нащокин привез.

И по твоему государеву указу боярин и воевода Василей Петрович Шереметев с товарыщи твой государев указ им сказал, на чем ты, государь, жаловал их против пунктов. И витепские, государь, шляхта и мещаня тебе, великому государю, добили челом и Витепск верхней каменой и // деревяной город здали. И твои, государь, ратные люди в Витепск в каменой и деревяной город вошли ноября в 18 день. А под Сурож, государь, и под Велиж твои, государь, ратные люди пойдут вскоре.

Друкуецца па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 323—324.

Сярэднявечнае права на самакіраванне

17 сакавіка 1597 года вялікі князь ВКЛ і кароль польскі Жыгімонт III Ваза падпісаў грамату, паводле якой Віцебск атрымаў магдэбургскае права. З гэтага часу эканамічная дзейнасць гараджан, маёмасныя правы, грамадска-палітычнае жыццё, саслоўнае становішча пачалі рэгуляваць ўласнай сістэмай юрыдычных норм.

Гораду былі нададзены герб з выявай Спаса Збавіцеля, харугва (сцяг), пячатка, права штогодняга кірмашу, дазвалялася пабудаваць ратушу і гасціны двор.

Былі праведзены выбары магістрата — органа гарадскога самакіравання, незалежнага ад ваяводы. Магістрат з'яўляўся распарадчым, выканаўчым і судовым органам. Яго ўзначальваў войт, прызначаны вялікім князем. Войт, у сваю чаргу, зацвярджаў абраную гараджанамі калегію выбаршчыкаў (райцаў, радцаў). Магістрат складаўся з рады і лавы. Рада ажыццяўляла функцыі гарадской улады, збор падаткаў, арганізацыю выбараў, адказвала за гарадскія даходы і зямельныя ўчасткі, наглядала за гандлем, устанаўлівала цэны, у прыватнасці на хлеб. Лава — судовы орган па крымінальных справах гараджан.

У гарадскую раду выбіраліся бурмістры і райцы, у лаву — лаўнікі. У 1597 г. ў магістрат уваходзілі войт, лентвойт, 4 бурмістры, 7 райцаў, 8 лаўнікаў. Паседжанне рады праводзіў адзін з бурмістраў, лавы — войт альбо лентвойт, які выбіраўся гараджанамі са свайго асяродку. Бурмістраў і райцаў выбіралі штогод, лаўнікаў — на больш доўгі перыяд.

У сярэдзіне 17 ст. магістрат Віцебска валодаў 8 вёскамі, жыхары якіх выконвалі на карысць горада розныя павіннасці: прадастаўлялі падводы, рамантавалі вуліцы, плацілі аброк.

У 1597 г. была пабудавана першая драўляная ратуша, у якой і размясціўся магістрат, а вакол ратушы пачаў фарміравацца цэлы гандлёвы комплекс: гасціны двор, гандлёвыя рады, склады, вагі. Плошча перад ратушай стала называцца Рынкавай. Тэрыторыя за ратушай — Біржай, бо там адбываліся ўсе гандлёвыя аперацыі.

Магдэбургскае права — права самакіравання, пэўнай аўтаноміі і незалежнасці ў дзяржаве. Самакіраванне ўмацоўвала эканамічны стан гарадоў, таму ўрад Вялікага княства Літоўскага спрыяў яго распаўсюджванню.

У 1597 г. Віцебск далучыўся да гарадоў Еўропы, якія кіраваліся магдэбургскім правам: Лейпцыг, Вена, Гановер, Кельн...

У Вялікім княстве Літоўскім магдэбургскае права яшчэ ў 14 ст. атрымала сталіца краіны Вільня (1387), а таксама Брэст (1390) і Гродна (у 1391 г. няпоўнае, у 1496 г. поўнае). На Віцебшчыне — Полацк (1498), Браслаў (1500), Дзісна (1569), Ула (1577), Друя (1618), Орша (1620), Бешанковічы (1634), Ушачы (1758).

Магдэбургскае права Віцебска адменена ў 1623—44 гг. і 1775 г. *С.М.Кавалеўскі.*

Дакументы сведчаць

ГРАМАТА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА III ВІЦЕБСКІМ МЯШЧАНАМ НА МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА

17.3.1597 г.

Жикгимонт третій, Божьею милостью король Польскій, великій князь Литовскій, Русскій,Прусскій, Жомойдскій, Мозавецкій, Инфлянцкій, а Шведскій, Кготски, Вандалски дедычны король. Ознаймуем сим листом нашим всим вобец и каждому зособно, нынешним и напотым будучим, кому бы то ведати належало, иж славутные мещане конные посельскіе и все поспольство места нашого Витебского, маючи з давных часов великіе вольности од продков наших, королей их мости Польских и великих князей Литовских им наданые, а не маючи только права Майдебурского и будучи под присудом замку нашого тамошняго, не могли к досконалому порадку и розширеню того места нашого прывести и розмножыти; и били нам господару чолом, вси огулом, через посланцов своих, абы есмо для лепшого размноженя того места украинного и в нем порадку, прикладом продков нашых, вызволивши их от вшелякой владзы и зверхности вряду воеводского замкового и иншых врядов земских, право Майдеборгское им надали и привилеем нашым утвердили. За которыми и их милость панове рада

и врядники наши обоего народу, на теперешнем сойме вальном при нас будучіе, и пан воевода Витебски, вельможны Миколай Сапега, через лист свой, сталую верность и подданство их, а звлаща, под часом валки с непріятелем, великим князем Московским, продком нашым и речи посполитой отдаваные, перед нами залецаючи, в причине за ними нас жедали, указуючи то, иж мещане и обыватели места тамошняго, кгды тое право з ласки нашое одержать, не только стан свой лепшим учинити, але теж кгды ся размножат и в маетности запомогутся, и место нашо тамошнее, яко пограничное (на котором нам и речи посполитой немало залежит), за часом лепей и досконалей обваровоно и в большую безпечность противо каждого непріятеля прыведено мети могут. А так мы господарь видечи то, иж высокій маестат монархов и княжат звытяжством валк бывает подвышон, але тежь с постановленя прав и справедливых устав до разширенья панств и помноженья всего добраго приходит (бо добрая устава справедливости всих мест ненарушоный есть фундамент, и тою самою за малых великіе и славные места с оздобою и пожитком речи посполитой уростають; а где зась порадных устав и права писаного варовнаго обыватели не мають, там для самаго непорадку, великіе и можные места до згубы и знищенья приходят и в нивошто ся оборочают); за чим теж з особливое ласки нашой господарской, хотячи стан и кондецыю тых мещан наших Витебских лепшую учинити и з иншими месты нашими головными, так в короне Польской, яко и в великом княжестве Литовском поровнати, за причиною их милости панов рад и врядников наших, тое место Витебское, яко у своих границах заложено есть и теперь ся мает, и всих огулом обывателев места того в месте и на предместю и в фольварках по селах мешкаючых, со всеми их добрами, подданными, маетностью и належностями, с права земского князства Литовского, от всякое юриздикцыи и моцы судов головных трибунальных, также з моцы всих воевод Витебских из моцы инших всяких воевод, каштелянов, старост, державцов, врядов земских и инших преложоных и децких выймуем и вылучаем и вечне вызволяем, а поддаем их праву и суду Майдеборскому и уставляем то, иж мещан места Витебского нихто иншый судити и владзы над ними мети не будет, только войт сам сполне с бурмистрами, райцами[1] и лавниками[2], водлуг способу и порядку права Майденборгскаго и прикладом инших мест нашых судити их будут. А войта мы и потомкове нашы, короли Польскіе и великіе князи Литовскіе, з народу шляхетского, веры хрестіанской и повшехной, яко право Майдеборское давное указует, ведле воли нашое подавати им будем: ведже каждый войт, по упривилеванью нашом або потомков наших, от вышняго до найменьшаго стану шляхетскаго (заровно в том почитаючи) первей присягу на отправованье судов и на то, иж месту жичливый, право в целости задерживати, згубы перестерегати и о помножене и разширене посполитого доброго меского старатися будет выконати, а потом врядом войтовским владнути мает (якош вже дали есмо тое войтовство земянину нашему воеводства Витебского, урожоному Юрью Летецкому, до живота его). На которое войтовство дали есьмо и село Коровайно, яко перед тым належало, и прежніе войтове то держывали и теперешній вже в держаню своем мает, так и в час пришлый тое село со всеми принадлежностями и пожитками, и все то, што прежніе войтове держывали и яких кольвек пожитков и доходов уживали, на тое войтовство Витебское вечными часы фундуем и утверждаем. Которому войту нашему теперешнему и потом будучым даем во всех крыминалах и в инших судах и во всех справах головных и поточных зуполную моц водлуг описаня права Майдеборского судити, сказывати и винных карати. До того, войту Витебскому лантвойта постановити позволяем, под правом тамошним Витебским местским оселого. Обыватели теж Витебскіе месскіе бурмистров, райцов и лавников водлуг порядку права Майдеборского и звычаев места нашого столочного Виленского и иншых мест нашых обирать и войту нашему тамошнему оказывати повинны будут; а войт особ на тые вряды водле права Майдеборского обраных присяги выслухати, и до себе на суды их пріймовати, и з ними справы судовые он сам, або лантвойт его порадком права Майдеборского отправовати мает; а мещане и все поспольство места Витебского и всякіе речи кровавые и поточные перед тым врядом войтовским Витебским каждому жалобливому усправедливятся и за наказом судовым досыть чинити повинны будут, а ветьже не иншым правом, одно водлуг артыкулов и писания права Майдеборского, яко ся вышей поменило. А естли бы ся кому кольвек суд вряду местского с крывдою быти видел, таковому каждому вольно будет до нас господара и до потомков нашых за двором апеллевати: ветьже и на дворе нашем тым же правом Майдеборским сужоны быти мають. А кгды бы войт в судех важных, сам, або из иншыми врядники, не з особы, але з уряду своего крывду кому учинили, тогды за позвом нашым, будуть повинны перед нами господарем становитися и водлуг права Майдеборского усправедливятися, певным роком от положенія позву нашого (если в короне Польской, то за сем недель, а если в великом князстве Литовском будем, за чотыри недели). Герб надаем месту нашому Витебскому, в блекитном полю

образ Спаса Збавителя нашого, и прытом зараз трохи нижей меч голый червоны, што ся мает разуметь кровавый, и таковогож гербу печать тому месту надаем и утверждаем, и в сем листе нашом вымалевать его есмо казали; которою печатью вряд оного места листы у судах и в инных справах и потребах месских печатовать, и того гербу тое место уживати мает вечными часы. А ижь тежь места нашы упривильеванные для оздобы местское и хоругвы мають; ино мы теж и тому месту нашому Витебскому межи иншыми оздобами и тот клейнот хоругов, под тым же выше мененым гербом надаем и у вечные часы утверждаем; мають мещане Витебскіе тое хоругви за справою вряду меского войтовского уживати, и под час посполитого рушенія и потребы военное при хоругве земской Витебской с хоругвою своею месскою становитися, и никоторых незгод и разрозненя не уживаючи, теж хоругов земскую поветовую и стан рыцерскій шляхетскій в звыклом пошанованю и учтивости маючи отпор непріятелю зодного давати. И людем ремесленным, каждому цеху свою хоругов в том месте нашом Витебском за справою и ведомостью враду меского мети позволяем и вечне утверждаем. А штося дотычет вин и судов права Майдеборского в том месте, так ховать уставляем, яко тое право Немецкое Майдеборское учит. Отчизны их, фольварки, именя, села, поля месскіе и пущи, здана мещаном Витебским належачіе, тых яко хто чого перед тым уживал, так и на вси потомные вечные часы уживати мает под правом Майдеборским и зверхностью враду тамошнего Витебского месского. Ктому теж крамницы и коморы для складаня речей и товаров, так теж ятки мясные, пострыгальню, торговое, перевоз на реке Двине и на Лучосе, лазню месскую на пожиток того места збудовати вольность надаем, дом теж гостинный для людей пріезджих купецких, з вагою мескою, водле первшого давнего звычаю их, и померное от збожья всякого под справу и присуд месскій на пожиток того места прылучаем и поддаем вечными часы. До того, яко с давных часов, от предков наших, королей их милости Польских и великих князей Литовских обыватели места Витебского мают привилья им наданые, которыми их на вечные часы от мыт всяких во всих панствах нашых вольными учинено, которое вольности они и до сих часов спокойне уживают; тогды и мы тым теперишним прывильем продков нашых и водлуг ужываня их, от плаченя мыт старых во всих панствах наших, в короне Польской и великом князстве Литовском и в земли Лифлянской, в местех наших, князских, панских, духовных и свецских, и в дорогах, купцов места вызволяем и вольность им в том здавна наданую утверждаем. Ку тому теж вси пожытки и доходы тому месту Витебскому здавна належачые, которых они и до сих часов в ужываню были, и которые од воевод наших Витебских и наместников их на них над права и вольности их вытяговано и из мусу брано, яко струговое, чолновое, возовое, узвестки и квитовое, когды за границу едут, у Витебску, на Лучосу, у Суражу и на Велижу, так теж и тые, которые властне брать належало, яко пересуды, вины и вси иншые пожытки и доходы, теперишним листом привильем нашим им вечне даем и утверждаем; мають они тых всих пожитков, в том привилью нашом помененных, яко тых, которых в держаню до того часу были, так и тых, которые и на потом прибавити могут, на врад мескій войтовски и ку ратушу на пожиток мески Витебски уживати на вси потомные часы; а зато мещане места Витебскаго ратуш к оздобе месской збудовати и фундовати повинны будуть и на улицах месских, гдебы кольвек потреба того была, мост мостити або бруковати и опатривати мають, за справою и дозором тамошнего вряду меского.

А иж пречечоное место наше Витебское, с давных часов, од продков нашых, межы иншыми вольностями и то обваровано мает, же князем, паном шляхте мещан своих в месте Витебском невольно мети, тогды и мы яко пры всих вольностях, так и прытом праве их в целости заставуючи, утвержаем и вечными часы мети хочем, абы нихто вшелякого стану людей од вышшаго до наймнейшаго стану в помененом месте нашом и предместіях собе не привлащал и не мел: бо многыми юриздикцыями и зверхностями места нищеют. Якож и мы, по дате сего привилея нашого, никого и никоторых добр от юриздикцыи меское Витебское вылучати и вызволяти немаем, и никому жадных привилеев з уймою владзы и зверхности вряду тамошнего и доброго посполитого меского давати не будем; а хотя бы хто и одержал от нас привилей, сему привилею нашому противный, тогды таковый никоторое моцы в кождом суде и местцу мети не мает, але сесь привилей наш яко во всем, так и в том помененном артыкуле моцно держан быти мает. А кгды бы который шляхтичь, од вышшого до мнейшого стану заровно в том почитаючи, оселость в месте Витебском, або на предместью набыл, тогды с тою оселостью не иншому, але тому праву и юриздикцыи вряду меского тамошняго во всем подлегати, и всякіе повинности заровно со всими обывателями выконывати повинен будеть. Естли теж люде розных станов духовных и светских яким кольвек способом в том месте нашом Витебском и на предместях оселости свои мают, и которые теж купецтва, альбо ремесла, альбо торгов меских уживають; тогды, будучи под тым правом Майдеборским, заживаючи и ве-

селячися з него, под вси тежары мескіе подлегати и заровно з иншими мещаны нашими тые тежары и оборону против непріятеля выконывати мають. А надто, к пожитку и розмноженью их, надали и утвердили есмо в том же месте Витебском ярмарок годовый один, на день святаго Петра, свята Римского, который чрез чотыри недели трвати мает; и на том ярмарку всякого стану люди, наши и чужоземцы, так тые, которые торговати, то есть товары продавати, яко и тые, которые куповати будут, никоторых мыт и цел нашых и жадных инших никому давати не мають и повинны небудуть. На тот же ярмарок позволяем им мети склад, сто медниц меду, разсытивши, добровольне и безмытне вышинковать. Торги теж кождого дня вольно им мевать, окром свят урочистых и недели, и тые водле обряду и звычаю костела Римского без отправованья работ и торгов к ушанованью отправовать приказуем. Якож всим, якого кольвек стано людем купецким, фурманом и каждому пріезжому, откуль кто кольвек до того места Витебского с товарами на торг альбо на ярмарок пріедет, даем вольность продавати, куповати, заменяти и з них вольно и безпечно отъезжати, отдавши и поплативши повинность мескую, окром таковых людей, которые бы там, пріехавши, якого злочинства заживали, и за тым товарыства межи людей добрых мети годными небыли: тые таковых прав вольностей от нас наданых уживати немают. Ведьже купцы приезджіе не обчим купцом, только купцом обывателем места Витебского всякіе товары огулом продавати мають; а они, зась, купцы Витебскіе каждому обчому, и насторону, также и в месте порозну тыеж товары продавати будуть. Гости пріезджые купцы нигде инде, только перед войтом и врядом местским тамошним судитися, и справы свои отправовати, и кождому укривжоному управедливятися повинны будуть о всякіе выступки там у Витебску пополненные. А иж кождый врядник, для доскональшаго отправованья справ, вряду его належачих, спокойного мешканья потребует, и для того они покоем особливым посполите обваровываны бывають (яко тому ясные приклады в инших местах наших упрывильеваных суть): тогды и тому месту нашому Витебскому з ласки нашое варуем, иж на ратушу, также в домах войтовском, бурмистревских, райцов и лавников врядники наши, жолнеры гайдуки, слуги воеводскіе, врядовые и нихто з гостей пріезджих становитися немають, и никому господы у них з уряду записованы быти не могут; опрочь самое бытности нашое господарской. Жидове теж в том месте нашом Витебском ни яких оселостей водлуг давного звычаю мети не мают. Людей ремесленных, золотаров, кравцов, ковалев, котляров, резников, сыромятников, кожемяк, пекаров, гончаров, шевцов, теслев, кушнеров и инших всяких ремесленников от работы замковой вольными чиним. А подвод под посланцов наших яко пред тым недаивали, так и теперь давати немают вечными часы; а по выистью перемирія, под час непокою и валки с непріятелем панств наших великим князем Московским и противо кождого непріятеля обыватели места Витебского, водлуг стародавного звычаю, под справою войта своего будучи, оборону и всю повинность военную выконывати повинны будут; але под час покою и перемирія, на всякіе тежары к войне и небеспеченству належачіе они примушаны быти немають, и овшем в покою захованы будуть. Вилькер, то есть, способ порядку повинностей и инших розных справ к доброму посполитому мещаном нашим Витебским згодне з войтом намовити и установити позволяем, и по памовенью и установленью их держати и водле того ся заховати всим приказуем и утверждаем. А иж теж в том месте нашом Витебском мещане тамошніе до сего часу двух назвиск заживали, одны конными, а другіе поспольством ся называли и одны на других ся прекладали, про то мы им всим тое право Майдеборское надаючи, всих ровнаем, так, или вжо назвиск собе нияких невынайдуючи, ани одны на других не прекладаючися, вси одное кондицыи быти мают, яко и в инших местах наших упривильеваных. До выбиранья доходов меских тыеж присяжные врядники мескіе быти мають: с которых доходов и всих приходов и расходов меских, в кождый год, на день Нового лета водле календару Римскаго, личбу перед войтом и поспольством чинити повинны будут; а войт личбы выслухавши, з ведомстью поспольства их квитовати будет, и квитацыя войтова так яко и наша господарская важна быти мает. В котором-то праве Майдеборском от нас наданом, также и в инших всих вольностех от продков наших наданых и от нас господара поприсежоных, которых до сего часу в спокойном уживанью были и которые им тепер от нас наданы и утвержены суть, прежречоных мещан и обывателев места Витебского, счадков и потомков их, которые бы оселостей слушне потом там набыли, никого з них невылучаючи, але всих, огулом, в месте и на предместях мешкаючих, с кгрунты и фольварками их на селах будучими, вечне заховати хочем, и за потомков наших, королей Польских и великих князей Литовских обецуем и прирекаем. А воеводе нашому Витебскому тепершнему и на потом будучим, также врядником нашим земским, дворным, и гродским, а особливо судьям головным трибунальным и иншим всяким судьем и врядником нашим приказуем, абы пад тое право от нас месту Витебскому наданое, жадноя трудности мещаном Ви-

тебским не чинили, але вовсих тых вольностях и свободах здавна и тепер им наданых, таким порядком яко против мещан наших Виленьских и инших мест упривильеваных заховатися звыкли, абы и против их также ся спокойне заховали, для ласки нашое господарское. А для лепшое веры и певности тое речи, сесь наш привилей рукою нашою подписавши, печать нашу к нему привесити есмо росказали. Писан у Варшаве, на сойме вальном, лета от нароженья сына Божьего тысеча пятдевятдесят семого, месяца Марта семнадцатого дня, при бытности их милостей велебных в Бозе, ясновельможных и урожоных панов сенаторов наших духовных и свецких, также врядников земских и дворных короны Польской и великого князства литовского: Станислава Карнковскаго, арцыбискупа Гнезненьскаго; Яна Дмитра Суликовскаго, арцыбискупа Львовскаго; Юрія Радивила кнежати на Ольце и Несвижу, кардинала и бискупа Краковскаго; Берната Матеевскаго Луцкого и Берестейскаго; Вавринца Кгослицкаго Премыслскаго бискупов; Януша кнежати Острожскаго, каштеляна Краковскаго; Яна Фирлея с Дубровицы, воеводы Краковскаго, старосты Новоместского; Яроша Кгостомского, воеводы Познаньскаго;Крыштофа Радивила, кнежати на Биржах и Дубинках, воеводы Виленского, гетмана найвышшого великого князства Литовского; Яронима Ходкевича, каштеляна Виленьского; Юрія Мншика, воеводы Сендомирского; Яна Абрамовича, воеводы Смоленского, старосты Лидского; Феодора Скумина, воеводы Новогородского, старосты Городеньского; Крыштофа Зеновича, воеводы Мстиславского; Андрея Зборовского, каштеляна Бецкого; Миколая Жабридовскаго, маршалка великаго коронного, старосты Краковскаго; Яна Замойскаго, канцлера и гетмана короннаго, старосты Белзского; Льва Сапеги, канцлера великого князства Литовского, старосты Слонимского; Яна Тарновскаго, подканцлерого коронного и Габріеля Войны, подканцлерого великого князства Литовского, старосты Мерецкого; Яна Фирлея з Дубровицы, подскарбія земского коронного; Димитра Халецкого с Хальча, подскарбія земского великого князства Литовскаго, старосты Берестейского; Вавринца Кгенбицкого, секретаря коронного; Матея Войны и Яроша Воловича, писаров великого князства Литовского; Миколая Сапеги, Матея Буриминского, Александра Корвина-Кгонсевского, Доминика Обрынского, секретаров и иншых многих врядников и дворян наших.

Жыгімонт кароль

(М.П.)

---

[1] Райцы — саветнікі.

[2] Лавники — члены магістрата ў гарадах ВКЛ, ад польск. ławnik — засядацель.

Друкуецца па кн.: Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Витебск, 1883. Т. 1. С. 74—82.

АСОБЫ, ЯКІЯ ПЕРШЫМІ БЫЛІ ВЫБРАНЫ Ў РАТУШУ ПАСЛЯ АТРЫМАННЯ ВІЦЕБСКАМ МАГДЭБУРГСКАГА ПРАВА 17.3.1597 г., ПАВОДЛЕ ВІЦЕБСКАГА ЛЕТАПІСУ 18 ст.

«Войт Александр Корвин Сугосов, староста Велижскій, секретарь е.к.в.
Ландвойт Захарій Волк, мещанин Витебскій.
Бургомистр Иван Клыга.
Бургомистр Василій Сымонович, Велижанин.
Бургомистр Василій Ильинич Танко.
Бургомистр Иван Исакович Андроновскій.
Ратман[1] Константин Фомич Служаковскій.
Ратман Сергей Петрович Зафатай.
Ратман Лаврин Ходкевич Галуза.
Ратман Михайла Колес.
Ратман Фёдор Степанович Спица.
Ратман Осип Гаврилович Клыга.
Ратман Яким Юрьевич Шавра.
Заседатель Кузьма Иванович Комаса.
Заседатель Богдан Якимович Пекуча.
Заседатель Фёдор Симонович Вертошка.
Заседатель Богдан Сыдзкевич.
Заседатель Иван Гутор.
Заседатель Осип Никифорович Шавра.
Заседатель Иван Исакович Самуйлов.
Заседатель Данило Григорьевич Шулька.

Эти лица выбраны были из почетных мещан в ратушу, впервые городу данную, в царствованіе монарха, государя нашего милостивейшаго, Сигизмунда III, в 1597 году, месяца марта 17 дня».

---

[1] Ратман, радца, райца — выбарны член гарадской рады.

Друкуецца па кн.: Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Витебск, 1883. Т. 1. С. 473.

ЛІСТ-КРЭДЭНС А.ЖЫЛКУ НА ПАСАДУ РОТМІСТРА, НАДАНЫ 10.10.1753 г.

Року 1790, месяца студзеня 9 дня.

На пасяджэнні Яе імператарскай Міласці Віцебскага гарадскога магістрата перад намі, Сымонам Насекам, бурмістрам, Янкелем Бейнішовічам, Абрамам Хаймовічам, Пракопам Бібкам і Кандратам Лявіцкім, радцамі, з'явіўшыся асабіста, пан Міхаіл Галуза, паручнік расійскіх войск, гэты выпіс з актаў Віцебскага магістрата прадставіў, наступным чынам пісаны: выпіс з земскіх кніг Віцебскай правінцыі, року 1785, месяца кастрычніка 27 дня. У Віцебскіх павятовых земскіх судах Полацкага намесніцтва кастрычніцкай кадэнцыі[1], у бягучым годзе, што ў даце акрэслены, у належным месцы перад намі, Антонам Косавым, суддзёй, калежскім асесарам, Ксаверыем Заранкам, асесарам, судовымі земскімі чыноўнікамі Віцебскага павета, што ў гэтым годзе па судовых справах засядаюць, з'явіўшыся ў судзе ўласнай персонай, шляхетны ягамосць пан Аляксандр Жылка, прэзідэнт Віцебскага правінцыяльнага гарадскога магістрата, прадставіў крэдэнс[2] наступнага зместу: Юзаф з Давойнаў Салагуб, ваявода і войт Віцебскі, Санніцкі, Эйшыскі і г.д. староста, палкоўнік войск Яго Каралеўскае Міласці Рэчы Паспалітай, Вялікага Княства Літоўскага, кавалер ордэна Белага Арла, гэтым маім лістом-крэдэнсам абвяшчаю ўсім, каму аб тым ведаць належыць, а менавіта шляхетным ягамосцям панам бурмістрам, радцам, лаўнікам і ўсяму паспольству места Віцебска, што найяснейшы кароль ягамосць Жыгімонт Трэці сваім прывілеем, наданым у року 1597 сакавіка 17 дня ў Варшаве і на вальным сойме адзначаным, мяшчанам места Віцебска за нязменныя і вялікія заслугі перад Рэччу Паспалітай надаў правы ўсялякіх вольнасцяў да аздобы места Віцебска, а таксама герб, які гэтае места мела б на пячатцы, з выявай Ісуса Хрыста, а пад ім меч крывавы; разам з тым гербам ласкава надаў права мець і гарадскую харугву, пад якой у часе ваеннай патрэбы пры земскай харугве Віцебскага ваяводства знаходзіцца дазволіў. Згодна з прывілеем, тыя ж мяшчане места Віцебска, паводле сваіх даўніх звычаяў, дзень святой Веранікі і Збаўцы[3] з гэтай харугвай і належным рыштункам звычайна святкавалі, прэзентавалі і пахваляліся; дзеля таго, каб хвалебныя і гэтаму ж месту Віцебску аздобныя справы паводле старадаўняга звычая зрабіць, вакантнае месца ротмістра места Віцебска шляхетнаму ягамосцю пану Аляксандру Жылку, справамі і вялікімі заслугамі сваімі і сваіх продкаў у гэтым месце вядомаму, гэтым маім лістом-крэдэнсам надаю і зацвярджаю з тым, каб гэты ж ротмістр шляхетны ягамосць пан Аляксандр Жылка па належнаму яго пасадзе праву, а таксама згодна з даўнімі звычаямі і парадкам места Віцебска, суаднёсшыся з магістратам, уладарыць, кіраваць і распараджацца быў вольны на працягу свайго жыцця, і каб ягонай уладзе, распараджэнням і верхавенству шляхетны магістрат і паспольства ніякім чынам не працівіліся, аб чым я распараджаюся і, дзеля надання яму большай моцы, гэты афіцыйны ліст уласнай рукой і пячаткай зацвярджаю. Наданы ў Лукішках року 1753 месяца кастрычніка 10 дня. На тым крэдэнсе ўласнаручны подпіс ваяводы і выціснутая на чырвоным сургучы пячатка са словамі: Юзаф Салагуб, віцебскі ваявода. У канцы дадатак з наступнымі словамі: 1783 року месяца мая 10 дня на пасяджэнні Яе імператарскай Міласці Віцебскага гарадскога магістрата, з'явіўшыся асабіста Аляксандр Жылка, сын вахмістра Ахтырскага палка, крэдэнс ягонаму бацьку, шляхетнаму ягамосцю пану Аляксандру Жылку, былому прэзідэнту правінцыяльнага магістрата ... (на гэтым месцы тэкст дакумента абрываецца).

---

[1] Кадэнцыя — скліканне, акрэслены тэрмін выканання выбарным органам сваіх функцый.

[2] Крэдэнс — пасведчанне.

[3] Дзень святой Веранікі і Збаўцы святкаваўся 16 жніўня і меў яшчэ адну назву: свята Пячаткі горада.

Пераклад с польскай мовы.

Дакумент надрукаваны на польскай мове ў кн.: Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске. Вып. 19. Витебск, 1889. № 86. С. 322—325.

УРЫВАК З ВІЦЕБСКАГА ЛЕТАПІСУ, СКЛАДЗЕНАГА Ў 1760[1] г. СЦЯПАНАМ АВЕРКАМ НА АСНОВЕ ЛЕТАПІСУ М.ПАНЦЫРНАГА, ЗАПІСАЎ ЧАРНОЎСКІХ і І.АВЕРКІ

«...Имена тех, кто и когда был Витебским воеводою, с трудом собранныя.
Януш Костевич, воевода Вит., жил и был воеводою в 1516 году Августа 7 дня.
Иван Богданович, воевода Витебскій, жил и был воеводою ок. 1551 года.
Станислав Кишка жил ок. 1552 г.
Степан Андреевич Збрасскій жил и был воеводою ок. лета Господня 1561.
Николай Павлович Сапега был воеводою Витебским ок. 1591 года. По милости этого воеводы дано Магдебургское право е.в. королем Сигизмундом III — 1597 г.
Ян Завиша был воеводою Витебским ок. 1600 года.
Ян Раковскій был воеводою ок. 1614 года.
Симон Самуил Сангушко был воеводою около лета Господня 1633.
Христофор Кишка был воеводою ок. 1641 года.
Станислав Волович, гетман польный в.к. Л., был воеводою Витебским ок. 1633 года.
Ян Антоній Храповицкій, воевода Витебскій, жил ок. 1683 года.
Леонард или Лев Поцей жил в 1688 году, был воеводою Витебским.
Андрей Крышпин жил ок. 1695 года, воевода Витебскій.
Казимир-Александр Поцей, воевода Витебскій, жил ок. 1701 года.
Мартіан-Михаил Огинскій, воевода Витебскій, жил ок. 1730 года.
Иосиф Соллогуб — да здравствует! — нынешній воевода Витебскій, прибыл на воеводство Витебское в 1753 году».

[1] 1768 г. паводле ЭГБ. Мн., 1994. Т. 2. С. 330.

Друкуецца па кн. Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Витебск, 1883. Т. 1. С. 474.

Віцебск у агні

Цар спаліў Віцебск, абрабаваўшы, у 1708 годзе 27 bra а дванаццатай гадзіне, у самы поўдзень. Людзі маскоўскія, некалькі сот, што былі прысланыя ад розных народаў: маскалі, казакі, немцы, калмыкі, якія і Магілёў ужо спалілі, стаялі пад Віцебскам на гарах каля Лукішак. Некалькі з іх, прыехаўшы на ратушу, патрабавалі для сваіх, каб зараз жа хлеба, піва, мёду, гарэлкі і г.д. з гораду далі, а кіраўнікі горада, каб у лагеры размясціліся. Люд адразу пачаў трывожыцца, але яны тут жа супакоілі, кажучы: «Нічога не бойцеся, мы да вас смірна», — і ад'ехалі, узяўшы бурмістра і пісара пана Боніча, якіх, патрымаўшы да поўначы, адпусцілі, але, відаць, узялі з іх прысягу маўчаць, што маскалі меліся паліць горад. Гэта выцякае з наступнага: Боніч, вярнуўшыся, не хваляваўся, а толькі казаў, што 600 талераў патрабуюць, а на самой справе гэтыя 600 талераў ён паабяцаў сам, каб Зарэчча горада, дзе ён жыў, не спалілі. Але гэтага пісар Боніч не паведаміў людзям, ганебна ашукаў іх, настолькі, што не так маскалям, як гэтай таямнічнасці належыць прыпісаць такое зруйнаванне. І гэта найважнейшы аргумент. Бо калі б люд ад гэтага перасцераглі, то ён не толькі паліць не дазволіў бы, а саміх маскалёў уначы моцна пастрашыў бы. Бо чэрнь, калі аб гэтым дазналася, пачала выказваць незадавальненне. Самуэль Кісель, харунжы і падваявода віцебскі, як гаспадар, быў упэўнены, што ўсё будзе спакойна, бо быццам не было ніякай прычыны турбавацца. Ілжывым абяцанням маскалёў загадаў верыць, а ў горадзе афіцыйна прыказаў абвясціць, каб ніякага тлуму не рабілі. Гэта і адбылося: каго Бог хацеў захаваць, тыя ўначы з лепшымі рэчамі ўцяклі, у зямлю закопвалі; бо нейкі добры чалавек, маскаль, з некаторымі добра знаёмы, пісаў свайму пабраціму: «Сцеражыся, горад будуць паліць». І гэтае слова дайшло да некаторых толькі весткаю.

Раніцай дня 28 7 bra толькі ўзышло сонца, маскалі рушылі з гор на горад, расцягнуліся па ўсім горадзе аж праз Узгор'е на другі бок і разлажыліся, частка па гарах над горадам, частка за горадам, ужо маючы раскватараванне. І дзе каму рабаваць і паліць належала — падзялілі. А сам камендант Салаўёў, на ратушу прыехаўшы, казаў, каб той час былі кіраўнікі, а таксама гараджане, святары, жыды

і іншыя на плошчы і слова гасударава слухалі. У той час маскаль адзін, Боніч, адлучыўшыся ад плошчы, сказаў паведаміць свайму пляменніку Бонічу, што будуць паліць. І гэта ў момант па людзях разнеслася. Тут жанчыны пачалі крычаць, плакаць, лямантаваць у горадзе. Перш за ўсё аб тым, што не на плошчу трэба было ісці, а сядзець дома, і што магчыма ад агню ўратаваць.

Не дачакаўшыся і паўгадзіны, і каля гадзіны стоячы, нарэшце цару паведаміў Боніч, што ўжо люд патрывожаны, здагадваецца, што збіраецеся рабіць, ужо пачынаюць адсюль сыходзіць, толькі тады сказаў: «Слова гасударава да вас такое: за тое, што вы, віцябляне, радуецеся шведу, і правіянт даеце ворагу гасударараму, загадана вас паліць, вось вам тры гадзіны нямецкія, убірайцеся».

Адразу ж горад лямантам і крыкам напоўніўся, хто што меў даражэйшага, выносіць кінуліся. Не прайшло і паўгадзіны, як пачалі па ўсім горадзе рабаваць. Спачатку людзей распраналі да бялізны, шукаючы дарагіх рэчаў, грошай, аж да бялізны і абутку. Ягамосць пана Самуэля Кіселя, харунжага і падваяводу, пачалі рабаваць проста сярод вуліцы і тых, што з ім былі: шляхту, такіх, як Вацлаў Шапка, стражнік віцебскі, і інш. Ад ветру сталі запальваць. Запалілі маленькі кляштар жанчын базыліянак пры царкве Святога Духа. Не само памяшканне, дзе жылі манашкі, а пякарню і г.д. І кожны, абрабаваўшы сваю кватэру, запальваў, а калі разгарэлася, выехалі, і адны другіх выганялі за горад і ўжо каля горада дзе каго маглі знайсці — абдзіралі: паноў, шляхту, ксяндзоў, жанчын і г.д. Келіхі ва ўсіх касцёлах забралі і цэрквах і сакрамэнт выкідалі, апрача саборнай, бо там цынкавы келіх быў у той час пастаўлены, і ён згарэў з царквой.

У айцоў езуітаў казак, калі кс. Мрачкоўскі Прэзідэнт, келіх узяўшы, нёс у закрыстыю, пытаўся недасведчаны: «Што ён такое нясе?». Ксёндз адказаў: «Пана Бога». Казак пакланіўся да зямлі, у грудзі сабе стукнуў, уздыхнуў і кажа: «Ойча, усё роўна сабачыя дзеці, нехрысці возьмуць гэта. Я хрысціянін, вазьму лепш я». І так узяўшы келіх, адчыніў, Найсвяцейшы сакрамэнт на алтар высыпаўшы, келіх за пазуху паклаў і пайшоў. У касцёле Айцоў Дамініканцаў калмык на вачах кс. Прыора з келіха камуніканты прэч на зямлю аж да паўхору кінуў і г.д.

Калі ўжо горад заняўся пажарам, і ўсе з горада выйшлі, усю здабычу пахавалі. Выбраўшы што лепшае і што маглі забраць — забралі, а рэштку пакідалі і самі ад'ехалі. Да цёмнай ночы ўвесь горад з кляштарамі, касцёламі і г.д. спалымнеў. Засталося толькі поле, пасыпанае попелам і закіданае вуголлем. Царква саборная, перад спаленнем 16 месяцаў, як узятая на рэстаўрацыю, згарэла: праз сем год яшчэ не ўзноўленая. Звон вялікі: чатыры меншых згарэлі на попел. Кляштар, нанова ў 1706 г. выбудаваны, быў пахаваны ў попеле. У гэтым тлуме, калі ўжо загарэўся горад, некалькі казакоў і калмыкаў, што яшчэ блукалі, людзі забілі, і пры адным з іх знайшлі 2000 злотых аднымі капейкамі.

Пераклад зроблены з выдання: Ратуг, 1863.

Перакладчыца Алена Манкевіч.

Друкуецца па часопісе: «Беларуская мінуўшчына». № 5—6, 1993. С. 42.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё Віцебска

Эканамічнае развіццё тэрыторыі Віцебскай зямлі ў 14—18 ст. падзяляецца на 2 этапы. Першы з іх супадае з перыядам уваходжання Віцебска і падуладнай яму тэрыторыі ў склад Полацкай зямлі і Вялікага княства Літоўскага (да 16 ст.). Другі этап ахоплівае эпоху Рэчы Паспалітай: з сярэдзіны 16 ст. і да канца 18 ст.

Найбольш складаным у асвятленні з'яўляецца перыяд 14 — 1-я палавіна 16 ст. Па-першае, ён не забяспечаны пісьмовымі крыніцамі, па-другое, прадметы матэрыяльнай культуры, якія атрыманы ў выніку археалагічных даследаванняў і адносяцца да гэтага перыяду, таксама недастаткова інфармацыйныя. У адпаведнасці са знаходкамі культурнага пласта 14—16 ст. можна зрабіць вывад, што асноўнымі відамі рамеснай вытворчасці ў Віцебску застаюцца тыя ж, што і ў раннім сярэдневякоўі (жалезаапрацоўчая, гарбарна-абутковая, дрэваапрацоўчая, ганчарная, ювелірная і інш.).

У жалезаапрацоўчым рамястве назіраюцца некаторыя змены формаў прадметаў гаспадаркі і быту, аднак яны ажыццяўляюцца ў межах агульнаеўрапейскіх стандартаў (замкі, ключы, завесы і інш.). У тэхналогіі вытворчасці назіраецца тэндэнцыя да спрашчэння



Шахматы з раскопак у Віцебску: 1 (Верхні замак) і 2 (Ніжні замак) — ладдзя 13—14 ст.; 3 (Верхні замак) — фігурка ферзь 17 ст.

якасці вырабаў шырокага спажывання, напрыклад, нажоў, што, хутчэй за ўсё, звязана з павелічэннем вытворчасці тавараў на рынак і памяншэннем вытворчасці на заказ. З'яўляюцца падковы, падкоўкі на абцасы, новыя віды зброі і амуніцыі для воінаў.

У гарбарна-абутковай вытворчасці да канца 16 ст. назіраецца спецыялізацыя, аддзяленне гарбарнага рамяства ад абутковага. З 14 ст. з'яўляюцца новыя мадэлі абутку, ускладняецца тэхналогія яго вырабу.

З 2-й палавіны 13 ст. набірае тэмп удасканаленне ганчарнай вытворчасці. Посуд 14—15 ст. мала адрозніваецца арнаментыкай, і асартымент яго амаль той жа.

Па іншых відах рамеснай дзейнасці гэтага перыяду ў Віцебску захаваліся адзінакавыя і разрозненныя звесткі, якія не дазваляюць прасачыць шляхі і характар іх развіцця.

Побач з вялікакняжацкімі гарадамі ў 16 ст. і асабліва 1-й палавіне 17 ст. заўважаецца рост прыватнаўласніцкіх гарадоў і мястэчак. Асабліва актыўна яны ствараліся пасля прыняцця Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г., які дазволіў феадалам закладваць мястэчкі ў сваіх уладаннях. У эпоху феадалізму, як вядома, гарады становяцца цэнтрамі рамяства і гандлю. У гарадах узрастае колькасць рамеснікаў. Аднак толькі нязначная частка вольных гараджан займалася рамеснай вытворчасцю. Большую частку рамеснікаў у каралеўскіх і вялікакняжацкіх гарадах складалі прыгонныя сяляне, якія ўцякалі ад прыгнёту феадалаў. Разам з тым развіццё таварнай вытворчасці прыцягвала ўвагу феадалаў, якія імкнуліся падпарадкаваць яе сваім патрэбам. На гарадской тэрыторыі яны захоплівалі зямельныя ўчасткі, засноўвалі юрыдыкі і пасялялі на іх сваіх прыгонных, якія займаліся рамяством. Царкоўныя феадалы дзейнічалі гэтак жа, як і свецкія. Напрыклад, паводле інвентару 1618 г. ў Віцебску на зямлі, якая належала Полацкай архіепіскапіі, пражывала 19 рамеснікаў. Такім чынам, прырост рамеснага насельніцтва горада ажыццяўляўся як за кошт беглага, так і пераселенага ўладальнікамі сялянства. Імкненне да павелічэння дзяржаўных даходаў прымушала вярхоўную ўладу выдаваць граматы, якія прадастаўлялі некаторыя льготы гарадскім сялянам-перасяленцам. Так, у 1531 г. Віцебску было дадзена права «людзі вольныя за сабою трымаці па Полацкаму», г.зн. што асобы, якія надоўга пасяліліся ў горадзе, вызваляліся ад падаткаў і павіннасцей на 10 гадоў.

Абслугоўванне вытворчых, гаспадарчых і асабістых патрэб насельніцтва характарызуе гарадское рамяство як таварную вытворчасць. Менавіта рамеснікі фарміравалі гарадскі рынак, утвараючы спецыялізаваныя рады. Паводле пісьмовых крыніц 16—17 ст. у Віцебску вядомы гандлёвыя рады, якія складаліся з 8 гаршковых, 6 саляных, 5 рыбных, 24 мясных лавак, 34 лавак без назвы. Наяўнасць рынкаў збыту забяспечвала адносна хуткае развіццё абутковага, кушнерскага, ганчарнага, кавальскага рамёстваў, садзейнічала росту колькасці рамеснікаў гэтых прафесій. Рамёствы, вырабы якіх карысталіся меншым попытам, развіваліся горш. Сярод іншых гарадоў Віцебск вылучаўся рамеснымі прафесіямі, якія былі звязаны з абслугоўваннем рачных портаў: рулявымі, суднавадзіцелямі, лямачнікамі, вяровачнікамі, грузчыкамі, палатняншчыкамі, а таксама прафесіямі шабельніка-бронніка, булатніка, стрэльніка, бронніка-пішчальніка. Акрамя таго, у Віцебску значнае развіццё атрымала гарбарнае рамяство. У канцы 18 ст. скуры віцебскіх гарбарных заводаў прадаваліся гарадскім шаўцам, сталярам у якасці абівачнага матэрыялу для крэслаў, павозак, вывозіліся ў суседнія рэгіёны.

Структура гарадскога сярэдневяковага рамяства спачатку ўключала вядомыя са старажытнарускага перыяду асноўныя прафесіі каваля, гарбара, цесляра, ганчара і інш. Потым у выніку развіцця таварнай вытворчасці, звя-

Касцяныя вырабы 14—18 ст. з раскопак на Ніжнім замку.

занай з патрэбамі рынку, гэтыя рамесныя прафесіі паступова дыферэнцыруюцца. З прафесіі каваля, напрыклад, вылучыліся вытворцы прылад працы, зброі, ювелірных вырабаў. Яны, у сваю чаргу, падзяляліся на замочнікаў, кавалёў-пішчальнікаў, шабельнікаў-броннікаў і г.д. У 1655 г. ў Віцебску працавалі рамеснікі наступных спецыяльнасцей: шаўцоў — 5, кавалёў — 5, краўцоў — 2, хлебнікаў — 4, цесляроў — 5, ганчароў — 5, аўчыннікаў — 6, вінакураў — 1, саладоўнікаў — 1, ігольшчыкаў — 1, шабельшчыкаў — 1, кацельшчыкаў — 1, токараў — 3, слесараў — 2, маслабойшчыкаў — 4, кажамякаў — 8, шапавалаў — 4, бондараў — 1, канатнікаў — 2, чабатароў — 2, сінільшчыкаў — 2, шкляроў — 1, сталяроў — 1, сніцароў — 1 (займаліся разьбой па дрэве, мебельшчыкі), цырульнікаў — 1. Згодна з пісьмовымі крыніцамі, у 1660 г. ў Зброевай палаце працавала 68 полацкіх і віцебскіх «сярэбранай, і броннай, і ствольнай, і замочнай вінтавальных пішчаляў, і лажэўнай, і такарнай, сталярнай і загармістрэльнай, і карэтнай, і замочнай справы к святліцам» майстроў і вучняў.

Сёння цяжка вызначыць становішча той ці іншай групы віцебскіх рамеснікаў, зрабіць вывад аб развіцці асобнай рамеснай вытворчасці. Тым не меньш, большасць рамеснікаў складалі тыя, хто абслугоўваў шырокія масы гарадскога і сельскага насельніцтва: шаўцы, кушняры, цесляры, ганчары, кавалі, хлебнікі. Менш было ювеліраў, шкляроў, збройнікаў. У 1665 г. ў Віцебску было 10 ганчароў, 8 піваварaў, 8 шаўцоў, 7 шапавалаў (плялі рукавіцы і іншыя вырабы), 5 краўцоў, 5 кажамякаў, 3 канавалы, 3 кацельшчыкі, 3 кавалі, 3 токары, 2 залатых спраў майстры, 2 цесляры, 2 кушняры, шабельшчык, алейнік (маслабойшчык), пільшчык (распілоўшчык дошак, брускоў, бэлек), хлебнік, вінакур, сінільшчык, баўтушнік (апрацоўваў ласіныя скуры), каляснік, скамарох.

У канцы 18 ст. ў Віцебску дзейнічалі 7 гарбарных заводаў. Адзін з іх у 1777 г. пабудаваў мешчанін Андрэй Гарноўскі, астатнія пачалі сваю працу ў 1800 г. і належалі Антону Цытро, Сямёну Стаброўскаму, Кацярыне Стаброўскай, Івану Бураку, Пракофію Лінсе. На гэтых заводах выраблялі чорны і белы

Распісаная талерка з Віцебскай карчмы. 17 ст. З раскопак на Ніжнім замку.



Кафля з дывановым арнаментам. 18 ст. З раскопак на Ніжнім замку.

юхт, чорныя і белыя апойкі, падэшвы, боты і чаравікі, а таксама дубленіцу з ялавічных і нізкага гатунку конскіх скур, якую адпраўлялі ў Рыгу, дзе ўжывалі на пасталы.

У 1765 г. ў Віцебску Емяльянам Плюхіным быў пабудаваны цагельны завод. Дастаткова высокі ўзровень вытворчасці кафлі даў магчымасць наступнікам віцебскага мешчаніна Андрэя Будніка заснаваць у 1790 г. кафельны завод. Прадукцыя гэтага прадпрыемства збывалася ў Віцебску і яго наваколлі, Мінску і Мінскай губерні, Парэцкім павеце Смаленскай губерні, Аршанскім, Магілёўскім, Сенненскім паветах Магілёўскай губерні. У сярэдзіне 19 ст. (каля 1850) на базе ганчарнай вытворчасці слабады Русь быў створаны другі кафельны завод, які належаў мешчаніну Ерамею Гарбузу. Сыравіна для кафельных заводаў Віцебска здабывалася за 2 км ад горада ва ўрочышчы Царкоўшчына, якое належала Багаслоўскаму прыходу. Кафлі выраблялiся трох гатункаў: белыя, зялёныя і шэрыя. Матэрыялы для палівы (волава і свінец) набывалі ў Рызе. У гэты час у слабадзе Ільіншчына з'явіўся ганчарны завод, які належаў віцебскаму мешчаніну Сяргею Ваху і выпрабляў паліўны посуд. Посуд, які выпрабляўся на віцебскіх заводах, меў наступныя формы: супавыя вазы, салянкі, цукерніцы, малочнікі, паласкальныя кубкі, фруктовыя талерачкі, вазы для кветак, чарнільныя прыборы, кафейнікі, чайныя кубкі, шклянкі, гаршчочкі, умывальнікі.На посуд наносілася паліва зялёнага, жоўтага, шэрага, шакаладнага і фіялетавага колераў.

Першыя звесткі, якія б дазволілі меркаваць пра ўзнікненне рамеснага аб'яднання (брацтва) у Віцебску датуюцца 1495 г. Паводле дакумента, 2 майстры-кажамякі выступілі на судзе з заявай, што абодва яны «са сваімі таварышамі» не будуць выконваць падводную павіннасць. У пісьмовых крыніцах 1539 г. ўпамінаецца «староста ковальский витебский ... со всеми витебскими помочниками своими ... которые под послушенством того старосты ковальского». Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ў канцы 15 — 1-й палавіне 16 ст. ў Віцебску ўжо існавалі аб'яднанні рамеснікаў кажамякаў і кавалёў. У грамаце караля Жыгімонта II Аўгуста ваяводу віцебскаму князю Стафану Збаражскаму ад 6 чэрвеня 1561 г. ёсць звесткі пра існаванне «брацтваў» пры карчме віцебскай плябаніі. Кароль, дакараючы Збаражскага ў парушэнні правоў гэтых брацтваў, зазначаў яму: «Абы твая милость и теперь оных братств из звечистых мети им допустил и ничим им до того не заборонял». З дакумента вынікае, што ў сярэдзіне 16 ст. ў Віцебску існавалі «звечистые», г. зн. даўнія, звычайныя арганізацыі — брацтвы. Аналізуючы дзейнасць віцебскіх рамесных арганізацый, беларускі гісторык У.Г.Краснянскі адзначаў, што прымітыўныя рамесныя аб'яднанні мелі месца ў выглядзе т.зв. «мядовых братчын» на аснове звычайнага («звыклага») права, напэўна, без пісьмовых дакументаў. Гэтыя арганізацыі паслужылі правобразамі цэхаў і адрозніваліся ад царкоўных брацтваў. Нягледзячы на тое, што

статуты віцебскіх «мядовых братчын» не захаваліся, унутраны распарадак дзейнасці такой арганізацыі магчыма прасачыць па матэрыялах віленскіх аб'яднанняў. Так, статут віленскай братчыны шапашнікаў складаўся з 2 частак: уласна рэлігійнага і дадатковых артыкулаў царкоўна-дабрачыннага характару. Знешнім выяўленнем такога аб'яднання былі «звыклыя» склады-кануны для прыгатавання мёду ў дні царкоўных святаў. Па гэтай прычыне самі брацтвы называліся мядовымі.

Пра віцебскія мядовыя брацтвы паведамляюць каралеўскія прывілеі 1551, 1561 і 1619 гг. У першым з іх вызначаецца парадак уладкавання складоў-канунаў: «...на кожны год складов мети, одно три: первший о Матце Божай Опошней, другий о Святом Симеоне, а третий о Святом Михаиле, и не мают тыи склады должей тривати, только по два дни...». Такі распарадак уладкавання складоў-канунаў быў выкліканы тым, што мёд, гарэлка, піва маглі прадавацца толькі віцебскай плябаніяй, якой на гэта былі выдадзены асобыя льготы яшчэ ў 1518 г. У гэты ж час віцебскія братчыкі, карыстаючыся правам мець склады-кануны, ладзілі іх на доўгі тэрмін, тым самым выклікалі незадавальненне царкоўнай юрыдыкі: «по три недели склады сытять ку великой шкоде корчам плебановских». У канцы 16 — пачатку 17 ст. віцебскія брацтвы паступова ператвараюцца ў цэхавыя карпарацыі. Разглядаючы прычыны ўзнікнення цэхаў на тэрыторыі Беларусі, гісторык З.Ю.Капыскі адзначаў, што выдача прывілея на магдэбургскае права матывавалася, па-першае, жаданнем садзейнічаць росту гарадоў; па-другое, імкненнем павялічыць даходы казны. Сумяшчэнне гэтых мэт утрымлівае грамата, якую атрымаў Віцебск у 1597 г. Яна з'яўлялася прававой санкцыяй на пераўтварэнне гараджан у саслоўе феадальнага грамадства. Грамата ўтрымлівае раздзел, які накіраваны на паляпшэнне эканамічнага становішча рамеснікаў: «...Людей ремесленных, золотаров, кравцов, ковалев, котляров, резников, сыромятников, кожемяк, пекаров, гончаров, шевцов, теслев, кушнеров и иншых всяких ремесленников от работы замковой вольными чиним». Такім чынам, рамеснікі, падначаленыя гарадскому магістрату, маглі бесперашкодна ствараць свае аб'яднанні па прафесіях — цэхі.

Пры стварэнні цэхаў у іх статуты перайшла тэрміналогія брацтваў, паколькі цэхі, па сутнасці, з'яўляліся ўзаконенымі брацкімі аб'яднаннямі. Захавалася дзяленне на «старэйшых і малодшых братоў», у склад кіравання ўваходзілі стараста, ключнік. Мелася грашовая «скрынька» ці «шапа». Акрамя статута, суда, скрынкі, зброі цэхі надзяляліся знешнімі рысамі свайго адзінства — яны мелі харугву і пячатку. Кожны цэх удзельнічаў у святочных гарадскіх працэсіях у поўным складзе з харугвамі, а ў час ваенных падзей цэхі ўтваралі самастойныя баявыя падраздзяленні. У месцах рассялення рамеснікаў адной спецыяльнасці існуючыя цэрквы рабіліся брацкімі, або будаваліся новыя на сродкі цэхавай арганізацыі. У грамаце віцебскім кормнікам ад 3 лютага 1619 г. гаворыцца: «... мещанам тамошним витебским кормникам направити церковь опалую заложень Преображения господня с пределом с. Николы за рекою Витьбою, на посаде Узгорском у пирожном ряду и меть склады звыклые на праздник святого Архистратига Михаила и св. Симона... а их бы то порадией ити мало...

Конаўкі і кубачак 17 ст. з раскопак на Верхнім замку.

Рукамый 17 ст. з раскопак у Віцебску.

Курыцельныя люлькі 17 і 18 ст. з раскопак на Верхнім замку.

тым же кормникам мещанам Витебским при той звышепомененой церкви мети братство церковное, в которое они вписавшиеся могли бы с посродку себе што рок старших общгать и схожки на обмышленье приходов и расходов».

Згодна з пісьмовымі крыніцамі, такія аб'яднанні рамеснікаў каля цэркваў развіваліся двума шляхамі. Калі гэта былі прадстаўнікі аднаго цэха, то аб'яднанне складалася па прафесійных прыкметах. У іншым выпадку ў царкоўнае брацтва ўваходзілі прадстаўнікі розных прафесій, але адной веры — праваслаўнай ці каталіцкай. Царкоўныя брацтвы адыгралі вялікую ролю ў грамадска-палітычным жыцці гараджан 2-й палавіны 17 ст.; яны фарміравалі іх пазіцыю адносна рэлігійна-царкоўнай барацьбы. Вядома апісанне 9 цэхавых сцягоў (7 — з Успенскага сабора і 2 — з Гарадской управы) 19 ст., якія ў даваенныя гады захоўваліся ў Віцебскім музеі. Малюнкі на сцягах сведчаць пра іх цесную сувязь з брацкімі абразамі, царкоўнымі святамі і цэрквамі, з якімі цэхі былі звязаны ў 17—19 ст. Напрыклад, Петрапаўлаўская царква ў Задзвінні з'яўлялася брацкай царквою цэха канатчыкаў, а іх брацкім абразам быў абраз Благавешчання. У гарбароў брацкай царквою была Васкрасенская Заручаўская, у піваварaў і вінакураў — Мікольская рынкавая царква. Цэх краўцоў наведваў Увядзенскую царкву на Узгор'і. Пасля яе знішчэння брацкі абраз Сёмухі перанеслі ў Мікольскую Завіцьбенскую царкву.

У 1721 г. ў Віцебску існавала 7 цэхаў: гарбароў; кавалёў, мечнікаў, слесараў і меднікаў; залатароў; мяснікоў; краўцоў, шапачнікаў, гальштучнікаў, шмуклераў; ганчароў, муляроў, фарбавальшчыкаў; шаўцоў, рымараў, сядзельнікаў. У 1738 г. ўзніклі саладаварны, піваварны і вінакурны цэх, у 1760 г. быў створаны цэх рэзчыкаў, шкляроў, карэтнікаў, цесляроў, бондараў, сталяроў і сітнікаў. Нягледзячы на тое, што гарадскім самакіраваннем была ахоплена толькі частка насельніцтва і яно не распаўсюджвалася на грамадзян, якія жылі на тэрыторыях прыватных юрыдык, у цэхавыя арганізацыі павінны былі ўваходзіць усе рамеснікі горада. Такое становішча аслабляла прыватнаўласніцкія правы феадалаў, таму што майстры, якія з'яўляліся іх падданымі, траплялі пад юрысдыкцыю цэха, а потым і гарадскога самакіравання. У выніку, калі першапачаткова цэхавыя ўставы зацвярджаліся толькі магістратамі гарадоў, то з ростам прыватнаўласніцкай юрысдыкцыі кожны цэх імкнуўся дамагчыся свайго зацвярджэння спецыяльнай каралеў-

скай граматай. Захавалася грамата караля Аўгуста III ад 12 кастрычніка 1738 г., якая сцвярджала, што калі «брацтвы і цэхі... маюць у сабе тую ўласнасць, што асобы, якія да іх належаць, знаходзяцца паміж сабой у належнай суполцы, таму ...жадаючы бачыць парадак як у іншых цэхах рамесніцкіх, ... і схіляючыся на просьбу віцебскіх мяшчан і ўсіх братчыкаў гэтых упамянутых цэхаў» кароль даравaў права «саладаварам, піваварам і вінакурам мець свой цэх і брацтва».

Кожны цэх кіраваўся ўставам, у якім існавалі артыкулы, што забяспечвалі майстрам асобае прававое становішча ў горадзе ў параўнанні з тымі, хто не ўваходзіў у цэх. Устаў цэха віцебскіх саладавараў, піваварaў і вінакураў 1738 г. складаўся з 14 артыкулаў. Першы артыкул устава цэха паведамляў пра штогадовыя выбары на сходзе ўсіх братчыкаў 4 старшынь з ліку асоб, аддадзеных гарадскім інтарэсам. Звычайна ў склад кіраўніцтва цэхам (старшынь) выбіралі 1—2 прадстаўнікоў ад кожнай прафесіі. Пад «адданымі інтарэсам горада асобамі» разумеліся майстры, якія знаходзіліся пад юрысдыкцыяй гарадскога магістрата. Такі прынцып аб'яўляўся асноўным, таму што ў абавязкі стараст (старшынь) уваходзіла захоўванне касы і дакументаў цэха (2-і артыкул устава). Перавыбары старшынь цэха праводзіліся праз год. Цэхавы куфар (каса) павінен быў захоўвацца не на прадмесці, а ў самым горадзе ў падвале. Куфар утрымліваў не толькі грашовы набытак цэха, але і яго дакументацыю. Цэхавыя даходы ўтвараліся з розных крыніц. Значную іх частку складалі ўступныя ўзносы рамеснікаў. Паводле 6-га артыкула цэхавага ўстава, кожны гаспадар майстэрні, якая належала цэху, быў абавязаны ўнесці на патрэбы суполкі па 4 копы літоўскіх грошаў. Гэта сума ў параўнанні з іншымі гарадамі Беларусі нязначная. Звычайна цэхі з вялікай колькасцю рамеснікаў у выпадку, калі іх вытворчасць была цесна звязана з рынкам, збіралі да 4 коп або 10 злотых. У той жа час цэхі рамёстваў, якія працавалі пераважна на заказ, спаганялі да 10 коп літоўскіх грошаў. Згодна з уставам цэха віцебскіх саладавараў, піваварaў і вінакураў, грошы з цэхавай касы у першую чаргу павінны былі пайсці на ахвяраванні царкве св. Мікалая на рынку. Акрамя таго, грошы выдаткоўваліся на цэхавы сцяг і вайсковае ўзбраенне, каб падчас царкоўных свят суправаджаць працэсію па распараджэнню магістрата. Парушэнні членамі цэха пэўных маральных і этычных нормаў павінен быў разглядаць цэхавы сход. Гаспадар майстэрні, якая ўваходзіла ў склад цэха, па ўсіх пытаннях падпарадкоўваўся рашэнню цэха, акрамя тых, якія не адносіліся да цэхавых. Іншымі словамі, цэх вырашаў у асноўным толькі вытворчыя пытанні. Калі членамі цэхавай арганізацыі з'яўляліся прыватнаўласніцкія рамеснікі, то яны не мелі права звяртацца да суда сваіх гаспадароў па вытворчых пытаннях.

Касцяная пячатка з Віцебска. 17 ст.

Як вядома, гарадскія рамеснікі ўнутры цэха падзяляліся на вучняў, чаляднікаў і майстроў. Узаемаадносіны паміж імі таксама рэгламентаваліся ўставам. Вучні навучаліся на працягу розных тэрмінаў у залежнасці ад узросту і характару будучай прафесіі. У некаторых цэхах увогуле адсутнічалі якія-небудзь юрыдычныя або традыцыйныя нормы навучання вучня ў майстра. Так, у віцебскім канатным цэху кожны майстар меў свае правілы і ўстанаўліваў свае тэрміны навучання вучня. На жаль, віцебскія першакрыніцы не асвятляюць узаемаадносін майстроў і чаляднікаў, не адказваюць на пытанне, ці існавалі тут, як у цэхах іншых гарадоў, пераходныя ступені паміж вучнем і чаляднікам.

Гандлёвыя сувязі Віцебска 14—18 ст. ажыццяўляліся па старажытных водных шляхах з волакамі паміж рачнымі сістэмамі. Частка старажытнага воднага шляху «з варагаў у грэкі» несумненна працягвала выкарыстоўвацца і ў 14—17 ст. Згодна з мытнай кнігай Віцебска 1605 г., на гарадскі рынак пры-



Самшытавыя грабяні. 13 — пачатак 16 ст. З раскопак на Верхнім замку.

язджалі купцы з Усвят, Смалян, Полацка, Езярышча, Дзісны, Глыбокага, Суража, Шклова, Пуціўля, Ігумена, Шыдлаўца, Галоўчына, Куравічоў, Оршы, Лукомля, Мсціслава, Магілёва, Вільні, Мінска, Веліжа. Безумоўна, выкарыстоўваліся як водныя шляхі сувязі, так і сухапутныя дарогі, бо купцы наведвалі Віцебск на працягу ўсяго года. У 14—15 ст. найбольш інтэнсіўна развіваліся гандлёвыя сувязі паміж Віцебскам, Полацкам, Псковам, Ноўгарадам на паўночным усходзе і Віцебскам, Полацкам, Рыгай на паўночным захадзе. На мяжы 14—15 ст. палачане і віцябляне атрымалі для карыстання ў Рызе каталіцкі сабор, які пазней перадалі праваслаўнай царкве. Ганзейскія купцы, якія мелі свае канторы ў 14—15 ст. у Пскове і Ноўгарадзе, імкнуліся ўзмацніць свой уплыў на гарады, размешчаныя каля водных шляхоў Вялікага княства Літоўскага. Пасля закрыцця нямецкага двара ў Ноўгарадзе (1494) Заходняя Дзвіна стала важнай гандлёвай артэрыяй для літоўска-рускіх купцоў. Віцебск імкнуўся падтрымліваць прамыя гандлёвыя кантакты не толькі з гарадамі Маскоўскай дзяржавы, але і з рыжанамі. Аднак з 1440-х гадоў пачаліся ўзаемныя перашкоды Рыгі і Полацка ў перамяшчэнні купцоў. Адначасова са знешнім гандлем развіваўся ўнутраны гандаль. Пра гэта сведчыць канцэнтрацыя тавараў з ваколіцы ў гарадскіх цэнтрах (у Віцебску і Полацку). Закупка іх у сельскай мясцовасці ажыццяўлялася ўжо не прыезджымі купцамі («гасцямі»), а гандлярамі з размешчаных паблізу гарадоў.

У 2-й палавіне 15 ст. гандаль Віцебска трапіў у перыядычную залежнасць ад Полацка, які ў гэты час іграў галоўную ролю ў гандлі па Заходняй Дзвіне. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца ліст баяр і жыхароў Полацка Рыжскаму магістрату, у якім палачане пісалі, што «прапусцяць рыжскіх купцоў у Віцебск, калі рыжане дадуць ім вольны праезд за мора, а таксама дазволяць вольныя шляхі ў Ліфляндыі, акрамя Рыгі». Гэтае патрабаванне палачан было задаволена і гандаль рыжан з Віцебскам узнавіўся «па старому... вадой, а дзе немагчыма, сухім шляхам на конях». У той жа час улада пастаянна рэгулявала і кантралявала сістэму збірання розных пошлін, што таксама адыгрывала станоўчую ролю ў развіцці гандлю. У 1495 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр звяртаўся да віцебскага намесніка князя Міхаіла Заслаўскага і дакараў яго, што той забараняў віцебскім мяшчанам гандляваць у горадзе мёдам, жытам і рыбай, набытымі ў акрузе. Акрамя гэтага, вялікі князь выказаў незадавальненне па прычыне ўвядзення дадатковых адвольных пабораў з купцоў, якія вазілі тавар з Віцебска ў Рыгу. У 2-й палавіне 15 ст. адбываюцца змены ў наменклатуры тавараў, якія паступаюць у Рыгу. Калі ў канцы 13 — пачатку 14 ст. галоўную ролю ў еўрапейскім экспарце Смаленска і Полацкай зямлі іграў воск, то пазней акцэнт перамясціўся ў бок лясных матэрыялаў. Пасля пачатку рэфармацыйнага руху ў Еўропе назіраецца зніжэнне попыту на воск. У той жа час развіццё еўрапейскай мануфактурнай прамысловасці выклікала вострую патрэбу ў вялікай колькасці сыравіны. Вось чаму ў канцы 15 ст. першае месца ў рыжскім экспарце займаў лес, попел, дзёгаць, каноплі, лён. Рэгіён Паўночнай Беларусі апынуўся ў вельмі спрыяльных умовах з улікам попыту на новыя віды тавараў. Яго

прыродныя рэсурсы сталі прадметам павышанай зацікаўленасці як з боку мяшчанскага купецтва, так і прадстаўнікоў феадальнай знаці — непасрэдных уладальнікаў маёнткаў і лясных масіваў, якія ўключаліся ў гандлёвую сферу. У 15 ст. прывазнымі таварамі з'яўляліся фландрскія і англійскія сукны, соль, галандскія і вестфальскія палотны, жалеза, медзь, волава, свінец, селядцы, віно, піва, вострыя прыправы. З канца 15 ст. Заходняя Дзвіна ўваходзіла ў сістэму камунікацый, якія злучалі Маскву з Рыгай праз Смаленск, Віцебск, Полацк. Адпаведна мытнай кнізе Віцебска 1605 г., на мяжы 16—17 ст. гандлёвыя сувязі Віцебска з Маскоўскай дзяржавай зноў актывізаваліся. Тавары паступалі ў Віцебск з Белага, Тарапца, Смаленска. У асобных выпадках адзначалася, што тавары дастаўлялі проста «з-за мяжы». У далейшым гэтыя сувязі ўмацоўваліся. У 1654 г. па Заходняй Дзвіне ўстанавілася права бяспошліннага гандлю. Да канца 18 ст. па тэрыторыі Паўночнай Беларусі пралягалі надзейныя сухапутныя маршруты. Найбольш важнымі з іх лічыліся: Масква—Смаленск—Віцебск—Полацк—Вільня; Пецярбург—Віцебск—Магілёў—Кіеў. Віцебск выконваў ролю пункта, у якім фарміраваўся груз пры пастаўках тавараў з Расіі ў Беларусь і Рыгу.

У сярэдзіне і 2-й палавіне 18 ст. ўзровень гандлю віцебскіх купцоў быў даволі высокім. Асабліва хадавым таварам была пянька. У 1750 г. толькі 2 купцы (Іван Талоцка і Фама Ларэнс) адправілі ў Рыгу пяньку на суму 1789 талераў. Пра вялікі тавараабарот Віцебска ў 2-й палавіне 18 ст. сведчыць наступны факт. Паводле даных 1765 г. у казну паступіла 78 565 злотых грашовых збораў з віцебскай сплаўной мытні, што склала больш чым палову збораў ад 8 сухапутных мытняў Беларусі.

Поспех тавараабаротаў у немалой ступені залежыў ад арганізацыі гандлёвай справы. Вядома, што ў сплаве тавараў купцы ўдзельнічалі групамі. Сумеснымі пастаўкамі займаліся прадстаўнікі віцебскага «гандлёвага дома» — купцы ігольнікі, Гейкі, Татаркі. Гэта былі кампаньёны на 1—2 аперацыі або на некалькі гадоў. Паводле пісьмовых крыніц канца 17 ст. вядомы групы віцяблян Аляксея Татаркі і Давіда Навумовіча (1694), Васіля Каралькевіча і Васіля Данілевіча (1692), Васіля Каралькевіча і Кузьмы Скорбы (1694—99). У арганізацыі гандлю купцы ўзаемадзейнічалі са шляхтай, што праяўлялася ў скупцы тавараў у дваран, перавозцы шляхецкага тавару пад пратэкцыяй магната і г.д.



Маёлікавае блюда 16 ст. італьянскай вытворчасці. З раскопак на Верхнім замку.



Гузік з горнага крышталя 15 ст. З раскопак на Верхнім замку.

Самым масавым матэрыялам, які адлюстроўвае накірунак знешніх гандлёвых сувязей Віцебска ў перыяд 14—18 ст., з'яўляліся прывазныя керамічныя вырабы. Акрамя керамікі ў Віцебск увозілі вырабы са шкла, жалеза, скуры, асобныя віды сыравіны. Як вядома, шкловытворчасць на Русі зарадзілася ў 10—11 ст. у Кіеве і да 17 ст. развівалася ў выглядзе маленькіх майстэрняў — «гут». Большасць знойдзеных у Віцебску у час археалагічных даследаванняў бранзалетаў, якія выраблены з каліева-свінцова-крэмнязёмнага і каліева-кальцыева-свінцова-крэмнязёмнага шкла, кіеўскага паходжання. Віцебская мытная кніга 1605 г. паведамляла пра ўвоз шкла з Шыдлаўца. У 17 ст. прадметы са шкла ў Віцебск паступалі таксама з Рыгі. Да імпартных

Шкляныя і каменныя каралі з раскопак на Ніжнім замку. 17 – 19 ст.

шкляных вырабаў 14—18 ст. адносяцца кварты, штофы, аптэчныя «шкляніцы».

Існаваў міждзяржаўны абмен жалезам і жалезнымі вырабамі. Напрыклад, у Польшчу гэты тавар паступаў з Венгрыі, Швецыі, Маравіі, а адтуль — у Літву, Беларусь і Рускую дзяржаву. Віцебск атрымліваў жалеза і жалезныя вырабы з Рыгі. Паводле мытнай кнігі 1605 г. частка вырабаў з жалеза (нажы, жалезны посуд, нагайкі) паступала ў Віцебск з Маскоўскай дзяржавы. Адначасова заходнееўрапейскія вырабы (венгерскія пілкі) накіроўваліся праз Віцебск у паўночна-усходнія раёны. Вялікую ролю віцебскага купецтва ў эканамічным жыцці горада 17—18 ст. пацвердзіла наданне каралём Аўгустам III Устава купецкай думы 12 снежня 1738 г.

Літаратура: Акты Литовской метрики. Т. 1. Варшава, 1896; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 1. Мн., 1959; Акты, относящиеся к истории Западной России. Т. 4. СПб., 1851; Витебская старина. Т. 1. Витебск, 1883; Похилевич Д.Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы в 16—18 вв. Львов, 1957; Копысский З.Ю. О ремесленном производстве в городах Белоруссии // История СССР, 1959. № 3; Яго ж. Магдебургское право в городах Белоруссии (конец 15 в.) // Советское славяноведение, 1972. № 5; Яго ж. Гандлёвыя сувязі гарадоў Беларусі з гарадамі Польшчы ў канцы 16 – першай палове 17 ст. // Весці АН БССР. Серыя грамад. навук, 1961. № 2; Яго ж. Экономическое развитие городов Белоруссии в 16 – первой половине 17 в. Мн., 1966; Карпачёв А.М. О социально-экономической сущности вотчинной мануфактуры (По материалам белорусских мануфактур второй половины 18 в.) // Вопросы истории, 1957. № 8; История Белорусской ССР. Т. 1. Мн., 1961; Краснянскі В. Музейныя помнікі старадаўніх Віцебскіх Рамесніцкіх Арганізацыяў // Віцебшчына. Т. 1. Віцебск, 1925; Супінскі А.К. Прыгонная Віцебшчына // Віцебшчына. Т. 2. Віцебск, 1928.

В.М.Ляўко.

Дакументы сведчаць

АДПІСКА ВЫЩЕБСКАГА ВАЯВОДЫ Н.М.БАБАРЫКІНА Ў ЗБРОЕВУЮ ПАЛАТУ АБ АДСЫЛЦЫ Ў МАСКВУ РОЗНЫХ СПРАЎ МАЙСТРОЎ І СПІС МАЙСТРОЎ

4.5.1660 г.

Государю царю и великому князю Алексею Михайловичю, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии самодержцу, холопи твои Микитка Боборыкин с товарыщи челом бьют...

Указал ты, великий государь, из Витепска взять к Москве розных дел мастеров, которые в Витепску остались, иконописца Фетьку да бронников сабельного дела мастеров Сеньку Тимофеева с сыном Кирюшкою, Сенькина товарыща Данилка, замочного мастера Ивашка Степанова, токарного цеха мастеров Петрушку, прозвище Скобельку, Кирюшку, прозвище Толкочова и их товарыщей, которые токарному делу умеют, сницарей, резного деревеного дела мастеров Давыдка, Павлова, Якушка Погорельского. И нам бы, холопем твоим, по прежней твоей великого государя грамоте... и по нынешнему твоему великого государя указу и по грамоте, в Витепску розных дел мастеров, которые в твоей великого государя грамоте имены писаны, велено сыскать, а, сыскав, прислать тех мастеров к тебе, великому // государю, к Москве с кем пригоже, дав им подводы и твое великого государя жалованье денег и платья, против их братьи витепских слесарей, которые ныне присланы к тебе, великому государю, с прапорщиком з Данилом Тарпановым.

...А отписку, государь, и именную роспись велено подать и мастеровым людем явитца в Оружейном приказе окольничему и оружейничему Богдану Матфеевичю Хитрово да стольнику Афанасью Ивановичю Нестерову да дьяку Богдану Арефьеву.

...А иконописца, государь, Фетьки да пушкарей Ивашки Степанова да Сеньки Тимофеева с сыном к тобе, великому государю, мы, холопи твои не посылали, потому что в Витепску в городе иконник Фетька адин человек ...

А пушкарь Ивашка Степанов в Витепску в городе человека божия Алексея в манастыре держит боевые часы один же в Витепску. И чтоб ты, великий государь, их пожаловал, тово Фетьки иконника и пушкаря Ивашки Степанова, которой у часов, из Витепска взять не указал для церковного строенья иконново письма, а Ивашки Степанова для часов. А Сенька пушкарь к тобе, великому государю, не послан, потому он, Сенька, ведает по городу у всякого пушечного наряду и в твоей великого государя казне пешево строю оружие и всякую бронь, а сабельного, государь, дела он, Сенька, и сын ево Кирюшка никакова делать не умеют, акроме что ножки к саблям старыя починивают. А Данилка да Петрушка Скобелька да твоей великого государя указной грамоты из Витепска, нанявся у торговых у витепских людей, съехали в Ригу. А, как государь, они из Риги приедут в Витепск, и мы, холопи твои, их Данилку да Петрушку, к тобе, великому государю, пришлем тотчас. //

Роспись мастеровым людем и что мы им дано великого государя денежного жалованья и платья.

Кирюшка, прозвище Толкачев, 5 рублев да шуба; Ивашка Микитин 5 рублев да шуба; Давыдко Павлов 5 рублев да шуба; Ивашка Григорьев 5 рублев да шуба; Якушко Погорельской 5 рублев да шуба; Самулка Богданов 5 рублев да шуба. ...

Дакумент друкуецца са скарачэннямі па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 428—430.

СПІС ПОЛАЦКІХ, ВІЦЕБСКІХ, ВІЛЕНСКІХ МАЙСТРОЎ І ВУЧНЯЎ ЗБРОЕВАЙ ПАЛАТЫ МАСКОЎСКАГА КРАМЛЯ

Не пазней 11.6.1660 г.

Роспись имянная полоцким и витепским и вилинским серебреного и бронного, и [сабель]ного и замочного, винтовальных пища[лей] и ложевного, и токарного, и столярного, и загормистрельного, и коретного, и замочного дела к светлицам мастером и их учеником, хто кокому мастерству умеет и что л[юдей] в семье.

...И всего полоцких серебреного и бронного и ствольного и замочного, винтовальных пищалей мастеров и их учеников и жон их и детей мужеска полу и женска 85 человек.

Витепские серебреного дела мастеры: Ян Станиславов с женою да з дочерью. // Станиславка Иванов з женою да 2 дочери да племянница девка. Ивашка Красильников з женою да з дочерью. Якубко Семенов з женою да у него ж 2 дочери. Аничка Фролов з женою. Гаврилка Лавриков. Митрофанко Юрьев. Егубко Семенов. Петрушка Красовской.

Того ж мастерства ученики: Гришка Томкин, Пашка Орлов, Аничка Кухнарев, Федька Максимов, Федька Полоченинов, Сергейко Гаврилов.

Ствольного и замочного винтовальных пищалей мастеры: Климка Максимов з женою, // да у него ж сын да 2 дочери. Максимко Родионов з женою, да у него ж сын. Понтелейко Степанов з женою да з дочерью, да з племянницей з девкою. Назарка Иванов з женою, да у него ж сын да дочь. Гришка Богданов з женою, да у него ж сын да дочь. Павелко Яковлев з женою, да 2 дочери. Васька Быховец з женою, да у него ж сын да дочь да племянница, Мишка Васильев з женою, да у него ж своячина девка. Софонка Гаврилов з женою.

Того ж мастерства ученики:

Осипко Юрьев, Федька Матков, Ивашка Григорьев, // Микулка Мартинов, Софонка Яковлев, Федька Иванов, Данилко Белевин.

Всего витепских серебреного дела мастеров 9 человек, учеников их 6 человек, ствольного и замочного винтовальных пищалей мастеров 9 человек, учеников их 7 человек, жон их 14 человек, детей их мужеска полу 5 человек, женска полу 18 человек. И всего витепских серебреного и бронного и ствольного замочного винтовальных пищалей мастеров и их учеников и жон их и детей мужеска полу и женска 68 человек.

Витебские ж токари и столяры: Кирилка Толкачов з женою да у него ж 2 дочери. // Ивашка Микитин з женою да у него ж 4 дочери. Самулка Богданов з женою да у него ж дочь. Данилка Кокотка. Ивашка Дракуля.

Столяры: Давыдка Павлов з женою да дочь. Якубко Погорецкой з женою да у него ж сын да 2 дочери да своячина.

Всего витепских токарей 5 человек, столяров 2 человека, жон их 5 человек, детей их мужска полу 1 человек, женска полу 10 человек. И всего витепских токарей и столяров и их жон и детей мужска полу и женска 24 человека. //

...И всего вилинских замочного дела мастеров и их учеников и жон их и детей мужеска полу и женска 16 человек. //

Полоцких и витепских и вилинских серебреного дела мастеров 12 чел. Того ж мастерства учеников 11 человек. Бронного дела мастеров 5 человек. Учеников 2 человека. Ствольного и замочного винтовальных пищалей мастеров 21 человек. Учеников 17 человек. Ложевник 1 человек. Токарей 5 человек. Столяров 2 человека. Загормистров и коретного и замочного дела к светлицам мастеров 3 человека.

И всего полоцких и витепских и вилинских серебреного и бронного, и ствольного, и замочного винтовальных пищалей, и ложевнаго, и токарного и столярного, // и загормистрельного и коретного, и замочного дела к светлицам и мастеров 49 человек, учеников их 30 человек. Обоего мастеров и учеников 79 человек. Жон их 41 человек. Детей их мужска полу 47 человек; обоего детей их мужеска полу и женска 71 человек.

И всего мастеров и их учеников и жон их и детей 192 человека.

Дакумент друкуецца са скарачэннямі па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 430—433.

ЗАПІСЫ З ПРЫХОДНА-РАСХОДНАЙ КНІГІ ЗБРОЕВАЙ ПАЛАТЫ МАСКОЎСКАГА КРАМЛЯ АБ ВЫДАЧЫ БЕЛАРУСКІМ МАЙСТРАМ АКЛАДАЎ, ЖАЛАВАННЯ ЗА ПРЫЕЗД І ГРОШАЙ НА АПЛАТУ ПРАЦЫ

13 чэрвеня — 30 жніўня 1660 г.

...Июня в 13 день по приказу око[льничего][1] и оружейничего Богдана Ма[твееви]ча[1] Хитрово иноземцом поло[цким][1] и витепским и виленским Оружейного приказу мастеровым людем, которые присланы с Микитою Левошовым вновь, Понкрату Иевлеву с товарыщи 31-у человеку государева жалованья за их к Москве приезд по 10 рублев человеку, одному из них человеку для семьи 13 рублев, итого 313 // [рубле]в,[1] дано.[2] Да учеником ...ке[3] Понкратову с товарыщи [десят]и[1] человеком государева жалованья в приказ по 5-ти рублев человеку, итого 50 рублев, дано.[2]

Того ж числа при приказу окольничего и оружейничего Богдана Матвеевича Хитрово прежним витепским иноземцом Оружейного ж приказу мастеровым людем Климку Максимову с товарыщи 9-ти // человеком государева жалованья в [приказ][1] к прежней их даче ко шти [рублям][1] в добавку в 10 рублев по [четы]ре[1] рубли человеку, итого 36 рублев, дано.[2] Да учеником их Осипку Юрьеву с товарыщи 7-ми человеком государева жалованья в приказ к прежним к трем рублям в добавку в 5 рублев по 2 рубли человеку, итого 14 рублев, дано.[2] А о даче тех денег помета на росписи окольничего и оружейничего Богдана Матвеевича Хитрово. Росписка в тех деньгах на росписи в столпу. //

...Того ж числа[4] по приказу окольничего и оружейничего Богдана Матвеевича Хитрово иноземцом витепским Оружейного приказу розных дел мастеровым людем Климку Максимову с товарыщи 10-ти человеком государева жалованья поденного корму на 3 месяца, апреля с 1 числа июля по 1 число, // по полтора рубли человеку...,[3] итого 46 рублев...[3] натцать алтын 4 де[ньги, дано].[1]

Того ж числа иноземцом Оружейного приказу наводного дела мастером Савке Совостьянову с товарыщи осьми человеком на наручи на уголье по 10-ти алтын человеку, итого 2 рубли 13 алтын 2 деньги, дано.[2] //

Того ж числа иноземцом витепским ствольного дела мастером Климку Максимову, Ваське Быховцу, Луке // Жюрину, велено им здел[ать по ду]лу[1] винтовальному в длину [полто]ра[3] аршина с вершком, и им [на][1] железо и на уголье по рублю человеку, итого 3 рубли, дано.[2]

... Того ж числа иноземцом витепским замочным мастером Мишке Васильеву, Данилку Афонасьеву, велено им зделать по 2 замка добрые к винтовальным пищалем, и им на железо и на уголье по // [полтин]е[1] человеку, итого рубль, дано.[2]

[Того ж чис]ла[1] Гришке Богданову, Паньке Яковлеву велено им зделать четверы стремена прорезные, и им на железо и на уголье и на полуду 2 рубли, дано[2].

Того ж числа карабинного дела мастеру иноземцу Федьке Помозу велено зделать карабинной замок, и ему на железо и на уклад и на // уголье 8 алтын 2 д[е]н[ьги дано].[1]

Того ж числа иноземцу Мат[вею][3] Левонтьеву велено зделать пару пистольных замков, и ему на железо и на уклад и на уголье 16 алтын 4 деньги, дано[2] ...

...Того ж числа[5] иноземцом ствольным мастером Понкрату Иевлеву с товарыщи шти человеком велено им зде[лать][3] // [ше]сть[3] пищалей винтованных, [и и]м[3] на уголье по штинат[ца]ти[3] алтын по 4 деньги человеку на пищаль, да на уклад по 3 алтына по 2 деньги на замок, итого 3 рубли 20 алтын, дано.[2]

Того ж числа полотцкому иноземцу ствольному мастеру Петру Мартынову велено зделать вновь карабин да пистоль совсем в отделке, и ему на // на уголье 20 алтын [да на][3] уклад на замки по тр[и алтына] по 2 деньги на замок, [ито]го[3] 6 алтын 4 деньги, дано.[2] ...

Того ж числа иноземцам сабельным мастером Ивану Иевлеву с товарыщи 4-м человеком велено зделать к осьми полосам сабельным ножны и крыжи совсем в отделке, по 2 полосы человеку дано ис казны, и на ту сабельную оправу на крыжи, и на олово, и на уголье, и на доски, и на медь, и на клей, и на фар // ...,[3] [и на][1] кожю, и на железо по 15 алтын по 4 деньги на саблю, итого на 8 сабель 3 рубли 25 алтын 2 деньги, дано...[2]

...Того ж числа[6] иноземцом витепским токорем Кирюшке Степанову с товарыщи 5-ти человеком велено им зделать порашницу да шахмот да чернильницу, и им на лосиною кость на покупку рубль дано.[2] //

...Того ж числа[7] иноземцу Лучке Жюрину велено зделать 2 ствола винтовальных. На железо и на уголье 2 рубли дано[2]...

...Того ж числа[8] коретного дела мастеру иноземцу Гришке Жданову государева жалованья поденного корму июля с 1 числа сентября по 1 число 169 году по 10 денег на день, итого 3 рубли, дано.[2] Помета о том на челобитной дьяка Богдана Арефьева. //

...Того ж числа[9] иноземцу токарю Матвею Петрову велено зделать государю царевичю кресла точеные, и ему на липовое деревья 16 алтын 4 деньги дано...[2]

...Августа в 14 день иноземцом Оружейного приказу ствольным мастером Понкрату Иевлеву с товарыщи // шти человеком велено зделать 6 пищалей винтовальных совсем в отделке, и им на стволы, на железо и на уголье по рублю человеку на пищаль, да на замки по 8 алтын по 2 деньги на замок, итого 7 рублев 16 алтын 4 деньги, дано.[2]

Того ж числа иноземцу ствольному мастеру Петру Мартынову зделать пару пистолей щкотцкими замками, // и ему на железо и на уголье и на сталь 2 рубли, дано.[2]

Того ж числа иноземцу замочному мастеру Петру Васильеву велено зделать 4 замка к винтовальным пищалем, и ему на замок по 8 алтын по 2 деньги итого 16 алтын 4 деньги, дано.[2]

Того ж числа иноземцу замочному // мастеру Ваське Иванову велено зделать 2 замка карабинных, 2 замка пистольных, по осьми алтын по 2 деньги за замок, итого рубль, дано.[2]

Того ж числа иноземцом сабельным мастером Ивану Иевлеву с товарыщи 4-м человеком велено зделать по 5-ти сабельных ножен и с крыжами к готовым полосам 20 полос. Дано им ис казны, // а на приклад по 15-ти алтын по 4 деньги на саблю, итого 9 рублев 13 алтын 2 деньги, дано.[2] Взял деньги Григорей Литовитцкой.

Того ж числа иноземцу коретному мастеру Алексею Дмитрееву велено зделать 4 бердыша, и ему на уголье 13 алтын 2 деньги, дано.[2] // ...

Того ж числа[10] иноземцом Оружейного приказу розных дел мастером Федьке Гаврилову, Кузьке Мартынову, Ивашке Дмитрееву государева жалованья поденного корму июля с 1 числа сентября по 1 число по 10 денег на день человеку, итого 9 рублев 10 алтын, дано.[2] Помета о том на челобитнай дьяка Богдана Арефьева.

---

[1] Тэкст страчаны, адноўлены па сэнсу і аналогіі з іншымі запісамі.
[2] Слова «дано» ўпісана пазней іншым почыркам.
[3] Тэкст страчаны.
[4] 14 чэрвеня.
[5] 20 чэрвеня.
[6] 4 ліпеня.
[7] 14 ліпеня.
[8] 19 ліпеня.
[9] 26 ліпеня.
[10] 30 жніўня.

Друкуецца па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 433—436.

АДПІСКА ВІЦЕБСКАГА ВАЯВОДЫ Н.М.БАБАРЫКІНА СМАЛЕНСКАМУ ВАЯВОДЗЕ Б.А.РАПНІНУ ПРА ЗМЕНУ ПРЫСЛАНЫХ У СМАЛЕНСК ДЛЯ ГАРАДСКОЙ СПРАВЫ ВІЦЕБСКІХ ЦАГЕЛЬНІКАЎ І ГАНЧАРОЎ. СПІС ЦАГЕЛЬНІКАЎ І ГАНЧАРОЎ, АДСЫЛАЕМЫХ У СМАЛЕНСК НА ЗМЕНУ ПРЫСЛАНЫХ РАНЕЙ

13.7.1660 г.

Господину князю Борису Александровичю Микита Боборыкин с товарыщи челом бьют.

Нынешнего, господине, 168 году июля в 13 день по указу великого государя царя и великого князя Алексея Михайловича, всеа Великия и Малыя и Белыя России самодержца, посланы из Витепска в Смоленск витепские гончары к городо[во]му кирпичному делу Ивашко Начовка с товарыщи 40 человек витепским же прежним ганчаром на перемену Ивашку Алешкину с товарыщи.

И тебе б, господине, прежним кирпищиком об отпуске учинить по указу великого государя, а хто имены гончаров из Витепска в Смоленеск на перемену прежним гончарам послано, и тем имена под сею отпискою, а больши тех гончаров в Витепску не сыскано. //

Имена витепским гончаром, которым ити в Смоленеск на перемену витепским прежним гончаром.

Карпушка Начовка, Ивашка Начовка, Хомка Цветуха, Гришка Автух, Самуска Магеев, Осипко Вольской, Марчка Сластенник, Сенька Шерапов, Лавринко Водовозов, Масейко Шерапов, Корнилко Шерапов в Смоленске, Якимка Седушка, Стенька Метелица, Кондрашка Медведь, Левонко Медведь, Михалко Медведь, Савостька Медведь, Ивашка Прокуда, Гришка Прокуда, Наумко Артемьев, Алешка Пухов, Микифорко Стретов в Смоленску, Стенька Ретька, Власко Жилин, Васька Ласен, Якушко Смута, Микитка Федоров, Фетька Скробин, збежал, Артюшка Подавалица, Тишка Войлицов, Андрюшка Демидов, Куземка Латышев, Кирилко Марков, збежал и з женою, Ивашка Брезгун, Сенька Иванов, Тараска Марков, Авсейко Соровайцов, Фетька Кухоренок, Андрюшко Кузмин, збежал, Филипка Маснев, Тимошка Баран.

Июля в 13 день такова ж отписка послана в Смоленеск с витепским гончаром с Карпушкой Начовкой с товарыщи.

Друкуецца па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 437—438.

ЗАПІСЫ З РАСХОДНАЙ КНІГІ ЗБРОЕВАЙ ПАЛАТЫ АБ ВЫДАЧЫ СЛАНОВАЙ КОСЦІ БЕЛАРУСКІМ РЭЗЧЫКАМ

5.10.1661 г. — 11.2.1662 г.

...Октября в 5 день по указу великого государя Оружейные палаты костяного дела токарем иноземцом Кириле Толкачеву с товарыщи слоновой кости по весу 10 фунтов, дано. Велено им зделать великому государю царевичу и великому князю Алексею Алексеевичу, всеа Великия и Малыя и Белыя Росии, 12 коней белых и чорных, а на тех бы конех были люди...

Генваря в 26 день по указу великого государя Оружейные полаты костяного дела токарем иноземцом Самойлу Богданову с товарищи 5-ти человеком слоновой кости по 10 фунтов с полуфунтом, дано. Велено им делать шахмоты, сколько будет. //

Февраля в 11 день по указу великого государя Оружейные полаты костяного дела токарем иноземцом Ивану Микитину с товарищи слоновой кости по весу 22 фунта, дано. Велено им делать шахмоты добрые, сколько будет...

Друкуецца па кн.: Русско-белорусские связи. Сборник документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 454.

ПРЫВІЛЕЙ КАРАЛЯ АЎГУСТА ІІІ НА ЗАСНАВАННЕ Ў ВІЦЕБСКУ КУПЕЦКАЙ ДУМЫ. УСТАЎ ДУМЫ

12.12.1738 г.

Августъ III, Божіею милостію, король Польскій, великій князь Литовскій, Русскій, Прусскій, Мазовецкій, Жмудскій, Кіевскій, Волынскій, Подольскій, Инфляндскій, Смоленскій и Черниговскій, наследственный князь Саксонскій и курфирст.

Объявляем сею грамотою привилегіею нашею всем и каждому, кому бы о том ведать надлежало, что принесена нам сенаторами и чинами, при нас состоящими, просьба и челобитная

от Витебских мещан и купцов, подданных наших, о том, что в купечестве и торговле их нет никакого порядка, потому что прибылые отовсюду люди, поселясь на землях разных ведомств (juryzdykach) в городе, предместьях и за городом, равно как и пріезжіе, ведя всякую торговлю валовую, водную и портовую, а также в лавках, не подчиняются ведомству и суду городскому и не хотят платить надлежащих податей Речи Посполитой и городских повинностей в ратушу. Вследствіе этого, старожилые Витебскіе мещане и купцы, в городском ведомстве состоящіе, дошли до большой нищеты и гибели, так что, по причине частаго разоренія и опустошенія огнем большей части города и вследствіе разных других потерь, ведя притом торговлю без должнаго порядка и лада, — не в состояніи выполнять платежа податей Речи Посполитой. А посему покорно просили, чтобы мы привилегіею нашею соизволили дать и назначить им купеческую думу (izbę kupiecką) с тем, чтобы ни один мещанин, не приписавшійся к купеческой думе и не принесшій присяги, не смел торговать и продавать, под страхом лишенія товара — одной половины на нас, а другой в пользу Витебскаго магистрата и купеческой думы. А так как они при том представили устав (artykuly), столь необходимый для установленія купеческих порядков и собраній, то мы, по тщательном разсмотреніи, приняли таковый и, за утвержденіем нашим, выдали им для всегдашняго и безпрепятственнаго употребленія как ныне, так и в последующія времена. Каковой устав следующій: Статья 1. Ежегодный выбор установляется в день св. Николая, праздника Римскаго, на котором избираются шесть старшин купцов из людей достойных, которые должны управлять и распоряжаться в теченіи целаго года и выслушать, надлежащим порядком, счеты; в этот же срок избрать других шесть купцов, для смены, и передать им управленіе. Такой же порядок соблюдается и в отношеніи третьей смены, а по истеченіи третьяго года заседают опять, своим порядком, первые выборные. Статья 2. В случае выбытія кого либо из сих смен, должны избрать из среды своей (купцы) также достойнаго купца и представить магистрату, за признаніем и согласіем котораго допускают его к заседанію; должен он, однакож, занимать не упразднившееся место, а последнее, — и так далее. Статья 3. Общих (walne) купеческих собраній должно быть четыре в году, то есть каждую четверть года, аккуратно, в восьмом часу утра, за предварительным оповещеніем всех купцов, чрез служителей, в каковое собраніе еслибы кто не прибыл, без уважительной причины, должен уплатить в купеческую кассу 24 гроша. Старшіе же купцы заседают на своих местах еженедельно два раза — во вторник и в четверг, в девятом часу утра, для купеческих дел, а еслибы который не явился, то за всякое таковое отсутствие должен уплатить шесть грошей штрафа в купеческую кассу; но еслибы который из них без ведома уехал, то платить в кассу штраф две копы, — за чем старшіе должны строго наблюдать. В случае же смерти котораго либо или нахожденія в пути, магистрат должен заместить его своим ратманом, а еслибы этот последній оказался нерадивым, то должен уплатить штраф 24 гроша. Впрочем, два члена могут обсуждать и решать купеческія дела, а еслибы который заболел, то магистрат должен командировать члена из своей среды. Статья 4. Еслибы случились какія обиды со стороны других купцов, вне магдебургскаго ратушнаго права находящихся, и о которых было бы донесено инстигатором старшим годичным (членам думы), то таковыя (обиды) всемерно устранять, совместно с гг. ратманами, за решеніем магистрата (cum magistratus consilio), на счет купеческой кассы, и сильно защищать права. Помехи в торговле, купле и продаже один другому чинить не должны; нарушителей сего судить совместно с двумя ратманами, от магистрата командированными, со взысканіем, соответственнаго делу, штрафа в купеческую кассу. Еслибы кто сему общественному порядку воспротивился, то годичные старшіе должны о таковом донести магистрату и искать с него удовлетворенія, а (сіе судебное) учрежденіе должно безотлагательно постановлять решеніе и приводить оное в действительное исполненіе. Ремесленникам никакой торговли не дозволять, а еслибы какой ремесленник занялся купечеством, то о таковом донести магистрату и требовать наказанія его; за чем магистрат обязан строго наблюдать. Еслибы купцы друг с другом, с лавочником, либо с слугою имели дело о купеческих счетах, то старшіе должны учинить разбирательство, — кроме случая апелляціи короне, с указом магистрату, — магистратом же налагается штраф два злотых в купеческую кассу, а еслибы дело шло о брани неприличными словами, тогда определеніе штрафа принадлежит суду войтовскому. Статья 5. В купеческой думе каждый должен занимать свое место, по порядку, и в делах купеческих голоса должны быть подаваемы также по порядку, без всяких колкостей и неприличных выраженій, из уваженія к магистрату, под штрафом по определенію, и магистрат будет всегда содействовать купеческой думе. Статья 6. Купеческій денежный ящик должен находиться всегда в ратуше, за двумя ключами, из коих одному быть у ратмана, а другому у старших текущаго года, занимающих в заседаніи первыя места; в каковом ящике должны храниться

все дела, привилегіи, купеческія приходо-расходныя книги, и один без другаго открывать оный не должны, а только совместно, при старших и с общаго согласія. Таким же порядком действовать и распоряжаться и следующим после них (выборным) на другой год, после отдачи им надлежащаго отчета и передачи в целости денег, которых не обращать ни на что другое, как только на охрану прав и интересов купеческой думы, с тем, что еслибы потребовались деньги на какое-либо купеческое дело, то таковыя должно брать не иначе, как с разрешенія магистрата, который невправе отказать в них на действительную потребу. Статья 7. Купеческіе денежные склады должны быть платимы ежегодно, по распределенію, в пропорціи, на каждаго из купцов, и вкладываемы в купеческій ящик, от каковых складок освобождаются лишь годичные, прикомандированные из магистрата, ратманы и писарь; затем, магистрат, сделав раскладку, обязан, согласно с таковою, собирать деньги и передавать в купеческій ящик. Также и годичные заседающіе (выборные купеческой думы) освобождаются от складчины. Статья 8. Еслибы кто захотел торговать в лавке, должен вкупиться в книгу купеческой думы; иначе не дозволять такой торговли. Фальшивые весы и меры обнаруживать и за оные наказывать. Посторонним и пріезжим людям мелочная продажа, а ремесленникам цеховым и нецеховым торговля воспрещается; нарушителей же сего вызывать мандатом (позывом) к нам или в магистрат и судить строго. Статья 9. В купеческой думе иметь писаря, который должен вести в ней дела и всякія книги, а также выдавать, кому будет нужно, из купеческой думы разныя бумаги, — с производством ему годичной платы из купеческой кассы, а еслибы он к исправленію своей должности признан был негодным, то дозволяется заменить его другим. Статья 10. В купеческой думе иметь двух присяжных служителей, для оповещенія о собраніях и делах купеческих и двух младших из лавочников для услуг. Статья 11. В купеческой думе иметь четырех людей, которые обязаны наблюдать за пріезжими купцами с товарами и о тех, которые хотя и Витебскіе мещане, но живут не под городским ведомством, а между тем занимаются торговлею и производят обмен товаров доносить старшим. Статья 12. Установляется для дел при купеческом денежном ящике печать с вырезкою на ней герба св. Николая, которую купеческому обществу употреблять для клейменья товаров, где бы купец с купцом торговал и возникло бы спорное дело пред старшими, а также выдавать и употреблять и по другим купеческим делам. Статья 13. Все купеческіе прикащики, как городскіе, так и прибылые, выслужив лета, принимаются в купеческую думу не прежде, как по представленіи их магистрату, принесеніи присяги и после пропорціонального взноса вкупных денег в купеческую кассу, а еслибы который воспротивился сему, таковаго товары должны быть забраны, из коих одна половина поступает на нас, а другая на купеческую думу. Статья 14. Никто из купцов не должен препятствовать один другому в торговле, перекупать и перенимать сторгованные товары, под штрафом 20 талеров в пользу купеческой думы. Статья 15. Купцы, вписанные в купеческую думу, не должны принимать посторонних купцов в товарищество и торговлю, под штрафом 20 талеров. Пріезжіе купцы, в силу привилегій, должны останавливаться с товарами в гостинном дворе или у присяжнаго купца. Статья 16. Еслибы прикащик причинил в торговле убыток своему хозяину, то взысканіе налагать должен магистрат; один другому отказывать не должен, под штрафом 20 талеров в кассу. Статья 17. Сія же купеческая дума нашего города Витебска должна применяться во всем к правилам города Вильны. Затем, мы, король, милостиво снисходя к помянутой просьбе и челобитной нашего города Витебска, сію привилегію городу Витебску, на предмет учрежденія купеческой думы, во всех ея (привилегіи) статьях и пунктах, силою и властію нашею королевскою навсегда утверждаем, укрепляем и одобряем во увереніе и утвержденіе чего, мы (грамоту сію) собственною рукою нашею подписав, повелели приложить к ней в. к. Лит. печать. Дана в Варшаве, 12 дня месяца Декабря лета Господня 1738, царствованія же нашего в 6-й год. Подлинная подписана сими словами:

Август Король.

(М.П.) Привилегія на купеческую думу в городе Витебске.

Феликс Овсяный, чешник Волковыскій, е. к. в. большой печати в. к. Лит. секретарь.

Пераклад з польскай мовы.

Друкуецца па кн.: Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Витебск, 1883. Т. 1. С. 192—195.

Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў 14—18 ст.

Новы этап горадабудаўнічага развіцця Віцебска прыпадае на 14 ст. і звязаны перш за ўсё з дзейнасцю князя Альгерда Гедзімінавіча (1296—1377). Пры ім старажытны дзяцінец трансфармаваўся ў Верхні замак, а акольны горад набыў значэнне Ніжняга замка. У выніку гэтага гарадская планіроўка атрымала больш арганізаваны, рэгулярны характар, бо ў склад агульнагарадской цытадэлі трапіла значная частка тэрыторыі горада. Пры Альгердзе драўляныя ўмацаванні замяняюцца мураванымі сценамі і вежамі. Іх агульная даўжыня перавышала 1750 м.

Мураваныя замкі Віцебска пабудаваны ў даволі сцісłыя тэрміны — недзе за 30 гадоў. Будаўніцтва завершана ў 1351 г. другой жонкай Альгерда княгіняй Ульянай. Акрамя абарончых умацаванняў, у Верхнім замку змураваны княжацкія палаты. На высокім узвышшы ўсходняга канца Заручаўя, дзе знаходзіўся курганны могільнік, Альгерд змураваў Святадухаўскую царкву, а яго жонка Ульяна заснавала пры храме жаночы манастыр, дзе ў 1393 г. прыняла пастрыг пад імем Марыі і пражывала тут да сваёй смерці. Яна ж у 1345 г. пабудавала на Узгор'і драўляную царкву Іаана Багаслова. Альгерду ж належыць таксама адбудова саборнай Дабравешчанскай (Благавешчанскай) царквы на Ніжнім замку. У канцы 14 — пачатку 15 ст. на Лысай (Успенскай) гары была пастаўлена драўляная царква Успення Прачыстай Багародзіцы, якая ўпершыню згадваецца ў гістарычных дакументах пад 1406 г. У выніку агульная гарадская кампазіцыя атрымала новыя выразныя дамінантныя аб'ёмы, якія зафіксавалі яе паўднёва-ўсходнюю, паўночна-ўсходнюю і паўночна-заходнюю кропкі.

Рэканструкцыя горада Альгердам і Ульянай у 14 ст. значна ўзмацніла яго абарончую сістэму, якую ў той час не меў ніводзін з беларускіх гарадоў. Таму невыпадкова віцябляне паспяхова адбівалі напады моцных войскаў у 1393, 1396 і 1435 гг.

У выніку ўсіх гэтых ваенных дзеянняў гораду былі нанесены вялікія страты. Асабліва пацярпелі абарончыя муры, узведзеныя Альгердам і Ульянай. Але пасля 1435 г. і да пачатку 16 ст. віцябляне жылі адносна спакойна і адбудавалі горад. Ён некалькі пашырыўся тэрытарыяльна, прычым не толькі ў сваёй асноўнай левабярэжнай частцы, але ўзнікае паселішча ў правабярэжнай частцы, якая атрымала агульную назву Задзвінне.

Віцебск увайшоў у лік дзяржаўных («каралеўскіх») гарадоў, дзякуючы чаму яго насельніцтва атрымлівала ад вярхоўнай улады пэўныя правы і прывілеі. Гэта станоўча спрыяла развіццю гарадской забудовы. Асабліва ўзрос статус горада з 1506 г., калі ён быў зроблены цэнтрам буйнога ваяводства. Тут пачалі з'яўляцца адміністрацыйна-грамадскія збудаванні.

На працягу 16 ст. (1502, 1516, 1519, 1534—36, 1562, 1563, 1568) віцебскім умацаванням давялося вытрымаць шэраг удараў з боку рускіх войскаў. У выніку Віцебск аказаўся страшэнна разбураны і спустошаны. Ад былых мураваных умацаванняў Альгерда заставалася толькі адна амаль што разбураная сцяна і моцна пашкоджаная мураваная вежа над Дзвіной. Але горад паступова адраджаўся, пашыралася яго забудова. Замкі былі адбудаваны з дрэва.

У 16 ст. цэнтральная частка Віцебска, ахаваная замкавымі сценамі, забудоўвалася надзвычай шчыльна. Напрыклад, у Ніжнім замку, які з Верхнім злучаўся Замкавай брамай па вуліцы Прабойнай, што прылягала да вуліцы Вялікай, пабудовы размяшчаліся нават пад замкавымі сценамі і валамі, што ў стратэгічных адносінах было нязручна, бо перашкаджала войскам манеўраваць уздоўж абарончых збудаванняў.

У дакументах гэтага часу згадваюцца вуліцы Вялікая, Вялікая Задунаўская, Прабойная, Казьмадзем'янскі завулак. У 16 ст. актыўна забудоўваецца Узгор'е, асноўнай восю якога з'яўлялася вуліца Вялікая (сучасная — Леніна). Узгорскі пасад называўся таксама Завіцебным, злучаўся з Ніжнім замкам мостам праз Віцьбу і Завіцебнай брамай. У дакуменце 1592 г. Завіцебны пасад ужо названы «месцам», гэта значыць ён адносіўся да асноўнай гарадской тэрыторыі. Каля гэтага «месца» ўзніклі новыя гарадскія ўчасткі: Вострая магіла, Завіцебныя палі, Уваскрасенскае, Іванскае Багаслоўскае, Фёдараўшчына каля Яркова рова (раён сучаснай вуліцы Баўмана). Дакумент 1596 г. сведчыць, што да гэтага часу Узгор'е было абнесена астрогам, пракладзена вуліца, што ішла да прадмесця Пісарэўшчына. Тут жа на Узгор'і пачала фарміравацца новая гандлёвая плошча з крамамі.

Гістарычныя крыніцы паказваюць, што забудова Віцебска ў 16 ст. развівалася нераўнамерна. Гэта ў немалой ступені вызначылася складаным рэльефам з яго шматлікімі пагоркамі, лагчынамі, ярамі і іншымі перашкодамі. Гарадская забудова развівалася у асноўным ад замкаў уздоўж Дзвіны і Віцьбы, дзе яна была больш шчыльнай. У 1-й палавіне 16 ст. паўночная частка Узгор'я яшчэ не была заселена, бо ў дакуменце 1522 г. сказана, што царква Іаана Багаслова, якая тут знаходзілася, «на поли стоит за местом».

Усходняя частка Заручаўя пачала засяляцца яшчэ пазней, у 17—18 ст. У той час у раёне Святадухаўскай царквы, якая раней стаяла «у полі», утварылася новае прадмесце — Духаўская слабада. Задунаўская слабада ўзнікла ў 14 ст. і да 16 ст. не мела рэгулярнай забудовы. Толькі ў 16—17 ст. слабада становіцца адным з гарадскіх пасадаў. На тэрыторыі Кстоўскай гары, як і на Задунаўі, знаходзіліся старажытныя могілкі. Тут існавала невялікая Кстоўская слабада, а на поўнач ад яе — слабада пры Мікалаеўскай Завіцьбенскай царкве. У Задзвінні найбольш старажытнай з'яўлялася паўднёвая частка, вядомая пад назвай Русь. Пазней склалася паўночная частка, якая называлася Прысмушкамі. Тут таксама вядомы такія гістарычныя мясцовасці, як Ярова, Ялагі, Ілліншчына, Юр'ева горка і інш. Яны з'яўляліся прадмесцямі.

У 1597 г. Віцебску нададзена магдэбургскае права, у сувязі з чым пачынае больш актыўна развівацца забудова Узгор'я. Паводле прывілея на магдэбургскае права, падпісанага каралём Жыгімонтам III, мяшчане былі павінны збудаваць новую гандлёвую плошчу з ратушай.

Наданне Віцебску магдэбургскага права (адменена імператрыцай Кацярынай II у 1775 г.) паўплывала на далейшае развіццё яго архітэктурна-планіровачнай структуры. Фарміраванне новага адміністрацыйна-грамадскага цэнтра на Узгор'і (раней рынак існаваў у Ніжнім замку) пашырыла цэнтральную частку горада і на правабярэжжа Віцьбы. З гэтых часоў Узгор'е пачало паступова набываць усё большае значэнне ў архітэктурным ансамблі горада. І калі Верхні і Ніжні замкі выконвалі ў значнай меры ваенна-стратэгічную ролю, то Узгор'е набыло выразна акрэсленую грамадскую функцыю.

Да канца 16 ст. Віцебск з'яўляўся фактычна праваслаўным горадам. Паводле дакументаў гэтага часу вядома не менеш 18 цэркваў: мураваныя — Дабравешчання Багародзіцы і Сашэсця Св. Духа, драўляныя — Троіцкая, Мікалая, Іаана Багаслова, Уваскрасення Хрыстова (Васкрасенская рынкавая), Параскевы Пятніцы, архангела Міхаіла (замкавая), Уваскрасення Хрыстова (Васкрасенская заручаўская), Пакравоў Багародзіцы, Іаана Хрысціцеля, Сімяона Столпніка, Пятра, Успення Багародзіцы, Спаса-Праабражэння, Дзмітрыя, Барыса і Глеба, Казьмы і Дзям'яна. У дакуменце 1552 г. сказана, што «инших церквей в месте не мало, нижли ку ним людей, земли и наданя ни которого нет».

Акрамя праваслаўных цэркваў, у 16 ст. існаваў рэфарматарскі храм, які належаў кальвінскай абшчыне. Яе паяўленне было звязана з трывалымі гандлёвымі сувязямі Віцебска з Рыгай, Круляўцом і інш. прыбалтыйскімі гарадамі. Відаць, адтуль рэфармацыйны рух і прыйшоў у Падзвінне. У 2-й палавіне 16 ст. кальвіністы пабудавалі на Ніжнім замку драўляны збор, вучылішча і шпіталь. Але ў сярэдзіне 17 ст. гэтыя збудаванні разабраны і іх матэрыял выкарыстаны для ўмацаванняў Узгорскага замка. Потым гэтае месца забудавана мяшчанскімі дамамі. Пасля 1667 г. канцэньёр беларускай правінцыі Хрыстафор Жарнавіт адсудзіў у магістрата былыя кальвінскія пляцы, але невядома, ці адбудавалі збор.

Першы касцёл у Віцебску з'яўвіўся ў пачатку 15 ст. паводле фундацыі караля Ягайлы-Уладзіслава II. Належаў ён манахам-францысканцам. Доўгі час гэта быў адзіны каталіцкі храм у горадзе, абслугоўваў невялікую колькасць выхадцаў з Польшчы, якія тут знаходзіліся на дзяржаўнай службе ці займаліся гандлёвымі справамі. У сярэдзіне 16 ст. касцёльнага будынка ўжо не існавала і набажэнствы адбываліся ў прыватным доме. Папскі легат Антоній Пасевін, які наведаў у той час Віцебск, застаў тут двух манахаў-езуітаў, якія стаялі на чале мясцовай каталіцкай абшчыны. Але да 17 ст. яны не здолелі ўзвясці асобнага будынка.

Пасля прыняцця Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі ў 1596 г. становішча рэзка змянілася. Полацкі ўніяцкі архіепіскап Іасафат Кунцэвіч (1580—1623) пазачыняў усе праваслаўныя цэрквы, многія з якіх былі перароблены ва ўніяцкія. Для адпраўлення богаслужб праваслаўнае насельніцтва пабудавала 2 вялікія шопы: адну ў Заручаўі, другую ў Задзвінні, насупраць Успенскай саборнай царквы. У 1640 г. на месцы былой царквы



Рэканструкцыя Віцебскіх замкаў 16—17 ст. паводле А.П. Сапунова. I. Верхні замак: 1 — палац князя Альгерда; 2 — царква св. Міхаіла; II. Ніжні замак: 7 — царква Звеставанн; 8 — вуліца Вялікая; 3 — Замкавая брама; 4 — Завіцебная брама; 5 — Задунайская брама; 6 — Заручайская брама.

Параскевы Пятніцы быў заснаваны касцёл езуітаў з кляштарам і калегіяй.

У 1-й палавіне 17 ст. Віцебск некалькі вырас тэрытарыяльна, узніклі новыя раёны (Псіная палянка, Узгорскі пасад і інш.). У той жа час працягвалася ўмацаванне Узгор'я. Паводле сведчання невядомага аўтара 1632 г., тут «почат город делать земляной, да не доделан, а стоит на горе, а не строен... дворов мещанских с 2000, стоят не стройно, врозни...». З гэтага можна зрабіць выснову, што забудова Узгор'я развівалася некалькі бессістэмна. Праўда, колькасць двароў выклікае сумненне.

Архітэктурнае аблічча Віцебска напярэдадні вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. наглядна ілюструюць інвентары таго часу. Яны паказваюць, што Верхні замак знаходзіўся ў моцна разбураным стане. На тэрыторыі Верхняга замка знаходзіліся 52 двары гараджан (з іх 34 — шляхты), арсеналы з узбраеннем і ваенным рыштункам.

Да пачатку баявых дзеянняў прадпрымаліся спешныя спробы аднавіць умацаванні Верхняга замка з дрэва. Гэта нагадвала «латанне дзірак». Інвентар паказвае ў Верхнім замку 47 двароў шляхты і іншых мяшчан. Жыллё заможных гараджан названа «дамамі», у той час як рамеснікі мелі «хаты» і «халупы». Верагодна, гэтыя збудаванні адрозніваліся адно ад другога памерамі і ступенню добраўпарадкавання. Акрамя іх, у замку знаходзіліся драўляная царква Міхаіла, замкавы свіран, некалькі пуняў і клецяў, стайня ваяводы. Усяго ў замку было 7 мураваных вежаў. Інвентар 1640-х гадоў пералічвае тут 96 двароў шляхты і мяшчан, 5 пуняў, цэрквы Пятніцы і Дабравешчання, рэфарматарскі (кальвінскі) збор.

Узгор'е з'яўлялася самай значнай часткай горада. Сюды з канца 16 ст. перамясціўся дзелавы цэнтр, які раней размяшчаўся на тэрыторыі Ніжняга замка. Каля мосту цераз Віцьбу склаўся ансамбль гандлёвай плошчы, галоўнай пабудовай якой з'яўляўся гасціны двор. Да яго з плошчы вялі вялікія «вечныя» вароты, над якімі размяшчаўся ярус з гарадскім гадзіннікам і вялікім гадзіннікавым звонам. Забудову двара складалі дом тыпу заезжай карчмы з кухняй і святліцай абапал сеняў, 8 складскіх збудаванняў для хавання купецкай маёмасці, важніца з 2 вагамі і 12 гірамі для ўзважвання тавараў. На рынку знаходзіліся 74 крамы, якія падзяляліся на рынкавыя (36), ганчарныя (8), саляныя (6) і мясныя (24). Акрамя іх існаваў пірожны рад — крыты прылавак з дошак, падзелены на «локці».

У інвентары 1640-х гадоў адзначана, што ў гасціным двары кухня пераўтворана ў курную жылую ізбу, з'явіліся стайня і памяшканне для паседжанняў магдэбургскага суда. Такім чынам, гасціны двор пачаў набываць функцыі ратушы. У гэты час на рынку налічвалася 80 крам і камор, якія ў дзвюх процілеглых лініях забудовы ўтваралі гандлёвыя вуліцы.

У 1641 г. ва Узгорскім пасадзе вылучаліся 2 часткі: адна абкружала рынак і налічвала 77 сялібных пляцаў; другая, з 140 пляцамі,



Збудаванні Верхняга замка (з «Чарцяжа» Віцебска 1664). Уверсе: Вялікая праезная брама (злева); Міхайлаўская царква. Унізе: дом Горскага (злева), вежа «Бабарыкін круглік».

уключала Багаслоўскі завулак, Падзвінскую і Багародзіцкую вуліцы, прырэчныя тэрыторыі «ўніз па Віцьбе». Інвентар 1640-х гадоў называе на Узгор'і 332 двары. Яго тэрыторыю абмяжоўваў ручай Слізкі. Вуліца вяла да брамы, ад яе адыходзілі завулкі. У пасадзе знаходзіліся 3 цэрквы: Іаана Багаслова, Троіцкая і Прачысценская. Жылі тут пераважна рамеснікі.

У 1641 г. ў пасадзе на Псінай палянцы налічвалася 20 дамоў без агародаў (з іх 8 пушкарскіх), адзін пляц з агародам і 11 асобных агародаў. У Задунаўскім пасадзе знаходзіліся 4 дамы і 1 хата без агародаў, 24 пляцы з дамамі і агародамі, 8 пляцаў і 3 асобныя агароды, Заручаўскі пасад налічваў 32 дамы з агародамі і 3 дамы без агародаў; Слабадскі — 97 участкаў з дамамі і агародамі, 15 — з «халупамі» і агародамі, 2 — з хатамі і агародамі, 2 дамы і 2 «халупы» без агародаў, «халупу з садком», пляц, пляц з агародам, пляц з 3 дамамі і агародам; Рускі пасад — 20 участкаў з дамамі і агародамі, 2 пляцы (на адным з іх 2 дамы), 2 «убогія халупкі» і 4 агароды. Акрамя таго, існавалі ў розных юрыдыках, што належалі архіепіскапу, віленскай капітуле, віцебскаму земскаму суддзі і шляхце, 596 двароў. Усяго ў 1641 г. было 1027 двароў (без уліку Ніжняга замка).

Інвентар 1640-х гадоў пасад на Псінай палянцы не называе, у Задунаўскім пасадзе адзначае 61 двор і гумно, у Заручаўскім — 158 двароў, царкву Св. Духа, Заручаўскую браму з багадзельняй (шпіталем) каля яе, у Слабадскім (за Дзвіной) — 165 двароў з агародамі, у Рускім — 207 двароў і царкву Св. Пятра «над ракой». Усяго ў гэтым дакуменце згадваецца 1066 двароў, што блізка да даных інвентара 1641 г.

У сярэдзіне жніўня 1654 г. ў горадзе пачалася спешная падрыхтоўка да адбіцця штурму рускіх войскаў. Для ўзмацнення абарончых збудаванняў выкарысталі дрэва з разабраных кальвінскага храма, дома пастара, вучылішча, багадзельні і мяшчанскіх дамоў, з якога ўзвялі вежы і астрог. Пасля 14-тыднёвай аблогі і штурму горад быў узяты рускімі войскамі пад камандаваннем Шарамецева.

У 1664 г. быў выкананы «чарцёж» віцебскіх умацаванняў і дастаўлены цару на зацвярджэнне ваяводам Якавам Валконскім. Карыстаючыся гэтым дакументам і «Сметнымі кнігамі» таго часу, можна рэканструяваць архітэктурнае аблічча горада ў сярэдзіне 17 ст. На «чарцяжы» відаць, што ў Віцебску ўтвораны 3 аўтаномныя крэпасці, звязаныя адна з другой брамамі. Вялікі ўплыў на фарміраванне архітэктурна-планіровачнай структуры зрабіла гідралагічная сістэма, што ўключала раку Дзвіну з яе прытокамі, якія вызначылі галоўныя кампазіцыйныя восі горада. Пойменная тэрыторыя, перасечаная ярамі, стварала сваеасаблівыя ландшафтныя ўмовы для фарміравання арыгінальных архітэктурных кампазіцый.

Верхні і Ніжні замкі займалі востраўнае становішча на мясцовасці, абмежаванай Дзвіной, Віцьбай і Замкавым ручаём, іх плошча выцягвалася трохвугольным мысам з захаду на ўсход. Верхні замак уяўляў сабой няправільны авал, абкружаны сценамі (агульная даўжыня 391,5 сажняў) з 9 вежамі. Тут часткова выкарыстаны фрагменты старых каменных сценаў. Разбураныя ўчасткі запаўняліся драўлянымі тарасамі, што мелі два баявыя ярусы. Завяршаліся тарасы абламамі і двухсхільнымі дахамі. Вышыня сценаў да абламаў складала ад 1,5 да 3,5 сажняў, самі абламы мелі ад 3 да 7 вянкоў (да 2 м), 2 вежы названы «Каменнымі палатамі», астатнія — драўляныя. Вежа «Цёмныя вялікія праязныя вароты» звязвала паміж сабой Верхні і Ніжні замкі. У мураванай сцяне на ўсход ад Танкавай вежы мелася арачная фортка да Віцьбы, з якой «емлют воду».

Планіроўку Верхняга замка вызначала вуліца, якая ішла з паўднёвага захаду на паўночны ўсход ад вежы «Цёмныя вялікія праязныя вароты» да форткі. Яна падзяляла замак на 2 часткі — усходнюю і заходнюю. У першай, адносна больш бяспечнай, ахаванай Ніжнім замкам, былі засяроджаны асноўныя збудаванні — двор ваяводы, прыказ і Міхайлаўская царква. У другой на «чарцяжы» паказана толькі турма.

Ніжні замак уяўляў сабой выцягнутую прыблізна з паўднёвага захаду на паўночны ўсход тэрыторыю, што ахоплівала Верхні замак у межах ад Дзвіны да Віцьбы. Яго сцены (агульная працягласць 589,5 сажняў) з 12 вежамі прылягалі з паўднёвага захаду да вежы «Каменныя палаты», з паўночнага ўсходу — да Шарамецева кругліка Верхняга замка. Вежа Валконскі круглік злучала Ніжні замак з Угор'ем, Падзвінская брама («Жыдоўскія вялікія вароты») вяла да Дзвіны, Заручаўская — да Заручаўская слабады. Астатнія 9 вежаў глухія. Ва ўсходняй сцяне існавала фортка Задунаўская. Асноўныя архітэктурна-планіровачныя восі стваралі 2 вуліцы: Вялікая, што ішла ад Заручаўскай брамы да Задунаўскай форткі, і яе адгалінаванне на поўнач, да Узгор'я. Каля перасячэння гэтых восяў размяшчаўся Аляксееўскі манастыр. У заходняй частцы, непадалёку ад Сярэдняй вежы, стаяла Дабравешчанская царква. Яшчэ адна вуліца злучала Заручаўскую браму з Вялікай брамай Верхняга замку.



Рэканструкцыя жыллёвага комплексу сярэдзіны 14 ст. Віцебскі Верхні замак. Раскопкі 1982 г. Аўтары рэканструкцыі Л.У.Калядзінскі і С.А.Сергачоў.

Сцены Ніжняга замку былі адбудаваны нанава — некалькі меньшай вышыні, чым у Верхнім замку (да 2,25 сажняў), з абламамі ў 3—6 вянкоў і двухсхільным пакрыццём, мелі 2 баявыя ярусы для агню з мушкетаў і сярэдні мост гарматнага бою. На ярусы вялі вонкавыя лесвіцы, якія мелі ўверсе галерэйкі. Канструкцыя сценаў — тарасы.

Узгорскі замак (астрог) межаваў з поўначы (праз р. Віцьбу) з Верхнім і Ніжнім замкамі. Ён з трох бакоў быў абнесены сцяной з 13 вежамі (агульная даўжыня ўмацаванняў 529,25 сажняў), меў 3 брамы: Падзвінскую ў заходняй сцяне, Суражскую ў паўночнай і Кстоўскую ва ўсходняй. Замак Красным мостам цераз Віцьбу звязваўся з праезнай брамай Ніжняга замка — Валконскім круглікам.

Збудаванні Ніжняга замка (з «Чарцяжа» Віцебска 1664). Уверсе: царква Звеставання (злева); дом Шапкі. Унізе: Аляксееўскі манастыр (злева); вежа «Валконскі круглік».

Кампазіцыйным цэнтрам усяго Узгор'я з'яўлялася гандлёвая плошча ў паўднёва-усходняй частцы замка, дзе знаходзіліся гандлёвыя рады, асобныя крамы і гасціны двор з ратушай. Ад яе адыходзілі 3 промні: на захад да Падзвінскай брамы (сучасная — вуліца Талстога), Вялікая Узгорская на поўнач (сучасная — вуліца Леніна) і на паўночны захад да Суражскай брамы (сучасная — вуліца Суворава). На тэрыторыі Узгор'я паказаны 3 цэрквы — Увядзенская, Васкрасенская і Спаса-Праабражэнская.

Складальнік «чарцяжу» замаляваў традыцыйнае народнае жыллё толькі ў слабодах Віцебска. Малюнкі схематычныя і ўмоўныя, таму не даюць магчымасці меркаваць пра канкрэтныя тыпы жылля простага люду. Дамы часцей за ўсё не мелі падклецяў, вырашаліся квадратнымі ці прамавугольнымі ў плане зрубамі, накрытымі драцінамі на 2 схілы. Увахады размяшчаліся як у падоўжных, так і ў тарцовых сценах. Верагодна, у планеровачных адносінах гэтыя дамы ўяўлялі сабой простыя аднакамерныя і больш складаныя 2- і 3-камерныя структуры. Нярэдкія выявы дамоў з рознымі гаспадарчымі прыбудовамі ў працягу падоўжнай восі або перпендыкулярна ёй. У цэлым забудова слабодаў не вылучалася строгай рэгулярнасцю — яна жывапісна фарміравалася адпаведна ландшафту мясцовасці.

На тэрыторыі замкаў змешчаны выявы 4 жылых дамоў знаці. Дом ваяводы ў Верхнім замку ўяўляў сабой працяглы прамавугольны ў плане аб'ём пад высокім двухсхільным пакрыццём. Верагодна, ён меў сіметрычную планіроўку з сенямі ў цэнтры, пра што сведчыць традыцыйнае размяшчэнне пячных комінаў у сярэдняй частцы пакрыцця. Паколькі на выяве ніжняя частка дома схавана замкавай сцяной, цяжка з упэўненасцю сказаць, ці меў ён падклеццe.

Кампактны прамавугольны план меў дом шляхціча Горскага (ці, паводле даных інвентара 1640-х гг., Стацгорскага). Ён засноўваўся на глухім падклецці, пазбаўлены вокнаў. Сцены жылога паверха рытмічна расчлянялі прамавугольныя аконныя праёмы, па перыметры яго абкружала адкрытая галерэя. Вы-



Збудаванні Узгорскага замка (з «Чарцяжа» Віцебска 1664). Уверсе: ратуша, гасціны двор і гандлёвыя рады (злева); Сярэдняя вежа. Унізе: Падзвінская праезная брама (злева); Увядзенская царква.

сокі дах напружанага малюнка з прагінам у сярэдняй частцы завяршаўся ў тарцах 2 шпілямі ці адзінкавымі гатычнымі вільчакамі. Архітэктуры дома былі ўласцівыя некаторыя рэнесансавыя рысы.

Больш развітой кампазіцыяй адрозніваўся дом Шапкі, які ўяўляў сабой жывапіснае спалучэнне трох аб'ёмаў. Асноўны двухпавярховы жылы корпус меў, верагодна, у ніжняй частцы невысокае падклецце ці цоколь і завяршаўся двухсхільным дахам. Два коміны, што сіметрычна ўзвышаліся над пакрыццём, сведчылі пра цэнтральнае размяшчэнне сяней. Уваход у дом утварала гранёная двухярусная шатровая вежа, увянчаная флюгерам. Трэці аб'ём, таксама двухпавярховы, прылягаў да тарца асноўнага корпуса, утвараючы з ім Г-падобную ў плане сувязь. Аўтар «чарцяжа» змясціў будынак на тэрыторыі Ніжняга замка. Цытаваны намі інвентар 1640-х гг. паказвае яго ў Верхнім замку «подле круглика на муре», каля Міхайлаўскай царквы, і ўдакладняе, што належаў ён «пану Базылю Шапке».

Арыгінальнае палацавае збудаванне з рысамі готыкі і рэнесансу — дом князя Агінскага. А.П.Сапуноў звязваў гэтую пабудову з так званым «домам з купалам», у якім у пачатку 19 ст. знаходзілася базыльянскае вучылішча. Яму былі ўласцівыя тыя ж кампазіцыйныя рысы, што і адзначанаму вышэй дому Шапкі, але больш развітыя, манументальныя.

Галоўным грамадскім збудаваннем горада з'яўлялася ратуша, збудаваная (ці адноўленая) у 1644 г., калі Віцебску вярнулі магдэбургскае права. Мяркуючы па выяве, яна была вырашана кампактным квадратным у плане двухпавярховым аб'ёмам, завершаным высокім шатровым дахам. Над усечанай верхняй часткай пакрыцця ўзвышаўся гранёны двух'ярусны бельведэр з перыметральнай прагулачнай галерэяй і купалком са шпілем і гербам. Адзін з бакоў пабудовы ў другім паверсе быў афармлены адкрытай галерэяй. Кампазіцыя ратушы рэнесансавая, хаця і вырашаная ў традыцыйных формах. Яна адпавядала мясцовым традыцыям дойлідства, для якога характэрны вертыкальныя ярусныя

аб'ёмы. Размешчаная непадалёк ад Валконскага кругліка, ратуша пераклікалася з ім архітэктурнымі формамі, што стварала выразны ансамбль.

Безумоўную цікавасць выклікае будынак прыказу ў Верхнім замку. Ён складаўся з 2-х паралельных двухпавярховых карпусоў пад двухсхільнымі пакрыццямі. Бакавы фасад папярэдняга корпуса меў двух'ярусную галерэю. Уваход у ніжні паверх вылучаў вежападобны аб'ём, завершаны масіўным купалам тыпу рускай «бочкі». На другі паверх вяла крытая лесвіца з ганкам, завершаным кілепадобным шчытом.

Каля мосту праз Віцьбу, на тэрыторыі Узгорскага замка, знаходзілася багадзельня (прыют для ўбогіх і нямоглых) — прамавугольнае ў плане аднапавярховае збудаванне пад двухсхільным пакрыццём. Млыны ўключаліся ў сістэму абарончых збудаванняў, мелі наверсе баявыя памяшканні з байніцамі. Красны мост праз Віцьбу ў сярэдняй частцы асноўваўся на клецях-ізбіцах. Існавалі простыя зрубныя студні, перакрытыя рашоткамі і вырашаныя ў выглядзе ратонды з шатровым вянчаннем.

На «чарцяжы» прысутнічаюць выявы 8 культавых збудаванняў, з якіх 2 былі каменныя (Дабравешчанская і Святадухаўская цэрквы), астатнія драўляныя. Дабравешчанская царква да сярэдзіны 17 ст. была некалькі перабудавана: замест паўкруглых закамар зроблены трохвугольныя шчыты, якія стварылі аснову 8-схільнага пакрыцця наўгародскага тыпу. Драўляная званіца перад царквой мела традыцыйную 2-ярусную кампазіцыю. Яе зграбныя, выцягнутыя па вертыкалі прапорцыі, безумоўна, вызначаліся месцазнаходжаннем на беразе Дзвіны.

Царква Св. Духа — крыжападобны ў плане пяцікупальны храм. Да квадратнага цэнтральнага памяшкання з усходу прылягала алтарная апсіда, з захаду — двух'ярусны нартэкс. Па баках апсіды размяшчаліся 2 выцягнутыя па вертыкалі прыдзелы, кожны з якіх завяршаўся шатром са светлавым барабанам, галавой і крыжам.

У драўляных цэрквах вылучаліся 2 асноўныя кампазіцыйныя схемы: падоўжна-восевая і глыбінна-прасторавая. Найбольш просты тып храма прадстаўлены Міхайлаўскай царквой у Верхнім замку. У 12 ст. яна была мураванай, але потым была зруйнавана і адбудавана з дрэва пасля 1618 г., паколькі інвентар таго часу адзначае яе пагарэўшай. Царква складалася з двух чацверыковых зрубаў, злучаных адзін з другім па падоўжнай восі і завершаных самастойнымі двухсхільнымі пакрыццямі. Асноўны зруб завяршаўся чацверыковай шатровай вежай з крыжыкам, перад уваходам існавала адкрытая галерэйка. Вядома, што ў гэтай царкве захоўваліся партрэты князя Альгерда і яго жонкі Ульяны.

Блізкай да Міхайлаўскай была Сімяонаўская царква ў Задзвінні. Яе кампазіцыя таксама будавалася па падоўжнай восі, над асноўным аб'ёмам — складаны па форме купал. Больш развітую кампазіцыю мела Спаса-Праабражэнская царква, што стаяла на тэрыторыі Узгорскага замка. Месцазнаходжанне на высокім пагорку вызначыла вертыкалізм яе формаў. Царква складалася з асноўнага аб'ёму і алтарнай апсіды, накрытых двухсхільнымі дахамі. Галоўны фасад утварала трох'ярусная вежа-званіца, завершаная складаным па форме купалам і шасціканцовым крыжам.

Цікавы манастырскі ансамбль склаўся ў Ніжнім замку каля Валконскага кругліка. Тут некалі знаходзілася старажытная Пятніцкая царква, змураваная ў 12 ст. Але яна была разбурана, і на яе месцы пастаўлена драўляная. У 1640 г. яна перабудавана ў езуіцкі касцёл, каля яе ўзніклі будынкі кляштара і калегіі езуітаў. У 1654 г. комплекс ператвораны ў праваслаўны Аляксееўскі манастыр, які існаваў да 1667 г. Потым тут зноў размясціліся езуіты.

На тэрыторыі Узгорскага замка, непадалёк ад ратушы, існавалі 2 цэрквы глыбінна-прасторавай кампазіцыі: Увядзенская і Васкрасенская. Абедзьве яны былі трохзрубнымі, складаліся з асноўнага аб'ёму, алтарнай апсіды і вежы-званіцы. Кожны аб'ём вырашаўся ў выглядзе высокага яруснага збудавання з самастойным купальным завяршэннем.

Такім чынам, у архітэктурна-планіровачным развіцці Віцебска пераважалі абарончыя задачы. У сярэдзіне 17 ст. горад ператвораны ў магутную цытадэль, якая складалася з трох узаемазвязаных адзін з другім замкаў: Верхняга, Ніжняга і Узгорскага. Гэта, з аднаго боку, абмяжоўвала тэрытарыяльнае развіццё горада, але з другога — выклікала да жыцця прыём яруснага будавання кампазіцый. Гэтыя прыёмы першапачаткова зарадзіліся ў чыста абарончых збудаваннях, але ўжо ў канцы 16 — 1-й палавіне 17 ст. набылі і свецкія рысы. Актыўна ўваходзячы ў архітэктуру грамадзянскіх і культавых збудаванняў, яны садзейнічалі выпрацоўцы адзінай мастацка-вобразнай

сістэмы. Таму можна з упэўненасцю сцвярджаць, што з другой палавіны 16 ст. фарміруецца самабытная школа драўлянага дойлідства, развіццё якой плённа працякала да апошняй трэці 18 ст.

Пасля вайны Расіі з Рэччу Паспалітай, якая працягвалася 13 доўгіх гадоў, Віцебск знаходзіўся ў страшэнным заняпадзе і запусценні. У 1667 г. ў ім налічвалася ўсяго некалькі двароў. Паступова горад пачаў адраджацца, але яго развіццю перашкаджалі частыя пажары, якія вынішчылі цэлыя раёны (1690, 1698, 1708).

У 17—18 ст. культавае дойлідства Віцебска было прадстаўлена, у асноўным, толькі касцёламі і уніяцкімі цэрквамі. У 1629 г. ўжо існаваў фарны (дамініканскі) касцёл. У 1640 г. заснаваны езуіцкі кляштар з калегіумам і касцёлам, у 1676 г. з'явіўся кляштар бернардзінцаў з касцёлам Св. Антонія, у 1682 г. пры Успенскай царкве заснаваны базыльянскі манастыр, пры Святадухаўскай царкве абсталяваліся базыльянкі. У 18 ст. будуюцца кляштары трынітараў, піяраў, марыявітак, з канца 18 ст. вядомы касцёл Св. Варвары. Існавалі таксама рэфарматарскі збор, больш дзесятка уніяцкіх цэркваў. А вось праваслаўных цэркваў да 2-й палавіны 18 ст. ў межах горада не існавала. Адзіным цэнтрам праваслаўя з'яўляўся Маркаў манастыр, які размяшчаўся за межамі горада, на паўднёвы захад ад яго.

У 18 ст. сфарміраваўся цікавы архітэктурны ансамбль забудовы цэнтра. Яго складалі мураваныя, пераважна культавыя будынкі, вырашаныя ў стылі позняга (так званага Віленскага) барока. Найперш вылучалася ратушная плошча, на якой паўсталі ратуша (1775), бернардзінскі кляштар з касцёлам Св. Антонія (1768), Васкрасенская царква (1772). На Успенскай гары ўзвышаўся велічны гмах Успенскага сабору з базыльянскім манастыром (1743—85). На поўдзень ад ратушнай плошчы забудаваны комплекс езуіцкага кляштара (1716—31). Далей на Духавай гары ўздымаліся вежы Святадухаўскай царквы, перабудаванай у 18 ст. ў барочным стылі. Усе гэтыя будынкі мелі выразную кампазіцыю, іх вежы актыўна фарміравалі сілуэт горада, стваралі адзіную архітэктурную тэму, якая праходзіла ад Узгор'я да Задунаўя. У пачатку 19 ст. ў агульную архітэктурную сімфонію ўключыўся мураваны трынітарскі касцёл (сучасная Пакроўская царква).

Як вядома, першы ансамбль ратушнай плошчы сфарміраваўся яшчэ ў 17 ст. Яго складалі драўляныя будынкі ратушы і цэркваў. Ужо на гэтым этапе вызначыўся генеральны прынцып фарміравання кампазіцыі высотнымі яруснымі аб'ёмамі, якія фіксавалі найбольш выразныя кропкі рэльефу. Але агульная кампазіцыя ўсёй прасторы была неўраўнаважаная, бо імкнулася, у асноўным, да заходняй часткі Узгор'я. Усходняя ж частка была амаль што пазбаўлена архітэктурных дамінантаў (за выключэннем абарончых вежаў на беразе Віцьбы). Акрамя таго, не зусім выразнай з'яўлялася сістэма вуліц.



Водаадводная сістэма ў Задунаўскай слабадзе. 17 ст.

Адзначаныя недахопы пераадолены ў новым ансамблі 18 ст. У яго аснову пакладзены прынцыпы анфіладнасці і паўзамкнёнасці. Першы прынцып вызначыў стварэнне галоўных восевых перспектыў, на якія «нанізваліся» асноўныя дамінантныя аб'ёмы з плошчамі і іншымі прасторавымі элементамі. Утварылася суцэльная вось (былыя вуліцы Смаленская і Гогалеўская, сучасная Леніна), якая праходзіла праз усю левабярэжную частку горада паралельна Дзвіне.

Для прыдання ўсёй горадабудаўнічай кампазіцыі арганічнага стылёвага адзінства дой-

ліды вырашылі дамінантныя аб'ёмы ў адзіных архітэктурных формах, асноўнай прыкметай якіх з'явіўся двухвежавы галоўны фасад. У выніку кожны будынак, пры пэўнай самастойнасці архітэктурных формаў, трактаваўся як частка вялікага цэлага — усёй гарадской кампазіцыі. Прынцып паўзамкнёнасці быў звязаны з тым, што стыль барока своеасабліва трактаваў «мікрапрастору», акаляючую тое ці іншае збудаванне. Яна не адсякалася цалкам ад наваколля, расчынялася адным бокам у знешняе асяроддзе. Гэта рабіла ансамбль ратушнай плошчы і іншыя больш рухомымі і дынамічнымі. Кожны будынак меў свой маштаб архітэктурных элементаў і дэталяў, які вызначаўся яго месцазнаходжаннем і роляй у агульнай гарадской кампазіцыі.

Асноўная гарадская вось, адзначаная вышэй, не была адзінай. Яе паўтаралі яшчэ 2 прыбярэжныя лініі, што ішлі ўздоўж Дзвіны. На левым беразе ланцуг дамінантных аб'ёмаў утваралі фарны касцёл, Дабравешчанская царква, сінагога, цэрквы Нараджэння Хрыстова (1810), Васкрасенская Заручаўская (1771—1800) і іншыя. Уздоўж правага берага ў Задзвінні выцягнуліся цэрквы Ільінская (1746), Пакравоў Багародзіцы, Сімяонаўская (1790—1805), Мікалаеўская (1774—79), пі-

ярскі касцёл (з 1830-х гг. кірха). Выразныя кампазіцыі стваралі і культавыя збудаванні ў іншых раёнах: царква Іаана Багаслова ва Узгор'і, Троіцкая на Пескаватыку, Юраўская на на Юр'евай горцы.

Літаратура: Віцебск. Гісторыка-эканамічны нарыс. Мн., 1974; Долгоруков В.М. Витебская губерния: Историко-географический и статистический обзор. Вып. 1. Витебск, 1890; Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии. М., 1954; Квитницкая Е.Д. Проблемы формирования торгово-административного центра Витебска в 18 в. // Архитектурное наследство. Т. 22. М., 1974; Краснянскі В. «Чарцёж» места Віцебску 1664 году як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва // Запіскі аддзела гуманітарных навук. Кн. 6: Працы камісіі гісторыі мастацтва. Т. 1., сш. 1. Мн., 1928; Левко О.Н. Витебск 14—18 вв. Мн., 1984; Яе ж. Экскурсия по древнему Витебску. Мн., 1984; Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины Витебска. Витебск, 1899; Сапунов А.П. Витебская старина. Т. 1, 4, 5. Витебск, 1883—1888; Яго ж. «Чертеж» города Витебска 1664 года // Труды Витебской ученой архивной комиссии. Витебск. 1910. Кн. 1; Сементовский А.М. Витебск: Исторический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1864 г. СПб., 1865; Яго ж. Витебск: Статистический очерк // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. СПб. 1865; Ткачев М.А.Замки Белоруссии. Мн., 1987; Чарняўская Т.І. Архітэктура Віцебска: З гісторыі планіроўкі і забудовы горада. Мн., 1980; Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли: (9—13 вв.) Мн., 1978; Якімовіч Ю.А.Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска 19 — пачатку 20 ст. Мн., 1990. Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии 16 — середины 17 в.: Справочное пособие, Мн., 1991. *Ю.А.Якімовіч.*

Дакументы сведчаць

УРЫВАК З ІНВЕНТАРА ВІЦЕБСКА 1640-х ГАДОЎ

«Вшедши в тот замок, около идя, по правой стороне поворотивши... идя почавши от брамы на сто шагов аж до башни, где знать и дворец королевский белый, но сейчас только одна стена окольная целая, а три стены того будованья с землей поровнаны. Идя до башты нарожной, кругликом называной, перегоревшей, на котором помещается аблам из дерева, но без помостов, ненакрытый, в некоторых местах погнилый... Над стеной выше идя, на которой начато было те башты из дерева будовать, но недобудованы... Оттуда на другой перее поступивши над Витьбой к Двине, муру шмат перегорелого, а в нем, не доходя фортки... руина в несколько сажней, почато было будовать деревом, але ей недобудовано... Идя перед той форткой над Витьбой, выходят три стены прибудованные и накрытые... избиц восемь недобудовано без покрытия и мостов...»

Друкуецца па кн.: Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии 16 — середины 17 в. Справочное пособие. Мн., 1991. С. 62.

УРЫВАК З «ХРОНІКІ ЕЎРАПЕЙСКАЙ САРМАТЫІ» АЛЯКСАНДРА ГВАНЫНІ (1534—1614), ПОЛЬСКАГА ГІСТОРЫКА, РОТМІСТРА Ў ВОЙСКУ ВКЛ, УДЗЕЛЬНІКА ЛІВОНСКАЙ ВАЙНЫ, КАМЕНДАНТА ВІЦЕБСКА

«В Витебску два города широкіе, а делом издавна крепкіе, а те городы один вышній, другой нижній, а две башни дубовыя, сделаны и насыпаны землею и каменем: наряду и всякой стрельбы в городе много, и те башни, вместе с городом, со всхода солнца, обошла р.Двина, а с другой стороны города, в Двину впала речка Витьба под городом; а тот город всех горо-

дов пограничный, и всей Литвы есть найкрепчайшій, как бы башни против недругу Московитину, потому что на самых границах недруга того, и многожды от него Москва великим убытком утекла и проганивана бывала, а служивых людей на нем четыре ротмистра пеших всегда живут, в котором ще те и Аз с своим отцем Амвросіем ко-Вагнином 10-ть лет служим».

Друкуецца па кн.: Витебская старина. Сост. А.П.Сапунов. Т. 1. Витебск, 1883. С. 657.

«Чарцёж» Віцебска 17 ст.

У фондах Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў захоўваецца цікавы дакумент па гісторыі сярэдневяковага Віцебска — «Чарцёж» места Віцебска 1664 г. Ён быў знойдзены вядомым даследчыкам гісторыі Віцебшчыны А.П.Сапуновым сярод фондаў былога Маскоўскага архіва Міністэрства замежных спраў (аднаго з 5 асноўных гістарычных архіваў Расійскай імперыі, якія склалі сучасны РДАСА). «Чарцёж» выкананы пяром на некалькіх склееных і месцамі падклееных лістах шэра-жоўтай паперы; рэкі Дзвіна і Віцьба размаляваны сіняватай фарбай, а ўзгоркі і яры жоўта-зялёнай. Надпісы зроблены кінаварам. Даўжыня «Чарцяжу» складае 108 см, шырыня — 79 см. На дакументе знаходзіцца надпіс: «РОГ (г.зн. 173 г. ці 1664 г.) ноября 15, таков чертёж к великому государю к Москве в розряд прислал из Витебска воевода князь Яков Волконского с витебским розсыльщиком с Ларкою Быковым».

* * *

В 1654 г. началась длительная война Речи Посполитой с Московией. Это война была очень длительной и кровопролитной.

Русские войска почти без боя заняли Невель, Полоцк, Мстиславль, Друю, Дисну и другие города. Только Витебские замки задержали победоносное шествие русской армии. У боярина Василия Петровича Шереметева было 20 тыс. войск и 20 пушек. Осада Витебска продолжалась 14 недель. 22 ноября 1654 г. после упорного наступления город был взят. В «отписке» царю об этом событии говорилось: «Боярин и воевода Василий Петрович Шереметев с товарищи и со всеми ратными людьми взяли приступом два острога и литовских людей побили, а достальные литовские люди бежали в верхние в два города, и видя свое изнеможение, те литовские люди государю добили челом и верхние два города сдали». Царь Алексей Михайлович принял титул «Государя всея Великия и Малыя и Белыя России». Сам царь Алексей Михайлович дважды посетил Витебск: 27 июня 1656 г., на пути «под город под Ригу, пришел государь в Витебск и стал подле Двины реки в шатрах», 29 июня «на праздник св. Апостолов Петра и Павла, ели у государя царя и вел. князя



«Чарцёж» месца Віцебска 1664 г.: А — Верхні замак; Б — Ніжні замак; В — Узгорскі замак; Г — слабоды.



Выява царквы Св. Міхаіла паводле «Чарцяжа» месца Віцебска 1664 г.

Алексея Михайловича, всея Великия и Малыя и Белыя России самодержца. Крутицкий митрополит Питирим да сибирские царевич Петр да Алексей Алексеевича, а стол был в комнатном шатре, а у стола велел государь быть боярам и окольничим всем без мест; да у стола ж пожаловал государь велел быть витебской шляхте и мещанам...» По повелению Алексея Михайловича и был создан «Чертёж 1664 г.», который и был доставлен в Москву.

Ценность «Чертежа» в том, что он позволяет представить витебскую школу архитектуры. Следует отметить, что витебские строители достигли высокого мастерства. Витебских мастеров приглашали и в другие города. Например, в 1660 г. витебские строители были приглашены в Смоленск для строительства оборонительных сооружений. На «Чертеже 1664 г.» отмечены оборонительные, культовые и гражданские сооружения, все башни, которые были преимущественно деревянными. Стены башен прорезали небольшие бойницы. Между башнями шли оборонительные высокие стены. В стенах были ворота, которые были более монументальными, чем башни. Всего было 7 ворот, а башен — 22. Каждая из башен имела свое название: Шереметев круглик, Вестовая, Танковая, Боборыкин круглик, Храповицкая и т.д. Некоторые башни были в три и два этажа. Крыши были шатровые: четырех или восьмискатные. Для осадного времени был выкопан колодец, но вода в нем была нечистой. В 19 веке этот колодец был засыпан, потому что со временем он превратился в довольно обширное болото. На «Чертеже» отмечены жилые постройки. Их немного: дом Шапкина, Горского и Огинского. Дом Шапкина представлял двухэтажное здание на высоком фундаменте. Состоял он из двух срубов, соединенных между собой. Украшало здание высокое крыльцо. В начале 20 века на месте дома Шапкина находился пожарный двор. Наиболее сложным в планировке был дом Огинского. Его основная часть состояла из прямоугольного сруба. Окна узкие. Крыльцо — двухъярусная шестигранная башня, второй этаж которой имел открытую галерею, а первый — высокую лестницу. К основному зданию была пристроена высокая башня с куполом. Эта башня выполняла функцию домашней церкви. Этот замечательный по своей затейливой архитектуре дом сохранился до 1860-х годов. Он был известен в городе как «дом с куполом». Когда-то в нем помещалось иезуитское училище, а после изгнания иезуитов оно было передано в духовно-учебное ведомство для помещения здесь Витебского духовного училища. Но училище сюда так и не переехало. Дом этот был продан на снос.

Но вернемся к «Чертежу». Самым простым по своей архитектуре был дом Горского. Это был одноэтажный дом прямоугольной формы с четырехскатной крышей. Дома были огорожены заборами, были небольшие огороды. Отапливались дома при помощи печей.

Гражданские учреждения представлены очень скупо. В черте Верхнего замка отмечен двор воеводский (теперь на этом месте размещается здание художественного музея), приказ, тюрьма (примерно район ул. Замковой). А в черте Взгорья отмечена «Ратуша, гостиный двор и лавки», богадельня. В «Инвентаре города Витебска 1641 года» было помещено следующее описание «Гостиного двора»: «В самом городе Гостиный двор на рынке, против церкви (Воскресенской) стоящий. В который ведут большие ворота, а на верху этих ворот — мезонин, на котором часы с большим часовым колоколом; в самом же Гостином дворе — кухня с сенями, а насупротив малая святелка. Для склада товаров приезжающих купцов имеется семь амбаров, а также большой сарай. В этом же Гостином дворе — важня, т.е. сарай старый, обрушившийся без крыши, в котором больших и малых весовых гирь 12». Следует отметить, что этот вид Ратуши и Ратушной площади — самое древнее изображение. Ратуша была двухэтажной с четырехскатной крышей, которая завершалась башней. Над башней возвышал-

ся шпиль с гербом. А на месте богадельни у самого моста был в 19 веке построен дом Витенберга.

§14. В случае остановки работы по вине хозяина, старшему рабочему выдается первые 2 дня, только лишь на харчи, по 25 коп.,.. как самому старшему, так и его подручным, но без всякого другого вознаграждения...

Владелец войлочного завода Б.Апирьян

Б) Табель штрафов

№ п/п	Взыскивается	Сумма штрафа			
		От		До	
		руб.	коп	руб.	коп
1.	За непредоставление рабочими паспортов в срок и несвоевременную отсрочку и возобновление таковых	—	20	—	50
2.	За несвоевременную явку на работу, за приход на работу в пьяном виде	—	50 20	1 —	— 50
3.	За ослушание и неподчинение старшим и хозяину	—	50	1	—
4.	За самовольную отлучку с работы	—	25	—	—
5.	За несоблюдение чистоты и опрятности	—	20	—	50
6.	За неосторожное обращение с огнем	—	50	1	—
7.	За несоблюдение тишины и спокойствия	—	30	—	60
8.	За игры на деньги	—	20	—	50
9.	За привод на завод посторонних лиц без разрешения	—	50	1	—
10.	За неаккуратную работу	—	35	—	70
11.	За порчу товара	—	50	1	—
12.	За порчу или потерю заводских принадлежностей	—	10	—	30
13.	За прогул (т.е. неявку на работу не менее как 1/2 рабочего дня)	—	50	1	—

Владелец войлочного завода Б.Апирьян.

Документы и материалы по истории Белоруссии. Минск, 1940. Т. 2. С. 750—752.

Развіццё асветы і народнай адукацыі ў Віцебску

Канец 18 — пачатак 19 ст. Калі гісторыя адукацыі ў Расійскай імперыі пачынаецца галоўным чынам з канца 18 ст., то на тэрыторыі Беларусі яна мае значна больш глыбокія карані, якія сягаюць у далёкае сярэднявечча. Большасць створаных тут у 16—18 ст. навучальных устаноў утрымліваліся манахамі каталіцкіх і уніяцкага ордэнаў і прызначалася для выхавання моладзі, што паходзіла пераважна з вышэйшага і сярэдняга класаў насельніцтва.

Першае вучылішча было заснавана ў Віцебску кальвіністамі, якія з'явіліся ў горадзе ў 2-й палавіне 16 ст. У Дольнім замку побач з Благавешчанскай царквой імі быў пабудаваны збор (малітоўны дом), плябанія, багадзельня і школа.[1] Больш падрабязных звестак пра дзейнасць гэтай навучальнай установы, на жаль, не захавалася.

У 2-й палавіне 16 ст. ў Беларусі з'явіліся ксяндзы-езуіты, якія пазней сталі на чале адукацыі моладзі ўсяго краю. Езуіты пасяліліся ў Віцебску ў 1639 г., калі смаленскі ваявода А.К.Гасеўскі падарыў ім прыстань на Заходняй Дзвіне і землі на Смаленшчыне. У 1641 г. езуіты адчынілі ў горадзе школу, пры якой з 1676 г. існавала музычная бурса.[2] З 1756 г. пры езуіцкім калегіуме дзейнічала семінарыя для дзяцей збяднелай шляхты, заснаваныя братамі Ігнатам і Стафанам Лускінамі, друкарня, аптэка (з 1697), школьны тэатр. Віцебская езуіцкая калегія была вышэйшай, бо ў ёй апроч граматыкі, паэтыкі і рыторыкі выкладаліся і розныя часткі філасофіі. З 1812 г. калегія падпарадкоўвалася Полацкай езуіцкай акадэміі. На пачатку 19 ст. ў розныя гады яна мела ад 55 да 189 вучняў. Паводле сацыяльнага паходжання колькасць вучняў калегіі ў 1816—17 навучальным годзе размяркоўвалася наступным чынам: дзяцей шляхты — 123 (65%), уніятаў — 33 (17,5%), мяшчан — 33 (17,5%).[3] Дзейнасць віцебскіх езуітаў была перапынена паводле ўказа Аляксандра I ад 13 сакавіка 1820 г. аб

высылцы езуітаў з Расійскай імперыі, пасля чаго была скасавана Полацкая акадэмія і ўсе падведамасныя ёй вучэльні.

Глыбокімі традыцыямі ў сферы адукацыі і выхавання моладзі вылучаўся і каталіцкі ордэн ксяндзоў-піяраў. Паводле звестак А.П.Сапунова, школа пры піярскім кляштары ў Віцебску існавала ўжо ў 1740 г.[4] Яна мела 5 класаў, пры ёй дзейнічаў школьны тэатр. Вядома, што ў 1765 г. ў тэатры была пастаўлена польскамоўная трагедыя ў 3 актах Я.Кушаля «Артаксар», выдадзеная ў год пастаноўкі асобнай кніжкай у Вільні. У 1785 г. князь Рыгор Пацёмкін, карыстаючыся нагодай знаходжання ў Санкт-Пецярбургу папскага нунцыя Арыгеці, атрымаў ад апошняга дазвол на перамяшчэнне ксяндзоў-піяраў з Віцебска ў ахвяраванае яму мястэчка Дуброўна ў Аршанскім павеце. На новым месцы піярам быў вызначаны фундуш «на ўтрыманне вучылішча для шляхетнага юнацтва» ў памеры 15 000 руб. і в. Азоркава. У 1799 г. мітрапаліт рымска-каталіцкіх цэркваў у Расійскай імперыі вярнуў піяраў з Дуброўна ў Віцебск.

Паводле дадзеных рэвізіі В.Севяргіна, у 1803 г. Віцебскую піярскую школу наведвала 68 вучняў, і навучанне ў ёй вялося «ў ніжэйшых класах на польскай мове, а ў вышэйшых – на лацінскай».[5] Пэўны час у школе выкладаў Гіляры Заблоцкі – бацька вядомага паэта Тадэвуша Лады-Заблоцкага (1811–47).

Піярскі кляштар быў зачынены ў 1822 г., а яго манахі пераведзены ў Полацк. Піярская школа ў Полацку дзейнічала да красавіка 1830 г., пакуль не была ліквідавана па прадпісанню піярскага правінцыяла.[6]

У 1807–09 гг. дзейнічала вучылішча пры Віцебскім трынітарскім кляштары.[7]

Выхаваннем дзяўчынак традыцыйна займаліся манашкі каталіцкага ордэна мар'явітак. Жаночы мар'явіцкі кляштар быў заснаваны ў Віцебску ў 1749 г., у 1768 г. пры ім было створана вучылішча, дзе звычайна выхоўвалася да 10 дзяўчынак. У 1836 г. з-за недахопу ў горадзе жаночых пансіёнаў пры кляштары адчынілася 4-класнае вучылішча, якое наведвала каля 100 навучэнак. Вучылішча было зачынена ў 1842 г.[8]

Яшчэ адно жаночае вучылішча дзейнічала ў 1803–12 гг. пры Віцебскім жаночым Свята-Духаўскім базыльянскім кляштары. У 1807 г. на яго ўтрыманні знаходзіліся 34 вучаніцы.[9]

Пры Віцебскім мужчынскім базыльянскім кляштары яшчэ з сярэдзіны 18 ст. існавалі школа для свецкага юнацтва і філасофская студыя для манахаў, у якой выкладалі логіку, фізіку і іншыя навукі. Апрача таго, на кляштарным утрыманні знаходзіліся канвіктары (пансіянеры), якія навучаліся ў розных вучылішчах горада. Іх лік даходзіў да 15 чалавек.[10] Пасля забароны ў 1820 г. дзейнасці ордэна езуітаў у Расіі, віцебскім базыльянам у 1822 г. было дазволена адкрыць у былых езуіцкіх мурах вучылішча «на ступені гімназіі». Вучылішча мела 6 класаў і знаходзілася ў падпарадкаванні Віленскага універсітэта. У розныя гады ў ім навучалася ад 97 да 176 вучняў, пераважную большасць якіх складалі дзеці шляхты.[11] Вучылішча было скасавана разам з іншымі прыкляштарнымі вучэльнямі Беларусі па загаду імператара Мікалая I ад 1 мая 1832 г.

Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай расійскімі ўладамі быў узяты курс на стварэнне сеткі свецкіх навучальных устаноў, перш за ўсё рускіх школ і вучылішчаў для гарадскога насельніцтва.

Першай свецкай навучальнай установай у Віцебску стала галоўнае народнае вучылішча, якое было ўтворана паводле Статута вучылішчаў, зацверджанага Кацярынай II 5 жніўня 1786 г. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 29 студзеня 1794 г. Вучылішча было 4-класнае, у першых трох класах навучанне доўжылася па аднаму году, у апошнім чацвёртым – 2 з-за складанасці і насычанасці праграмы. Кола выкладаемых прадметаў рэгламентавалася статутам, аднак аб'ём адукацыі, якую прапаноўвала народнае вучылішча, быў меншы, чым у піярскай школе ці езуіцкім калегіуме. Выкладанне ў вучылішчы вялося на рускай мове, што асабліва прывабліва гарадскіх чыноўнікаў і вайскоўцаў, якія паходзілі з расійскіх губерняў.

У першы год існавання ў вучылішчы было 27 вучняў, у 1807 г. – 140 чалавек.[12] На пачатку 19 ст. амаль палову ад агульнай колькасці навучэнцаў складалі дзеці шляхты і чыноўніцтва, прыблізна на трэцюю частку – купцоў і мяшчан. Як занатаваў у матэрыялах рэвізіі 1803 г. В.Севяргін, сярод вучняў народнага вучылішча былі дзеці палкоўнікаў, маёраў, паручнікаў, калежскіх рэгістратараў, паштальёнаў, канцылярыстаў, купцоў і салдат.[13]

Да 1796 г. вучылішча знаходзілася ў падпарадкаванні Полацкага, а да 1803 г. – Віцебскага прыказаў грамадскага апекавання і размяшчалася ў наёмным доме Літмана пры

езуіцкім калегіуме. 24 студзеня 1803 г. яно паступіла ў падпарадкаванне Віленскай навучальнай акругі і Віленскага універсітэта. У гэты ж час для яго быў узведзены асобны будынак на Саборнай вуліцы (сучасны дом № 7 па вул. Крылова). У 1808 г. галоўнае народнае вучылішча было ператворана ў Віцебскую губернскую мужчынскую гімназію.

У 1795 г. у Віцебску дзейнічала таксама батальённае вучылішча, у якім навучалі пачаткам чытання, пісьма і арыфметыкі.[14]

Такім чынам, у канцы 18 — пачатку 19 ст. у Віцебску ў сістэме адукацыі адбыліся істотныя змены, звязаныя з паступовай ліквідацыяй прыкляштарных навучальных устаноў і заменай іх свецкімі дзяржаўнымі агульнаадукацыйнымі. Лаяльныя адносіны ўрада да каталіцкіх і уніяцкіх навучальных устаноў ужо ў 1-й чвэрці 19 ст. саступілі месца палітыцы, накіраванай на іх знішчэнне і стварэнне той сістэмы асветы, якая была здольна ўмацаваць і пашырыць аўтарытэт расійскага самадзяржаўя сярод насельніцтва Беларусі.

Першая палавіна 19 ст. У пачатку 19 ст. ў Расійскай імперыі была праведзена рэформа асветы. На змену кацярынінскай «Камісіі аб заснаванні вучылішчаў» прыйшло Міністэрства народнай асветы. Еўрапейская частка краіны была падзелена на 6 навучальных акруг, кожную з якіх узначальваў папячыцель, які прызначаўся імператарам. Віцебская губерня ўвайшла ў склад Віленскай навучальнай акругі. У імперыі сфарміравалася новая адзіная сістэма агульнаадукацыйных школ, якая складалася з ніжэйшых (прыходскія і павятовыя вучылішчы) і сярэдніх (гімназіі) навучальных устаноў. Кіраўніцтва імі было строга цэнтралізавана. Настаўнікі прыход-



Будынкі Віцебскай гімназіі. Канец 19 ст.

скіх вучылішчаў падпарадкоўваліся наглядчыку павятовага вучылішча, наглядчыкі павятовых вучылішчаў губерні — дырэктару губернскай гімназіі, а дырэктары гімназій — вучылішчнаму камітэту Віленскага універсітэта.

Павятовае і прыходскае вучылішчы ў Віцебску былі створаны паводле Статута 1804 г. пры мужчынскай Аляксандраўскай гімназіі і доўгі час размяшчаліся ў адным з ёю будынку. Прыходскае вучылішча было аднакласнае, павятовае — двухкласнае. Асноўнае месца ў вучэбным плане павятовага вучылішча займала вывучэнне польскай, лацінскай, французскай і нямецкай моў. Прыблізна чвэрць усяго вучэбнага часу адводзілася на фізіка-матэматычныя і прыродазнаўчыя навукі, выкладаліся таксама гісторыя, геаграфія, логіка і права. З цягам часу распараджэннямі кіраўніцтва Віленскага універсітэта праграмы навучання ў Віцебскіх прыходскім і павятовым вучылішчах былі зменены такім чынам, што яны страцілі характар самастойных навучальных устаноў і ператварыліся ў падрыхтоўчыя класы губернскай гімназіі.

У 1828 г. быў прыняты новы школьны статут, паводле якога быў значна паглыблены саслоўны прынцып у адукацыі. Аднакласныя прыходскія вучылішчы павінны былі «дастаўляць ... сродкі для набыцця ведаў дзецям самых ніжэйшых станаў», трохгадовыя павятовыя — пераважна «для купцоў», рамеснікаў і іншых «гарадскіх абывацеляў», гімназіі — для дзяцей «дваран і чыноўнікаў».[15] Некаторыя настаўнікі звярталіся да ўрада з патрабаваннем павялічыць колькасць школ для бяднейшай часткі насельніцтва. Так, яшчэ ў 1820 г. дырэктар Віцебскай гімназіі К.А.Канароўскі-Саховіч напісаў пісьмо, названае ім «Думка аб размяшчэнні вучылішчаў па Віцебскай губерні», дзе адкрыта ставіў пытанне аб павелічэнні колькасці школ для «дзяцей бяднейшых грамадзян».[16]

17 студзеня 1829 г. з 2 беларускіх губерняў (Віцебскай і Магілёўскай) была створана новая навучальна-адміністрацыйная адзінка — Беларуская навучальная акруга з цэнтрам у Віцебску. У 1831 г. ў склад акругі дадаткова ўвайшлі Мінская, у 1832 г. — Гродзенская і Віленская губерні, а таксама Беластоцкая вобласць. На тэрыторыі акругі дзейнічала 6 гімназій, 17 павятовых вучылішчаў, 160 пачатковых школ і 29 пансіёнаў, пераважна жаночых.[17]

У 1830 г. ўсе павятовыя вучылішчы Беларускай навучальнай акругі былі рэфармаваны і падзелены на 2 разрады: пяцікласныя для дваран і трохкласныя для мяшчан. Трохкласнае павятовае вучылішча для мяшчан у Віцебску было адчынена паводле загада ад 1 мая 1832 г.[18]

Кіраванне навучальнай акругай ажыццяўляў папячыцель, пры якім дзейнічала праўленне, у склад якога ўваходзілі дырэктары гімназій і ганаровыя папячыцелі. Першым папячыцелем Беларускай навучальнай акругі быў Рыгор Іванавіч Карташэўскі (1777—1840). Добра вывучыўшы стан адукацыі ў Беларусі, ён распрацаваў канкрэтную праграму перабудовы школьнай справы і прадставіў яе ў Міністэрства народнай асветы, а таксама генерал-губернатару М.М.Хаванскаму. Карташэўскі прапаноўваў стварыць сетку пачатковых школ у маёнтках памешчыкаў, ва ўсіх павятовых гарадах і ў вялікіх мястэчках. Найбольш мэтазгоднымі, таннымі і масавымі для распаўсюджвання пісьменнасці на Беларусі ён лічыў школы ўзаемнага навучання ланкастэрскага тыпу (ланкастэрскае вучылішча ў Віцебску існавала ў 1830-я гады). Падрыхтоўку настаўнікаў меркавалася наладзіць пры адной з гімназій акругі. Пасля скасавання ў 1832 г. Віленскага універсітэта планавалася заснаванне вышэйшай навучальнай установы (ліцэя) у Оршы, на што нават ужо былі выдаткаваны сродкі. Аднак у 1834 г. урад адмовіўся ад сваёй задумы.

6 жніўня 1834 г. ў Віцебску па ініцыятыве Карташэўскага была створана першая ў Беларусі семінарыя прыходскіх настаўнікаў, якая рыхтавала выкладчыкаў для прыходскіх і павятовых вучылішчаў, а таксама падрыхтоўчых класаў гімназій. Семінарыя існавала пры губернскай гімназіі, на чале яе стаяў дырэктар (упраўляючы) ланкастэрскімі вучылішчамі Беларускай навучальнай акругі Аглоблін, у штат уваходзілі загадчык Віцебскага ланкастэрскага вучылішча Вінаградаў і настаўнік, які быў адначасова наглядчыкам.[19] Тэрмін навучання складаў 4 гады. Разам з гімназістамі семінарысты наведвалі заняткі ў 4 ніжэйшых класах гімназіі і былі вызвалены толькі ад вывучэння моў. Апрача таго, яны мелі асобных настаўнікаў рускай мовы, музыкі і спеваў. Маючы ўтрыманне з дзяржаўнай скарбніцы, усе семінарысты жылі на адной кватэры пад апекай асобнага наглядчыка. Прымаліся ў семінарыю выхадцы з усіх вольных станаў. Семінарыя была зачынена 9 ве-

расня 1839 г. з-за адсутнасці сродкаў на яе ўтрыманне. За 5 гадоў існавання яна падрыхтавала 68 настаўнікаў.[20]

У канцы 1830-х — пачатку 1840-х гадоў у Беларусі пачалі рабіцца першыя крокі па арганізацыі пры гімназіях каморніцка-таксатарскіх класаў, якія рыхтавалі кваліфікаваных каморнікаў і межавых чыноўнікаў. Каморніцка-таксатарскія класы пры Віцебскай гімназіі дзейнічалі з 1861 па 1873 гг. У іх вывучалі тапаграфію, планіметрыю, таксацыю, чарчэнне, межавыя законы, прыродазнаўства.

У 1863—64 гг. у Віцебску агульная колькасць навучэнцаў складала 1737 чалавек. Калі ўлічыць, што ў 1862 г. насельніцтва Віцебска налічвала 27 868 чалавек,[21] то атрымліваецца, што на той час вучыўся кожны 16-ы гараджанін (прыблізна 6,2%).

Пэўная частка навучальных устаноў горада належала духоўнаму ведамству. Найбольш значнай сярод іх была Полацкая духоўная семінарыя, заснаваная яшчэ ў 1806 г. полацкім уніяцкім архіепіскапам Іракліем Лісоўскім і перададзеная пасля скасавання уніі ў праваслаўнае ведамства. Першапачаткова семінарыя знаходзілася ў Полацку, а ў 1856 г. была пераведзена ў Віцебск у будынак былога мужчынскага базыльянскага кляштара (цяпер тут размяшчаецца станкаінструментальны тэхнікум). З 1876 г. яна заняла таксама і будынак, у якім раней размяшчалася губернская гімназія.

Духоўная семінарыя ўтрымлівалася і кіравалася Святейшым Сінодам. Штогод у ёй навучалася каля 150 чалавек. Пераважную большасць складалі дзеці асоб духоўнага звання, вучыліся таксама дваране, купцы і прадстаўнікі іншых станаў. Выхаванцы семінарыі станавіліся ў асноўным праваслаўнымі святарамі, некаторыя з іх пазней працавалі ў школах законанастаўнікамі, а таксама выкладалі розныя іншыя прадметы.

У 1864 г. ў Віцебску пачало сваю дзейнасць Полацкае епархіяльнае жаночае вучылішча «для дзяўчат духоўнага звання», дзе выкладаліся Закон Божы, чытанне і пісьмо на рускай мове, арыфметыка, граматыка, гісторыя і геаграфія (усеагульная і руская), царкоўныя спевы, чыстапісанне і рукадзелле, праводзіліся практычныя заняткі ў агародзе, садзе, птушніку, жывёльным двары. Апрача таго, выхаванак вучылі таму, як трэба даглядаць дзяцей. З 1871 г. выпускніцы гэтага вучылішча мелі права на званне хатніх настаўніц.

Для яўрэйскага насельніцтва Віцебска, якое ў 1862 г. складала амаль 53%, былі адчынены 2 аднакласныя казённыя вучылішчы 1-га разрада, 2 школы для бедных хлопчыкаў (талмудторы, адна з якіх была заснавана ў 1853), 72 хатнія школы (меламеды) і 3-класнае дзявочае вучылішча Вальтцара. Рознымі відамі адукацыі было ахоплена менш за 4% ад агульнай колькасці яўрэйскага насельніцтва Віцебска.

Такім чынам, у 1-й палавіне 19 ст. адбылося фарміраванне трохступеннай структуры (прыходскія і павятовыя вучылішчы і гімназіі) агульнаадукацыйнай рускай школы. Са



Віцебск. Будынак былой духоўнай семінарыі. Канец 19 ст.



Віцебск. Будынак жаночага епархіяльнага вучылішча. Пачатак 20 ст.

знішчэннем прыкляштарных школ і вучылішчаў яна стала пануючай на Беларусі.

Другая палавіна 19 ст. Пачатак 1860-х г. у Расійскай імперыі быў адзначаны шэрагам буржуазных рэформ, праведзеных урадам Аляксандра II (адмена прыгоннага права, земская, судовая, ваенная і іншыя рэформы). Пад уплывам грамадскіх рухаў улады вымушаны былі правесці рэформы не толькі ў галіне эканомікі, але і ў сферы адукацыі. У 1863 г. была праведзена рэформа вышэйшай школы, у 1864 г. — пачатковай і сярэдняй.

Паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, якое ўспыхнула на Беларусі ў 1863 г., было падаўлена ўладамі самымі жорсткімі мерамі. Яно выклікала ўзмацненне палітыкі русіфікацыі ў галіне народнай асветы краю. Асноўныя палажэнні гэтай палітыкі былі выпрацаваны Віленскім генерал-губернатарам і галоўным начальнікам Віцебскай і Магілёўскай губерняў М.М.Мураўёвым, а пазней працягнуты ў дзейнасці папячыцеляў Віленскай навучальнай акругі (адноўлена ў 1850). У выніку ў перыяд падаўлення паўстання 1863 г. з гімназій і прагімназій навучальнай акругі было выключана 455 вучняў, а ўсяго ў 1863 г. з гімназій выбыла каля 2000 чалавек.[22] Па распараджэнню М.М.Мураўёва восенню 1864 г. быў зачынены Віленскі дваранскі інстытут, вясной 1863 г. Горы-Горацкі земляробчы інстытут пераведзены ў Пецярбург, ліквідаваны шэраг гімназій і дваранскіх вучылішчаў. Віцебскае 3-класнае павятовае вучылішча ў 1865 г. разам з іншымі аналагічнымі ўстановамі Віцебскай і Магілёўскай губерняў было рэарганізавана ў 2-класнае.

У Віцебску, як і па ўсёй Беларусі, да канца 1860-х г. у выніку стварэння новых, пераўтварэння часткі старых і захавання раней адкрытых назіралася вялікая разнастайнасць тыпаў сярэдніх і ніжэйшых навучальных устаноў. Яна яшчэ больш павялічылася ў 1870—90-я гг. пасля адкрыцця рэальных вучылішчаў, яўрэйскіх пачатковых вучылішчаў, царкоўнапрыходскіх школ.

У 1871 г. ў Віцебску пры бальніцы прыказам грамадскай апекі была заснавана фельчарская школа. Яна з'яўлялася ў значнай ступені агульнаадукацыйнай навучальнай установай, тэрмін навучання ў ёй складаў 4 гады. У школу прымаліся асобы, якія ўмелі чытаць і пісаць. Выкладаліся руская і лацінская мовы, арыфметыка, са спецыяльных дысцыплін — догляд за хворымі, кровапусканне, воспапрышчэпліванне, кастапраўства, рэанімацыя, анатаміраванне, выдаленне зубоў і інш. Першы набор у школу адбыўся ў пачатку 1872 г., першы выпуск (6 чалавек) — у 1875 г. Школа спыніла сваю дзейнасць пасля 1879 г.[23]

Пашырэнне колькасці і тыпаў навучальных устаноў у Віцебску ў 2-й палавіне 19 ст. садзейнічала больш шырокаму распаўсюджванню пісьменнасці і адукацыі сярод яго жыхароў. Агульная колькасць навучэнцаў у 1883 г. ў параўнанні з 1863—64 гг. узрасла на 24%. Аднак варта адзначыць, што колькасць жыхароў горада за гэты ж час павялічылася амаль удвая. Асаблівы прырост насельніцтва выклікала будаўніцтва Рыга-Арлоўскай чыгункі (1868) і перасяленне ў Віцебск на пачатку 1890-х г. яўрэйскіх сем'яў з унутраных губерняў Расійскай імперыі. У 1881 г. ў горадзе налічвалася 48 206 жыхароў, паводле дадзеных перапісу 1897 г. — ужо 66 143.[24] Натуральна, што пры такой дэмаграфічнай сітуацыі навучальных устаноў у Віцебску да канца 19 ст. не хапала.

Пачатак 20 ст. На пачатку 20 ст. колькасць насельніцтва Віцебска значна павялічылася. У 1904 г. ў горадзе было 81 122, у 1910 г. — 101 000 жыхароў.[25] У гэты час істотна павялічылася колькасць сярэдніх навучальных устаноў горада. Былі адчынены жаночая Аляксееўская гімназія (1905), прыватныя жаночыя гімназіі А.А.Варварынай (1906) і К.М.Чарновай (1908), прыватная мужчынская гімназія І.Р.Неруша (1908), прыватныя жаночыя яўрэйскія прагімназіі Д.С.Давыдавай (1907) і Р.Л.Хаўкінай (1907). Значна пашырылася і колькасць ніжэйшых навучальных устаноў, падпарадкаваных Міністэрству народнай асветы. Пры Міністэрстве гандлю і

прамысловасці былі створаны камерцыйныя вучылішчы.

Яны адносіліся да ліку сярэдніх навучальных устаноў. Ствараліся паводле «Палажэння аб камерцыйных навучальных установах», зацверджанага ў 1896 г. і дапоўненага ў 1900 г. Восенню 1901 г. група віцебскіх купцоў, прамыслоўцаў і прадстаўнікоў банкаў звярнулася ў гарадскую ўправу з прашэннем аб неабходнасці адкрыцця ў Віцебску «сярэдняй камерцыйнай навучальнай установы для падрыхтоўкі адукаваных камерсантаў».[26]

У 1872 г. ў Расійскай імперыі быў зацверджаны Статут рэальных вучылішчаў. Гэта былі сярэднія навучальныя ўстановы, у якіх галоўнае месца адводзілася дысцыплінам натуральна-матэматычнага цыкла. Прайшоўшы 6—7 гадовы курс навучання, выпускнікі паступалі звычайна ў тэхнічныя, прамысловыя і гандлёвыя вышэйшая навучальныя ўстановы. Віцебскае рэальнае вучылішча было створана ў 1911 г. на сродкі, атрыманыя па завяшчанню мсціслаўскага ваяводы Іосіфа Гільзена (памёр у 1786), які, прызначаючы нашчадкамі сваёй багатай спадчыны пляменнікаў Ігната і Ксаверыя Шадурскіх, паставіў умову, каб сродкі ад атрыманых даходаў накіроўваліся перш за ўсё на «распаўсюджванне навук і выхаванне беднага высакароднага юнацтва». У 1837 г. на гэтыя грошы пры Віцебскай мужчынскай гімназіі быў адчынены канвікт (інтэрнат) Гільзена-Шадурскіх на 40 вучняў. Аднак нашчадкі да канца не выконвалі ўмоў завяшчання, таму Міністэрства народнай асветы і Віцебская гімназія падалі на іх у суд і ў 1907 г. атрымалі 200 тыс. руб. Палавіна гэтых сродкаў была выкарыстана на адкрыццё рэальнага вучылішча ў Віцебску, якое размясцілася ў доме купца Пішчуліна. Былі набраны хлопчыкі ў падрыхтоўчы і 2 першыя класы. Дырэктарам стаў У.Г.Краснянскі. Старэйшыя класы вучылішча адкрываліся паступова па аднаму штогод. Поўны склад навучэнцаў (93 чалавекі) быў набраны ў 1916 г. Выкладаліся матэматыка, фізіка, прыродазнаўства, чарчэнне, маляванне, нямецкая і французская мовы, механіка, тэхналогія, камерцыя. Плата за навучанне ў падрыхтоўчым класе складала 50 руб., у асноўных — 60 руб. Адзіны выпуск (72 чалавекі) адбыўся ў 1917 г. Вучылішча спыніла сваё існаванне ў 1918 г.[27]

На пачатку 20 ст. пэўныя зрухі адбыліся і ў галіне прафесійнай і спецыяльнай адукацыі. Сярэдніх тэхнічных навучальных устаноў у Віцебску не было. Ніжэйшымі навучальнымі ўстановамі былі мужчынскае чыгуначнае вучылішча, а таксама 3- ці 6-месячныя курсы пры ўпраўленні трамвая і на розных прадпрыемствах, дзе рыхтавалі кандуктараў, вадзіцеляў, швачак, ткачоў і г.д.

У 1906 г. ўрачом У.В.Счансновічам у Віцебску была адчынена прыватная фельчарска-акушэрская школа, у якой рыхтаваўся сярэдні акушэрскі персанал. Праграма навучання ў школе забяспечвала цесную сувязь тэарэтычных ведаў з практыкай. Для выкладання запрашаліся вопытныя ўрачы, акушэры-гінеколагі, якія спалучалі медыцынскую практыку з навуковай дзейнасцю. Школа дзейнічала да 1913 г. і штогод выпускала 30—60 чалавек.[28]

У лік устаноў народнай адукацыі ўваходзілі таксама дзіцячыя прытулкі і ўстановы для выхавання дашкольнікаў. У 2-й палавіне 1900-х г. у Віцебску дзейнічаў дзіцячы сад, які ўтрымлівала Наталля Іванаўна Пракаповіч. Выхаваннем дзяўчынак тут апроч начальніцы сада, яе памочніцы і наглядчыцы займаліся таксама бона парыжанка, бона немка, законаастаўнік, настаўнікі танцаў і гімнастыкі.[29]

1 ліпеня 1910 г. пачаў сваю дзейнасць Віцебскі настаўніцкі інстытут — спецыяльная навучальная ўстанова для падрыхтоўкі настаўнікаў няпоўнай сярэдняй школы. Тэрмін навучання ў ім складаў 3 гады. У інстытуце выкладаліся агульнаадукацыйныя прадметы, а таксама педагогіка, псіхалогія, школазнаўства, методыка выкладання мовы, матэматыка, прыродазнаўства. Штогод набіралася 35 чалавек. Інстытут размяшчаўся на Гогалеўскай вуліцы ў былых казармах Ленкаранскага кавалерыйскага палка, які да гэтага часу змяніў месца дыслакацыі (сучасны дом № 12 па вуліцы Леніна).

Віцебскі інстытут быў створаны паводле Статута настаўніцкіх інстытутаў Расійскай імперыі. У яго прымаліся асобы толькі мужчынскага полу праваслаўнага веравызнання, якія скончылі настаўніцкія семінарыі і мелі не менш чым двухгадовы стаж педагагічнай працы. Пры інстытуце былі абсталяваны фізіка-матэматычны, гісторыка-геаграфічны і прыродазнаўча-хімічны кабінеты, дзейнічала бібліятэка, якая налічвала каля 3 тысяч тамоў. Пры інстытуце існавала вышэйшае пачатковае вучылішча, дзе студэнты праходзілі практыку. Паспяваючым студэнтам выплачвалася стыпендыя, якую яны павінны былі

адпрацаваць або вярнуць пасля заканчэння навучання.

Першы выпуск інстытута адбыўся ў 1913 г. Абітурыенты атрымлівалі няпоўную вышэйшую адукацыю, грунтоўную педагагічную і метадычную падрыхтоўку. За ўвесь тэрмін свайго існавання інстытут зрабіў 5 выпускаў, падрыхтаваў каля 150 кваліфікаваных настаўнікаў. Значная праца праводзілася і праз розныя арганізаваныя пры інстытуце курсы. Існавалі курсы настаўнікаў ручной працы, фізвыхавання, чыстапісання, рускай мовы і інш.

У 1918 г. настаўніцкі інстытут быў рэарганізаваны ў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут (зараз Віцебскі дзяржаўны універсітэт). На працягу ўсяго часу яго існавання нязменным дырэктарам Віцебскага настаўніцкага інстытута быў вядомы педагог Клаўдзій Іванавіч Ціхаміраў (1858–1924), які потым (да 1921 г.) узначальваў і Віцебскі педагагічны інстытут.

27 кастрычніка 1911 г. было адчынена Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута – першая вышэйшая навучальная ўстанова ў губерні. Як вядома, пасля закрыцця Віленскага універсітэта (1832) і пераводу Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў Пецярбург (1864) вышэйшую адукацыю выхадцам з Беларусі можна было атрымаць толькі па-за яе межамі. Таму моладзь звычайна ехала вучыцца ў Маскоўскі, Пецярбургскі, Кіеўскі, Харкаўскі ці Дэрпцкі універсітэты, а таксама ў вышэйшыя навучальныя ўстановы гарадоў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Кракаў, Жэнева, Цюрых і інш.). Улады некалькі разоў збіраліся адчыніць вышэйшую навучальную ўстанову ў Беларусі (у прыватнасці, не аднойчы вяліся размовы пра адкрыццё універсітэта ў Віцебску), аднак гэтая задума ўрадам так і не была рэалізавана.

У 1910-х г. выкладчыкі Маскоўскага археалагічнага інстытута (МАІ) наладжвалі чытанне сістэматычнага курса лекцый па ўсіх выкладаемых у інстытуце дысцыплінах у розных гарадах Расійскай імперыі. Па хадайніцтву Віцебскай вучонай архіўнай камісіі асобнае аддзяленне МАІ было адчынена і ў Віцебску. Спецыяльнай мэтай яго адкрыцця была падрыхтоўка археолагаў і архівістаў. Курс навук быў разлічаны на слухачоў з вышэйшай адукацыяй, аднак сярод іх пераважалі выпускнікі сярэдніх школ.

Аддзяленне мела археалагічны і археаграфічны факультэты, з 1917 г. – яшчэ і факультэт гісторыі мастацтва. Першапачаткова лекцыі чыталі пераважна ўвечары выкладчыкі, якія прыязджалі з Масквы. Тэрмін навучання складаў 3 гады, з 1917 г. – 4 гады. Плата за навучанне была 80 руб. у год. У 1911 г. на першы курс было прынята каля 90 чалавек, у 1918–19 навучальным годзе іх колькасць павялічылася да 428. У Віцебскім аддзяленні выкладалі археолаг В.А.Гарадцоў, мастацтвазнавец А.І.Успенскі, гісторыкі Б.Р.Брэжга (з 1918 г. – загадчык аддзялення), А.П.Сапуноў, У.М.Перцаў, этнограф У.М.Дабравольскі, філолагі Р.Ф.Брант, М.І.Навасадскі, С.І.Сабалеўскі і інш.[30]

Пасля ліквідацыі Віцебскай вучонай архіўнай камісіі ў 1919 г. аддзяленню былі перададзены яе бібліятэка (3700 тамоў), музей і гістарычны архіў (314 спраў), а таксама частка бібліятэкі былой Віцебскай езуіцкай калегіі (2 тыс. тамоў).

У лістападзе 1918 г. Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута было рэфарміравана. У студзені 1921 г. пры яго этнаграфічным кабінеце быў створаны студэнцкі этнаграфічны гурток, сябры якога запісалі больш за 300 народных песень, сабралі каля 120 этнаграфічных прадметаў, пачалі выдаваць машынапісны часопіс «Белорусский этнограф» (выйшлі 2 нумары).

У сувязі з закрыццём археалагічных інстытутаў у РСФСР у чэрвені 1922 г. было зачынена і аддзяленне МАІ у Віцебску.

Такім чынам, за перыяд з канца 18 да пачатку 20 ст. ў Віцебску, як і ў іншых гарадах Беларусі, была створана шматступенная сістэма агульнаадукацыйных рускіх школ, якая давала магчымасць атрымаць свецкую адукацыю выхадцам з розных станаў насельніцтва. Духоўную адукацыю ў горадзе маглі набыць толькі асобы праваслаўнага веравызнання. Пры пэўнай абмежаванасці тагачаснай асветы і адукацыі развіццё ў Віцебску шырокай сеткі навучальных устаноў мела станоўчае значэнне, бо па сутнасці адпавядала аб'ектыўным патрабаванням развіцця грамадства.

Даследаванні і крыніцы

1. Zvkaszewicz J. Lzieje kosciolow wyznania helweckiedow litwie. T. 11. Poznau, 1863. S. 150.

2. Дадзіёмава В. З гісторыі музычнай бурсы пры Віцебскім езуіцкім калегіуме. Віцебскі сшытак. № 1. 1995. С. 26–31.

3. Materyaly do dzielow Akademii Polockiej i szkol od niej zaleznycn,. Zebral I.G. Krakow, 1905. S. 177.

4. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. Витебск, 1884. С. 153.

5. Тамсама. С. VII—VIII.
6. Тамсама. С. 153.
7. Тамсама.
8. Сементовский А.М. Витебск, статистический очерк. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. СПб., 1865. С. 196.
9. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. С. 139.
10. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу, ф. 823, воп. 2, спр. 3102; ф. 824; воп. 2, спр. 117, л. 14 адв.; Zukaszenicz I. Nistoryf szkd w Koronie i w Wielkim jcsisstwie Litewskim od najdawniejszycn czasow az do roku 1794. T. 2. Poznav, 1850. S. 142.
11. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. С. 18.
12. Тамсама. С. 27—29.
13. Кузняева С. Віцебскі езуіцкі калегіум на пачатку XIX стагоддзя (па матэрыялах рэвізіі В.М.Севяргіна). Віцебскі сшытак. № 1. 1995. С. 33.
14. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. С. CLXV.
15. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн., 1968. С. 147.
16. Тамсама. С. 146.
17. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т. 1. С. 382.
18. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. С. 38—39, 161, CLIV.
19. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 326.
20. Сапунов А. Историческая записка 75-летия Витебской гимназии. С. 62—65.
21.Памятная книжка Витебской губернии на 1865 год. С. 282.
22. Нарысы гісторыі народнай асветы. С. 175.
23. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 327.
24. Сапунов А.П. Витебская старина. Т. 1. Витебск, 1883. С. 452; Памятная книжка Витебской губернии на 1898 год. Витебск, 1898. С. 35.
25. Памятная книжка Витебской губернии на 1905 год. Витебск, 1905. С. 3;
Егоров Ю.А. Градостроительство Белоруссии. М., 1954. С. 162.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 2496, воп. 1, спр. 4327, арк. 26.
27. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 321.
28. Тамсама. С. 326.
29. Адресная и справочная книга г. Витебска. Витебск, 1907. С. 84.
30. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 2. С. 318.

Л.У.Хмяльніцкая.

Віцебскія гімназіі

Гімназіі з'яўляліся сярэднімі навучальнымі ўстановамі дарэвалюцыйнай Расіі. Рэарганізацыя народных вучылішч у губернскіх гарадах Расійскай імперыі рабілася па загаду імператара Аляксандра I ад 24 студзеня 1803 г., таму нанава створаныя гімназіі сталі называцца Аляксандраўскімі. Яны былі ліквідаваны дэкрэтам Усерасійскага ЦВК ад 16 кастрычніка 1918 г.

Мужчынская Аляксандраўская гімназія

Першая ў горадзе. Створана ў 1808 г. ў выніку рэарганізацыі Віцебскага галоўнага народнага вучылішча. Гэта была ўсесаслоўная ўстанова з 4-гадовым курсам навучання. Згодна з гімназічным статутам ад 5 лістапада 1804 г. выкладаліся фізіка, матэматыка, гісторыя з міфалогіяй і старажытнасцямі, геаграфія і статыстыка, філасофія, эстэтыка і рыторыка, навукі палітычныя (палітэканомія і права), прыродазнаўства з асновамі сельскай і лясной гаспадаркі, асновы тэхналогіі і навук камерцыйных, лацінская, нямецкая і французская мовы, маляванне. Дадаткова выкладаліся польская мова, хімія і правілы прышчэплівання каровінай воспы.

Першапачаткова гімназія знаходзілася ў падпарадкаванні Віленскай навучальнай акругі, таму афіцыйная перапіска і выкладанне некаторых прадметаў у ёй вяліся на польскай мове. Пасля далучэння гімназіі ў 1824 г. да Пецярбургскай навучальнай акругі навучанне вялося выключна на рускай мове. Размяшчалася гімназія ва ўласным будынку на Саборнай вуліцы (цяпер — дом № 7 па вуліцы Крылова).

8 снежня 1828 г. быў прыняты новы гімназічны статут, згодна з якім быў значна зменены курс навук, што выкладаліся ў гімназіі, і ўведзена 7-гадовае навучанне. Віцебская гімназія была рэфармавана па новым статуце 9 верасня 1830 г. Для вучняў цяпер дапускаліся цялесныя пакаранні, галоўнымі прадметамі абвяшчаліся старажытныя мовы (грэчаская і лацінская) і матэматыка. Па новым статуце выкладаліся Закон Божы, расійская славеснасць і логіка. У 1834—39 гг. пры гімназіі існавала семінарыя для падрыхтоўкі выкладчыкаў прыходскіх вучылішчаў, з 1837 г. дзейнічаў канвікт (інтэрнат для вучняў) Гільзена-Шадурскіх. У гэтай дабрачыннай

установе ўтрымліваліся 40 навучэнцаў за кошт фундуша Гільзена, 10 — за кошт фундуша Хрыстафора Закржэўскага, 1 — маёра Бушгунта, 2 — нашчадкаў Ігнація Шадурскага. Канвікт размяшчаўся ў адным з будынкаў былога бернардынскага кляштара побач з касцёлам Св. Антонія (будынак не захаваўся).

У 1851 г. ў гімназіі ўведзена навучанне прыёмам вайсковай службы. У вышэйшых класах выкладаўся страявы статут пяхотнай службы.

19 лістапада 1864 г. зацверджаны новы статут гімназій, згодна з якім усе яны падзяліліся на класічныя і рэальныя (у абодвух тэрмін навучання складаў 7 гадоў). У класічных гімназіях у аснову было пакладзена выкладанне старажытных («класічных») моў, у рэальных — матэматыкі і прыродазнаўства. Выпускнікі класічных гімназій атрымоўвалі права паступаць ва універсітэты без экзаменаў. Абітурыенты рэальных гімназій паступалі пераважна ў вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы, трапіць на вучобу ва універсітэт ім было вельмі складана. Віцебская гімназія была ператворана ў класічную.

Згодна з новым статутам гімназій ад 30.7.1871 г. гімназіямі прызнаваліся толькі былыя класічныя, рэальныя ж гімназіі ператвараліся ў рэальныя вучылішчы. Тэрмін навучання ў класічных гімназіях павялічваўся да 8 гадоў (пры Віцебскай гімназіі восьмы клас быў адчынены ў 1875 г.). Пасля заканчэння поўнага курса гімназіі абітурыенты атрымлівалі атэстаты і права паступаць ва ўсе вышэйшыя навучальныя ўстановы. Пры паступленні на дзяржаўную службу абітурыенты гімназій атрымлівалі перавагу ў атрыманні першага класнага чыну паводле «Табеля аб рангах». Абітурыенты, узнагароджаныя пасля заканчэння гімназіі залатым або сярэбраным медалямі, атрымлівалі чын адразу ж пры паступленні на службу.

Пераважную большасць навучэнцаў складалі дзеці дваран і гарадскіх саслоўяў праваслаўнага і рыма-каталіцкага веравызнанняў. Гімназічны будынак на Саборнай вуліцы 16 мая 1873 г. набыло ў сваю ўласнасць духоўнае ведамства. Пэўны час у ім яшчэ працягваліся заняткі, а 2 чэрвеня 1876 г. па загаду міністра народнай асветы ён быў перададзены духоўнай семінарыі. Гімназія змушана была перасяліцца ў будынак, дзе раней размяшчаўся канвікт Гільзена-Шадурскіх (апошні быў пераведзены ў наёмны дом). Адначасова пачалося ўзвядзенне спецыяльнага новага будынка для гімназіі на Пушкінскай вуліцы. Заняткі ў ім пачаліся ў 1880 г. (будынак не захаваўся).

Плата за навучанне ў гімназіі складала 50 руб. на год, у 1910-х г. яна ўзрасла да 70 руб. Пры гімназіі існавалі фундаментальная і вучнёўская бібліятэкі (у 1906 у іх налічвалася адпаведна 18 047 і 2748 тамоў кніг), фізічны, прыродазнаўчы і нумізматычны кабінеты, гімнастычная зала, царква ў імя св. Сергія Раданежскага.

Сярод выкладчыкаў гімназіі асабліва варта адзначыць імёны Івана Пятровіча Трутнева, знакамітага рускага жывапісца, акадэміка, арганізатара і загадчыка Віленскай рысавальнай школы, які ў 1866—67 гг. выкладаў у Віцебскай гімназіі маляванне і чарчэнне; беларускага этнографа Паўла Васільевіча Шэйна, які ў 1865—73 гг. выкладаў тут нямецкую мову; этнографа і фальклярыста Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага, які ў 1882—1909 гг. працаваў настаўнікам падрыхтоўчага класа гімназіі; вядомага віцебскага гісторыка і краязнаўцу Аляксея Парфёнавіча Сапунова, які напачатку вучыўся ў гімназіі, а ў 1873—97 гг. выкладаў у ёй старажытныя мовы; выпускніка юрыдычнага факультэта Казанскага універсітэта Усевалада Антонавіча Кадыгробава, які ў 1905—12 гг. выкладаў у гімназіі заканадаўства і быў актыўным удзельнікам мясцовага краязнаўчага руху.

У Аляксандраўскай гімназіі вучыліся дзекабрыст Іван Іванавіч Гарбачэўскі (1800—69), беларускі і польскі паэт, фальклярыст і кнігавыдавец Аляксандр Феліксавіч Рыпінскі (1811 — каля 1900), адзін з першых у Расіі санскрытолагаў Каэтан Касовіч (1814—83), настаўнік і палітычны ссыльны Максімілян Восіпавіч Маркс (1816—93), беларускі і польскі пісьменнік Геранім Марцынкевіч (1816—64), аўтар знакамітай паэмы «Тарас на Парнасе» Канстанцін Васільевіч Вераніцын (1834—1904), сусветна вядомы філосаф Мікалай Ануфрыевіч Лоскі (1870—1965) і інш.

Дырэктары Віцебскай гімназіі: Кірыл Афанасьевіч Канароўскі-Саховіч (з 4 студзеня 1802); Пётр Мікалаевіч Кошка (з 26 жніўня 1821); Пётр Мацвеевіч Катлоўскі (з 25 мая 1822); Уладзімір Канароўскі-Саховіч (з 24 ліпеня 1824); Дзмітрый Мікалаевіч Палянскі (з 19 жніўня 1824); Фёдар Якаўлевіч Целешаў (з 3 студзеня 1827); Карл Іванавіч Водар (з 3 лістапада 1831); Іван Аляксеевіч

Гарэтоўскі (з 2 красавіка 1832); Аляксандр Іванавіч Арлоў, магістр Маскоўскай духоўнай акадэміі (з 5 ліпеня 1834); Андрэй Пярфільевіч Рынман (з 15 снежня 1835); Антон Антонавіч Бернгоф (з 7 кастрычніка 1841); Сцяпан Іванавіч Краснавумаў, выпускнік Пецярбургскага педагагічнага інстытута (з 6 лютага 1852); Мікалай Міхайлавіч Арнольд, кандыдат юрыдычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта (з 31 снежня 1865); Густаў Карлавіч Шэфлер, выхаванец Пецярбургскага педагагічнага інстытута (з 1 красавіка 1867); Юліян Аляксеевіч Шакальскі, магістр гісторыка-філалагічных навук, выпускнік Варшаўскай галоўнай школы (з 9 жніўня 1881); Сцяпан Мікалаевіч Фяліцын, выпускнік Казанскага універсітэта (з 1 жніўня 1882); Іван Андрэевіч Увядзенскі (з 1890); Фёдар Андрэевіч Вазнясенскі, выпускнік Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага інстытута (з 25 лістапада 1899); Павел Паўлавіч Радкевіч, кандыдат фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага універсітэта (з 16 чэрвеня 1907).

Літаратура: Избранные стихотворения учеников Витебской мужской гимназии. 1885–1899 гг. Витебск, 1899; Сапунов А.П. «Историческая записка 75-летия Витебской гимназии». Витебск, 1884.

Жаночая гімназія ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі

Існавала з 1870 г. Размяшчалася ва ўласным доме на Гогалеўскай вуліцы (сучасная вуліца Леніна, будынак не захаваўся). У ёй выкладаліся Закон Божы, руская мова і славеснасць, мовы французская і нямецкая, матэматыка, гісторыя і геаграфія, прыродазнаўства, фізіка і касмаграфія, педагогіка, маляванне і чыстапісанне, рукадзелле і спевы. Ніжэйшым класам лічыўся сёмы, вышэйшым — першы. Выкарыстоўвалася 12-балавая сістэма адзнакі ведаў. Пасля заканчэння поўнага курса гімназіі навучэнкі атрымлівалі атэстат на званне хатняй настаўніцы, а тыя з іх, што мелі ўзнагароды (медаль або кнігу), — дадаткова права без экзаменаў паступаць на педагагічныя курсы. Плата за навучанне складала ад 30 да 100 руб. на год.

У асноўных класах гімназіі вучыліся пераважна дочкі дваран праваслаўнага веравызнання, на вячэрнім, паралельным, аддзяленні — мяшчан іўдзейскага веравызнання. Інтэрната пры гімназіі не было. Іншагароднія навучэнкі жылі або ў сваякоў, або на прыватных кватэрах. Пры гімназіі дзейнічала таварыства дапамогі навучэнкам, што жылі ў нястачы. Яно размяркоўвала стыпендыі, што накопліваліся з працэнтаў ад дабрачынных прыватных ахвяраванняў (у 1906 існавала 18 такіх стыпендый), аказвала матэрыяльную дапамогу бяднейшым асобам у плаце за навучанне.

У сувязі са значным павелічэннем колькасці навучэнак у 1902 г. губернскім інжынерам У.Коршыкавым быў складзены праект на ўзвядзенне новага будынка гімназіі, але з-за абмежаванасці сродкаў ён не быў ажыццёўлены.

Выпускніцы гімназіі А.А.Варварына і К.М.Чарнова адчынілі ў Віцебску ўласныя прыватныя жаночыя гімназіі.

Літаратура: Адресная и справочная книга г. Витебска. Витебск, 1907; Акт в Витебской женской гимназии. Витебск, 1895; Ликсо А.А. Гигиена и домашний уход за больными, читанные в Полоцком женском училище Духовного ведомства в г. Витебск. Витебск, 1901; М. Л. Речь начальника женской Мариинской гимназии на выпускном акте 30 мая 1908 г. Витебск, 1908; Новейшая программа Витебской женской гимназии ведомства учреждений императрицы Марии. Витебск, 1910.

Жаночая Аляксееўская гімназія

Заснавана 1 ліпеня 1905 г., названа ў гонар вялікага князя Аляксея Мікалаевіча, наследніка трону. Размяшчалася гімназія ўвесь час у наёмным доме спачатку на Замкавай, а з 1910-х г. — на Пушкінскай вуліцы ў доме купчыхі Ханы Гурэвіч (будынак не захаваўся). Апрача датацыі з дзяржаўнай скарбніцы гімназія ўтрымлівалася за кошт грашовых сум Віцебскага гарадскога грамадзянскага ўпраўлення і платы за навучанне, якая складала ад 55 руб. на год у падрыхтоўчым класе да 100 руб. у педагагічным. Начальнікам гімназіі ў 1907 г. быў Іван Юр'евіч Сабін-Гус, з 24 верасня 1908 г. — Андрэй Андрыянавіч Ляхніцкі, з 11 верасня 1910 г. — Клаўдзій Іванавіч Ціхаміраў, кандыдат Пецярбургскай духоўнай акадэміі, які адначасова з'яўляўся дырэктарам Віцебскага настаўніцкага інсты-

тута і працяглы час быў старшынёй Віцебскай навуковай архіўнай камісіі. У 1906 г. гімназію наведвала 389 навучэнак, у 1911 – 493, у 1915 – 520. У гімназію прымаліся навучэнкі ўсіх саслоўяў і веравызнанняў. Выкладаліся наступныя прадметы: Законы Божы, руская мова, гісторыя, геаграфія, прыродазнаўчая гісторыя, матэматыка, фізіка, чыстапісанне, рукадзелле і гімнастыка. Неабавязковымі для вывучэння былі нямецкая і французская мовы, маляванне, спевы і танцы. У педагагічным класе дадаткова вывучаліся методыка рускай мовы і практыкаванні ў выкладанні. Вучэбныя планы набліжаліся да планаў мужчынскіх гімназій. Сістэма адзнакі ведаў была 5-балавай. Пасля заканчэння сёмага класа навучэнкам выдаваўся атэстат на званне настаўніцы пачатковых школ, пасля заканчэння восьмага класа – атэстат на званне хатняй настаўніцы і магчымасць без экзаменаў паступаць на вышэйшыя жаночыя курсы. Кіраваў гімназіяй яе начальнік, які зацвярджаўся міністрам асветы.

Літаратура: Адресная и справочная книга г. Витебск. Витебск, 1907.

Прыватныя гімназіі

Прыватныя гімназіі ў дарэвалюцыйнай Расіі вядомы з 1856 г. Тыя з іх, што карысталіся правамі ўрадавых гімназій, абавязаны былі падпарадкоўвацца гімназічнаму статуту 1871 г. і распараджэнням мясцовай навучальнай акругі, а таксама прытрымлівацца праграм, зацверджаных міністэрствам народнай асветы. Утрымліваліся прыватныя гімназіі ў пераважнай большасці толькі за кошт платы за навучанне, але ж ім выдзяляліся і невялікія ўрадавыя субсідыі.

Віцебская прыватная жаночая 8-класная з правамі ўрадавых гімназія А.А.Варварынай

Створана ў 1906 г. ў выніку рэарганізацыі жаночага вучылішча, што існавала ў Віцебску з 1870 г. Заснавальніцай вучылішча была баранэса Соф'я Аляксандраўна Бадэ.

Утрымлівала гімназію Аляксандра Аляксандраўна Варварына, выпускніца Віцебскай Марыінскай гімназіі. Размяшчалася гімназія ў наёмным доме спачатку А.Гурэвіча ў Бібкіным завулку (сучасны дом № 9 на вуліцы Янкі Купалы), а з 1909 г. – на Вакзальнай вуліцы ў доме Зарына (будынак не захаваўся). У 1906–18 гг. у гімназіі выкладаў Мікалай Мікалаевіч Багародскі, кандыдат гістарычнага аддзялення Маскоўскай духоўнай акадэміі, які працаваў у Віцебскай духоўнай семінарыі і актыўна ўдзельнічаў у мясцовым краязнаўчым руху.

З 1911 г. загадчыкам вучэбна-выхаваўчай часткі, а пазней старшынёй педагагічнага савета гімназіі з'яўляўся Уладзімір Гаўрылавіч Краснянскі, дырэктар Віцебскага рэальнага вучылішча і вядомы краязнаўца. Навучэнак у гімназіі было: у 1908 г. – 412, у 1913 – 393, у 1915 – 439. Плата за навучанне складала ад 40 руб. на год у падрыхтоўчым класе да 100 руб. у дадатковым восьмым класе.

Прыватная жаночая 7-класная з правамі ўрадавых гімназія К.М.Чарновай

Створана ў 1908 г. пасля рэарганізацыі прыватнага яўрэйскага вучылішча. 2-класнае прыватнае жаночае яўрэйскае вучылішча было адчынена ў Віцебску ў 1866 г. і першапачаткова ўтрымлівалася Лізаветай Восіпаўнай Рэдэлін не толькі за кошт платы за навучанне, а і за кошт штогадовых аддлічэнняў са святочнага збору, які спаганяўся з яўрэйскага насельніцтва. У розныя гады тут навучалася ад 45 да 130 дзяўчынак. У 1901 г. вучылішча было ператорана ў 4-класнае, у 1906 г. – у 4-класную прагімназію і, зрэшты, у 1908 г. – у 7-класную гімназію. Гімназія размяшчалася ў доме Х.Гурэвіч на Смаленскай вуліцы. Утрымлівала яе Кацярына Міхайлаўна Чарнова, якая скончыла Віцебскую Марыінскую гімназію.

Плата за навучанне ў гімназіі складала ад 40 руб. на год у падрыхтоўчым класе да 70 руб. у выпускным. У 1912 г. ў гімназіі было 212 вучаніц, у 1915 г. — 216. У 1910—12 гг. касмаграфію ў гімназіі выкладаў Мікалай Мікалаевіч Багародскі, актыўны ўдзельнік мясцовага краязнаўчага руху.

Прыватная мужчынская 8-класная з правамі ўрадавых гімназія І.Р.Неруша

Створана ў ліпені 1908 г. з прыватнай 4-класнай прагімназіі І.Р.Неруша, якая існавала ў Віцебску з верасня 1906 г. (у першы навучальны год у прагімназіі было 46 вучняў, у другі — 116). Утрымліваў гімназію Іван Раманавіч Неруш, выпускнік гісторыка-філалагічнага інстытута князя Безбародкі ў г. Нежын. З 1898 г. І.Р.Неруш працаваў выкладчыкам старажытных моў у Віцебскай мужчынскай Аляксандраўскай гімназіі (тут ён працаваў нават і тады, калі ўжо меў уласную гімназію). Да 1910 г. гімназія (а перад тым і прагімназія) размяшчалася ў доме Лур'е на Падзвінскай вуліцы (сучасны дом № 4 па вуліцы Талстога), з 1910 г. Неруш узяў у арэнду ў горада частку памяшканняў былых казармаў Ленкаранскага палка на Гогалеўскай вуліцы (сучасны дом № 16 па вуліцы Леніна). Гімназія ўтрымлівалася толькі за плату за навучанне, якая складала для кожнага вучня ад 100 да 125 руб. на год. Колькасць вучняў, што наведвалі гімназію, складала ў 1908 г. 171, у 1911 — 232, у 1915 — 210 чалавек. Рускую мову і арыфметыку ў падрыхтоўчым класе гімназіі ў 1906—09 гг. выкладаў беларускі этнограф і фальклярыст М.Я.Нікіфароўскі. У 1911—12 гг. у гімназіі працаваў Усевалад Антонавіч Кадыгробаў, на той час старшыня Віцебскай вучонай архіўнай камісіі і ініцыятар адкрыцця першай у горадзе вышэйшай навучальнай установы — Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута.

Літаратура: Адресная и справочная книга г. Витебск. Витебск, 1907.

Віцебскія прагімназіі

Прагімназіі ў дарэвалюцыйнай Расіі з'яўляліся самастойнымі навучальнымі ўстановамі, якія складаліся з 4-х або 6-ці ніжэйшых класаў і мелі праграму ва ўсім аднолькавую з адпаведнымі класамі гімназій. Асобы, што заканчвалі курс прагімназій, атрымлівалі пасведчанні. У 1866 г. прагімназіі атрымалі права праводзіць экзамены на званне прыходскага настаўніка і на першы класны чын «Табелі аб рангах». Прагімназіі былі ліквідаваны разам з гімназіямі дэкрэтам Усерасійскага ЦВК ад 16 кастрычніка 1918 г.

Прыватная 4-класная жаночая яўрэйская прагімназія Д.С.Давыдавай

Створана ў 1907 г. ў выніку рэарганізацыі прыватнага 3-класнага жаночага яўрэйскага вучылішча, што існавала з 1895 г., пры якім дзейнічала дадаткова вячэрняе аддзяленне для дарослых жанчын (агульная колькасць наведвальніц вучылішча ў 1900—01 навучальным годзе склала 249 чалавек). З 1901 г. вучылішча стала 4-класным. Утрымлівала вучылішча, а пазней і прагімназію Дар'я Самойлаўна Давыдава, выпускніца Магілёўскай жаночай Марыінскай гімназіі і Маскоўскіх педагагічных курсаў. Размяшчалася прагімназія на Падзвінскай вуліцы ў доме Борэра (будынак не захаваўся). Плата за навучанне складала ад 30 да 60 руб. на год і з'яўлялася адзінай фінансавай крыніцай існавання ўстановы. У 1912 г. прагімназію наведвалі 190 вучаніц, у 1914 г. — 180, у 1915 — 200.

Прыватная 4-класная жаночая яўрэйская прагімназія Р.Л.Хаўкінай

Існавала з 1907 г. Размяшчалася на Замкавай вуліцы ў доме Нірэнштэйна (будынак не захаваўся). Утрымлівала яе Разалія Львоўна Хаўкіна, якая скончыла вышэйшыя жаночыя курсы ў Пецярбургу і мела званне хатняй настаўніцы. Р.Л.Хаўкіна ў 1897 г. адчыніла ў Віцебску 2-х класнае жаночае яўрэйскае вучылішча. У 1901 г. ператорана ў 3-класнае вучылішча, а ў 1907 г. — у 4-класную прагімназію. Утрыманне прагімназіі ажыццяўлялася толькі на сродкі, атрыманыя ў якасці платы за навучанне (для кожнай навучэнкі яна складала ад 30 да 50 руб. на год). У 1914 г. тут вучылася 140 дзяўчынак, у 1915 г. — 150.

Артыкулы пра гімназіі падрыхтавала Л.У.Хмяльніцкая.

Дакументы сведчаць

НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ВІЦЕБСКА 1860 г.

Наименование учебных заведений	Учащихся			Учителей	Школ
	м.	ж.	всего		
Витебская губернская гимназия (с 1808)	250	—	250	18	
Уездное училище	125	—	125	7	
Приходское училище	30	—	30	2	
Образцовый пансион благородных девиц	—	56	56	2	
Частный женский четырехклассный пансион	—	56	56	2	
Казенная школа для образования бедных девиц	—	19	19	1	
Частная женская школа Соколовской	—	15	15	1	
Частная школа Сеницкой	—	15	15	1	
Первое 1-го разряда казенное еврейское училище	17	—	17	3	
Второе 2-го разряда казенное еврейское училище	20	—	20	—	
Частный женский еврейский пансион	—	21	21	3	
Витебское духовное училище	150	—	150	6	
Витебское Спасо-Ефрасиньевское училище	—	60	60	6	
Всего:	442	182	624	40	
Всего с духовными	592	242	834	52	13

Табліца складзена Л.У.Хмяльніцкай.

НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ВІЦЕБСКА 1866 г.

Наименование учебных заведений	Количество учащихся			Количество учителей			Школ
	м.	ж.	всего	м.	ж.	всего	
Средние учебные заведения:							
Мужская гимназия	361	—	361	17	—	17	
Полоцкая духовная семинария	119	—	119	9	—	9	

Працяг табліцы

Наименование учебных заведений	Количество учащихся			Количество учителей			Школ
	м.	ж.	всего	м.	ж.	всего	
Низшие учебные заведения:							
Землемерно-таксаторские классы при гимназии	40	–	40	5	–	5	
Уездное двухклассное училище	70	–	70	5	–	5	
Духовное уездное училище	126	–	126	5	–	5	
Приходское 1-е училище	72	–	72	2	–	2	
Приходское 2-е училище	50	–	50	2	–	2	
Женские учебные заведения:							
Женская трехклассная гимназия	–	95	95	14	4	18	
Образцовый 4-классный пансион	–	16	16	6	3	9	
Частный 4-х классный пансион	–	15	15	5	2	7	
Частные одноклассные школы:							
Соколовой	–	16	16	1	1	2	
Татарской	–	11	11	1	1	2	
Величко	–						
Детский приют	9	101	110	3	3	6	
Конговицкой	–	11	11	1	1	1	
Вериго	–	6	6	1	1	2	
Училище для девиц духовного звания	–	40	40	4	2	6	
Женская школа при приходском училище	–	25	25	1	1	2	
Училище для бедных девиц	–	34	34	1	1	2	
Казенные еврейские училища:							
Первое	100	–	100	3	–	3	
Второе	100	–	100	3	–	3	
Девичье еврейское двухклассное училище	–	49	49	2	1	3	
Всего:	1047	422	1969	92	22	114	22

Табліца складзена Л.У.Хмяльніцкай.

КОЛЬКАСЦЬ НАВУЧЭНЦАЎ ВІЦЕБСКАЙ МУЖЧЫНСКАЙ АЛЯКСАНДРАЎСКАЙ ГІМНАЗІІ У 1809—1906 гг.

Год	Колькасць навучэнцаў	Год	Колькасць навучэнцаў
1809	181	1857	321
1810	226	1858	335
1811	98	1859	338
1812	194	1860	296

Працяг табліцы

Год	Колькасць навучэнцаў	Год	Колькасць навучэнцаў
1813	100	1861	390
1814	122	1862	413
1815	174	1863	364
1816	186	1864	361
1817	187	1865	361
1819	163	1866	308
1820	207	1867	303
1821	247	1868	307
1823	138	1869	324
1824	148	1870	333
1825	133	1871	385
1826	143	1872	384
1827	168	1873	347
1828	174	1874	354
1829	210	1875	360
1830	241	1876	357
1831	139	1877	460
1832	196	1878	392
1833	191	1879	431
1834	212	1880	466
1835	202	1881	479
1836	217	1882	446
1837	227	1883	398
1838	240	1884	378
1839	233	1885	405
1840	270	1886	439
1841	271	1887	380
1842	330	1888	385
1843	309	1889	376
1844	335	1890	395
1845	331	1891	400
1846	346	1892	384
1847	318	1893	403

Працяг табліцы

Год	Колькасць навучэнцаў	Год	Колькасць навучэнцаў
1848	286	1894	403
1849	314	1895	400
1850	299	1896	405
1851	299	1900	527
1852	316	1901	531
1853	299	1903	584
1854	294	1904	622
1855	284	1905	636
1856	310	1906	667

КОЛЬКАСЦЬ НАВУЧЭНАК ВІЦЕБСКАЙ ЖАНОЧАЙ МАРЫІНСКАЙ ГІМНАЗІІ Ў 1884—1906 гг.

Год	Колькасць навучэнак	Год	Колькасць навучэнак
1884	336	1894	322
1885	308	1895	328
1886	283	1896	351
1887	276	1900	413
1888	259	1901	453
1889	269	1903	530
1890	255	1904	600
1891	278	1905	662
1892	292	1906	636
1893	319		

Табліца складзена Л.У.Хмяльніцкай.

НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ ВІЦЕБСКА **1913 г.**

	Преподаватели	Учащиеся
Отделение Московского археологического института	—	—
Учительский институт	13	103
Городское училище при институте	4	95
Мужская гимназия Александра I	31	610
Частная мужская гимназия Неруша	27	262
Витебское реальное училище	13	140
Витебская Алексеевская женская гимназия	39	503
Частная женская гимназия Варвариной	32	410
Частная 7-классная женская гимназия Черновой	20	216
Частная 4-классная прогимназия Давыдовой	13	10
Частная 4-классная прогимназия Хавкиной	10	140
1-е городское училище	13	163
2-годичные педкурсы	11	42
2-е городское училище	10	160
3-е городское училище	9	152
Низшая ремесленная школа	4	57
Духовная семинария	18	
Коммерческое училище	22	
Женская Мариинская гимназия	53	
Полоцкое женское духовное училище	26	
Мужское духовное училище	10	

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 246, воп. 1, спр. 74, с. 16.

Музычнае і тэатральнае жыццё Віцебска (19 — пачатак 20 ст.)

Віцебск у 19 — пачатку 20 ст. быў адным з музычных цэнтраў Беларусі. Культурны ўзровень жыцця Віцебска рос, дзякуючы зручнаму геаграфічнаму становішчу. Знаходзячыся ў цэнтры заходняй часткі Еўрапейскай Расіі, між Пецярбургам і Масквой, Кіевам, Рыгай і Варшавай, Віцебск уваходзіў у гастрольныя маршруты многіх творчых калектываў.

У 19 ст. першае значнае ажыўленне музычнага жыцця ў Віцебску адбылося ў 1830—40-я гг. У гэты час горад наведвалі вядомыя рускія і замежныя артысты. На гарадской плошчы, у парках і скверах наладжваліся канцэрты духавых і струнных аркестраў, ансамбляў беларускіх народных інструментаў.

У сярэдзіне 1840-х г. у Віцебску дзейнічаў хатні тэатр у генерал-лейтэнанта А.М.Галіцына, беларускага (смаленскага, віцебскага і магілёўскага) генерал-губернатара. Рэзідэнцыя генерал-губернатара знаходзілася ў Віцебску, дзе і быў створаны тэатр. Да ўдзелу ў спектаклях былі дапушчаны толькі дваране-аматары, але аркестр, хор і балет складаліся пераважна з прафесійных выканаўцаў (часам прыгонных ці вольнанаёмных). Кіравалі музычна-сцэнічнымі пастаноўкамі вядомыя тэатральныя дзеячы — капельмайстар Г.Ягеман і балетмайстар М.Піён.

Асаблівай увагі заслугоўвае дзейнасць балетнага ансамбля пад кіраўніцтвам французскага харэографа Марыса Піёна. Упершыню танцоўшчык з'явіўся ў Віцебску ў лістападзе 1844 г. Да адкрыцця мясцовага тэатра артысты выступалі ў губернатарскім палацы, парку «Цівалі», будынку гарадской гімназіі. Асноўны састаў балетнага ансамбля быў невялікі, складаўся з 6 чалавек: братоў Марыса, Уладзіслава і Адольфа Піёнаў, мужа і жонкі Кос і маладой балерыны Царовай. Кардэбалет складаўся з прыгонных сялян і некалькіх запрошаных артыстаў. Вядучыя танцоўшчыкі былі на ўтрыманні і атрымлівалі да 60 руб. у месяц.

23 снежня 1845 г. ў Віцебску адкрыўся гарадскі тэатр, на сцэне якога балетная трупа М.Піёна ставіла свае спектаклі.

Мастацкі ўзровень піёнаўскіх спектакляў быў вельмі высокі. У той час на віцебскай сцэне былі пастаўлены балеты «Дзве статуі» Ю.Эльспера, «Швейцарская малочніца» А.В.Гіровеца і М.Э.Карыфаў ды Калабрана, «Вяселле ў Айцове» К.Курпінскага і Ю.Дамсэ, «Чароўная флейта» і інш. Суправаджаў спектаклі М.Піёна мясцовы аркестр пад кіраўніцтвам скрыпача-віртуоза Г.П.Ягемана.

У 1850—60-я г. ў Віцебскай губерні праходзілі вельмі папулярныя музычныя вечарыны. Нагодай для іх, як правіла, была дабрачыннасць. Выканаўцамі на гэтых канцэртах былі юныя артысткі, выхаванкі пансіёна Крузэ-Драздоўская і Мацюніна. У рэпертуары вечара гучалі арыі з опер Т.Даніцэці і В.Беліні, Д.Расіні і Дж.Нікаліні. У гэтых жа канцэртах у выкананні мясцовых аматараў прагучалі уверцюры да опер Ф.Герольда «Цампа», К.Вэбера «Аберон», Дж.Расіні «Вільгельм Тэль» і С.Манюшкі «Галька».

Да адкрыцця ў Віцебску музычных школ навучанне музыцы ажыццяўлялася ў хатніх умовах айчыннымі і замежнымі педагогамі, а таксама ў розных пансіёнах. У гэты перыяд асобае месца сярод настаўнікаў музыкі займала выдатная піяністка Ф.Д.Тэйтэльбаум-Левінсон, вучаніца А.Рубінштэйна. Сярод яе вучняў былі М.В.Юдзіна, Е.С.Фрадкіна, Д.А.Гершэвіч, скрыпачка Э.Лерман. У музычнай адукацыі і канцэртным жыцці горада значнай была роля жаночых пансіёнаў Ю.Янкоўскай (1826), Л.Чаплінскай, А.Рэзенер, Е.Зэйдэль (1834—35). Выхаванкі пансіёнаў навучаліся ігры на фартэпіяна і спевам, выступалі з канцэртамі.

У 1887 г. ў Віцебску створана Таварыства музычнага і драматычнага мастацтва з класамі спеваў, фартэпіяна, скрыпкі, тэорыі музыкі. Істотную ролю ў дзейнасці гэтага таварыства адыгрываў аматарскі аркестр пад кіраўніцтвам мясцовага музыканта і кампазітара І.В.Шадурскага, а таксама хор пад кіраўніцтвам М.Д.Дзьяканава. З 2-й палавіны 80-х г. членамі таварыства «ва ўласным памяшканні» праводзіліся аматарскія вечары, на якіх выконваліся арыі і сцэны з опер. Асаблівай ініцыятыўнасцю тут вызначалася аматарка А.П.Корбун, якая выконвала арыі з опер Мейербера («Гугеноты» і «Афрыканка») і Рубінштэйна («Дэлеан»), рамансы Чайкоўскага, Давыдава, Капры, Скюдэры і інш. Пастаянна ўдзельнічаў у гэтых вечарах віцебскі аматар спеваў М.І.Ігнацьеў, які пазней атрымаў запрашэнне ад антрэпрэнёра А.Г.Даніловіч уступіць у прафесійную трупу Таварыства драматычных і аперэтачных артыстаў. Партнёрамі М.І.Ігнацьева ў трупе былі вядомыя аперэтачныя спявачкі У.А.Райцава і Ф.А.Каліноўская, разам з якімі віцебскі

Віцебск. Гарадскі тэатр. Пачатак 20 ст.

«аматар сцэнічнага мастацтва» з поспехам выступаў у гарадскім тэатры, у «Карневільскіх званах» Р.Планкета, «Бедным студэнце», «Гаспароне, марскім разбойніку» К.Мілекера, «Цыганскім бароне» І.Штрауса, «Донне Муаніце» Ф.Зупэ, «Фаусце навыварат» Ф.Эрве, «Гальцы» С.Матошкі і інш. Да канца 19 ст. невялікая колькасць прафесійных аркестравых музыкантаў аб'ядноўваецца ў сімфанічны аркестр пры гарадскім тэатры. Дырэктарам тэатра на працягу многіх гадоў быў С.М.Сухадрэў, прадстаўнік адной з некалькіх віцебскіх дынастый музыкантаў. У гэты ж час працаваў струнны аматарскі аркестр пад кіраўніцтвам Л.Я.Лермана. У выканальніцкую праграму гэтага аркестра ўваходзілі творы П.І.Чайкоўскага, Ж.Бізэ, А.Арэнскага, В.Моцарта, М.Глінкі, Л.Бетховена і іншых вядомых кампазітараў.

У пачатку 20 ст. было створана Таварыства вытанчаных мастацтваў. У горад прыязджалі выпускнік Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі З.Г.Кано, ў 1909 г. — Б.М.Вядра. Яны падалі прашэнні на імя губернатара аб адкрыцці ў Віцебску прыватных музычных школ. Прашэнні былі задаволены і педагогі атрымалі дазвол на адкрыццё такіх школ.

Гораду прысвяцілі свае творы кампазітар-аматар О.Крамер («Трамвайны марш», 1898), музычны дзеяч В.Месман (вальс «Віцеблянка», 1919).

У 1908 г. ў Віцебску адкрываецца музычна-драматычны гурток, кіраўніком якога была Марыя Уладзіславаўна Штэйнберг. У ліку арганізатараў гуртка быў кампазітар і педагог М.Анцаў. Гурток аб'ядноўваў 150 прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі і складаўся з музычнай і драматычнай секцый. Яго заснавальнікі пад кіраўніцтвам М.У.Штэйнберг распрацавалі статут, у якім адзначалася, што адной з мэт гуртка з'яўляюцца «практыкаванні ў харавых і сольных спевах, сумесная і сольная ігра на музычных інструментах». Статутам прадугледжаны таксама «публічныя канцэрты і спектаклі». У кожным сезоне (з кастрычніка да мая) 1906—09 удзельнікі гуртка праводзілі 20—30 музычных і тэатральных вечарын. Яго музычная секцыя складалася з квартэта і сімфанічнага аркестра. На музычных вечарах гучалі сімфанічныя творы В.А.Моцарта, Л.Ван Бетховена, М.І.Глінкі, П.І.Чайкоўскага, С.В.Рахманінава, арыі з опер Ж.Бізэ, творы Ф.Шапэна, Р.Шумана, А.Грачанінава.

Драматычная секцыя ставіла вадэвілі і камедыі, кіраваў ёй А.Сабін-Гус. Дзейнасць гуртка карысталася папулярнасцю ў жыхароў Віцебска.

У гэты перыяд у Віцебску выступала шмат выканаўцаў-гастралёраў. У 1869 г. — вядомы рускі піяніст А.Рубінштэйн, 9 кастрычніка 1899 г. іграў О.Габрыловіч, 16 кастрычніка таго ж года, у той жа зале — Ю.Слівінскі. У сакавіку 1899 г. гастраляваў Шварцбургскі сімфанічны аркестр, 21 верасня 1903 г. — аркестры Львоўскай філармоніі, Рыжскага опернага тэатра, вялікарускі аркестр В.Андрэева, Пецярбургскі «Мекленбургскі квартэт». З канцэртамі таксама выступалі вядомыя піяністы Ядвіга Залеская (4.12.1907), Р.Пюнью (5.10.1900), А.Зілаці, І.Гофман (1901), скрыпачы іспанец П. Сарасатэ (1902), амерыканец Я.Хейфец, Я.Ацэр (1904), віяланчэліст А.Вержбіловіч, рускія спевакі Л.Собінаў (1912, 1915), І.Фігнер, А.Вяльцава, В.Паніна, М.Доліна (1906), М.Міхайлава, В.Куза, А.Збруева, камерная спявачка Зоя Лодзей і інш.

Вельмі папулярным у Віцебску было опернае мастацтва. Як сведчыць І.І.Багалюбаў, асаблівай папулярнасцю карысталіся спявачка С.Б.Осіпава (лірыка-каларатурнае сапрана) і «чароўны барытон» І.М.Міронаў. Віцебскі паліцмайстар Крылоў, які любіў оперу, звычайна збіраў з публікі грошы на падарунак бенефіцыянту. У красавіку 1900 г. ў Віцебск прыязджала італьянская оперная трупа Ф.Кастэлана (былі пастаўлены оперы «Аіда», «Багема», «Кармэн», «Сельскі гонар» і інш.). 10 студзеня 1901 г. капельмайстар гарадскога тэатра С.М.Сухадрэў у свой бенефіс паставіў оперу «Фауст». А крыху пазней віцебскія гледачы пазнаёміліся з маскоўскай трупай (оперы «Пікавая дама», «Паяцы», «Дэман» і інш.).

22 снежня 1912 г. ў гарадскім тэатры на дабрачынным вечары выступаў дзіцячы аркестр пад кіраўніцтвам Лібермана. Аркестр выканаў «Дзіцячую сімфонію» І.Гайдна.

В.В.Крыкун.

Выдавецкая справа ў Віцебску

Першая спроба стварэння друкарні ў Віцебску адносіцца яшчэ да 1768 г. Тады польскі кароль і вялікі князь Літоўскі Станіслаў-Аўгуст даў віленскім базыльянам права перанесці сваю друкарню з Вільні, дзе яны «не мелі матэрыялаў для друку», у Віцебск. Ім «дазвалялася друкаваць кнігі на грэчаскай, лацінскай, польскай і рускай мовах». Ці друкавала гэтая друкарня нешта і ці існавала яна ўвогуле — невядома.

У 1796 г. Віцебск стаў цэнтрам Беларускай губерні. А ўжо праз год у ім адкрылася першая друкарня. Яна належала губернскаму праўленню, была невялікай па памерах, друкавала бланкі і этыкеткі, з 1838 г. — газету «Витебские губернские ведомости». Першае і адзінае ў 18 ст. дастаткова саліднае выданне было здзейснена ў 1799 г. Гэта была брашура «Пахвальная песня пры ўзышэсці на прастол імператара ўсяе Расіі Паўла Пятровіча Першага». У 1806 г. ў той жа друкарні была надрукавана кніга тагачаснага віцебскага цывільнага губернатара, цяпер забытага рускага пісьменніка, пляменніка знакамітага драматурга А.Сумарокава Паўла Сумарокава «Арлы і шпакі».

Да 1858 г. ў Віцебску было выдадзена ўсяго 7 брашур і кніг. Акрамя ўжо названых, гэта працы вядомага віцебскага ўрача Карла Гюбенталя: «Апісанне жыццемагнетычнага лячэння, якое было здзейснена на вопыце» (1817) і «Настаўленні з нагоды падзяжу жывёлы, што пачаўся ў Віцебскай губерні, з паказаннем прыкмет і спосабаў лячэння гэтай хваробы» (1820 і 1827).

У 1848 і 1849 гг. у Віцебску выдадзена даследаванне Г.Арэўса «Вопыты і назіранні аб падзяжу рагатай жывёлы», у 1849 г. — «Слова, якое сказаў высокапраасвяшчэнны Васіль, архіепіскап Полацкі і Віцебскі, у дзень узышэсця на прастол гасудара імператара Мікалая Паўлавіча».

З 1858 г. ў Віцебску рэгулярна выдаваліся кнігі і брашуры, і да 1917 г. было выпушчана больш за тысячу розных выданняў — мастацкая літаратура, падручнікі, разнастайныя справаздачы, статуты, літаратура па гісторыі, археалогіі, статыстыцы, этнаграфіі, фальклоры краю, медыцыне, ветэрынарыі і г.д. Асноўны аб'ём віцебскіх дарэвалюцыйных выданняў прыходзіўся на долю губернскай друкарні. Да сярэдзіны 19 ст. яна размяшчалася ў будынку на беразе Заходняй Дзвіны, які пазней набыў дваранскі сход (цяпер на гэтым месцы тэатр імя Я.Коласа), потым — на першым паверсе прыгожага двухпавярховага будынку на вуліцы Смаленскай (цяпер — Леніна). У губернскай друкарні былі надрукаваны многія вядомыя выданні, у т.л. «Віцебская даўніна» А.Сапунова, «Памятныя кніжкі Віцебскай губерні», працы М.Нікіфароўскага, У.Стукаліча, А.Семянтоўскага, Дз.Даўгялы, П.Красавіцкага, І.Гарбачэўскага і інш.

Другой у горадзе і старэйшай прыватнай друкарняй была друкарня купца М.Нэймана. Заснаваная ў 1818 г., яна існавала амаль 100 гадоў і была адной з буйнейшых на Беларусі. У 1902 г. тут працавала 29 рабочых і было выраблена друкаванай прадукцыі на 12 300 руб. Як і большасць беларускіх прыватных друкарань, яна параўнальна мала друкавала кніг і лічыла за лепшае вырабляць этыкеткі, прэйскуранты, візітныя карткі, бланкі, канверты, рэкламу, афішы і г.д. На яе долю прыходзілася 15—16 % віцебскіх выданняў.

У 1870 г. заснавана друкарня братоў Падземскіх, якая выпускала кнігі ў 1900—06 гг. Потым яна належала асабіста П.Падземскаму.

Каля 30 кніг выпусціла невялікая друкарня Малкіна, што існавала ў 1870—1900 гг. Сярод яе выданняў працы А.Сапунова: «Дзвінскія, або Барысавы камяні» і «Полацкі Спаса-Еўфрасіньеўскі дзявочы манастыр», 3—5-ы выпускі «Беларускага зборніка» Е.Раманава і інш.

У перадрэвалюцыйныя гады ў Віцебску працавалі яшчэ некалькі невялікіх друкарань: М.Галашчокіна, Ф.Лейбмана, «Праца», «Энергія», Э.Шэйніна, «Момант» і інш.

А.М.Падліпскі.

Віцебская вучоная архіўная камісія

У памяці ўдзячных нашчадкаў застанецца вялікая грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (ВВАК) — таварыства, якое займалася збіраннем гісторыка-архіўных, фальклорна-этнаграфічных і археалагічных матэрыялаў у Віцебскай губерні. Заснавана 31.5 (13.6) 1909 г. па ініцыятыве М.Ц.Багародзіцкага. У 1910 г. у яе саставе налічвалася 102 ганаровых і 356 сапраўдных членаў. Камісія існавала да

1918 г. на субсідыі ўрада, ахвяраванні прыватных асоб і ўстаноў з Бешанковіч, Невеля, Полацка, Янавіч і іншых населеных пунктаў, а таксама членскіх узносаў і паступленняў за лекцыі. Старшынёй камісіі спярша быў У.К.Арсеньеў. Пляменнік вядомага захавальніка Аружэйнай палаты, прафесар Маскоўскага археалагічнага інстытута, ён быў пераведзены на службу ў Віцебск. З 1910 г. старшынёй Камісіі быў У.А.Кадыгробаў, потым К.І.Ціхаміраў і інш. Членамі камісіі былі М.Я.Нікіфароўскі, А.П.Сапуноў, В.П.Федаровіч, І.І.Далгоў, Дз.С.Леанардаў, М.В.Анцаў і інш. Ганаровыя члены — Б.І.Эпімах-Шыпіла, В.В.Ключэўскі, Я.Ф.Карскі, П.П.Сямёнаў-Цян-Шанскі, В.І.Сразнеўскі і інш.

Пры камісіі працавалі бібліятэка, музей, архіў. Адбываўся абмен навуковымі выданнямі і матэрыяламі са 105 навуковымі ўстановамі Масквы, Львова, Кіева, Табольска, Тулы, Кракава і інш. Камісія падтрымлівала сувязі з археалагічнымі таварыствамі Вільні, Масквы, Ноўгарада, Пецярбурга. Камісія выдавала зборнікі «Працы Віцебскай вучонай архіўнай камісіі» (1910) і «Полацка-Віцебская даўніна» (1911—1916), вялася работа па складанню гістарычна-геаграфічнага слоўніка Віцебскай губерні. Члены камісіі праглядалі спіскі архіўных дакументаў, якія планавалася знішчыць, дамагаліся зберагання каштоўных гістарычных крыніц.

Адной з найбольш выдатных спраў ВВАК стала адкрыццё ў горадзе аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута (МАІ). Да гэтага падобныя навучальныя ўстановы ўжо былі ў Смаленску і Калузе, дзе карысталіся ў мясцовых аматараў старажытнасці вялікім поспехам. Актыўнасць у рашэнні пытання аб адкрыцці Віцебскага аддзялення МАІ праявіў старшыня ВВАК У.Кадыгробаў, выкарыстоўваючы свае маскоўскія знаёмствы. Пасільную дапамогу яму аказваў і А.П.Сапуноў. 27 кастрычніка 1911 г. ва ўрачыстай абстаноўцы адбылося адкрыццё першай у горадзе вышэйшай навучальнай установы. А.Сапунова ў гэты час у Віцебску не было, але разам з іншымі дэпутатамі 3-й Дзяржаўнай думы з Віцебскай губерні ён адправіў прывітальную тэлеграму. Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута існавала з 1911 па 1922 г.

Вялікую працу камісія прарабіла па ўвекавечванню памяці герояў вайны 1812 г., пошуку брацкіх магіл, устанаўленню помнікаў на Віцебшчыне. У 1920 г. на аснове Віцебскай вучонай архіўнай камісіі была створана спецыяльная камісія на чале з А.Штохерам, у сувязі з 900-годдзем з часу першага ўпамінання Віцебска ў старажытнарускіх летапісах. Да гэтай даты прадугледжвалася стварыць альбом і брашуру «Стары Віцебск». Вялікая заслуга камісіі ў стварэнні губернскага гісторыка-археалагічнага музея, які пачаў работу ў 1919 г. Аснову калекцый музея склала падараваная А.П.Сапуновым калекцыя з 1845 прадметаў. Вялікі ўклад ў музейную справу зрабіў галоўны хавальнік музея А.Р.Брадоўскі. Ён таксама перадаў музею сваю калекцыю манет, медалёў, прадметаў археалогіі і твораў мастацтва і народнай творчасці, якую збіраў на працягу 50 гадоў.

У 1918 г. камісія была скасавана ў сувязі з утварэннем Губернскага архіўнага ўпраўлення. У пачатку 1919 г. Віцебскаму аддзяленню Маскоўскага археалагічнага інстытута была перададзена бібліятэка — 3700 тамоў, музей і гістарычны архіў (314 спраў былой Віцебскай езуіцкай калегіі).

Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў час яго знаходжання ў складзе Расійскай імперыі

У 1772 г. Віцебск увайшоў у склад Расійскай імперыі. З гэтай нагоды ў 1780 г. яго наведала імператрыца Кацярына II. Адзін з яе прыдворных склаў тапаграфічнае апісанне горада таго часу: «Лучший сей в Белоруссии город разделен Двиною на две части, из коих по левую сторону реки лежащая есть большая. Сия также разделяется на другие три части речкою Витьбою и буераком таким образом, что Витьба, впадая в Двину, отсекает большую часть жительства, вверх по Двине, на покате узгорка лежащего. За Витьбою, против оного жительства, на возвышенном месте находится замок, обнесенный от Витьбы высоким земляным валом. За замком в превеликом буераке бежит в Двину небольшой ручеек, за которым на угорке находящаяся часть города называется Заручевье; к сему буераку от Витьбы, позадь замка, подходит также буерак, через который к

План гістарычнай часткі Віцебска 19 ст. з пазначэннем ручаёў, якія ўпадалі ў Дзвіну.



жительству, вверх по горе лежащему, сделан мост, называемый Кривой; через Витьбу к замку другой находится мост, который Красным называется; третий мост от замка к Заручевью никакого наименования не имеет. На Заручевье лучшее строение: одна приходская каменная церковь и девичий базилианский монастырь, который вверх по буераку, позади всего жила, поставлен. В замке знаменитость составляют монастыри: иезуитский, плебанский, тринитарский и доминиканский; в нем же находится девичий монастырь марцианов [марыявітак]. За Красным мостом, кроме двух монастырей — бернардинского, великолепного базилианского, из коих первый возле самого моста, а другой — на высоком холме Двинского берега, Лысою горою называемым, стоит, — находится несколько и каменных домов обывательских. Правый берег Двины, на котором другая часть стоит города, ниже левого и ровнее, жительство на нем порядочнее и строение лучше, между коим есть немало и каменного; также монастырь пиарский и каменная приходская церковь». Па падліках аўтара апісання, у Віцебску ў той час налічвалася 1843 дамы.

У 1-й палавіне 19 ст. Віцебск быў перапланіраваны. Ад старой планіроўкі тут засталася толькі сістэма цэнтральных плошчаў і некалькіх вуліц. Першы праектны план быў зацверджаны Кацярынай II у 1778 г. Але ён быў няўдалым, бо складзены быў на падставе памылкова зробленай тапаграфічнай сітуацыі. Гэта тлумачылася спешкай, бо на подпіс

імператрыцы 21 лютага 1778 г. паступіла больш за 2 дзесяткі праектных планаў беларускіх гарадоў. На гэтым плане відаць, што горад размяшчаўся на абодвух берагах Дзвіны, прычым галоўнай яго часткай з'яўлялася больш высокая левабярэжная.

Цэнтр складала тэрыторыя былых замкаў. Тут знаходзіліся важнейшыя храмы, адміністрацыйныя будынкі, плошчы. Жылыя кварталы цягнуліся ўздоўж рачных берагоў. Вулічная сетка не мела геаметрычнага парадку. Яна падпарадкоўвалася рэльефу і лініям берагоў рэк, перарывалася лагчынамі і рачнымі поймамі. Архітэктурны ансамбль стваралі 3 ланцугі манументальных культавых збудаванняў (іх у цэнтральнай частцы плана паказана 16), што цягнуліся прыкладна з поўначы на поўдзень, адпаведна цячэнню Дзвіны.

Новы праектны план, складзены ў пачатку 19 ст., адрозніваўся ад папярэдняга тым, што вулічная сетка значна перапланіравана. Калі раней вуліцы фарміраваліся ў пэўнай ступені стыхійна, адпаведна цячэнню рэк і ручаёў, то ў гэтым плане яны атрымалі дакладны геаметрычны характар. Планам прадугледжвалася захаванне толькі нязначнай колькасці старых вуліц пасля іх спрамлення і пашырэння. Новая галоўная вуліца (сучасная — Леніна) пракладвалася цераз жылыя кварталы такім чынам, што пачыналася яна ад цэнтральнай плошчы, ішла на поўнач і завяршалася новай гандлёвай плошчай (Смаленскай). Новая вуліца стварала працяглы цэнтр і менавіта ўздоўж гэтай восі размяшчаліся палац губернатара, будынак дваранскага сходу, гімназія і іншыя манументальныя збудаванні. Ствараліся новыя плошчы ў Задзвінні (тры), Заручаўі і на Ўзгор'і. Такая сістэма планіроўкі рэалізавана ў натуры прыкладна за 2—3 дзесяцігоддзі, бо натурны план 1838 г. паказвае, што асноўныя ідэі праекту пачатку 19 ст. ў цэлым ажыццявіліся.

Паводле гэтага плану, гарадская тэрыторыя падзялялася на 3 часткі: Узгорскую, Заручаўскую і Задзвінскую. Найбольш заселенымі з'яўляліся тэрыторыі каля Віцьбы і Русь з Прысмушкамі ў Задзвінні. З наданнем Віцебску статуса губернскага горада ён пачаў хутка забудоўвацца, яго вуліцы выпраміліся, на іх нярэдка можна было ўбачыць дамы ў два, а то і тры паверхі. Гэтыя дамы хутка выцяснілі старадаўнія драўляныя хаткі, што некалі распаўзаліся па ярах і берагах Дзвіны і Віцьбы. Дастаткова сказаць, што, напрыклад, за 10 гадоў (1853 — 63) узведзены 1053 новыя дамы. А ўсю дынаміку развіцця забудовы ў 19 — пачатку 20 ст. можна прадставіць наступным чынам:

Год	Колькасць дамоў		
	драўляных	мураваных	разам
1808	1936	98	2034
1860	2568	178	2746
1891	4551	540	5091
1914	5817	1945	7762

Як бачна з прыведзеных статыстычных даных, хутка расла не толькі агульная колькасць жылых будынкаў, але і значна павялічваўся аб'ём капітальнага мураванага будаўніцтва. Праўда, у справе добраўпарадкавання як саміх дамоў, так і прылеглых да іх тэрыторый, не ўсё было добра. Віцебскі краязнаўца А.М.Семянтоўскі ў 1864 г. адзначаў, што ў большасці дамоў адсутнічалі парадныя лесвіцы, светлыя вялікія пярэднія пакоі, вельмі простая была аздоба інтэр'ераў. «Ямы для нечистот составляют явление редкое, по большей части, кухонные и комнатные остатки и помои выбрасываются и выливаются или среди двора, или даже на улицу, отчего в улицах тесный смрад нестерпимый...»

На плане 1838 г. прыведзена колькасць кварталаў і вуліц горада. Так, у першай (Узгорскай) частцы існавала 29 кварталаў з больш чым 20 вуліцамі, завулкамі, бульварамі і загароднім праспектам. На гэтых вуліцах, акрамя 1206 дамоў, налічвалася 213 розных крам. Найлепшыя будынкі былі размешчаны па вуліцах Смаленскай і Падзвінскай. Узгорскае прадмесце складаў 21 квартал, прычым тэрыторыя была слаба заселена. Другая (Заручаўская) частка горада ўключала гістарычныя раёны — Заручаўе, Замкоўе, Задунаеўе.

Лепшыя мураваныя будынкі знаходзіліся на Магілёўскай вуліцы (сучасная — Леніна), прычым амаль усе яны былі заняты пад памяшканні дзяржаўных устаноў. Забудова ў цэлым размяшчалася на ўзгорыстай мясцовасці, прычым розныя пагоркі і ўзвышшы адзяляліся адзін ад другога ручайкамі, ярамі, балотцамі. Забудова то ярусамі выцягвалася ўгару, то хвалямі спадала да падножжаў, што стварала яркую жывапісную карціну. Толькі з цягам часу тут пабольшала прамых, адносна шырокіх вуліц, забудаваных мураванымі дамамі. Прадмесце трэцяй часткі горада — За-

Віцебск. Від на Успенскую гару і сабор. Пачатак 20 ст.

дзвіння, складалася з 20 кварталаў, раскінутых на значнай прасторы, прычым забудова разрывалася ярамі і ручаямі.

Са старадаўніх часоў вуліцы масціліся дрэвам, што было зручна, але нядоўгатэрмінова, бо драўляныя маставыя прыходзілася часта перасцілаць. Больш трывалымі з'яўляліся вуліцы з каменнай брукоўкай. Але іх у Віцебску было няшмат, нягледзячы на безліч камянёў у ваколіцах горада. Каб паскорыць працэс брукоўкі вуліц, начальнік Беларускай губерні 22.4.1798 г. вынес спецыяльнае прадпісанне, згодна якому кожны жыхар павінен выбрукаваць адрэзак вуліцы на палову шырыні ў межах сваёй сядзіны. У 1815 г. губернатар Тармасаў абавязаў усіх, хто прыязджаў у горад на таргі, везці з сабой тры камяні вагой не меней 5 фунтаў кожны і здаваць іх на паліцэйскіх заставах. Праўда, такі парадак існаваў нядоўга. З 1827 г. вуліцы пачалі ўначы асвятляцца, спачатку тлушчавымі свечкамі, з 1860 г. — спірта-скіпінарнымі ліхтарамі.

Віцебск. Былы палац губернатара. Канец 18 — пачатак 19 ст.

Паводле даных на 1864 г., у Віцебску існавала 8 гарадскіх плошчаў. Яны актыўна ўключыліся ў гарадскую структуру, надаючы цэнтральным магістралям анфіладны характар кампазіцыі. У паўночнай частцы горада асноўнай плошчай лічылася Гандлёвая ці Смаленская, прызначаная для правядзення таргоў і кірмашоў. У 1862 г. на трох яе баках былі пабудаваны муры новага гасцінага двара, паўночна-заходні кут плошчы займаў адкрыты манеж, дзе адбывалася выездка коней для мясцовай жандармерыі. На поўдзень ад Смаленскай размяшчаліся Дварцовая і Рынкавая (або Паліцэйская) плошчы. Першая існавала з напалеонаўскіх часоў перад палацам губернатара, уяўляла сабой невялікую прастору з кветнікам і альтанкамі, некалькімі дрэвамі. Другая плошча знаходзілася на схіле пагорка каля ратушы. Ад яе па Красным мосце цераз Віцьбу траплялі на невялікую Саборную плошчу (цяпер — пл. Свабоды).

На захад ад Саборнай плошчы, з процілеглага боку Замкавай гары, месцілася Дваранская плошча, названая так ад дому дваранскага сходу, які некалі тут знаходзіўся. А.М.Семянтоўскі называў гэтае месца «ваксал-гарою» і адзначаў, што тут існавалі цудоўны кветнік і вялікі «ваксал» (у перакладзе з англійскай мовы — зборная палата, зала для гулянняў, дзе звычайна гучала музыка).

Краязнаўца пісаў, што «там нярэдка замест гарматных грымотаў... даносіліся гукі полькі ці вальса і мільгалі танцуючыя пары». У пачатку 19 ст. будынак знаходзіўся ў надзвычай трухлявым стане. Таму яго ў 1806 г., па ініцыятыве цара Аляксандра I, перадалі мясцовай шляхце для перабудовы ў дом дваранскага сходу, паколькі дзяржаўныя ўлады не мелі сродкаў на рамонт таго гмаху. Дваране сабралі патрэбную суму грошай (19 201 руб. серабром), і да 1863 г. будынак быў капітальна адрамантаваны. Перад яго парадным пад'ездам знаходзіліся ўкапаныя ў зямлю старыя чыгунныя гарматы.

У канцы магілёўскай магістралі, у паўднёвай частцы горада каля заставы, існавала плошча, званая Магілёўскім рынкам. У Задзвінскай частцы горада вылучаліся 2 плошчы: адна — каля Полацкай заставы; другая — Гандлёвая.

Планіроўку Віцебска пачатку 20 ст. наглядна ілюструе складзены тады план. Горад падзяляўся на 3 раёны: Узгорскі, Задунаўскі і Задзвінскі. У цэлым асноўныя гарадскія кампазіцыі развіваліся ўздоўж Дзвіны, якая з'яўлялася галоўнай архітэктурна-планіровачнай воссю паселішча.

Віцебск. Плошча і від на ратушу. Акварэль Ю.Пешкі.

Узгорскі раён развіваўся на поўнач ад месца злучэння Віцьбы і Дзвіны. Яе цэнтрам з'яўлялася былая Ратушная плошча, дзе каля мураванага Краснага мосту размяшчалася ратуша. На захад ад яе ўзносіла свае вежы Васкрасенская (рынкавая) царква, з усходу ад ратушы знаходзіліся будынкі бернардзінскага кляштара (касцёл і манастырскія карпусы). Тут жа злева і справа ад ратушы, размяшчаліся гандлёвыя рады, а некалькі на поўдзень стаяла капліца, узведзеная ў памяць 50-годдзя далучэння ўніяцкай царквы да праваслаўнай. Тэрыторыю каля берага Віцьбы займалі гасцініца Бразі і будынак аддзялення Маскоўскага міжнароднага банка.

Ад Ратушнай плошчы адыходзілі 3 вуліцы. Адна з іх (Талстога, былая Падзвінская) ішла на захад да берага Дзвіны, другая (Суворaўская, былая Суражская, сучасная — Суворава) вяла на поўнач да былога прадмесця Пескаватык, трэцяя (Смаленская, былая Вялікая, сучасная — Леніна) ішла паралельна Суворaўскай да Смаленскага рынку. Паміж гэтымі двума апошнімі вуліцамі ў тыле ратушы сфарміравалася невялікая плошча, якая некалі называлася Цэнтральнай. На яе паўночным баку знаходзіўся будынак грамадскага сходу (цяпер — гарадскі цэнтр культуры), а на ўсходнім — будынак друкарні і рэдакцыі «Витебских губернских ведомостей». Далей на поўнач па вул. Смаленскай стаяў будынак прыватнай аптэкі. Заходні бок гэтай часткі Узгор'я фарміраваў комплекс Успенскага сабора і былога базыльянскага манастыра, у якім у 2-й палавіне 19 ст. размясцілася духоўная семінарыя.

Ніжэй, на самым беразе Дзвіны, знаходзіўся яхт-клуб. Ад Успенскага сабора ўздоўж кромцы Успенскай гары ішла вуліца Верхне-Набярэжная, якая вяла да комплексу губернатарскага палаца. Насупраць палацавага будынка існуе невялікі скверык, дзе калісьці стаяла Спаса-Праабражэнская царква. Яна разбурана паводле загаду імператара Напалеона ў 1812 г. Потым царкву пабудавалі некалькі на поўнач ад плошчы, па сучаснай вул. Путны. А ў цэнтры плошчы ў 1912 г. ўзведзены помнік-абеліск у памяць Айчыннай вайны 1812 г., прысвечаны 100-годдзю гэтай падзеі. Ад помніка га[illegible]нялася вул. Дварцо-

Гасцініца Бразі ў Віцебску. Паштоўка пачатку 20 ст.

Віцебск. Вуліца Суворaўская. Пачатак 20 ст.

вая або Палацавая (сучасная – Савецкая), якая ішла на ўсход, перасякала вуліцы Суворaўскую і Смаленскую і вяла да мосту цераз Віцьбу, які злучаў Узгор'е з Задунаўем.

На поўдзень ад перакрыжавання вуліц Дварцовай і Смаленскай стаялі будынкі кантрольнай палаты, мяшчанскай управы і губернскай канцылярыі, на поўнач – аптэка Вайнкопа, будынкі казённай палаты і казначэйства, дзіцячага прыюту, «губернскай па ваеннай павіннасці прысутнасці», гарадской паліцэйскай управы, дваранскай апекі і інш. У заходняй частцы гэтага квартала, па вул. Суворaўскай існавала сінагога, а на ўсходзе, па вул. Багаслоўскай (сучасная Камуністычная) размяшчаліся цэрквы Іаана Багаслова, Мікалаеўская і Успенская адзінаверская. Далей на поўначы вул. Смаленская завяршалася плошчай Смаленскі рынак. На ёй у 1860-я гады былі пабудаваны гандлёвыя рады, пазней – будынак пажарнай аховы з каланчой. Тут жа існаваў манеж. У сярэдзіне 19 ст. ва

Віцебск. Дварцовая вуліца. Пачатак 20 ст.

ўсходняй частцы плошчы пабудаваны будынак гарадскога тэатра (сучасная філармонія).

Ад Смаленскага рынку разыходзіліся вуліцы Афіцэрская (сучасная Урыцкага), Ветраная (сучасная Чэхава), на захад — Грязная, Бальнічная (на поўнач і паўночны ўсход), якія вялі да Конскай плошчы. Па вул. Бальнічнай размяшчалася гарадская бальніца, а за пл. Конскай — турма. За турмой на паўночным усходзе пачыналася магістральная вул. Суражская (сучасная Людзнікава), а на поўнач ад пл. Конскай размяшчаліся дробныя кварталы драўлянай забудовы, сярод якіх знаходзіліся Трайчэнскія могілкі з Троіцкай царквой, якая ў народзе называлася Трайчэнскай. Непадалёку ад іх размяшчаліся Багаслоўскія могілкі. У былым прадмесці Пескаватык (былая Псіная палянка), якое размяшчалася паміж ручаямі Слізкім і Сутокі, найбольш значнымі збудаваннямі з'яўляліся будынак мужчынскага духоўнага вучылішча (цяпер вучэбны корпус Віцебскага дзяржаўнага універсітэта па вуліцы Чэхава), Троіцкая царква (т. зв. Чорная Троіца на Пескаватыку), якая існавала з 17 ст. на могілках.

Пераходзячы цераз Віцьбу па мосце, ў канцы вуліцы Дварцовай (Савецкай) траплялі на т. зв. Кстоўскую гару, размешчаную паміж р. Віцьба і ручаём Дунай. У паўночнай частцы гэтай тэрыторыі знаходзіліся могілкі з праваслаўнай Мікалаеўскай царквой, якая называлася завіцьбенскай. У паўднёвай частцы гэтага раёна, амаль што на беразе ручая Дуная, знаходзіліся царква Іаана Прадцечы і трамвайнае дэпо. Тут жа існавала Задунаў-

Віцебск. Сінагога і набярэжная Заходняй Дзвіны.

Віцебск. Замкавая вуліца і Мікалаеўскі сабор. Пачатак 20 ст.

Віцебск. Каменны мост цераз р. Віцьба, вуліца Смаленская і касцёл св. Антонія (злева — вежы Васкрасенскай рынкавай царквы і ратушы). Канец 19 ст.

Віцебск. Траецкая царква. Канец 17 ст.

Віцебск. Будынак сялянскага пазямельнага банка на Гогалеўскай вуліцы. Пачатак 20 ст.

Віцебск. Будынак былога акруговага суда. 1883 г.



Благавешчанская царква. Пачатак 20 ст.

ская плошча, на якой стаяў будынак лазарэту. Яшчэ адзін цікавы помнік гэтай часткі горада — будынак пазямельна-сялянскага банку, які знаходзіцца на перакрыжаванні сучасных вуліц Баўмана і Даватара. Асноўнымі восямі тэрыторыі з'яўляліся Задунаўская і Маскоўская вуліцы, якія вялі ад цэнтра на ўсход. Квартальная планіроўка тут сфарміравалася у асноўным у 19 ст.

Далей на Задунаўскай тэрыторыі, у яе цэнтры каля Краснага мосту размяшчалася Саборная плошча, названая ў гонар Мікалаеўскага сабора — былога езуіцкага касцёла, пабудаванага у 18 ст. Тут, каля сабора, размяшчаліся архірэйскія палаты, царкоўна-археалагічны музей, брацкая бібліятэка і інш. Насупраць гэтага комплексу размяшчаўся будынак акруговага суда (1883), а далей на захад — канторскія будынкі, мужчынская гімназія, дом дваранскага сходу, гасцініца Кушнера. На беразе Дзвіны стаялі былы фарны касцёл (дамініканскі), які згарэў у 1868 г., Благавешчанская царква, марыявіцкі кляштар, перабудаваны пад канторы.

Перайшоўшы па драўляным мосце цераз Замкавы ручай, траплялі да сінагогі, якая стаяла на беразе Дзвіны. Каля яе ў кварталах размяшчаліся цэрквы Васкрасенска-Заручаўская, Нараджэння Хрыстова, жаночая гімна-



Віцебск. Гогалеўская вуліца і Мікалаеўскі сабор. Пачатак 20 ст.

зія ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі і іншыя будынкі. На поўдзень ад іх стаяла Пакроўская царква, а ўсходнюю частку узбярэжжа, дзе з Замкавым ручаём злучаліся ручаі Дунай і Гапееў, займаў комплекс Свята-Духаўскага манастыра. Ад яго мясцовасць атрымала назву Духава гара. Тут у 1902 г. ўзведзены будынак жаночага епархіяльнага вучылішча (цяпер аблвыканкам).

Цэнтральнай магістраллю гэтай часткі горада з'яўлялася вуліца Гогалеўская (сучасная Леніна), на якой размяшчаліся 1-е гарадское чатырохкласнае вучылішча, жаночая гімназія ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі, аддзяленне сялянскага пазямельнага банка, Пакроўская царква (былы трынітарскі касцёл).

Гогалеўская вуліца выводзіла да плошчы Магілёўскі рынак. Да гэтай плошчы вяла таксама вуліца Магілёўская, якая ішла ад берага Дзвіны. За Магілёўскай плошчай разыходзіліся 3 магістралі: Смаленская шаша (сучасны Маскоўскі праспект) на ўсход, Аршанская вуліца на паўднёвы ўсход і Лучосаўская — на поўдзень. Тут знаходзіліся 3 могільнікі, адзін з іх, яўрэйскі, на беразе Дзвіны. На цвінтары па Смаленскай шашы стаяла Крыжаўзвіжанская царква. У канцы Лучосаўскай вуліцы размяшчаўся маёнтак Лукішкі.

Задзвінскі раён горада з'яўляўся самым вялікім па тэрыторыі. Ён злучаўся з цэнтрам каменным мостам, пабудаваным у 1863—67 гг. цераз Дзвіну. Гэты мост адносіўся да распаўсюджанай у Еўропе арачнай сістэмы, распрацаванай заходнімі інжынерамі Эмі і Грынам. Гэты праект упершыню выкарыстаны ў 1840 г. на Сен-Жэрменскай чыгунцы ў Францыі.

Віцебск. Від на мост цераз Заходнюю Дзвіну і Успенскі сабор. Пачатак 20 ст.

Віцебск. Від на Богаяўленскую царкву і Задзвінне. Пачатак 20 ст.

Віцебскі мост меў 4 пралёты, асноўваўся на 2 устоях і 3 рачных быках. Даўжыня моста 105 футаў, шырыня 4, вышыня над узроўнем вады 65 футаў.

Планіроўку прыдзвінскай тэрыторыі Задзвіння (да лініі чыгункі) вызначалі вуліцы, што ішлі ўздоўж ракі (Ніжне-Пятроўская, Канатная, Пакроўская і інш.). Іх перпендыкулярна перасякалі папярочныя вуліцы, якія разам з падоўжнымі стваралі рэгулярную сетку кварталаў прамавугольнай, трохвугольнай і трапецыідальнай формы. У паўднёвай частцы гэтай тэрыторыі знаходзіліся 3 цвінтары, на адным з іх стаяла Міхайлаўская царква. Бліжэй да Дзвіны знаходзіліся цэрквы Нараджэння Багародзіцы, Пятра і Паўла. Непадалёку ад іх размяшчаліся вайсковыя казармы і інтэнданцкія склады, тут жа размяшчалася Арлоўская плошча. На поўнач ад вуліцы Вакзальнай, што ішла ад мосту да вакзала, пабудаванага ў 1860-я гады, знаходзіліся 2 плошчы: Полацкая і Ільінская. Тут каля Дзвіны стаяла Сімяонаўская царква, за ёй размяшчаліся Мікалаеўская царква, кірха (былы піярскі касцёл), а далей, на поўнач, паміж вуліцамі Пакроўскай і Ільінскай, — Пакроўская і Ільінская цэрквы.

Асноўнымі планіровачнымі восямі той часткі Задзвіння, якая знаходзілася на захад ад чыгункі, з'яўляліся вуліца Полацкая (сучасная Цітова) — дарога на Полацк, і Гарадоцкая шаша (вуліца Ленінградская). Каля іх злучэння знаходзіліся праваслаўныя Мікалаеўскія могілкі і каталіцкія могілкі з касцёлам Варвары. На поўдзень ад полацкай магістралі размяшчаліся Сямёнаўскія могілкі, таксама могілкі ваенныя і лютэранскія. За імі на поўдзень пачыналася тэрыторыя Юр'евай горкі, дзе стаялі драўляныя Юр'еўская царква і капліца над крыніцай. Яшчэ адна аўтаномная частка Задзвіння склалася на поўдні, паміж разгалінаванняў чыгуначных ветак у Рыгу і

Віцебск. Вакзальная вуліца. Пачатак 20 ст.



Віцебск. Будынак былых правіянцкіх (саляных) складоў.

Віцебск. Гасцініца «Брыстоль». Пачатак 20 ст.

Смаленск. Яна забудавана дробнымі кварталамі ў 3 паралельных гарадской мяжы вуліцах. На поўдзень ад гарадской мяжы дарога вяла да в. Маркава слабада, дзе існаваў славуты Троіцкі манастыр.

Вялікую цікавасць прадстаўляе жыллёвая забудова Віцебска канца 18 — пачатку 20 ст. Вулічная забудова ўяўляла сабой суцэльную стужку фасадаў, якую перарывалі толькі перпендыкулярныя вуліцы і праезды. Розныя па колькасці паверхаў і па свайму стылявому вырашэнню дамы ляпіліся адзін да другога тарцамі, што стварала надзвычай выразную, жывапісную кампазіцыю. Кожны будынак меў нешта сваё, адметнае. Дзякуючы гэтаму, кампазіцыя вулічнай забудовы ніколі не паўтаралася, і кожны яе элемент з'яўляўся самастойным мастацкім цэлым. Таму, калі праходзіш па вуліцах старога горада, уражанне складваецца не па агульнаму архітэктурна-прасторавому вырашэнню, а як быццам па частках, пры гэтым адно ўражанне напластоўваецца на другое. У той жа час сярод забудовы вылучаліся дамы з найбольш багатым пластычным вырашэннем, якія адыгрывалі ролю архітэктурных акцэнтаў.

У наш час найбольш насычаным па захаванасці старой забудовы з'яўляецца раён Узгор'е. Асабліва вылучаецца вуліца Суворава — адрэзак паміж былой Ратушнай плошчай і вуліцай Грыбаедава — з прылягаючымі да яе вуліцамі Талстога, Савецкай, Купалы, Крылова, Чэхава, Маякоўскага, Грыбаедава. Часткова зберагалася старая забудова па вуліцы Леніна. У За-

Віцебск. Від на касцёл св. Варвары (канец 19 ст.) і Гарадоцкую шашу. Пачатак 20 ст.

дзвінні захаваўся ансамбль старой вулічнай забудовы па вуліцах Камсамольскай, Кастрычніцкай, Дзмітрава, Зяньковай і інш.

Усе дамы можна падзяліць на 3 асноўныя групы. У першую ўваходзяць тыя збудаванні, у архітэктуры якіх прыкметны ўплыў класіцызму. У другую аб'ядноўваюцца помнікі мадэрна і розных звязаных з ім стылёвых плыняў. У асобную групу мэтазгодна вылучыць пабудовы ў т.зв. «цагляным» стылі, бо іх архітэктура мае спецыфічныя выразныя сродкі.

Літаратура

Віцебск. Гісторыка-эканамічны нарыс. Мн., 1974.

Долгоруков В.М. Витебская губерния: Историко-географический и статистический обзор. Вып. 1. Витебск, 1890.

Егоров Ю. Градостроительство Белоруссии. М., 1954.

Квитиницкая Е.Д. Проблемы формирования торгово-административного центра Витебска в XVIII в. Архитектурное наследство. М., 1974. Т. 22.

Красіянскі В. «Чарцёж» места Віцебску 1664 году як дакументальны помнік да гісторыі беларускага драўлянага будаўніцтва. Запіскі аддзела гуманітарных навук. Кн. 6. Працы камісіі гісторыі мастацтва. Т. 1, сш. 1. 1928.

Левко О.Н. Витебск XIV – XVIII вв. Мн., 1984.

Левко О.Н. Экскурсия по древнему Витебску. Мн., 1984.

Никифоровский Н.Я. Странички из недавней старины Витебска. Витебск, 1899.

Сапунов А.П. Витебская старина. Витебск, 1883–1888. Т. 1, 4, 5.

Сапунов А.П. «Чертеж» города Витебска 1664 года. Труды Витебской ученой архивной комиссии. Витебск, 1910. Кн. 1.

Сементовский А.М. Витебск: Исторический очерк. Памятная книжка Витебской губернии на 1864 г. СПб., 1865.

Сементовский А.М. Витебск: Статистический очерк. Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. СПб, 1865.

Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1987.

Чарняўская Т.І. Архітэктура Віцебска: З гісторыі планіроўкі і забудовы горада. Мн., 1980.

Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли: (IX – XIII вв.) Мн., 1978.

Якімовіч Ю.А. Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX – пачатку XX ст. Мн., 1990.

Якимович Ю.А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. Справочное пособие. Мн., 1991.

Ю.А.Якімовіч.

Віцебск канца 18 — пачатку 19 ст. вачамі Юзафа Пешкі

Юзаф (Іосіф) Пешка (1767–1831) – прадстаўнік акадэмічнага класіцызму ў мастацтве Польшчы 1-й трэці 19 ст. Працаваў у Кракаве. У 1793–1813 гг. шмат падарожнічаў па Беларусі. Вынікамі вандровак стала калекцыя акварэляў з выявамі беларускіх гарадоў. Зроблены яны былі і ў Віцебску, дзе мастак, верагодна, быў некалькі разоў. Нельга не заўважыць, як цудоўна перадаў Ю.Пешка асаблівасці прасторавай кампаноўкі забудовы і як хораша і дакладна ўмелі выбіраць асноўныя відарысныя дамінанты віцебскія дойліды.

Акварэлі мастака дазваляюць убачыць у гарадскім ландшафце усё каштоўнае: і асобныя будынкі, і ўзаемасувязь пабудоў у гарадской прасторы.

На 2 вялікіх акварэлях – від на цэнтральную частку горада. І гэта яднае, здавалася б, розныя выявы. Шырокі яр Гапеева ручая і звілістае рэчышча Віцьбы дазваляюць бачыць гарадскі цэнтр не толькі на значнай яго адлегласці, але і з розных бакоў. Прыродны ландшафт стаўся вельмі прыдатным момантам у фарміраванні архітэктурнага аблічча горада. Прырода нібы зляпіла грабяні водараздзелаў і рачных далінаў, тэрасы, акаймаваныя прыбярэжнымі схіламі, асобныя ўзвышшы і лагчыны. На левым беразе Заходняй Дзвіны ўтварыўся вялікі натуральны амфітэатр, разгорнуты ў напрамку да ракі. Ягоным дном быў лапік невысокае выспы, якую абмывалі Дзвіна, Віцьба і Ручай. Вось у гэтай прыроднай катлавіне, там, дзе сыходзіліся рачныя даліны і яры, і склалася гістарычнае ядро горада. Тут былі пабудаваны замкі і першыя храмы. У старажытным Віцебску, як і ў іншых беларускіх гарадах, быў скарыстаны важны прыём – асобныя структурныя элементы горада дапасоўваліся да асаблівасцяў мясцовасці. Вось чаму Віцебск, і стары, і сённяшні, быццам сатканы з разнастайных архітэктурных перспектыў.

У час пажараў 1708, 1733 і 1752 гг. у Віцебску згарэлі 3 магутныя лініі абарончых пабудоў – Верхні, Ніжні і Узгорскі замкі. Яны так і не аднавіліся. Суадносіны вышыняў шэраговых і вядучых будынкаў, невялікая шчыльнасць дазвалялі з любой кропкі горада бачыць высокія і прыгожыя збудаванні.

У канцы 18 ст. ў горадзе было 15 цэркваў і 8 касцёлаў. Яны стаялі ў выгадных месцах, і кожны храм рабіўся кампазіцыйным акцэнтам у тым ці іншым гарадскім раёне. На акварэлях Пешкі такую «ролю» выконваюць цэрквы Святога Духа і Іаана Багаслова.

Царкву Святога Духа пабудаваў князь Альгерд у 1340 г., калі ажаніўся з князёўнаю

Марыяй Віцебскай. Царкву Іаана Багаслова заснавала пасля 1345 г. другая жонка Альгерда, дачка князя Цвярскога Ульяна. Вось такія галоўныя пабудовы, а не папярэдне спраектаваны план, давалі штуршок развіццю старажытнага Віцебска.

На акварэлях выразна прамаляваны галоўныя будынкі горада. Велічныя храмы нібы збіраюць у адзіны архітэктурны комплекс раскіданыя жылыя дамы. На перспектыве ўздоўж Гапеева ручая высотныя пабудовы размешчаны ўжо шчыльней. Тут касцёл езуітаў, Успенскі сабор (былая царква базыльянскага манастыра), Васкрасенская (Рынкавая) царква, касцёл бернардзінаў, за ім — ратушная вежа. Па восі даліны ракі Віцьбы бачым тыя ж будынкі, аднак ужо ў іншай паслядоўнасці: касцёлы езуітаў, бернардзінаў, затым вежы Васкрасенскай царквы, ратушы і Успенскага сабора. Згадваецца правіла старых майстроў-дойлідаў: адзін прыгожы будынак увасабляецца ў столькі будынкаў, якія ўпрыгожваюць горад, колькі кропак для яго агляду можа даць вам зрок!

Калі тут маляваў Ю.Пешка, гэтая вуліца называлася Смаленскай, Пецярбургскаю яна стала пазней. Але менавіта ёй суджана было стаць кампазіцыйнай воссю планіровачнай структуры ўсяго левабярэжжа. Яна з'яўлялася і транспартнай артэрыяй, і стрыжнем, на якім фарміраваўся архітэктурны воблік горада. Побач з існуючымі ўнікальнымі пабудовамі вялікую мастацкую ролю выконвала шараговая забудова.

Асаблівасцю фарміравання жылой забудовы (у канцы 18 ст. яна рабілася па праектным плане) было спалучэнне прынцыпаў рэгулярнасці, прыёмаў класіцызму, якія прыйшлі ў правінцыяльны горад з некаторым спазненнем, і моцнага ўплыву традыцый старажытнага дойлідства.

Гарадскія жылыя дамы набывалі абрысы, абумоўленыя памерамі і формаю набытага ўчастка. Паміж сабою яны злучаліся цагляными супрацьпажарнымі сценкамі (брандмаўэрамі), а вонкавы фасад быў адзіным месцам для дэкаратыўнай аздобы. Магчыма, з гэтае прычыны Віцебск 19 ст. здаўся Івану Буніну «... древним и нерусским... На главной улице... высокие, в одно слитые дома с крутыми крышами, с небольшими окнами, с глубокими и грубыми полукруглыми воротами в нижних этажах».

Глыбокія вароты — гэта, верагодна, аркавы праезд у двор. Што да вокнаў, то, як сведчаць акварэлі Ю.Пешкі, выгляд фасадаў адпавядаў традыцыйнай сістэме мастацкіх сродкаў класіцызму, і таму вокны былі розных памераў.

Паўтор гэтых адметнасцей падкрэсліваў архітэктурную своеасаблівасць Віцебска. Характэрны прыклад — 2 сіметрычныя дамы на рагу вуліц Афіцэрскай і Саборнай, пабудаваныя ў 1799 г. (захаваліся да нашых дзён на рагу вуліц Суворава і Крылова).

І сёння ёсць у Віцебску дзівосная мясцінка, своеасаблівая пляцоўка для агляду. Гэта — Успенская горка. Адсюль, як на далоні, распасціраецца панарама Задзвіння і значнай



Віцебск. Успенскі сабор. Акварэль Ю.Пешкі.

часткі левабярэжжа. Фрагменты забудовы гарманічна спалучаюцца з наваколлем — з маўклівай ракой унізе, сцішаным перамоўем магутных старых дрэў, сонечна-блакітным даляглядам. Больш чым 50 гадоў назад тут яшчэ стаяла велічная прыгожая бажніца — Успенскі сабор. Сёння мы бачым яго на акварэлях Юзафа Пешкі.

Малюнкі сцвярджаюць: Успенскі сабор належыць да пабудоў, якія здзіўляюць архітэктурнай дасканаласцю і ўдала выбраным месцам. Пра тое ж кажуць і сведкі. Гісторык Віцебска А.Семянтоўскі, які бачыў храм штодня, запісаў: «Мы заўсёды любаваліся на яго лёгкія спічастыя вежы, і на яго велічны партал, і на яго дзівосны купал, і на ўсё гэта разам. Асабліва прыгожы храм, калі промні на захадзе сонца прарвуцца скрозь вялізныя вокны галоўнага ўвахода і купала і абліюць сваім залатым бляскам іканастас і сцены». А міністр народнай асветы граф Дз.Талстой, калі ўпершыню пабачыў сабор, уражаны сказаў архітэктару, які яго суправаджаў: «Навучыцеся будаваць храмы так надзейна, лёгка, велічна і хораша, як зроблены гэты храм!»

Каб выразна паказаць шырокую панараму, што паўстае з Успенскай горкі, Ю.Пешка малюе на першым плане ствалы дрэў, якія растуць на пагорку. Між імі добра бачыцца група архітэктурных вертыкаляў, акцэнтуючых галоўныя плошчы старога Віцебска. Так, вежы ратушы, Васкрасенскай (Рынкавай) царквы і касцёла бернардзінаў у цэнтры акрэсліваюць ратушную плошчу. Купал і званіцы касцёла езуітаў служаць арыенцірам адміністрацыйнай плошчы.

Дарэчы, панарама, якая адкрываецца з Успенскай горкі, ілюструе разнастайныя віды зрокавых узаемасувязей паміж кульмінацыйнымі вузламі старога Віцебска. Адны архітэктурныя перспектывы паўставалі ўздоўж вуліцы, як, прыкладам, ад Успенскага сабора па Саборнай вуліцы да рынку. Іншыя прасторавыя сувязі ўзнікалі над гарадской забудоваю з улікам магчымасцяў, якія даваў узгорысты рэльеф, напрыклад, ад Успенскага сабора

Віцебск. Від на Васкрасенскую царкву і бернардзінскі касцёл. Акварэль Ю.Пешкі.

над прыроднай катлавінай да царквы Святога Духа.

Заснаваны на левым беразе Заходняе Дзвіны, старажытны Віцебск рос галоўным чынам уздоўж яе; пазней горад перакінуўся на другі бераг, але шырокая рака пакінула дастаткова прасторы дзеля ўспрымання гарадскога сілуэта. Раскрыты на раку цэнтр — адна з істотных мастацкіх асаблівасцяў сярэднявечнага Віцебска. У такога горада ёсць свае адметнасці. Вось і малюнкі Ю.Пешкі зафіксавалі: Заходняя Дзвіна — галоўная кампазіцыйная вось горада, да яе маюць выхад усе старажытныя часткі, ад яе нібы цягнуцца будынкі, каштоўныя з сацыяльнага, функцыянальнага і мастацкага боку.

Агульная панарама левабярэжжа ўзбагачаецца за кошт яруснасці рэльефу. Абрысы забудовы на правым беразе нібы распластаныя, аднак таксама маюць свае акцэнты. Гэта шэраг храмаў у Задзвінні.

На кожным малюнку, які зрабіў мастак на берагах Заходняй Дзвіны, знаходзім дынамічныя глыбінныя перспектывы; яны ўзмацняюць, узбагачаюць уражанні ад прыбярэжнай панарамы. Гэта — выгляд на Замкавую гару паміж Дабравешчанскай царквой і парафіяльным касцёлам; малюнак дарогі, што рассякае шчыльную забудову Заручаўя; зрокавая гармонія, скіраваная ад плошчы каля царквы Сымона Стоўпніка да Петрапаўлаўскай царквы. У выніку неад'емнымі архітэктурнымі асаблівасцямі старога Віцебска сталася спалучэнне адначасова цеснай і шырокай прасторы, выверанай разнастайнасці, шчаслівай выпадковасці. *Ю.Н.Кішык.*

«Культура». 1993. № 1, 2 за 4 і 18 студзеня.

Па старонках віцебскіх газет

ВІТЕБСК. ДЕКАБРЬ. 1898 г.

Получили долгожданные награды участники выставки 1896 г. в Нижнем Новгороде. Были отмечены: из Двинска Ш.Я.Закс, Двинское реальное училище, Двинская женская гимназия, Витебская женская гимназия, Витебская воскресная школа и др. Всего было 18 награжденных.

По инициативе инженера А.А.Павловского началось устройство железнодорожного клуба. Для этой цели в железнодорожном депо были отведены специальные комнаты. При клубе планировалось устроить буфет.

Свой 50-летний юбилей службы в акцизном управлении отмечал бухгалтер М.Н.Банин. По случаю юбилея он пожертвовал 50 рублей на нужды Витебской женской воскресной школы.

В очередной раз 163-й ленкоранско-нашебургский пехотный полк, квартировавший в Витебске, праздновал свой полковой праздник. На Соборной площади был праздничный развод полка.

Свой храмовый праздник отметили прихожане Николаевского собора, который занимал в городе самое лучшее место (теперь пл. Свободы). В давние времена на этом месте находилась деревянная церковь Параскевы Пятницы. Прибывшие в город иезуиты получили разрешение от короля построить здесь свой костел и монастырь (кляштор).

В 1644 г. костел и монастырь были построены. Главным фундатором (дарителем) был смоленский воевода Корвин-Гроссевский. Когда город был захвачен войсками московского царя Александра Михайловича, иезуитский монастырь стал православным Алексеевским монастырем. После возвращения города Польше монастырь опять перешел к иезуитам. В 1716 г. иезуиты начали строительство каменного здания коллегиума и костела. В 1820 году иезуиты были изгнаны из России. В Витебске выселение иезуитов не обошлось без трагикомической истории. Прокурор, чиновники особых поручений военного генерал-губернатора, гражданского губернатора и полицмейстер явились для описания и опечатывания имущества.

Один из приставов был отправлен в подвал, который представлял сокровищницу Али Бабы. Там на цепях, прикрепленных к потолку, хранились бочки с различными винами, наливками и медами столетней выдержки. Над бочками были специальные надписи. Пристав вооружился ковшом для удостоверения надписей, а также фонарем для их прочтения. Вскоре было описано все имущество иезуитов, а экспедиция из подвала не возвращалась. Все власти в окружении вооруженного караула отправились на поиски пропавших. И что же? Пристав и его команда лежали в подвале без сознания. Все старания возвратить к жизни упившегося пристава ока-

зались тщетными. Так и умер несчастный пристав, слишком рьяно исполнявший свой долг. Со временем вдове была назначена пенсия. В 1822 г. костел и кляштор перешли базыльянам. А в 1843 г. кляштор перешел к православным, был превращен в архиерейское подворье, а 17 октября был освящен высокопреосвященным Василием Лужинским, архиепископом Полоцким и Витебским. Собор преобразился. Стены были белые. Внутри также был очень красиво убран. Для сохранения тепла под главным куполом сделано стеклянное покрытие. При архиепископе Савве в 1869 г. собор был капитально отремонтирован. Главный купол потерял свою тяжелую форму и принял более изящный вид. Был поставлен новый иконостас, иконы были выполнены московскими иконописцами. Стены покрыты позолотой и орнаментом. В 1956 г. вся эта красота была уничтожена: собор был взорван.

В ночь с 27 на 28 декабря Двина стала, навигация была закрыта. Горожане готовились к Рождеству Христову, а природа ждала прихода тепла и весны.

И.Абрамова. «Витебский курьер». 1998 г. Декабрь.

Звязаны лёсам

АКРЭЙЦ Станіслаў Станіслававіч [псеўданім Арліцкі; 13(25).8.1836, Арол (?) – пасля 1918]. Беларускі і рускі журналіст, мемуарыст, белетрыст. Скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію (1856). Быў вольным слухачом Горы-Горацкага земляробчага інстытута. Служыў у Магілёве ў палаце дзяржаўных маёмасцей. Дасылаў заметкі ў пецярбургскія часопісы «Искра» і «Экономический указатель», падтрымліваў сувязі з рэдакцыяй «Современника». У Магілёве збіраўся выпускаць часопіс «Белорусский вестник» (не выходзіў). Удзельнік паўстання 1863–64 гг. Працаваў у Віленскай публічнай бібліятэцы. З 1868 г. ў Пецярбургу, сакратар газеты «Новое время». Выдаваў часопісы «Дешевая библиотека», «Всемирный труд», «Луч» і інш. Аўтар некалькіх раманаў, аўтабіяграфічнай хронікі, мемуарных нарысаў. *Г.В.Кісялёў.*

АЛОНАЎ Яўген Піліпавіч (1875, Гарадоцкі р-н – 23.12.1929). Ветэрынарны ўрач, заснавальнік навуковай ветэрынарыі на Беларусі. Герой працы (1924). Скончыў Варшаўскі ветэрынарны інстытут (1903), працаваў павятовым ветэрынарным урачом у Гарадоцкім павеце. У 1911 г. выбраны земскім губернскім урачом, у 1912 г. – загадчыкам Віцебскага губернскага ветэрынарнага аддзялення. Удзельнічаў у арганізацыі першай навуковай канферэнцыі ветэрынарных урачоў Віцебскай губерні. У 1913 г. арганізаваў першую на Беларусі ветэрынарную лабараторыю ў Віцебску, у 1914 г. – экспедыцыйнае абследаванне жывёлагадоўлі Віцебскай губерні. У 1918 г. стварыў у Віцебску найлепшы ў Расіі ветэрынарна-заалагічны музей. Ініцыятар распрацоўкі «Ветэрынарнага статута БССР», склікання 1-га Усебеларускага з'езда ветработнікаў (1924), заснавання Віцебскага батанічнага сада, музея анатоміі, арніталогіі і энтамалогіі (1924), часопіса «Беларуская ветэрынарыя» (1924). Заснавальнік і з 1924 г. рэктар Віцебскага ветэрынарнага інстытута, адначасова кіраўнік Ветэрынарнага ўпраўлення Наркамата земляробства БССР. Навуковыя працы па аналізе ветэрынарна-санітарнага стану і прычынах хвароб сельскагаспадарчай жывёлы на Беларусі.

АНГІЯЛІНІ Каэтан (1748, Італія – 17.11.1816). Архітэктар. Вучыўся ў Балонні і Вероне. У 1784 г. пераехаў у Полацк. З 1786 г. жыў у Віцебску, дзе працаваў рэгентам канвікта і прафесарам французскай мовы, у 1789–96 гг. выкладаў тэорыю архітэктуры ў езуіцкім калегіуме. У 1796–97 гг. жыў у Оршы. Пасля вяртання ў Віцебск да 1801 г. зноў выкладаў архітэктуру. Пад яго кіраўніцтвам у 1794 – 96 і 1800–01 гг. Віцебскі езуіцкі касцёл быў упрыгожаны новымі алтарамі і канфесіяналамі. Наступныя 2 гады быў італьянскім прапаведнікам у Пецярбургу, з 1803 г. – генеральным пракуратарам ордэна езуітаў. Да 1805 г. жыў у Полацку, пазней пераехаў у Рым. У 1806 г. зрабіў праект дэкаратыўнага ўпрыгожання касцёла езуітаў у г. Палерма. Памёр у Рыме.

АНЦАЎ Міхаіл Васілевіч [30.9.(12.10).1865, Смаленск – 21.7.1945]. Беларускі кампазітар, харавы дырыжор і педагог. У 1894 г. скончыў Пецярбургскую кансерваторыю, вучыўся ў кампазітара М.Рымскага-Корсакава. З 1896 г. жыў у Віцебску, выкладаў харавыя спевы ў розных навучальных установах (у т.л. і Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі,

дзе стварыў хор). З 1906 г. займаў пасаду начальніка газетнага стала і загадчыка губернскай друкарні, быў рэдактарам неафіцыйнага аддзела газеты «Витебские губернские ведомости» і дадатку да яе «Народный листок» (1905—12). На працягу многіх гадоў быў музычным аглядальнікам шэрагу віцебскіх газет. У 1918 г. прымаў актыўны ўдзел у стварэнні ў горадзе народнай кансерваторыі (чытаў у ёй лекцыі па гісторыі музыкі). У паслякастрычніцкія гады актыўна займаўся кампазітарскай творчасцю. У Віцебску выдаў кнігі: «Нотная тэрміналогія. Даведачны слоўнік» (1904), «Дваццаць басен» (1910), «Экскурсія Віцебскай архіўнай камісіі 14 мая 1911 г. ў мястэчка Бешанковічы» (1911).

БАГАРОДСКІ Мікалай Мікалаевіч [2(14).6.1877, с. Барыса-Глеб Бежацкага павета Цвярской губерні — 3.1.1938]. Беларускі гісторык і краязнавец. Член-карэспандэнт Інбелкульта (1927). У 1904 г. скончыў гістарычнае аддзяленне Маскоўскай духоўнай акадэміі. У 1904—17 гг. працаваў выкладчыкам лацінскай мовы і царкоўнай даўніны ў Віцебскай духоўнай семінарыі, дзе ў 1910 г. стварыў гурток царкоўнай даўніны. З 1908 г. на грамадскіх пачатках загадваў Віцебскім царкоўна-археалагічным музеем. Быў адным з ініцыятараў, стваральнікаў і членаў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. У 1911 г. ўдзельнічаў у рабоце 15-га археалагічнага з'езда ў Ноўгарадзе. У 1914—16 гг. рэдактар неафіцыйнай часткі «Полоцких епархиальных ведомостей». У 1918—28 гг. працаваў настаўнікам у Віцебску, у 1928—37 гг. у Віцебскім культурна-гістарычным музеі, адначасова ў 1930—37 гг. у Віцебскім гістарычным архіве. Быў членам камісіі па ахове помнікаў гісторыі і мастацтва (1919—24), Віцебскага акруговага таварыства краязнаўства (1924—28), у якім узначальваў гісторыка-культурную секцыю. У 1937 г. быў арыштаваны, асуджаны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 г.

БАДЭНДЗІК Аляксандр Іванавіч. Педагог. Скончыў Галоўны педагагічны інстытут. З 1873 г. выкладаў нямецкую мову ў Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі. Аўтар падручнікаў «Граматыка сучаснай нямецкай мовы» (1885; 1888) і «Першае навучанне нямецкай мове» (1887), якія былі выдадзены ў Віцебску ў друкарні Нэймана.

БЕТЫНІ Восіп Іванавіч (1790—1861). Беларускі архітэктар. Вучыўся ў Польшчы і Італіі. У 1827—42 гг. працаваў віцебскім губернскім архітэктарам. Выканаў праекты перабудовы бальніцы (1838, пабудавана ў 1820) і Віцебскага дваранскага дэпутацкага сходу (1842; не ажыццёўлены).



М.В.Анцаў.

БРАДОЎСКІ Антон Рафаілавіч [8(20).10.1859, Новааляксандраўск Ковенскай губерні, цяпер г. Зарасай, Літва — 17.3.1928]. Беларускі калекцыянер, музейны работнік. Скончыў Новааляксандраўскае павятовае вучылішча (1875). Працаваў пісьмаводам, даваў прыватныя ўрокі па агульнаадукацыйных дысцыплінах. У 1881—82 гг. быў загадчыкам Васільеўскай казённай цагельні ў Вільні, у 1882—92 гг. — дзесятнікам на будаўніцтве крэпасці ў Коўне (цяпер Каўнас) і ваеннага порта ў Лібаве (цяпер Ліепая). У 1893—1918 гг. працаваў у інжынерным упраўленні Віленскай ваеннай акругі. Прымаў удзел у будаўніцтве помнікаў Кацярыне II і М.Мураўёву ў Вільні (1897—98). У 1915 г. ў сувязі з 1-й сусветнай вайной разам са штабам акругі пераехаў у Віцебск. З дзяцінства займаўся нумізматыкай і калекцыяніраваннем прадметаў старажытнасці. Частку калекцыі (каля 4,5 тыс. манет і медалёў, прадметаў з археалагічных раскопак, мастацкіх твораў) перадаў Віцебску. У 1918 г. на базе гэтай калекцыі і музея Віленскага вайсковага сходу, эвакуіраванага ў горад у гады 1-й сусветнай вайны, быў створаны Віцебскі губернскі музей, які ўзначаліў А.Брадоўскі. З 1924 г. працаваў навуковым супрацоўнікам музея. У 1919—24 гг. быў членам камісіі па ахове помнікаў гісторыі і мастацтва, у 1924—28 гг. — акруговага таварыства краязнаўства ў Віцебску.

БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ Андрэй Сімпліцыянавіч (1826—1916). Беларускі метэаролаг. У 1849 г. скончыў Пецярбургскі універсітэт. У 1861—64 гг. быў неадменным членам Віцебскай губернскай па сялянскіх справах

прысутнасці. Выйшаўшы ў адстаўку, пасяліўся ў сваім маёнтку Новае Каралёва ў Віцебскім павеце, за 20 вёрст ад горада. Метэаралагічныя назіранні пачаў весці з 1865 г., іх вынікі напачатку друкаваліся ў «Витебских губернских ведомостях». У 1891 г. атрымаў дыплом карэспандэнта Галоўнай фізічнай абсерваторыі. У 1895 г. пабудаваў новую метэастанцыю ў Новым Каралёве, якую на ўласныя сродкі абсталяваў новымі прыборамі і інструментамі. Праводзіў назіранні над ападкамі, расой, атмасферным ціскам, тэмпературай і вільготнасцю паветра, сілай і напрамку ветру, тэмпературай глебы на розных глыбінях, працягласцю сонечнага ззяння і інш. 12 ліпеня 1911 г. ахвяраваў Галоўнай фізічнай абсерваторыі сваю метэастанцыю з усімі пабудовамі і прыборамі, а таксама 2000 квадратных сажняў зямлі.

ВЕРАНІЦЫН Канстанцін Васілевіч (13.6.1834, в. Астраўляны Гарадоцкага раёна — 1904). Беларускі літаратар. Паводле меркавання даследчыка беларускай літаратуры Г.В.Кісялёва, з'яўляецца найбольш верагодным аўтарам паэмы «Тарас на Парнасе». Паходзіў з прыгонных. У 1844 г. скончыў Гарадоцкае прыходскае вучылішча. У наступным годзе атрымаў вольную і паступіў у Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. У 1851 г. прыпісаўся да гарадскіх мяшчан і выбраў сабе прозвішча Вераніцын (першапачатковае — Васільеў). У 1852 г., не давучыўшыся ў гімназіі, стаў студэнтам Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, адкуль яго праз 2 гады выключылі па невядомых прычынах. У 1857 г. паступіў адразу на 3-і курс Горы-Горацкага земляробчага інстытута, які выдатна закончыў праз 2 гады. У 1863—74 гг. і з 1880 г. жыў і працаваў у Пецярбургу, у 1874—79 гг. працаваў у Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі.

ВРАНГЕЛЬ фон ГЮБЕНТАЛЬ Карл Піліп [1786, Гесенская зямля, Германія — 1(13).9.1858, Віцебск]. Урач, вядомы практык-эпідэміёлаг, вынаходнік гіпсавай імабілізацыі ў медыцыне. Медыцынскую адукацыю атрымаў ва універсітэтах Гетынгена і Марбурга. У 1805 г. атрымаў дыплом доктара і паступіў на службу ў армію Расійскай імперыі. Быў прызначаны палкавым лекарам гвардзейскага егерскага палка, удзельнічаў у бітвах пад Прэйсіш-Эйлаў і Фрыдляндам. У 1811 г. дэмабілізаваўся і ў Віленскім універсітэце здаў экзамен на права вядзення ўрачэбнай практыкі ў Расіі. З чэрвеня 1811 г. да ліпеня 1812 г. працаваў аператарам і інспектарам Мінскай урачэбнай управы. У гэты час вынайшаў спосаб лячэння пераломаў касцей з дапамогай іх гіпсавай імабілізацыі, да чаго яго падштурхнулі заняткі ляпнінай. У 1812—14 гг. працаваў у Цверы, у 1816—38 гг. — інспектарам Віцебскай урачэбнай управы, пасля выйшаў у адстаўку і жыў у Віцебску. У 1831 г. паспяхова змагаўся з эпідэміяй халеры, спрабаваў рабіць аперацыі па трансплантацыі органаў у жывёл, удасканальваў хірургічныя інструменты. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім і культурным жыцці Віцебска: выступіў адным з заснавальнікаў Беларускага вольнага эканамічнага таварыства (1826), у 1845—47 гг. і 1853—56 гг. быў ганаровым папячыцелем Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі.

ВУЛЬ Ялегі Пранціш [сапраўднае Карафа-Корбут Элігій Францішак Маўрыкіевіч; 9(21).4.1835, Віцебск — 1880-я гады]. Беларускі паэт. Шляхціц, нарадзіўся ў сям'і дробнага чыноўніка. З 1846 г. вучыўся ў Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі, якую не скончыў. У 1856—62 гг. працаваў пісарам у Віцебскай палаце дзяржаўных маёмасцей. У час паўстання 1863—64 гг. разам з жонкай, бацькам, маці і малодшым братам пакінуў Віцебск, каб далучыцца да паўстанцкіх атрадаў. За ўдзел у паўстанні быў сасланы ў Сібір. Апошнія гады жыцця правёў у Варшаве, дзе разам з В.Каратынскім і А.Плугам стварыў беларускі гурток. Як паэт фарміраваўся пад уплывам А.Вярыгу-Дарэўскага. Вядомы адзіным беларускім вершам «К дудару Арцёму ад наддзвінскага мужыка», які ў 1859 г. ўпісаў у «Альбом» Вярыгу-Дарэўскаму. Верш адметны дасканаласцю формы, паэтычнай сімволікай, натуральнасцю і чысцінёю мовы. У «Альбоме» быў змешчаны яшчэ адзін, значна менш арыгінальны польскі верш «Няновая думка» (1859). Творы Я.П.Вуля пры жыцці не друкаваліся.

Г.В.Кісялёў.

ВЯРЫГА Браніслаў Фартунавіч [14(26).2.1860—1927]. Расійскі фізіёлаг. Нарадзіўся ў Дынабургскім павеце Віцебскай губерні ў сям'і дробнага чыноўніка. У 1877 г. скончыў з залатым медалём Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. Вучыўся на прыродазнаўчым факультэце Пецярбургскага універсітэта, за поспехі ў вучобе атрымліваў імператарскую стыпендыю. У 1882 г. скончыў універсітэт і паступіў у Ваенна-медыцынскую акадэмію, дзе ў ліку лепшых выпускнікоў

быў пакінуты для працы. У 1897 г. стаў прафесарам медыцынскага факультэта Новарасійскага, у 1917 г. — Пермскага універсітэтаў. Адзін з заснавальнікаў электрафізіялагічнага накірунку ў фізіялогіі.

ВЯРЫГА-ДАРЭЎСКІ Арцём Ігнатавіч [псеўданім Беларуская Дуда; 23.10.(4.11).1816, в. Кублічы Ушацкага раёна — 1884]. Беларускі пісьменнік-дэмакрат. Скончыў Забельскую гімназію (мяст. Валынцы Дрысенскага павета, цяпер Верхнядзвінскі раён), служыў у розных установах Віцебска. Жыў у в. Стайкі непадалёку ад горада, арганізоўваў народныя школы, бібліятэкі, чытальні. У час паўстання 1863—64 гг. быў адным з арганізатараў узброенага выступлення на Віцебшчыне. 6 мая 1863 г. быў арыштаваны і зняволены ў віцебскую турму, у 1865 г. сасланы ва Усолле (Усходняя Сібір). З 1868 г. жыў на пасяленні ў Іркуцку. Пісаў на беларускай і польскай мовах. З 1858 г. вёў «Альбом», у якім пакінулі свае аўтографы, вершы, празаічныя і нотныя тэксты многія вядомыя вучоныя, пісьменнікі, дзеячы культуры, удзельнікі вызваленчага руху на Беларусі і ў Літве: У.Сыракомля, А.Адынец, А.Рэніер, А.Кіркор, І.Ходзька, гісторыкі М.Балінскі і М.Маліноўскі, гітарыст М.Сакалоўскі, паэты В.Каратынскі, В.Дунін-Марцінкевіч, Я.Вуль, А.Рыпінскі і інш. Памёр Вярыга-Дарэўскі ў Сібіры.

А.І.Вярыга-Дарэўскі.

К.А.Гаворскі.

І.І.Гарбачэўскі.

ГАВОРСКІ Ксенафонт Антонавіч [1821, Кіеў (?) — 17(29).6.1871]. Беларускі гісторык, археолаг, выдавец. Нарадзіўся ў сям'і уніяцкага святара. У 1845 г. скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Працаваў у Полацкай духоўнай семінарыі. У 1857—58 гг. рэдагаваў неафіцыйную частку «Витебских губернских ведомостей». З 1862 г. жыў у Кіеве, у 1864 г. па запрашэнні генерал-губернатара М.М.Мураўёва пераехаў у Вільню. У грамадскай і навуковай дзейнасці стаяў на рэакцыйных пазіцыях, ухваляў усе мерапрыемствы царызму ў Паўночна-Заходнім краі. Выдаваў пад сваёй рэдакцыяй «Вестник Западной России», у якім асуджаў паўстанне 1863—64 гг. у Польшчы, на Беларусі і ў Літве. Выступаў супраць паланізацыі Беларусі, але сам актыўна праводзіў русіфікацыю, быў адным з пачынальнікаў заходнерусізму. Апублікаваў важныя для гісторыі Беларусі дакументы, арыгіналы якіх потым загінулі.

ГАРБАЧЭЎСКІ Іван Іванавіч [22.9.(4.10).1800, г. Нежын, Украіна — 9(21).1.1869]. Рэвалюцыянер-дзекабрыст. Дзяцінства і юнацтва прайшлі ў Віцебску. У 1817 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. У 1817—19 гг. вучыўся ў афіцэрскай школе ў Пецярбургу. З 1820 г. служыў у 8-й артылерыйскай брыгадзе ў г. Наваград-Валынскі (цяпер Жытомірская вобласць, Украіна). У 1823 г. ўступіў у Таварыства з'яднаных славян. Сааўтар новага статута і праекта рэарганізацыі таварыства (1824—25). У час паўстання Чарнігаўскага пяхотнага палка (29.12.1825—3.1.1826) спрабаваў узняць суседнія вайсковыя часці. 20.1.1826 г. арыштаваны, накіраваны ў Пецярбург. Прыгавораны да смяротнага пакарання, па царскай канфірмацыі пазбаўлены дваранства і высланы ў Сібір на катаржныя работы. Пасля сканчэння тэрміну катаргі (1839) жыў на пасяленні ў г. Пятроўскі Завод (цяпер Пятроўск Забайкальскі Чыцінскай вобласці). Аўтар «Запісак», якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай па гісторыі дзекабрысцкага руху. Імем І.І.Гарбачэўскага названа вуліца ў Віцебску.

ГАРПЕ Васіль Іванавіч (1765, Эстонія — 3.3.1814). Расійскі ваенны дзеяч. Генерал-ма-

Дз.І.Даўтяла.

П.П.Канаўніцын.

ёр (1812). На ваеннай службе з шаснаццаці гадоў. Удзельнік руска-шведскай вайны 1788—90 гг., польскіх кампаній 1792 г. і 1794 г., руска-аўстра-французскай 1805 г., руска-турэцкай 1806—12 гг. і руска-шведскай 1808—09 гг. войнаў. У вайну 1812 г. камандзір 1-й брыгады 14-й пяхотнай дывізіі 1-га корпуса П.Х.Вітгенштэйна. Удзельнік Клясціцкага бою 1812 г., баёў каля Полацка (жнівень і кастрычнік) і інш. Найбольш вызначыўся ў баях 7.11.1812 г. пры вызваленні Віцебска ад французаў і ў лістападзе пад Барысавам, дзе была захоплена ў палон французская дывізія разам з камандзірам. У 1813 г. ўдзельнічаў у замежных паходах рускай арміі ў Германіі. У Лейпцыгскай бітве 16—19.10.1813 г. цяжка паранены, у выніку чаго пазней памёр.

ДАЎГЯЛА Дзмітрый Іванавіч (1.11.1868, в. Казьяны Шумілінскага раёна — красавік 1942 ?). Беларускі гісторык, архівіст, археограф, крыніцазнавец. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю і Пецярбургскую духоўную акадэмію (1894). Выкладаў у духоўнай семінарыі і мужчынскай гімназіі ў Віцебску. З 1897 г. працаваў у Віцебскім, Віленскім архівах старажытных актаў. З 1906 г. член, з 1912 г. старшыня Віленскай археаграфічнай камісіі, рэдактар «Записок Северо-Западного отдела Русского географического общества», ганаровы член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Удзельнік Усебеларускага з'езда 1917 г. З 1921 г. загадчык Магілёўскага губернскага архіва. З 1925 г. супрацоўнік Інбелкульта, дацэнт БДУ, з 1929 г. дырэктар бібліятэкі АН БССР, з 1937 г. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР. Аўтар прац па гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі. Першы даследаваў гісторыю і гістарычную тапаграфію полацкіх, Барысаўскага, Свіслацкага, Аршанскага замкаў, вывучаў гісторыю нацыянальных меншасцей у Беларусі. Складальнік, рэдактар, удзельнік выдання «Гісторыка-юрыдычных матэрыялаў» (т. 27—32, 1899—1906), Актаў Віленскай камісіі (т. 32-37, 1907—12), «Беларускага архіва» (т. 1—3, 1927—30), «Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах» (т. 1, 1936) і інш. 10.12.1937 г. арыштаваны, 11.9.1939 г. высланы ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1964 г.

ДУДЫШКІН Сцяпан Сямёнавіч [25.12.1820 (6.1.1821) — 16(28).9.1866]. Рускі літаратурны крытык і журналіст.

Быў час, калі чалавека, імя якога зусім сёння забытае, Вісарыён Бялінскі, Мікалай Някрасаў лічылі аднадумцам, пераемнікам. І вось што, у прыватнасці, пісаў Бялінскі: «...Цяпер ён наш... Мы нават маем прычыну спадзявацца, што ніводнага радка Дудышкіна не будзе ў «Отечественных записках». Дык хто ж ён — невядомы, забыты Сцяпан Сямёнавіч Дудышкін, які нарадзіўся ў Віцебску? І які след пакінуў у гісторыі рускага прыгожага пісьменства наш зямляк, які і пражыў усяго толькі чатыры з паловай дзесяткі гадоў?..

Нарадзіўся ў сям'і прыказчыка, які ў мінулым быў купцом. У 1837 г. скончыў курс Віцебскай гімназіі. Адразу ж паступіў на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Увайшоў у мастацкі гурток сям'і Майкавых. Тут ён сустракаецца з І.Ганчаровым, А.Заблоцкім-Дзесятоўскім і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі літаратурнага працэсу.

Скончыўшы ў 1841 г. універсітэт, Дудышкін некаторы час даваў урокі. У 1842 г. атрымаў месца ў дэпартаменце знешняга гандлю. Праз год яго перавялі ў камісарыяцкі дэпартамент.

Друкавацца пачаў з 1845 г. Адна з першых публікацый — артыкул пра філалагічныя назіранні Якава Грыма над галоўнымі славянскімі гаворкамі. З 1847 г. быў супрацоўнікам часопіса «Отечественные записки». Пасля смерці Майкава ўзначальваў аддзел крытыкі і бібліяграфіі гэтага часопіса. Аўтар гадавых аглядаў рускай літаратуры, артыкулаў пра А.Дз.Кантэміра, Дз.І.Фанвізіна, М.Ю.Лермантава, М.В.Гогаля, Л.М.Талстога, І.А.Ганчарова, І.С.Тургенева, А.С.Грыбаедава, А.Ф.Пісемскага і інш. У 1858—60 гг. Дудышкін сумесна з Краеўскім выдаў серыю кніг «Гісторыкі і публіцысты навейшага часу ў перакладзе на рускую мову». Падрыхтаваў

2 выданні збора твораў М.Ю.Лермантава (1860, 1883). Пачатак дзейнасці Дудышкіна як крытыка быў ухвалены В.Р.Бялінскім. Супрацоўнічаў з рэдакцыяй «Современника». Паводле дагавору з А.А.Краеўскім з 1860 г. стаў другім, фактычным рэдактарам «Отечественных записок» і быў ім да смерці. Пахаваны ў Санкт-Пецярбургу.

КАНАЎНІЦЫН Пётр Пятровіч [28.9(9.10).1764—28.8(9.9).1822]. Рускі ваенны дзеяч. Генерал ад інфантэрыі (1817), граф (1819). На ваеннай службе з 1785 г. Удзельнік руска-шведскіх войнаў 1788—90 гг. і 1808—09 гг. У час ваенных дзеянняў супраць Рэчы Паспалітай 1792—94 гг. камандаваў мушкецёрскім палком. У пачатку вайны 1812 г. камандаваў 3-й пяхотнай дывізіяй у 3-м корпусе генерала М.А.Тучкова, у баях пад в. Астроўна 14(26) ліпеня стрымліваў націск французскіх карпусоў маршала Мюрата і генерала Багарнэ. Вызначыўся ў бітвах пад Смаленскам і Барадзіно. З верасня 1812 г. ў генеральным штабе аб'яднаных заходніх армій. Удзельнік ваенных дзеянняў 1813—14 гг. У 1815—19 гг. ваенны міністр. З 1819 г. член Дзяржаўнага савета, начальнік ваенных навучальных устаноў, дырэктар Царскасельскага ліцэя.

КАРЧЭЎСКІ Мікалай Фёдаравіч (1824 — пасля 1900). Беларускі архітэктар. У 1844 г. скончыў Пецярбургскае будаўнічае вучылішча па спецыяльнасці грамадзянскі інжынер. Працаваў губернскім архітэктарам гарадоў Камянец-Падольскі (1848), Віцебск (1870—85), Разань (1885—90). У 1870—85 гг. займаў пасаду віцебскага губернскага інжынера. Паводле яго праектаў у Віцебску быў перабудаваны пад гарадскі тэатр 2-павярховы будынак былога паліцэйскага аддзялення (1870-я гады), узведзены 3-павярховы будынак мужчынскай гімназіі (1880, разам з інжынерам А.А.Палонскім), рэканструяваны 2-павярховы жылы дом, прыстасаваны пад публічную бібліятэку (1883). Удзельнічаў у праектаванні і ўзвядзенні будынка Віцебскага акруговага суда (1882, архітэктар І.П.Камінскі) і 1-павярховага мураванага будынка бальніцы (1884).

КАСОВІЧ Каятан Андрэевіч [2(14).5.1814, Полацк — 26.1(7.2).1883]. Беларускі і рускі вучоны-ўсходазнавец; адзін з першых санскрытолагаў Расіі. Паходзіў з вельмі беднай сям'і святара. У 1832 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. Па рэкамендацыі папячыцеля Беларускай навучальнай акругі Р.І.Карташэўскага быў накіраваны на вучобу ў Маскоўскі універсітэт за казённы кошт. Падчас вучобы разам з землякамі Т.Лада-Заблоцкім і І.Савінічам уваходзіў у тайнае студэнцкае таварыства аматараў польскай літаратуры, пазней — у гурток М.У.Станкевіча. Быў знаёмы з В.Бялінскім. У 1836 г. скончыў універсітэт. З 1839 г. працаваў выкладчыкам грэчаскай мовы ў Цвярской, з 1843 г. — у 2-й Маскоўскай гімназіях. У 1845—47 гг. выкладаў у Маскве ў Лазараўскім вучылішчы ўсходніх моў. Потым пераехаў у Пецярбург. З 1850 г. быў рэдактарам навуковых прац Публічнай бібліятэкі, адначасова з 1858 г. выкладаў мову санскрыт у Пецярбургскім універсітэце. З 1864 г. прафесар Харкаўскага, з 1865 г. — Пецярбургскага універсітэтаў. Зрабіў значны ўклад у даследаванне старажытных моў, стаў складальнікам першага ў Расіі «Санскрыта-рускага слоўніка» (1854, выданне не закончана), пераклаў на рускую мову «Яўрэйскую граматыку» Гезеніуса і «Яўрэйскую хрэстаматыю» (1874—75), выдаў зборнік старажытнаперсідскіх клінападобных надпісаў, разам са сваім братам І.А.Касовічам склаў «Грэчаска-рускі слоўнік» (1847—48), які быў адзначаны Дзямідаўскай прэміяй Акадэміі навук. Памёр у Пецярбургу.

КАТЫРЛА Васіль Ігнатавіч (1838, Полацк — пасля 1874). Удзельнік рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў. З сям'і дробнага чыноўніка-разначынца. У 1856 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. З 1859 г. вольны слухач Пецярбургскага універсітэта. Член пецярбургскай арганізацыі «Зямля і воля». З лютага 1863 г. на радзіме, у сакавіку распаўсюджваў сярод салдат і жыхароў Оршы пракламацыю ЦК «Зямлі і волі» «Льецца польская кроў, льецца руская кроў...», вёў агітацыю за паўстанне, вербаваў людзей у атрады, 12.3.1863 г. арыштаваны. Ваенным судом у Магілёве асуджаны на 10 гадоў катаргі. У 1874 г. знаходзіўся ў Краснаярску.

Г.В.Кісялёў.

КІБАРДЗІН Ціхан Васілевіч (1863, г. Слабадской Кіраўскай вобласці, Расія — 1.11.1933). Беларускі архітэктар. Скончыў архітэктурнае аддзяленне Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1890). У красавіку 1890 г. быў прызначаны на пасаду віцебскага гарадскога архітэктара, якую займаў да 1917 г. Пад яго кіраўніцтвам у 1890 і 1902 гг. былі распрацаваны генеральныя планы Віцебска. Паводле яго праектаў у горадзе былі пабуда-

ваны новы гарадскі тэатр (на месцы згарэўшага ў 1887), будынак Віцебскага аддзялення Дзяржаўнага банка на Замкавай вуліцы (закладка адбылася 21.7.1902), бальніца духоўнай семінарыі (1908—1910; дом № 5 па вуліцы Крылова), амбулаторыя яўрэйскай бальніцы і інш. Аўтар рэканструкцыі будынкаў Віцебскага аддзялення Маскоўскага міжнароднага гандлёвага банка (дом № 2 па вуліцы Талстога), гарадскіх казармаў (дом № 12 па вуліцы Леніна), рэальнага вучылішча, семінарыі і інш. 16.8.1914 г. прызначаны на пасаду архітэктара пры Віцебскай жаночай Марыінскай гімназіі. Пасля рэвалюцыі выконваў абавязкі павятовага і гарадскога інжынера, а з красавіка 1922 г. — губернскага архітэктара. У канцы 1920-х гадоў пераехаў у Ленінград. У Віцебску жыў у пабудаваным каля 1900 г. на ўласныя сродкі доме на Саборнай вуліцы (дом № 6 па вуліцы Крылова).

КЛЯМЕНЦЬЕЎ Аляксандр Мікалаевіч (1852 — пасля 1917). Беларускі архітэктар. У 1879 г. скончыў Пецярбургскае будаўнічае вучылішча па спецыяльнасці грамадзянскі інжынер. Працаваў малодшым архітэктарам будаўнічага аддзялення Віцебскага губернскага праўлення, у 1887—90 гг. — віцебскім губернскім інжынерам, адначасова ў 1878—90 гг. выконваў абавязкі полацкага епархіяльнага архітэктара. З 1878 г. ажыццяўляў тэхнічны нагляд за будаўніцтвам у Віцебску і павятовым горадзе Веліжы. Паводле праекта А.М.Кляменцьева ўзведзены будынак мужчынскага духоўнага вучылішча (1892), флігель наглядчыка пры губернатарскім доме (1872), рэканструяваны будынак лазарэта для жаночага духоўнага вучылішча, будынак гарадскога тэатра пасля пажару (1888—90), распрацаваны праекты гарадскога клуба, будынкаў губернскага праўлення ў Віцебску, астрога ў в. Струнне Полацкага раёна.

КНЯЗЬНІН Францішак Дыянізы (4.10.1750, Віцебск — 25.8.1807). Польскі паэт, драматург, перакладчык. Адзін з пачынальнікаў польскага сентыменталізму. У 1764 г. скончыў клас рыторыкі ў Віцебскім езуіцкім калегіуме, дзе напісаў першыя вершы на лацінскай мове. У 1764—70 гг. вучыўся ў Полацку, Нясвіжы і Слуцку. З 1770 г. жыў у Варшаве. З 1775 г. сакратар князя А.К.Чартарыйскага, з 1783 г. прыдворны паэт Чартарыйскіх у Пулавах (Люблінскае ваяводства). Пісаў паэмы, ідыліі, элегіі, оды, байкі, гераічна-патрыятычныя п'есы, лібрэта опер. У элегіях і ідыліях славіў край свайго дзяцінства — Віцебск і Віцебшчыну. Цікавіўся беларускім фальклорам і выкарыстоўваў яго ў сваіх творах. Перакладаў заходне-еўрапейскую паэзію. На беларускую мову асобныя творы Ф.Д.Князьніна пераклалі А.Жлутка, Н.Мерашчак, Л.Семянюк.

КОРШЫКАЎ Уладзімір Фёдаравіч (1858—1920). Беларускі архітэктар. У 1886 г. скончыў Пецярбургскі інстытут грамадзянскіх інжынераў. Працаваў малодшым інжынерам будаўнічага аддзялення Віцебскага губернскага праўлення, ажыццяўляў тэхнічны нагляд за будаўніцтвам у павятовых гарадах Лепелі, Себежы, Люцыне, Рэчыцы. У 1895—1902 гг. быў губернскім архітэктарам, у 1902—17 гг. — губернскім інжынерам, адначасова ў 1895—1917 гг. выконваў абавязкі полацкага епархіяльнага архітэктара. Аўтар праектаў Крыжаўзвіжанскай царквы ў Полацку (1897), Віцебскай жаночай Марыінскай гімназіі (1902, праект не быў ажыццёўлены), рэканструкцыі будынкаў духоўнай кансісторыі (1900) і губернатарскага дома (1916). Выканаў праекты цэркваў і ажыццяўляў іх будаўніцтва ў вёсках Нача і Марцінава Лепельскага павета, Старая Слабада Люцынскага павета, Чурылава (1900) і Нова-Замшаны (1905) Дрысенскага павета, Астроўскае і Таралева (1903) Віцебскага павета (перабудова апошніх), праектаваў і будаваў царкоўна-прыходскія школы, жылыя дамы.

КРАСНЯНСКІ Уладзімір Гаўрылавіч [9(21).7.1863, с. Руціна Валдайскага павета Наўгародскай губерніі — 4.5.1930]. Беларускі гісторык. У 1886 г. скончыў Пецярбургскі гісторыка-філалагічны інстытут. Выкладаў у Беластоцкім рэальным вучылішчы (1886—96), Мінскай гімназіі (1896—1903), установах Віленскай навучальнай акругі (1903—06), быў дырэктарам Мсціслаўскай гімназіі (1906—11). З 1911 г. працаваў у Віцебску на выкладчыцкай, лектарскай і музейнай рабоце. Член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1911—18), камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва (1919—24), акруговага таварыства краязнаўства (1924—27). Зрабіў значны ўклад у захаванне і сістэматызацыю музейных каштоўнасцей Віцебшчыны. Аўтар прац пра падзеі вайны 1812 г. ў Беларусі, па музейнай справе і старажытнай архітэктуры Віцебска. Значны яго ўклад у стварэнне музеяў Віцебска ў 1920-я гады.

ЛАДА-ЗАБЛОЦКІ Тадэвуш Гіляравіч (27.8.1811, в. Лугінавічы Сенненскага раёна — жнівень 1847). Паэт. Пісаў на польс-

кай, рускай, французскай, і, магчыма, на беларускай мовах. Вучыўся спачатку ў Віцебскай семінарыі пры кляштары базыльян, потым у Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі. У 1831 г. па рэкамендацыі папячыцеля Беларускай навучальнай акругі Р.І.Карташэўскага быў накіраваны на вучобу ў Маскоўскі універсітэт, дзе паступіў на літаратурнае аддзяленне. У Маскве ўвайшоў у тайнае студэнцкае таварыства, зблізіўся з В.Бялінскім. У 1831 г. быў узяты пад следства спецыяльнай камісіяй, створанай у Віцебску ў сувязі з распаўсюджваннем у горадзе патрыятычных польскіх песень. У 1833 г. арыштаваны і выключаны з універсітэта. У 1837 г. прыгавораны да 22 гадоў ссылкі, якая была заменена Мікалаем I «добраахвотным» запісам — «адправіць радавым у Каўказскі корпус», адбываў ссылку ў Таганрогу, потым на Каўказе. Тут ён пазнаёміўся з грузінскімі пісьменнікамі Н.Бараташвілі і М.Туманашвілі, азербайджанскім асветнікам і паэтам А.Бакіханавым. Пісаў па-польску, перакладаў на польскую мову сусветную паэзію, на рускую мову — «Гісторыю Азербайджана» Бакіханава. У сваіх творах апяваў прыгажосць Каўказа, роднай Беларусі (паэма «Ваколіцы Віцебска», вершы «Да Дзвіны», «Да Лучосы», «Даўжынскае возера»).

ЛАЖЭ́ЧНІКАЎ Іван Іванавіч (25.9.1792, г. Каломна Маскоўскай вобласці, Расія — 8.7.1869), рускі пісьменнік. Удзельнік Айчыннай вайны 1812 г. і замежных паходаў рускай арміі 1813—15 гг. У 1820—37 гг. (з перапынкамі) дырэктар навучальных устаноў Пензенскай, Казанскай, Цвярской губерняў.З 1843 г. віцэ-губернатар у Цверы, у 1853—54 гг. — у Віцебску. У 1856—58 гг. цэнзар у Пецярбургу. З 1858 г. ў Маскве. Друкаваўся з 1807 г. Адзін з пачынальнікаў рускага гістарычнага рамана («Апошні Навік», ч. 1—4, 1831—33; рамантызаваная версія першых перамог Расіі ў Паўночнай вайне 1700—21). Лепшы гістарычны раман — «Ледзяны дом» (1835), у якім праўдзіва ўзнавіў эпоху царавання Ганны Іванаўны і «біронаўшчыны». Суровы каларыт часоў стварэння цэнтралізаванай Маскоўскай дзяржавы ў 15 ст. апісаў у рамане «Басурман» (1838). Пісаў вершаваныя трагедыі («Апрычнік», напісана ў 1842, забаронена цэнзурай, выдадзена ў 1859; паводле яе аднайменная опера П.І.Чайкоўскага), вадэвілі. Аўтар раманаў «Вядзьмар на Сухаравай вежы» (1840, незавершаны), «Няшмат гадоў таму» (ч. 1—4, 1862), «Унучка панцырнага баярына» (1868; напісаны на матэрыялах, сабраных ім у Віцебску, з кансерватыўных пазіцый паказвае паўстанне 1863—64), мемуарнай аповесці «Беленькія, чорненькія і шэранькія» (1856), нарысаў-успамінаў пра А.С.Пушкіна, В.Р.Бялінскага, вайну 1812 г. У «Паходных запісках рускага афіцэра» (1820) акрамя сваіх ваенных уражанняў змясціў запісы пра беларускія гарады. Эпісталярная спадчына часоў службы ў Віцебску адлюстроўвае спачувальнае стаўленне Лажэчнікава да беларускіх сялян.

Т.Г.Лада-Заблоцкі.

Л.В.Календа.

ЛАЗАРЭВІЧ-ШАПЯЛЕВІЧ Леў Юльянавіч [1(13).10.1863, Віцебск — 28.1(10.2).1909]. Гісторык літаратуры, археолаг. У 1882 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце Харкаўскага, потым Новарасійскага універсітэтаў (1882—87). Магістр усеагульнай літаратуры (1892), доктар філалогіі (1896), дацэнт, прафесар Харкаўскага універсітэта. Аўтар даследаванняў «Эцюды пра Дантэ» (1891), «Першы публіцыст у Еўропе Эразм Ратэрдамскі» (1895), «Нашы сучаснікі» (1899), «Нарысы з гісторыі сярэдневяковай літаратуры і культуры» (1900), «Жыццё Сервантэса» (1901), «Дон Кіхот» (1903) і інш. Пад уплывам М.Ф.Кусцінскага, А.П.Сапунова і Е.Р.Раманава пачаў вывучаць матэрыяльную і духоўную культуру Беларусі. З 1900 г. пастаянна выязджаў з археалагічнай экспедыцыяй у Гарадоцкі, Невельскі і Себежскі паветы Віцебскай губерні. Пры даследаванні крывіцкіх курганоў зрабіў каштоўныя знаходкі, якія паступілі ў Эрмітаж, гістарычныя музеі ў Маскве і Харкаве, музей Віцебскага статыстычнага камітэта. Памёр у Харкаве.

М.В.Маркс.

М.Я.Нікіфароўскі.

ЛУСКІНА Стафан (11.12.1725–21.8.1793). Беларускі публіцыст, астраном, матэматык. Нарадзіўся ў Віцебскім ваяводстве ў сям'і віцебскага гараднічага Юзафа Лускіна і Тэрэзы з Альшэўскіх. Член ордэна езуітаў (1742–73). Скончыў тэалагічны факультэт Віленскай езуіцкай акадэміі. Працаваў у Латарынгіі, дзе быў спаведнікам караля Станіслава Ляшчынскага (1677–1766). Пасля смерці караля працаваў у Варшаўскім езуіцкім калегіуме, дзе выкладаў астраномію і матэматыку, а таксама 3 гады быў яго рэктарам. Разам з братам Ігнатам Лускінам заснаваў пры Віцебскім езуіцкім калегіуме семінарыю для бедных вучняў, на якую 23.7.1760 г. адпісаў 1000 талераў бітых. Пасля забароны ў 1773 г. булай папы Клімента IV ордэна езуітаў С. Лускіна па рэкамендацыі караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага стаў рэдактарам газеты «Gazeta Warszawska» («Варшаўская газета»). Аўтар навуковых прац па астраноміі. Памёр у Варшаве.

МАНЬКОЎСКІ Ігнат Антонавіч [каля 1765, Віцебшчына – 30.12.1831(11.1.1832)]. Беларускі публіцыст. Паходзіў з беларускай шляхты. З 1783 г. на дзяржаўнай службе – саветнік Беларускага губернскага праўлення. У 1793 г. прызначаны старшынёй дэпартамента Магілёўскага губернскага магістрата. У сакавіку 1797 г. паводле царскіх указаў атрымаў у пажыццёвае ўладанне казённы маёнтак Буева з некалькімі вёскамі і чын надворнага саветніка ў Беларускім губернскім праўленні. Пазней набыў суседнюю з маёнткам вёску Мазалава і разумным гаспадараннем ператварыў яе ва ўзорны маёнтак, які атрымаў назву Мілае. У 1799–1801 гг. быў камянецпадольскім губернскім пракурорам на Украіне, потым на той жа пасадзе ў Віцебску. У Айчынную вайну 1812 г. арганізаваў вываз губернскай дакументацыі і маёмасці ў Расію (Вялікія Лукі). У красавіку 1813 г. стаў Віцебскім віцэ-губернатарам. З 1817 г. ў адстаўцы, жыў у сваім маёнтку Мілае. Супрацоўнічаў у рускіх часопісах. «У пісьме з Віцебска» («Сын Отечества», 1813) асудзіў агрэсію Напалеона, услаўляў гістарычны подзвіг народаў Расіі ў вайне 1812 г. У 1831 г. ўзнагароджаны залатым медалём Вольнага эканамічнага таварыства ў Пецярбургу за конкурсны твор «Адказ на задачу, прапанаваную імператарскім Вольным эканамічным таварыствам: «Якім чынам лёгка і трапна выправіць сялянскія пабудовы або зрабіць у іх карысныя ўдасканаленні?» (выд. 1833), у якім патрабаваў паляпшэння бытавых умоў сялян, выказваў каштоўныя думкі па пытаннях сельскай гаспадаркі, аховы прыроды. Мяркуюць, што Манькоўскі пісаў і па-беларуску, некаторыя даследчыкі лічаць яго аўтарам «Энеіды навыварат».

МАРКС Максімілян Восіпавіч [7(19).10.1816, Віцебск – 1893]. Мемуарыст, даследчык Сібіры, удзельнік рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў. У 1834 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. З 1857 г. выкладаў у Смаленскай, потым у Маскоўскай 4-й гімназіях. Па падазрэнні ў сувязях з паўстанцамі быў арыштаваны, у снежні 1863 – лютым 1864 гг. зняволены ў Трубяцкім бастыёне Петрапаўлаўскай крэпасці, потым выпушчаны пад нагляд паліцыі. Пасяліўся ў Маскве, дзе кіраваў адной з рэвалюцыйных падпольных арганізацый. У 1866 г. прыцягнуты да крымінальнай адказнасці па справе Дз.У. Каракозава, які ажыццявіў няўдалы замах на імператара Аляксандра II. 24.9.1866 г. пазбаўлены ўсіх правоў і сасланы ў Сібір на пажыццёвае пасяленне. Спачатку жыў у с. Кажэмскі Енісейскага павета, у 1868 г. пераведзены ў Енісейск. Заснаваў у Енісейску 1-ю сібірскую метэастанцыю. Вынікі прыродазнаўчых назіранняў змясціў у сваіх працах «Клімат Енісейска паводле 12-гадовых назіранняў 1871–1883» (1887), «Табліцы енісейскага часу» (1891) і інш. Вёў назіранні над касмічным пылам і даказаў яго існаванне. За навуковыя даследаванні быў узнагароджаны залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства (1878). Напісаў успаміны пра Віцебск і Віцебшчыну ў 1820–30-я гады («Запіскі старога», рукапіс зберагаецца ў бібліятэцы АН Украіны ў Львове), пакінуў запісы бела-

рускіх фальклорных матэрыялаў, урыўкі з паэмы «Энеіда навыварат», звесткі пра цікаўнасць да беларускага фальклору Э.Плятэр. Аўтар рукапіснага зборніка вершаў на польскай мове (зберагаецца ў бібліятэцы імя Асалінскіх у Вроцлаве, Польшча). Напісаў нататкі пра К.Касовіча (1886) і М.Буташэвіча-Петрашэўскага (1889), якія былі надрукаваны ў часопісе «Русская старина». Памёр у Енісейску. *Г.В.Кісялёў.*

МАРЦІНКЕВІЧ Геранім Францавіч [2(14).7.1816, в. Тулава Віцебскага раёна — пасля 1864]. Беларускі і польскі пісьменнік. У 1835 г. скончыў Віцебскую губернскую гімназію, вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Пасля доўгі час служыў чыноўнікам у Віцебскім губернскім праўленні і дваранскай дэпутацкай зборні. Творы на беларускай мове не захаваліся. Ёсць звесткі, што яго беларуская камедыя «Адвячорак (Аказія ў карчме пад Фальковічамі)» ставілася ў 1862 г. ў Віцебску. На польскай мове выдаў 2 зборнікі «Паэзія» (Вільня, 1845 і 1848) і кнігу «Творы, напісаныя між іншым» (Вільня, 1857). Драма «Падарожны» (1859) не апублікавана. Пераклаў на польскую мову беларускія народныя песні, вершы Гётэ і М.Лермантава; А.Вярыгу-Дарэўскаму і яго брату Сямёну прысвяціў верш «Заход сонца» (1843). *Г.В.Кісялёў.*

НІКІФАРОЎСКІ Мікалай Якаўлевіч [5(17).5.1845, в. Вымна Віцебскага раёна — 28.5(10.6).1910]. Беларускі этнограф і фальклярыст. Правадзейны член Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі Маскоўскага універсітэта (з 1890), Рускага геаграфічнага таварыства (з 1897). Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (1867). Працаваў настаўнікам народных вучылішчаў і гімназіі ў Віцебску і Віцебскай губерні, у Свіслацкай і Маладзечанскай семінарыях. З 1860-х гадоў вывучаў побыт і культуру Беларусі. Больш за 20 гадоў быў карэспандэнтам П.В.Шэйна, з 1890-х гадоў выступаў з самастойнымі працамі. Апублікаваў каля 20 даследаванняў па этнаграфіі, фальклору і гісторыі Віцебшчыны, апісаў побыт, сацыяльна-эканамічнае становішча розных слаёў і груп сельскага насельніцтва Віцебшчыны. Аўтар прац «Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку (Этнаграфічныя звесткі)» (1895), «Нарысы Віцебскай Беларусі» (ч. 1—8, 1892—99), «Старонкі з нядаўняй старыны горада Віцебска» (1899). Складальнік зборнікаў: «Простанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асобы і мясціны» (1897, 2307 запісаў), «Нячысцікі: Збор простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу» (1907) і інш.

Н.Орда.

ОРДА Напалеон (11.2.1807, в. Варацэвічы Іванаўскага раёна — 26.4.1883). Піяніст, кампазітар, мастак, педагог, пісьменнік. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Польшчы. З 1823 г. вучыўся ў Віленскім універсітэце, з якога ў 1827 г. выключаны за прыналежнасць да тайнага студэнцкага таварыства «Заране». Удзельнік паўстання 1830—31 гг., пасля эмігрыраваў у Францыю. У сярэдзіне 1840-х гадоў быў дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы. З 1856 г. жыў у Варацэвічах, у 1862—63 гг. — у Гродне, потым на Валыні, быў хатнім настаўнікам музыкі. Шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Польшчы і Літве, рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей і архітэктурных помнікаў. Вылучаюцца яго архітэктурныя замалёўкі (больш за 200 па Беларусі), якія выкананы алоўкам, сепіяй, акварэллю. Сярод іх былі і акварэлі з відамі Віцебска: «Забудова Ратушнай плошчы з боку Віцьбы», «Віцебск. Царква стараверaў, выгляд з боку ракі», «Былы езуіцкі касцёл і кляштар». Малюнкі вызначаюцца строгай дакументальнасцю, маюць каштоўнасць для гісторыі архітэктуры. Зараз зберагаюцца ў Нацыянальным музеі ў Кракаве (Польшча). Паводле шматлікіх малюнкаў і акварэляў Орды мастаком А.Місуровічам у 1873—83 гг. былі зроблены і выдадзены ў Варшаве літаграфіі (260 графічных аркушаў у 8 серыях). Відарысы Віцебска літаграфіраваны не былі. Выдавецтва «Ураджай» выдала альбом «Беларусь у малюнках Напалеона Орды. Другая палова XIX стагоддзя» (2001).

А.І.Остэрман-Талстой.

ОСТЭРМАН-ТАЛСТОЙ (да 1796 Талстой) Аляксандр Іванавіч [1770—14(26).2.1857]. Расійскі ваенны дзеяч. Генерал ад інфантэрыі (1817), граф Остэрман (1796). Службу пачаў у 1784 г. прапаршчыкам. Удзельнік руска-турэцкай 1787—91 гг., руска-аўстра-французскай 1805 г. і руска-пруска-французскай 1806—07 гг. войнаў; вызначыўся ў 1807 г. ў бітвах каля Чарнова, Пултуска, Пройсіш-Эйлаў. У 1808—10 гг. камандаваў Праабражэнскім палком і 1-й гвардзейскай дывізіяй. У пачатку вайны 1812 г. пры корпусе П.Х.Вітгенштэйна. З канца чэрвеня (пачатак ліпеня) 1812 г. камандуючы 4-м пяхотным корпусам 1-й Заходняй арміі. У баі каля Астроўна 13—14(25—26).7.1812 г. на суткі затрымаў праціўніка, што дало магчымасць галоўным сілам арміі адысці на Віцебск. Удзельнік Барадзінскай бітвы 26 жніўня (7 верасня), асенне-зімовай кампаніі 1812 г. У 1813 г. ў час замежных паходаў вызначыўся ў бітвах пад Баўцэнам, Дрэздэнам, Кульмам [17(29).8.1813], дзе страціў руку. У 1815—18 гг. шэф Паўлаўскага палка, камандуючы Грэнадзёрскім корпусам. З 1818 г. ў бестэрміновым водпуску. Жыў у Заходняй Еўропе, з 1837 г. ў Швейцарыі, дзе памёр.



Ю.Пешка. Аўтапартрэт.

ПАКРОЎСКІ Веньямін Веньямінавіч (1839, Магілёўская губ. — 15.8.1881). Беларускі архітэктар. У 1862 г. скончыў Пецярбургскае будаўнічае вучылішча па спецыяльнасці грамадзянскі інжынер. Працаваў малодшым архітэктарам Віцебскай будаўнічадарожнай камісіі (1862—76), полацкім епархіяльным архітэктарам (1876—78). Аўтар праектаў рамонту з частковай рэстаўрацыяй Сафійскага сабора ў Полацку (1869), мураванай царквы ў в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна (1881).

ПЕТРАЖЫЦКІ Леў Іосіфавіч [13(25).4.1867, в. Калантаева Віцебскай губерні — 15.5.1931]. Прававеді сацыёлаг. Скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію і юрыдычны факультэт Кіеўскага універсітэта, пасля чаго быў накіраваны за мяжу. Вучыўся ў спецыяльнай юрыдычнай школе для рускіх у Берліне, слухаў лекцыі ва універсітэтах Парыжа, Страсбурга, Вены, Мюнхена і Нансі. Доктар юрыдычных навук. У 1892—95 гг. у Германіі выдаў свае першыя працы па рымскаму праву. У 1898—1918 гг. кіраваў кафедрай энцыклапедыі і філасофіі права ў Пецярбургскім універсітэце. Аўтар прац «Акцыянерная кампанія» (1898), «Нарысы філасофіі права» (1900), «Універсітэт і навука» (1907) і інш. Адзін з кіраўнікоў партыі канстытуцыйных дэмакратаў (кадэтаў), член рэдакцыі часопісаў «Право», «Вестник права». Працаваў у розных заканадаўчых камісіях. Быў дэпутатам 1-й Дзяржаўнай думы. Пасля 1917 г. ў Польшчы, узначальваў кафедру сацыялогіі Варшаўскага універсітэта. Памёр у Варшаве.

ПЕШКА Юзаф (19.2.1767, г. Кракаў — 4.9.1831). Польскі жывапісец, прадстаўнік

класіцызму. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Расіі. Вучыўся ў Д. Эстрэйхера ў Кракаве і з 1786 г. ў Ф.Смуглевіча ў Варшаве. Магістр прыгожых мастацтваў (пасля 1810). У 1793—1812 гг. жыў у Гродне, Мінску, Вільні, Маскве і Пецярбургу, часта наведваў Віцебск. З 1812 г. жыў у Кракаве, з 1815 г. прафесар жывапісу і малюнка ў Школе прыгожых мастацтваў. Аўтар алегарычных і гістарычных кампазіцый, партрэтаў, а таксама пейзажаў, у тым ліку серыі відаў Мінска, Віцебска і інш. Вядомы 12 акварэляў канца 18 — пачатку 19 ст. з відамі Віцебска, якія захоўваюцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Украіны ў Львове. Гл. таксама артыкул «Віцебск канца 18 — пачатку 19 ст. вачамі Юзафа Пешкі».

ПІЯТРОЎСКІ Віктар Іосіфавіч (1855 — пасля 1917). Беларускі архітэктар. У 1879 г. скончыў Пецярбургскае будаўнічае вучылішча па спецыяльнасці грамадзянскі інжынер. З 1879 г. працаваў малодшым інжынерам будаўнічага аддзялення ў Наўгародскай губерні, у 1881—87 гг. займаў пасаду Віцебскага гарадскога архітэктара. Паводле праекта Пятроўскага і пад яго кіраўніцтвам быў пабудаваны піваварны завод у мяст. Чашнікі Лепельскага павета (цяпер горад Віцебскай вобласці), рэканструяваны гарадскі тэатр (1882) і Варварынскі касцёл (1885) у Віцебску.

ПЛЮШЧЭЎСКІ-ПЛЮШЧЫК Уладзімір Аляксеевіч (26.6.1849, Пецярбург — 18.4.1926). Беларускі энтамолаг. Вучыўся ў Пецярбургскім земляробчым інстытуце. У 1890—1918 гг. працаваў у Віцебску падатковым інспектарам; у 1919—25 гг. у Віцебскім сельскагаспадарчым тэхнікуме і ветэрынарным інстытуце (выкладчык і загадчык прыродна-гістарычнага музея). Сабраў вялікую калекцыю жукоў і матылёў (52 580 экземпляраў з 14 667 відаў — прадстаўнікоў фауны ўсяго свету), якую перадаў Віцебскаму ветэрынарнаму інстытуту (заснаваў у ім першы на Беларусі энтамалагічны музей). Працы прысвечаны вывучэнню цвердакрылых і лускакрылых. Правадзейны член Маскоўскага таварыства прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі.

А.С.ПУШКІН І ВІЦЕБСК

В летописи жизни А.С.Пушкина есть две даты, связанные с городом на Двине. Впервые он проехал через Витебск по пути из Петербурга на юг в мае 1820 г. Августовским днем 1824 г. дорога А.С.Пушкина снова пролегла через Витебск, когда он ехал из Одессы в Михайловское.

Помнік А.С.Пушкіну ў Віцебску.

Светилась, переливалась многоцветными красками лета белорусская земля. И в его подорожной — проездном свидетельстве, которое давало право сменить лошадей на почтовых станциях — значились белорусские города: Чечерск, Могилев, Орша, Витебск, Полоцк. В память о дороге осталась подорожная (хранится в Пушкинском Доме в Санкт-Петербурге) и записка владельцу имения в Колпино Витебской губернии с датой 8 августа 1824 г.

В творчестве великого поэта не раз откликнулись эта земля, эта дорога. В рецензии на сочинения Г.Конисского он с горечью писал о бедствиях белорусов, «народа, издревле нам родного, но отчужденного от России жребиями войны». Белорусским прототипом главного героя в романе «Дубровский» стал обедневший витебский дворянин Павел Островский, судьба которого во многом схожа с судьбой пушкинского героя, и в начале его именем назывался роман — «Островский». Исследователи творчества поэта утверждают, что казак в поэме «Полтава» — лицо истинное, Петр Яценко. И держит он путь в Витебск, где во время Северной войны находил-

8. Зак. 434.

ся Петр I, именно сюда «при звездах и при луне» скачет казак, у которого в шапке зашит «Донос на гетмана злодея Царю Петру от Кочубея». Страницы сохранившегося пушкинского плана работы над «Историей Петра I» пестрят именами и названиями нашего края: Симеон Полоцкий, Минск, Витебск, Полоцк, Орша, Копось, Бешенковичи, Дубровно, Днепр, Двина...

В Витебске жили родители А.А.Дельвига, от которого А.С.Пушкин получил уже в Михайловском письмо с описанием витебских событий в 1825 г. А в 1833 г. из Витебска прибыло еще одно послание: поклонник таланта поэта признавался, что полюбил русскую поэзию, благодаря вечным произведениям Александра Сергеевича.

В 1899 г., к столетию со дня рождения А.С.Пушкина, жители Витебска впервые по-настоящему открыто заговорили о своей любви к великому поэту, а в театре, где проходили народные чтения, звучали его строки о вольности святой. В Витебске открылась публичная библиотека имени поэта. Одна из улиц Витебска стала улицей Пушкина. Его имя носит мост через Витьбу – Пушкинский мост (назван к 1000-летию города в 1974 г.) А в 1989 г. в красивом уголке, там, где сливаются Витьба с Двиной, открыт памятник А.С.Пушкину (авторы – скульптор И.Казак и архитектор В.Ягодницкий), изображающий поэта в момент, когда он вышел на почтовой станции в Витебске.

Ежегодно в начале августа в Пушкинском уголке города проходит праздник, который проводит Пушкинский комитет. И звучат над Витьбой и Двиной крылатые девизы Пушкинского праздника:

В трудный час борьбы добра и зла
не иссякнет памяти криница.
Мы проходим к Пушкину, друзья,
красоте нетленной поклониться...
А Пушкинской дороги нет конца.
И, не старея, вечно молодая,
Поэзия проходит сквозь сердца,
в суровый век людей объединяя.

Д.Г.Сімановіч.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: «Подорожная Александра Пушкіна». Мн., 1977. С. 8–21.

РАМАНАЎ Еўдакім Раманавіч [30.8.(11.9).1855, мяст. Нова-Беліца, цяпер у межах Гомеля – 20.1.1922]. Беларускі этнограф, фалькларыст, археолаг, педагог. Правадзейны член Рускага геаграфічнага таварыства (1886), Маскоўскага таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі (1888), Маскоўскага археалагічнага таварыства (1890), Віцебскага статыстычнага камітэта (1891). Член-карэспандэнт з 1886 г. Паходзіў з бедных мяшчан. У 1870 г. скончыў Гомельскую прагімназію, у 1872 г. – курсы настаўнікаў рускай мовы і гісторыі. З 1872 г. працаваў настаўнікам, у 1886–1906 гг. – інспектарам народных вучылішчаў Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай губерняў. У 1906–16 гг. член Часовай камісіі па ўладкаванні Віленскай публічнай бібліятэкі і музея. У 1886–94 гг. жыў у Віцебску, дзе разам з А.П.Сапуновым заснаваў царкоўна-археалагічны музей. У 1897–1903 гг. рэдактар неафіцыйнага аддзела газеты «Могилевские губернские ведомости». З 1910 г. загадваў секцыяй этнаграфіі і археалогіі Паўночна-Заходняга аддзялення Рускага геаграфічнага таварыства. З 1917 г. жыў у г. Стаўрапаль. Вывучаў матэрыяльную і духоўную культуру беларусаў: жыллё, адзенне, сямейны побыт, народныя абрады, вераванні, народны каляндар і медыцыну, дзіцячыя гульні. Апублікаваў больш за 200 прац па этнаграфіі, фальклору, гісторыі, археалогіі і мове беларусаў, больш за 10 тыся фальклорных твораў.

РЫПІНСКІ Аляксандр Феліксавіч (1811, в. Кукавячына Віцебскага раёна – 1890). Беларускі і польскі паэт, фалькларыст, графік, кнігавыдавец. Скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. У 1829–30 гг. вучыўся ў школе прапаршчыкаў у Дынабургу (цяпер Даўгаўпілс, Латвія), дзе блізка сышоўся з В.Кюхельбекерам, які знаходзіўся пад арыштам у Дынабургскай крэпасці. Удзельнічаў у паўстанні 1830–31 гг. Будучы прапаршчыкам, змагаўся ў атрадзе генерала Антона Гелгуда, які вёў баі на Віцебшчыне. Рыпінскі камандаваў ротай пяхоты, потым падраздзяленнем артылерыстаў. У адным з баёў ён згубіў ранец з запісамі беларускіх народных песень, якія былі зроблены на Віцебшчыне. Пазней гэта ўскладніла работу над кнігай «Беларусь», калі Рыпінскаму па памяці прыйшлося ўзнаўляць радок за радком песні роднага краю. Пасля задушэння паўстання А.Рыпінскі, ратуючыся ад катаргі, разам са сваім атрадам перайшоў прускую граніцу, потым перабраўся ў Францыю. Спачатку жыў у Авіньёне, потым у Парыжы, дзе зблізіўся з Адамам Міцкевічам. У польскім літаратурным тава-

рыстве ў Парыжы чытаў лекцыі па беларускай этнаграфіі і фальклору. У 1840 г. ў Парыжы выдаў уласную кніжку «Беларусь», у якой змясціў гісторыка-літаратурныя і этнаграфічныя звесткі, апісанні абрадаў, выслоўі, узоры музычнай культуры беларусаў Віцебшчыны. У Парыжы А.Рыпінскі захапіўся фотасправай, якой працягваў займацца і пасля пераезду ў 1846 г. ў Лондан. Тут ён заснаваў вольную друкарню і адзін з першых у свеце стаў пераводзіць фотаздымкі на літаграфію, якія змяшчаў у сваіх кнігах. Быў мастаком-графікам, аўтарам розных сюжэтных малюнкаў. У лонданскай друкарні ён выдаў зборнікі сваіх вершаў на польскай мове з уласнымі ілюстрацыямі («Прарок», 1851; «Паэзія», 1853; «Сяржант-філосаф...», 1854) і беларускую рамантычную баладу «Нячысцік» (1853, адна з першых у беларускай літаратуры). У кастрычніку 1852 г. А.Рыпінскі пачаў выпускаць цэнтральны орган польскага дэмакратычнага таварыства. У 1857 г. ён прадаў сваю лонданскую друкарню і накіраваўся ў Парыж, дзе затрымаўся да 1859 г., калі расійскія ўлады канчаткова вырашылі яго пытанне. У 1859 г., пасля царскай амністыі, вярнуўся ў Віцебск, пасяліўся ў доме свайго роднага брата, адстаўнога штабс-капітана, героя Крымскай вайны Віктара Феліксавіча Рыпінскага ў маёнтку Кукавячына. Паліцэйскі нагляд за А.Рыпінскім не быў зняты, ён па-ранейшаму быў пазбаўлены ўсіх чыноў, званняў як палітэмігрант. Неўзабаве А.Рыпінскі зблізіўся з беларускім пісьменнікам-дэмакратам А.І.Вярыгам-Дарэўскім, які жыў непадалёку ад Віцебска, у в. Стайкі. У 1858–63 гг. Вярыга-Дарэўскі вёў альбом — унікальны помнік беларускай культуры. У ім пакінулі свае вершы і запісы В.Дунін-Марцінкевіч, У.Сыракомля, В.Каратынскі, А.Кіркор, Я.Вуль, а таксама А.Рыпінскі.

Пасля задушэння паўстання 1863–64 гг. А.Рыпінскі пераехаў у маёнтак Страгані (цяпер в. Страганы Лёзненскага раёна), дзе жылі яго родзічы. Валодала маёнткам Ксаверыя Аляксандраўна Рыпінская, якая набыла яго ў Ганны Іванаўны Заблоцкай, жонкі беларускага паэта Тадэвуша Лады-Заблоцкага. Гаспадарка была стратная і не пакрывала расходы на яе ўтрыманне. Аддаленыя ад бойкіх дарог і гарадоў, ціхія Страганы не сталі для А.Ф.Рыпінскага месцам бяздзейнасці. Тут ён працягваў літаратурную працу, бываў на кірмашах у мястэчку Янавічы, у Віцебску, наведваў бліжэйшыя вёскі Кавалі, Глоданкі, Веляшковічы, Пнева — збіраў беларускі фальклор, запісваў паданні і легенды пра мясцовыя курганы, гарадзішчы і іншыя помнікі старажытнасці. Наладзіў сувязі з тымі, хто мог яму дапамагчы ў зборы матэрыялаў для сістэматызацыі дагэтуль нікім не распрацаванага беларускага літаратуразнаўства. Яго гасцямі былі родны брат Арцёма Вярыгі-Дарэўскага — Сымон, які пісаў працы па гісторыі Беларусі. У Страганы ішлі пісьмы ад польскага пісьменніка і публіцыста Адама Плуга, беларускага археолага, этнографа і краязнаўца, аднаго з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі Яўстафія Тышкевіча, беларускага і польскага пісьменніка і журналіста Вінцэся Каратынскага, беларускага публіцыста, літаратуразнаўца, грамадскага дзеяча Уладзіміра Саковіча, беларускага археолага, краязнаўца і фатографа Міхаіла Кусцінскага. Асабліва актыўна пісаў Рыпінскаму беларускі этнограф, гісторык, эканаміст і пісьменнік Аляксандр Ельскі.

Е.Р.Раманаў.

А.Ф.Рыпінскі.

У Страганах школьны таварыш Зянон Харошча прачытаў А.Рыпінскаму на памяць «Энеіду навыварат». Ад шляхціча Юрэвіча Рыпінскі запісаў звесткі пра Ігната Манькоўскага, якому некаторыя даследчыкі прыпісваюць аўтарства «Энеіды навыварат», у руках Рыпінскага быў і славуты «Альбом» А.Вярыгі-Дарэўскага. Ён цікавіўся ўсімі новымі імёнамі беларускіх літаратараў. Гэта садзейнічала напісанню гісторыі беларускай літаратуры. У пісьме Адаму Плугу ў 1883 г. А.Рыпінскі паведамляў, што збірае звесткі бібліяграфічнага характару пра дзеячоў літаратуры — ураджэнцаў беларускай зямлі, і прыкладаў спіс з прозвішамі 55 пісьменнікаў.

А.П.Сапуноў.

Зразумела, гэта пачатак, і А.Рыпінскі наракаў: «Некаторыя з іх з вялікай цяжкасцю прыходзілася мне адкопваць». Са Страганаў пісаў А.Плугу: «Скляпаў ужо з большага біяграфію Баршчэўскага, Князьніна і Лускіна Юзафа, Рысінскага Францішка, Шыдлоўскага Ігната і Заблоцкага Тадэвуша, а колькі ж гэта яшчэ (не дачакаліся) ні слова». На жаль, рукапіс «Гісторыя беларускай літаратуры» А.Рыпінскага згублены.

Ёсць звесткі, што А.Рыпінскі памёр каля 1900 г. Іншыя крыніцы сцвярджаюць, што яго смерць наступіла не раней 1886 г. У «Слоўніку геаграфічным Каралеўства Польскага» пад 8.11.1890 г. ўпамінаюцца: «Страганы як уладанне Віцебскай губерні, дзе жыў А.Рыпінскі, аўтар даследавання «Беларусь».

Відавочна, што ў момант напісання артыкула пра Страганы А.Ф.Рыпінскага ў жывых ужо не было. Значыць, ён памёр не раней 1886 г., але і не пазней 1890 г. На жаль, не ўдалося ўстанавіць, дзе ён пахаваны. Страганы ж застануцца назаўсёды памятнай мясцінай беларускай культурнай спадчыны.

РЫСІНСКІ Францішак (?–1830?). Беларускі і польскі паэт. Старшыня Цывільнай палаты ў Віцебску. Пісаў эпіграмы, лірычна-філасофскія і гумарыстычныя вершы на польскай, беларускай і рускай мовах. Творы яго распаўсюджваліся на Віцебшчыне ў спісах і вусна, а таксама публікаваліся ў часопісах «Tugodnik Wileński» («Віленскі штотыднёвік», 1819), «Dziennik Wileński» («Віленскі дзённік», 1830), «Roeznik literacki» («Літаратурны штогоднік», 1844). Рысінскі, магчыма, аўтар макаранічных беларуска-польскіх мініяцюр «Плач пакінутага каханай» і «За пенкнай паненкай аж душа сумуе...», апублікаваных А.Рыпінскім у кнізе «Беларусь» (Парыж, 1840).

САБОЛЬШЧЫКАЎ Васіль Іванавіч [13(25).1.1813, Віцебск – 19(31).10.1872]. Архітэктар і бібліяфіл. Нарадзіўся ў сям'і багатага купца. Скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, пасля чаго пачаў дапамагаць бацьку ў гандлёвых справах. З 1825 г. працаваў капіістам у Віцебскім губернскім праўленні. У 1830 г. пераехаў у Пецярбург, дзе ўладкаваўся на службу ў канцылярыю рыма-каталіцкай калегіі, з 1834 г. працаваў у Публічнай бібліятэцы. Валодаў польскай, нямецкай, французскай, англійскай і італьянскай мовамі. У канцы 1830-х гадоў захапіўся архітэктурай. Адначасова з працай у бібліятэцы наведваў як вольны слухач класы Акадэміі мастацтваў. Сістэматызаваў і апісаў калекцыю эстампаў (50 тыс. экземпляраў), загадваў аддзяленнямі «Росіка», «Мастацтва», «Тэхналогія», выконваў абавязкі аканома, скарбніка і архітэктара Публічнай бібліятэкі. Аўтар некалькіх дзесяткаў прац па бібліятэказнаўству, быў прыхільнікам стварэння сістэматычных каталогаў, для якіх прапанаваў выкарыстоўваць сістэму картак. Адным з першых у рускай бібліяграфіі выказаў думку пра неабходнасць стварэння прадметных каталогаў. Памёр у Пецярбургу і быў пахаваны на Шувалаўскіх могілках.

САЗОНАЎ Аляксандр Міхайлавіч [5(17).6.1817–27.11(9.12).1886, Віцебск]. Беларускі гісторык, архівіст. Нарадзіўся ў сям'і мяшчан. Скончыў Сімбірскую гімназію і філасофскі факультэт Казанскага універсітэта. З 1839 г. працаваў выкладчыкам гісторыі і геаграфіі ў Слонімскім дваранскім вучылішчы, з 1848 г. – выкладчыкам гісторыі ў Дынабургскай гімназіі. У 1860 г. выйшаў у адстаўку з-за хваробы. З 1862 г. працаваў архіварыусам Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў. З 1871 г. пачаў выдаваць археаграфічны зборнік «Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Витебском центральном архиве». Да сваёй смерці паспеў падрыхтаваць і выдаць 16 тамоў зборніка. У 1881–86 гг. выконваў абавязкі сакратара Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта.

САПУНОЎ Аляксей Парфенавіч [15(27).3.1851–2.10.1924]. Беларускі гісторык, археограф, краязнавец. Усё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню роднага Падзвіння. Пяру знакамітага земляка – «летапісца Ві-

цебшчыны» — належыць каля 270 навуковых і краязнаўчых прац, якія адкрылі сучаснікам многія невядомыя ці даўно забытыя старонкі далёкага мінулага горада на Дзвіне і Віцьбе, багатай гісторыі самабытнай культуры пакаленняў віцьбічаў старажытных і пазнейшых стагоддзяў.

Нарадзіўся А.П.Сапуноў у старадаўнім гарадку Усвяты, які некалі ўваходзіў у склад Віцебскага княства і Віцебскай губерні (цяпер Пскоўская вобласць). Выхадзец з небагатай купецкай сям'і. Большую частку жыцця правёў у Віцебску. У 1869 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, потым вучыўся на гісторыка-філалагічным факультэце Пецярбургскага універсітэта, які паспяхова скончыў у 1872 г. з атрыманнем ступені кандыдата навук. Тут пад кіраўніцтвам прафесара У.І.Ламанскага, будучы яшчэ студэнтам, пераклаў з лацінскай мовы хроніку Адама Брэменскага пра балтыйскіх славян 11 ст. і зрабіў уласныя каментарыі да перакладу. Улічваючы вялікія здольнасці і схільнасць да даследчай работы, прафесар Ламанскі прапанаваў свайму таленавітаму выхаванцу застацца працаваць на кафедры. Але ў сувязі з тым, што Сапуноў у час свайго навучання з'яўляўся стыпендыятам Міністэрства народнай асветы, ён вымушаны быў пакінуць сталіцу і вярнуцца ў Віцебск. Прычынай была страта бацькі і нечаканая хвароба. Са жніўня 1873 г. малады вучоны прызначаецца на пасаду выкладчыка гісторыі і старажытных моў Віцебскай гімназіі (дзе сам нядаўна вучыўся), з 1896 г. працаваў архіварыусам цэнтральнага архіва актавых кніг Віцебскай і Магілёўскай губерняў.

Пры падрыхтоўцы «Віцебскай даўніны» яму давялося шмат працаваць у архіўных сховішчах Пецярбурга, Масквы, Вільні, Віцебска і Полацка. У зборніку змешчаны ўрыўкі з летапісаў, інвентары горада, граматы віцебскіх і полацкіх князёў, «Летапіс Віцебска» С.Аверкі і М.Панцырнага, дакументы пра Віцебскае паўстанне 1623 г., заняцце Віцебшчыны войскамі цароў Івана Жахлівага і Аляксея Міхайлавіча і інш.

Працы мясцовага гісторыка і перш за ўсё «Віцебская даўніна» і «Рака Заходняя Дзвіна» прынеслі аўтару не толькі поспех, новыя сімпатыі, павагу, але і прызнанне яго вялікага аўтарытэта і вядомасці ў навуковым свеце. Вясной 1897 г. А.П.Сапуноў атрымаў прапанову ад упраўляючага Маскоўскай навуковай акругі заняць пасаду памочніка інспектара студэнтаў Маскоўскага універсітэта. У Маскве з'явілася магчымасць рэгулярна працаваць у архівах і бібліятэках. Акрамя таго павышэнне па службовай лесвіцы давала істотную прыбаўку ў заработку. Галоўнае ж — адкрывалася перспектыва ў навуковай дзейнасці.

А.П.Сапунову было даручана даць навуковую ацэнку працы вядомага нямецкага гісторыка Ф. фон Кейслера «Канец першапачатковага рускага ўладарання ў Прыбалтыйскім краі ў 13 стагоддзі». Яна прэтэндавала на высокую ўзнагароду — Увараўскую акадэмічную прэмію за вялікі ўклад у вывучэнні гістарычнага мінулага Расіі. Тэма для віцебскага даследчыка была не новая. Ён займаўся ёй яшчэ ў Пецярбургскім універсітэце і пазней. Аднак, каб падрыхтаваць даволі аб'ёмную і глыбокую рэцэнзію, якая сама па сабе мела навуковае значэнне, давялося шмат папрацаваць. Выкарыстоўваючы хроніку Генрыха Латыша, Лаўрэнцьеўскі, Пскоўскі першы і другі, Наўгародскі першы і чацвёрты, Пераяслава-Суздальскі летапісы, працы К.Бястужава-Руміна, С.Салаўёва, Д.Іловайскага, Н.Кастамарава, А.Сапуноў далёка не цалкам згаджаецца з вывадамі Кейслера. Пераканаўча даказвае свой пункт гледжання. У той жа час аддае належнае вучонаму, падкрэсліўшы, што ён «даўно ўжо і не без поспеху працуе над даследаваннем розных бакоў гэтага цікавага і важнага пытання». Падводзячы вынікі свайго аналізу, рэцэнзент прызнае працу Кейслера як дастойную Увараўскай прэміі. За сваю рэцэнзію А.П.Сапуноў быў удастоены Увараўскага залатога медаля Расійскай Акадэміі навук.

Поспех цікавай працы «Дзвінскія або Барысавы камяні», яе папулярнасць натхнялі аўтара на стварэнне новай, адной з самых вядомых яго кніг — «Рака Заходняя Дзвіна» (Віцебская губернская друкарня, 1893). Грунтоўнае даследаванне А.Сапунова з'явілася важным укладам у гісторыка-геаграфічную навуку. Садзейнічала пашырэнню ведаў пра родны Прыдзвінскі край, яго галоўную жыццёвую артэрыю — вялікую беларускую раку, на маляўнічых берагах якой узніклі старажытнейшыя гарады Віцебск, Полацк, Сураж, Веліж і шмат іншых славянскіх паселішчаў. Гэта выданне высока ацанілі не толькі ў Расіі, але і ў Англіі, Францыі і Германіі. «Перад намі новая грунтоўная праца нястомнага даследчыка заходне-рускіх ускраін А.П.Сапунова», — інфармавалі сваіх чытачоў «Мос-

ковские новости». «Кніга А.П.Сапунова ўяўляе багаты ўклад у нашу бедную яшчэ гісторыка-геаграфічную літаратуру», — падтрымліваў іх «Сын Отечества». «Хоць аб Дзвіне пісалася ўжо і раней як з нашага (польскага), так і з рускага боку, патрэбна, аднак, прызнаць, што праца А.Сапунова, які здаўна карыстаецца заслужанай вядомасцю па іншых гістарычных даследаваннях яго, — самая шырокая і самая важная. Сабраў ён даволі многа цікавых і новых да нашага часу невядомых звестак аб гэтым прадмеце, умела іх апрацаваў, дадаў да іх удалыя малюнкі і стварыў такім чынам даволі добрае і павучальнае цэлае, за што і трэба прынесці яму шчырую падзяку...» — пісаў Львоўскі ў часопісе «Исторический ежеквартальник».

Калі ў 1901 г. А.Сапунову стала вядома аб вакантнай пасадзе сакратара Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта, ён пакінуў Маскоўскі універсітэт і вярнуўся ў Віцебск, да родных мясцін, па якіх даўно сумаваў. Тым больш, што восенню 1898 г. ўжо споўнілася 25 гадоў службы ў сістэме народнай асветы, якая гарантавала яму пенсію. Можна было разлічваць на больш спакойнае і большменш забяспечанае жыццё, спрыяльныя ўмовы для навуковай працы. Штат губернскага статыстычнага камітэта складаўся тады з аднаго сакратара. Яго абавязкам быў збор і абагульненне статыстычных дадзеных аб насельніцтве, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, помніках старажытнасцей. Першай працай Аляксея Парфенавіча пасля вяртання ў Віцебск стала яго кніга «Помнікі часоў старажытных і найноўшых у Віцебскай губерні», выдадзеная статыстычным камітэтам у 1903 г. Новая цікавая праца гісторыка з'явілася ў сувязі з цыркулярам Міністра ўнутраных спраў, у якім звярталася ўвага губернатараў, граданачальнікаў і обер-паліцмайстараў «на адсутнасць нагляду за захаваннем старажытных замкаў, крэпасцей, помнікаў і іншых будынкаў старажытнасці...» Аднак замест канцылярскай справаздачы быў створаны каштоўны навуковы даведнік пра гістарычныя помнікі мінулага Віцебшчыны. У кнізе А.П.Сапуноў апісаў найбольш старажытныя храмы Полацка-Віцебскага краю, у т.л. і Спаскую царкву Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку і Благавешчанскую царкву ў Віцебску. Газета «Северо-Западный край» пісала: «Нельга не вітаць падобнае выданне... Працы А.Сапунова, якія маюць несумненнае навуковае значэнне і цікавасць для шырокай публікі, ужо дастаткова вядомыя для таго, каб аддаць належнае яго новай рабоце».

Вынікам першых гадоў працы А.П.Сапунова ў статыстычным камітэце сталі некалькі афіцыйных выданняў — каштоўных крыніц па гісторыі Віцебска і вобласці: зборнікі «Спіс населеных месц Віцебскай губерні» (1906), «Землеўладанне, землеўладальнікі Віцебскай губерні ў 1905 годзе» (1908), а таксама тры выданні «Памятнай кніжкі Віцебскай губерні» на 1903, 1904, 1905 гг., у якіх акрамя традыцыйных матэрыялаў апублікаваны ў выглядзе дадаткаў даследаванні Аляксея Парфенавіча як гісторыка: «Кустарная прамысловасць у Віцебскай губерні» (1904), «Перыядычны друк у Віцебскай губерні», «План горада Віцебска» (1905).

Прызнаннем заслуг А.П.Сапунова ў навуковай дзейнасці і перш за ўсё ў вывучэнні мінулага Полацка-Віцебскага краю, стаў удзел яго ў падрыхтоўцы 9-га тома папулярнага даведніка «Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай айчыны. Настольная і дарожная кніга для рускіх людзей» (С.-Пецярбург, 1905). Выходзіў ён пад рэдакцыяй праслаўленага В.Сямёнава, пад агульным кіраўніцтвам яго брата П.П.Сямёнава Цян-Шанскага і акадэміка У.І.Ламанскага, які вучыў А.Сапунова ў Пецярбургскім універсітэце. Разам з А.Сапуновым 9-ы том «Верхняе Падняпроўе і Беларусія», дзе апавядаецца пра Смаленскую, Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні, рыхтавалі вядомыя гісторыкі В.Сямёнаў, М.Доўнар-Запольскі, Д.Шэндрык і А.Кабакоў. У сааўтарстве з двума апошнімі А.П.Сапуноў напісаў сёмую главу — «Шляхі зносін» — раздзела «Насельніцтва» і 3 главы раздзела «Выдатныя населеныя месцы і мясцовасці», якія склалі амаль палову гэтай аб'ёмнай кнігі. У названых яе главах і раздзелах даецца гістарычны нарыс шляхоў зносін, расказваецца пра тагачасныя водныя шляхі, грунтовыя і шашэйныя дарогі, а таксама чыгункі, рэкі і тыпы грузавых драўляных суднаў, пра суднабудаванне і параходства, якія тады толькі зараджаліся. Прыводзяцца гістарычныя і статыстычныя дадзеныя пра буйнейшыя населеныя пункты, даецца апісанне гарадоў, мястэчак, найбольш буйных вёсак Віцебшчыны. У кнізе змешчана вялікая колькасць фатаграфій гарадоў, цікавых помнікаў архітэктуры і гістарычных мясцін, старажытных планаў, карт, дыяграм. У 1907 г. выбраны дэпутатам ад Віцебскай губерні ў Дзяр-

жаўную Думу 3-га склікання. Актыўна ўдзельнічаў у стварэнні Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея, вучонай архіўнай камісіі. Адзін з ініцыятараў адкрыцця Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута, у якім выкладаў і ў 1913 г. быў абраны прафесарам. Чытаў лекцыі ў Віцебскім настаўніцкім інстытуце (1911—22) і курс беларусазнаўства ў Віцебскім педагагічным інстытуце (1923—24). Пахаваны ў Віцебску.

А.М.Падліпскі.

СЕМЯНТОЎСКІ Аляксандр Максімавіч (1821, Палтаўшчына — 1893). Беларускі і рускі гісторык, археолаг, краязнавец, этнограф і фальклярыст. У 1840 г. скончыў Нежынскі ліцэй. На Беларусі пасяліўся напярэдадні паўстання 1863—64 гг. Лічыўся даверанай асобай царскай адміністрацыі. У 1860—90-я гады сакратар Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта, рэдактар неафіцыйнай часткі «Витебских губернских ведомостей», пазней рэдактар «Памятнай кніжкі Віцебскай губерні». З 1882 г. жыў у сваім маёнтку Ражаншчына пад Полацкам. Займаўся этнаграфіяй, гісторыяй, геаграфіяй Беларусі, пераважна Віцебшчыны. Па просьбе Пецярбургскай Акадэміі навук выяўляў і вывучаў помнікі археалогіі. Асабіста раскопкамі не займаўся, але сачыў за даследаваннямі беларускіх археолагаў. Шэраг навуковых прац прысвяціў Беларусі. Апісаў гісторыю Віцебскай губерні, Барысавы камяні, Віцебскую Благавешчанскую царкву, Полацкі Сафійскі сабор, сабор у Бельчыцах, старажытныя помнікі, археалагічныя знаходкі, крыж Лазара Богшы і інш.



А.М.Семянтоўскі.

СТРУКАЎ Дзмітрый Міхайлавіч (1827?—1899). Мастак, археолаг, педагог. Скончыў Строганаўскае вучылішча ў Маскве. У 1849 г. заснаваў вучылішча малявання пры Троіцка-Сергіеўскай лаўры ў Сергіевым Пасадзе (Маскоўская вобласць). У 1864 г. ажыццявіў экспедыцыю па Беларусі, у выніку якой зрабіў замалёўкі (каляровая акварэль, туш, грызайль) населеных месцаў, помнікаў архітэктуры, эпіграфікі, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У Віцебску намаляваў Троіцкую і Ільінскую цэрквы, Маркаў манастыр, план і разрэз Благавешчанскай царквы, аправу Евангелля 1508 г., якое захоўвалася ў гэтым жа храме, узоры рукапісаў і малюнак вадзянога знака з яго; узоры рукапісных актавых матэрыялаў з цэнтральнага архіва старажытных грамат; мітру, панагію, сярэбраны крыж Іасафата Кунцэвіча з Мікалаеўскага сабора; чашу 1584 г. і жалезную падстаўку для кадзільнай жароўні з Маркава манастыра; сярэбраны



Дз.М.Струкаў. Маркаў манастыр у Віцебску. Акварэль. 1864 г.

У.К.Стукаліч.

крыж Благавешчанскай царквы; кафляны падсвечнік і аканіцу з царквы святога Юр'я; план старажытнай царквы святых Барыса і Глеба; камень І.Кунцэвіча, што знаходзіўся каля горада. Усе пералічаныя акварэлі захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў Дзяржаўнага універсітэта ў Вільнюсе (Літва).

СТУКАЛІЧ Уладзімір Казіміравіч [28.10(9.11.)1858, г. Екабпілс, Латвія — 18.10.1918]. Беларускі літаратуразнавец, гісторык і краязнавец. У 1879 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, у 1883 г. — юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. За сувязь з народавольцамі ў 1884 г. быў сасланы пад нагляд паліцыі ў Віцебск, дзе пражыў усё жыццё за выключэннем перыяду з 1898 па 1903 гг., калі працаваў у казённай палаце ў Слоніме, Гродне. Працаваў у Віцебскай казённай палаце. Быў адным з ініцыятараў стварэння Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, на працягу многіх гадоў з'яўляўся членам Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта. У 1886—1900 гг. пад псеўданімам Вяневіч у газеце «Русскій курьер» друкаваў нарысы па сучаснай літаратуры. Аўтар прац «Да пытання аб арганізацыі універсітэта ў Віцебску» (1903), «Аўтарскае права» (1896), «А.П.Сапуноў. Да 25-годдзя яго навуковай і літаратурнай дзейнасці» (1905), «М.Я.Нікіфароўскі, 1845—1910 гг.» (1910), шэрагу артыкулаў па краязнаўстве Беларусі, гісторыі беларускага горада. Актыўны ўдзел прымаў у грамадска-палітычным жыцці, стаяў каля вытокаў стварэння першых палітычных партый на Віцебшчыне, быў адным з лідэраў заходнерусізму. Расстраляны па прысуду Віцебскай надзвычайнай камісіі разам з іншымі лідэрамі партыі Беларускі народны саюз.

СЯМЁНАЎ Дзмітрый Дзмітрыевіч [22.12.1834(3.1.1835), в. Асінаўка Аршанскага павета Магілёўскай губерні — 1902?]. Педагог, мемуарыст. У 1852 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. У 1869—83 гг. працаваў дырэктарам настаўніцкіх семінарый на Каўказе, потым — рэдактарам часопіса «Детское чтение». Аўтар мемуараў «З успамінаў старога педагога», дзе апісаў свае гімназічныя гады і Віцебск 1840—50-х гадоў.

ТРУТНЕЎ Іван Пятровіч [1827, г. Чакалін Тульскай вобласці — 5(18).2.1912]. Рускі жывапісец, графік, педагог. Вучыўся ў Строганаўскім вучылішчы ў Маскве, Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1850—58; з 1868 акадэмік). У 1866—1912 гг. арганізатар і загадчык Віленскай рысавальнай школы. Шмат зрабіў для развіцця мастацкай адукацыі на Беларусі. У 1866—67 гг. выкладаў у Віцебскай мужчынскай гімназіі маляванне, чарчэнне і чыстапісанне. За час працы ў Віцебску выканаў шэраг замалёвак будынкаў горада, Ільінскай царквы (змешчана ў кнізе П.Бацюшкава «Беларусь і Літва», 1890). Аўтар шэрагу партрэтаў.

ФАНТАНА Іосіф III (1700? — пасля 1755). Архітэктар. Прадстаўнік барока. Паходзіў з Італіі. Працаваў пераважна ў Гродне і Вільні. Пабудаваў царкву Раства Багародзіцы ў Гродзенскім манастыры базыльянак (1726) і палац Сапегаў у Гродне (1741—44), склаў праект (1740) і кіраваў будаўніцтвам (1741—43) Сталавіцкай царквы Іаана Хрысціцеля. З'яўляецца таксама аўтарам праекта і кіраўніком будаўнічых работ (1745—53) царквы базыльянскага кляштара Успення Прасвятой Багародзіцы і св. пакутніка Іасафата ў Віцебску.

ФЕДАРОВІЧ Вацлаў Пятровіч [25.9.1848, Магілёў — 12(25).1.1911, Віцебск]. Беларускі краязнавец, калекцыянер, юрыст. Член-карэспандэнт Кракаўскай Акадэміі навук. Скончыў Маскоўскі універсітэт. З 1872 г. працаваў адвакатам у Саратаве, Балашове, Царыцыне, Ерэване. З 1884 г. жыў і працаваў у Віцебску. Намеснік старшыні Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. У часопісах «Ziemia» («Зямля»), «Kraj» («Край») і інш. друкаваў артыкулы па гісторыі Віцебшчыны. Сабраў археалагічную і нумізматычную калекцыі, творы літаратуры і мастацтва (сярод іх рукапісы А.Рыпінскага, Я.Баршчэўскага, дакументы 17—18 ст.), абразы, пячаткі, медалі, ордэны, масонскія знакі, прадметы ваеннага побыту і хатняга ўжытку (каля 4500 экземпляраў). У бібліятэцы Федаровіча (больш за 1 тыс. тамоў) былі кнігі па

гісторыі Беларусі і Літвы, беларускія і літоўскія выданні 18—20 ст. Быў складальнікам і ініцыятарам выдання літаратурна-краязнаўчага зборніка «З ваколіц Дзвіны» (Віцебск, 1912). Распрацаваў статут Беларускага вольна-эканамічнага таварыства. У 1924 г. калекцыя Федаровіча ўвайшла ў склад Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

ЦІХАМІРАЎ Клаўдзій Іванавіч (1858—1924). Беларускі педагог. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію. Працаваў інспектарам народных вучылішчаў, дырэктарам Свіслацкай, потым Полацкай настаўніцкіх семінарый (1905—10). У 1910—18 гг. дырэктар Віцебскага настаўніцкага інстытута, выкладаў у ім педагогіку і псіхалогію з элементамі логікі. Унёс вялікі ўклад у падрыхтоўку настаўнікаў народных школ на Беларусі. Аўтар метадычных дапаможнікаў, артыкулаў «Навучанне грамаце» (1901), «Галоўнейшыя вынікі вывучэння памяці» (1905), «Складовы метад навучання грамаце ў новай апрацоўцы» (1911), «Псіхалагічныя асновы навучання» (1912) і іншыя. Важным сродкам павышэння ўзроўню падрыхтоўкі настаўнікаў лічыў настаўніцкія з'езды і курсы. У настаўніцкай семінарыі і інстытуце, якімі кіраваў, увесь час наладжваў настаўніцкія курсы, дзе сам выкладаў педагогіку і кіраваў практычнымі заняткамі. У Віцебску Ціхаміраў арганізаваў заатэхнікум, на базе якога пазней быў створаны ветэрынарны інстытут. У 1920-я гады быў рэктарам Віцебскага практычнага сельскагаспадарчага інстытута. Памёр у Віцебску.

ЧАЧОТ Антон Антонавіч (1842—1924). Урач-псіхіятр, педагог. Нарадзіўся ў Магілёўскай губерні. У 1860 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, праз 4 гады перавёўся ў медыка-хірургічную акадэмію ў Пецярбургу. У 1866 г. скончыў яе з сярэбраным медалём. Працаваў урачом у псіхіятрычнай бальніцы св. Міколы Цудатворца, у 1881—1901 гг. дырэктар гэтай бальніцы. У 1876 г. абараніў дысертацыю на ступень доктара медыцыны, у 1882 г. атрымаў званне прыват-дацэнта медыцынскай акадэміі па нервовых і псіхічных хваробах. Некалькі гадоў выкладаў на жаночых медыцынскіх курсах у Пецярбургу, актыўна садзейнічаў пашырэнню ў Расійскай імперыі медыцынскай адукацыі сярод жанчын. 10 гадоў працаваў урачом на Пуцілаўскім заводзе, дзе на той час было каля 10 тыс. рабочых. Узначальваў Таварыства

І.П.Трутнеў. Аўтапартрэт.

пецярбургскіх урачоў, быў членам Таварыства псіхіятраў, прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні 1-га з'езда псіхіятраў Расіі (1884). Працы прысвечаны пераважна судова-медыцынскім праблемам і практычнай псіхіятрыі.

ЧЫР'ЕЎ Сяргей Іванавіч (1850, Віцебск — 1915). Фізіёлаг, педагог. Нарадзіўся ў купецкай сям'і. У 1866 г. скончыў Віцебскую Аляксандраўскую гімназію, адначасова вучыўся ў каморніцка-таксатарскіх класах пры гімназіі, дзе разам з атэстатам атрымаў званне каморніка-таксатара. У 1867 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Маскоўскага універсітэта, адкуль быў выключаны ў сакавіку 1868 г. за ўдзел у хваляваннях і накіраваны ў Віцебск пад нагляд паліцыі. У кастрычніку 1868 г. паступіў на той жа факультэт Пецярбургскага універсітэта, які скончыў у 1871 г., і быў пакінуты пры кафедры для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. Але праз год, расчараваўшыся ў абранай спецыяльнасці, пакінуў універсітэт і паступіў у Пецярбургскую медыка-хірургічную акадэмію. У 1875 г. скончыў акадэмію і быў залічаны на ваенна-медыцынскую службу. Пасля паспяховай абароны доктарскай дысертацыі атрымаў стыпендыю Вільє і права на замеж-

П.В.Шэйн.

ную камандзіроўку для ўдасканальвання ведаў. У 1867—79 гг. працаваў у лепшых лабараторыях і клініках Германіі, Францыі, Англіі і Аўстрыі. У 1880 г. стаў прафесарам Мікалаеўскага ваеннага шпіталя ў Пецярбургу, праз год быў абраны прыват-дацэнтам кафедры фізіялогіі жывёл. У 1884 г. пераехаў у Кіеў, дзе працаваў прафесарам ва універсітэце на кафедры фізіялогіі чалавека. Аўтар навуковых прац па медыцыне, выступаў з прапановамі рэфармавання вышэйшай і сярэдняй адукацыі ў Расіі. Шмат зрабіў для падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў на Украіне. Памёр у Кіеве.

ШАПЯЛЕВІЧ Радзіслаў Іасафатавіч (1800 — май 1846). Паэт, педагог. Нарадзіўся ў Магілёўскай губ. У 1820 г. скончыў Полацкую езуіцкую акадэмію. Служыў у Пецярбургу. У 1828—30 гг. займаўся разборам фонду бібліятэкі Полацкай езуіцкай акадэміі. У 1830—34 гг. выкладаў лацінскую мову ў Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі, адкуль быў звольнены за ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1830—33 гг. Пісаў вершы на польскай і рускай мовах, якія друкаваліся ў часопісе «Вестник Европы», альманаху «Niezabudka» («Незабудка»). Аўтар паэмы «Псіхея» (1843). Р.Шапялевіч — дзед вядомага гісторыка літаратуры і археолага Л.Ю.Лазарэвіча-Шапялевіча.

ШЭЙН Павел Васілевіч [1826, Магілёў — 14(27).8.1900]. Беларускі і рускі этнограф і фальклярыст. Вучыўся ў нямецкім вучылішчы пры лютэранскай царкве св. Міхаіла ў Маскве. З 1851 г. працаваў выкладчыкам у розных павятовых вучылішчах і гімназіях Тулы, Віцебска (1865—73 выкладаў нямецкую мову ў Віцебскай Аляксандраўскай гімназіі), Калугі і іншых гарадоў. З 1881 г. жыў у Пецярбургу. Збіральніцкую дзейнасць пачаў у сярэдзіне 1850-х гадоў. У 1867 г. пад уплывам міфалагічнай школы напісаў і выдаў у Віцебску «Праграму для збірання помнікаў народнай творчасці — адну з першых спецыяльных фальклорных праграм у Расіі — і разаслаў яе па Беларусі. Меў шырокую сетку карэспандэнтаў, сярод якіх былі А.Я.Багдановіч, Я.Ф.Карскі, Ю.Ф.Крачкоўскі, Я.Лучына, М.Я.Нікіфароўскі, З.Ф.Радчанка і інш. Найбольш поўны беларускі матэрыял прадстаўлены ў кнізе «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (т. 1—3, 1887—1902). У кнізе змешчаны апісанні каляндарных і сямейных абрадаў, звесткі пра матэрыяльную культуру беларусаў (жыллё, адзенне, ежу, заняткі), песні, казкі, легенды, паданні і інш. Складальнік зборнікаў «Рускія народныя песні» (1870), «Беларускія народныя песні...» (1874), «Велікарус у сваіх песнях, абрадах, звычаях, вераваннях, казках, легендах і да т.п.» (т. 1, вып. 1—2, 1898—1902) і інш. Архіў Шэйна зберагаецца ў архіве Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Віцебск у час 1-й сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года

У 1913 г. ў Віцебску было 109 тыс. жыхароў. Горад стаў адным з найбуйнейшых прамысловых цэнтраў: дзейнічала 45 фабрык і заводаў, на 6 з іх было занята па 100 і больш чалавек, на льнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» — 1,2 тыс. рабочых (да канца 1914 — 1,7 тыс.). Усяго ў прамысловасці горада працавала каля 8 тыс. чалавек, з іх 40% у тэкстыльнай і каля 20% у металаапрацоўчай галінах. Нягледзячы на жорсткае падаўленне рэвалюцыі 1905—07 гг., барацьба працоўных не спынялася. У студзені—лютым 1914 г. адбыліся забастоўкі на шчаціннай фабрыцы і заводах сельгасінвентару.

З пачаткам 1-й сусветнай вайны Віцебская губерня была аб'яўлена на ваенным становішчы, з восені 1915 г. Віцебск стаў прыфрантавым горадам, куды перамясціўся штаб Дзвінскай ваеннай акругі, ваенныя ўстановы, шпіталі. Гарнізон у 1916 г. налічваў да 40 тыс. чалавек. Эканоміка пераводзілася на выпуск ваеннай прадукцыі, ствараліся новыя прадпрыемствы і майстэрні для абслугоўвання патрэб фронту. Вайна дала падставы ўладам узмацніць рэпрэсіі: прафсаюзы і іншыя грамадскія арганізацыі былі забаронены, а члены і ўдзельнікі іх арыштоўваліся. Тым не менш, у 1916 г. па Віцебску пракацілася хваля забастовак, у якіх прымала ўдзел да 300 чалавек адначасова. Колькасць рабочых на прадпрыемствах у сакавіку 1917 г. дасягнула 18 тыс. чалавек. З 1916 г. ў Віцебску асела шмат бежанцаў з акупіраваных германскімі войскамі раёнаў Прыбалтыкі. У лютым—ліпені 1917 г. ў горадзе дзейнічала Віцебская латышская раённая арганізацыя РСДРП.

Пра звяржэнне царызму і адрачэнне імператара Мікалая II ад прастола ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. ў горадзе стала вядома ў пачатку сакавіка. Палітычнае жыццё актывізавалася. Каля 20 партый і рухаў уключылася ў барацьбу за ўладу і ўплыў на насельніцтва горада і губерні. Былі сфарміраваны мясцовыя органы Часовага ўрада, Віцебскі грамадскі камітэт, які актыўна падтрымлівалі дзеячы земскага і гарадскога самакіравання. На правым флангу палітычнага жыцця вылучалася Партыя народнай свабоды (кадэты), якая падтрымлівала стварэнне Віцебскага гарадскога грамадскага камітэта. Разам з кадэтамі дзейнічалі Беларускі народны саюз і Клуб рэспубліканцаў, арганізаваны М.Н.Гніларыбавым. Аднак найбольшы ўплыў на насельніцтва горада і губерні мелі Віцебская аб'яднаная арганізацыя РСДРП, эсэры, яўрэйская сацыялістычная рабочая партыя (ЯСРП), Бунд, Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ), Працоўная народна-сацыялістычная партыя («трудавікі»), Польская сацыялістычная партыя (ППС) і інш.

У Віцебску ініцыятыва стварэння Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў зыходзіла ад нарады членаў розных сацыялістычных партый, якая адбылася 3(16).3.1917 г. Першым узнік Савет салдацкіх дэпутатаў, які быў выбраны 5 сакавіка на сходзе прадстаўнікоў

усіх часцей гарнізона. Яго старшынёй стаў меншавік Я.Тарле. 8(21) сакавіка на ўстаноўчым сходзе прадстаўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў горада (300 дэпутатаў) быў абраны Віцебскі Савет рабочых дэпутатаў (старшыня бундавец І.Арансон). На першым пасяджэнні Савета, якое адбылося ў той жа дзень, Выканком Савета ў адозве «Да ўсіх рабочых гор. Віцебска» паставіў задачу стварэння рабочай міліцыі з мэтай барацьбы супраць контррэвалюцыі і пагромаў. Найбольш пільнай і неадкладнай прызнавалася харчовая праблема. У сувязі з гэтым Савет запатрабаваў ад гарадскога грамадскага камітэта ўзяць на сябе закупку мукі для насельніцтва, выявіць наяўныя запасы прадуктаў і арганізаваць іх правільнае размеркаванне, забяспечыць рабочыя сем'і хлебам. 12 сакавіка Выканком звярнуўся да Віцебскага Савета салдацкіх дэпутатаў з прапановай стварыць аб'яднаны Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў [які быў створаны 20 сакавіка (2 красавіка)]. Савет у Віцебску, як і Саветы ва ўсіх беларускіх губернях, прызнаваў кіруючую ролю Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў: выконваў яго пастановы, якія мелі агульнарасійскае значэнне. Разам з тым ён, па прыкладу Петраградскага Савета, прызнаваў Часовы ўрад і яго органы на месцах — пры ўмове адпаведнасці іх дзейнасці інтарэсам народа.

6.3.1917 г. Часовы ўрад перадаў уладу ў губернях і паветах сваім камісарам, якія назначаліся з ліку старшыняў губернскіх і павятовых земскіх управаў. Да губернскіх камісараў пераходзілі функцыі губернатараў. Акрамя паліцыі, жандармерыі і пракуратуры ўсе астатнія мясцовыя органы захоўваліся і павінны былі дзейнічаць пад кіраўніцтвам камісараў. Ім падпарадкоўвалася міліцыя, ім жа даручаўся нагляд за законнасцю дзейнасці ўсіх устаноў і чыноўнікаў.

З першых жа дзён рэвалюцыі пачалі актыўна ўтварацца прафесійныя саюзы, як і ва ўсіх буйных гарадах Беларусі. Рабочымі выстаўляліся патрабаванні аб паляпшэнні свайго становішча, скарачэнні рабочага дня, павелічэнні зарплаты і інш. Уласнікі прадпрыемстваў ва ўмовах рэвалюцыі звычайна задавальнялі патрабаванні сходаў рабочых. Аднак дзе-нідзе аказвалася супраціўленне, і тады рабочыя аб'яўлялі стачку. Пытанні аб працягласці рабочага дня, заработнай плаце і інш. разглядаліся на пасяджэннях Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Вядома, на іх імкнуліся прымаць рашэнні на карысць рабочых, але ў межах рэальных магчымасцей і на аснове ўзаемных пагадненняў бакоў. Стыхія забастовак, задавальненне патрабаванняў явачным парадкам не заахвочвалася Саветам. Выказаўшыся за 8-гадзінны рабочы дзень без памяншэння зарплаты, Савет разам з тым цвёрда выказаўся супраць самавольнага скарачэння рабочага часу. Дапускаў ён і магчымасць звышурочных работ — з павышэннем аплаты і са згоды прафсаюзаў, а таксама лічыў іх абавязковымі, калі гаворка ішла пра абарону краіны. Рабочыя, сялянскія і салдацкія масы вясною 1917 г. ішлі за дэмакратычнымі, сацыялістычнымі партыямі, якія праяўлялі пэўную абачлівасць у вырашэнні важнейшых пытанняў — аб міры і вайне, харчовага, аграрнага, нацыянальнага, рабочага, звязваючы іх са скліканнем усерасійскага Устаноўчага сходу. 27 жніўня (9 верасня) на выбарах у гарадскую думу перамог сацыялістычны блок [РСДРП, Бунд, «Трудавікі», Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў)].

Аднак бальшавікі-ленінцы ўжо ў красавіку 1917 г. ўзялі курс на сацыялістычную рэвалюцыю. Яны выкарыстоўвалі палітыку буржуазнага Часовага ўрада і тагачасных Саветаў, узначальваемых эсэрамі і меншавікамі, хуткае паглыбленне сацыяльна-эканамічнага крызісу і гаспадарчай разрухі, ваенныя паражэнні і рост незадаволенасці мас. Адзначаныя ўмовы, нізкі культурны ўзровень шырокіх мас, пазбаўленых вопыту дзейнасці ва ўмовах дэмакратычнага ладу, дазволілі бальшавікам праз некалькі месяцаў павесці гэтыя масы на заваяванне ўлады.

На развіццё сітуацыі ў Беларусі ўплывалі спецыфічныя ўмовы, створаныя 1-й сусветнай вайной. Беларусь была падзелена лініяй фронту на заходнюю і ўсходнюю часткі. Гаспадарчыя, культурныя і іншыя сувязі паміж імі былі перарваныя. У раёнах усходняй Беларусі (у т.л. і ў Віцебску), якая стала прыфрантавой зонай, не было ніякіх умоў для гаспадарчай дзейнасці. Працавалі толькі тыя галіны прамысловасці, якія абслугоўвалі патрэбы фронту. Сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад. Мабілізацыя на вайну значнай часткі працаздольнага мужчынскага насельніцтва абумовіла катастрафічны недахоп працоўнай сілы. Насельніцтва прыфрантавой паласы шырока прыцягвалася на разнастайныя работы для фронту. Вайна паставіла працоўных у гранічна цяжкія ўмовы жыцця, выклікала высокі ўзровень палітызацыі насельніц-

тва. Імкненне да міру стала вызначальнай рысай людскога настрою, абумовіла ўзнікненне антываеннага руху.

Аднак Часовы ўрад абвясціў працяг вайны да пераможнага канца. Між тым эканамічнае становішча пагаршалася з дня ў дзень, што ў першую чаргу біла па працоўных. Мацнела расчараванне ў рэвалюцыі, што адбылася, адначасова ўзрастала сацыяльнае напружанне, настрой на новыя рэвалюцыйныя дзеянні. Пачалася пэўная палярызацыя палітычных сіл. Ліберальны лагер выступаў за ўмацаванне ўраду і працяг вайны, адцягваючы рэформы да склікання Устаноўчага сходу. Памяркоўныя сацыялісты імкнуліся да неадкладных рэформ і дамагаліся міру шляхам перамоў. На левым флангу палітычнага спектра апынуліся бальшавікі, адзіныя, хто выступаў за неадкладнае спыненне вайны і перадачу ўлады Саветам. У той час, калі Часовы ўрад ліхаманіла ад крызісаў, правыя сілы пачалі схіляцца да ідэі моцнай улады, да згортвання свабод, да дыктатуры. Натхняльнікамі такога павароту стала пэўная частка кадэтаў, але асноўную ролю ўзяў на сябе генералітэт пры маўклівай падтрымцы Сената, Сінода, Дзяржаўнага савета і 4-й Дзяржаўнай думы і самога Часовага ўрада.

Гэтыя захады выклікалі кансалідацыю сіл у рэвалюцыйным лагеры. Істотна ўзрасла колькасць бальшавікоў у складзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Бальшавіцкія лозунгі, якія патрабавалі міру неадкладна, карысталіся ўсё большай папулярнасцю.

Чэрвеньская дэманстрацыя ў Петраградзе, задуманая эсэрамі і меншавікамі як акцыя ў падтрымку з'езда Саветаў, вылілася ў магутнае выступленне супраць ураду і працягу вайны. Пасля таго, як сіламі юнкераў і казакаў дэманстрацыя была разагнана (пры гэтым загінула 56 чалавек і 650 было паранена), шматлікія дэманстрацыі пракаціліся па ўсёй краіне. Нягледзячы на арышты і рэпрэсіі, на выбарах у гарадскія думы, у т.л. і ў Віцебску, правыя партыі страцілі большую частку сваіх былых выбаршчыкаў, бальшавікі, наадварот, умацавалі свае пазіцыі. Усталяванне ваеннай дыктатуры заглохла на паўдарозе. Але ў канцы жніўня пры маўклівай згодзе Часовага ўрада на Петраград рушылі войскі генерала Карнілава. Аднак разлік мяцежнікаў на шырокую падтрымку з боку большасці воінскіх часцей пры абыякавасці народных мас не апраўдаўся. Сацыялістычныя кіраўнікі лепш ведалі настрой салдат і рабочых на адпор любым спробам усталявання ваеннай дыктатуры. Віцебскі Савет стварыў ваеннае бюро, пад кіраўніцтвам якога былі арганізаваны з рабочых і салдат заградатрады на чыгунцы і шасэйных дарогах, узяты пад кантроль установы горада, гарнізон. На станцыі Віцебск былі затрыманы выкліканыя Карнілавым эшалоны з тэкінцамі і драгунцамі, якія былі сагітаваны і перайшлі на бок рэвалюцыйных войск. Ініцыятыву ў актыўнай барацьбе з карнілаўшчынай узялі на сябе бальшавікі, што прызнавалі і лідэры правых фракцый меншавікоў і эсэраў, якія складалі большасць у Савеце і ў бюро. Пасля ліквідацыі мяцяжу папулярнасць як урада, так і партый, якія яго падтрымлівалі, упала яшчэ больш. Адмовіўшыся падтрымліваць Часовы ўрад, яшчэ 2(15) ліпеня бальшавікі выйшлі з Віцебскага аб'яднанага камітэта РСДРП і стварылі гарадскі партыйны камітэт РСДРП(б) у складзе 9 чалавек. 1—3(14—16) кастрычніка ў Віцебску прайшла іх 1-я губернская партканферэнцыя. Віцебскія бальшавікі былі настроены рашуча і рыхтаваліся да захопу ўлады. Да Кастрычніцкага пераваротy заставаліся лічаныя дні.

Дакументы сведчаць

ВІЦЕБСК У 1916 годзе

Общественная жизнь Витебска в 1916 г. прошла, как и в прежние годы, серо и буднично. В течение целого года необычайного развития экономической жизни не было ни одного яркого момента. Бездумная спекуляция и жажда наживы овладели всем городом, отодвинули на задний план всякие «идеи», загнав обывателя в тесную скорлупу личной жизни...

В конце 1915 и начале 1916 г. в Витебске наметился продовольственный кризис. В 1916 г. в Витебске введена была карточная система на сахар и пшеничную муку. В конце года Витебск переживал мучной кризис. Тяжелый дровяной кризис (разбирали заборы и могильные кресты для топлива — сильные холода).

В 1916 г. в Витебске функционировало 2 театра и 4 кинематографа, не считая 2 летних садов, а в конце года открылся пятый кинематограф. Обилие денег у населения сделало для него доступным всевозможного рода развлечения. В течение истекшего года населением израсходовано на посещение театров и кинематографов до 1 млн. руб.

Широко развивалось в Витебске в 1916 г. тайное винокурение и продажа спирта, самогонки и ханжи. Пьянство приняло такие грандиозные размеры, что в конце года бывший витебский генерал-губернатор Н.П.Галахов вынужден был обратиться с воззванием к населению, призывая его к борьбе с этим злым недугом, принявшим характер народного бедствия... Спирт доставлялся целыми вагонами.

Наряду с пьянством широко развился в Витебске азарт: играли в номерах гостиниц, в частных домах, играли дни и ночи напролет.

Проституция свила себе прочное гнездо в Витебске. В течение лета сюда прибывали целыми партиями «гастролерши», так что военные власти вынуждены были прибегнуть к массовой высылке «этих дам».

Ряд дерзких разгромов магазинов, лавок и частных квартир.

«Зеленый змий» снова становится властителем жизни.

Витебский листок. 1917. 1 января.

ЗВАРОТ НАЧАЛЬНІКА ДЗВІНСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ ДА НАСЕЛЬНІЦТВА

5 сакавіка 1917 г.

Граждане округа!

Переход к новому строю свершился. Согласно указания главнокомандующего, признав Временное правительство и подчинившись ему вместе со всеми офицерами и солдатами войск округа, я обращаюсь к населению края.

Граждане! Для правильного перехода к новому порядку, для того, чтобы голос народа мог надлежащим образом выразиться в будущем учредительном собрании, для того чтобы все классы населения без различья сословий, вероисповедания и национальности были бы правильно организованы, для того, чтобы беспрепятственно протекала мирная жизнь страны и для того, чтобы война с упорным врагом была бы доведена до победоносного конца на благо Родины — прежде всего необходимо соблюдение порядка.

Теперь нет более внутри страны двух борющихся сторон. Армия служит единому делу вместе со всем остальным населением, для осуществления своих прямых целей она должна оставаться единой, цельной и дисциплинированной. Поэтому никакие попытки и призывы к нарушению внутреннего порядка в армии, а тем более к откалыванию от нее каких-либо частей не должны быть с вашей стороны допускаемы. Правильное участие офицеров и солдат в общественных организациях, указанные законами, происходит и будет происходить, но никакого беспорядка в войсках допущено быть не может.

Продовольственное дело находится в руках избранных вами органов, которым мною будет оказываема всевозможная помощь и поддержка в мере моих сил.

Вам принадлежит право организации милиции, причем, в согласии с постановлениями избранных вами органов и для беспрепятственного перехода к новому порядку, разоружаемая ныне по моему приказанию полиция будет служить лишь временно до сдачи своих обязанностей милиции. Верю, что никаких насилий над личностью и собственностью вами не будет допущено. Если же найдутся лица, которые из личных интересов или по другим соображениям посягнут на неприкосновенность личности и собственность граждан, то я беру на себя обязанность решительным образом прекращать всякие беспорядки и грабежи, на что имею приказ Главнокомандующего и указания Временного правительства.

Подлинное подписал:

Главный начальник Двинского Военного округа

генерал от инфантерии Зуев

Витебские губернские ведомости. 1917. 22 марта.

ЗВАРОТ ВЫКАНКОМА ВІЦЕБСКАГА САВЕТА РАБОЧЫХ ДЭПУТАТАЎ ДА РАБОЧЫХ ВІЦЕБСКА З ПАВЕДАМЛЕННЕМ АБ СТВАРЭННІ І ЗАДАЧАХ САВЕТА І ЗАКЛІКАМ ДА АБ'ЯДНАННЯ ВАКОЛ ЯГО

8 сакавіка 1917 г.

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

Ко всем рабочим гор. Витебска

Товарищи! 8 марта возник в Витебске Совет рабочих депутатов. Свыше 8 тыс. товарищей рабочих приняли участие в выборах депутатов. Все фабрики и заводы, ремесленный пролетариат по своим профессиям, торгово-промышленные служащие послали своих депутатов. Товарищи железнодорожники, в первый же момент присоединяйтесь к объединенной организации рабочего класса в гор. Витебске...

На долю Совета рабочих депутатов выпадают особые самостоятельные задачи как представителя объединенного рабочего класса. Не только для охраны личности и имущества от покушений, но во имя создания боевых дружин революции Совет рабочих депутатов примет на себя долг по организации участия рабочих в народной милиции. Необходимо создать специально рабочую милицию, которая в нужный момент для отражения контрреволюции, для борьбы с погромами могла бы встать рука об руку с товарищами солдатами.

Продовольственная разруха, это тяжкое наследие, оставленное нам царской властью, должна быть прекращена, ибо обеспечение хлебом трудящихся является неотложным и самым важным требованием дня. Совет рабочих депутатов требует, чтобы «городской общественный комитет» взял на себя закупку муки для населения, чтобы для правильного распределения продуктов были избраны попечительства из представителей всех слоев населения, чтобы был произведен учет всех наличных запасов, открыты общественные лавки и хлебопекарни, уничтожены очереди и хвосты, чтобы рабочая семья была обеспечена дешевым хлебом. Совет рабочих депутатов призывает товарищей принять энергичное участие во всей работе по урегулированию продовольственного вопроса.

Ближайшей задачей Совета рабочих депутатов будет организация классовой борьбы рабочих на почве повседневной экономической нужды. Вопрос о введении 8-часового рабочего дня на предприятиях гор. Витебска, регулирование возникающих экономических конфликтов, организация рабочих в тех предприятиях и профессиях, которые еще не организованы, наконец, вопросы борьбы с безработицей — вот те ближайшие задачи экономической борьбы, которые стоят перед Советом рабочих депутатов. Исполнительный комитет уже приступил к выработке проекта примирительных камер[1], к учреждению профессиональных союзов и бирж труда. Исполнительный комитет призывает всех товарищей объединиться вокруг Совета рабочих депутатов и дружно вести борьбу за классовые, политические и экономические интересы пролетариата.

Товарищи! Совет рабочих депутатов горячо верит, что усилиями армии и пролетариата Великая российская революция окончательно победит и установит прочные основы гражданской свободы России...

В Витебске Совет депутатов переизбран. Старому Совету предложено сдать дела и разойтись. Организован Военно-революционный комитет. Сделано распоряжение о перевыборах всех Советов Витебской губ. Назначен на 2 декаб[ря] губ[ернский] съезд для правильного и планомерного проведения в жизнь постановления II съезда. Декрет по Режицкому у. осуществлен. Земля, живой и мертвый инвентарь взяты на учет волостным комитетом.

Председатель комитета Солонко

Звезда. 1917. 1 декабря.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 347.

РЭЗАЛЮЦЫЯ КАМІТЭТА 360-й ВІЦЕБСКАЙ ДРУЖЫНЫ СУПРАЦЬ СПРОБАЎ ФАРМІРАВАННЯ ВОЙСКАЎ БЕЛАРУСКАЙ РАДЫ

6 снежня 1917 г.

Дружинный комитет 360-й пеш[ей] Витебской дружины в полном составе 6 декабря, выслушав доклад об организации национальных войск, в частности Белорусской радой, постановил: протестовать против хитрых приспособлений буржуазной прессы помещиков, которые стремятся парализовать революционную демократию при посредстве искусственного дробления на мелкие национальные войска. Подобным раздроблением демократии буржуазия укрепляет свой классовый буржуазный фронт. Мы, представители данной войсковой части, в преобладающем количестве белорусы Витебской губ., не видя чистых идей, а лишь искажение единого фронта, мы, сыновья крестьянства, солдат и рабочих, призываем товарищей и братьев белорусов не увлекаться иллюзиями по отношению отдельных организаций, как рада, легионы и т.д.

Подразумевая основные правила самоопределения, мы имеем волостные органы, земельные комитеты и Советы Народных Комиссаров во всем государственном масштабе. В лице народных комиссаров мы, белорусы, видим единое средство избавления от зла.

Советская правда. 1917. 10 декабря.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 390.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ВІЦЕБСКІМ ГУБЕРНСКІМ З'ЕЗДЗЕ САВЕТАЎ

Сегодня, 10 декабря, назначен губернский съезд крестьянских, солдатских, рабочих и батрацких депутатов Витебской губ. Открытие съезда назначено в здании окружного суда, но в случае его многолюдности место заседания будет перенесено в здание городского театра. До 6 час. вечера 9 декабря зарегистрировано около 100 уже прибывших на съезд членов.

Прибывающие на съезд направляются в Витебский Революционный Совет (бывший губернаторский дом), где получают все необходимые справки. Время открытия будет определено самими делегатами при участии Витебского Рев[олюционного] Совета.

Повестка заседания:

1. Текущий момент.
2. Земельный вопрос.
3. Продовольственный вопрос.
4. Местная организация самоуправления.
5. Демобилизация армии и стоящие в связи с этим вопросы о пенсиях, пайках и пр.
6. О народном просвещении.
7. Об организации суда и революционного трибунала.
8. Организация общегубернского съезда и его исполнительного органа.
10. О демократизации армии.
11. Разные вопросы и текущие дела.

Известия Витебского Совета. 1917. 10 декабря.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 482.

ПАСТАНОВА ВЫКАНКОМА ВІЦЕБСКАГА САВЕТА «АБ ПРЫВЯДЗЕННІ Ў ВЫКАНАННЕ Ў Г. ВІЦЕБСКУ ДЭКРЭТА САВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ АБ АДМЕНЕ ПРЫВАТНАЙ УЛАСНАСЦІ НА ГАРАДСКУЮ НЕРУХОМУЮ МАЁМАСЦЬ»

1. С 1 декабря 1917 г. отменяется право частной собственности на все без исключения земельные участки, как застроенные, так и незастроенные, находящиеся в пределах витебской городской черты.

Примечание. Городская черта определяется в пределах селитебной площади, установленной для взимания государственного налога с городских недвижимостей.

2. С того же времени отменяется право частной собственности на строения в пределах витебской городской черты, стоимость которых вместе с находящейся под ними землей превышает 12 000 руб., и на все те строения, которые служат предметом постоянной сдачи внаем, не принимая во внимание их стоимости.

Примечание. Действие настоящего постановления не распространяется на строения, являющиеся необходимой принадлежностью промышленных предприятий всякого рода.

3. Строения, которые не сдавались постоянно внаем, и стоимость которых вместе с находящейся под ними землей не превышает 12 000 руб., могут передаваться по наследству лишь в пределах родства первых двух степеней по прямой линии.

4. За бывшими собственниками городских недвижимостей оставляется право пользования занимаемыми ими в их домах квартирами на следующих основаниях:

а) в тех случаях, когда чистая доходность занимаемых ими квартир оценена для залога на городские недвижимости в 1916 г. не свыше 600 руб. в год, бывший собственник пользуется квартирой безвозмездно;

б) если же доходность превышает 600 руб. в год, то бывший собственник уплачивает за занимаемую квартиру плату в размере излишка чистой доходности сверх 600 руб.;

в) бывший собственник обязан одновременно нести издержки по содержанию дома на одинаковых основаниях с другими квартиронанимателями. Бывший собственник имеет право занимать для каждого члена своей семьи не более 1 комнаты.

Примечание. В случае противодействия бывшего владельца недвижимости проведению сего постановления, он лишается права, предоставленного настоящей статьей.

5. Право, предоставляемое бывшим собственникам недвижимостей, согласно предыдущей статье, может ими передаваться лишь в пределах первых двух степеней родства по прямой линии.

6. Все городские земли и строения, которые соответственно сему обязательному постановлению изъемлются из частной собственности, объявляются достоянием всего народа и переходят в ведение Совета.

7. Во исполнение вышеизложенных пунктов настоящего постановления Исполнительный комитет Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов предписывает к неуклонному исполнению нижеследующее:

а) съемщикам земли, квартир и всякого рода помещений в пределах витебской городской черты с 1 декабря с.г. наемную плату внести не бывшим владельцам городских недвижимостей и строений, а в отделение Государственного банка (Замковая ул.) и в губернское казначейство (Дворцовая ул.);

б) съемщикам, внесшим наемную плату за декабрь месяц владельцам ранее издания настоящего постановления, предлагается о внесенных суммах дать точные сведения в финансово-хозяйственную секцию Совета рабочих и солдатских депутатов (дом губернатора). Владельцам недвижимостей принятую за декабрь месяц наемную плату внести немедленно в упомянутое отделение банка и казначейство;

в) обычным сроком взноса наемной платы на будущее время считается 1-е число каждого месяца;

г) каждый съемщик земли, квартиры и прочих помещений в гор. Витебске обязан не позднее 20 сего декабря доставить в финансово-хозяйственную секцию Витебского Совета солдатских и рабочих депутатов заявление с указанием места нахождения нанимаемой им земли или помещения, имени и фамилии владельца, суммы наемной платы, срока ее взноса и других условий найма. Такое же заявление каждый съемщик обязан вывесить на наружной стороне двери или стены занимаемого им помещения. Кроме того, каждый съемщик обязан по прибытии лица, уполномоченного на то Витебским Советом рабочих и солдатских депутатов, предъявлять квитанцию о взносе наемной платы или давать показание о причине неуплаты таковой;

д) виновные в уплате наемной платы прежним владельцам недвижимостей или неверном показании суммы платы наемной и срока ее взноса подвергаются: 1) тюремному заключению от 7 до 30 дней; 2) лишению права занимать снятое ими помещение и выселению в 3-дневный срок и 3) денежному штрафу в двойном размере невнесенной наемной платы;

е) бывший владелец недвижимостей, виновный в получении наемной платы и в нарушении других пунктов настоящего постановления, кроме выселения из занимаемых им квартир подлежит тюремному заключению сроком до 1 года и конфискации всего прочего имущества.

8. Впредь до организации центрального жилищного городского совета, районных и квартирных жилищных советов для управления отчуждаемыми недвижимостями на бывших владельцев недвижимостей возлагается обязанность управления ими.

9. Все владельцы недвижимостей и строений витебской городской черты обязаны не позже 20 декабря 1917 г. представить в финансово-хозяйственную секцию Витебского Совета рабочих и солдатских депутатов подробные сведения о количестве принадлежавших им земли и строений с указанием, где таковые находятся, какие из строений занимаются самими владельцами и какие сдаются внаем; в заявлениях должны быть указаны стоимость недвижимостей, сумма числящихся на недвижимостях ипотечных долгов к 1 декабря 1917 г. и сумма уплоченных ими в 1916 г. государственных налогов за городские недвижимости, отдельно за недвижимости, отдаваемые внаем, и отдельно [за] занимаемые самими владельцами. К заявлениям этим должны быть приложены окладные листы или другие документы, удостоверяющие сумму уплоченного в 1916 г. государственного налога.

Председатель Совета рабочих и солдатских депутатов Гоба

Секретарь Дризуль

Известия Витебского Революционного Совета. 1917. 12 декабря.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 500–502.

ПРАТАКОЛ № 2 ПАСЯДЖЭННЯ САНІТАРНА-МЕДЫЦЫНСКАЙ СЕКЦЫІ ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА АБ АРГАНІЗАЦЫІ МЕДЫЦЫНСКАГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

20 снежня 1917 г.

1917 г. 20 декабря санитарно-медицинская секция, собравшись с. ч. в числе 4 чел. членов, под председательством тов. К.Шантаренка, секретаря Ф.Шпакова и членов тов. С.Дылан и П.Защеринского для обсуждения вопроса по санитарно-медицинскому ведомству губернии определила:

1) Принять в свое распоряжение все дела и документы медицинского губернского управления.

2) Подчинить все находящиеся штаты служащих Советской власти.

3) Сделать тщательный контроль управления всего имущественного, санитарного и аптечного состояния и медикаментов и принять таковые под контроль.

4) Обратить особое внимание на содержание чистоты во всех местностях губернии.

5) Усилить врачебные пункты в тех местностях губернии, где таковых окажется недостаточно.

6) Пересмотреть штаты служащих всех врачебных учреждений губернии и их содержание.

7) Привлечь всех частных врачей, фельдшеров и акушерок на общественные службы за определенное жалованье.

8) Принять мероприятия и ограничить частных врачей, фельдшеров и акушерок таксой, для контроля же установить квитанционные книги для выдачи квитанций пациентам за визитации и лечения.

9) Превратить в реквизиционном плане в полном объеме все частные аптеки в общегосударственные под наблюдением контроля.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 614—615.

ПАСТАНОВА ЮРЫДЫЧНАЙ СЕКЦЫІ ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА АБ СКАСАВАННІ АКРУЖНОГА СУДА І СТВАРЭННІ ЧАСОВАГА РЭВАЛЮЦЫЙНАГА СУДА

20 снежня 1917 г.

1) Витебский окружной суд, согласно декрету о суде Совета Народных Комиссаров, упраздняется.

2) Все дела суда передаются в юридическую секцию губернского Совета.

3) Юридическая секция впредь до разрешения губернским Советом вопроса об организации судов составляет Временный революционный суд в следующем составе: 2 члена от революционного трибунала местного Совета и 1 от юридической секции губернского Совета.

Примечание. Революционный трибунал и юридическая секция имеют право делегировать в состав суда и лиц, не являющихся членами рев[олюционного] триб[унала] и юрид[ической] секции.

4) Временный революционный суд должен быть сконструирован до 22 декабря с.г. и немедленно приступить к своим работам.

5) Всем служащим и служителям упраздняемого окружного суда предписывается оставаться на своих местах и под общим руководством юридической секции исполнять все необходимые работы для окончания неоконченных дел, а также давать заинтересованным лицам справки о положении дел.

6) Всякие ассигновки без юридической секции недопустимы.

7) С 21 сего декабря юридическая секция приступает к своим работам и помещается в гражданском отделении суда (комната дежурного члена суда).

8) Всем служащим вменяется в обязанность по всем срочным и текущим делам обращаться за соответствующими распоряжениями в означенную секцию.

9) Уклонение от своих прямых обязанностей будет рассматриваться как непризнание Советской власти, и эти лица будут подвергнуты суду революционного трибунала по всей строгости революционного закона.

Юридическая секция

Известия Витебского Революционного Совета. 1917. 21 декабря.

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 612—613.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА ВЦВК АБ СТРУКТУРЫ І ДЗЕЙНАСЦІ САВЕТА

30 снежня 1917 г.

Витебский губернский Совет крестьянских, рабочих, солдатских и батрацких депутатов доводит до сведения Центрального Всероссийского Исполнительного Комитета, что Чрезвычайным губернским съездом Советов крестьянских, рабочих, солдатских и батрацких депутатов всей Витебской губ., состоявшимся с 11 по 16 декабря с.г., для управления Витебской

губ. был избран исполнительный губернский орган Советской власти под названием: «Витебский губернский Совет крестьянских, рабочих, солдатских и батрацких депутатов» в числе 65 чел.

Совет состоит из президиума в числе 9 членов и 11 секций: 1) земледелия и народных имуществ; 2) труда и промышленности; 3) народного просвещения; 4) финансов; 5) по военным делам; 6) по внутренним делам самоуправления; 7) юстиции; 8) продовольствия; 9) почты и путей сообщения; 10) народного призрения и 11) санитарно-медицинской.

В секции, из числа членов Совета, смотря по важности дела и способности лиц, вошли от 3 до 8 чел.

Президиум Совета, являясь центром управления губернией, принял на себя функции губернского комиссара, секции же становятся во главе отделов губернских учреждений, придерживаясь организации центральных комиссариатов Крестьянского и Рабочего Правительства.

В данное время происходит переход губернских учреждений в ведение президиума Совета и секций. Продовольственное дело перешло в ведение продовольственной секции; окружные суды как гражданский, так и военный, упраздняются и дела переходят в ведение секции юстиции. Остальные отрасли переходят постепенно.

Настроение народа вполне определенное. Крестьяне, рабочие и батраки признают единственной властью — власть Советов и народных комиссаров центрального правительства.

Губернский съезд постановил упразднить все земские учреждения. Замечается течение в пользу упразднения городских дум с тем, чтобы ведение городского хозяйства перешло в руки местных Советов рабочих и солдатских депутатов и жилищных Советов. Декреты о земле и об упразднении частной городской собственности проводятся в жизнь. Совету крайне желательно получить директивы и указания Центрального Исполнительного Комитета относительно упразднения бывших выборных учреждений, т.е. земских и городских управ.

Об учреждении губернского Совета одновременно доводится до сведения Совета Народных Комиссаров и Областного исполнительного комитета Северной обл. Уездные Советы реорганизуются.

Председатель Совета [подпись неразборчива]

Секретарь Ф.Паулус

Друкуецца па кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. Т. 2. Мн., 1957. С. 650–651.

Удзельнікі рэвалюцыйных падзей у Віцебску

ВАСТРАЦОЎ Сцяпан Сяргеевіч. Савецкі ваенны дзеяч, герой грамадзянскай вайны. Нарадзіўся 17(29).12.1883 г. ў с. Казанцава Бірскага павета Уфімскай губерні (цяпер с. Вастрацова Бураеўскага раёна, Башкортастан), у сялянскай сям'і. Працаваў памочнікам каваля ў чыгуначных майстэрнях. З 1906 г. ў арміі. За рэвалюцыйную агітацыю сярод салдат у 1909 г. быў асуджаны на 3 гады турмы. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. Тройчы паранены, двойчы трапіў пад газавую атаку. Узнагароджаны 3 георгіеўскімі крыжамі, 2 медалямі, з фронта вярнуўся прапаршчыкам. У Кастрычніцкую рэвалюцыю прыняў бок савецкай улады, пасля Брэсцкага міру вярнуўся дамоў, працаваў кавалём, быў абраны ў сельскі Савет. Быў арыштаваны белагвардзейцамі, але ўцёк з турмы, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. У далейшым — камандзір 242-га Волжскага палка 27-й Омскай дывізіі, удзельнік баёў на Усходнім і Заходнім франтах, вызначыўся пры вызваленні Уфы, Чалябінска, Омска, Нованікалаеўска, потым Смалявіч, Мінска, Баранавіч, Ваўкавыска, Слоніма. У 1921 г. ўзначальваў управленне войск ВЧК па ахове граніц Сібіры, у 1922 г. камандаваў групай войск пры вызваленні Прымор'я, удзельнічаў у штурме Спаска, у 1923 г. кіраваў экспедыцыяй па ліквідацыі войск Ахоцка-Аянскай групы генерала Пепеляева. Скончыў Ваенна-акадэмічныя курсы вышэйшага каманднага саставу РСЧА (1924). Камандзір 17-й стралковай дывізіі (1924–28), потым 9-га стралковага корпуса, якія дыслацыраваліся ў Віцебску. Член ЦВК БССР (1927–29). У далейшым быў прызначаны камандзірам 18-га стралковага корпуса, удзельнічаў у ліквідацыі ўзброенага канфлікту на Кітайска-Усходняй чыгунцы (КВЖД, 1929). Адзін з першых кавалераў 4 ордэнаў

Чырвонага Сцяга, быў узнагароджаны ганаровай рэвалюцыйнай зброяй (1930). Памёр 5.5.1932 г. Адна з вуліц Віцебска носіць яго імя.

ЕЎСЦІГНЕЕЎ Міхаіл Аляксандравіч. Савецкі партыйны і гаспадарчы дзеяч. Нарадзіўся 17.9.1895 г. ў Новаторжокскім павеце Цвярской губерні ў беднай сялянскай сям'і. З 16 гадоў працаваў падручным у слясарнай майстэрні, потым слесарам у порце ў Свеаборгу, ужо тут далучыўся да рэвалюцыйнага руху. Пераехаўшы ў Петраград, уладкаваўся на Пуцілаўскі завод, але ў хуткім часе быў звольнены за рэвалюцыйную дзейнасць. Потым працаваў у Колпіне на Іжорскім заводзе, тут у 1915 г. ўступіў у РСДРП. 8.2.1917 г. быў арыштаваны разам з іншымі ўдзельнікамі забастоўкі рабочых Іжорскага завода, але ў хуткім часе быў вызвалены Лютаўскай рэвалюцыяй і адразу ж актыўна акунуўся ў палітычнае жыццё. У сваей аўтабіяграфіі ён пісаў пра гэтыя дні: «Да Кастрычніцкай рэвалюцыі я працаваў у асноўным у прафесійных саюзах, быў членам Петраградскага Савета, саюза металістаў, членам Цэнтральнага праўлення рэвізійнай камісіі. Прымаў удзел у Кастрычніцкім перавароце, пасля перавароту быў агітатарам пры Петраградскім камітэце». У канцы лістапада 1917 г. прыехаў у Віцебск, быў агітатарам у сельскай мясцовасці, пасля акупацыі кайзераўскімі войскамі часткі Віцебшчыны стаў адным з арганізатараў партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі. На 1-м губернскім з'ездзе Саветаў у снежні 1917 г. ўзначаліў рабочую секцыю і ад яе быў абраны членам губернскага Выканаўчага камітэта. Асабліва вялікія яго заслугі ў арганізацыі народнай гаспадаркі. Да справы, абсалютна новай, не вельмі знаёмай, паставіўся з усёй адказнасцю, стаў арганізатарам і першым старшынёй губернскага Савета народнай гаспадаркі, старшынёй губернскага Савета фабрычна-заводскіх камітэтаў. Пры яго актыўным удзеле ў Віцебску адбылося аб'яднанне асобных дробных прадпрыемстваў гарбарнай прамысловасці ў гарбарны трэст. У 1919 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт, змагаўся з войскамі генерала Мамантава, калі тыя набліжаліся да Арла і пагражалі Маскве, выконваў абавязкі начальніка забеспячэння войск Паўднёвага фронту. Летам 1920 г. захварэў тыфам і памёр.

За вялікія заслугі ў стварэнні гарбарнай прамысловасці імя М.А.Еўсцігнеева было прысвоена Віцебскаму гарбарнаму заводу, цяпер яго імя носіць утвораны ў 1976 г. на базе завода футравы камбінат і адна з вуліц Віцебска.

М.І.КАЛІНІН У ВІЦЕБСКУ

11—12.6.1919 г. ў Віцебску знаходзіўся агітацыйна-інструктарскі поезд «Кастрычніцкая рэвалюцыя» на чале са старшынёй ЦВК РСФСР М.І.Калініным. Палітычным камісарам поезда быў прадстаўнік ЦК РКП(б) П.Ваяводзін.

Задачы такіх паяздоў прадугледжвалі спалучэнне розных форм палітычна-асветніцкай работы — правядзенне мітынгаў, сходаў і гутарак, прыём і разгляд заяў і скаргаў ад насельніцтва, інструктаж мясцовых работнікаў і аказанне канкрэтнай дапамогі гаспадарчаму і культурнаму будаўніцтву. Дзейнасць агітацыйна-інструктарскіх паяздоў мела вялікае значэнне ў мабілізацыі насельніцтва на дапамогу фронту і тлумачэнні палітыкі партыі, сутнасці важнейшых рашэнняў ЦК РКП(б) і ЦВК, асабліва ва ўмовах грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі. У 17 вагонах поезда знаходзіліся лекцыйная зала, кніжная крама, агітацыйныя вітрыны, кіназала. У поездзе выпускаліся малафарматныя газеты «Октябрьская революция» і «К победе».

М.І.Калінін выступіў на мітынгу перад чырвонаармейцамі Віцебскага гарнізона і на аб'яднаным сходзе — пасяджэнні адказных работнікаў губернскіх, гарадскіх і павятовых партыйных камітэтаў, праўленняў прафсаюзаў і фабрычна-заводскіх камітэтаў. На другі дзень М.І.Калінін наведаў в. Бабінічы Віцебскага павета, дзе на сустрэчу з ім сабралася больш за 200 чалавек з навакольных вёсак, пасля чаго прыняў удзел у мітынгу ў дэпо ст. Віцебск і выступіў на мітынгу ў гарадскім тэатры. Увечары адбылося аб'яднанае пасяджэнне пленума гарадскога і павятовага выканкомаў, праўленняў прафсаюзаў і фабрычна-заводскіх камітэтаў, якое стала своеасаблівым падвядзеннем вынікаў работы агітацыйна-інструктарскага поезда «Кастрычніцкая рэвалюцыя» ў Віцебску.

КРЫЛОЎ Сямён Мікалаевіч. Савецкі партыйны і ваенны дзеяч. Нарадзіўся ў красавіку 1892 г. ў г. Белы Смаленскай губерні (цяпер у Цвярской вобл.), у сялянскай сям'і. Скончыў гарадское вучылішча. Член РСДРП з 1909 г. З 1913 г. ў арміі. У 1917 г. скончыў школу

прапаршчыкаў. Увесь гэты час вёў актыўную прапагандысцкую работу. 27.10(9.11).1917 г. прызначаны Віцебскім ваенна-рэвалюцыйным камітэтам ваенным камендантам горада і начальнікам Віцебскага гарнізона; член губвыканкома. У 1918 г. арганізаваў на тэрыторыі губерні разгром мяцяжу часцей корпуса Доўбар-Мусніцкага, кіраваў абаронай Віцебска ад кайзераўскіх войск. У 1919 г. — старшыня Віцебскага губернскага камітэта РКП(б). З сакавіка 1919 г. на Паўднёвым фронце. Камандаваў брыгадай, потым 14-й стралковай дывізіяй. У 1920—21 гг. — старшыня Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта і гарадскога савета г. Севастопаль. У 1921 г. вярнуўся ў Віцебск, працаваў намеснікам старшыні, потым старшынёй Віцебскага губвыканкома. У 1923 г. ў Віцебску выдавецкім аддзелам камісіі па арганізацыі святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі была выдадзена кніга яго ўспамінаў «Год революции в Витебске». У 1923 г. С.М.Крылоў пакінуў Віцебск, працаваў старшынёй Сярэдняволжскага крайкома ВКП(б), загадчыкам сельгасаддзела газеты «Правда», у апараце ВКП(б).

Памёр 13.5.1938 г.

ПУТНА Вітаўт Казіміравіч. Савецкі ваенны дзеяч, герой грамадзянскай вайны. За мужнасць і адвагу, умелае кіраўніцтва войскамі ў барацьбе з ворагамі маладой Савецкай дзяржавы быў узнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга. Дзейнасць В.К.Путны як аднаго з выдатных арганізатараў Чырвонай Арміі цесна звязана з Віцебскам. Нарадзіўся 12.4.1893 г. ў сям'і беднага селяніна вёскі Мацканцы Віленскай губерні. З ранніх гадоў спазнаў беднасць, эксплуатацыю мясцовых багацеяў, у якіх быў пастухом. У пошуках лепшай долі адправіўся ў Рыгу, дзе працаваў на заводзе. У 1913 г. быў арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць. У 1915 г. яго мабілізуюць у армію. Радавы Путна прыняў удзел у шэрагу баёў, вызначыўся ў іх, але быў кантужаны і атручаны газамі, трапіў у шпіталь. Пасля лячэння яго накіравалі ў школу прапаршчыкаў, у пачатку 1917 г. прапаршчык Путна трапіў у адзін з палкоў 12-й арміі.

У лютым 1917 г. стаў членам партыі бальшавікоў. Да кастрычніка 1917 г. знаходзіўся на фронце, пасля рэвалюцыі разам з салдатамі батальёна, у якім служыў, добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. Неўзабаве быў прызначаны арганізатарам Чырвонай Арміі Віцебскага ваеннага аддзела. У маі 1918 г. стаў віцебскім ваенным камісарам і быў выбраны членам губернскага выканкома, на гэтай пасадзе многа зрабіў для фарміравання і ўмацавання часцей маладой Чырвонай Арміі. Пры яго непасрэдным удзеле на тэрыторыі губерні былі сфарміраваны Невельскі, Аршанскі і іншыя палкі, Віцебская стралковая дывізія. З мая 1919 г. — камандзір 228-га Карэльскага палка, а са снежня 1919 г. — начальнік праслаўленай у баях 27-й Омскай стралковай дывізіі. У яе састаў уваходзілі часці, сфарміраваныя на тэрыторыі Віцебскай губерні пры яго асабістым удзеле (235-ы Невельскі і 236-ы Аршанскі палкі). Пад камандаваннем В.К.Путны дывізія паспяхова змагалася на Усходнім фронце супраць белачэхаў і калчакаўцаў, удзельнічала ў вызваленні Урала і Сібіры. Пасля разгрому калчакаўскіх войск 27-я дывізія была перакінута на Заходні фронт. Тут новымі гранямі заззяў палкаводчы талент В.К.Путны. 27-я дывізія прарвала абарону белапалякаў і фарсіравала Бярэзіну. Неўвядальнай славай пакрылі сябе байцы і камандзіры дывізіі ў баях каля Смалявіч і Азярышча, пры вызваленні Мінска. За асаблівую мужнасць і храбрасць у гэтых баях, выключны асабісты гераізм В.К.Путна ў лістападзе 1920 г. быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонага Сцяга. Трэцім ордэнам Вітаўт Казіміравіч адзначаны за мужнасць і гераізм пры ліквідацыі Кранштацкага мяцяжу ў сакавіку 1921 г.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны В.К.Путна з усёй энергіяй аддаўся рабоце па будаўніцтву кадравай Чырвонай Арміі ў мірных умовах. У пачатку 1927 г. яго зноў накіроўваюць на камандную работу. Ён камандаваў 6-м, 2-м стралковымі карпусамі, потым быў накіраваны на ваенна-дыпламатычную работу, быў ваенным аташэ ў Японіі, Фінляндыі і Германіі. З ліпеня 1931 г. да 1934 г. камандаваў стралковым корпусам, потым Прыморскай групай войск на Далёкім Усходзе. У 1932 г. за вялікі асабісты ўклад у справу вызвалення Беларусі ад захопнікаў ЦВК БССР узнагародзіў яго ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР — вышэйшай у той час узнагародай рэспублікі. У 1934—36 гг. — ваенны аташэ ў Вялікабрытаніі. Потым займаў адказныя пасады ў Наркамаце абароны. У 1937 г. яму было прысвоена званне камкора. Але ў тым самым годзе В.К.Путна быў рэпрэсіраваны, 11.6.1937 г. расстраляны.

Ён быў усебакова адукаваным чалавекам, таленавітым военачальнікам і вопытным дыпламатам, ваенным пісьменнікам і самабытным мастаком.

ЧУНЧЫН Віліс Янавіч. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Латвіі, усталявання Савецкай улады на Віцебшчыне і грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1882 г. ў Кулдзігскім раёне Латвіі. З 1902 г. вёў рэвалюцыйную работу ў г. Ліепая. У 1906 г. быў арыштаваны і сасланы ў Сібір. З лютага 1917 г. старшыня Латышскага раённага камітэта РСДРП(б) у Віцебску. 8(21).3.1917 г. быў абраны членам выканкома Віцебскага Савета рабочых дэпутатаў, з 2(15).7.1917 г. член камітэта Віцебскай арганізацыі інтэрнацыяналістаў [з верасня — Віцебская арганізацыя РСДРП(б)]. У лістападзе 1917 г. ўзначаліў харчовую секцыю ў новым рэвалюцыйным Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў Віцебска. У снежні на 1-м Віцебскім губернскім з'ездзе Саветаў быў абраны старшынёй губернскага Савета рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў. З 1918 г. на партыйнай рабоце ў Сібіры, сакратар Омскага гарадскога падпольнага камітэта РКП(б). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў паўстанняў супраць калчакаўшчыны ў Омску. 3.2.1919 г. быў схоплены калчакаўцамі і закатаваны. У Віцебску яго імем названа вуліца. *Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.*

Жыхары Віцебска — удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны

АЛЕШЧАНКА Піліп Яфрэмавіч, н. ў 1896 г. Служыў у 6-й кавалерыйскай брыгадзе, у 1919—20 гг. начальнік атрада на Заходнім фронце.

АРДЫНЦАЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1895 г. З жніўня 1918 г. да снежня 1922 г. палітрук роты галоўнага атрада 9-й дывізіі чыгуначных войск. Удзельнік баёў з польскімі войскамі пад Жлобінам.

АРЭШКА Пётр Нічыпаравіч, н. ў 1899 г. У 1920—22 гг. баец 14-га чыгуначнага палка. Пад Беларэцкам удзельнічаў у ліквідацыі прарыву белафінаў.

БАГДАНОЎСКАЯ Раіса Абрамаўна, н. ў 1902. З верасня 1919 г. да мая 1921 г. палітрук шпіталяў № 225, 144.

БАЙЦОЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1901 г. У сакавіку—верасні 1920 г. палітрук роты 9-га стралковага палка па ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу. З 1937 г. — начальнік палітаддзела Віцебскага аддзялення Заходняй чыгункі.

БАННІКАЎ Мікалай Ананьевіч, н. ў 1901 г. З чэрвеня 1918 г. ў Чырвонай гвардыі, баец падрыўнога атрада. Ваяваў пад Мілікесам і Сімбірскам.

БЕЛЯКОЎ Ілья Іванавіч, н. ў 1893 г. з 1918 г. да чэрвеня 1919 г. камандзір роты Чырвонай гвардыі ў Неўскім раёне.

БУБНОЎСКІ Дамітрый Пятровіч, н. ў 1900 г. У 1919—23 гг. чырвонаармеец 471-га стралковага палка 53-й дывізіі. Удзельнік баёў пад Псковам.

ВАЙНШТЭЙН Саламон Давыдавіч, н. ў 1901 г. З кастрычніка 1919 г. да лютага 1921 г. ваяваў на Заходнім і Каўказскім франтах.

ВАРАНЦОЎ Рыгор Васілевіч, н. ў 1898 г. З верасня 1920 г. па чэрвень 1921 г. палітрук батальёна войск ВЧК. Прымаў удзел у барацьбе з контррэвалюцыйнымі бандамі на тэрыторыі Віцебскай губерні.

ВАСІЛЬЕЎ Ілья Цімафеевіч, н. ў 1897 г. З красавіка 1918 г. да кастрычніка 1919 г. служыў у 22-м Віцебскім стралковым палку. У складзе 61-га стралковага палка ўдзельнічаў у баях на Польскім фронце. У чэрвені 1920 г. ў складзе Петраградскай брыгады курсантаў змагаўся супраць Урангеля і Махно.

ВОЛКАЎ Нічыпар Іванавіч, н. ў 1898 г. Старшы фельчар 4-га этапна-ветэрынарнага лазарэта пры 16-й стралковай дывізіі. Ваяваў на Польскім фронце.

ВОЛЧАК Ізраіль Фрыдманавіч, н. ў 1899 г. З мая 1919 г. да жніўня 1922 г. чырвонаармеец 865-га стралковага палка 5-й стралковай дывізіі. Ваяваў на Польскім фронце.

ГАБЗЕМ Рудольф Крышавіч, н. ў 1896 г. З мая 1918 г. да чэрвеня 1919 г. фельчар эскадрона 1-га кавалерыйскага палка 52-й латышскай дывізіі. Прымаў удзел у баях на Усходнім і Заходнім франтах, у т.л. пад Уфой і Рыгай. З чэрвеня 1919 г. да лістапада 1920 г.

фельчар 2-й батарэі латышскай дывізіі. Ваяваў на Паўднёвым фронце, пад Арлом, дайшоў да Феадосіі.

ГЕЙКА Дзмітрый Захаравіч, н. ў 1897 г. З лютага 1918 г. да лістапада 1921 г. ў брыгадзе Катоўскага, памочнік камандзіра эскадрона. Ваяваў на Паўднёвым фронце супраць войск Дзянікіна, гетманаўскіх і махноўскі атрадаў, пад Харкавам, Нікалаевам, Адэсай.

ГЛАДШТЭЙН Абрам-Давід Іосель-Беркавіч, н. ў 1897 г. З красавіка 1919 г. да студзеня 1920 г. чырвонаармеец 611-га стралковага палка, 3-й Тамбоўскай асобнай брыгады.

ДАРАШКЕВІЧ Міхаіл Аўгуставіч, н. ў 1901 г. Ваяваў супраць Калчака ў складзе Арэнбургскага рабочага палка 7-й Самарскай дывізіі. Удзельнік баёў з войскамі барона Урангеля.

ДАРОЖКІН Павел Яфімавіч, н. ў 1900 г. З лістапада 1917 г. чырвонагвардзеец Калышанскага камуністычнага атрада. Ваяваў у 17-м кавалерыйскім палку 17-й стралковай дывізіі 1-й коннай арміі, 61-м палку 11-й дывізіі. Удзельнік баёў на Польскім фронце, змагаўся з басмачамі ў Туркестане.

ДЗЕРГАЧОЎ Канстанцін Андрэевіч, н. ў 1899 г. У лістападзе — кастрычніку 1918 г. палітрук роты 43-га стралковага палка 5-й стралковай дывізіі на Заходнім фронце.

ЕЎДАКІМАЎ Карнілій Васілевіч, н. ў 1898 г. З красавіка 1918 г. да снежня 1919 на Заходнім фронце, камандзір аддзялення ў 1-м Віцебскім запасным палку. Са снежня 1919 г. ваяваў на Паўднёвым фронце, у складзе 164-га і 1-га Данецкага запаснага палкоў — быў памочнікам камандзіра ўзвода. Узнагароджаны ордэнам Леніна і 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга.

ЗІЛЬБЕРГ (ЗІЛЬБЕР) **Рувім Яфрэмавіч**, н. ў 1891 г. З чэрвеня 1918 г. да верасня 1921 г. палітбаец 57-й стралковай дывізіі 4-й арміі, удзельнік баёў на Польскім фронце.

ІВАНОЎ Фама Раманавіч, н. ў 1899 г. З мая 1919 г. да чэрвеня 1920 г. ў складзе 17-й стралковай дывізіі ўдзельнічаў у баях з белапалякамі пад Вілейкай і Варшавай. З 1920 г. і па снежань 1922 г. — у асобым атрадзе пры 5-й стралковай дывізіі 16-й арміі.

ІВАНОЎ Яфім Захаравіч, н. ў 1899 г. З мая 1919 г. да кастрычніка 1920 г. старшына эскадрона 5-га кавалерыйскага палка 17-й дывізіі на Польскім фронце.

ІВАНОЎСКІ Сямён Міронавіч, н. ў 1901 г. З 1919 г. да кастрычніка 1920 г. чырвонаармеец 1-га Віцебскага палка, ваяваў на Заходнім фронце.

КАБЛУКОЎ Іван Аляксеевіч, н. ў 1899 г. Стралок 53-й пагранічнай дывізіі, з чэрвеня 1919 г. да кастрычніка 1920 г. ваяваў на Польскім фронце.

КАВАЛЕНКА Цімафей Ануфрыевіч, н. ў 1900 г. Са студзеня 1918 г. да мая 1921 г. баец Горлаўскага рабочага атрада, чырвонаармеец спецатрада ў Віцебску, 1-га Віцебскага палка, камандзір атрада 44-га палка 5-й Віцебскай дывізіі, палітрук роты. За актыўны ўдзел у грамадзянскай вайне ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (1967).

КАЖЫЧЭНКАВА Марыя Сямёнаўна, н. ў 1902 г. З лістапада 1919 г. да сакавіка 1921 г. малодшы палатны наглядальнік 244-га эвакашпіталя на Польскім фронце.

КАЖЫЧЭНКАЎ Сяргей Рыгоравіч, н. ў 1902 г. З чэрвеня 1919 г. да верасня 1920 г. баец-тэлефаніст асобнай Петраградскай брыгады, потым стралок часці асобага прызначэння ў Тамбове.

КАЗІМІРАЎ Аляксандр Ігнатавіч, н. ў 1901 г. Чывонаармеец 77-й стралковай брыгады 13-й арміі. З красавіка 1920 г. да снежня 1920 г. прымаў удзел у баях супраць Дзянікіна на Паўднёвым фронце.

КАЗЛОЎСКІ Ігнат Ігнатавіч, н. ў 1897 г. З красавіка 1918 г. да жніўня 1923 г. баец 5-га рабоча-сялянскага палка, перайменаванага потым у 245-ы стралковы полк 28-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях супраць Калчака на Усходнім фронце.

КАРЭТНЮК Іван Цімафеевіч, н. ў 1900 г. З красавіка 1919 г. да кастрычніка 1920 г. чырвонаармеец 398-га стралковага палка, 45-й стралковай дывізіі, удзельнік баёў з пятлюраўцамі, дзянікінцамі пад Цірaспалем і Бендэрамі, Вапіяркай і Крыжопалем.

КАЧАТКОЎ Міхаіл Рыгоравіч, н. ў 1896 г. У 1918—21 гг. нумар гарматнага разліку браняпоезда. Удзельнічаў у вызваленні Урала. Ваяваў супраць англійскіх інтэрвентаў пад Баку.

КОРСАК Іосіф Антонавіч, н. ў 1897 г. У 1918—21 гг. шафёр бронемашыны 21-га бранявога атрада 14-й кавалерыйскай дывізіі. Ваяваў на Паўднёвым фронце, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

КРЫШТОБ (КРЫШТОФ) **Рыгор Васілевіч**, н. ў 1900 г. З лютага 1919 г. да верасня 1920 г. камандзір стралковага ўзвода 98-га стралковага палка, 11-й стралковай дывізіі на Заходнім фронце. Удзельнічаў у баях з атрадамі Юдзеніча пад Ленінградам.

КУГЕЛЬ Ілья Хонавіч, н. ў 1900 г. З верасня 1919 г. да мая 1920 г. служыў у 313-м стралковым палку 55-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у баях супраць Калчака пад Омскам і Акмолінскам.

КУЛАКОЎ Васіль Канстанцінавіч, н. ў 1897 г. З ліпеня да верасня 1919 г. камандзір роты Гомельскага зводнага атрада. Прымаў удзел у ліквідацыі прарыву польскіх войск пад Туравам і Давыд-Гарадком, банд у Рэчыцкім уездзе.

КУНЦЭВІЧ Іван Мікалаевіч, н. ў 1895 г. З лютага 1918 г. да кастрычніка 1920 г. ў 2-м Кунчурскім палку 29-й стралковай дывізіі, камандзір роты. Прымаў удзел у баях супраць Калчака. У складзе 3-й арміі ваяваў на Польскім фронце.

КУХТО Іван Спірыдонавіч, н. ў 1901 г. У 1919—21 гг. ваяваў на Польскім фронце.

ЛАБОК Ізраіль Моўшавіч, н. ў 1899 г. У 1918—22 гг. служыў у брыгадзе ЧОН. Удзельнік баёў з польскімі войскамі пад Лепелем і з контррэвалюцыйнымі бандамі.

ЛЕБЕДЗЕЎ Ігнацій Ягоравіч, н. ў 1898 г. У 1918—22 гг. служыў у 27-м артдывізіёне. Ваяваў з бандай Махно пад Харкавам і з часцямі барона Урангеля.

ЛІТВІНАЎ Георгій Пятровіч, н. ў 1897 г. З лістапада 1918 г. да кастрычніка 1921 г. ваяваў у складзе 26-га стралковага палка 8-й арміі і 356-га стралковага палка 40-й Багучарскай дывізіі на Паўднёвым фронце.

ЛІХМАНАЎ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1894 г. Са жніўня 1919 г. да ліпеня 1921 г. кулямётчык 5-га Сцяпнога партызанскага палка, Алтайскі край. Ваяваў супраць Калчака.

ЛЯХАЎ Васіль Лявонцевіч, н. ў 1897 г. У 1918—20 гг. радыст на 837-й асобнай радыёстанцыі. Ваяваў супраць нямецкіх захопнікаў пад Петраградам.

МАКАРАЎ Міхаіл Пятровіч, н. ў 1902 г. Са жніўня 1917 г. да сакавіка 1918 г. — баец Чырвонай гвардыі г. Петраград. Удзельнік штурму Зімняга палаца. У сакавіку 1918 г. — снежні 1919 г. малодшы камандзір 17-га кавалерыйскага палка на Усходнім фронце. Са снежня 1919 г. да лістапада 1922 г. — камандзір узвода 64-га кавалерыйскага палка на Паўднёвым фронце, удзельнічаў у баранцьбе з войскамі барона Урангеля. У 1967 г. ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

МАРОКА Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1892 г. Са жніўня 1919 г. да жніўня 1921 г. баец 103-га Каўказскага палка 18-й кавалерыйскай дывізіі 11-й арміі, удзельнік баёў з войскамі генерала Дзянікіна.

МІРХАСІН Якаў Рыгоравіч, н. ў 1898 г. З лістапада 1918 г. да снежня 1919 г. вучыўся на магілёўскіх курсах камандзіраў Чырвонай Арміі, у далейшым служыў у 159-м пяхотным палку 6-й арміі на Паўночным фронце, камандаваў ротай. У 1929—50 гг. у органах НКУС. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

ПАЛІТЫК Піліп Іванавіч, н. ў 1895 г. З лютага 1918 г. да 1923 г. начальнік кулямётнай каманды 41-га батальёна войск ВЧК, змагаўся супраць польскіх войск, з бандытызмам у Віцебскай і Смаленскай губернях.

ПАРАХНЕВІЧ (ПАХАРНЕВІЧ) **Васіль Лукіч**, н. ў 1898 г. Са снежня 1918 па 1920 г. — на Заходнім фронце. Памочнік камандзіра ўзвода 1-га лёгкага артдывізіёна 17-й стралковай дывізіі, удзельнік баёў з польскімі войскамі.

ПЕСКІНА-КІСЕЙМАН Сара-Тауба Давыдаўна, н. ў 1898 г. З лістапада 1919 г. да чэрвеня 1922 г. медсястра эвакапрыёмніка ў 163-м галоўным эвакапункце (г. Барысаглебск), палітрук у 404-м палявым шпіталі. З красавіка 1921 г. палітрук кулямётнага ўзвода і роты 41-га батальёна войск ВЧК.

РАДЗІВОНАЎ Уладзімір Піліпавіч, н. ў 1898 г. З красавіка 1918 г. да сакавіка 1921 г. старшы санітар 157-га ваенна-санітарнага цягніка. З 1921 г. — камісар санітарнай брыгады 4-й санітарнай дывізіі, якая дыслацыравалася ў г. Барысаў. З 1922 г. камісар лазарэта 7-й кавалерыйскай дывізіі.

РАЙ Арсеній Андрэевіч, н. ў 1898 г. Са жніўня 1919 г. да лютага 1921 г. памочнік паліткамісара, паліткамісар конна-горнага артылерыйскага дывізіёна 5-й кавалерыйскай дывізіі. З 1921 г. — сакратар палітаддзела 2-й стралковай дывізіі ў Туркестане. Прымаў удзел у барацьбе з бандамі басмачоў.

РАМАНАЎ Іларыён Раманавіч, н. ў 1895 г. З сакавіка да лістапада 1920 г. сувязіст стралковага палка, ваяваў на Паўночным і Заходнім франтах.

РАСКАЗАЎ Васіль Дзмітрыевіч, н. ў 1895 г. З красавіка да жніўня 1920 г. ваяваў на Польскім фронце ў 476-м стралковым палку 53-й стралковай дывізіі.

РЫБАКОЎ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1902 г. З чэрвеня 1918 г. да сакавіка 1922 г. ўдзель-

нічаў у барацьбе з бандытызмам у складзе Віцебскага палка ВЧК.

САНДЛЕР Хаім Абрамавіч, н. ў 1898 г. З ліпеня 1918 г. да 1922 г. — радавы 26-га стралковага палка 3-й стралковай дывізіі. Ваяваў супраць Дзянікіна пад Курскам, Тулай, Батайскам і Краснадарам, супраць Махно і Урангеля.

САРОКІН Іван Іванавіч, н. ў 1897 г. З мая 1918 г. да чэрвеня 1922 г. ваяваў у атрадзе Блюхера на Паўднёвым Урале. Прымаў удзел у баях супраць банд Дутава, у складзе 30-й дывізіі 3-й арміі Усходняга фронту — супраць войск Калчака і Пепеляева.

СЕРАБРАКОЎ Макар Дзмітрыевіч, н. ў 1897 г. Са жніўня 1918 г. да красавіка 1919 г. ў складзе 200-га стралковага палка 21-й стралковай дывізіі. Ваяваў супраць інтэрвентаў і контррэвалюцыйных банд.

СЕРАБРАКОЎ Яўціхій Мінавіч, н. ў 1888 г. Са жніўня 1918 г. па сакавік 1919 г. чырвонаармеец Віцебскага асобнага стралковага батальёна, удзельнік баёў з польскімі войскамі.

СУХОРСКІ Казімір Купрыянавіч, н. ў 1892 г. З сакавіка 1919 г. па лістапад 1922 г. камандзір роты і намеснік камандзіра 7-га стралковага батальёна войск ВЧК па барацьбе з бандамі на Віцебскім напрамку (у раёнах Суража, Веліжа, Сянно, Лёзна).

СЦЕПАНЕНКА Мікалай Цярэнцьевіч, н. ў 1890 г. З кастрычніка 1918 г. да студзеня 1922 г. ваяваў у 1-й коннай арміі камандзірам кавалерыйскага ўзвода; быў памочнікам камандзіра экспедыцыі супраць банд Зялёнага ў Васількаўскім павеце Кіеўскай губерні.

ТАРАСАЎ Цярэнцій Цімафеевіч, н. ў 1894 г. З красавіка 1918 г. да лютага 1919 г. чырвонаармеец Віцебскага палка. Прымаў удзел у барацьбе з контррэвалюцыйнымі бандамі ў Віцебскай і Гомельскай губернях.

ФІЛІПАВА Таццяна Фёдараўна, н. ў 1901 г. З мая да кастрычніка 1920 г. — у 17-й стралковай дывізіі, медсястра. Удзельнічала ў баях з польскімі войскамі пад Бабруйскам.

ЦЮЦЮННІКАЎ Міхаіл Іванавіч, н. ў 1900 г. З верасня 1919 г. ў Чырвонай Арміі, ўдзельнічаў у баях супраць войск Дзянікіна і Урангеля на поўдні Украіны і ў Крыме, стралок 97-й брыгады. Ваяваў супраць басмачоў на Паўднёвым Урале.

ЧАРКАСКІ Леў Саламонавіч, н. ў 1899 г. З ліпеня 1918 г. баец Чырвонай гвардыі Адэсы. У лютым 1919 г. вучыўся на камандных курсах у Кіеве. Потым камандаваў асобным батальёнам на Усходнім фронце. У 1921 г. — на Туркестанскім фронце, начальнік палітаддзела 3-й дывізіі. Адазваны ў Палітупраўленне рэўваенкамата рэспублікі на пасаду начальніка аддзела і галоўнага інспектара.

ЧЭРНІН Рувім Хацкелевіч, н. ў 1896 г. У 1918—22 гг. радавы Віцебскага батальёна ВЧК.

ШУЛЬКІН Давід Маркавіч, н. ў 1896 г. З кастрычніка 1918 г. да жніўня 1919 г. курсант віцебскіх камандных курсаў. Прымаў удзел у барацьбе з бандамі пад Веліжам і Суражам, у баях з польскімі войскамі.

ШЭВЕЛЬДЗІН Нічыпар Ігнатавіч, н. ў 1901 г. З верасня 1920 г. да кастрычніка 1924 г. чырвонаармеец 7-га Самарскага кавалерыйскага дывізіёна 5-й пяхотнай дывізіі, ваяваў на Польскім фронце.

ШЭЎКІН Абрам Лейбавіч, н. ў 1893 г. У 1918—21 гг. у 2-м дывізіёне 17-й стралковай дывізіі. Прымаў удзел у баях з пятлюраўцамі (Сарны, Лахва).

ЭСТРЫН Маісей Хацкелевіч, н. ў 1898 г. Са студзеня 1919 г. да мая 1920 г. курсант Мінскіх пяхотных камандзірскіх курсаў. Ваяваў на Паўднёвым фронце супраць Дзянікіна, з мая да верасня 1920 г. ў складзе 57-й і 4-й стралковых дывізій на Заходнім фронце.

ЯКАЎЛЕЎ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1901 г. З ліпеня 1920 г. да снежня 1923 г. ў Чырвонай Арміі, удзельнічаў у барацьбе з бандамі Антонава.

На шляху сацыялістычных пераўтварэнняў

Пераможнае шэсце Савецкай улады па абшарах былой імперыі не здымала само па сабе пакінутых царызмам праблем. Нягледзячы на ўсе памкненні бальшавікоў да міру, баявыя дзеянні працягваліся. Віцебская губерня амаль уся ўваходзіла ў франтавую паласу, а сам горад быў адначасова і франтавым, і ближэйшым тылам. Акрамя значнай колькасці салдат, у ім было шмат армейскіх устаноў, баз, складаў, майстэрань і вялікае скапленне бежанцаў.

Стварэнне ў Віцебску часцей Чырвонай Арміі. Стомленасць салдат царскай арміі ад вайны, унутраныя супярэчнасці ў вайсковых

часцях, памкненне былых сялян вярнуцца да зямлі прывялі Віцебскі гарнізон да разлажэння. Востра паўстала пытанне аб дэмабілізацыі. Гэта праца, якая праводзілася камендантскім упраўленнем горада, працягвалася ў лістападзе і снежні, у выніку гарнізон паменшаў амаль у 10 разоў. Паўстала пытанне аб арганізацыі новай арміі. Пры ваенна-рэвалюцыйным камітэце быў створаны штаб Чырвонай гвардыі, у чыгуначных майстэрнях было прынята рашэнне аб стварэнні атрада для аховы чыгункі (у склад арганізацыйнай групы ўвайшлі Біге, Кунцэвіч, Трэйман, Барздайн і Недрыт). Хутка з рабочай моладзі быў створаны атрад Чырвонай гвардыі ў колькасці 50 чалавек. Адначасова праводзілася агітацыйная кампанія сярод салдат гарнізона, у выніку чаго знайшлося каля 300 добраахвотнікаў. Пачатак быў пакладзены. Гарадскі атрад Чырвонай Арміі ў снежні 1917 г. налічваў да 100 чалавек. У гэты ж час пачалі фарміравацца атрады, якія камплектаваліся па нацыянальнай прыкмеце: беларускія, польска-літоўскія. 10 снежня на першым пасяджэнні губернскага з'езда Саветаў разам з іншымі секцыямі была створана і ваенная. У яе склад увайшлі С.М.Крылоў, Анфілаў, Бондараў, Яфрэмаў, Гусеў. Задачамі секцыі былі заканчэнне дэмабілізацыі старога войска і яго рэарганізацыя на дэмакратычных пачатках. Адразу ж на чыгуначнай станцыі было створана дэмабілізацыйнае бюро з прадстаўнікоў саветаў, камітэтаў чыгуначных служачых, вайсковых часцей і ўстаноў.

У лістападзе 1917 г. адбыліся выбары ва Устаноўчы сход, з якім звязвалі свае спадзяванні шырокія слаі насельніцтва зруйнаванай Расійскай імперыі. Прадстаўнікі шматлікіх партый і рухаў вялі актыўную агітацыйную работу па ўсёй губерні. У Віцебск прыязджалі лідэры кадэтаў, эсэраў, меншавікоў. Перадвыбарнымі лозунгамі стракацелі ўсе газеты. Па ўспамінах сучаснікаў, сцены і агароджы ў горадзе былі залеплены плакатамі, лістоўкамі, палітычнымі праграмамі.

28 лістапада (у гэты дзень у Петраградзе павінен быў адкрыцца Устаноўчы сход, потым адкрыццё перанесена на 5 студзеня) у Віцебску адбылося ўрачыстае пасяджэнне гарадской думы, на якім было прынята рашэнне аб асігнаванні з гарадской казны 100 тыс. рублёў на заснаванне ў горадзе Палаца Свабоды. Вуліцу Смаленскую (цяпер вуліца Леніна) прапаноўвалася назваць вуліцай 28 лістапада, а Саборную плошчу — плошчай Устаноўчага сходу, і нават узвесці на ёй калону ў гонар гэтага форуму. У дзень адкрыцця Устаноўчага сходу павінна была адбыцца маніфестацыя. Але 2.1.1918 г. рашэннем Віцебскага Савета гарадская дума была скасавана, як ігнараваўшая дырэктывы Савецкай улады. Дэманстрацыі і мітынгі 4—5 студзеня былі забаронены, горад быў аб'яўлены на ваенным становішчы, якое было адменена толькі 8 студзеня. Некаторыя члены апазіцыйных партый былі арыштаваны. На гэтым скончылася і гісторыя плошчы Устаноўчага сходу. Захаваўся пратакол таго пасяджэння гарадской думы 28.11.1917 г. (захоўваецца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі).

Пасля роспуску Беларускага з'езду і Усерасійскага ўстаноўчага сходу камандуючы 1-га польскага корпуса рускай арміі генерал Доўбар-Мусніцкі 12.1.1918 г. афіцыйна абвясціў вайну Савецкай Расіі (хаця ўжо ў лістападзе—снежні 1917 г. часці корпуса пад выглядам аховы маёмасці памешчыкаў-палякаў праводзілі антысавецкія акцыі, у т.л. ў Віцебскай губерні). Палітычныя мэты мяцежнікаў зводзіліся да ліквідацыі савецкай улады ў Беларусі і далучэння беларускіх губерняў да Польшчы. На часова захопленай тэрыторыі Беларусі быў усталяваны жорсткі акупацыйны рэжым, накіраваны не толькі супраць бальшавікоў, але і мясцовага насельніцтва. Таму жыхары акупіраваных раёнаў актыўна дапамагалі Чырвонай Арміі, сыходзілі ў партызанскія атрады. Асобы і арганізацыі, якія падтрымлівалі мяцежнікаў, былі аб'яўлены бальшавікамі па-за законам. Поруч з карнымі мерамі савецкія органы разгарнулі актыўную прапаганду, скіраваную на салдат корпуса. Пасля шэрагу буйных перамог атрадаў Чырвонай Арміі і партызан над сіламі корпуса распад войск Доўбар-Мусніцкага стаў неабарачальным. Легіянераў бралі ў палон і раззбройвалі паўсюдна (толькі каля Віцебска — каля 1200 чалавек). Многія легіянеры потым уступілі ў Чырвоную Армію.

18.2.1918 г. войскі кайзераўскай Германіі перайшлі ў наступленне, у выніку чаго Віцебск апынуўся пад пагрозай акупацыі. У горадзе быў створаны рэвалюцыйны штаб, у склад якога ўвайшлі С.М.Крылоў, У.А.Мяніцкі, Л.К.Беме, М.Касцерын, Адаменка, Бялінскі, С.А.Шэйдліна. Штаб прыняў меры па ўзбраенні рабочых, фарміраванні атрадаў Чырвонай Арміі. У данясенні ваеннаму камісару Заходняй вобласці ад 17.3.1918 г. Віцебскі губваенкам пісаў, што ў горадзе маецца ў

наяўнасці 6 тыс. чырвонаармейцаў. Да 1.4.1918 г.былі створаны новыя і ўмацаваны раней створаныя часці: 1-ы батальён імя Віцебскага Саўдэпа (900 чалавек, камандзір Чабатарэўскі, у далейшым — герой Усходняга фронту, старшыня Чалябінскага губвыканкома), 2-гі батальён імя Віцебскага Саўдэпа (600 чалавек з лёгкай батарэяй, камандзір Мосенцаў), 1-ы конна-разведвальны атрад (65 чалавек, камандзір Відзе), баявая дружына левых эсэраў-інтэрнацыяналістаў (200 чалавек, у хуткім часе расфарміравана), польскі рэвалюцыйны дывізіён (800 чалавек, камандзір Макоўскі, у далейшым камандзір Заходняй дывізіі), партызанскія атрады колькасцю 2400 чалавек для засылкі ў акупіраваныя раёны. Пазней батальёны Віцебскага Саўдэпа былі перафарміраваны ў палкі, а польскі рэвалюцыйны дывізіён у 4-ы Варшаўскі полк.

У гэты ж час былі створаны 10-ы аўтабранявы атрад (камандзіры Даўбе і Ільяшэнка), інжынерны батальён і паветраная эскадрылля. На Заходняй Дзвіне пачаў дзейнічаць атрад плывучых сродкаў (на параходах былі размешчаны гарматы і кулямёты). Фарміраванне вайсковых часцей праходзіла на прынцыпах добраахвотнасці. 8.4.1918 г. рэвалюцыйны штаб быў расфарміраваны. У гэты ж час у горадзе з'явіўся атрад анархістаў у колькасці 100 чалавек, па большасці з матросаў. Ён размяшчаўся ў Палас-Атэле, недалёка ад вакзала. Сумеснае пасяджэнне Губсаўдэпа і гарвыканкома 29 красавіка было прыпынена паведамленнем С.М.Крылова пра беспарадкі з удзелам анархістаў. Латышскі конны полк, браняпоезд і Варшаўскі полк атрымалі загад ліквідаваць атрад анархістаў, што і было зроблена да канца дня. Наступным крокам у фарміраванні новай арміі стаў пераход увосень 1918 г. ад камплектавання на добраахвотных пачатках да абавязковай мабілізацыі.

Віцебскі чыгуначны вузел. Напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1917 г. Віцебскі чыгуначны вузел меў самы буйны ў горадзе — пасля фабрыкі «Дзвіна» — працоўны калектыў. Чыгуначнікі былі актыўнымі ўдзельнікамі рабочага руху. Камітэт РСДРП(б) на ст. Віцебск быў створаны 3.9.1917 г. Яго намаганнямі быў арганізаваны адзін з першых у Віцебску атрадаў Чырвонай Арміі. Чырвонагвардзейцы-чыгуначнікі прымалі ўдзел у многіх баявых аперацыях, у т.л. ў раззбраенні польскіх легіянераў Доўбар-Мусніцкага. Пры гэтым многія з іх прыходзілі на начныя дзяжурствы і аперацыі, не пакідаючы сваёй працы на станцыі ўдзень. У штаб Чырвонай гвардыі ўваходзілі тады Прус, Мазевіч, Барздайн, Кунцэвіч, Каляда.

На працягу 2-й палавіны 1917 г. на чыгунцы фактычна існавала двоеўладдзе. З аднаго боку — Усерасійскі выканаўчы камітэт чыгуначнікаў («Вікжэль», утвораны ў маі 1917 г. з'ездам прадстаўнікоў галоўных камітэтаў чыгунак), які фактычна прадстаўляў інтарэсы меншавікоў і блізкіх да іх партый і падтрымліваў палітыку Часовага ўрада. З другога боку — створаны пры актыўным удзеле бальшавікоў «Союз мастеровых и рабочих», пераўтвораны потым на Усерасійскім з'ездзе работнікаў транспарту ў саюз пад назвай «Викжелдор». Пры ўсім падабенстве назваў і аб'яўленых мэтаў і задач, паміж двума прафсаюзамі меліся істотныя разыходжанні ў ацэнцы кастрычніцкіх падзей і ў планах уладкавання жыцця ў краіне. «Викжелдор» рашуча падтрымаў рэвалюцыйныя падзеі ў Петраградзе. Пра гэта сведчыць рэзалюцыя, прынятая агульным сходам служачых і рабочых Віцебскага вузла 30.10.1917 г. Баронячы інтарэсы рэвалюцыі, Ваенна-рэвалюцыйны камітэт Віцебска загадаў Галоўнаму камітэту Рыга-Арлоўскай чыгункі на Віцебскім вузле «неадкладна, у выпадку атрымання тэлеграфам звестак аб руху войск да Гатчыны, паведамляць гэтыя звесткі Ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту для прыняцця своечасовых мер, ні ў якім выпадку не прадастаўляць паравозы і рухомы састаў у іх войск распараджэнне, усімі сіламі і сродкамі, пад страхам суровай рэвалюцыйнай адказнасці, перашкаджаць і супраціўляцца руху войск да Піцера». Так, ужо 1.11.1917 г. на ст. Віцебск быў затрыманы 4-ы Данскі казачы полк з моцнай кулямётнай камандай, які быў распрапагандаваны і перайшоў на бок бальшавікоў, а ўсяго ў Віцебску было затрымана да 20 тыс. салдат і казакаў, накіраваных Стаўкай на Петраград і Маскву.

Неабходнасць утрымання заваёў рэвалюцыі на першае месца для прафсаюза чыгуначнікаў выводзіла клопаты аб бесперапыннай дзейнасці транспарту і аб паўсядзённым жыцці работнікаў чыгункі. Пратаколы прафсаюзных сходаў таго часу паказваюць, што прафсаюз не ўмешваўся ў тэхнічны бок справы, а вырашаў канкрэтныя пытанні — гаспадарчыя, кадравыя і нармавання працы, культурна-асветныя, змагаўся за ўмацаванне дысцыпліны на вытворчасці.

У сувязі з наступленнем нямецкіх войск была створана эвакуацыйная камісія, на якую была ўскладзена арганізацыя вывазу з горада матэрыяльных каштоўнасцей. Камісарам па ахове чыгункі быў прызначаны Трэйман. Адступленне пагрозы акупацыі горада не здымала пытання аховы чыгункі і яе ўстаноў.

24.7—11.8.1918 г. на Віцебскім чыгуначным вузле праходзіў 2-гі (потым перайменаваны ў 5-ы) прафсаюзны з'езд Рыга-Арлоўскай чыгункі. Асноўная частка разглядаемых пытанняў тычылася харчовага забеспячэння чыгуначнікаў і іх сем'яў. Абстаноўка на з'ездзе была напружаная, чаму спрыялі паведамленні аб фактах бюракратычнага і часам яўна правакацыйнага характару дзеянняў некаторых выканаўцаў па рэквізіцыі харчавання, нарыхтаванага чыгуначнікамі «самазакупам» на поўдні Расіі і Украіны, у сувязі з чым 30.7.1918 г. ў Маскву была адпраўлена тэрміновая тэлеграма.

Стан транспартных камунікацый пасля адступлення лініі фронту патрабаваў неадкладных аднаўленчых работ, катастрафічна не хапала паліва. Таму, нягледзячы на недахоп кваліфікаваных кадраў, выдзяляліся людзі на нарыхтоўку дроў, паколькі забеспячэнне бесперапыннай дзейнасці транспарту прыраўноўвалася да ваенна-аператыўных заданняў.

Прафсаюзныя актывісты-чыгуначнікі прымалі шырокі ўдзел у працы Віцебскага губсавета прафсаюзаў. У снежні 1920 г. чыгунку ў ім прадстаўлялі Антон Юшкевіч, Горбуль, Аляксандр Сабалеўскі, Кляменцій Сівохін, Баляслаў Маскалюк, Аляксандр Найдзёнак, Іосіф Лугоўскі, Міхаіл Лабейка, Альберт Эрнін, Мікалай Шарыкаў, Мікалай Жураў, Дзмітрый Зайцаў, Стэфан Пушны, Канстанцін Багдановіч. На 27.11.1920 г. прафсаюзная арганізацыя Віцебскага чыгуначнага вузла налічвала 3765 чалавек.

За свае працоўныя заслугі Акім Іванавіч Берасцень — арганізатар і стваральнік уласнай чыгуначнай вытворчасці будаўнічых матэрыялаў — і Кляменцій Фліпавіч Сівохін — актыўны ўдзельнік аднаўлення чыгункі, вядомы рацыяналізатар — былі прадстаўлены да ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Да 1924 г. ўся гаспадарка Віцебскага чыгуначнага вузла была поўнасцю адноўлена. Да 1926 г. дэпо атрымала новыя айчынныя паравозы, у 1927 г. грузавыя цягнікі пачалі абсталёўвацца аўтаматычнымі тармазамі. У 1928 г. ў дэпо ўпершыню ўстанавілі механічны паваротны круг. З'яўленне новых паравозаў «ФД» дазволіла давесці вагу грузавых цягнікоў да 2800 т, а іх хуткасць дасягнула 50 км/гадз.

Пры ўсёй недасканаласці кіравання народнай гаспадаркай у той складаны перыяд разруха, адсталасць, галеча адступалі, павышалася прадукцыйнасць працы, раслі жыццёвы ўзровень, адукацыя і культура чыгуначнікаў.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці,

ф. 41, воп. 1, спр. 6, л. 94, 105;

ф. 107, воп. 1, спр. 3, л. 8, 9, 13; спр. 4, л. 16, 179; спр. 19;

ф. 835, воп. 1, спр. 1, л. 2, 4, 5; спр. 18, л. 30; спр. 39, л. 4; спр. 59, л. 17; спр. 247. л. 9;

ф. 9742, воп.1, спр. 155, л. 99;

ф. 10050, воп. 1, спр. 2, л. 42, 43.

Г.Якаўлеў.

Віцебск у адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле краіны. З 7(20).11.1917 г. горад уваходзіў у склад Заходняй вобласці, якая з 13.9.1918 г. пачала называцца Заходняй Камунай. 1.1.1919 г. быў абвешчаны Маніфест аб стварэнні ССРБ, што было заканадаўча замацавана 2 лютага 1-м Усебеларускім з'ездам Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Але тады ж Віцебск адышоў у склад РСФСР. Дарэчы, супраць уключэння Віцебскай губерні ў склад Беларускай рэспублікі выказаўся губком РКП(б). Вясной 1919 г. на тэрыторыю Беларусі ўварваліся польскія войскі. У сувязі з тым, што Віцебск апынуўся ў прыфрантавой паласе, загадам начальніка гарнізона ад 22 жніўня горад быў аб'яўлены на ваенным становішчы. Адпаведна ўказанням рэўваенсавета Заходняга фронту ад 6.10.1919 г. быў створаны Віцебскі губернскі рэвалюцыйны камітэт, у склад якога ўвайшлі старшыня губвыканкома Сяргееўскі, старшыня губкома РКП(б) Пяскоўскі, губваенком Скудрэ і камісар 17-й стралковай дывізіі Жгун. Губрэўком сумесна с прафсаюзамі арганізаваў рабочыя атрады для абароны горада і будаўніцтва ўмацаванняў. На абарончых работах штодзённа было занята больш за 1000 чалавек. Яшчэ ў маі 1919 г. быў створаны атрад асобага прызначэння. Важным крокам на шляху далейшага развіцця Віцебскага рэгіёна з'явілася рашэнне 1-й сесіі ЦВК СССР па пытанні аб перадачы Беларусі раёнаў з пераважна беларускім насельніцтвам. Прэзідыум ЦВК СССР 4.2.1924 г. прыняў пастанову перадаць БССР са складу Віцебскай губерні па межах адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу 1920 г. 8 паветаў, на аснове якіх 17.7.1924 г. была створана Віцебская акруга. Акт камісіі народных камісараў БССР па прыёму тэрыторыі Віцебскай губер-

ні, перададзенай БССР, быў падпісаны 4.3.1924 г. старшынёй Віцебскага губвыканкома Дз.Ф.Прышчэпавым і старшынёй паўнамоцнага камітэта СНК БССР па прыёму тэрыторыі Віцебскай губерні Я.А.Адамовічам. На момант падпісання акта агульная колькасць насельніцтва далучаных тэрыторый складала 193 426 чалавек, з іх 197 185 гарадскіх жыхароў. 26.7.1930 г. Віцебская акруга была скасавана, і Віцебск на нейкі час стаў усяго толькі адным з 90 раённых цэнтраў БССР. Аднак падпарадкаванне раёнаў непасрэдна рэспубліканскім структурам сябе не апраўдала. 15.1.1938 г. Віцебск стаў цэнтрам новаўтворанай Віцебскай вобласці (насельніцтва горада на той час склала 167 424 чал.), а 27.9.1938 г. атрымаў статус горада абласнога падпарадкавання.

Гаспадарчае будаўніцтва. Акрамя задач па абароне заваёў рэвалюцыі, у першыя гады Савецкай улады вырашаліся і задачы гаспадарчага будаўніцтва, праграму якога прыняў 1-ы губернскі з'езд Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Яна прадугледжвала нацыяналізацыю банкаў, канфіскацыю прыбыткаў, увядзенне працоўнай павіннасці, вырашэнне харчовага пытання, арганізацыю саўнаргасаў, устанаўленне рабочага кантролю на прадпрыемствах, аднаўленне прамысловай вытворчасці, барацьбу з беспрацоўем. Адным з першых актаў Віцебскага Савета з'явілася ўвядзенне рабочага кантролю на льнопрадзільнай фабрыцы «Дзвіна», электрастанцыі, фабрыцы Левінсона, акулярнай фабрыцы, заводзе сельгасмашын Берліна і іншых прадпрыемствах. Унікальная ў сваім родзе форма арганізацыі вытворчасці нарадзілася ў гэты час у Віцебску. У сувязі з рэзкім павелічэннем беспрацоўя, выкліканым масавай дэмабілізацыяй з войска, у канцы 1917 г. па ініцыятыве прафсаюзаў быў створаны Камітэт па барацьбе з беспрацоўем. На базе артылерыйскіх майстэрань былі адкрыты дрэваапрацоўчы завод, шавецкая, кравецкая і рымарская майстэрні. Колькасць рабочых на прадпрыемствах камітэта павялічылася з 240 чалавек у 1917 г. да 1635 у 1920 г. Нягледзячы на велізарныя эканамічныя цяжкасці, гэтыя прадпрыемствы ўяўлялі сабой устойлівую гаспадарчую сістэму, якая ў 1921 г. была нацыяналізавана і перададзена ў падначаленне Віцебскаму саўнаргасу.

У першыя паслярэвалюцыйныя гады прамысловасць горада знаходзілася ў заняпадзе з-за недахопу паліва, сыравіны, зношанасці абсталявання. Многія фабрыкі і заводы прастойвалі. Рэзка скараціўся падвоз сыравіны і харчавання. У асобныя месяцы 1921 г. і без таго невялікія хлебныя пайкі скарачаліся на 50%. Пагалоскамі кранштацкіх падзей сакавіка 1921 г. сталі хваляванні рабочых фабрыкі «Дзвіна» і воднага транспарту. У справаздачы Віцебскай губернскай эканамічнай нарады Савета Працы і Абароны за перыяд з 1.10.1921 г. па 1.4.1922 г. адзначалася, што аб'ём прамысловай вытворчасці ў горадзе і губерні ў параўнанні з даваенным часам скараціўся амаль напалову. Голад і іншыя цяжкасці адмоўна ўплывалі на настрой рабочых, параджалі песімізм, маркоту. Яны аказвалі непасрэдны ўплыў і на іх палітычную пазіцыю. Пад уздзеяннем цяжкага эканамічнага становішча некаторыя рабочыя выходзілі з бальшавіцкай партыі. Іншыя траплялі пад уплыў эсэраў і меншавікоў, анархістаў, якія выступалі з крытыкай палітыкі бальшавікоў, абвінавачвалі іх у няздольнасці кіраваць краінай, у дыктатуры і тэроры. Камуністычныя ячэйкі прадпрыемстваў былі тады нешматлікія і не маглі сур'ёзна ўплываць на фарміраванне палітычнага настрою рабочых, сярод якіх (асабліва сярод былых вяскоўцаў) пераважалі анархісцкія і эсэраўскія погляды.

Пераход да нэпу, нягледзячы на тлумачальную работу, многімі быў успрыняты неадназначна, у тым ліку і радавымі бальшавікамі (у многіх ячэйках у 1921 – 22 гг. адзначалася перавышэнне колькасці тых, хто выйшаў (або быў выключаны) з партыі, над колькасцю тых, хто ўступіў). Напрыклад, на праведзенай у Віцебску 21.4.1921 г. беспартыйнай рабочай канферэнцыі па дакладу старшыні губвыканкома І.Варэйкіса «Аб бягучым моманце» была адхілена прапанаваная бальшавікамі рэзалюцыя і прынята меншавіцкая, у якой асуджалася сацыяльна-эканамічная палітыка бальшавіцкай партыі. Гэтую рэзалюцыю падтрымалі рабочыя сходы акулярнай і іголкавай фабрык. Аднак большасць працоўных ухваліла пераход да новай эканамічнай палітыкі. Новая эканамічная палітыка, паварот да больш жыццяздольных метадаў эканамічнага кіраўніцтва актывізавалі гаспадарчае жыццё. Аднавіла працу льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна», пачаў працаваць гарбарны завод №1, рыхтавалася да выпуску прадукцыі абутковая фабрыка імя Лекерта (пачала дзейнічаць у 1923), завяршылася абсталяванне швейнай фабрыкі «Прафінтэрн». Быў адрамантаваны і перабудаваны будынак панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цэткін, піваварны завод; на акулярнай фабрыцы прыступілі да шліфавання ап-

Ударная брыгада.

тычнага шкла. На базе дробных паўсаматужных металаапрацоўчых майстэрань стваралiся цэхі завода сельскагаспадарчых машын «Чырвоны металіст», які ўвайшоў у строй у 1925 г. (з 1934 — станкабудаўнічы завод імя Кірава). Але, нягледзячы на пэўныя поспехі, на шляху прамысловага будаўніцтва меліся і складанасці. Усталяваліся высокія цэны на прамысловыя тавары і нізкія — на прадукты сельскай гаспадаркі. У цяжкім становішчы апынуліся ў першую чаргу швейныя прадпрыемствы горада, на якіх звычайнай справай стала затрымка зарплаты. Для аздараўлення эканомікі было праведзена ўпарадкаванне цэн, скарачэнне гандлёвых і накладных выдаткаў, грашовая рэформа. Аднародныя прадпрыемствы былі сгрупаваны ў галіновыя аб'яднанні — «Металапрам», «Кожпрам», «Швейпрам» і г.д., якія потым увайшлі ў адпаведныя прамысловыя трэсты, што давала магчымасць эфектыўна выкарыстоўваць абаротныя сродкі, знізіць накладныя расходы. Частка прадпрыемстваў была пераведзена на гаспадарчы разлік. Гэтыя мерапрыемствы далі пэўныя вынікі. Вясной 1924 г. прадукцыйнасць працы ў параўнанні з 1923 г. павялічылася на 13%. У 1925 г. ў горадзе пачаўся рэгулярны аўтобусны рух. Да канца 1925 г. большасць прадпрыемстваў горада па выпуску асноўных відаў прадукцыі пераўзышла даваенны ўзровень, многія былі рэканструяваны, перайшлі на двухзменную працу. У сярэднім аб'ём валавой прадукцыі павялічыўся ў параўнанні з 1924 г. на 29,8%. Але разам з тым некаторыя прадпрыемствы, напрыклад абутковая фабрыка, былі закрыты з-за крызісу збыту прадукцыі, па-ранейшаму мелі месца выпадкі затрымкі заработнай платы. Уцягванне прыватнага капіталу з утоенага становішча ў легальны абарот на аснове нэпа садзейнічала хуткаму пад'ёму вытворчасці і таваразвароту. У Віцебску ўжо ў верасні 1921 г. налічвалася 1997 прыватных гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў. Пераважная большасць такіх прадпрыемстваў былі дробныя і абыходзіліся без наёмных рабочых. Іх гаспадары з'яўляліся непасрэдна і вытворцамі, адносіць якіх да буржуазіі, няхай і дробнай, неапраўдана. Іх жыццё мала чым адрознівалася ад жыцця фабрычных рабочых. Многія з іх жылі ў тых самых памяшканнях, дзе працавалі. Рабочы дзень нярэдка складаў 10—12 гадзін, заробак не перавышаў аплату працы рабочых на заводах. Але сацыяльна-эканамічная палітыка дзяржавы ў адносінах да саматужнікаў і рамеснікаў нярэдка не ўлічвала іх цяжкага становішча. Падаткі і іншыя плацяжы былі непамерна высокія. Паварот жа да палітыкі індустрыялізацыі фактычна азначаў знішчэнне прыватнага сектара ў эканоміцы. Да пачатку 1-й пяцігодкі колькасць цэнзавых прадпрыемстваў у Віцебску складала 41, на іх працавалі 8786 рабочых. Аб'ём капітальных укладанняў у прамысловасць Віцебска ў гады 1-й пяцігодкі перавысіў 38 млн. руб., з іх больш за 23 млн. руб. было накіравана на будаўніцтва новых прамысловых аб'ектаў. У 1928—33 гг. былі пабудаваны фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», панчошна-трыкатажная імя КІМ, шчаціннашчотачны камбінат, элеватар, заводы — маслабойны, 2 цагельныя, вапнавы. Многія паўсаматужныя прадпрыемствы былі рэканструяваны і набылі рэспубліканскае і агульнасаюзнае значэнне. Але даволі часта прадпрыемствы не выконвалі планы прамысловага развіцця. Так, у 1932 г. ён быў выкананы на 77,8%, а ў 1933 г. — на 83,6%. З пачатку 1930-х гадоў сістэматычна, з квартала ў квартал, не выконваліся прамфінпланы на новых прадпрыемствах, дзе якасць выпускаемай прадукцыі была асабліва нізкай. Напрыклад, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» стаяла перад пагрозай закрыцця цэха па пашыве паліто з-за сістэматычнага выпуску браку ў вялікай колькасці. У гады 2-й пяцігодкі (1933—37) былі пабудаваны ЦЭЦ, халадзільнік, кінатэатр, масты цераз Дзвіну і Віцьбу. Працягласць трамвайных ліній узрасла на 8 км, з'явіліся новыя аўтобусныя маршруты. Праводзілася рэканструкцыя на фабрыках — ільнопрадзільнай «Дзвіна», акулярнай, панчошна-трыкатажнай імя КІМ і імя К.Цэткін, на заводах — ігольным, гарбарным, станкабудаў-

нічым імя Кірава, у чыгуначным дэпо. У 1940 г. на базе чыгуналіцейна-машынабудаўнічага завода быў створаны станкабудаўнічы завод імя Камінтэрна. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны Віцебск з'яўляўся буйным прамысловым цэнтрам. Працягвалася развіццё тэкстыльнай вытворчасці з выкарыстаннем мясцовай сельскагаспадарчай сыравіны. Значна ўзрасла доля трыкатажнай прамысловасці. Пабудаваная ў гады 1-й пяцігодкі фабрыка «КІМ» і рэканструяваная фабрыка імя Клары Цэткін з'яўляліся буйнейшымі прадпрыемствамі галіны ў СССР. У 1940 г. аб'ём іх прадукцыі склаў 73 млн. пар панчошна-шкарпэткавых і больш як 13 млн. вырабаў трыкатажнай бялізны. Значнай была роля і прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці. Напрыклад, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» выпускала за год прадукцыі на 40—45 млн. руб. Фабрыка «Прафінтэрн» у 1940 г. выпрабіла прадукцыі на 20,8 млн. руб. Найбольш моцнымі прадпрыемствамі гарбарна-абутковай прамысловасці з'яўляліся гарбарны завод імя Еўсцігнеева і абутковая фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» і «Прагрэс». Шчацінна-шчоткавы камбінат у 1941 г. лічыўся найбольш механізаваным прадпрыемствам у краіне. Дрэваапрацоўчая прамысловасць была прадстаўлена 2 лесапільнымі заводамі, фанерным заводам і 2 мэблевымі фабрыкамі. Значныя запасы высокаякасных пластычных глін і даламітызаваных вапнякоў сталі базай для буйной вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, у прыгарадзе (Вярхоўе і Левая Руба) былі пабудаваны 2 заводы па абпальванні вапны, у горадзе таксама дзейнічалі 2 заводы па вырабе чарапіцы. Свой значны ўклад уносілі і металаапрацоўчыя прадпрыемствы. Акрамя гэтага, 3 станкабудаўнічыя заводы горада вырабілі ў 1940 г. прадукцыі на 16 млн. руб. Акулярная фабрыка з гадавым аб'ёмам прадукцыі 27,5 млн. руб., на якой працавалі 842 чалавекі, была адзіным у СССР прадпрыемствам па вырабе аптычных акуляраў і ахоўных акуляраў і прылад. Харчовую прамысловасць на 1.1.1941 г. ў горадзе прадстаўлялі 2 хлебазаводы, маслабойны, малочны, дражджавы і піваварны заводы, мясакамбінат, птушкакамбінат, махорачная фабрыка. У 1938 г. пачала дзейнічаць абласная друкарня імя Камінтэрна, якая з'яўлялася самым сучасным прадпрыемствам горада. Яе вытворчыя магутнасці на 1.1.1941 г. ацэньваліся ў 876 тыс. руб. Побач з магутнай дзяржаўнай прамысловасцю існавала разгалінаваная сетка прадпрыемстваў прамысловай кааперацыі, на якія ў 1941 г. прыйшлося 85% вытворчасці тавараў народнага спажывання.

Дом-камуна.

Жыллёвае пытанне. У галіне жыллёвага забеспячэння 1920-я гады можна назваць крызіснымі. Асноўная колькасць жылых памяшканняў знаходзілася ў прыватным уладанні: 6561 з 7044 (92,5%). Адносіны мясцовых улад да домаўладальнікаў былі дастаткова складанымі, іх абвяшчалі дробнабуржуазнымі элементамі, а як вынік, на гэтай падставе выключалі з партыі, прафсаюзаў, звальнялі з устаноў. Таму дзесяткі людзей, баючыся ўціску, пакідалі свае дамы. У гады грамадзянскай вайны частка дамоў у Віцебску без неабходнасці была канфіскавана, частка пакінута ўладальнікамі. У выніку ў 1920 г. ў сістэме камунальнага аддзела апынулася 160 дамоў, з якіх трэцяя частка магла пайсці толькі на разборку ў якасці будаўнічага матэрыялу, каля паловы патрабавала капітальнага рамонту, і толькі астатнія (каля 20%) былі населены, але і яны патрабавалі бягучага рамонту. Нягледзячы на ўсе папярэджанні з боку цэнтра, муніцыпалізацыя ў горадзе працягвалася. Калі ў 1920 г. такіх дамовых уладанняў у Віцебску было 160, то ў 1922 г. — 250. Прыватнае жыллёвае будаўніцтва з 1919 г. амаль поўнасцю спынілася. Некаторае яго аднаўленне пачалося ў 1922 г., аднак у выглядзе невялікіх драўляных дамоў плошчай 6—10 кв. сажняў самай простай канструкцыі, прызначаных для адной сям'і ўласніка. Такім чынам у Віцебску быў пабудаваны 31 драўляны дом.

Ва ўмовах устойлівага росту колькасці гарадскога насельніцтва, пры адсутнасці сродкаў на будаўніцтва новага жылля, у першай палавіне 1920-х гадоў мясцовыя ўлады шука-

Жылы дом спецыялістаў.

лі дзейсныя падыходы да вырашэння праблемы. І адным з іх стала браніраванне 30% плошчы ў прыватнаўладальніцкіх дамах для рабочых. Напрыклад, у 1924 г. такімі былі 2034 пакоі агульнай плошчай 7078 кв. сажняў. Сродкі, якія камунальныя аддзелы мелі для вырашэння жыллёвага пытання, галоўным чынам ішлі на рамонт старога жылля, якое засялялася рабочымі. Менавіта гэтая сацыяльная катэгорыя атрымлівала ўсе плошчы, якія вызваляліся пасля выезду ўстаноў з прыватных будынкаў. Працэс меў і другі бок — ад былых уладальнікаў паступалі заявы аб дэмуніцыпалізацыі канфіскаваных дамоў. У 1921 г. ў Віцебскім гарадскім камунальным аддзеле былі зафіксаваны 123 такія просьбы. Але дэмуніцыпалізацыі ў Віцебскай губерні да 1922 г. не было, за выключэннем Веліжа. У канцы 1920-х гадоў разгарнулася будаўніцтва мураваных секцыйных жылых дамоў, школ, дзіцячых устаноў, крамаў у пасёлках пры буйных прадпрыемствах. На галоўных магістралях горада былі ўзведзены 4-павярховыя жылыя дамы камунальнага тыпу, дзе ў адным будынку аб'ядноўваліся жылыя і грамадскія гаспадарчыя памяшканні. Сярод такіх будынкаў вылучаецца т.зв. «Дом-камуна», пабудаваны ў 1927—29 гг. і разлічаны на пражыванне 280—300 чалавек. Для вядучых спецыялістаў горада ў 1935 г. быў узведзены 5-павярховы жылы дом («Дом спецыялістаў»). Новым тыпам грамадскіх будынкаў сталі заводскія клубы, дзе пад адным дахам размяшчаліся розныя па свайму прызначэнню памяшканні. 1-ы генеральны план рэканструкцыі Віцебска, распрацаваны ў 1938 г., вызначаў далейшыя перспектывы развіцця горада з улікам яго гістарычных асаблівасцей. Прадугледжвалася будаўніцтва кальцавой аўтамагістралі, якая злучыла б ускраіны і звязала б іх з цэнтрам. Але вайна перашкодзіла рэалізацыі гэтага плана.

Сацыяльная сфера. Сацыяльнай базай савецкай дзяржавы з'яўляўся пралетарыят, які ў 1920-я гады ў Віцебску быў нешматлікім, складаючы каля 6% (5650 пры колькасці гараджан 90 918 у 1923 г., 6232 і 98 808 адпаведна ў 1926 г.). Таму невыпадкова 14-я Віцебская губернская канферэнцыя РКП(б) (5—7.4.1923) вымушана была канстатаваць, што губком абапіраецца не на мясцовых рабочых, а на вайскоўцаў і чыгуначнікаў.

Пэўныя асаблівасці меліся ў развіцці сацыяльнай сферы. Ва ўмовах эканамічнай разрухі пачатку 1920-х гадоў ажыццявіць адначасова ўстойлівае забеспячэнне сацыяльных патрэб усіх катэгорый насельніцтва было проста немагчыма, таму згодна марксісцкай тэорыі аб тым, што пралетарыят з'яўляецца асноўнай прагрэсіўнай сілай, бальшавікі ажыццяўлялі класавы падыход у ажыццяўленні сацыяльнай палітыкі. Пасля таго як на тэрыторыі губерні скончыліся ваенныя дзеянні, рабіліся спробы арганізаваць дапамогу самым безабаронным катэгорыям: інвалідам і пенсіянерам. У 1921 г. было зарэгістравана 7560 інвалідаў працы, 6389 — імперыялістычнай вайны, 1633 інваліды грамадзянскай вайны. Былі адкрыты першыя інвалідныя дамы, але большасць іх насельнікаў з-за недахопу харчавання былі вымушаны жабраваць. Ва ўмовах пераходу сацыяльнага забеспячэння на мясцовыя сродкі ў кастрычніку 1922 г. ў Віцебску існавала 6 інвалідных дамоў на 284 чалавекі. У гэты перыяд у горадзе для працы інвалідаў былі адкрыты кравецкая і шавецкая майстэрні на 30 чалавек кожная. Наступствы войн і эканамічныя цяжкасці адбіліся на дзіцячых лёсах, выклікалі рост беспрытульніцтва. У гэтых умовах улады былі вымушаны ісці на ўсялякую падтрымку прыёмнікаў-размеркавальнікаў, дзіцячых дамоў, працоўных камун, сталовых. Гэтая работа была ўскладзена на жаночыя аддзелы партыйных і савецкіх органаў. У 1920 г. ў Віцебску існавала 21 дзіцячая камуна. Даволі часта праводзіліся тыдні дапамогі беспрытульным, якія арганізоўваліся Віцебскім фондам імя Леніна, створаным у лютым 1924 г. У снежні 1923 г. ў горадзе было створана таварыства «Сябры дзяцей», якое ў гэтым жа годзе адкрыла размеркавальнік для беспрытульных дзяцей

на 30 месцаў, 3 камерцыйныя прадпрыемствы, кансультацыю для немаўлят. Характэрнай рысай гэтага этапу развіцця сістэмы аховы здароўя з'явілася выдзяленне рабочай медыцыны і перавод усіх астатніх устаноў на гаспадарчы разлік. 2-я палавіна 1921 г. і ўвесь 1922 г. прайшлі пад знакам скарачэння штатаў і пераводу аптэчнай сістэмы на гаспадарчы разлік. Згодна скарачэнню лячэбнага апарату з 1145 ложкаў у Віцебску да лістапада 1922 г. засталося 835, для абслугоўвання рабочых і служачых у горадзе было пакінута 3 аптэкі. Але становішча і захаванай сеткі лячэбных устаноў было цяжкім. Забеспячэнне медыкаментамі ў 1924 г. было катастрафічна недастатковым. Пасылаемыя па развёрстцы перавязачныя матэрыялы, жарапаніжальныя сродкі задавальнялі толькі 5% патрабаванняў. Не лепшым было і харчаванне хворых. З патрэбных па норме мяса, рыбы, круп, малака, агародніны, бульбы і цукру яны атрымалі ў 1924 г. 75% бульбы і цукру, толькі 5% малака. На 1.10.1924 г. ў Віцебску было 7 бальніц на 418 ложкаў, 2 пункты першай дапамогі, 4 амбулаторыі, 7 зубных кабінетаў, 2 дыспансеры, 2 санаторыі. Ва ўмовах пачатку эканамічнай стабілізацыі павялічваліся затраты на ахову здароўя. Калі ў 1923 г. на аднаго віцябляніна яны склалі 2 руб. 45 кап., то ў 1925 г. — ужо 3 руб. Важкім звяном новай сістэмы аховы здароўя было сацыяльнае страхаванне. Арганізацыя меддапамогі застрахаваным ажыццяўлялася ў адпаведнасці з пастановай НКЗ і ВЦСПС ад 20.11.1922 г. Яна прадугледжвала пераважнае абслугоўванне застрахаваных. Да гэтай катэгорыі ў першую чаргу адносілі рабочых і служачых. Менавіта для іх павінны былі выкарыстоўвацца лепшыя лячэбныя ўстановы, лепшыя спецыялісты, уключаючы выдзяленне адпаведных медыцынскіх устаноў толькі для абслугоўвання застрахаваных, што і адбылося ў Віцебску. Ужо з 15.5.1923 г. была арганізавана амбулаторыя для прыёму толькі застрахаваных, яе прапускная магчымасць у дзень складала 200–240 чалавек на прыёме і 500–600 на даму. З 15 чэрвеня па такой жа схеме пачала працаваць і раённая амбулаторыя. З красавіка ўсе застрахаваныя атрымлівалі бясплатныя лекі ва ўсіх аптэках горада з пометкай «за кошт страхавога савета». У верасні была арганізавана аптэка пры 1-й амбулаторыі, якая адпускала лекі толькі застрахаваным з прапускной магчымасцю 220–280 рэцэптаў у дзень.

Яшчэ ў 1921 г. адкрылася 3-гадовая акушэрская школа і фармацэўтычныя курсы, Дом санітарнай асветы. У наступныя гады сетку медыцынскіх устаноў Віцебска папоўнілі 1-я гарадская бальніца (створана на базе абшчыны сясцёр міласэрнасці, 1923), бальніца «Дзвіна» (1932), абласная бальніца (1935). У 1934 г. адкрылася бальніца-медінстытут (з 1938 — медінстытут). У 1937 г. былі пабудаваны новы радзільны дом, санітарныя яслі, капітальна адрамантаваны Дом маці і дзіцяці, рэарганізавана служба хуткай дапамогі. Аднак план па засваенню капітальных укладанняў у ахову здароўя быў выкананы толькі на 92%. Ложкавы фонд бальніц быў недастатковы, на якасць медыцынскага абслугоўвання ўплываў недахоп персаналу (на 1 урача прыходзіліся ў сярэднім 2–3 пасады). У 1940 г. ў горадзе мелася 11 бальніц на 1747 месцаў (у тым ліку клінічная бальніца на 360 ложкаў, дзіцячая бальніца на 120, туберкулёзная — на 110 ложкаў), 9 кансультацый і паліклінік, працавалі 336 урачоў і 590 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу.

Праграма беларусізацыі. 15.7.1924 г. ЦВК БССР прыняў пастанову «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі», якая стала асноўным нарматыўным актам праграмы, якая атрымала назву беларусізацыі. Асноўныя этапы яе правядзення на Віцебшчыне былі разгледжаны і замацаваны ў пастанове пленума Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б ад 17.11.1924 г. Ужо 1-я акруговая партыйная канферэнцыя, якая праходзіла ў снежні 1924 г., канстатавала першыя дасягненні ў вобласці беларусізацыі: ва ўсіх сямігодках, ФЗВ, прафтэхшколах, вячэрніх школах рабочай моладзі горада было ўведзена выкладанне беларускай мовы, а ў тэхнікумах (педагагічным, настаўніцкім і кааператыўным) пачалося выкладанне гісторыі і гістарыяграфіі Беларусі на беларускай мове. Было арганізавана акруговае таварыства краязнаўства, мэтай якога з'яўлялася вывучэнне этнаграфіі, гісторыі, стану прамысловасці і сельскай гаспадаркі краю. Да 1927 г. яно выдала шэраг навуковых прац, у тым ліку «Витебский краевой словарь». Але адной з асноўных складанасцей на шляху пераводу адукацыі на беларускую мову з'яўлялася невялікая колькасць настаўнікаў, якія ведалі беларускую мову. Так, па Віцебску ў 1924 г. іх налічвалася не больш за 30 чалавек. Мяняліся падыходы да моўнай палітыкі і ў

сродках масавай інфармацыі, друкаваны орган Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б газета «Заря Запада» з ліпеня 1924 г. пачаў выходзіць на рускай, беларускай і яўрэйскай мовах. З 12.9.1925 г. выходзіла «Витебская крестьянская газета», якая з 7-га нумара перайшла на беларускую мову. Зыходным прынцыпам беларусізацыі было забеспячэнне правоў і магчымасцей кожнай нацыі, што пражывала на Беларусі, на навучанне дзяцей на роднай мове. Практычныя мерапрыемствы ў галіне нацыянальнай палітыкі былі распрацаваны кастрычніцкім (1924) пленумам Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б. Прадугледжвалася для супрацоўнікаў арганізацый і ўстаноў абавязковае веданне беларускай і рускай моў, а для пэўнай колькасці супрацоўнікаў яшчэ дадатковае веданне польскай ці яўрэйскай.

У 1924/25 навучальным годзе ў школьнай сетцы Віцебска мелася 127 класаў беларускіх, 88 рускіх, 39 яўрэйскіх, 12 польскіх, 4 латышскія. У Віцебску меліся 2 нацыянальныя ўчасткі народных судоў (латышскі і яўрэйскі), быў арганізаваны прыём заяў і скаргаў на мовах нацменшасцей. Беларусізацыя ў Віцебску была састаўной часткай агульнарэспубліканскага працэсу. За кароткі прамежак часу ўдалося зрабіць велізарны аб'ём работы. На беларускую мову перайшла сістэма адукацыі. Да канца 1925 г. беларускія класы ў школьнай сетцы Віцебска складалі 47%. Паказальным з'яўляецца той факт, што сярод вучняў школ горада беларусы складалі 33,6% (3970 чалавек), а працэнт тых, хто атрымліваў адукацыю на беларускай мове, быў вышэйшы — 35,4% (4186). Гэта сведчыць аб росце прэстыжу беларускай мовы. У Віцебску працавалі дзяржаўны тэатр (БДТ-2), тэатр рабочай моладзі з беларускім і яўрэйскім аддзяленнямі, узрасла плынь нацыянальных пісьменнікаў. Але на пачатку 1930-х гадоў антыбеларускія тэндэнцыі ў партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве ўзялі верх. Праграма беларусізацыі была фактычна пахавана, найбольш актыўныя яе ўдзельнікі і прыхільнікі сталі ахвярамі рэпрэсій.

У 1933 г. ў горадзе было 60 школ, педагагічны і ветэрынарны інстытуты, 7 тэхнікумаў, 2 дзённыя і 4 вячэрнія рабфакі, 9 ФЗВ, шэраг іншых навучальных устаноў. Таксама працавалі 2 навукова-даследчыя інстытуты, 19 бібліятэк, 21 клуб, узгаданыя вышэй тэатры, 3 кінатэатры (з іх 1 — гукавы), 4 музеі. У 1934 г. пачала дзейнічаць бальніца-медінстытут (з 1938 — Віцебскі медінстытут), у 1935 г. пры педагагічным інстытуце (які пасля рэарганізацыі меў 4-гадовы цыкл навучання) адкрыўся настаўніцкі інстытут (праіснаваў да 1955), які рыхтаваў настаўнікаў для 7-гадовай школы. На 1.1.1938 г. ў 4 ВНУ горада налічвалася 212 выкладчыкаў і 2045 студэнтаў, а ў 15 сярэдніх спецыяльных навучальных установах — 4662 студэнты і навучэнцы і 335 выкладчыкаў. У 1940 г. ва ўсіх навучальных установах Віцебска навучалася каля 50 тыс. чалавек, акрамя вышэйшых і спецыяльных навучальных устаноў дзейнічалі 43 школы, 53 дзіцячыя садкі і 29 ясляў на 6120 месцаў, колькасць бібліятэк узрасла да 40.

Культурнае жыццё. Т э а т р. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тэатральнае жыццё горада актывізавалася. У 1918 г. пры гарадскім тэатры арганізавалася акцёрская студыя — 52 чалавекі (праіснавала да 1920). Менавіта ў Віцебску нарадзіўся першы ў Савецкай Расіі агітацыйна-прапагандысцкі Тэатр рэвалюцыйнай сатыры (Тэрэўсат), стваральнікамі якога былі М.Пустынін і А.Сумарокаў. Першае выступленне адбылося ў лютым 1919 г. на прывакзальнай плошчы перад чырвонаармейцамі, якія адпраўляліся на фронт. У маі 1920 г. віцебскіх акцёраў запрасілі на гастролі ў Маскву, дзе выступленні прайшлі з вялікім поспехам, пасля чаго значная частка калектыву засталася ў Маскве, дзе стала асновай трупы Тэатра рэвалюцыі (цяпер — тэатр імя Маякоўскага). У 1919—20 гг. па ініцыятыве Пралеткульта была створана сетка тэатральных кружкоў, а з сярэдзіны 1920 г. працавалі калектывы «Сіняй блузы». У 1919 г. пры губернскім камітэце дапамогі чырвонаармейцам узнікла Юнацкая драматычная студыя, якая стала асновай для стварэння ў 1923 г. губернскага Паказальнага тэатра. Тэатр абслугоўваў шпіталі і вайсковыя часці, арганізоўваў спектаклі для дзяцей і рабочай моладзі. У 1926 г. на базе Беларускай драматычнай студыі (1921—26, Масква) ў Віцебску быў створаны Беларускі 2-гі дзяржаўны тэатр (БДТ-2; з 1944 — тэатр імя Якуба Коласа). У 1931—34 гг. існаваў Тэатр рабочай моладзі (ТРАМ), у рэпертуар якога ўваходзілі агітканцэрты і кампазіцыі, уласныя інсцэніроўкі.

М у з ы к а. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Віцебск стаў цэнтрам інтэнсіўнага развіцця нацыянальнай музычнай культуры. Вялізарнае значэнне для падрыхтоўкі кампазітарскіх і выканальніцкіх кадраў і непасрэдна-

га ўзбагачэння культурнага жыцця горада мела адкрыццё ў 1918 г. народнай кансерваторыі (з 1922 — музычны тэхнікум) і стварэнне сімфанічнага аркестра (кіраўнік Н.Малько, у саставе — каля 50 музыкантаў). Значны ўклад у музычнае жыццё Віцебска ўнёс кампазітар, педагог, дырыжор М.Анцаў (з 1918 — выкладчык народнай кансерваторыі, потым — музычнага вучылішча). У 1919 г. адбыўся 1-ы з'езд настаўнікаў спеваў і музработнікаў Віцебскай губерні, скліканы губернскім пададдзелам з мэтай шырокай прапаганды музыкі сярод народных мас. У час работы з'езда праводзіліся 2-тыднёвыя інструктарскія курсы настаўнікаў, на якіх чыталіся лекцыі па методыцы выкладання спеваў, гісторыі музыкі і эстэтыцы. У горадзе пастаянна выступалі хор (дырыжор М.Анцаў), струнны квартэт, выкладчыкі і навучэнцы народнай кансерваторыі, гастралявалі ансамбль Маскоўскага народнага дома, Петраградскі дзяржаўны балет, Украінскі музычна-драматычны тэатр, харавая капэла Ю.Агранёва-Славянскага. У 1924 г. Віцебск наведала славутая танцоўшчыца Айседора Дункан. У 1920—30-я гады музычнае жыццё канцэнтравалася вакол музычнага тэхнікума (з 1935 — музычнае вучылішча). Яркімі падзеямі сталі цыкл сімфанічных канцэртаў (1925), музычныя вечарыны, прысвечаныя Л.Бетховену (1927), П.Чайкоўскаму (1940).

Літаратура. Пасля ўсталявання Савецкай улады ў Віцебску выдаваліся газеты «Известия военно-революционного комитета г. Витебска», «К оружию», часопісы «Парус», «Штурм», «Искусство», дзе друкаваліся паэтычныя і празаічныя творы, літаратуразнаўчыя артыкулы. Рэпертуар тэатра рэвалюцыйнай сатыры складалі ў асноўным творы мясцовых аўтараў. Губернскі Пралеткульт арганізаваў у горадзе сетку кружкоў, рабочых клубаў, Камуністычны універсітэт, у якіх з лекцыямі выступалі літаратуразнаўцы М.Бахцін і П.Мядзведзеў, якія жылі тады ў Віцебску. У 1924—28 гг. дзейнічаў Віцебскі філіял аб'яднання беларускіх савецкіх пісьменнікаў «Маладняк», які выдаў зборнікі «Пачатак» і «Світанне», у 1931—32 гг. дзейнічала Асацыяцыя пралетарскіх пісьменнікаў (выйшаў зборнік «Рытмы будоўлі»). Частымі гасцямі Віцебска былі Я.Купала, Я.Колас, К.Чорны, горад наведвалі, прысвяцілі яму свае радкі А.Талстой (1924), Я.Райніс (1926), У.Маякоўскі (1927), і многія іншыя.

Мастацтва. Нягледзячы на пэўныя эканамічныя і палітычныя праблемы, а можа,



К.С.Малевіч. Трыбуна аратараў. Віцебск. 1919.

і дзякуючы ім, Віцебск у 1918—20 гг. стаў культурным цэнтрам, вакол якога згуртаваліся значныя мастацкія сілы. Па розных прычынах у гэты час у горад прыехала шмат вядомых мастакоў і выкладчыкаў жывапісу. Тое, што горад апынуўся па-за межамі зоны ваенных дзеянняў, быў адносна забяспечаны палівам і харчаваннем, стварыла для іх параўнальна спрыяльныя ўмовы для жыцця і працы. У 1918 г. на базе школы-майстэрні Ю.Пэна па ініцыятыве М.Шагала (прызначанага ў жніўні 1918 г. губернскім камісарам аддзела народнай адукацыі) была створана народная мастацкая школа, якую ўзначальвалі Ю.Пэн (1918), М.Дабужынскі (1918), М.Шагал (1919—20). Сярод выкладчыкаў школы былі К.Багуслаўская, В.Ермакова, К.Малевіч, І.Пуні, Ю.Пэн, Н.Шагал, Р.Фальк, скульптар Д.Якерсон. Пры школе існаваў музей сучаснага мастацтва (1919—21), у якім захоўваліся каля 120 твораў авангарднага характару (у тым ліку работы Н.Альтмана, А.Бразэра, Д.Бурлюка, П.Канчалоўскага, П.Кузняцова, М.Ларывонава, І.Машкова, К.Малевіча, Р.Фальпа, М.Шагала, С.Юдовіна; з 1925 г. частка фондаў музея школы захоўвалася ў абласным краязнаўчым музеі). «Рэвалюцыйны стыль» тагачаснага мастацтва ў поўным сэнсе выліўся на вуліцы і плошчы горада. Фасады дамоў былі пакрыты карцінамі, велізарнымі тэматычнымі пано, плакатамі. Паказальным у гэтым плане было афармленне горада да святкавання 1-й і 2-й гадавін Кастрычніка, створанае па эскізах М.Шагала, Э.Лісіцкага і В.Ермалаевай. У 1919 г. адбылася выстаўка твораў мастакоў-авангардыстаў, дзе акрамя работ віцебскіх жывапісцаў і графікаў, дэманстраваліся карці-

ны з музеяў Масквы і Петраграда. У 1920—23 гг. існавала арганізацыя «Сцвярджальнікі новага мастацтва», створаная з мэтай замяніць выяўленчае мастацтва абстрактнымі формамі вытворча-мастацкага канструявання. У 1920 г. К.Малевіч выпусціў у Віцебску кнігі «Бог не скінуты», «Мастацтва, царква, фабрыка», «Супрэматызм» (у апошняй аўтар выкладаў тэорыю новага авангардысцкага напрамку). У тым жа годзе народная мастацкая школа была пераўтворана ў вольныя мастацкія майстэрні, яшчэ праз год на іх аснове быў створаны мастацка-практычны інстытут (1921—23), які ў сваю чаргу быў рэарганізаваны ў мастацкі тэхнікум (1923—39), а потым у мастацкае вучылішча (1939—41).

Выдаваўся ў 1921 г. часопіс «Искусство». Вялікай папулярнасцю ў жыхароў горада карысталіся агітацыйна-прапагандысцкія мастацкія плакаты, якія выдаваліся Віцебскім аддзяленнем Расійскага тэлеграфнага агенцтва (РОСТА) у жніўні 1919 г. —, студзені 1921 г., так званыя «Окна РОСТА» («Окна сатиры»). Выпуск плакатаў быў звязаны з агіткампаніямі, якія праводзіліся ў горадзе і губерні. Тэатр рэвалюцыйнай сатыры стварыў больш за 120 спектакляў — жывых карцін «Вокнаў» (т.зв. тантамарэскі). Пад плакатамі змяшчаліся вершаваныя тэксты (найчасцей аўтарамі выступалі паэт-сатырык М.Пустынін і журналіст А.Ісбаха), тыраж вагаўся ад 1 да 5 тыс. экзэмпляраў. Але не хапала сродкаў, паперы, фарбаў у губернскай друкарні, таму частка задум не была рэалізавана. У 1921 г. быў выдадзены «Журнал Витебского отделения РОСТА» (адзін нумар), дзе падводзіліся вынікі работы аддзялення, былі апублікаваны агітп'есы і мініяцюры Пустыніна, асобныя малюнкі і тэксты «Вокнаў» і насценных газет. У 1927 г. пры мастацкім тэхнікуме ўтварылася аб'яднанне творчай моладзі «Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыі» (кіраўнік П.Гаўрыленка), якое рэгулярна праводзіла ў горадзе ў 1928—30 гг. выстаўкі работ сваіх удзельнікаў. У 1920-я гады пачало дзейнічаць акруговае таварыства краязнаўства (кіраўнік М.Каспяровіч, сярод удзельнікаў — І.Гаўрыс, А.Шлюбскі, М.Эндэ, І.Фурман; у 1927—32 — філіял Усебеларускага аб'яднання мастакоў), члены таварыства збіралі ўзоры народнай творчасці, рабілі замалёўкі помнікаў архітэктуры і г.д. Таварыства выдала брашуры Фурмана «Крашенина» (1925) і «Витебск в гравюрах С.Юдовина» (1926), Каспяровіча «Белорусская архитектура» (1925). Артыкулы М.Каспяровіча, М.Шчакаціхіна, І.Гаўрыса, Я.Васілевіча аб праблемах мастацтва друкаваліся ў зборніку «Віцебшчына» (1925 і 1928). У цэлым 1920-я гады вызначыліся вострай барацьбой паміж прыхільнікамі рэалістычнага мастацтва і авангардыстамі. У 1939 г. была адкрыта мастацкая галерэя Ю.Пэна ў кватэры мастака (будынак не захаваўся), дзе адначасова экспанавалася каля 100 работ, у фондах галерэі іх было каля 800 (потым галерэя была эвакуіравана ў Саратаў, дзе знаходзілася да 1946 г., пасля чаго асноўная частка фондаў была перададзена Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР, асобныя творы — Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею). У 1941 г. адбылася выстаўка выяўленчага мастацтва Віцебска, на якой дэманстраваліся творы жывапісу, скульптуры і графікі, дзейнічала і перасоўная экспазіцыя графікі.

Кінафікацыя. Кінематограф у Віцебску з'явіўся ў пачатку 20 ст. У 1905 г. пачаў дзейнічаць прыватны кінатэатр «Рэкорд» (цяпер «Спартак»), у 1910 г. — «Кіно-Арс», «Ілюзіён», «Факел», «Одэон», «Мастацкі». У пачатку 1919 г. прыватныя кінатэатры былі нацыяналізаваны, была створана мясцовая кінакалегія, у хуткім часе рэарганізаваная ў губернскую кінафотасекцыю, якая падпарадкоўвалася губернскаму аддзелу народнай адукацыі. Кінафотасекцыя сабрала значны пракатны фонд, кінастужкі з якога дэманстраваліся ў Віцебскай, Смаленскай, Пскоўскай і Гомельскай губернях. У маі 1920 г. ў час «Тыдня працоўнага фронту» былі створаны першыя фільмы на тэму вытворчага жыцця горада. У 1940 г. ў Віцебску працавалі 3 кінатэатры — «Спартак», «Пралеткіно», «1 Мая» — і каля 30 кінаўстановак.

Сродкі масавай інфармацыі. У лістападзе 1917 г. ў адпаведнасці з ленінскім «Дэкрэтам аб друку» ў Віцебску былі закрыты ўсе буржуазныя, нацыяналістычныя і бундаўскія газеты, чыя дзейнасць трапляла (у разуменні новай улады) пад вызначэнне контррэвалюцыйнай агітацыі. Ці не адзіным ацалелым прыватным выданнем стала газета «Витебский листок» (выдавалася з лютага 1916 па ліпень 1919; у 1917 выходзіў дадатак «Вечерний бюллетень»). Ствараліся ўмовы для развіцця партыйнага савецкага друку. Ужо ў 1917 г. бальшавікі пачалі выдаваць «Известия военно-революционного комитета города Витебска». Назва газеты ў далейшым неаднаразова змянялася: «Заря Запада» (1924—29), «Віцебскі пралетарый» (1929—38), з 1938 г. — «Віцебскі рабочы». У перыяд грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі, нягледзячы на цяжкія ўмовы, бы-

ла створана новая газета «Голас бедняка» (1918), выдаваліся часопісы «Коммунистический труд» (1919—23, выданне губкома РКП(б) і губпрафсаюза) і «Голос труда» (1920—21, орган губсавета прафсаюзаў). З 1921 г. ў Віцебску працавалі аддзяленні Дзяржвыдата РСФСР, губернскае палітвыдавецтва, літаратуру выпускала губернскае бюро гісторыі партыі. У 1919—21 гг. дзейнічала аддзяленне Расійскага тэлеграфнага агенцтва (РОСТА), якое выпускала агітплакаты, лістоўкі, брашуры, вусную і светлавую газету, выдала ў 1921 г. «Журнал Витебского отделения РОСТА». Выдавецкай дзейнасцю займаліся таксама Віцебскі губком РКП(б), губернскі аддзел народнай адукацыі, акруговае таварыства краязнаўства. Выдаваліся ў розныя гады часопісы «Искусство» (1921, выйшла 6 нумароў, тыраж дасягаў 500 экз.), «Парус», «Штурм», «Белорусская ветеринария» (1-ы нумар выйшаў у Мінску ў 1924, у Віцебску выдаваўся ў 1925—29, спачатку штоквартальна, з 1927 — штомесячна, на рускай мове, з 1928 частка матэрыялаў друкавалася па-беларуску), выходзіла «Віцебская сялянская газета» (1925—27). У сакавіку 1927 г. ў Віцебску пачалося ўласнае радыёвяшчанне.

М у з е і. У лістападзе 1918 г. на базе калекцыі А.Р.Брадоўскага музея Віленскага вайсковага сходу, эвакуіраванага ў Віцебск пасля пачатку 1-й сусветнай вайны, быў заснаваны Віцебскі губернскі музей (адкрыўся ў чэрвені 1919), з 1924 г. — аддзяленне Беларускага дзяржаўнага музея, з 1938 г. Віцебскі абласны краязнаўчы музей. У 1920-я гады існавалі грамадскія музеі: сельскагаспадарчы (пры Доме селяніна), заалагічны, санітарнай асветы і гігіены (пры сельскагаспадарчым тэхнікуме), музей Рэвалюцыі (пры 29-й школе). Існаваў таксама музей сучаснага мастацтва (1919—21, пры Народнай мастацкай школе), мастацкая галерэя Пэна (1939—41).

Фізкультура і спорт. У 1918 г. пры Віцебскім губернскім камісарыяце быў арганізаваны аддзел усенавуча, які курыраваў фізкультурна-спартыўную работу сярод насельніцтва, у гэтым жа годзе быў створаны першы ў горадзе спартыўны комплекс (у парку «Елагі»). У 1919 г. ў Віцебску ўзнік першы спартыўны кружок рабочых-чыгуначнікаў, які праз 3 гады быў пераўтвораны ў клуб «Суботнік». Пазней з'явіліся клубы «Алімп», «Мнагаборац», «Чырвоны дапрызыўнік», «Спартак» і інш. У 1919 г. адбылася 1-я губернская алімпіяда. Спаборніцтвы праходзілі па лёгкай атлетыцы, конным спорце, французскай (вольнай) барацьбе, футболе. У рамках усесаюзнага Дня спорту ў 1923 г. адбылася першая легкаатлетычная эстафета. Вялікай падзеяй для спартсменаў Віцебска стала алімпіяда Віцебска-Арлоўскай чыгункі, на якой ва ўсіх відах праграмы віцябляне занялі першыя месцы. Пачынаючы з 1923 г., віцебскія спартсмены паспяхова выступалі на многіх усесаюзных спаборніцтвах. Да пачатку 1924 г. ў Віцебску налічвалася 26 спартыўных кружкоў, у канцы года — 56. У 1925 г. ў Віцебску адбыліся першыя ў БССР спаборніцтвы авіямадэлістаў, 1-ы чэмпіянат рэспублікі па французскай барацьбе, у 1933 г. — 1-е Усебеларускае воднае свята.

Літаратура:

1. Борьба за Советскую власть в Белоруссии (1918—20). Сборник документов и материалов. Т. 1. Мн., 1968. С. 86.
2. Красная быль. Витебск, 1923. С. 210.
3. Отчет Витебского губернского экономического совещания Совета Труда и Обороны. Витебск, 1922. С. 9.
4. Матэрыялы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці:

ф. 10, воп. 1, спр. 161, л. 161;
ф. 14, воп. 1, спр. 177, л. 20;
ф. 15, воп. 1, спр. 32, л. 60;
ф. 15, воп. 6, спр. 1, л. 32;
ф. 46, воп. 1, спр. 1, л. 25;
ф. 64, воп. 1, спр. 443, л. 32;
ф. 102, воп. 1, спр. 157, л. 52;
ф. 102, воп. 1, спр. 573, л. 130;
ф. 118, воп. 1, спр. 115, л. 286—289;
ф. 118, воп. 1, спр. 191, л. 40;
ф. 476, воп. 1, спр. 39, л. 2;
ф. 1821, воп. 1, спр. 475, л. 212;
ф. 10051, воп. 1, спр. 2, л. 492.

К.І.Зайко.

Развіццё народнай адукацыі ў Віцебску ў 1917—41 гг.

Напярэдадні 1-й сусветнай вайны ў дакладной запісцы губернатару было сказана: «Ажыццяўленне ўсеагульнай абавязковай адукацыі ў гор. Віцебску магчыма толькі да канца 1-й паловіны гэтага стагоддзя (у 1950), а ў вёсцы — да канца гэтага стагоддзя (у 2000)».

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі перад беларускім народам адкрыліся новыя магчымасці эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця. Было ўведзена бясплатнае ўсеагульнае навучанне дзяцей на роднай мове. У шырокіх маштабах разгортвалася школьнае

будаўніцтва, стваралася адзіная працоўная дзяржаўная школа на сацыялістычных прынцыпах. З першых дзён Савецкай улады пачалася барацьба з непісьменнасцю насельніцтва. Для ўсіх слаёў насельніцтва стваралася адзіная працоўная школа з 9-гадовым тэрмінам навучання (8—17 гадоў), падзеленая на 1-ю і 2-ю ступені.

З 1921 г. побач з 9-гадовай школай шырокае развіццё атрымала «сямігодка». У 1923—34 гг. у вёсцы распаўсюдзіліся школы сялянскай моладзі (ШСМ), а ў горадзе (з 1925) — фабрычна-завадскія сямігодкі (ФЗС). У 1919—40 гг. меўся асобны тып школы — рабочы факультэт (рабфак).

Ішоў пошук арганізацыйнага ўладкавання, форм і метадаў навучання. У 1917—21 гг. існавалі школы 1-й ступені з 5-гадовым навучаннем і 2-й ступені — з 4-гадовым навучаннем. У 1922 г. сістэма адукацыі была рэарганізавана. Працавалі пачатковая школа (1—4-я класы) і 7-гадовая школа (1—7-я класы). У 1926 г. заснаваны школы-дзевяцігодкі. У 1931 г. з'явіліся сярэднія школы (1—10-я класы). З 1934 г. школа была уніфікавана: стала 10-гадовай з размежаваннем на пачатковую (4 гады навучання), няпоўную сярэднюю (7 гадоў навучання) і сярэднюю школу (10 гадоў навучання).

Пастановай Наркамасветы РСФСР ад 3.2.1918 г. ранейшыя навучальныя акругі скасоўваліся, і кіраўніцтва школай на месцах перадавалася мясцовым Саветам рабочых і сялянскіх дэпутатаў. Пры Віцебскім гарадскім Савеце быў утвораны аддзел народнай адукацыі, які падпарадкоўваўся губернскаму аддзелу і Наркамату асветы РСФСР. На працягу 1920-х і на пачатку 1930-х гадоў назва кіраўнічых органаў народнай адукацыі неаднаразова змянялася ў сувязі са змяненнем адміністрацыйнага падзелу, але задачы заставаліся ранейшымі: рэформа школьнай справы на новай, савецкай аснове, матэрыяльнае забеспячэнне адукацыйнай працы ў горадзе, забеспячэнне асветніцкіх устаноў кваліфікаванымі кадрамі, развіццё сеткі асветніцкіх устаноў, выпрацоўка найбольш мэтазгодных арганізацыйных форм, праграм і прыёмаў асветніцкай працы, інструктаванне нізавых органаў і асветніцкіх устаноў, прапаганда ідэй савецкай асветы і г.д. Гарадскі аддзел народнай адукацыі займаўся: пастаноўкай працы ў школьных і дашкольных установах, хатах-чытальнях, народных дамах, клубах, школах для дарослых, саўпартшколах, бібліятэках, агітпунктах, лікпунктах, тэатрах. Пры аддзеле народнай адукацыі існавалі секцыі: яўрэйская, польская, латышская, мастацкая, дзіцячых дамоў, прававой абароны. Першай загадчыцай гарадскога аддзела народнай адукацыі была С.А.Шэйдліна.

Стварэнне новай школы праходзіла ў вельмі цяжкіх умовах грамадзянскай вайны і гаспадарчай разрухі, калі культурнае будаўніцтва тармазілася з-за недастатковасці матэрыяльных сродкаў, адсутнасці падрыхтаваных настаўнікаў і вопыту працы ў новых умовах. У першым нумары «Вестника народного образования» (май 1921) канстатавалася: «першыя 3 гады — працэс разбурэння старых форм, вялікага мноства ў большасці няўдалых спроб закласці падмурак новай і ідэйна і фармальна сістэмы народнай асветы, унесці новы змест і стварыць новыя метады ва ўсіх галінах школьнай, пазашкольнай і навуковай працы. Ідэя працоўнай школы захоўваецца».

У сістэме народнай асветы замацаваліся 3 асноўныя накірункі: сацыяльнае выхаванне, палітасветная праца, прафесійная адукацыя. У адпаведнасці з гэтым ствараліся органы кіравання.

Першы накірунак ахопліваў выхаванне і адукацыю дзяцей да 15 гадоў, а таксама забяспечваў прававую абарону дзяцей да 18 гадоў, займаўся пастаноўкай дашкольнай і школьнай справы. Другі — займаўся пазашкольнай працай, кіраваў усёй палітычна-асветніцкай працай сярод юнацтва і дарослых. Трэці накірунак ахопліваў прафесійныя навучальныя ўстановы.

У пачатку 1921 г. ў сістэму народнай асветы горада ўваходзіла па лініі сацвыхавання 49 школ 1-й ступені, 18 школ 2-й ступені, 25 дзіцячых дамоў і інтэрнатаў, 8 школ падлеткаў, 4 асяродкі, 18 дзіцячых садоў, 4 дзіцячыя бібліятэкі, 6 устаноў прававой абароны, музей і майстэрня цацак. Дзеці навучаліся на рускай, беларускай, яўрэйскай, латышскай, польскай мовах. Вялікая колькасць дзіцячых дамоў тлумачылася значнай колькасцю ўцекачоў, беспрытульнікаў, якія навадніліго-рад, што стаяў на скрыжаванні найважнейшых дарог. Да ўстаноў прававой абароны належалі: камісія па справах непаўналетніх, размеркавальна-назіральны пункт, калонія для маральна дэфектыўных, інтэрнат глуха-

нямых, губернская дапаможная школа, дашкольны дом.

Па лініі прафесійнай адукацыі ў горадзе было: устаноў сельгасадукацыі — 2, педагагічных устаноў — 3, прафесійнай адукацыі рабочых — 8, тэхнічнай адукацыі — 3, прамыслова-эканамічнай адукацыі — 1, мастацкай адукацыі — 6.

Па лініі палітасветы існавалі 2 саўпартшколы, 40 лікпунктаў, 7 народных дамоў, клубаў і дамоў асветы, 43 бібліятэкі, 8 адна- і двухгадовых курсаў для дарослых, 3 музеі.

У навучальных і выхаваўчых установах сацвыхавання навучалася і выхоўвалася больш за 18 тыс. дзяцей, а ў арганізацыях прафесійнай адукацыі — 3100 чалавек.

Савецкая дзяржава прыкладала тытанічныя намаганні, каб падтрымаць сістэму народнай асветы. Вясной 1921 г. ў Віцебску навучальных устаноў і вучняў у іх было больш, чым у 1913 г., нягледзячы на тое, што насельніцтва горада ў гады 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў скарацілася на 18 тыс. чалавек і складала каля 90 тыс. жыхароў. Аднак пасляваенная разруха, паглыбленая голадам у Паволжы, прымусіла скараціць колькасць навучальных устаноў і лічбу тых, хто ў іх займаўся. Даводзілася шукаць новыя крыніцы фінансавання. У «Известиях ВЦИК» ад 23.9.1921 г. пісалася: «Нарадукацыі даецца права ствараць пры сваіх установах шэраг прадпрыемстваў: майстэрні, фермы, па магчымасці нават фабрыкі і заводы». У гарадах і мястэчках уводзіліся агульныя падаткі на тыя патрэбы, якія недастаткова задавальняліся з Цэнтра. Сталі ствараццца школьныя гаспадарчыя Саветы, якія мелі права на самаабкладанне (г.зн. дадатковыя зборы з насельніцтва для падтрымкі жыццядзейнасці народнай асветы). Пры гэтым не дапускалася адхіленя ад заняткаў тых, хто не мог заплаціць.

Трэба адзначыць, што заданні па самаабкладанні ўвесь час зрываліся, і тады паўстала пытанне пра ўвядзенне платы за навучанне. Гэта выклікала вострыя дыскусіі ў грамадстве. Праціўнікі платнага навучання рэзка крытыкавалі гэтыя праекты, указваючы на адступленне ад першапачатковых прынцыпаў, але рэальных шляхоў вываду школы з крызісу не прапаноўвалі.

Канец спрэчкам паклала пастанова ВЦВК РСФСР ад 22.3.1923 г. У адпаведнасці з ёй Віцебскі губернскі аддзел народнай адукацыі выдаў інструкцыю аб увядзенні платнага навучання ў працоўных школах. Згодна з ёй рабочыя і службоўцы адлічвалі 5% незалежна ад колькасці дзяцей, ад свайго заробку. Астатнія жыхары горада, якія не з'яўляліся членамі прафсаюзаў, у 1-ю ступень 2 руб. золатам, у 2-ю ступень 3 руб., сяляне — 25—50 кап. золатам. Немаёмныя вучыліся бясплатна.

У сакавіку 1924 г. Віцебск быў вернуты ў склад БССР. Беларусь і Украіна раней перайшлі да сямігодкі, адхіліўшы дзевяцігадовую школу як недаступную рабочым і занадта дарагую. Настаўнікі горада не адразу прынялі рэарганізацыю, але пасля растлумачальнай працы сямігодка паступова стала ўкараняцца. У новай школе дзеці навучаліся з 8 да 15 гадоў, потым пераходзілі ў прафтэхвучылішча і далей, па магчымасці, у ВНУ.

У школах горада напачатку 1924/25 навучальнага года было 8 тыс. вучняў. Паводле нацыянальнага складу было: рускіх — 13%, беларусаў — 21%, яўрэяў — 52%, палякаў — 7%. Сацыяльны склад вучняў быў наступны: рабочых — 21%, служачых — 29%, сялян — 9%, саматужнікаў — 17%.

У новай школе быў уведзены моўны прынцып навучання, г.зн. кожнае дзіця магло вучыцца на сваёй роднай мове.

Крыніцамі фінансавання з'яўляліся: сродкі з дзяржаўнага бюджэту, мясцовыя зборы, спецыяльныя сродкі ці плата за навучанне. Поўнасцю на дзяржданацыі былі прафесійнатэхнічныя і сельскагаспадарчыя школы, фабрычна-завадскія вучылішчы, школы для дарослых, рабфакі, шэраг тэхнікумаў, дзіцячыя дамы, партшколы, некаторыя іншыя навучальныя ўстановы.

Плата бралася з навучэнцаў у гарадскіх сямігодках, у дзіцячых садах, мастацкім, музычным, прамыслова-эканамічным, медыцынскім тэхнікумах, у ВНУ.

Ад платы за навучанне былі вызвалены дзеці вайскоўцаў, ссыльных і катаржнікаў, беспрацоўных і малазабяспечаных. Плата была дыферэнцаванай: ад 50 кап. да 180 руб. у месяц.

Пры прыёме ў школу захоўваўся класавы падыход. Так, у распараджэнні загадчыка акружнога аддзела народнай адукацыі Крывасава ў ліпені 1925 г. гаварылася: «... Пры камплектаванні першага года неабходна прымаць у першую чаргу дзяцей рабочых і сялян, потым служачых і ў апошнюю чаргу, калі бу-

дуць вольныя месцы, прымаць дзяцей непрацуючых грамадзян, але каб колькасць прынятых з іх не перавышала 12%. Ад паступаючых у малодшыя і старэйшыя класы неабходна патрабаваць дакументы аб сацыяльным паходжанні вучня і ў залежнасці ад гэтага належыць аднесці яго да той ці іншай катэгорыі плацяжоў за вучобу».

З пачатку 1924/25 навучальнага года паступова ўводзіцца праграма ГВСа (Галоўнага Вучонага Савета). У аснову яе быў пакладзены комплексны метад навучання. У адрозненне ад прадметнага тут вывучаецца якая-небудзь буйная з'ява, і, аналізуючы яе розныя бакі, вучні знаёмяцца з фізічнымі, хімічнымі, біялагічнымі, грамадскімі складальнымі. Комплексны план меў 3 ступені: прырода, праца, грамадства. Гэты метад дазваляў бачыць навакольны свет як адзінае цэлае, узаемазвязнае, узаемазалежнае, але трывалых, сістэматычных ведаў па асобных прадметах не даваў. Таму ў пачатку 1930-х гадоў савецкая школа вярнулася да выпрабаванай прадметнай сістэмы навучання.

Але, бадай, галоўнай падзеяй у развіцці адукацыі ў 1920-я гады стала беларусізацыя. Пастановамі 2-й сесіі ВС БССР па нацыянальным пытанні і вучэбнымі планамі ва ўсіх школах горада была ўведзена беларуская мова як прадмет выкладання з 3-га года навучання. На агульным сходзе загадчыкаў віцебскіх школ 12.2.1925 г. было ўхвалена рашэнне аб пераходзе на беларускую мову. Таксама было прынята рашэнне аб правядзенні школьных саветаў па пытанні паглыблення беларусізацыі, дзе сцвярджалася, «што беларусазнаўства — галоўная школьная дысцыпліна».

Ужо праз год у Віцебску больш за палову школ працавала на беларускай, яўрэйскай, польскай, латышскай мовах.

Паводле даведкі Віцебскага акруговага аддзела народнай адукацыі ў 1925/26 навучальным годзе ў горадзе дзейнічалі 15 беларускіх, 10 яўрэйскіх, 2 польскія і 14 рускіх школ, праектавалася адкрыццё літоўскай школы ў наступным годзе і цыганскай — у перспектыве. Палепшылася забеспячэнне вучэбнай літаратурай да 80% ад неабходнага.

Палітыка беларусізацыі была разлічана на доўгі тэрмін, але з пачатку 30-х гадоў яна пачала згортвацца. Небяспечнымі сталі лічыцца падручнікі, літаратурныя творы Я.Лёсіка, Ц.Гартнага, Я.Купалы і інш.

У 1925/26 навучальным годзе ў Віцебску канчаткова склаліся сетка і план усеагульнай пачатковай адукацыі дзяцей 8—11 гадоў, і таму, калі 7.4.1926 г. ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі з 1934/35 навучальнага года, горад быў да гэтага гатовы. Ужо ў верасні 1930 г. ўсе дзеці малодшага школьнага ўзросту ў Віцебску маглі сесці за парты.

Імклівы рост школьнага будаўніцтва ў горадзе пачаўся ў перыяд даваенных пяцігодак, з канца 1920-х гадоў. Хуткімі тэмпамі павялічваліся асігнаванні на народную адукацыю. Гэта дазволіла ўзвесці шмат новых школьных будынкаў. За 13 гадоў былі пабудаваны сярэднія школы №№ 2, 3, 7, 8, 9, 10, 15, 18, 19, 20, 22, 25, 29. Вучэбныя памяшканні забяспечваліся стандартнай мэбляй, наглядным дапаможнікамі, бібліятэкамі.

З 1931/32 навучальнага года школы перайшлі на прадметную сістэму навучання, а з 1933 г. вучні старэйшай і малодшай школы пачалі здаваць экзамены замест субяседавання.

У 1936 г. ў горадзе праводзілася атэстацыя настаўнікаў. З 546 чалавек, што прайшлі гэтае выпрабаванне, вышэйшую адукацыю мелі 153 настаўнікі, сярэднюю і незакончаную вышэйшую — 344, незакончаную сярэднюю — 49.

Працаўнікі народнай адукацыі адносіліся да катэгорыі высокааплатных работнікаў. У 1940 г. работнікі школы атрымлівалі ў сярэднім 363 руб. ў месяц, у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах — 414 і 419 руб. Дарэчы, сярэдняя зарплата па вобласці складала каля 270 руб.

На апошняй перадваеннай 3-й сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных загадчык аблана Бекарэвіч паведаміў наступныя факты: «Толькі ў адным горадзе Віцебску ёсць цяпер 25 сярэдніх школ, 10 няпоўных сярэдніх і 3 пачатковыя школы, у якіх працуюць 820 настаўнікаў і вучацца 22 тыс. школьнікаў. Акрамя таго, у горадзе 4 вышэйшыя навучальныя ўстановы і 13 тэхнікумаў. Наша вобласць непасрэдна падыйшла да поўнага ажыццяўлення сярэдняй адукацыі ў горадзе і 7-гадовай на вёсцы».

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці,
ф. 1966, воп. 12, спр. 15, л. 71;
ф. 1737, воп. 1, спр. 37, л. 76 і спр. 1, л. 28;
ф.1167,воп. 1, спр. 62;
ф. 1966, воп. 12, спр. 15, л. 71. **А.В.Чэн.**

Медыцына і ахова здароўя ў Віцебску ў 1917—41 гг.

У 1865 г. ў Віцебску дзейнічалі 1 бальніца на 170 ложкаў і 1 багадзельня. За год (у сярэднім) у бальніцы лячылася 829 чалавек. У 1897 г. ў горадзе было ўжо 2 бальніцы на 145 месцаў (пры колькасці насельніцтва 66 тыс. чалавек).

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі сістэма аховы здароўя ў горадзе, як і ў цэлым па рэспубліцы, стала актыўна развівацца. Медыцынская дапамога насельніцтву стала бясплатнай. Значна пашырылася сетка медыцынскіх устаноў. У 1917 г. ў горадзе была адкрыта інфекцыйная гарадская клінічная бальніца, а ў 1918 г. — бальніца чыгуначнай станцыі Віцебск. Гэта быў цяжкі час. Вайна, якая каціласа па краіне, пакінула пасля сябе смерць, хваробы, разруху. Дарэвалюцыйная сістэма аховы здароўя, якая і без таго аказвала дапамогу толькі невялікаму працэнту насельніцтва, была разбурана, нешматлікія медыцынскія ўстановы разрабаваны. На тэрыторыю губерні вярталіся з Германіі расійскія ваеннапалонныя, перамяшчаліся вялікія масы насельніцтва з Петраграда, Украіны, Паволжа, несучы з сабою тыф, халеру, воспу.

Першымі ў барацьбу з хваробамі ўключыліся навастворапыя санітарныя ўстановы горада. Для навядзення санітарнага парадку была арганізавана гарадская санітарная міліцыя, якой былі нададзены шырокія паўнамоцтвы. Там працавалі старшы ўрач Паўлоўская, 2 малодшыя ўрачы, 8 санітарных наглядчыкаў і прыкамандзіраваныя гарадскія міліцыянеры. Санітарная міліцыя ў той цяжкі перыяд правяла велізарную работу па навядзенню санітарнага парадку ў горадзе. Здзяйсняўся пастаянны санітарны кантроль за станам крыніц вады, крамаў, рынкаў, вакзалаў, інтэрнатаў, гасцініц, турмаў, казармаў. Напрыклад, у 1919 г. супрацоўнікамі міліцыі праведзена 1386 аглядаў аб'ектаў г. Віцебска: 239 прадпрыемстваў дробнага гандлю, 108 харчовых прадпрыемстваў, 151 баня і пральня, 144 сталовыя і чайныя, 254 двары, дамы і кватэры. На 108 асоб былі накладзены спагнанні і штрафы. А ў 1921 г. толькі за 1-е паўгоддзе было праведзена 7550 праверак санітарнага стану гарадскіх аб'ектаў. Па парушэннях складзена 816 пратаколаў. Акрамя таго, пад час абходаў і праверак супрацоўнікі міліцыі выяўлялі інфекцыйных хворых і накіроўвалі іх у лячэбныя ўстановы.

Вялікую ролю ў барацьбе з распаўсюджваннем эпідэмій і інфекцый адыграў гарадскі санітарна-дэзінфекцыйны атрад, створаны ў 1919 г. 14 дэзінфектараў і санітараў на чале з вопытным санітарным урачом М.Андрэевым здзяйснялі санітарную апрацоўку аб'ектаў, дастаўку хворых у лячэбныя ўстановы. У распараджэнні атрада было да 20 конных экіпажаў, 8 дэзінфекцыйных камер, іншая дэзінфекцыйная тэхніка і сродкі. Толькі за 2-е паўгоддзе 1919 г. атрад апрацаваў 642 ачагі інфекцыі і даставіў у лячэбныя ўстановы 754 хворых. У 1920 г., у сувязі са з'яўленнем у горадзе выпадкаў захворвання халерай, быў створаны другі санітарна-дэзінфекцыйны атрад.

Актыўную дзейнасць ужо ў гады грамадзянскай вайны разгарнула гарадская санітарна-бактэрыялагічная лабараторыя, якой кіравалі ўрачы-сёстры А.Б. і В.Е. Буравы. Лабараторыя праводзіла абследаванні хворых у гарадскіх бальніцах і дома, даследавала прадукты харчавання, рыхтавала супрацьхалерную і супрацьвоспенную вакцыны.

У 1921 г. на базе лабараторыі, пастэраўскай станцыі і воспеннага цялятніка ствараецца новая навукова-практычная ўстанова — Губернскі хіміка-бактэрыялагічны інстытут. Толькі за адзін 1923 г. санітарна-бактэрыялагічная лабараторыя гэтага інстытута выканала 9295 клінічных, бактэрыялагічных і сералагічных даследаванняў, прыгатавала 120 460 доз воспеннага дэтрыту, 38 405 доз супрацьхалернай вакцыны.

Работу па правядзенні прышчэпак супраць самых эпідэмічна небяспечных захворванняў той пары — воспы і халеры — праводзілі спецыяльныя станцыя (загадчыца Е.П.Сямёнава) і атрады. Толькі за 1-е паўгоддзе 1920 г. іх супрацоўнікі агледзелі 14,2 тыс. жыхароў горада. Да 1923 г. прышчэплены супраць воспы былі ўжо каля 50 тыс. чалавек.

Барацьбу з эпідэміямі і інфекцыямі вялі і іншыя медыцынскія і лячэбныя ўстановы горада: ваенны шпіталь і шпіталь Чырвонага Крыжа, гарадскія бальніцы.

На пачатку 1920-х гадоў шырокі размах атрымала прапаганда медыцынскіх і санітарных ведаў сярод насельніцтва. У 1921 г. ў Віцебску быў адкрыты абласны Дом санітарнай асветы імя М.А.Сямашкі. Медыкі горада чыталі лекцыі на прадпрыемствах і арганізацы-

ях; спецыяльныя групы лектараў накіроўваліся ў аддаленыя паветы і сёлы; распаўсюджваліся лістоўкі, памяткі, плакаты медыцынскага зместу, спецыяльныя матэрыялы выходзілі на старонках газет, ладзіліся санітарна-асветніцкія выставы.

Работу па станаўленню і развіццю сістэмы аховы здароўя ў горадзе ўзначальвалі ў тыя гады С.А.Глебаўскі, А.Я.Гуткін, Г.Ф.Фёдараў.

У верасні 1921 г. ў Віцебскай губерні быў адкрыты першы туберкулёзны дыспансер. З моманту свайго стварэння ён стаў арганізацыйна-метадычным цэнтрам барацьбы з туберкулёзам (сухотамі). У дыспансеры не толькі лячыліся хворыя, але і вялася шырокая работа па папярэджванню распаўсюджвання захворвання, укараненню сярод насельніцтва метадаў прафілактыкі. На пачатку 1923 г. там працавалі 6 урачоў і 3 медыцынскія сястры. А ўжо ў 1927 г. ў вёсцы Сасноўка пад Віцебскам быў адкрыты супрацьтуберкулёзны санаторый. Трэба адзначыць, што шырокі комплекс лячэбных і прафілактычных мерапрыемстваў дазволіў ужо ў 1930-я гады значна палепшыць на Віцебшчыне эпідэмічную сітуацыю па туберкулёзу. Вялікую ролю адыграла ў гэтым правядзенне масавых прафілактычных прышчэпак супраць хваробы. У 1923 г. ў горадзе быў адкрыты Абласны скурна-венералагічны дыспансер.

Створаныя ў паслярэвалюцыйныя гады медыцынскія і санітарныя ўстановы выканалі вялікую работу па барацьбе з эпідэміямі і інфекцыямі. На аснове іх працы фарміраваліся прынцыпы санітарна-прафілактычнага, супрацьэпідэмічнага, медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. У студзені 1921 г. ў горадзе было 9 бальніц на 1050 месяцаў, 15 амбулаторый, у т.л. дзіцячая, 14 устаноў аховы мацярынства і дзяцінства, у тым ліку 2 Дамы дзіцяці на 35 і на 60 месцаў, Дом маці і дзіцяці на 50 месцаў і г.д., 11 зубаўрачэбных амбулаторый.

У 1921 г. ў Віцебску была адкрыта 3-гадовая акушэрская школа і фармацэўтычныя курсы. У 1923 г. на базе абшчыны сясцёр міласэрднасці стала функцыянаваць 1-я гарадская клінічная бальніца імя М.І.Калініна. У 1932 г. прыняла сваіх першых пацыентаў бальніца «Дзвіна», цяпер 2-я гарадская клінічная бальніца.

Пастановай Савета Народных Камісараў БССР № 208 ад 11.10.1934 г. «Аб падрыхтоўцы ўрачоў» Віцебскі апорны пункт завочнага інстытута медыцынскага навучання з 1 лістапада таго ж года быў пераўтвораны ў бальніцу-медВНУ. Для выкладання спецыяльных дысцыплін з Масквы і Мінска былі запрошаны вучоныя і спецыялісты-медыкі. У ВНУ выкладалі таксама вучоныя з ветінстытута, вопытныя віцебскія ўрачы-практыкі. У 1938 г. Віцебская бальніца-медВНУ была перайменавана ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, які размясціўся ў будынку былой казённай палаты па вул. Суворава (з 1999 — Віцебскі дзяржаўны медыцынскі універсітэт).

У сакавіку 1935 г. па ініцыятыве навуковых супрацоўнікаў і выкладчыкаў медінстытута было арганізавана Віцебскае медыцынскае таварыства, якое лічыла сваёй задачай пашырэнне і каардынацыю навуковай работы сярод мясцовых урачоў і ўзмацненне прафілактычнай і лячэбнай работы ў горадзе і прылягаючых раёнах. У дзейнасці Таварыства прымалі ўдзел не толькі вучоныя, але і практыкуючыя ўрачы горада і вобласці. Прафесары і асістэнты медінстытута чыталі лекцыі, праводзілі кансультатыўныя прыёмы ў гарадах і раёнах вобласці і рэспублікі (Лепель, Полацк, Дрыса, Магілёў, Орша, Сураж, Гарадок і інш). Віцебскія медыкі (прафесары Фешчанка, Берэнштэйн, дацэнт Герасімовіч) — члены Таварыства прымалі ўдзел у міжнародным кангрэсе фізіёлагаў. Пры медыцынскім таварыстве працавалі афтальмалагічныя, отарыналарынгалагічная і дэрматавенералагічныя секцыі. Арганізатарамі і актыўнымі ўдзельнікамі работы Таварыства былі прафесары Ф.Я.Берэнштэйн, І.І.Багдановіч, Г.Х.Карнілаў, С.Н.Купрэеў, В.О.Марзон, А.А.Смірноў, Г.А.Фешчанка, М.А.Хазанаў, А.А.Чарнышэнка, дацэнты Герасімовіч, Энцін, урачы Я.А.Качан, І.С.Маскова, С.Л.Пеўзнер, Д.І.Хесін.

У снежні 1935 г. ў новым, спецыяльна ўзведзеным будынку была адкрыта Віцебская абласная клінічная бальніца імя 11-га з'езда Саветаў на 275 месцаў. Бальніца стала навукова-метадычным цэнтрам аховы здароўя вобласці, клінічнай базай Віцебскага медыцынскага інстытута. Былі разгорнуты факультэцкая і шпітальная тэрапеўтычныя клінікі, факультэцкая і шпітальная хірургічныя клінікі, клініка ЛОР-захворванняў, кафедра паталагічнай анатоміі. Тут жа адкрыўся філіял рэспубліканскага факультэта ўдасканалення ўрачоў. Шмат сіл і энергіі ў будаўніцтва і аснашчэнне бальніцы ўклаў першы галоўны

ўрач бальніцы Л.А.Вязьмінскі. Для аказання неадкладнай і планавай медыцынскай дапамогі бальніца шэфствавала над Гарадоцкім раёнам, туды выязджалі групы ўрачоў дзеля кансультавання хворых і правядзення складаных аперацый. Урачы і навуковыя супрацоўнікі клінік вялі навуковую работу, імі было падрыхтавана і абаронена 8 дысертацый. У 1939—41 гг. былі праведзены значныя работы па пашырэнню і рэканструкцыі бальніцы, павялічана да 325 колькасць месцаў.

У 1940 г. ў горадзе было 11 бальніц на 1747 месцаў, 9 жаночых і дзіцячых кансультацый і паліклінік, у якіх працавала 336 урачоў і 590 чалавек медыцынскага персаналу. Дзейнічала 86 дзіцячых малодшых дашкольных устаноў на 6120 месцаў.

Медыцынскае абслугоўванне стала бясплатным і агульнадаступным, а галоўнае, высокапрафесійным. Былі пераможаны эпідэміі, якія вякамі былі «карай Боскай». Такім чынам, ахова здароўя горада за 2 перадваенныя дзесяцігоддзі зрабіла велізарны крок наперад.

Літаратура:

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 64, воп. 1, спр. 278, л. 17—18; спр. 674, л. 9—11, спр. 772, л. 198; ф. 65, воп. 1, спр. 35, л. 319, 325.

2. Витебск. Энциклопедический справочник. Мн., 1988. С. 488.

3. Справаздача аб рабоце Віцебскага медыцынскага таварыства за 1935—38 гг. // Зборнік работ ВМТ, вып. 1, 1938. С. 247.

4. Юрцаў А.І. 70 год нястомнай барацьбы // Віцебскі рабочы. 31.10.1991 г.

Я.А.Клімянцёнак.

Канфесійная палітыка савецкай улады ў Віцебску

23.1.1918 г. быў прыняты «Дэкрэт аб адлучэнні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы», згодна з якім «ніякія царкоўныя і рэлігійныя таварыствы не маюць права валодаць уласнасцю».

У рамках рэалізацыі палажэнняў гэтага дакумента Віцебскі гарвыканком выдаваў свае цыркуляры, праз якія меркавалася больш далікатнае ажыццяўленне дэкрэта.

Напрыклад, здыманне абразоў у грамадскіх будынках праводзілася толькі ў непрацоўны час, да духавенства не павінны былі прымяняцца ніякія рэпрэсіўныя меры, акрамя агульнаграмадзянскіх.

У цыркуляры НКУС ад 31.12.1919 г. гаварылася: «Рэлігійныя групы, у валоданне якім ... выканкомамі былі аддадзеныя ў свой час рэлігійныя храмы, павінны зараз частку гэтых памяшканняў саступіць мясцовым адзелам народнай асветы... для школьных заняткаў так, каб рэлігійныя патрэбы насельніцтва без страты для вернікаў маглі задавальняцца ў тых храмах, што засталіся».

Аднак з паведамлення Віцебскага павятова-гарадскога ваенрэўкома ад 11.11.1920 г. можна даведацца, што ў Віцебску да гэтага моманту ніводная культавая ўстанова не была выкарыстана для грамадскіх патрэб. Ды і меры мясцовых улад у адказ на цыркуляр былі выключна агітацыйныя. Верагодна, яны ўлічвалі высокую ступень рэлігійнасці насельніцтва розных веравызнанняў у Віцебску.

Пастановай прэзідыума Віцебскага губвыканкома ад 3.2.1922 г. была ўтворана Віцебская губернская камісія па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей.

Камісія прыступіла да работы 10.3.1922 г., пачаўшы з уліку царкоўных каштоўнасцей. Скончыўшы ўлік, дачакаўшыся завяршэння велікоднага тыдня, з 24 красавіка камісія пачала канфіскацыю каштоўнасцей.

Да 20.5.1922 г. ў г. Віцебску было забрана з яўрэйскіх сінагог і малельняў 18 фунтаў золата і серабра, з 23 цэркваў і 2 капліц розных веравызнанняў каля 20 пудоў серабра, 1 фунт золата і 2-3 дзесяткі каштоўных камянёў (улік, як бачым, быў недастаткова дакладны).

Святары як маглі спрабавалі прадухіліць канфіскацыю каштоўнасцей з цэркваў. На нарадзе прадстаўнікоў духавенства ўсіх культаў з нагоды канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей было прапанавана перш чым забраць каштоўнасці, выкарыстаць спосаб добраахвотных збораў сярод прыхаджан. 11 лютага ад імя архіепіскапа Полацкага і Віцебскага Інакенція быў разасланы заклік да праваслаўных хрысціян аб добраахвотным ахвяраванні прыхаджанамі на карысць галадаючых. Было сабрана 20 млн. руб. і 27 пудоў хлеба (па губерні). Але мэта кампаніі была іншай — канфіскацыя каштоўнасцей. Святары хавалі каштоўнасці і інвентарныя кнігі дома, вырывалі лісты з інвентарных кніг.

Губкамісіяй было дадзена рашучае прадпісанне, што асоб, якія вінаваты ва ўтойванні каштоўнасцей і інвентарных кніг, выступалі і агітавалі супраць канфіскацыі, тэрмінова аддаць пад суд і бязлітасна пакараць.

Асаблівай агітацыі святарам не трэба было праводзіць, бо вернікі падтрымлівалі царкву, пра што сведчыць даклад губкамісіі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей аб выніках вопісу каштоўнасцей царквы Ражаства і Свята-Духаўскай царквы. Вопіс каштоўнасцей адбываўся ў прысутнасці прыхаджан. «Перш чым прыступіць да вопісу, давялося доўгі час супакойваць прысутных, фанатызм якіх дасягаў вялікіх памераў. Праклёны так і сыпаліся на галаву бальшавікоў і нават на сваіх дзяцей, якія знаходзіліся на савецкай службе», — паведамлялася ў дакладзе. У Маскву ж камісія рапартавала, што канфіскацыя адбываецца спакойна, не лічачы 2-3 выпадкаў.

У дакладзе губкамісіі ў Цэнтральную камісію дапамогі галадаючым пры УЦВК ад 29.5.1922 г. запісана: «З прычыны некаторых хваляванняў, што мелі месца ў час уліку, давялося для забеспячэння поспеху папярэдне звярнуцца да энергічнага ўздзеяння на духавенства. Павальныя вобыскі ў святароў, якія завяршыліся арыштам тых з іх, у каго на кватэры аказаліся схаваныя каштоўнасці... Адносіны духавенства да канфіскацыі ў большасці выпадкаў пасіўныя, адмоўныя, але яно было настолькі напалохана, што само прымала меры, каб не дапусціць якія-небудзь эксцэсы, аднак лаяльных святароў, што ішлі насустрач, у горадзе нямнога, усяго толькі 3...»

Выконваючы прадпісанні губкамісіі, органы НКУС пачалі арышты духоўных асоб. Першым быў арыштаваны ў красавіку 1922 г. архіепіскап Полацкі і Віцебскі Інакенцій. Верагодней за ўсё улады пры яго арышце кіраваліся цыркулярам Вярхоўнага трыбунала ЦВК ад 25.4.1922 г., дзе гаварылася: «... У першую чаргу прыцягваць да следства і суду кіраўнічыя кадры дадзенай мясцовасці, як свядома дазволіўшыя антыўрадавую агітацыю на рэлігійнай падставе, нават калі яны і не прымалі актыўнага ўдзелу».

Самае актыўнае супраціўленне аказвала каталіцкае духавенства, спасылаючыся на тое, што без указанняў Ватыкана яны не могуць дазволіць канфіскацыю. Віцебскія ксяндзы Капусцінскі, Тручкоўскі, Бараноўскі былі арыштаваны і аддадзены пад суд рэўтрыбунала, і забіранне каштоўнасцей з касцёлаў давялося праводзіць у прысутнасці вартаўніка.

За ўвесь перыяд кампаніі па Віцебскай губерні было забрана: серабра — 101 пуд 9 фунтаў 52 залатнікі 70 долей; золата — 1 фунт 93 залатнікі 10 долей; каштоўных камянёў — 51 залатнік 81 доля; банкаўскага серабра (мікалаеўскага) — 725 руб. 25 кап.; разменных манет: сярэбраных — 207 руб. 55 кап.; залатых (мікалаеўскіх) —985 руб.; 75 трубак парчы і 16 пачкаў фольгі. Уся названая маёмасць адпраўлена ў Маскву.

Работа камісіі па канфіскацыі каштоўнасцей была прызнана здавальняючай: «Колькасць забранага адпавядае меркаванням, работа праводзілася зусім спакойна і эксцэсаў нідзе не было дапушчана. Кампанія суправаджалася антырэлігійнымі прапагандысцкімі дзеяннямі».

Губком пастанавіў «весці энергічную работу па разбурэнню царквы як аплоту контррэвалюцыі, ніякім чынам не дапускаючы існавання нават лаяльнай дзяржаве («савецкай») царквы ў сацыялістычным грамадстве. Адначасова партыя павінна развіць кампанію узмоцненай антырэлігійнай прапаганды». Антырэлігійная прапаганда пасля знішчэння царквы як эканамічнай сілы стала асноўнай задачай дзяржавы ў адносінах да царквы. Акрамя гэтага, дзяржава не цуралася і іншых метадаў: уводзіла непасільныя падаткі, прыцясняла і падвяргала рэпрэсіям духавенства. Напрыклад, з-за немагчымасці заплаціць падатак Успенскі сабор і Свята-Духаўская царква ў 1923 г. былі закрыты. Яўрэйскай абшчыне прапаноўвалася ўстанавіць спецыяльны падатак на карысць галадаючых каля ўсходняй сцяны сінагог. Дзецям духавенства ўсяляк перашкаджалі пры паступленні ў навучальныя ўстановы, асабліва вышэйшыя.

У 1927 г. ў Віцебску дзейнічалі 20 праваслаўных цэркваў, 2 рымска-каталіцкія касцёлы, 1 стараверская, 1 аднаверская цэрквы, 1 кірха, 1 сінагога, 26 яўрэйскіх малітоўных дамоў. Аднак царква заставалася яшчэ магутнай грамадска-палітычнай сілай і ў свядомасці віцяблян адыгрывала яшчэ вялікую ролю. Пра гэта сведчыць той факт, што загадам ад 23.4.1923 г. па Віцебскім губкамаддзеле былі ўстаноўлены святочныя дні для праваслаўных — Ражаство, Хрышчэнне, Вялікдзень, Узнясенне, Духаў дзень, Праабражэнне, Успенне, для іудзеяў — Пасха, Швуэс, Ром-гашэна, Ём-кіпур, Сукее. Каб выжыць, царкве неабходна было прыстасоўвацца да

новых умоў. Так, 7.11.1923 г. ў Кафедральным Саборы Віцебска быў адслужаны малебен з нагоды ўсенароднага дзяржаўнага свята.

У 2-й палавіне 1920-х гадоў у горадзе пачалося закрыццё культавых установ і выкарыстанне іх у культурна-асветных мэтах. У касцёле св. Антонія, напрыклад, быў адкрыты антырэлігійны аддзел Віцебскага музея. У гэты ж час ва ўсіх установах ствараліся таварыствы «Бязбожнік». Іх мэтай была антырэлігійная прапаганда, яны выступалі супраць правядзення рэлігійных святаў Вялікадня, Масленіцы і інш.

Многія культавыя пабудовы Віцебска з'яўляліся прызнанымі дзяржавай архітэктурнымі помнікамі. Таму спачатку культавыя пабудовы перадаваліся пад установы культурна-асветнага прызначэння. Але пасля таго, як у 1930-я гады былі скінуты купалы, улады перайшлі да разбурэння храмаў.

Так, у 1934 г. быў узарваны Богаяўленскі сабор, у студзені 1936 г. знесена Уваскрэсенская царква, хаця гэтыя храмы згодна з пастановай СНК БССР ад 5.7.1926 г. былі аб'яўлены дзяржаўнай уласнасцю.

Рэпрэсіі 1930-х гадоў, несумненна, закранулі і служыцеляў культу. Але ўстанавіць, у якой ступені гэта адбывалася ў Віцебску, немагчыма з-за адсутнасці адпаведных дакументаў.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці,

ф. 56, воп. 1, спр. 163, л. 6;

ф. 67, воп. 1, спр. 56, л. 74;

ф. 102, воп. 1, спр. 112, л. 128;

ф. 123, воп. 1, спр. 754, л. 10; спр. 756, л. 57; спр. 771, л. 164;

ф. 133, воп. 1, спр. 771, л. 503;

ф. 200, воп. 1, спр. 1948: л. 57;

ф. 332, воп. 1, спр. 3, л. 30;

ф. 449, воп. 1, спр. 2395, л. 1—12;

ф. 570, воп. 1, спр. 57, л. 29;

ф. 2262, воп. 1, спр. 1, л. 3; спр. 53, л. 1;

ф. 2268, воп. 1, спр. 47, л. 214;

ф. 10050, воп. 1, спр. 377, л. 44.

Г.Н.Кадзянава, А.Р.Трусава.

Абарончыя таварыствы

Тысячы тых, хто змагаўся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, прайшлі пачатковую ваенную падрыхтоўку ў абарончых таварыствах Беларусі, у тым ліку і ў Віцебску.

Пачатак руху. Восенню 1920 г. пачало дзейнічаць ваенна-навуковае таварыства (ВНТ) Віцебскага гарнізона. Актывісты таварыства ствараліна прадпрыемствах і ў навучальных установах гурткі ваенных ведаў і ваеннай падрыхтоўкі, дапамагалі развіццю фізічнай культуры і спорту. У 1923 г. гарадская камсамолія становіцца калектыўным членам таварыства сяброў паветранага флоту (ТСПФ). Яно ставіла мэтай аказанне матэрыяльнай дапамогі ў будаўніцтве маладой савецкай авіяцыі. На сабраныя сродкі таварыства пабудавала і перадала авіяатраду, які базіраваўся ў горадзе, ангар на 10 самалётаў. Адкрыла з дапамогай авіятараў першыя ў рэспублікі курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў ячэек ТСПФ. Ініцыятыва і вопыт віцебскіх сяброў авіяцыі былі шырока падхоплены па ўсёй краіне. Тады ж членамі таварыства сталі ўсе рабочыя і служачыя віцебскай камунальнай гаспадаркі «Вадасвятло». Яны вырашылі залічыць ганаровым машыністам сваёй гаспадаркі У.І.Леніна. Адначасова ў Беларусі ствараюцца саветы садзейнічання ваеннаму навучанню працоўных. Неўзабаве Віцебскі савет садзейнічання выдзеліў 4100 залатых руб. для абсталявання 27 цэнтральных і 7 дапаможных навучальных пунктаў ваеннай падрыхтоўкі. У горадзе развіваўся авіяцыйны спорт. Ствараліся планерныя і авіямадэльныя гурткі, у рабочых і камсамольскіх клубах — авіягурткі. Тады ж быў пабудаваны планер «Віцебскі авіяхім». (Авіяхім — таварыства сяброў авіяцыйнай і хімічнай абароны і прамысловасці). 5.7.1925 г. ў Віцебску праводзіліся 1-я рэспубліканскія авіямадэльныя спаборніцтвы. А 21 ліпеня і ўлетку наступнага года — 1-я і 2-я Усебеларускія спаборніцтвы авіямадэлістаў. У кастрычніку таго ж года ў Віцебску быў створаны першы ў рэспубліцы акруговы Савет таварыства садзейнічання абароне (ТСА). Асабліва вызначыліся актыўнай працай ячэйкі ТСА на заводзе «Метпром» № 3, на панчошнай фабрыцы, на чыгуначнай станцыі. Гурткі ваенных ведаў — на абутковай, махорачнай, акулярнай, іголкавай фабрыках, на «Прафінтэрне» і «Дзвіне», на гарбарным і піваварным заводах, у ветэрынарным інстытуце.

23.1.1927 г. на 1-м Усесаюзным з'ездзе абарончыя таварыствы аб'ядналіся ў адзінае — Асаавіяхім. Галоўная мэта — пераход

да сталага практычнага ваеннага навучання ўсяго насельніцтва. Масавы характар набыла здача норм на значкі «Гатоў да працы і абароны», «Гатоў да СПХА», «Варашылаўскі стралок», «Варашылаўскі коннік», «Гатоў да санітарнай абароны». Праводзіліся масавыя спаборніцтвы за званне ўдарніка абароны. 60% прызыўнікоў неўзабаве заваявалі права насіць такія значкі. Пра тых, хто заваяваў найбольшую колькасць значкоў, расказвалі лістоўкі, насценны друк, гарадская і шматтыражныя газеты. Імі ганарыліся калектывы, іх партрэты выстаўляліся ў галерэях перадавікоў, на Дошках гонару, побач з ардэнаносцамі. У горадзе сталі часта праводзіцца захапляючыя ваенізаваныя гульні, агітпаходы, манеўры, парады, вучэнні. Дэвіз гэтай масавай грамадскай арганізацыі быў шматзначны: «Асаавіяхім — апора мірнай працы і абароны СССР». У тыя гады абарончую работу ў Віцебску ўзначальваў гарадскі савет Асаавіяхіма.

Паход адзінаццаці. Асобнай старонкай у летапіс віцебскага Асаавіяхіма ўвайшоў пешы пераход у процівагазах на вялікую адлегласць у лістападзе 1935 г. Адзінаццаць дзяўчат, лепшых працаўніц фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», Марыя Саенка (камандзір паходу), Дора Слесарава (камсорг), Радчанка, Каралькова, Бароўчанка, Фруза Спірыдонава, Марыя Ляхоўская, Юлія Бераснёва, Зіна Альтбрэгіна, Ніна Сарбай, Ліза Драбава — за 6 дзён (1—6 лістапада) прайшлі 308 км па маршруту Віцебск—Мінск. Іх урачыста сустракала сталіца Беларусі і ўрад рэспублікі. Усе яны мелі па некалькі абарончых значкоў. Пра паход адзінаццаці расказала спецыяльна выпушчаная брашура. Самай малодшай удзельніцы паходу Юліі Бераснёвай было 16 год. Яна прыйшла на фабрыку ў 1934 г. з дзіцячага дома пасля заканчэння ФЗВ. Неўзабаве яна праявіла сябе выдатнай спартсменкай і працаўніцай.

Дора Слесарава — камсорг паходу — нарадзілася ў 1915 г. Уступіла ў камсамол у 1931 г. У гэтым жа годзе паступіла ў ФЗВ, скончыла яго і пайшла працаваць на фабрыку «Сцяг індустрыялізацыі». Ударніца абарончай работы, скончыла рэспубліканскую школу снайпераў, з'яўлялася інструктарам стралковай справы на фабрыцы, падрыхтавала 315 «Варашылаўскіх стралкоў». У 1935 г. без адрыву ад вытворчасці скончыла групу матарнага лятання пры віцебскім аэраклубе. Мела званне пілота і парашутыстки. У гады Айчыннай вайны некаторыя ўдзельнікі паходу бясстрашна ваявалі. За баявыя подзвігі Зінаіда Якаўлеўна Альтбрэгіна (Сорына) узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, медалямі «За адвагу», «За вызваленне Варшавы». Праслаўленай разведчыцай у партызанскай брыгадзе імя Чапаева была Юлія Данілаўна Бераснёва — таксама адзначаная многімі баявымі ўзнагародамі.

Калі Радзіма пакліча. Лыжны агітпаход Віцебск—Орша—Магілёў—Мінск, прысвечаны 20-годдзю РСЧА, правялі ў 1938 г. асаавіяхімаўцы Віцебскага педінстытута пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры фізкультуры С.Н.Рольбіна. Сярод удзельнікаў гэтага паходу быў студэнт 3-га курса фізіка-матэматычнага факультэта Пётр Машэраў, будучы Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы, 1-ы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Паўсюдна ствараліся гурткі, у якіх моладзь вучылася мастацтву трапнай стральбы. Ціры працавалі ў парках і скверах, на бульварах. Там маглі не толькі авалодваць зброяй, але і паслухаць даклад на абаронную тэму, набыць у кніжным кіёску ваенную літаратуру. На абарончых масоўках праводзіліся трэніроўкі па рукапашным боі, у кіданні гранат. Ураджэнец Віцебска, выпускнік аэраклуба, удзельнік вайны Леў Ісаевіч Малочнікаў успамінаў: «На ўсіх спаборніцтвах у Віцебску ўдзельнічалі каманды пад дэвізам «Часць таварыша Смушкевіча». Ваенны аэрадром, які прымыкаў да вуліцы Чарняхоўскага, быў адным з лепшых у СССР, а авіябрыгада Смушкевіча, потым двойчы Героя Савецкага Саюза, адной з лепшых у ваенна-паветраных сілах краіны. Штогод віцебскія авіятары ўдзельнічалі ў паветраных парадах у Маскве». З 1.1.1940 г. ў краіне быў уведзены новы комплекс «Гатоў да працы і абароны СССР». Разам з камсамольскімі і фізкультурнымі арганізацыямі саветы Асаавіяхіма разгортвалі барацьбу за лепшую падрыхтоўку будучых воінаў. Вучоба з класаў пераносілася ў поле. У Віцебскім лагеры Асаавіяхіма яна праходзіла ў любы час дня і ночы, пры любым надвор'і. Вялікая ўвага ўдзялялася супрацьпаветранай і супрацьхімічнай абароне, барацьбе з авіядэсантамі праціўніка. Каманда пярвічнай арганізацыі Віцебскага шчотачнага камбіната заваявала права выступаць на Усесаюзных хімічных спаборніцтвах. Віцебскія асаавіяхімаўцы былі першымі ў ліку тых, хто падняўся на ўсенародную вайну супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У дзеючую армію, на ахову аб'ектаў і матэрыяльных каштоўнасцей у першую чаргу пасылалі членаў абароннага таварыства. Старажылы памятаюць подзвіг байцоў 1-й роты батальёна Асаавіяхіма ў першыя дні нападу

фашысцкай Германіі, патрыёты амаль усе загінулі, адбіваючы націск ворага ў раёне Журжава. Многія асаавіяхімаўцы змагаліся ў радах Чырвонай Арміі, у партызанскіх атрадах. А тыя, хто эвакуіраваўся, працягвалі працаваць на перамогу. У Віцебску добра ведалі майстра спорту, удзельніка многіх даваенных стралковых спаборніцтваў Пятра Лявонавіча Бужынскага, пазней начальніка Віцебскага стралкова-спартыўнага клуба Асаавіяхіма. Знаходзячыся ў эвакуацыі, ён рыхтаваў снайпераў для фронту.

Віцебскі аэраклуб. У 1930 г. было прынята рашэнне аб адкрыцці ў Віцебску 1-й беларускай школы Асаавіяхіма па падрыхтоўцы пілотаў для грамадзянскай авіяцыі. Рабілася ўсё, каб школа пачала дзейнічаць 1.1.1931 г. У Доме асветы па вуліцы Гогаля вылучылі пакоі пад класы і інтэрнат для курсантаў. За 15 км ад горада каля вёскі Кукавячына выбралі пляцоўку для аэрадрома. Абсталяваць яе дапамаглі вайскоўцы. Будаўніцтва вялося на сродкі, зароблены на гарадскіх суботніках, добраахвотныя ўзносы, датацыі ўрада рэспублікі і Цэнтральнага Савета Асаавіяхіма. Дапамаглі прамысловыя прадпрыемствы — завод «Чырвоны металіст» і фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі». Кіравалі будаўніцтвам і арганізацыяй лётнага навучання начальнік школы Муратаў і камісар Ісаеў. Гарадскія ячэйкі Асаавіяхіма правялі адбор 25 маладых камуністаў і камсамольцаў (беспартыйныя не прымаліся) кандыдатамі ў вучлёты 1-га набору. У пачатку студзеня 1931 г., як сведчаць данясенні Віцебскага гарсавета Асаавіяхіма ў Цэнтральны Савет, 1-я беларуская школа Асаавіяхіма па падрыхтоўцы пілотаў для грамадзянскай авіяцыі ў горадзе, як планавалася, пачала заняткі. Вось што расказаў пра тыя дні вучлёт 1-га набору С.М. Федасеенка: «Працаваў і вучыўся. Пасля заняткаў па тэорыі — палёты. На аэрадроме ў Кукавячыне былі лётная пляцоўка, ангар, іншыя будовы, у якіх размяшчаліся штаб школы, інтэрнат, сталовая. Дарогі туды, ды і транспарту не было. Цягніком даязджалі да станцыі Княжыцы, а там мясцовыя жыхары на лодках праз Заходнюю Дзвіну перапраўлялі нас у Кукавячына. Не ўсе вытрымлівалі вучобу, даводзілася і развітвацца з надзеяй стаць пілотам. На першым выпуску, а ён адбыўся 5.9.1931 г., пасведчанні лётчыкаў атрымалі 15 чалавек». За 1931—33 гг. школа падрыхтавала 4 выпускі — пілотамі сталі 130 юнакоў і дзяўчат. Камандзір віцебскай авіябрыгады Я.В.Смушкевіч, які прымаў экзамены, адзначаў добрыя тэарэтычныя веды і ўстойлівыя навыкі вучлётаў у тэхніцы пілатавання. Віцебскую школу пілотаў сталі называць базай па разгортванню аэраклубнай работы ў рэспубліцы. Школа мела 7 самалётаў «У-1» і 4 «У-2». Тут праходзілі падрыхтоўку пілоты-планерысты, інструктары-лётчыкі і парашутысты Мінска, Гомеля, іншых гарадоў. У 1933 г. віцебская школа пілотаў ператварылася ў аэраклуб Асаавіяхіма, які аб'ядноўваў і планерную школу, і парашутную станцыю. 17 жніўня, напярэдадні Дня паветрана флоту, які ўпершыню адзначаўся ў 1933 г., адбылося афіцыйнае адкрыццё аэраклуба. Перад вайной, па ўспамінах выпускніка аэраклуба 1940 г. Л.І.Малочнікава, клуб называлі імем 7 герояў-лётчыкаў, якія выратавалі чэлюскінцаў. Праводзячы падрыхтоўку лётчыкаў, калектыў аэраклуба шмат ўвагі надаваў развіццю авіямадэльнага, планернага і парашутнага спорту, знаёмству з авіяцыяй, выяўленню добраахвотнікаў-кандыдатаў на чарговыя наборы курсантаў па авіяцыйных спецыяльнасцях. У 1939 г. Віцебскі аэраклуб выпусціў 187 пілотаў самалёта «У-2», 60 лётчыкаў-назіральнікаў, 60 паветраных стралкоў, дзесяткі авіяцыйных тэхнікаў і матарыстаў.

Штогод паступала сотні заяў ад моладзі горада з просьбай аб залічэнні ў аэраклуб. Дзесяткі тых, хто прыйшоў сюды ў тыя гады, сталі вядомымі не толькі ў нашым краі людзьмі, што праславілі Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. *В.І.Галдзілаў.*

Дакументы сведчаць

КАНДЫДАЦКІЯ СПІСЫ ПА ВІЦЕБСКУ ДА ВЫБАРАЎ ВА УСТАНОЎЧЫ СХОД

не пазней 28 лістапада 1917 г.

Выборы в Учредительное собрание в 1917 году стояли в центре всей политической жизни Витебска. Эта избирательная кампания была ярчайшей демонстрацией политических страстей, споров, борьба за влияние на массы различных сил и движений. А спектр их в Витебске

был достаточно широк. На выборах в Учредительное собрание было представлено 14 кандидатских списков от 19 разных партий и объединений.

Список № 1 – партий социалистов-революционеров (эсеров) – Гизетти А.А., Болдыш М.Д., Новаковский Ю.С., Рускуль И.П., Цетлин М.С., Василевский Д.М., Прокофьев А.П., Каценеленбоген Г.Д., Ляховский М.Т., Моисеев В.Г.

№ 2 – Трудовой народно-социалистической партии – Зарудный А.С., Брамсон Л.М., Карпов В.Н., Богданов М.И., Кисляков Н.М., Лихницкий А.А., Кюссе-Тюз А.Я., Шестов А.И., Алонов Е.Ф., Третьяков В.С., Столповский В.П., Демидов М.П., Соловьев П.А.

№ 3 – Партии народной свободы (кадеты) – Винавер М.М., Степанов В.А., Дубосарский Э.А., Нечаева О.К., Васильев П.П., Сеньковский Е.П., Бурков С.Д., Лузгин А.Н., Абморшев И.Д.

№ 4 – Латгальского Народного Комитета и латгальской социалистической партии трудового народа – Калепиш Ф.А., Скруль А.Ф., Лайзан З.И., Вылцан Ф.П.

№ 5 – РСДРП(б) – Каменев Л.Б., Дзержинский Ф.Э., Саркисьянц С.М., Чепийко-Сохацкий С.В., Пинсон Б.Д., Ривкин З.О., Чунчин В.Я., Филитовский З.П., Лаговиер Н.О., Литвин И.В., Склянский Э.М., Песковский Н.Т., Бадаев А.Е.

№ 6 – Витебского Белорусского Народного Союза и Союза православных и единоверческих приходов Полоцкой епархии – Полонский Г.И., Бавтуто Т.Ф., Бялыницкий-Бируля Б.А., Литвинов Ф.П., Соколов М.Х., Сухарев А.С., Григорович Ф.И., Зайцев Т.Г., Старовойтов А.С., Подхилко Ф.С.

№ 7 – Еврейского национального избирательного комитета – Фридман Н.М., Брук Г.Я., Бруцкус Ю.Д., Бергер И.А., Гринберг Х.И.

№ 8 – Витебского Губернского Союза земельных собственников и Общества старообрядов Витебской губернии – Котмеревский С.А., Гусаков Г.М., Капацинский Л.Н., Ковалев А.К., Янсон А.А., Савельев В.Д., Бигге Х.И., Коссов В.Ф., Мирский Б.Д.

№ 9 – Объединенной РСДРП (м) – Бунд-Чхенкели А.И., Рейн Р.А., Гвоздев К.А., Фрумкина-Вахман М.Я., Мацканов А.А., Аронсон Г.Я., Сивицкий В.С., Матуков А.В., Чижевский Ш.М., Поморов К.И., Подашевский М.А.

№ 10 – Объединенных польских организаций – Ропп Э.Ю., Дымина Г.К., Лопацинский С.И., Недзвецкий К.В., Чесновицкий И.Л., Балюль В.В., Буйницкий А.П., Зданович С.И.

№ 11 – Социалистов-федералистов и крестьян Латгалии – Скринда А.Д., Лайзан А.А., Сейль В.Б., Бояр, Мануилов Н.М., Залан П.А., Дорошко Д.П., Козловский Э.В., Эвидрин А.Е., Габранов В.А., Габрушев Д.П.

№ 12 – Латышей-демократов-националистов – Лаберж Ю.С. Мейеровитц З.Г., Гришан И.К., Киндзуль И.К., Лаздан П.Я., Камбала С.А., Лачкай-Лаче Д.Я.

№ 13 – Крестьян Витебской губернии – Лобус А.И., Новиков Н.Ф., Алексеев Я.У., Пузыня В.И., Загулов И.П., Гущенко С.А., Коваленок Т.Е.

№ 14 – Граждан Болецкой волости Городского уезда – Кузьминский И.И.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА г. ВІЦЕБСКА

4 студзеня 1918 г.

В связи с нехваткой продуктов питания была организована их реквизиция у зажиточной части населения. Однако «ретивые» исполнители этого мероприятия, а то и прямые провокаторы, устраивали наглый грабеж людей. В ряде мест в Витебске ... происходили обыски для реквизиции продуктов питания, топлива, одежды. Обыскивались и железнодорожники. Прикрываясь именем Военно-Революционного Комитета, грабители отбирали у людей подушки, обувь, белье, теплые вещи, снимали даже серьги. Население сплотилось против грабителей, разоружило и разогнало шайки. Железнодорожники активно участвовали в борьбе с грабителями и мародерами.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 107, воп. 1, спр. 3, л. 9.

ТЭЛЕГРАМА 5-га ДАРОЖНАГА ДЭЛЕГАЦКАГА З'ЕЗДА РЫГА-АРЛОЎСКАЙ ЧЫГУНКІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ АБ КАТАСТРАФІЧНЫМ СТАНОВІШЧЫ З ХАРЧОВЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННЕМ РАБОТНІКАЎ ЧЫГУНКІ

30 ліпеня 1918 г.

Вне всякой очереди. Срочно. Москва, Совнарком, Ленину, Нарком ПС, Продпуть, Викжелдор, Всепрофжель. По линии Риго-Орловской ж.д. Центральному совету профессио-

нальных Союзов, н. комиссару дороги. Копия: Продпуть Подлазову, члену Продкома Р.-О. ж.д., наркому продовольствия.

5-й Дорожный Делегатский съезд Р.-О. ж.д., заслушав вопрос продовольственного дела на дороге, усматривает полное катастрофическое положение дороги в отношении продовольствия, что и заставляет свыше 60% служащих, мастеровых и рабочих превращаться в мешочников, которым наряду с последними реквизициями все-таки не удается раздобыть ни одного фунта хлеба; голодные же служить не могут, не взирая ни на какие репрессии в виде составления актов о невыходе на службу, увольнения и предания суду революционного трибунала, а потому мы требуем во имя спасения транспорта и революции выслать для голодающего пролетариата Р.О. ж.д. в кратчайший срок не менее 30 вагонов хлеба из расчета 100000 едоков, если же настоящее требование не будет выполнено, то ввиду того, что Дорога с мая месяца получила лишь по 2 фунта муки, 5-й Дорожный Делегатский съезд вынужден снять с себя всякую ответственность, ибо далее сдерживать изголодавшиеся массы от дезорганизованных выступлений уже не представляется возможным.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 835, воп. 1, спр. 5, л. 16–17.

ПРАПАНОВЫ САВЕЦКІХ ВАЕННЫХ І ГРАМАДЗЯНСКІХ УЛАД ГЕРМАНСКАМУ КАМАНДАВАННЮ Ў ПОЛАЦКУ АДНОСНА ЎМОЎ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ РЭЭВАКУАЦЫІ БЕЖАНЦАЎ ПА ЛІНІІ ВІЦЕБСК–ДЗВІНСК У СУВЯЗІ З АДЫХОДАМ НЯМЕЦКІХ ВОЙСК ДА ЗАХОДНЯЙ ДЭМАРКАЦЫЙНАЙ ЛІНІІ

3 верасня 1918 г.

1. Образовать в Витебске смешанную комиссию из равного числа русских и германских представителей для регистрации, приема и отправления беженцев...

2. По линии Витебск – Двинск возвращаются преимущественно беженцы из Литвы, Латвии, Латгалии и оккупированных частей Витебской губернии.

3. Беженцам разрешается брать с собой все свое движимое имущество за исключением тех предметов, вывоз которых воспрещен распоряжениями, узаконенными правительством Российской Советской Федеративной Социалистической Республики.

4. Русские беженские поезда из Витебска в составе 40 вагонов с беженцами в числе около 800 человек следует непосредственно до Двинска...

5. Все сообщение происходит без вознаграждения с той или другой стороны...

(В 9-ти пунктах и многих примечаниях к этому соглашению об условиях реэвакуации беженцев были предусмотрены все подробности.)

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 56, воп. 1, спр. 6, л. 503.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АГУЛЬНАГА СХОДУ ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РКП(Б) ПАД СТАРШЫНСТВАМ С.М.КРЫЛОВА

16 студзеня 1919 г.

Собрание Витебской организации РКП большевиков, заслушав доклад об областном съезде и полагая, что в экономическом, культурном и политико-военном отношениях все Белорусские губернии неразрывно связаны с остальной Россией, что создание Белорусской республики только разрушит уже начавший налаживаться государственный аппарат, что идейным центром по старому останется В.Ц.И.К. и что создание Белорусского Совнархоза приведет к переписыванию декретов, изданных Московским Ц.И.К. постановили считать необходимым включение ее обратно в состав России, но впредь до решения этого вопроса полномочными партийными съездами и конференциями, советскими учреждениями, временно поддерживать связь с Белорусским правительством.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 10050, воп. 1, спр. 24, л. 3.

РЭЗАЛЮЦЫЯ 4-га З'ЕЗДА САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ ПА ПЫТАННІ САМАВЫЗНАЧЭННЯ БЕЛАРУСІ

26 студзеня 1919 г.

Заслушав доклад о самоопределении Белоруссии, 4-й Съезд рабочих, красноармейских и крестьянских депутатов Витебской губернии, не входя в рассмотрение вопроса об образовании независимой Белорусской республики по существу и принимая во внимание:

1. Что экономически Витебская губерния ничем не связана с Белоруссией, а наоборот имела и имеет живую связь с центральными губерниями Советской России;

2. Что губерния давно уже русифицирована;

Население белорусского языка не знает, белорусской культуры нет;

3. Что националистических белорусских тенденций среди широких пролетарских и крестьянских масс не было и нет;

ПОСТАНОВИЛ: выделить Витебскую губернию из состава Белоруссии и присоединить к единой Советской России.

В заключение Губернский съезд Советов призывает трудящихся всех стран сплотиться для создания Единой Всемирной Социалистической Республики.

Дзяржаўны архіў Віцебкай вобласці, ф. 92, воп. 1, спр. 6, л. 18.

ЗАГАД НАЧАЛЬНІКА ВІЦЕБСКАГА ГАРНІЗОНА АБ АБВЯШЧЭННІ ВІЦЕБСКА НА ВАЕННЫМ СТАНОВІШЧЫ Ў СУВЯЗІ З НАСТУПЛЕННЕМ ПОЛЬСКІХ ВОЙСК

23 жніўня 1919 г.

Во исполнение приказа Начальника штаба армии, объявляю город Витебск на военном положении с 12 часов дня 23 августа 1919 года.

1. Воспрещается всякое движение и появление граждан на улицах города Витебска с 23 часов и до 6 часов утра под страхом ответственности в первый раз штрафа 50 руб. и второй раз — 500 руб., с преданием военно-полевому суду.

2. Всем Советским и общественным заведениям и учреждениям предлагается за получением пропусков сотрудникам, служебное положение коих сопряжено с передвижением по городу в запрещенное время, войти в сношение с комендантом города.

3. Разрешается функционировать театрам, кинематографам и подобным учреждениям, подведомственным отделам Народного Образования и Политпросвету Витгубвоенкома, коим прекращать свою деятельность ровно в 22 часа.

4. Устройство собраний, митингов и проч. разрешается только мною.

Начальник гарнизона Скудре
Комендант города Бездесев

ЗАГАД № 1 НАЧАЛЬНІКА АТРАДА АСОБАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ ПРЫ ВІЦЕБСКІМ ГУБЕРНСКІМ КАМІТЭЦЕ РКП(б)

24 верасня 1919 г.

§1

Вследствие предписания Губпарткома от 11 сентября сего года за № 4193 я вступил в обязанности Начальника Отряда особого назначения при Губернском Партийном Комитете РКП(б), о чём и довожу до Вашего сведения.

§2

Вследствие распоряжения ЦКП предлагается всем членам партии, кандидатам и сочувствующим, за исключением женщин (последние добровольно), всем коллективам и ячейкам (за исключением военных), в 3-дневный срок вступить членами в отряд Особого назначения и явиться для записи в штаб отряда — Пушкинская, д. 4 с 10 до 2-х часов дня.

§3

Все члены партии, кандидаты и сочувствующие, уже состоящие в отряде в тот же срок должны представить в штаб отряда анкеты с указанием имени, отчества, фамилии, точного адреса, имеющегося на руках снаряжения и оружия и их номера, а также номер телефона домашнего и служебного.

§4

Все члены отряда обязаны аккуратно по понедельникам, средам и пятницам ровно в 5 часов вечера без малейших опозданий являться на военное обучение.

§5

Все выбывшие из города члены отряда обязаны сообщать об этом в штаб отряда, выбывающие же навсегда — сдавать туда же снаряжение и оружие.

§6

Всё находящееся на руках оружие и снаряжение должно быть в чистоте и опрятности. За порчу, утерю или небрежное отношение к оружию виновные будут преданы партийному суду.

§7

Все члены отряда — как партийные, так и сознательные товарищи, обязаны подчиниться всем моим законным распоряжениям и служить для всех примером. Все распоряжения должны выполняться быстро, точно и аккуратно без малейших уклонений. Этого требует партийная дисциплина и Революция. Неподчиняющиеся Революционной дисциплине будут преданы партийному суду.

Начальник отряда Особого назначения А.Реуцкий.

ПАСТАНОВА ВІЦЕБСКАГА ГУБЕРНСКАГА ВАЕНРЭЎКОМА АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЕПІСЬМЕННАСЦІ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА

27 студзеня 1920 г.

Во исполнение декрета Совнаркома от 26 декабря 1919 г. о ликвидации безграмотности среди населения РСФСР Витебский губвоенревком постановил:

1. Предложить отделу труда освобождать неграмотных рабочих и служащих, занятых на фабриках, заводах, мастерских, предприятиях, учреждениях и пр., от работ и занятий на 2 часа ежедневно с сохранением заработной платы для занятий в школах по ликвидации безграммотности.

2. Губотделу народного образования в недельный срок приступить к фактической ликвидации безграмотности среди трудящегося населения Витебской губ., привлекая к этой работе в порядке трудовой повинности все грамотное население, не призванное в войска, в порядке и постепенности по усмотрению отдела, с оплатой труда по ставкам союза раб[отников] просвещения и социальной культуры.

3. Всем органам снабжения вменить в обязанность удовлетворить запросы учреждений, имеющих целью ликвидацию безграмотности, преимущественно перед другими учреждениями.

4. Все лица и учреждения, препятствующие неграмотным посещать школы или уклоняющиеся от установленных настоящим постановлением повинностей, будут привлекаться к ответственности по законам революционного времени.

Известия Витебского губисполкома. 1920. 3 февраля.

БЯЛЯЕЎ Пётр Пятровіч, н. ў 1874, в. Росчыца Дрысенскага раёна. Святар Пакроўскай царквы, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.7.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 12.9.1989.

БЯЛЯЎСКІ Аркадзь Антонавіч, н. ў 1926, Віцебск. Ваеннаслужачы. Асуджаны 31.12.1944 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.11.1962.

БЯЛЯНСКІ Васіль Барысавіч, н. ў 1895, в. Козы Горы Суражскага раёна. Аглядчык вагонаў ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.4.1933. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 18.3.1961.

БЯРОЗКІН Аркадзь Нілавіч, н. ў 1877, в. Стар Конаўскага павета. Кучар санстанцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.10.1937 да 8 гадоў ППЛ. 24.11.1941 асуджаны да ВМП. Мера пакарання заменена на 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 27.7.1942. Рэабілітаваны 28.4.1992.

БЯРЭЗІН Яфім Міхайлавіч, н. ў 1910, хут. Новы Двор Бешанковіцкага раёна. Рабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.12.1958.

ВАВЕР Арнольд Адамавіч, н. ў 1901, г. Рыга. Слесар-інструментальшчык Віцебскага саюзтранса, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 5.1.1941. Рэабілітаваны 25.5.1958.

ВАВЕР Лідзія Пятроўна, н. ў 1911, м. Мсціж Бягомльскага раёна. Студэнтка Віцебскага медінстытута, жыла ў Віцебску. Асуджана 25.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 15.3.1940.

ВАГЕЛЬ Юліан Іванавіч, н. ў 1881, ст. Гараны Полацкага раёна. Вартаўнік ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.12.1958.

ВАЗНЯК Іосіф Уладзіслававіч, н. ў 1894, г. Варшава. Планавік Віцебскай канторы дэпо трамвая, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.11.1938. Расстраляны 21.11.1938. Рэабілітаваны 16.11.1963.

ВАЗНЯК Ірына Эдмундаўна, н. ў 1895, г. Варшава. Медыцынская сястра інфекцыйнай бальніцы, жыла ў Віцебску. Асуджана 26.2.1938. Расстраляна 21.3.1938. Рэабілітавана 29.9.1989.

ВАЗНЯК Пётр Мікалаевіч, н. ў 1877, г. Варшава. Рабочы шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 26.5.1970.

ВАЙНБЕРГ Абрам Айзікавіч, н. ў 1894, Польшча. Шчаціншчык Віцебскага шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ВАЙЦАХОВІЧ Іван Мацвеевіч, н. ў 1901, Свянцянскі павет. Змазчык на фабрыцы, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.3.1959.

ВАЙЦАХОЎСКІ Адольф Антонавіч, н. ў 1870, в. Шыкі Суражскага раёна. Не працаваў, пражываў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.11.1961.

ВАЙЦАХОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1885, г. Рыга. Грузчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 17.1.1938. Рэабілітаваны 14.8.1959.

ВАЙЦАХОЎСКІ Васіль Альфонсавіч, н. ў 1916, г. Веліж. Матарыст авіямайстэрняў, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ВАЙЦАХОЎСКІ Павел Францавіч, н. ў 1876, Лёзненскі раён. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ВАЛАЕЎ Іван Іванавіч, н. ў 1900, Латвія. Рабочы будпляцоўкі № 3 УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 28.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ВАЛОДКА (ВАЛАДКО) Пётр Феліксавіч, н. ў 1889, г. Коўна. Дырэктар Белэнергазбыту, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 5.3.1959.

ВАЛАСАЧ Валянцін Якаўлевіч, н. ў 1893, Полацк. Служачы ваеннага шпіталю, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ВАЛЕЙКА Іпаліт Адамавіч, н. ў 1874, Віленская губ. Кандуктар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 (у тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам з 20.6.1931 па 23.10.1931). Рэабілітаваны 20.11.1989.

ВАЛЬПТЭР Вакінцій Станіслававіч, н. ў 1876, Курляндская губ. Рабочы 6-га вагоннага ўчастка ст. Віцебск, жыў у пас. ст. Віцебск. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 28.2.1962.

ВАЛЬТМАН Рахіль Аронаўна, н. ў 1904, г. Люблін. Пенсіянерка. Жыла ў Віцебску. Асуджана 29.3.1938. Расстраляна 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 11.4.1970.

ВАЛЬТЭР Эрых Энгельбертавіч, н. ў 1902, Курляндская губ. Цясляр 5-га прарабскага пункта ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.4.1938. Расстраляны 16.4.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ВАЛЮКАС Леанард Антонавіч, н. ў 1891, г. Мінск. Загадчык сталовай начсастава авіяаб'яднання г. Ула, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 9.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

ВАЛЯНСКАЯ Міра Абрамаўна, н. ў 1909, г. Вільна. Бракоўшчыца фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1938. Рэабілітавана 19.08.1966.

ВАНАГЕЛЬ Леапольд Іванавіч, н. ў 1889, г. Дзвінск, машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 4.11.1938. Рэабілітаваны 19.08.1966.

ВАНД Меер Моўшавіч, н. ў 1905, в. Пяскі Гродзенскай губ. Загадчык магазіна Дрыбінскага сяльпо, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.1.1959.

ВАНОГ (ВОНАГ) Дамінік Усцінавіч, н. ў 1884, в. Кокенішкі Дзвінскага павета. Электрамеханік ст. Віцебск, жыў на ст. Віцебск. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 2.12.1957.

ВАРАБ'ЁЎ Васіль Аляксандравіч, н. ў 1883, в. Трэгубцы Бешанковіцкага раёна. Фельчар 6-га санітарнага раёна Заходняй чыгункі, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 20.8.1938. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ВАРАНОВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1905, в. Калюты Дрысенскага раёна. Манцёр Віцебскай майстэрні Белсельэлектра, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.9.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.3.1940.

ВАРАНОВІЧ Пётр Яфімавіч, н. ў 1903, Дрысенскі раён. Слесар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 10.3.1959.

ВАРАТНІКОЎ Аляксей Іванавіч, н. ў 1899, г. Варшава. Старшы электраманцёр ватнай фабрыкі імя Крупскай, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ВАРАШКЕВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1884, в. Пагарцы Вілейскага павета. Апальшчык паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.7.1958.

ВАРКУЛЕВІЧ Рыгор Нікіфаравіч, н. ў 1900, в. Гасцілава Гарадоцкага раёна. Рабочы фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.2.1962.

ВАРКУЛЕВІЧ Сцяпан Пракоф'евіч, н. ў 1893, в. Пісарава Сіроцінскага раёна. Грузчык ст. Чэпіна, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 27.8.1937. Рэабілітаваны 17.2.1962.

ВАРЛАХОВІЧ Іосіф Фёдаравіч, н. ў 1902, в. Міцкевічы Віленскай губ. Выкладчык Віцебскага палітэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 19.5.1958.

ВАРФАЛАМЕЕЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1897, Віцебск. Ваеннаслужачы. Асуджаны 14.4.1943 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.9.1958.

ВАРФАЛАМЕЕЎ Андрэй Іванавіч, н. ў 1889, в. Смолькі Віцебскага раёна, машыніст паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.12.1958.

ВАСЕРМАН Іосіф Іцкавіч, н. ў 1915, Польшча. Кравец фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 2.5.1942 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАСІЛЕЎСКАЯ Ядвіга Іосіфаўна, н. ў 1899, хут. Хронаўшчына Віцебскага раёна. Жыла ў Віцебску. Асуджана 28.11.1937. Расстраляна 10.1.1938. Рэабілітавана 15.10.1957.

ВАСІЛЕЎСКІ Тэафіл Сільвестравіч, н. ў 1884, Латвія. Вартаўнік радзільнага дома, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.2.1956.

ВАСІЛЕЎСКІ Ціт Сямёнавіч, н. ў 1881, в. Смяшкова (Смешкава) Сіроцінскага раёна. Тэхнік гарадской тэлефоннай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.3.1934 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ВАСІЛЬЕВА Еўдакія Яфрэмаўна, н. ў 1889, в. Зазер'е Полацкага раёна. Рабочая вулканізацыйнай майстэрні, жыла ў Віцебску. Асуджана 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 18.1.1960.

ВАСІЛЬЕЎ Канстанцін Рыгоравіч, н. ў 1885, в. Аляшковічы Віцебскага раёна. Возчык 3-га ЖАКТ, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 3.6.1942. Рэабілітаваны 28.8.1958.

ВАСІЛЬЕЎ Мікіта Анікеевіч, н. ў 1896, в. Копці Лёзненскага раёна. Аграном Віцебскай канторы «Заготлён», жыў у Віцебску. Асуджаны ў 1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.4.1950.

ВАСІЛЬЕЎ Пётр Васілевіч, н. ў 1882, г. Ленінград. Інжынер гаркамгаса, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.12.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВАСІЛЬЕЎ Пётр Васілевіч, н. ў 1887, в. Зуйкова Калінінскай вобл. Сталяр фабрыкі «Прагрэс», жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 5.10.1942. Рэабілітаваны 22.12.1956.

ВАСІЛЬЕЎ Рыгор Міхайлавіч, н. ў 1915, в. Алешкавічы (Аляшковічы) Віцебскага раёна. Тэхнік фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Ві-

цебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.3.1955.

ВАСІЛЬКОЎ Сяргей Андрэевіч, н. ў 1880, в. Палавіннікі Полацкага раёна. Грузчык Віцебскага пединстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ВАСІТАЎ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1897, в. Церамі Віцебскага раёна. Баец пажарнай аховы ватнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 21.11.1957.

ВАСКРАСЕНСКІ Барыс Васілевіч, н. ў 1899, Віцебск. Планавік саўгаса «Індустрыя», жыў у пас. Апатыты Мурманскай вобл. Арыштаваны 1.7.1938. Справа спынена 16.8.1939, вызвалены.

ВАСЮКЕВІЧ Іосіф Адамавіч, н. ў 1897, в. Селен Навагрудскага раёна. Рабочы завода «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.3.1938. Расстраляны 27.9.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ВАСЮТОВІЧ Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1901, Віцебск. Рабочы-змазчык ст. Віцебск. Асуджаны 2.11.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 18.9.1965.

ВАШКЕВІЧ Барыс Канстанцінавіч, н. ў 1906, в. Клімянцінава Кобрынскага раёна. Інжынер-будаўнік Віцебскай АТС, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.7.1962.

ВАШКЕВІЧ Іван Емяльянавіч, н. ў 1896, в. Гатава Мінскага раёна. Начальнік змены цагельнага завода № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 10.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 10.4.1970.

ВАХІМЯК Антон Віктаравіч, н. ў 1908, Фінляндыя. Слесар сударамонтных майстэрняў, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 25.5.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ВЕБЕР Іаган Давідавіч, н. ў 1875, Германія. Майстар на мэблевай фабрыцы, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.1.1938 да высылкі за межы СССР. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ВЕГЛІН Іван Пятровіч, н. ў 1908, в. Трохсвяцкая Заходняй вобл. Рабочы лесазавода № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 14.2.1941. Рэабілітаваны 26.7.1958.

ВЕГЛІН Карл Давыдавіч, н. ў 1874, Ліфляндская губ., рабочы лесазавода № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.7.1958.

ВЕГЛІН Пётр Давыдавіч, н. ў 1882, Ліфляндская губ. Рабочы лесазавода № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.7.1958.

ВЕГНЕР Аляксандр Густававіч, н. ў 1895, Віцебск. Загадчык забеспячэння і збыту шклозавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.2.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ВЕГНЕР Аркадзь Густававіч, н. ў 1896, Віцебск. Тэхнолаг маслапрама. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 10.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 12.4.1960.

ВЕЙН Іван Пятровіч, н. ў 1889, в. Нова-Клішава Лёзненскага раёна. Рабочы аддзялення сувязі, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1956.

ВЕЙНБЕРГ Карл Фрыцавіч, н. ў 1898, Ліфляндская губ. Вагаўшчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 13.10.1989.

ВЕЙКША Іван Антонавіч, н. ў 1890, Ковенская губ. Слесар дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.5.1938. Расстраляны 14.7.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ВЕЙН Ільза Іванаўна, н. ў 1912, в. Новаклініна Лёзненскага раёна. Рахункавод бальніцы імя Леніна, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ВЕЙЦКІН Яфім Юдавіч (Юдзелевіч), н. ў 1902, г. Глыбокае. Загадчык сталовай, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ВЕЛЬФЛЕ Вільгельм Юльянавіч (Іванавіч), н. ў 1890, г. Лодзь. Чорнарабочы лесазавода № 13, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 28.5.1958.

ВЕНЯДЗІКТАЎ Георгій Іосіфавіч, н. ў 1873, г. Лепель. Экспедытар, пражываў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 18.10.1937. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ВЕРАМЕЙЧЫК Сямён Зосімавіч, н. ў 1903, в. Рэчань Любанскага раёна. Загадчык кафедры ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 24.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.3.1958.

ВЕШТАРТ Фёдар Паўлавіч, н. ў 1890, г. Вільна. Муляр вагоннага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 21.1.1958.

ВІДМАНТ Валяр'ян Станіслававіч, н. ў 1910, Сенненскі раён. Шафёр акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

ВІДМАНТ Карл Іосіфавіч, н. ў 1897, в. Шашкі Сенненскага раёна. Вагаўшчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 21.5.1959.

ВІКС Аўгуст Карлавіч, н. ў 1892, Латвія. Загадчык трамвайнай электрастанцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.3.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ВІЛЕНЧЫЦ Іосіф Аляксандравіч, н. ў 1893, в. Стараселле Быхаўскага раёна. Інжынер абласнога ўпраўлення сувязі, жыў у Віцебску. Асуджаны

11.12.1941 да 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 29.4.1942. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ВІЛЬКАНСКІ Арон Генахавіч, н. ў 1910, г. Навагрудак. Студэнт Віцебскага палітэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

ВІЛЬЦЭН Альберт Рыгоравіч, н. ў 1893, м. Жогарава, Латвія. Дворнік, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 22.5.1938. Рэабілітаваны 8.1.1965.

ВІЛЬЧЫНСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1898, г. Дзвінск. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ВІНАГРАДАВА Марыя Іванаўна, н. ў 1898, в. Пікцян Суражскага раёна. Паліроўшчык Віцебскай акулярнай фабрыкі, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 20.8.1957.

ВІНАГРАДАЎ Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1900, г. Калуга. Тэхнік-будаўнік 10-й дыстанцыі службы пуці, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 19.2.1957.

ВІНТЭР Рэгіна Нахімаўна, н. ў 1904, в. Магільніца Варшаўскага ваяводства. Краўчыха арцелі «Спартак», жыла ў Віцебску. Асуджана 5.1.1942 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.6.1989.

ВІТКО Генрых Іосіфавіч, н. ў 1911, в. Краснае Валынскай губ. Настаўнік польскай сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 31.10.1933 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ВІШНЕЎСКІ Станіслаў Адамавіч, н. ў 1893, в. Дылманы Дзвінскага павета. Рабочы Віцебскай акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.4.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.4.1989.

ВІШНЯК Самуіл Ісідоравіч, н. ў 1878, Віцебск. Галоўны інжынер будаўніцтва Кемераўскай ГЭС, жыў у Маскве. Арыштаваны 9.2.1938. Асуджаны 26.4.1938 да ВМП. Дата пакарання не ўказана. Рэабілітаваны 17.5.1992.

ВОДНЕЎ Шалом Янкелевіч, н. ў 1878, м. Плісы. Рабочы лесазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ВОЙНІЧ Франц Канстанцінавіч, н. ў 1888, Мінск. Шавец, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

ВОЛКАВА Алена Дзмітрыеўна, н.ў 1888, г. Палтава. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 25.8.1937. Расстраляна 27.8.1937 у Мінску. Рэабілітавана 27.4.1990.

ВОЛКАЎ Лазар Іванавіч, н. ў 1876, в. Стайкі Быхаўскага раёна. Рабочы шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.1.1931 да ссылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 25.5.1990.

ВОЛКАЎ Аляксей Нікіфаравіч, н. ў 1911, в. Казлова Віцебскага раёна. Рабочы маслазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 15.8.1947. Рэабілітаваны 16.3.1963.

ВОЛЧАК Рыгор Абрамавіч, н. ў 1897, м. Беразіно. Рабочы панчошна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 5.10.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.4.1958.

ВОЛЬФСАН Дзіна Шмуіл-Залманаўна, н. ў 1912, Віцебск. Студэнтка Віцебскага медінстытута. Асуджана 25.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 15.3.1940.

ВОРАНАЎ Лявон Піліпавіч, н. ў 1911, в. Малыя Палойнікі Віцебскага раёна. Студэнт педтэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.4.1930 да 1 году ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 20.8.1993.

ВОРАНАЎ Міхаіл Піліпавіч, н. ў 1906, в. Малыя Палойнікі Віцебскага раёна. Дыспетчар вагоннага ўчастка ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.6.1956.

ВОЎК Мікалай Нікіфаравіч, н. ў 1880, хут. Бакай Белацаркоўскага раёна. Вартаўнік дзіцячага дому, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ВРАХАРЫТ Фёдар Фёдаравіч, н. ў 1863, Ленінградская вобл., загадчык гаспадаркі 4-й сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ВУРГАНАВА Еўдакія Андрэўена, н. ў 1904, Віцебск. Медсястра бальніцы г. Віцебска. Асуджана 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 28.8.1958.

ВЫДРЫЦКІ Ігнацій Ігнацьевіч, н. ў 1891, в. Рудкава Дрысенскага раёна. Возчык маслазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938 да ВМП. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ВЫКАЙН Уладзіслаў Людзвігавіч, н. ў 1894, в. Новадай, Латвія. Шавец майстэрні НКУС, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ВЫЛЦАН Іван Пятровіч, н. ў 1885, Дзвінскі павет. Слесар паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 17.10.1989.

ВЫРВІЧ Аляксандр Георгіевіч, н. ў 1886, м. Мядзель. Жыў у Віцебску. Асуджаны 11.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 22.12.1933. Рэабілітаваны 18.3.1961.

ВЫСАКОЎСКІ Віктар Іванавіч, н. ў 1889, в. Буракі Віцебскага раёна. Машыніст вадакачкі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 16.5.1959.

ВЫСОЦКАЯ Тэрэза Іванаўна, н. ў 1898, в. Худанава Ульскага раёна. Прыбіральшчыца магазіна мясакамбіната, жыла ў Віцебску. Асуджана

15.11.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.12.1989.

ВЫСОЦКІ Аляксей Іванавіч, н. ў 1905, в. Бітаўка Суражскага раёна. Пажарнік 1-й пажарнай каманды, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.5.1976.

ВЫСОЦКІ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1881, г. Варшава. Рабочы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 14.7.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 10.4.1970.

ВЫСОЦКІ Уладзімір Вікенцьевіч, н. ў 1894, Віцебск. Грузчык спіртзавода. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.5.1958.

ВЫШЫНСКІ Аўгусцін Гаўрылавіч, н. ў 1886, Віцебск. Памочнік бухгалтара Мурманскага абласнога камітэта па радыёвяшчанні, жыў у Мурманску. Арыштаваны 25.8.1937. Асуджаны 14.9.1937. Расстраляны 15.9.1937. Пахаваны ў г. Ленінградзе на Левашоўскіх могілках. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ВЯЛІЧКА Адольф Кайтанавіч, н. ў 1885, г. Даугаўпілс. Рабочы лесазавода № 13, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 8.9.1961.

ВЯЛІЧКА Уладзімір Кайтанавіч (Канстанцінавіч), н. ў 1892, Ковенская губ. Рабочы лесазавода № 13, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

ВЯЛІЧКА Ягор Карпавіч, н. ў 1908, м. Дрыса. Рабочы фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ВЯЛЮГА Васіль Рыгоравіч, н. ў 1876, в. Баравая Полацкага раёна. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

ВЯРЖБІЦКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. ў 1881, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 14.9.1959.

ВЯРЖБІЦКАЯ Соф'я Іванаўна, н. ў 1885, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 31.10.1958.

ВЯРЖБІЦКІ Іван Яцкавіч, н. ў 1875, м. Чашнікі. Пенсіянер. Жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.9.1959.

ВЯРЖБІЦКІ Казімір Яцкавіч, н. ў 1877, м. Чашнікі. Рабочы вагоннага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 31.10.1958.

ВЯРОЎКІН Васіль Аляксандравіч, н. ў 1911, в. Таль Любанскага раёна. Бухгалтар прыстані ОСВОД, жыў у Віцебску. Арыштаваны 10.8.1938. Памёр у турме падчас следства 19.9.1938. Рэабілітаваны 25.1.1960.

ВЯРНОЎСКІ Абрам Давідавіч, н. ў 1908, м. Лоеў Гомельскай вобл. Выкладчык Віцебскай медшколы, жыў у Віцебску. Асуджаны 27.2.1937 да 5 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 3 гады. Рэабілітаваны 14.6.1940.

ВЯРЫГА Адам Антонавіч, н. ў 1901, в. Вакаўшчына Расонскага раёна. Чорнарабочы Віцебскай трапічнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

ВЯРЫГА Адам Ігнацьевіч, н. ў 1883, м. Дрыса. Вартаўнік УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 9.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

ВЯРЫГА Валяр'ян Іосіфавіч, н. ў 1910, Віцебск. Будаўнік на фабрыцы імя Кагановіча. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 3.2.1961.

ВЯРЫГА Іосіф Францавіч, н. ў 1867, в. Геронкі Дрысенскага раёна. Ксёндз, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.5.1933 да ссылкі на працоўнае пасяленне ў Казахстан тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1989.

ВЯРЫГА Рамуальд Іосіфавіч, н. ў 1914, Віцебск. Слесар палітэхнікума. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.9.1957.

ВЯРЫГА-МЕЕР Эрна Іванаўна, н. ў 1901, г. Рыга. Прыбіральшчыца УВБР-98, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ВЯЧОРСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1896, г. Вільнюс. Пажарнік акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.5.1960.

ГАБРОЎ Амбросій Іосіфавіч, н. ў 1882, Люцінскі павет. Загадчык манеўрамі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ГАВАНІС Мечыслаў Баляслававіч, н. ў 1895, г. Коўна. Намеснік старшыні партыі левых сацыялрэвалюцыянераў (эсэраў), жыў у Віцебску. Асуджаны 24.9.1922 да ссылкі ў Рыбінскую губ. тэрмінам на 2 гады. Рэабілітаваны 22.9.1996.

ГАГАЛІНСКІ Аляксандр Захаравіч, н. ў 1914, Віцебск. Слесар ігольнага завода. Асуджаны 22.11.1936 (у тэрмін пакарання ўключаны тэрмін знаходжання пад следствам). Другі раз асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 2.10.1989 і 5.11.1989.

ГАДЛЕЎСКІ Віктар Іванавіч, н. ў 1895, Ковенская губ. Рабочы пахавальнага бюро, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.3.1960.

ГАЕЎСКАЯ Эмілія Мікалаеўна, н. ў 1900, в. Заполле Віцебскага раёна. Загадчык гаспадаркі інстытута, жыла ў Віцебску. Асуджана 8.1.1938. Расстраляна 26.2.1938 у Мінску. Рэабілітавана 1.11.1957.

ГАЕЎСКІ Антон Францавіч, н. ў 1894, г. Дзвінск. Рабочы пякарні № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ГАЕЎСКІ Іван Іванавіч, н.ў 1909, в. Асінаўка Бешанковіцкага раёна. Ахоўнік на фабрыцы імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1956.

ГАЗЕНФУС Яўген Рабертавіч, н. ў 1898, Ліфляндская губ. Загадчык аддзела Саюзмашснабзбыту, пражываў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1938. Расстраляны 21.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 13.10.1958.

ГАЙВЕНІС Пётр Усцінавіч, н. ў 1890, в. Пацьева Руднянскага раёна. Вартаўнік трамвайнага дэпо, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 28.8.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.12.1959.

ГАЙДУК Уладзіслаў Вікенцьевіч, н. ў 1884, Літва. Рабочы арцелі «Саюзутыль», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ГАЙДУКОЎ Пётр Антонавіч, н. ў 1880, Віцебск. Памочнік начальніка ст. Віцебск. Асуджаны 11.1.1931 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.8.1989.

ГАЙДЭЛЬ Іосіф Казіміравіч, н. ў 1883, в. Трэбукі Віленскай губ. Рабочы завода № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.8.1959.

ГАЙЛІТ Уладзімір Фадзеевіч, н. ў 1883, м. Друя. Цырульнік ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ГАЙЛПШ Адольф Юр'евіч, н. ў 1875, Літва. Вартаўнік вагоннага ўчастка ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.2.1938. Расстраляны 17.3.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 18.7.1959.

ГАЛАЎНЁВА Ганна Мікалаеўна, н. ў 1909, в. Заклеценне Кобрынскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 20.5.1933 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 2.10.1989.

ГАЛАЎНЁЎ Лявон (Лявонцій) Андрэевіч, н. ў 1897, в. Галаўні Полацкага раёна. Сталяр аўтапарка, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.10.1989.

ГАЛАЎЧЫНЕР Самуіл Паўлавіч, н. ў 1909, г. Дуброўна. Рабочы завода № 1 пас. Руба, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.8.1939 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.8.1955.

ГАЛЕЕВА Ефрасіння Арцёмаўна, н. ў 1892, в. Загаворына Бешанковіцкага раёна. Рабочая «Плодаагародніны», жыла ў Віцебску. Асуджана 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 18.1.1960.

ГАЛЕЕЎ Аляксей Міхайлавіч, н. ў 1880, в. Кабаны Суражскага раёна. Чорнарабочы ігольнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1989.

ГАЛІМСКІ Лукаш Дзямідавіч, н. ў 1904, в. Рогаўка Бабруйскага раёна. Рабочы тарнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ГАЛІН Іван Іванавіч, н. ў 1900, в. Дубовец Суражскага раёна. Матарыст перавалачнага воднага пункта, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ГАЛОШАЎ (ГАЛОШЧАЎ) Ермалай Парфенавіч, н. ў 1884, в. Казлы Віцебскага раёна. Рабочы тарнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 24.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ГАЛУБІН Фёдар Фаміч, н. ў 1881, в. Тачонае Сіроцінскага раёна. Качагар поезда, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.2.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.5.1989.

ГАЛЬКОЎСКІ Павел Іванавіч, н. ў 1892, г. Невель. Рабочы макароннай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 7.10.1964.

ГАЛЯВІЦКІ Пейсах Самуілавіч, н. ў 1910, в. Бронікі Навагрудскага ваяводства. Рабочы трамвайнай канторы, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

ГАЛЯШЭВІЧ Казімір Антонавіч, н. ў 1886, г. Любава. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны 24.10.1955.

ГАМКАЛА Іван Ісідоравіч, н. ў 1911, в. Барынічы Львоўскага павета. Бухгалтар фабрыкі «Прафінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.7.1972.

ГАНДЭЛЬМАН Рувім Мендзелевіч, н. ў 1895, Сядлецкая губ., Польшча. Сталяр ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ГАНІН Крыш'ян Гутардавіч, н. ў 1871, Ковенская губ. Жыў у Віцебску. Асуджаны 9.5.1933 да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ГАНІПРОЎСКІ Рычард Іосіфавіч, н. ў 1918, в. Каралёва Лёзненскага раёна. Студэнт ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ГАНУС Марыя Андрэеўна, н. ў 1902, г. Енісейск. Без пэўных заняткаў, жыла у Віцебску. Асуджана 20.1.1938. Расстраляна 9.3.1938 у Мінску. Рэабілітавана 3.12.1957.

ГАРАВЫ Сяргей Міхайлавіч, н. ў 1903, Віцебск. Качагар ледакола «Малыгін» Мурманскага марскога параходства, жыў у Мурманску. Арыштa-

ваны 3.2.1932. Асуджаны да 2 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.5.1989.

ГАРАДЗЕЦКІ Сільвестр Антонавіч, н. ў 1885, Віленская губ. Праваднік вагонаў ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.19.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1959.

ГАРАЛЕВІЧ Ніканор Дзмітрыевіч, н. ў 1908, в. Забор'е Бешанковіцкага раёна. Качагар, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 7.4.1989.

ГАРАЧЫКАЎ Барыс Якаўлевіч, н. ў 1901, м. Любань. Дырэктар вячэрняй рабочай школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.12.1937. Расстраляны 29.2.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ГАРБ Эма Аляксандраўна, н. ў 1897, г. Панявежыс. Медсястра інфекцыйнай бальніцы, жыла у Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 13.10.1989.

ГАРБУНОВА Геня Ізраілеўна, н. ў 1912, г. Вільна. Не працавала, жыла у Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 21.9.1959.

ГАРБУНОВА Юлія Паўлаўна, н. ў 1902, в. Забор'е Дзісненскага павета. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 9.12.1937. Расстраляна 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 16.4.1959.

ГАРБУНОЎ Панфіл Васілевіч, н. ў 1912. Заходне-Сібірская вобл. Студэнт Віцебскага ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.8.1989.

ГАРДЗЕЕЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1907, в. Замосце Віцебскага раёна. Студэнт Віцебскага педтэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.4.1930 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.8.1958.

ГАРДЗІЕНКА Іван Рыгоравіч, н. ў 1889, м. Камень Лепельскага раёна. Бухгалтар, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1938.

ГАРКАЛІН Сігізмунд Андрэевіч, н. ў 1879, Віцебск. Слесар дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 4.7.1931 да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Другі раз асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.6.1960 і 14.8.1964.

ГАРНІЦКАЯ Клаўдзія Ніканораўна, н. ў 1891, в. Альбрэхтава Полацкага раёна. Настаўніца школы № 52, жыла у Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 18.3.1958.

ГАРНОЎСКІ Канстанцін Данілавіч, н. ў 1889, Віцебск. Слесар лесаэкспартнай базы «Чэпіна». Асуджаны 29.3.1938. Расстраляны 4.6.1938. Рэабілітаваны 16.7.1958.

ГАРНЫ Якаў Рыгоравіч, н. ў 1893, в. Русілкі Бешанковіцкага раёна. Ахоўнік лесазавода № 13, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.4.1989.

ГАРШКО Антон Францавіч, н. ў 1896, Ковенская губ. Слесар дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.11.1930 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ГАРЭЛАВА Вера Барысаўна, н. ў 1899, г. Краснадар. Пенсіянерка, жыла у Віцебску. Асуджана 22.2.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 2.11.1989.

ГАРЭЛІКАЎ Данііл Патапавіч, н. ў 1878, в. Гарэлікі Гарадоцкага раёна. Рабочы 1-га ўчастка ваеннага будаўніцтва, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.5.1932 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ГАРЭЛЬШАВА Алена Антонаўна, н. ў 1899, в. Клюшкова Полацкага раёна. Машыністка 10-й дыстанцыі пуці Заходняй чыгункі, жыла у Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 3.11.1961.

ГАРЭЛЬШАЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1909, в. Баранава Лёзненскага раёна. Электразваршчык завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 31.10.1961.

ГАРЭЦКІ Бернард Антонавіч, н. ў 1894, Полацкі павет. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.1.1938 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.3.1988.

ГАУК Георгій Карлавіч, н. ў 1887, Ліфляндская губ. Майстар завода «Чырвоны металіст», жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 25.5.1958.

ГАЎРЫЛАВА Еўдакія Мікітаўна, н. ў 1889, в. Пустыні Невельскага раёна. Прыбіральшчыца спіртзавода, жыла у Віцебску. Асуджана 15.11.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.11.1989.

ГАЎРЫЛАЎ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1901, в. Любіна Сіроцінскага раёна. Цясляр фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 29.2.1960.

ГАЎРЫЛАЎ Яўціхій Ягоравіч, н. ў 1880, в. Астахава Невельскага раёна. Вартаўнік фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 13.2.1938. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ГАЎРЫЛЬЧЫК Іван Сцяпанавіч, н. ў 1905, в. Галаўні Віленскай губ. Служачы Віцебскага шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.1.1959.

ГАЎРЫЛЬЧЫК Міхаіл Іванавіч, н. ў 1895, в. Бялеўшчына Ветрынскага раёна. Сталяр торфазавода «Гараднянскі мох», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 2.2.1940. Рэабілітаваны 11.5.1963.

ГЕБГАРДТ Ліанель Іванавіч, н. ў 1894, г. Ліпава, Латвія. Касір ст. Чэпіна Заходняй чыгункі, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ГЕДРОЙЦ-ЮРАГА Генрых Віктаравіч, н. ў 1875, Віцебск. Без пэўных заняткаў. Асуджаны 11.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ГЕЙМАН Веніамін Маркавіч, н. ў 1909, Віцебск. Загадчык механічнай майстэрні. Асуджаны 2.11.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 18.9.1989.

ГЕЛЕРМАН-СЦЯПАНАВА Бася Такхомаўна, н. ў 1898, м. Грыўна Курляндскай губ. Сястра-выхавацельніца ясляў Віцебскага гарсавета, жыла у Віцебску. Асуджана 10.1.1938. Расстраляна 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 23.9.1966.

ГЕЛЬВІХ Генрых Рудольфавіч, н. ў 1885, Віцебск. Слесар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1942 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.11.1989.

ГЕНКЕ Юлій Іванавіч, н. ў 1882, г. Лодзь, Польшча. Бухгалтар Чэпінскай базы «Запсплаўлес», жыў у Віцебску. Асуджаны 11.12.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1964.

ГЕРАІМАЎ Арцемій Кузьміч, н. ў 1876, в. Лаўнікі, Літва. Пячнік, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ГЕРАСІМАЎ Палікарп Георгіевіч, н. ў 1893, Віцебск. В.а. дыспетчэра ст. Віцебск. Асуджаны 11.1.1931 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.8.1989.

ГЕРТМАН Файвіш Аўсеевіч, н. ў 1885, г. Свянцяны Віленскай губ. Упаўнаважаны аддзялення калегіі абаронцаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.9.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 24.9.1957.

ГЕРЦАГ Пётр Пятровіч, н. ў 1895, в. Млынская Дзвінскага павета. Вагонны слесар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 14.7.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ГЕРЦАГ Браніслава Аляксандраўна, н. ў 1902, г. Дзвінск. Краўчыха фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыла у Віцебску. Асуджана 22.10.1938 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.11.1989.

ГЕРЦЫК Пётр Ягоравіч, н. ў 1903, в. Велья Расонскага раёна. Шафёр Белкамбуду, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.1.1959.

ГЕРЫНГ Ян Янавіч, н. ў 1905, в. Парэчча Пухавіцкага раёна. Дырэктар люстэркавай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.12.1937. Расстраляны 28.12.1937 у Мінску. Рэабілітаваны 14.4.1958.

ГЛЕВІЧ Рыгор Уладзіміравіч, н. ў 1885, г. Новая Вуліца, Украіна. Тэхнік-планавік фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 12.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

ГЛЕЎСКІ Баляслаў Іванавіч, н. ў 1891. Радомская губ. Рабочы, жыў у Віцебску. Асуджаны 31.8.1928 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.6.1992.

І.С.Гаўрыльчык.

Л.І.Гебгардт (здымак 1913 г.).

ГЛЬКІН Шолам (Шмуйла) **Лейбавіч**, н. ў 1903, Віцебск. Асуджаны 28.1.1927 да высылкі ў Сярэднюю Азію на 3 гады. 15.4.1927 мера пакарання заменена на высылку ў Палесціну. Рэабілітаваны 15.7.1993.

ГІМБУТ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1916, м. Бягомль. Студэнт ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ГІМЕЛЬШТЭЙН Нахман Гіршавіч, н. ў 1892, Польшча. Упакоўшчык арцелі «Хімік», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ГІМЕЛЬШТЭЙН Янкель Вульфавіч, н. ў 1902, г. Шаўль Ковенскай губ. Дырэктар 23-й яўрэйскай школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1957.

ГІНЗБУРГ-МІТУЎ Бер Хацкелевіч, н. ў 1888, Віцебск. Дырэктар піваварнага завода. Асуджаны 24.10.1924 да 2 гадоў ссылкі ў г. Чарапавец. Рэабілітаваны 9.9.1993.

ГІНТАЎТ Віктар Антонавіч, н. ў 1891, г. Сядлец, Польшча. Тэхнік тэлеграфа, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.3.1934 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ГЛЕБКА Юлія Антонаўна, н. ў 1887, Дзісненскі павет. Санітарка бальніцы імя Калініна, жыла у Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 14.8.1964.

ГЛОТАЎ Вікенцій Іванавіч, н. ў 1889, в. Падзівы Віленскай губ. Млынар, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.9.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 17.7.1956.

ГНЯДОЎСКІ Феадосій Фёдаравіч, н. ў 1897, в. Турэц Полацкага раёна. Бухгалтар-касір трэста сталовых і рэстаранаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1942 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.8.1961.

ГОЗ Залман-Навум Абрамавіч, н. ў 1896, г. Гомель. Кравец швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937.

Расстраляны 3.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ГОЛУБЕЎ Астафій Аксёнавіч, н. ў 1902, в. Кір'яненкі Сіроцінскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1960.

ГОЛУБЕЎ Афанасій Сцяпанавіч, н. ў 1902, в. Кір'яненкі Сіроцінскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1960.

ГОЛУБЕЎ Рыгор Паўлавіч, н. ў 1901, Віцебск. Рабочы акулярнай фабрыкі. Асуджаны 14.8.1933 (у тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам з 9.2.1933 па 14.6.1933). Рэабілітаваны 22.11.1989.

ГОЛУБЕЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1908, в. Кір'яненкі Сіроцінскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1960.

ГОЛЬБРАЙХ Абель Хаімавіч, н. ў 1886, Віцебск. Бухгалтар Белхарчгандлю. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 16.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ГОЛЬДБЕРГ Арон Давыдавіч, н. ў 1896, м. Крынкі, Польшча. Майстар Віцебскага дражжавога завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.9.1966.

ГОЛЬДБЕРГ Зіна Якаўлеўна, н. ў 1905, в. Чыжэў Беластоцкай губ. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 9.1.1959.

ГОЛЬДЗІН Залман-Іосель Моўшавіч, н. ў 1896, г. Гарадок. Загадчык аддзела Белдзяржбуду, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 28.12.1939. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ГОЛЬДЗІН Майсей Іосіфавіч, н. ў 1908, в. Замосце Гарадоцкага раёна. Фрэзероўшчык ігольнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1942 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.4.1967.

ГОФМАН Сцефанія Іосіфаўна, н. ў 1877, г. Калуга. Загадчыца польскай бібліятэкі, жыла у Віцебску. Асуджана 26.1.1931 да 5 гадоў ППЛ з заменай высылкай у Сібір. Рэабілітавана 14.8.1964.

ГОФФЕР Алтэр Менахамавіч, н. ў 1910, г. Варшава. Нарыхтоўшчык арцелі «Каапабуўшчык», жыў у Віцебску. Асуджаны 16.7.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

ГРАБЕКЛІС Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1899, Курляндская губ. Экспедытар Віцебскага Белдзяржзабеспячэння, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.1.1964.

ГРАБНЁЎ Афанасій Піліпавіч, н. ў 1902, в. Пальчыкі Сенненскага раёна. Цясляр-сталяр 3-й пляцоўкі УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ГРАБЯНЦОЎ Пётр Емяльянавіч, н. ў 1895, в. Благушкі Віцебскага раёна. Рабочы скуранога завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.1.1941 да 3 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 2 гады. Рэабілітаваны 13.12.1991.

ГРАЖЭЎСКІ Браніслаў Міхайлавіч, н. ў 1887, в. Жураўлёва Дзісненскага павета. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.4.1959.

ГРАЛЬ Іосіф Аронавіч, н. ў 1901, Ломжыцкая губ. Начальнік цэха абутковай фабрыкі «Прагрэс», жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1938. Расстраляны 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 18.9.1989.

ГРАНІТ Віктар Канстанцінавіч, н. ў 1887, Варшаўская губ. Грузчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.10.1937 да ВМП. Расстраляны 8.11.1937. Рэабілітаваны 28.8.1959.

ГРАЎЖЫНІС Людвіг Іванавіч, н. ў 1881, в. Буйтуны Віленскай губ. Слесар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 17.5.1938. Рэабілітаваны 9.10.1989.

ГРАХОВІЧ Уладзімір Андрэевіч, н. ў 1891, Польшча. Рабочы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ГРАЧАНІКАВА Вольга Аляксееўна, н. ў 1889, г. Дзвінск. Рабочая фабрыкі гнутай мэблі, жыла у Віцебску. Асуджана 24.2.1934 да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 17.4.1989.

ГРОЗАВА Сафія Адамаўна, н. ў 1898, в. Узульнікі Рыжскага павета. Прыбіральшчыца магазіна № 165, жыла у Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ГРОМАК Іван Лукіч, н. ў 1902, в. Жарабковічы Ляхавіцкай воласці. Майстар інструментальнамэблевай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 22.10.1957.

ГРОНСКАЯ Ганна Антонаўна, н. ў 1895, в. Антонава Лёзненскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 20.11.1937. Расстраляна 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.11.1957.

ГРОНСКАЯ Ганна Іванаўна, н. ў 1884, в. Шапурова Лёзненскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 20.11.1937. Расстраляна 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 25.2.1958.

ГРОНСКАЯ Яніна Феліксаўна, н. ў 1911, в. Адзяжанка Лёзненскага раёна. Рабочая фабрыкі «КІМ», жыла у Віцебску. Асуджана 9.11.1937. Расстраляна 9.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 11.12.1959.

ГРОНСКІ Браніслаў Феліксавіч, н. ў 1918, Віцебск. Слесар-вадаправодчык фабрыкі «КІМ». Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

ГРОНСКІ Фама Кліменцьевіч, н. ў 1884, в. Астраўшчына Лёзненскага раёна. Вартаўнік КЭЧ, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.11.1957.

ГРОНСКІ Фелікс Кліменцьевіч, н. ў 1891, в. Астравішча Лёзненскага раёна. Вартаўнік лесазавода № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.3.1959.

ГРОСКОП Мінна Генрыхаўна, н. ў 1890, Віцебск. Загадчык кладовай ст. Віцебск. Асуджана 4.2.1938. Расстраляна 17.3.1938. Рэабілітавана 16.10.1989.

ГРУБІН Залман Беркавіч, н. ў 1903, Віцебск. Эканаміст планавага аддзела фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі». Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ГРУДНЫ Уладзіслаў Рыгоравіч, н. ў 1896, в. Гора (Гара) Полацкага раёна. Качагар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

ГРУЗНЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1911, в. Баравыя Сіроцінскага раёна. Студэнт Віцебскага педтэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.4.1930 да 1 году ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны 20.8.1993.

ГРУНМАН Юліан Іосіфавіч, н. ў 1907, г. Варшава. Чырвонаармеец, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.5.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 9.11.1989.

ГРУШЭЦКАЯ Ванда Баляславаўна, н. ў 1902, Віцебск. Настаўніца 15-й польскай школы. Асуджана 26.1.1931 да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 14.8.1964.

ГРУШЭЦКІ Вацлаў Казіміравіч, н. ў 1900, г. Радом, Польшча. Настаўнік школы імя Парыжскай камуны, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.7.1931 да ВМП. Мера пакарання заменена на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.8.1964.

ГРУШЫН Іван Раманавіч, н. ў 1890, маёнтак Кісялёўка Лёзненскага раёна. Сталяр завода «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.4.1958.

ГРУШЭЎСКАЯ Станіслава Севярынаўна, н. ў 1894, м. Чашнікі. Сарціроўшчыца вузла сувязі, жыла у Віцебску. Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 4.8.1958.

ГРЫБОЎСКАЯ Ванцэнціна Фамінічна, н. ў 1907, в. Аляксандрава Лёзненскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 20.11.1937. Расстраляна 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.11.1957.

ГРЫБОЎСКІ Станіслаў Восіпавіч, н. ў 1900, в. Янавец, Польшча. Слесар вагоннага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.3.1959.

ГРЫГАЛОЎСКАЯ Марыя Францаўна, н. ў 1888, г. Ленінград. Хатняя гаспадыня, жыла у Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1937. Рэабілітавана 28.11.1957.

ГРЫГАЛОЎСКІ Аляксандр Фёдаравіч, н. ў 1880, г. Рыга. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.6.1925 да 3 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 21.7.1925. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ГРЫГАРОВІЧ Аляксандр Дзмітрыевіч, н. ў 1870, в. Лізіна Себежскага павета. Святар Спаскай царквы, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.7.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ГРЫГАРОВІЧ Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1903, Віцебск. Загадчык амбулаторыі завода «Чырвоны металіст». Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 18.10.1937. Рэабілітаваны 15.3.1940.

ГРЫГОР'ЕВА Ірына Канстанцінаўна, н. ў 1895, в. Аржана Лёзненскага раёна. Выкладчыца 39-й школы, жыла у Віцебску. Асуджана 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 4.5.1957.

ГРЫГОР'ЕЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1896, в. Белькі (Бялькі) Гарадоцкага павета. Слесар арцелі «Метал», жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.10.1956.

ГРЫГОР'ЕЎ Кірыла Андрэевіч, н. ў 1926, в. Градкі Веліжскага раёна. Шафёр аўтатранспартнай канторы, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.3.1951 да 10 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 5 гадоў. 20.10.1954 тэрмін пакарання зніжаны да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.9.1992.

ГРЫГОР'ЕЎ Мікалай Якаўлевіч, н. ў 1903, в. Курцава Яраслаўскай губ. Чырвонаармеец, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.9.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах на 3 гады. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ГРЫГОЎЛЯ Сідар Казіміравіч, н. ў 1897, Літва. Шавец шавецкай майстэрні ваенгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

ГРЫНБЕРГ Ян Янавіч, н. ў 1887, г. Лібава Курляндскай губ. Кладаўшчык 11-га чарапічнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ГРЫНЕВІЧ-КВЕСЕЛЬ Людвіга Антонаўна, н. ў 1879, в. Селішча Ушацкага раёна. Без пэўных заняткаў, жыла у Віцебску. Асуджана 5.11.1937. Расстраляна 26.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 8.9.1958.

ГРЫНЬ Герман Іванавіч, н. ў 1902, Латвія. Беспрацоўны, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.8.1936 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.11.1989.

ГРЫНЬКОЎ Сяргей Сямёнавіч, н. ў 1890, Мінск. Начальнік УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 27.10.1956.

ГРЫЦ Яўген Афанасьевіч, н. ў 1910, в. Васілевічы Віленскай губ. Настаўнік 21-й польскай школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ГРЫЦЭВІЧ Гаўрыіл Канстанцінавіч, н. ў 1906, Польшча. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ГРЫЦЭВІЧ Мікалай Канстанцінавіч, н. ў 1914, г. Пінск. Слесар фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.6.1957.

ГРЫЦЭВІЧ Міхаіл Канстанцінавіч, н. ў 1915, г. Харбін. Слесар фабрыкі «КІМ», пражываў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.6.1957.

ГРЫЦЭВІЧ Пётр Канстанцінавіч, н. ў 1918, г. Харбін. Слесар дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 24.4.1955.

ГРЫШАНАЎ Барыс Якаўлевіч, н. ў 1908, в. Бондарава Віцебскага раёна. Студэнт Віцебскага педтэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.4.1930 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.8.1993.

ГРЫШАНАЎ Карп Парфенавіч, н. ў 1904, в. Загародна Лёзненскага раёна. Грузчык Віцебскай трыкатажнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 9.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 9.7.1960.

ГРЫШКОЎ Канстанцін Васілевіч, н. ў 1896, г. Вязьма. Інжынер Трансгандальхарча, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 10.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.3.1957.

ГРЫШЧАНКА Афанасій Яўгенавіч, н. ў 1893, Віцебск. Бухгалтар-эканаміст ватнай фабрыкі. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ГУБЕР Анатоль Эдуардавіч, н. ў 1881. Херсонская губ. Касір санітарнай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ГУБЕР Марыя Мікалаеўна, н. ў 1884, г. Севастопаль. Машыністка Белдзяржпраекта, жыла ў Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1937. Рэабілітавана 28.11.1957.

ГУБІНА Надзея Вікенцьеўна, н. ў 1928. Віцебск. Касір-інкасатар Віцебскага халадзільніка. Асуджана 8.12.1951 да 5 гадоў ссылкі ў Карагандзінскую вобласць. Рэабілітавана 16.11.1993.

ГУДАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. ў 1891, в. Паазерцы Ковенскай губ. Паравозны качагар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ГУДЭ Арнольд Карлавіч, н. ў 1895, Курляндская губ. Начальнік канцылярыі Віцебскай турмы, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.3.1960.

ГУЛЕЦКІ-ГУЛЯШКА Іван Ігнацьевіч, н. ў 1871, Дзісненскі павет. Конюх ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 14.7.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 4.2.1972.

ГУЛЬЧЫНСКАЯ Паліна Каетанаўна, н. ў 1888, г. Сянно. Краўчыха фабрыкі «Прафінтэрн», жыла ў Віцебску. Асуджана 2.11.1937. Расстраляна 29.11.1937. Рэабілітавана 22.12.1958.

ГУМЕННІКАЎ Фёдар Пятровіч, н. ў 1889, Віцебск. Слесар паравознага дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 18.12.1936 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1958.

ГУНЯДЫ Мартын Міхайлавіч, н. ў 1894, г. Быстрыца, Аўстра-Венгрыя. Слесар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 31.1.1942 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ГУРКО Цімафей Клімавіч, н. ў 1894, в. Новікі Віцебскага раёна, змазчык ВЧ-6 ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 20.11.1958.

ГУРЛАДЗІ Сяргей Хрысанфавіч, н. ў 1894, г. Херсон, бухгалтар ст. Віцебск, жыў на ст. Віцебск. Асуджаны 7.9.1938. Расстраляны 25.11.1938. Рэабілітаваны 26.7.1990.

РЭУТ Антон Баляслававіч, н. ў 1910, в. Саснягі Лепельскага раёна. Аглядчык вагонаў ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

РЭУТ Браніслаў Іосіфавіч, н. ў 1898, в. Губіна Лепельскага раёна. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.10.1937. Расстраляны ў Смаленску (дата не ўказана). Рэабілітаваны 24.2.1958.

РЭУТ Іван Дзяменцевіч, н. ў 1904, в. Слінкава Суражскага раёна. Грузчык базы «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 3.2.1961.

РЭУТ Іосіф Адамавіч, н. ў 1907, в. Клецкі Суражскага раёна. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

РЭУТ Каетан Іосіфавіч, н. ў 1896, в. Скіна Лепельскага павета. Загадчык гаража Віцебскага аўтадора, жыў у Віцебску. Асуджаны 27.12.1935 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.4.1990.

РЭУТ Паўліна Вікенцьеўна, н. ў 1900, в. Ліпавец Ушацкага раёна. Краўчыха фабрыкі «Прафінтэрн», жыла ў Віцебску. Асуджана 15.4.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 23.4.1989.

САБЛЕЎ Іван Венядзіктавіч, н. ў 1892, в. Кавалеўка Сіроцінскага раёна. Асфальціроўшчык СМУ фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.3.1947 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.6.1955.

САВАЧКІН Георгій Захаравіч, н. ў 1902, в. Родзіна Лёзненскага раёна. Тэхнік гістарычнага музея, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.2.1956.

САВЕЛЬЕЎ Канстанцін Канстанцінавіч, н. ў 1906, в. Шчэрба Сувалкаўскай губ., Польшча. Чырвонаармеец, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.6.1930 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.4.1989.



Б.І.Рэут.

САВЕЛЬЕЎ Уладзімір Варфаламеевіч, н. ў 1896, Віцебск. Памочнік загадчыка склада Белкамунснаба. Асуджаны 28.11.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.8.1958.

САВІЦКАЯ Эмілія Пятроўна, н. ў 1876, в. Асінаўшчына Лёзненскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 20.10.1937. Расстраляна 4.11.1937. Рэабілітавана 28.11.1957.

САВІЦКІ Адольф Баляслававіч, н. ў 1912, Віцебск. Шафёр фабрыкі «КІМ». Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

САВІЦКІ Баляслаў Адольфавіч, н. ў 1879, Ковенская губ. Рабочы на могілках, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.9.1959.

САВІЦКІ Іван Лаўрэнцьевіч, н. ў 1896, Курляндская губ. Грузчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 26.10.1989.

САВІЦКІ Іван Фёдаравіч, н. ў 1897, в. Рабышы Полацкага раёна. Бухгалтар фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

САВІЦКІ Іосіф Вікенцьевіч, н. ў 1900, Віцебск. Слесар фабрыкі «КІМ». Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 21.1.1960.

САВІЦКІ Франц Баляслававіч, н. ў 1916, Віцебск. Рабочы фабрыкі імя Лекерта. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 17.3.1962.

САДЛОН Фердзінанд Аскаравіч, н. ў 1896, г. Козель, Прусія. Рабочы 10-й дыстанцыі пуці ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 22.5.1938. Рэабілітаваны 8.1.1965.

САЗОНАЎ Дзмітрый Максімавіч, н. ў 1891, в. Ладзінава Сенненскага раёна. Загадчык гаспадаркі пагрузачнай канторы, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.5.1946 да 3 гадоў ссылкі. Рэабілітаваны 9.9.1993.

САЗОНАЎ Іван Маркавіч, н. ў 1896, в. Бобр Крупскага раёна. Шафёр КЭЧ стралковага корпу-

са, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.4.1937 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.5.1992.

САЙКОЎСКІ Браніслаў Ігнацьевіч, н. ў 1896, в. Манюкі Ковенскай губ. Рабочы дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.10.1989.

САКАЛОЎ Васіль Сысоевіч, н. ў 1890, в. Падворышча Суражскага раёна. Галоўны бухгалтар рамонтнай канторы гаржылсаюза, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.8.1989.

САКАЛОЎ Кандрацій Ананьевіч, н. ў 1873, в. Краснаполле Віцебскага раёна. Каваль Белэнерга, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 16.10.1961.

САКАЛОЎ Мікалай Пятровіч, н. ў 1893, г. Кастрама. Начальнік паравознага аддзялення, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.12.1936 да 4 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.5.1967.

САКАЛОЎ Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1919, в. Ведзенкі Лёзненскага раёна. Шкляр люстраной фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11. 1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.4.1958.

САКАЛОЎ Пётр Антонавіч, н. ў 1913, г. Себеж. Электраманцёр махорачнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 28.8.1958.

САКАЛОЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. ў 1896, г. Смаленск. Ваеннаслужачы, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.8.1957.

САКОВІЧ Апалінарый Віктаравіч, н. ў 1894, Таранава Чашніцкага раёна. Пячнік канторы Жакта, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.1.1938. Расстраляны 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 10.7.1959.

САКСОНАВА Марыя Восіпаўна, н. ў 1896, в. Росіца Дрысенскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыла ў Віцебску. Асуджана 26.2.1938. Расстраляна 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 18.9.1989.

САЛАВЕЙ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1905, г. Вільна. Загадчык аддзела кадраў цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.9.1938. Расстраляны 21.11.1938. Рэабілітаваны 24.8.1989.

САЛАТКА-ПЯТРЫШЧА Браніслаў Іванавіч, н. ў 1881, в. Крупелеўка Лепельскага раёна. Дворнік Віцебскага аб'яднання Дзяржбанка, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 15.9.1989.

САЛАТКА-ПЯТРЫШЧА Станіслаў Іванавіч, н. ў 1890, в. Камень Лепельскага раёна. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 10.7.1938. Рэабілітаваны 3.10.1989.

САЛАЎЁЎ Афанасій Аляксеевіч, н. ў 1886, в. Зімухі Смаленскай губ. Дворнік Віцебскага швейна-тэкстыльнага тэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1989.

САЛАЎЁЎ Карп Акімавіч, н. ў 1908, в. Кулізіна Сіроцінскага раёна, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.4.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1960.

САЛАЎЁЎ Рыгор Эраставіч, н. ў 1914, в. Цыганы Віцебскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.4.1949 да 25 гадоў ППЛ. 12.9.1957 прыгавор адменены. Справа спынена 12.4.1958.

САЛАЎЁЎ Сяргей Сцяпанавіч, н. ў 1892, в. Сцяпанава Віцебскага раёна. Экспедытар арцелі інвалідаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.3.1938 да 8 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 8 гадоў. Рэабілітаваны 19.10.1993.

САЛЬНІКАВА Марыя Іванаўна, н. ў 1895, г. Цвер. Рэгістратар паліклінікі ст. Віцебск, жыла ў Віцебску. Асуджана 2.9.1938 да 2 гадоў пад надзор. Рэабілітавана 10.12.1990.

САЛЬНІКАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1887, г. Красны Холм Калінінскай вобл. Начальнік 6-га паравознага аддзялення ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.4.1938 да 15 гадоў турэмнага зняволення. Рэабілітаваны 28.3.1956.

САЛЬЦЭВІЧ Іван Станіслававіч, н. ў 1898, г. Дзвінск. Качагар бані № 6, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 18.5.1942. Рэабілітаваны 30.11.1989.

САМАРОДАЎ Яўген Піліпавіч, н. ў 1903, в. Панзары Тамбоўскай вобл. Ваеннаслужачы, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.9.1939 да 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 14.2.1944. Рэабілітаваны 17.11.1958.

САМАРЫН Ігнат Міронавіч, н. ў 1869, в. Гукі Бешанковіцкага раёна. Вартаўнік чыгуначнага парка, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.9.1960.

САМАХВАЛАЎ Нічыпар Логвінавіч, н. ў 1883, Віцебск. Цясляр Саюзтранса. Асуджаны 19.1.1935 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.8.1959.

САМОЖНЕЎ Еўдакім Аляксеевіч, н. ў 1900, в. Старое Сяло Віцебскага раёна. Інспектар Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 1.6.1956.

САМОЙЛАЎ Антон Рыгоравіч, н. ў 1893, в. Карпавічы Віцебскага раёна. Токар завода «Чырвоны металіст», жыў у Віцебску. Асуджаны 21.11.1937. Расстраляны 29.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.6.1956.

САМУСЁНАК Аляксей Васілевіч, н. ў 1924, Віцебск. Ваеннаслужачы. Асуджаны 31.12.1944 да 10 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 5 гадоў. Памёр у зняволенні 1.4.1948. Рэабілітаваны 5.11.1962.

САМЦОЎ Улас Іванавіч, н. ў 1885, Віцебск. Слесар паравознага дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 11.6.1937 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.1.1958.

САНГАЙЛА Браніслаў Юр'евіч, н. ў 1886, Ковенская губ. Цясляр фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1989.

САНДРЫГАЙЛА Вячаслаў Іванавіч, н. ў 1873, г. Санкт-Пецярбург. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 29.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.2.1961.

САНЬКО Фёдар Мітрафанавіч, н. ў 1891, в. Друева Слуцкага раёна. Загадчык магазіна, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 9.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

САПРОН Адольф Усцінавіч, н. ў 1898, в. Варонічы Полацкага раёна. Цясляр рамонтнай канторы, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 9.8.1989.

САРАК Сімон Нахманавіч, н. ў 1906, Віцебск. Каменшчык на будаўніцтве. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 24.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.3.1958.

САРАК Якаў Лазаравіч, н. ў 1890, Віцебск. Касір арцелі інвалідаў імя 25-га Кастрычніка. Асуджаны 22.7.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.4.1989.

САРКІСАЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. ў 1902, Іран. Ахоўнік цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 31.1.1962.

САРОКА Адэль Паўлаўна, н. ў 1888, в. Савін Дуб Лепельскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 20.5.1938. Расстраляна 3.7.1938. Рэабілітавана 7.8.1938.

САРОКА Марыя Канстанцінаўна, н. ў 1885, м. Чарэя Магілёўскай акругі. Выкладчык 19-й школы, жыла ў Віцебску. Асуджана 26.1.1931 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 14.8.1964.

САРОКА Іосіф Савельевіч, н. ў 1880, Лепельскі павет. Качагар ватнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 3.7.1938. Рэабілітаваны 7.8.1938.

САЎЛУКОВІЧ Аляксандр Афанасьевіч, н. ў 1885, в. Стайкі Суражскага раёна. Шкляр Віцебскага драмтэатра, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.1.1949 да 25 гадоў ППЛ. 4.8.1949 апраўданы.

САЎЛУКОВІЧ Леанід Антонавіч, н. ў 1898, Віцебск. Вартаўнік 6-га вагоннага ўчастка. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 9.10.1989.

САЎЛУКОВІЧ Пётр Антонавіч, н. ў 1903, в. Хадчына Суражскага раёна. Сталяр працоўнай калоніі НКУС, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.10.1959.

САЎЛУКОВІЧ Франц Афанасьевіч, н. ў 1892, в. Балотнікі Віцебскага раёна. Вагаўшчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 2.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 23.10.1989.

САЎРАМЕННЫ Мікалай Васілевіч, н. ў 1901, в. Сарокіна Заходняй вобл. Выкладчык СШ № 24, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

САЎЧАНКА Павел Архіпавіч, н. ў 1914, г. Рыга. Ваеннаслужачы, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.3.1945 да ВМП. 26.3.1945 мера пакарання заменена на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 5.4.1988.

САЎЧАНКА Цырэнцій Іосіфавіч, н. ў 1903, в. Волчкі Суражскага раёна. Токар завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.7.1958.

САЎЧУК Мікалай Іванавіч, н. ў 1892, Гродзенская губ. Дворнік 2-й школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны 22.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 5.11.1958.

САХАЧЭЎСКІ Саламон Вольфавіч, н. ў 1900, г. Лодзь. Кравец фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 21.2.1942 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.2.1950.

СБІЦКІ Фёдар Сцяпанавіч, н. ў 1910, в. Акшынка Гомельскай вобл. Загадчык пенсійнага сектара Віцебскага аблвыканкома, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.5.1941 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.8.1993.

СВЕРДАЛЬ Юда Шэвелевіч, н. ў 1900, Віцебск. Тэхнолаг фабрыкі «Прафінтэрн». Асуджаны 15.12.1935 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.7.1963.

СВІДЭРСКІ Гаўрыіл Фёдаравіч, н. ў 1862, в. Буй Віцебскага раёна. Архіерэй, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.5.1988.

СВІНЦІЦКАЯ Вікторыя Аляксандраўна, н. ў 1886, Віцебск. Настаўніца польскай школы. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ. 23.7.1931 тэрмін пакарання зніжаны да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 14.8.1964.

СВІРСКІ Казімір Іосіфавіч, н. ў 1908, в. Ласосіна Віцебскага раёна. Слесар паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 16.10.1989.

СВІРШЧЭЎСКАЯ Ганна Мацвееўна, н. ў 1871, хут. Марковічы Віцебскай губ. Без пэўных заняткаў, жыла ў Віцебску. Асуджана 17.11.1937. Расстраляна 10.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 13.9.1957.

СВЯДСКІ Іван Аляксандравіч, н. ў 1886, г. Дзвінск. Цырульнік, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 12.6.1962.

СВЯНЦІЦКІ Іван Аляксандравіч, н. ў 1907, в. Тур'ева Сенненскага раёна. Памочнік бухгалтара Віцебскага праўлення ЦРК, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.6.1935 да 6 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.12.1955.

СЕВЕНКА (СІВЕНКА) Міленцій Венядзіктавіч, н. ў 1907, в. Шчарбовічы Гродзенскага павета. Шафёр ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 5.11.1937. Рэабілітаваны 15.6.1957.

СЕГАЛЬ Міхаіл Гіршавіч, н. ў 1916, г. Вільна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

СЕГЛІН Карл-Эдуард Янавіч, н. ў 1889, г. Рыга. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 24.3.1970.

СЕЛІВАНАЎ Ісідар Нічыпаравіч, н. ў 1890, в. Навасёлкі Віцебскага раёна. Дырэктар ватнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 21.11.1957.

СЕЛІВАНАЎ Пётр Савельевіч, н. ў 1908, в. Сарокі Віцебскага раёна. Токар завода «Чырвоны металіст», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 15.6.1989.

СЕЛІВАНАЎ Пётр Фёдаравіч, н. ў 1915, в. Андронава Калінінскай вобл. Рабочы завода «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1959.

СЕЛІВОНІК Карнелій Фёдаравіч, н. ў 1871, в. Радаван Гродзенскай губ. Служачы ст. Арлова, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.10.1924 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 6.6.1995.

СЕЛЯДЗЕЦ Алена Пракоф'еўна, н. ў 1897, м. Ула Бешанковіцкага раёна. Медсястра бальніцы імя Калініна, жыла ў Віцебску. Асуджана 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 11.1.1940 (справа спынена).

СЕЛЯДЗЕЦ Леанід Сяргеевіч, н. ў 1911, Віцебск. Токар абутковай фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік». Асуджаны 26.11.1940 да 8 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 27.8.1941. Рэабілітаваны 20.3.1958.

СЕЛЯЗНЁВА Ганна Васілеўна, н. ў 1916, в. Місякі Багушэўскага раёна. Рознарабочая цагельнага завода, жыла ў Віцебску. Асуджана 18.12.1946 да 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 16.11.1993.

СЕЛЯЗНЁВА Зінаіда Цімафееўна, н. ў 1941, жыла ў Віцебску. Асуджана 18.12.1946 да 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 16.11.1993.

СЕЛЯЗНЁВА Настасся Цімафееўна, н. ў 1943, жыла ў Віцебску. Асуджана 18.12.1946 да 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана 16.11.1993.

СЕЛЯЗНЁЎ Васіль Цімафеевіч, н. ў 1946, жыў у Віцебску. Асуджаны 18.12.1946 да 5 гадоў ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 16.11.1993.

СЕЛЯЗНЁЎ Сцяпан Цімафеевіч, н. ў 1894, в. Старынкі Віцебскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.2.1938. Расстраляны 15.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.7.1961.

СЕМЕЖ Алена Барысаўна, н. ў 1885. г. Дзісна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 22.10.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 26.10.1989.

СЕМЯНЮГА Андрэй Пятровіч, н. ў 1893, в. Шчэцькі Сіроцінскага раёна. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

СЕМЯЧКІН Міхаіл Аляксандравіч, н. ў 1892, в. Караваева Уладзімірскай вобл. Бухгалтар Белкамунтрэста, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.9.1957.

СЕНЦАРОЎ (СІНЦАРОЎ) Фядосій Цітавіч, н. ў 1885, в. Кавалі Багушэўскага раёна. Рабочы сплаўлеса «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.8.1958.

СЕРАБРАКОЎ Васіль Рыгоравіч, н. ў 1912, в. Красы Лёзненскага раёна. Рабочы ігольнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 17.4.1964.

СЕРАБРАКОЎ Лазар Феафанавіч, н. ў 1883, в. Красыні Лёзненскага раёна. Цясляр 2-га Беларускага драматычнага тэатра, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.10.1957.

СЕРАБРАКОЎ Рыгор Лявонавіч, н. ў 1906, в. Красы Лёзненскага раёна. Ахоўнік завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

СЕРАБРАКОЎ Фёдар Фёдаравіч, н. ў 1906, у в. Красіны Лёзненскага раёна. Грузчык хлебазавода № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

СЕРАБРАКОЎ Флор Якаўлевіч, н. ў 1886 у в. Красіны Лёзненскага раёна. Цясляр УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

СЕРАФІМОВІЧ Ядзвіга Канстанцінаўна, н. ў 1877, Латвія. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 7.5.1933 да пазбаўлення права пражывання ў БССР і пагранічнай паласе на 3 гады. Рэабілітавана 22.11.1990.

СІВЕЦ Мацвей Адамавіч, н. ў 1896, Вілейскі павет. Сепаратаршчык дражджавога завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.2.1958.

СІДАРЭНКА Антон Мікалаевіч, н. ў 1883, Віленская губ. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

СІДЛЕР Іван Усцінавіч, н. ў 1880, м. Ула Бешанковіцкага раёна. Матрос парахода, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 16.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 27.12.1958.

СІКОРСКІ Валяр'ян Антонавіч, н. ў 1893, Віцебская вобл. Электраманцёр тарнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

СІЛЯВО Васіль Сцяпанавіч, н. ў 1907, м. Іванкоў Кіеўскай вобл. Рабочы Упраўлення будаўнічых работ, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.4.1989.

СІМУН Міхаіл Якаўлевіч, н. ў 1886, Іран. Чысцільшчык абутку, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.9.1989.

СІНЕВІЧ Вікенцій Іванавіч, н. ў 1891, Латвія. Грузчык пагрузачнай канторы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.3.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 5.11.1960.

СІНІЦКІ Антон Іванавіч, н. ў 1889, в. Паршына Сіроцінскага раёна. Цясляр, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.2.1958.

СІНІЦКІ Марк Іванавіч, н. ў 1879, в. Паршына Сіроцінскага раёна. Вартаўнік ляснога склада, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.2.1958.

СІНКЕВІЧ Браніслаў Якаўлевіч, н. ў 1896, в. Лукшы Ковенскай губ. Брыгадзір пуці ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.4.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1989.

СІНЯЎСКІ Ніл Рыгоравіч, н. ў 1895, в. Путчына Пліскага раёна. Дзесятнік, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 2.11.1959.

СІПКО Канстанцін Савельевіч, н. ў 1894, хут. Віхры Віцебскага раёна. Канторшчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.11.1930 за пабег з месца пасялення да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.4.1989.

СІРОТ Гірш-Лейзер Беньямінавіч, н. ў 1885, Віцебск. Сарціроўшчык шчаціннага камбіната. Асуджаны 4.11.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.5.1957.

СКАКОЎСКІ Норберт Іванавіч, н. ў 1863, Ковенская губ. Кравец, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1989.

СКАКОЎСКІ Роберт Норбертавіч, н. ў 1899, г. Пскоў. Тэхнік ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 28.8.1958.

СКАРЖЫНЕЦ Адам Ільіч, н. ў 1905, в. Лудынь Столінскага павета. Чорнарабочы інструментальна-мэблевай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.10.1960.

СКАРУПСКІ Мікалай Восіпавіч, н. ў 1885, г. Ціфліс. Начальнік сектара капітальнага будаўніцтва фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны 19.5.1958.

СКІБА Марыя Цеафілаўна, н. ў 1899, г. Севастопаль. Рахункавод 5-га будаўнічага ўчастка, жыла ў Віцебску. Асуджана 7.10.1938. Расстраляна 4.11.1938 у Смаленску. Рэабілітавана 16.10.1989.

СКІРГАЙЛА Уладзіслаў Уладзіслававіч, н. ў 1899, Віцебск. Майстар ст. Віцебск. Асуджаны 22.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1959.

СКІТОВІЧ Міхаіл Фаміч, н. ў 1894, в. Пагарэльцы Віцебскай губ. Кладаўшчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 20.2.1959.

СКОБЛА Мейлах Беньямінавіч, н. ў 1892, Віцебск. Рабочы. Асуджаны 26.3.1933 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.11.1989.

СКУБІЛІНА Анфіса Іванаўна, н. ў 1876, м. Майорэнгоф, Латвія. Служачая Віцебскага аддзялення Дзяржбанка, жыла ў Віцебску. Асуджана 8.8.1927 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 24.12.1992.

СКУРАТАЎ Аляксандр Макаравіч, н. ў 1895, Віцебск. Выкладчык 1-й школы для дарослых. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

СКУРСТЫНЬ Роберт Іванавіч, н. ў 1899, г. Лібава. Грузчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.3.1970.

СЛАВЕЦКІ Альфонс Фаміч, н. ў 1905, в. Рэпішчына Лепельскага раёна. Аглядчык на ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 11.12.1958.

СЛАВІНСКІ Уладзіслаў Францавіч, н. ў 1896, г. Полацк. Ахоўнік базы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.11.1961.

СЛУЦКІ Сцяпан Іванавіч, н. ў 1906, в. Папоўцы Плешчаніцкага раёна. Рабочы арцелі «Саюзутыль», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

СЛЯДОЎСКІ Генрых Станіслававіч, н. ў 1887, г. Варшава. Рабочы скурзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.3.1934 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1989.

СЛЯПКОЎ Павел Данілавіч, н. ў 1902, в. Вавінкі Гарадоцкага павета. Сакратар нарсуда 5-га ўчастка Віцебскага павета, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1921. Рэабілітаваны 8.7.1992.

СМАЛЕЎСКІ Вікенцій Васілевіч, н. ў 1904, Віцебск. Пажарнік маслазавода. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

Ц.П.Смаліха з сям'ёй.

СМАЛЕЎСКІ Каетан Антонавіч, н. ў 1901, Віцебск. Рабочы фабрыкі «КІМ». Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

СМАЛЕЎСКІ Сцяпан Антонавіч, н. ў 1911, Віцебск. Рабочы Віцебскага ўчастка Днепра-Дзвінскага басейна. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 10.12.1937. Рэабілітаваны 8.10.1957.

СМАЛЕЎСКІ Франц Васілевіч, н. ў 1892, в. Андронавічы Віцебскага раёна. Рабочы тарнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 6.1.1938. Рэабілітаваны 23.6.1958.

СМАЛІХА Цімафей Пятровіч, н. ў 1898, в. Кісялёва Віцебскага раёна. Рабочы тарнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 26(28).9.1937. Рэабілітаваны 28.7.1956.

СМАРЖЭЦКІ Барыс Антонавіч, н. ў 1894, в. Далганосава Віцебскага раёна. Шафёр пажарнай каманды, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.11.1961.

СМІЛЬТЭН Канстанцін Карлавіч, н. ў 1908, Яраслаўская вобл. Дырэктар 30-й латышскай школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

СМІРНОЎ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1896, м. Халопенічы. Настаўнік 17-й сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

СМОЛІКАВА Ефрасіння Піліпаўна, н. ў 1923, Віцебск. Рабочая ОРСа Віцебскага аблбудтрэста. Асуджана 15.4.1946 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 31.10.1967.

СМУЛЬКО Іосіф Адамавіч, н. ў 1878, в. Дзяргова Ковенскай губ. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 20.10.1989.

СМЯТАНКА Вольга Аляксандраўна, н. ў 1878, Сядлецкая губ. Выкладчык 15-й польскай школы, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ з заменай высылкай у Сібір на 5 гадоў. 23.7.1931 выслана ў Паўночны край на 3 гады. Рэабілітавана 14.8.1964.

СНАПОК Уладзімір Іванавіч, н. ў 1893, в. Чаркасава Дрысенскага раёна. Служачы канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.4.1935 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.4.1990.

СНЕДЗЕ Аляксандр Карлавіч, н. ў 1890, Віцебск. Начальнік штаба проціпаветранай абароны фабрыкі імя К.Цэткін. Асуджаны 14.11.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 25.5.1958.

СОРЫН Міхель-Абрам Залманавіч, н. ў 1885, г. Невель. Загадчык аддзела забеспячэння ватнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.11.1957.

СПАСІБЕНАК Афанасій Максімавіч, н. ў 1901, м. Бабынічы Лепельскага павета. Прыёмшчык АТК завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

СПІВАК Мендзель Абрамавіч, н. ў 1908, г. Лепель. Кравец арцелі «25-га Кастрычніка», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1937 да 3 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 3 гады. Рэабілітаваны 13.7.1960.

СПІРЫДОНАЎ Георгій Міхайлавіч, н. ў 1880, г. Бабруйск. Вакцынатар санстанцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.6.1936 да 3 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 17.2.1938. Рэабілітаваны 15.11.1991.

СПІНТЭС Іаган Іаганавіч, н. ў 1900, г. Рыга. Шавец арцелі «Капрамонт», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

СТАЛЕЎСКАЯ Алена Станіславаўна, н. ў 1906, с. Обаль Гарадоцкага раёна. Настаўніца 21-й польскай школы, жыла ў Віцебску. Асуджана 15.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.10.1957.

СТАЛЕЎСКАЯ Марыя Станіславаўна, н. ў 1904, в. Янава Гарадоцкага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 26.2.1938. Расстраляна 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 5.11.1957.

СТАЛЕЎСКІ Віктар Станіслававіч, н. ў 1898, с. Обаль Гарадоцкага раёна. Урач паліклінікі імя Калініна, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 9.3.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

СТАЛЕЎСКІ Генрых Станіслававіч, н. ў 1917, в. Колуб Дзвінскага павета. Механік фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.2.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1957.

СТАЛЕЎСКІ Леў Станіслававіч, н. ў 1913, в. Колуб Дзвінскага павета. Рэтушор фотаарцелі імя Чырвонай Зоркі, жыў у Віцебску. Асуджаны

26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 5.11.1957.

СТАЛЬМАКОВА Надзея Рыгораўна, н. ў 1900, в. Забелы Полацкай акругі. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.4.1930 да пазбаўлення права пражывання ў 6 населеных пунктах на 3 гады. Рэабілітавана 10.7.1989.

СТАЛЬМАКОВІЧ Марыя Вікенцьеўна, н. ў 1896, в. Шацілава Полацкага раёна. Рабочая Белутыля, жыла ў Віцебску. Асуджана 5.5.1933 да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітавана 27.9.1989.

СТАЛЬМАКОЎ Яфім Мікалаевіч, н. ў 1882, в. Елагі Віцебскага раёна. Цясляр камтрэста, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.1.1931. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 27.7.1989.

СТАЛЬМАШЭЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч, н. ў 1879, Віцебск. Не працаваў. Асуджаны 7.9.1937. Расстраляны 29.9.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.1.1960.

СТАНКЕВІЧ Антон Фартунатавіч, н. ў 1876, Віцебск. Паштальён канторы сувязі. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

СТАНКЕВІЧ Валянцін Ільіч, н. ў 1887, в. Кошалева Дрысенскага раёна. Рабочы завода «Руба», жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 11.12.1958.

СТАНКЕВІЧ Вікторыя Адамаўна, н. ў 1887, в. Стары Двор Лепельскага раёна. Рабочая дзіцячага дома № 8, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 15.2.1956.

СТАНКЕВІЧ Войцех Казіміравіч, н. ў 1892, г. Дзвінск. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 3.2.1961.

СТАНКЕВІЧ Генрых Феліксавіч, н. ў 1909, Віцебск. Нарміроўшчык акулярнай фабрыкі. Асуджаны 28.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.10.1957.

СТАНКЕВІЧ Ігнат Феліксавіч, н. ў 1883, в. Кароўка Суражскага раёна. Калёснік УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

СТАНКЕВІЧ Іосіф Іпалітавіч, н. ў 1897, в. Ясіншчына Суражскага раёна. Пажарнік 2-й пажарнай аховы НКУС, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Іванавіч, н. ў 1880, хут. Боркі Віцебскага павета. Галоўны кандуктар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Другі раз асуджаны 11.4.1933. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 18.3.1961 і 30.11.1989.

СТАНКЕВІЧ Сусана Феліксаўна, н. ў 1875, в. Навінка Лепельскага раёна. Аднаасобніца, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.11.1937. Расстраляна 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 28.5.1957.

СТАНКУС Францішафавіч, н. ў 1893, г. Рыга. Рабочы фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 23.4.1938. Рэабілітаваны 20.3.1959.

СТАРАВОЙТАВА Ганна Усцінаўна, н. ў 1915, в. Пацава Віцебскага раёна. Рабочая Віцебскага спіртзавода, жыла ў Віцебску. Асуджана 17.10.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.7.1960.

СТАРАВОЙТАЎ Яфім Ільіч, н. ў 1875, в. Дашкі Віцебскага раёна. Возчык фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.2.1961.

СТАРЫКОВІЧ Адам Апалінаравіч, н. ў 1895, в. Яроміна Лёзненскага раёна. Інвалід, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.4.1933 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 6.7.1959.

СТАРЫКОВІЧ Антон Эдуардавіч, н. ў 1895, в. Камяжына Віцебскага раёна. Пекар хлебазавода № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1956.

СТАРЫКОВІЧ Герман Канстанцінавіч, н. ў 1906, в. Падбалонне Суражскага раёна. Рабочы піўзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да 10 гадоў ППЛ з заменай ссылкай на 5 гадоў. Рэабілітаваны 7.4.1989.

СТАРЫКОВІЧ Іван Мікалаевіч, н. ў 1883, в. Касовічы Смаленскай вобл. Экспедытар арцелі «Транспарт», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1957.

СТАРЫКОВІЧ Іосіф Антонавіч, н. ў 1897, в. Сёміна Суражскага раёна. Рабочы шчотачнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.11.1957.

СТАРЫКОВІЧ Іосіф Ануфрыевіч, н. ў 1896, в. Маркаўшчына (Маркоўшчына) Суражскага раёна. Грузчык фабрыкі «Саюзутыль», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

СТАРЫКОВІЧ Іосіф Іванавіч, н. ў 1901, Віцебск. Рабочы ст. Віцебск. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

СТАРЫКОВІЧ Іосіф Фаміч, н. ў 1892, Віцебск. Стругальшчык дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.1.1959.

СТАРЫКОВІЧ Пётр Антонавіч, н. ў 1895, в. Семіна Суражскага раёна. Цясляр фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.11.1957.

СТАРЫКОВІЧ Сігізмунд Францавіч, н. ў 1887, в. Лісы Ямы Віцебскага раёна. Рабочы фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.11.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 14.3.1959.

СТАРЫКОВІЧ СтаніслаўАнуфрыевіч, н. ў 1892, в. Губакі Суражскага раёна. Экспедытар фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 18.10.1957.

СТАРЫКОВІЧ Станіслаў Феліксавіч, н. ў 1894, Віцебск. Бляхар паравознага дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 16.10.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 22.12.1958.

СТАРЫКОВІЧ Тэрэза Георгіеўна, н. ў 1897, в. Салокі Ковенскай губ. Санітарка інфекцыйнай бальніцы, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 31.10.1958.

СТАРЫКОВІЧ Франц Эдуардавіч, н. ў 1892, в. Шуты Суражскага раёна. Пекар хлебазавода № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.11.1956.

СТАРЫКОВІЧ Францішка Станіславаўна, н. ў 1903, в. Кімбары Лёзненскага раёна. Рабочая плодавінзавода, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 16.3.1959.

СТАРЫКОВІЧ Эмілія Фамінічна, н. ў 1886, в. Пнёва Суражскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 3.6.1960.

СТАСКЕВІЧ Аляксандр Лукіч, н. ў 1909, г. Вільна. Начальнік мантажнай групы УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.2.1956.

СТАТКЕВІЧ Франц Іванавіч, н. ў 1911, г. Кіеў. Майстар інструментальна-мэблевай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.12.1959.

СТОЖ Антон Еўсцігнеевіч, н. ў 1893, Віцебск. Сталяр дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 28.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.10.1957.

СТОЛЬЦ Зося Хаймаўна, н. ў 1911, м. Відля, Польшча. Рабочая фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 22.10.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 9.6.1958.

СТОМА Антон Вікенцьевіч, н. ў 1906, хут. Навіны Лепельскага раёна. Токар дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1934 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.8.1959.

СТОМА Іосіф Францавіч, н. ў 1880, в. Бубны Дрысенскага павета. Рабочы электрастанцыі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.7.1958.

СТРАЛЕЦКІ Войцэх Іванавіч, н. ў 1891, в. Сеславіцы, Польшча. Грузчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1937. Расстраляны 29.11.1937. Рэабілітаваны 28.10.1957.

СТРАЛКОВА Лізавета Рычардаўна, н. ў 1886, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 25.7.1942 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 7.4.1958.

СТРАЦІЎНЫ Лаўрэнцій Фёдаравіч, н. ў 1891, в. Гаравая Гарадоцкага раёна. Цясляр цагельнага завода № 32, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937. Расстраляны 22.8.1937. Рэабілітаваны 21.1.1960.

СТРУМБІС Пётр Францавіч, н. ў 1880, в. Ворбы Ковенскай губ. Рабочы электрастанцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.6.1960.

СТРУНІН (БЕЛАПОЛЬСКІ) Аляксандр Абрамавіч, н. ў 1898, г. Дзвінск. Сакратар Віцебскага райаддзела Саюза хімікаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.8.1925 да ВМП. Рэабілітаваны 25.5.1992.

СТРЫЖЭЎСКАЯ Магдаліна Станіславаўна, н. ў 1880, в. Стабенцішкі Віленскай губ. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 4.5.1957.

СТРЫЖЭЎСКІ Юльян Станіслававіч, н. ў 1875, в. Яркава Мінскага раёна. Рабочы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.5.1933 да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 27.9.1989.

СТУДЗЯНКОЎ Дзямід Іванавіч, н. ў 1876, в. Студзенкі Расонскага раёна. Рабочы льнопрадзільнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.9.1960.

СТУМБУР Эдуард Іванавіч, н. ў 1877, Ліфляндская губ. Качагар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938 да 5 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 25.5.1958.

СТУНЖА Ігнат Казіміравіч, н. ў 1893, в. Кухцішка Ковенскай губ. Пажарнік завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

СТЭПСАН Карл Карлавіч, н. ў 1900, хут. Калдукшэн Рыжскага павета. Дзесятнік вугальнага склада ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.2.1938. Расстраляны 5.3.1936. Рэабілітаваны 19.9.1967.

СУБОЧ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1903, в. Мікольцы Мядзельскай воласці. Артыст дзяржтэатра, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.1.1959.

СУВОРАЎ Міхаіл Ягоравіч, н. ў 1909, в. Слабада Суражскага раёна. Слесар завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.11.1989.

СУДЗІЛОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч, н. ў 1899, Свярдлоўская вобл. Ветурач навукова-даследчай ветэрынарнай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.7.1957.

СУДМАН Іван Карлавіч, н. ў 1884, в. Ракава Віцебскага раёна. Чорнарабочы трамвайнай лініі, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.10.1937. Расстраляны 3.1.1938. Рэабілітаваны 29.10.1957.

СУДМАН Роберт Карлавіч, н. ў 1895, в. Левантава Віцебскай акругі. Касір Дзяржбанка, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.6.1930 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 16.10.1989.

СУДНІК Станіслаў Іванавіч, н. ў 1908, Глускі раён. Студэнт, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

СУДНІС Анатоль Усцінавіч, н. ў 1905, Віцебск. Дыспетчар ст. Віцебск. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 19.12.1958.

СУДНІС Усцін Восіпавіч, н. ў 1869, в. Дзернічка Віленскай губ. Старшы кандуктар на чыгунцы, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.5.1933 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 27.9.1989.

СУП'ЕЎ (СУПЕЎ) Уладзімір Адамавіч, н. ў 1877, в. Высокі Бор Віцебскай губ. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 11.9.1989.

СУРАЖСКІ Самуіл Ізраілевіч-Хаймавіч, н. ў 1905, г. Лодзь. Бухгалтар-рэвізор Віцебскага аблгарбпрамсаюза, жыў у Віцебску. Арыштаваны 24.6.1941. 10.11.1941 справа спынена.

СУХАНОСАЎ Іван Пятровіч, н. ў 1902, в. Аляксандраўскае Арджанікідзенскага краю. Ваеннаслужачы, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 1.10.1957.

СУХАРУЧКІН Іван Аляксандравіч, н. ў 1894, в. Сяло-Гарадок Яраслаўскай вобл. Выкладчык Віцебскага гарсавета, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.6.1938. Расстраляны 28.6.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 29.12.1966.

СУХОРСКІ Станіслаў Паўлавіч, н. ў 1895, хут. Клешкава Суражскага раёна. Дарожны майстар Віцебскага гарсавета, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 7.4.1960.

СУХОЦКІ Цярэнцій Сямёнавіч, н. ў 1882, в. Замялочча Бешанковіцкага раёна. Дзесятнік Белэнергакамбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны 28.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 21.8.1989.

СУШКЕВІЧ Аркадзь Сцяпанавіч, н. ў 1890, г. Гарадок. Намеснік галоўнага бухгалтара Белдзяржснаба, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.11.1937. Расстраляны 26.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 12.7.1958.

СУШЧЫНСКАЯ Ганна Антонаўна, н. ў 1910, в. Кабыльнікі Лёзненскага раёна. Прыбіральшчыца фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 3.6.1960.

СУШЧЫНСКАЯ Софія Антонаўна, н. ў 1905, в. Дрэя Лёзненскага раёна. Прыбіральшчыца фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 14.9.1959.

СУШЧЫНСКАЯ Праня Антонаўна, н. ў 1901, Віцебск. Прыбіральшчыца фабрыкі «КІМ». Асуджана 29.10.1937. Расстраляна 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 3.6.1960.

СЦЕПАНЕНКА Пётр Антонавіч, н. ў 1884, в. Далецкія Полацкага раёна. Рахункавод Жакта № 9, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.5.1931 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 11.10.1989.

СЦЕРЧ Лазар Ісакавіч, н. ў 1920, г. Вільна. Вучань механіка фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 27.6.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

СЦЯПАНАЎ Васіль Васілевіч, н. ў 1911, в. Анежыцы Ленінградскай вобл. Метэаролаг 11-га авіяпалка, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.7.1931 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.3.1993.

СЦЯПАНАЎ Пётр Васілевіч, ён жа Фёдараў Гаўрыіл, н. ў 1879, г. Цюмень. Тэхнічны кіраўнік абутковай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.7.1931 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1989.

СЫРАЎ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1887, в. Раздова Шуйскага раёна. Шавец арцелі «Капрамонт», жыў у Віцебску. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 3.12.1957.

СЯМАШКА Марыя Міхайлаўна, н. ў 1882, г. Коўна. Не працавала, жыла ў Віцебску. Асуджана 9.12.1937. Расстраляна 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 16.4.1959.

СЯНКЕВІЧ Іван Аляксандравіч, н. ў 1901, г. Тукумс, Латвія. Грузчык, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 27.5.1938. Рэабілітаваны 26.10.1989.

СЯНКЕВІЧ Мікалай Пятровіч, н. ў 1888, г. Дзвінск. Вагаўшчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 16.10.1989.

СЯНКЕВІЧ Тэлесфор Вікенцьевіч, н. ў 1918, г. Вінніца. Слесар завода «Чырвоны металіст», жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.10.1957.

СЯРВУТА Іван Баніфацьевіч, н. ў 1886, Курляндская губ. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.11.1930 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 22.12.1989.

ТАБАКОЎ Арцём Ануфрыевіч, н. ў 1888, в. Бардашы Бешанковіцкага раёна. Возчык Белкамунбуда, жыў Віцебску. Асуджаны 14.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.8.1959.

ТАЛОЧКА Аляксей Восіпавіч, н. ў 1892, м. Жупраны Ашмянскага павета. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ТАЛОЧКА Леанід Восіпавіч, н. ў 1892, м. Жупраны Ашмянскага павета. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937.

Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ТАЛОЧКА Марыя Мацвееўна, н. ў 1895, в. Швакшты Віленскай губ. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 9.11.1937. Расстраляна 9.1.1938. Рэабілітавана 1.10.1957.

ТАЛСТОЙ Цімафей Пракоф'евіч, н. ў 1882, в. Андрукі Бешанковіцкага раёна. Матарыст перавалачнага пункта, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.9.1937 да 8 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 4 гады. Памёр у зняволенні 17.10.1938. Рэабілітаваны 15.1.1969.

ТАЛЬМАН Аляксандр Віктаравіч, н. ў 1888, в. Забалоцце Лёзненскага раёна. Бухгалтар Віцебскага гарсавета, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 21.4.1958.

ТАЛЬМАН Аляўціна Юр'еўна, н. ў 1890, в. Забалоцце Віцебскага раёна. Повар ветінстытута, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ТАМАСЮК Іван Мартынавіч, н. ў 1882, в. Ябланя Сядлецкага павета. Ахоўнік майстэрань, жыў у Віцебску. Асужаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ТАМАШЭЎСКІ Стафан Андрэевіч, н. ў 1890, м. Мільгабура, Польшча. Загадчык арцелі «Саюзкож», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 6.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

ТАНСКІ Андрэй Валянцінавіч, н. ў 1891, г. Варшава. Рабочы фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

ТАПЛАС Вацлаў Францавіч, н. ў 1895, г. Коўна. Намеснік старшыні Віцебскага губкама партыі левых сацыялістаў-рэвалюцыянераў, жыў у Віцебску. Асуджаны 24.9.1922 да ссылкі ў Рыбінскую губерню на 2 гады. Рэабілітаваны 22.3.1996.

ТАРАСАЎ Аляксей Тарасавіч, н. ў 1881, в. Аляксандраўка Смаленскай губ. Майстар дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.6.1937 да 6 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20.3.1940.

ТАРАСАЎ Андрэй Цімафеевіч, н. ў 1873, в. Шутава Цвярской губ. Галоўны кандуктар Віцебскага рэзерва, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.4.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 13.4.1959.

ТАРАСЕНКА Ягор Цімафеевіч, н. ў 1900, в. Кавалёва Віцебскага раёна. Бухгалтар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 26.5.1958.

ТАРКАЛІНА Ганна Пятроўна, н. ў 1879, Віцебск. Прачка «Чырвонага Крыжа» ст. Віцебск. Асуджана 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 31.10.1958.

ТАРНОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1886, г. Полацк. Гандляр магазіна, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.4.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 14.3.1959.

ТАШКАН Георгій Іосіфавіч, н. ў 1872, в. Лейманішкі Рэжыцкага павета. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.12.1937. Расстраляны 25.2.1938. Рэабілітаваны 26.3.1959.

ТАШКЕВІЧ Уладзіслаў Францавіч, н. ў 1890, г. Кракаў. Пячнік 1-га Жакта, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ТКАЧОВА Яўгенія Васілеўна, н. ў 1923, в. Данілава Калінінскай вобл. Эканаміст Віцебскага абл статупраўлення, жыла ў Віцебску. Асуджана 5.5.1945 да 20 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 19.3.1992.

ТКАЧОЎ Іван Мацвеевіч, н. ў 1896, г. Гарадок. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ТКАЧОЎ Іван Самсонавіч, н. ў 1887, в. Плігаўкі Сіроцінскага раёна. Рымар фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 7.4.1989.

ТКАЧОЎ Іосіф Гардзеевіч, н. ў 1897, Польшча. Рабочы фанернага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ТКАЧОЎ Яфім Мацвеевіч, н. ў 1883, г. Смаленск. Гандляр прадметамі царкоўнага ўжытку, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.7.1932 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ТКАЧЫК Уладзіслаў Сямёнавіч, н. ў 1888, г. Варшава. Грузчык ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 13.3.1959.

ТОТ Іосіф Казіміравіч, н. ў 1894, Віцебск. Загадчык 14-й і 15-й польскіх школ. Асуджаны 4.7.1931 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.8.1964.

ТРАНДОРФ Фёдар Вільгельмавіч, н. ў 1877, Віцебск. Слесар-механік фабрыкі «КІМ». Асуджаны 1.11.1938. Расстраляны 20.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 16.8.1989.

ТРАХЛЕБАВА Надзея (Валянціна) Андрэеўна, н. ў 1911, м. Дрыса. Рабочая фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 9.11.1937. Расстраляна 9.1.1938. Рэабілітавана 23.6.1958.

ТРАЦЦЯКЕВІЧ Альберт Канстанцінавіч, н. ў 1902, Віцебск. Возчык дарожна-транспартнай канторы ст. Віцебск. Асуджаны 1.4.1938. Расстраляны 16.4.1938. Рэабілітаваны 25.9.1962.

ТРАЧУМ Эдуард Аляксеевіч (Алаізаравіч), н. ў 1877, м. Краслава Дзвінскага павета. Рабочы 6-га вагоннага ўчастка ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.2.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.12.1958.

ТРЖЦЫНСКІ Баляслаў Людвігавіч, н. ў 1888, в. Памехава Варшаўскай губ. Прараб тэлефоннай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938.

Расстраляны 10.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ТРОЦКАЯ Таісія Васілеўна, н. ў 1896, г. Варонеж. Выкладчык школы, жыла ў Віцебску. Асуджана 14.12.1937. Расстраляна 4.1.1938. Рэабілітавана 31.7.1959.

ТРОЦКІ Іван Васілевіч, н. ў 1893, г. Калінін. Выкладчык Віцебскага медыцынскага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.10.1937. Расстраляны 31.10.1937. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ТРОСТНІКАВА Марыя Мікалаеўна, н. ў 1896, в. Цярэнкі Віцебскага раёна. Рабочая фабрыкі гнуткай мэблі, жыла ў Віцебску. Асуджана 24.2.1934 да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. Рэабілітавана 17.4.1989.

ТРУБАЧ Іван Андрэевіч, н. ў 1880, Віцебск. Выкладчык педінстытута. Асуджаны 20.1.1934 да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. 29.4.1934 вызвалены ад далейшага адбыцця пакарання. Рэабілітаваны 17.7.1961.

ТРУБІНА Аляксандр Іванавіч, н. ў 1887, в. Сафонава Суражскага раёна. Санітар чыгуначнай бальніцы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ТРУБІНА Антон Іванавіч, н. ў 1878, в. Зайбушша Суражскага раёна. Цясляр піўзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 29.1.1959.

ТРУБІНА Іван Іванавіч, н. ў 1885, в. Семіна Суражскага раёна. Рабочы фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ТРУСКОЎСКАЯ Вольга Іосіфаўна, н. ў 1930, в. Буткуны, Латвія. Рабочая Віцебскай махорачнай фабрыкі, жыла ў Віцебску. Асуджана 10.2.1954 да 5 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 3 гады. Рэабілітавана 1.3.1996.

ТРУСКОЎСКАЯ Разалія Іванаўна, н. ў 1882, Ковенская губ. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да 3 гадоў ссылкі ў Сібір. Рэабілітавана 14.8.1964.

ТРЫБУЛАС Канстанцін Адамавіч, н. ў 1895, г. Ленінград. Бухгалтар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да ссылкі на Урал на 3 гады. Рэабілітаваны 8.12.1989.

ТРЫЗНА Мікалай Андрэевіч, н. ў 1907, в. Ізабеліна Кіраўскага раёна. Студэнт ветэрынарнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 24.12.1937. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ТУБЕЛІС Ірына Рыгораўна, н. ў 1897, г. Коўна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 30.12.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 9.2.1990.

ТУЛЯКОЎ Васіль Сяргеевіч, н. ў 1896, в. Абухова Маскоўскай вобл. Зменны майстар плюшавага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.11.1949 да ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 28.12.1956.

ТУРЧЫНОВІЧ Антон Іосіфавіч, н. ў 1907, м. Бешанковічы. Рабочы фабрыкі «Дзвіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1934 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.4.1960.

ТЫКОЦКІ Шан Іосіфавіч, н. ў 1903, г. Востраў Мазавецкай губ. Слесар майстэрні Белдзяржбуда, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1938. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 31.8.1989.

ТЫНТ Ант Пятровіч, н. ў 1875, Курляндская губ. Вартаўнік склада ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ТЭПЕР Барыс Іосіфавіч, н. ў 1901, г. Рыга. Гадзіннікавы майстар ваенгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 14.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 2.4.1974.

УБЫШ Мар'ян Леанардавіч, н. ў 1892, г. Варшава. Вагонны слесар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.10.1989.

УЛАДЫКА Сцяпан Васілевіч, н. ў 1902, в. Роліў Львоўскай губ. Рабочы пагрузачнай канторы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.10.1037. Расстраляны 10.10.1937. Рэабілітаваны 16.10.1989.

УЛАДЫЧАНСКІ Рафаіл Аўгуставіч, н. ў 1870, Аршанскі павет. Рабочы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.11.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

УЛАДЫЧАНСКІ Станіслаў Аўгусцінавіч, н. ў 1883, г. Орша. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.11.1937. Расстраляны 5.1.1938. Рэабілітаваны 6.9.1963.

УЛАСАЎ Іван Аляксандравіч, н. ў 1899, в. Данілаўка Бешанковіцкага раёна. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.9.1937 да 10 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 5 гадоў. Рэабілітаваны 8.8.1990.

УЛАСАЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1876, в. Ізворы Бесарабскай губ. Старшы стрэлачнік чыгуначнай станцыі Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

УЛАСЕВІЧ Іосіф Мацвеевіч, н. ў 1860, г. Сянно. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

УЛЬМАН Карл Оттавіч, н. ў 1893, г. Рыга. Цясляр жылтрэста, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 5.5.1989.

УМЕЦКІ Іосіф Пятровіч, н. ў 1872, в. Бурсучына Бабруйскага раёна. Работнік Асавіяхіма, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

УПЕНІК Усцін Аўгуставіч, н. ў 1893, Дзвінскі павет. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асу-

джаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

УРБАН Жазефіна Іванаўна, н. ў 1893, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 4.7.1931 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана 14.8.1964.

УРБАН Юрый Іосіфавіч, н. ў 1873, Ковенская губ. Галоўны кандуктар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ з заменай высылкай у Сібір на 5 гадоў. Рэабілітаваны 14.8.1964.

УРБАНОВІЧ Іван Андрэевіч, н. ў 1893, г. Беласток. Кіраўнік духавога аркестра інструментальнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.9.1989.

УРБАНОВІЧ Іван Мацвеевіч, н. ў 1877, в. Трубічы Віцебскага раёна. Грузчык фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.12.1937. Расстраляны 24.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 22.12.1958.

УРБАНОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1891, в. Шкрабы Віцебскай губ. Рабочы таварнага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 31.10.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 18.10.1989.

УРКЕВІЧ Карл Оттавіч, н. ў 1902, Курляндская губ. Шафёр базы Белкапмалако, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.1.1957.

УРУБЕЛЬ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1904, г. Харбін. Загадчык кафедры Віцебскага педінстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.6.1949 да ссылкі на пасяленне. Рэабілітаваны 17.10.1955.

УРУБЛЕЎСКІ Антон Вацлававіч, н. ў 1896, Віленская губ. Выкладчык кінатэхнікума Віцебска, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.12.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 26.2.1959.

УРУБЛЕЎСКІ Іван Францавіч, н. ў 1900, ст. Ялоўка Ковенскай губ. Майстар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 10.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

УСАЎ Ніканор Яўлампіевіч, н. ў 1899, м. Дзімітрава Адэскай вобл. Загадчык аддзела Віцебскага універмага, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 10.6.1965.

УСЦІНОВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1895, в. Лукаўцы Полацкага павета. Механік 40-га авіяпарка, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.8.1958.

УТКІН Міхаіл Паўлавіч, н. ў 1897, г. Востраў Пскоўскай губ. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.5.1923 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.7.1992.

УШАЛ Пётр Казіміравіч, н. ў 1896, в. Ярошава Сіроцінскага раёна. Старшы дыспетчар лесапункта «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937. Расстраляны 26.9.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 17.9.1960.

УШАЛАЎ Ігнацій Іосіфавіч, н. ў 1903, в. Ярошава Сіроцінскага раёна. Таваравед фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 18.3.1958.

УШАЛАЎ Іосіф Пятровіч, н. ў 1906, в. Яршова Сіроцінскага раёна. Рабочы дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

УШАЛАЎ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1871, Сіроцінскі раён. Вартаўнік райаддзела сувязі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 7.10.1964.

УШАЛАЎ (УШАЛ) Піус Пятровіч, н. ў 1909, в. Яршова Сіроцінскага раёна. Машыніст вадакачкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 29.1.1959.

УШАЛАЎ Станіслаў Карлавіч, н. ў 1909, в. Сакалоўка Сіроцінскага раёна. Слесар ляснога завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

УШКУРАЎ Іван Васілевіч, н. ў 1902, в. Козінева Лёзненскага раёна. Механік махорачнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.1.1944.

УЧЭНЬ Якаў Беркавіч, н. ў 1913, Польшча. Рабочы абутковай фабрыкі «Прагрэс», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1940 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 6.3.1990.

УЭЛЬСКАЯ Ванда Браніславаўна, н. ў 1893, Маскоўская вобл. Бібліятэкар ветэрынарнай станцыі, жыла ў Віцебску. Асуджана 19.11.1937. Расстраляна 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 11.2.1958.

УЭЛЬСКІ Георгій Аляксандравіч, н. ў 1916, г. Масква. Студэнт кінатэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.5.1957.

ФАЛАЛЕЕВА Надзея Еўдакімаўна, н. ў 1923, г. Мінск. Без пэўных заняткаў, жыла ў Віцебску. Асуджана 21.11.1945 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 6.1.1993.

ФАЛКІН Ізраіл Копелевіч, н. ў 1894, Віцебск. Інспектар Віцебскага аддзялення Дзяржбанка. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.10.1956.

ФАЛЬКОЎСКІ Вацлаў Францавіч, н. ў 1911, хут. Хладзінава Барысаўскага павета. Фрэзероўшчык фабрыкі гнуткай мэблі, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.10.1957.

ФАМІН Барыс Аляксандравіч, н. ў 1907, г. Смаленск. Электразваршчык паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.10.1954.

ФАТЭР Абрам Ісаевіч, н. ў 1880, Польшча. Шавец па найму, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.7.1993.

ФЕДАРОВІЧ Генрых Іванавіч, н. ў 1878, в. Субочава Дзісненскага павета. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.4.1958.

ФЕДАСЕЕНКА Пётр Максімавіч, н. ў 1896, в. Войлева Віцебскага раёна. Шафёр махорачнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 28.10.1941. Рэабілітаваны 21.8.1965.

ФЕДЧАНКА Софія Міхайлаўна, н. ў 1914, в. Лесаўшчына Віцебскага раёна. Рабочая фабрыкі «КІМ», жыла ў Віцебску. Асуджана 23.8.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.12.1989.

ФЕДЭРМАН Якаў Давыдавіч, н. ў 1881, Латвія. Гандляр Белпрамгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1939 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ФЕЛЬДБАУМ Майсей Гіршавіч, н. ў 1890, г. Міжрэчча, Польшча. Рабочы шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.1.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ФЕЛЬДМАН Беньямін Хаймавіч, н. ў 1889, г. Міжрэчча, Польшча. Сарціроўшчык шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.11.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ФЁДАРАЎ Фядот Фёдаравіч, н. ў 1883, в. Слабада Веліжскага раёна. Рулявы парахода «Веліса», жыў на прыстані Віцебска. Асуджаны 26.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 18.8.1942. Рэабілітаваны 13.11.1965.

ФІАЛА Адольф Іванавіч, н. ў 1880, г. Вена. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ФІГІМАН Янкель Беркавіч, н. ў 1913, г. Александрыя, Украіна. Муляр гархарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.2.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ФІЛАМАЦІЦКІ Аляксандр Ільіч, н. ў 1894, Віцебск. Загадчык пункта «Белплодаагародніна» ст. Забалоцінка. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.11.1938 у Смаленску. Рэабілітаваны 31.3.1970.

ФІЛІПЦОЎ Фёдар Паўлавіч, н. ў 1897, в. Слабодка Багушэўскага раёна. Рабочы фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 16.5.1942. Рэабілітаваны 14.6.1958.

ФІЛІПЧАК Мар'ян Уладзіслававіч, н. ў 1910, г. Варшава. Рабочы шчотачнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 27.6.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.6.1992.

ФЛЯЎМЕНБАУМ Моўша Алтэравіч, н. ў 1898, м. Антопаль Кобрынскага павета. Рабочы абутковай фарыкі «Прагрэс», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.2.1958.

ФРАДКОЎ Самуіл Якаўлевіч, н. ў 1888, г. Веліж. Сталяр фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 5.10.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 1.10.1966.

ФРАНСУС Іосіф Антонавіч, н. ў 1899, в. Галонак Петрыкаўскай губ. Рахункавод люстраной фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.9.1937. Расстраляны 2.10.1937. Рэабілітаваны 26.10.1989.

ФРАНЦ Іван Антонавіч (Оттавіч), н. ў 1877, г. Мітава. Загадчык гаспадаркі 53-й СШ, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 25.5.1958.

ФРАНЦУК Ян Станіслававіч, н. ў 1890, Віленская губ. Выкладчык каталіцкага катэхізіса польскай школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 27.8.1920 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.2.1993.

ФРЫД Ісаак Майсеевіч, н. ў 1892, в. Галіцынаў, Польшча. Дырэктар вучэбнага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.10.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.3.1965.

ФРЫД Маша Нахімаўна, н. ў 1897, г. Брэст-Літоўск. Нарыхтоўшчыца фабрыкі «Прагрэс», жыла ў Віцебску. Асуджана 29.3.1938. Расстраляна 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 14.5.1965.

ФРЫДМАН Абрам Якаўлевіч, н. ў 1898, Польшча. Кравец фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 1.2.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ФРЫДМАН Майсей Цулкавіч, н. ў 1888, м. Егліск Радомскай губ. Рабочы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 27.8.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1993.

ФРЫДМАН-САНДАМІРСКАЯ Рыва Мордухаўна, н. ў 1909, Польшча. Урач амбулаторыі хуткай дапамогі, жыла ў Віцебску. Асуджана 10.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 6.9.1955.

ФРЫШМАН Генрых Карлавіч, н. ў 1878, г. Лібава. Слесар завода «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 6.11.1938. 20.11.1938 справа спынена.

ФРЫШМАН Жан Генрыхавіч, н. ў 1913, г. Рыга. Матарыст воднага транспарту, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1989.

ФРЭЙВАЛЬД Альфрад Пятровіч, н. ў 1879, в. Субры Ліфляндскай губ. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.3.1930. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 30.10.1989.

ФРЭЙДЛІН Навум Рыгоравіч, н. ў 1897, м. Бялынічы. Рэдактар газеты «Віцебскі пралетарый», жыў у Віцебску. Асуджаны 21.11.1937. Расстраляны 22.11.1937. Рэабілітаваны 6.10.1956.

ФРЭЙМАН Барыс Іванавіч, н. ў 1899, г. Рыга. Служачы бюро крымінальнага вышуку, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.8.1927 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.12.1992.

ФЯДЗЮШКА Макар Міхайлавіч, н. ў 1883, в. Селішча Слуцкага раёна. Чорнарабочы канторы Сплаўлеса «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.12.1956.

ФЯДОТАЎ Герасім Антонавіч, н. ў 1874, Віцебск. Аднаасобнік. Асуджаны 11.2.1931 да пазбаўлення права пражывання ў пэўных населеных пунктах СССР тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 27.11.1989.

ФЯДЭЛЬСКАЯ Лізавета Аляксееўна, н. ў 1901, г. Невель. Рабочая абутковай фабрыкі, жыла ў Віцебску. Асуджана 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітавана 4.5.1957.

ХАДЗЯНОК Рыгор Аляксеевіч, н. ў 1896, в. Ржаўка Бешанковіцкага раёна. Рабочы спіртзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 27.2.1938.

ХАДКЕВІЧ Пётр Цімафеевіч, н. ў 1894, в. Шайтэрава Дрысенскага раёна. Цясляр базы Маслатопа, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1938. Расстраляны 8.10.1938. Рэабілітаваны 8.9.1958.

ХАЙКІН Рыгор Мацвеевіч, н. ў 1908, в. Далісечы Арлоўскай вобл. Загадчык гаспадаркі завода імя «20 гадоў БССР», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.5.1943 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.4.1956.

ХАЛДЫНСКІ Іосіф Станіслававіч, н. ў 1889, г. Варшава. Без пэўных заняткаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.10.1939. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 1.11.1989.

ХАЛЕЕЎ Фёдар Майсеевіч, н. ў 1893. Слесар аўтатрактарнай майстэрні, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.10.1937. Расстраляны 15.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 31.10.1990.

ХАЛЕНДЭР Аляксандр Генрыхавіч (Індрыкавіч), н. ў 1889, Латвія. Загадчык склада Гархарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.8.1959.

ХАЛСЦННІКАЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1876, Віцебск. Чорнарабочы цагельнага завода. Асуджаны 11.1.1931 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.7.1989.

ХАМЦОЎ Сцяпан Дамітрыевіч, н. ў 1900, в. Асабняк Віцебскага раёна. Рахункавод 1-га дзяржмлына, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.9.1930. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 30.10.1989.

ХАНІН Абрам Іахімавіч (Наханавіч), н. ў 1893, Віцебск. Выкладчык палітэхнікума. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.5.1957.

ХАНІН Гірша Хаймавіч, н. ў 1892, Віцебск. Рабочы друкарні «Камінтэрн». Асуджаны 4.5.1937 да 5 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні ў 1938 г. Рэабілітаваны 24.10.1958.

ХАНІН Хаім-Давід Саламонавіч (Сімонавіч), н. ў 1863, Віцебск. Загадчык сушыльнага аддзялення тытунёвай фабрыкі. Асуджаны 18.4.1924 да ссылкі на Урал тэрмінам на 2 гады. Рэабілітаваны 29.5.1992.

ХАНІН Янкель Абрамавіч, н. ў 1896, Віцебск. Таваравед Белпрамгандлю. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ХАРАМОНЕНКА Канстанцін Трафімавіч, н. ў 1912, в. Хацінічы Віцебскага раёна. Бухгалтар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ХАРАМОНЕНКА Трафім Архіпавіч, н. ў 1882, в. Хацінічы Віцебскага раёна. Рабочы дражджавога завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ХАРАШКЕВІЧ Іван Пятровіч, н. ў 1912, в. Белня Ушацкага раёна. Рабочы цагельнага завода № 31, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ХАРЭЎСКІ Іван Сямёнавіч, н. ў 1893, г. Мінск. Майстар водазабеспячэння ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.6.1938 да 8 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 5 гадоў. Рэабілітаваны 1.4.1957.

ХАТДОЧЫНА Марыя Ігнацьеўна, н. ў 1911, в. Пушчавыя Асвейскага раёна. Прыбіральшчыца маслазавода, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 28.11.1957.

ХАТКОЎСКІ Франц Ігнацьевіч, н. ў 1893, в. Сілічы Лагойскага раёна. Грузчык завода «Руба», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.12.1959.

ХАУКОЎСКІ Іван Ігнацьевіч, н. ў 1896, в. Роніна Лёзненскага раёна., Грузчык фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 26.10.1989.

ХАШКОЎСКАЯ Кацярына-Казіміра Каетанаўна, н. ў 1882, в. Тыкаўшчына Сенненскага раёна. Краўчыха швейнай арцелі «Уперад», жыла ў Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 18.3.1958.

ХАШКОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. ў 1898, в. Хашковічы Віцебскага раёна. Рабочы батанічнага сада, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.9.1932 да 5 гадоў ППЛ. Другі раз асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 27.8.1937. Рэабілітаваны 15.2.1964.

ХАШКОЎСКІ Іван Аляксандравіч, н. ў 1915, в. Елагінскае Віцебскага раёна. Рабочы саўгаса «Новы шлях», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ХВЕСЮК Павел Фёдаравіч, н. ў 1895, в. Парэчча Пінскага павета. Начальнік радыёвузла, жыў

у Віцебску. Асуджаны 3.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.7.1958.

ХЕЙФЕЦ Залма Абрамавіч, н. ў 1901, Віцебск. Парторг ФЗВ швейнікаў. Асуджаны 10.10.1938 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.7.1956.

ХЕЛАНДЭР Аляксандр Генрыхавіч, н. ў 1889, г. Мітава, Латвія. Кладаўшчык Гархарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.8.1959.

ХІЛЬКОЎ Павел Ягоравіч, н. ў 1908, в. Кавалёва Езярышчанскага раёна. Рабочы цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.9.1958.

ХІНСКІ Абрам Юдзелевіч, н. ў 1895, г. Беласток. Кравец фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.9.1958.

ХЛЯБОЎСКІ Станіслаў Войцэхавіч, н. ў 1887, г. Ласк, Польшча. Інструктар Віцебскай МТС, жыў у Віцебску. Асуджаны 24.2.1934 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.4.1989.

ХМЯЛЕЎСКІ Аляксандр (імя па бацьку не ўказана), н. ў 1904, г. Полтуск, Польшча. Беспрацоўны, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.8.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.6.1989.

ХМЯЛЕЎСКІ Іван Казіміравіч, н. ў 1895, м. Новы Двор Гродзенскай губ. Дзесятнік топліўнага склада ст. Віцебск, жыў на ст. Віцебск. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 18.10.1989.

ХОБЕЦ Софія Якаўлеўна, н. ў 1889, в. Кавалі Беластоцкага павета. Чорнарабочая фабрыкі імя Кагановіча, жыла ў Віцебску. Асуджана 17.5.1945 да 10 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 3 гады. Рэабілітавана 14.3.1955.

ХОКА Васіль Рыгоравіч, н. ў 1888, Віцебск. Брыгадзір паравознага дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 18.12.1936 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1958.

ХОМА Міхаіл Іванавіч, н. ў 1892, г. Рымніў Львоўскай вобл. Машыніст дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.5.1938. Расстраляны 14.7.1938. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ХОМІЧ Іван Якаўлевіч, н. ў 1914, в. Бязвархавічы Слуцкага раёна. Студэнт ветэрынарна-заалагічнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 19.4.1962.

ХОПШТЭЙН Давід Абрамавіч, н. ў 1917, г. Лодзь, Польшча. Рабочы спіртзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.6.1940 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

ХРОЛ Адольф Эдуардавіч, н. ў 1904, в. Хролы Дзісненскага раёна. Электраманцёр, жыў у Віцебску. Асуджаны ў ліпені 1933 да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ХРУЦКАЯ-АГЕЙЧЫК-БАГУСЛАЎСКАЯ Ганна Антонаўна (Міхайлаўна), н. ў 1897, Віцебск. Без пэўных заняткаў. Асуджана 25.8.1937. Расстраляна 27.8.1937 у Мінску. Рэабілітавана 16.10.1989.

ХРЫПОВІЧ Іван Адамавіч, н. ў 1889, в. Ужулішкі Ковенскага павета. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938. Расстраляны 1.1.1938. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ХРЫШЧАНОВІЧ Якаў Якаўлевіч, н. ў 1893, в. Шымкава, Літва. Машыніст ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.3.1960.

ХУРЖАНАЎ Кузьма Аляксандравіч, н. ў 1891, Сядлецкая губ. Рабочы таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.10.1937. Расстраляны 17.10.1937. Рэабілітаваны 28.8.1959.

ЦАЛКОВІЧ Альбіна Станіславаўна, н. ў 1918, в. Салаўёва Лёзненскага раёна. Рабочая кінатэатра, жыла ў Віцебску. Асуджана 22.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана.

ЦАЛКОВІЧ Станіслаў Іванавіч, н. ў 1883, в. Прудзішча Лёзненскага раёна. Цясляр райспажыўсаюза, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 21.11.1957.

ЦАРКОЎСКІ Сямён Васілевіч, н. ў 1896, в. Замошанне Бешанковіцкага раёна. Выкладчык палітэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 6.9.1957.

ЦАРЭВІЧ Уладзімір Пятровіч, н. ў 1885, г. Даугаўпілс (Дзвінск). Юрысконсульт Віцебскага аддзялення Белдзяржснаба, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937. Расстраляны 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.10.1957.

ЦАХАНОЎСКІ Яўтен Нікіціч, н. ў 1901, в. Нікуліна Смаленскай вобл. Старшы бухгалтар Віцебскага сяльпо, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.7.1960.

ЦАХОЎСКАЯ Ганна Андрэеўна, н. ў 1887, м. Краслава, Латвія. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 12.4.1938. Расстраляна 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 1.11.1990.

ЦАХОЎСКІ Іосіф Сцяпанавіч, н. ў 1882, в. Бронікі, Латвія. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1990.

ЦЕНЯРОЎ Ціхан Севасцьянавіч, н. ў 1879, г. Полацк. Паязны кандуктар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 19.5.1958.

ЦЕРЫН Канстанцін Аўгуставіч, н. ў 1913, в. Ула Бешанковіцкага раёна. Памочнік машыніста цеплахода «КП(б)Б», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.3.1961.

ЦІЗЕНГАЎЗЕН Рамуальд Антонавіч, н. ў 1911, Віцебск. Тэхнік паравознага аддзялення ст.

Віцебск. Асуджаны 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.1.1957.

ЦМАФЕЕЎ Генадзь Іванавіч, н. ў 1926, Віцебск. Ваеннаслужачы. Асуджаны 31.12.1944 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.11.1962.

ЦМАФЕЕЎ Іван Лявонцьевіч, н. ў 1884, Ленінградская вобл. Аграном, жыў у Віцебску. Арыштаваны 23.12.1944. 18.6.1945 справа спынена.

ЦМАФЕЕЎ Рыгор Макаравіч, н. ў 1891, г. Веліж Пскоўскай губ. Намеснік загадчыка базы «Белплодаагародніна», жыў у Віцебску. Асужаны 30.5.1931 да 5 гадоў ППЛ. 14.12.1931 высланы на астатні тэрмін у Сібір. Рэабілітаваны 26.12.1989.

ЦМОНІН Аляксандр Іванавіч, н. ў 1905, г. Балакова Саратаўскай вобл. Начальнік штаба 3-й дывізіі, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.11.1967.

ЦТОЎ Іван Усцінавіч, н. ў 1903, в. Панізоўе Лёзненскага раёна. Цясляр УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 20.12.1941. Рэабілітаваны 16.2.1973.

ЦХАНАЎ Андрэй Аляксандравіч, н. ў 1887, г. Полацк. Дырэктар 53-й сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.5.1960.

ЦХАНЕНКА Аляксей Васілевіч, в. Свінава, Латвія. Майстар ліцейнага цэха палітэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938 (у тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам з 17.8.1938). Рэабілітаваны 29.9.1989.

ЦХАНЕНКА Пётр Іосіфавіч, н. ў 1902, в. Альбрэхава Расонскага раёна. Цясляр канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 5.5.1959.

ЦХОШ Лаўрэнцій Лаўрэнцьевіч, н. ў 1887, в. Сітанец Люблінскай губ. Слесар завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЦОФНАС (ЦОФІАС) Сімон Мендзелевіч, н. ў 1894, г. Гродна. Загадчык магазіна № 2, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.5.1938. Расстраляны 10.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 12.11.1959.

ЦУКЕРМАН Гінда Сімхаўна, н. ў 1898, г. Парчаў, Польшча. Настаўніца 37-й яўрэйскай школы, жыла ў Віцебску. Асуджана 22.10.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 9.6.1958.

ЦУКЕРМАН Фішэль Шлёмавіч, н. ў 1898, г. Парчаў, Польшча. Рабочы газеты «Віцебскі пралетарый», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 9.6.1958.

ЦУРБАН Іван Іванавіч, н. ў 1898, в. Застарынне Бешанковіцкага раёна. Рахункавод дзіцячых ясляў фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.9.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 7.10.1957.

ЦЫБУЛІЧ Павел Ільіч, н. ў 1885, г. Дзяржынск Тураўскага раёна. Бондар Віцебскага вінзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

ЦЫБУЛЬСКІ Васіль Панкрацьевіч, н. ў 1912, в. Плігаўка Сіроцінскага раёна. Касір ст. Чэпіна Заходняй чыгункі, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.7.1938 да 10 гадоў ППЛ з паражэннем у правах на 5 гадоў. 25.1.1941 мера пакарання зніжана да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.10.1961.

ЦЫГУС Юліус Іванавіч, н. ў 1888, г. Рыга. Рабочы завода «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ЦЫЛЬВЕКС Аксар Юр'евіч, н. ў 1893, Курляндская губ. Брыгадзір каталожнага цэха ігольнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ЦЫНГЕЛЬ Ванда Францаўна, н. ў 1913, Сенненскі раён. Рабочая ветэрынарнай станцыі, жыла у Віцебску. Асуджана19.11.1937. Расстраляна 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 11.2.1958.

ЦЫНГЕЛЬ Генрых Францавіч, н. ў 1911, в. Гарадок Сенненскага раёна. Шафёр ветэрынарнай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.2.1958.

ЦЫНГЕЛЬ-СНАРСКАЯ Міхаліна Іосіфаўна, н. ў 1882, в. Ляхаўшчына Бешанковіцкага раёна. Рабочая фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыла ў Віцебску. Асуджана 19.11.1937 да ВМП. Расстраляна 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 11.2.1958.

ЦЫРУЛЬНІКАЎ Самуіл Мордухавіч, н. ў 1886, Віцебск. Мастак арцелі «Гігіена». Асуджаны 27.8.1951 да 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 24.10.1956.

ЦЯРАЕЎ Мірон Платонавіч, н. ў 1883, в. Вепрынец Арлоўскай губ. Бухгалтар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.11.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЦЯРЭШЧАНКА Андрэй Якаўлевіч, н. ў 1868, в. Замошша Бешанковіцкага раёна. Вартаўнік тэлефоннай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.12.1937. Расстраляны 16.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ЦЯРЭШЧАНКА Іван Іосіфавіч, н. ў 1911, в. Капітонава Віцебскага раёна. Электраманцёр фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.2.1961.

ЦЯРЭШЧАНКА Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1882, в. Пашкова Віцебскага раёна. Рабочы-арматуршчык Белкамунбуда, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 15.8.1959.

ЦЯЦЕРСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. ў 1891, м. Леніна Слуцкага раёна. Настаўнік СШ № 1, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 30.12.1937. Рэабілітаваны 27.11.1962.

ЧАЙКОЎСКАЯ Глікерыя Іванаўна, н. ў 1885, г. Брэст, жыла ў Віцебску. Асуджана 6.12.1937. Расстраляна 24.12.1937. Рэабілітавана 3.12.1957.

ЧАЛЕЙ Уладзімір Аляксандравіч, н. ў 1886, в. Міхасельцы Навагрудскага павета. Юрысконсульт фабрыкі імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны 19.5.1958.

ЧАЛЕЙ Сігізмунд Уладзіміравіч, н. ў 1923, Віцебск. Не працаваў. Арыштаваны 20.7.1945. 10.10.1945 справа спынена.

ЧАПКОЎСКІ Іосіф Пятровіч, н. ў 1892, Ковенская губ. Рабочы тараканбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны 28.11.1938. Рэабілітаваны 28.5.1958.

ЧАПУЛЯНЕЦ Карл Францавіч, н. ў 1902, Віленская вобл. Рабочы саюзтранса, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.1.938. Расстраляны 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.6.1958.

ЧАРНАВУСАЎ Аляксандр Якаўлевіч, н. ў 1892, в. Пушча Гарадоцкага раёна. Рабочы лесазавода № 13, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 20.6.1959.

ЧАРНАГУБАЎСКАЯ Генія Рыгораўна, н. ў 1922, г. Мазыр. Студэнтка настаўніцкага інстытута, жыла ў Віцебску. Арыштавана 22.6.1941. 9.11.1941 справа спынена.

ЧАРНАГУБАЎСКІ Рыгор Барысавіч, н. ў 1897, м. Стаўбцы. Галоўны бухгалтар фанернага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЧАРНАМОРДЗІК Барыс Майсеевіч, н. ў 1886, Харкаўская губ. Юрысконсульт на фабрыцы, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 16.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ЧАРНЕЦКІ Іван Сямёнавіч, н. ў 1904, в. Дудзічы Самахвалавіцкага (Смілавіцкага) раёна. Дырэктар пединстытута, жыў у Віцебску. Арыштаваны 15.9.1936 (з-пад варты вызвалены). Другі раз арыштаваны ў 1937. Асуджаны 9.12.1937. Расстраляны 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.4.1959.

ЧАРНЕЦКІ Іосіф Цеафілавіч, н. ў 1897, Люблінскі павет. Нарміроўшчык завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЧАРНЯК Марыя Еўсцігнееўна, н. ў 1888, Віцебск. Фельчар чыгуначнай бальніцы. Асуджана 16.5.1938 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 3.8.1959.

ЧАРНЯК Мікалай Платонавіч, н. ў 1885, г. Мсціслаўль. Ветэрынарны ўрач біяфабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ЧАРНЯЎСКІ Фёдар Міхайлавіч, н. ў 1898, в. Антонавічы Ветрынскага раёна. Бухгалтар жыллёвага таварыства, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.11.1927 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.3.1993.

ЧАРНЯЎСКІ Юрый Іванавіч, н. ў 1909, Віленская губ. Студэнт мастацкага тэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.3.1933 (у тэрмін пакарання залічаны тэрмін знаходжання пад следствам з 10.12.1932). Рэабілітаваны 31.5.1989.

ЧАРЭПНІН Аляксандр Іванавіч, н. ў 1903, в. Дворышча Полацкага раёна. Ваеннаслужачы, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.8.1938 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 27.8.1955.

ЧАХОВІЧ Марыя Рамуальдаўна, н. ў 1881, в. Каралі Сенненскага раёна. Без пэўных заняткаў, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 14.8.1964.

ЧАЧУРА Сцяпан Фёдаравіч, н. ў 1883, г. Сураж. Загадчык тэлефоннай станцыі, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.3.1934 да 5 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні ў 1947. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ЧВУРКА Лявон Восіпавіч, н. ў 1890, Польшча. Пажарнік кансервавага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЧЖАН Лян Цян-Міхаіл, н. ў 1891, Кітай. Рабочы пральні, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.8.1989.

ЧУГУНОЎ Еўдакім Паўлавіч, н. ў 1910, в. Чыжыкі Суражскага раёна. Аўтаслесар УВБР-200, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.10.1946 да 15 гадоў катаржных работ. Рэабілітаваны 24.4.1956.

ЧУДАРОВА Яўгенія Мікалаеўна, н. ў 1895, ст. Броды Свярдлоўскай вобл. Медыцынская сястра ваеннага шпіталю, жыла ў Віцебску. Асуджана 14.12.1937. Расстраляна 25.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 19.5.1958.

ЧУЛІТ Іван Пятровіч, н. ў 1897, Ліфляндыя. Сезонны рабочы, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.8.1930 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 7.7.1989.

ЧУМАКОЎ Рыгор Іванавіч, н. ў 1889, в. Гапонаўка Віцебскага раёна. Выкладчык мастацкага тэхнікума, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 4.12.1957.

ЧЫЖЭЎСКАЯ Караліна Дамянікаўна, н. ў 1897, г. Сянно. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 7.5.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 27.9.1989.

ЧЫЖЭЎСКІ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1909, г. Дрыса. Рабочы цагельнага завода № 33, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ШАБРЫНСКІ Іван Яўстаф'евіч, н. ў 1889, Віцебск. Машыніст ст. Віцебск. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 17.5.1938. Рэабілітаваны 6.4.1957.

ШАДЗЕЎСКІ Мар'ян Браніслававіч, н. ў 1911, г. Лепель. Слесар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 21.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 29.4.1959.

ШАДУРСКІ Адам Мацвеевіч, н. ў 1904, в. Шэдзькі Сіроцінскага раёна. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.12.1937. Расстраляны 25.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.1.1967.

ШАЙКО Алена Ісакаўна, н. ў 1895, Віцебск. Сакратар швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі». Асуджана 3.1.1938. Расстраляна 17.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 23.6.1958.

ШАЙКО Галіна Ісакаўна, н. ў 1896, Віцебск. Настаўніца 15-й польскай школы. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ. 23.7.1931 тэрмін пакарання зніжаны да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 14.8.1964.

ШАЛАЕЎ Фінаген Аўдзеевіч, н. ў 1865, в. Шмана Сіроцінскага раёна. Калгаснік калгаса імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ШАМШУРА Цімафей Антонавіч, н. ў 1911, в. Плоскія Віцебскага раёна. Рабочы хлебазавода № 1, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ШАНАЙЦА (ШАНАЙЦ) Станіслаў Казіміравіч, н. ў 1914, г. Маздок Цвярской вобл. Тэхнік сувязі Віцебскай МТС, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.9.1938. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 2.10.1989.

ШАПО Павел Дзмітрыевіч, н. ў 1898, в. Усна Ушацкага раёна. В.а. дырэктара 10-й сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.11.1937. Расстраляны 10.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ШАПУРАЎ Аляксандр Ягоравіч, н. ў 1898, в. Чэрткі Лёзненскага раёна. Касір сплаўлеса «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 11.12.1941 да 5 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні ў снежні 1941. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ШАПУРАЎ Цімафей Сцяпанавіч, н. ў 1888, в. Старое Сяло Віцебскага раёна. Юрысконсульт базы Белветснаб, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ШАРАНКОЎ Васіль Кузьміч, н. ў 1883, в. Новая Вайхеня Гарадоцкага раёна. Рабочы Белкамунбуда, жыў у Віцебску. Асужаны 23.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.11.1989.

ШАРКОЎ Цімафей Фядосавіч, н. ў 1909, в. Лазаватка Суражскага раёна. Шафёр фабрыкі «Саюзутыль», жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.7.1959.

ШАРЫПА Іван Ільіч, н. ў 1913, в. Заполле Ушацкага раёна. Слесар маслазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.3.1963.

ШАРЫПАЎ Цімафей Сямёнавіч, н. ў 1907, в. Доўгая Ніва Суражскага раёна. Возчык арцелі «Хімік», жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.10.1989.

ШАСТАКОВА-СТУМБРЫС Альбіна Пятроўна, н. ў 1909, г. Рыга. Экспедытар хлебазавода № 2, жыла ў Віцебску. Асуджана 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 28.4.1961.

ШАСТАКОЎ Іван Ільіч, н. ў 1903, Віцебск. Начальнік 6-га вагоннага ўчастка ст. Віцебск. Асуджаны 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 30.3.1942. Рэабілітаваны 28.4.1961.

ШАЎКО Іосіф Міхайлавіч, н. ў 1892, г. Беласток. Бухгалтар малочнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.10.1938. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны 4.9.1989.

ШАЎЛОЎСКАЯ Марыя Аляксандраўна, н. ў 1885, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 4.7.1931 да 3 гадоў ссылкі ў Сібір. Рэабілітавана 14.8.1964.

ШАЎЛОЎСКІ Антон Ульянавіч, н. ў 1878, Польшча. Муляр на будаўніцтве маста, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.7.1931 да 3 гадоў ссылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 14.8.1964.

ШАЎРОЎ Пётр Кандрацьевіч, н. ў 1878, в. Старышча Віцебскага раёна. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.10.1937. Расстраляны 3.1.1938. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ШАЎСКІ Аляксандр Алімпіевіч, н. ў 1878, Віцебск. Начальнік паязной брыгады праваднікоў ст. Віцебск. Асуджаны 19.2.1939 да пазбаўлення волі на 1 год і 6 месяцаў. Рэабілітаваны 19.3.1939 (справа спынена).

ШАЎСКІ Парфірый Ерафеевіч, н. ў 1894, Віцебск. Служачы вузла сувязі. Асуджаны 2.3.1934 да 8 гадоў ППЛ. 15.9.1951 сасланы на пасяленне ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ШАЎЧЭНКА Аляксандр Мікалаевіч, н. ў 1911, в. Мілешкі Суражскага раёна. Прараб УВБР-98, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 15.2.1956.

ШАФІР Адольф Майсеевіч, н. ў 1912, г. Мінск. Вучань сельскагаспадарчай прафтэхшколы «Лукішкі», жыў у Віцебску. Асуджаны 28.2.1931 да ссылкі ў Казахстан на 3 гады. Рэабілітаваны 2.8.1989.

ШАФРАН Ігнацій Ягоравіч, н. ў 1888, в. Мурзы Віцебскага раёна. Вартаўнік будоўлі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.11.1938 (мера пакарання не ўказана). Рэабілітаваны 16.10.1989.

ШАХОРА Станіслаў Мартынавіч, н. ў 1891, г. Варшава. Качагар фабрыкі імя Кагановіча, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 11.12.1959.

ШАХУРЫН Леанід Аляксандравіч, н. ў 1898, м. Корсаўка Віцебскай губ. Інспектар фінаддзела, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.11.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.8.1956.

ШАЦЕРКІНА Аляксандра Васілеўна, н. ў 1874, Віцебск. Пенсіянерка. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ШАЦКАЯ Наталля Пятроўна, н. ў 1887, г. Праснышава. Не працавала, жыла ў Віцебску. Асу-

джана 11.2.1931 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 23.10.1989.

ШАШКОЎ Максім Пратасавіч, н. ў 1902, в. Новы Двор Суражскага раёна. Дэзінфектар, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ШАШКОЎ Фёдар Пратасавіч, н. ў 1905, в. Новы Двор Суражскага раёна. Рабочы цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.7.1958.

ШАШКОЎСКІ Павел Георгіевіч, н. ў 1900, м. Сураж. Бухгалтар мясакамбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.12.1939 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 18.3.1994.

ШВАЙЧАНКА Фёдар Маркавіч, н. ў 1896, в. Глушаняты Лёзненскага раёна. Брыгадзір аўтатранспартнай брыгады канторы сплаўлеса, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 4.10.1956.

ШВАРЦ Франц Іванавіч, н. ў 1895, Чэхаславакія. Сталяр махорачнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 1.11.1938. Расстраляны 21.11.1938 у Мінску. Рэабілітаваны ў 1989 г.

ШВАРЦМАН Іосіф Іцкавіч, н. ў 1918, г. Цераспаль над Бугам, Польшча. Рабочы арцелі «Каапабутак», жыў у Віцебску. Асуджаны 16.7.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

ШВЕЦ Меер Беркавіч, н. ў 1907, м. Дамбровіцы, Польшча. Дырэктар Віцебскага тэатра, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 26.10.1959.

ШВІЛПО Дамінік Іосіфавіч, н. ў 1889, Ковенская губ. Слесар-каваль ФЗВ металістаў, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 25.5.1958.

ШКІНДЭР Дзмітрый Леанідавіч, н. ў 1879, в. Накоўнікі Дрысненскага павета. Цясляр дабрабыту, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.11.1938. Расстраляны 27.11.1938. Рэабілітаваны 25.5.1958.

ШКІРМАН Антон Іосіфавіч, н. ў 1892, в. Скотаўкі Люцынскага павета. Вартаўнік дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.10.1938 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 31.8.1941. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ШКЛЕННІК Адольф Фаміч, н. ў 1875, г. Дзвінск. Рахункавод аддзела кадраў ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.10.1931 да ссылкі на Урал тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ШКОЛДЗІН Фёдар Лукіч, н. ў 1870, Новасібірская вобл. Тэхнік-эксперт Наркамлегпрама, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 4.12.1957.

ШКОЛДЗІНА Ганна Стафанаўна (Станіславаўна), н. ў 1893, г. Дзвінск. Не працавала, жыла ў Віцебску. Асуджана 21.9.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 9.8.1958.

ШКОЛЬНІК Мордух Хаймавіч, н. ў 1901, Віцебск. Рабочы шчаціннага камбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.11.1936 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 11.10.1989.

ШКУБЕР Рудоль Якаўлевіч, н. ў 1886, г. Лібава. Механік завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.12.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.5.1976.

ШКУЛЬЦЕЦКІ Антон Іосіфавіч, н. ў 1909, в. Супорніцы Расонскага раёна. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.11.1970.

ШЛІНГЕР Вульф Мордухавіч, н. ў 1913, г. Блоні Варшаўскага ваяводства. Рабочы ігольнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.6.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

ШЛЯКАЎ Канстанцін Восіпавіч, н. ў 1912, г. Вятка. Кладаўшчык хлебапякарні, жыў у Віцебску. Асуджаны 2.9.1932 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1993.

ШЛЯХТАЎ Валяр'ян Уладзіміравіч, н. ў 1908, в. Кавалева Суражскага раёна. Сталяр сталовай № 3, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 28.8.1958.

ШЛЯХТО-БІТНАЯ Надзея Іванаўна, н. ў 1896, Віцебск. Машыністка фабрыкі «Дзвіна». Асуджана 11.2.1931. Расстраляна (дата не ўказана). Рэабілітавана 23.10.1989.

ШМІДРЭ Андрэй Пятровіч, н. ў 1882, Рыжскі павет. Муляр фанернага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.10.1959.

ШМІДТ Натан Міхайлавіч, н. ў 1898, г. Веліж Смаленскай вобл. Загадчык гаспадаркі сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 16.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ШМІДЭР (ШМІДРО, ШМІДРЭ) Іван Пятровіч, н. ў 1880, Ліфляндская губ. Муляр фанернага завода № 6, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 23.3.1962.

ШНАРКЕВІЧ Павел Аляксандравіч, н. ў 1891, в. Светніцы Полацкага раёна. Чорнарабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 13.9.1957.

ШНЕЙДЭР Эма Якаўлеўна, н. ў 1908, г. Мінск. Цырульнік цырульні № 7, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.11.1937. Расстраляна 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 13.10.1971.

ШНЕЙДЭР Якаў Абрамавіч, н. ў 1905, г. Вільна. Шкляр арцелі шкляроў, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

ШНЕУР Хаім Мееравіч, н. ў 1908, Віцебск. Інспектар Віцебскага халадзільніка, жыў у Віцебску.

Асуджаны 5.1.1942 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 22.6.1989.

ШНІТКО Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1884, в. Чэрніца Сіроцінскага раёна. Рахункавод таварыства слепых, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.9.1957.

ШОСТАК Антон Іванавіч, н. ў 1905, Віцебск. Тэхнік-будаўнік паравознага аддзялення ст. Віцебск. Асуджаны 9.10.1938. Расстраляны 21.10.1938. Рэабілітаваны 21.5.1959.

ШОСТАК Іван Пятровіч, н. ў 1867, м. Ветрына. Вартаўнік сельгасснаба, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.10.1938. Расстраляны 26.10.1938. Рэабілітаваны 21.5.1959.

ШОФМАН Ісаак Сіманавіч, н. ў 1903, г. Гарадок. Юрысконсульт фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 10.12.1949 да ссылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны 6.8.1955.

ШПАКОЎ Міхаіл Сіліч, н. ў 1889, в. Бялянкі Віцебскага павета. Слесар паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 18.12.1936 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 26.11.1958.

ШПАКОЎ Сцяпан Дзмітрыевіч, н. ў 1885, в. Цемешава Гарадоцкага раёна. Качагар макароннай фабрыкі імя 25-га кастрычніка, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.10.1959.

ШПАКОЎСКІ Іосіф Іосіфавіч, н. ў 1894, хут. Сухарукава Дрысненскага павета. Старшы бухгалтар рыбнага ўчастка, жыў у Віцебску. Асуджаны 3.11.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 18.2.1958.

ШПАКОЎСКІ Мікалай Паўлавіч, н. ў 1881, в. Навічкі Сенненскага раёна. Тэхнік склада ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.2.1938. Расстраляны 17.3.1938. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ШПІЦ Аўгуст Фрыдрыхавіч, н. ў 1894, г. Рыга. Машыніст КЭЧ, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 28.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.10.1965.

ШПОПС Іосіф Ігнацьевіч, н. ў 1901, в. Курцечы Дзвінскага павета. Рабочы завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.12.1969.

ШРЭДЭР Отта Вільгельмавіч, н. ў 1883, Віцебск. Загадчык страхавога аддзела канторы сувязі. Асуджаны 12.11.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 2.6.1958.

ШТОЛЬДЭ Аляксандр Аляксандравіч, н. ў 1896, г. Дрыса. Майстар цэха сударамонтных майстэрань, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.6.1959.

ШТЭЙН Зуся Рувімавіч, н. ў 1919, м. Сточыт Люблінскага павета. Рабочы фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыў у Віцебску. Асуджаны 25.6.1940 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1993.

ШТЭЙН Піня Мееравіч, н. ў 1900, г. Гродна. Экспедытар фабрыкі «Прафінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 26.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 7.9.1960.

ШУБІН Іван Філарэтавіч, н. ў 1881, в. Саранчы Віленскай губ. Дырэктар іпадрома, жыў у Віцебску. Удзельнік грамадзянскай вайны, камандаваў кавалерыйскім палком, быў узнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга і асабістай зброяй. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.9.1957.

ШУКАЙЛА Ціт Ермалаевіч, н. ў 1884, м. Чарэя Чашніцкага раёна. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 5.2.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 28.1.1957.

ШУКЕВІЧ Пётр Антонавіч, н. ў 1897, г. Дзвінск. Грузчык цагельнага завода № 32, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 5.11.1957.

ШУКЕВІЧ Цеафіл Іосіфавіч, н. ў 1905, г. Дзвінск. Шліфавальшчык акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.11.1937. Расстраляны 9.1.1938. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ШУКЕЛЬ Ігнацій Вікенцьевіч, н. ў 1887, в. Кершэва Дрысенскага раёна. Служачы рэлігійнага культа, жыў у Віцебску. Асуджаны 4.7.1931 да ВМП з наступнай заменай на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 14.8.1964.

ШУЛЬЖЫК Аляксандр Іванавіч, н. ў 1879, Брэст-Літоўскі павет. Планавік арцелі «Метал», жыў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 18.10.1937. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ШУЛЬЖЫК Аляксей Аляксандравіч, н. ў 1915, Гродзенская вобл. Шафёр «Саюзтранса», жыў у Віцебску. Асуджаны 3.1.1938. Расстраляны 28.1.1938. Рэабілітаваны 5.11.1957.

ШУЛЬКО Міхаіл Сцяпанавіч, н. ў 1883, Віцебск. Механік дражджавога завода. Асуджаны 25.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.2.1958.

ШУЛЬЦ Генрых Мартынавіч, н. ў 1877, г. Рыга. Токар завода па сплаву леса «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 5.9.1989.

ШУМСКІ Антон Мікалаевіч, н. ў 1873, в. Кандратовічы Лагойскага раёна. Вартаўнік будканторы гаражылсаюза, жыў у Віцебску. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.9.1959.

ШУПЕЙКА Канстанцін Васілевіч, н. ў 1896, в. Лазічына Дрысенскага раёна. Дэзінфектар дэгазацыйнага ўзвода, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 19.3.1959.

ШУСЦЕР Давід Іоселевіч, н. ў 1911, м. Эпсішкі Лідскага павета. Шорнік арцелі «Адраджэнне», жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.9.1959.

ШУЦЬКО Настасся Якаўлеўна, н. ў 1902, г. Полацк. Настаўніца 32-й НСШ, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.11.1937. Расстраляна 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 16.3.1959.

ШЧАРБАК Станіслаў Іванавіч, н. ў 1887, Гарадоцкі раён. Цясляр Віцебскага дэпо, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 21.11.1957.

ШЧАРБАКОЎ Іван Мікалаевіч, н. ў 1892, г. Георгіеўск, Паўночны Каўказ. Загадчык кааператыўнага магазіна, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ШЫБІНСКІ Генрых Іпалітавіч, н. ў 1892, в. Клімчыца Сядлецкай губ. Цырульнік ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 15.12.1956.

ШЫЙРОН Іван Іванавіч, н. ў 1894, хут. Бярэзіна Ліфляндскай губ. Рахункавод сярэдняй школы, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 9.5.1959.

ШЫКОЎКА (ШЫКОЎСКІ) Уладзімір Кузьміч, н. ў 1883, г. Барысаў. Рэвізор па сельгаспастаўках, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.2.1924 да 3 гадоў ППЛ. Па адбыцці пакарання высланы ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 23.7.1992.

ШЫКОЎСКАЯ Марыя Генрыхаўна, н. ў 1893, Віцебск. Хатняя гаспадыня. Асуджана 22.2.1924 да 2 гадоў ППЛ з заменай высылкай на Урал на 3 гады. Рэабілітавана 23.7.1992.

ШЫМАНОВІЧ Казімір Пятровіч, н. ў 1902, в. Альгова Віцебскага раёна. Бухгалтар арцелі, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ШЫМАНОВІЧ Пётр Казіміравіч, н. ў 1874, в. Качаны Панявежыскага павета. Не працаваў, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ШЫМАНСКАЯ Ядвіга Сямёнаўна, н. ў 1902, г. Нясвіж. Выхавальніца ў школе, жыла ў Віцебску. Асуджана 14.12.1937. Расстраляна 5.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 3.12.1957.

ШЫРМАХЕР Эдуард Генрыхавіч, н. ў 1896, Віцебск. Загадчык матэрыяльнага забеспячэння дыстанцыі пуці ст. Віцебск. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 5.11.1957.

ШЭЙНБЕРГ Ілья Ізраілевіч, н. ў 1893, г. Мітава, Латвія. Рабочы рамонтнай канторы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.8.1989.

ШЭЙНВАЛЬД Марыя Піменаўна, н. ў 1903, Віцебск. Санітарка бальніцы. Асуджана 12.4.1938. Расстраляна 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 8.8.1989.

ШЭКАЛА Аляксей Мікалаевіч, н. ў 1874, Люблянская вобл. Святар уваскрэснай царквы, жыў у Віцебску. Асуджаны 14.7.1932 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ШЭЛЕПЕНЬ Васіль Міхайлавіч, н. ў 1890, в. Клясціцы Расонскага раёна. Справавод 8-га палка, жыў у Віцебску. Асуджаны 19.11.1937. Расстраляны 29.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.2.1958.

ШЭНГАРД-ШЭЙНГАРД Гуго (Гюго) Карлавіч, н. ў 1874, Курляндская губ. Загадчык цэнтралізацыі ст. Віцебск, жыў пры ст. Віцебск. Асуджаны 16.9.1927 да пазбаўлення права пражывання ў пэўных населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 16.4.1992.

ШЭПЕЛЬ Пётр Елісеевіч, н. ў 1888, с. Вольнае Чарнігаўскай губ. Намеснік начальніка 6-га аддзялення Маскоўска-Беларуска-Балтыйскай чыгункі, жыў на ст. Віцебск. Асуджаны 25.11.1930 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.5.1990.

ШЭРШНЕЎ Ларыён Максімавіч, н. ў 1899, в. Усвіца Ушацкага раёна. Рабочы «Гужтранспарта», жыў у Віцебску. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 17.3.1940. Рэабілітаваны 1.4.1967.

ЭВАЛЬД Іван Казіміравіч, н. ў 1885, Ковенская губ. Слесар завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.11.1938 да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.9.1989.

ЭГЛІТ Альберт Францавіч, н. ў 1902, в. Бычкова Лёзненскага раёна. Грузчык Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 10.12.1937. Рэабілітаваны 8.10.1957.

ЭГЛІТ Аляксандр Карлавіч, н. ў 1895, в. Васюціна Лёзненскага раёна. Шафёр трамвайнага ўпраўлення, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ЭГЛІТ Аляксандр Паўлавіч, н. ў 1875, в. Болец Гарадоцкага раёна. Сарціроўшчык канторы «Заготлён», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ЭГЛІТ Генрых Францавіч, н. ў 1981, в. Бычкова Лёзненскага раёна. Рабочы піўзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 30.1.1938. Рэабілітаваны 18.9.1989.

ЭГЛІТ Канстанцін Карлавіч, н. ў 1899, в. Сташкава Аршанскага раёна. Слесар завода «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ЭГЛІТ Карл Аўгуставіч, н. ў 1894, хут. Летум Ліфляндскай губ. Майстар хлебакамбіната, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.4.1970.

ЭГЛІТ Марыя Карлаўна, н. ў 1905, в. Сташкова Смаленскай вобл. Вагонаважатая трамвайнага парка, жыла ў Віцебску. Асуджана 12.4.1938. Расстраляна 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 19.2.1959.

ЭГЛІТ Міна Мартынаўна, н. ў 1897, в. Бычкова Віцебскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ЭГЛІТ Уладзімір Якаўлевіч, н. ў 1895, в. Шульцава Віцебскага раёна. Шафёр чыгуначнай паліклінікі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.9.1957.

ЭЛІНСОН Ізраіль Львовіч, н. ў 1886, м. Забольнікі Ковенскай губ. Бухгалтар маслазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 18.7.1942. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ЭЛЬСТЭР Марыя Якаўлеўна, н. ў 1885, г. Рыга. Рабочая шчаціннай арцелі «Чырвоная Зорка», жыла ў Віцебску. Асуджана 10.1.1938. Расстраляна 28.1.1938. Рэабілітавана 2.10.1989.

ЭЛЬТЭРМАН Хрыстафор Іванавіч, н. ў 1898, Курляндская губ. Дырэктар мікрабіялагічнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ЭНТАЎ Цалко Самуйлавіч, н. ў 1901, Віцебск. ыёмшчык Белплодаагародніны. Асуджаны 11.1930 да ссылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. абілітаваны 24.11.1989.

ЭПШТЭЙН Цевель Вульфавіч, н. ў 1908, в. роўка Клічаўскага раёна. Загадчык магазіна 21, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.9.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.5.1992.

ЭРДМАН Антон Антонавіч, н. ў 1907, Віцебск. Авіятэхнік самалётнага цэха авіямайстэрань. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЭРДМАН Віталь Пятровіч, н. ў 1881, в. Пушчавыя Асвейскага раёна. Вартаўнік «Белкамунбуда», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 15.8.1959.

ЭРДМАН Мікалай Іванавіч, н. ў 1889, ст. Краслава, Латвія. Вагавы майстар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.3.1939 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 23.9.1939 (прыгавор адменены калегіяй Вярхоўнага суда СССР).

ЮБІЛЯР Срол Аронавіч, н. ў 1899, г. Сядлец, Польшча. Рабочы друкарні «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.1.1959.

ЮДЗЕЙКА Альфрэд Юрысавіч, н. ў 1882, Курляндская губ. Грузчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЮЗЭФОВІЧ Фелікс Восіпавіч, н. ў 1888, м. Нова-Аляксандраўск Ковенскай губ. Слесар акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 25.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 24.8.1989.

ЮІН-ЦЯН СІ (Уладзімір), н. ў 1898, г. Харбін, Кітай. Рабочы пральні, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.11.1959.

ЮНГЕЛЬСОН Геня Самуйлаўна, н. ў 1905, м. Глыбокае. Краўчыха фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыла ў Віцебску. Асуджана 26.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 21.9.1959.

ЮРГЕН Пётр Іванавіч, н. ў 1896, в. Матышава Лёзненскага раёна. Кацельшчык паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.9.1958.

ЮРГЕН Эдуард Давыдавіч, н. ў 1904, в. Матышава Лёзненскага раёна. Грузчык Прамгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 28.4.1938. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЮРПЛЕВІЧ Станіслаў Карлавіч, н. ў 1889, Віцебск. Рабочы завода «Чырвоны металіст». Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 15.12.1958.

ЮРКО Іван Піліпавіч, н. ў 1881, в. Шэймаціс Ковенскай губ. Вартаўнік ваенгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.9.1957.

ЮРЧАК Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1883, Холмская губ., Польшча. Рабочы па дагавору, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ЮРЧАНКА Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1897, Віцебск. Тэхнік па забеспячэнні склада НХЧ-2 ст. Віцебск. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 22.5.1938. Рэабілітаваны 30.12.1958.

ЮХНАВЕЦКІ Віктар Якаўлевіч, н. ў 1896, г. Беласток. Слесар фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.8.1957.

ЮШКЕВІЧ Вітольд Казіміравіч, н. ў 1886, в. Чайці Віленскай губ. Возчык канторы Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.9.1938. Расстраляны 13.10.1938. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЮШКЕВІЧ Іван Адамавіч, н. ў 1906, в. Рубеж Бярэзінскага раёна. Рабочы Белдзяржбуда, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 7.10.1964.

ЮШКЕВІЧ Іосіф Адамавіч, н. ў 1876, г. Полацк. Рабочы цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ЮШКЕВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1888, в. Баяры Віленскай губ. Памочнік начальніка ўчастка лесаразработак, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.1.1931 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 4.3.1961.

ЮШКОЎСКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. ў 1882, в. Стуграва Віцебскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.11.1937. Расстраляна 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 28.5.1957.

ЮШКОЎСКАЯ Марыя Нікіцічна, н. ў 1896, в. Украшча Магілёўскай губ. Табельшчыца школы швейнікаў № 1, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ. 23.7.1931 тэрмін пакарання зніжаны да 3 гадоў ППЛ з заменай высылкай у Казахстан на 3 гады. Рэабілітавана 14.8.1964.

ЮШКОЎСКІ Данат Іосіфавіч, н. ў 1902, в. Буева Віцебскага раёна. Качагар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937.

Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.10.1959.

ЮШЧАНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1908, Віцебск. Вугальшчык вугальнага склада ст. Віцебск. Асуджаны 26.5.1935 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.1.1994.

ЯВІЧ Макс Барысавіч, н. ў 1894, Віцебск. Цырульнік ст. Віцебск. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.4.1960.

ЯГОРАЎ Афанасій Пятровіч, н. ў 1900, в. Нікуліна Заходняй вобл. Начальнік паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.6.1937 да 8 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20.3.1940.

ЯГОРАЎ Фядот Карнеевіч, н. ў 1902, г. Коўна. Рабочы завода «Чырвоны Кастрычнік», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ЯЗЕЎ Цімафей Дзям'янавіч, н. ў 1905, в. Гняздзілава Бешанковіцкага раёна. Памочнік механіка рачнога флота, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ЯКАВІЦКІ Пётр Кузьміч, н. ў 1894, ст. Чудава Акцябрскай чыгункі. Галоўны бухгалтар участка сувязі № 6 ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 15.3.1941. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ЯКАЎЛЕВА Аляксандра Васілеўна, н. ў 1906, в. Міхайлаўка. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 3.10.1932 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 5.5.1993.

ЯКАЎЛЕВА-ШАХРАЙ Пелагея Сцяпанаўна (ЯКАЎЛЕВА-СВЯНЦІЦКАЯ Паліна Стафанаўна), н. ў 1909, м. Усвяты Пскоўскай вобл. Афіцыянтка сталовай маслазавода, жыла ў Віцебску. Асуджана 15.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 15.1.1963.

ЯКАЎЛЕЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1903, в. Міхайлаўка, Паволжа. Кладаўшчык хлебапякарні «Белпрамхлеб», жыў у Віцебску. Асуджаны 2.9.1932 да ВМП з заменай на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1993.

ЯКАЎЛЕЎ Сяргей Якаўлевіч, н. ў 1880, в. Барашкі Пскоўскай губ. Памочнік машыніста ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.12.1940.

ЯКУБОЎСКІ Андрэй Міхайлавіч (ён жа **ЯКУБЧЫК Сцяпан Цімафеевіч**), н. ў 1898, в. Алекшыцы Гродзенскай губ. Рабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.8.1958.

ЯКУТА Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1895, Віцебск. Касір рамонтнай канторы Гаржылсаюза. Асуджаны 6.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 11.3.1938. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ЯКУШАЎ Усцін Філімонавіч, н. ў 1883, в. Жалнерава Віцебскага раёна. Вартаўнік Гартопа, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 18.10.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ЯКУШАЎ Якаў Ліфанавіч, н. ў 1899, в. Мазурына Сіроцінскага раёна. Конюх Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1956.

ЯЛЕНСКІ Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1871, в. Скуратава Віцебскага раёна. Вартаўнік склада ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ЯЛЕНСКІ Аляксандр Фадзеевіч, н. ў 1902, г. Дзісна. Загадчык лабараторыі канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.9.1958.

ЯЛЕНСКІ Вікенцій Уладзіміравіч, н. ў 1885, Лёзненскі раён. Матарыст 2-га будаўнічага прарабскага ўчастка ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 1.9.1939. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЯЛЕНСКІ Норберт Іасафатавіч, н. ў 1885, в. Жыленшчыца Лёзненскага раёна. Рахункавод-касір аэраклуба, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЯЛЕНСКІ Пётр Пятровіч, н. ў 1896, Віцебскі раён. Кур'ер Віцебскага народнага суда, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 10.3.1958.

ЯЛЕНСКІ Уладзіслаў Рыгоравіч, н. ў 1878, в. Скуратава Віцебскага раёна. Швейцар вакзала ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ЯНІН Аўгуст Адамавіч, н. ў 1900, г. Дзвінск. Стругальшчык завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ЯНКЕВІЧ Пётр Сідаравіч, н. ў 1887, Віцебск. Машыніст дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 23.10.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЯНКІЛЕВІЧ Рахміэль Іосіфавіч, н. ў 1896, м. Слоніма, Польшча. Рахункавод канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 16.5.1990.

ЯНКОЎСКІ Іосіф Венядзіктавіч, н. ў 1894, в. Дамковічы Полацкага раёна. Рабочы саўгаса «Новы шлях», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ЯНСОН Алена Якаўлеўна, н. ў 1892, в. Мядзіна Віцебскага раёна. Санітарка ваеннага шпіталю, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.3.1938. Расстраляна 4.6.1938. Рэабілітавана 25.12.1959.

ЯНСОН Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1892, г. Тукумс, Латвія. Намеснік дырэктара кінатэатра «Спартак», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.7.1989.

ЯНУЛЕВІЧ Іосіф Пятровіч, н. ў 1887, в. Скрэўдзы Сувалкаўскай губ. Рабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да

ЭГЛІТ Міна Мартынаўна, н. ў 1897, в. Бычкова Віцебскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 13.1.1938. Расстраляна 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітавана 21.4.1958.

ЭГЛІТ Уладзімір Якаўлевіч, н. ў 1895, в. Шульцава Віцебскага раёна. Шафёр чыгуначнай паліклінікі ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 30.9.1957.

ЭЛІНСОН Ізраіль Львовіч, н. ў 1886, м. Забольнікі Ковенскай губ. Бухгалтар маслазавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 18.7.1942. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ЭЛЬСТЭР Марыя Якаўлеўна, н. ў 1885, г. Рыга. Рабочая шчацінай арцелі «Чырвоная Зорка», жыла ў Віцебску. Асуджана 10.1.1938. Расстраляна 28.1.1938. Рэабілітавана 2.10.1989.

ЭЛЬТЭРМАН Хрыстафор Іванавіч, н. ў 1898, Курляндская губ. Дырэктар мікрабіялагічнага інстытута, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 19.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 14.11.1957.

ЭНТАЎ Цалко Самуйлавіч, н. ў 1901, Віцебск. Прыёмшчык Белплодаагародніны. Асуджаны 25.11.1930 да ссылкі ў Сібір тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 24.11.1989.

ЭПШТЭЙН Цевель Вульфавіч, н. ў 1908, в. Дуброўка Клічаўскага раёна. Загадчык магазіна № 21, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.9.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 8.5.1992.

ЭРДМАН Антон Антонавіч, н. ў 1907, Віцебск. Авіятэхнік самалётнага цэха авіямайстэрань. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЭРДМАН Віталь Пятровіч, н. ў 1881, в. Пушчавыя Асвейскага раёна. Вартаўнік «Белкамунбуда», жыў у Віцебску. Асуджаны 17.8.1937. Расстраляны 25.8.1937. Рэабілітаваны 15.8.1959.

ЭРДМАН Мікалай Іванавіч, н. ў 1889, ст. Краслава, Латвія. Вагавы майстар ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.3.1939 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 23.9.1939 (прыгавор адменены калегіяй Вярхоўнага суда СССР).

ЮБІЛЯР Срол Аронавіч, н. ў 1899, г. Сядлец, Польшча. Рабочы друкарні «Камінтэрн», жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.1.1959.

ЮДЗЕЙКА Альфрэд Юрысавіч, н. ў 1882, Курляндская губ. Грузчык таварнага двара ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.10.1938. Расстраляны 31.10.1938. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЮЗЭФОВІЧ Фелікс Восіпавіч, н. ў 1888, м. Нова-Аляксандраўск Ковенскай губ. Слесар акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 21.1.1938. Расстраляны 25.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 24.8.1989.

ЮІН-ЦЯН СІ (Уладзімір), н. ў 1898, г. Харбін, Кітай. Рабочы пральні, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.5.1938. Расстраляны 13.7.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.11.1959.

ЮНГЕЛЬСОН Геня Самуйлаўна, н. ў 1905, м. Глыбокае. Краўчыха фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», жыла ў Віцебску. Асуджана 26.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 21.9.1959.

ЮРГЕН Пётр Іванавіч, н. ў 1896, в. Матышава Лёзненскага раёна. Кацельшчык паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.9.1958.

ЮРГЕН Эдуард Давыдавіч, н. ў 1904, в. Матышава Лёзненскага раёна. Грузчык Прамгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.3.1938. Расстраляны 28.4.1938. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЮРПЛЕВІЧ Станіслаў Карлавіч, н. ў 1889, Віцебск. Рабочы завода «Чырвоны металіст». Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 15.12.1958.

ЮРКО Іван Піліпавіч, н. ў 1881, в. Шэймаціс Ковенскай губ. Вартаўнік ваенгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.9.1957.

ЮРЧАК Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1883, Холмская губ., Польшча. Рабочы па дагавору, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 15.6.1989.

ЮРЧАНКА Дзмітрый Іванавіч, н. ў 1897, Віцебск. Тэхнік па забеспячэнні склада НХЧ-2 ст. Віцебск. Асуджаны 16.4.1938. Расстраляны 22.5.1938. Рэабілітаваны 30.12.1958.

ЮХНАВЕЦКІ Віктар Якаўлевіч, н. ў 1896, г. Беласток. Слесар фабрыкі «КІМ», жыў у Віцебску. Асуджаны 29.3.1938. Расстраляны 4.6.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 20.8.1957.

ЮШКЕВІЧ Вітольд Казіміравіч, н. ў 1886, в. Чайці Віленскай губ. Возчык канторы Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.9.1938. Расстраляны 13.10.1938. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЮШКЕВІЧ Іван Адамавіч, н. ў 1906, в. Рубеж Бярэзінскага раёна. Рабочы Белдзяржбуда, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.1.1938. Расстраляны 8.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны 7.10.1964.

ЮШКЕВІЧ Іосіф Адамавіч, н. ў 1876, г. Полацк. Рабочы цагельнага завода, жыў у Віцебску. Асуджаны 8.1.1938. Расстраляны 30.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 1.11.1957.

ЮШКЕВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1888, в. Баяры Віленскай губ. Памочнік начальніка ўчастка лесаразработак, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.1.1931 да ссылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 4.3.1961.

ЮШКОЎСКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. ў 1882, в. Стуграва Віцебскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.11.1937. Расстраляна 31.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 28.5.1957.

ЮШКОЎСКАЯ Марыя Нікіцічна, н. ў 1896, в. Украішча Магілёўскай губ. Табельшчыца школы швейнікаў № 1, жыла ў Віцебску. Асуджана 4.7.1931 да 5 гадоў ППЛ. 23.7.1931 тэрмін пакарання зніжаны да 3 гадоў ППЛ з заменай высылкай у Казахстан на 3 гады. Рэабілітавана 14.8.1964.

ЮШКОЎСКІ Данат Іосіфавіч, н. ў 1902, в. Буева Віцебскага раёна. Качагар фабрыкі імя К.Цэткін, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937.

Расстраляны 3.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 30.10.1959.

ЮШЧАНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. ў 1908, Віцебск. Вугальшчык вугальнага склада ст. Віцебск. Асуджаны 26.5.1935 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 21.1.1994.

ЯВІЧ Макс Барысавіч, н. ў 1894, Віцебск. Цырульнік ст. Віцебск. Асуджаны 29.10.1937. Расстраляны 1.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 4.4.1960.

ЯГОРАЎ Афанасій Пятровіч, н. ў 1900, в. Нікуліна Заходняй вобл. Начальнік паравознага дэпо ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.6.1937 да 8 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны 20.3.1940.

ЯГОРАЎ Фядот Карнеевіч, н. ў 1902, г. Коўна. Рабочы завода «Чырвоны Кастрычнік», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.5.1933 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

ЯЗЕЎ Цімафей Дзям'янавіч, н. ў 1905, в. Гняздзілава Бешанковіцкага раёна. Памочнік механіка рачнога флота, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.8.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 17.11.1956.

ЯКАВІЦКІ Пётр Кузьміч, н. ў 1894, ст. Чудава Акцябрскай чыгункі. Галоўны бухгалтар участка сувязі № 6 ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.12.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 15.3.1941. Рэабілітаваны 20.10.1989.

ЯКАЎЛЕВА Аляксандра Васілеўна, н. ў 1906, в. Міхайлаўка. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 3.10.1932 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 5.5.1993.

ЯКАЎЛЕВА-ШАХРАЙ Пелагея Сцяпанаўна (ЯКАЎЛЕВА-СВЯНЦІЦКАЯ Паліна Стафанаўна), н. ў 1909, м. Усвяты Пскоўскай вобл. Афіцыянтка сталовай маслазавода, жыла ў Віцебску. Асуджана 15.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 15.1.1963.

ЯКАЎЛЕЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1903, в. Міхайлаўка, Паволжа. Кладаўшчык хлебапякарні «Белпрамхлеб», жыў у Віцебску. Асуджаны 2.9.1932 да ВМП з заменай на 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1993.

ЯКАЎЛЕЎ Сяргей Якаўлевіч, н. ў 1880, в. Барашкі Пскоўскай губ. Памочнік машыніста ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 6.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 30.12.1940.

ЯКУБОЎСКІ Андрэй Міхайлавіч (ён жа **ЯКУБЧЫК Сцяпан Цімафеевіч**), н. ў 1898, в. Алекшыцы Гродзенскай губ. Рабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.8.1958.

ЯКУТА Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1895, Віцебск. Касір рамонтнай канторы Гаражсаюза. Асуджаны 6.10.1937 да 10 гадоў ППЛ. Памёр у зняволенні 11.3.1938. Рэабілітаваны 29.10.1957.

ЯКУШАЎ Усцін Філімонавіч, н. ў 1883, в. Жалнерава Віцебскага раёна. Вартаўнік Гартопа, жыў у Віцебску. Асуджаны 25.9.1937. Расстраляны 18.10.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 15.9.1956.

ЯКУШАЎ Якаў Ліфанавіч, н. ў 1899, в. Мазурына Сіроцінскага раёна. Конюх Белхарчгандлю, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 29.9.1956.

ЯЛЕНСКІ Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1871, в. Скуратава Віцебскага раёна. Вартаўнік склада ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 6.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 16.3.1959.

ЯЛЕНСКІ Аляксандр Фадзеевіч, н. ў 1902, г. Дзісна. Загадчык лабараторыі канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 11.9.1958.

ЯЛЕНСКІ Вікенцій Уладзіміравіч, н. ў 1885, Лёзненскі раён. Матарыст 2-га будаўнічага прарабскага ўчастка ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938. Расстраляны 1.9.1939. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЯЛЕНСКІ Норберт Іасафатавіч, н. ў 1885, в. Жыленшчыца Лёзненскага раёна. Рахункавод-касір аэраклуба, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.11.1937. Расстраляны 3.12.1937. Рэабілітаваны 13.8.1957.

ЯЛЕНСКІ Пётр Пятровіч, н. ў 1896, Віцебскі раён. Кур'ер Віцебскага народнага суда, жыў у Віцебску. Асуджаны 26.2.1938. Расстраляны 21.3.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 10.3.1958.

ЯЛЕНСКІ Уладзіслаў Рыгоравіч, н. ў 1878, в. Скуратава Віцебскага раёна. Швейцар вакзала ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.10.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 4.5.1957.

ЯНІН Аўгуст Адамавіч, н. ў 1900, г. Дзвінск Стругальшчык завода імя Кірава, жыў у Віцебску Асуджаны 13.1.1938. Расстраляны 26.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.4.1958.

ЯНКЕВІЧ Пётр Сідаравіч, н. ў 1887, Віцебск Машыніст дэпо ст. Віцебск. Асуджаны 23.10.1931 да пазбаўлення права пражывання ў 12 населеных пунктах тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны 20.11.1989.

ЯНКІЛЕВІЧ Рахміэль Іосіфавіч, н. ў 1896, м. Слоніма, Польшча. Рахункавод канторы «Заготзбожжа», жыў у Віцебску. Асуджаны 22.9.1938. Расстраляны 3.10.1938. Рэабілітаваны 16.5.1990.

ЯНКОЎСКІ Іосіф Венядзіктавіч, н. ў 1894, в. Дамковічы Полацкага раёна. Рабочы саўгаса «Новы шлях», жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ЯНСОН Алена Якаўлеўна, н. ў 1892, в. Мядзіна Віцебскага раёна. Санітарка ваеннага шпіталю, жыла ў Віцебску. Асуджана 29.3.1938. Расстраляна 4.6.1938. Рэабілітавана 25.12.1959.

ЯНСОН Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1892, г. Тукумс, Латвія. Намеснік дырэктара кінатэатра «Спартак», жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 28.7.1989.

ЯНУЛЕВІЧ Іосіф Пятровіч, н. ў 1887, в. Скрэўдзы Сувалкаўскай губ. Рабочы акулярнай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937 да

ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 1.10.1957.

ЯНУШАЎ Андрэй Ануфрыевіч, н. ў 1901, в. Лысая Полацкага раёна. Дыспетчар лесапункта «Чэпіна», жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.9.1960.

ЯНУШКЕВІЧ Мечыслаў Іосіфавіч, н. ў 1882, в. Жукі Дзісненскага раёна. Рабочы Жакта № 7, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937. Расстраляны 22.8.1937. Рэабілітаваны 27.3.1959.

ЯНУШКЕВІЧ Міхаіл Іосіфавіч, н. ў 1899, в. Курвічы Ветрынскага раёна. Рабочы, жыў у Віцебску. Асуджаны 9.8.1937. Расстраляны 22.8.1937. Рэабілітаваны 27.3.1959.

ЯНУШКЕВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. ў 1874, в. Лісіцына Магілёўскай вобл. Вартаўнік ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.10.1937. Расстраляны 4.11.1937. Рэабілітаваны 28.11.1957.

ЯНУШКОЎСКІ Мікалай Антонавіч, н. ў 1890, в. Наварошша Лёзненскага раёна. Супрацоўнік Віцебскага зямельнага аддзела, жыў у Віцебску. Асуджаны 13.11.1937. Расстраляны 18.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 18.3.1958.

ЯНУШКОЎСКІ Фадзей Іванавіч, н. ў 1877, в. Красікі Руднянскага раёна. Качагар вагонарамонтнага пункта ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 26.5.1958.

ЯНУШЭЎСКІ Уладзіслаў Іосіфавіч, н. ў 1889, в. Лапушына Келецкай губ. Рабочы ст. Віцебск, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.5.1938 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 16.10.1989.

ЯРАШЭВІЧ Яфім Міхайлавіч, н. ў 1895, в. Сліва Слуцкага раёна. Рабочы, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.10.1937. Расстраляны 15.10.1937. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЯРМАК Баляслаў Рыгоравіч, н. ў 1898, в. Баркуйцы, Латвія. Загадчык магазіна № 101, жыў у Віцебску. Асуджаны 12.4.1938. Расстраляны 30.4.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 21.3.1960.

ЯРШОЎ Віналій Яфімавіч (Якімавіч), н. ў 1899, в. Кузьмянцы Пскоўскай вобл. Слесар завода імя Кірава, жыў у Віцебску. Асуджаны 23.8.1937 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.7.1959.

ЯСІНСКАЯ Леанарда Францаўна, н. ў 1904, в. Калодзікава Барысаўскага раёна. Хатняя гаспадыня, жыла ў Віцебску. Асуджана 28.11.1937. Расстраляна 10.12.1937 у Віцебску. Рэабілітавана 13.9.1957.

ЯСІНСКАЯ Юлія Пятроўна, н. ў 1912, в. Любавір Буда-Кашалёўскага раёна. Лабарантка ветэрынарнай станцыі, жыла ў Віцебску. Асуджана 15.11.1937 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 22.12.1989.

ЯСІНСКІ Браніслаў Антонавіч, н. ў 1893, Віленская губ. Майстар цэха мэблевай фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 20.11.1937. Расстраляны 7.12.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 25.2.1958.

ЯСІНСКІ Цэзар Антонавіч, н. ў 1905, в. Макушова Віленскай губ. Вартаўнік Гартопа, жыў у Віцебску. Асуджаны 22.10.1937. Расстраляны 4.11.1937 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.4.1958.

ЯСОЦКІ Вячаслаў Адамавіч, н. ў 1909, в. Амбросавічы Сіроцінскага раёна. Шліфоўшчык люстраной фабрыкі, жыў у Віцебску. Асуджаны 30.9.1938. Расстраляны (дата не ўказана). Рэабілітаваны 17.7.1956.

ЯСТРАБАЎ Андрэй Пратасавіч, н. ў 1875, в. Ястрабы Віцебскага раёна. Вартаўнік дзіцячага сада № 21, жыў у Віцебску. Асуджаны 17.9.1937 да ВМП. Звестак аб пакаранні няма. Рэабілітаваны 9.9.1993.

ЯСЬКО Аляксандр Рыгоравіч, н. ў 1900, в. Міханавічы Мазырскага раёна. Загадчык аддзела культуры Віцебскага гаркома КП(б)Б, жыў у Віцебску. Асуджаны 27.9.1938. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны 16.7.1963.

ЯУНЗЕН Мартын Якаўлевіч, н. ў 1859, Курляндская губ. Пенсіянер, жыў у Віцебску. Асуджаны 16.6.1930 да 5 гадоў ППЛ з заменай высылкай ў Сібір. Рэабілітаваны 5.10.1989.

ЯЎСЕЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч, н. ў 1906, в. Прудок Багушэўскага раёна. Памочнік машыніста ваеннага гарадка, жыў у Віцебску. Асуджаны 10.1.1938. Расстраляны 28.1.1938 у Віцебску. Рэабілітаваны 8.10.1965.

ЯЎСЕЕЎ Цімафей Яўсеевіч, н. ў 1869, в. Драпіцы Віцебскага раёна. Аднаасобнік, жыў у Віцебску. Асуджаны 7.9.1937. Рэабілітаваны 31.10.1989.

ЯФІМАЎ Іван Яфімавіч, н. ў 1903, в. Мышкі Сіроцінскага раёна. Рабочы плодавінзавода, жыў у Віцебску. Асуджаны 15.3.1938 да 3 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.9.1969.

ЯФРЭМАЎ Васіль Патапавіч, н. ў 1918, в. Забор'е Гарадоцкага раёна. Слесар 10-й дыстанцыі пуці Заходняй чыгункі, жыў у Віцебску. Асуджаны 28.9.1945 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 17.2.1954.

ЯФРЭМЕНКА Пётр Іванавіч, н. ў 1904, в. Будзілава Віцебскага раёна. Дзесятнік будаўнічай групы ТН-6, жыў у Віцебску. Асуджаны 11.12.1941 да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 3.6.1960.

ЯХНІНА (КАНТАРОВІЧ) Ганна Барысаўна, н. ў 1876, Віцебск. Інспектар губернскага савета прафсаюзаў. Асуджана 18.11.1922 да ссылкі ў Арэнбургскую губерню на 2 гады. Рэабілітавана 9.9.1993.

ЯЧЭЙКА Эмілія Восіпаўна, н. ў 1886, в. Сункава Дзвінскага павета. Вартаўнік вакзала ст. Віцебск, жыла ў Віцебску. Асуджана 15.6.1938 да 10 гадоў ППЛ. 13.12.1947 тэрмін пакарання зніжаны да фактычна адбытага тэрміну. Рэабілітавана 30.10.1989.

ЯШЧАНКА Вольга Міхайлаўна, н. ў 1918, Віцебск. Загадчыца буфета сталовай № 19. Асуджана 30.6.1945 да 10 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 18.6.1966.

Пакалечанае жыццё

Іван Сцяпанавіч Гаўрыльчык да 1937 г., увайшоўшага ў гісторыю як «год вялікага тэрору», працаваў сакратаром партыйнага камітэта Віцебскага шчаціннага камбіната. Ён сардэчна верыў у палітыку партыі, сумленна служыў свайму народу. Але за гэта яго зрабілі «ворагам народа», а дакладней — шпіёнам польскай разведкі. Прыгавор быў суровы — вышэйшая мера пакарання.

З успамінаў Валянціны Іванаўны Багдзя, дачкі І.С.Гаўрыльчыка: «У пачатку 30-х мы жылі ўтраіх — тата, мама і я. У нас была свая хата, сад, агарод, у гаспадарцы трымалі нейкую жыўнасць. Мы жылі нябедна і радаваліся жыццю... І вось наступіў 1937 год. У канцы лета хворая мама ляжала ў бальніцы, а праз тыдзень, 24 жніўня, арыштавалі бацьку. Памятаю, прыйшлі да нас у хату двое мужчын — чужых і хмурных, якія паводзілі сябе, як гаспадары. Перарылі ў хаце ўсё, але нічога не знайшлі. Ды і што яны шукалі, нам не сказалі. Напаследак забралі на 3 тыс. руб. аблігацый, усе фатаграфіі, а бацьку не дазволілі нават з намі развітацца. Я толькі паспела сабраць яму невялічкі хатулёк (тыя людзі сказалі, што ён паедзе ў камандзіроўку). Пазней маме па знаёмству ўдалося перадаць яму валёнкі і іншыя цёплыя рэчы. Больш мы свайго бацьку не бачылі». У засценках НКУС Віцебска Івана Сцяпанавіча трымалі амаль да новага года. І вось аднойчы Пелагея Іванаўна, яго жонка, кіпяціла малако, калі зайшла іх суседка і сказала, што бачыла, як па гораду кудысьці вялі Івана Гаўрыльчыка. Пелагея Іванаўна так расхвалявалася, што ў яе з рук выпала каструля з гарачым малаком і абварыла дачцэ ногі. Паўгода Валянціна знаходзілася ў бальніцы, за гэты час яе маці атрымала з НКУС паведамленне, што І.С.Гаўрыльчык асуджаны на 10 гадоў без права перапіскі.

Так яны засталіся ўдваіх, Пелагея Іванаўна і дачка-школьніца Валянціна, сам-насам з усімі сваімі праблемамі. Пра іх забыліся нават некалі блізкія знаёмыя, добрыя сябры. Гэта пазней Валянціна Іванаўна зразумела, што ў той час небяспечна было падтрымліваць добрыя адносіны з сям'ёй «ворага народа», як і тое, што калі ў іх хату паштальён прынёс звестку аб асуджэнні бацькі, Івана Сцяпанавіча ўжо не было ў жывых.

На гэтым пакуты двух мужных жанчын Гаўрыльчык не скончыліся. Пачалася вайна. Фабрыку «Сцяг індустрыялізацыі», дзе Пелагея Іванаўна працавала швачкай, эвакуіравалі. З фабрыкай выязджалі і рабочыя, але Пелагею Іванаўну, як жонку «ворага народа», не ўзялі. Тады яны самі паспрабавалі пакінуць горад, але ў раёне Журжава сустрэлі немцаў. А калі вярнуліся да роднай хаты, то ў ёй засталі чужых людзей. «Калі вы не пакінеце гэты дом, мы скажам немцам пра вашу камуністычную сям'ю, пра тое, кім працаваў ваш бацька», — заявілі ім няпрошаныя госці. І Пелагеі Іванаўне з дачкой прыйшлося пакорліва пагадзіцца з яшчэ адным ударам лёсу.

Жылі дзе прыйдзецца: і ў падвалах, і ў кінутых чужых хатах, і пад чыстым небам. Пелагея Іванаўна згаджалася на любую працу, абы зарабіць нейкі кавалак хлеба і не памерці з голаду. Крыху пазней зарабляць грошы на жыццё ёй пачала дапамагаць дачка. Справа ў тым, што Валянціна, нягледзячы на малы ўзрост, вельмі добра вышывала. Вышыўкі з відамі Віцебска яна насіла да нямецкага шпіталя і там прадавала ад'язджаючым на адпачынак у Германію немцам. Маленькая дзяўчынка спадабалася аднаму нямецкаму афіцэру, звалі яго Хуберт, родам ён быў са Штутгарта, і ён стаў дапамагаць ім прадуктамі.

А потым наступіла доўгачаканае вызваленне. Пелагея Іванаўна з дачкой вярнуліся ў свой дом, але ён згарэў падчас баёў за горад. Брыгадай, у склад якой ўваходзілі толькі жанчыны і дзеці, за тры месяцы адбудавалі новы свой вугал. А неўзабаве Пелагеі Іванаўне пашанцавала: яна ўладкавалася на работу ў папраўча-працоўную калонію. Але радасць была нядоўгай. Не прайшло і паўгода, як яе зволілі з работы. Начальнік калоніі выклікаў яе да сябе і сказаў, што яна добрая работніца, але, як высветлілася, жонка «ворага народа» і таму працаваць у ППК ёй нельга.

Доўга яшчэ П.І.Гаўрыльчык і яе дачка заставаліся сям'ёй «ворага народа». Уладкавацца на работу ні было якіх шанцаў, а калі і траплялася што-небудзь, тады адміністрацыя хутка знаходзіла прычыну для звальнення.

У 1953 г. Пелагея Іванаўна з дачкой напісалі пісьмо ў ЦК КПСС, каб вярнуць чэснае імя іх мужа і бацькі. Адказ прыйшлося чакаць 5 гадоў. Толькі ў лютым 1959 г. яны атрымалі наступную даведку:

СПРАВКА

Дело по обвинению Гаврильчика Ивана Степановича, 1905 года рождения, до ареста — 24 августа 1937 г. работал секретарем парткома Витебского щетинного комбината, пересмотрено Военным Трибуналом Белорусского военного округа 9 января 1959 г.

Постановление от 28 октября 1937 г. в отношении Гаврильчика Ивана Степановича отменено, и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

Гаврильчик Иван Степанович реабилитирован посмертно.

Заместитель председателя Военного Трибунала Белорусского военного округа полковник юстиции (Коробский).

А яшчэ праз 30 гадоў, Валянціна Іванаўна (на той час Пелагея Іванаўна ўжо памерла) атрымала ліст з Віцебскага абкома партыі за подпісам 2-га сакратара Я.Радзецкага. У ім было напісана, што «Бюро Витебского обкома Компартии Белоруссии 19 января 1989 г. рассмотрело материалы персонального дела Вашего отца Гаврильчика Ивана Степановича. Учитывая необоснованность обвинений, предъявленных ему при исключении из партии в 1937 г., его полную реабилитацию в судебном порядке, он восстановлен в КПСС (посмертно)».

...Праўда ўзяла верх больш чым праз паўстагоддзя. Але за гэта сям'я Гаўрыльчык заплаціла дарагой цаной. *А.І.Мацяюн.*

Прызнаць ворагам народа...

ГЕБГАРДТ Лионель Иванович родился в 1894 г. в г. Либаве, где он окончил гимназию. До ареста работал инспектором на железной дороге в Витебске, был арестован органами НКВД в 1937 г., расстрелян 17.3.1938 г. и посмертно реабилитирован в 1989 г.

Его жена Александра Андреевна Гебгардт-Федорова родилась в 1898 г. в г. Сандомир, окончила гимназию в г. Порхов, после ареста мужа и до начала войны работала бухгалтером на одном из витебских текстильных предприятий.

Из воспоминаний Александры Андреевны

Ноябрь 1937 года. Ноябрь в советском областном городе. В один из вечеров этого ноября я сидела с моим мальчиком в ложе нашего городского театра. Мой восьмилетний мальчик наблюдает, как наша Олечка — моя десятилетняя дочь, стоит на сцене с группой таких же девочек и мальчиков и повторяет за своим вожатым слова торжественной клятвы пионеров. «К борьбе за дело пролетарской революции всегда готов», — звучит хор восторженных детских голосов. И моя душа полна гордости за дочь, которая с сегодняшнего дня пионерка, член нашего социалистического общества, носит красный галстук, как и ее подружки. Как прекрасна может быть жизнь в такой стране, как наша! А на улице жуткая снежная метель, снег бьет в лицо, но мы его не замечаем, мы бежим домой, все трое радостно возбуждены. Наша Олечка стала пионеркой, через 2 года и Гоша будет пионером. Мы сейчас все это расскажем нашему папе, все подробно о празднике в театре, о том, как украшена была сцена, как все было торжественно и красиво.

Он, конечно, тоже будет очень радоваться такому событию в жизни нашей Олечки. Раздеваемся в прихожей, бабушка слушает наши рассказы с каким-то непривычным выражением лица, которое заставляет меня замолчать. Она незаметно для детей делает мне знак головой в сторону кухни. Иду за ней: вскоре после того, как мы ушли в театр, пришли двое военных. Поверхностно просмотрели бумаги в ящиках письменного стола и на столе, заглянули в буфет, в комод, спросили, есть ли в доме оружие, нашли папку с моей корреспонденцией и бегло просмотрели ее, потом предложили моему мужу взять с собой немно-

го белья, мыло, полотенце, одеться и идти с ними. На вопрос, почему и отчего, они только пожимали плечами.

Мой муж попрощался с моей мамой, просил ее передать нам, чтобы мы не беспокоились, это все недоразумение, он же ни в чем не виноват, все разъяснится и самое большое через несколько дней он, конечно, вернется домой.

Я не помню больше, что эта была за ночь, и день после этой ночи, и еще много-много дней и ночей в нашей жизни. Я перебывала во многих учреждениях, пыталась спросить, разъяснить, узнать что-нибудь. Писала и в область, и в Москву, стучала в закрытые двери, задавала вопросы, на которые никогда не пришло ответа. Только те, кто пережил те страшные дни в Советской России, могут понять ту страшную темноту, которая опустилась над страной в те дни. Примерно 14—15 млн. людей были арестованы, высланы куда-то, где нет возможности жить, или просто уничтожены каким-нибудь другим путем. Я работала в то время в одном большом государственном банке, работала уже много лет на довольно ответственной должности. Через 2 дня после ареста моего мужа мне принесли бумажку со штемпелем и печатью, подписанную начальником нашего отделения, где меня ставили в известность, что я с завтрашнего дня уволена, так как в банке не должны работать родственники репрессированных. Я получу аттестат, и завтра же мне будет выплачен месячный оклад компенсации. На другой день, когда я пришла получить мои деньги и аттестат, этого начальника уже в банке не было, в предыдущую ночь он был тоже арестован и тоже исчез навсегда в той же неизвестной дали, где исчез и мой муж.

Через несколько недель после его ареста я стояла во дворе городской тюрьмы. Это было 15 декабря 1937 года. Одна моя знакомая чередовалась со мной в эти дни и ночи. Когда она шла домой спать, в очереди стояла я, когда она приходила в очередь, я тащилась домой переспать три-четыре часа и немного отогреться. В очереди во дворе тюрьмы стояло около тысячи человек, а за сутки могли быть проверены и передать передачу примерно 100 человек. В передаче допускалась теплая одежда, белье, немого сухарей, кусочек сала. Мороз все время был 20—25 градусов, и все стоящие в очереди были так закутаны, что походили не на людей, а на бесформенных существ. У всех была одна только мысль — достигнуть цели, отдать передачу. Мы не замечали ни мороза, ни свинцовой усталости во всем теле, ни голода, ни душевной боли. Передо мной, закутанная в какие-то бесконечные одежи, стояла маленькая девочка лет девяти, худенькая, прозрачно-бледная, с огромными серыми глазами. Она была благодарна, если ей удавалось опереться на кого-нибудь из взрослых, она отдыхала в эту минуту, и ей было не так холодно.

Она стояла обычно 5—6 часов кряду, и ее сменял брат, мальчик лет двенадцати, такой же бледный и худенький, как и она. Отец и мать этих двух детей — оба были в тюрьме. Дети не имели никаких родственников, жили впроголодь, но раздобыли где-то буханку хлеба и уже третьи сутки стояли в очереди во дворе городской тюрьмы, чтобы передать этот хлеб родителям. Знает ли кто-нибудь, как длинна морозная зимняя ночь на тюремном дворе? Знает ли кто-нибудь, какие думы рождаются в человеческой измученной, изодранной душе в такую ночь?

Эти дети возле тюрьмы, эти старухи с отчаянием в потускневших глазах, эти искалеченные человеческие жизни — кому это было нужно?

Через три дня и три ночи мне удалось добраться до решетчатого окна тюремной конторы. На переданную в окно карточку с именем моего мужа поставили штемпель — «выбыл из тюрьмы».

Из воспоминаний Георгия Гебгардта, сына Л.И.Гебгардта

...Примерно через 4 месяца после ареста моего отца, которые мне показались годом, нас, а именно маму, сестричку и меня, провели в большую комнату, похожую на зал. Диван, несколько стульев и маленький столик. Со стенки смотрит зоркими глазами дорогой Иосиф Виссарионович Сталин. Через большие окна без решеток видны старые дубы, кивающие от ветра ветками. Это здание НКВД, мимо которого я раньше много раз проходил, не боясь его, принадлежало когда-то зловещему буржую, а теперь служит доброй цели.

Красивый охранник очень вежливо предложил нам присесть.

Вошел следователь, товарищ Кузнецов, довольный, сытый. Мама с ним уже была знакома по предыдущим вызовам на допросы. Он вежливо кивнул нам головой, почти торжественно объявил маме, что свидание будет

продолжаться ровно час, и ушел через боковую дверь, через которую сразу же вошел наш отец.

Стройный, подтянутый, на брюках стрелка. Он прижал нас всех вместе к себе. Только сегодня, много-много лет спустя я могу себе представить его чувства, догадаться, что происходило тогда в душе этого дорогого мне человека. Отец с матерью и сестричка, прижавшись к отцу, сели на диван, а я, мужчина, — напротив них на стул. Разговор шел быстро, беззаботно, как будто мы, как и раньше, сидим, например, на вокзале в ожидании поезда, который отвезет нас на целый день за город.

Красивый охранник, стоя около входной двери, выходящей в сад, скучая, смотрел в окно, иногда поглядывая на нас.

Нет, это не так, как раньше. Волосы у отца светлые стали. Светлые? Да это же седина! Глубокие морщины перебороздили его лицо. А его раньше голубые глаза были «разведены водой», как я развожу голубую акварельную краску, когда рисую море.

И, глядя на дорогих мне людей, сидя напротив них на стуле, я слушал, как мама то очень тихим, то совершенно нормальным голосом рассказывала, что дедушка очень болен и не встает уже несколько месяцев с постели, а только спит и спит, и что тут надо ожидать самого худшего, что она перешла на другую, еще лучшую работу (отец, конечно, понял, что значит «лучшая работа»), и что бабушка тоже просит его быть очень осторожным и не лезть на рожон, если его куда-нибудь сошлют, и что Бобика, нашего собаку, воры отравили и через несколько дней после этого пробовали к нам залезть, но мы вовремя это услышали, и что у нас теперь новые соседи. Мы отдали им нашу третью комнату и живем теперь только в двух...

Конечно, она не сообщила ему, что регулярно приходят письма с приказанием освободить всю квартиру. И сейчас, когда я слышал беспечный голос мамы, у меня, считавшего себя давно взрослым, потекли слезы, и мне было очень стыдно.

Я ведь уже очень давно не плакал. Почему это именно сейчас я распустил нюни? Наверное, мне стало всех так жалко или я был тронут такой несправедливостью, что моего невинного отца арестовали, маму уволили с хорошей работы, одну комнату отобрали, а теперь выгоняют из всей квартиры. И, посмотрев на портрет Иосифа Виссарионовича Сталина, я сожалел, что он о несправедливости к нам не знает. Ах если б он, добрый отец народов, это узнал! Он бы сразу возмутился, сразу же дал бы приказ моментально отпустить папу, отдать нам нашу третью комнату назад и еще, узнав, что воры отравили Бобика, сразу же дал бы приказ моментально разыскать этих воров...

Слезы моего гнева катились, и у меня не было силы их остановить. «Мой маленький мальчик, — это мама заметила мои слезы. — Перестань же, дорогой. Все будет хорошо!»

И много раз в моей жизни, в разных ситуациях, я повторял это мамино простое: «Все будет хорошо!»

Разговоры бежали и бежали, и вдруг красивый охранник объявил, что свидание кончилось. И все кончилось очень быстро. Отец поднял меня высоко-высоко, как обычно поднимал меня, приходя с работы, поцеловал нас всех и хотел проводить нас к выходной двери, но тут красивый охранник преградил ему дорогу, он просто встал перед папой. Тогда папа еще раз крепко и долго поцеловал маму. И это все. Открывая дверь, мама еще раз помахала папе. Бедная, она тогда еще не знала, что она уже вдова.

Никогда не забыть мне взгляда моего отца, когда обернулся я к нему, выходя из зала.

* * *

6 июня 1995 г. Георгий Гебгардт обратился в соответствующие органы Республики Беларусь с просьбой дать разъяснение по поводу реабилитации своего отца, Гебгардта Лионеля Ивановича. Вот ответ на его запрос:

«...Гебгардт Лионель Иванович был арестован 5 ноября 1937 года по обвинению в контрреволюционной деятельности и шпионаже в пользу Латвии.

Постановлением Комиссии НКВД СССР и Прокурора СССР от 4 февраля 1938 года приговорен к расстрелу. Приговор приведен в исполнение 17 марта 1938 года.

На основании Указа Президиума Верховного Совета СССР от 16 января 1989 года Гебгардт Лионель Иванович реабилитирован Прокуратурой Белорусского военного округа 16 октября 1989 года».

Из воспоминаний Г.Л.Гебгардта

Так значит его расстреляли 17 марта.

Как же его во время следствия мучили, избивали... чтобы он «во всем» признался? Как в него стреляли — в сердце, в голову? Где его

убили, в лесу, в овраге?.. Где зарыли его труп?...

17 марта 1938 года — это был четверг, в этот день я был, безусловно, в школе; меня, быть может, вызвали к доске; на большой перемене, быть может, мы играли в снежки; после обеда, сделав домашнее задание, я, быть может, был на катке...; а вечером я уснул с надеждой, как и каждый вечер в те дни, что отца скоро отпустят.

«Это очень просто! — хочется воскликнуть мне. — Арестовать, добиться «признания», расстрелять..., а затем, «очень просто», осчастливить и мертвых, и живых, и самих себя — реабилитировать!»

«Вот как все просто делается!» — хочется воскликнуть мне, но я не кричу, я тихо расскажу моим сыновьям об их дедушке...

* * *

Георгий Гебгардт родился в 1928 г. в Витебске, где окончил 6 классов средней школы.

В 1943 г. его семья оказалась в Германии. Там он окончил текстильный и машиностроительный институты в Раутлингене и Штутгарте.

В 1956 г. он был направлен швейцарской консультантской фирмой в Египет, а затем в Турцию.

В 1961 г. стал директором крупного бельгийского машиностроительного предприятия, а в 1972 г. — пайщиком и главой филиала этой фирмы в Дюссельдорфе (ФРГ).

Па матэрыялах кнігі «Записки сына врага народа» (Москва, 1996 г.) падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

Дакументы сведчаць

СПЕЦЗВОДКА АБ УСКРЫТЫХ ДЗІЦЯЧЫХ ПАДПОЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ АНТЫСАВЕЦКАГА НАПРАМКУ З НАВУЧЭНЦАЎ МАСАВЫХ ШКОЛ г. ВІЦЕБСКА (на 4 лютага 1934 г.)

Устаноўлена, што сярод вучняў масавых школ Віцебска існуюць дзве нелегальна-падпольныя дзіцячыя арганізацыі антысавецкага напрамку, з якіх адна называлася «Махно», а другая «8-ы полк 27-й Омскай дывізіі».

Па няпоўных звестках у арганізацыю «Махно» ўваходзіць 21 чалавек.

Арганізацыяй «Махно» кіруе штаб (указваюцца тры прозвішчы), акрамя таго ёсць яшчэ камандзіры, прозвішчы якіх пакуль не ўстаноўлены. Камандзірам можа быць толькі той, які атрымаў ордэн. Ордэн атрымлівае той, хто праявіў сябе ў час бойкі (паспяховы ўдар каменем, цаглінай, нажом), зрабіў крадзеж і г.д.

У арганізацыі «81-ы полк 27-й Омскай дывізіі» таксама ёсць штаб (указваюцца прозвішчы начальніка штаба, яго памочніка і начальніка пушкі). Чыны ў арганізацыі ўстаноўлены такія: генерал, афіцэр, унтэр-афіцэр, фельдфебель. Усе члены арганізацыі абавязаны аддаваць чэсць камандзіру. Быў устаноўлены пароль «Варашылаў».

Сход адбываўся па выхадных днях у камандзіра ў альтанцы. Там віселі загады, расклад, калі збірацца, парадак дзяжурстваў і г.д. «81-ы полк 27-й Омскай дывізіі» мае чырвоны сцяг з надпісам «Энскі полк». Удзельнікі арганізацыі павінны захоўваць канспірацыю...

Арганізацыя «Махно» ставіла перад сабой задачы арганізаванага хуліганства, крадзяжоў, зладзействаў і г.д.

Арганізацыя «Махно» збіраецца ў папоўскім двары каля 5-й школы. На сходзе абмяркоўваюць, як нападаць на іншых рабят, як красці на рынку, хто лепш — Ленін, Сталін ці Троцкі. Камандзір і іншыя рабяты гаварылі, што пры Троцкім было б лепш. Сталін усё дрэнна робіць, стварае калгасы, а іх не трэба ствараць, таму трэба біць чырвоных, бо яны за Сталіна.

Удзельнікі «81-га палка 27-й Омскай дывізіі» збіраліся ў камандзіра ў двары ў альтанцы і ў Косці пад мянушкай «Кот» на Пакроўскай, 9.

У альтанцы, дзе адбываўся сход, былі партрэты Варашылава, Будзённага, Сталіна і Леніна. Рабяты мелі сваю бібліятэку з сабраных і часткова купленых кніг. Напрыклад, «Сака і Ванцэці», «Мурзілка» і інш.

У час сходу абмяркоўвалі пытанні, як нападаць на іншых рабят, вучыліся страляць, займаліся маршыроўкай, вучыліся хадзіць у процівагазах, будавалі будкі, размяркоўвалі крадзенае, збіралі грошы на пакупку запалак (серу выкарыстоўвалі для стральбы), праводзілі зборы на набыццё аптэчкі і г.д.

Удзельнікі арганізацыі «Махно» ўзброены. Адзін з камандзіраў мае пісталет, кінжал і фінку. Усе астатнія маюць фінкі, востра заточаныя жазлекі і ножыкі. У Косці быў рэвальвер «Кольт».

На рынку пад кіраўніцтвам галоўнага члена арганізацыі крадуць бульбу, масла, грошы і рэчы. Грошы дзеляць па прынцыпу: хто больш крадзе, той больш атрымлівае...

Галоўны збіраў ва ўдзельнікаў арганізацыі грошы, каб пабудаваць такую ж царкву, якую пабудаваў Махно на Украіне.

Захопленых у палон рабят удзельнікі арганізацыі б'юць і мучаюць. З аднаго хлопчыка летам 1933 года знялі штаны і білі крапівой. У галоўнага ёсць аптэчка, марля і бінты.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 102, воп. 1, спр. 282, л. 82—86.

З ЗАПІСКІ САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

У маі 1935 года ўскрыта і ліквідавана антысавецкая групоўка студэнтаў Віцебскага ветзаінстытута. Па справе арыштавана 8 студэнтаў трэцяга курса ветфака. Сярод іх сын былога ўпраўляючага маёнткам, два сыны абкладзенага цвёрдым заданнем, сын медфельчара, а астатнія, з іх слоў, з'яўляюцца выхадцамі з сялян-сераднякоў.

З васьмі арыштаваных 6 чалавек раней былі членамі ВЛКСМ, з якога былі выключаны па розных прычынах: за правы ўхіл, лятунства, адмову ад вучобы, антысавецкія праяўленні і нежаданне ўдзельнічаць у рабоце камсамола.

Следствам устаноўлены шэраг фактаў арганізаваных гэтымі асобамі антысавецкіх выступленняў. У дзень Кастрычніцкага свята 1934 года студэнт (сын былога ўпраўляючага маёнткам) арганізаваў нявыхад на дэманстрацыю жыльцоў аднаго пакоя інтэрната інстытута. Сярод студэнтаў членамі антысавецкай групоўкі сістэматычна праводзілася антыкалгасная агітацыя, ідэалізаваліся Троцкі, Зіноўеў, Каменеў і выказваўся недавер генеральнай лініі партыі, яе правадырам і Савецкай уладзе...

Устаноўлены з іх боку факты нецэнзурнай лаянкі ў адносінах т. Калініна і іншых правадыроў, а таксама антысеміцкія і тэрарыстычныя выказванні ў адносінах да т. Кагановіча.

Паказанні дапытаных па справе сведкаў амаль поўнасцю пацвярджаюцца прызнаннямі саміх абвінавачваемых.

Адзін з камандзіраў заявіў, што ён будзе страляць у свайго настаўніка за тое, што ён выгнаў яго з класа...

Папярэднія даныя сведчаць аб тым, што названыя дзіцячыя арганізацыі антысавецкага напрамку з'яўляюцца вынікам слабай палітыкі выхаваўчай работы з дзецьмі ў школе і асабліва па-за школай, з боку настаўніцтва, школьных камсамольскіх і піянерскіх арганізацый, неадпаведнасці форм і метадаў гэтай работы з дзецьмі. Таму дзеці паддаюцца ўплыву вуліч-нага разбэшчанага элемента.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 102, воп. 1, спр. 377, л. 243—246.

ДАВЕДКА АБ УЛІКУ БЫЛЫХ ЧЛЕНАЎ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАРТЫЙ
(на 27 ліпеня 1936 г.)

Троцкісты. «Чырвоны металіст» — 7 чалавек, «Прафінтэрн» — 3, друкарня «Камінтэрн» — 3, «Сцяг індустрыялізацыі» — 12, цагельны завод № 2 — 1, шчацінная арцель — 6, розныя прадпрыемствы — 9. Усяго 41 чалавек.

Эсэры. Белгандаль — 2 чалавекі, шчоткамбінат — 1, у розных установах — 3, урачы — 1, фабрыка імя Лекерта — 1, маслазавод — 1, аптэкаўпраўленне — 1, настаўнікі горада — 2, Белпедтэхнікум — 1, пенсіянеры — 2, настаўнікі сельскія — 1, «Сцяг індустрыялізацыі» — 1. Усяго 17 чалавек.

Бундаўцы. Дрожджавы завод — 1 чалавек, служачыя розных устаноў — 2, шчоткамбінат — 2, Белгандаль — 1. Усяго 6 чалавек.

Сіяністы. «Сцяг індустрыялізацыі» — 1 чалавек, служачыя ў розных установах — 4, урачы — 2, хатнія гаспадыні — 1, інвалідныя арцелі — 2, яўрэйскі педтэхнікум — 1, чыгунка — 1. Усяго 12 чалавек.

Нацдэмы. Настаўнікі гарадскія — 2, кінатэхнікум — 3, палітэхнікум — 1, настаўнікі сельскія — 3, у розных установах — 3, мастацкі тэхнікум — 3, пединстытут — 2, яўрэйскі педтэхнікум — 1, Белпедтэхнікум — 3, фінтэхнікум — 1, веттэхнікум — 1, педрабфак — 1, НХУ — 2. Усяго 26 чалавек.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 102, воп. 1, спр. 541, л. 171—172.

Дакументы падрыхтаваў да друку М.У.Пішчулёнак.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Баі за Віцебск у 1941 г.

З першых гадзін фашысцкага нашэсця, стрымліваючы ворага, савецкія войскі неслі вялікія страты. Агнявы вал вайны няўмольна каціўся на ўсход. 25 чэрвеня 1941 г. Стаўка Галоўнага Камандавання прыняла рашэнне стварыць у тыле Заходняга фронту абарончы рубеж на лініі: сярэдняе цячэнне р. Заходняя Дзвіна — Віцебск — р. Дняпро да Крамянчуга і сканцэнтраваць на гэтым рубяжы групу армій Рэзерву Галоўнага Камандавання на чале з Маршалам Савецкага Саюза С.М.Будзённым. Перад арміямі была пастаўлена задача да зыходу 28 чэрвеня заняць і ўтрымліваць абарону на лініі Краслава — Дзісна — Полацк — Віцебск — Орша.

Аднак прынятае рашэнне запазнілася. Да моманту атрымання дырэктывы нямецкія танкавыя злучэнні групы армій «Цэнтр» прасунуліся ў глыб савецкай тэрыторыі да 200 км.

Ацаніўшы ўсю трагічнасць становішча, Вярхоўнае Галоўнае Камандаванне прыняло тэрміновае рашэнне аб умацаванні Заходняга фронту 5 арміямі — 16-й, 19-й, 20-й, 21-й і 22-й, якімі камандавалі генералы М.Ф.Лукін, І.С.Конеў, П.А.Курачкін, М.Р.Яфрэмаў, П.А.Ершакоў. Арміі налічвалі 37 дывізій. Яны прыбылі з унутраных акруг і сканцэнтраваліся на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна і Дняпро і павінны былі стварыць трывалую абарону, стабілізаваць становішча. Адначасова была ўзмоцнена авіяцыя.

22-я армія генерала П.А.Ершакова рыхтавалася да абароны на ўчастку ад Ідрыцы да Дрысы і далей па Заходняй Дзвіне да Віцебска. У яе тыле сканцэнтравалася 19-я армія пад камандаваннем генерала І.С.Конева. Ад Віцебска да Оршы ў міжрэччы Заходняй Дзвіны і Дняпра займала абарону 20-я армія генерала П.А.Курачкіна. Падрыхтоўка да абароны на рубяжы рэк Заходняя Дзвіна Дняпро вялася ў складаных умовах. Многія злучэнні і часці 19-й, 20-й, 21-й армій (13 дывізій) знаходзіліся на падыходзе да фронту. Да моманту выхаду нямецка-фашысцкіх войск да Заходняй Дзвіны прыбыўшыя сюды з рэзерву арміі не паспелі сканцэнтравацца, стварыць абарончыя пазіцыі, разгарнуць войскі ў неабходны баявы парадак, наладзіць кіраванне. У першых эшалонах армій знаходзіліся 24 дывізіі. Салдаты спешна капалі акопы, стваралі драцяныя загароды. Абарона рыхтавалася ў шырокіх палосах: ад 35 да 70 км на дывізію. Выяўлялася слабая матэрыяльная і тэхнічная забяспечанасць войск. Часці і злучэнні былі дрэнна ўкамплектаваны асабістым складам і тэхнікай. У дывізіях першых эшалонаў арміі налічвалася толькі 145 танкаў. Фронт меў толькі 380 гармат і мінамётаў і 501 самалёт, з якіх спраўнымі былі толькі 389 (ЦАМАРФ, ф. 208 воп. 256210, спр.1, л. 17).

Спяшалася і вярхоўнае камандаванне Германіі, якое хацела скарыстаць спрыяльную сітуацыю, што склалася на заходнім стратэгічным напрамку, і паскорыць наступленне на Маскву. Яно патрабавала ад групы армій «Цэнтр» фарсіраваным маршам прадоўжыць наступленне, акружыць, рассячы і знішчыць

савецкія войскі, якія абараняліся на рэках Заходняя Дзвіна і Дняпро, авалодаць рубяжом Орша – Смаленск – Віцебск і адкрыць шлях на Маскву.

На шляху ворага быў Віцебск... У пачатку ліпеня разгарэліся ўпартыя баі на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. Па загадзе камандуючага 4-й танкавай арміяй немцаў фельдмаршала фон Г. Клюге 3-я танкавая група наносіла ўдар па Віцебску з задачай прарваць абарону савецкіх войск на Заходняй Дзвіне, авалодаць Віцебскам, пасля чаго наступаць на поўнач і на захад ад Смаленска на Ярцава. Нешматлікія разрозненыя злучэнні Заходняга фронту не маглі процістаяць масіраваным ударам танкавых груп праціўніка і вымушаны былі з цяжкімі баямі адыходзіць на ўсход. Разам з тым, яны выкарыстоўвалі любую магчымасць, каб на выгадных рубяжах абароны затрымаць ворага, замарудзіць тэмпы яго наступлення, нанесці яму максімальныя страты.

4 ліпеня Ваенны савет Заходняга фронту паставіў перад войскамі задачу: абараняць лінію Полацкага ўмацаванага раёна, рубеж ракі Заходняя Дзвіна – Сянно – Орша і далей па рацэ Дняпро, не дапусціць прарыву немцаў на поўнач і ўсход. Пры гэтым 22-я армія павінна была ўпарта абараняць Полацкі УР і рубеж па рацэ Заходняя Дзвіна да Бешанковічаў уключна, не дапусціўшы выхаду праціўніка на правы бераг Заходняй Дзвіны (ЦАМАРФ, ф. 208, воп. 2513, спр. 72, л. 396 – 399).

10 ліпеня для паляпшэння кіраўніцтва ваеннымі дзеяннямі Дзяржаўны камітэт абароны СССР стварыў 3 галоўныя напрамкі (паўночна-заходні, заходні і паўднёва-заходні), якія сталі прамежкавымі органамі кіравання паміж ВГК і франтамі. Галоўнакамандуючым заходнім напрамкам быў прызначаны Маршал Савецкага Саюза С.К.Цімашэнка. Аналізуючы становішча, якое склалася на той момант, 10 ліпеня маршал Цімашэнка ў загадзе пісаў: «Праціўнік, сканцэнтраваўшы 8-ы і 39-ы матарызаваныя карпусы на Віцебскім напрамку і 90-ы матарызаваны корпус на Магілёўскім напрамку, фарсіраваў рэкі Заходняя Дзвіна і Дняпро і развівае наступленне на Веліж і Горкі. Задача Заходняга фронту – сумеснымі дзеяннямі 22-й, 19-й і 20-й армій ва ўзаемадзеянні з авіяцый знішчыць праціўніка, які прарваўся, і замацавацца на фронце Ідрыца – Полацкі УР – ст. Княжыца – Орша і далей па рацэ Дняпро (ЦАМАРФ, ф. 208, воп. 2511, спр. 20, л. 232 – 233).

Баявыя дзеянні супраць варожага наступлення на Віцебскім напрамку вялі злучэнні 22-й, 20-й і 19-й армій. Праціўнік меў значную перавагу ў сіле. Напрыклад, ад Себежскага ўмацаванага раёна да Віцебска на ўчастку больш за 200 км супраць 6 дывізій 22-й арміі наступала 16 нямецкіх дывізій. Непасрэдна для абароны Віцебска была выдзелена 153-я стралковая дывізія (камандзір М.А.Гаген). Адначасова ў горадзе былі сфарміраваны 3 батальёны народнага апалчэння, якімі камандавалі І.П.Клёнаў, А.А.Манахаў, Б.К.Сямёнаў. Абарончыя баі пад Віцебскам працягваліся з 5 па 11 ліпеня. Гітлераўскія войскі пры актыўнай падтрымцы авіяцыі 2 дні атакавалі пазіцыі 153-й стралковай дывізіі на рубяжы Гняздзілавічы – Ліпна – Машканы – Аляксандрава, але поспеху не дамагліся. Савецкія воіны актыўнымі абарончымі дзеяннямі, рашучымі контратакамі вымотвалі ворага, наносілі яму значны ўрон у жывой сіле і тэхніцы. І ў далейшым вораг неаднаразова спрабаваў прарваць абарону, але кожны раз адкідваўся на зыходныя пазіцыі, несучы вялікія страты.

Каля месяца 153-я стралковая дывізія вяла баі на палях Віцебшчыны ва ўмовах поўнага акружэння. Яна скоўвала значныя сілы ворага, які рваўся да Масквы. За час дзеянняў пад Віцебскам дывізія разграміла да 2 пяхотных дывізій праціўніка, падбіла і спаліла да 200 танкаў, знішчыла 5 складаў з боепрыпасамі і другой ваеннай маёмасцю.

Апошні цяжкі бой на Віцебшчыне дывізія вяла ў час выхаду з акружэння. Гітлераўцы ўсяляк стараліся не дапусціць прарыву дывізіі да галоўных сіл Чырвонай Арміі. Але дружнай атакай і смелым манеўрам кальцо фашыстаў у раёне Дабрамысля было перарвана, і дывізія пайшла на ўсход па тылах ворага, сеючы паніку і наносячы яму страты. Стойкасць і мужнасць воінаў 153-й стралковай дывізіі ў баях на тэрыторыі Віцебскай вобласці былі высока ацэнены дзяржавай. У ліку першых чатырох злучэнняў яна 18.9.1941 г. была перайменавана ў 3-ю гвардзейскую дывізію.

Для таго, каб аслабіць націск ворага на Віцебск, камандуючы Заходнім фронтам загадаў войскам 20-й арміі генерала П.А.Курачкіна нанесці контрудар з раёна на поўнач і захад ад Оршы ў фланг наступаючай 3-й танкавай групы гітлераўцаў. Галоўная роля ў

выкананні гэтай задачы адводзілася 7-му і 5-му механізаваным карпусам (камандзіры генералы В.І.Вінаградаў, І.П.Аляксеенка), якія мелі каля 1000 танкаў, хаця і ўстарэўшых узораў. Раніцай 6 ліпеня механізаваныя карпусы неспадзявана для гітлераўцаў перайшлі ў наступленне на Сянно—Лепель. Разгарнулася адна з буйнейшых танкавых бітваў пачатковага перыяду вайны, у якой з абодвух бакоў прымалі ўдзел не менш за 1,5 тыс. танкаў. У ходзе 5-дзённых баёў механізаваныя карпусы спынілі наступленне ворага. Прайшоўшы 30—40 км наперад, яны выйшлі да Сянна, разгромілі 2 нямецкія матарызаваныя палкі, нанеслі вялікі ўрон войскам праціўніка. Сустрэўшы ўпартае супраціўленне падышоўшага сюды 47-га нямецкага матарызаванага палка і выкінутага ў раён Сянно буйнога паветранага дэсанта, 5-ы і 7-ы карпусы 9 ліпеня вымушаны былі прыпыніць далейшае наступленне. Камандзір 18-й нямецкай танкавай дывізіі генерал Нерынг пра баі пад Лепелем пісаў: «Страты амуніцыі, зброі і машын незвычайна вялікія... Гэта становішча нецярпімае, інакш мы наперамагаемся да ўласнай пагібелі» (Краснознаменный Белорусский военный округ. М., 1983. С. 117).

6—9 ліпеня немцы сканцэнтравалі галоўныя сілы на паўночным і паўночна-заходнім напрамках з тым, каб акружыць Віцебск. Камандуючы фронтам маршал Цімашэнка ў дырэктыве ад 9 ліпеня ўказваў: «Знішчэнне праціўніка, які прарваўся ў раён Сіроціна—Віцебск, ускладваю на камандуючага 19-й арміяй генерала І.С.Конева. Для гэтай мэты яму падпарадкоўваю 186-ю і 128-ю стралковыя дывізіі і дазваляю выкарыстанне 220-й мотастралковай і 5-й танкавай дывізій, а ў раёне Віцебска і 390-га гаўбічнага артылерыйскага палка. Задача: ва ўзаемадзеянні з часцямі 22-й і 20-й армій 10 ліпеня знішчыць праціўніка, які прарваўся ў раёне Сіроціна—Бешанковічы—Віцебск, і аднавіць становішча, трывала заняўшы ўсходні бераг р. Заходняя Дзвіна» (ЦАМАРФ, ф. 208, воп. 2511, спр. 20, л. 190).

Завязаліся баі за горад. Воіны 220-й мотастралковай дывізіі 19-й арміі сумесна з апалчэнцамі 10 ліпеня двойчы выбівалі гітлераўцаў з усходняй часткі Віцебска, 6 разоў у рукапашных сутычках адбівалі варожыя атакі. Аднак, валодаючы большай перавагай у сіле і сродках, нямецка-фашысцкія войскі 11 ліпеня захапілі горад. *М.Ф.Крывёнак*

Дакументы сведчаць

ВАЙСКОВЫЯ ЧАСЦІ І ЎСТАНОВЫ, ЯКІЯ РАЗМЯШЧАЛІСЯ Ў ВІЦЕБСКУ (НА 15.5.1941)

Управление 21-го стрелкового корпуса с корпусными частями.
Взвод управления начальника артиллерии 21-го стр. корпуса.
56-й корпусной артполк 21-го стр. корпуса.
264-й отдельный батальон связи 21-го стр. корпуса.
288-й отдельный саперный батальон 21-го стр. корпуса.
Корпусной полевой госпиталь 21-го стр. корпуса.
Корпусной ветлазарет.
Военный трибунал.
Военная прокуратура 21-го стр. корпуса.
Управление 37-й стр. дивизии.
Штабная батарея начальника артиллерии 37-й стр. дивизии.
245-й гаубичный артполк 37-й стр. дивизии.
20-й стр. полк 37-й стр. дивизии.
91-й стр. полк 37-й стр. дивизии.
83-й отдельный батальон связи 37-й стр. дивизии.
68-й отдельный развед. батальон.
385-й зенитно-артиллерийский дивизион 37-й стр. дивизии.
13-й взвод дегазации местности 37-й стр. дивизии.
74-й отдельный автотранспортный батальон 37-й сд.
Отдельная рота регулирования.
58-й саперный батальон 37-й стр. дивизии.
92-й отдельный ПАХ 37-й стр. дивизии.

39-й медсанбат 37-й стр. дивизии.
144-й ДАРМ 37-й стр. дивизии.
Военная прокуратура 37-й стр. дивизии.
Управление бригады района противовоздушной обороны.
737-й полк противовоздушной обороны.
8-й батальон ВНОС.
Склад горючего № 503.
Продсклад № 194.
Витебский госпиталь № 430.
Витебские облвоенкомат, горвоенкомат, райвоенкомат.
5-й железнодорожный полк.
Управление 12-й авиадивизии.
6-й СБ авиаполк.
43-й СБ авиаполк.
Гарнизонный узел связи № 41.
69-я зенитная батарея ПВО 20-го района.
Управление 60-й авиабазы 20-го района.
160-я рота связи управления авиабазы.
258-й батальон аэродромного обслуживания 20-го района.
259-й батальон аэродромного обслуживания 20-го района.
15-я дивизионная школа младших авиационных специалистов.
173-я аэродромно-техническая рота.

Архіў Віцебскага гарваенкамата.

АПЕРАТЫЎНЫЯ ЗВОДКІ 153-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

Оперативная сводка № 53

КП дивизии – учхоз Лужесно, 1.7.41 г. 10.00

1. 153-я стрелковая дивизия заняла полосу обороны:

а) 1-й стр. батальон 453-го стр. полка резерв командира дивизии лес 8 ост. Броды (2415), 2 сб с одной батареей па, одной батареей ПТО занял район обороны м. Улла (2442) с задачей оборонять мост и не допускать переправы противника через р. Западная Двина, 3-й стр. батальон с одной батареей ПТО занял район обороны пос. Стрелка (0557) с задачей оборонять северный берег р. Зап. Двина и не допустить переправы противника.

б) 666-й стр. полк с 581-м гаубичным арт. полком одной батареей 565-го легкого артполка, одной батареей 150 од ПТО занял участок обороны (иск.) Рябиновка (1718): свх Парижская коммуна (1719), (иск.). Детская коммуна, ж.д. линия в Смоленске, не допустить подхода противника со стороны Орши и овладеть переправой через р. Западная Двина.

в) 505-й стр. полк с 565-м легким артполком без одной батареи занял участок обороны, (иск.) ж.д. линии в Смоленск, Драники (1722), отдельные дома по шоссе в Смоленск (1924), отдельные дома по шоссе (2224), южный берег р. Витьба до истока в Западную Двину с задачей не допустить подхода противника со стороны Смоленска и овладения г. Витебск.

2. Оставшиеся части Витебского гарнизона:

а) 20-й стр. полк (один батальон) занял район обороны Боровка (4679), Малое Карпино (4890) з задачей не допустить подхода противника с запада и овладение шоссе и железной дорогой.

б) 91-й стр. полк, 264-й отдельный батальон связи заняли район обороны Городок (5189), Войховские (5385), Бол. Прудок (8755), Васильево (9152) с задачей не допустить противника с запада, овладение г. Городок и ж.д. станцией.

в) 281-й саперный батальон обороняет район Томаши (3010).

г) Артиллерия оставшегося гарнизона поддерживает огнем части дивизии и составляет резерв командира дивизии.

Командир 153-й стрелковой дивизии
полковник Гаген.
Начальник штаба подполковник Черепанов.

Оперативная сводка № 6

КП дивизии, Тарелки, 1.7.41 г. 20.00

1. Противник ожидается с юга-западного направления.

2. Дивизия перешла на новый рубеж обороны Гнездиловичи, Еромки, ст. Крынки, Мазурово с задачей прикрыть г. Витебск, не допустить прорыва танков противника, отделить пехоту от танков и уничтожить ее. Начались оборонительные работы.

Оперативная сводка № 8

КП дивизии, Тарелки, 2.7.41 г. 7.00

1. Сведений о противнике нет.
2. Положение частей прежнее, роем окопы.
3. Установлена связь с 73-й стрелковой дивизией, соседом слева, которая занимает рубеж обороны фронтом на запад.
4. В 6.30 пролетело 4 бомбардировщика противника в северо-восточном направлении.
5. Потерь и трофеев нет.

Оперативная сводка № 9

КП дивизии, Тарелки, 2.7.41 г. 16.00

1. Сведений о противнике нет.
2. Положение частей, занявших рубеж обороны, прежнее.
3. в/ч 4629 занимает участок обороны Липно (иск.), Ерошки, Гнездиловичи.

а) 1-й сб занимает район обороны Гнездиловичи (иск.), Новоселки, Бордаши.

б) 2-й сб занял район обороны Новоселки, Ерошки, Черепки, 2-й стр. батальон д. Дубровка.

в) 3-й сб 1-й сд сосредоточен в районе Качино.

г) КП войсковой части 4629 Обухово.

4. В/ч 4650 заняла участок обороны:

а) 1-й сб занимает район обороны (иск.) Ерошки, (иск.), Овчинники, Замосточье.

б) 2-й сб занимает район обороны Овчинники (иск.) Косачи.

в) 3-й сб занимает район обороны (иск.) ст. Замосточье, высота 157, Запруды.

Боевой приказ № 4

КП дивизии, Тарелки, 3.7.41 г.

1. Частям дивизии продолжать укреплять и оборонять полосу Гнездиловичи – Липно Александрово – Мазурово. Передний край полосы дивизии находится вдоль железной дороги на участке Жестянка – Комарово.

2. Справа 180-й сд обороняется по северному берегу р. Западная Двина, граница с ней: Гнездиловичи (иск.), Бешенковичи, слева занимает оборону 289-я сд – граница с ней: Александрово, Головичи.

3. 666-й сп с 665-м лап с 2-мя санротами 208-й осб оборонить участок Гнездиловичи – Липно – Черепки с передним краем на линии Гнездиловичи и далее по восточному берегу оз. Сарро (иск.), Парнево.

Боевое охранение на линии: Карповичи – Перекопово.

Граница слева: (иск.) Парнево – оз. Жеринское.

4. 235-й сп с 293-м пап оборонять участок Парнево (иск.), Леонтово.

Граница слева (иск.) Леонтово, Сенно.

5. 505-й сп с 581-й гап (без 2 дивизион.) с 2 ротами 211-й осв оборонять участок Леонтово – Александровка – ст. Замосточье.

Боевое охранение на линии Сталбки – Платаны.

6. 435-му сп расположиться во 2-м эшелоне в районе Мазурово – Лядищи. Подготовить оборонительный район и контратаки в направлениях: Гнездиловичи, Леонтово, Александрово.

7. 150-му оад ПТО расположиться в районе Тарелки – Антусы – Гряда. Быть готовым к действиям в направлениях Гнездиловичи – Леонтово – Александрово.

8. РБ расположиться в районе Тарелки в готовности к действиям совместно с противотанковым резервом. Разведку вести в направлениях Лепель – Борисов.

9. Прикрыть расположение ударной группы дивизии, район артиллерийских позиций и КП дивизий: в районе Вороны – Федоровка.

10. Медсанбат расположится в лесу юго-восточнее Комли. Подготовить его в противотанковом отношении. Быть готовым к отражению танков, пехоты и парашютистов противника, использовать ручные гранаты и горючее.

11. 2-у эшелону находиться в районе лагерей Витебска.

Оперативная сводка № 15

КП дивизии, лес северо-восточнее 1,5 км Тарелки, 4.7.41 г. 22.00

Наши передовые отряды, усиленные батальонами, находятся: 666-й сп – Верховье и 505-й сп – Сенно.

Оперативная сводка № 22

КП дивизии, лес 1,5 км северо-восточнее Тарелки 7.7.41 г. 2.00

1. Противник в течение последних 2 дней проявил активность на участке 666-го стрелкового полка. Все наступательные попытки, предпринимаемые, по-видимому, с разведывательной целью в районе Гнездиловичи, отражены, и дивизия прочно удерживает занимаемый ею фронт.

2. За истекшие сутки противник потерял: 5 танков, 1 бронемашину, 4 мотоцикла, пушку, 2 ручных пулемета, минометную батарею, 6 противотанковых орудий и большое количество боеприпасов.

3. Сбито ружейно-пулеметным огнем 4 самолета противника.

4. При отходе 505-го стрелкового полка противником выведены из строя одна батарея гап и одно орудие. Убито и ранено 10 человек.

Начальник штаба 153-й стрелковой дивизии подполковник Черепанов.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 376, воп. 10103, спр. № 9.

АПЕРАТЫЎНЫЯ ЗВОДКІ ШТАБА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ

Командующим 19-й, 20-й, 22-й армий.

Директива № 18.

Штаб Западного фронта.

Смоленск, 9.7.41, карта 500

Первое. Противник в ночь на 9.7.41 прорвался танковыми частями (до 100—150 танков) и мотопехотой через фронт 186-й сд в районе Бешенковичи и развивает наступление в направлении Сиротино, заняв северо-западную часть последнего.

Второе. Уничтожить противника, прорвавшегося в район Сиротино, Витебск, возлагаю на командующего 19-й армией, посему для этой цели подчиняю 186-й сд и 128-ю сд и разрешаю использование 220-й мотодивизии и 57-й танковой дивизии, подчинив себе в районе Витебска 390-й гап.

Задача: во взаимодействии с частями 22-й и 20-й армий 10 июля уничтожить прорвавшегося противника в районе Сиротино, Бешенковичи, Витебск и восстановить положение, прочно заняв восточный берег р. Западная Двина.

Граница справа — Велиж, Городок, Улла.

Граница слева — Рудня, Витебск, р. Западная Двина.

Командующий Западным фронтом маршал Тимошенко.

Член Военного совета Западного фронта армейский комиссар 1-го ранга Мехлис.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, 10169 сс, спр. 4, л. 190.

РАЗВЕДСВОДКА № 28

Штаб Западного фронта

Смоленск, к 8.00 10.7.41 г., карта 500

Первое. Противник в течение 2-й половины дня 9 июля и ночи на 10 июля на Лепельско-Витебском направлении крупными мотомех. и пехотными частями (до двух ак) форсировал реку Западная Двина и овладел г. Витебск.

Второе. Лепельско-Витебское направление.

Противник силами 8-й и 39-й ак (моториз.) форсировал реку Западная Двина на участке Улла, Бешенковичи, развивал наступление в направлениях Сиротино, Витебск; к рассвету 10 июля вышел на рубеж Заборье, Оболь, Сиротино, Витебск.

Отмеченный 8 июля отход противника из района Сенно (28 км ю.-в. Бешенковичи) был маневром уклонения мотомехчастей противника от боя до подхода резервов из глубины.

9 июля крупные мотомехчасти противника вели бой западнее Сенно, обеспечив свой левый фланг сильным противотанковым районом на рубеже Черногостье, Озера, Новоселки и поддержанные действиями бомбардировочной и пикирующей авиации и тяжелой артиллерией.

Вывод. Основное усилие действий противника отмечается на Лепельско-Витебском направлении.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, воп. 3038 сс, спр. 5, л. 161—163.

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 21 к 20.00 10.7.41 г.

Штаб Западного фронта

1. Войска фронта в течение дня 10 июля вели упорные бои с наступающими частями противника в районах Себеж – Освея – Борковичи – Городок – ст. Барсуки – Борколобово.

Противник неустановленной силы (по разведданным установлены части 8 и 39 ак) прорвал фронт 22-й армии на участке Улла, Бешенковичи и, развивая наступление в северо-восточном направлении, занял Витебск.

Основное усилие фронта направлено на ликвидацию наступления витебской группировки противника.

2. 22-я армия. Части армии в течение дня вели ожесточенные бои с превосходящими силами противника, обтекающими флангами Себежского и Полоцкого УР.

51-й стрелковый корпус: 170-я дивизия к 10.30 вела бои на фронте Кременцы – Кузнецовка – Силявы – Ляхово – Теплюки – Освейская.

112-я дивизия в течение 9 июля понесла большие потери и к 10.30 10 июля отошла на фронт Игналино (на северо-восточном берегу оз. Освейское) – озеро Белое – Лисно, по восточному берегу р. Свольна – м. Волынцы;

98-я дивизия к 11.30 10 июля продолжает удерживать северный берег р. Дрисса на участке Волынцы – Игнатово – Владычино, отразив 2 попытки противника форсировать р. Дрисса на участках Горовцы – Игнатово.

62-й стрелковый корпус: 174-я дивизия (с частями 126-й сд на правом фланге) к 10.30 10 июля вела бои на всем фронте.

На правом фланге противнику удалось вклиниться в стык 98-й и 174-й дивизий, захватить 6 ДОТ на участке (иск.) Владычино – Кумляки. Остальной фронт дивизии без изменений.

186-я дивизия. На участке Улла, Бешенковичи противник форсировал р. Западная Двина. Днем 10 июля продолжал развивать наступление на северо-восток, захватил Городок и северо-западную окраину Витебска. Данных в положении 186-й сд о штурме нет.

Штаб 62-го стрелкового корпуса:

179-я дивизия – 215-й стрелковый полк с танковым батальоном 48-й танковой дивизии к 11.30 10 июля заканчивала сосредоточение в районе Идрица. Остальные части дивизии в районе Невеля.

50-я дивизия отводится в район Велижа для укомплектования.

3. 20-я армия. Части армии ведут упорные бои с танковыми и моторизованными частями противника, развивающими наступление на Витебск и Оршу.

Установлено скопление моторизованных и танковых частей противника в районах Лепель – Сенно – Толочин.

В районе Бочкарево – Шилки выброшен авиадесант противника в составе 200 человек.

Подвижные части армии после боев с моторизованными и танковыми частями противника занимают районы: 14-я танковая дивизия – Тепляки – Коборево; 18-я танковая дивизия – Луги – Богушевское; 13-я танковая дивизия – ст. Климовичи; 17-я танковая дивизия – Белица; ее 2 батальона с артдивизионом в районе Толочин ведут бой в окружении танков и мотопехотных частей противника.

1-я мсд совместно с 73-й сд – на рубеже Русский Селец (иск.) – Лисуны.

2-й ск отошел за линию фронта и сосредотачивается в районе Чемоданы.

Части 19-й армии в составе 220-й мд и 23-го мк совместно с 153-й сд 20-й армии перешли в наступление, в витебском направлении теснят небольшие силы противника, перешедшие на восточный берег р. Западная Двина.

6. 19-я армия. Части армии продолжают сосредоточение.

220-я мсд с 3.00 10 июля ведет бои с прорвавшимися мотомехчастями противника на северо-западной окраине Витебска.

25-й стрелковый корпус с 11.00 10 июля перешел в наступление на фронте Прудники – Сеньково. Результатов боя 25-го корпуса и 220-й дивизии пока не поступало.

8. ВВС фронта днем 9 июля бомбардировали танки и мотопехоту противника в районах Бешенковичи – Лепель – Кашень – Березино – Бобруйск, в ночь на 10 июля уничтожили авиацию противника на аэродромах, действовали по переправке в районах Бешенковичи – Улла – Дисна.

За 9 июля было сбито 20 самолетов противника в воздухе и по предварительным данным уничтожено на земле 49.

Наши потери: сбито в воздухе — 7, уничтожено на земле — 4 и не вернулись на свои аэродромы 20 самолетов.

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 33 к 20.00 11.7.41 г.

Штаб Западного фронта

1. Войска фронта днем 11 июля продолжали бои с наступающими частями противника в районе Себеж – Освея – Борковичи – Городок – Витебск — ст. Барсуки – Борнолобово, направляя основные усилия на ликвидацию наступления витебской группировки противника.

19-я армия с утра 11 июля вела напряженный бой за Витебск, результаты боя пока не уточнены.

Остальные части продолжают сосредоточение.

На 11 июля из 350 эшелонов прибыло и разгрузилось 130 эшелонов.

В состав армии переподчинены 7-й пехотный корпус, 153-я, 186-я, 50-я стр. дивизии.

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 37 к 20.00 13.7.41 г.

Штаб Западного фронта

62-й стр. корпус: 174-я стр. дивизия, с частями 126-й дивизии 11-й армии, продолжает оборонять Полоцкий УР.

19-я армия: части армии в ночь на 13 июля готовились к наступлению с рубежа Вороны — ст. Заболотинка, создавая резервы из подходящих частей 34-го стрелкового корпуса в районе Лиозно. В первой половине дня 13 июля части перешли в наступление. Данных о результатах боя и положении частей армии к 19.00 13 июля не поступило.

По дополнительным данным армия в течение 12 июля вела бои:

25-й стр. корпус действующими на фронте частями вел бой с прорвавшимся противником на рубеже Сураж – Витебск – Яновичи.

34-й стр. корпус двумя частями вел бой на рубеже Сураж – Витебск – Кармолиты с моточастями противника, пытавшимися окружить части дивизии.

127-я стр. дивизия двумя полками с 18.00 12 июля вела бой с танками противника на юго-восточных подступах Сураж – Витебск – Яновичи.

34-й стр. корпус частью сил вел бой с мотомехчастями противника на рубеже Вороны – Фальковичи, а с 18.00 на подступах к Веляшковичам, частью сил выдвигался из Руднина на рубеж Стайки – Королево.

7-й мех. корпус: 14-я танковая дивизия — к 6.00 12 июля были сосредоточены для наступления в районе Клевцы – Стасево; 18-я танковая дивизия — в районе Добромысль.

20-я армия: вечером 12 июля и в ночь на 13 июля отбросив пехоту противника у ст. Богушевская – Копысь, восстановила прежнее положение. С утра 13 июля части армии ведут бой с разрозненными группами танков и мотопехоты, прорвавшимися в глубину обороны.

69-й стр. корпус, отбросив части противника, занял оборону:

153-я дивизия — по восточному берегу р. Лучеса на фронте Вороны — ст. Заболотинка – Гряда.

229-я дивизия — (иск.) Гряда – Луги – Богушевская.

233-я дивизия — Коленьки — ст. Стайки.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, воп. 10169 сс, спр. 7, л. 126 – 129, 134 – 138, 153 – 158.

З ЗАГАДА ВОЙСКАМ ЗАХОДНЯГА НАКІРУНКУ № 060 АД 12 ЛІПЕНЯ 1941 г.

1. Противник, сосредоточив 8-й и 39-й танковые корпуса на витебском и до танкового корпуса на могилевском направлениях, форсировал реки Западная Двина, Днепр и развивает наступление на города Велиж, Горки.

2. Задача фронта — совместными действиями 22-й, 19-й и 20-й армий, во взаимодействии с авиацией, уничтожить прорвавшегося противника и, овладев г. Витебск, закрепиться на фронте Идрица – Полоцкий УР, — Сиротино — ст. Княжица – Шилки – Орша и далее по р. Днепр.

Начало наступления 8.00 13.7.41 г.

3. 22-й армии... перейти в наступление силами 214-й и 186-й СД с 56-м ГАП и 390-м ГАП, 102-й ДДТ и 46-й САД с фронта ст. Войханы — Городок и нанести удар в направлении Ви-

тебска, к исходу дня выйти на рубеж населенных пунктов Сиротино, ст. Княжица, где прочно закрепиться.

4. 19-й армии, сдерживая прорвавшиеся группы противника в направлении г. Велиж, силами 7-го МК, 162-й СД, 220-й МД и 399-м ГАП, 11-й САД наступать с рубежа населенные пункты Шумовщины, Вороны в направлении Витебска с задачей овладеть городом. К исходу дня выйти на рубеж: Ворошилы, Пушкари, где закрепиться и прочно сдерживать оборону.

5. 20-й армии активными действиями в своем левом фланге уничтожить прорвавшегося на восточный берег р. Днепр противника и прочно закрепиться на рубеже: ст. Богушевская, р. Днепр. Силами 5-го МК, 153-й и 229-й СД, с 57-й ТД, 23-м АД, имея основную группировку на своем правом фланге, нанести удар в направлении Островно, содействуя тем самым успешному наступлению 19-й армии. К исходу дня выйти и закрепиться на рубеже Павловичи — Шилки — Богушевское.

8. ВВС фронта. Задачи:

1. В 7.30 13.7.41 г. нанести удар с воздуха по противнику в районах населенных пунктов Городок, Островно, Витебск, действуя главным образом по артиллерии и танкам противника.

2. Наблюдением с воздуха своевременно вскрывать очаги сопротивления противника на пути движения наших войск и немедленно их подавлять.

3. Прикрыть наземные войска от ударов воздушного противника.

4. Дальнебомбардировочный корпус использовать для ударов по противнику в районе населенных пунктов Городок, Витебск, Бешенковичи и Шклов.

Главнокомандующий Западным направлением Маршал Советского Союза С.Тимошенко

Начальник штаба Западного направления генерал-лейтенант Маландин.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, воп. 10189 сс, спр. 1 л. 232—234.

З ДАКЛАДА ГАЛОЎНАКАМАНДУЮЧАГА ВОЙСКАМІ ЗАХОДНЯГА НАКІРУНКУ АД 13 ЛІПЕНЯ 1941 г. СТАЎЦЫ ВЯРХОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ 12 і 13 ЛІПЕНЯ 1941 г.

13 июля 1941 г.

Тов. СТАЛИНУ
Тов. ЖУКОВУ

В течение 12 и 13.7.41 г. противник ведет беспрерывные атаки на всем Западном фронте, кроме 21-й армии. После ожесточенных боев, с большими потерями противнику 12.7.41 г. удалось овладеть г. Витебск и форсировать р. Днепр в направлениях населенных пунктов Шклов и Быхов, атаки противника на остальном фронте отбиты.

22-я армия удерживает рубеж: Идрица — Полоцкий УР.

В направлении населенного пункта Прибытки (10 км севернее ст. Толмачевская) противник силами до 2 пехотных дивизий теснит 98-ю стр. дивизию в Витебском направлении. 12 и 13.7.41 г. идет бой с переменным успехом за Городок.

19-я армия, понеся большие потери в боях за Витебск, отошла на восточный берег р. Западная Двина, и с утра 13.7.41 г. ведет наступление 162-я стр. дивизия и 220-я мех. дивизия на Витебск. Наступление проходит в тяжелых условиях, т.к. 19-я армия успела сосредоточить только 2 дивизии. Противник небольшими группами прорвался в тыл 19-й армии в район населенных пунктов Велиж и Лиозно.

20-я армия ночными боями ликвидировала прорыв противника у населенного пункта Копысь и продолжает действия по ликвидации противника в районе г. Шклов совместно с частями 13-й армии. С утра 13.7.41 г. правофланговые 153-я и 229-я стрелковые дивизии ведут наступление на д. Островно в обход Витебска, содействуя захвату его войсками 19-й армии.

Решил: 1. К исходу 13.7.41 г. действиями 22-й, 19-й, 20-й армий при усиленной поддержке авиации овладеть г. Витебск, восстановить фронт на рубеже Сиротино — ст. Княжица — р. Лучеса.

Тимошенко.
Маландин.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, воп. 10169 сс, спр. 4, л. 235—237.

З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 19-й АРМІІ ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЭНАНТА І.С.КОНЕВА

«19-й армии подчинен 23-й мотостр. корпус, сосредоточенный в районе Стасьево и имеющий одну 220-ю мотостр. дивизию.

Войска в ночь с 9 на 10 июля были выдвинуты в район Витебска.

Восточная сторона Витебска оборонялась 150 вооруженными рабочими и 10 — 15 танками.

Железнодорожный мост был захвачен немцами. Западная часть Витебска горела.

С 3.00 10 июля 220-я мотостр. дивизия завязала бой с противником и имела успех в центре, где ей удалось переправиться одним полком на западный берег р. Западная Двина и разгромить штаб германского соединения (убито 6 офицеров и 1 генерал).

Конев»

«БОЕВОЙ ПРИКАЗ КОМАНДУЮЩЕГО ВОЙСКАМИ 19-й АРМИИ ОТ 11 ИЮЛЯ 1941 г. НА УНИЧТОЖЕНИЕ ПРОТИВНИКА

Штарм 19, Вороны, 11.7.41 г. 12.30

1. Противник силами 8-го и 36-го мотокорпусов форсировал р. Западная Двина на участке Улла — Бешенковичи, развивает наступление в направлении Сиротино, Витебск. К рассвету 10 июля вышел на рубеж Заборье — Оболь — Сиротино — Витебск. К исходу дня 10 июля — западная окраина Витебска занята противником.

2. Правее 22-я армия ведет оборонительный бой на всем фронте армии. Граница с ней — Велиж — Городок — оз. Черствятское. Слева ведут бои части 20-й армии.

3. 19-й армии занять и упорно оборонять фронт Городок — оз. Лосвидо — Слобода — ст. Княжица и далее вдоль рек Западная Двина и Лучеса.

4. 25-й стр. корпус (127-я, 134-я, 162-я, 186-я стр. дивизии) оборонять полосу Городок — Слобода — Будница — Борок, подчинив себе 186-ю стр., дивизию которая к утру 10 июля вела бои на фронте Латыгово — Слобода — Плющевка — Прудины, подготовить ее для совместного боя.

5. 34-й стр. корпус (220-й мсд, 153-я 158-я дивизии, 471-й , 467-й корпусные арт. полки).

6. Резерв: 129-я, 38-я и 50-я стр. дивизии, 23-й мотостр. корпус (без 220-й мотостр. дивизии), 7-й мотостр. корпус.

В 23-й мотостр. корпус входит 57-я и 51-я танковые дивизии

25-й стр. корпус — штаб Яновичи.

162-я стр. дивизия — 501-й и 1/267-й стр. полки — Колышки.

134-я стр. дивизия — 629-й стр. полк без одного батальона, 738-й стр. полк и 156-й отдельный разведбатальон — Поизовье, Полуяново.

Управление 34-го стр. корпуса, 1/535-го гаубичного артиполка, 158-й стр. дивизии — район Рудни.

Конев».

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 17 К 19.30 5.7.41 г.

Штадив 153-й, лес 1,5 км северо-восточнее Тарелки.

1. Части 153-й стр. дивизии вошли в соприкосновение с противником, 1/666-й стр. полк атакован группой танков.

В 15 км западнее Бешенковичи по направлению Улла движется колонна танков и пехоты (150 — 200 машин). 505-й стр. полк подвергнут бомбардировке.

2. 153-я стр. дивизия удерживает полосу обороны.

3. 1/666-й стр. полк отбил танковую атаку. 2/666-й стр. полк перебрасывается на машинах в хвост колонны противника на Уллу.

Начальник 1-го отдела полковник Сидоров.

БОЕВОЕ РАСПОРЯЖЕНИЕ № 3

Штадив 153-й, 5.7.41 г.

5 июля мотомехчасти противника в 12.00 в районе западнее Бешенковичи вели бой с отдельным разведывательным батальоном (2 танка противника выведены из строя).

В 17 часов танки противника пытались атаковать 1/666-й стр. полк, но были отброшены. Во время атаки саперы взорвали мост через реку, в результате танкетка и 1 мотоцикл противника с личным составом погибли в реке.

С севера на подступах к Витебску подбита 1 бронемашина.

Огнем 3-й армии за 5 июля над районами 435-го и 505-го стр. полков сбито 3 самолета противника.

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 18 к 7.00 6.7.41 г.

Штадив 153-й, лес 1,5 км северо-восточнее Тарелки.

1. В течение ночи противник перед фронтом 666-го стр. полка производил разведывательные поиски. В 5.00 6.7.41 г. до батальона пехоты противника при поддержке до 15 танков пытались вклиниться в расположение 666-го стр. полка у населенного пункта Гнездиловичи, но были отбиты.

Потери: до 60 человек убитыми и ранеными.

2. Передовой отряд 505-го стр. полка в 16.00 5.7.41 г. находится в Сенно. Через него проходят части 50-й стр. дивизии.

ОПЕРАТИВНАЯ СВОДКА № 22 к 2.00 7.7.41 г.

Штадив 153-й, лес 1,5 км северо-восточнее Тарелки.

1. 666-й стр. полк обороняется в районе Гнездиловичи.

2. За истекшие сутки противник потерял 5 танков, 1 бронемашину, 4 мотоцикла, батальонную пушку, 2 ручных пулемета, минометную батарею, 6 противотанковых орудий.

3. Сбито ружейно-пулеметным огнем 4 самолета противника.

4. При отходе 505-го стр. полка противником выведена из строя 1 батарея гаубичного арт. полка и 1 орудие полковой артиллерии (из Сенно).

Потери: убито и ранено 10 человек.

БОЕВОЙ ПРИКАЗ КОМАНДИРА 153-й стр. дивизии № 05/оп

Штадив 153-й, опушка леса юго-восточнее Замошенья.

9.7.41 г. 18.00

1. Наши мехчасти громят противника в направлении Сенно, Лепель. Противник, прорвавшийся в районе Улла, успешно отбивается нашими частями на подступах к Витебску с северо-запада.

2. 153-я и 229-я стр. дивизии выдвигаются к исходу дня 9.7.41 г. на рубеж Бешенковичи – Сенно, а к исходу 10.7.41 г. – на рубеж Улла – Чашники – ст. Вятны.

3. 153-й стр. дивизии, оставив для обороны на фронте Гнездиловичи – оз. Сарро 666-й стр. полк и один батальон на участке оз. Липно – Дубовицы, двумя полками (435-м и 505-м стр. полками) с 581-м гаубичным арт. полком и 1 дивизионом 565-го легкого арт. полка выступить из занимаемого района и к исходу 9.7.41 г. выйти на рубеж Бешенковичи – Кашево – Русилки – Осовец (4 км западнее Подворица).

Ось движения – Задорожье – свх. Ходцы – Сауши – Ганковичи – Верх. Кривино. К исходу 10.7.41 г. выйти на рубеж р. Улла.

4. 505-й стр. полк со 2-м батальоном 20-го стр. полка 1-м дивизионом 581-го гаубичного арт. полка, саперным батальоном 20-го стр. полка, одной батареей 150-го отдельного дивизиона ПТО, хим. ротой наступать в полосе с границей слева – Мошканы – свх. Ходцы – Голынь – Дубровки с задачей – уничтожить противника в районе урочища Андронов Остров и к исходу дня 9.7.41 г. выйти на рубеж Бешенковичи.

Архіў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, ф. 766, воп. 154852 с, спр. 2, л. 6,7; спр. 3, л. 3; спр. 5, л. 17, 20, 23, 31.

ДАНЯСЕННЕ НАЧАЛЬНІКА ІНЖЫНЕРНЫХ ВОЙСК ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ АД 11 ЛІПЕНЯ 1941 г. ГАЛОЎНАМУ ВАЕННА-ІНЖЫНЕРНАМУ ЎПРАЎЛЕННЮ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ПРОЦІТАНКАВЫХ РУБЕЖОЎ У ПАЛАСЕ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ФРОНТУ

1. Силами войск и местного населения подготовлены противотанковые рубежи:
1-й — Витебск – Богушевск по р. Лучеса.
2-й — Лиозно – Добромысль по р. Мошна.
3-й — Смоляны – Голошевна.
4-й — Орша – Могилев – Годиловичи.
5-й — Оспоки – Ляды – Баево.
2. Подготавливаются противотанковые рубежи с готовностью на 18.00 10 июля около 60%.
1-й — Богушевск – Орша.
2-й — Бабиновичи – Красное.
3-й — Баево – Горки – Дрибин.
4-й — отдельными районами: Чаусы – Пропойск – Чечерск – Гомель.
4. Минированы и взорваны мосты в районах:
1-й — Березино – Рожно – Лепель — 11 мостов.
2-й — Чашники – Лазуки — 3 моста.
3-й — Толочин – Вилятин – Тетерин — 6 мостов.
5-й — Полоцк – Бешенковичи – Витебск — 9 мостов и подготовлены к взрыву 20 мостов.
5. Группы ТОС в направлениях:
1-е — Толочин – Гусино.
2-е — Витебск – Сиротино — Островно.
3-е — Витебск – Городок – Смоличи.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 208, воп. 2454 сс, спр. 28, л. 441–442.

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 153-Й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

11.7.41 г. дивизия вышла на рубеж восточный берег р. Лучеса в район: узел дороги Поповка – Карповичи — ст. Крынки (22 км юго-восточнее Витебска). Оказавшись в полном окружении, ее части с занимаемых рубежей не отошли. С 11.7.41 г., ведя ожесточенные бои с подходившими резервами мотопехоты и танками противника, пытавшимися расчленить и уничтожить дивизию, они организованно пробивались на соединение с остальными частями Красной Армии.

К утру 17 июля 1941 г, своими основными силами дивизия вышла на западный берег р. Черница в район Слепцы – Логуны – Короли.

Противник решил расчленить и уничтожить дивизию на р. Черница, для чего в районе Добромысль сосредоточил значительное количество своих мотомеханизированных частей, артиллерии и танков.

Командиром дивизии было принято решение прорвать кольцо окружения противника на узком фронте Винокорно 1-е — Рублево – Ковенское, форсировать р. Черница и выходить далее в район Смоленска.

17.7.41 г. в районе Перемонт северо-восточнее Добромысли проведена разведка боем, которая отвлекла противника от действительного места переправы.

После двухнедельных, исключительно ожесточенных боев, части дивизии к 12.00 18.7.41 г., разгромив основные силы противника, овладели переправой. К исходу 18.7.41 г. дивизия с боем форсировала р. Черница, прорвала кольцо окружения противника и в ночь с 18 на 19.7.41 г. вышла в район Горбово, а к утру 19.7.41 г. — к Любавичи.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 766, воп. 518179, спр. 1, л. 3–5.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б М.І.ЛЕВІКАВА АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ДЗЕЙНАСЦІ БАТАЛЬЁНА АСААВІЯХІМА Ў СКЛАДЗЕ ДЫВІЗІІ НАРОДНАГА АПАЛЧЭННЯ

16 жніўня 1941 г.

27 чэрвеня Віцебскім гарадскім камітэтам КП(б)Б быў арганізаваны батальён Асаавіяхіма з 3 рот у колькасці 450 чалавек. Батальён быў укамплектаваны ў асноўным камуністамі і камсамольцамі. Да пачатку баёў у Віцебску батальён нёс ахову горада. Увесь састаў баталь-

ёна быў пераведзены на казарменнае становішча, і ў вольны ад дзяжурства час з байцамі праводзілася ваенная вучоба. Увесь камандны склад батальёна быў у асноўным укамплектаваны работнікамі Асаавіяхіма, і толькі некаторая частка з камсаставу запасу.

Камандзірам батальёна быў прызначаны работнік Асаавіяхіма, старшы лейтэнант, кандыдат у члены ВКП(б) І.П.Клёнаў. Ваенкомам батальёна гарком партыі вылучыў члена Віцебскай гарадской партарганізацыі, старшыню Саюза работнікаў пачатковых і сярэдніх школ Г.С.Усаценку.

Батальён быў узброены вінтоўкамі, 3 станковымі і 6 ручнымі кулямётамі і 350 – 400 гранатамі.

6 ліпеня 1941 г. са стварэннем дывізіі народнага апалчэння батальён цалкам увайшоў у склад дывізіі.

9 ліпеня з пачаткам баёў у Віцебску батальёну быў адведзены ўчастак абароны па левым беразе р. Заходняя Дзвіна ў раёне Мазурына. Батальён Асаавіяхіма трымаўся на сваім участку, не адступіўшы ні на адзін крок... У ноч з 9 па 10 ліпеня праціўнік падрыхтаваў пераправу цераз р. Заходняя Дзвіна ў раёне Мазурына.

Начальнік штаба батальёна з 2 байцамі-камсамольцамі замаскіраваўся са станковым кулямётам у кустах на левым беразе ракі.

Да іх далучыліся 2 чырвонаармейцы, што адарваліся ад сваёй часці, таксама са станковымі кулямётамі, яны таксама замаскіраваліся ў кустах. Усю ноч праціўнік асвятляў левы бераг пражэктарамі, правяраючы, ці ёсць у гэтым раёне агнявыя кропкі, але кулямёты не выявіў і на світанні пачаў пераправу батальёна войск на плытах. Падпусціўшы праціўніка да сярэдзіны ракі, абодва кулямёты адкрылі агонь, у выніку вялікая частка батальёна была знішчана.

Праціўнік адкрыў моцны агонь па беразе, але байцы паспелі выехаць на машыне, захапіўшы з сабою кулямёты, і прыбылі ў сваю часць.

10 ліпеня адно аддзяленне батальёна пад камандаваннем камбата Клёнава кінулася ў атаку на агнявую кропку праціўніка, знішчыла кулямётны разлік і захапіла кулямёт.

11 ліпеня ў раёне Журжава (пад Віцебскам) 1-я рота батальёна трапіла пад моцны агонь праціўніка і ў няроўным баі амаль цалкам загінула. Вялікія страты панеслі і іншыя роты батальёна.

У ноч з 12 на 13 ліпеня ў сувязі з адступленнем часцей Чырвонай Арміі батальён адступіў да Суража, дзе вёў бой з дэсантам праціўніка.

Батальён звязаўся з камандаваннем часцей Чырвонай Арміі і ў кантакце з імі ўдзельнічаў у баях з 9 па 14 ліпеня ўключна. Па звестках, што маюцца, рэшткі батальёна ўліліся ў часці Чырвонай Арміі.

Сакратар Віцебскага гарадскога камітэта КП(б)Б Левікаў

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 33а, арк. 223 – 225.

Хроніка абароны Віцебска

У Цэнтральным архіве Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі захоўваюцца дакументы, якія датычацца абароны Віцебска ў ліпені 1941 года, у т.л. па 19-й арміі.

З баявога загаду камандуючага войскамі 19-й арміі генерал-лейтэнанта І.С.Конева ад 10 ліпеня 1941 г. на знішчэнне праціўніка

Штаб 19-й арміі, в. Вароны.

1. Праціўнік на працягу 9 ліпеня авалодаў заходняй ускраінай г. Віцебска і праздармам перад чыгуначным мостам. У ноч з 9 на 10.7.1941 г. праціўніку ўдалося авалодаць в. Уланавічы. У ноч з 9 на 10.7.1941 г. падышлі часці 220-й мотастралковай дывізіі, праціўнік з раніцы 10.7.1941 г. быў атакаваны і паспяхова адкінуты на заходні бераг р. Заходняя Дзвіна.

У сувязі з наяўнай абстаноўкай падраздзяленні атрымалі наступныя задачы:

1. 19-й арміі сумесна з 20-й і 22-й арміямі знішчыць праціўніка ў раёне Сіроціна – Бешанковічы – Віцебск, авалодаць усходнім берагам р. Заходняя Дзвіна і моцна ўтрымліваць яго.

2. 23-му стралковаму корпусу ўсімі наяўнымі сіламі 162-й і 134-й стралковых дывізій фарсіраваць р. Заходняя Дзвіна на ўчастку Пруднікі – Сінькова, знішчыць праціўніка на паўночна-заходнім беразе р. Заходняя Дзві-

на, захапіць і трывала ўтрымліваць рубеж Казловічы – Печышча – ст. Лосвіда, выставіць перадавыя часці на рубеж Гарадок – ст. Лосвіда. Граніца злева – Калышкі – паўднёвы бераг возера каля в. Слабодка; справа – 6 км на поўнач ад г. Віцебск – в. Смалькі.

3. 24-му механізаванаму корпусу (220-я мотастралковая дывізія) з часцямі ўзмацнення авалодаць г. Віцебск, захапіць і моцна ўтрымліваць заходні бераг р. Заходняя Дзвіна, выставіўшы разведку на Смалькі і Бешанковічы. Граніца злева – Рудня – Віцебск – Бешанковічы.

4. 34-му стралковаму корпусу ўсе наяўныя сілы сканцэнтраваць у раёне Скулавіч – ст. Забалоцінка – ст. Крынкі – Лёзна і надзейна абараняць указаны раён, быць гатовымі аказаць падтрымку 24-му механізаванаму корпусу.

З баявога загаду па 19-й арміі ад 11 ліпеня 1941 года

1. Праціўнік сіламі 8-га і 36-га матарызаваных карпусоў фарсіраваў раку Заходняя Дзвіна на ўчастку Ула – Бешанковічы, развівае наступленне ў напрамку Сіроціна – Віцебск. Да раніцы 10 ліпеня выйшаў на рубеж Забор'е – Обаль – Сіроціна – Віцебск. На зыходзе дня заходняя ўскраіна Віцебска занята праціўнікам.

2. Справа 22-я армія вядзе абарончыя баі на ўсім фронце арміі. Граніца з ёй – Веліж – Гарадок – воз. Чарсвяцкае. Злева вядуць баі часці 20-й арміі.

Войскі атрымалі наступную задачу:

1. 19-й арміі заняць і ўпарта абараняць фронт: Гарадок – возера Лосвіда – Слабада – ст. Княжыца і далей уздоўж рэк Заходняя Дзвіна і Лучоса.

2. 25-му корпусу (127-я, 134-я, 162-я, 186-я стралковыя дывізіі) абараняць паласу Гарадок – Слабада – Будніца – Барок, падпарадкаваўшы сабе 186-ю стралковую дывізію, якая раніцай 10 ліпеня вяла баі на фронце Лапінава – Слабада – Плюшчаўка – Прудзіна.

3. 24-му механізаванаму корпусу (220-я мотастралковая дывізія), 153-й, 158-й стралковым дывізіям 34-га стралковага корпуса, 471-му і 467-му артпалкам утрымліваць подступы да Віцебска і сам горад.

4. Рэзерв: 129-я, 38-я, 50-я стралковыя дывізіі, 23-і механізаваны корпус (57-я і 51-я стралковыя дывізіі), 162-я стралковая дывізія – 501-ы стралковы і 1-ы батальён 267-га стралковага палка – в. Калышкі. 134-я стралковая дывізія размешчана ў вёсках Панізоўе, Палуянава. Кіраўніцтва 34-га стралковага корпуса, 1-я батарэя 535-га гаўбічнага артпалка, 158-я стралковая дывізія размешчаны ў раёне Рудні. Арміі падпарадкаваны 23-і механізаваны корпус у раёне Стасева.

* * *

А вось што гаворыцца ў пасляслоўі да загаду.

Войскі ноччу з 9 на 10 ліпеня былі выстаўлены ў раён Віцебска. Усходняя ўскраіна горада абаранялася акрамя таго 150 узброенымі апалчэнцамі і 10—15 танкамі. Чыгуначны мост быў захоплены немцамі. Заходняя частка Віцебска гарэла.

У 3.00 10 ліпеня 220-я мотастралковая дывізія завязала бой з праціўнікам і мела поспех у цэнтры горада, дзе ёй удалося пераправіцца адным палком на заходні бераг Заходняй Дзвіны і разграміць штаб германскага злучэння (забіта 6 афіцэраў і генерал).

Праціўнік трымаў Уланавічы на правым флангу і аэрадром на левым флангу, фарсіраваў Заходнюю Дзвіну і заняў Уланавічы палком пяхоты. На аэрадроме бой вёўся за кожны будынак.

Раніцай 10 ліпеня з поўдня да лукавіны Заходняй Дзвіны падышоў полк 229-й стралковай дывізіі і ўмацаваў левы фланг 220-й мотастралковай дывізіі.

Ноччу з 10 на 11 ліпеня полк 229-й стралковай дывізіі адышоў ад лукавіны на 1—1,5 км, паставіўшы пад пагрозу фланг 220-й дывізіі, якая, у сваю чаргу, адвяла полк з заходняга берага на ўсходні. Наспявала пагроза праваму флангу з боку Уланавіч. Камандуючы арміяй загадаў 162-й стралковай дывізіі атакаваць і авалодаць Уланавічамі, адкінуць праціўніка на заходні бераг Дзвіны.

501-ы стралковы полк (162-я стралковая дывізія) сканцэнтраваўся да 22.00 10 ліпеня ў раёне Сенькава. Два батальёны 501-га палка з ходу накіраваліся на Уланавічы і пасля 10—12 км маршу ў 3.30 11 ліпеня атакавалі гітлераўцаў. Бой пачаўся паспяхова. Праціўнік не вытрымаў і пабег, кідаючы на полі бою кулямёты і іншую зброю. Уланавічы былі захоплены, але раніцай наляцела авіяцыя і наступленне прыпынілася. Батальёны заляглі, а потым пачалі адыход на паўночны ўсход.

Да 18.00 11 ліпеня батальёны, заняўшы шасэ, утрымлівалі цагельны завод (за 5 км на паўночны ўсход ад Віцебска) і шашу. Батальёны былі ўзмоцнены адной ротай з Сенькава.

У 19.00 з Віцебска па шашы на Веліж накіраваліся мотамехвойскі немцаў. Да 22.00 501-ы стралковы полк вёў бой з праціўнікам, а потым пачаў адыходзіць. 501-ы полк біўся без дывізіённай артылерыі і процітанкавага дывізіёна, якія яшчэ не падышлі. 134-я стралковая дывізія да пачатку бою каля Уланавіч часткай сіл пераправілася на паўночны бераг р. Заходня Дзвіна, частка засталася на паўднёвым беразе. У такім становішчы яна была атакавана мотамехзлучэннямі праціўніка пры падтрымцы авіяцыі.

У выніку ўсе тое, што было на паўднёвым беразе, рассеялася, разрозненыя групы працягвалі біцца, выходзіць з акружэння. У паўночнай групе змагаліся 2 батальёны з саставу 22-й арміі. Кіраўніцтва 162-й і 134-й стралковых дывізій перадыслацыравалася на паўночны бераг р. Заходняя Дзвіна і акружной дарогай перабралася ў раён Вязьмы.

Штаб 25-га стралковага корпуса быў атакаваны і згубіў радыёстанцыю, яго месцазнаходжанне ўстанавіць было немагчыма. Акрамя таго, былі згублены ўсе карпусныя дакументы. Астатнія часці 25-га корпуса, 720-ы стралковы полк на працягу 12—13 жніўня вялі бой пад Калышкамі, 515-ы стралковы полк — пад Янавічамі, 2 батальёны 162-й стралковай дывізіі пад камандаваннем начальніка артылерыі палкоўніка Аляксеева — пад Дзямідавам.

Часці 134-й і 162-й дывізій былі не столькі разбіты, колькі рассеяны авіяцыяй і мотамехчасцямі праціўніка. Такі ж лёс напаткаў 127-ю дывізію 25-га корпуса, 38-ю, 129-ю і 158-ю дывізіі 34-га стралковага корпуса.

Вынік контрудару пад Віцебскам і ў горадзе мог аказацца больш значным, калі б удалося падтрымаць першы поспех 19-й арміі свежымі сіламі. На жаль, для гэтага не аказалася ні часу, ні сіл. Войскі арміі ўступалі ў бой разрознена, асобнымі групамі, нярэдка без артылерыйскага забеспячэння, не маючы неабходнай колькасці боепрыпасаў. Усё гэта паралізавала іх наступальны парыў.

Падрыхтаваў А.Бурдо

Па матэрыялах «Сборника приказов по армиям. Кн. 34-я». (Архивное издание Генштаба. М., 1960.)

Віцебскае народнае апалчэнне 1941 г.

Сфарміравалася 5—6.7.1941 г. ў Вялікую Айчынную вайну паводле рашэння Віцебскага абкома КП(б)Б у адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 30.6.1941 г. Складалася з 4 батальёнаў: Асаавіяхіма, Кастрычніцкага, Першамайскага, Чыгуначнага; налічвала 2 тыс. чалавек. Апалчэнцы разам з войскамі Чырвонай Арміі 9—10 ліпеня абаранялі Віцебск.

Батальён народнага апалчэння Першамайскага раёна (камандзір А.А.Манахаў) уступіў у бой 8 ліпеня. Першая рота батальёна 9 ліпеня разам з воінамі 153-й стралковай дывізіі вяла бой у цэнтры горада, утрымлівала ўчастак на левым беразе Заходняй Дзвіны, адбівала неаднаразовыя спробы гітлераўцаў пераправіцца цераз раку.

Батальён народнага апалчэння Чыгуначнага раёна (1900 чалавек — рабочыя станкабудаўнічых заводаў, чыгуначнага вузла, студэнты і выкладчыкі, служачыя; камандзір — сакратар Чыгуначнага РК КП(б)Б Віцебска Б.К.Сямёнаў) вёў абарончыя баі ў раёне воз. Лосвіда, у напрамку Суражскай шашы. 9 ліпеня пасля 5-гадзіннага бою апалчэнцы былі вымушаны адысці да Віцебска, дзе працягвалі змагацца з ворагам.

Батальён Асаавіяхіма (450 чалавек, камандзір І.П.Клёнаў) трымаў абарону на ўчастку ўздоўж берага Заходняй Дзвіны ў раёне Мазурына. 9—10 ліпеня апалчэнцы да позняга вечара вялі баі супраць нямецка-фашысцкіх падраздзяленняў, знішчылі да 200 гітлераўцаў, якія перапраўляліся цераз Заходнюю Дзвіну, 10 ліпеня вялі баі на паўночна-ўсходняй ускраіне Віцебска. 11 ліпеня 1-я рота батальёна амаль уся загінула ў няроўным баі ў раёне в. Журжава. Жорсткія баі апалчэнцаў супраць ворага вяліся на тэрыторыі прадпрыемстваў, вуліцах горада, у раёне Смаленскай шашы, у іншых месцах. 11 ліпеня апалчэнцы пакінулі Віцебск разам з часцямі Чырвонай Арміі, многія ўліліся ў яе рады, частка — у рады партызан і падпольшчыкаў.

Літаратура: Андрющенко Н.К. На земле Белоруссии летом 1941 г. Мн., 1985.

М.К.Андрушчанка.

Гарнізон уступае ў бой

Чэрвень 41-га. Часці 21-га стралковага корпуса 37-й стралковай дывізіі Віцебскага гарнізона былі перакінуты да заходняй граніцы. У паласу 3-й арміі корпус перамяшчаўся у складзе 3 дывізій. Ім камандаваў генерал-маёр В.Б.Барысаў.

Чытаем успаміны камандуючага арміяй генерал-палкоўніка К.М.Галіцкага:

«...Головные части входивших в 21-й стрелковый корпус 17-й и 37-й дивизий прибыли в район города Лиды»[1]. Это было утром 22-го июня.

24-го июня: «...части 37-й стрелковой дивизии полковника А.Е.Чехарина северо-восточнее Воронова были сегодня атакованы противником и во встречном бою нанесли ему поражение, отбросив фашистов на запад»[2].

Заўважым, што гэта здарылася адразу ж пасля 300-кіламетровага маршу і пры адсутнасці тылоў і недахопе боепрыпасаў.

---

[1]К.Н.Галицкий «Годы суровых испытаний». 1941—44». «М., 1973. С. 52.

[2]Там жа, стар. 68.

* * *

А пра тое, як змагаліся авіятары 12-й бамбардзіровачнай авіяцыйнай дывізіі (БАД), 6-ы і 43-і авіяпалкі якой перад вайной дыслацыраваліся ў Віцебску, сведчаць штабныя дакументы, што захаваліся ў архіве.

а. Налеты русской авиации на переправы через Западную Двину юго-западнее Витебска.

б. Командование противника действует энергично и умело. Противник сражается ожесточенно и фанатически.

в. Танковые соединения понесли значительные потери в личном составе и материальной части. Войска устали.

Группа армий «Центр»: танковая группа Гота отразила в районе Витебска яростные контратаки противника с юго-востока. Южнее Витебска 12-я и 7-я танковые дивизии, преодолевая сопротивление противника, вышли к шоссе Орша – Витебск.

12 июля 1941 г., 21-й день войны

Обстановка на фронте:

Танковая группа Гота отражает в районе Витебска упорные контратаки противника с севера и востока. Части танковой группы Гота, продвигающиеся вслед за ударным клином вдоль Западной Двины, также подвергаются непрерывным контратакам противника из районов Великих Лук и Невеля.

Генерал Бограч:

Воздушная разведка доставила сведения о результатах налетов нашей бомбардировочной авиации на железные дороги в тылу противника. Отмечена сильная противовоздушная оборона (зенитная артиллерия) в районе Витебска и южнее Витебска.

13 июля 1941 г. (воскресенье), 22-й день войны

Группировка сил противника:

Район Орша – Витебск – Смоленск. В эту группировку входят соединения противника, действующие перед фронтом 2-й и 3-й танковых групп. За последнее время эта группировка усилилась в несколько раз. В ее состав теперь вошла 19-я армия, развертывающаяся в районе восточнее Витебска.

16 июля 1941 г. (среда), 25-й день войны

Обстановка на фронте:

В районе, отрезанном ударами танковых групп Гудериана и Гота, осталось много сохранивших боеспособность групп противника, что вынуждает наши передвижные соединения действовать в различных направлениях.

* * *

25 июля 1941 г., на 43-й день войны, после совещания начальников штабов групп армий генерал-полковник Гальдер записывает в свой «Дневник» важное признание главкома сухопутных войск генерала-фельдмаршала фон Браухича: «Своеобразие страны и своеобразие характера русских придает компании особую специфику. Первый серьезный противник...»

Генерал-полковник Ф.Гальдер. Военный дневник. Ежедневные записи начальника генерального штаба сухопутных войск. 1939–1942 гг. Том. 3, кн. 1. Перевод с немецкого. М., 1971. С. 96, 97, 99, 103, 105–107, 109, 112, 118, 119, 121, 122, 128, 143, 190.

Падрыхтаваў М.Ф.Крывёнак.

Так пачыналася вайна

З успамінаў В.І.Лузгіна, першага сакратара Віцебскага абкома камсамола.

Па трывозе мяне паднялі дзесь а пятай гадзіне. Званіў памочнік першага сакратара абкома партыі І.А.Стулава.

Усе сабраліся дружна. Маўчым. Адна думка: у чым жа справа? Ніколі не было, каб у такі ранні час збіралі ўсіх членаў бюро абкома партыі. У кожнага на твары заклапочанасць і трывога.

Іван Андрэевіч Стулаў, з хваляваннем вымаўляючы кожнае слова, сказаў: «Таварышы, вайна... Паведамілі толькі што з Мінска, з Цэнтральнага Камітэта, што на нашу краіну напалі фашысцкія войскі. Хутка будзе перададзена па радыё афіцыйнае паведамленне з Масквы. Ідуць жорсткія баі на ўсёй заходняй граніцы, бамбяць нашы гарады».

Стулаў заклікаў да спакою і пільнасці, прапанаваў накіравацца ў працоўныя калектывы. Там ужо стыхійна збіраюцца людзі, мітынгуюць, гнеўна асуджаюць фашысцкіх агрэсараў, выказваюць гатоўнасць ісці на фронт.

У кожнага тады было адно перакананне: мы непераможныя, Гітлера хутка разаб'ём, нямецкіх захопнікаў знішчым на нашых абарончых рубяжах. І вайне канец.

У першыя дні вайны варожыя самалёты не паяўляліся над горадам. Але жудасны адгалосак яе мы адчулі адразу, гледзячы на людзей, што рухаліся з Заходняй Беларусі, Літвы і

В.І.Лузгін.

Латвіі праз Віцебск на ўсход. А нам не верылася: ці ж можа так быць, каб нямецкія лётчыкі кідалі бомбы ў людскі натоўп, ганяліся за цывільнымі, расстрэльвалі з паветра жанчын і дзяцей, і дзейнічалі беспакарана...

Тады ж на першым ваенным пасяджэнні бюро абкома была пастаўлена задача: адмабілізаваць і накіраваць у армію ваеннаабавязаных. Усіх працаздольных, не занятых на вытворчасці, накіраваць на абарончыя работы — капаць акопы, супрацьтанкавыя равы, дапамагаць рабіць запасныя пасадачныя пляцоўкі для самалётаў. А на выпадак акупацыі — рыхтаваць падполле.

У апараце абкома камсамола тады было 27 чалавек — сакратары, загадчыкі аддзелаў, інструктары. Праз тыдзень нас засталося двое: я, першы сакратар, і Варвара Васільеўна Драздова, сакратар па школах. Яна не прызывалася ў армію па стану здароўя. Усе нашы мужчыны пайшлі на фронт. Мне загадалі пакуль што тут займацца абарончымі справамі. Сакратарамі райкомаў і гаркома камсамола Віцебска засталіся толькі жанчыны. У гаркоме — Самуйлава, у Кастрычніцкім райкоме — Зільберборт, у Першамайскім — Кротава, у Чыгуначным — Іваноў. Яго пакінулі і кіраўніком падпольнай арганізацыі на выпадак акупацыі. Давалася заданне: яднаць юных патрыётаў у баявыя ячэйкі, групаваць вакол актывістаў усю моладзь. Узбройвацца, каб наносіць як мага большы ўрон ворагу ўсімі магчымымі сродкамі барацьбы, весці разведку, выкрываць і знішчаць здраднікаў, уздымаць патрыятычны дух людзей, дапамагаць усяляк нашай арміі ў яе цяжкай барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі.

10 ліпеня мы вымушаны былі пакінуць Віцебск. «Мы» — гэта я і Варвара Драздова. Спыніліся ў Суражскім раёне, дзесь ля вёскі Янова. Тут сабралася ўсё бюро абкома партыі, так мы дамовіліся. Там былі вызначаны новыя задачы, выкліканыя надзвычайнай абстаноўкай, удакладнены канкрэтныя абавязкі кожнага. Нас чакалі доўгія гады выпрабаванняў.

Вайна стукае ў дзверы

Гэта быў звычайны святочны дзень чэрвеня. Жыхары Віцебска кожны па-свойму рыхтаваліся правесці яго. Хто з вечара выехаў на рыбалку, хто накіраваўся да родзічаў у вёску. На некаторых прадпрыемствах працавалі рабочыя змены. Нічога, здаецца, не прадвяшчала вялікай бяды, што абрынулася летняй раніцай 22 чэрвеня 1941 г. на нашу зямлю.

Вайну чакалі, да яе рыхтаваліся, але ў душы была надзея, што можа нічога такога і не здарыцца, вораг не пасмее замахнуцца на нашу вялікую і магутную Радзіму. А калі ўжо наважыцца на гэтае, дык атрымае знішчальны ўдар: «чужой зямлі мы не хочам ні пядзі, а і сваёй вяршка не аддадзім». Гэтыя словы з папулярнай тады песні часта гучалі з рэпрадуктараў. Кожны савецкі чалавек быў упэўнены, што ваяваць Чырвоная Армія будзе на чужой тэрыторыі і абавязкова атрымае перамогу малой крывёю. Панікі і разгубленасці не было. Не было і яснага разумення той вялікай трагедыі, якая напаткала нашу Радзіму, увесь наш народ. У тыя першыя дні народ узняўся на барацьбу, пакляўся змагацца.

Вось што пісалі, напрыклад, работніцы швейнай фабрыкі «Прафінтэрн» у сваім адкрытым пісьме-звароце да воінаў Чырвонай арміі:

«Мы, работніцы фабрыкі «Прафінтэрн», з найвялікшым абурэннем даведаліся пра подлую правакацыю германскай ваеншчыны, якая распачала вайну супраць Савецкага Саюза.

Мы, мацеры, сёстры і жонкі, выпраўляем сваіх мужыкоў, сыноў і братоў на фронт, на Вялікую Айчынную вайну савецкага народа. Застаючыся на вытворчасці, будзем з удзесяцяронай энергіяй працаваць, каб забяспечыць родную Чырвоную Армію ўсім неабходным для хутчэйшага і поўнага знішчэння фашысцкіх гадаў.

Вы не турбуйцеся пра нас. Мы вас заменім на кожным участку і пакажам сапраўдныя ўзоры прадукцыйнай працы. Вы на фронце граміце бязлітасна ворага, а мы сваёй самаадданай працай будзем мацаваць магутнасць і абараназдольнасць нашай любімай Радзімы. І калі краіна запатрабуе, то мы ўсе, як адзін, рука аб руку з воінамі Чырвонай Арміі выступім на абарону нашай любімай Радзімы. Ніякая варожая сіла не ўстаіць супраць вялікага, свабодалюбівага і гераічнага савецкага народа».

З такім патрыятычным уздымам сустракалі першыя ваенныя сполахі жыхары старажытнага Віцебска.

«Віцебскі рабочы». 1941. 25 чэрвеня.

Першыя дні вайны

З успамінаў Усевалада Фёдаравіча Філатава, былога механіка дрожджавага завода. Пасля вайны жыў у Віцебску. Працаваў сакратаром Першамайскага райкома партыі г. Віцебска.

Калі пачалася вайна, дырэктар нашага завода Герцкін, дбайны гаспадар, быў у ад'ездзе, і мне давялося ўзяць на сябе клопаты па эвакуацыі прадпрыемства. Калі пагроза захопу Віцебска стала відавочная, прыняўся актыўна дзейнічаць толькі што створаны штаб эвакуацыі. Кожны дырэктар намагаўся атрымаць больш вагонаў і хутчэй вывезці абсталяванне, каб устанавіць яго на новым месцы, у тыле. Памятаю, як наш сусед, дырэктар фабрыкі акуляраў Міхельсон, пагражальна размахваў кулакамі, даводзячы: «У мяне лётныя акуляры. Акрамя нас іх ніхто ў Саюзе не выпускае. А вы мне даеце адзін вагон, а суседу два»... А я сваё: «Мае трубкі з чырвонай медзі — стратэгічная сыравіна, вельмі патрэбна сёння фронту. Можа там як раз узрыўных запалаў не хапае, медзі».

Дырэктар тытунёвай фабрыкі Школьнік (ён яшчэ хлапчуком пачаў працаваць на фабрыцы) ужо паспеў эвакуіраваць абсталяванне і людзей, і сам пакінуў Віцебск. Потым пра віцебскую махорку ведалі на ўсіх франтах.

Немцы набліжаліся да горада. Зачасціла варожая авіяцыя. Але панікі не было. Была праца да змору, у запале, з лаянкай, але грузілі ўсё строга па графіку. Мы пачалі эвакуацыю завода 5 ліпеня, і праз суткі былі гатовы ў шлях. Трубапровады загрузілі на адкрытыя платформы, электраматоры склалі ў крытыя вагоны. Трэба ж было адправіць у тыл рабочых і іх сем'і. Заставацца ў горадзе ніхто не хацеў. Жадаючых пакінуць Віцебск было шмат. А месц у вагонах няма. Людзі самі шукалі выйсце: ладзілі з дошак нары, вышуквалі месцы паміж станкоў. Кіраваў стары электрамеханік Вэбер, латыш, кемлівы і рупны, і яго вучань Алёха Мамойкін. Цяпер ён пенсіянер, жыве ў Мінску.

Раніцой 6 ліпеня эшалон рушыў на Пензу. Я застаўся ў Віцебску выконваць абавязкі механіка без асноўнай тэхнікі. Справа ў тым, што на заводзе была электрастанцыя, і на той выпадак, калі адключалася БелДРЭС, мы павінны былі забяспечваць работу хлебазавода і вадакачкі. Свой пост я не мог пакінуць ні днём, ні ўначы.

9 ліпеня самалёты ворага бамбілі мост і вакзал. Узмацніўся артабстрэл жылых кварталаў. Горад быў ахоплены дымам. Навокал неразбярыха. Стаў шукаць сувязь з падраздзяленнямі мясцовай супрацьпаветранай абароны, каб атрымаць дазвол пакінуць завод. Ніхто не адказваў. З'явілася думка ўзарваць завод, бо ён таксама быў замініраваны. Але я не меў на тое права. Па мабілізацыйнаму плану ўзарваць любое прадпрыемства ў горадзе магла і павінна была спецыяльная каманда. І тут паявіўся наш шафёр, Рыгор Гаранскі. Усе нашы машыны былі мабілізаваны, акрамя спісанага «зіла». Рыгор доўга корпаўся і адрамантаваў машыну. Прыхапілі мяшок сухароў, скрынку патронаў, вінтоўкі і раніцай 10 ліпеня выехалі на Суражскую шашу. Калі праехалі каля 20 км, машына заглохла. Нейкі адрэзак шляху цягнулі нас адступаўшыя вайскоўцы. Потым мы пайшлі пехатою, пад Суражам сустрэлі рэшткі нашага гарадскога знішчальнага батальёна і сакратароў гаркома партыі Левікава і Грыгор'ева. Далей мой шлях быў на фронт, пад Юхнава.

Пакідаў горад пад бомбамі

З успамінаў Р.Д.Дыменштэйна, жыхара г. Віцебска.

У нядзелю 22 чэрвеня 1941 г. а дванаццатай гадзіне дня хтось прыйшоў з родзічаў і кажа, што па радыё павінен выступаць Молатаў, тагачасны нарком замежных спраў, з якойсці важнай заявай.

Сказаць папраўдзе, абстаноўка ў тыя прадваенныя часы была грознаю. Штодня праводзіліся вучэнні супрацьхімічнай і супрацьпаветранай абароны, на прадпрыемствах чыталі лекцыі на абарончыя тэмы. А вясною 1941 г. шмат гарадской і вясковай моладзі накіравалі на новую граніцу будаваць доты. Быццам бы і рыхтаваліся да вайны. А вось калі па радыё перадалі, што нямецкія войскі ўварваліся на нашу тэрыторыю, аказалася, што ўсур'ёз ніхто не гатоў даць адпор агрэсару. Вестка гэтая ўсіх ашаламіла, але панікі не было. Праз дзень у нас на рабоце ўсіх мужчын прызыўнога ўзросту разлічылі, і яны адправіліся ў ваенкамат. Па радыё сталі перадаваць зводкі аб баявых дзеяннях на фронце — немцы хутка прасоўваліся ў глыбіню нашай краіны. Ніхто не разумеў, чаму Чырвоная Армія адступае, а не б'е ворага на яго тэрыторыі, як нас у гэтым запэўнівалі. А тут яшчэ дайшлі звесткі, што нямецкія самалёты ўжо бамбілі Мінск.

Мая сястра была членам партыі. Мы з ёй накіраваліся ў райком партыі (размяшчаўся на вуліцы Вакзальнай, цяпер Кірава), каб даведацца, што рабіць далей. У райкоме нікога не было. У райвыканкоме сустрэлі міліцыянера, які прапанаваў адправіцца на ўскраіну горада капаць супрацьтанкавы роў. Прыйшлі, а там ужо было шмат людзей. Усю тэрыторыю разбілі на ўчасткі, паказалі, як трэба капаць. Капалі акопы з раніцы да вечара. Сюды нам прывозілі хлеб і ваду, тут жа мы і начавалі пад адкрытым небам. Часта наляталі самалёты ворага, але мы хаваліся ў тым рове і чакалі. А ўначы з 8 на 9 ліпеня прыйшлі нейкія ваенныя і сказалі, што капаць акопы больш не трэба, прапанавалі разыходзіцца, бо немцы побач. Мы пайшлі на вакзал. Селі на цягнік і пад бомбамі паехалі ў Рудню. Рухаліся цягнікі па 2 лініях, суцэльным патокам, састаўленыя ўшчыльную вагон за вагонам. Увечары дабраліся да Рудні, адтуль пешшу дайшлі да Смаленска, з пустымі рукамі. Усе пажыткі пасажыраў засталіся ў вагонах.

У Віцебск вярнуліся толькі ў 1946 г., з Омскай вобласці і разам з усімі адраджалі яго. Горад ляжаў у руінах.

Сустрэлі ворага як след

Батальён Асаавіяхіма (450 чалавек, камандзір старшы лейтэнант І.П.Клёнаў, камісар Г.С.Усаценка) меў на ўзбраенні вінтоўкі, 3 станковыя і 6 ручных кулямётаў, 350 гранат. Яго байцы стойка абаранялі левы бераг Заходняй Дзвіны ў раёне Мазурына і ахоўвалі мост праз Дзвіну (зараз Кіраўскі). На світанку 10 ліпеня немцы спрабавалі фарсіраваць раку каля Мазурына на плытах. Апалчэнцы ружэйна-кулямётным агнём знішчылі каля 200 гітлераўцаў. У баі вызначыліся начальнік штаба батальёна старшы лейтэнант Лапаценка, які разам з двума байцамі вёў агонь са станковага кулямёта.

У раёне Журжава (у той час прыгарад Віцебска, цяпер у межах горада) у няроўным баі загінула амаль уся 1-я рота, але батальён Асаавіяхіма працягваў змагацца. 11 ліпеня апалчэнцы пакінулі Віцебск, частка з іх улілася ў Чырвоную Армію, частка ў рады падпольшчыкаў і партызан.

З успамінаў Г.С.Усаценкі, удзельніка абароны горада, былога камісара батальёна Асаавіяхіма.

25 чэрвеня.

Працуем у скверы паміж вуліцамі Леніна і Валадарскага, паблізу Дома настаўніка. Капаем абарончыя равы і акопы. Апоўдні мяне выклікаюць у Кастрычніцкі райком партыі і па ўзгадненню з ваенкомам прызначаюць камісарам роты Асаавіяхіма. Напэўна, успомнілі, што я армейскі палітработнік, хоць і ў запасе. Давялося развітацца з надзеяй вярнуцца ў кадравую армію. Прыступіў да фарміравання роты.

26 чэрвеня.

Ледзь размеркавалі людзей па ўзводах, паступіў загад: фарміраваць знішчальны батальён. Камандзірам прыслалі нейкага палкоўніка. Не паспелі як след пазнаёміцца, як яго адкамандзіравалі ў воінскую часць. Новым камбатам прызначаны старшы лейтэнант І.П.Клёнаў, начальнікам штаба — старшы

лейтэнант Лапаценка. Ім па 30 гадоў. Энергічныя, ініцыятыўныя камандзіры.

Штаб размяшчаем у клубе фабрыкі імя Клары Цэткін, што ў цэнтры горада над Віцьбай. Райком і ваенкамат няспынна падкідваюць папаўненне з тых, каго не прызываюць у армію — галоўным чынам студэнтаў. Большасць настроена патрыятычна, імкнецца хутчэй уступіць у дзеючую Чырвоную Армію. На наш «мясцовы батальён» глядзяць як на штосці часовае.

Касцяк батальна — апалчэнская рота, у якую ўваходзяць былыя армейскія камандзіры і палітрукі, камуністы. З маладымі апалчэнцамі праводзім заняткі. Вучым іх валодаць зброяй, укараняем армейскую дысцыпліну, праводзім палітычную работу. Словам, рыхтуем асабовы склад да адпору ворагу, вучым пільнасці. Выкарыстоўваем усё — газеты, зводкі Саўінфармбюро.

Са зброяй проста бяда. Многа старых вучэбных вінтовак, малакалібернай зброі. Не ўсім камандзірам дасталіся наганы. Надакучваем каменданту гарнізона і ваенкамату: «Давайце баявую зброю».

27 чэрвеня.

Прыступілі да аховы важнейшых аб'ектаў. Паслалі атрад тушыць пажар на аэрадроме. Полымя ўзнікла пасля бамбёжкі.

Завяршылі фарміраванне батальёна ў складзе 3 стралковых і кулямётнай рот.

28—30 чэрвеня.

Па ўказанню абкома КП(б)Б і ваенорганаў забіраюць нашу першую, затым другую і трэцюю роты. За 3 дні забралі 500 байцоў і камандзіраў. Разумеем — для выканання спецыяльнага задання. Тут жа даўкамплектоўваемся за лік рабочай і студэнцкай моладзі.

Непакояць «ракетчыкі». Са змярканнем з розных месц узлятаюць ракеты варожых лазутчыкаў. Прачосваем горад. Падазроных асоб затрымліваем і дастаўляем у штаб воінскай часці ці ў адзел НКУС.

2 ліпеня.

Па маіх падліках, за гэты час праз батальён прайшло звыш тысячы байцоў і камандзіраў. Нарэшце мы атрымалі зброю — новенькія вінтоўкі і станковыя кулямёты, патроны. Кожнаму байцу ўручылі па 2 бутэлькі з запальнай сумессю для барацьбы з варожымі танкамі. Часткова выдалі абмундзіраванне. Нам прыслалі медсясцёр.

Начальнік штаба Лапаценка прынёс трывожныя звесткі: ёсць небяспека пераправы фашыстаў цераз Дзвіну ў раёне Мазурына. Маскіруючыся, падыходзім да высокага берагу. Ля самай вады ўбачылі варожую групу, якая рыхтавалася да пераправы.

Вырашаем, што трэба перакінуць сюды на 2 аўтамашынах узвод з вінтоўкамі, ручным і станковым кулямётамі. А «галоўныя сілы» ў пешым страі рухаюцца да Мазурына і сканцэнтроўваюцца ў гаі.

...Сцямнела. Гітлераўцы пачалі грузіцца на плыты. Іх сотні.

Мы адкрылі агонь з кулямётаў і вінтовак. Злева няспынна страчыў яшчэ адзін кулямёт — там занялі абарону чэкісты.

Першая спроба гітлераўцаў пераправіцца цераз Дзвіну была адбіта з вялікімі для іх стратамі. На беразе засталося звыш сотні трупаў.

9 ліпеня, 12 гадзін.

Узыходзіла сонца. Гітлераўцы зрабілі другую спробу фарсіраваць раку з боем. Бой працягваўся некалькі гадзін. У поўдзень стала вядома, што праціўнік пераправіўся цераз Заходнюю Дзвіну на поўнач ад Мазурына. Узнікла пагроза, што фашысты выйдуць нам у тыл і адрэжуць ад горада.

9 ліпеня, 16 гадзін.

Батальён займае абарону фронтам да Мазурына. Разведгрупа і добраахвотнікі-піянеры паведамілі: на тэрыторыі Мазурына паявіліся гітлераўцы.

Праз гадзіну завязалася перастрэлка.

Усяго ў аперацыях за 8 і 9 ліпеня было знішчана да батальёна нямецка-фашысцкіх войск

10 ліпеня, 21 гадзіна.

Камбата і мяне выклікалі ў штаб дывізіі народнага апалчэння (на вуліцу Леніна). У зале чалавек 20—30. Выступіў нейкі капітан з НКУС, азнаёміў з аператыўнай абстаноўкай.

Наш батальён павінен быў заняць пазіцыю разам з воінскай часцю каля Заходняй Дзвіны на поўнач і паўночны-захад ад Віцебска.

10 ліпеня, 23 гадзіны.

Прыбылі з камбатам на новую пазіцыю, батальён заняў намечаны рубеж абароны.

11 ліпеня.

Калі развіднела, стала ясна: пазіцыя праходзіць па лясістай мясцовасці. З-за густых хмызнякоў агляду няма. Камбат вырашыў перасунуць роты наперад. Але позна. Варожыя аўтаматчыкі прасачыліся ў хмызнякі і пачалі атакаваць батальён.

11 ліпеня, 5 гадзін раніцы.

Вядзём бой. Варожае камандаванне ўвяло ў дзеянне свежыя сілы, тэхніку. На нас абрушыўся шквал артылерыйскага агню.

Нарастае шум танкаў. Падаюць забітыя і раненыя, мы нясём страты. Ранены камбат. Рэшткі батальёна змушаны былі адыходзіць на Сураж, дзе яны зліліся з часцямі Чырвонай Арміі.

* * *

Пра баявыя дзеянні байцоў-апалчэнцаў гэтага батальёна сведчыць наступны дакумент.

«У ноч з 12 на 13 ліпеня ў сувязі з адступленнем часцей Чырвонай Арміі батальён адступіў да Суража, дзе меў бой з дэсантам праціўніка.

Батальён звязаўся з камандаваннем часцей Чырвонай Арміі і ў кантакце з імі ўдзельнічаў у баях з 9 ліпеня па 13 ліпеня ўключна. Па звестках, рэшткі батальёна ўліліся ў часці Чырвонай Арміі».

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

Мы былі ў народным апалчэнні

З успамінаў А.І.Когана, былога студэнта Віцебскага педінстытута.

Пазней Аляксандр Іосіфавіч Коган ваяваў у складзе 18-й арміі пад Туапсе, удзельнічаў у марскіх дэсантах у раёне Наварасійска, Керчанскага паўвострава. Быў паранены на мысе Херсанес. Удзельнічаў у штурме Севастопаля. Інвалід Айчыннай вайны. Жыве ў Віцебску.

У чэрвені 1941 г. я скончыў трэці курс Віцебскага педінстытута. Наперадзе — канікулы. Нядоўгія зборы ў піянерскі лагер, які размяшчаўся ў Старым Сяле, дзе мяне чакала работа старшага піянерважатага.

Страшная вестка: вайна! Трагізм яе дайшоў да нашай свядомасці не адразу. Мы былі выхаваны на сталінскіх словах: нам чужой зямлі не трэба, але і сваёй ні пядзі не аддадзім.

Кожны дзень уставалі з думкай: сёння фашыстаў пагоняць назад. Мы мацней. Калі ў піянерлагер прыязджалі бацькі, каб забраць дзяцей, мы супакойвалі іх: чаго панікуеце? Пакуль закончыцца змена ў лагеры, вайне будзе канец.

А тым часам у Віцебску разбамбілі універмаг. Не стала многіх дамоў, іншых збудаванняў. Над горадам па многу разоў у дзень разгараліся паветраныя баі.

Мы вырашылі вывесці дзяцей з лагера. Транспарт ужо не хадзіў. Да Віцебска дабіраліся пехатою.

Студэнты інстытута збіраліся ў асноўным у інтэрнаце па вуліцы Фрунзе. Хлопцы імкнуліся ў бой. Панікі не было.

Частка студэнтаў капала акопы за горадам, частка «атакавала» прызыўны пункт, каб хутчэй трапіць на фронт. У пачатку ліпеня камітэт камсамола (тады яго ўзначальваў Сямён Фрыдман) прапанаваў жадаючым уступіць у народнае апалчэнне.

Мы, группа студэнтаў, сталі яго байцамі. Кожны раён горада меў сваё падраздзяленне. Штаб нашага знаходзіўся ў клубе імя Клары Цэткін (цяперашні акадэмічны тэатр). Камандзірам падраздзялення быў вайсковец Клёнаў, камісарам — Усаценка.

Апалчэнцы занялі пазіцыі ў раёне парка Мазурына. Перад гэтым мы атрымалі зброю. Гэта была вучэбная зброя ДТСААФ, ваенных кафедраў інстытутаў. Некалькі вінтовак атрымалі і ў штабе корпуса, які размяшчаўся па вуліцы Суворава.

Хлопцы ў нашым атрадзе былі розныя па ўзросту. Большасць маладых, але нямала было і людзей больш сталых. З нашага інстытута там было некалькі дзесяткаў чалавек. Пэўна, нашы студэнты былі і ў іншых падраздзяленнях. Я помню байцоў-апалчэнцаў: Валодзю Глебава, Стаса Саўрыцкага, Валодзю Казлова (загінуў пад Масквой), Жэню Дударава (пасля вайны працаваў сакратаром Шумілінскага райкома партыі). Сярод апалчэнцаў былі і старшакласнікі, і нямала дзяўчат.

На беразе Дзвіны мы прынялі першы бой. Нямецкія войскі на гэтым ўчастку не змаглі пераправіцца цераз раку. Пасля баёў частка апалчэнцаў нашага падраздзялення рушылі ў напрамку Суража. Некаторыя сталі партызанамі.

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

У тыя першыя дні

З успамінаў Г.А.Марчанкі, былой студэнкі педінстытута.

22 чэрвеня наша студэнцкая лёгкаатлетычная каманда павінна была ехаць на спаборніцтвы ў Мінск. З раніцы мы сабраліся на стадыёне, каб правесці апошнюю трэніроўку. Пазаймаліся да паўдня, а потым усёй гурбою пайшлі дадому. На вуліцах панавала нейкае незвычайнае ажыўленне: маса народу, іграюць гармонікі, некаторыя жанчыны плачуць. Нам сказалі, што пачалася вайна. Нашы хлопцы ідуць на фронт.

Хуценька пабегла да мамы на пошту (яна там працавала), адтуль у інстытут. Тут ужо

поўным ходам пераабсталёўвалі аўдыторыі і кабінеты пад шпітальныя палаты. У работу ўключылася і я. Працавалі да знямогі. Інстытут наш тады быў насупраць цэнтральнага універмага. Вечарам горад быццам вымер — ні агеньчыка, ні людзей не відаць.

Экзамены перанеслі на нейкі час, не да таго было. Студэнты і выкладчыкі расстаўлялі бальнічную мэблю, а нас адправілі на Маркаўшчыну. Там у памяшканні 18-й сярэдняй школы рыхтавалі яшчэ адзін шпіталь. Папрасіліся, каб узялі медсёстрамі, але нам адмовілі. Пайшлі ў ваенкамат, на вуліцу Суворава, а тут многа людзей. На фронт нас не ўзялі. І ўсё ж такі санітаркамі ў шпіталь некаторыя нашы дзяўчаты трапілі. Да 3 ліпеня ў наш шпіталь не паступала ніводнага параненага, відаць, не паспявалі давезці. Таму наш шпіталь хутка згарнулі, а ўсю маёмасць пагрузілі ў таварныя вагоны. Паўскоквалі ў вагоны і мы, калі ўжо цягнік крануўся. Але як толькі цягнік выйшаў за гарадскі семафор, на эшалон наляцелі нямецкія бамбардзіроўшчыкі. На шчасце, абышлося без ахвяр. У дарозе нас некалькі разоў абстрэльвалі нямецкія самалёты, і мы панеслі цяжкі ўрон. Нарэшце стала вядома, што едзем пад Маскву, у Валакаламск. З таго часу ўсю вайну я працавала ў шпіталі.

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

Уперадзе чакаў Сураж

У 1930-я гады я працаваў у Віцебску ў органах міліцыі. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, мяне прызначылі намеснікам камандзіра роты.

У першы бой мы ўступілі на Успенскай горцы. Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка нам прыйшлося адступіць да вёскі Журжава. Побач у лесе высадзіўся варожы дэсант. Мы ўступілі ў бой і знішчылі яго. Гэта дало магчымасць нашым часцям бесперашкодна адысці на новыя пазіцыі пад Сураж.

А.Чачураў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

Цяжкія гады акупацыі

11 ліпеня 1941 г. нямецка-фашысцкія войскі ўвайшлі ў Віцебск. Пачаўся цяжкі перыяд акупацыі, які скончыўся толькі 26 чэрвеня 1944 г. Увесь гэты час Віцебск знаходзіўся ў складзе тылавога раёну групы армій «Цэнтр», дзе ўлада была сканцэнтравана ў руках ваеннага кіраўніцтва, а выканаўчымі органамі былі палявыя і падначаленыя ім мясцовыя камендатуры.

У горадзе знаходзіўся штаб 59-га армейскага корпуса. Віцебск быў напоўнены фашысцкімі карнымі органамі: Абвер – група 113, Абвер – група 318, Абвер – група 210, падраздзяленні тайнай палявой паліцыі ГФП – 703 і ГФП – 717. Акрамя таго, у горадзе былі сканцэнтраваны вялікія сілы жандармерыі, войск СС, ахоўнай паліцыі, а таксама штурмавыя атрады. Актыўна дзейнічала і мясцовая паліцыя – аддзела аховы парадку гарадской управы і крымінальны аддзел пры ім.

Яшчэ 3 ліпеня 1941 г. пачалася эвакуацыя з Віцебска і вобласці матэрыяльных і культурных каштоўнасцей. У тыл былі накіраваны 2500 вагонаў з сыравінай, абсталяваннем і гатовымі вырабамі, была вывезена маёмасць 37 буйных прадпрыемстваў (у т.л. звыш 1000 металаапрацоўчых станкоў, трансфарматар нае абсталяванне і ўвесь запас каляровых металаў). Тое, што нельга было эвакуіраваць прыйшлося знішчыць. Справу разбурэння давяршылі ваенныя дзеянні. Такім чынам, ужо ў самым пачатку вайны горад быў зруйнаваны.

У Віцебску, які быў стратэгічна важным пунктам і ў якім былі сканцэнтраваны буй-

Віцебск у перыяд акупацыі.

Будынак, у якім размяшчалася фельдкамендатура.

Будынак на вул. Крылова, у якім размяшчалася гестапа.

ныя ваенныя сілы ворага, гітлераўцам неабходна было мець шэраг прамысловых прадпрыемстваў і працоўную сілу з ліку мясцовага насельніцтва для іх абслугоўвання. Таму ў дапамогу ваеннай камендатуры быў створаны дапаможны адміністрацыйны апарат у выглядзе Віцебскай гарадской управы.

Дакументы пра дзейнасць управы ў ліпені - пачатку верасня 1941 г. не захаваліся, але па дадатковых дадзеных можна зрабіць вывад, што яна функцыянавала з 20 ліпеня 1941 г. За час свайго існавання ўправа 3 разы арганізоўвалася (у канцы снежня 1941 г., у красні 1942 г., і ў канцы снежня 1943 г.). З студзеня 1942 г. ў яе склад уваходзілі 13 аддзелаў (прэзідыум на чале з бургамістрам, харчова-гандлёвы, гарадской гаспадаркі, жыллёвы, аховы здароў'я, аховы гораду, культуры і асветы, ветэрынарны, транспартны, працы, фінансавы, грамадскага (сацыяльнага) забеспячэння, агульны). З 10 верасня 1942 г., пасля чарговай рэарганізацыі, у складзе ўправы засталося 8 аддзелаў (гарадской гаспадаркі, аховы гораду, аправізацыі (харчавання), фінансаў, аховы здароў'я, культуры і асветы, жыллёвы, агульны), а з 22 снежня 1943 г. — усяго 3 (агульны, фінансавы і жыллёвы). Са снежня 1943 г. сапраўдная дзейнасць Віцебскай гарадской управы спынілася. Амаль усё насельніцтва горада (12 тыс. з застаўшыхся 15 тыс.) было прымусова заключана ў працоўныя лагеры.

З самага пачатку дзейнасці. Віцебскую гарадскую ўправу ўзначальваў бургамістр Л.Г.Брандт. З 20 жніўня 1941 г. і да снежня 1943 г. У.Ф.Родзька — актыўны дзеяч беларускага нацыяналістычнага руху. У 1939 г. ён апынуўся ў нямецкім палоне і стаў на шлях актыўнага супрацоўніцтва з фашыстамі. У 1941 г. У.Родзька быў уключаны ў склад беларускай эмігранцкай арганізацыі «Цэнтр», якая планавала пры падтрымцы «Абвера» аб-

Разбураны Віцебск.

вясціць сябе часовым урадам захопленай немцамі Беларусі. У.Родзька карыстаўся даверам лідэраў беларускай эміграцыі, але шпіёніў за імі на карысць германскай разведкі. У 1942 г. ён стварыў нелегальную Беларускую незалежную партыю, каб, па ўказанню немцаў, унесці раскол у нацыянальны беларускі рух. Быў членам прэзідыума Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР). У снежні 1943 г. У.Родзьку адклікалі ў Мінск, дзе ён пачаў актыўную дзейнасць па стварэнню Беларускай Краёвай Абароны і прымаў удзел у працы 2-га Усебеларускага кангрэсу. У 1944 г. за ўдзел у карнай аперацыі супраць партызан ён быў узнагароджаны Жалезным крыжам 2-га класа. У 1945 г. служыў у разведвальна-дыверсійнай школе ў мястэчку Дальвіц. У красавіку 1945 г. прызначаны віцэ-прэзідэнтам БЦР. Пасля з дыверсійнымі мэтамі быў закінуты ў Беласток, арыштаваны там восенню 1945 г. і ў 1946 г. прыгавораны да расстрэлу. На допыце У.Ф.Родзька прызнаў, што калі быў бургамістрам Віцебска, то садзейнічаў расстрэлу 5 тыс. яўрэяў і вывазу ў Германію каля 1 тыс. чалавек.

Віцебская гарадская ўправа, на чале якой стаяў У.Родзька, знаходзілася пад кантролем палявой і мясцовай камендатур, атрымлівала ад іх указанні і загады. Трэба адзначыць, што ўправа не была і не магла быць органам самакіравання ва ўмовах акупацыйнага рэжыму, хоць менавіта так сцвярджала фашысцкая прапаганда, бо ўся яе дзейнасць была накіравана на забеспячэнне патрэб у першую чаргу нямецка-фашысцкіх войск.

Надпісы на сценах дамоў у акупіраваным Віцебску.

Так, пад кіраўніцтвам управы ў першыя месяцы акупацыі, у адпаведнасці з планамі германскага камандавання па эканамічнаму выкарыстанню акупаваных тэрыторый, былі здзейснены захады па аднаўленню некаторых буйных прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці і энергетычнага комплексу. З лістапада 1941 года пачалі працаваць кавальскі, слясарна-механічны, ліцейны і дрэваапрацоўчы цэхі Віцебскага чыгуналіцейнага завода, дзе выраблялiся запасныя часткі да сельскагаспадарчых машын (напэўна, гэта быў заказ германскіх улад, для якіх галоўнай мэтай было забеспячэнне войска харчаваннем). Таксама на заводзе была наладжана вытворчасць пэўных тавараў народнага спажывання, якія выкарыстоўваліся і для патрэб арміі (цвікі, патэльні, ложкі і інш.). У канцы лістапада за-

Жыхары Віцебска, павешаныя каля будынка краязнаўчага музея.

Нямецкі патруль правярае дакументы ў жыхароў горада.

вод выдаваў прадукцыі на 350 – 400 тыс. руб. штомесячна, там працаваў 121 чалавек, планавалася адрамантаваць плужны і гальванічны цэхі. Вясной 1942 г. завод павінен быў забяспечыць вытворчасць 30 тыс. плугоў, 10 тыс. барон і 8 тыс. калёсаў, якія былі неабходны для паспяховага правядзення сяўбы і бесперапыннага забеспячэння германскага войска харчаваннем, бо пасля перамогі Чырвонай Арміі пад Масквой стала зразумела, што вайна зацягнецца.

Адной з галоўных задач, якія ставіліся перад мясцовай адміністрацыяй, быў кантроль і ўлік насельніцтва, якое кіраўніцтва трэцяга рэйху планавала выкарыстоўваць у якасці працоўнай сілы. Да вайны ў Віцебску жыло 180 тыс. чалавек, у верасні 1941 г. – 64 тыс., на 1.11.1941 г. – 54 588, на 1.5.1942 г. – 39 107, а ў жніўні 1942 г. колькасць насельніцтва зменшылася да 33 508 чалавек. Апошняе рэзкае змяншэнне колькасці жыхароў было выклікана кампаніяй па іх прымусоваму ўгону ў Германію. Пасля гэтага на працягу амаль года ўзровень насельніцтва не змяніўся (у лістападзе 1943 г. ў Віцебску жыло 33 216 чалавек). У лютым 1944 г. ў сувязі з наступленнем савецкіх войск большасць жыхароў горада была прымусова вывезена ў працоўныя лагеры, а сам Віцебск фашысты ператварылі ў моцны ўмацаваны раён. Усяго ж за гады акупацыі ў Віцебску гітлераўцы знішчылі 62 тыс. мірных грамадзян і 76 тыс. ваеннапалонных.

Цэнтральнае месца ў арганізацыі вывазу і эксплуатацыі насельніцтва адводзілася менавіта гарадской управе. Ужо з кастрычніка 1941 г. ў пашпартным стале і аддзеле працы абавязаны былі рэгістравацца ўсе навапрыбыўшыя грамадзяне, юнакі ад 16 да 18 гадоў і беспрацоўныя. На 1.11.1941 г., па звестках управы, было 7688 беспрацоўных, а да 1.8.1942 г. афіцыйныя справаздачы абвясцілі пра амаль поўную ліквідацыю беспрацоўя. Гэта было зроблена за кошт прымусовай адпраўкі грамадзян на працу ў Германію, дзе іх сустрэлі вельмі цяжкія ўмовы жыцця.

Але насельніцтва ў Віцебску апынулася ў яшчэ больш горшым становішчы, бо фактычна было на мяжы харчовага і таварнага голаду. Адразу пасля пачатку акупацыі і на працягу ўсяго перыяду выдача харчовых прадуктаў ажыццяўлялася гарадской управай па картках, якія падзяляліся на 2 віды: для ра-

Павешаныя фашыстамі грамадзяне Віцебска.

бочых і служачых і для ўтрыманцаў, да якіх адносілі хлопчыкаў да 14 гадоў, дзяўчынак да 16 гадоў, мужчын пасля 60 і жанчын пасля 55 гадоў. Карткі на ўсю сям'ю атрымліваў працаўнік, таму для бессямейных інвалідаў складаліся асобныя спісы; забеспячэнне непрацуючых было абмежаваным і ажыццяўлялася ў апошнюю чаргу. У далейшым насельніцтва было падзелена на 3 групы: працаўнікі; члены іх сем'яў; беспрацоўныя і інваліды. Першая група атрымлівала хлебна-харчовыя і сталовыя карткі, другая — толькі хлебна-харчовыя, а трэцяя група наогул забяспечвалася ў апошнюю чаргу і ў залежнасці ад запасаў. Нормы харчавання былі недастатковыя. Напрыклад, у ліпені 1942 г. чыгуначнікі атрымлівалі на месяц 6 кг мукі, 400 г цукру, 400 г маргарыну, 400 г павідла і 280 г солі. Пры гэтым забеспячэнне харчам дадзенай катэгорыі працаўнікоў было найлепшым, бо яны павінны былі ажыццяўляць бесперапынную чыгуначную сувязь паміж фронтам і тылам. Надалей харчовыя нормы памяншаліся: у снежні 1942 г. на розныя віды картак выдавалася ўсяго ад 8 да 12 кг бульбы, 500 г солі на дарослых і 250 г на дзяцей; з-за адсутнасці прадуктаў была закрыта сталоўка, дзе па спецыяльных картках маглі раней харчавацца рабочыя.

Сістэма забеспячэння па картках была дзейсным інструментам па прыцягненню насельніцтва да працы і кантролю за яе выкананнем. Здабыць прадукты без карткі было практычна немагчыма, бо, нягледзячы на дазвол уладамі прыватнага гандлю, сяляне амаль не вывозілі сваю прадукцыю ў горад. Таму мясцовым жыхарам прыходзілася ісці на прымусовае супрацоўніцтва з фашыстамі і ўладкоўвацца на працу, знаходзячыся пад пастаяннай пагрозай пазбаўлення за нязначны промах сродкаў да існавання.

Вельмі цяжкім было і становішча з прамысловымі таварамі. Нягледзячы на частковае аднаўленне ў Віцебску працы некаторых прадпрыемстваў і дазвол прыватнага прадпрымальніцтва, гараджане адчувалі вялікую патрэбу ў прадметах першай неабходнасці. Працаўнікі атрымлівалі спецыяльныя карткі для набыцця некаторых тавараў. У маі 1942 г. на тыдзень рабочы мог набыць шкляны ці гліняны посуд — 1 прадмет; 2 пачкі запалак; іншыя дробныя прадметы ўжытку — без картак (але ў продажы яны фактычна адсутнічалі). Цэны на рынку былі высокія, не дазвалялі на зарплату набыць нават самае неабходнае. Напрыклад, летам 1942 г. 1 л малака каштаваў 1,25 марак, шклянка смятаны — 2 маркі, 50 г тытуню — 5 марак, ношанае мужчынскае паліто — 200 марак. А заробак рабочых (напрыклад, у чыгуначным дэпо) складаў 30—50 марак у месяц. Неабходна таксама ўказаць, што насельніцтва было абкладзена вялікай колькасцю падаткаў і збораў, з якіх фарміраваўся бюджэт Віцебскай гарадской управы.

Адна з прыкмет «новага парадку».

Напрыклад, 24.9.1941 г. бургамістр У.Родзька падпісаў праекты па падаткаабкладанню, якія былі распрацаваны на аснове спецыяльнага распараджэння палявой камендатуры. З гэтага часу ўводзіліся падаткі з будынкаў, пазямельны, гандлёва-прамысловы, падаходны, з жывёлы, акцызы на прадукты шырокага спажывання, зборы за права гандлю на базары, за медыцынскі агляд і дазвол на продаж прадуктаў харчавання, за ўстаноўку нумароў дамоў, за выдачу пашпартоў і іх прыпіску і іншае. Са студзеня 1942 г. насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 60 гадоў абавязана было працаваць таксама падушны падатак, які ў розныя перыяды складаў ад 30 да 120 руб. на год.

Найбольш цярпелі ў гэтых цяжкіх умовах тыя, хто не меў магчымасці працаваць — пенсіянеры, інваліды, якіх ў студзені 1942 г. налічвалася каля 6 тыс. чалавек. У першы перыяд акупацыі з прапагандысцкімі мэтамі, каб стварыць у вачах мясцовага насельніцтва прыхільны вобраз новай улады, у складзе гаруправы быў створаны аддзел сацыяльнага забеспячэння, які ўзяў на сябе клопаты аб гэтай катэгорыі грамадзян. Аддзел плаціў пенсіі, аднаразовую дапамогу, раздаваў хлебныя



Разбураны будынак чыгуначнага вакзала.

і харчовыя карткі, прадукты, уладкоўваў сваіх падапечных на працу. Але гэтая дапамога была вельмі сціплай і аказвалася толькі невялікай частцы пенсіянераў: у студзені 1942 г. пенсію памерам ад 30 да 300 руб. (3—30 марак) атрымлівалі толькі 205 чалавек, а ў далейшым пастаянныя выплаты пенсій спецыяльным указам камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» наогул былі забаронены, дазвалялася толькі выдаваць аднаразовую грашовую дапамогу па 50—60 руб. (5—6 марак). Германскае камандаванне не жадала выдаткоўваць сродкі на ўтрыманне непрацаздольнага насельніцтва. Пры гэтым грошы на сацыяльныя патрэбы паступалі ад жыхароў акупіраванага горада ў выглядзе спецыяльнага 4%-нага падатку з зарплаты, які пачаў збірацца са студзеня 1942 г.

Асаблівую цікавасць выклікаюць адносіны акупантаў да медыцынскага абслугоўвання мясцовага насельніцтва. Маючы на мэце прадухіленне эпідэмій інфекцыйных захворванняў у сваім тыле, нямецкае камандаванне надавала пытанням аховы здароў'я вялікую ўвагу. Пры Віцебскай гарадской управе быў створаны аддзел аховы здароў'я, у горадзе мелася 4 бальніцы, паліклініка, 4 амбулаторыі, 2 аптэкі. За кастрычнік—снежань 1941 г. ўсе гэтыя ўстановы абслужылі 51 960 чалавек, аптэкі выдалі лекаў па 31 731 рэцэпту, а выдаткі на ахову здароў'я за гэты перыяд, па сцверджанні акупацыйнай прэсы, склалі 1 млн. руб. Лячэбныя ўстановы ў першую чаргу забяспечваліся харчаваннем ад палявой камендатуры, харчовага аддзела гаруправы і ўласнай прысядзібнай гаспадаркі; камендатура таксама забяспечвала бальніцы і амбулаторыі лекамі і медыкаментамі. У медыцынскіх установах Віцебска абслугоўваліся гараджане і сельскія жыхары, праводзілася ўсеагульная вакцынацыя і санапрацоўка насельніцтва; тут жа праводзіўся агляд людзей, што выязджалі на прымусовую працу ў Германію. Але існавала і шмат праблем: не хапала медыкаментаў, бялізны, нават звычайнай солі для лабараторных даследаванняў, з-за адсутнасці электрычнасці нярэдка прастойваў рэнтгенкабінет. Медперсанал атрымліваў маленькі заробак. Камендатура пастаянна патрабавала ад грамадзянскіх медыцынскіх устаноў скарачэння заказаў на лекі і больш эканомнага іх выкарыстання. Нельга забываць, што клопат пра здароў'е насельніцтва з боку акупантаў тлумачыўся прагматычна: неабходнасцю мець здаровую працоўную сілу, прыдатную да эксплуатацыі, а таксама страхам эпідэмій у тыле.

Разбураны Віцебск. Тут знаходзілася гарадская ратуша.

Акрамя эканамічных і сацыяльных пытанняў, акупацыйныя ўлады надавалі вялікую ўвагу сферы культуры, выкарыстоўвалі яе ў прапагандысцкіх мэтах. Ужо з першых дзён стварэння гаруправы пры ёй дзейнічалі аддзелы культурных устаноў і інфармацыі, якія пазней былі аб'яднаны ў адзел асветы і прапаганды. У асобны аддзел выдавецтва былі выдзелены рэдакцыя газеты «Віцебскія ведамасці» і друкарня гарадской управы, яго ўзначаліў сын намесніка бургамістра Л.Г.Брандта Аляксандр Брандт. Прэса, лістоўкі і радыё былі асноўнымі сродкамі фашысцкай прапаганды. У Віцебску з 2 жніўня да 3 снежня 1941 г. з перыядычнасцю 2 — 3 разы на тыдзень выдавалася газета «Віцебскія ведамасці», а з 7 снежня 1941 г. да 18 чэрвеня 1944 г. — «Новы шлях». Са старонак гэтых газет праводзілася актыўная прафашысцкая прапаганда, якая спрабавала падаць «новы парадак» як вялікае шчасце, прынесенае нямецкай арміяй-«вызваліцельніцай» прыгнечанаму бальшавікамі народу Беларусі; акрамя таго, гэтыя выданні мелі відавочную антысеміцкую накіраванасць.

У пачатку вайны з Віцебска не паспелі эвакуіраваць усе музейныя каштоўнасці, архіўныя дакументы і кнігі, музеі і бібліятэкі горада былі разрабаваны. Восенню 1941 г. гарадская ўправа занялася гэтым пытаннем і патрабавала ад насельніцтва вярнуць украдзеныя музейныя экспанаты і бібліятэчныя кнігі. Аднак музеі ў перыяд акупацыі так і не былі адкрыты, а іх найбольш каштоўныя экспанаты апынуліся ў Германіі. Вельмі пацярпеў архіў: з-за пашкоджанняў даху будынка дакументы заліваліся вадой і прыходзілі ў непрыгоднасць.

Для патрэб працаўнікоў управы з мэтай выкарыстання ў далейшым для выкладання ў школах была створана спецыяльная бібліятэка, дзе ў ліпені 1942 г. налічвалася 8736 кніг. Выданні зведалі цэнзуру: з іх было выкраслена ўсё, што магло нагадаць пра савецкі перыяд. Карыстанне бібліятэкай было платнае, а доступ у яе абмежаваны — у асноўным для працаўнікоў гарадской управы.

Перад наступленнем савецкіх войск у час ваенных дзеянняў установы культуры Віцебска былі поўнасцю знішчаны нямецка-фашысцкімі акупантамі.



Разбураны будынак былога гарадскога тэатра ў Віцебску.

Такім чынам, перыяд акупацыі стаў для насельніцтва Віцебска найцяжэйшым выпрабаваннем. Гітлераўцы максімальна імкнуліся выкарыстаць эканамічныя, сыравінныя і людскія рэсурсы заваяваных тэрыторый вымушаючы насельніцтва клапаціцца аб уласным выжыванні. Для падтрымкі парадку і з мэтай прапаганды была арганізавана Віцебская гарадская ўправа, якая імітавала самакіраванне, але рэальна з'яўлялася саўдзельніцай фашыстаў у эксплуатацыі і рабаванні горада і яго жыхароў. Насельніцтва было пазбаўлена элементарных выгод (газа, вады, электрычнасці), апынулася на мяжы харчовага і таварнага голада, выкарыстоўвалася на прымусовай працы. Нямецкая прапаганда падавала некаторыя мерапрыемствы новай улады (напрыклад, у сферы медыцынскага абслугоўвання, уласнага прадпрымальніцтва, культуры) як «клопат» пра беларусаў, вызваленых ад ланцугоў бальшавізму.

На самой справе гэтыя мерапрыемствы тлумачацца імкненнем германскага камандавання зняць з сябе турботы пра насельніцтва акупіраваных тэрыторый і забяспечыць санітарны парадак у тыле сваёй арміі, а таксама больш эфектыўна ажыццяўляць эксплуатацыю і выкарыстанне акупіраванай зоны.

А.В.Бяляеў.

Дакументы сведчаць

З ДАКЛАДА ОРТСКАМЕНДАТУРЫ 1/262 (МЯСЦОВАГА ГАРНІЗОНА) АД 14.5.1942 г.

За час ад 1.4. да 15.5.1942 г. было затрымана 843 чалавекі з-за забароненага наведвання базару; у той жа час праведзена 46 арыштаў за крадзёж. Далей было арыштавана 35 чалавек з-за парушэння рабочай дысцыпліны; акрамя таго, 541 чалавек з-за адсутнасці (недастатковае афармленне) дакументаў. ГФП і СД перададзены 25 чалавек на ўстанаўленне асобы.

Л-нт Бюхель.

СПРАВАЗДАЧА ОРТСКАМЕНДАТУРЫ 1/162

Раздзел «Бяспека і парадак»

Бяспека і парадак унутры горада забяспечваюцца цераз фельджандармерыю, СД, ГФП і рускую ОД. За час з 15.5.42 па 14.6.42 былі арыштаваны асобы:

176 чалавек за неафармленне дакументаў;
245 чалавек за наведванне базару;
72 чалавекі за хаджэнне ў забаронены час;
31 чалавек за падазрэнне ў венерычных захворваннях;
15 чалавек за ўхіленне ад работы;
1 чалавек (рускі) за падазрэнне ў пашкоджанні кабеля;
1 чалавек за вядзенне агітацыйных размоў.

Для навядзення парадку фельдкамендатурай суд прысудзіў за справаздачны перыяд 815 чалавек да расстрэлу, пакаранне смерцю цераз павешанне — 3 мужчын і 3 жанчын. Дзве з гэтых жанчын венерычна хворыя, уцяклі з бальніцы.

Пераклад з нямецкай мовы. Скарочаны варыянт.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2155, воп. 1 с, л. 1.

З ЗАКЛЮЧНЫХ ДАКЛАДАЎ ПА «ВІЦЕБСКАЙ СПРАВЕ» КАМАНДАВАННЮ 3-й ТАНКАВАЙ АРМІІ, «І-Ц» (АДДЗЕЛ КОНТРРАЗВЕДКІ)

ад 17.5.1943 г.

Супрацоўнікі 703-й групы тайнай палявой паліцыі, якія з лютага 1943 у якасці агентаў, пасланыя ў Віцебск, умела накіроўваліся унтэр-афіцэрам і перакладчыкам Пячонкіным, за мінулы перыяд звязаліся з шэрагам асоб, што займаліся антыгітлераўскай дзейнасцю, у прыватнасці, шпіянажам, пастаўкай зброі і боепрыпасаў, антыгерманскай прапагандай і падтрымкай шпіёнаў і бандытаў...

У якасці важнейшых вынікаў праведзенага да гэтага часу расследавання належыць указаць...

2. Выяўленне шпіёна Белахвосцікава, які са шматлікімі памочнікамі збіраў інфармацыю ў Віцебску і перадаваў яе бандзе Шчарбакова з брыгады «Аляксея». Па гэтай справе арыштаваны 4 шпіёны...

20) Белахвосцікаў Аляксандр. Доўгі час працаваў са шпіёнамі. Падтрымліваў сувязь з камісарам Шчарбаковым з брыгады «Аляксея».

...Прымушаў розных людзей ў Віцебску перадаваць яму інфармацыю, апрацоўваў яе і перадаваў цераз сувязных у брыгаду «Аляксея».

21) Марыя Белахвосцікава, сястра вышэйназванага, ведала, чым займаецца яе брат, і выконвала яго справы, калі ён адсутнічаў.

. . . . . .

23) Шалаеў Сяргей. Быў даверанай асобай і саратнікам Белахвосцікава. Ён сістэматычна перадаваў яму даныя аб войсках, размешчаных у Віцебску...

З усіх арыштаваных да гэтага часу расстраляны асобы, якія названы пад пунктамі (нумарамі)... 20, 21, 22, 23...

Штаб групы апрацоўвае і будзе яшчэ на працягу значнага часу апрацоўваць і вывучаць «Віцебскую справу», па якой да гэтага часу арыштавана 29 чалавек.

ад 25.5.1943 г.

Белахвосцікаў і 4 яго саўдзельнікі былі арыштаваны і расстраляны, адна са шпіёнак (Паліна Шлякава. — *Рэд.*) патрэбна для далейшага следства...

Пераклад з нямецкай мовы. З матэрыялаў УКДБ па Віцебскай вобласці, якія захоўваліся ў сярэдзіне 1960-х гадоў.

З ПАКАЗАННЯЎ БЫЛОГА ЧЫНОЎНІКА ВІЦЕБСКАГА СД-9 ГРУПЕНФЮРЭРА ЭРЫХА ШТРАУХА

Следствие в СД велось не более 2–6 дней. После чего дело шло на заключение в тройку, которая состояла из шефа команды СД Витебска и двух представителей СД, которые заседали 2–3 раза в месяц. Следователь же, который вел дела: давал свои соображения в отношении срока наказания начальнику отделения, который докладывал шефу.

... При втором отделении существовала команда СС, состоявшая из 25–30 человек, которая занималась арестами и расстрелами советских граждан после суда... Также эта же команда участвовала в карательных экспедициях против партизан...

З ПАКАЗАННЯЎ БЫЛОГА ЧЫНОЎНІКА ВІЦЕБСКАГА СД-9 (СЛЕДЧАГА), ГАЎПТШАРФЮРЭРА СС ФРАНЦА КУБЕ

В нашей команде СД были чиновники Штраух и Рабке (состояли в команде гестапо, в звании ротенфюрера. – *Ред.*), которые в виде развлечения вечерами вызывали к себе арестованных СД русских женщин и избивали их палками. Чиновник Рабке обычно любил бить женщин палкой по грудям. Это ему доставляло большое удовольствие.

Сведчанні ўзяты ў 1945 г. ў г. Эрфурт савецкімі следчымі органамі. З архіва УКДБ па Віцебскай вобласці.

З дзённіка нямецкага салдата

23 лютага 1942 г.

Картину неспокойной жизни в захваченном врагом Витебске описывает в своей книге «Дневник немецкого солдата» известный писатель-антифашист П.Кернер-Шрадер. Тот самый немец-интернационалист Шрадер, чье имя носит одна из улиц Витебска.

Писатель-коммунист, призванный в вермахт, в годы войны служил в Витебске унтер-офицером немецкого эвакогоспиталя, расположенного в бывшем четырехэтажном здании школы у Полоцкого рынка. Он установил связь с партизанами, подпольщиками, действовавшими в городе, тайно вел дневниковые записи, которые тщательно зашифровывал.

Шрадер пишет: «В «Дневнике немецкого солдата» только факты... Их могут подтвердить все бывшие солдаты и офицеры, служившие в подразделении полевая почта № 01621». Документальность книги подчеркивается и в предисловии издателей. А факты потрясающие. Изобличающие фашизм. Ниже отдельные выдержки, повествующие о советских десантниках, из главы «1942 год» книги Шрадера.

«С конца февраля у нас началась буквально «парашютная паника». Все только и говорят о десанте, об опасностях, которые подстерегают нас на каждом шагу...»

«Зазвонил телефон, Фельдфебель снял трубку:

– Штаб СД – один слушает... Да, готов, принимаю...

Приняв телефонограмму, он повторил ее, четко выговаривая каждое слово:

– Телефонограмма... Сектор «Днестр». Текст: «За линией фронта в районе Демидова выброшен парашютный десант противника силой до батальона». Все. Благодарю.

Фельдфебель положил трубку и побежал докладывать командиру.

– Господин полковник, важная телефонограмма из штаба сектора.

Полковник прочел.

– Вот те на. А всякие птенцы болтают, будто у русских праздник. Не похоже на праздник. Фельдфебель, вам известно, что сегодня день Красной Армии?

– Так точно, господин полковник. Так написано в календаре.

– Тогда объявите тревогу. Передать всем штабам: удвоить полевые посты. Уведомить о случившемся соседей. Всю охранную дивизию и батальон полиции поднять на ноги.

Зазвонили все телефоны. Срочные телефонограммы полетели во все концы.

Тотчас несколько высокопоставленных господ вспомнили о неотложных делах в тылу и отбыли в весьма срочную служебную командировку – километров за сто от места происшествия, по возможности еще дальше»...

«Вскоре стали поступать сообщения о стычках с противником в глубоком тылу. Вечером началась дикая бомбардировка. Земля сотрясалась от разрывов бомб, падающих из-за снежных туч. Дрожали стены, звенели ок-

на, погас свет. Грохот разрывов чередовался с завыванием пикирующих бомбардировщиков. Такое ощущение, будто пилорама на пределе своих сил резала сырые стволы. Не успеют смолкнуть отзвуки одного налета, как прилетают новые группы советских самолетов, и все повторяется сначала.

— Вот что у них называется праздником.

— Какой может быть праздник во время войны?

Разные люди в различных местах повторяли эти две короткие фразы»...

«Дня через два в сборный лагерь для военнопленных привели пленных и сразу начали допрашивать. Все что творится в лагере, немедленно становится известным солдатам в окрестных частях. Красноармейцы держались удивительно стойко, на всех допросах молчали. А службе безопасности во что бы то ни стало надо было выудить, какие задачи были поставлены перед парашютистами, даны ли им явки к партизанам, какие объекты приказано взорвать, уничтожить, разведать.

Для парашютистов установили особый режим. Известно какой: голод, холод и ни минуты сна. Будят пинками, а то и прикладом по голове. Всю верхнюю одежду немедленно отобрали, распороли, исследовали, но ничего не нашли. Одежду, конечно, не вернули, а мороз — ниже тридцати. Полураздетые, голодные люди, прижимаясь друг к другу, меняясь местами, согревая своим телом коченеющих, боролись за жизнь, но молчали. У них не было никакого оружия, кроме тепла собственного тела, мужества и внутренней убежденности».

«В лагере есть яма смерти... Многие в этой яме умирали, не дождавшись расстрела. На ледяном ветру, под открытым небом полуголые люди просто замерзали. За школой ветврачей на поросшей соснами высотке (лесопарк Юрьева Горка. — *М.К.*) врыты в землю высокие колья. Там — стрельбище «отряда вознесения на небо...»

«Допрос следовал за допросом, были пущены в ход все излюбленные методы развязывания языков, но охранникам не удалось узнать даже номера воинской части и то, готовили ли их специально или они солдаты пехотных частей регулярной армии. Пленных запугивали смертью, а нескольких даже расстреляли для острастки...»

«Упорство парашютистов взбесило палачей. Разыграли комедию суда. Объявили приговор — короткий и одинаковый для всех: к повешению. Одиннадцать приговоренных увели. Один от слабости не мог идти и упал. Товарищи подхватили его, натерли затылок снегом, и он пошел вместе со всеми. Перед казнью они пожимали друг другу руки. Двое расцеловались. Один смеялся и что-то громко говорил, но эсэсовцы ничего не поняли. Повесили их перед зданием фашистской городской управы в Витебске, там, где две улицы сходятся к большому дому, скрытому каштанами и липами. Рядом дежурила эсэсовская охрана»...

«Из пойманных в живых осталось шестеро. Какое обвинение предъявлено этим шестерым, неизвестно. Но к ним решили применить особую казнь, так называемый «нимб», или «холодную лапшу», на жаргоне палачей. Эта казнь, вернее, удушение состоялось на десятый день после праздника Красной Армии. Шестерым советским солдатам связали руки на спине, потом приказали стать на колени. Тогда один рванулся, словно пытаясь бежать. Его застрелили. Остальным на головы набросили «нимб», петлю из крепкого ремня свиной кожи, шириной с палец. Ремень упал на плечи и повис, как цепь. Пятеро палачей из карательного отряда взяли по дубинке, вставили их в кожаную петлю на затылке каждого пленного и стали закручивать «нимб», как тиски. «Холодная лапша» натянулась. Через мгновение палачи могли доложить начальству, что приказ выполнен».

Так пишет писатель-интернационалист о гибели в Витебске неизвестных нам славных советских воинов. С ними поступали по-фашистски, как заявил на допросе один парашютист (его здесь же убили).

Что же это был за десант? Возможно, один из отрядов, которые в 1941—42 гг. выбрасывались Западным фронтом на соседнюю с Витебщиной Смоленщину. Руководил действиями этих подразделений начальник парашютно-десантной службы ВВС фронта полковник И.Г.Старчак.

Об этом еще вот какие строки из его книги «С неба — в бой» (М., 1965): «Совсем недавно я получил весточку от бывшего бойца нашего отряда Александра Ерохина. После неудачной выброски западнее Велижа он служил в разведке Западного фронта...»

Демидов — Витебск — Велиж. Это, вероятно, как раз тот треугольник, откуда в 1942 г. навели панику в оккупированном Витебске советские парашютисты.

Пауль Кернер-Шрадер. Дневник немецкого солдата (Полевая почта № 01621). Пераклад з нямецкай мовы. М., 1961.

ПРИМЕЧАНИЕ: В редакции не было оснований сомневаться в достоверности записок немецкого коммуниста-интернационалиста П.Кернера-Шрадера, чье имя связано с Витебском. Однако других документов в т.ч. партизанской разведки, подтверждающих данный эпизод, нами не было обнаружено. А происшедшее в ту далекую зиму достойно благодарной памяти поколений.

«Гвардеец». 1993. 23 февраля.

Падрыхтаваў да друку М.Ф.Крывёнак.

Віцебск пад ценем свастыкі

В Витебске, как и других оккупированных городах, гитлеровцы ввели комендантский час с 8 часов вечера до 5 часов утра. В это время жителям под страхом смерти было запрещено появляться на улицах. Вход в город и выход из него разрешался только по пропускам комендатуры. Основным документом, удостоверявшим личность, служил советский паспорт, прошедший немецкую регистрацию в паспортном столе управы, имевший штампы прописки и перечисление подробных примет владельца. По ночам устраивались облавы и проверки. Гражданам, не имевшим паспортов, выдавались временные удостоверения личности с подробным описанием примет и отпечатками пальцев. Помимо этого, жители города должны были иметь при себе так называемую «рабочую карточку» — удостоверение с места работы. Если во время проверки документов такого удостоверения не оказывалось, то человека задерживали и направляли на рытье окопов, а то и на каторжные работы в Германию. Кстати, перерегистрация всего населения проходила иногда по два раза в месяц.

Пропагандой занимались не только штатные специалисты немецкой армии. Посильную лепту в дело оболванивания народа вносил отдел культуры и просвещения городской управы и так называемый «Белорусский Народный дом»: где часто выступали как местные националисты, восхвалявшие новый порядок, так и их хозяева. С августа 1941 г. в Витебске выпускалась газета «Віцебскія ведамасці» — орган городской управы, которая выходила 3 раза в неделю. С декабря она стала называться «Новый путь», и тираж ее достиг 70 тыс. экземпляров. Кроме того, в городе выходили газеты «Белорусское слово», «Свободный пахарь» и «Школьник». По Витебску почти ежедневно ездили специальные машины с радиоустановками, вещавшими об очередных победах доблестных германских войск над большевистско-монгольскими ордами.

Поскольку Витебск должен был стать одним из «бастионов рейха» на Востоке, в городе должно было остаться около 40 тыс. человек, так как сюда гитлеровцы намеревались поселить 20 тыс. немцев-колонистов (из расчета по 2 раба на каждого немца). Следует напомнить, что до войны (по переписи 1939) в Витебске проживали 167 тыс. человек.

В городе сосредоточились большие силы жандармерии, войск СС, охранной полиции. Городская тюрьма и ее двор уже не могли вместить все возрастающий поток заключенных. Повседневными явлениями были телесные наказания жителей города. Так, некто Иван Каренин за несдачу радиоприемника был наказа 6 месяцами тюрьмы и 120 палочными ударами — по 20 ежемесячно. Нередко люди погибали от побоев, о чем свидетельствует тюремная книга.

В городе были открыты публичные дома для немецких солдат, куда под страхом смерти привозили молодых девушек. Многие из них кончали жизнь самоубийством, а некоторых после заражения венерическими заболеваниями ожидал расстрел...

Порой людей казнили только за взгляд, брошенный на оккупанта.

Жительница города Егорова вспоминала: «Не успев построить виселицы, фашисты вешали на деревьях. Первой была повешена женщина-еврейка на суку дерева в садике. Потом стали вешать по нескольку человек уже на специально устроенных виселицах».

Окрестности города — такие, как Туловский и Духовской овраги, пойма реки Витьбы за ветинститутом, ложбина у 5-го железнодорожного полка и Улановой горы — стали могилами для многих советских людей...

Люди умирали мучительной смертью, силясь вырваться из-под тяжести насыпанной земли.

В городе вспыхивали эпидемии тифа и дизентерии. Медикаментов не было. Больницы, особенно туберкулезная и инфекционная, были переполнены. На 1.8.1942 г. в Витебске были 4 больницы и 29 врачей, зато имелись 5 концлагерей и 6 филиалов, где находились десятки тысяч человек.

В.В.Костюкевич. «Витьбичи». 1992. 24 июня.

Лагеры смерці

В период оккупации в Витебске было создано 5 крупных лагерей смерти.

1. На территории бывшего 5-го железнодорожного полка (ныне ул. Титова). Создан в 1941 г. как лагерь для военнопленных. Располагался по обе стороны оврага, где стояло несколько полуразрушенных, непригодных для жилья бараков, обнесенных колючей проволокой, 3 наблюдательные вышки с пулеметами. В 1941 г. тут находилось до 40 тыс. военнопленных. К 1943 г. почти все они были уничтожены. В марте—апреле 1943 г. гитлеровцы поместили сюда до 20 тыс. человек местного населения, преимущественно женщин, стариков и детей, а в феврале—мае 1944 г. почти все оставшееся население города. Всего в лагере расстреляно, замучено, удушено, погибло от голода и болезней более 80 тыс. человек (по другим данным, более 100 тыс. человек). В 1964 г. на месте лагеря жертвам фашистского террора установлен обелиск. См. также статьи «Горкая праўда», «Лагер катавання».



Лагер смерці «Зяркалка».

2. Гетто. Создано в июле 1941 г. на правом берегу Западной Двины по ул. Верхне-Набережной (ныне ул. Ильинского). При переправе заключенных через Западную Двину утоплено свыше 300 человек. К середине октября 1941 г. в Туловском (Иловском) овраге (восточная окраина города) уничтожено свыше 10 тыс. узников. Всего тут расстреляно до 20 тыс. человек. См. также статью «Віцебскае гета».

3. В поселке Лучоса («Архиерейская дача»). Создан в 1941 г. на левом берегу Лучосы и прилегающей территории. В лагере фашисты содержали преимущественно командиров и политработников Красной Армии, армейских и партизанских разведчиков. Условия в нем были самые жестокие. Заключенным почти не давали пищи. От голода люди объедали листья и кору на деревьях. Почти ежедневно заключенных расстреливали.

4. На зеркальной фабрике по ул. Задунавской (ныне пр. Фрунзе). Создан в 1941 г. как так называемый рабочий лагерь. Заключен-

Лагер смерці пад адкрытым небам.



Лагер смерці «5-ы полк».



Канцлагер на ўскраіне горада.

ных в лагере заставляли ежедневно работать по 11 часов на разгрузке угля, ремонте дорог, разборке разрушенных зданий и др. Даже за скудное питание платили сами заключенные или их родственники. Постоянная муштра унижала человеческое достоинство. Лагерь существовал до 1944 г.

5. В лесу недалеко от станции Крынки. В мае 1944 г. гитлеровцы под открытым небом поместили свыше 12 тыс. человек, вывезенных из лагеря на территории 5-го железнодорожного полка, чтобы использовать их в качестве живого заслона при отступлении немецко-фашистских войск. Территорию обнесли колючей проволокой и заминировали. В лагерь поместили также несколько сот тифозных больных с целью заразить наступавшие части Красной Армии и мирных жителей. В лагере погибло 4 тыс. человек, 8 тыс. человек освобождены Красной Армией. См. статью «Бітва за жыццё».

Небольшие лагеря смерти создавались при немецких воинских формированиях как резерв рабочей силы для возведения оборонительных сооружений на передовой, на месте дислокации воинских частей. Узники содержались без крова и почти без пищи, работали под огнем, почти все погибли. В апреле 1944 г. в лагерях при 206-й немецкой пехотной дивизии (на окраине Витебска) находилось до 400 человек; в районе дислокации 346-й пехотной дивизии (северо-западнее Витебска) — 1 тыс. человек; при 4-й авиаполевой дивизии 53-го армейского корпуса в лагере погибло 700 человек. Всего в Витебске и его окрестностях в лагерях смерти погибло 76 тыс. военнопленных и около 62 тыс. мирных граждан (по другим данным не менее 150 тыс. человек).

«Витебск. Энциклопедический справочник». Мн., 1988. С. 215.



Амерыканская камісія Чырвонага Крыжа і прадстаўнікі абласнога аддзела аховы здароўя каля адной з раскапаных магіл на тэрыторыі лагера смерці «5-ы полк».

Горкая праўда

На выездзе з Віцебска па вул. Цітова, за 30 м ад дарогі стаіць сціплы па памерах і архітэктуры, але велічны па сваёй значнасці помнік — абеліск ахвярам фашызму, якія закатаваны і загублены ў лагеры смерці КА-313-СД. Канцлагер дзейнічаў на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка Віцебска з першых месяцаў акупацыі і да вызвалення горада.

У акце Спецыяльнай камісіі ад 26.9.1944 г. засведчана: «На тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка знойдзена 70 магіл памерам 7—8—4 м, да 300 магіл памерам 2,5—3—2,5 м. Яма велічынёй 15—10—5 м, і ў ёй вялікая колькасць трупаў у ваеннай форме. Другая яма амаль круглай формы запоўнена трупамі ў ваеннай форме. Трупы не маюць пад захаваўшайся скурай ніякай падскураной клятчаткі. Гэта шкілеты, абцягнутыя скурай. У верхнім слаі гэтай ямы камісіяй налічана да 300 трупаў, а такіх слаёў было 7...»

Агульная колькасць расстраляных, загінуўшых ад голаду і катаванняў і пахаваных на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка перавышае 80 тыс. чалавек, з іх больш за 40 тыс. мірныя жыхары. Гэты лагер быў месцам масавага знішчэння савецкіх людзей.

Помнік ахвярам фашызму на месцы лагера смерці «5-ы полк» па вул. Цітова

У дакладной запісцы № 2/3158 ад 24 лістапада 1947 г. начальніка ўпраўлення МУС па Віцебскай вобласці Гогалева сакратару Віцебскага абкома КПБ Кудраўцаву сказана: «Віцебскі лагер ваеннапалонных быў ператвораны ў лагер смерці. У яго зганяліся мірныя савецкія грамадзяне. Сярод іх вялікая колькасць жанчын, старых, дзяцей. У лагеры панавалі голад, холад, эпідэмія тыфу, іншыя інфекцыйныя захворванні.

У выніку ўчыненых зладзействаў у Віцебскім лагеры ваеннапалонных расстраляна, замучана, загінула ад голаду і хвароб больш за 100 тыс. савецкіх грамадзян».

У 1941—42 гг. у лагеры ўтрымліваліся ваеннапалонныя, якія да канца 1942 г. былі амаль знішчаны. У яго засценкі гітлераўцы пачалі заганяць мірных жыхароў з партызанскай зоны Віцебскага, Суражскага і Гарадоцкага раёнаў, а восенню—зімой 1943—44 гг. у лагер ужо ў масавым парадку зганяліся мірныя жыхары з Віцебска і навакольных вёсак.

Для грамадзянскага насельніцтва быў той жа рэжым, што і для ваеннапалонных. Калючы дрот у 2—3 рады, баракі без вокнаў і дзвярэй, а месцамі ўжо і без прасценкаў, нары у 3 ярусы. Холад, бруд і цесната, кубак баланды і буханка хлеба (калі яго можна назваць хлебам) на 10 чалавек раз у суткі. А акрамя таго, тыф і іншыя хваробы... Штодзённа паміралі па 20—30 чалавек.

Ад Асвенціма, Бухенвальда, Дахау гэты лагер смерці адрозніваўся толькі тым, што вязням не прысвойваліся нумары, не было печаў для спальвання і газавых камер. Трупы выкідваліся ў ямы-магільнікі. З яго засценкаў дзесяткі тысяч чалавек былі вывезены ў іншыя канцлагеры і на прымусовыя работы.

Вясной 1944 г. гітлераўцы правялі разгрузку лагера. Каб схаваць свае злачынствы, а таксама, каб распаўсюдзіць хваробы сярод насельніцтва і наступаючай Чырвонай Арміі, тысячы знясіленых голадам, тыфам, іншымі інфекцыйнымі хваробамі вязняў былі вывезены ў Бешанковіцкі, Чашніцкі і Ушацкі раёны, іншыя месцы. Большасць з іх там і памерлі. Да 12 тыс. вязняў было вывезена ў раён станцыі Крынкі. Каля 4 тыс. з іх там загінулі. Як жывы шчыт выкарыстоўвалі гіт-

лераўцы вязняў пры сваім адступленні ў ліпені 1944 г.

У дзень вызвалення ў лагеры было толькі 117 чалавек.

Магіла больш чым 100 тыс. чалавек — сведка зверстваў фашызму на гэтым трагічным кавалачку зямлі. Доўг усіх жывых — захоўваць аб гэтым памяць.

І.І.Белякоў,
былы вязень лагера смерці «5-ы полк».

Лагер катавання

Мы жылі на Полацкай шашы, у доме № 173. Як раз насупраць нас знаходзіўся канцэнтрацыйны лагер — ён быў разбіты на тэрыторыі былога ваеннага гарадка 5-га чыгуначнага палка.

Увесь лагер быў у 4 рады абнесены калючым дротам. Акрамя таго, дротам быў агароджаны і кожны барак паасобку. Баракі нават узімку не аціпляліся. Вокны былі без шкла. Нары для вязняў там былі зроблены ў 3 паверхі. У гэтых смярдзючых, халодных бараках усе палонныя і арыштаваныя не маглі змясціцца, і значная іх частка так і знаходзілася пад адкрытым небам і днём, і ўначы.

Да нас у дом часта даносіліся стрэлы, стогны, крыкі зняволеных.

Кожны дзень паміралі дзесяткі людзей, замардаваных голадам, сцюжай, загінуўшых ад куль нямецкіх вартавых. А расстрэльвалі нават у лазні. Пасля кожнай партыі, што пабывала ў лазні, адтуль выносілі на насілках трупы. Да лагера часта падыходзілі мясцовыя жыхары і спрабавалі перадаць якую-небудзь ежу, але рэдка калі ім удавалася гэта зрабіць — патрулі адганялі іх ці адкрывалі агонь без папярэджання.

Нягледзячы на моцную ахову, нявольнікі амаль кожную ноч рабілі спробу вырвацца з гэтага лагера смерці. Раніцою часам можна было бачыць целы застрэленых пры спробе да бегства.

Але былі шчасліўцы, якім удавалася вырвацца адтуль. Я памятаю выпадак, калі 20 арыштаваных, якіх выгналі з лагера на працу, перабілі ахову і збеглі.

Калі немцы зрабілі аблаву, дык усіх жыхароў нашага раёна сагналі ў той самы лагер, што супраць нашага дому.

Не думала я, калі ўваходзіла з дзеткамі праз вароты гэтага лагера, што змагу выбрацца адсюль жывою. Не думала, што застануся жывою, калі немцы грузілі нас у эшалон і загналі ў другі лагер. Адна ў нас была надзея на Чырвоную Армію. І вось яна вырвала нас з рук нямецкіх катаў. Не ведаю, як аддзячыць вас, байцы. Родныя мае, харошыя.

Н.В.Міронава.
«Красноармейская правда». 1944. 8 чэрвеня.

Віцебскае гета

Даже в самом кошмарном сне не могло бы присниться витеблянам то, что пришлось им увидеть в оккупированном Витебске. Тысячи евреев стали здесь жертвой фашистского геноцида — невиданных унижений и издевательств, а потом тотального уничтожения. Столетиями были они значительной частью населения этого древнего города. По предвоенной переписи 1939 г. в Витебске проживало 37 тыс. евреев, что составляло 22% всего населения.

В первые дни оккупации по приказу немецкого командования была проведена принудительная регистрация евреев. В списки было занесено 16 тыс. человек. Правда, на регистрацию обязаны были явиться не только евреи, но и дети от смешанных браков во втором и третьем поколении. Вполне возможно, что на эту регистрацию явились далеко не все, т.к. часть еврейских семей, которые предприняли попытку эвакуироваться, блуждали в это время в окрестностях города и впоследствии, не сумев перейти линию фронта, были вынуждены вернуться обратно. Вместе с ними оказались в Витебске и беженцы из западных районов Белоруссии, которых также обогнал фронт. Поэтому, возможно, в Витебске в первые недели оккупации оказалось гораздо больше евреев, чем проживало до войны.

Установление «нового порядка» гитлеровцы начали с уничтожения еврейского населения. Вот кровавая хроника первых недель оккупации.

Из показаний, данных В.Орловой 27 сентября 1944 г.: «С первых же дней фашисты



Віцебскае гета (рэканструкцыя М.С.Рыўкіна).

организовали облавы на евреев. В районе Песковатика на протяжении трех дней производили расстрелы на еврейском кладбище».

17 июля по приказу немецкого командования на стенах домов были расклеены объявления, в которых говорилось о том, что все евреи должны зарегистрироваться до 20 июля, а кто не зарегистрируется, будет расстрелян. Каждый еврей должен пришить к своей одежде на груди с правой стороны и сзади на спине круг из желтой ткани диаметром 10 см.

20 июля немцы приказали всем мужчинам от 15 до 50 лет собраться в бывшем саду имени Ленина. Здесь их стали избивать, потом выбрали из каждого ряда по 30 человек и расстреляли за то, что не все исполнили приказ прийти с нашитыми на одежде желтыми знаками.

24 июля гитлеровцы собрали около 300 молодых мужчин якобы для расчистки территории города от завалов. Их погнали в сторону еврейского кладбища на Улановичскую гору. Ничего не подозревающие люди с лопатами и метлами, охраняемые несколькими солдатами, подчинились приказу. По свидетельству очевидцев, на Улановичской горе им приказали вырыть яму, и здесь же расстреляли.

Спустя пару дней по городу были расклеены сообщения немецкого командования, из которых жители города узнали, что 300 евреев были расстреляны за поджог города во время вступления в него немцев.

25 июля фашисты приказали всем евреям переселиться на правый берег Западной Двины к зданию бывшего Клуба металлистов. С собой было разрешено брать только ручную кладь. Срок переселения определялся до 27 июля. Переправа евреев через реку была задумана фашистами как очередная расправа над мирным населением.

По рассказам бывшей узницы витебского гетто П.Фрумсон, уже к 11 часам утра 25 июля на берегу Западной Двины, в районе Успенской горки, собралось несколько тысяч евреев. Немцы ходили среди собравшихся, выбирали молодых девушек, уводили их и насиловали. Солдаты отбирали у людей понравившиеся им вещи. Одну пожилую женщину фашисты привязали к лодке и таскали по воде до тех пор, пока она не захлебнулась.

Витебский рабочий М.Железняк в письме к сыну на фронт: опубликованном в газете «Комсомольская правда», писал: «Немцы посадили на весла отпетых уголовников. Эти бандиты довозили женщин, детей и стариков до середины реки, выбрасывали их и топили. Тех, кто пытался спастись, добивали ударами весел. Немцы с берега фотографировали эту «переправу».

Немецкие солдаты, плававшие на своих лодках посреди переправы, якобы для того, чтобы регулировать движение, переворачивали лодки и плоты с сидящими на них людьми. Многие, не умевшие плавать, особенно пожилые люди и маленькие дети, тонули.

Другие солдаты развлекались тем, что стреляли по лодкам с противоположного берега. В этот день переправы, по свидетельству очевидцев, было потоплено в Западной Двине более 300 человек.

Бывший бургомистр В.Родько во время допроса в августе 1945 г. показал: «В подборе места для гетто и выселения еврейского населения из квартир приняли активное участие Л.Г.Брандт, а в расстреле — местная полиция, во главе которой стояли П.Шосток и А.Туровский».

Место, отведенное для гетто, представляло собой сплошное каменное пожарище, где никто уже не проживал. Оно занимало территорию в пределах нынешних улиц Комсомольской, Набережной, Ильинского, Энгельса, Ки-

рова. Здесь узникам, согнанным в гетто, приходилось жить под навесами, в конурах из кирпичей, жести и обгоревших кроватей. Тысячи ютились в небольшом здании бывшего Клуба металлистов. По воспоминаниям бывшего узника гетто Х.Портного, люди размещались на лестничных клетках и под лестницами, сотни набились на балконы и лоджии, был занят каждый сантиметр на полу в зале. Но все-таки большая часть узников осталась под открытым небом на берегу реки, во дворах разрушенных зданий.

После того, как всех евреев переселили в гетто, его территория была обнесена дощатым забором и колючей проволокой. Гетто днем и ночью охранялось полицаями.

Выходить из гетто имели право только те мужчины, которых гоняли под конвоем на черновые работы. Правда, подростки умудрялись по ночам убегать из гетто, чтобы обменять что-нибудь из вещей на продукты и вернуться обратно к своим родным.

Вспоминает С.И.Голубовская (Гольдина): «Однажды собравшись с духом и силами, я решила бежать. Думала спасти себя и принести хоть какую-нибудь еду родителям. Понимала, если не решусь на этот шаг, погибнем все. Меня подтолкнули снизу, и я перескочила через проволочное ограждение. Внизу стоял охранник. Я выхватила у него винтовку, отбросила ее в сторону и стала убегать. Наверное, охранник, не ожидавший от меня такой прыти, не сразу опомнился. А может быть, у него были другие причины, но он не погнался за мной и не стал стрелять вслед. Я бежала куда глаза глядят, вскоре оказалась в деревне Вымно. Одна женщина в деревне дала мне иголку с ниткой, чтобы я могла привести в порядок разорванную одежду. Другая — стакан молока с куском хлеба. Я выпила молоко, а хлеб спрятала и пошла обратно в город, надеясь передать хлеб родителям. Мне это удалось. И я неоднократно совершала такие рейды по окрестным деревням».

На судебном процессе, который состоялся в Западном Берлине в мае 1962 г. над 6 офицерами «Айнзацкоманды-9» группы «В», принимавшими активное участие в уничтожении еврейского населения Витебска, было установлено: «В последние дни июля, самое позднее 2.8.1941 г. «Айнзацкоманда-9» достигла сильно разрушенного Витебска. Она расквартировалась в достаточно хорошо сохранившемся здании политехникума. Отсюда было видно находившееся у Двины гетто, огражденное забором... «Айнзацкоманда-9» занялась тотчас тем, что стала вылавливать евреев, живших в окрестностях Витебска и доставлять их в и без того переполненное гетто. Этими акциями были затронуты евреи, жившие в деревнях. Их хозяйство, в том числе и скот, оставалось без присмотра. Доктор А.Фильберт (оберштурмбанфюрер, руководитель «Айнзацкоманды-9» группы В) распорядился соорудить хлев, куда загоняли коров, лошадей и овец, отобранных у евреев.

В самом Витебске А.Фильберт начал выполнение приказа по расстрелам евреев. В первые 10 дней пребывания в Витебске состоялись по меньшей мере 2 акции, жертвами которых стали около 100 человек. В этих акциях помимо «Айнзацкоманды-9» принимал участие в качестве взвода оцепления взвод полицейских.

«Для гетто была отгорожена большая территория. Каждый день от голода, болезней, холода умирали десятки человек. Первыми умирали старики и дети. Иногда трупы вывозили за территорию гетто, но чаще покойников хоронили здесь же, рядом со зданием клуба или в разрушенном здании складывали покойников штабелями — как дрова», — вспоминала бывшая узница С.Я.Сарак.

Ю.М.Зарецкий тогда был ребенком, перенес все ужасы гетто, вспоминал, что из вереницы ежедневных кошмаров ему врезался в память эпизод, когда на улице умирала девочка 6—7 лет, его ровесница. Она лежала на куче тряпья. Из горла вырывались какие-то хриплые звуки. Мать металась рядом, и, обезумев от горя, кричала: «Кто-нибудь, помогите». Привели доктора, такого же узника гетто. Он посмотрел девочку, развел руки в сто-

Група яўрэяў, сагнаная фашыстамі.

роны и сказал: «Дайте ей спокойно умереть...»

16 сентября 1941 г. Местная профашистская газета «Віцебскія ведамасці» опубликовала объявление:

«Усім грамадзянам нежыдоўскага паходжання сурова забараняецца знаходжанне на тэрыторыі гета. Адначасова усім жыдам забараняецца хаджэнне па няўказанай ім тэрыторыі. За парушэнне вінаватыя будуць пакараны. Крымінальны аддзел горада Віцебска».

...Письмо, приведенное нами ниже, было написано в сентябре 1941 г. и передано за колючую проволоку гетто. Его написала жена известного витебского врача София Исидоровна Ратнер. До войны она преподавала иностранный язык в Витебском художественном училище. В 1941 г. ей было уже 72 года. Вот оно:

«Моим детям Ниночке, Марусеньке, Аточке, Витеньке. Дорогие детки: Марусенька, Аточка, Витенька, Ниночка, прощайте. Умираю. Что мы тут переживаем в гетто, не поддается описанию. Лучше умереть. Надя единственный человек, который с наступлением катастрофы и до конца заботилась о нас с большим риском для себя. Она чистый, кристально чистый человек. И сохранилась такой, несмотря на жуткое окружение, грабежи, насилия, издевательства, подлости и предательства. Не забудьте этого никогда. Сделайте для нее все, что можете, если она будет нуждаться в чем-нибудь. Она для нас самый, единственно близкий, единственно родной человек.

Дорогие, любимые, бесконечно любимые, прощайте. Живы ли вы все, я этого не знаю. Ничего мы не знаем, что кругом делается, отрезаны от всего мира. Мы здесь с Фаней, плюс, конечно, все оставшееся в Витебске еврейство. Прощайте же еще раз, дорогие. Как тяжело расставаться с вами навсегда. Бесконечно любящая мама. 6.XI.41 г.»

Письмо Софьи Исидоровны Ратнер из гетто сохранила и передала в конце войны ее родным замечательная белорусская женщина Надежда Фоминична Шидловская (Врублевская). До войны 15 лет она жила в семье Ратнеров, вела домашнее хозяйство. Это и есть та самая Наденька, которая с риском для жизни приходила в гетто и передавала Софии Исидоровне еду и одежду.

Опасность возникновения эпидемий в гетто была обоснована всем режимом содержания узников. И методом борьбы с болезнями становилось поголовное уничтожение людей. Об этом свидетельствует выдержка из материалов судебного процесса, состоявшегося в мае 1962 г. в Западном Берлине: «Голод увеличивал предрасположенность к инфекционным заболеваниям. Врачебной помощи не было. Санитарные условия были в ужасном состоянии. В этой ситуации доктор Альфред Фильберт издал указ о поэтапном уничтожении гетто, то есть расстреле всех находящихся в нем евреев. Обосновал он свой указ опасностью возникновения эпидемий».

Уничтожение потребовало проведения нескольких акций. Под руководством Грайфенбергера расстреляно 250 человек — мужчин, женщин, детей. Сам Грайфенбергер утверждал, что это была первая плановая акция по уничтожению гетто. Жертвы были привезены около 9.00 утра на грузовых автомобилях за пределы города в район, поросший деревьями и кустарником. Их расстреливали 5 эсэсовцев выстрелами в затылок на краю могилы глубиной 2—3 м и длиной 6—7 м. Из глубины могилы доносились стоны. Тогда эсэсовец выстрелил несколько раз из карабина непосредственно в могилу. Стоны прекратились. Менявшаяся несколько раз во время акции команда стрелков имела возможность у одного из грузовиков выпить шнапс. Двое карателей из «Айнзацкоманды-9» в перерыве расстреляли 7 еврейских детей. Они брали детей за руку, подводили к краю могилы и убивали выстрелом в затылок из пистолета. Тела потом бросали в могилу. К окончанию акции, которая длилась до 16.00, тела убитых наполнили могилу на 30—40 см ниже верхнего ее края.

Вскоре после этого была предпринята очередная акция, на которой присутствовал А.Фильберт. Сама перевозка жертв из гетто к месту расстрела длилась с раннего утра (8.00) до полудня. Очередную партию евреев выгрузили примерно в 200—300 м от места расстрела — танкового рва у д. Иловка. Все жертвы, в том числе и женщины, должны были снять верхнюю одежду. Над этим «работала» команда из 30 человек. Эта акция окончилась также около 16 часов. Она стоила жизни 750 евреям.

Неделей позже по приказу А.Фильберта расстрелом руководил Штрук. Число жертв было еще больше — около 800 человек. Среди них были женщины с детьми. Детей просто сбрасывали в могилу, когда матери были уже расстреляны.

Безусловно, место для массовых расстрелов было выбрано фашистами после тщательного обдумывания и основательных подсчетов. Во-первых, недалеко от города, не потребуется много времени на «операцию», во-вторых, там есть окопы и противотанковые рвы, вырытые в первые дни обороны. Значит, немного труда уйдет на рытье могил. Как ни страшно и жутко об этом писать, но учитывалось все. Звериное лицо фашизма, умноженное на немецкую педантичность и обстоятельность, дало дикое, варварское сочетание. Согласно разработанному положению, верхняя одежда людей, идущих на расстрел, складывалась в одну стопку, нижняя — в другую, обувь — в третью. Как показывал по собственному признанию на допросах в 1945—46 гг. бывший бургомистр Витебска В.Родько (он имел непосредственное отношение к уничтожению 5 тыс. евреев): «Имущество расстрелянных было изъято и перешло в собственность немецкой армии».

Все ценности и часть одежды лучшего качества были высланы СД в Берлин в адрес своего управления. Часть одежды была роздана местным немцам, оставшаяся часть передана городскому управлению для нужд города. Большую часть расхитили сотрудники СД и некоторые полицейские.

Главным палачом Витебского гетто стал руководитель «Айнзацкоманды-9» доктор А.Фильберт, фигура одиозная даже для фашистов. На судебном процессе в Западном Берлине его же сослуживцы показывали: «Усердие в этой деятельности Фильберт проявлял не только по приказу, а также по своим убеждениям. Он заботился о том, чтобы каждый еврей, которого схватили, был расстрелян. Он не ограничивался тем, что расстреливал евреев в рамках возможного в городах, а даже посылал офицеров и сам ездил прочесывать маленькие деревни и убивал все еврейское население...»

Фашисты и их подручные полицаи применяли самые изощренные методы издевательства. Вспоминает бывший узник Витебского гетто Юрий Моисеевич Зарецкий: «Вечером эсэсовцы пришли в гетто, чтобы развлечься. Приказали мужчине и женщине раздеться и продемонстрировать им половой акт. Когда из этого ничего не вышло, они расстреляли обоих и, смеясь, пошли дальше».

«К осени через Западную Двину был построен узкий деревянный мост, движение по которому шло в одном направлении. У этого моста можно было в те дни наблюдать такую картину. Среди машин и подвод выделялся грузовик. Рядом с шофером на переднем сиденье сидел немец с винтовкой, в кузове — полицейские. У их ног — фигурки людей. Только глаза блестят. В основном это женщины и дети. Некоторые временами начинают плакать. Таких полицейские бьют палкой, ногами. У края кузова стоит белокурая девочка в плюшевом пальтишке. Она машет ручкой всем прохожим и радостно улыбается, не обращая внимания, что кого-то рядом бьют. Она радуется, что едет на машине, что тут река, много людей, подвод — весело, не то, что было в гетто. Проходящие люди стараются не смотреть на эту машину: им уже известно, что ее пассажиров везут на расстрел...» — так описывает события того периода И.Иванов (журнал «Социалистический вестник». 1952. № 1—2. С. 49).

Проехав, наконец, мост, грузовик несется, нигде уже больше не останавливаясь. Он мчится мимо казарм, трамвайного парка, пересекая широкое поле к Иловскому оврагу.

Черными днями для витебских евреев стала первая десятидневка октября, когда ежедневно работал смертоносный конвейер. В эти дни начальник полиции безопасности и СД в своем донесении сообщал, что в Витебском гетто возникла большая опасность эпидемий, поэтому было расстреляно 3 тыс. человек. Этот факт зафиксирован в «Акте о злодеяниях немецко-фашистских захватчиков на территории Витебского района»: «Детей и стариков бросали в ров и закапывали живыми, а потом по этим могилам проходила немецкая грузовая автомашина по нескольку раз. Из фактов массового расстрела в этом рву можно привести следующее: 20—25 октября 1941 г. немцы привозили людей на автомашинах, не доезжая 100 м до рва, группами по 10—15 человек подводили ко рву и расстреливали, также бросали в яму живых людей, раздетых догола, и так в течение 3 суток немецкие бандиты убивали здесь советских людей, творили неслыханные злодеяния...»

И.Е.Рываш.

Об этой акции подробно рассказывал советским следственным органам в 1950 г. А.В.Цыпкевич, представший перед трибуналом в Краснодарском крае. Он свидетель и соучастник тех преступлений, его показания позволяют наглядно представить весь ужас происходящего: «П.Шостак сказал, что мы должны быть в гетто и будем участвовать в перевозке евреев в лагерь. В 9 часов мы строем прибыли в гетто, а вслед за нами — 15 больших грузовых машин. Затем подкатил легковой автомобиль, из которого вышел начальник СД-9 П.Шостак, переговорив с нами, предупредил, чтобы мы, полицейские, никому ничего не говорили о перевозке евреев в лагерь. Нам стало ясно, что будет расстрел, а не этапирование. Узникам же объявили, что они перемещаются в лагерь. Большинство обреченных, доверившись, взяли с собой ценные и необходимые в быту вещи. Погрузив на машины по 20—25 человек: детей, стариков, женщин и мужчин, мы выехали. За городом, в километрах пяти на юго-восток, есть большой овраг. Название его не помню. К этому оврагу и прибыли машины. К этому времени он уже был оцеплен немецкими солдатами. Когда немцы стали отбирать у евреев вещи и ценности, поднялся страшный шум, крик, плач детей и женщин. Что произошло дальше, я не видел... До двух часов я трижды выезжал к месту расстрела... Массовые расстрелы продолжались и последующие 3—4 дня».

Не только Иловский ров стал огромной братской могилой для довоенного еврейского населения Витебска. Расстреливали и на территории еврейского Старо-Улановичского кладбища, на Улановичской горе у нынешнего кладбища в Мазурино. По сведениям старожилов города, массовые расстрелы производились также в Духовском овраге, у старого аэропорта в районе Лучесы, а также в пойме реки Витьбы, недалеко от ветеринарного института.

Немногим узникам гетто удалось обмануть судьбу и, пережив все ужасы, остаться в живых. Одна из них — Софья Яковлевна Сарак, которой удалось бежать накануне ликвидации витебского гетто. Она собиралась добраться до д. Орехово, где жила ее знакомая, попросить у них кое-какие продукты и отнести обратно в гетто умирающим от голода родственникам. Когда она шла обратно, то увидела свою бывшую соседку Клавдию Осиповну Белоусову. Как оказалось, Клавдия Осиповна специально ждала ее, чтобы предупредить: в гетто идти нельзя.

Почти 9 месяцев К.О.Белоусова, Старовойтовы, Ильины прятали С.Я.Сарак, делились с ней последним куском хлеба.

До войны в Витебске работало много высококвалифицированных врачей, закончивших в свое время медицинские факультеты крупнейших университетов Европы. Верные своему врачебному долгу, они работали до последней минуты в больницах и поликлиниках города. Многие из них оказались потом в гетто. И погибли.

Опытнейшего гинеколога Иезикеила Евелевича Риваша называли профессором. Во время создания гетто женщины города упросили оккупационные власти оставить доктора И.Е.Риваша на работе в роддоме. В 1941 г. и в начале 1942 г. он практиковал в этом медицинском заведении.

М.Б.Гинзбург, одна из старейших фармацевтов Витебска, хорошо знала доктора Риваша. В годы войны она вместе с сыном Ю.И.Новиковым была эвакуирована в г. Сызрань. «Однажды весной в 1942 г., — вспоминает Ю.И.Новиков, — маму разыскала фармацевт из Витебска по фамилии Красовская. Она много рассказывала о Витебске, в том числе и о судьбе доктора Риваша. Несмотря на преклонный возраст, в 1941 г. ему было 70 лет, и на особые условия, в которых в оккупированном городе жили евреи, доктор оказывал медицинскую помощь партизанам и подпольщикам. Специально для него по приказу партизан в аптеке, где работала Красовская, собирали медикаменты. В начале 1942 г. Иезикеила Евелевича арестовали».

Подробности его дальнейшей судьбы предстоит еще выяснить. В одном из документов нам удалось найти следующую запись:

«№ 129. Риваш И.Е. — 1868 г., муж., евр., профессор-гинеколог, убит в 1942 г., № 130. Риваш А.Е. — 1887 г.. жен., евр., домохоз., убита в 1942 г.». Именно убиты, а не расстреляны, как указано в этом списке напротив фамилий тех, кто погиб от рук фашистских выродков.

Даты массовых расстрелов, связанных с уничтожением гетто, в показаниях свидетелей упоминаются разные. Одни утверждают, что гетто было уничтожено в восьмых числах октября, другие — в конце ноября, третьи — 4—6 ноября. 1941 г., в канун главного советского праздника. Последнюю дату подтверждает бывший узник гетто Семен Исаакович Угорец: «Четвертого ноября молодой полицай, он жил на нашей улице, сказал мне, что если я не выйду из гетто, значит все — завтра конец. Я прибежал, сказал родителям, сестре. Они не поверили. Да и тяжело им было решиться на побег. А я решил бежать. Мать дала мне кое-какие вещи. И подвалами домов я вышел из гетто. Назавтра я стоял около пекарни на Замковой улице и видел, как машины вывозили евреев из гетто. Их везли расстреливать в сторону деревни Тулово».

Заметая следы, в сентябре 1943 г. гитлеровцы издали секретный приказ о сжигании трупов ранее расстрелянных ими советских граждан. Для отработки технологии этой варварской акции в Могилеве собрали руководителей СД и гестапо из всех городов оккупированной Белоруссии и провели показательное сжигание.

Из показаний бывшего криминал-комиссара гестапо Коха: «К месту, где уже был сложен костер из 100 трупов советских граждан, расстрелянных в этот день, подвели всех участников совещания. Костер занимал площадь около 36 м^2, в нижней части костра были положены камни, примерно высотою 50 см, на которых лежали рельсы; на рельсы клались кряжи, на кряжи клались ряды трупов, на трупы клались дрова. И так было 3 яруса. К низу костра подкладывались дрова».

Приказ о сжигании трупов был исполнен и в Витебске.

Только через 50 с лишним лет, в октябре 1993 г. на месте Витебского гетто и на месте массовых расстрелов в Иловском рву были установлены памятные камни.

М.С.Рывкин, А.Л.Шульман.
«Віцьбічы». 1993. 30 кастрычніка.

Бітва за жыццё

Паведамленне, якое ўзрушыла сэрцы людскія. Над Масквой узыходзіла сонца. Закончыўся каменданцкі час. Левітан чытаў зводку Савецкага інфармацыйнага бюро аб становішчы на фронце.

«...На працягу 4 чэрвеня 1944 г. — гучаў голас дыктара, — на паўднёвы ўсход ад горада Віцебска нашы атрады ў адным населеным пункце вызвалілі 8 тыс. жыхароў, сагнаных гітлераўцамі ў канцэнтрацыйны лагер. Галодныя і знясіленыя ў фашысцкай няволі, савецкія грамадзяне — старыя, жанчыны і дзеці — са слязьмі радасці сустракалі воінаў Чырвонай Арміі».

Мільёны савецкіх людзей, разгортваючы чарговы нумар «Правды», не маглі не звярнуць увагу на здымак, зроблены пад Віцебскам. Ён узрушваў сэрцы. З лесу бясконцай чарадой цягнуліся тысячы людзей. Старым, відаць, цяжка хадзіць. Многія абапіраюцца на кій. У калоне многа жанчын, ёсць дзеці. Знясіленыя, ідуць вязні са страшэннага лагера.

Пад фотаздымкам тэкстоўка: «Яны былі за калючым дротам у нямецкім палоне, і калі іх вызвалілі і яны пайшлі ад свайго смяротнага жылля ў наш тыл, ім не верылася, што гэта свабода. Вочы іх блішчэлі ад слёз, калі насустрач з лясоў і пералескаў, з бліндажоў і зямлянак выходзілі нашы байцы і афіцэры.

Восем тысяч мірных жыхароў Віцебска і навакольля вызвалілі рускія байцы з нямецкай няволі. Восем тысяч жыхароў, восем тысяч сэрцаў дзяцей, старых і жанчын вярнуў рускі салдат да святла, да жыцця».

А хто ж яны, гэтыя салдаты вялікай арміі-вызваліцельніцы? Каму абавязаны былыя вязні фашысцкага канцлагера сваім выратаваннем ад немінучай гібелі?

Ні зводка Савінфармбюро, ні газеты таго часу неданеслі да нас імёны воінаў-герояў. Ва ўрагане вайны яны заставаліся для вызваленых невядомымі. Спатрэбіўся час крапатлівых пошукаў, перш чым старонка за старонкай раскрылася гісторыя аднаго з эпізодаў тых далёкіх, але грозных падзей.

Трагедыя ў лесе. У фондах 3-га Беларускага фронту архіва Міністэрства абароны СССР захоўваецца данясенне палітаддзела. Чытаем радок за радком і быццам бачым мёртвыя вуліцы Віцебска: начную аблаву на мірных людзей 27.5.1944 г. І як старых, жанчын, дзяцей, нават хворых з бальніц, з інфекцыйных баракаў сагналі спачатку ў канцлагер, што размяшчаўся ў казармах так званага «5-га палка», а затым пагрузілі ў эшалон і павезлі цягніком, на машынах, гналі па лясах да пярэдняга краю фронту.

Гэты лагер смерці быў створаны спешна за некалькі дзён да адыходу гітлерацаў. На тэрыторыі 2,5 гектара. Яго абнеслі калючым дротам, аперазалі ровам, подступы і выхады замініравалі. Зняволеныя жылі пад адкрытым небам. Ім амаль не давалі ежы, забаранялі разводзіць агонь, сістэматычна збівалі і забівалі.

Кроў стыне ў жылах, калі слухаеш расказы былых вязняў канцлагера.

Е.А.Грушэўская: 27 мая ў 5 гадзін раніцы ў наш віцебскі дзіцячы дом уварваліся фашысты і загадалі тэрмінова сабрацца і пакінуць памяшканне. На працягу гадзіны дзеці і частка маёмасці былі пагружаны ў эшалон. Ноччу, на шляху, у вагон зайшоў патруль і загадаў неадкладна выйсці. Галодныя, босыя дзеці ва ўзросце сямі год былі выкінуты на сырую зямлю. Затым вагоны з маёмасцю закрылі, а нас пагрузілі ў машыны і адправілі на перасыльны пункт, дзе мы знаходзіліся да 2 чэрвеня. У гэты ж дзень нас адвезлі ў лес. Дзецям давялося начаваць на зямлі пад дажджом. Раніцой мы зрабілі для іх будан.

В.Ф.Еўдакімаў: Калі нас прывезлі ў лес, гітлераўцы адабралі групу здаровых мужчын і жанчын. Потым мы знайшлі іх расстралянымі. Фашысты нават не закапалі трупы.

І.В.Осіпаў: З Віцебска мы ехалі цягніком у напрамку да Багушэўска. Пад маркай выдачы ежы нас высадзілі з вагонаў без рэчаў і прадуктаў. Затым павезлі ў лес. Гітлераўцы прапанавалі нам «кансервы» па 50 марак за банку. Калі адкрылі іх, там аказаліся пясок і яловыя шышкі.

Сыраежкава: Мой сын Уладзімір, каб не трапіць на работу ў Германію, прыкінуўся кульгавым. Фашысты схапілі яго, вывезлі з лагера і прымусілі капаць яму. І калі яна яшчэ не была гатова, сын быў на маіх вачах расстраляны разрыўной куляй у патыліцу.

Вяртанне 8 тыс. вызваленых савецкіх грамадзян з лагера смерці, які знаходзіўся на паўднёвы ўсход ад Віцебска. Чэрвень 1944 г.

* * *

Пачынаючы з мая 1944 г. ў зводках Савецкага інфармацыйнага бюро амаль штодзённа ўпамінаўся віцебскі напрамак. У гэты час асабліва ўзмоцнена ішлі пошукі разведчыкаў. Напярэдадні рашаючай бітвы на віцебскай зямлі ў адну з дывізій пасля лячэння ў медсанбаце прыбывае Міхаіл Піліпавіч Маскаеў. Ён назначаецца камандзірам разведроты.

Прадаставім слова самому герою чэрвеньскай бітвы. Ён неаднаразова бываў жаданым госцем Віцебска:

«Наша разведрота размяшчалася тады побач са штабам дывізіі. Паблізу знаходзіўся ўзвод снайпераў. Позна вечарам іграў духавы аркестр. Усе мы танцавалі. І раптам аркестр змоўк. Ад'ютант камандзіра дывіі аб'явіў:

— Камандзіра разведроты да камандзіра дывізіі!

Я атрымаў баявое заданне. Роту падняў па трывозе, і на пярэдні край. Зайшлі лесам у нейтральную паласу. Разведалі лінію абароны і агнявыя кропкі праціўніка. Баявое заданне выканана. Можна было вярнуцца ў падраздзяленне. І раптам паблізу пачулі страшэнныя крыкі жанчын і плач дзяцей. Што гэта?.. Відаць, побач фашысцкі канцэнтрацыйны лагер.

Выклікаю камандзіраў узводаў і гавару ім: «Чуеце крыкі і стогны? Пэўна, нашы савецкія людзі ў фашысцкай няволі. Выручым?

Камандзіры ў адзін голас:

— Выручым!

Тут жа на хвіліну збіраю роту. Усе разам абмяркоўваем абстаноўку...»

А была яна надзвычай складаная, загадкавая. Ноччу з чэрвеня праціўнік чамусьці адышоў на новы абарончы рубеж. Лагер жа пакінулі на ранейшым месцы. Такім чынам ён аказаўся ў нейтральнай паласе. Чаму ж гітлераўцы не перамясцілі вязняў у свой тыл? На гэта пытанне мог быць толькі адзін адказ: відаць, фашысты вырашылі выкарыстаць тысячы мірных савецкіх людзей як жывую заслону, як прыкрыццё ад удараў нашых войск.

Лагер ахоўваўся камандай СС. І вось новая нечаканасць: у апошнюю ноч вораг зняў ахову і пакінуў толькі паблізу свае дазоры. Гітлераўцы, відаць, задумалі штосьці страшэннае. Разведчыкі разумелі, што дарагая кожная мінута, нават секунда.

«Нашы рабяты, — расказвае Міхаіл Піліпавіч Маскаеў, — яшчэ ў цемры скрытна пераадолелі драцяную агароджу і ля самых варожых траншэй чакалі каманды. І як толькі яна была дадзена, хлопцы знялі дазорных ворага. Імкліва наблізіліся да лагера, разрэзалі дрот, размініравалі выхад...»

«Хутчэй, хутчэй!» Маскаеўцы рызыкуючы жыццём, прабівалі былым вязням шлях, ачышчалі яго ад мін. Не марудзячы, пачалі вывозіць са страшэннага месца цяжкахворых, якія самі не маглі рухацца.

Гітлераўцы сапраўды задумалі яшчэ адно неймавернае злачынства супраць чалавечнасці. Яны адкрылі ўраганны артылерыйскі агонь па тэрыторыі лагера. Але, на шчасце, ужо было позна. Нашы савецкія людзі амаль поўнасцю былі выведзены з таго праклятага месца.

Але тут і здарылася бяда.

Дарагой цаной. Тым, хто крочыў па ваенных дарогах, ніколі не забыць, як дорага каштавала нам перамога. Дарагой цаной дасталася і Міхаілу Піліпавічу Маскаеву незвычайна дзёрзкая баявая аперацыя пад Віцебскам.

Калі разведчыкі выводзілі людзей з лагера, Маскаеў заўважыў паблізу ад сябе немца. Фашыст мог яшчэ пайсці на авантуру: адкрыць з аўтамата агонь. І тады загінулі б дзесяткі людзей. Яго трэба неадкладна ўбраць. Але як? Страляць нельга: вакол людзі. І, не раздумваючы, камандзір разведчыкаў кідаецца на фашыста. Толькі зрабіў некалькі крокаў... Выбух. Узарвалася міна, якіх многа было вакол лагера. Маскаеў падае, абліваючыся крывёю. Яго падхопліваюць моцныя рукі сяброў.

Маскаеў страціў шмат крыві. Яму зрабілі цяжкую аперацыю — ампуціравалі нагу. Гангрэна... Потым спатрэбіліся яшчэ чатыры аперацыі. З медсанбата Маскаева перавезлі ў палявы шпіталь. Ездавы заблудзіў і даставіў хворага ў палявы шпіталь толькі на другі дзень у непрытомным стане.

«Калі я апрытомнеў, — успамінае Міхаіл Піліпавіч, — мне зачыталі Указ аб прысваенні мне героя. Я ведаў і раней, што быў прадстаўлены да вышэйшай узнагароды. Але, шчыра кажучы, забыўся пра гэта. Была адна мара, адно імкненне хутчэй разграміць акупантаў і вярнуцца да мірнага жыцця».

Восем тысяч жыхароў, восем тысяч сэрцаў вярнуў рускі салдат да жыцця і святла.

Я.Я.Рыклін.

Чорныя дні Віцебска

Рассказы відавочцаў, вызваленых з нямецкага палону ў бальнічным гарадку.

На тэрыторыі Маркаўскай бальніцы, у падвалах і склепах, у печках і пад падлогаю хаваліся ад немцаў каля 150 чалавек — пераважна моладзь.

Сам я хаваўся спярша ў падвале за кучай ламанай мэблі, а потым у печы. Для гэтага давялося выняць дымаходы і зрабіць падроблены, кардонавы калпак над печкаю. На цагліны я паклаў дошку і праседжваў на ёй усе дні. Праз юшку мне падавалі кацялок з ядою. Уначы немцы баяліся засад і таму вобыскаў не рабілі — з печы можна было выходзіць.

Жонка мая была ў шафе, таксама завалена усялякім хламам. Так я хаваўся каля 3 месяцаў, але апошняя аблава не абмінула і мяне з жонкаю.

Разам з тыфознымі хворымі нас пагрузілі ў вагоны і павезлі ў напрамку да Оршы. А ўначы на раз'ездзе эшалон стаў разгружацца. Хворых, знясіленых ад голаду немцы выцягвалі з вагонаў за ногі і кідалі на зямлю.

Лагер, у які нас завезлі, можна назваць лагерам катавання і смерці. Усіх маладых немцы хапалі і вывозілі, многіх расстралялі там жа, у лагеры. Уцячы нікому не ўдалося. Абнесены густа калючым дротам, ён пільна ахоўваўся гітлераўцамі і надрэсіраванымі, адкормленымі аўчаркамі.

Разам са мною ў лагеры знаходзіўся кладаўшчык нашай бальніцы Казімір Адамовіч. Раптам ён знік, а праз 2 дні я ўбачыў у руках нямецкага канвойнага запальніцу Казіміра — памыліцца я ніяк не мог, таму што запальніцу гэтую калісьці рабіў для Адамовіча я сам.

З ліку былых жыхароў бальнічнага гарадка шмат загінула ад голаду і холаду, некаторыя былі забіты немцамі напярэдадні вызвалення нас Чырвонай Арміяй. Многія, асабліва з ліку моладзі, былі вывезены немцамі, пра іх горкі лёс можна толькі здагадвацца.

Я ведаю групу жыхароў Віцебска, якія самаахвярна хавалі ад немцаў моладзь, параненых чырвонаармейцаў, што трапілі ў палон, дапамагалі партызанам.

Прафесара Мурашку немцы расстралялі за тое, што ён пасылаў партызанам медыкаменты. Мурашку прымусілі спальваць трупы расстрэляных яўрэяў, а потым расстралялі яго, як і ўсіх тых, хто мог расказаць потым аб гэтым злачынстве.

Яфім Савіцкі.

«Красноармейская правда». 1944. 8 чэрвеня.

Забівалі дзеля пацехі

Гэта было ў 2-й палавіне ліпеня 1941 г., неўзабаве пасля таго, як у Віцебск уварваліся гітлераўскія захопнікі. А закінуў мяне сюды ад радзімых полацкіх мясцін лёс юнага ўцекача, што шукаў шлях на ўсход, да сваіх...

Я апынуўся ў раёне Маркаўшчыны, тут, здавалася, было меней руін, радзей сустракаліся патрулі. Я ўбачыў людскі натоўп і чорны густы дым, які валіў з высокай вежы. Казалі, что гэта гараць вежы алейнага завода.

Пайшоў да бліжэйшай вежы і я. Там убачыў, што праз адтуліну ў вежы сыпалася зерне соі. Людзі напаўнялі вёдры, торбы, а хто сыпаў зерне за апранутыя на сябе кашулі. Натоўп збіраўся, абступаючы вежы.

Раптам побач нешта грымнула, засвісталі кулі, пачуліся рогат, крыкі. Гэты былі гітлераўскія малойчыкі. Рагочуць, аж прысядаюць. Бачу, людзі кінуліся, хто куды. А некалькі чалавек засталіся ляжаць на зямлі каля тых вежаў: іх забілі дзеля забавы «вызваліцелі», прышэльцы з фашысцкай Германіі. Вось так прыняліся яны ўсталёўваць «новы парадак» на нашай зямлі.

Г.Свалаў.

Мы адпомсцім за вашы пакуты, дзеці

Кожны дзень на вуліцах Віцебска можна было бачыць галодных і абадраных дзяцей. Школы, дзіцячыя дамы і дзіцячыя сады зачынены. У горадзе нейкім цудам захаваўся адзін дзіцячы дом. Але што там робіцца! Дзеці літаральна паміраюць з голаду. У іх няма адзення, абутку.

Аднойчы мы назіралі, як каля кухні нямецкага аэрадрому сабралася многа дзяцей з баначкамі. Яны чакалі, калі вылюць памыі, каб што-небудзь падабраць. Выйшаў тоўсты

немец і паклікаў дзяцей, абяцаючы даць ім ежы. Галодны натоўп маленькіх кінуўся ў памяшканне. Тады фашысты пачалі бязлітасна збіваць іх палкамі. Савецкі народ, Чырвоная Армія адпомсцяць за вашы пакуты, дзеці.

В.Іванаўна.

Што яны зрабілі з нашым Віцебскам

Захапіўшы нашы гарады і вёскі, фашысты крычалі: «Мы вас вызвалім ад жабрацкай зарплаты, узбагацім еўрапейскай культурай».

За год фашысцкага панавання ў Віцебску жыхары добра пазналі, што такое «фашысцкая культура». Людзі гавораць: «Гітлер вызваліў нас ад працы ад хлеба, ад школ і, наогул, ад чалавечага жыцця».

Першым «культурным» мерапрыемствам немцаў было адкрыццё ў горадзе «афіцэрскага дому». Туды сілком збіралі беспрацоўных беларускіх дзяўчат. Дзяўчаты павінны былі быць вышэй сярэдняга росту, светлавалосыя, з блакітнымі вачыма. Спачатку на біржы працы сілком адабралі 50 дзяўчат. З іх у афіцэрскі дом загналі толькі пяць. Праз некаторы час іх заразілі венерычнай хваробай і выкінулі на вуліцу.

У першыя ж дні свайго прыходу акупанты зверскі замучылі і расстралялі дзесяткі тысяч мірных і невінаватых людзей. На самым відным месцы па Ленінскай вуліцы фашысты паставілі шыбеніцу. Праз некаторы час яны паставілі яшчэ 6 шыбеніц у розных раёнах горада.

Кроў стыне ў жылах

Кроў стыне ў жылах, калі падумаеш, якія здзекі чыняць фашысцкія бандыты над нашымі сёстрамі і маткамі ў захопленым Віцебску.

Двух знаёмых мне рускіх дзяўчат немцы згвалцілі, заразілі венерычнай хваробай, а потым павесілі. Нахабнасць паршывых гадаў дайшла да таго, што на слупе яны прыбілі надпіс: «За прастытуцыю».

У Цялятніках, дзе быў размешчаны 20-ы стралковы нямецкі полк, двум нашым жанчынам нямецкія салдаты прапанавалі па кавалку хлеба. Жанчыны хацелі адмовіцца, але голад перамог, яны ўзялі хлеб. Выявілася, што гэта была правакацыя. Калі жанчыны праходзілі кантрольную будку казармы, іх абшукалі і знайшлі тыя самыя кавалкі хлеба. За гэта жанчынам далі па 15 палак.

Зімой да нас на кватэру прыбегла наша знаёмая Вера. Цэлы кіламетр яна бегла амаль голая і босая па марозе, ратуючыся ад нямецкіх бандытаў, якія ўначы ўварваліся да яе ў пакой і хацелі згвалціць.

Раз'юшаныя звяры! За здзекі з савецкіх жанчын мы адплацім поўнай мерай.

Зінаіда.

«За свабодную Беларусь». 1942. 24 ліпеня.

У Віцебску пануе голад

Насельніцтву ні хлеба, ні іншых якіх-небудзь прадуктаў не выдаецца. На рынку шклянка мукі каштуе 150 руб., шклянка круп 170 руб. Прадукты, якія гарадскія жыхары выменьваюць у вёсцы на адзенне, адбіраюць паліцэйскія.

«За свабодную Беларусь». 1942. 31 мая.

Горад пакут

У мінулым шумлівы, жыццярадасны савецкі Віцебск фашысты ператварылі ў горад пакут і смерці.

Вось плошча Смаленскага базару. Яе ўпрыгожвае сімвал фашысцкага «новага парадку» — велізарная шыбеніца.

Цэлы тыдзень тут вісеў Аляксей Радчанка. Гэтага 60-гадовага старога нямецкія фашысты павесілі толькі за тое, што ён быццам бы пераехаў сваім возам тэлеграфны провад, які ляжаў на дарозе.

«Віцебскі рабочы» № 179. 1942. 21 верасня.

На заняволенай зямлі

Хваробы і смерць, якія прынеслі на Беларусь фашысты, пашыраюцца ў Віцебску ў нечуваных памерах. Гэта хвалюе народ. Фашысцкія чалавеканенавіснікі вымушаны зрабіць выгляд, што яны клапоцяцца пра здароўе насельніцтва, і загадалі ачысціць горад. Але куды ж яны прымушаюць вывозіць нечыстоты? У газеце «Новый путь» надрукаваны загад, у якім сказана, што нечыстоты трэба вывозіць на сметнік, што за 400 м на поўдзень ад уваходу ў лагер ваеннапалонных № 313. У такіх умовах утрымліваюць фашысты савецкіх ваеннапалонных. Яны хочуць заразіць іх хваробамі і загубіць разам з цывільным насельніцтвам, якое знаходзіцца ў тых самых лагерах.

«За свабодную Беларусь» № 119. 1942. 6 чэрвеня.

Дзіцячыя дамы Віцебска

Згодна архіўных звестак, у Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны дзейнічалі дзіцячыя дамы пад нумарамі 1, 2, 3, 4 (у дакументах Віцебскай гарадской управы ўпамінаецца таксама дзіцячы дом № 5).

Дзіцячыя дамы № 1 і № 2 падпарадкоўваліся аддзелу аховы здароўя гарадской управы. Там знаходзіліся дзеці ва ўзросце да 6 гадоў. На 1.8.1942 г. ў дзіцячым доме № 1 было 93 выхаванцы, з іх 55 хлопчыкаў і 38 дзяўчынак. Кошт харчавання аднаго дзіцяці ў дзень складаў у сярэднім 5 руб. 10 кап. Гэтага было недастаткова. Літр малака летам 1942 г. на рынку каштаваў 12 руб., шклянка смятаны 20 руб. Выдаткі ж гарадской управы на ўтрыманне дзіцячага дома № 1 у ліпені 1942 г. склалі 4300 руб.

У дзіцячым доме № 2 на 1.8.1942 г. былі 62 выхаванцы, з іх 40 хлопчыкаў і 22 дзяўчынкі. Кошт харчавання на адно дзіця ў дзень складаў у сярэднім 5 руб. 40 кап. Выдаткі на ўтрыманне дзіцячага дома № 2 за ліпень 1942 г. склалі 3600 руб. У дзіцячых дамах № 1 і 2 было 7 выхавацеляў.

Дзіцячыя дамы № 3 і 4 падпарадкоўваліся аддзелу адукацыі і культуры гарадской управы. Там жылі дзеці ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў. На 1.8.1942 г. ў доме № 3 было 109 чалавек, з іх 56 хлопчыкаў і 53 дзяўчынкі; у доме № 4 — 58 чалавек, з іх 31 хлопчык і 27 дзяўчынак. Сярэдні кошт харчавання на адно дзіця ў дзень складаў 2 руб. 66 кап. Выдаткі на харчаванне ўсіх выхаванцаў за ліпень 1942 г. склалі 13 333 руб. 17 кап. Працавалі 7 выхавацеляў.

Але акупацыйныя ўлады клапаціліся пра асірацелых дзяцей не з гуманістычных памкненняў. У дзяцей бралі кроў для нямецкіх шпіталяў.

Па ўспамінах саміх выхаванцаў, «фашысцкая медыцына», голад, хваробы дзесяткамі і сотнямі касілі дзіцячыя жыцці. Але ваеннае ліхалецце напаўняла дамы ўсё новымі і новымі дзецьмі.

Калі да Віцебска стала набліжацца лінія фронту, выхаванцы дзіцячых дамоў былі вывезены ў канцэнтрацыйны лагер у раёне станцыі Крынкі Лёзненскага раёна.

Пасля вызвалення у чэрвені 1944 г. дзіцячыя дамы некаторы час знаходзіліся на тэрыторыі Смаленскай вобласці, а потым зноў былі пераведзены ў Віцебск.

Дзіцячым домам № 2, які знаходзіўся на беразе Дзвіны, на месцы цяперашняга мемарыялу на плошчы Перамогі, да 23 жніўня 1944 г. загадвала Кацярына Андрэеўна Прудкоўская (Пруткоўская), як успамінаюць былыя выхаванцы, пажылая жанчына каля 60 гадоў. За выратаванне дзяцей Кацярына Андрэеўна была ўзнагароджана.

Дзесяткі і сотні дзіцячых жыццяў абарваліся ў Віцебску ў гады вайны. І няхай хаця б гэты нарыс будзе напамінам пра бязвінныя ахвяры.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны звесткі з Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і ўспаміны выхаванцаў дзіцячых дамоў.

Я.А.Клімянцёнак.

Я гэта бачыла сама

З успамінаў Ганны Андрэеўны Саладухінай, жыхаркі Віцебска.

Са жніўня — верасня 1941 г. немцы амаль штодня прыводзілі цэлымі партыямі мірных жыхароў на тэрыторыю цагельнага завода і расстрэльвалі іх там. Трупы кідалі ў ямы і засыпалі пяском. Такіх ям, дзе закопвалі расстраляных, на тэрыторыі цагельнага завода многа.

Для расстрэлу прыводзілі мужчын, жанчын і дзяцей. У час расстрэлу да тэрыторыі завода нікога не пускалі, выстаўлялі пасты. Я асабліва назірала выпадкі расстрэлу са свайго дома, паколькі ён знаходзіўся на тэрыторыі завода. Усяго там было расстраляна звыш 20 тыс. мірных грамадзян. У верасні 1942 г. немцы за сувязь з партызанамі на шыбеніцы, што стаяла каля Смаленскага рынку, павесілі маю сяброўку Зіну Васільеву — студэнтку педагагічнага інстытута, а таксама Лідзію Бярозкіну. У той раз былі павешаны 6 чалавек.

Што мы бачылі...

З успамінаў Вольгі Сямёнавай, жыхаркі Віцебска.

Да вайны я і мая сястра Палагея працавалі вагонаважатымі гарадскога трамвая. Я працавала на ўсіх шасці маршрутах. Прыгадваю як сон той шчаслівы час, калі маторны вагон № 123, весела пазвоньваючы, імчаўся па вуліцах майго горада, апярэджваючы шумны ажыўлены людскі паток, што запаўняў тратуары. Аб'язджаючы горад з канца ў канец, я бачыла, як наш Віцебск добраўпарадкаваўся, як прыгажэў з кожным днём...

У пачатку акупацыі немцы вывезлі ў Германію медныя правады трамвайных ліній, спалілі вагоны, а сам горад ператварылі ў пустыню — адны руіны ды папялішчы.

Немцы спалілі і памяшканне 13-й школы на Гогалеўскай вуліцы, дзе калісьці вучылася мая сястрычка Марыя. Школу закрылі, а ў яе памяшканні зрабілі размеркавальны пункт біржы працы. Тут сартыравалі моладзь перад адпраўкай на катаргу ў Германію. Нават скрозь зачыненыя вокны на вуліцу даносіўся плач і галашэнні мноства юнакоў і дзяўчат. А на вуліцы, на другім яе баку тоўпіліся, заліваючыся слязьмі, іх бацькі, пакуль патрулі не разганялі іх гумавымі палкамі.

Мы месяцамі не выходзілі на вуліцу. У нас быў пад зямлёй ход з дому ў лазню, што стаяла на агародзе. Бацька звычайна вартаваў ля вакна, і, калі паяўляліся немцы, мы хаваліся ў лазні.

Правасуддзе здзейснілася

З 29 лістапада па 3 снежня 1947 г. ў тэатры імя Якуба Коласа праходзіў працэс над нямецкімі ваеннымі злачынцамі Гальвітцэрам і іншымі, што арудавалі ў акупіраваным Віцебску. Судзіў злачынцаў Ваенны трыбунал Прыбалтыйскай ваеннай акругі. Абвінавачанне падтрымліваў ваенны пракурор Беларускай ваеннай акругі генерал-маёр Смірноў.

Увечары 3 снежня быў аб'яўлены прыгавор. У адпаведнасці з артыкуламі 319-м, 320-м Крымінальна-працэсуальнага кодэкса БССР і Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 мая 1947 г. Ваенны трыбунал прыгаварыў Фрыца Гальвітцэра, Ганса Шмідта, Альфонса Хіттэра, Клауса Мюллер-Бюлова, Ганса Дыльмана, Генрыха Клутэ, Германа Руха, Леангарда Буцбаха, Курта Гюнтэра і Філіпа Адама да заключэння ў папраўча-працоўных лагерах тэрмінам на 25 год кожнага.

Жыхары Віцебска і вобласці, якія прысутнічалі ў зале, сустрэлі прысуд з адабрэннем.

Правасуддзе здзейснілася. *М.Ф.Крывёнак.*

На нямецкай катарзе

Вываз насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію быў выкліканы правядзеннем ў жыццё палітыкі фашызму ў адносінах акупаваных народаў, згодна з якой 25% жыхароў Беларусі планавалася выкарыстоўваць у якасці працоўнай сілы на тэрыторыі Германіі, якой неабходна было шмат працоўных рук.

Цяжкае становішча на ўсходнім фронце выклікала патрэбу ў мабілізацыі ў армію мужчын малодшага прызыўнога ўзросту. Выправіць гэтае становішча магла толькі адпраўка ў рэйх некалькіх мільёнаў усходніх рабочых. На наяўнасць чалавечых рэзерваў на акупаваных усходніх землях неаднойчы звяртала ўвагу нямецкае кіраўніцтва.

Спачатку насельніцтва горада і вобласці на работу ў Германію адпраўлялася на добраахвотнай аснове (у 1-й палавіне 1942 г.). На акупаваных тэрыторыях была разгорнута актыўная агітацыйная кампанія. У прэсе друкаваліся матэрыялы аб высокім узроўні жыцця працоўных і сялян у рэйху, растлумачваўся парадак выезду. У агітацыйных артыкулах падкрэслівалася, што большасць прадпрыемстваў у выніку баявых дзеянняў знішчана, а ў Германіі астарбайтарам будзе прадастаўлена работа і дадзена магчымасць стаць кваліфікаванымі спецыялістамі. Сялянам пасля звароту дадому абяцаліся зямельныя надзелы.

Клопат аб арганізацыі вольнага часу і быту ўсходніх рабочых быў даручаны нацыянал-сацыялістычнай супольнасці «Сіла ў радасці», якая ўваходзіла ў склад Германскага рабочага фронту, які павінны быў сачыць за тым, каб памяшканні рабочых утрымліваліся ў парадку, а таксама ўлічваліся нацыянальныя звычаі ў прыгатаванні ежы.

Астарбайтарам гарантавалася высокая заработная плата. Са жніўня 1943 г. былі ўведзены прэміі. Пасля заканчэння першага года працы прадугледжвалася надбаўка ў выглядзе 20% ад заработнай платы, пасля заканчэння другога года — 30%, трэцяга — 50%. Для сямей асоб, добраахвотна паехаўшых у Германію, выплачвалася грашовая дапамога ў 130 руб. (са жніўня 1943 г. павялічана да 200 руб.). Калі параўнаць памеры грашовай датацыі з цэнамі на прадукты харчавання (1 л малака каштаваў болей за 10 руб., пуд хлеба — 900—1200 руб., пуд бульбы — 200—300 руб.), відавочна, што датацыя не забяспечвала жыццёвага мінімуму. Калі працоўны быў асноўным кармільцам, то сям'я трапляла ў крытычнае становішча.

Распараджэннем рэйхсміністра працы ад 30 сакавіка 1943 г. былі ўведзены датацыі па страце працаздольнасці, якія маглі атрымліваць рабочыя, страціўшыя працаздольнасць на 33%. Асобам, пацярпеўшым у выніку няшчаснага выпадку або прафесійнага захворвання, абяцалася медыцынская дапамога. У выпадку смерці рабочага яго ўдава, калі яна з'яўлялася непрацаздольнай, мела права на атрыманне датацыі.

Тыя, хто працаваў у Германіі, мелі права перасылаць накопленыя грошы да родных. Для накаплення грошай мелі хаджэнне спецыяльныя маркі наміналам у 1, 3, 5, 10, якія цалкам суадносіліся рэйхсмаркам. Гэтыя ашчадныя маркі захоўваліся кіраўнікамі прадпрыемстваў, і яны былі абавязаны адсылаць іх у Берлінскае аддзяленне цэнтральнага сельскагаспадарчага банка Украіны, адкуль яны паступалі ў мясцовыя банкі, дзе родныя і атрымлівалі грошы.

Працоўныя таксама мелі права двойчы ў месяц весці перапіску з роднымі. Адсылаць дазвалялася толькі паштоўкі, што дазваляла нямецкім уладам кантраляваць змест.

У Германіі для ўсходніх рабочых выдавалася газета «Труд» (з 21.5.1942 г.), галоўнай задачай якой з'яўлялася інфармаванне астарбайтараў пра жыццё нацыянал-сацыялістычнай Германіі і сітуацыі на «вызваленых» землях.

Аднак названыя меры сацыяльнай абароны ўсходніх рабочых існавалі толькі ў нямецкіх агітацыйных артыкулах.

У лютым 1942 г. на працоўнай біржы ў Віцебску пачаўся запіс тых, хто жадаў паехаць на работу ў Германію. Запрашаліся мужчыны і жанчыны ва ўзросце 17—40 год розных спецыяльнасцей і адукацыі. Для высокакваліфікаваных спецыялістаў абмежаванняў не існавала. Дазвалялася браць з сабой дзяцей ва ўзросце не меней за 14 год.

25 сакавіка з Віцебска адправілася першая партыя «добраахвотнікаў» колькасцю 720 чалавек. З 2-й палавіны 1942 г. пачаўся прымусовы вываз рабочых у Германію. Аб нязначнай колькасці добраахвотнікаў сведчыць той факт, што гарадская ўправа Віцебска ў канцы 1942 г. выплачвала грашовую дапамогу толькі некалькім сотням сем'яў, а з 1 мая да 1 жніўня таго ж года з Віцебска ў Германію было адаслана болей за 5 тыс. чалавек. Па звестках генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні рабочай сілы Фрыца Заўкеля, з 5 млн. іншаземных рабочых у Германію добраахвотна прыбылі меней за 200 тыс. чалавек.

Акупацыйныя ўлады прынялі шэраг мер па павелічэнні колькасці рабочай сілы, якая вывозілася. Мясцовым біржам працы было даручана весці ўлік працаздольнага насельніцтва. Значна павялічваецца ўгон у 1943 г. 1.8.1943 г. было даведзена да насельніцтва распараджэнне нямецкіх улад аб усеагульнай мабілізацыі на работу грамадзян 1925 г. нараджэння. Ад прымусовай працы вызваляліся толькі асобы, якія неслі службу ў мясцовых узброеных фарміраваннях, а таксама прызнаныя непрыгоднымі спецыяльнай медыцынскай камісіяй. Грамадзянам 1925 г. нараджэння неабходна было прыбыць у пэўны тэрмін да месца збору, мець пры сабе асобныя рэчы

і адзенне, у т.л. зімовае. 8 жніўня быў абвешчаны прызыў асоб 1926 г. нараджэння.

На акупаваных тэрыторыях была ўстаноўлена квота ўгону астарбайтараў. З 15.3.1943 г. з тэрыторыі гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» (тэрыторыя тыла групы армій «Цэнтр», куды ўваходзіла і Віцебская вобласць) планавалася вывозіць каля 5 тыс. чалавек кожны месяц. З 1.4.1943 г. квота падвоілася. Аднак заселенасць беларускіх зямель значна паменшылася яшчэ да 1942 г., таму план вывазу не выконваўся. У тэлеграме міністэрства па справах акупаваных зямель Заўкелю ад 14.6.1944 г. гаварылася: «Неабходна адпраўляць у рэйх непаўналетніх ва ўзросце ад 10 да 14 год». Таксама меў месца вываз асоб пенсійнага ўзросту (1864—1868 гадоў нараджэння), якіх утрымлівалі ў лагеры, але яны не працавалі. Гэта сведчыць аб імкненні мясцовых улад абавязкова выканаць план угону. Вялікая колькасць астарбайтараў была захоплена карнікамі ў час правядзення аперацый супраць партызан. Так, у час аперацыі «Котбус» (май—чэрвень 1943 г. з-пад Лепеля былі вывезены 6053 чалавекі.

Захопам насельніцтва ў горадзе і на тэрыторыі вобласці займаліся армейскія часці 53-га корпуса групы армій «Цэнтр», жандармерыя, атрады СС і СД, а таксама мясцовыя ўзброеныя фарміраванні (паліцыя, Руская народная армія, атрады латышоў). Садзейнічалі ўгону прадстаўнікі мясцовых улад — старасты, бургамістры.

Умовы жыцця ўсходніх працоўных у Германіі карэнным чынам адрозніваліся ад таго, што прапагандавалася на акупаваных тэрыторыях. Каштоўнай крыніцай разумення ўмоў працы і быту астарбайтараў з'яўляюцца апытальныя лісты грамадзян, якія вярнуліся з Германіі. Апытанне праводзілася савецкімі ўладамі ў 1944—45 гг. Паказанні сведчаць, што вываз праводзіўся ў таварных вагонах, працоўныя па некалькі дзён не атрымлівалі ежы і нават вады. Нездавальняючым было харчаванне астарбайтараў, якія атрымоўвалі норму, усталяваную для савецкіх ваеннапалонных.

Выключна дрэнна забяспечваліся працоўныя адзеннем і абуткам. Зрэдку выдаваліся спяцоўка і драўляныя башмакі, але часцей насілі тое, што было прывезена з дому. Умовы размяшчэння вывезеных працоўных залежалі ад канкрэтнай гаспадаркі і змяняліся ад зусім цяжкіх (у канцлагерах) да здавальняючых (у сялянскіх гаспадарках). Да ўсіх працоўных прымяняліся розныя пакаранні.

Памеры заработнай платы астарбайтараў былі розныя. У апытальных лістах названы сумы ад 5 да некалькіх дзесяткаў марак. Нізкая заработная плата тлумачыцца высокімі падаткамі на прадпрыемствы, дзе выкарыстоўвалася праца рабочых, а таксама рознымі штрафамі і інш.

Найбольш насельніцтва горада і вобласці вывезена ў Германію ў 1943 г. (больш 50% угнаных). У час акупацыі з тэрыторыі Віцебскай вобласці было ўгнана 68 934 чалавекі. Да 1948 г. на Радзіму вярнуліся толькі 43 812 чалавек.

Я.А.Грэбень.

Нанятыя хлусы

Нямецкія блюдалізы з бульварнай газеткі «Новый путь» атрымалі чарговы загад з гестапа: абвяргаць усё, што пішуць загнаныя ў Германію беларусы, выдумляць пісьмы і змяшчаць у газеце, і хлусіць да знямогі. Адным словам, рабіць так, як оберхлус Гебельс.

І, вось, вынік — артыкул ад 27 ліпеня пад сенсацыйным загалоўкам; «Работающие и поющие покойники». Але як ні стараўся выслужыцца прадажны пісака, як ні выдумляў і не хлусіў — нічога ў яго не атрымалася, а выйшаў нязграбны артыкул, які выдае хлусаў разам з іх аслінымі вушкамі.

Першай справай бравы пісака расправіўся з «хлуслівымі слухамі», і, як загадана, васкурыў фіміям па адрасу фашысцкай Германіі, назваўшы яе краінай «истинного социализма» (!?). Далей безымянны аўтар апавядае з захапленнем аб тым, як задаволены сваім становішчам працуючыя ў Германіі Екацярына І., Тамара М., Іван А. і Ягор М.

Кожны, каму ўсунуць у рукі гэту бульварную газетку, і без растлумачэння таямнічага аўтара зразумее, што ўсе гэтыя І.М., А. — нязграбная выдумка, плод фантазіі, мёртвыя душы.

Інакш, чаму б не назваць прозвішчы, месца жыхарства і г.д.? Незадачлівы «збіральнік» мёртвых душ не падпісаў таксама пад артыкулам і свайго ўласнага прозвішча.

Гэта зроблена з-за сціпласці? Не. Выдадак, пазбаўлены сумлення і гонару, не здоль-

ны на сціпласць! У чым-чым, а ў сціпласці мы яго абвінаваціць не можам. Чаму ж не падпісаў? Вельмі проста, рызыкоўна. Прадажных хлусаў б'юць. Б'юць не толькі на вуліцах Віцебска, але і ва ўласным доме.

Вернемся, аднак, да зместу гэтага, з дазволу сказаць, артыкула.

Аўтар сцвярджае, што работа «завербаваных» «не працяглая і не цяжэй работы германскіх прамысловых рабочых». І далей: «Як толькі раздаецца фабрычны гудок, машыны спыняюцца. «Потым усе накіроўваюцца ў сталовую, дзе абедаюць або вячэраюць за доўгімі, чыста вымытымі сталамі». І ўсё. А вось які працяглы рабочы дзень, калі пасля колькіх гадзін знясільваючай працы «раздаецца гудок» і чым харчуюцца рабочыя, седзячы за «чыста вымытымі сталамі» — аб гэтым ні гуку. Гэта і ёсць тое, што загадана схаваць.

Але праўды не ўтоіш. Мы ведаем, што праца катаржная, што нашы людзі працуюць пад наглядам эсэсаўскіх дзяржыморд, што кормяць іх баландой з бульбяных лушпін і памыямі.

Аднак тое-сёе праскоквае нават скрозь гэту злавонную хлусню. Распісваючы «харастро» правядзення вольнага часу, невядомы пісака мімаволі малюе карціну казарменнага жыцця, дзе ўсё робіцца ва «ўстаноўлены час», нават ігра на балалайцы і спевы «сумных песень». Далей казармы-каземата ўсходні рабочы не мае права хадзіць.

І, нарэшце, у завяршэнне гэтай агіднай пісаніны зусім сур'ёзна сцвярджаецца, што загнаным ў Германію «не адсякаюць рукі і не адразаюць вушэй».

Яшчэ б! Чаго варты раб без рук і каму ён патрэбен. Ахвотна верым, што рускім, беларусам, украінцам у Германіі не адсякаюць рук. Знясіленыя паднявольнай працай, замучаныя голадам, яны паміраюць тысячамі, уносячы з сабой у магілу ссохшыя рукі і грозна сціснутыя, кастлявыя кулакі.

Васіль Глускі.
«Віцебскі рабочы». 1942. 12 жніўня.

Дакументы сведчаць

ДАНЯСЕННЕ ЧЛЕНА ВАЕННАГА САВЕТА 5-й АРМІІ ГЕНЕРАЛ-МАЁРА І.М.ПАНАМАРОВА ЧЛЕНУ ВАЕННАГА САВЕТА 3-га БЕЛАРУСКАГА ФРОНТА ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЭНАНТУ В.Е.МАКАРАВУ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГОРАДЗЕ ВІЦЕБСКУ

7 чэрвеня 1944 г.

Утром 3 июня с.г. после отхода противника на новый оборонительный рубеж, на участке 491-го стр. полка 159-й стр. дивизии между населенными пунктами Шалемино и Казимирово в лесу был обнаружен лагерь для мирного населения гор. Витебска, созданный немцами. Лагерь размещался на площади 2,5 гектара, был обнесен колючей проволокой и рвом. Подступы к лагерю и выходы из него оказались заминированными.

Сразу же Военным советом были приняты меры по оказанию помощи заключенным лагеря, выводу их из зоны артиллерийского обстрела противника и выяснению обстоятельств создания лагеря. В лагерь были посланы представители командования, работники Политуправления ПОАРМА и ПОКОРА-15, работники отдела контрразведки «Смерш», а также медицинские работники.

В результате расследования было установлено, что большинство мирного населения, заключенного в лагере, белорусы. Среди них есть часть жителей Курской, Орловской, Смоленской и Витебской областей, угнанных немцами во время отступления.

За последнее время немцы производили эвакуацию мирного населения из гор. Витебска, причем жилые помещения сжигались, а имущество жителей в большинстве случаев отбиралось немецкими властями. Последняя партия была эвакуирована 28 мая с.г., причем было вывезено около 12 тыс. человек. В лагерь, освобожденный нашими частями, было отправлено около 8 тыс. Впоследствии часть из них была отобрана и отправлена в Германию, остальное трудоспособное население — в рабочие батальоны, свыше 150 человек умерли в этом лагере от голода и болезней, 80 человек погибло от артиллерийского обстрела лагеря немцами, а часть жителей была расстреляна охраной лагеря на его территории.

Всего в лагере было обнаружено 5862 человека, из них около 3,5 тыс. детей до семилетнего возраста. Остальные заключенные, преимущественно старики, инвалиды, женщины.

Все они крайне истощены и обессилены от голода, болезней и зверского обращения немцев. До момента отхода немецких частей лагерь охранялся подразделениями службы охраны. Население лагеря жило под открытым небом. Им не давали пищи, запрещали разводить огонь, систематически подвергали избиениям и кровавым расправам. Больным и раненым никакой помощи не оказывалось.

Немецкие солдаты и офицеры приходили в лагерь и отбирали оставшихся здоровых мужчин в возрасте от 14 до 45 лет, якобы, в рабочие батальоны, а потом выводили из лагеря и расстреливали. Всего на территории лагеря было расстреляно свыше 150 человек.

По рассказам жителей, эвакуация гор. Витебска началась с марта 1944 г., причем она сопровождалась массовыми зверствами, ограблениями и расстрелами мирного населения. В районе железной дороги был создан концлагерь для мирных жителей, куда они сгонялись перед отправкой. Многие жители находились в этом лагере по 5 и больше недель, причем там значительная часть умирала от голода, болезней и зверского обращения. Из этого лагеря немцы отбирали молодежь для отправки в Германию, трудоспособное население на оборонительные работы, а женщин, детей, стариков и инвалидов вывозили в конце мая и в начале июня в лагерь у дер. Казимирово.

Все эти мероприятия немцев были направлены на зверское истребление советских граждан. Об этом свидетельствует отсутствие питания у заключенных, перемешивание заразных больных со здоровыми, близость лагеря к переднему краю, обстрел его артиллерийским и минометным огнем со стороны немцев и т.д.

На территорию лагеря выезжали руководящие работники армии. С населением лагеря был проведен митинг и регулярно проводились беседы политработниками. Население с огромной радостью и со слезами встречало Красную Армию и горячо благодарило за свое освобождение от немецко-фашистского ига.

Военным советом был принят ряд мер по оказанию медицинской и материальной помощи и эвакуации населения лагеря. Жители были накормлены и им выдан был 5-суточный запас продовольствия на путь следования на родину. 5617 человек были эвакуированы 5 и 6 июня в Износковский и Темкинский районы Смоленской области. 220 больных и 25 раненых были немедленно изъяты и размещены в санучреждение армии.

Приложение: акты, письма, описания и фотоматериалы на листах.

Член Военного Совета 5-й армии генерал-майор Пономарев

Начальник политотдела 5-й армии полковник Хватов

7 июня 1944 г.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 241, воп. 2632, спр. 12, л. 65—66. Выявіў і падрыхтаваў да друку У.І.Лемяшонак.

АКТ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННІ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ВІЦЕБСКУ

26 верасня 1944 г.

Віцебск

Мы, нижеподписавшиеся, комиссия в составе: начальник УНКВД по Витебской области подполковник госбезопасности Гоголев, военный прокурор войск НКВД майор юстиции Новиков, облсудмедэксперт Силищев, сотрудник УНКВД мл. лейтенант Домошнев, облгосинспектор Кардаш по поручению Областной Комиссии содействия в работе Чрезвычайной Государственной Комиссии по расследованию злодеяний немецких оккупантов произвели обследование мест захоронения истребленных немецкими оккупантами советских граждан на территории города Витебска.

Материалами следствия, осмотра мест истребления и захоронения, а также судебно-медицинским исследованием трупов и их останков Комиссия установила:

В течение всего периода временной оккупации на территории Витебска и его окрестностей немецко-фашистские варвары производили массовые, систематические истребления советских военнопленных и мирных граждан. Немецко-фашистские изверги уничтожили десятки тысяч бойцов и офицеров Красной Армии. Многочисленные места захоронения, обнаруженные Комиссией в районе г. Витебска, свидетельствуют о планомерном умерщвлении фашистскими захватчиками детей, подростков, женщин и стариков.

С целью сокрытия совершенных злодеяний немцы в некоторых местах делали запахивание могил, ям и траншей и посев на них.

В районе г. Витебска и его окрестностей Комиссией обследованы могилы массовых жертв фашистского террора:

1. на территории бывшего 5-го железнодорожного полка;
2. на территории кирпичного завода;
3. на территории Ново-Улановской горы и Черного болота.

Лагерь военнопленных на территории бывшего 5-го железнодорожного полка (в трех километрах от г. Витебска, между двух шоссейных дорог — на Полоцк и на Городок). Здесь Комиссия обнаружила 70 могил, имеющих в среднем 7 × 8 × 4 м и, кроме этих могил, еще до трехсот могил размером 2 $^{1}/_{2}$ × 3 × 3 $^{1}/_{2}$. Трупы, найденные в могилах, находились в беспорядочном положении, т.е. одни из них лежали вниз лицом, другие вверх ногами, третьи с поджатыми коленями к животу, четвертые — ногами к лицу и т.п. Большинство из них были одеты в военную или гражданскую одежду.

Судебно-медицинским осмотром установлены повреждения костей черепа тупыми предметами (например, прикладами винтовок) и пулевыми ранениями из огнестрельных оружий. Осмотром пулевых ранений в костях черепа и плеча установлены у большинства входные отверстия пулевых ранений расположены в области затылка головы и задних частей тела. Судебно-медицинским исследованиям трупов и свидетельскими показаниями граждан установлено, что содержавшиеся в лагере военнопленные и мирные жители умерщвлялись путем создания голодного режима при непосильном изнуряющем физическом труде, антисанитарных условий, ведших к массовым инфекционным заболеваниям (сыпной тиф, дизентерия и др.), лишения медицинской помощи, а также истязаний и систематических расстрелов. В одной из ям, величиной 15 × 10 × 5 м, найдено большое количество трупов в военной одежде с наличием сохранившихся бинтов и металлических проволочных шин на местах ранений и переломов костей. Эта яма была заполнена исключительно ранеными военнопленными. Другая яма, представляющая собою почти круглую форму, заполнена трупами мужчин в военной форме, умерших от изнурительного голода и холода. Трупы не имеют под сохранившейся кожей никакой подкожно-жировой клетчатки. Это скелеты, обтянутые кожей. В верхнем слое этой ямы насчитано Комиссией до трехсот трупов, а таких слоев здесь было семь.

Западная сторона лагеря. Здесь в низинах обнаружено несколько могил крупного размера. В одной из них, размером 7 × 8 × 4 м, трупы военнопленных в одежде с солдатскими котелками, пустыми консервными банками, привязанными к поясному ремню или заменяющей ремень проволоке. Здесь много ложек, кружек, баночек с крупинками соли и других предметов. В этом месте найден труп одной женщины в гражданской одежде, рядом с которой лежал стакан с вложенными в него детскими чулочками.

Преобладающий возраст погибших 20—30 лет.

Общее количество расстрелянных и погибших от голода и истязаний, похороненных на территории бывшего 5-го железнодорожного полка, по свидетельским показаниям и данным экспертизы, превышает 80 000 чел. Из них было около 4000 чел. гражданского населения: детей, стариков, женщин.

Расследованием Комиссии установлено, что лагерь (в окрестностях) на территории бывшего 5-го железнодорожного полка был местом массовых расстрелов советских людей с первых дней оккупации до дней прихода Красной Армии. Здесь, с целью сокрытия следов злодеяний, немцы производили запашки плугами поверхностей могил.

Настоящий акт составили и подписали:

Гоголев, Новиков, Силищев, Домошнев, Демьянченок, Кардаш.

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 1971, воп. 3, спр. 1, л. 1.

Віцебскае падполле дзейнічае

Віцебскае партыйна-патрыятычнае падполле пачало дзейнічаць з першых жа дзён акупацыі. У яго станаўленні і дзейнасці выразна бачны 2 перыяды: 1-ы — ад пачатку акупацыі Віцебска да адкрыцця Віцебскіх (Суражскіх) «варот» у лютым 1942 г. і 2-і — з лютага 1942 г. да канца чэрвеня 1944 г., да вызвалення.

Прыфрантавое становішча горада на працягу 3 год унесла спецыфіку ў дзейнасць патрыётаў на акупіраванай Віцебшчыне, у т.л. і дзейнасць віцебскага падполля. Па словах начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнкі, барацьба тут праходзіла «...почти непосредственно в боевых порядках войск противника, в его ближайшем тылу, наиболее насыщенном силами и учреждениями противника»[1].

30 чэрвеня — 1 ліпеня 1941 г. ЦК Кампартыі Беларусі накіраваў у неакупіраваныя раёны дырэктывы, якія абавязвалі партыйныя, савецкія і камсамольскія арганізацыі рыхтавацца і пераходзіць на падпольную работу, разгортваць партызанскі рух. Так, дырэктыва № 1 адносна падполля патрабавала: «Под ответственность первых секретарей обкомов, горкомов, райкомов КП(б)Б заблаговременно создать из лучших людей надежные подпольные ячейки и явочные квартиры... В городах и районах для руководства работой подпольных ячеек первыми секретарями обкомов назначаются городские и районные тройки...»[2]. Гэтыя «тройкі» у далейшым сталі называцца «партыйнымі цэнтрамі» і нават «камандным пунктамі». Атрымаўшы дырэктывы, Віцебскі абком КП(б)Б тут жа правёў нараду сакратароў гаркомаў і райкомаў партыі, на якой абмяркоўваліся неадкладныя меры па іх выкананню.

З мэтай аказання дапамогі партыйным органам вобласці ў Віцебск прыязджалі сакратары ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка, Уладзімір Рыгоравіч Ванееў, Іосіф Іванавіч Рыжыкаў, першы сакратар ЦК ЛКСМБ Міхаіл Васілевіч Зімянін, упаўнаважаны ЦК ЛКСМБ, рэдактар газеты «Чырвоная змена» Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў і іншыя кіраўнікі рэспублікі.

6.7.1941 г. І.І.Рыжыкаў правёў у абкоме партыі інструктаж камуністаў, рэкамендаваных для работы ў падполлі. Разам з першым сакратаром абкома КП(б)Б Іванам Андрэевічам Стулавым яны асабіста гутарылі з кожным камуністам паасобку. У падполлі было пакінута 60 камуністаў, 150 камсамольцаў[3] і 12 работнікаў міліцыі.

Усю падпольную работу ў горадзе павінен быў узначаліць падпольны партыйны цэнтр на чале з сакратаром гаркома партыі па прамысловасці П.І.Івановым. Прадстаўніком ЦК КП(б)Б у падполлі Віцебска быў прызначаны 2-і сакратар Беластоцкага абкома партыі П.І.Папоў.

Усё было зроблена аператыўна, як патрабавалі дакументы ЦК КП(б)Б, але выбар кіраўнікоў партцэнтра («тройкі») аказаўся няўдалым. Ужо 16.7.1941 г. пастановай бюро абкома партыі, пасяджэнне якога праходзіла ўжо за межамі вобласці, на Смаленшчыне, Іваноў быў выключаны з радоў партыі за: «Невыполнение решения обкома, самовольный выезд из Витебска, где он был оставлен для организации партработы, и проявленную трусость»[4]. У той жа пастанове сказана і аб іншым кіраўніку падпольнага цэнтра: «Довести до сведения ЦК партии Белоруссии, что Попов — секретарь Белостокского обкома КП(б)Б, направленный для работы в Витебске, решение бюро не выполнил и самовольно выехал из Витебска»[5].

І.І.Рыжыкаў.

І.А.Стулаў.

У сувязі з гэтым у сваёй даведцы ў ЦК КП(б)Б у жніўні 1941 г. І.А.Стулаў называе новых кіраўнікоў партцэнтра: «В Витебске остались для руководства партийными организациями Семенов — первый секретарь Железнодорожного РК КП(б)Б, Любимцев — первый секретарь Октябрьского РК КП(б)Б, а также 60 членов и кандидатов партии»[6].

З іншых крыніц стала вядома, што ў якасці сувязнога з абкомам партыі прызначаўся 2-і сакратар Чыгуначнага райкома КП(б)Б горада Віцебска Ісак Георгіевіч Грыгор'еў. Сярод пакінутых у падполлі вядомы таксама імёны А.Я.Белахвосцікава, С.П.Бурлакова, В.А.Вярбіцкага, І.І.Галдаевіча, У.А.Казлоўскага, А.І.Каласоўскага, В.І.Кірыленкі, М.А.Купалава, М.В.Любчанкі, А.М.Нямыкіна, М.У.Пальчэўскага, К.С.Разбаева, А.Д.Таропіна, В.Э.Трэсцера, Л.А.Хрыпача і іншых.

У выніку такіх вось паводзін адказных кіраўнікоў, усе пакінутыя ў падполлі камуністы засталіся без дакументаў, паколькі свае ім загадана было здаць на захаванне, а новыя, якія павінен быў падрыхтаваць Іваноў і работнікі НКУС, яны не атрымалі[7].

Абставіны, якія склаліся, крайне негатыўна адбіліся на настроі і лёсе пакінутых у падполлі, у значнай меры дэзарганізавалі і затармазілі пачатак падпольнай работы, прывялі да гібелі людзей.

І.Г.Грыгор'еў.

З кіруючага партцэнтра ў горадзе засталіся сакратары Чыгуначнага РК КП(б)Б Барыс Калістратавіч Сямёнаў з групай камуністаў свайго раёна (15 чалавек) і Грыгор'еў. Яны не ведалі і не верылі, што Іваноў і Папоў збеглі зусім і марна страцілі шмат часу на іх пошукі. Пяць разоў Сямёнаў і Грыгор'еў са сваімі камуністамі выходзілі з Віцебска і вярталіся зноў. Без дакументаў, выпадковай работай зарабляючы на хлеб, яны абышлі пазначаныя яўкі ў Віцебскім, Лёзненскім, Суражскім, Панізоўскім і Веліжскім раёнах.

Наведваючы раёны, яны праводзілі палітычную работу сярод насельніцтва, знаёмілі мясцовых жыхароў са зместам лістовак, якія раскідвалі савецкія самалёты. А ў Веліжскім раёне Смаленскай вобласці Сямёнаў, Грыгор'еў і чыгуначнік-камуніст Мікалай Аляксандравіч Купалаў стварылі 2 падпольныя групы з мясцовых жыхароў і трапіўшых у акружэнне воінаў Чырвонай Арміі. Адну з гэтых груп у в. Крывачы ўзначаліў Купалаў. Але, адчуваючы адказнасць за сваё асноўнае заданне ў падполлі горада, у кастрычніку 1941 г. ўсе трое вярнуліся ў Віцебск.



Вярбовачныя дакументы на тонкай паперы, з якімі сувязныя прыходзілі ў горад.

Няўрымслівы і энергічны М.А.Купалаў адразу ўзначаліў групу чыгуначнікаў, якія таксама вярнуліся ў горад. Да іх у хуткім часе далучылася каля 20 былых ваеннапалонных, перапраўленых з бальніцы ў Маркаўшчыне ўрачом Т.М.Шырочанка. На гэтую групу Купалава ў першую чаргу абапіраліся Сямёнаў і Грыгор'еў. Але замацавацца ў горадзе і легалізавацца ўдалося толькі І.Г.Грыгор'еву. Рызыкуючы жыццём, двое мясцовых жыхароў падцвердзілі, што ён беспартыйны. Б.К.Сямёнаў вымушаны быў пакінуць горад у снежні 1941 г. Яму раздабыць дакументы не ўдалося, і ён нелегальна пражываў у сям'і былога шафёра райкома партыі. Доўга хварэў, потым перабраўся ў партызанскі атрад, адкуль быў выкліканы ў абком КП(б)Б. Атрымаў вымову па партыйнай лініі і ў 1943 г. зноў накіраваны ў тыл ворага. 7.4.1943 г. ўвайшоў у склад створанага ў гэты час падпольнага гаркома партыі.

У друку і ў некаторых дакументах існуюць зусім процілеглыя ацэнкі іх дзейнасці ў пачатковы перыяд вайны. У.Е.Лабанок лічыў, што ў гэты цяжкі час Чыгуначны райком партыі, у асобе двух сакратароў, выконваў функцыі падпольнага гаркома партыі[8]. Зусім інакш ацаніў іх работу абком КП(б)Б, які лічыў, што яны не выканалі партыйнае даручэнне. Пра І.Г.Грыгор'ева І.А.Стулаў паведамляў у ЦК КП(б)Б: «Это задание он не выполнил, возвратился в Витебск и там отсиживался»[9].

Відаць, адназначна-катэгарычна ацэньваць дзейнасць Сямёнава і Грыгор'ева нельга.

Паступова І.Г.Грыгор'еў наладзіў сувязь з кіраўнікамі падпольных груп А.Я.Белахвосцікавым, К.С.Акаловіч, з камуністамі І.К.Оскер і яго сястрой, А.Д.Таропіным, П.Сафронавым, З.І.Козыравай, сям'ёй Мартышунас, беспартыйнымі патрыёткамі Г.С.Стаяковай, К.П.Конанавай і інш. Але, як члены партыйнага цэнтра, яны не здолелі праявіць самастойнасць, адчуць сябе кіраўнікамі яго і ўзначаліць падполле. 20.5.1942 г. пакінуў горад і І.Г.Грыгор'еў[10]. К.С.Акаловіч пераваяла яго да партызан. Такім чынам, кіруючы партыйны цэнтр у горадзе не склаўся.

Тым не менш працэс стварэння і станаўлення падполля працягваўся. Групы ў горадзе ствараліся радавымі камуністамі і камсамольцамі, або фарміраваліся стыхійна, аб'ядноўваючы патрыётаў па сумеснай даваеннай

працы ці па сямейнаму або сваяцкаму прынцыпу. Многія асобныя групы фарміраваліся вакол армейскіх разведчыкаў, якія сумелі пранікнуць і ўладкавацца ў горадзе амаль з першых дзён вайны. Цікава расказаў аб сваім з'яўленні і дзейнасці ў Віцебску Васіль Іванавіч Чыркоў: «28 сентября 1941 г. я был направлен в тыл врага на территорию Витебской области... Весь 1941 год и до конца февраля 1942 г. действовал как разведчик-маршрутчик в районе наибольшего скопления войск противника вокруг Витебска... Пробрался в Витебск... Познакомился с врачом Околович Ксенией Сергеевной..., ей удалось достать мне документы на имя Белицкого Владимира Ивановича. Прописка была оформлена по улице Гоголевской, 11. Так я стал коренным витеблянином... Очень многие советские патриоты помогали, ежедневно рискуя попасть в лапы врага»[11].

Да канца 1941 г. ў горадзе дзейнічала 20 падпольных груп і нямала падпольшчыкаў-адзіночак[12]. Палову гэтых падпольных груп стварылі камсамольцы і моладзь.

Дарэчы, камсамольскія важакі, пакінутыя ў падполлі гаркомам ЛКСМБ (першы сакратар Надзея Сямёнаўна Самуйлава), былі падабраны даволі ўдала. Напрыклад, група Белахвосцікава («Альдэмар») аформілася ў Стадыённым пасёлку яшчэ да акупацыі горада і дзейнічала актыўна і без страт да сярэдзіны 1943 г., група У.А.Казлоўскага — да кастрычніка 1942 г.

Апрача пералічаных груп, у 1941 г. пачалі дзейнічаць падпольныя групы М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова (у медустановах), А.Г.Канаплёва (затым — Бярозкінай у друкарні і вузле сувязі), Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі (на чыгунцы), М.Я.Нагібава (раён Гарадоцкіх вуліц), Л.І.Хрыпача (у торфаўпраўленні), В.Д.Шалуха (Тарны пасёлак), В.С.Кулагінай (прыгарад), Спірыдонавай і інш.

Адсутнасць адзінага кіруючага цэнтра ў горадзе, сувязі з Вялікай зямлёй, крывавы акупацыйны рэжым прымушалі кіраўнікоў першых падпольных груп прымаць рашэнні і дзейнічаць самастойна. Так, К.С.Акаловіч, працуючы ўрачом тубдыспансера, захавала пашпарты памерлых хворых, тым самым стварыўшы сапраўдны падпольны пашпартны стол. Пачатак сваёй дзейнасці К.С.Акаловіч апісвае так: «Выздоровевших военнопленных мы провожали до черты города или ближайшего селения, отправляли по направлению Суража или Лиозно, где, по нашим сведениям, можно было встретиться с партизанами. Таня Вишневская... провожала военнопленных через Лужесно и указывала им дальнейшее направление. Ведь тогда еще никто из нас не был связан с партизанами. Мы действовали совершенно одни»[12].

Д.Ф.Райцаў.

М.Ф.Бірулін.

Пашпартны стол групы К.С.Акаловіч дзейнічаў да верасня 1942 г. як своеасаблівы штаб па выратаванню ваеннапалонных, разведчыкаў, камуністаў, яўрэйскіх сем'яў. Тут было выдадзена да сотні пашпартоў. Гл. таксама артыкул «Падпольная група К.С.Акаловіч».

Фашысты лютавалі. Першымі іх ахвярамі ў Віцебску сталі пракурор С.Н.Міхайлаў, суддзя Вера Фядотава, машыніст Струкін, сакратар камітэта камсамола паравознага дэпо Аркадзь Каласоўскі, юны апалчэнец Леанід Бараноўскі і іншыя патрыёты. Пачалося знішчэнне жыхароў горада яўрэйскай нацыянальнасці. На вуліцах і плошчах з'явіліся шыбеніцы. У верасні 1941 г. фашысты схапілі і павесілі камсамольца Уладзіміра Вінаградава. На ўцалелым фотаздымку відаць надпіс: «Владимир Виноградов. Убил 29.9.41 г. в Витебске немецкого солдата».

У снежні 1941 г. па даносу правакатара за захаванне радыёпрыёмніка і за распаўсюджванне «ложных слухов о поражении германских войск под Москвой»[13] быў павешаны малады камуніст Андрэй Канаплёў.

Мала ці многа зрабілі першыя падпольныя групы, але яны былі першымі, да таго ж дзейнічалі ў найбольш складаны і цяжкі перыяд вайны. Яны закладвалі асновы будучай усенароднай барацьбы з фашызмам.

У студзені—лютым 1942 г. атрады Міная Шмырова («Бацькі Міная»), Данілы Райцава, Міхаіла Біруліна, Аляксея Дзіка, Якава

Захарава і іншых ужо ўтрымлівалі ў сваіх руках вялікую тэрыторыю, утварылі першы на Віцебшчыне партызанскі край плошчай 1600 км^2. У выніку гэтага склаліся спрыяльныя ўмовы для дзейнасці партызан і падполля.

Фронт спыніўся за 80 км ад Віцебска. Прыфрантавым горадам ён заставаўся аж да вызвалення. Гітлераўцы называлі яго «шчытом» у Прыбалтыку і Усходнюю Прусію і сталі ўсямерна ўмацоўваць. Гарнізон горада павялічыўся з 2—3 тыс. да 4—5 тыс. чалавек[14].

У горадзе і вакол яго размясціліся штабы, майстэрні, склады, лазарэты. Моцныя гарнізоны аперазалі Віцебск з усіх бакоў. Напрыклад, у невялічкім санаторным пасёлку Сасноўка размяшчаліся па чарзе штаб 3-й танкавай арміі, 59-га армейскага корпуса і гарнізон да 2 тыс. чалавек. Павялічылася колькасць карных і разведвальных органаў. Апрача аператыўнай каманды СД-9, сюды прыбылі каманды абвера (Абвер-113, Абвер-210, Абвер-318), тайнай палявой паліцыі (ГФП-703, ГФП-717). Умацоўвалася мясцовая паліцыя. Ускладніўся рэжым перамяшчэння. На кожны накірунак выхада з горада і ў горад былі ўстаноўлены пропускі розных форм[15].

Дапамога віцебскім падпольшчыкам прыйшла з боку Чырвонай Арміі. Цераз «вароты» пад Віцебск літаральна хлынулі шматлікія спецгрупы. За люты—красавік 1942 г. прыбылі армейскія разведгрупы А.О.Берзіна, П.В.Буткевіча, крыху пазней з'явіліся групы М.І.Кавалёва («Байкал»), П.А.Крылатых («Орлікаў»), «Панко», Ю.С.Рудакова («Жорж», «Ягор»), М.Р.Яфімава («Армец»), а таксама аператыўна-чэкісцкая група А.А.Максіменкі. Для работы непасрэдна ў Віцебску прызначаліся групы У.А.Мядзведзева («Іспалін») і М.М.Стаховіча («Макс»). У горадзе ўладкаваліся радысты і разведчыкі многіх з пералічаных груп: А.С.Вінаградава («Каця»), М.М.Кірухіна (цяпер — Калугіна), М.К.Яніна («Грач», «Дзядзя Міша»), працягваў падпольную дзейнасць Чыркоў, у другі раз прыбыў у Віцебск са спецзаданнем Пётр Татарынаў.

З'яўленне такой колькасці пасланцаў з Вялікай зямлі, ды яшчэ з радыёстанцыямі, было сапраўдным святам для падпольшчыкаў горада, тым больш, што ў іх было чаму павучыцца. У сваю чаргу, падпольшчыкі дапамагалі армейцам легалізавацца, збіраць разведінфармацыю, прыцягваць да работы новых людзей. Так, група Ганны Грабяньковай дапамагла групе У.А.Мядзведзева («Іспалін») — амаль 5 месяцаў па вуліцы Верхне-Набярэж-

Удзельнікі падпольнай групы: П.В.Буткевіч (камандзір, злева), В.І.Барадзін, Л.Бяляева (злева), Т.А.Ламаносенка.

най, 75, працавала яе радыёстанцыя. Група Васіля Арлоўскага двойчы перадавала спецгрупе Паўла Буткевіча план Віцебска з апісаннем ваенных аб'ектаў ворага на левым беразе Заходняй Дзвіны і фотаздымкі 5 агентаў абвера з апісаннем іх прыкмет. Гл. таксама артыкул «Падпольная група В.М.Арлоўскага».

З армейскім разведчыкам П.В.Буткевічам супрацоўнічала падпольная група Тамары Ламаносенка-Барадзіной. Падпольныя групы Івана Бекішава (гл. таксама артыкул «Падпольная група І.А.Бекішава»), Барыса Шарэнды, Трафіма Марудава, Веры Кулагінай, Дусі Спірыдонавай цераз рэзідэнта-разведчыка Мікалая Шпакава перадавалі звесткі з Віцебска спецгрупам Ю.С.Рудакова і М.Р.Яфімава. Групы Мікалая Нагібава, Пятра Смірнова і Андрэя Ліпці выконвалі заданні групы Паўла Крылатых.

У жорсткай барацьбе выхоўваліся і заказляліся выдатныя падпольшчыкі — разведчыкі, вопытныя канспіратары. Сярод іх Тащяна Шчукіна («Скромная»), Зінаіда Шаракова (Матвіевіч), Еўдакія Суранава, сёстры Ганна, Марыя, Галіна і Зінаіда Саладухіны, Любоў Мацвеева, Любоў Карнатава, Адольф Турчыновіч («УС»), Марыя Савіцкая, Тамара Сутарман (Дземярза), Яфім Хмялёў («Сідараў»), Галіна Красціна (Дзяркач), Наталля Трахімік, Еўдакія Спірыдонава («Соня»), П.М.Зайцаў («Бывалы», «Пленны»), Элеанора Бараноўская.

В.Р.Кудзінаў.

К.М.Анісімава.

Па атрыманых звестках падпольшчыкаў і армейскіх разведчыкаў савецкая авіяцыя настолькі дакладна і вынікова наносіла ўдары па варожых ваенных аб'ектах, што не толькі наводзіла на акупантаў страх, але і здзіўляла іх. У аўтабіяграфічнай кнізе «Дневник немецкого солдата» нямецкі камуніст Кёрнер-Шрадэр, які знаходзіўся ў складзе войск вермахта ў Віцебску з верасня 1941 да сакавіка 1942 г. пісаў: «Самолеты прилетают теперь ко времени прибытия и разгрузки эшелона. Создается впечатление, что кто-то докладывает советскому командованию о времени прибытия эшелонов. Раньше бомбы сбрасывались просто на железнодорожные пути, теперь они летят прямо на вагоны. Все ломают голову, откуда противник узнает о прибытии воинских составов»[15].

З адкрыццём Віцебскіх (Суражскіх) «варот» былі адноўлены кантакты кіруючых органоў з акупіраванай тэрыторыяй вобласці. У сакавіку 1942 г. з-за лініі фронта ў тыл ворага, у размяшчэнне партызан-шмыроўцаў прыбыла група адказных работнікаў Віцебскіх абкома партыі (І.А.Стулаў), абкома ЛКСМБ (В.І.Лузгін), аблвыканкома (І.М.Рабцаў) і прадстаўнік ЦК КП(б)Б В.Р.Раманаў. Адразу ж у раён Віцебска абкомам КП(б)Б быў накіраваны вопытны работнік пагранвойск НКУС Васіль Раманавіч Кудзінаў. Спачатку ў якасці ўпаўнаважанага абкома, а з мая 1942 г. — адказнага арганізатара абкома партыі па 5 раёнах вобласці і гораду Віцебску — «Віцебскі куст»[16]. Але ўжо 15.9.1942 г. В.Р.Кудзінаў зацвярджаецца адказным арганізатарам толькі па гораду Віцебску. З той жа мэтай 1 лістапада даваенны сакратар парткома фабрыкі «Знамя индустрыялізацыі» Марыя Ільінічна Мацэнка была паслана інструктарам абкома партыі па Віцебску[17].

Кіраўніцтва ажыццяўлялася праз сувязных, роля якіх станавілася выключна адказнай, бо рэжым перамяшчэння ажыццяўляўся пад дэвізам: «Ні аднаго рускага на дарогах!». У дакументах (ЦШПД) ад 24.7.1942 г. паведамлялася: «В Витебске установлен еще более строгий режим... В паспорт заносятся приметы владельца: цвет волос, глаз и т.д. Передвижение по городу с 18.00 до 6 утра запрещено. С 4 июня с.г. властями запрещено гражданскому населению передвижение по всем ведущим в город шоссейным и грунтовым дорогам»[18].

Складаную работу сувязных выконвалі пераважна жанчыны і падлеткі: В.К.Агінская, К.М.Анісімава («Чыгуначніца»), К.Д.Балдачова («Бяроза»), Г.С.Вінаградава («Каця»), А.Я.Войценка, Н.І.Воранава, В.Ц.Вурганава, І.П.Гауберг-Іванова, Г.М.Гранькова, І.А.Жан Ванфу (Эм), М.А.Жыдовіч, М.П.Захарава, Л.В.Кірыленка, Г.С.Кіташова, А.М.Казлова, Н.А.Корачкіна, В.І.Лебедзева, Н.Ф.Лынчан-

А.П.Максіменка.

ка («Цёця Маша»), Е.І.Мардвінава, Т.І.Пілат, С.С.Піскунова (Шлык), Е.А.Сакалова («Пявуння»), Т.С.Шчукіна, І.Я.Якімаў («Ястраб»), А.С.Якімава («Бойкая»), піянеры і школьнікі Тамара Барчанка, Леанід Быкаў, Ганна і Алёша Вялавы, Эдуард Грабянькоў, Іван Ерафееў («Цыганок»), Жэня Калабанава, Ларыса Крупко, Валя Кульбеева («Цыганка»), Паўлік Сакалоўскі. Усяго больш за 100 сувязных[19].

У канцы 1942 г. ў Віцебску дзейнічала ўжо 56 падпольных груп[20]. У гэтую барацьбу ўключыліся цэлыя сем'і: Бекішавы, Вялавы, Журынскія, Кулагіны, Лявонавы, Сакаловы, Свечкіны, Саладухіны, Старавойтавы, Шпакавы. З'явіліся сямейныя падпольныя групы.

Але ж да восені 1942 г. спробы стварыць у Віцебску адзіны партыйны цэнтр па кіраўніцтву падпольнай барацьбой з акупантамі не мелі поспеху. Таму ў верасні ў абласны горад з дапамогай партызан была накіравана група вопытных спецыялістаў па дыверсійнай і арганізатарскай рабоце на чале з інструктарам ЦК КП(б)Б Верай Захараўнай Харужай. У першых сваіх пасланнях на імя Кудзінава Вера Захараўна падкрэслівае, што глеба для работы ў горадзе добра падрыхтавана.

Але абстаноўка была вельмі складаная. Пасля гібелі Веры абком КП(б)Б робіць яшчэ адну спробу заслаць у Віцебск кіруючую групу, узначаліць якую павінна была Лізавета Іванаўна Майзіт. Да прыходу Веры яна ўжо некалькі месяцаў працавала ў тыле ворага. Гэта чарговая спроба не ўдалася, зноў з-за дакументаў.

7.4.1943 г. быў, нарэшце, зацверджаны Віцебскі падпольны гарком партыі на чале з В.Р.Кудзінавым. Але зноў за горадам.

1942 г. быў годам найбольш бурнага росту падпольных арганізацый, самага высокага накалу барацьбы і вынікавасці работы падполля. Дыверсіі, сабатаж, тэрарыстычныя акцыі і іншыя баявыя дзеянні набылі выключна шырокі размах, больш моцнай стала іх матэрыяльная база. Цераз «вароты» з Вялікай зямлі бесперапынна паступалі міны, тол, зброя, а таксама матэрыялы для палітычнай работы і медыкаменты.

У горадзе з'явілася некалькі патаемных складоў дыверсійных матэрыялаў: у сем'ях Свечкіных (пас. Качэргі, 12, цяпер вул. Пугачова), П.С.Смірнова (17-я Гарадоцкая, 1, цяпер вул. Вінаградавай), Я.І.Тычынінай (17-я Гарадоцкая, 6), А.М.Казловай (1-я Украінская, 5), Г.С.Кіташовай (8-я Клінічная, 43), У.А.Казлоўскага (вул. Авіяцыйная), Ф.К.Мехава (3-і Вапняковы завулак, 7), В.А.Шніпава (22-я Гарадоцкая, 7) і інш.

Падлікі паказваюць, што за 1942 г. падпольшчыкі Віцебска ажыццявілі 102 дыверсіі[21]. Так, толькі група Мікалая Нагібава за кастрычнік—снежань 1942 г. здзейсніла 11 дыверсій на чыгункі. А з лютага да лістапада 1943 г. кожныя 3 дні адбываліся дыверсіі, акты сабатажу, пабегі ваеннапалонных і г.д. Асабліва актыўную баявую работу вялі групы Мікалая Ляхоўскага, Пятра Смірнова, Васіля Арлоўскага, Леаніда Хрыпача, Васіля Кірыленкі, Івана Бекішава.

Высокую арганізаванасць і дысцыпліну ў работу гарадскога падполля ўнесла чэкісцкая група Аляксея Пятровіча Максіменкі. Па яе заданню падпольшчыкі Іван Наўдзюнас, Уладзімір Конанаў, Міхаіл Стасенка, Яўген Філімонаў 26.11.1942 г. прывялі ў выкананне прыгавор народа здрадніку Радзімы А.Л.Брандту — рэдактару прафашысцкай газеты «Новый путь»[22].

Падпольшчыкі групы В.А.Вярбіцкага — Мікалай Вінакураў, Лідзія Шчаглова, Пётр Іваноў, Юрый Шніпаў і іншыя, у поўным сэнсе амаль расцягнулі склад трафейнай зброі 59-га армейскага корпуса ворага, які знаходзіўся на месцы цяперашняй ЦЭЦ[23]. Цэлымі скрынкамі патрыёты вывозілі адсюль патроны, гранаты, запчасткі да зброі. Пётр Іваноў з жонкай і сынам сабралі дома і перадалі партызанам 6 аўтаматаў. Але сёмы выпадкова папаў у рукі правакатара. Гэта і паслужыла прычынай арышту і расстрэлу многіх членаў групы В.А.Вярбіцкага.

Паспяхова дзейнічалі і падпольныя групы Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі, якія пусцілі пад адхон 9 эшалонаў. 11.11.1942 г. яны падпалілі ваенны склад, у выніку чаго было знішчана 20 матораў для аўтамашын, 23 веласіпеды, шмат абмундзіравання, коўдраў і іншай маёмасці[24].

Апрача таго, патрыёты выкрадалі ў афіцэраў каштоўныя дакументы і розныя пасведчанні.

На патрэбы акупантаў працаваў фанерны завод. Падпольная група Р.І.Пушкарова тройчы падпальвала яго. У выніку дыверсій завод спыніў работу, а падпольшчыкі прыхапілі касіра з касай і пайшлі да партызан.

Важнейшым накірункам работы падпольных груп на працягу ўсяго перыяду акупацыі была палітычная работа сярод жыхароў горада, ваеннапалонных і салдат вермахта. Для транспарціроўкі літаратуры і газет у тыл ворага пастановай ЦК КП(б)Б ад 25.10.1942 г. была створана спецыяльная экспедыцыя, якую ўзначаліў І.С.Краўчанка (будучы акадэмік АН БССР). А пры Віцебскім абкоме партыі з'явілася база па забеспячэнню літаратурай не толькі Віцебскай, але і іншых абласцей рэспублікі і нават Прыбалтыкі. Як сведчыць статыстыка, на Віцебскую вобласць прыходзілася найбольшая частка літаратуры і газет, што паступалі з Вялікай зямлі. Безумоўна, за кошт выкарыстоўвання Віцебскіх «варот».

Выключна складана было дастаўляць прапагандысцкі матэрыял у нямецкія гарнізоны, бо за кожную знойдзеную лістоўку або газету расстрэльвалі на месцы. У сувязі з гэтым, летам і восенню 1942 г. камсамольцы-падпольшчыкі з групы Лідзіі Бярозкінай — Яўген Валчок і Васіль Карняшонак наладзілі выпуск савецкіх лістовак непасрэдна ў друкарні прафашысцкай газеты «Новый путь». На жаль, ужо ў верасні 1942 г. 6 членаў групы, у т.л. Валчок і Карняшонак, былі арыштаваны і павешаны.

Спрабуючы разграміць і наогул спыніць партызанскі рух, знішчыць падполле, з канца 1942 г. і амаль на працягу ўсяго 1943 г. гітлераўцы праводзілі буйныя карныя экспедыцыі супраць партызан і адначасова ўзмацнялі рэпрэсіі супраць падпольшчыкаў. У падполлі пачаліся правалы. Так, у канцы 1942 г. ў рукі гітлераўцаў трапілі некалькі сувязных і армейскіх разведчыкаў з груп «Макса» і «Исполина» разам з радыёстанцыяй. Расплаціўся жыццём за падпольную работу чыгуначнік Прохар Воднеў. Загінула няўлоўная «Каця-Шура» Вінаградава, радыстка групы Крылатых. Вымушана была пакінуць горад К.С.Акаловіч і большая частка яе групы. 23.12.1942 г. на тэрыторыі канцлагера «5-ы Чыгуначны полк» былі расстраляны 13 з 24 падпольшчыкаў з груп Мехава і Гагулі. Асабліва бязлітасна ворагі катавалі А.А.Гагулю, а яго нявесце Ганне Лапаухавай выламалі рукі.

Былі і іншыя цяжкія страты, але падполле дзейнічала. Ф.К.Мехаў і члены групы Косця Шутаў, Іван Іотка, Саша Іваноў пусцілі пад адхон амаль у межах горада 4 эшалоны. 19.1.1943 г. раздаўся выбух у памяшканні гарадской паліцыі. Дыверсію зрабіла камсамолка Васіліса Вялава («Дзіна»). Амаль бесперапынна грымелі выбухі на чыгунцы, аэрадроме, на будаўніцтве ўмацаванняў вакол горада.

У лютым 1943 г. гітлераўцы заслалі ў падполле горада вялікую групу спецыяльна падрыхтаваных правакатараў. Па падполлю быў нанесены цяжкі ўдар. У красавіку — маі 1943 г. толькі ГФП-703 было арыштавана 72 падпольшчыкі, з іх 35 расстраляны, 26 кінуты ў лагер СД[25]. У лістападзе былі арыштаваны яшчэ 63 патрыёты, з якіх расстраляна 38 чалавек[26]. Загінула большая частка падпольных груп Белахвосцікава, Вярбіцкага, Свечкіных, Шлякавай, парушыліся сувязі з кіруючымі падпольнымі цэнтрамі, партызанскімі брыгадамі і спецгрупамі.

Цяжкія страты не выклікалі панікі. Падпольны гарком партыі правёў даволі складаную работу па ўмацаванню ўцалелых і стварэнню новых падпольных груп. На працягу 1943 г. было створана 10 такіх груп, пераважна з былых ваеннапалонных, прыцягнутых акупантамі для работы ў розных майстэрнях. Апора на такую катэгорыю людзей была невыпадковая: яны насілі форму гітлераўскіх салдат, мелі адпаведныя дакументы, маглі выходзіць за горад для збору запчастак для рамонтных работ. Вось гэтую акалічнасць і выкарыстаў гарком КП(б)Б. Кіравалі групамі В.Т.Амельчанка («Максім»), І.І.Анапрыенка («Лісіцын»), А.П.Барадзін, А.Ф.Гамаюнаў, І.С.Ермакоў («Мартынаў»), А.Г.Крукаў, В.Г.Кутняк, Р.С.Пісарэўскі («Мажайскі»), Г.М.Рускіх, Н.М.Чайка. Яны дастаўлялі каштоўную інфармацыю з вайсковых часцей, рабілі дыверсіі, выконвалі ролю сувязных. Барацьба працягвалася.

Трэба адзначыць, што віцебскае падполле было інтэрнацыянальнае. Не толькі таму, што побач з беларусамі змагаліся прадстаўнікі многіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза. З падполлем супрацоўнічалі таксама нямецкія, чэшскія, славацкія, польскія антыфашысты з вайсковых часцей вермахта. Сярод іх былі Карл Шрадэр, Курт Шнайдэр, Эрых Паленга, Вілім Крэўзігер, Вацлаў Шмок, Іаган Лойда («Іван Іванавіч»), Эрых з фельдкамендатуры і «Геноссе Ян» з Вены (два інтэрнацыяналісты прозвішчаў не называлі).

Восенню 1943 г. частка Віцебскай вобласці была вызвалена ад акупантаў. Ужо з верасня гітлераўцы пачалі эвакуіраваць з горада свае ўстановы, некаторыя карныя і разведвальныя

М.П.Шмыроў.

органы, а з кастрычніка пачалі ажыццяўляць і прымусовы вываз насельніцтва на захад. Тысячы мірных жыхароў акупанты заключылі ў рабочыя лагеры пад адкрытым небам, выкарыстоўвалі іх для абарончых работ. Поле дзеяння для падпольнай работы звужалася. Таму многія групы патрыётаў сталі арганізавана выходзіць да партызан.

Як вядома, на дзень вызвалення горада з падвалаў, вадасцёкавых калодзежаў, з іншых схронаў выйшла ўсяго 118 чалавек, сярод якіх знаходзіліся і падпольшчыкі з групы Т.А.Марудава і сям'я інструктара падпольнага гаркома партыі М.І.Мацэнкі.

За перыяд акупацыі ў горадзе дзейнічала да 66 падпольных груп, а таксама шмат падпольшчыкаў-адзіночак (усяго каля 1500 чалавек). Большую частку іх складалі беларусы. Сярод падпольшчыкаў было 42% жанчын. Падпольшчыкі мелі ў горадзе больш за 50 канспіратыўных кватэр. У жорсткай і цяжкай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі загінуў амаль кожны трэці падпольшчык. Многія мужныя патрыёты былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, а В.З.Харужай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Сёння вуліцы многіх гарадоў і паселішчаў носяць іх імёны. Гл. таксама артыкулы пра асобныя падпольныя групы.

Крыніцы

1. З прамовы П.К.Панамарэнкі на святкаванні 25-годдзя 1-й Беларускай партызанскай брыгады 14 красавіка 1967 г. Запіс прамовы знаходзіцца ў архіве аўтара.

2. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — ноябрь 1942). Мн., 1967. Т. 1. С. 52.

3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — ноябрь 1942). Мн., 1967. Т. 1. С. 78.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 4, воп. 33а, спр. 15.

5. Там жа.

6. НАРБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 15, л. 29.

7. П.І.Іваноў забраў з сабой спісы пакінутых у падполлі камуністаў, 16 тыс. руб., прызначаных для падпольнай работы, дакументы, якія (па яго словах на судзе) выкінуў у ручай дзесьці каля Суража, а сам прабраўся да Іванаўскай вобласці (там ён нарадзіўся) і жыў да арышту ў верасні 1943 г. Быў асуджаны па арт. 16-58, ч. 1а, УК РСФСР тэрмінам на 5 год.

8. Лабанок В.Е. В боях за Родину. Мн., 1964. С. 79.

9. НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 50, л. 71. Тут пра далейшы лёс Грыгор'ева.

10. Грыгор'еў, як і Сямёнаў атрымаў вымову па партыйнай лініі. Быў прызначаны камісарам атрада Сысоева 1-й брыгады Біруліна. Памёр пасля вайны.

11. З выступлення Чыркова па Віцебскаму тэлебачанню. 1965 год.

12. Падлікі зроблены на аснове спісаў падпольных груп.

13. НАРБ, ф. 4824, воп. 1, спр. 4, л. 2. Сёстры Таня і Глафіра Вішнеўскія належалі да групы Акаловіч, у іх доме была асноўная явачная кватэра армейскага разведчыка В.І.Чыркова.

13. Н.І.Пахомаў, Н.І.Дарафеенка, Н.В.Дарафеенка. Віцебскае падполле. Мн., 1974. С. 101.

14. Архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 213, воп. 2004, спр. 15, л. 1.

15. НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 50, л. 197.

15а. П.Кёрнер-Шрадер. Дневник немецкого солдата. М., 1961. С. 135.

16. НАРБ, ф. 3793, воп. 1, спр. 1, л. 61—62.

17. Там жа, л. 76.

18. РЦХИДНИ (Российский центр хранения и изучения документов новейшей истории), ф. 69, воп. 1, спр. 143, л. 50.

19. Я.Жилянин, И.Позняков, В.Лузгин. Без линии фронта. Мн., 1975. С. 184.

20. Н.И.Пахомов, Н.И.Дорофеенко, Н.В.Дорофеенко. Витебское подполье. Мн., 1974. С. 86.

21. Н.И.Пахомов, Н.И.Дорофеенко, Н.В.Дорофеенко, Витебское подполье. Мн., 1974. С. 159.

22. НАРБ, ф. 3880, воп. 1, спр. 9, л. 11—12.

23. НАРБ, ф. 4824, воп. 1, спр. 23, л. 26.

24. Там жа, л.11; ф. 3500, воп. 4, спр. 323, л. 1—2.

25. НАРБ, ф. 4824, воп. 1, спр. 24, л. 36.

26. Подвиг их бессмертный. Мн., 1978. С. 193.

Н.І.Дарафеенка.

Віцебскі падпольны абком КП(б)Б

Створаны Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б і працаваў пад яго кіраўніцтвам з 8.3.1942 г. да ліп. 1944 г. Дзейнічаў на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Узначальваў Віцебскі падпольны гарком КП(б)Б і 20 падпольных райкомаў, якія аб'ядноўвалі 198 пярвічных партыйных арганізацый, 3800 камуністаў у партызанскіх фарміраваннях. 15 райкомаў выда-

валі газеты. Кіраваў дзейнасцю 39 партызанскіх брыгад на тэрыторыі вобласці. Накіроўваў работу Віцебскага падпольнага абкома ЛКСМБ, Аршанскага, Асвейскага, Асінторфскага, Боркавіцкага, Віцебскага, Гарбачэва-Мурагоўскага, Забор'еўскага, Лепельскага раённага, Межаўскага, Обальскага, Полацкага раённага, Прошкаўскага, Расонскага, Сакалішчанскага, Сельніцка-Краснапольскага, Сімакоўскага, Ушацкага, Чашніцкага партыйнага, камсамольскага і патрыятычнага падполля. Сакратары абкома: І.А.Стулаў (1-ы сакратар), Я.А.Жылянін (з 23.4.1942), І.Б.Пазнякоў (з 1.11.1942), М.І.Пліс (з 7.4.1943); члены: І.М.Рабцаў (да 5.9.1942), В.І.Лузгін (да чэрв. 1944), М.П.Шмыроў (18.9.1943 – чэрв. 1944), С.В.Юрын (да 5.9.1942), В.Я.Каган (1.11.1942–8.2.1943). Базіраваўся ў прыфрантавой паласе на неакупіраванай тэрыторыі. Друкаваны орган – газ. «Віцебскі рабочы». Для аператыўнага кіраўніцтва партыйным падполлем і партызанскім рухам абком КП(б)Б падзяліў вобласць на 4 зоны: Аршанскую (адказны арганізатар Г.Дз.Рэзнікаў), Віцебскую (В.Р.Кудзінаў), Лепельскую (К.П.Бажанок), Полацкую (Б.І.Мажайскі). Пры адказных арганізатарах працавала па 3–5 інструктараў. У тыле ворага падоўгу знаходзіліся сакратары падпольнага абкома, асабліва Жылянін і Пазнякоў. Абком вырашаў пытанні расстаноўкі кадраў, росту партыйных радоў у партызанскіх фарміраваннях, удасканалення структуры партызанскіх сіл, баявой дзейнасці партызан і падпольшчыкаў, распрацоўваў найбольш буйныя баявыя аперацыі, арганізоўваў агітацыйную і прапагандысцкую работу, дастаўку і распаўсюджанне газет і лістовак сярод насельніцтва ў тыле праціўніка.

І.М.Рабцаў.

М.І.Мацэнка.

М.У.Дарафеенка.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945). Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 133.

Віцебскі падпольны гаркам КП(б)Б

Дзейнічаў з 7.4 да 28.10.1943 г. пад кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б. Узначальваў Віцебскае партыйна-камсамольскае падполле, барацьбу працоўных Віцебска супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наладзіў сувязь падполля з партызанскімі атрадамі, арганізоўваў забеспячэнне падпольшчыкаў узрыўчаткай, літаратурай, удзельнічаў у распрацоўцы сумесных баявых аперацый падпольшчыкаў і партызан. Накіроўваў работу Віцебскага падпольнага гаркома ЛКСМБ. Сакратар гаркома В.Р.Кудзінаў (з верасня 1943 адначасова камісар партызанскай брыгады 1-й Віцебскай), члены: М.І.Мацэнка, Б.К.Сямёнаў (да мая 1943). Базіраваўся ў размяшчэнні 1-й Віцебскай партызанскай брыгады.

Да стварэння гаркома з ліпеня 1941 г. да мая 1942 г. ў горадзе працаваў сувязны абкома КП(б)Б, 6. сакратар Чыгуначнага РК КП(б)Б г. Віцебска І.Г.Грыгор'еў. 24.5.1942 г. ўпаўнаважаным падпольнага абкома КП(б)Б, адказным арганізатарам па Віцебскай зоне раёнаў, уключаючы г. Віцебск, зацверджаны Кудзінаў, з 15.9.1942 г. ён адказны арганізатар толькі па горадзе. У жніўні 1942 г. для арганізацыі шырокай падпольнай барацьбы і стварэння кіруючага партыйнага цэнтра ў горад накіравана В.З.Харужая. З 1.11.1942 г. ў Віцебску працавала інструктар падпольнага абкома КП(б)Б Мацэнка.

А.С.Панамарова.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941–1945). Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 134.

Віцебскі падпольны абком ЛКСМБ

Створаны Віцебскім падпольным абкомам КП(б)Б і *Цэнтральным Камітэтам ЛКСМБ* і працаваў пад іх кіраўніцтвам з 8.3.1942 г. да 26.6.1944 г. Узначальваў дзейнасць Віцебскага падпольнага гаркома ЛКСМБ, 20 падпольных райкомаў Віцебскай вобласці, 814 тэры-

Н.С.Самуйлава.

тарыяльных, 533 пярвічных камсамольскіх арганізацый у партызанскіх фарміраваннях, усяго — больш за 12 тыс. камсамольцаў. На тэрыторыі вобласці камсамольскім падполлем кіравалі сакратары ЦК ЛКСМБ: М.В.Зімянін, К.Т.Мазураў, С.В.Прытыцкі, Ф.А.Сурганаў. У розны час у 1942—43 гг. тут працавалі члены бюро ЦК ЛКСМБ М.П.Барашкаў, інструктары ЦК ЛКСМБ па падпольнай рабоце Т.І.Гаварэнь (Прытыцкая), Г.Ф.Шастакоў. Бюро абкома: Я.А.Жылянін [з 17.7.1942, сакратар Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б], В.І.Лузгін [17.7.1942—25.5.1944, член Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б], Н.С.Самуйлава (з 17.7.1942, член ЦК ЛКСМБ), Ф.А.Башкінцаў (31.7.1942—30.11.1943), А.А.Быкава (31.7.1942—30.11.1943, член ЦК ЛКСМБ), І.Ф.Канарскі (з 19.12.1943), В.Н.Пазняк (з 1.12.1943), А.П.Жаўнерка (з 31.7.1943); сакратары: Лузгін (да 25.5.1944, 1-ы сакратар, чл. ЦК ЛКСМБ), Башкінцаў (30.7.1942—30.11.1943), Жаўнерка (з 31.7.1943), Пазняк (з 1.12.1943), Канарскі (з 19.12.1943), члены: Жаўнерка, В.Ц.Радкевіч (з 1.5.1942), А.А.Казюля, Пазняк, Самуйлава (усе трое з 1.6.1942), А.М.Шкурынава (1.6.1942—18.7.1943, загінула), Ф.К.Падскочая (1.5—1.10.1943, член ЦК ЛКСМБ), В.П.Маркоўская (з 1.10.1943), А.М.Нямыкін (з 1.4.1944); інструктары на падпольнай рабоце: Нямыкін (8.3.1942—1.4.1943), Н.Л.Герман (1.7—30.9.1942), М.П.Мацкевіч (13.7.1942—4.1.1944), В.К.Шабуня (1.1—26.6.1943), М.Я.Майзіт (1.3—1.8.1943), Маркоўская (1.5—1.10.1943), А.І.Кандрацкая (16.6.1943—10.3.1944), В.П.Карпушэнка (з 1.8.1943), В.А.Карпушэнка (з 1.8.1943), В.А.Кулікава (1.9.1943—1.4.1944), Н.В.Паўлоўская (з 10.9.1943); лектар абкома В.І.Розін (15.6.1942—1.10.1943).

Летам 1942 створаны 4 зоны (Аршанская, Віцебская, Лепельская, Полацкая); кіраўнікі: Жаўнерка, Радкевіч, Пазняк, Шкурынава, Маркоўская. Паводле рашэння бюро абкома (пачатак 1943) з маладых партызан у кароткі тэрмін падрыхтавана каля 5 тыс. кулямётчыкаў, мінамётчыкаў, артылерыстаў, снайпераў, мінёраў, створаны 263 камсамольскія дыверсійныя групы. 5.4.1943 абком правёў у в. Клясціцы Расонскага р-на міжраённую камсамольскую канферэнцыю (85 дэлегатаў ад камсамольскіх арганізацый партызанскіх брыгад).

Базіраваўся ў прыфрантавой паласе, на ПнУ ад Суража Віцебскай вобласці, з 8.3.1942 г. ў партызанскім атрадзе М.П.Шмырова, у іншых партызанскіх атрадах і брыгадах Віцебскай вобласці.

У в. Клясціцы ў гонар камсамольскай канферэнцыі ў 1969 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

В.І.Лузгін, Р.М.Шавяла.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945). Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 133—134.

Віцебскі падпольны гарком ЛКСМБ

Дзейнічаў з 1.6.1942 г. да 28.12.1943 г. пад кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага абкома ЛКСМБ і Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б. Кіраваў дзейнасцю падпольных камсамольска-маладзёжных арганізацый і груп Віцебска. Сакратар гаркома Н.С.Самуйлава, чл. ЦК ЛКСМБ; члены: А.М.Нямыкін, А.Я.Белахвосцікаў (да 5.5.1943, загінуў), Е.А.Крыцкая (да ліпеня 1943). Асноўная база знаходзілася ў Віцебскім раёне ў партызанскай брыгадзе 1-й Віцебскай.

Р.М.Шавяла.

Падпольныя патрыятычныя групы, якія дзейнічалі ў Віцебску і прыгарадзе

Назва групы	Месца дзейнасці
В.А.Азеуша	Вёска Букаціна
К.С.Акаловіч	Тубдыспансер па вуліцы Гогалеўскай (цяпер — вуліца Леніна)
В.Т.Амельчанкі	Нямецкая вайсковая часць, былая сярэдняя школа № 6; група ваеннапалонных
І.І.Анапрыенкі	На тэрыторыі былога іголкавага завода па Суражскай шашы (цяпер прыборабудаўнічы завод па вуліцы Гагарына); група ваеннапалонных
В.М.Арлоўскага	Аэрадром
А.П.Барадзіна	Нямецкая вайсковая часць па вуліцы Верхненабярэжнай (цяпер — вуліца А.К.Ільінскага)
І.А.Бекішава	Аэрадром
А.Я.Белахвосцікава	Бляшаная майстэрня па вуліцы Леніна
П.П.Белянёва	Гаруправа
Л.Дз.Бярозкінай	Вуліца Замкавая, друкарня
П.І.Вішнеўскага	Пасёлак тарнага камбіната
І.С.Вялава	Раён Сакольніцкіх вуліц
В.А.Вярбіцкага	Маркаўшчына
А.А.Гагулі	Раён Гарадоцкіх вуліц
А.Ф.Гамаюнава	Нямецкая гаспадарчая часць у Доме спецыялістаў; група ваеннапалонных
З.Я.Гваздзёвай	Пасёлак Лужасна
Г.К.Грабяньковай	Пескавацік, Кастрычніцкі раён горада
П.П.Грунтова	Вучэбная гаспадарка «Падбярэззе»
Г.Я.Данілава	Ліцейная вытворчасць па Суражскай шашы (цяпер вуліца Гагарына)
В.М.Дзянісава	Раён вуліцы Піянерскай
І.С.Ермакова	Транспартная арганізацыя «Штрала»; група ваеннапалонных
М.І.Еўдакімава	Вёска Альгова
М.А.Журынскай	Хлебазавод № 1
Заронаўская	Вёска Заронава
Д.П.Земляковай	Станцыя Лосвіда — в. Доўжа
С.Р.Кажычэнкава	Раён плошчы Свабоды
У.А.Казлоўскага	Электрастанцыя
М.М.Капцелавай	Вуліца Талстога
В.І.Кірыленкі	Стадыённы пасёлак
М.К.Корбан	Пасёлак Лучоса, Першамайскі раён горада
З.Ф.Кочатавай	Вёска Батрукі і г. Віцебск
М.П.Красоўскага	Чыгуначны вузел
Г.А.Красцінай	Раён аэрадрома

Працяг таблiцы

Назва групы	Месца дзейнасці
І.Д.Краўчынскага	Пескавацік, Кастрычніцкі раён горада
А.Г.Крукава	Нямецкая вайсковая часць у раёне в. Падбярэззе; група ваеннапалонных
В.С.Кулагінай	Вёска Букаціна — Кастрычніцкі раён горада
М.А.Купалава	Чыгуначны вузел
В.Т.Кутняка	Нямецкая вайсковая часць па вуліцы Баўмана; група ваеннапалонных
Т.А.Ламаносенка	Раён вуліцы Авіяцыйнай (цяпер вуліца газеты «Правда»)
А.І.Ліпці	Пральня па вуліцы Леніна
М.А.Ляхоўскага	Чыгуначны вузел
П.К.Ляхоўскага	Вёска Старое Сяло
А.П.Максіменкі	Група «Няўлоўныя»
Т.А.Марудава	Чыгуначны раён Віцебска
Ф.К.Мехава	Раён Вапнавых вуліц, чыгуначная магістраль
А.В.Міхайлоўскай—Р.М.Гіро	Вёска Лётцы
М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова	Гаруправа, медустановы горада
М.Я.Нагібава	Раён Гарадоцкіх вуліц
П.А.Папяляевай	Пескавацік, Кастрычніцкі раён горада
Г.С.Пісарэўскага	Нямецкая вайсковая часць у раёне в. Падбярэззе; група ваеннапалонных
Р.І.Пушкарова	Фанерны завод
Г.М.Рускіх	Нямецкая вайсковая часць сувязі на беразе Заходняй Дзвіны (цяпер вуліца Камсамольская)
М.К.Свечкінай	Стадыённы пасёлак
А.А.Сакаловай	Пескавацік, Кастрычніцкі раён горада
М. і Г. Саладухіных	Раён былога 5-га цагельнага завода (цяпер — вуліца Баўмана)
Сасноўская	Вёска Сасноўка
А.Г. і Г.Г. Скорабагатавы	Чыгуначны вузел
П.С.Смірнова	Раён Гарадоцкай і Полацкай шашы (цяпер — вуліцы Ленінградская і Цітова)
Е.С.Спірыдонавай	Вёска Трыніўкі — г. Віцебск, Чыгуначны раён
Т.П.Сутарман	Маркаўшчына
В.З.Харужай	Пескавацік, Кастрычніцкі раён, вуліца Трактарная (цяпер вуліца В.Харужай
Л.І.Хрыпача	Торфаўпраўленне, торфапрадпрыемства вобласці
І.М.Чайкі	Нямецкая вайсковая часць на плошчы Свабоды; група ваеннапалонных
В.Дз.Шалуха	Пасёлак тарнага камбіната
Б.С.Шарэнды	Мастацкая майстэрня па вуліцы Леніна

Пра падпольныя патрыятычныя групы, якія дзейнічалі ў Віцебску і прыгарадзе, гл. таксама асобныя артыкулы.

Н.І.Дарафеенка.

Важнейшыя канспіратыўныя кватэры падпольшчыкаў Віцебска

Вуліца Абаронная, 10 (трымаў І.П.Наўдзюнас) — кватэра чэкістаў.

Вуліца Авіяцыйная, 16 (цяпер вуліца газеты «Правда») — кватэра армейскай разведвальнай групы П.В.Буткевіча, падпольнай групы Т.А.Ламаносенка.

Вуліца Авіяцыйная, 23 (цяпер вуліца газеты «Правда») — кватэра падпольнай групы У.А.Казлоўскага.

Вуліца акадэміка Паўлава, 5 (Н.Ф.Лынчанка) — кватэра армейскай разведгрупы Ю.С.Рудакова, падпольных груп Т.А.Марудава, П.К.Ляхоўскага.

Вуліца Аршанская, 19 (К.Д.Сямёнава) — кватэра падпольных груп І.А.Бекішава, Т.А.Ламаносенка.

Вуліца Аршанская, 54а (В.П.Брухнова) — кватэра падпольнай групы М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова.

Вуліца Баўмана, 16 — кватэра падпольнай групы сясцёр Саладухіных.

Вуліца 3-я Валадарскага, 20 (І.М.Арлоў) — кватэра армейскай разведгрупы Ю.С.Рудакова і падпольнай групы В.С.Кулагінай.

Вуліца Верхне-Набярэжная, 11 (цяпер вул. А.К.Ільінскага; К.Е.Пятроў) — кватэра сакратара Чыгуначнага райкома КП(б)Б І.Г.Грыгор'ева.

Вуліца 2-я Ветраная, 11 (цяпер вул. Грыбаедава, 5; В.Пінчук) — кватэра армейскай разведгрупы П.А.Крылатых.

Вуліца 2-я Ветраная (цяпер Грыбаедава, 14; М.І.Мацэнкі) — кватэра падпольнага гаркома КП(б)Б, падпольнага партыйнага цэнтра.

Вуліца 3-я Ветэрынарная, 11 (цяпер 3-я Даватара; Л.П.Амелькін) — кватэра спецгрупы НКУС.

Вуліца 5-я Вінчэўскага, 16 (цяпер праспект Чарняхоўскага; М.К.Оскер) — кватэра падпольнага партыйнага цэнтра, армейскай разведгрупы М.Р.Яфімава.

Вуліца 12-я Гарадоцкая, 20/10 (сям'я А.І.Ліпці) — кватэра падпольнага партыйнага цэнтра.

Вуліца 14-я Гарадоцкая, 17 (А.М.Лапавухаў) — кватэра чэкістаў, падпольнай групы А.А.Гагулі.

Вуліца 14-я Гарадоцкая, 19 (Ф.М.Шалаева) — кватэра падпольнай групы А.А.Гагулі.

Вуліца 17-я Гарадоцкая, 1 (цяпер вуліца Вінаградавай; П.С.Смірноў) — кватэра армейскай разведгрупы П.А.Крылатых, падпольных груп П.С.Смірнова, М.Я.Нагібава.

Вуліца 17-я Гарадоцкая, 6 (цяпер вуліца Вінаградавай; Я.І.Тычыніна) — кватэра падпольнага гаркома КП(б)Б, армейскай разведгрупы П.А.Крылатых, падпольнай групы М.Я.Нагібава.

Вуліца 17-я Гарадоцкая, 21 (М.П.Захарава) — кватэра армейскай разведчыцы А.С.Вінаградавай, падпольнай групы П.С.Смірнова.

Вуліца 22-я Гарадоцкая, 7 (В.А.Шнипаў) — кватэра падпольнай групы А.А.Гагулі.

Гарадоцкая шаша, 103 (цяпер вуліца Ленінградская, 37; П.Кёрнер-Шрадэр), кватэра нямецкіх антыфашыстаў.

Вуліца Гогалеўская, 11 (цяпер вул. Леніна, 18, былы тубдыспансер; К.С.Акаловіч) — кватэра армейскай разведгрупы М.Р.Яфімава, чэкістаў, падпольнай групы К.С.Акаловіч.

Вуліца 3-я Гутараўская, 33 (А.П.Волат) — кватэра падпольнай групы гаркома КП(б)Б, падпольнага партыйнага цэнтра.

Вуліца 2-я Жлобінская, 25 (сёстры Лявонавы) — кватэра армейскага разведчыка В.І.Чыркова, падпольнай групы К.С.Акаловіч.

Вуліца 3-я Завадская, 12 — кватэра падпольных груп А.А.Сакаловай, І.А.Бекішава, падпольнага гаркома КП(б)Б.

Вуліца 3-я Загарадная, 20 (сям'я Б.С.Шарэнды) — кватэра армейскіх разведгруп Ю.С.Рудакова, М.Р.Яфімава, падпольнай групы Б.С.Шарэнды.

Вуліца Замкавая, гадзіннікавая майстэрня (П.Д.Багдановскі) — кватэра армейскай разведгрупы М.Р.Яфімава, падпольнай групы А.М.Казлова.

Вуліца Замкавая, 3 (П.І.Гаўберг-Іванова) — кватэра падпольнай групы Л.Дз.Бярозкінай.

3-і Вапнавы зав., 7 (Ф.К.Мехаў) — кватэра чэкістаў, падпольных груп Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі.

Вуліца Інжынерная, 35, цяпер 41 (І.Ц.Куракоў) — кватэра армейскай разведкі, падпольнай групы М.А.Ляхоўскага.

Керасінны зав., 4 — кватэра падпольнай групы Т.А.Марудава, армейскай разведгрупы Ю.С.Рудакова.

Вуліца Кінафабрычная, 10 (цяпер вул. Чапаева; Е.С.Мазікава-Хаванская) — кватэра чэкістаў.

Вуліца 8-я Клінічная, 43 (Г.С.Кіташова) — кватэра армейскай разведгрупы П.В.Буткевіча, падпольнай групы Т.А.Ламаносенка.

Клубны завулак, 9 (М.А.Кузняцова) — кватэра армейскага разведчыка В.І.Чыркова,

падпольнай групы К.С.Акаловіч, падпольны пашпартны стол.

Вуліца 1-я Краснабрыгадная, 22-а (Д.І.Кузьміна) — кватэра армейскай разведгрупы П.В.Буткевіча.

Вуліца 7-я Куйбышава, 12 (Г.С.Стаякова) — кватэра армейскага разведчыка В.І.Чыркова, кватэра сакратара Чыгуначнага райкома КП(б)Б І.Г.Грыгор'ева.

Вуліца 5-я Лінія, 20 (Г.М.Гранькова) — кватэра падпольнага абкома ЛКСМБ.

Вуліца 6-я Лінія, 4, цяпер 5 (сям'я В.М.Арлоўскага) — кватэра армейскай разведгрупы П.В.Буткевіча, падпольнай групы В.М.Арлоўскага.

Вуліца 4-я Нагіна, 17 (А.Я.Лукашэнка) — кватэра падпольнай групы К.С.Акаловіч.

Пасёлак Качэргі, 12 (цяпер вул. Пугачова, 11) — кватэра падпольнай групы М.К.Свечкінай, А.Я.Белахвосцікава.

Пасёлак Новы Быт, Ручэйны зав., 10а (М.Я.Мартышунас) — кватэра сакратара Чыгуначнага райкома КП(б)Б І.Г.Грыгор'ева.

Пасёлак Чэпіна, І (Я.І.Хмялёў) — кватэра армейскай разведгрупы П.А.Крылатых, падпольнай групы М.Я.Нагібава.

Вуліца Рыжская, 65/14 (М.К.Янін) — кватэра армейскай разведгрупы П.А.Крылатых.

Вуліца 2-я Сакольніцкая, 2 — кватэра падпольных груп Л.С.Вялава, Е.С.Спірыдонавай, падпольнага гаркома КП(б)Б.

Вуліца 2-я Стадыённая, 27 (цяпер вул. Белахвосцікава, 29; А.Я. і М.Я.Белахвосцікавы) — кватэра падпольнага абкома КП(б)Б, падпольнай групы А.Я.Белахвосцікава.

Вуліца 2-я Стадыённая, 27а (цяпер вул. Белахвосцікава; сям'я Пахомавых) — кватэра падпольнай групы А.Я.Белахвосцікава.

Вуліца 3-я Суражская, 10 (Г.І.Багданава) — кватэра армейскага разведчыка М.А.Шпакава, падпольнай групы І.А.Бекішава.

Вуліца 3-я Суражская, 10, гадзіннікавая майстэрня (М.А.Панкоў) — кватэра армейскага разведчыка М.А.Шпакава, падпольнай групы І.А.Бекішава.

Пасёлак тарнага камбіната, 6 (сёстры Вішнеўскія) — кватэра армейскага разведчыка В.І.Чыркова.

Пасёлак тарнага камбіната, 2 (М.Ц.Цвяткова) — кватэра падпольнай групы В.Дз.Шалуха.

Пасёлак тарнага камбіната, 5 (Л.М.Аўсянкіна) — кватэра падпольнай групы В.Дз.Шалуха.

Вуліца Трактарная, 4 (цяпер вул. В.Харужай; сям'я Вараб'ёвых) — кватэра падпольнага партыйнага цэнтра — падпольнай групы В.З.Харужай.

Вуліца 1-я Украінская, 5 (А.М.Казлова) — кватэра чэкістаў, падпольнай групы В.А.Вярбіцкага.

Вуліца 1-я Эсперанта, 17 (цяпер вуліца 1-я Чарнышэўскага, 13/1; А.П.Шашкова) — кватэра армейскай разведгрупы «Іспалін» У.А.Мядзведзева, падпольнай групы Г.К.Грабяньковай. *Н.І.Дарафеенка.*

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945). Энцыклапедыя. Мн., 1990. С. 134.

Мемарыяльная дошка на месцы былой явачнай кватэры віцебскіх падпольшчыкаў і армейскіх разведчыкаў (вуліца 7-я Куйбышава, 12).

Подзвіг Веры Харужай у Віцебску

Аб Веры Захараўне Харужай напісаны кнігі, шмат артыкулаў, надрукаваны яе ўспаміны і пісьмы розных часоў. Праўда, большасць напісанага адносіцца да дзейнасці Веры ў заходнебеларускім падполлі, значна менш — аб рабоце ў мірны час і яшчэ менш даследавана часцінка яе ваеннай біяграфіі, звязанай з барацьбой у віцебскім падполлі, з тым горадам, дзе яна здзейсніла свой апошні подзвіг і загінула.

Пісьмы Харужай з ахопленага вайной Віцебска друкаваліся неаднаразова, аднак заўсёды ў скарочаным выглядзе, пры тым кожны, хто рыхтаваў іх да друку, тлумачыў іх па свайму разуменню.

Адшукаць першапачатковы варыянт расшыфраваных пісьмаў доўгі час не ўдавалася. А яны ж, яе пісьмы, амаль адзіная, найбольш дакладная крыніца вывучэння яе дзейнасці ў Віцебску. І ўсё ж у апошнія гады ўдалося сёе-тое адшукаць у архівах і сфармуляваць больш аб'ектыўны погляд на дзейнасць Харужай і яе сяброў у Віцебску.

Перашкаджала аб'ектыўнаму адлюстраванню гістарычных падзей і тое, што ў пасляваенныя гады па ваеннай тэматыцы пісалі ў асноўным аб станоўчым, гераічным, чым мы законна ганарыліся і ганарымся цяпер. Але вельмі рэдка ў публікацыях аб вайне адзначалася тое адмоўнае, якога таксама было зашмат: замоўчваліся важныя падзеі, ганебныя ўчынкі асобных кіраўнікоў, пазбягалі пісаць аб калабарантах і г.д.

Ёсць такія старонкі і ў гісторыі віцебскага гарадскога падполля. Адна з іх — аб няўдачах стварэння ў Віцебску кіруючага падпольнага партыйнага цэнтра і яго арганізатарах.

Гісторыя адмерала Віцебску амаль 3 тыдні для правядзення падрыхтоўчых работ на выпадак акупацыі горада і вобласці. Многае ў гэтым напрамку паспелі зрабіць, у тым ліку па падрыхтоўцы падполля. У пачатку ліпеня 1941 г. афіцыйна быў створаны кіруючы падпольны партыйны цэнтр, які павінен быў узначаліць барацьбу патрыётаў горада ва ўмовах варожай акупацыі. Спіс яго членаў не знойдзены, а, магчыма, ён наогул не захаваўся, ці нават не быў напісаны.

У сваёй даведцы, датаванай жніўнем 1941 г., першы сакратар абкома партыі Іван Андрэевіч Стулаў паведамляў у ЦК КП(б)Б: «В Витебске остались для руководства партийными организациями в нелегальных условиях Семенов — первый секретарь Железнодорожного РК КП(б)Б, Любимцев — первый секретарь Октябрьского РК КП(б)Б, а также 60 членов и кандидатов партии» (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 4, воп. 33а, спр. 15, л. 29).

З іншых крыніц вядома, што сувязным з абкомам партыі прызначаўся 2-гі сакратар Чыгуначнага райкома КП(б)Б Ісак Георгіевіч Грыгор'еў. У сваёй даведцы Стулаў не называе сапраўдных кіраўнікоў партыйнага цэнтра. І не выпадкова. Справа ў тым, што ўжо 16.7.1941 г. рашэннем бюро абкома партыі яе кіраўнік, сакратар Віцебскага гаркома КП(б)Б П.І.Іваноў, быў выключаны з партыі за «невыполнение решения обкома, самовольный выезд из Витебска, где он был оставлен для организации партработы, и проявленную трусость» (Там жа, л. 33).

У гэтым жа рашэнні сказана і пра другога кіраўніка падпольнага цэнтра, накіраванага сюды па лініі ЦК КП(б)Б: «Довести до сведения ЦК партии Белоруссии, что Попов — секретарь Белостокского обкома КП(б)Б, направленный для работы в Витебске, решение бюро не выполнил и самовольно выехал из Витебска» (Там жа, л. 33).

У выніку такіх вось паводзін адказных кіраўнікоў усе пакінутыя ў падполлі камуністы засталіся без дакументаў, паколькі свае ім загадана было здаць, а новыя яны не атрымалі. Па выхадзе з Віцебска ў маі 1942 г. Грыгор'еў у сваёй справаздачы падрабязна апісаў, як усё гэта адбылося: «...всем этим людям было предложено сдать зав. орготделом обкома Кислику все документы. Иванову было поручено подготовить новые документы, которые 8.7.1941 г. должны были получить у т. Иванова. Явившись за получением документов в указанное время, на месте не нашли ни Пархоменко (секретарь обкома, который к тому времени получил новое задание — *аўтар*), ни Иванова. Комната была открыта и на полу валялось много бумаг, которые нами были сожжены... Так все мы остались без документов, приобретая их впоследствии разными путями».

Абставіны, якія склаліся, негатыўна адбіліся на настроі і лёсе пакінутых у падполлі камуністаў і ў значнай меры дэзарганізавалі і затармазілі пачатак падпольнай работы, прывялі да гібелі многіх людзей.

А.Ермаковіч, Самсонік (справа).

Вось аб гэтых учынках Іванова і Папова ўсе пасляваенныя гады ў публікацыях замоўчвалася. Як бачым, у даведцы Стулава іх прозвішчы таксама не былі названы. Упершыню пра іх паводзіны было сказана толькі ў 1968 г., ды і то ў закрытай дысертацыі, прысвечанай віцебскаму падполлю.

З кіруючага партыйнага цэнтра ў горадзе замацаваўся і легалізаваўся толькі сувязны Грыгор'еў. Аднак устанавіць сувязь з абкомам партыі ён таксама не сумеў. 20.5.1942 г. Грыгор'еў пакінуў горад і перабраўся ў партызанскую зону. Яшчэ раней, у канцы 1941 г., вымушаны быў выйсці з горада ў сельскую мясцовасць, а затым і да партызан, Б.К.Сямёнаў.

Такім чынам, кіруючы падпольны цэнтр у горадзе так і не склаўся. Тым не менш працэс стварэння і станаўлення падполля працягваўся, бо вельмі высокім быў патрыятычны настрой нашых людзей. Некаторыя групы ствараліся пакінутыя ў горадзе радавыя камуністы і камсамольцы, іншыя фарміраваліся стыхійна, аб'ядноўвалі патрыётаў ці то па сумеснай даваеннай працы, ці то па сямейнаму, або сваяцкаму прынцыпу. У выніку, у канцы 1941 г. ў горадзе дзейнічала ўжо да 20 падпольных груп і нямала падпольшчыкаў-адзіночак.

Летам 1942 г. абком КП(б)Б зрабіў другую спробу ўмацаваць кіраўніцтва падполлем горада. З гэтай нагоды 9 чэрвеня бюро абмеркавала пытанне «О создании Витебской городской руководящей группы» і сваім рашэннем зацвердзіла такую групу з 5 чалавек на чале з сакратаром абкома партыі па прамысловасці Іванам Савельевічам Камісаравым. Больш ніякіх дакументаў аб гэтай групе таксама не знойдзена, у Віцебску яе дзейнасць ніяк не адзначаецца, а сам Камісараў да кастрычніка 1943 г. працаваў начальнікам спецшколы БШПР № 3, якая была размешчана недзе ў Падмаскоўі. Рашэнне абкома партыі так і засталося на паперы. Кіруючы гарадскі падпольны партыйны цэнтр не запрацаваў і на гэты раз.

Кіраўніцтва гарадскім падполлем па-ранейшаму ажыццяўлялася партыйнымі, савецкімі і камсамольскімі органамі звонку, з размяшчэння партызан. Ды вось сувязь з горадам станавілася ўсё больш складанай; у прыфрантавой паласе, якая праходзіла па тэрыторыі вобласці, рэжым перамяшчэння быў найстражэйшы, ён ажыццяўляўся пад дэвізам: «Ні аднаго рускага на дарогах!» І не выпадкова, што абком партыі робіць новы крок у напрамку канкрэтызацыі кіраўніцтва падполлем горада. У верасні 1942 г. Васіль Раманавіч Кудзінаў быў зацверджаны адказным арганізатарам абкома партыі па Віцебску. Але ён у горад так і не перабраўся, а па-ранейшаму кіраваў з партызанскай брыгады, цераз сувязных.

Нават у такіх складаных умовах многія падпольныя групы ўстанавілі сувязі з армейскімі і чэкісцкімі групамі і выконвалі іх заданні; сувязі з падполлем Віцебска ўстанавілі многія партызанскія фарміраванні.

З аднаго боку, сувязі падполля па-за горадам актывізавалі яго дзейнасць, падпольшчыкі добра адчувалі, як кажуць, «плячо сябра», удасканальваліся формы і метады работы, расла ўпэўненасць у сваіх сілах.

З другога боку, такое перапляценне мноства сувязей аслабляла канспірацыю, павышала магчымасць правалаў, прыводзіла да розных кур'ёзаў. Пра адзін з іх у пісьмах да Кудзінава паведамляла Харужая. Яна пісала, як

падпольшчыцу Бекішаву, якая ішла на сустрэчы да Кудзінава, затрымалі партызаны ці армейцы. Шэсць дзён вялі яны допыты і адпусцілі яе толькі тады, калі яна дала падпіску, што будзе працаваць на іх. Кудзінава пра гэта нават не праінфармавалі. Відаць, гэтая затрымка перашкодзіла Веры сустрэчу з Бекішавай, да якой у Харужай быў пароль («Советская отчизна». 1957, № 2, письмо от 30.10.42 г.).

Зразумела, што і разведінфармацыя, якая паступала па такіх розных накірунках, была разрозненая і не давала поўнага ўяўлення пра становішча ў горадзе. Абставіны па-ранейшаму патрабавалі цэнтралізацыі кіраўніцтва. Тым больш, што падпольны гарком партыі канчаткова не быў створаны. Ён быў зацверджаны толькі ў красавіку 1943 г. І зноў не ў горадзе.

Накіраванне ў Віцебск у верасні 1942 г. вопытнай падпольшчыцы В.З.Харужай было трэцяй спробай наладзіць у горадзе кіруючы цэнтр. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца спіс партработнікаў, накіраваных у свой час у тыл ворага. У ім за № 27 лічыцца Харужая, насупраць яе прозвішча допіс: «Включить в состав подпольного партийного центра в Витебске». А паколькі такі цэнтр да яе прыходу не быў створаны, то стварыць яго павінна была Харужая.

Сакратар ЦК КП(б)Б Рыгор Барысавіч Эйдзінаў сказаў аб Веры Харужай так: «Харужая — революционерка высшего класса и направлялась в Витебск как эмиссар ЦК партии Белоруссии с очень широкими полномочиями... Это выше, чем секретарь горкома партии» (Запіс размовы знаходзіцца ў архіве аўтара).

Чаму менавіта у Віцебск была накіравана такая вопытная падпольшчыца, як Харужая?

У першую чаргу гэта тлумачыцца ваенна-стратэгічным значэннем Віцебска. Па тэрыторыі вобласці праходзілі важнейшыя стратэгічныя камунікацыі, па якіх вораг забяспечваў Ленінградскую і Заходнюю групоўкі сваіх войск рэзервамі, боепрыпасамі, харчаваннем і г.д.

Пасля бітвы пад Масквой Віцебск стаў прыфрантавым горадам і таму быў насычаны воінскімі часцямі, разведвальнымі і контрразведвальнымі органамі, тут размяшчаліся склады, майстэрні, шпіталі, амаль у цэнтры горада знаходзіўся ваенны аэрадром. І вакол горада, і ўнутры яго былі ўзведзены моцныя абарончыя збудаванні.

Е.С.Суранава.

І яшчэ адна прычына пасылкі сюды менавіта Веры Харужай тлумачыцца вастрынёй унутрыгарадской барацьбы, хуткім і даволі бурным ростам падпольных арганізацый, іх баявітасцю, асабліва пасля адкрыцця Віцебскіх (Суражскіх) «варот». Вядома, што да моманта прыбыцця Веры Захараўны ў горад, тут дзейнічалі 56 падпольных груп. Трэба было скаардынаваць іх дзейнасць.

20.9.1942 г. Вера Харужая, Тоня Ермаковіч (Узкая), Дуся Суранава ступілі на партызанскую зямлю ў размяшчэнні 1-й Беларускай партызанскай брыгады М.П.Шмырова. Астатняя частка яе групы пакуль што засталася на Вялікай зямлі, у прыфрантавой палосе, у распараджэнні Віцебскага абкома партыі.

27 верасня партызанская сувязная Клаўдзія Балдачова («Бяроза») прывяла ў горад да Вараб'ёвых на вул. Трактарную, дом 4, Е.С.Суранаву і А.Ф.Ермаковіч. Вараб'ёвы былі родзічамі Е.С.Суранавай, таму пасланцаў з Вялікай зямлі яны прынялі ветліва і сардэчна.

Выкананне задання вырашылі не адкладваць, і ў той жа дзень прыступілі да справы. Клава Балдачова накіравалася да сваіх знаёмых «кітайцаў» (так называлі падпольную группу А.І.Ліпці, якая аб'ядноўвала мясцовых жыхароў кітайскай нацыянальнасці). Дуся Суранава і Тоня Ермаковіч наведалі сям'ю даваеннага сакратара партыйнай арганізацыі фабрыкі «Знамя індустрыялізацыі», а цяпер інструктара падпольнага абкома КП(б)Б М.І.Мацэнка і сясцёр Аляксандру і Ефрасінню Волат, якія пражывалі па Гутараўскай, 33 (цяпер праспект Людніка). Так былі ўстаноўлены першыя сувязі Харужай у віцебскім падполлі.

М.І.Вараб'ёва («Баба Маша»).

В.С.Вараб'ёў.

1.10.1942 г. ў Віцебск прыбыла і Вера Харужая ў суправаджэнні Тоні Ермаковіч, якая прыступіла да выканання ролі сувязной.

Яшчэ па дарозе Вера зразумела, што іх дакументы нікуды не годныя, сур'ёзнай праверкі яны не вытрымаюць, а абстаноўка значна складаней, чым бачылася тым, хто яе накіроўваў у горад. Ужо на трэці дзень знаходжання ў Віцебску Вера паведаміла Кудзінаву: «Обстановка очень сложная».

У наступным пісьме яна ўдакладняе: «В общем всё интересно... Только несколько труднее. На сегодняшний день главная трудность состоит в нашей личной неустроенности...». «В нашем списке оказалось много пустых мест» (Вера Хоружая. Письма на волю. 1962. С. 235).

Размова ідзе пра 104 (па іншых крыніцах 118) адрасы жыхароў і падпольшчыкаў горада, якія Вера атрымала ад Кудзінава і сабрала сама сярод партызан. Патрабавалася самая ўважлівая і асцярожная праверка адрасоў і людзей, для чаго патрэбны былі час і ўмовы. У іх жа не было ніякіх умоў, а час не чакаў. Вера Харужая з Дусяй Суранавай самі хадзілі па адрасах, знаёміліся з людзьмі, вывучалі акупацыйны рэжым. Вера з вялікай цеплынёй піша аб многіх віцябчанах, з якімі звёў яе ваенны лёс, захапляецца іх патрыятызмам, верай у перамогу. Не выпадкова часта ў яе пісьмах сустракаюцца такія выразы: «Хороших людей много», «Эти чудесные люди», «Люди рады налёту и ждут следующего» (маюцца на ўвазе налёты савецкіх самалётаў).

Сапраўды Веры Харужай пашчасціла на многіх памочнікаў у Віцебску. Праўда, былі і небяспечныя сустрэчы, Вера называе нават некаторыя прозвішчы, аднак мы назавём толькі тых, хто, рызыкуючы жыццём сваіх блізкіх, дапамагаў прыбліжаць перамогу.

Асноўным месцам сустрэч Веры і Дусі была кватэра Вараб'ёвых. Асабліва пяшчотна Вера пісала пра гаспадыню дома — Марыю Ігнатаўну («Бабуля Маша»). Яе сын Васіль Сямёнавіч працаваў на хлебазаводзе, а яго стрыечны брат Мікалай Вараб'ёў — на тэлефоннай станцыі, побач з якой размяшчаўся варожы радыёвузел. Браты забяспечвалі Веру інфармацыяй з гэтых цікавых для разведчыц аб'ектаў.

У сям'і Мацэнкі адбылося вельмі карыснае знаёмства з камуністкай Марыяй Іванаўнай Гульбе, мясцовай жыхаркай латышскай нацыянальнасці, якая добра ведала нямецкую мову і мела надзейныя дакументы. Брат Мацэнкі, які працаваў на чыгунцы і інфармаваў Веру пра становішча на ёй, расказваў, што Вера і Гульбе адразу пасябравалі і пры сустрэчах падоўгу гутарылі ў падвале дома па вуліцы Грыбаедава, 14, дзе месцілася сям'я Мацэнкі. Цэлымі днямі хадзіла Гульбе па гораду, наведвала сваіх знаёмых, асабліва тых, хто працаваў у акупацыйным апараце, заходзіла ў розныя ўстановы і да канца дня мела шмат цікавых назіранняў.

Вельмі чула адносілася Вера да Матроны Кліменцеўны Оскер, якая ў сваю чаргу плаціла Харужай тым жа, яна самаадданa выконвала даручэнні Веры. Брат М.К.Оскер быў камісарам аднаго з партызанскіх атрадаў, пляменніца Венера — армейскай разведчыцай, а сама Матрона Кліменцеўна ўжо набыла вопыт падпольнай работы ў групе К.С.Акаловіч. Сціплая краўчыха-інвалід не выклікала асобых падазрэнняў у акупантаў і яе кватэра па 2-й Ногіна, 18 (або 5-я Вінчэўскага, 16) стала надзейнай паштовай скрынкай для падпольшчыкаў. У кватэры Оскер і адбылася тая таямнічая сустрэча Веры ў «цёмным пакоі» з «нявестай партызана Германовіча», пра якую шмат пісалі ў кнігах і артыкулах пра Харужую. Толькі дакладна ніхто не ведаў, з кім і ў каго адбылася сустрэча.

У Оскер Харужая пазнаёмілася яшчэ з адной падпольшчыцай з групы Акаловіч — Антанінай Лукашэнка. Відаць, Оскер і Лукашэнка расказалі Веры аб Акаловіч, якая да гэтага часу, пад пагрозай арышту, вышла з горада, але трапіла ў рукі кіраўніка чэкісцкай групы С.В.Юрына. У сувязі з гэтым Вера прасіла Кудзінава паведаміць Юрыну, што ў Віцебску яна чула пра Акаловіч толькі добрае і хвалюецца, каб не было дапушчана памылкі

ў адносінах да Акаловіч. На вялікі жаль, Юрын не прыслухаўся да парады Веры і адна з актыўнейшых кіраўнікоў падпольнай групы ў Віцебску трапіла ў турму.

Каштоўныя звесткі паступалі да Веры ад групы А.І.Ліпці, якая дзейнічала ў пральні па вул. Леніна. З яе вокнаў падпольшчыкі вялі назіранне за перамяшчэннем транспарту па цэнтральнай вуліцы горада, за ўправай і паліцыяй, памяшканні якіх знаходзіліся якраз насупраць пральні. Але самае галоўнае было тое, што па маркіроўцы бялізны і па накладных падпольшчыкі вызначалі нумар і месца дыслакацыі, а таксама прыблізны колькасны склад воінскіх часцей, якія здавалі бялізну для мыцця.

Некаторыя сувязі Харужай, пра якія ўпамінаецца ў пісьмах, да сённяшняга дня раскрыць не ўдалося, паколькі некаторыя прозвішчы пазначаны толькі пачатковымі літарамі. Не ведаем, напрыклад, хто такія Азолавы, якім Вера перадае прывітанне; жанчына пад псеўданімам «Зорачка», якую шукала і не магла адшукаць Вера; да каго хадзілі Вера і Ермаковіч на вуліцу Пясчаную...

Вядома, што з чыгуначнага вузла да Веры паступілі звесткі ад падпольнай групы «Радзіма», якая налічвала каля 30 чалавек. Вера дае станоўчую ацэнку яе рабоце і піша, што «они и кое-что делают». Ніхто з групы «Радзіма» так і не адклікнуўся на публікацыі, у якіх называлася іх група.

Пошукі і знаходкі даюць права сказаць, што дзейнасць Харужай у віцебскім падполлі прыніжалася таму, што сур'ёзна не вывучалася. Нельга пагадзіцца з тым, што ў друку Вера ўвесь час падаецца як радавы кіраўнік адной з падпольных груп горада. На самай справе, яна стварыла не групу, а ўстанавіла сувязь з многімі падпольнымі групамі горада і падпольшчыкамі-адзіночкамі, прыцягнула да работы новых людзей. Яна накіроўвала дзейнасць усяго падполля, давала заданні, вучыла канспірацыі. Варта пагаварыць з Зінай Шараковай, і адразу стане зразумелым, як многа магла даць Вера нават за адну сустрэчу. Яе сустрэчы з падпольшчыкамі насілі характар інструктажа, парад, перасцярог, давалі зарад вялікіх духоўных сіл.

Харужая добра ўсведамляла, што накіравана ў Віцебск, каб узначаліць усё падполле і дзейнічала адпаведна заданню. Ёю быў створаны кіруючы цэнтр, куды паступала інфармацыя амаль з усіх канцоў горада і з най-

М.К.Оскер (справа) і яе пляменнікі.

Г.П.Іванькова.

больш важных аб'ектаў ворага. Нашы даследаванні пацвярджаюцца схемай сувязей Харужай у Віцебску, складзенай і перададзенай Кудзінавым у архіў.

Эфектыўнасць работы падпольнага цэнтра бачна з размовы з сакратаром ЦК КП(б)Б Эйдзінавым: «Для действий фронтовой авиации, — сказал он, — Вера дала больше, чем дано за многое время до неё. Её информация поступала сразу же в штаб армии, штаб фронта, в ЦК партии Белоруссии. Шифровки могут быть у Кудинова» (Запіс размовы знаходзіцца ў архіве аўтара).

Камера былой турмы СД.

Надпіс на сцяне камеры № 3 у былой турме гестапа, дзе, магчыма, была В.З.Харужая.

Назва ж «група Харужай» адносіцца да той групы з 18 жанчын, якія выехалі з Верай з Масквы і прыбылі ў Віцебскі абком партыі. У самім Віцебску з іх пабывалі толькі Суранава, Ермаковіч, Панкова і Іванькова. Апошняя пасылалася, каб высветліць абставіны правалу Веры. Астатнія члены яе групы дачынення да дзейнасці Веры ў Віцебску не мелі, а чацвёра з іх нават так і не трапілі ў тыл ворага наогул.

В.З.Харужая была вопытным і ўмелым канспіратарам. Пра падпольшчыкаў стала вядома Ганне Васільевай, другой нявестцы Вараб'ёвых, баязлівай, подлай і наогул нядобрай жанчыне. 13.11.1942 г. сувязная Балдачова прывяла для сустрэчы з Харужай Соф'ю Сяргееўну Панкову. Даведаўшыся аб гэтым, здрадніца адразу ж данесла ў СД, што ў Вараб'ёвых сабраліся падпольшчыкі. У лапы ворага трапілі Вера Харужая (па дакументах «Ганна Карнілава»), Еўдакія Суранава («Марыя Пятроўская»), Соф'я Панкова («Антаніна Заско»), Клаўдзія Балдачова («Бяроза»), гаспадыня кватэры Марыя Ігнатаўна («Бабуля Маша»), яе нявесткі Агаф'я Максімаўна, жонка сына гаспадыні, і Ганна Васільева. Васіля Вараб'ёва арыштавалі на рабоце. Каб адвесці падазрэнні, фашысты забралі і даносчыцу Ганну Васільеву, але праз некалькі дзён выпусцілі. На допытах яна расказала ўсё, што ведала пра падполле.

Больш чым месяц арыштаваных трымалі ў гарадской турме і засценках СД.

4 снежня 1942 года, узятыя з розных камер у 6 гадзін раніцы, Вера Харужая, Соф'я Панкова, Дуся Суранава, Клава Балдачова (Шадурская) і трое Вараб'ёвых былі расстраляны ў лагеры ваеннапалонных на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка. Чаму там? Па вельмі простай прычыне. Кожны дзень у лагеры паміралі шмат людзей, і ўвесь час былі адкрытымі свежавыкапаныя ямы, у любую хвіліну гатовыя прыняць новыя ахвяры.

Зусім выпадкова знайшлася сведка апошніх гадзін жыцця Веры — Ганна Сцяпанаўна Кіташова, віцебская падпольшчыца, якая 3 снежня 1942 г. была кінута ў падвалы СД, у камеру, бітком набітую арыштаванымі. Гарэла тусклая лямпачка, месца свабоднага не бы-

ло. Кіташова прысела на край парашы. Малады хлопец, які сядзеў непадалёку, каб неяк падтрымаць «новенькую», паказаў на жанчыну, якая ляжала на саломе, і сказаў, што з яе трэба браць прыклад. Усе ў камеры называлі яе «настаўніцай». Яна ляжала спакойна, ні з кім не размаўляла, толькі паціху стагнала, ды прасіла піць. Кроў праступала праз усю вопратку, ногі былі ў сіняках, а твар распух. Побач з «настаўніцай» увесь час знаходзілася жанчына сярэдніх гадоў, як і першая, з чорнымі прамымі валасамі, рэдкімі зубамі, апранутая ва ўсё чорнае. З кансервавай банкі яна паіла «настаўніцу». Так выглядала і была апранута ў дзень арышту Соф'я Панкова. Вопратка ж «настаўніцы» была быццам бы ўзята з гардэроба Харужай.

4 снежня 1942 г. ў 6 гадзін раніцы ў камеры з'явіліся гітлераўцы з сабакам, сталі па спісу выклікаць арыштаваных. Сяброўка «настаўніцы» дапамагла ёй падняцца на ногі, а сама кінулася да сцяны, з намерам нацарапаць штосьці. Ці паспела яна напісаць штонебудзь? У гэтую хвіліну гітлеравец дубінкай ударыў «настаўніцу» і сяброўка вярнулася, каб яе падтрымаць. У канцы таго ж дня вязняў, што заставаліся ў падвале, сагналі ў адно месца сартаваць прывезеную вопратку. Яе было вельмі многа. Кіташова апазнала коўдру і каралі жанчыны, якая сядзела непадалёку ад яе з 2 невялікімі дзяўчынкамі і ўвесь час накрывала іх гэтай коўдрай. Лёс вывезеных раніцай не пакідаў сумненняў. Харужую і яе сяброў прыняла віцебская зямля. Брат Веры Харужай Васіль Захаравіч сустракаўся з Кіташовай і потым у сваёй паштоўцы яшчэ раз пацвердзіў нам, што «настаўніца» і яе сяброўка — гэта Вера Харужая і Соф'я Панкова і не толькі па вопратцы, але і па паводзінах. Так загінулі цудоўныя людзі, палымяныя патрыёты Радзімы. Яны ўсе былі вартыя свайго кіраўніка — Веры Захараўны Харужай. І вось пытанне. А ці магла Вера Харужая пакінуць горад, каб выратаваць усе пытанні, якія маглі б умацаваць іх становішча ў горадзе, або зусім пакінуць горад? Прычыны ж для гэтага былі і даволі важкія. Да ўсяго ж Вера мела двух дзяцей, якія ўжо страцілі бацьку. Практычна яна магла так паступіць. Ды толькі яна не была б тады Харужай. Справа для Веры Захараўны заўсёды стаяла на першым месцы. Нават калі б абставіны былі ў сто разоў больш цяжкія, Вера засталася б на даручаным ёй баявым пасту.

С.С.Панкова з сынам Аляксеем. 1941 г.

17 мая 1960 года Веры Захараўне Харужай пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У Віцебску адна з вуліц (былая Трактарная) і СШ № 19 носяць яе імя. У двары сярэдняй школы № 31 устаноўлены бюст Харужай.

Пасля гібелі Харужай Віцебскі абком партыі ў чацверты раз спрабуе паслаць у Віцебск

Мемарыяльная дошка на будынку былой турмы гестапа.

Помнік Герою Савецкага Саюза В.З.Харужай (каля будынка СШ № 31).

ГЕРОЮ СОВЕТСКОГО СОЮЗА

ПРЕЗИДИУМ ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР
УКАЗОМ от «17» мая 1960 г.
за активное участие в революционной деятельности и проявленный героизм в борьбе против немецко-фашистских оккупантов в годы Великой Отечественной войны
ПРИСВОИЛ Харужей
Вере Захаровне
ЗВАНИЕ ГЕРОЯ СОВЕТСКОГО СОЮЗА.

СОЮЗ СОВЕТСКИХ СОЦИАЛИСТИЧЕСКИХ РЕСПУБЛИК

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР
СЕКРЕТАРЬ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР

Москва—Кремль, 2 июня 1960 г.

Грамата аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза Веры Захараўне Харужай.

новую кіруючую групу на чале з Лізаветай Іванаўнай Майзіт, якая ўжо мела вопыт работы ў тыле ворага. Да таго ж, Майзіт крыху ведала Віцебск. Кудзінаў, як адказны арганізатар абкома партыі па Віцебску, павінен быў забяспечыць новую групу дакументамі. Але і на гэты раз дакументы не здабылі, група Майзіт у горад не папала. У адным з данясенняў Майзіт пісала, што яна пачала сумнявацца ў Кудзінаве, «в его способностях что-нибудь организовать» і дадае «тут началась карательная экспедиция, и он нашу группу по существу расформировал».

На гэтым фоне інакш выглядае дзейнасць В.З.Харужай. За паўтара месяца, без дакументаў, без прыпіскі і, па сутнасці, без грошай яна змагла зрабіць многае. Зрабіла дзякуючы свайму багатаму вопыту падпольнай работы ў Заходняй Беларусі, пачуццю вялікай адказнасці за даручаную справу, самаадданасці Радзіме і свайму народу. Разам з ёю працавала цудоўная жанчына-патрыётка, такая ж добрасумленная як і Вера — Дуся Суранава. Нягледзячы на цяжкія пакуты ў засценках СД, Вера і яе сябры нікога не выдалі, канспіратыўны ланцужок быў створаны надзейна, таму падпольныя групы і адзіночкі, звязаныя з В.Харужай, не пацярпелі, засталіся на месцы і прадоўжылі барацьбу. М.Оскар, А.Ліпці, В.Чучалін загінулі, але значна пазней, пры іншых абставінах.

Н.І.Дарафеенка.

Падпольная група К.С.Акаловіч

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да сакавіка 1943 г. ў медыцынскіх установах горада. Налічвала 15 чалавек. Кіраўнік — урач туберкулёзнай бальніцы Ксенія Сяргееўна Акаловіч. Выкарыстаўшы пашпарты памерлых, гісторыі хвароб, бланкі розных даведак, яна аформіла каля 100 дакументаў для выратавання ваеннапалонных, камуністаў, асоб яўрэйскай нацыянальнасці, разведчыкаў і сувязных, моладзі ад вывазу ў Германію. Акаловіч і Т.М.Шырочанка размяшчалі ў бальніцы воінаў Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў тыле ворага, потым пераводзілі іх на канспіратыўныя кватэры, далечвалі, а Т.К.Вішнеўская выводзіла з горада. К.С.Акаловіч перапраўляла з горада не толькі ваеннапалонных,

але і мірных жыхароў, у першую чаргу тых, каму пагражала небяспека. Так, 7 і 20 мая 1942 г. яна асабіста суправаджала да партызан групу звыш 30 чалавек, пераважна камуністаў і іх сем'і, сярод іх быў і сакратар Чыгуначнага РК КП(б)Б Грыгор'еў.

З дапамогай Акаловіч былі легалізаваны армейскі разведчык В.І.Чыркоў і радыстка з разведгрупы М.Р.Яфімава («Армейца»). Пад выглядам наведвання хворых Акаловіч і М.М.Кірухіна збіралі ў горадзе звесткі аб размяшчэнні штабоў, складоў, абарончых збудаванняў, зенітных установак. Здабытыя разведданыя, медыкаменты, перавязачны матэрыял падпольшчыкі перадавалі аператыўна-чэкісцкай групе А.А.Максіменкі, партызанскай брыгадзе «Аляксея». У красавіку 1942 г. патрыёты вывелі да партызан групу ваеннапалонных, у маі Акаловіч вывела яшчэ каля 30 чалавек.

Невыпадкова А.А.Максіменка цераз Вярбіцкага ў чэрвені 1942 г. прасіў папярэдзіць Ксенію Сяргееўну аб большай канспіратыўнасці ў рабоце на партызан і фактычна забараніў ёй асабіста суправаджаць тых, хто выходзіць з горада.

В.М.Арлоўскі.

Л.М.Арлоўская.

У жніўні 1942 г. пад пагрозай правалу Акаловіч і некаторыя падпольшчыкі пайшлі ў партызаны. Тыя, што засталіся ў горадзе, працягвалі працаваць пад кіраўніцтвам Т.М.Шырачэнка.

На будынку былога тубдыспансера (цяпер вул. Леніна, 189) у 1966 г. ў гонар падпольшчыкаў установлена мемарыяльная дошка.

Падпольная група В.М.Арлоўскага

Дзейнічала на варожым аэрадроме ў Віцебску з вясны 1942 г. да сакавіка 1944 г. Аб'ядноўвала 15 чалавек. Кіраўнік В.М.Арлоўскі («Джон», «Арлёнак»). У групу ўваходзілі яго бацька Мікалай Кірылавіч, маці Ганна Аляксееўна, брат Генадзь і сястра Людміла Арлоўскія, Н.І.Багданава, У.Ц.Жызнеўскі, М.С.Ліцкала (Кудрашова), К.С.Максімава (Пракапчук), І.Міхненкаў («Дзядзя Ваня»), К.Ф.Неглін, Е.Самцова, А.І.Франтова, М.С.Хаванская, М.П.Шаўроў. Працавала ва ўзаемадзеянні з іншымі падпольнымі групамі. У 1942 г. цераз сувязных М.А.Жыдовіч і Д.І.Кузьміну была ўстаноўлена сувязь з разведгрупай П.В.Буткевіча і партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава), у 1943 г. І.А.Бекішаў і В.С.Кулагіна звязалі Арлоўскага з партызанскім атрадам Буеўскім і з Віцебскім падпольным гаркомам КП(б)Б. Падпольшчыкі наглядалі за перасоўваннем войск па Смаленскай і Аршанскай шашы, у 1942 г. перадалі групе Буткевіча план Віцебска з апісаннем аб'ектаў на левым беразе

М.К.Арлоўскі і Г.А.Арлоўская.

Г.М.Арлоўскі.

Заходняй Дзвіны, абясшкодзілі 5 агентаў абвера. Працуючы качагарам на аэрадроме, В.М.Арлоўскі здзейсніў узрыў у клубе лётчыкаў, замініраваў падыходы да бомбасховішча, 2 бронетранспарцёры, разам з братам і Бекішавым замініравалі 2 самалёты, адзін з якіх узарваўся над в. Шавардзіно, другі не вярнуўся на аэрадром. Генадзь узарваў насосную частку вадакачкі. Міны і ўзрыўчатку дастаўлялі сувязныя Жыдовіч, Шаўроў і інш. Ліцкала, Неглін, Міхненка вялі разведку, Франтова і Багданава распаўсюджвалі лістоўкі, Хаванская дабывала медыкаменты для партызан. Падпольшчыкі вывелі з в. Лятохі 14 чалавек да партызан. Пяцёра падпольшчыкаў з групы Арлоўскага дзейнічалі ў горадзе да сакавіка 1944 г., потым усе яны былі вывезены ў Германію. Кіраўнік групы В.М.Арлоўскі ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

Падпольная група І.А.Бекішава

Дзейнічала з сакавіка 1942 г. да лістапада 1943 г. Кіраўнік І.А.Бекішаў («Андрэй»), былы начальнік Кастрычніцкага райжылкіраўніцтва ў Віцебску, у 1941 г. трапіў у акружэнне, зімой 1941—42 гг. звязаўся з падпольшчыкам М.А.Шпакавым, вясной 1942 г. — з армейскай разведгрупай Ю.С.Рудакова («Жоржа», «Ягора»). Выконваючы іх заданні, прыцягваў да разведработы новых людзей. Летам 1942 г. Бекішаў устанавіў сувязь з В.Р.Кудзінавым — адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б па г. Віцебску. З красавіка 1943 г. група працавала пад кіраўніцтвам Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б. У складзе яе было 13 чалавек: камуністы Бекішаў і Р.П.Канаплёў, камсамолкі В.І.Турок (Старавойтава) і А.Ільюшчанка, 9 беспартыйных патрыётаў. На працягу амаль 2 гадоў група давала дакладныя звесткі пра аэрадром. Працуючы там электраманцёрам, Бекішаў склаў падрабязны план аэрадрома, разам з братамі В.М. і Г.М.Арлоўскімі замініраваў 2 самалёты, з Р.П.Канаплёвым выявіў несапраўдны аэрадром, што дало магчымасць савецкай авіяцыі бамбіць сапраўдны. Жонка Бекішава, вядомы ў горадзе ўрач Г.І.Багданава, прымаючы пацыентаў дома, забяспечвала сувязь паміж членамі групы, перасылала партызанам медыкаменты, ратавала моладзь ад угону ў Германію. Разам з медсястрой В.І.Турок яна вяла кругласутачнае назіранне за шашой Віцебск—Сураж. Падпольшчык М.А.Панкоў («Косця»), які быў умелым гравёрам, вырабляў розныя пячаткі і штампы. Група забяспечвала сябе і іншыя групы ўзрыўчаткай і толам, працавала амаль без правалаў у цесным кантакце з іншымі падпольнымі групамі. Адрас сястры Бекішава Ганны меўся ў Харужай, але Харужая яе не знайшла. У лістападзе 1943 г. фашысты напалі на след кіраўніка групы, але яму ўдалося разам з сям'ёй пайсці ў партызанскі атрад. Бекішаў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 2-й ступеней, «Чырвонай Зоркі», 10 медалямі; 4 члены яго групы таксама маюць узнагароды.

Падпольная група А.Я.Белахвосцікава

Дзейнічала ў цэнтры горада і пасёлку Стадыённы з ліпеня 1941 г. да лістапада 1943 г. Пачала стварацца яшчэ да акупацыі. Кіраўнік А.Я.Белахвосцікаў («Альдэмар») быў прызначаны на гэтую работу рашэннем гаркома ЛКСМБ. Група больш 2 гадоў дзейнічала без правалаў. Аб'ядноўвала 25 чалавек, у т.л. М.А.Раманенка, П.С.Шлякава, М.С.Баброва,

А.Ф.Данукалаў.

І.А.Бекішаў.

А.Я.Белахвосцікаў.

В.Ф.Пятроў.

Л.А.Сенкевіч, В.А.Аляксандрава, К.С.Шчуплікава, В.Пахомаў, М.Я.Белахвосцікава, С.Ц.Шалаеў, І.Ф.Бязбогіна, Г.Я.Фёдараў, А.П.Пахомаву (маці В.Пахомава, суседка Белахвосцікавых), А.Д.Шапурава, С.Р.Раманенка, М.Ф.Ткачова і інш. Намеснікамі кіраўніка ў яго адсутнасць былі В.Пахомаў і М.Я.Белахвосцікава. Да вясны 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам даваеннага сакратара Чыгуначнага райкома КП(б)Б І.Г.Грыгор'ева, была цесна звязана з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава), Лёзненскім падпольным райкомам КП(б)Б, армейскай разведгрупай Ю.С.Рудакова («Жоржа», «Ягора»). Цераз групу ішла каштоўная разведінфармацыя ад А.М.Казлова з в. Сасноўка, дзе размяшчаўся штаб 3-й танкавай арміі ворага. У ноч на 22.2.1942 г. падпольшчыкі з дапамогай светлавых сігналаў навялі савецкія самалёты на Смаленскі рынак, дзе была замаскіравана калона аўтамашын з ваенным грузам. Атрымаўшы ў 1942 г. патэнт на адкрыццё майстэрні, Белахвосцікаў ператварыў яе ў штаб-кватэру падпольнай групы. Падпольшчыкі і сувязныя прыносілі сюды савецкія газеты, лістоўкі, медыкаменты, узрыўчатку, абменьваліся разведінфармацыяй, намячалі планы дзеянняў. Але ў маі 1943 г. патрыёты былі выданы правакатарамі і арыштаваны. 5.5.1943 г. А.Я.Белахвосцікаў, яго сястра Марыя, С.Ц.Шалаеў былі расстраляны каля в. Гарадняны. Некалькі пазней загінулі юны паэт В.Пахомаў, В.А.Аляксандрава, М.А.Раманенка. Група працягвала дзейнасць пад кіраўніцтвам П.С.Шлякавай. У яе ўвайшлі Дз.А.Сазонаў, В.Ф.Пятроў, М.І.Шаршнёў і многія іншыя. Аднак у пачатку лістапада 1943 г. пачаліся новыя арышты. На гэты раз былі расстраляны В.Ф.Пятроў, Аляксей Ражкоў, Дз.А.Сазонаў, Іван Трыфунтаў, Уладзімір Туркін, Г.Я.Фёдараў, Б.Халімановіч, М.І.Шаршнёў, П.С.Шлякава, адпраўлены ў Асвенцім М.Ф.Ткачова і К.С.Шчуплікава.

У Віцебску, па былой 2-й Стадыённай вуліцы, якая цяпер носіць імя А.Я.Белахвосцікава, на доме № 29 у гонар падпольшчыкаў устаноўлена мемарыяльная дошка. А.Я.Белахвосцікаў і яго юны памочнік Валянцін Пахомаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені; медалямі «За адвагу» ўзнагароджаны П.С.Шлякава, В.А.Аляксандрава і А.П.Пахомава.

Падпольная група Л.Дз.Бярозкінай

Дзейнічала ў гарадской управе, друкарні і на вузле сувязі з ліпеня 1941 г. да верасня 1942 г. Аб'ядноўвала 10 чалавек: Л.Дз.Бярозкіна («Бомба»), студэнтка педінстытута З.Ц.Васільева, работнікі абласной друкарні Я.Я.Ваўчок і В.Дз.Карняшонак, супрацоўнік тэлефоннай станцыі М.У.Вараб'ёў, М.І.Захараў і яго жонка П.І.Гаўберг-Іванова, чыгуначнік А.Г.Канаплёў, В.М. і Б.В.Салаўёвы (бацька і сын). Слухаючы радыёпрыёмнік, які ўстанавіў Канаплёў у падвале дома № 4 па вуліцы Савецкай, Бярозкіна і Канаплёў запісвалі зводкі Саўінфармбюро і знаёмілі з іх зместам найбольш даверaных асоб са свайго

асяроддзя. Але 19.12.1941 г. Канаплёў быў высачаны і павешаны акупантамі. Групу ўзначаліла Бярозкіна. Цэнтрам стала кватэра Захаравых па вуліцы Замкавай, 3, дзе жыла Бярозкіна. Гаспадыня кватэры Гаўберг-Іванова выконвала ролю сувязной з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава). Група была звязана таксама і з партызанскім атрадам М.Ф.Біруліна (з красавіка 1942 у складзе 1-й Беларускай партызанскай брыгады). Падпольшчыкі вялі антыфашысцкую прапаганду, забяспечвалі партызан разведінфармацыяй, перадавалі медыкаменты, ратавалі ваеннапалонных і дапамагалі ім выходзіць з горада да партызан. Група Бярозкінай — адзіная ў Віцебску, якая наладзіла выпуск савецкіх лістовак непасрэдна ў горадзе. Камсамольцы Валчок і Карняшонак, якія працавалі ў друкарні прафашысцкай газеты «Новый путь», на працягу лета і восені 1942 г. рэгулярна друкавалі і распаўсюджвалі лістоўкі. Цераз урача М.Б.Мурашка (член падпольнай групы медработнікаў) Гаўберг-Іванова атрымоўвала медыкаменты. Пры падрыхтоўцы дыверсіі на нямецкім вузле сувязі і тэлефоннай станцыі 7.9.1942 г. па даносу правакатара былі арыштаваны М.У.Вараб'ёў, Л.Дз.Бярозкіна, З.Ц.Васільева, М.І.Захараў, а пазней Ваўчок і Карняшонак. Два тыдні катавалі патрыётаў гітлераўцы. Але ўсе трымаліся стойка і ўратавалі ад арышту Гаўберг-Іванову. 22.9.1942 г. каля Смаленскага рынка акупанты павесілі Л.Дз.Бярозкіну, З.Ц.Васільеву, Я.Я.Ваўчка, М.І.Захарава, В.Дз.Карняшонка. У 1968 г. на месцы іх пакарання пастаўлены помнік; на брацкай магіле падпольшчыкаў (вул. 3-я Полацкая, Новасямёнаўскія могілкі) у 1971 г. ўстаноўлена мемарыяльная пліта, на будынку друкарні (Шчарбакова-Набярэжная, 6) — мемарыяльная дошка. П.І.Гаўберг і М.І.Захараў узнагароджаны.



Брацкая магіла падпольшчыкаў на Стара-Сямёнаўскіх могілках.

Павешаныя акупантамі ў 1942 г. члены падпольнай камсамольскай групы Захараў, Ваўчок, Карняшонак, Вараб'ёў, Бярозкіна, Васільева.

І.С.Вялаў.

Васіліса Вялава.

В.А.Вярбіцкі.

Мікалай Вінакураў.

Падпольная група І.С.Вялава

Дзейнічала з верасня 1942 г. да кастрычніка 1943 г. У групу ўваходзілі І.С.Вялаў («Кузняцоў») і яго дзеці: 16-гадовая камсамолка Васіліса, 14-гадовая Ганна і 12-гадовы Алёша. Асноўная канспіратыўная кватэра знаходзілася ў хаце Вялавых па вуліцы 2-й Сакольніцкай, 2. З 1943 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам падпольнага гаркома КП(б)Б. Каб збіраць інфармацыю і карміць сям'ю, Вялаў пачаў працаваць цесляром на чыгуначным вакзале. Сачыў за перамяшчэннем вайсковых эшалонаў і грузаў, двойчы падпальваў памяшканне вакзала, каб зноў рабіць там рамонт. Васіліса («Дзіна») і Ганна («Малая») дапамагалі дваюраднай сястры, падпольшчыцы Е.С.Спірыдонавай, раскідваць у горадзе лістоўкі. Каб узарваць будынак гарадской паліцыі і пашпартнага стала, Васіліса і Ганна даставілі тол у мяху з бульбай і 19.1.1943 г. выканалі заданне. У выніку быў разбураны будынак, забіта 2, паранена 5 паліцаяў. Алёша дастаўляў падпольнаму гаркому партыі і партызанам разведдадзеныя, кіслату, а ў горад — лістоўкі. У сакавіку 1944 г. сям'ю Вялавых гітлераўцы змясцілі ў лагер смерці ў Чашніцкім раёне, дзе яны і знаходзіліся да вызвалення. У 1946 г. ад туберкулёза памерлі Васіліса і Алёша, у 1964 г. пайшоў з жыцця І.С.Вялаў. У гонар падпольшчыкаў Вялавых у Віцебску па вуліцы 2-й Сакольніцкай, на месцы, дзе стаяла хата Вялавых, устаноўлена мемарыяльная дошка. Усе члены групы ўзнагароджаны медалямі.

Падпольная група В.А.Вярбіцкага

Дзейнічала са жніўня 1941 г. да красавіка 1943 г. Разведвальна-дыверсійная група была створана камуністамі В.А.Вярбіцкім і С.П.Бурлаковым, пакінутымі ў Віцебску для падпольнай работы, налічвала 33 чалавекі. З вясны 1942 г. працавала пад кіраўніцтвам аператыўна-чэкісцкай групы А.П.Максіменкі. Пазней устаноўлена сувязь з адказным арганізатарам падпольнага абкома КП(б)Б па Віцебску В.Р.Кудзінавым і партызанскімі атрадамі М.Ф.Біруліна і Д.Ф.Райцава, якія дзейнічалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Сярод падпольшчыкаў гэтай групы былі камуністы А.М.Міхайлоўская, З.П.Ражкова, А.Ц.Окунеў, У.У.Жукаў, В.Лук'яненка, камсамольцы М.Н.Вінакураў, Л.Я.Шчаглова, У.Забаранкаў, сёстры М.І. і Г.І.Старавойтавы. У распаўсюджванні савецкіх лістовак актыўна ўдзельнічаў піянер СашаБагданаў. Адказныя заданні выконвалі А.Ф.Разумоўскі, А.Ф.Юшкевіч, П.Ф.Іваноў, М.В.Лапуноў і інш. На працягу амаль 2 гадоў група вяла разведку, антыфашысцкую прапаганду, пастаўляла партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, забяспечвала дакументамі, накіроўвала ваеннапалонных і жыхароў горада да партызан. Патрыёты наладзілі масавы вынас зброі са склада армейскага корпуса ворага. Толькі за 2 першыя месяцы 1943 г. яны перадалі ў партызанскія атрады каля 4 тыс.

патронаў, 20 ручных гранат, 6 кг узрыўчаткі, кулямёт, некалькі пісталетаў, 2 пісталеты-кулямёты. Асабліва шмат зброі і боепрыпасаў здабылі М.Н.Вінакураў, М.В.Лапуноў, В.Лук'яненка, Л.Я.Шчаглова. П.Ф.Іваноў па частках вынес, сабраў і перадаў партызанам 7 аўтаматаў. Медыкаменты паступалі ад сясцёр Старавойтавых, якія працавалі ў аптэцы. Муж і жонка А.Ф.Юшкевіч і А.М.Міхайлоўская захоўвалі ў сваім доме радыёпрыёмнік, слухалі зводкі і забяспечвалі групу прапагандысцкім матэрыялам, хавалі ваеннапалонных і перапраўлялі іх да партызан. У пачатку 1943 г. ў перыяд карнай аперацыі супраць партызан група Вярбіцкага, як і многія іншыя падпольныя групы горада, страціла сувязь са сваім кіраўніцтвам. У красавіку 1943 г. гітлераўцы арыштавалі 30 членаў гэтай групы. У час вобыску на канспіратыўнай кватэры ў А.М.Казловай па вул. 1-й Украінскай, 5, дзе жыў Вярбіцкі, была знойдзена скрынка са ўзрыўчаткай, пісталет і 7 ручных гранат. 18 падпольшчыкаў, у т.л. ўсе камуністы, а таксама М.Н.Вінакураў, У.Забаранкаў, П.Ф.Іваноў, М.Лавігін, М.В.Лапуноў, Дз.А.Літвінаў, М.Малічаў, К.Меньшыкава, Л.Я.Шчаглова, А.Ф.Юшкевіч расстраляны, многія адпраўлены ў лагер. СД. Вярбіцкі і Бурлакоў узнагароджаны медалямі «За адвагу», а ўсяго 7 членаў гэтай групы атрымалі ўзнагароды.

Падпольная група Г.К.Грабяньковай

Дзейнічала ў Віцебску з канца 1941 г. да лютага 1943 г. Аб'ядноўвала 10 чалавек. Кіраўнік групы Г.К.Грабянькова прыцягнула да падпольнай работы сваю маці Ганну Пятроўну, сястру Е.К.Лукашэнка, брата І.К.Лукашэнка, сына Эдуарда, брата мужа К.С.Грабянькова і яго сына Дзяменція. У лютым 1942 г. членамі групы сталі А.П. і М.І.Шашковы, В.Ц.Вурганава. Зімой 1941—42 гг. група ўстанавіла сувязь з партызанскім атрадам М.Ф.Біруліна (з красавіка 1942 г. ў складзе 1-й Беларускай партызанскай брыгады) і выконвала яго заданні па разведцы, з красавіка 1942 г. група працавала фактычна пад кіраўніцтвам разведгрупы У.А.Мядзведзева («Іспаліна»), у складзе якой ваяваў брат Грабяньковай Аляксандр Гарбатаў. На працягу амаль 5 месяцаў разведчыкі рэгулярна перадавалі ў Цэнтр звесткі пра варожы гарнізон, палітычныя і эканамічныя мерапрыемствы ў горадзе. У кароткі тэрмін з дапамогай сям'і Грабяньковых усе члены групы «Іспалін» былі легалізаваны. Падпольшчыкі садзейнічалі бесперапыннай рабоце радыёстанцыі; летам 1942 г. Грабянькова, Вурганава і А.П.Шашкова даставілі сілкаванне для рацыі з-за лініі фронту. У канцы жніўня 1942 г. фашыстамі былі схоплены многія разведчыкі групы «Іспалін». У лютым 1943 г. былі арыштаваны і пасля катаванняў расстраляны: Г.К.Грабянькова, Д.К.Грабянькоў, К.С.Грабянькоў, Э.Грабянькоў, Е.К.Лукашэнка, І.К.Лукашэнка, А.П.Шашкова. З 10 членаў групы 8 расстраляны. Ніхто не ўзнагароджаны.

Падпольная група М.І.Еўдакімава

Дзейнічала ў в. Альгова (за 2 км ад Віцебска) з лета 1942 г. да кастрычніка 1943 г. Аб'ядноўвала 12 чалавек. Кіраўнік М.І.Еўдакімаў («Міша»). А.А.Еленская, М.Ф.Гваздзёва і Н.С.Сельчыкава ўжо са жніўня 1941 г. аказвалі дапамогу партызанскай групе І.Д.Буцьянава—М.Ф.Біруліна, хадзілі па вёсках і ўстанаўлівалі сувязі з іншымі камуністамі раёна. У 1942 г. Сельчыкава стала сувязной групы Еўдакімава з адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б па гораду В.Р.Кудзінавым, а таксама з Віцебскім падпольным райкомам ЛКСМБ. У падпольную работу ўключылася сям'я Еўдакімава (маці Наталля Іванаўна, сястра Лідзія, жонка Тамара Цярэнцьеўна, сястра маці В.І.Грабянцова), камсамольцы А.Раўкоў, У.А.Макееў, І.Я.Цярэшчанка, ветурач Т.І.Цярэшчанка. Ф.І.Ахрамовіч працаваў паліцэйскім у Альгове, выратоўваў людзей ад угону ў Германію, выводзіў з фашысцкага канцлагера савецкіх грамадзян. З яго дапамогай падполь-

шчыкі збіралі дакладную інфармацыю аб праціўніку: яго ўмацаваннях, размяшчэнні пастоў і кантрольна-прапускных пунктаў, карных органаў і іх супрацоўнікаў. У маі 1943 г. Ахрамовіч з дапамогай міны, якую прынесла Сельчыкава, знішчыў склад бензіна (70 бочак і 3 аўтамашыны з прычэпамі). У кастрычніку 1943 г. Еўдакімаў праз Сельчыкаву ўручыў міну служыўшаму ў СД паліцэйскаму, які залажыў яе ў пакоі афіцэра СД. Выбухам афіцэр быў забіты. Члены групы ўстанавілі сувязь з нямецкімі антыфашыстамі, распаўсюджвалі сярод насельніцтва газеты і лістоўкі. Макееў і Раўкоў праводзілі палітычную агітацыю сярод ваеннапалонных. З набліжэннем лініі фронту, у сувязі з вывазам насельніцтва ў заходнія раёны і канцлагеры, у кастрычніку 1943 г. дзейнасць групы спынілася. У радах Чырвонай Арміі барацьбу з ворагам працягвалі М.І.Еўдакімаў, А.Раўкоў, У.А.Макееў, І.Я.Цярэшчанка (загінулі на фронце), Ф.І.Ахрамовіч і Л.І.Еўдакімава. Кіраўнік групы ўзнагароджаны медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» 2-й ступені.

М.І.Еўдакімаў.

М.І.Журынская.

Падпольная група М.А.Журынскай

Дзейнічала на хлебазаводзе № 1 з сакавіка 1942 г. да лістапада 1943 г. Налічвала 10 чалавек. Кіраўнік М.А.Журынская. Калі акупанты аднавілі хлебазавод для патрэб арміі, па заданні камуніста І.А.Бекішава камсамолка М.А.Журынская (да вайны студэнтка медінстытута) стварыла на заводзе падпольную групу. У яе ўвайшлі яе сёстры Ала (Адміралава) і Ада (Дамарацкая), маці Алёна Іванаўна, камсамолка Г.В.Касюбайціс (Шапо), маці і дачка Грынявіцкія, піянерка Люба Марозава (Мурашка), а таксама ваеннапалонныя П.А.Жукаў і У.М.Ануфрыеў, якія працавалі на хлебазаводзе. Патрыёты выводзілі са строю абсталяванне, устройвалі пажары, выносілі і вывозілі гатовую прадукцыю. Па нумарах і ўмоўных знаках на аўтамашынах, якія прыбылі на завод, па колькасці адпушчанага хлеба і дакументах вызначалі колькасць асабовага складу, назву і месца дыслакацыі вайсковых часцей. Хутка група Журынскай устанавіла сувязь з возчыкамі хлеба ваеннапалоннымі І.Сідзельнікавым і Ф.Нікалаевым. Амаль штодзённа сёстры Журынскія, І.Грынявіцкая хавалі ў тайнікі пад сядзеннем па некалькі буханак хлеба для ваеннапалонных. Журынская па падробленых талонах арганізавала адпраўку хлеба партызанам (зімой 1942—43 вывезена 850 кг). Жукаў і Ануфрыеў дапамагалі ў зборы разведінфармацыі. Узламаўшы ваенны склад, яны выкралі вялікую колькасць вінтовак і боепрыпасаў, імі былі забяспечаны дзесяткі ваеннапалонных, якіх вывезлі ў партызанскія атрады. У жніўні 1943 г. Жукаў і Ануфрыеў, якія папалі пад падазрэнне, былі перапраўлены да партызан. У кастрычніку 1943 г. ўсе астатнія члены групы арганізавана выйшлі з горада. Кіраўнік групы М.А.Журынская загінула (смяротна паранена асколкам міны), не вярнулася з разведкі Іда Грынявіцкая. Сёстры Н. і А. Журынскія і Г.Касюбайціс узнагароджаны медалямі «За адвагу».

Падпольная група Д.І.Земляковай

Дзейнічала на чыгуначнай станцыі Лосвіда і ў в. Доўжа з кастрычніка 1941 г. да сакавіка 1944 г. Налічвала 12 чалавек. Кіраўнік Д.П.Землякова. Спачатку ў групу ўваходзілі Т.А.Шамшура (Найдунова), В.К.Парфёнава (Палонская) і Д.П.Землякова. Увосень 1941 г. падпольшчыкі арганізавалі пабег групы ваеннапалонных, якія працавалі на будаўніцтве

казармы. Група папоўнілася новымі членамі: К.П. і С.І.Воранавы, сям'я Т.А.Шамшура, А.С.Гурко, Я.Я. і Д.Д.Купоўскія, Г.А.Карэйчанка, сям'я Котавых, І.Аляксандраў. Дом Воранавых стаў канспіратыўнай кватэрай. Парфёнава ўладкавалася на работу ва ўправу, выратоўвала моладзь ад угону ў Германію, забяспечвала партызан і падпольшчыкаў дакументамі і пропускамі, дапамагла выкрыць і абясшкодзіць некалькі варожых агентаў, якія былі засланы ў партызанскія атрады. У пачатку красавіка 1942 г. Землякова і Шамшура звязаліся з аператыўна-чэкісцкай групай А.П.Максіменка, пазней — з Віцебскім падпольным райкомам КП(б)Б. Падпольшчыкам даручылі ўладкавацца на работу да акупантаў. Сама Землякова ўладкавалася прыбіральшчыцай ў салдацкай казарме, Шамшура — у нямецкім шпіталі, Д.Кукоўскі стаў паліцэйскім. Сям'я Котавых назірала за чыгункай. Піянер Коля Землякоў быў разведчыкам і сувязным. У выніку агітацыі сярод ахоўнікаў да партызан пайшлі 16 чалавек. Гурко і Аляксандраў, якія атрымалі ад партызан 1-й Беларускай партызанскай брыгады тол і міны, знішчылі мост на шашэйнай дарозе каля в. Казлы, падарвалі 2 машыны з харчаваннем і гітлераўцамі. У лютым 1943 г. Землякова даставіла ў в. Доўжа 48 кг толу. 60% у групе складала моладзь, пераважна камсамольцы. Іх гібель была асабліва балючай. А страты былі. У жніўні 1942 г. пры выкананні баявога задання загінуў камсамолец Кукоўскі. Прапаў без вестак В.Пальчыкаў. У 1943 г. пры ўстаноўцы міны на складзе зброі ў пасёлку Чэпіна быў схоплены Аляксандраў. Пры расклейванні лістовак арыштаваны і закатаваны настаўнік Кім Цітоў. Але патрыёты не спынялі дзейнасці. Здабывалі разведінфармацыю, перадавалі сілкаванне для партызанскіх радыёстанцый, харчаванне, медыкаменты, зімой 1943 г. знішчылі мясцовага бургамістра. Браты Котавы (Іван, Пётр і Аляксандр) пры адыходзе ў партызанскі атрад захапілі з сабой у якасці «языка» нямецкага афіцэра. Усе члены сям'і Котавых загінулі. Дзейнасць групы ацэнена высока. Д.П.Землякова, адна з нямногіх падпольшчыкаў, узнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, С.Воранаў — медалём «За адвагу».

Подпольная група У.А.Казлоўскага

Дзейнічала на электрастанцыі з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Кіраўнік У.А.Казлоўскі, які быў пакінуты Віцебскім ГК ЛКСМБ для падпольнай работы ў Віцебску. У групу ўваходзілі: бацька Казлоўскага Аляксандр Данатавіч, маці Лізавета Данілаўна, брат Аляксандр, М.А.Жыдовіч і інш. У першыя дні вайны У.А.Казлоўскі быў арганізатарам маладзёжных атрадаў народнага апалчэння, у абарончых баях быў паранены. З чэрвеня 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам Віцебскіх падпольных абкома і гаркома камсамола, мела сувязь з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава). Жыдовіч, а пасля яе гібелі ў маі 1943 г. яе маці Д.І.Кузьміна дастаўлялі патрыётам з партызанскай брыгады міны, узрыўчатку, забяспечвалі партызан разведінфармацыяй, прывялі ў атрад 25 ваеннапалонных. У.А.Казлоўскі запісваў па радыёпрыёмніку зводкі Саўінфармбюро, якія потым члены групы размнажалі і распаўсюджвалі. Працуючы электраманцёрам на электрастанцыі, ён узарваў 2 трансфарматарныя будкі, правёў 2 дыверсіі на падстанцыі, замініраваў танк. 28.10.1942 г. У.А.Казлоўскі і яго бацька загінулі пры выкананні задання: наводзячы светлавымі сігналамі савецкія самалёты на электрападстанцыю, яны выклікалі агонь на сябе. Члены групы, якія засталіся, працавалі пад кіраўніцтвам партызанскай брыгады «Аляксея». А.А.Казлоўскі заставаўся ў падполлі да вызвалення горада, загінуў на фронце. Кіраўнік групы і М.А.Жыдовіч узнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені.

Падпольная група В.І.Кірыленкі

КІРЫЛЕНКА Васіль Іванавіч нарадзіўся ў 1904 г., да вайны — участковы ўпаўнаважаны 3-га аддзялення міліцыі г. Віцебска. 10.7.1941 г. разам з многімі работнікамі міліцыі выехаў у бок Суража. Недалёка ад горада іх машыны былі затрыманы вышэйшым кіраўніцтвам вобласці. Тут жа, на хаду, адабралі 12 чалавек на чале з Е.Р.Навасельцавым

для падпольнай работы ў Віцебску. У в. Скулавічы яны перапрануліся ў цывільнае адзенне і паступова перабраліся ў горад, дзе ў многіх жылі сем'і або родзічы.

У групу Кірыленкі ўвайшлі жонка Лідзія Васілеўна, сын Уладзімір (н. ў 1929), сёстры Дар'я і Вера, браты Мікалай і падлетак Косця, а таксама іх сваяк М.Т.Харытонаў.

У горадзе адразу ўзяліся за справу: накаплівалі зброю і пераносілі ў лес, вывучалі ворага і яго звычкі, прыглядаліся да людзей, на якіх бы маглі разлічваць у сваёй падпольнай дзейнасці.

Нечакана быў арыштаваны іх кіраўнік Е.Р.Навасельцаў, а затым і сваяк Міхаіл Харытонаў. Навасельцава расстралялі, а Харытонава выратавалі.

Паказальна, што ў вызваленні Харытонава дапамог Кірыленку намеснік начальніка гарпаліцыі Ф.Н.Калеснікаў. Ён жа паспрыяў, каб усе, за каго прасіў Кірыленка, атрымалі нямецкія дакументы і пропускі. Такім чынам, становішча падпольнай групы стала больш надзейным, і ад разведкі яны сталі пераходзіць да дыверсій. Асабліва гэта дзейнасць актывізавалася, калі Кірыленка і Харытонаў у маі 1942 г. ўвайшлі ў партызанскую брыгаду «Аляксея», Васіль Іванавіч узначаліў узвод брыгаднай разведкі.

Факты з баявой хронікі групы.

Гэта было ў пачатку 1942 г. Вера Іванаўна, падлеткі Косця і Валодзя паклалі міну ў печ дома па вул. Фрунзе, у якім жылі нямецкія афіцэры. Загінулі 12 фашыстаў.

У тым жа годзе Вера, Косця і Валодзя паклалі міну пад Чэпінскі мост. Асаблівых пашкоджанняў узрыў не выклікаў, але сам факт дыверсіі меў пэўны эфект.

У сакавіку 1942 г. яны ж знішчылі машыну з боепрыпасамі на тэрыторыі трамвайнага парку.

28.4.1942 г. на падкладзенай імі міне ўзарвалася легкавая аўтамашына камандзіра знітчыкаў у Стадыённым пасёлку. Загінулі шафёр і яго пасажыр.

У жніўні 1942 г. сям'я Кірыленкі панесла цяжкія страты. Загінулі юныя патрыёты Косця і Валодзя (насіў прозвішча Тарасаў). Яны накіраваліся мініраваць аўтакалону каля Смаленскага рынку. На некаторай адлегласці за імі ішлі Вера і Лідзія Васілеўна. Каля моста цераз Віцьбу на вул. Баўмана ў кішэні Валодзі ўзарвалася міна. Ён загінуў адразу, Косцю адарвала руку і нагу. У бальніцы ён памёр. Гітлераўцы спрабавалі што-небудзь даведацца ад Косці, але ён нічога не сказаў.

Астатнія члены групы пакінулі горад і сталі партызанскімі разведчыкамі. Усе яны загінулі, апрача Васіля Іванавіча і сястры Дар'і Іванаўны, загінулі трагічна, аказаўшыся ў руках ворага. Лідзія Васілеўна пры пераходзе шашы Віцебск—Сураж трапіла на засаду і была схоплена каля в. Краўцова.

33 дні пабояў і катаванняў перацярпела Вера Іванаўна ў ГФП-717 (інтэрнат ветінстытута). Яе расстралялі ў пойме р. Віцьба восенню 1942 г.

Загінуў і Мікалай Кірыленка, які, будучы ўжо ў партызанскім атрадзе, хацеў перавесці да партызан групу паліцэйскіх. Але на хутары Янукоўшчына гэтыя паліцэйскія схапілі Мікалая і перадалі ў СД. Больш ніхто яго не бачыў.

Так вось склаўся лёс патрыётаў. З верай ў перамогу яны ішлі на смерць і дзяцей вялі тым жа шляхам.

Толькі за 1942 г. падпольшчыкамі Віцебска ажыццёўлена 102 дыверсіі. На працягу верасня 1943 г. яны здзейснілі 15, а ў кастрычніку — 32 дыверсіі, у т.л. і ў рэдакцыі газеты «Новый путь», на складзе вайсковай часці № 607.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 3793, воп. 1, спр. 29, л. 20—25.

Падпольная група З.Ф.Кочатавай

Дзейнічала ў Віцебску і в. Батрукі з лета 1942 г. да кастрычніка 1943 г. Кіраўнік З.Ф.Кочатава. У групу з 6 чалавек уваходзілі яе муж М.В.Кочатаў, сястра Г.Ф.Лятоха (Дворнікава), Е.С.Круглікаў і яго жонка А.С.Пранеўская, Я.А.Вільковіч. Падпольшчыкі ратавалі савецкіх ваеннапалонных, перапраўлялі іх у партызанскія атрады. У чэрвені 1943 г. наладзілі пабег дэшыфравальшчыку нямецкай вайсковай часці чэху Іагану Лойдзе, які займаўся ў разведштабе расшыфроўкай радыёграм Чырвонай Арміі і партызанскіх брыгад. Лойда быў перапраўлены ў 1-ю Беларускую партызанскую брыгаду, адтуль у Маскву, дзе паведаміў каштоўныя звесткі пра характар, колькасць і месцы дыслакацыі вай-

В.С.Кулагіна.

А.П.Ламаносенка.

Г.А.Ламаносенка.

Т.А.Ламаносенка.

сковых часцей у Віцебску, пра сістэму гітлераўскай радыёразведкі, а галоўнае, аб недахопах у зашыфроўцы партызанскіх радыёграм. Пасля вайны Лойда прыязджаў у Віцебск, а Галіна Лятоха неаднойчы гасцявала ў «Івана Іванавіча», як ён сам сябе называў. У кастрычніку 1943 г. З.Ф.Кочатава, тры яе сястры, Вільковіч былі арыштаваны, падвергнуты катаванням і адпраўлены ў фашысцкі канцлагер Асвенцым, дзе Зінаіда Філатаўна і загінула. Пазбеглі арышту, пайшлі ў партызанскі атрад, а потым на фронт — Кочатаў, Круглікаў і Пранеўская. Чацвёра членаў групы ўзнагароджаны.

Падпольная група В.С.Кулагінай

Дзейнічала ў в. Букаціна Віцебскага раёна і Віцебску са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. Кіраўнік В.С.Кулагіна («Ліса»). У групу ўваходзілі: яе маці Ганна Іванаўна, сёстры Марыя і Ганна, сваяк Сяргей Аляксандравіч Кулагін, В.М. і А.М.Гарновы, А.Ц. і П.Ц. Юпатавы, І.Л. і Ф.Л.Юпатавы, Мікалай Васілевіч і Ніна Васілеўна Азеўшы, В.Ф.Фёдарава. Муж і жонка К.М. і Ф.І. Анісімавы, А.І. і І.М.Арловы вялі падпольную работу ў Віцебску. Ужо ў жніўні — снежні 1941 г. падпольшчыкі накіравалі ў партызаны многіх ва-

Сустрэча баявых сяброў партызан-падпольшчыкаў 24 жніўня 1968 г. каля Віцебска (в. Буева). У першым радзе злева направа: Е.Е.Бруева, А.А.Сакалоў, А.Г.Клюйкіна, Д.Я.Сямёнаў, А.А.Пагарэлаў (камандзір атрада). У другім радзе: В.М.Арлоўскі, В.С.Кулагіна, І.А.Бекішаў, В.М.Гарнова.

Г.І.Худалей.

В.В.Худалей (Казлова).

З.Ц.Басава.

В.Н.Рошчына.

еннаслужачых, якія трапілі ў акружэнне і хаваліся ў прыгарадных лясах, сабралі вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў. Ф.Л.Юпатава па заданні кіраўніка партызанскай групы М.Ф.Біруліна звязалася з сёстрамі Гваздзёвымі з в. Лужасна (пазней — падпольная група З.Я.Гваздзёвай), а В.С. і М.С.Кулагіны — з падпольнай групай Ф.П.Грунтова (15 чал.) з вучгаса «Падбярэззе», дзе знаходзіліся варожыя гарнізоны. Патрыёты перадавалі звесткі аб гарнізонах, забяспечвалі партызан медыкаментамі і перавязачным матэрыялам. Наладзіўшы сувязі з падпольнымі групамі І.А.Бекішава, М.А.Журынскай, В.М.Арлоўскага, А.А.Сакаловай, аператыўна-чэкісцкай групай А.П.Максіменкі, армейскай разведгрупай Ю.С.Рудакова («Жорж», «Ягор»), з адказным арганізатарам абкома КП(б)Б па гораду В.Р.Кудзінавым. У выніку звесткі падпольшчыкаў партызанам аб перамяшчэнні праціўніка, будаўніцтве ўмацаванняў і іншыя сталі больш дакладнымі. Ад партызан атрымлівалі лістоўкі, газеты, міны, заданні для іншых падпольных груп, выводзілі ў партызанскія атрады ваеннапалонных і моладзь. З вясны 1943 г. В.С.Кулагіна стала сувязной Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б і начальнікам агентурнай разведкі Буеўскага атрада 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Па заданні разведчыка М.А.Шпакава яна з дапамогай С.А.Кулагіна сабрала звесткі аб варожых гарнізонах уздоўж дарогі Віцебск – Янавічы, аб аэрадроме пад Янавічамі. І.М.Арлоў, які працаваў у домакіраўніцтве ў Віцебску, забяспечваў жыллём і прыпіскай разведчыкаў і сувязных. 27.12.1942 г. партызаны з дапамогай падпольшчыкаў груп Кулагінай і Грунтова разграмілі варожы гарнізон у вучэбнай гаспадарцы «Падбярэззе». У верасні 1942 г. сям'я Кулагіных пайшла да партызан. У канцы 1942 г. арыштаваны і закатаваны гітлераўцамі І.М.Арлоў, загінуў С.А.Кулагін. Да восені 1943 г. В.С.Кулагіна, В.М.Гарнова, муж і жонка Анісімавы прымалі актыўны ўдзел у дыверсіях на чыгункі. Усе сёстры Кулагіны атрымалі высокія ўзнагароды; кіраўнік групы В.С.Кулагіна ўзнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны 2-й ступені, медалём.

В.Я.Сакалова.

Л.А.Мацвеева (Любімава).

Падпольная група Т.А.Ламаносенка

Дзейнічала ў Віцебску са студзеня 1942 г. да снежня 1943 г. Налічвала каля 30 чалавек. Кіраўнік Т.А.Ламаносенка (Барадзіна). У групу ўваходзілі яе бацька Аляксандр Пятровіч, маці Марыя Мікалаеўна, брат Генадзь, сваякі М.А. і С.А.Ізмайлавічы, знаёмыя А.Кананенка, В.І.Лебедзева, Л.А.Мацвеева (Любімава), Н.А.Мірановіч, У.Ф.Папсуевіч,

І.М.Ліпская.

М.Я.Сакалова.

В.Я.Сакалова і яе муж У.І.Лелаус, К.А.Сцяпанава, Я.П.Фільчанка, Г.І.Худалей, В.В.Худалей (Казлова) і інш. Для падтрымкі сувязі з групай, аператыўнай дастаўкі разведдадзеных, а ў горад — лістовак, газет і дыверсійнага матэрыялу ў групу былі ўключаны некалькі разведчыкаў і сувязных партызанскай брыгады «Аляксея» (А.Ф.Данукалава) і армейскай разведгрупы П.В.Буткевіча. Сувязнымі і разведчыкамі былі А.С.Кіташова, Я.Я.Калабанава, В.М.Кульбеева, яе бацька Мікалай Лявонавіч і маці Ірына Дзмітрыеўна Кульбеевы, Лебедзева, Г.М.Рашэўская, К.Н.Ціхош. Член групы К.Д.Сямёнава выконвала заданні падпольных груп У.А.Казлоўскага і Бекішава. Падпольшчыкі распаўсюджвалі газеты і лістоўкі, збіралі інфармацыю ваеннага характару і накіроўвалі яе ў партызанскую брыгаду «Аляксея», пазней — у Віцебскі падпольны гарком КП(б)Б. На сувязь да партызан часта хадзіла 16-гадовая падпольшчыца Калабанава, якая дастаўляла ў горад міны, узрыўчатку, удзельнічала ў дыверсіях на чыгунцы. Увосень 1943 г. Мацвеева, якая працавала на аэрадроме, разам з Калабанавай арганізавалі пабег савецкіх ваеннапалонных у партызанскую брыгаду «Аляксея». Члены падпольнай групы ўдзельнічалі ў аперацыі брыгады па разгрому варожага гарнізона ў маёнтку Білёва (за 3 км ад Віцебска). У барацьбе з акупантамі загінулі: Я.Я.Калабанава, А.Кананенка, В.І.Лебедзева, У.Ф.Папсуевіч, К.Д.Сямёнава. Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі 9 чалавек, у т.л. кіраўнік групы ордэн Чырвонай Зоркі.

Падпольная група А.І.Ліпці

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да верасня 1943 г. ў пральні, якая абслугоўвала вайсковыя часці акупантаў. Кіраўнік А.І.Ліпці, у доме якога (па вул. 12-й Гарадоцкай, д. 20/10) была канспіратыўная кватэра. У складзе групы: С.Сюдаболь, В.Чу Чалін, З.Шаракова (Матвіевіч) і інш. Па квітках на бялізну яны вызначалі нумары вайсковых часцей, месцы іх дыслакацыі, прыкладную колькасць, час прыбыцця і выбыцця часці з пэўнага ўчастка фронту. Падпольшчыкі перапальвалі хімікатамі вялікія партыі бялізны, здабывалі для партызан зброю і бензін (толькі за адзін раз партызанам адпраўлена 17 каністраў бензіну). Група мела сувязь з партызанскім атрадам М.Ф.Біруліна цераз К.Дз.Балдачову. З прыбыццём В.З.Харужай яна разам з З.Шараковай была яе сувязной. З лета 1942 г. група Ліпці выконвала заданні армейскай разведгрупы П.А.Крылатых. Сувязнымі былі сёстры Ірына і Міра Жан Ванфу, якія перадавалі шыфроўкі Харужай адказнаму арганізатару Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б па гораду В.Р.Кудзінаву. У верасні 1943 г. гітлераўцы арыштавалі Ліпці, Чу Чаліна і Сюдаболя. У турме іх штодзённа збівалі. Сюдаболь, які дрэнна гаварыў па-руску, здаўся акупантам мала прыдатным для падпольных спраў і таму быў адпраўлены ў канцлагер, адкуль яму ўдалося ўцячы. А.І.Ліпці і В.Чу Чалін былі расстраляны.

Падпольная група М.А.Ляхоўскага

Дзейнічала ў Віцебску з верасня 1941 г. да снежня 1943 г. Вылучылася з падпольнай групы М.Я.Нагібава. Аб'ядноўвала 13 чалавек. Кіраўнік М.А.Ляхоўскі. У складзе групы яго сястра В.А.Ляхоўская (Навумчык), С.У.Воранаў, Г.П.Жаўрыд, М.Жыгуноў, А.Гагарын, Я.Г., В.Г. і В.С.Сцяпанавы, А.А.Залецкі, Я.І.Лазоўскі, І.Ц.Куракоў, В.Іваноў. Патрыёты здабывалі зброю, дакументы, парушалі сувязь, накіроўвалі ў партызаны ваеннапалонных і мясцовых жыхароў, стваралі аварыйныя сітуацыі на чыгуначным

В.А.Прудніка ва.

А.І.Ліпці.

З.А.Шаракова.

І.Жан Ванфу.

вузле, падсыпалі пясок у буксы вагонаў і інш. У дыверсіях прымалі ўдзел усе члены групы. Ляхоўская, В.С.Сцяпанава, Лазоўскі, Іваноў дастаўлялі ў горад тол і міны, Залецкі, Іваноў, Воранаў, якія працавалі на вугальным складзе, падкідвалі замаскіраваныя пад вугаль міны, падкладвалі міны пад прыстанцыйныя баракі, дзе чакалі адпраўкі нямецкія салдаты. У кастрычніку – лістападзе 1943 г. Жыгуноў, Лазоўскі, Жаўрыд, Іваноў устанавілі на праходзячых цягніках 11 мін, якія спрацавалі ў дарозе. У кастрычніку 1943 г. Іваноў падклаў міну вагой 4 кг пад вагон з ракетамі. Браты Сцяпанавы займаліся разведкай у Віцебску і на ст. Лосвіда, куды па даручэнні Нагібава пераехаў Я.Г.Сцяпанаў. У сярэдзіне лістапада 1943 г. 28 віцебскіх падпольшчыкаў, у т.л. з групы Ляхоўскага, на чале з Нагібавым выйшлі з Віцебска і сустрэліся з наступаючымі танкавымі часцямі Чырвонай Арміі. Падпольшчыкі, якія добра ведалі мясцовасць, аказвалі дапамогу чырвонаармейцам; на працягу 16 дзён яны трымалі абарону ў раёне вёсак Цыганы – Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна. Я.Г.Сцяпанаў з групай танкістаў падарваў стрэлачныя пераводы на ст. Лосвіда. В.Г.Сцяпанаў выконваў ролю правадніка, некалькі разоў з армейскай разведкай браў «языка». Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі многія падпольшчыкі пайшлі на фронт. Загінулі С.У.Воранаў, Г.П.Жаўрыд, М.А.Ляхоўскі. У Віцебску ў гонар падпольшчыкаў М. і В. Ляхоўскіх, С.Воранава, А.Залецкага на будынку сярэдняй школы № 18, дзе яны вучыліся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Падпольныя групы П.К.Ляхоўскага і А.В.Міхайлоўскай — Р.М.Гіро

Група настаўніка П.К.Ляхоўскага («Васіль») налічвала 35 чалавек і дзейнічала ў в. Старое Сяло са жніўня 1941 г. да чэрвеня 1944 г.

Група (14 чалавек) А.В.Міхайлоўскай («Оля»), потым Р.М.Гіро («Іван Іванавіч») вяла работу ў в. Лётцы са снежня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. У склад абодвух груп уваходзілі пераважна настаўнікі і вучні мясцовых школ.

У снежні 1941 г. ў в. Старое Сяло прыбыў М.А.Шпакаў, студэнт Маскоўскага авіяцыйнага тэхналагічнага інстытута, які ўключыўся ў актыўную падпольную работу і да ліпеня 1942 г. быў фактычным кіраўніком Старасельскай групы, у якую ўваходзілі яго бацька Андрэй Ільіч, маці Аляксандра Ільінічна і сястра Ніна Андрэеўна Шпакавы, М.К. і П.К.Ляхоўскія, Я.А. і І.П. Галубоўскія, Е.П.Барчанка, яго дочкі Надзея і Тамара, Ф.В.Ігнаценка, Я.Р.Булатаў, С.П.Гувеннікаў, урач М.Д.Вінічэнка, С.І.Раміцан, З.К.Багданава, А.М.Іспенкоў, медсястра М.А.Ганчарова і яе сястра Вольга, студэнт В.В.Глебаў, Т.В.Сініцына і інш. 20.4.1942 г. пад Віцебск прыбыла група армейскай разведкі на чале з Ю.С.Рудаковым («Жорж», «Ягор»). З дапамогай Шпакава разведчыкі за кароткі тэрмін устанавілі сувязь з падпольнымі групамі, якія дзейнічалі ў Віцебску і яго наваколлі. У групу Міхайлоўскай – Гіро ўваходзілі жонка Гіро Ефрасіння Андрэеўна, Р.С.Тумановіч, А.С.Скуратава (Быхаленка), М.Г. і Г.К. Быкавы, Г.Ф.Гусакова, І.Ф.Макавецкая, Л.С.Быкаў («Пець-

ка»), Г.А.Мацецкая (Залатарова), Л.С.Скуратава (Жызнеўская). Прыстанцыйныя вёскі Старое Сяло і Лётцы размешчаны каля чыгункі Віцебск—Полацк, на якой гітлераўцы забяспечвалі групу армій «Цэнтр». У задачу падпольшчыкаў уваходзіла назіранне за рухам па чыгунцы і шашы, за гарнізонамі, размешчанымі па гэтых шляхах ад Віцебска да Шуміліна. Падпольшчыкі збіралі таксама зброю для партызан, у в. Старое Сяло на кватэры А.С.Баброўскага прымалі зводкі Саўінфармбюро, вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва. Група ў Лётцах назірала за домам адпачынку «Лётцы», дзе размяшчаліся штабы нямецкіх вайсковых часцей і знаходзіліся на адпачынку розныя спецпадраздзяленні, трымала ў полі зроку варожы аэрадром каля в. Княжыцы. Падпольшчыкі склалі план Лётцаў, на якім былі пазначаны ўмацаванні, агнявыя кропкі, штабы і інш. Іспянкоў і К.Багданаў забяспечвалі партызан і разведчыкаў бланкамі розных дакументаў, Вінічэнка і Ганчарова — медыкаментамі і перавязачным матэрыялам, пад выглядам хворых выратоўвалі ваеннапалонных, арыштаваных сувязных і перапраўлялі іх да партызан. З мая 1942 г. разведінфармацыя ад падпольшчыкаў стала паступаць Віцебскім падпольным райкомам КП(б)Б і ЛКСМБ. З мэтай удасканалення падпольнай работы ў ліпені 1942 г. Шпакаў перабраўся ў Віцебск, уладкаваўся на працу ў зброевую майстэрню акупантаў, устанавіў сувязі з падполлем. Сувязь з Ю.С.Рудаковым ажыццяўлялася праз Скуратаву, Тумановіч, Т.Е.Барчанка (Прудніка-ву), Л.С.Быкава. У чэрвені абедзве групы перададзены разведгрупе М.Р.Яфімава («Армейца»). У лютым 1944 г. жыхары в. Старое Сяло былі выселены ў Бешанковіцкі раён, дзе Ляхоўскі і падпольшчыкі працягвалі работу, астатнія пайшлі да партызан. М.А.Шпакаў загінуў на тэрыторыі Усходняй Прусіі ў складзе разведгрупы Чырвонай Арміі. У партызанах загінулі: камандзір атрада І.П.Галубоўскі, Н.Е.Барчанка, В.В.Глебаў, Т.В.Сініцына. Фашысты расстралялі Ф.Баброву, К.Багданава, М.А.Ганчарову. Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі 11 чалавек.

Падпольная група Т.А.Марудава

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да чэрвеня 1944 г. Налічвала 19 чалавек. Кіраўнік Т.А.Марудаў («Федзя»). У красавіку 1942 г. Марудаў па заданню разведчыка М.А.Шпакава з армейскай разведгрупы Ю.С.Рудакова («Жорж», «Егор») стварыў у горадзе падпольную групу, у якую ўвайшлі былыя ваеннапалонныя М.Е.Станкееў («Бялоў»), Г.М.Озераў, А.П.Скуман («Косця»), мясцовыя жыхары Н.Ф.Лынчанка («Цёця Маша»), В.В.Бараноўская, М.М.Бараноўская («Бабуля Шура»), Э.В.Бараноўская («Зоя») А.Е.Словас, В.П.Марудава, М.І.Гарадзецкая, Л.П.Цыганова («Галя») і інш. Сувязнымі былі дзеці Лынчанка — Коля, Дзіна і Эма, Галя Марудава. Сувязь са спецгрупай Рудакова ажыццяўлялася праз Н.Ф.Лынчанка, сувязных спецгрупы Е.С.Спірыдонаву (Піражкову) і Паўліка Сакалоўскага. Звесткі з в. Загор'е ад Скумана прыносіла яго пляменніца Ала Аўсеева. Стрэлачнік Озераў, сцэпшчык вагонаў Словас, М.М.Бараноўская і

Канспіратыўная кватэра падпольнай групы Т.А.Марудава (вуліца імя акадэміка Паўлава, 5).

Скуман назіралі за перавозкамі па чыгунцы. Станкееў збіраў звесткі аб умацаваннях праціўніка на левым беразе Віцьбы па Смаленскай шашы. У жніўні 1942 г. ён быў арыштаваны і накіраваны ў лагер ваеннапалонных. Там ён выявіў групу варожых лазутчыкаў, якіх падрыхтавалі для засылкі ў савецкі тыл, дзе яны былі абясшкоджаны. Ваганава, якая працавала на хлебазаводзе, дапамагала вызначаць прыбываючыя ў горад вайсковыя часці. Э.В.Бараноўская ў маі 1942 г. ўладкавалася рахункаводам у кантору гарнізоннага склада, які меў аддзяленні ў Гарадку, Лёзна, Невелі. Праз яе праходзілі ведамасці на выдачу харчавання і фуражу воінскім часцям, у якіх пазначаліся нумар часці і месца размяшчэння, колькасць людзей і коней. У сакавіку 1943 г. яна здабыла звесткі аб размяшчэнні штаба 3-й танкавай арміі і іншых злучэннях праціўніка. Сястра Бараноўскай Вікторыя і іх цётка Марыя Мікалаеўна з вакна сваёй кватэры сачылі за рухам па чыгунцы на Смаленск і ў зваротным кірунку. У лютым 1943 г. арыштаваны і закатаваны Г.М.Озераў

Н.Ф.Лынчанка («Цёця Маша»).

і Н.Ф.Лынчанка, Паўлік Сакалоўскі, у кастрычніку адпраўлены ў канцлагер і Марудаў. Групу ўзначаліла Э.В.Бараноўская. Уладкаваўшыся прыбіральшчыцай у кантору сувязі, яна вывучала сістэму сувязі ворага і перадавала звесткі ў спецгрупу. Сем'і Бараноўскіх і Марудавых заставаліся ў горадзе да вызвалення. 13 чалавек з групы атрымалі дзяржаўныя ўзнагароды.

Падпольныя групы Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі

Дзейнічалі са жніўня 1941 г. да лютага 1943 г. на чыгунцы ў Віцебску. Аб'ядноўвалі 24 чалавекі, пераважна моладзь, вучняў 20-й і 25-й сярэдніх школ горада. Кіраўнікі: Ф.К.Мехаў і А.А.Гагуля. Спачатку групы дзейнічалі пад кіраўніцтвам Мехава, а з кастрычніка 1942 г. — самастойна, але ў цесным кантакце. Да канца 1941 г. ў групе Мехава працавалі: У.Ю.Баталкін, В.К.Багданава (Аляксандрава), В.А.Гагуля, І.М.Ерафееў («Цыганок»), А.М.Івашчанка, І.М. і А.М. Іоткі, У.М.Кузнечык, Дз.Ф.Тарасаў, С.М.Шалаеў, Ф.М.Шалаева (Несцярэнка), В.А.Шніпаў, К.І.Шутаў, сем'і Лапавухавых, Мехавых і Шутавых. Асноўнымі канспіратыўнымі былі кватэры Шалаевай (вул. 14-я Гарадоцкая, 19) і Шніпава (вул. 22-я Гарадоцкая, 7). У маі 1942 г. Мехаў, Шутаў і Гагуля звязаліся з аператыўна-чэкісцкай групай А.П.Максіменкі, а праз яе — з Віцебскім падпольным гаркомам КП(б)Б. Абедзве групы займаліся разведкай і дыверсіямі на чыгуначным вузле. Падлеткі Ерафееў і Тарасаў назіралі за рухам цягнікоў, разгрузкай і пагрузкай, запаміналі надпісы на вагонах, аўтамашынах і цягачах. Гагуля і У.Ф.Няглін здабывалі дакументы для групы Максіменкі. Знаёмства з паліцаямі дапамагло Івашчанку ўвосень 1942 г. прадухіліць правал у групе. Шутаў і Мехаў, працуючы ў аўтарамонтных майстэрнях, разам з ваеннапалоннымі неаднаразова псавалі рухавікі аўтамашын і танкаў, вывелі да партызан 6 ваеннапалонных. Летам 1942 г. Мехаў, Гагуля, Шутаў і І.М.Іотка замініравалі чыгунку каля в. Грышаны, пусцілі пад адхон паравоз і некалькі вагонаў з боепрыпасамі. У канцы верасня падпольшчыкі магнітнымі мінамі ўзарвалі эшалон з жывой сілай і баявой тэхнікай праціўніка. За верасень—кастрычнік 1942 г. вывелі са строю 20 аўтамашын, 23 веласіпеды, 2 лентачныя транспарцёры, выкралі 300 камплектаў абмундзіравання, 40 коўдраў, 600 кг сметанкавага масла, 500 кг цукру, 250 л гарэлкі, 10 т хлеба, 10 скрынак мыла. У пачатку снежня 1942 г. былі арыштаваны А.А.Гагуля, В.А.Гагуля, П.В.Гурын, І.М.Ерафееў, У.М.Кузнечык, А.Н.Лапавухаў, К.Я.Лапавухава, С.М.Шалаеў, В.А.Шніпаў. 23.12.1942 г. ўсе, апрача Ерафеева (уцёк), расстраляны. Тыя, што засталіся на волі, працягвалі барацьбу. 9 снежня ўзарвалі чыгуначны мост цераз вуліцу Яноўскую (зараз вул. Мічурына); 21 снежня за 4 км ад горада — воінскі эшалон з аўтамашынамі і харчаваннем. У

дзень пакарання сваіх таварышаў патрыёты адправілі пад адхон эшалон працiўніка, у студзені 1943 г. — яшчэ 2. У час карнай экспедыцыі нямецка-фашысцкіх акупантаў у лютым 1943 г. загінулі І.М.Іотка, А.А.Іваноў, у маі — Ф.К.Мехаў. Узнагароджаны Ф.К.Мехаў ордэнам Чырвонага Сцяга, А.А.Гагуля медалём «За адвагу».

Падпольная група М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова

Дзейнічала з лістапада 1941 г. да жніўня 1943 г. Налічвала 13 чалавек, пераважна медработнікаў. Кіраўнікі: былы загадчык кафедры судовай медыцыны Віцебскага медінстытута М.Л.Мурашка і ўрач Ветрынскай райбальніцы Р.Ф.Махноў. Як загадчык аддзела аховы здароўя гарадской управы Мурашка ўладкаваў на работу ў лячэбныя ўстановы горада патрыятычна настроеных людзей: інспектарам санстанцыі прызначаны Махноў, галоўным урачом гарадской бальніцы (па вуліцы Лабазнай, цяпер Чайкоўскага) — Н.І.Чарткоў, урачамі М.Б.Мурашка, Л.Я.Пасвянскі, на здраўпункце цагельнага завода — Г.І.Багданава, В.І.Турок, на Бараўлянскім урачэбным участку і ў Лёзненскай бальніцы — У.М.Велічэнка і І.І.Папоў. Карыстаючыся сваім службовым становішчам, Махноў наведваў лагеры ваеннапалонных, выяўляў камандзіраў і палітработнікаў Чырвонай Арміі, найбольш слабых чырвонаармейцаў і пад выглядам тыфозна хворых размяшчаў іх у бальніцах горада. Вясной 1942 г. Мурашка і Махноў прадухілілі знішчэнне тыфозных хворых у Веліжы. 12.3.1942 г. гітлераўцы вывезлі з Веліжа 24 ваеннапалонных, у т.л. цяжка параненага палкоўніка, якіх размясцілі ў бальніцах па вуліцы Лабазнай і на Маркаўшчыне. У красавіку 1942 г. члены падпольнай групы К.С.Акаловіч з дапамогай падпольшчыкаў групы Мурашкі — Махнова вывелі ваеннапалонных да партызан. У студзені 1943 г. Махноў перайшоў працаваць у тыфозную бальніцу ў в. Якуціна. Тут пад выглядам тыфозных хворых змяшчалі ваеннапалонных, арыштаваных партызан і падпольшчыкаў, моладзь, якой пагражаў угон у Германію. Група забяспечвала медыкаментамі, перавязачным матэрыялам, хірургічным інструментам партызан Сіроцінскага раёна, праз сувязную В.П.Брухнову — партызан брыгады «Аляксея» (А.Ф.Данукалава), праз П.І.Гаўберг-Іванову — падпольную групу Л.Д.Бярозкінай, праз Н.П.Круглову, Д.Е.Цяпкіну, М.Д.Вінічэнка — падпольную групу М.К.Свечкінай. Па заяўках урача Папова (з Лёзненскай бальніцы) М.К.Свечкіна і Н.І.Воранава двойчы атрымлівалі вялікую колькасць медыкаментаў з аптэчнага склада ў Віцебску. З інфекцыйнай бальніцы медыкаменты прыносіў урач І.А.Прудзікаў. У жніўні 1943 г. гітлераўцы арыштавалі і пасля катаванняў расстралялі В.П.Брухнову, Р.Ф.Махнова, М.Л.Мурашку, у лістападзе загінула М.Б.Мурашка. Махноў, Велічэнка і Чаткоў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

Падпольная група М.Я.Нагібава

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да сакавіка 1944 г. Аб'ядноўвала 25 чалавек. Кіраўнік М.Я.Нагібаў («Смелы»). У групу ўваходзілі: Т.С.Шчукіна (намеснік кіраўніка, «Скромная»), А.Т.Граўжынас, С.Ф.Дарагінскі, М.Д.Зайцаў, В.І.Індрушонак (Кірыленка), І.Л. і С.І.Калініны, А.В.Кавалёў, У.М.Лазука, В.М.Лісіцкая, Н.І.Міхайлоўская, М.Г.Навасельскі, А.Пятроў, З.Ц.Пірожнікава, І.А. і М.М.Табуновы, А.Н. і Н.Ф.Цярэнцьевы, У.М. і Я.І.Тычыніны, Я.І.Хмялёў, У.П.Шарцаў, А.Р. і Я.А.Юшчанка. З першых дзён акупацыі Віцебска члены групы збіралі зброю, узрыўчатку, вялі разведку, наладжвалі і ўмацоўвалі сувязі з жыхарамі горада. На канспіратыўнай кватэры Тычынінай (вул. 17-я Гарадоцкая, 6) Нагібаў арганізаваў навучанне падпольшчыкаў мінна-падрыўной справе. Вясной 1942 г. група наладзіла сувязі з 1-й Беларускай партызанскай брыгадай і адказным арганізатарам Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б па гораду В.Р.Кудзінавым. Падпольшчыкі ахапілі разведкай амаль увесь фашысцкі гарнізон, ажыццяўлялі дыверсіі на чыгуначным вузле, лініях Віцебск — Гарадок, Віцебск — Полацк. Толькі за кастрычнік — снежань 1942 г. на чыгункі разбіты 3 паравозы, 39 вагонаў, 36 цыстэрнаў з бензінам, узарваны шашэйны мост у раёне чыгуначнай станцыі Залучча. У кастрычніку 1942 г. ў прыгарадзе Віцебска

Нагібаў і Шчукіна падарвалі цягнік і 22 вагоны. У ноч на 26 лістапада група пусціла пад адхон 2 ваенныя эшалоны, у снежні — паравоз і 12 вагонаў. Група ўзаемадзейнічала з падпольнымі групамі Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі, П.С.Смірнова, М.А.Ляхоўскага, перадавала партызанам і армейскім разведгрупам каштоўныя звесткі, ажыццяўляла сувязь з падпольным гаркомам партыі, праводзіла ў тыл праціўніка армейскіх разведчыкаў, давала ім свае базы. З 18.11. да 4.12.1943 г. падпольшчыкі разам з савецкімі танкістамі і іншымі падпольшчыкамі трымалі абарону на ўчастку вёсак Цыганы — Малыя Стайкі Гарадоцкага раёна, знішчылі 20 гітлераўцаў і іх памагатых, 19 захапілі ў палон. Дзейнічала да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі. Кіраўнік групы ўзнагароджаны ордэнам Чырво-

М.Я.Нагібаў.

нага Сцяга і медалём «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені, Т.С.Шчукіна, З.Ц.Пірожнікава і У.М.Лазука — ордэнам Чырвонай Зоркі, 6 чалавек — медалямі.

Падпольная група А.А.Сакаловай

Дзейнічала са снежня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. Аб'ядноўвала 12 чалавек. Кіраўнік А.А.Сакалова («Цёця Лена», «Пявуння»). У групу ўваходзілі яе муж А.А.Сакалоў, сястра Н.А.Пашкевіч-Уданоўская, Г.С.Яраноўская, а таксама Л.М.Гнядоўская, М.І.Іваноў, А.Ц.Капцель, І.Ц.Кузьмянкоў, М.Р.Лазарэўскі, бацька і дачка А.К. і М.А.Левановічы, Яўген Матылёў. Група дзейнічала сумесна з другімі падпольнымі групамі, трымала сувязь з Віцебскім падпольным гаркомам КП(б)Б, з партызанскімі брыгадамі 1-й Беларускай і «Аляксея» (А.Ф.Данукалава), з аператыўна-чэкісцкай групай А.П.Максіменка. На сваёй кватэры (вул. 2-я Заводская, 12) Сакаловы прымалі сувязных, партызан, армейскіх разведчыкаў, ваеннапалонных для адпраўкі да партызан, сюды сцякалася інфармацыя. Бацька і дачка Левановічы вялі разведку, хадзілі на сувязь, выводзілі з горада ваеннапалонных, 19.1.1943 г. яны былі схоплены і расстраляны. У верасні 1943 г. Матылёў вывеў са строю ваданапорную вежу на аэрадроме. Пашкевіч-Уданоўская рыхтавала ваеннапалонных, якія працавалі на цагельным заводзе, да адпраўкі ў партызаны. Яраноўская, работніца сталовай цагельнага завода, забяспечвала падпольшчыкаў і партызан харчаваннем. У канцы верасня 1943 г. на кватэры Сакаловых правялі вобыск. Арыштаваная Яраноўская была закатавана, Сакалоў адпраўлены ў лагер смерці. Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі 5 чалавек, у т.л. кіраўнік групы.

Падпольная група Саладухіных

Дзейнічала ў Віцебску з вясны 1942 г. да сакавіка 1943 г. У групу ўваходзілі сёстры Ганна, Галіна, Марыя і Зінаіда Саладухіны, іх маці Ганна Міхайлаўна. Дом Саладухіных знаходзіўся побач з ветэрынарным інстытутам, дзе у час вайны размяшчалася палявая камендатура і жылі ваеннапалонныя, якія яе абслугоўвалі. У пачатку 1942 г. Саладухіны ўстанавілі сувязь з партызанамі брыгады «Аляксея» (А.Ф.Данукалава), выконвалі іх заданні. Сёстры Саладухіны, камсамолка-падпольшчыца В.Г.Дунке ў чэрвені 1942 г. ажыццявілі пабег на аўтамашыне 6 ваеннапалонных. Сёстры ўстанавілі сувязь з падпольнай групай Л.Дз.Бярозкінай, атрымлівалі ад яе і распаўсюджвалі лістоўкі. Пасля правалу групы Бярозкінай у верасні 1942 г. Саладухіны пакінулі горад. Ганна і Галіна сталі партызанскімі разведчыцамі. Зінаіда і Марыя 11.3.1943 г. былі схоплены гітлераўцамі і адпраўлены ў лагер СД, адкуль збеглі і ў студзені 1944 г. пайшлі ў Чырвоную Армію. Тры сястры Саладухіны ўзнагароджаны медалямі.

Падпольная група М.К.Свечкінай

Дзейнічала ў Віцебску ў Стадыённым пасёлку з верасня 1942 г. да лістапада 1943 г. Аб'ядноўвала 6 чалавек. Кіраўнік М.К.Свечкіна (Блахіна). У групу ўваходзілі яе браты Анатоль і Іван, іх жонкі О.С. і А.К.Свечкіны, Н.І.Воранава. Дзейнічала ў цеснай сувязі з групамі А.Я.Белахвосцікава, А.І.Кірыленкі (дзейнічала там жа), М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова, Т.А.Ламаносенкі. Была звязана з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава). У доме Свечкіных у пасёлку Качэргі захоўваліся ўзрыўчатка, міны, начавалі і адпачывалі разведчыкі і сувязныя. Дыверсійны матэрыял і літаратуру ад партызан прыносіла 16-гадовая Яўгенія Калабанава. У брыгаду патрыёты рэгулярна дастаўлялі разведдадзеныя, медыкаменты, прыводзілі да партызан ваеннапалонных. Свечкіных забяспечвалі медыкаментамі ўрачы Р.Ф.Махноў, І.А.Прудзнікаў і яго жонка В.А.Сянькоўская, медсястра К.Аляксеева і санітарка Ф.Аляксеева. Свечкіны разам з Махновым склалі і перадалі партызанам схему размяшчэння абарончых збудаванняў, зенітных батарэй і дыслакацыі вайсковых часцей праціўніка ў Віцебску. М.К.Свечкіна, А.К.Свечкін і І.К.Свечкін былі арыштаваны і 16.11.1943 расстраляны. У Віцебску імем Свечкіных названа вуліца, на якой яны жылі, на доме № 1 у 1968 устаноўлена мемарыяльная дошка. Усе 6 членаў групы ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

Падпольная група І.А.Сідарэнка-Пабудзея

Дзейнічала ў в. Бабінічы Віцебскага раёна з канца 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Налічвала 7 чалавек. Кіраўнік І.А.Сідарэнка-Пабудзей («Бальшак»). У складзе групы яго жонка, загадчык бальніцы Т.М.Пабудзей, медсястра Л.М.Клімянкова, яе сястра Л.М. і Т.М.Клімянкова (Манушына), Л.М. і В.Л. Клімянкова, І.Д.Грубінаў, яго дачка Н.І.Грубінава (Рыжова).

М.К.Свечкіна з братам.

У 1937—41 гг. Ігнат Антонавіч Сідарэнка-Пабудзей сядзеў у турме. Як вядома, такіх людзей акупанты падбіралі ў свой адміністрацыйны апарат. Падабралі і яго. Але тут яны пралічыліся, ён застаўся адданым Радзіме. Выкарыстоўваючы сваё становішча бургамістра воласці, Сідарэнка-Пабудзей з дапамогай членаў групы ўкрываў моладзь ад угону ў Германію, зрываў пасылку людзей на будаўніцтва розных абарончых збудаванняў, загатоўку прадуктаў харчавання, збор цёплых рэчаў для акупацыйнай арміі і г.д. Падпольшчыкі хавалі ў бальніцы ваеннапалонных, асоб яўрэйскай нацыянальнасці (Сідарэнка-Пабудзей выдаваў дакументы, а яго жонка — даведкі аб хваробах). У 1942 г. падпольшчыкі звязаліся з 1-й Беларускай партызанскай брыгадай, армейскімі разведгрупамі, у 1943 г. — з Віцебскім падпольным гаркомам КП(б)Б, перадавалі ім звесткі аб перамяшчэнні войск па шашы Віцебск—Веліж, папярэджвалі партызан аб планах карнікаў. Раз-пораз усю пошту, якая паступала ў валасную ўправу, Сідарэнка-Пабудзей перадаваў партызанскаму кіраўніцтву для прагляду і адбору патрэбных дакументаў, забяспечваў партызан бланкамі пашпартоў, у сваёй воласці выдаў дакументы ўсім партызанскім сем'ям. Група працавала ў складаных умовах: праз вёску па шашы ішло кругласутачнае перамяшчэнне войск ворага, вакол размяшчаліся буйныя гарнізоны праціўніка. Побач, на процілеглым беразе Заходняй Дзвіны, пачыналася Суражская партызан-

ская зона. Праз зону ажыццяўлалася сувязь партызан з падполлем горада. Група была звязана з падпольнымі групамі В.С.Кулагінай, І.А.Бекішава, М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова. У кастрычніку 1943 г. падпольшчыкі папярэдзілі партызан і часці Чырвонай Арміі аб тым, што прадбачыцца канцэнтрацыя войск ворага ў раёне Мікалаеўскага і Бабініцкага сельсаветаў, аб будаўніцтве пантоннага моста цераз Заходнюю Дзвіну, які, дзякуючы падпольшчыкам, быў знішчаны савецкай авіяцыяй. Група дзейнічала да чэрвеня 1944 г., дня вызвалення горада. І.А.Сідарэнка-Пабудзей і яго жонка ўзнагароджаны медалямі.

Падпольная група П.С.Смірнова

Дзейнічала з ліпеня 1941 г. да студзеня 1943 г. Аб'ядноўвала 11 чалавек. Кіраўнік П.С.Смірноў («Крэмнеў», «Медны»). У складзе групы былі Р.Л.Голубеў, М.П.Захарава, Т.П., Е.В. і І.І.Нікіціны, Л.Я.Пятроў, В.В. і Н.В. Чыстабаевы, І.Я.Якімаў і яго жонка А.С.Якімава («Бойкая»). Смірноў, апынуўшыся ў акружэнні, з дапамогай мясцовых патрыётаў здабыў дакументы, атрымаў патэнт на адкрыццё абутковай майстэрні па вул. 17-й Гарадоцкай, якая стала канспіратыўнай кватэрай для падпольшчыкаў, партызанскіх сувязных, армейскіх разведчыкаў. У тайніках кватэры захоўваліся зброя, узрыўчатка, літаратура. Смірноў арганізаваў разведку ваенных аб'ектаў ворага ў Віцебску і яго наваколлі і наносіў іх на план горада. У студзені 1943 г. ён перадаў гэты план Віцебскаму падпольнаму абкому КП(б)Б. Група ўдзельнічала ў дыверсіях на чыгунцы і шашэйных камунікацыях. У канцы 1942 г. на перагоне Віцебск — Княжыца падпольшчыкі пусцілі пад адхон паравоз і 2 платформы з ваенным грузам, прыпынілі рух на 10 гадзін, спалілі 6 цыстэрнаў з бензінам, нямецкі эвакапункт. Многія дыверсіі праводзіліся сумесна з падпольнымі групамі М.Я.Нагібава, Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі. У студзені 1943 г. Смірноў і Якімавы атрымалі ў 1-й Віцебскай партызанскай брыгадзе тол для сваёй групы, які везла А.С.Якімава. Падпольшчыцу арыштавалі. На наступны дзень былі схоплены П.С.Смірноў і І.І.Нікіціна. Пасля жорсткіх катаванняў гітлераўцы расстралялі Г.Л.Голубева, М.П.Захараву, І.І.Нікіціну, П.С.Смірнова, В.В.Чыстабаеву, А.С.Якімаву. У баях з ворагам загінуў І.Я.Якімаў.

У Віцебску на доме № 1 па вул. Ленінградскай, у якім жыў П.С.Смірноў, устаноўлена мемарыяльная дошка. 4 члены групы ўзнагароджаны, у т.л. Л.Я.Пятроў ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга, П.С.Смірноў — медалём «За адвагу».

Падпольная група Е.С.Спірыдонавай

Дзейнічала ў в. Трыніўкі Віцебскага раёна і Віцебску з ліпеня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. Аб'ядноўвала 7 чалавек. Кіравала групай камсамолка, былая работніца панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ Е.С.Спірыдонава («Дуся», «Соня»). У групу ўваходзілі яе бацька Сцяпан Іванавіч, маці Марыя Сямёнаўна, сястра маці М.С.Бяляева, яе муж В.Т.Бяляеў, іх дзеці піянеры Рыгор і Пеця. З моманта акупацыі горада фашыстамі Спірыдонава з бацькамі пасялілася ў в. Трыніўкі ў доме Бяляевых, які стаў месцам канспіратыўных сустрэч падпольшчыкаў і сувязных. З лістапада 1942 г. група дзейнічала пад кіраўніцтвам армейскіх разведгруп Ю.С.Рудакова («Ягора», «Жоржа»), з чэрвеня 1943 г. — М.Р.Яфімава («Армейца»), выконвала заданні 1-й Віцебскай партызанскай брыгады, Віцебскага падпольнага гаркома КП(б)Б. Члены групы збіралі разведінфармацыю, дастаўлялі падпольшчыкам Віцебска міны, тол, лістоўкі, газеты, выводзілі з горада людзей. У 1943 г. пры выкананні задання Спірыдонаў быў затрыманы фашыстамі і пасля цяжкіх пабояў памёр. У сакавіку 1943 г. карнікі расстралялі Рыгора і Пецю Бяляевых, у маі — В.Т.Бяляева. Е.Спірыдонава падтрымлівала сувязь з групамі І.А.Бекішава, Т.А.Марудава, Б.С.Шарэнда, А.Я.Белахвосцікава і працавала над стварэннем новых падпольных груп. Яна стварыла падпольную групу І.С.Вялава. У канцы 1942 г. пры яе ўдзеле створана падпольная група на фанерным заводзе, якую ўзначалілі Р.І.Пушкароў, потым В.Ц.Шафранскі («Ігар»). У выніку дыверсій увосень 1943 г. завод быў поўнасцю разбура-

ны. Калі члены гэтай групы аказаліся пад падазрэннем, большасць з іх Спірыдонава вывела да партызан. Пра Е.С.Спірыдонаву яшчэ ў вайну хадзілі легенды як аб вельмі смелай і знаходлівай разведчыцы. Быў выпадак, калі адна армейская група ўкрала яе ў другой. Але Дуся працавала на ўсіх, для Радзімы. Е.С.Спірыдонава ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені, Пушкароў і Шафранскі — медалямі.

Падпольная група В.Дз.Шалуха

Дзейнічала з ліпеня 1941 да кастрычніка 1943 г. ў в. Застадолле Сенненскага раёна і пасёлку Тарнага камбіната Віцебска (з чэрвеня 1942 г.). Налічвала 19 чалавек. Кіраўнік — настаўніца В.Дз.Шалуха. У групу ўваходзілі настаўнікі В.В.Абазоўская (Каралёва), А.А.Малчанаў, Л.М.Аўсянкіна (Хадарэнка), К.І.Патапенка, М.Т.Цвяткова (Маконіна), студэнткі А.В.Пятніцкая, В.Дз.Сідарэнка. Актыўна дапамагалі таксама А.М.Аўсянкіна (Юргілявічус), У.В.Пятніцкі, В.А.Пятніцкі, В.С.Войціхава, З.А.Галыня (Васілеўская), М.Ц.Кавалкіна, А.Дз.Сярогіна, М.Дз.Чач і інш. Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партызанскай брыгадай «Аляксея» (А.Ф.Данукалава): збіралі для партызан зброю і боепрыпасы, забяспечвалі іх медыкаментамі, распаўсюджвалі сярод насельніцтва звесткі Саўінфармбюро, вялі разведку. Члены групы, якія дзейнічалі ў вёсцы, выконвалі ролю сувязных і разведчыкаў. Пераважная ўвага ўдзялялася дыверсійнай рабоце, збору звестак аб віцебскім гарнізоне. Сувязь з партызанамі ажыццяўлялі Шалуха, М.Цвяткова (Махоніна), Л.М.Аўсянкіна, В.Дз.Сідарэнка. Праз іх перадаваліся ў Віцебск заданні партызанскага камандавання, лістоўкі. Вялікую каштоўнасць для камандавання Чырвонай Арміі меў план Віцебска з нанесенымі на ім ваеннымі аб'ектамі ворага, які перадала ў брыгаду Шалуха. Падпольшчыкі ўстанавілі кантакт з працаваўшымі на аэрадроме чэхамі В.Крэўзігерам і В.Шмокам, далучылі іх да актыўнай антыфашысцкай дзейнасці. Крэўзігер і Шмок выводзілі са строю навігацыйныя прыборы, сістэмы энергазабеспячэння і сігналізацыі, псавалі бензабакі ў самалётах, закладвалі міны. У ліпені 1942 г. гітлераўцы расстралялі Алу, Віктара і Уладзіміра Пятніцкіх. У кастрычніку 1943 г. пад пагрозай правала ўсе члены групы, у т.л. Крэўзігер і Шмок, пайшлі ў партызаны. У ліпені 1944 г. Крэўзігер і Шмок уступілі ў 1-ы Чэхаславацкі корпус Людвіка Свободы, удзельнічалі ў вызваленні Чэхаславакіі. У маі 1944 г. пры прарыве варожай блакады загінуў А.А.Малчанаў. Кіраўнік групы В.Дз.Шалуха ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» 1-й ступені.

Падпольная група Б.С.Шарэнды

Дзейнічала з красавіка 1942 г. да кастрычніка 1943 г. Аб'ядноўвала 19 чалавек. Кіраўнік Б.С.Шарэнда («Шура»). У групу ўваходзілі: яго бацька, Савелій Спірыдонавіч, маці Хрысціна Іванаўна, жонка А.А.Шарэнда, мастакі Я.П.Барадулін, браты В.Ц. і І.Ц. Раманавы, Я.С.Трафімаў, чыгуначнікі І.Ц.Пушкароў і М.К.Быкоўскі, яго жонка медработнік Г.Г.Аляксеенка, загадчык склада панчошнатрыкатажнай фабрыкі імя КІМ А.І.Мастыка, яго жонка Н.Ц.Мастыка і інш. Група сфарміравана па ініцыятыве разведчыка М.А.Шпакава з армейскай разведгрупы Ю.С.Рудакова («Жорж», «Ягор»). Вясной 1942 г. мастакі ўзялі патэнт на адкрыццё прыватнай мастацкай майстэрні (па вул. Леніна), дзе гітлераўскія афіцэры ахвотна рабілі заказы, а гарадская ўправа выпісала мастакам пропускі на права перамяшчэння па гораду. Месцам назірання за рухам варожых войск і сустрэч з'яўлялася мастацкая майстэрня, сувязных прымалі на кватэры Шарэнда (вул. 3-я Загарадная, 20). Мастакі вызначалі род войскаў, дзе служылі заказчыкі, дастаўляючы заказы на дом, удакладнялі месцазнаходжанне часці. У жніўні 1942 г. нямецкі палкоўнік авіяцыі заказаў партрэт і пажадаў бачыць увесь працэс працы над ім, тым самым забяспечыў мастака Барадуліна пропускам для ўваходу на аэрадром. Такім жа чынам падпольшчыкі пранікалі і на чыгунку. В.Раманаў збіраў звесткі аб сістэме зенітнай абароны горада, ён жа апрацоўваў і зашыфроўваў сабраную членамі групы інфармацыю. Падпольшчыкі выраблялі

неабходныя пячаткі і штампы. Летам 1942 г. група ўстанавіла сувязь з нямецкімі антыфашыстамі з аховы лагера ваеннапалонных, якія паведамлялі патрыётам пра аблавы і праверкі дакументаў у горадзе, дапамаглі арганізаваць некалькі пабегаў з лагера, перадавалі Шарэнду гранаты і патроны. Выратаваннем ваеннапалонных з лагера займаўся Быкоўскі. Аляксеенка здабывала медыкаменты. Восенню 1943 г. з набліжэннем фронту майстэрню давялося зачыніць. Мастакі працавалі ў паўваеннай транспартнай арганізацыі «Штрала» (малявалі нумары на машынах, дарожныя ўказальнікі і г.д.), дзе мелі магчымасць назіраць за рухам вайсковага транспарту, характарам перавозак. У кастрычніку 1943 г. па распараджэнню партызан група Шарэнды выйшла з горада. 9 членаў гэтай групы сталі байцамі Лёзненскай партызанскай брыгады. Я.П.Барадулін загінуў на фронце ў 1944 г. Кіраўнік групы Б.С.Шарэнда ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, Я.П.Барадулін — ордэнам Чырвонай Зоркі, В.Раманаў і Г.Аляксеенка — медалямі.

Аўтар артыкулаў пра падпольныя групы Н.І.Дарафеенка.

Пры падрыхтоўцы артыкулаў выкарыстана таксама кн. «Витебск. Энциклопедический справочник». Мн., 1988.

Тут расстралялі віцебскіх падпольшчыкаў

Больш 20 год заставалася невядомым дакладнае месца расстрэлу актыўных удзельнікаў Віцебскага падполля (усяго каля 70 чалавек). Было вядома толькі, што недзе каля в. Гарадняны. Сярод загінуўшых былі кіраўнікі падпольных груп камуністы Аляксандр Белахвосцікаў, Васіль Вярбіцкі, Паліна Шлякава, іх сябры Мікалай Вінакураў, Сямён Бурлакоў, Пётр Іваноў, Сяргей Шалаеў, Валянцін Пахомаў, Марфа, Анатоль, Іван Свечкіны і іншыя.

У Гараднянах з вясны да восені 1943 г. размяшчалася і лютавала вядомая сваёй жорсткасцю група тайнай палявой паліцыі ГФП-703. Побач з Гараднянамі, у санаторным пасёлку Сасноўка, доўгі час размяшчаўся штаб 3-й танкавай арміі ворага, яго разведвальныя і контрразведвальныя аддзелы і службы, у суседніх вёсках — разведвальна-шпіёнскія школы, аколіцы кішэлі правакатарамі.

У Гараднянах я сустракалася з жыхарамі, распытвала, хацела расказаць жудасную праўду аб расстрэле віцебскіх падпольшчыкаў.

Доўгі час мае пошукі былі безвыніковыя. І вось аднойчы да мяне падышла немаладая жанчына, паказала на бліжэйшыя кусты, за якімі пачынаўся лес і ціха сказала, каб яе я чакала там. У лесе яна падышла да невялікай ёлачкі, дакранулася да яе, нібы прыгалубіла, зрабіла паўабарота і накіравалася да другога такога ж дрэўца. Трэцяя і чацвёртая ёлачкі стварылі квадрат.

Аказваецца, ёлачкі пасадзіла гэта жанчына. Яшчэ ў час вайны сачыла, каб яны не загінулі і разам з імі аберагала вялікую брацкую магілу ад забыцця.

Віцебскі райком партыі, адміністрацыя і партарганізацыя саўгаса «Рудакова» даволі аператыўна арганізавалі перапахаванне загінуўшых. У 4 труны беражліва ўкладзена ўсё, што засталося ад герояў, — 40 чарапоў, многія з якіх былі прабіты кулямі, з пераломанымі сківіцамі і касцямі. А падпольшчыца Вольга Свечкіна знайшла ніжнюю сківіцу свайго мужа Анатолія. Палачы, відаць, не заўважылі на ёй залатую каронку задняга зуба і яна захавалася. Па знойдзеных другіх прадметах (лыжкі, тытунёвыя каробачкі, трубкі курыльшчыкаў) родныя пераконваліся, што гэта рэшткі іх блізкіх і дарагіх людзей.

Пад жалобныя гукі аркестра прах патрыётаў перанеслі на ўпрыгожаныя зелянінай і кветкамі аўтамашыны, і жалобнае шэсце накіравалася да невялічкага кургана, побач з дарогай Віцебск — Сасноўка, дзе ўжо былі пахаваны сотні ахвяр фашызму. У гэтым кургане і знайшлі свой апошні прытулак віцебскія падпольшчыкі, пахаваныя цяпер з заслужанай імі данінай павагі. *Н.І.Дарафеенка.*

Перапахаванне віцебскіх падпольшчыкаў каля в. Гарадняны.

Падпольшчыкам Віцебска прысвечаны

Помнік камсамольцам і моладзі Чыгуначнага раёна г. Віцебска, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мемарыяльны комплекс на плошчы Перамогі ў гонар воінаў-вызваліцеляў, партызан і падпольшчыкаў.

Мемарыяльны знак па вуліцы Леніна перад будынкам краязнаўчага музея (ратуша), дзе былі павешаны многія патрыёты, у т.л. падпольшчыкі бацька і сын Калініны, Андрэй Кавалёў, Мікалай Зайцаў, Уладзімір Вінаградаў, Андрэй Канаплёў.

Мемарыяльны знак на магіле ахвяр фашызму, пераважна падпольшчыкаў, на беразе ракі Віцьба.

Мемарыяльны знак у скверы каля завода імя Камінтэрна камсамольцам Віцебска, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Мемарыяльныя дошкі: у гонар загінуўшых падпольшчыкаў — наборшчыка В.Д.Карняшонка і друкара Я.Я.Ваўчка на будынку друкарні імя Камінтэрна па вул. Шчарбакова — Набярэжная, 2;

вучням-падпольшчыкам з групы М.А.Лясхоўскага на будынку СШ № 18;

сямейнай дыверсійнай групе Вялавых у двары дзіцячага садка «Васілёк» па Маскоўскаму праспекту, 35 а;

на вуліцах Вінаградавай, 6; 7-я Куйбышава, 12, дзе ў час акупацыі былі канспіратыўныя кватэры падпольшчыкаў Я.І.Тычынінай і Г.С.Стаяковай;

у гонар падпольнай групы П.С.Смірнова па вул. Ленінградскай 42/1;

у гонар падпольнай групы медработнікаў пад кіраўніцтвам К.С.Акаловіч па вул. Леніна, 18;

у гонар падпольнай групы А.Я.Белахвосцікава (вул. Белахвосцікава, 29);

сямейнай падпольнай групе патрыётаў Свечкіных (вул. Свечкіных, 1);

на будынку 27-й сярэдняй школы (вул. Шрадэра), прысвечана нямецкаму антыфашысту Карлу Шрадэру, які дапамагаў віцебскім падпольшчыкам;

па вул. Камісара Крылова, 7. У падвалах дома знаходзілася турма СД. Тут загінулі Вера Харужая і яе сябры, многія члены падпольнай групы Грабяньковай — Лукашэнка, таміліся многія іншыя падпольшчыкі.

Помнікі:

на Смаленскай плошчы, на месцы пакарання падпольшчыкаў групы Л.Д.Бярозкінай (6 чалавек) і другіх патрыётаў;

В.З.Харужай перад будынкам школы № 31 (Маскоўскі праспект);

на брацкай магіле падпольшчыкаў на Нова-Сямёнаўскіх могілках па вул. 3-я Полацкая;

курган і абеліск на месцы перапахавання віцебскіх падпольшчыкаў на тэрыторыі прыгараднага саўгаса «Рудакова»;

абеліск ахвярам фашызму на тэрыторыі 5-га Чыгуначнага палка. *Н.І.Дарафеенка.*

Дакументы сведчаць

З НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЎ

ДАКУМЕНТ № ОКШ-684

703-я група тайнай палявой паліцыі.

Сакрэтна.

1 с. 2074-43 г. ад 28.11.43 г.

...З допыту агента Веры Аляксандравай, арыштаванай яшчэ ў чэрвені, стала вядома, што нейкая Паўліна Шлякава працягвае вельмі ўмела справу Белахвосцікава ў Віцебску. Удалося, выкарыстоўваючы названы намі пароль, звязацца з указанай Паўлінай і да моманту яе арышту, 4 лістапада, у «сумеснай» рабоце атрымаць шмат матэрыялу і пазнаёміцца з многімі асобамі яе акружэння. Унтэр-афіцэр і перакладчык Пячонкін, які ў гэтай гульні фігураваў як камандзір самастойнай разведвальна-падрыўной групы, да апошняга дня карыстаўся поўным даверам Паўліны пасля таго, як яны асабіста сустрэліся 16.8.1943 г. ў лесе каля Астроўна, дзе агентамі 703-й групы тайнай палявой паліцыі быў створаны «лагер» групы падрыўнікоў.

4 лістапада яе накіравалі ў банду пад маркай таго, што камандзір банды атрымаў загад адправіць яе ў Маскву для даклада і атрымання ўзнагароды, і па шляху арыштавалі...

(Былі арыштаваны — *Рэд.*):

1. Паліна Шлякава, працавала ў будаўнічым атраде ў Віцебску. Прызналася, што з вясны 1942 г. па загаду начальніка разведслужбы Волкава з атрада Валожына сістэматычна выконвала шпіёнскія заданні для Чырвонай Арміі і банд. Яна перадавала матэрыялы цэнтральнай службе, якой кіравалі Белахвосцікаў і Хрыпач, і дзе яна займалася сакратарскай работай па сартыроўцы, ацэнцы і далейшай перадачы сабранага матэрыялу.

Пасля таго, як быў арыштаваны Белахвосцікаў, а Хрыпач уцёк, яна самастойна ўстанавіла ў Віцебску сувязь і працавала з цэлым шэрагам асоб. Апрача таго, асабліва ў апошні час, арганізавала ўцёкі многіх асоб да бандаў. У будаўнічай арганізацыі яна ўкрала нарукаўныя павязкі і падпісныя бланкі фармуляраў. 12.11.1943 г. як агент праціўніка яна расстраляна.

2. Валянцін Пахомаў, бліжэйшы супрацоўнік Белахвосцікава і Паліны, падтрымліваў пастаянную сувязь з адной з банд, збіраў і перадаваў розныя даныя. На шляху да партызан ён быў арыштаваны і як агент ворага 10.6.1943 г. расстраляны.

3. Вера Аляксандраўна дапытана і прызналася, што са студзеня 1943 г. працавала з Белахвосцікавым. Яна прызналася, што ў асноўным была сувязной да бандытаў, а іменна, — да камандзіра банды Шчарбакова (брыгада «Аляксея»), якой на працягу месяца многа разоў перадавала зашыфраваныя даныя ад Белахвосцікава. Працавала за плату і атрымлівала за кожны пераход 50 германскіх марак. 10.6.1943 г. яна расстраляна.

4. Аляксандр Украінскі, служачы нестраявой каманды 4-га тэхнічнага матарызаванага батальёна, па меншай меры з мая 1943 г. выступаў як небяспечны прапагандыст і антыгерманскі правакатар. Ён быў схоплены з Верай Аляксандравай. Угаварыў многіх служачых у нямецкіх войсках да ўцёку ў банды, і арганізоўваў гэтыя ўцёкі спачатку з Верай Аляксандравай, а затым з Паўлінай. Свой намер перабегчы самому ў банду ён не змог ажыццявіць у сувязі з пераводам у Рудню. 17 верасня быў там арыштаваны, і ў час пераводу ў ваенны суд забіты пры спробе да ўцёкаў.

5. Іван Андрэевіч працаваў электрыкам на аўтабазе. Праз яўку ў Віцебску (вул. Заводская, 58), меў пастаянную сувязь з бандытам Бірулiным і атрымліваў ад яго выбуховыя рэчывы і міны; адначасова пастаянна накіроўваў у банду людзей.

Сухавенка атрымаў ад яго ўсяго 6 амерыканскіх магнітных мін і вялікую колькасць пяхотных мін для нібы існуючай групы падпольшчыкаў. Андрэевіч не мог быць арыштаваны, таму што яго сувязная «Галіна» і іх яўка былі раскрыты 318-й групай контрразведкі. Ён, безумоўна, уцякаў да бандытаў. (Сухавенка, у сапраўднасці В.Сухаў, агент-правакатар ГФП-703, у 1957 г. прыгавораны да смяротнай кары за здраду Радзіме і за ўдзел у шматлікіх злачынствах на тэрыторыі СССР і замежных краін — *Рэд.*)

6. Міхаіл Раманенка, стары саратнік Белахвосцікава, член партыі, былы дырэктар дрэваапрацоўчага прадпрыемства ў Заходняй Беларусі. Быў выкрыты і прызнаўся, што з мая 1943 г. атрымліваў спачатку ад Белахвосцікава, а затым ад Паўліны заданні і выконваў іх (у сапраўднасці М.Раманенка член групы А.Белахвосцікава з 1941 г. — *Рэд.*). 8.11.1943 г. ён быў расстраляны.

7. Ганна Карлаўна Хрыпач, прыбіральшчыца торфаўпраўлення ў Віцебску. Жонка вышэйназванага агента Хрыпача. Ёй было вядома, што муж быў начальнікам разведкі, яна ведала яго саўдзельнікаў, у тым ліку Казлова, дырэктара торфазавода, размешчанага паблізу Сасноўкі. Была добра інфармавана аб рабоце мужа і яго саўдзельнікаў і пасрэднічала пры перакідцы людзей да бандытаў. 13.11.1943 г. яна расстраляна.

8. Яфім Харытонаў, працаваў сумесна з Хрыпачом, Белахвосцікавым і Паўлінай. Адправі̆ўся пры дапамозе Ганны Карлаўны Хрыпач са сваімі дарослымі дзецьмі (супраць іх жадання) да бандытаў і на шляху быў арыштаваны. 11 кастрычніка ён расстраляны. Трое яго дзяцей адпраўлены на работы ў Германію.

9. Аляксандра Лявонава, перакладчыца на торфазаводзе каля Сасноўкі. Сарабро і Хрыпач падазравалі, што яна падтрымлівала сувязі з дырэктарам торфазавода Казловым, расстраляным за шпіянаж, і ведала аб яго дзейнасці. Паколькі ні гэта, ні шпіёнскую дзейнасць нельга было даказаць, яна выпушчана на свабоду.

10. Рыгор Сарабро, майстар-тарфянік, быў арыштаваны на шляху да бандытаў. Ён быў вымушаны Карлаўнай (Хрыпач) пайсці ў банду. З-за страху перад набліжэннем Чырвонай Арміі ён пайшоў. Паколькі апрача гэтага, ні ў чым нельга было абвінаваціць, яго заключылі ў лагер для адпраўкі на работы ў Германію.

11. Уладзімір Чэмірыкін, працаваў слесарам у будаўнічым атрадзе (ОТ), быў завербаваны ў бандыты Верай, якая ўпамінаецца пад лічбай 14. У сябе на кватэры яна перадавала яго сувязной, якая павяла яго далей. Чэмірыкін разам з 2 сябрамі ўкраў перад гэтым са сховішча не менш 0,5 ц выбуховага рэчыва (толу), каб перадаць яго бандытам.

12. Анатоль Старасценка, слесар будаўнічага атрада (ОТ). Гл. пад лічбай 11.

13. Андрэй Бухарын, цясляр, працаваў у будаўнічым атрадзе (ОТ). Гл. пад лічбай 11.

14. Вера Загадская, працавала ў віцебскай управе. Займалася вярбоўкай і пераводам людзей у банды. Працавала разам з названай пад лічбай 17 (Уласавай). Прызналася, што пераклала на рускую мову лістоўку «Нацыянальнага камітэта свабоднай Германіі» і распаўсюджвала яе. 13 лістапада 1943 г. яна расстраляна.

15. Ганна Сапажкова, працавала ў 187-м палявым шпіталі. Была арыштавана на шляху да бандытаў разам з названым пад лічбай 16. Завербавана Паўлінай і ведала аб яе рабоце і асобах, што акружалі яе. Накіравана ў лагер.[1]

16. Браніслаў Халімановіч, артыст беларускага народнага тэатра (створаны калабарацыяністамі — *Рэд.*), камсамолец, узяў на сябе пісьмовае абяцанне перад Раманенкам (лічба 6), працаваць разам з ім. Па яго заданню сістэматычна збіраў звесткі, у прыватнасці, аб саставе авіябазы, а таксама аб саставе царкоўнага савета і гарадской управы Віцебска, якія дружалюбна ставіліся да немцаў. 12 лістапада 1943 г. ён расстраляны.

17. Марыя Уласава, дачка названага пад лічбай 20, працавала на кухні 1-й роты 15-га матарызаванага батальёна сувязі ВПС. Вельмі ўмела вербавала і арганізоўвала людзей, што варожа ставіліся да немцаў. Яна часта праводзіла іх да партызан. Нягледзячы на тое, што працавала ў нямецкай часці, адносілася да немцаў варожа і з нянавісцю. 11.11.1943 г. расстраляна.

18. Іосіф Шакута, працаваў у Віцебскай гарадской управе, быў звязаны з названым пад лічбай 20 Уласавым і яго людзьмі. Меў пры сабе і закапаў зброю. Арыштаваны на шляху да бандытаў. 11.11.1943 г. расстраляны.

19. Мікіта Пушкоў быў разам з Шакутам затрыманы на шляху да бандытаў. Паколькі ні ў чым іншым яго абвінаваціць нельга, накіраваны ў спецлагер СД.

20. Сяргей Уласаў, працаваў у гарадской управе г. Віцебска. Вербаваў людзей у банды, прыводзіў іх да сувязных і арганізоўваў далейшы рух, а таксама займаўся набыццём зброі. 12 лістапада расстраляны.

21. Казімір Паплаўскі.

22. Іван Жбанкоў.

Абодва юнакі з Віцебска, працавалі на аэрадроме і павінны былі быць накіраваны на работы ў Германію. Перад транспарціроўкай яны ўцяклі і схаваліся ў лазні названай пад лічбай 24 (Уласавай). 19 кастрычніка яны выехалі з Віцебска з дэзерціраваўшым оберяфрэйтарам Эрыхам Паленга і яго палюбоўніцай Ганнай Зеткінай (105 XVII будаўнічы батальён) і на грузавіку ВЛ 396807 накіраваліся ў банду, вывозілі з сабой 6 каністраў бензіну, 2 вінтоўкі і 3 скрынкі боепрыпасаў. Праз некалькі дзён яны былі накіраваны камандзірам Платонавым назад у Віцебск з разведвальным заданнем. 5.11.1943 г. абодва расстраляны.

23. Аркадзь Уласаў, дзейнічаў разам з Фёдарам Жбанковым, падтрымліваў сувязь з бандытамі і асобамі, што варожа ставіліся да немцаў. 11.11.1943 г. расстраляны.

24. Анастасся Уласава разам з сынам Аркадзем Уласавым хавала ў сябе Жбанкова і Паплаўскага і карміла іх. Яна на 3 месяцы накіравана ў рабочы лагер.

25. Фёдар Жбанкоў. Дапамог свайму дзядзьку Івану (№ 22) уцячы з лагера, хаваў яго, каб цераз сувязных пераправіць да партызан. 5.11.1943 г. расстраляны.

26. Яўціхій Лубчанка, магчыма, уцёкшы служачы «усходніх падраздзяленняў» або мясцовай паліцыі («паліцай»), аднак без якіх-небудзь дакументаў. Хаваўся ў Віцебску і знаходзіўся ў сувязі з Шакутам. У яго была схаваная вінтоўка з патронамі. Хацеў пайсці да бандытаў. 6.11.1943 г. расстраляны.

27. Аляксей Пабакачаеў таксама, магчыма, уцякаў з падраздзялення. Быў схоплены разам з № 26. Прызнаўся, што хацеў пайсці да партызан і меў пры сабе аўтамат. 6.11.1943 г. расстраляны.

28. Марыя Афанасенка, работніца хлебазавода ў Віцебску. Арыштавана на шляху да бандытаў. Яна была завербавана Паўлінай. Паколькі яна дзейнічала толькі пад чужым уплывам, то накіравана для выкарыстання на работах у Германію.

29. Іван Прудзікаў, урач-рэнтгенолаг з Віцебска, абвінавачваецца ў тым, што накіроўваў да бандытаў медыкаменты і іншыя матэрыялы. Ён прызнаўся, што аднойчы перадаў Раманенку невялікую колькасць ёду і бінт, але для яго асабістай патрэбы. Нягледзячы на працяглыя допыты, яго не ўдалося абвінаваціць у чым-небудзь, хоць яго роля і не зусім выразная. Паколькі ён з'яўляецца адзіным рэнтгенолагам у Віцебску і гарнізон хадайнічае за яго, ён быў вызвалены з-пад арышту.

30. Клаўдзія Шчуплікава, працавала ў будаўнічым атрадзе (ОТ) у Віцебску. Арыштавана на шляху ў банду. Яна накіравана туды Паўлінай і для яе ўкрыла ў атрадзе службовую пячатку і бланкі пасведчанняў. Сама падоўжыла сабе пасведчанне і падрабіла подпіс. Накіравана ў спецлагер СД.

31. Марыя Ткачова, працавала рознарабочай у адной з часцей у Віцебску. Была разам з названай пад лічбай 30, арыштавана на шляху ў банду. Таксама была накіравана Паўлінай. Накіравана ў спецлагер СД.

32. Дзмітрый Сазонаў быў супрацоўнікам НКУС. Ваеннапалонны, уцёк у 1941 г. з лагера ў Рослаўлі. Працаваў слесарам на аэрадроме ў Віцебску. Стварыў у Віцебску тэрарыстычную групу і вербаваў у яе людзей. Меў пры сабе 4 гранаты, 150 патронаў, украдзеныя на аэрадроме. Арыштаваны на шляху да бандытаў. 12.11.1943 г. расстраляны.

33. Аляксей Марозаў, служачы нямецкай нестралковай часці. Завербаваны названай пад лічбай № 34 Вольгай. Уступіў у тэрарыстычную групу Сазонава і даў пісьмовае абавязацельства. Быў арыштаваны на шляху ў банду. Накіраваны ў спецлагер (СД).

34. Вольга Кізяева, працавала ў будаўнічым атрадзе (ОТ). Прызналася, што была завербавана Паўлінай для антыгерманскай дзейнасці і адпаведна гэтаму дзейнічала. Апрача таго, яна ўкрала і перадала Паўліне 20 пачак бінту, хавала ў сябе ўцёкшага рускага лётчыка. Па асобых прычынах яна не была расстраляна, а вызвалена. Зараз працуе ў нашых інтарэсах.

35. Сігізмунд Усмял, уцёкшы з агентурнай групы паліцай, хадзіў па Віцебску, быў схаваны Сазонавым і завербаваны ў банду. На шляху ў яе арыштаваны. Быў накіраваны ў лагер (месцазнаходжанне і назва яго не ўстаноўлена — *Рэд.*).

36. Уладзімір Брухноў.

37. Іван Пятроў.

38. Георгій Пятроў.

39. Васіль Дзянісюк.

Яны належылі да тэрарыстычнай групы... Аднак, нягледзячы на пісьмовае абавязацельства, да гэтага часу актыўнай дзейнасцю не займаліся.

Яны былі арыштаваны на шляху да банды. Усе чацвёра накіраваны ў спецлагер СД.

40. Васіль Пятроў прызнаўся, што разам з Сазонавым вербаваў людзей для стварэння тэрарыстычнай групы. Пятроў быў арыштаваны на шляху да банды. 12.11.1943 г. расстраляны.

41. Аляксей Ражкоў, настаўнік з Шульцава, дзядзька Г.Фёдарава. Ён быў праваднікам у былых нямецкіх служачых нестраявой службы і грамадзянскіх асоб, якіх Фёдараў схіляў да уцёкаў у банды і прадстаўляў ім жыллё. У яго знойдзена 2 вінтоўкі і 100 патронаў, якія ён атрымаў ад 4 паліцэйскіх, што імкнуліся перабегчы ў банду. 21.11.1943 г. расстраляны.

42. Уладзімір Туркін. 21.11.1943 г. расстраляны.

43. Герасім Фёдараў, агент НКУС. Арыштаваны на шляху да бандытаў. Сваё пасведчанне НКУС ён зашыў у паліто. Меў пры сабе пісталет і фотаапарат. Накіроўваў да бандытаў былых ваеннаслужачых, якія служылі ў германскай арміі на нестраявых пасадах. Ведаў, дзе схавана зброя. 21.11.1943 г. расстраляны.

Г.Фёдараў быў звязаны з Уладзімірам Туркіным, сельскім паштальёнам у Шчульцаве, і Ражковым, а Туркін — з паліцэйскім Лебедзевым, для якога ён схаваў 4 вінтоўкі і значную колькасць боепрыпасаў.

44. Іван Трыфанаў паўтара гады працаваў на Віцебскім аэрадроме качагарам. Удзельнік тэрарыстычнай групы Сазонава. Краў на аэрадроме ручныя гранаты і боепрыпасы і дзейнічаў па ўказанню Сазонава і Паўліны. 16.11.1943 г. расстраляны.

45. Мікалай Шаронаў, слесар на чыгунцы. Сваяк названага пад лічбай № 40 (Пятрова). Належаў да тэрарыстычнай групы Сазонава і быў звязаны з інспектарам НКУС Фёдаравым

(лічба № 43). Падтрымліваў бандытаў зброяй і адзеннем, вербаваў для іх людзей. 24.11.1943 г. расстраляны.

46. Марфа Свечкіна, была звязана з Паўлінай, хавала ўзрыўчатку, што перадавала ёй Паўліна, якая прызначалася для правядзення дыверсій. Размова ідзе прыкладна аб 25 кг выбуховага рэчыва і 8 ампулах... Апрача таго, яна набыла ёд і медыкаменты, што прызначаліся для банды. 16.11.1943 г. расстраляна.

47. Анатоль Свечкін.

48. Іван Свечкін.

Браты завербаваны названай пад лічбай № 46 Свечкінай. Замешаны ў тых жа дзеяннях, што і яна. 17.11.1943 г. абодва расстраляны.

49. Ягор Стаякоў, працаваў у нямецкай вайсковай часці. Меў зносіны з асобамі, варожа настроенымі да немцаў і збіраўся перайсці да бандытаў. 24.11.1943 г. расстраляны.

50. Пётр Гарбачэнка, падтрымліваў сувязь з бандытамі і збіраўся разам з названым пад лічбай № 49 ісці да бандытаў. Пры арышце 21.11.1943 г. ў час спробы ўцячы быў забіты.

51. Іван Кашчац.

52. Аляксей Акулінін.

53. Андрэй Насонаў.

54. Васіль Абалбосаў.

55. Іван Віткоўскі.

56. Стэфан Шарапаў.

Усе былі ваенныя, служылі ў 560-м санітарным абозе, іх Паўліна схіліла да дэзерцірства і накіравала да бандытаў. На шляху туды яны былі арыштаваны.

Па рашэнню суда пры камандуючым 2-м танкавым раёнам былі выключаны з саставу германскіх узброеных сіл і накіраваны ў спецлагер.

Некаторая колькасць асоб, што належалі да акружэння «Паўліны» і «Сазонава», уцяклі, і да гэтага часу не маглі быць арыштаваны. У сувязі з эвакуацыйнымі мерапрыемствамі арышт названых асоб наўрад ці магчымы.

Захоплена:

1. Грошай 937,70 рэйхсмарак.

2. Зброі: 7 вінтовак, 1 аўтамат, 2 пісталеты, 4 ручныя гранаты, 50 кг выбуховых рэчываў, 18 розных мін, 8 ампул сернай кіслаты, некалькі соцен патронаў, адзін фотаапарат і розныя іншыя рэчы.

Усяго арыштавана 63 чал.

З іх: расстраляна — 38, накіравана ў лагер — 21, вызвалена — 4.

Уласныя страты: 1 цяжкапаранены, 2 лёгкапаранены.

Фон Дзірхшман С., камісар паліцыі і камандзір злучэння

З матэрыялаў УКДБ па Віцебскай вобласці. Пераклад з нямецкай мовы.

З НЯМЕЦКІХ ДАКУМЕНТАЎ

ДАКУМЕНТ № ОКШ-689

703-я група тайнай палявой паліцыі. Сакрэтна.

1 с. 2074-43 г. ад 26.11.

Была завершана шпіёнская справа «Паўліна», пачатая ў чэрвені 1943 г. ў сувязі са справай шпіёна Пахомава...

1. Шпіянаж. Пасля завяршэння ў маі 1943 г. шпіёнскай справы Белахвосцікава ў чэрвені было арыштавана двое яго саратнікаў, а іменна: Вера Аляксандрава і Валянцін Пахомаў. З допыту стала ясным, што нейкая Паўліна ў Віцебску вельмі ўмела працягвае справу Белахвосцікава. У выніку карпатлівай і тонкай работы на працягу апошніх 2 месяцаў гэта справа даведзена да канца. Усяго было затрымана больш 60 чалавек, якія займаліся шпіянажам, зборам звестак і іх перадачай, вярбоўкай мужчын і жанчын у банды, крадзяжом зброі і выбуховых матэрыялаў, а таксама антынямецкай прапагандай.

Было захоплена:

7 вінтовак, 1 аўтамат, 2 пісталеты, 4 ручныя гранаты, 50 кг ВР, 18 мін, 8 ампул сернай кіслаты, некалькі сот патронаў, фотаапарат і розныя іншыя рэчы.

З затрыманых 37 расстраляна, 19 чалавек накіравана ў спецлагер СД і для адпраўкі на работу ў Германію.

Да асоб, якія ўказаны ў п. IV І, адносіцца таксама тэрарыстычная група Сазонава.

Сазонаў ад Паўліны Шлякавай меў заданне стварыць тэрарыстычную групу, і яму ўдалося завербаваць у яе некаторых асоб. Яму ўдалося таксама раздабыць выбуховыя матэрыялы. Своечасовымі дзеяннямі група выяўлена і поўнасцю захоплена яшчэ да таго, як яна змагла пачаць сваю дзейнасць.

Фон Дзірхшман С., камісар паліцыі і камандзір злучэння

Пераклад з нямецкай мовы. З матэрыялаў УКДБ па Віцебскай вобласці, якія былі на захаванні ў сярэдзіне 1960-х гадоў.

З АБВІНАВАЎЧАГА ЗАКЛЮЧЭННЯ ПА СПРАВЕ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

По делу:

1. ГОЛЬВИТЦЕРА Фрица — генерала пехоты, бывшего командира 53-го армейского корпуса;

2. ШМИДТА Ганса — полковника, бывшего начальника штаба 53-го армейского корпуса;

3. ХИТТЕРА Альфонса — генерал-лейтенанта, бывшего командира 206-й пехотной дивизии;

4. МЮЛЛЕР-БЮЛОВА Клауса, генерал-майора, бывшего командира 246-й пехотной дивизии;

5. ДИЛЛЬМАННА Ганса — полковника, бывшего коменданта Витебского лагеря советских военнопленных;

6. КЛУТЕ Генриха — обер-лейтенанта, бывшего командира 53-й истребительной роты 53-го армейского корпуса;

7. РУХА Германа — фельдфебеля, бывшего командира взвода рабочего батальона 4-й авиаполевой дивизии;

8. БУЦБАХА Леонарда — унтер-офицера, бывшего командира отделения 246-го саперного батальона, 246-й пехотной дивизии;

9. ГЮНТЕРА Курта, обер-ефрейтора, бывшего шофера 246-го противотанкового дивизиона, 246-й пехотной дивизии;

10. АДАМА Филиппа, ефрейтора 404-го пехотного полка, 246-й пехотной дивизии.

Обвиняемых в преступлении, предусмотренном ст. 1 Указа Президиума Верховного Совета Союза ССР от 19 апреля 1943 г.

После вероломного нападения гитлеровской Германии на Советский Союз, немецко-фашистские захватчики, вторгшись в пределы Витебской области, учинили кошмарные злодеяния над советским населением и его имуществом.

По материалам Государственной Чрезвычайной Комиссии, гитлеровцы и их сообщники убили и замучили в Витебской обл. 151 421 советского гражданина, в том числе: большое количество малолетних и несовершеннолетних детей, больных и престарелых. Кроме того, было убито и замучено 92 891 военнопленный Советской Армии.

Было угнано в немецкое рабство 68 434 человека, преимущественно здоровых молодых девушек, женщин, мужчин, а также несовершеннолетних детей.

В г. Витебске немецкие захватчики полностью уничтожили жилой фонд и промышленные предприятия, в том числе крупные заводы и фабрики, как станкостроительные заводы им. Кирова и Коминтерна, трикотажные фабрики им. Клары Цеткин и «КИМ», обувная фабрика «Красный Октябрь», маслозавод, подстанции «Белгресс» и «Белэнерго». Были сожжены и разрушены педагогический и медицинский институты, педагогическое училище, городской театр, дом Красной Армии, здание телеграфа и другие культурные учреждения. Разрушению подвергались Покровский собор, 8 церквей, являвшиеся историческими памятниками русской древности, построенные в 11—12 вв.

Государственная Чрезвычайная Комиссия оценила общий ущерб, причиненный немецко-фашистскими захватчиками и их сообщниками гражданам, колхозам, промышленным предприятиям, государственным и общественным организациям Витебской области в сумме — 25 259 130 тыс. руб. (Том 2, л.д. 486—540).

С июня 1943 г. генерал Гольвитцер, командуя 53-м армейским корпусом, выполнял приказ командующего армейской группы «Центр» фельдмаршала Клюге о строительстве оборонительной линии «Пантера» протяжением 550—600 км от устья реки Припять до г. Витебска.

Для выполнения этой работы Гольвитцер насильно мобилизовал до 200 тыс. мирных советских граждан — женщин, стариков и подростков, чем также грубо нарушил нормы международного права.

Получив от фельдмаршала Клюге приказ о форсировании окончания строительства оборонительной линии «Пантера» на участке Гомель — Чаусы — Горки — Дубровно — Рудня, Гольвитцер в каждом из указанных районных центров создал специальные лагеря, в которые насильно были загнаны мирные советские граждане, а также военнопленные Советской Армии.

Лагеря представляли собой загоны, огороженные колючей проволокой. Для содержащихся в этих лагерях мирных советских граждан и военнопленных был создан каторжный режим. Они работали на строительстве оборонительных укреплений по 10 — 15 часов в сутки, получая по 150 г хлеба и поллитра недоброкачественной баланды. Все они размещались под открытым небом.

Прибыв 1 октября 1943 г. в район г. Витебска, Гольвитцер, командуя по-прежнему 53-м армейским корпусом, в состав которого в разное время входили 246-я, 256-я, 95-я и 206-я пехотные дивизии, а также 34-я и 6-я авиаполевые дивизии, продолжал строительство укреплений, для чего также организовывал в каждой дивизии лагеря, в каждом из которых содержалось от 800 до 2000 мирных советских граждан.

Свидетель Селезнева, содержавшаяся в лагере 4-й авиаполевой дивизии, показала: «Во время работы немцы без причин придирались к рабочим лагеря и тут же расстреливали. Помню такой факт, как-то: нас заставили рыть траншеи, у работавшей со мной девушки сломалась лопата, стоявший недалеко немец, увидев это, стал избивать девушку ногами, а затем отвел в кусты и расстрелял»... (Том 1, л.д. 69 — 71, 262 — 265, том 3, л.д. 48 — 49).

В своих показаниях обвиняемый Рух и свидетель Гусаков приводят многочисленные факты, когда советские девушки, содержавшиеся в лагере, подвергались изнасилованию со стороны немецких солдат и офицеров, а затем расстреливались (Том 9, л.д. 20 — 21, 28, 47 — 48).

Гольвитцером был издан приказ, в котором бесчеловечное обращение с советскими гражданами, заключенными в лагерях, мотивировалось следующим образом: «Чтобы ликвидировать помощь партизанам со стороны мирного населения окружающих деревень и прекратить связь населения с партизанами, — насильно заключать граждан в лагеря и создавать нечеловеческие условия содержания, которые способствовали бы истреблению советских граждан»... (Том 9, л.д. 30 — 31).

Войскам предписывалось, под видом борьбы с партизанами проводить карательные экспедиции... и перебрасывать нетрудоспособное советское население, предумышленно зараженное тифом и другими инфекционными болезнями, через линию фронта в расположение советских войск с целью распространения инфекционных заболеваний в рядах Советской Армии и гражданского населения (Том 1, л.д. 46, 47, 56, том 3, 50 — 51, 58 — 69).

Согласно преступным приказам Гольвитцера войсками 53-го армейского корпуса в период с апреля по июнь 1944 г. было насильно угнано из г. Витебска и ближайших районов в Германию на рабский труд 4800 советских граждан, около 12 тыс. человек нетрудоспособных и больных были собраны в лагерь, размещавшийся в г. Витебске на территории бывшего 5-го ж.-д. полка, откуда их угнали к линии фронта в район Богушевска в качестве «живого заслона» — для прикрытия отступления немецких войск... (Том 1, л.д. 96 — 136 — 137, 221 — 223, том 3, л.д. 90 — 92).

По заранее разработанному Гольвитцером плану г. Витебск и его окрестности систематически разрушались задолго до отступления немецко-фашистких войск.

Свидетель священник Оберенко Гавриил показал: «...Немецкие оккупанты производили разрушение всех имеющихся в Витебске религиозных зданий. Я, как священнослужитель, более двух недель содержался в лагере смерти. 23 мая 1944 г. в 16 часов от коменданта г. Витебска получил телефонограмму — убрать вещи из Покровского собора, ибо последний в 18 часов будет взорван. Приказ о взрыве собора был в тот же день выполнен. Покровский собор являлся историческим памятником русского народа, построенным 800 лет тому назад» (Том 2, л.д. 442 — 447).

Обвиняемый полковник германской армии Шмидт Ганс, будучи начальником штаба 53-го армейского корпуса, принимал непосредственное участие вместе с Гольвитцером в разработке и издании преступных приказов... Лично Шмидт в октябре и ноябре 1943 г. с ведома командира корпуса Гольвитцера разработал планы 6 карательных экспедиций и последовательно отдавал приказы командиру 53-й истребительной роты обер-лейтенанту Клуте об их проведении (Том 8, л.д. 232 — 237, 238 — 244).

Обвиняемый Хиттер Альфонс командовал 206-й пехотной дивизией, действовавшей в Калининской и Смоленской областях, с осени 1943 г. — в Витебской области.

По преступным приказам Хиттера в местах дислокации дивизии создавались лагеря и тюрьмы для мирных советских граждан, учинялись расправы, грабежи и другие злодеяния...

В июне 1944 г. Хиттер со своей дивизией по приказу командира 53-го армейского корпуса Гольвитцера должен был прикрывать отступление всего корпуса. Одновременно он был назначен комендантом города Витебска.

Выполняя приказ Гольвитцера, Хиттер производил разрушение жилых зданий и промышленных предприятий, а на пути отхода сжигал населенные пункты, что подтверждается многочисленными показаниями немецких военнопленных, а также Гольвитцера и Шмидта (Том 4, л.д. 261—268, 159—165, 175—181, 182, 189, 190—196).

Обвиняемый Буцбах показал, что он лично по приказу Мюллер-Бюлова вместе с другими военнослужащими 246-го саперного батальона в 20-х числах июня 1944 г. принял непосредственное участие в расстреле 70 человек, в том числе 4 женщин, доставленных к месту расстрела из рабочего лагеря. Перед расстрелом их заставили вырыть яму, а затем расстреляли.

При отступлении частей дивизии из района Витебска в июне 1944 г. Мюллер-Бюлов отдал приказ, который гласил: «Командирам оборонительных пунктов при отходе подвергать уничтожению жилые дома, бункера, гражданские сооружения, заводы и прочие постройки»...

Во исполнение этого преступного приказа частями 246-й пехотной дивизии был взорван Витебский вокзал, множество промышленных предприятий, общественных и культурных учреждений, в числе которых городской театр, большое количество многоквартирных домов (Том 6, л.д. 57—58, 115, 215—217).

Обвиняемый полковник германской армии Ганс Дилльманн, отличившись в 707-й охранной дивизии своей непомерной жестокостью по отношению к мирным советским гражданам был досрочно произведен в чин полковника, награжден железным крестом II класса, и в конце февраля 1943 г. назначен на должность начальника Витебского лагеря военнопленных Советской Армии. Там Дилльманн установил террористический режим, издевался над советскими военнопленными и проводил их физическое уничтожение...

Обвиняемый Дилльманн показал: «Я поддерживал в лагере режим, который в итоге должен был привести и приводил к голодной смерти военнопленных. Ничтожный рацион питания приводил к истощению организма, а изнурительный труд от восхода до захода солнца ускорял окончательное его разрушение...» (Том 7, л.д. 63).

Витебский лагерь военнопленных был Дилльманном превращен в лагерь смерти. В марте и апреле 1943 г. в этот лагерь было согнано до 20 тыс. мирных советских граждан, среди них большое количество женщин, стариков и детей насильственно угнанных гитлеровцами из деревень Витебского и Городокского районов Витебской области.

В результате в Витебском лагере военнопленных было расстреляно, замучено, погибло от голода и болезней более 100 тыс. советских граждан (Том 7, л.д. 299—300).

Оставшиеся в живых направлялись в лагеря смерти: «Майданек» и «Освенцим», где они уничтожались.

Свидетель Шакуро Елена показала: «...В конце марта 1943 г. немецкие солдаты всю нашу семью и жителей деревни Храповичи, пригнали в Витебский лагерь военнопленных. Там было очень много гражданского населения, стариков, женщин и детей. В бараке, куда нас поместили, не было пола, стояли только голые проволочные нары в три яруса, была ужасная скученность, грязь, царил голод и эпидемия тифа. Люди умирали в массовом количестве, по 20—30 человек в день.

В апреле 1943 г. наша семья: мать 60 лет, отец 70 лет, моя дочь Мария — 15, сын Иван — 12 лет и сын Виктор — 2-х лет из Витебского лагеря транспортом, в котором было более 1000 человек, вывезена в лагерь смерти «Майданек». В этом лагере погибли от болезни и голода мои престарелые родители, а 2-летнего сына Виктора заживо сожгли в крематории (Том 7, л.д. 265—267).

В мае 1943 г. Дилльманн был назначен комендантом Полоцкого лагеря военнопленных, где он продолжал уничтожать советских людей (Том 7, л.д. 105, 106).

В 1943 г. Дилльманн был назначен начальником строительства, усовершенствованного лагеря смерти для советских военнопленных в городе Орле (Том 8, л.д. 85—96, 119—124, 160—166, 132—137).

В 20 числах октября 1943 г. при проведении карательной экспедиции роте Клуте были приданы взвод артиллерии, минометы и отделение жандармов.

В этот раз артиллерийским и минометным огнем были разрушены и сожжены деревни Борок, Зимковичи Алексинического сельсовета Сенненского района и деревни Константиново, Кадуково, Стриги, Косовец Богушевского района Витебской области. Имущество граждан было полностью разграблено (Том 8, л.д. 89, 92, 147—148, 162—163, 179).

Обвиняемый фельдфебель германской армии Рух Герман являлся командиром взвода команды охраны лагеря, организованного для насильственно мобилизованных советских граждан при 4-й авиаполевой дивизии 53-го армейского корпуса.

Выполняя преступные приказы командира 4-й авиаполевой дивизии генерала Писториуса и приказы командира 53-го армейского корпуса генерала Гольвитцера, Рух, наравне с другими военнослужащими из команды охраны лагеря, избивал, насиловал и расстреливал советских граждан, насильно мобилизованных для постройки оборонительных сооружений. Всего в этом лагере было расстреляно, погибло от голода, болезней и истязаний 700 советских граждан (Том 9, л.д. 15, 18—21, 25).

Свидетель Гусаков Герасим, содержавшийся в лагере, показал: «...Я лично был неоднократно избит фельдфебелем Рухом за то, что обессилел и не мог продолжать работу. Питание состояло из банки супа, вернее, кипяченой воды с 2—3 мороженными картофелинами и 300 г хлеба, выдаваемых один раз в 3—4 дня...»

Это подтвердила и свидетель Куриленко, которая лично видела, как фельдфебель Рух избивал палкой Иванову Наталью Марковну, упавшую от голода и изнеможения.

Они же показали, что Рух в октябре 1943 г. беспричинно избил по лицу прикладом автомата заключенного Егора Смычкова, а затем его вместе с другими заключенными лагеря расстрелял якобы за попытку к побегу. Аналогичные показания дали и свидетели Селезева и Кублицкая.

По личному признанию Руха, им были изнасилованы 7 девушек, из них 4 были затем расстреляны. Им же были расстреляны 5 мужчин за то, что они не могли продолжать больше работу вследствие истощения (Том 9, л.д. 28—37, 41—44).

Обвиняемый унтер-офицер германской армии Буцбах Леонгард активно выполнял преступные приказы командира 246-й дивизии генерала Сирри, а с марта 1944 г. — командира этой же дивизии генерал-майора Мюллер-Бюлова об истреблении советских граждан, разграблении их имущества и уничтожении населенных пунктов и города Витебска. Кроме того, Буцбах совершал злодеяния в отношении советских военнопленных и мирного населения и по личной инициативе.

Находясь в городе Витебске, обвиняемый Буцбах в составе команды саперов, приданной коменданту города Витебска, уничтожал здания города, расстреливал мирное население, зверски избивал советских граждан.

Он показал, что: «...Под угрозой смерти население города Витебска поголовно выгонялось на строительство оборонительных сооружений. При этом лично мною было подвергнуто избиению до 15 советских граждан за то, что они отказались идти работать.

Выполняя приказ коменданта г. Витебска, мною лично взрывчатыми веществами уничтожено здание городского театра, хлебозавод, бывший общественный дом для немецких солдат, 3 многоквартирных дома и ряд других объектов.

Кроме того, в то же время с моим непосредственным участием за отказ от работы по постройке оборонительных сооружений было расстреляно 70 советских граждан...»

В мае 1944 г. Гюнтер, в составе своего дивизиона под командованием начальника подразделения СД капитана Штуарта принял участие в карательной экспедиции в районе деревни Крупенино Бешенковичского района, где было расстреляно 12 советских граждан. Из них лично Гюнтер расстрелял 3-х человек (Том 11, л.д. 37—38, 46—47).

Гюнтер виновным себя признал и объяснил: «...Одной из причин, что я расстреливал мирных граждан, являлось то, что я лично на фронте не был, работал по ремонту автомашин и мне как и другим шоферам поручали расстреливать население, чтобы упражняться в стрельбе из личного оружия...» (Том 11, л.д. 54—59).

Обвиняемый ефрейтор германской армии Адам Филипп участвовал в карательных экспедициях, во время которых, по личной инициативе, чинил зверские расправы над мирным советским населением.

Во время этих карательных экспедиций были полностью сожжены деревни Добромысль, Вишняки, Перемонт, Боровня, Крупеня, Дрозды Лиозненского района (Том 12, л.д. 32—33, 36—37).

Этой же карательной экспедицией в лесу в 2—3 км от деревни Добромысль было задержано 230 мирных советских граждан. Все задержанные были выстроены в лесу на поляне и

8 человек было повешено на дереве. Обвиняемый Адам своими руками повесил двух человек, а около 150 человек расстрелял из пулемета.

Обвиняемый Адам, признавая себя виновным, показал: «...Оставив горящую деревню, оба взвода в боевом порядке начали прочесывать лес. В лесу было задержано 200—230 человек мирных граждан. (Главным образом, эвакуированных из г. Витебска — *Ред.*)

Задержанные были построены по 5 человек в колонну на поляне. По приказу старшего лейтенанта Крана я повесил двух мужчин.

После чего на одну из повозок был установлен станковый пулемет, из которого я открыл огонь по этим людям. Они плакали, кричали в ужасе, но они были оцеплены и по ним стреляли из автоматов, а я из пулемета.

Я лично убил 120—150 человек. Оставшиеся в живых 78 человек были под конвоем отправлены в гор. Лиозно...» (Том 12, л.д. 68—69).

На основании изложенного:

1. Гольвитцер Фриц, 1889 года рождения, немец, уроженец города Булленгайм, провинция Бавария, генерал пехоты;

2. Шмидт Ганс, 1889 года рождения, немец, уроженец города Гамбурга, полковник;

3. Хиттер Альфонс, 1892 года рождения, немец, уроженец дер. Хохштадт, провинция Верхний Эльзас, генерал-лейтенант;

4. Мюллер-Бюлов Клаус, 1892 года рождения, немец, уроженец города Иоганийсбург, генерал-майор;

5. Дилльманн Ганс, 1887 года рождения, немец, уроженец города Байрбит, полковник;

6. Клуте Генрих, 1918 года рождения, немец, уроженец города Дортмунд, обер-лейтенант;

7. Рух Герман, 1911 года рождения, немец, уроженец города Метц, фельдфебель;

8. Буцбах Леонгард, 1918 года рождения, немец, уроженец дер. Диткерхен, провинция Гессен-Насау, ефрейтор;

9. Гюнтер Курт, 1919 года рождения, немец, уроженец города Чейн, ефрейтор;

10. Адам Филипп, 1923 года рождения, немец, уроженец дер. Гайнс-Гейн, провинция Пфальц, ефрейтор.

ОБВИНЯЮТСЯ:

Гольвитцер, Хиттер, Мюллер-Бюлов и Шмидт в том, что они, командуя соединениями немецкой армии на советской территории, являлись организаторами зверств, чинимых под их руководством подчиненными им солдатами и офицерами над мирным населением и военнопленными Советской Армии.

При отступлении подчиненных им соединений и частей они отдавали приказы о превращении оставляемой местности в зону пустыни и об истреблении мирного населения.

Во исполнение этих преступных приказов подчиненные им части и соединения уничтожали города, населенные пункты, а мирное население истреблялось или угонялось в Германию на рабский труд.

Дилльманн — в том, что он, состоя в должности командира батальона охранной дивизии, проводил карательные экспедиции и под видом борьбы с партизанами расстреливал мирных советских граждан и сжигал населенные пункты.

Состоя в должности коменданта Витебского и Полоцкого лагерей советских военнопленных, он поддерживал террористический режим в этих лагерях, поощрял произвол и всеми мерами добивался истребления заключенных.

В силу созданных Дилльманном невыносимых условий в лагере ежедневно умирало 20—30 человек. Много военнопленных и советских граждан расстреливались по указаниям Дилльманна.

Клуте — в том, что, являясь командиром истребительной роты, под видом борьбы с партизанами с особой жестокостью проводил карательные экспедиции, расстреливал мирных жителей, в том числе стариков, женщин и детей, грабил население и сжигал деревни.

Рух, Буцбах, Гюнтер и Адам — в том, что они, состоя на службе в гитлеровской армии и находясь на территории Советского Союза, лично истребляли советских граждан, жгли населенные пункты и грабили население.

Все вышеперечисленные обвиняемые совершили преступления, предусмотренные ст. 1-й Указа Президиума Верховного Совета Союза ССР от 19 апреля 1943 г. и подлежат суду Военного Трибунала.

Друкуецца па кн.: Обвинительное заключение по делу о злодеяниях, совершенных немецко-фашистскими преступниками на территории Витебской области... Витебск, 1947.

З выступлення В.І.Лузгіна на пасяджэнні ЦК ВЛКСМ

Снежань 1943 г.

Масква

... Палявая сумка, аловак і аўтамат у руках — вось вам партрэт камсорга — партызана. Але ваяваць даводзілася не толькі зброяй: у нашым падпольным абкоме была, напрыклад, лектарская група. Яе кіраўнік, Вадзім Іванавіч Розін, выкладаў гісторыю ў Віцебскім педінстытуце. А ў час вайны яго накіравалі да нас спецыяльна на агітацыйна-прапагандысцкую работу.

Акупацыя, небяспека на кожным кроку, а ў вёску прыходзіць лектар падпольнага абкома і расказвае пра становішча на фронце, пра тое, як жыве наш тыл. Мы і фільмы паказвалі. Ці ж трэба гаварыць, як узнімаў баявы дух людзей такі фільм, як «Разгром немцаў пад Масквой».

Мы абавязкова адзначалі ўсе нашыя святы. Да гэтага часу памятаю сход, прысвечаны 25-годдзю камсамола. І спаборніцтва сярод камсамольцаў у нас было: колькі на асабістым рахунку кожнага знішчаных эшалонаў, забіта фашыстаў. І такое пытанне ставілі на сходах: кожны камсамолец павінен мець некалькі партызанскіх спецыяльнасцей, у любую мінуту ўмець замяніць таварыша.

Мы цвёрда хадзілі па зямлі, верылі, ведалі, што не толькі павінны адваяваць яе, але і жыць на ёй.

Побач былі і здраднікі

З успамінаў Марыі Фёдараўны Ткачовай, былой удзельніцы Віцебскага падполля.

Немцы, як занялі Віцебск, увесь час ганялі нас то на расчыстку вуліц, то на рамонт дарог, а зімою раскопваць снежныя завалы. Помню, вясной пагналі масціць дарогу ля хлебазавода, прывакзальную плошчу. Там многа збіралася маладых людзей, пераважна жанчын. А ўлетку сорак другога ганялі на вуліцу, цяпер Ільінскага, там мы падсыпалі жвір у каляіны, выраўноўвалі калдобіны. Калі побач аказваўся наглядчык, рабілі выгляд руплівасці, стараліся... А што зробіш? Хоць штосьці плацілі, трэба было жыць, карміць дзяцей. І тое «штосьці» — гэта 2 маркі і 100 г хлеба, якія давалі за працу ад 8 гадзін раніцы да 6 вечара. Ды пропуск, што даваў шанц выйсці за горад, у вёску.

Наглядчык — стары фрыц, вельмі злы быў. Казалі, што сын яго загінуў пад Масквою... Не думай пайсці і на хвіліну раней шасці гадзін. Неяк раз у суботу захацелася дзяўчатам пакінуць работу за дзесяць хвілін да тых шасці. Заўважыў фрыц, падбег чамусьці да мяне, ды знянацку як ляпнуў кулаком у вуха, адразу цёмна стала ў вачах, захісталася... Доўга пазірала на свет: дзе гэта я? Але не расплакалася. Тут падбегла да мяне Паліна Савельеўна, вельмі расхвалявалася, абняла, расцалавала. У яе слёзы пакаціліся, і ў мяне. Кажа: «Перажывём, дарагая, каб на яго хуткая магіла найшлася, паганец фашысцкі».

Паліна Савельеўна Шлякава такая ўважлівая, такая добрая была. Разумная, чэсная. І вельмі прыгожая. Дзе яна раней працавала, не ведаю. А жыла на 2-й Стадыённай. У яе дачушка была маленькая, памерла. І быў сынок, муж недзе ў Маскве. Казала, што была партыйная. Увесь час потым старалася быць бліжэй да мяне. І Клава Шчуплікава са мной побач увесь час была.

Аднойчы Паліна Савельеўна ўзяла ды і прызналася, што мае сувязь з партызанамі, часам ходзіць у партызанскую зону, ажно ў Ноўку, за Сураж. Неўзабаве і мяне звадзіла туды, на нядзельны базар. А якое дзіва там убачыла! Навокал і партызаны, і вайскоўцы нашы, у форме, са зброяй. А базар быў неблагі, з усёй акругі збіраліся. Праз «Віцебскія вароты» рух і туды, і адтуль, і ўдзень, і ўначы. Мянялі хто што на яду.

А Паліна Савельеўна рабіла сваю справу — перадавала звесткі ці то вайскоўцам, ці то партызанам.

Прыйшлі ў той дзень дадому без здарэнняў, дакументы ў нас былі спраўныя. Праз які дзень яна і гаворыць:

— Бачыла нашых. Во як трасуць фрыцаў, ажно пад Віцебскам усё калоціцца... Давай, Марыя, і мы будзем дапамагаць нашым біць ворага.

— А ці ж я змагу?

— Збіраць будзеш звесткі, назіраць за машынамі, што і куды яны вязуць, пад якім нумарам і знакам ходзяць. Але больш за ўсё трэба сачыць за чыгункай. І перадаваць такія

звесткі будзеш Клаўдзіі Шчуплікавай. А яна нашаму старшаму, Белахвосцікаву... (Праўда, я ніколі яго не бачыла, але ведала, што з намі займаецца такі савецкі разведчык.)

Я пагадзілася, расказала дома бацьку, Фёдару Савельевічу. Ведала яго настрой супраць немцаў. А яму вельмі зручна было мне дапамагаць. У тую вайну ён амаль чатыры гады прабыў у нямецкім палоне і ладна размаўляў па-іхняму.

Бацька падгаварыў дваіх хлапчукоў, каб і яны па чарзе наглядалі за рухам цягнікоў па чыгунцы. Даў ім назву — «стрэлачнікаў». І сам узяўся мне шчыра дапамагаць. Ад нашага дому, жылі мы па Гарадоцкай, побач з чыгункай, усё было відаць, як на далоні. Колькі і ў які час праходзіць саставаў у бок фронту, і колькі назад, колькі вагонаў з жывой сілай, колькі гармат і танкаў на платформах. Хуткасць ля станцыі невялікая, цягнікі хадзілі толькі ўдзень, уначы на станцыі рабіліся манеўровыя работы. Так амаль год і дзевяць месяцаў перадавала звесткі для нашай разведкі.

А вясной сорак трэцяга Паліна сказала, што ад партызан, з-пад Астроўна прыйшлі двое нашых разведчыкаў — Уладзімір Сухаў і Міхаіл Брусаў, і што ўсе звесткі, што збірала ад нас, цяпер будзе перадаваць Сухаву. Пасяліўся ён на кватэры ў тым жа доме на Стадыённай, дзе жыла і Паліна Савельеўна. Час ад часу ён хваліў нас, што звесткі правільныя, камандаванне задаволена, падзякі аб'яўляў...

Але ў мяне ўсё скрабло на душы — нейкі не такі гэты Сухаў, здаецца не наш ён, падстаўны. Вясёлы, бесцырымонны. Ходзіць да партызан, усё яму гладка ўдаецца, усіх ён умее абхітрыць. Западозрыла я і кажу Паліне: «Не наш ён, гэты Валодзя».

Паліна Савельеўна задумалася і неўзабаве настойліва запатрабавала ад Сухава сустрэчы з камандзірам атрада. А ён усё віляе. А тым часам арыштавана многа падпольшчыкаў, даўно ўжо быў схоплены і Белахвосцікаў.

Мы дамовіліся з Палінай, што ў горадзе далей заставацца небяспечна і трэба ісці ў партызаны. А павядзе нас Сухаў. Ён, помню, сказаў: «Я павяду вас такімі вуліцамі, дзе немцы не ходзяць».

І так мы ідзем з Клаўдзяй Шчуплікавай па Лучаскай вуліцы ўніз, а Сухаў ззаду. Паглядаю на яго, а сэрца не на месцы. Раніца была, заўтра свята Кастрычніка. На поле выйшлі, кіламетры з два прайшлі, і тут раптам да нас пад'язджае машына. Ход сцішае. З яе выскокваюць немцы. Усіх у машыну пахапалі і паехалі далей. Між сабой загаргаталі, вясёлыя такія. А павезлі, здаецца, у Баронікі, загналі ў пуню, закрылі вароты. І з намі Сухаў. Бегае з вугла ў вугал, рукі заламвае, за галаву хапаецца: «Вось уначы разламаю дах і ўсе ўцячэм адсюль». А я яму: «Чаго табе ўцякаць, ты ж іхні... Уцячэш, цябе зноў выпусцяць. — Здраднік, правакатар, ты нас ашукаў». У той пуні сядзела многа народу.

Паліну Шлякаву кінулі да нас вечарам, усю збітую. Яна нам сказала: «Мяне расстраляюць, але я за вас гарой стаяла, што вы ні пры чым». Мінут праз дзесяць яе забралі ад нас, і хутка чутны быў стрэл.

Быў там яшчэ Дзмітрый Сазонаў — сувязны, ён таксама ішоў у партызаны. Яго таксама ў гэты ж дзень расстралялі.

А нас, мяне і Клаўдзію, білі. Спачатку было вельмі балюча, а потым не, звыкліся. Клаўдзію няможна было спазнаць. Сябе я не бачыла, толькі галаву нельга было пакратаць. Потым павезлі ў 5-й полк, у лагер СД. З месяц там патрымалі, чакалі састаў спецыяльны. Потым мяне, Клаўдзію і яшчэ многіх адправілі на станцыю, пасадзілі ў «цялятнікі» і павезлі. Доўга везлі. Можа з тыдзень, а можа і болей. Не кармілі, а з ежы ў нас нічога не было. Потым пра ежу ўжо і не думалі, каб толькі глыток вады далі.

Падагналі наш састаў прама да баракаў. А баракаў тых — шмат, канец дзесь за гарызонтам. Толькі трубы і трубы, дымяць усе. А навокал нейкі цягучы смурод, дыхаць страшна. Перш-наперш павялі ў санчасць, па іхняму. Зрабілі накол нумара. Мой нумар быў 69 240. Пастрыглі. Памазалі галаву нейкай смярдзючкай, і ў барак. Праз кожны тыдзень паўтаралі тую апрацоўку. Не вытрымлівалі многія. Скура пакрывалася шалупеннем, болькамі, загнівалася. Такіх хворых адпраўлялі ў крэматорый. Маю сяброўку Клаўдзію Шчуплікаву спалілі, як толькі яна знясілела.

У бараку змяшчалі па семсот чалавек. Нары былі пастаўлены ў 4 ярусы. На кожным ляжала па 8 чалавек. І ўсе восем спалі пад адной коўдрай. Павярнуўся адзін на другі бок, і ўсе павінны паварочвацца. Заядалі вошы, клапы, сяклі блохі. Прычапілася кароста. А ўнізе перад нарамі стаяў таз для розных нечыстот. Раніцой яго выносілі здаравейшыя, і сюды, у той жа таз, наліваўся чай. Ніхто нікога не лячыў, ніякіх лекаў не давалі, самі выходжвалі хворых, як маглі, каб толькі не даведаліся і не схапілі ў печку...

І вось ідзе аднойчы раніцай абход. Гавораць: «На вольнасць». А айзерка — чэшка была, запісвала. Я прашу яе: не пішыце мяне. Там, дома, у мяне ўсё згарэла, мо выжыву і так. Не хачу на «вольнасць». Яна паглядзела на мяне, усміхнулася: «Ну, а мне вшыстко едно». Узяла і выкрэсліла мой нумар.

І на наступны дзень усіх, хто быў на «вольнасць» запісаны, спалілі ў печы, а мяне адправілі ў другі барак да хворых. Там я доўга папраўлялася. Потым ганялі на работу кіламетраў за 15 – 20: зямлю капалі, палолі.

Аднойчы прыехалі нейкія немцы. Усіх агледзелі, выбіралі ў каго цела чыстае. І тыя немцы купілі 700 чалавек. Адправілі нас у Германію, а ў які горад, цяпер не помню. Там мы рабілі нейкія часткі, відаць, да самалётаў. Сяміпавярховы дом літарай «П» цягнуўся. У гэтым доме мы жылі. Больш здаровыя дзяўчаты працавалі на гэтым заводзе, але многія наўмысна атручваліся газамі, каб хутчэй памерці.

Помню, наляцелі амерыканскія ці англійскія самалёты і бамбілі ўсю ноч. Кругом усё было ў руінах. Наш дом толькі адзін застаўся. Яны, пэўна, ведалі, што тут вязні.

На другі дзень нас пагналі ў другі горад. Там 3 тыдні пратрымалі, на работу не выводзілі, а потым адвезлі ў Чэхію.

Там нас і выратавалі з палону.

Салдацікі нашы, калі прыйшлі, дзівіліся, як мы выжылі. Яны расказалі нам, што ў кіламетры ад нас быў яшчэ адзін лагер. Там усіх фашысты атруцілі газам. Болей чым тысячу чалавек. Мы зноў цудам уцалелі.

Вельмі хацелася дамоў. Але мяне і яшчэ дзвюх дзяўчат узялі памочніцамі повара ў нашу часць. Там мы былі доўга. Толькі ў канцы 1945 г. гэту часць расфарміравалі і я прыехала ў родны Віцебск.

У снежні 1967 г. судом ваеннага трыбунала па справе групы карнікаў ГФП-703 былыя правакатары Сухаў, Брусаў, Бодзюх, Гусеў і іншыя іх саўдзельнікі прыгавораны да расстрэлу. Сведкай супраць абвінавачаных на судзе выступала і М.Ф.Ткачова.

Запісаў П.П.Бяляўскі.

З успамінаў Аляксандры Паўлаўны Пахомавай, жыхаркі Віцебска, былой удзельніцы падполля

Перад вайной мы жылі ў доме № 27 па вуліцы 2-й Стадыённай. Мой муж, Мікалай Рыгоравіч Пахомаў, працаваў на станцыі сувязі наглядчыкам. Мы мелі сына Валянціна і дачку Ніну. Насупраць у доме жыла сям'я Белахвосцікавых — 2 браты і 2 сястры. Старэйшы, Аляксандр Яфімавіч, працаваў начальнікам планавага аддзела аблвыканкома, Іван вучыўся ў тэхнікуме, сястра Лізавета была медсястрой у дзіцячым доме, Марыя займалася на курсах лабарантак.

Сям'я была дружная і працавітая. Наш сын моцна пасябраваў з імі, асабліва з Аляксандрам, нягледзячы на розніцу ва ўзросце. Калі пачалася вайна, ён часта стаў заходзіць да нас. Я завешвала вокны, мы пілі чай і адводзілі душу ў невясёлых размовах пра жыццё пад гнётам чужынцаў.

Да Аляксандра амаль штодня прыходзіў яго сябар Мікалай Сяргеевіч Баброў, які таксама да вайны працаваў у аблвыканкоме. Яны разам ішлі ў горад, іншы раз бралі з сабой Валянціна. Яны асабліва радаваліся, калі нашы самалёты рабілі налёты. А тым часам па гораду хадзілі чуткі, што нехта падае нашым лётчыкам сігналы.

У той дзень, калі ў Ілаўскім яры расстрэльвалі яўрэяў, сын рана паехаў з тачкай у тулаўскі лес па дровы. Вярнуўся ноччу. Я цэлы дзень не знаходзіла сабе месца, чакаючы яго. А назаўтра ўбачыла на галаве Валянціна шмат сівых валасоў. Аказваецца, ён сядзеў, стаіўшыся за дрэвамі, і чуў крыкі і стогны ахвяр. Пазней ён расказаў, што ў падпольнай групе ёсць 2 яўрэйскія хлопцы, якім удалося ўцячы ад расстрэлу. Пасля гэтага я ужо цвёрда ведала, што ён стаў на шлях барацьбы з ворагам.

Недзе ў сакавіку 1942 г. Валянцін уладкаваўся працаваць у 80-ы полк, дзе ўтрымліваліся т.зв. «казакі» з добраахвотнікаў, якіх рыхтавалі для карных аперацый супраць партызан. Сын працаваў на ўборцы двара. 13 чэрвеня яго страшэнна збілі: падазравалі ў дыверсіі — ноччу у паветра ўзляцеў склад з боепрыпасамі.

Твар хлопца быў у кровападцёках, кашуля ў крыві, прыліпла да спіны. Я кінулася да ўрача Івана Апанасавіча Пруднікава, які жыў непадалёку, на Палявой вуліцы. Той прыйшоў і пачаў апрацоўваць раны. Уся спіна сына была спаласавана, скура звісала шматкамі. Доктар здзіўляўся цярпенню Валянціна, які ні разу не ўскрыкнуў, а толькі кусаў губы.

У тым жа месяцы ад знясілення з-за недаядання памерла наша дачка, бо не заўсёды ўдавалася здабыць харч. Даводзілася есці крапіву і гнілое шалупінне, якое я іншы раз

здабывала праз нашых дзяўчат з нямецкай кухні.

Калі сын ляжаў пабіты фашыстамі, яго часта наведваў Аляксандр Белахвосцікаў. І вось аднойчы, калі я перасцілала Валянціну пасцель, з-пад матраца пасыпаліся лістоўкі, перапісаныя яго рукой. Гэта былі зводкі Саўінфармбюро. Са слязьмі на вачах я сказала сыну, што шлях, які ён выбраў, можа прывесці да яшчэ больш зверскіх катаванняў, а то і да шыбеніцы. «Страшней за тое, што вырабляюць фашысты, ужо нічога быць не можа», — адказаў мне Валянцін. — «Лепш дапамагай нам, мама, калі можаш».

Пасля гэтага і я плячом у плячо стала змагацца супраць фашысцкіх гадаў.

У жніўні 1942 г. Аляксандр даручыў мне звязацца з адным з атрадаў брыгады «Аляксея». Я звязалася з атрадам Ахметчыка, які стаяў у в. Міхалова Суражскага раёна. Мяне накіравалі ў в. Куракі ў штаб разведкі да Ільі Волкава. Той сказаў, што ім патрэбны звесткі аб важных нямецкіх аб'ектах, даў мне газеты, часопісы, лістоўкі. Усё гэта я перадала Аляксандру. Ад таго разу пачала хадзіць у атрад і перадаваць туды розныя звесткі, медыкаменты, шрыфты, сілкаванне для радыёапаратуры.

З падпольшчыкаў я добра ведала Паліну Шлякаву, Веру Аляксандраву, Міхаіла Ануфрыевіча Раманенку, Клаўдзію Шчуплікаву, Марыю Фёдараўну Ткачову, Івана Фёдаравіча Бязбогіна, ад якога атрымлівала вельмі каштоўныя звесткі, цераз яго даставалі пашпарты.

Апошні раз я была ў атрадзе 4.5.1943 г. ў Лісічыне. Шчарбакоў сказаў, што ў Віцебску арыштаваны 50 чалавек з групы Белахвосцікава і што калі Аляксандру і майму Валянціну пагражае небяспека, іх трэба неадкладна перавесці ў атрад.

Калі я вярнулася з атрада і перадала Аляксандру словы Шчарбакова, ён сказаў, што не можа пайсці і адпусціць Валянціна, бо ён яму неабходны. А як прачытаў запіску Веры, дадаў, каб я рыхтавалася, бо заўтра павязём з Верай у атрад 29 чалавек. І яшчэ папрасіў, каб ні я, ні сын пакуль да яго не прыходзілі, бо за ім, магчыма, устаноўлена слежка.

Назаўтра, 5 мая, сын пайшоў на работу і неўзабаве вярнуўся. Па яго твары я зразумела, што адбылося няшчасце. Валянцін паведаміў, што Аляксандр арыштаваны. Калі прыйшлі рабочыя, з'явіўся Маршалкоў і сказаў, што майстэрня сёння працаваць не будзе з прычыны арышту Белахвосцікава. Маршалкоў жыў у п. Качэргі, і бачыў, як Аляксандра вялі двое ў цывільным. Марыю, яго сястру, арыштавалі таксама, а ў іх доме пакінулі засаду.

Пацягнуліся дні, поўныя трывогі. Сын штодня хадзіў у майстэрню і адразу ж вяртаўся, бо не было яшчэ новага загадчыка. Вера Аляксандрава таксама была ў горадзе, але праз некалькі дзён раптам нечакана знікла. Паліна Шлякава лічыла, што дзяўчыну схапілі фашысты, якія ўжо даўно ганяліся за ёю.

Праз 2 тыдні пасля арышту Аляксандра я з сынам рашыла, што трэба выходзіць з горада. Але пераход да партызан ускладняўся тым, што 15 мая атрад перайшоў «жалезку» і цяпер невядома, дзе знаходзіўся. Мы вырашылі, што я пайду ў Скулавічы і праз Соф'ю Лафаенка паспрабую звязацца з партызанамі. У пачатку вёскі стаяў вялікі калгасны хлеў. З яго нечакана выйшлі 2 немцы і загналі мяне туды, дзе было ўжо каля 100 чалавек.

Нас прывялі ў Бялынавічы. Там у камендатуры абшуквалі, дапытвалі, білі. У поўнач з'явіўся паліцэйскі і выклікаў дзвюх маладзенькіх дзяўчат (ім было гадоў па 14 – 15). Праз некаторы час забралі наступную пару. Усяго выклікалі да сябе каля 30 дзяўчат. Прыкладна праз гадзіну іх прыводзілі назад. Аказваецца, п'яныя фашысты здзекваліся над імі. Дзяўчаткі плакалі, казалі, што павесяцца ці ўтопяцца. Назаўтра нас адправілі ў горад у канцлагер, які знаходзіўся на тэрыторыі былой люстэркавай фабрыкі па вул. Задунайскай.

Пацягнуліся жахлівыя дні здзекаў, муштры. Загадвалі, напрыклад, бегаць з аднаго боку корпуса ў другі, станавіцца на карачкі і гаўкаць па-сабачаму, стаяць на адной назе, спяваць пеўнікам...

19 чэрвеня мне аддалі пашпарт і выкінулі з лагера, я ледзь-ледзь дабралася дадому.

Вечарам з'явілася Паліна. Яна сказала, каб я не хвалявалася, Валянціна, майго сына, за гэты час адправілі ў партызаны. Гэта зрабіў Уладзімір Васілевіч Новікаў, новы партызанскі сувязны.

Паліна паведаміла, што была ў атрадзе і ўпэўнілася: гэта свой чалавек. Сустрэлі яе вельмі добра, далі заданне, і цяпер яна пачне разгортваць работу. Перадала прывітанне ад Валянціна. На пытанне, ці бачыла яго, адказала: не бачыла. Камандзір атрада лічыць, што мне туды ісці пакуль не трэба, група на

чале з сынам на заданні. І каб я таксама ўключылася ў работу.

Паліна і Уладзімір пачалі кіраваць групай, у якую ўвайшлі ўсе з групы Белахвосцікава, хто застаўся ў жывых — Міхаіл Раманенка, Іван Фёдаравіч Бязбогін, Клаўдзія Шчуплікава, Марыя Ткачова, Дзмітрый Сазонаў, Фёдараў, Васільеў, Артамонавы з Андронавіч, Пятровы і іншыя. Я таксама старалася выконваць розныя заданні. Нярэдка хадзіла на сувязь да партызан.

А ў канцы кастрычніка пачаліся арышты. Былі арыштаваны браты Іван і Антон Свечкіны. Узялі доктара Прудніка, ён быў рэнтгенолагам. Праз яго праходзіла моладзь, якую адпраўлялі ў Германію. Дзякуючы яму многія пазбеглі жудаснага лёсу. Забралі з вечарынкі Веру Загадскую.

21.11.1943 г. была аб'яўлена эвакуацыя Віцебска. У гэты дзень я даведалася, што ў падполлі былі здраднікі, і мой сын загінуў. Такі ж лёс напаткаў і Паліну Шлякаву.

Раніцай я стала прабірацца ў напрамку Гарадка. Я падышла да Заронава і далучылася да бежанцаў. Непадалёку грымелі баі. 8.2.1944 г. мы былі вызвалены Чырвонай Арміяй.

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

Дапамагалі як маглі

З успамінаў Вікторыі Генрыхаўны Дунке, удзельніцы Віцебскага падполля.

Да вайны я скончыла 2 курсы медінстытута. Жыла ў Віцебску разам з маці. Калі баі пачалі набліжацца да горада, мы пайшлі на ўсход. Але ўжо ля Дзямідава апынуліся на акупіраванай тэрыторыі і разам з іншымі знаёмымі вырашылі вярнуцца ў Віцебск. Тут мы сустрэліся з сястрой Аняй. Жонка афіцэра, яна жыла з сям'ёю да вайны пад Беластокам і ўспела прыехаць ў Віцебск. Дом наш згарэў, і мы пасяліліся на той жа вуліцы ў пустой хаце. Пакуль было што абменьваць на харч, неяк трымаліся. Пад восень я і сястра ўладкаваліся санітаркамі ў толькі што адкрытую ветэрынарную лячэбніцу. Тут жа размяшчалася і фельдкамендатура немцаў.

Сястра прыбірала памяшканне, дзе вёўся прыём жывёлы — яго рабіў ветфельчар Канстанцін Пятровіч Сатанаў, чалавек пажылы, перад акупантамі не выслужваўся. Ён жа загадваў і аптэкай лячэбніцы. А вось уборка склада медыкаментаў, які размяшчаўся ў асобным аднапавярховым цагляным будынку, уваходзіла ў мой абавязак.

Фельдкамендатура трымала пры сабе так званы рабочы ўзвод з ваеннапалонных, былых нашых армейцаў. Яны ўбіралі тэрыторыю, дастаўлялі прадукты, выконвалі розныя іншыя работы. Былі сярод іх і шафёры. А ім дазваляліся пад аховай раз'езды на грузавых машынах па гаспадарчых справах. Адчувалі яны сябе больш вольна, чым іншыя палонныя, часта заходзілі да нас на склад. У першую чаргу гэта Ілья Волкаў і Сяргей Сахараў. Аднойчы яны павялі гаворку пра свае сем'і, пра тое, як трапілі ў палон. Паступова гаворка тая набывала давер. Потым яны прыйшлі да нас дамоў і адважыліся папрасіць, каб мы дапамаглі ім ўцячы з палону, знайсці партызанскі атрад.

Мы задумаліся, як гэта зрабіць. І вось нам пашчасціла. У горад толькі што вярнуўся сын нашых суседзяў Валодзя Ляўшын, мусіць, апалчэнец, а цяпер партызан. Праз маці я перадала яму, што ведаю групу з 6 палонных, якія б хацелі ўцячы ў атрад. Я пазнаёміла іх з Ляўшынам, гэта было ў пачатку лета 1942 г. Дамовіліся аб часе, маршруце ўцёкаў. У першы вызначаны дзень уцячы не ўдалося. 10 чэрвеня, у абедзенны перапынак, мы з сястрой перадалі прыгатаваныя імі рэчы, што ляжалі ў нас, у т.л. і зброю. Сахараў пагрузіў іх у машыну і паехаў. Астатнія пайшлі да абранага для сустрэчы месца.

А назаўтра, калі мы прыйшлі на работу, то ўбачылі, што вокны склада наглуха забіты дошкамі. Афіцэр камендатуры, зайшоўшы на склад, лаяўся як толькі мог і дапытваўся, ці ведаем мы пра ўцёкі палонных. Папярэдзіў, каб больш нікога не пускалі сюды. Потым некалькі тыдняў немцы праводзілі пастраенне рабочага ўзвода, казалі, што ўсе ўцекачы злоўлены і пакараны.

Праз некалькі дзён прыйшла сувязная з атрада, перадала, што ўсе дабраліся да месца і прасіла пагаварыць з таварышамі, гатовымі ісці ў партызаны.

У гэты ж час была арыштавана дальняя сваячка Ляўшыных — Вера Іванаўна Царава, яна потым загінула ў гестапа. Пасля гэтага маці Валодзі Ляўшына і сястра Ліля пакінулі Віцебск і таксама пайшлі ў партызаны. На гэтым наша сувязь з атрадам «Граза» спыніла-

ся, але восенню 1942 г. праз сям'ю Гудзелавых мы звязаліся з атрадам «Марак» брыгады «Аляксея» і працягвалі выконваць заданні штаба.

Атраду патрэбны былі медыкаменты, перавязачныя сродкі. Мы бралі іх на складзе ветлячэбніцы. А чаго там не было, прасілі ў К.П.Сатанава, ён ахвотна даваў нам тыя лекі. Часта ў канцы тыдня ён і сам рыхтаваў нам пакеты, прасіў перадаць прывітанне тым, з кім мы сустракаемся, асцярожна распытваў пра навіны з фронту.

Фронт наблізіўся да горада. Пад прымусам нямецкіх прыслужнікаў, шэфа лячэбніцы мы былі вывезены 8.12.1943 г. ў Гродзенскую вобласць. Але праз некалькі месяцаў пачалося вызваленне Беларусі, і я закончыла вайну ў радах Чырвонай Арміі.

Пауль Кёрнер-Шрадэр

Улица Шрадера в Витебске. Что мы знаем о человеке, в чью честь названа улица?

Кёрнер-Шрадер, известный немецкий писатель-коммунист родился в 1900 г., умер в 1962 г. Внук участника революции 1848 г., сын батрака. В 1918 г. рядовой Шрадер принял участие в буржуазно-демократической революции в Германии, стал членом солдатского Совета, а через год вступил в Коммунистическую партию.

Шрадер прошел суровую школу революционной борьбы и подполья. В 1920–27 г. был на нелегальной партийной работе. С 1928 г. сотрудник и один из редакторов газеты «Роте фане» – центрального органа Коммунистической партии Германии. В 1929 г. осужден на 3 года каторжных работ за «литературную государственную измену».

Нацисты, пришедшие в 1933 г. к власти, занесли писателя-коммуниста в свои «черные» списки. В 1939 г. Кёрнер-Шрадер мобилизован в фашистский вермахт. Находясь на территории Польши и Чехословакии, помогает местным патриотам в борьбе с гитлеровцами.

С осени 1941 г. в составе санитарной роты Шрадер служит в Витебском госпитале. Он установил связь с подпольщиками, партизанами, обеспечивал их разведданными, медикаментами, оружием, документами, спасал советских военнопленных. О жизни в оккупированном городе, своих связях с витебскими подпольщиками и партизанами он рассказал в книге «Дневник немецкого солдата».

Кёрнер-Шрадер пишет о войне не как историк, а как очевидец из лагеря противника, как невольный участник бредового похода на Восток. Во вступительной статье к своей книге он подчеркивает:

«Глубоко убежденный, что гитлеризм потерпит крах, я с первого дня войны стал записывать все события, свидетелем которых был, чтобы со временем опубликовать их. Я и не предполагал, какую уйму фашистской бесчеловечности мне придётся переварить...

Трудно было сохранить все записи. В случае их обнаружения они могли стать уликой против меня. Я разработал целую систему понятного только мне шифра и с его помощью записывал свои наблюдения. Я счел необходимым сохранить точно названия мест, где мы действовали, имена людей, с которыми общались. Подчеркивая это, хочу пресечь попытки новых рыцарей похода на Восток объявить изложенные мною факты ложью».

Витебск. Энциклопедический справочник. Мн., 1988. С. 386.

З «Дзённіка нямецкага салдата»

«Эшелон медленно двигался по Белоруссии мимо сожженных скирд, разоренных сел, разрушенных городов. По ночам небо на востоке ярко пламенело. В отдаленни громыхал фронт.

Осенним вечером мы добрались до Витебска. Разгрузка была назначена на следующий день. Ночью боялись нападения партизан.

Более половины наших санитаров были оставлены на станции для охраны эшелона. Остальные разошлись искать подходящее помещение для госпиталя.

Спотыкаясь в полутьме, с автоматами наготове мы с Рейнике шли по разрушенному городу. Разбитые танки, мотоциклы, изуродованные автомашины, мебель из разоренных домов, разлагающиеся трупы.

– Такая пустыня, Карл, что вряд ли мы тут установим связь с людьми. Ни единой души, – мрачно изрек Рейнике.

Я подумал и сказал:

— Если есть опасность нападения партизан, дорогой Густав, то должны быть и партизаны. Будем надеяться...»

«Октябрь позади. Все в снегу, началась такая зима, какой мы ещё не видывали.

Я стоял со своим сейфом на шоссе, ловя попутную машину. Ящик — нелегкий, а мне нужно попасть в Полоцк. Там я должен был сдать месячный отчет фельдфебелю Бартлю.

На гребне высоты остановился конный отряд эсэсовцев. Они поджидали свой обоз. Какой-то унтер-штурмфюрер все время разъезжал вдоль шоссе и, истошно ругаясь, наводил порядок в своем эсэсовском войске.

Он увидел полевую кухню взвода связистов, тоже расположившегося возле дороги, и направился к ней.

Там он обнаружил постороннее живое существо: к сиденью был привязан закутанный в одеяло ребенок. Из маленького отверстия в одеяле облачками вырывался пар.

Унтер-штурмфюрер строго поглядел по сторонам и подозвал к себе одного из сопровождающих полевую кухню солдат. Тот вытянулся перед эсэсовцем во фронт.

Я тоже пошел к кухне, заинтересованный тем, что же будет дальше.

Указав хлыстом на привязанного ребенка, унтер-штурмфюрер заорал на солдата:

— Это еще что такое?

— Ребенок, господин унтер-штурмфюрер.

— Чей ребенок?

— Он уже несколько недель при взводе.

— Я спрашиваю, чей это ребенок?

— Бездомный, господин унтер-штурмфюрер. Мы его нашли и прихватили с собой.

Лейтенант эсэсовских войск схватился за пистолет.

— Значит, это русский ребенок?

— Так точно, господин унтер-штурмфюрер.

— Проклятая немецкая сентиментальность! — сказал он, выхватил пистолет и выстрелил ребенку в голову.

Он знал: все видят его «подвиг», и как можно спокойнее отошел от места «сражения». Вскочив на своего коня, он снова отправился наводить порядок в рядах своих войск.

Я почувствовал, как у меня горят подошвы ног. Горячая и холодная волна прокатилась по всему телу. Закружилась голова. У меня не было сил поднять руку, чтобы остановить проезжающие мимо автомашины.

Пожилой солдат-связист вытащил нож и обрезал постромки, державшие мертвого ребенка...»

Отрывки из «Дневника...» см. также на стр. 429—431.

Дзеці вайны

У час нямецкай акупацыі ішло варварскае знішчэнне сістэмы народнай адукацыі. Школьныя будынкі, палацы піянераў прыраўноўваліся да ваенных аб'ектаў і разбураліся ў першую чаргу, калі не былі патрэбны вайсковым часцям або камендатурам. У Беларусі было знішчана або пашкоджана 80% будынкаў агульнаадукацыйных школ, на Віцебшчыне — 1076 (61%)[1]. За час акупацыі быў знішчаны 20-мільённы кніжны фонд віцебскіх школ. Ні адно школьнае памяшканне ў Віцебску не выкарыстоўвалася па прамому прызначэнню — для навучання дзяцей. У іх размяшчаліся штабы, шпіталі, лазарэты, карныя органы ворага. Так, у будынку пеінстытута спачатку размясцілася каманда СД-9, якая чыніла расправу над непакорнымі беларусамі. На першым паверсе была канюшня. Пры адступленні немцы наогул спалілі будынак.

Сімваламі т.зв. «новага парадку» сталі віселіцы, трупы расстраляных нявінных людзей, машыны-душагубкі. Не шкадавалі і дзяцей, асабліва з партызанскіх сем'яў і вёсак. Нават грудных дзяцей называлі партызанамі і забівалі.

Юныя змагары разам з дарослымі пераносілі ўвесь цяжар вайны і па меры сваіх сіл дапамагалі Радзіме. Сярод партызан Беларусі налічвалася 34 342 навучэнцы (12,16% ад даваеннай колькасці вучняў)[2]. На тэрыторыі вобласці дзейнічала звыш 20 падпольных груп, якія складаліся пераважна з настаўнікаў і вучняў. У Віцебску такімі падпольнымі групамі былі групы Фёдара Мехава і Андрэя Гагулі («Чума», «Болт»), у якія ўваходзілі вучні 20-й і 25-й сярэдніх школ і члены іх сем'яў. А ўсяго ў падполлі горада, па няпоўных падліках, змагаліся 52 піянеры і школьнікі[3]. 34,6% юных герояў віцебскага падпол-

ля загінулі, 44% з іх узнагароджаны ардэнамі і медалямі.

Крыніцы:

1. Акты Чрезвычайных комиссий о злодеяниях гитлеровских военных преступников на территории Витебской области в 1941—44 гг., стр. 2.

2. П.К.Пономоренко. Всенародная борьба в тылу немецко-фашистских захватчиков. 1941—44. М., 1986. С. 129.

3. Падлікі зроблены па зацверджаных ЦК КП(б)Б спісах удзельнікаў Віцебскага падполля. *Н.І.Дарафеенка.*

Піянеры і школьнікі Віцебска — удзельнікі патрыятычнага падполля і партызанскага руху

АЎСЕЕВА (ДРАНКО) Ала Сяргееўна.

БАГДАНАЎ Аляксандр. Загінуў пры выкананні баявога задання.

БАРЧАНКА (ПРУДНІКАВА) Тамара Ермалаеўна.

БЕЛЯНЁВА (УЛАСАВА) Раіса Пятроўна.

БОНДАР Сяргей. Расстраляны фашыстамі.

БЫКАЎ Леанід Сямёнавіч (падпольная мянушка «Пецька»).

ВЯЛАВА (ФЯДОТАВА) Ганна Ларыёнаўна.

ВЯЛАЎ Аляксей Ларыёнавіч (падпольная мянушка «Малыш»).

ГАГУЛЯ Вольга Аляксандраўна. Расстраляна фашыстамі.

ГАЛКІНА Галіна Васілеўна.

ГРАБЯНЬКОЎ Дзяменцій Конанавіч. Расстраляны фашыстамі.

ГРАБЯНЬКОЎ Эдуард Давыдавіч. Расстраляны фашыстамі.

ГРЫНЯВІЦКАЯ Іда Ігнацьеўна. Не вярнулася з разведкі, прапала без вестак.

ДУДКІН Алег Раманавіч. Расстраляны гітлераўцамі ў кватэры.

ЕРАФЕЕЎ Іван Міхайлавіч (падпольная мянушка «Цыганок»).

ЖУРЫНСКАЯ (ДАМАРАЦКАЯ) Ада Адамаўна.

ЗАЛЕЦКІ Аляксандр Афанасьевіч.

ІВАНОВА Любоў Якаўлеўна.

ІВАНОЎ Аляксандр. Загінуў пры выкананні баявога задання.

ІВАНОЎ Віктар. Загінуў пры выкананні баявога задання.

ІВАНОЎ Міхаіл Іванавіч.

ІОТКА Алімпіяда Мікалаеўна. Расстраляна фашыстамі.

КАЛАБАНАВА Яўгенія Яўсееўна.

КІРЫЛЕНКА Канстанцін Іванавіч. Загінуў пры выкананні баявога задання.

КРАСНІКАЎ Ілья (Юлій) Іванавіч. Загінуў пры выкананні баявога задання.

КРУПКО Ларыса Якаўлеўна. Не вярнулася з разведкі, прапала без вестак.

КУЛАГІНА (АРЭХАВА) Ганна Сямёнаўна.

КУРАКОЎ Ізот Цімафеевіч.

ЛАЗОЎСКІ Яўгеній Іванавіч.

ЛАЗУКА Уладзімір Мікітавіч.

ЛАМАНОСЕНКА Генадзь Аляксандравіч.

ЛЕБЕДЗЕЎ Георгій Георгіевіч.

ЛЫНЧАНКА (ДРАЗДОВА) Дзіна Паўлаўна.

ЛЫНЧАНКА Мікалай Паўлавіч.

ЛЫНЧАНКА Эма Паўлаўна.

МАКРОЎ Уладзімір Васілевіч.

МАРТЫНАВА Любоў Фёдараўна.

МАСТЫКА Іван Андрэевіч.

МАСТЫКА (КУЗЁМКІНА) Ліля Андрэеўна.

МАРУДАВА (СТАХОЎСКАЯ) Галіна Трафімаўна.

НІКІЦІН Трафім Піліпавіч (падпольная мянушка «Тапор»). Расстраляны фашыстамі.

ПАХОМАЎ Валянцін Мікалаевіч. Расстраляны.

ПУШКАРОЎ Даніла Іванавіч. Расстраляны фашыстамі.

САКАЛОЎСКІ Павел. Расстраляны фашыстамі.

СТЭФКІН Яўген Рыгоравіч.

ТАРАСАЎ Уладзімір Пятровіч. Загінуў пры выкананні баявога задання.

ТЫЧЫНІН Уладзімір Мікалаевіч.

ФАДЗЕЕЎ Фёдар Андрэевіч.

ЮШЧАНКА Якаў Антонавіч.

Н.І.Дарафеенка.

З успамінаў А.В.Вурганавай

ВУРГАНАВА Антаніна Васілеўна нарадзілася 13.4.1928 г. ў Віцебску. Вучылася ў СШ № 1. Пасля вайны працавала ў Вільнюсе. Жыве ў Віцебску. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі.

Я отдыхала у своей тети в г. Рудня Смоленскай области, когда услышала страшное слово война. Без разрешения родных я возвратилась в Витебск, хотя это было очень опасно. Город горел, то тут то там раздавались взрывы. До прихода немцев наша семья

эвакуировалась в д. Церковщина. Здесь я сдружилась с местными ребятами. Мы всячески вредили врагу — поджигали скирды сена, строения. Осенью 1942 г. я впервые с отцом ходила на связь с подпольщиками в Витебск. Вскоре всю нашу семью немцы решили увезти в Германию на работы, но литовские партизаны отбили нас у фрицев. После этого я попала в партизанский отряд «За Родину», и под именем Таня ходила в засады, пускала под откосы вражеские эшелоны. Победу встретила в Вильнюсе.

З успамінаў А.А.Гарбачэўскага

ГАРБАЧЭЎСКІ Анатоль Аляксандравіч нарадзіўся 29.9.1929 г. ў Віцебску. Вучыўся ў СШ № 34. Пасля вайны жыве ў Віцебску. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

Летом 1942 г. моя тетя, Анастасия Матвеевна Германович, ушла в партизанскую бригаду Бирюлина. Я у нее и был связным. Но вскоре фашисты схватили нашу семью и всех вывезли в Германию. Там мы жили в очень тяжелых условиях. Но мне, к счастью, удалось бежать. Меня спрятал один поляк, у которого я и дождался освобождения. Когда пришли наши солдаты, стал сыном полка. Был ранен, почти 2 месяца пролежал в госпитале. После выздоровления попал в музыкальный взвод 195-го гвардейского стрелкового полка 66-й стрелковой дивизии. Победу встретил под Берлином.

З успамінаў В.М.Кульбеевай

КУЛЬБЕЕВА Валянціна Мікалаеўна нарадзілася ў 1928 г. ў Віцебску. Да вайны вучылася ў СШ № 6. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Жыве ў Мінску.

В город пришли немцы и сразу стали наводить свой порядок: грабить население и убивать мирных жителей. Вскоре я узнала, что на территории 5-го железнодорожного полка фашисты создали лагерь смерти. Вместе с подругами, рискуя жизнью, носили военнопленным еду. Но наши довоенные запасы быстро иссякли и, чтобы не умереть с голоду, пришлось ходить по деревням и обменивать различные вещи на продукты. Однажды я встретила разведчиков из партизанского отряда им. Чапаева бригады «Алексея». С тех пор стала партизанской связной. Помню свое первое задание — распространить листовки на Смоленском рынке, а также обменять продукты на бинты. Мне дали подпольную кличку — «Цыганочка». Участвовала в разгроме полицейского гарнизона в Билева. В том бою погибла моя лучшая подруга Женя Колобанова. В 1943 г. фашисты схватили меня, долго пытали, а потом отправили в концлагерь, расположенный в селе Гранки Смоленской области. Чудом удалось оттуда бежать.

З успамінаў Л.В.Марозавай

МАРОЗАВА Люба Васілеўна нарадзілася 28.4.1927 г. ў Віцебску. Да вайны скончыла 6 класаў СШ № 44. Пасля вайны скончыла БДУ. Жыве ў Мінску. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

Война пришла в наш город с воем сирен, непрерывными бомбежками, артиллерийской канонадой. Город был в огне, колонны беженцев двигались на восток. Наша семья не успела эвакуироваться. Чтобы выжить, мне пришлось устроиться грузчицей на хлебозавод. Там и познакомилась с Мусей Журинской. Как потом оказалось, на хлебозаводе действовала подпольная группа, в которую входили сестры Журинские, Ида Гриневицкая, Анна Косюбайтис, военнопленные Петр Жуков и Владимир Ануфриев. И меня они вовлекли в диверсионную работу. Мы собирали сведения о дислокации немецких частей и количестве личного состава. Всячески срывали работу завода, поскольку хлеб выпекался только для солдат противника. Украденный хлеб передавали нашим военнопленным. Вывозили мы его с хлебозавода в тайниках, оборудованных под сиденьями повозок. Являясь старшим диспетчером, Муся Журинская смогла организовать отправку хлеба партизанам. В отчете подпольного горкома партии было записано: «... Зимой 1942—43 гг. по поддельным документам было вывезено партизанам один раз 500 кг хлеба, второй —350». Гл. таксама артыкул «Падпольная група М.А.Журынскай».

З успамінаў Б.Р.Міроненкі

МІРОНЕНКА Барыс Радзівонавіч нарадзіўся 15.5.1928 г. ў Віцебску. Да вайны скончыў 5 класаў СШ № 11. Пасля вайны жыў і працаваў у Віцебску. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. Памёр у 1995 г.

В июне 1941 г. я отдыхал в пионерском лагере в Лосвидо, находился на берегу озера. Мы купались, веселились. И вдруг бомбежка... Все изменилось в нашей жизни. Пешком добравшись до города, увидел его уже разрушенным, в огне. А вскоре увидел и первую советскую патриотку, повешенную фашистами. И решил сражаться с фашистами. Первое, что я сделал, это подорвал наш тяжелый

танк (благо внутри были снаряды), который был оставлен из-за отсутствия горючего нашими войсками. Он находился на месте городского катка. При взрыве погибли 2 фашиста. Позже, вместе с сестрой Верой, мы находили в разрушенных городских аптеках медикаменты и передавали их в д. Подлубье, где в лесу укрывались наши раненые при отступлении воины. А потом был связным партизанской бригады «Алексея», которой командовал А.Т.Щербаков. Доставлял в город листовки, вел наблюдения за передвижениями немецких войск.

З успамінаў І.І.Мядзведзева

МЯДЗВЕДЗЕЎ Іван Іванавіч нарадзіўся 24.1.1930 г. ў Віцебску. Да вайны вучыўся ў СШ № 17. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі. Жыве ў Віцебску. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

В июле 1941 г. я узнал, что в д. Добрейки наши части при отступлении оставили склад боеприпасов. По ночам ходил туда, приносил домой гранаты, головые шашки, которые прятал в сарае. Потом их забирала моя тетя Варвара Александровна и переправляла в партизанский отряд Бонкарева. В 1943 г. после гибели матери я ушел к партизанам и стал разведчиком. Позже я стал сыном 75-го стрелкового гвардейского полка. Участвовал в освобождении Кенигсберга. Был ранен.

З успамінаў С.Т.Спірыдонава

СПІРЫДОНАЎ Спірыдон Трафімавіч нарадзіўся 17.12.1928 г. ў Віцебску. Да вайны скончыў 4 класы Заронаўскай школы Віцебскага раёна. Пасля вайны жыў і працаваў у Віцебску. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені.

Когда немцы стали бомбить город, я с матерью и сестрой прятался в бункере на одной из горок в Лучосе. Зима 1941–42 гг. оказалась не только холодной, но и голодной. Я с друзьями Василием Кудиновым и Игнатом Новиковым периодически ходили за маслом на маслозавод. Однажды, когда мы пытались открыть кран, к нам подошел немец. Было много людей, все просили его разрешить взять масла и не сердиться. Но фашист был неприступен — он открыл огонь из автомата по толпе. В 1943 г. меня отправили на работу в Германию, оттуда удалось бежать лишь в 1944 г. Перейдя линию фронта, я попал к нашим войскам, был в штабе переводчиком, занимался возведением переправ через реки Одер и Висла. Был ранен.

З успамінаў В.І.Шырынава

ШЫРЫНАЎ Віктар Іванавіч нарадзіўся ў 1927 г. ў Віцебску. Да вайны скончыў 6 класаў СШ № 3. Жыве ў Віцебску. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

Начало войны для меня — это пылающий Витебск, воздушный бой наших истребителей с немецкими бомбардировщиками. Враг пытался разбомбить Кировский мост. Наша семья хотела уйти из этого огненного ада, но не удалось. Начались наши страдания и бесконечные мытарства в поисках продуктов. От голодной смерти нас спасло то, что мама хорошо шила и ей иногда удавалось кое-что продать или обменять из вещей. Лишь в феврале 1943 г. мне удалось в районе Островно перейти линию фронта. Так я стал бойцом 113-го минометного полка, наводчиком минометного орудия. Принимал участие в освобождении родной Белоруссии, Восточной Прусии, Югославии, Болгарии.

З успамінаў Г.М.Юзава

ЮЗАЎ Георгій Мінавіч нарадзіўся 16.11.1928 г. ў Віцебску. Да вайны скончыў 6 класаў СШ № 24. Пасля вызвалення служыў у Чырвонай Арміі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені. З 1952 г. жыве ў Віцебску.

Придя в город, фашисты начали уничтожать мирных жителей, всячески над ними издевались. Нас, детей, они привлекали к строительству дорог, расчистке завалов. Работали мы с утра до позднего вечера. Я сдружился с Сашей Врублевским, Севой Пыльским, Анатолием Левидовым. Мы решили собирать оружие, чтобы потом уйти в партизаны. В Комлевском лесу мы обнаружили заброшенный военный склад, где было много снарядов, патронов, гранат и запалов к ним. «Загрузившись» боеприпасами, мы ушли в лес. В партизанский отряд им. Щорса бригады «За Советскую Беларусь» попасть нам помог связной отряда Павел Вишневский. Вскоре я получил свое первое боевое крещение — фашисты проводили карательную операцию. Шквальным огнем встретили народные мстители непрошенных гостей. Пришлось мне участвовать и в «рельсовой войне»: неоднократно ходил на подрыв железной дороги Витебск–Лепель. Особенно запомнился бой по уничтожению немецкого гарнизона в д. Сокорово Лепельского района. Ни один гитлеровец тогда не ушел от справедливого возмездия. После освобождения города я ушел в действующую армию.

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

1942 год — першая спроба вызваліць Віцебск

Контрнаступленне савецкіх войск пад Масквой пачалося 5—6 снежня 1941 г., ахапіўшы вялізны фронт шырынёй звыш 1000 км, і працягвалася да 7—8 студзеня 1942 г. За гэты перыяд войскамі Заходняга, Калінінскага і Паўночна-Заходняга франтоў былі праведзены значныя наступальныя аперацыі. З 2-й палавіны студзеня 1942 г. пачалося далейшае наступленне савецкіх войск на заходнім напрамку.

19 студзеня Стаўка ВГК вырашыла перадаць 3-ю і 4-ю ўдарныя арміі з Паўночна-Заходняга фронту ў склад Калінінскага. Былі пастаўлены і новыя задачы. У прыватнасці, гэтым ударным арміям было загадана наступаць на Вялікія Лукі і далей на Віцебск, Оршу, адрэзаць Смаленск з захаду і забяспечыць авалоданне гэтым горадам. Выканаць пастаўленую задачу поўнасцю не ўдалося. Тым не менш, войскі 3-й і 4-й ударных армій прайшлі наперад больш за 120 км і завязалі баі за Холм, Вялікія Лукі, Веліж. Глыбокае ўкліненне савецкіх войск у раёнах Вялікіх Лук і Веліжа моцна занепакоіла варожае камандаванне і выклікала ў яго трывогу за левы фланг армій «Цэнтр». 30 студзеня ў Віцебск было перакінута кіраўніцтва 3-й танкавай арміі і пастаўлена задача арганізаваць абарону паўночна-заходняга фланга цэнтральнай групы армій на стыку 9-й арміі і групы армій «Поўнач». У склад гэтай танкавай арміі былі ўключаны 59-ы армейскі корпус і іншыя злучэнні і часці. (Разгром немецко-фашистских войск под Москвой. М., 1964. С. 337).

Да раніцы 22 студзеня склалася наступнае становішча. Праціўнік, сканцэнтраваўшы ў раёне Віцебска новыя сілы, меў на мэце затрымаць рух Чырвонай Арміі наперад і арганізаваць абарону на рубяжы Веліж — Дзямідаў, каб адрэзаць шлях савецкім войскам на Віцебск. Вяліся абарончыя работы ў раёнах Веліжа, Віцебска, Дзямідава, Рудні і ў іншых месцах. Вораг баяўся страціць ракады Невель — Веліж, Дзямідаў — Духаўшчына — Ярцава, Віцебск — Смаленск.

Вось што пісаў пра гэтыя падзеі былы камандуючы 4-й ударнай арміі Маршал Савецкага Саюза А.І.Яроменка ў кнізе «В начале войны»: «4-я ўдарная армія ўпарта рухалася наперад, праследуючы і знішчаючы рэшткі разбітых часцей праціўніка, ламаючы супраціўленне ар'ергардаў адыходзячых часцей і перадавых атрадаў. За 8 дзён з 22 да 30 студзеня армія прайшла наперад з баямі 100—115 км і выйшла ў раён Веліжа. За гэты час мы разгромілі значныя сілы праціўніка, знішчылі некалькі тысяч гітлераўцаў і захапілі многа трафеяў» (М., 1965. С. 451).

Пры выхадзе на рубеж Веліж — Усвяты — Чырвоны Луч камандаванне 4-й ударнай арміі прыняло рашэнне: дзеючым на правым фланзе 249-й стралковай дывізіі і 51-й стралковай брыгадзе наступаць на Віцебск і авалодаць ім.

Камандзір дывізіі генерал-маёр Г.Ф.Тарасаў, выконваючы пастаўленую задачу, загадаў прыдадзенай яму 51-й брыгадзе (камандзір палкоўнік А.Н.Фёдараў) узяць Сураж, а 249-й дывізіі авалодаць Віцебскам. Але аказалася, што да таго часу ў Сураж немцы перакінулі значныя сілы. 51-я брыгада ўцягнулася ў зацяжныя баі.

Перадавыя часці 249-й дывізіі 3 лютага наблізіліся да горада, выявілі разгорнутыя дывізіі праціўніка на яго ўскраіне. Быў спынены рух, каб разабрацца ў становішчы. У гэты час Г.Ф.Тарасаў атрымаў загад камандуючага арміяй А.І.Яроменкі аб спыненні руху на Віцебск. Камдыў вырашыў хутка адарвацца ад праціўніка. Гэта яму ўдалося, і да раніцы 5 лютага дывізія выйшла ў раён в. Астраўскія (40 км ад Віцебска).

51-я стралковая брыгада разам з 249-й стралковай дывізіяй не змаглі ўзяць Сураж. 249-я дывізія была выведзена ў армейскі рэзерв, а 51-я брыгада заняла абарону на поўнач ад Суража.

249-я стралковая дывізія засталася непераможнай, яна заслужыла у гэтых баях высокае званне гвардзейская і ўзнагароджана ордэнам Леніна. З яе радоў выйшла нямала герояў. Лейтэнант Мішкін — майстар нечаканых налётаў на ворага, падпалкоўнік Назарэнка і капітан Андрэеў — баявыя камандзіры авангардных часцей, батальённы камісар Гаўрылаў. Вызначыліся ў баях у гэтыя дні сяржанты Вялікотны і Фартфуддынаў, якія знішчылі дзесяткі гітлераўцаў. Разведчыкі Прылепін і Палякоў толькі ў адным баю знішчылі да 70 гітлераўцаў. Незвычайную кемлівасць і смеласць праявілі артылерысты. Пад кулямётным агнём ворага яны падпаўзлі да пакінутай у паніцы ворагам батарэі 105-мм пушак, павярнулі іх у бок былых гаспадароў і адкрылі прыцэльны агонь. Больш сотні снарадаў выпусцілі героі па ворагу, знішчылі шэсць кулямётных кропак і да дзесятка машын...

Удзячныя віцябчане назаўсёды захаваюць памяць аб тых героях, што ў суровыя дні зімы 1942 г. сваёй мужнасцю, верай і надзеяй на перамогу нашай савецкай Радзімы акрылілі жыхароў Віцебшчыны, зарадзілі надзею на хуткае вызваленне.

Першая спроба вызваліць Віцебск ад ворага не ўдалася. Разам з тым, у выніку зімовага наступлення 1941—42 гг. 3-я і 4-я ўдарная арміі на 40-кіламетровым участку фронта прарвалі абарону праціўніка, утварыўшы паміж Веліжам і Усвятамі так званыя Віцебскія (Суражскія) «вароты», якія мелі важнае значэнне для развіцця партызанскага руху на Беларусі. Гэтыя «Вароты» дзейнічалі з лютага да 28 верасня 1942 г. Гл. таксама артыкул Віцебскія «вароты». *М.Ф.Крывёнак.*

Віцебскія «вароты»

Віцебскімі (Суражскімі) «варотамі» называюць 40-кіламетровы пралом у лініі фронту на стыку нямецка-фашысцкіх груп армій «Поўнач» і «Цэнтр» паміж Веліжам і Усвятамі, які стварыўся ў выніку наступлення савецкай 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту ў ходзе Тарапецка-Холмскай аперацыі (9.1—6.2.1942) і вызвалення прыфрантавых раёнаў партызанамі атрадаў М.Ф.Біруліна, М.І.Дзячкова, М.П.Шмырова, Я.З.Захарава. Віцебскія «вароты» дзейнічалі з 10 лютага да 28.9.1942 г. Подступы ўтрымлівалі часці 4-й ударнай арміі і партызанскія брыгады 1-я і 2-я Беларускія. Праз «вароты» партызаны падтрымлівалі кантакты з Віцебскім абкомам КП(б)Б і аблвыканкомам, якія размяшчаліся на тэрыторыі Усвяцкага і Веліжскага раёнаў Смаленскай вобласці, з Паўночна-Заходняй аператыўнай групай ЦК КП(б)Б, камандаваннем 4-й ударнай арміі; у тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты, літаратура; з акупіраванай тэрыторыі выходзілі партызанскія атрады на перафарміраванне, добраахвотнікі, каб уступіць у Чырвоную Армію, насельніцтва, якое ратавалася ад карнікаў (эвакуіравана ў савецкі тыл каля 200 тыс. чалавек — жанчын, старых, дзяцей), ішлі абозы з прадуктамі ў фонд Чырвонай Арміі, у маі—чэрвені 1942 г. партызаны 1-й Беларускай брыгады сабралі і пераправілі ў Савецкі фонд абароны каштоўнасці на 7 млн. руб.

Гітлераўцы неаднойчы спрабавалі ліквідаваць «вароты». У пачатку верасня 1942 г. яны сцягнулі ў гэты раён вялікія сілы пяхоты з артылерыяй і танкамі, у ноч на 25.9.1943 г. пачалі наступаць. Найбольш жорсткія баі партызаны вялі каля в. Пунішча, Пудаць, Булы Суражскага раёна, Дразды, Шмыры, Мялыні Усвяцкага раёна Смаленскай вобласці. Атрад імя Курмялёва суткі трымаў абарону супраць суражскай групоўкі праціўніка каля в. Пунішча, знішчыў каля 300 карнікаў, 2 танкі і толькі з-за недахопу боепрыпасаў адышоў на новыя абарончыя рубяжы. 27 верасня ўвесь дзень ішлі баі ў раёне вёсак Шмыры і Мялыні, і толькі ўначы, пасля інтэнсіўнай артылерыйскай падрыхтоўкі, праціўніку ўдалося заняць в. Мялыні; 28 верасня карнікі занялі вёскі Шмыры, Шэршні, Карпекіна і інш. і закрылі Віцебскія «вароты».

У памяць аб баявых дзеяннях савецкіх воінаў і партызан у в. Заполле Віцебскага раёна ў 1977 г. пастаўлены помнік (скульптар В.Ягадніцкі), які сімвалізуе Віцебскія «вароты». *І.П.Хаўратовіч.*

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (1941—1945). Энцыклапедыя. Мн. 1990. С. 134.

Помнік у гонар Віцебскіх «варот» у в. Заполле Віцебскага раёна.

Да Віцебска — 4 кіламетры

1 лютага 1942 г. 249-я стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр Герман Фёдаравіч Тарасаў, начальнік штаба маёр Мікалай Мацвеевіч Міхайлаў з 51-й стралковай брыгадай, 141-й асобнай танкавай брыгадай, 67-м і 68-м асобнымі лыжнымі батальёнамі начнымі пераходамі пачалі выходзіць на рубеж для захопу Віцебска. Да раніцы часці дывізіі выйшлі ў раён Суража. Пра падзеі тых дзён сведчаць архіўныя звесткі, якія змешчаны ніжэй.

Дакументы сведчаць

БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ 249-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ 1—7.2.1942 г.

«925-й стр. полк 249-й стр. дивизии находился в районе Моршаки — Крюки — Островские, 921-й стр. полк 249-й стр. дивизии — в районе Захаренки — Сазаны — Сапраны — Пунище, 917-й стр. полк в районе Селища — Стикино — Храпаки.

К утру 2.2.42 г. части дивизии вышли в район Терешки — Сеньково — Трегубцы, 925-й стр. полк — в район Верховские поселки — колхоз «Колос», 921-й стр. полк в район Сеньково, 917-й стр. полк в район Трегубцы, 67-й лыжбат — в район Лужесно, 68-й лыжбат в район Хмары. Противник почти все время бомбил и обстреливал наши части с самолетов. Потери за 1.2.1942 г. составили: убитыми — 5, ранеными — 26 человек.

2 февраля противник силою до 2 полков пехоты с танками и артиллерией разного калибра подготавливал г. Витебск к упорной обороне. Его передовые части ведут бой с нашими частями на рубеже: Лужесно — Тетерки — Совари — Сураж.

Авиация противника в течение 2.2.42 г. почти беспрерывно бомбила дороги и районы расположения частей дивизии.

К 24.00 3.2.42 г. части дивизии сосредоточились: 925-й стр. полк — район Лужесно — Михеево — Букатино — Ризы, 917-й стр. полк — район Тетерки, 921-й стр. полк — район Койтово — Железняки. 51-я стр. бригада продолжает бой за Сураж, 67-й лыжный батальон в районе Верховья.

3 февраля бой продолжался ночью. К 3.00 925-й стр. полк, истребив до 300 фашистов, овладел Букатино — Михеево — учхоз. В 5.00 атаковал противника в Лужесно, в 7.15 занял его.

В 12.00 925-й стр. полк вступил в бой в районе д. Косолапиха с подошедшей колонной противника численностью до 500 человек пехоты, пытавшейся обойти полк с северо-западной стороны. Атака противника была отбита. Немцы, потеряв до 60 человек, отошли на 300 — 400 м западнее д. Косолапиха. Авиация беспрерывно бомбит и обстреливает боевые порядки 925-го стр. полка. За 3.2.42 г. 925-й стр. полк потерял: убитыми 56 человек, ранено — 51.

917-й стр. полк с 67-м лыжным батальоном к 5.00 занял Тетерки. В 11.30 вступил в бой с колонной противника до 500 человек с 2 танками, наступавшей с юга на Тетерки. 917-й стр. полк потерял: убитыми — 3, ранено — 9.

В 14.00 танки противника вели огонь по д. Тетерки из леса, зажгли 6 домов. Тетерки удерживаются 917-м стр. полком. Танки отошли в южном направлении.

921-й стр. полк ведет бой за Совари. В течение 3.2.42 г. противник численностью до 300 человек упорно обороняется.

3 февраля 249-я стр. дивизия вышла на рубеж 4 км северо-восточнее г. Витебска.

5 февраля 249-я стр. дивизия с 51-й стр. бригадой, 62-м, 67-м, 68-м лыжными батальонами имели задачу овладеть Суражем, истребить в нем гарнизон, после чего сосредоточиться в районе Кошевичи.

921-й стр. полк 4.2.42 г. вел бой за Совари. Группа противника, засевшая в домах, оказывала упорное сопротивление. К утру 5.2.42 г. полк вышел в район Горькава — Моршани — Будница и находился в резерве командира дивизии, к 6.2.42 г. подготавливал позиции в районе Гайдуки, обеспечивая заслоном с юго-востока операцию в местечке Сураж.

925-й стр. полк к 20.00 3.2.42 г. после упорного сопротивления, отражая неоднократные контратаки противника, под его сильным контрударом оставил Лужесно, отошел на север и к 7.00 4.2.42 г. вышел в район Авдеевичи — Сеньково — Ковали, повел наступление на Белыновичи. Противник, численностью до 500 человек, при поддержке 7 танков контратаковал 925-й стр. полк из Белынович.

Под давлением противника полк отошел в Сеньково. Фашисты, понеся потери до 100 человек убитыми и 6 подбитых танков, приостановили движение и до наступления 4.2.42 г. вели огневой бой на рубеже Сеньково, сожгли занимаемые им пункты.

К утру 5.2.42 г. 925-й стр. полк сосредоточился в районе Беликово – Островские, имея задачей со взводом ПТР 51-й стр. бригады занять позиции на западной окраине Горькаво; Клюки, заслоном обеспечить операцию на м. Сураж.

Колонны частей дивизии на марше в течение всего дня бомбились и обстреливались авиацией противника. От бомбежки и обстрела с воздуха за 4.2.42 г. и боев за Совари и под Сеньково части понесли потери ранеными и убитыми до 150 человек.

6.2.42 г. дивизия продолжает выполнять прежнюю задачу по овладению м. Сураж, к утру 6.2.42 г. части дивизии вышли на исходный рубеж для атаки.

917-й стр. полк атаковал южно-восточную окраину м. Сураж и к 12.00 под сильным огнем противника достиг рубежа 300 м восточнее м. Сураж. При отражении атаки противник применял танки.

921-й стр. полк к 7.00 вышел в район Гайдуки – Шапурово – Болоши, ведет разведку противника, препятствует подходу резервов с юго-восточной стороны.

Дивизия подошла к Витебску на 4 км, но, не имея поддержки, достаточной для дальнейшего продвижения вперед, получила приказ командующего 4-й ударнай армии вернуться назад и овладеть сначала Суражем и Велижем.

7 февраля 249-я стр. дивизия была выведена в резерв командующего 4-й ударной армией».

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 16-й гв. сд., воп. 1, спр. 12 – 13, л. 71 – 75 і 109.

Так закончылася яшчэ адна, вельмі цікавая і мала каму вядомая старонка баявых дзеянняў за Віцебск.

Савецкія байцы паказвалі прыклад мужнасці, адвагі і гераізму. Напрыклад, у баях пад Бабінічамі на 925-й стралковы полк (меў 300 чалавек) немцы кінулі да 500 чалавек пяхоты і 21 танк. Чырвонаармеец – кулямётчык Бабылёў, нягледзячы на танкі, якія рухаліся на яго, працягваў расстрэльваць праціўніка. Бабылёў загінуў разам з кулямётам пад гусеніцамі нямецкага танка.

За геройства і адвагу ў перыяд наступальных баёў (студзень – люты 1942 г.) пад Віцебскам 311 чалавек былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

16 лютага 1942 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 249 стралковая дывізія была перайменавана ў 16-ю гвардзейскую, а 16 сакавіка ўзнагароджана ордэнам Леніна. Гэта была другая гераічная дывізія, што атрымала ў той цяжкі час такое высокае званне за баі пад Віцебскам.

Надзея набывае крылы

Зіма 1942 г. Нямецкія перадавыя часці прайшліся агнявым катком па Віцебшчыне і рушылі на ўсход. На акупіраванай тэрыторыі ўстанаўліваўся так званы новы парадак. Зняволены народ быў пазбаўлены ўсялякай аб'ектыўнай інфармацыі. Хадзілі розныя супярэчлівыя чуткі. У вёсках, дзе і гарнізонаў нямецкіх нават не было, людзі жылі ў цяжкім няведанні – чуткамі.

А чуткі былі самыя няўцешныя. Гаварылі, што і Масква ўжо ўзята ворагам, і немцы ўжо нават амаль да Урала дайшлі.

Раптам дзесці ў студзені людзі ўбачылі, як занепакоіліся акупанты. І тут даведаліся, што Чырвоная Армія не толькі не разбіта, але і разбіла немцаў пад Масквой, што да нас ідуць з баямі савецкія войскі. У сэрцах савецкіх людзей успыхнула надзея на хуткае вызваленне. Смялей сталі дзейнічаць народныя мсціўцы.

А ўначы на 1 лютага партызаны атрада Біруліна сустрэліся з разведчыкамі 249-й стралковай дывізіі.

У тую ж ноч адна з армейскіх разведвальных груп увайшла ў в. Лушчыха Віцебскага раёна. Разведчыкам патрэбен быў праваднік. Дапамагчы пагадзіўся мясцовы хлопчык Міша Баброў. Ён правёў найкарацейшым шляхам да в. Шалыгі 2 падводы, на якіх ехалі байцы, і 9 разведчыкаў на конях. Да вёскі заставалася каля 4 км, калі камандзір разведчыкаў спыніў правадніка і падзякаваў за дапамогу.

У вёсцы нават не было чутна сабак, быццам бы вымерла яна. Разведчыкі спешыліся і падышлі да першай хаты. Стук у дзверы разбудзіў Піліпа Шарцава. Разведчыкі папрасілі паказаць дарогу ў некаторыя населеныя пункты. Выехалі на Вялікалуцкі тракт, павярнулі ў бок пасёлка Вярхоўе. Рабочы пасёлак спаў. Даехалі да Цяцерак. Ад гэтай невялікай вёсачкі, што размясцілася на высокім беразе ракі, ехалі па вузкіх палявых і лясных дарогах. Ціха праскочылі вёску Рызы, выехалі ў Лапіцкі лес.

Світала, калі заехалі ў в. Каралёва. Спыніліся ля канторы калгаса імя Чапаева. У любой вёсцы чалавек на вачах, тым больш новы. Праз некалькі хвілін у канторы сабраліся калгаснікі. Людзі плакалі ад радасці. Мужчыны дзяліліся курывам, жанчыны частавалі хлебам і малаком.

Камандзір расказаў пра разгром немцаў пад Масквой, новае наступленне Чырвонай Арміі.

За в. Каралёва на Вялікалуцкім тракце разведчыкі сустрэлі сані з двума седакамі. Шарцаў уважліва прыгледзеўся да іх. Гэта былі паліцаі Казачэнка і Шнэйдэр, якія ехалі ў Віцебск. Здраднікаў звязалі. Пасля спыніліся ля в. Трыгубцы. Разведчыкі праверылі паклажу паліцэйскага партфеля. Сярод папер былі спісы юнакоў і дзяўчат Нікалаеўскага сельсавета, падрыхтаваных для ўгону на катаржныя работы ў Германію. За здраду Радзіме паліцэйскія былі расстраляны.

Другога лютага перадавыя часці 249-й стралковай дывізіі, якой была пастаўлена задача вызваліць Віцебск, занялі на яго подступах вёскі Сувары, Койтава, Чырвоны Двор, Лушчыха, Нікалаева, Трыгубцы, Малыгі, Сушчова і Вярхоўе.

Калі нашы наблізіліся да Суража (гэта была 51-я стр. брыгада), камандаванне нямецкага гарнізона выслала групы сувязных у іншыя гарнізоны з просьбай аб дапамозе. Адна з такіх груп 5 лютага выйшла праз хутар Наўлокі да в. Нікалаева. Немцы не маглі нават падумаць, што тут знаходзіцца падраздзяленне Чырвонай Арміі.

Вось як расказвае пра гэты візіт Н.Е.Ганчарова: «5 лютага 1942 г. а дванаццатай гадзіне я вярталася з вёдрамі ад студні, гэтак метраў за 300 ад нашай хаты. Раптам да мяне наблізілася з боку торфазавода «20 год Кастрычніка» 6 узброеных вайскоўцаў у белым адзенні. Я падумала, што гэта чырвонаармейцы з вайсковай часці, што знаходзілася ў нашай вёсцы. Яны ішлі за мной, ціха гаманілі між сабой. Так следам яны і ўвайшлі ў хату, і толькі тут я зразумела, што гэта немцы. Яны селі за стол ля вакна, а ў гэты час па вуліцы прайшло некалькі нашых байцоў. Убачыўшы іх, немцы адхіснуліся ад вакна, закрылі дзверы на кручок і сталі рыхтавацца да бою. Я сказала сыну, каб збегаў да суседзяў і сказаў, што ў нас немцы.

Немцы так былі заняты падрыхтоўкай да бою, што на сына Толю не звярнулі аніякай увагі нават тады, калі ён адкінуў кручок і выйшаў на вуліцу. Я бачыла, як ён перабег дарогу і знік у суседнім двары. А праз некалькі хвілін хата была акружана чырвонаармейцамі. Немцы спрабавалі выскачыць і прарвацца да лесу, але іх усіх пабілі. У той жа дзень вечарам нашы пайшлі з вёскі».

Разам з падраздзяленнямі 249-й стралковай дывізіі партызаны пад камандаваннем М.Ф.Біруліна разграмілі нямецкія гарнізоны ў пасёлках Лужасна і Мазалава. Вызначыліся партызаны Данііл Тарабаеў, Іван і Сяргей Раманавы, Рыгор Аўсянка, Рыгор Юпатаў, Аляксандр Капышка, Лех Карнееў.

Акрамя бацькоў Біруліна ў баях прымалі ўдзел хлопцы з групы В.А.Хабарава — Рыгор Сысоеў, Васіль Азеўш, Іван Крыцкі, Аляксандр Ганчароў і інш.

Страціўшы больш за сотню салдат і афіцэраў, пакідаўшы ўсю маёмасць і транспарт, у т.л. 150 коней, гітлераўцы пабеглі ў бок Віцебска. Партызанам дасталося каля 15 т пшанічнай мукі, 25 т зерня. Уся гэта здабыча была перададзена Чырвонай Арміі.

Каб затрымаць далейшае наступленне нашых часцей, праціўнік ужо 3 лютага пачаў разгортваць пад Віцебскам воінскія часці, падцягнутыя з глыбокага тылу.

Пасля моцнага абстрэлу немцы ўварваліся ў вёску Койтава і, прачэсваючы дамы, у падполлі аднаго з іх знайшлі юнакоў Васіля Маскалёва, Мікалая і Казіміра Лескіных. Іх збілі. Вывелі на вуліцу і расстралялі. Але Маскалёва, на якога ўпалі браты Ласкіны, пулі не закранулі. Уначы ён дабраўся да партызан, расказаў ім, што натварылі гітлераўцы ў вёсцы і застаўся ў атрадзе, якім камандаваў Д.Ф.Райцаў.

У хуткім часе нашы часці адышлі з-пад Віцебска, але пакінулі надзею ў сэрцах жыхароў гэтага краю, што яны абавязкова сюды вернуцца.

Немцы, помсцячы мясцовым жыхарам за падтрымку Чырвонай Арміі, учынілі рэпрэсіі.

У в. Лужасна за дапамогу чырвонаармейцам гітлераўцы расстралялі Валянціна Малышава і Пятра Аляксеевіча Азеўша. У в. Матросы былі зверскі забіты члены сям'і Яроцкіх. Уварваўшыся ў в. Маркавічы Нікалаеўскага сельсавета, паліцэйскія пад кіраўніцтвам начальніка паліцыі Станкевіча схапілі і расстралялі Чжан Ванфу Варвару толькі за тое, што яе муж быў камуністам.

У выніку легендарнага рэйда 4-й ударнай арміі зімой 1942 г. адбыўся разрыў фронта нямецка-фашысцкіх войск ад Тарасенак (каля самага Суража) ад Усвят — райцэнтра Калінінскай вобласці. Гэты разрыў назвалі «Віцебскімі» або «Суражскімі» варотамі.

Разам з часцямі 249-й стралковай дывізіі з раёна баявых дзеянняў на Віцебшчыне выйшаў партызанскі атрад Біруліна. Да яго далучыліся рабочыя і служачыя вапнавага завода, жыхары пасёлка Вярхоўе.

Многія з іх удзельнічалі разам з падраздзяленнямі 4-й ударнай арміі ў лютаўскім разгроме нямецкага гарнізона ў Мікуліна і ў засадзе каля Дзямідава. Тут вораг страціў больш сотні салдат і афіцэраў. У канцы лютага яны ж разагналі паліцэйскую каманду і занялі Панізоўе. Тут акупанты хавалі вялікія запасы хлеба, а затым партызаны правялі смелы рэйд у раён Янавіч.

А напярэдзе яшчэ былі 3 доўгія гады вайны, у зыходзе якой у тыя далёкія дні ніхто з маіх землякоў цяпер ужо не сумняваўся.

А.А.Ганчароў.

* * *

Хлопчык Толя, які паведаміў аб групе немцаў, што зайшлі ў хату ў в. Нікалаева — аўтар гэтага артыкула, настаўнік з в. Вярхоўе Анатоль Аляксандравіч Ганчароў.

1943 год — пачатак 1944 г. — Чырвоная Армія набліжаецца да горада

Восенню 1943 г. пачаліся баі па выгнанню нямецка-фашысцкіх захопнікаў з усходніх раёнаў Беларусі, у т.л. з Віцебскай вобласці.

Войскі Заходняга (камандуючы генерал-палкоўнік В.Д.Сакалоўскі) і Калінінскага (рэарганізаваны 20.10.1943 г. ў 1-ы Прыбалтыйскі; камандуючы генерал-палкоўнік І.Х.Баграмян) франтоў у ходзе Смаленскай наступальнай аперацыі (7 жніўня—2 кастрычніка 1943) выйшлі да паўночна-ўсходняй і ўсходняй межаў Беларусі. Склаліся рэальныя магчымасці для выгнання фашысцкіх захопнікаў з Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

У кастрычніку і пачатку лістапада 1943 г. стаўка ВГК планавала ў ходзе зімовай кампаніі 1944 г. разгарнуць наступленне Чырвонай Арміі на вялізнай прасторы — ад Балтыйскага да Чорнага мора.

Для правядзення наступальных аперацый на заходнім тэатры ваенных дзеянняў прыцягваліся войскі Калінінскага (1-га Прыбалтыйскага), Заходняга і Цэнтральнага франтоў. У прыватнасці, перад Калінінскім франтам ставілася задача нанесці ўдар у агульным напрамку Віцебск — Полацк — Даўгаўпілс, каб у далейшым авалодаць сталіцай Латвіі — Рыгай. [Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМАРФ), ф. 132а, воп. 2642, спр. 34, л. 243].

У сувязі з наступленнем Чырвонай Арміі на тэрыторыі Беларусі і разгортваннем баявых дзеянняў па яе вызваленні перад падпольнымі партыйнымі органамі і партызанскімі фарміраваннямі паўсталі новыя задачы: арганізаваць узаемадзеянне з рэгулярнымі войскамі, аказваць ім дапамогу. З гэтай мэтай па распараджэнні Вярхоўнага Галоўнакамандуючага пры ваенных саветах франтоў ствараліся прадстаўніцтвы і аператыўныя групы Беларускага штаба партызанскага руху, якія павінны былі забяспечыць аператыўнае кіраўніцтва партызанскімі фарміраваннямі, што базіраваліся ў паласе будучага наступлення.

Імкнучыся абавязкова ўтрымаць Беларусь, гітлераўскае камандаванне сканцэнтравала тут вялікія сілы войск і стварыла моцную абарону. Гарады і гарадскія пасёлкі былі ператвораны ў апорныя пункты. Вакол Віцебска і іншых буйных населеных пунктаў ствараласа кругавая абарона, якая складалася з некалькіх абарончых рубяжоў траншэйнага тыпу. Па берагах шматлікіх рэк узводзіліся абарончыя ўмацаванні.

Вялікае спадзяванне гітлераўцы ўскладвалі на асеннюю распуціцу і бездарожжа ў гэтай лясіста-балотнай мясцовасці. Фашысцкія генералы не без падстаў лічылі, што ў гразь і слату савецкія войскі не змогуць пераадолець

абарону і паспяхова наступаць па раскіслых грунтавых дарогах.

Але насуперак іх прагнозам наступленне Чырвонай Арміі пачалося ў кастрычніку і вялося на шырокім фронце да канца 1943 г.

Першымі разгарнулі наступальныя дзеянні войскі Калінінскага фронту. Левафлангавыя арміі фронту 43-я і 39-я (камандуючыя генералы К.Дз. Голубеў, М.Э.Берзарын) 2 кастрычніка нанеслі ўдар на захад з мэтай завесці праціўніка ў зман і адцягнуць яго сілы ад раёна Невеля, дзе рыхтаваўся галоўны ўдар. У выніку ўпартых баёў савецкія войскі прарвалі варожую абарону, прайшлі наперад на 10 – 18 км і ўступілі на тэрыторыю Беларусі.

8.10.1943 г. воіны 84-га стралковага корпуса (камандзір генерал С.А.Князькоў), і рухомай манеўравай групы на чале з палкоўнікам П.Ф.Дромавым вызвалілі г.п. Лёзна. Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага 5 злучэнняў і часцей фронта атрымалі ганаровае найменне «Лёзненскія».

6 кастрычніка пасля паўтарагадзіннай артылерыйскай падрыхтоўкі перайшлі ў наступленне правафланговыя арміі Калінінскага фронту – 3-я і 4-я ўдарныя (камандуючыя генералы К.М.Галіцкі, В.І.Швяцоў). Яны наносілі галоўны ўдар на Віцебск з поўначы праз Невель у сутыку груп армій «Цэнтр» і «Поўнач». Пасля 2-дзённых баёў 7 кастрычніка моцны вузел супраціўлення ворага г. Невель быў вызвалены. Былі таксама ачышчаны ад гітлераўцаў 320 населеных пунктаў.

Невель, займаючы ключавое становішча на Віцебскім напрамку, меў вялікае аператыўнае значэнне для ваюючых бакоў. З вызваленнем гэтага горада спыніла функцыянаванне дарога Дно – Новасакольнікі – Невель, якая дазваляла фашыстам манеўрыраваць сіламі паміж групамі армій «Цэнтр» і «Поўнач». На стыку гэтых 2 груповак гітлераўскіх войск стварыўся 20-кіламетровы праём, не запоўнены войскамі.

Разумеючы ўсю небяспеку, што склалася, нямецкае камандаванне прыняло ўсе меры для таго, каб ліквідаваць прарыў савецкіх войск, адбіць Невель, аднавіць становішча. Яно спешна перакінула ў гэты раён 2 пяхотныя дывізіі з-пад Ленінграда, 5 пяхотных і танкавую дывізіі з паўднёвага крыла групы армій «Цэнтр». Тут таксама былі сканцэнтраваны ўсе эскадры 6-га паветранага флота. З 11 да 31 кастрычніка контратакі гітлераўцаў ішлі адна за другой.

У выніку ворагу ўдалося прыпыніць рух войск Чырвонай Арміі, але вярнуць Невель ён не змог. Тым не менш, войскі Калінінскага фронту, страціўшы ў кастрычніцкіх баях 56 474 чалавекі забітымі, параненымі і прапаўшымі без вестак, сваёй задачы не выканалі. Яны вымушаны былі праводзіць новую перагрупоўку сіл і рыхтавацца да працягу аперацыі на віцебскім напрамку (ЦАМАРФ, ф. 235, воп. 2642, спр. 34, л. 260).

У дырэктыве Стаўкі ВГК ад 16 кастрычніка адзначалася: «Войскі Калінінскага фронту пастаўленую задачу – авалодаць да 10 кастрычніка Віцебскам – не выканалі. Адной з прычын гэтага з'яўляецца неарганізаванасць наступлення войск фронту. Наступленне вядзецца не ўсімі сіламі фронту, больш-менш адначасова, а асобнымі арміямі на асобных участках фронту, што дае магчымасць праціўніку манеўрыраваць сваімі сіламі і ствараць кулакі для процідзеяння (ЦАМАРФ, ф. 132а, воп. 2642, спр. 34, л. 260).

На працягу лістапада нашы часці і злучэнні фронту атрымалі папаўненне, удакладнілі задачы. 13 снежня яны аднавілі наступленне, распачаўшы Гарадоцкую аперацыю, якая працягвалася да 31 снежня. Нашы войскі павінны былі нанесці ўдар 3-й танкавай арміі праціўніка і ліквідаваць гарадоцкі выступ, што стаяў на шляху нашых войск у наступленні на Віцебск.

«Раніцай 13 снежня, – успамінаў камандуючы 1-м Прыбалтыйскім фронтам Маршал Савецкага Саюза І.Х.Баграмян, – у дзень нашага наступлення зноў пацяплела, неба зацягнулася хмарамі, бачнасць пагоршылася да гранічнай, і камандуючы 3-й паветранай арміяй генерал-лейтэнант авіяцыі М.П.Папівін далажыў мне, што выкарыстоўваць авіяцыю будзе вельмі цяжка. Такім чынам, задача артылерыі ўскладнілася... Агнявая апрацоўка варожага пярэдняга краю, якая пачалася ў 9 гадзін раніцы, працягвалася 2 гадзіны, але з перапынкамі, таму што боепрыпасаў было недастаткова. Потым агонь быў перанесены ў глыбіню. Адначасова стралковыя часці рушылі ў атаку». (Баграмян И.Х. Так шли мы к победе. М., 1977. С. 272 – 273).

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы надвор'я, якія поўнасцю выключылі дзеянні нашай авіяцыі, 11-я гвардзейская, 4-я ўдарная і 43-я арміі прарвалі нямецкую абарону на фронце 15 км і 16 снежня прайшлі ўглыбіню на 25 км. Уведзеныя ў бой 1-ы і 5-ы танкавыя карпусы (камандзіры – генералы В.В.Буты-

коў, М.Г.Сахно) акружылі ў раёне станцыі Бычыха часці 4 пяхотных дывізій ворага, якія былі разгромлены. Да 20 снежня савецкія войскі вызвалілі больш за 500 населеных пунктаў.

Каб спыніць наступленне савецкіх войск, гітлераўскае камандаванне перакінула пад Віцебск новае падмацаванне — 2 пяхотныя дывізіі. Абапіраючыся на абарончыя рубяжы, якімі быў акружаны Гарадок, праціўнік аказваў стойкае супраціўленне. На подступах да горада 3 рубяжы абароны размяшчаліся ўшчыльную адзін за другім.

Рашаючы бой за Гарадок пачаўся 23 снежня. Перад атакай была праведзена разведка боем. Яна выявіла найбольш небяспечныя ачагі варожага супраціўлення. У 11 гадзін 23 снежня пачалася артылерыйская падрыхтоўка. Пасля гадзіннай артылерыйскай апрацоўкі перайшлі ў наступленне злучэнні 11-й гвардзейскай і 43-й армій. Разгарэліся рукапашныя схваткі ў траншэях і хадах зносін. Бой доўжыўся 36 гадзін, вёўся не толькі днём, але і ноччу.

Вечарам 24 снежня Масква салютавала войскам 1-га Прыбалтыйскага фронту, якія штурмам авалодалі горадам і буйнай чыгуначнай станцыяй Гарадок. Усяго ў ходзе Гарадоцкай аперацыі было вызвалена 1220 населеных пунктаў, знішчана больш за 65 тыс. і ўзята ў палон 3,3 тыс. гітлераўцаў (ЦАМАРФ, ф. 235, воп. 2074, спр. 829, Л. 13, 14).

Страты войск Калінінскага (1-га Прыбалтыйскага) фронту ў час Невельскай і Гарадоцкай аперацый (кастрычнік—снежань 1943) склалі 168 902 чалавекі, у т.л. незваротныя — 43 551 чалавек (Гриф секретности снят. Потери Вооруженных сил СССР в войсках, боевых действиях, военных конфликтах. М., 1993. С. 226).

Загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Гарадка, была аб'яўлена падзяка. 12 часцей і злучэнняў атрымалі ганаровае найменне «Гарадоцкія».

Развіваючы поспех, савецкія войскі перарэзалі чыгунку Полацк—Віцебск і 31 снежня падышлі да абарончага рубяжа на поўнач і захад ад Віцебска. Спробы прарваць яго не далі станоўчых вынікаў: не хапіла сіл, адчувалася стомленасць войск, адсталі тылы, з прычыны бездарожжа парушаўся падвоз боепрыпасаў. Па загаду Вярхоўнага Галоўнакамандавання войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта часова перайшлі да абароны. Рыхтавалася рашучае наступленне на Віцебск з паўночна-заходняга і паўднёва-ўсходняга напрамкаў. «... Менш паспяховымі былі дзеянні 3-й танкавай арміі, якая абаранялася на правым крыле групы армій, — пісалі гітлераўскія генералы. — У пачатку кастрычніка рускія прарвалі фронт каля Невеля ў раёне сутыку з 16-й арміяй (група армій «Поўнач»). Яны нанеслі шэраг удараў па напрамках, якія сыходзіліся з усходу і поўначы. Дывізія, якая абаранялася на левым флангу арміі, была разгромлена... Танкавая армія была адкінута да Віцебска, але там ёй не ўдалося замацавацца і ўтрымаць плацдарм на правым беразе Заходняй Дзвіны». (Вторая мировая война 1939—1945 гг. Перевод с нем. М., 1957. С. 222.) *М.Ф.Крывёнак.*

Прарваць абарону не ўдалося...

24 декабря 1943 г. Москва салютовала войскам 11-й гвардейской армии (командующий генерал-полковник К.Н.Галицкий), освободившим Городок и продолжавшим наступать к югу, в направлении Витебска. Но уже к исходу следующего дня стало ясно, что предстоят жестокие кровопролитные бои: 25 декабря, преодолевая упорное сопротивление, передовые части армии продвинулись всего на 4—5 км. Они стояли перед укрепленным рубежом противника, проходившим по линии Белодедово—Слобода—Боровка—разъезд Заручье—Шпаки[1]. Это была внешняя полоса обороны Витебска, расположенная в 25 км от него и имевшая 2—3 линии траншей полного профиля, проволочные заграждения и минные поля.

В 6—8 километрах южнее проходил второй рубеж, тянувшийся от Завязья через Городище к озеру Лосвидо. Был еще и третий рубеж — по линии река Пестуница—Михали—озеро Сосна, расположенный в 5—8 км от города.

Все населенные пункты и господствующие высоты в промежутках между ними гитлеровцы превратили в опорные пункты. Особенно основательно были укреплены те направления, где противник ожидал наступления наших войск, в частности, дороги, идущие из

Городка, Сиротина, Полоцка. В мощный узел обороны был превращен и Витебск.

Кроме того, противник прочно уплотнил свои боевые порядки на всем витебском направлении. Уже к 26 декабря против 11-й гвардейской, наступавшей правее, и 4-й ударной армий действовали 3-я и 4-я авиаполевые, 256-я и 197-я, 87-я, 211-я и 129-я пехотные дивизии немцев, часть сил 12-й пехотной дивизии[2].

С учетом мощной многополосной обороны противника и при незначительном превосходстве наших войск в пехоте задача, поставленная 11-й гвардейской и взаимодействовавшей с нею 4-й ударной армиям овладеть Витебском к 30—31 декабря, была невыполнима.

Казалось бы — 25 км! Но какими они стали для наших солдат и офицеров! Как свидетельствует командующий 11-й гвардейской армии генерал-полковник К.Н.Галицкий «... с 25 по 31 декабря войска армии продвинулись лишь на 5—7 км. За каждый метр отвоеванной земли приходилось платить великую цену — многими жизнями советских воинов...»

После неудачных попыток сходу пробиться к Витебску командующий 121-й гвардейской армии приказал войскам ударной группировки перейти временно к обороне и начать подготовку к дальнейшему наступлению. Эта подготовка длилась пять дней с 1.1.1944 г. по 5.1.1944 г. Соединения и части 8-го и 16-го гвардейских корпусов, которым предстояло действовать на главном направлении, были выведены в тыл, приведены в порядок, состав стрелковых рот за счет тыловых и спецподразделений доведен до 50 человек. Подтянули и отставшую артиллерию, и минометные части.

3.1.1944 г. с 13.00 до 18.00 проводилась разведка боем силами роты от каждой стрелковой дивизии при поддержке 2 артдивизионов. Она должна была уточнить истинное начертание переднего края обороны противника, его огневую систему, характер заграждений, захватить контрольных пленных. На всех направлениях разведроты были встречены организованным огнем пулеметов, минометов, артиллерии противника, и переднего края его обороны не достигли. Вскрыть огневую систему немцев, уточнить характер его заграждений не удалось.

4.1.1944 г. соединения ударной группировки армии в основном подготовку к наступательным действиям закончили и в ночь на 5.1.1944 г. заняли исходное положение для наступления[4]. По решению командующего оно должно было начаться с утра 5 января. Но из-за погодных словий перенесено на следующий день. 6.1.1944 г., отбив все контратаки противника, после артподготовки, продолжавшейся 50 минут, в 10.20 пехота и танки ударной группировки 11-й армии перешли в атаку.

Однако все происходило не так, как планировалось. В результате артподготовки огневая система на переднем крае оказалась не подавленной, и противник встретил нашу атакующую пехоту массированным огнем. Атака в самом своем начале захлебнулась. Пехота незначительно продвинулась вперед, залегла и завязала тяжелые затяжные бои за передний край.

Действия танков также развивались неудачно. 10-я гвардейская, 117-я и 89-я танковые бригады, перейдя в атаку, застряли в болоте и поддерживать действия пехоты не смогли. Отдельные танковые подразделения (89-й и 117-й ГБР) вклинились в оборону врага, но из-за отставания артиллерии сопровождения не были своевременно поддержаны ее огнем. И, наткнувшись на прочную противотанковую оборону, быстро выдохлись, понеся при этом большие потери.

16-й гвардейский стрелковый корпус, наступая на узком участке фронта частями 90-й, 31-й и 1-й гв. стрелковых дивизий, а также 89-й танковой бригады (1-го танк. корпуса) к 15.00 продвинулись на 400—800 м, выйдя к укрепленным узлам сопротивления противника — Ковальково — высота 174,6 — Сыворотка — был остановлен. Завязавшиеся бои, несмотря на усилия ударной группировки армии, не привели к успеху.

89-я гвардейская танковая бригада, форсировав безымянный ручей южнее д. Матрасы, попала в заболоченный участок местности и потеряла несколько танков, застрявших в топях. Танки же, преодолевшие болото, из-за глубокого снега продолжали движение на малых скоростях и явились хорошей мишенью для ПТО противника и его танков, курсировавших только по дорогам и на больших скоростях. Двигаясь мелкими группами, они расстреливали танки 89-й танковой бригады. В дополнение к этому полевая артиллерия противника также имела возможность вести по танкам прицельный сосредоточенный огонь. В результате боя в невыгодной для 89-й танковой бригады тактической обстановке она

потеряла в первой половине дня сожженными и подбитыми до 30 танков, и в дальнейшем уже не смогла оказать влияние на развитие боя.

16-я и 1-я гв. стрелковые дивизии к исходу дня достигли: 1-я — северо-западнее Сыворотка, 2-я севернее и северо-восточнее окраины Сыворотка, но овладеть этим пунктом в силу малочисленности пехоты не смогли.

В итоге упорных боев в течение дня соединения понесли потери:

90-я гв. стр. дивизия — убито 24 человека, ранено — 69.

31-я гв. стр. дивизия — убито 44 чел., ранено 123.

1-я гв. стр. дивизия — убито 28 чел., ранено — 135.

89-я гв. танк. бригада — из 50 танков Т-34 за день боя потеряно подбитыми 11, сгоревшими — 28, застрявшими в болоте — 4...

36-й стрелковый корпус имел задачу частью сил 11-й и 18-й дивизий ударом через озеро Лосвидо в направлении станции Дворы, Садёновка захватить к рассвету 7.1.1944 г. плацдарм на юго-восточном берегу озера.

В 1.30 27-й гв. стр. полк (11-й гв. стр. дивизии) с приданным дивизии 58-й гв. стр. полк (18-й стр. дивизии) начал наступление по льду через озеро Лосвидо в направлении Вострenки. Не доходя 400—500 м до юго-восточного берега, подразделения 27-го гв. стр. полка были встречены сильным пулеметным и артиллерийским огнем противника и залегли.

Обороняя южнее и восточнее берег озера, на всем протяжении немцы установили проволочные заграждения в 1—2 кола и спирали «Бруно», лед у берегов взорвали.

В 12.00 7.1.1944 г. после артналета подразделения 27-го и 58-го стрелковых полков возобновили наступление в прежнем направлении, продвинулись еще на 100—150 м и, встретив сильное огневое сопротивление, залегли. Отдельные группы бойцов все же достигли берега и закрепились на нем. Но, не имея поддержки и достаточных средств борьбы с численно превосходящим противником, наши воины отошли с берега и присоединились к главным силам. К исходу дня отошли на северный берег озера и оба полка. 18-я гв. стрелковая дивизия (без 58-го гв. стр. полка) в 5.30 7.1.1.1944 начала наступление через озеро Лосвидо в направлении населенных пунктов Могучево и Герасимово. Противник обнаружил движение по льду пехотных цепей, встретил их сильным огнем пулеметов, артиллерии и минометов. Но 51-й гв. стрелковый полк одним батальоном зацепился за южный берег озера и овладел мысом севернее Могучего.

В 13.00 противник 2 ротами с 4 танками предпринял контратаку, чтобы восстановить положение. Контратака была отбита. На остальных участках, встретив широкие полыньи, а на берегу проволочные заграждения, части дивизии были вынуждены отойти на северный берег озера Лосвидо...[5]

Бои с переменным успехом продолжались вплоть до 10.2.1944 г.

Документы тех дней свидетельствуют о кровопролитных сражениях на дальних подступах к Витебску. В «Журнале боевых действий 31-й гвардейской стрелковой дивизии 11-й гвардейской армии» день за днём записаны бои, в которых участвовали воины-гвардейцы этого соединения. Только за 8 дней боев, с 30 января 1943 г. по 2 февраля 1944 г. 31-я стрелковая дивизия потеряла 67 человек убитыми и 297 ранеными.

2.2.1944 г. в 6.00 дивизия полностью сменила 51-й гв. стр. полк. 18-я гв. стрелковая дивизия сосредоточилась: штурмовыми батальонами — в передовой траншее, батальонами вторых эшелонов — в лесу южнее Симовщина, вдоль дороги, юго-восточный берег (на полуострове) озера Зароновское, батальонам третьего эшелона — в районе отметки 155,2 в траншеях противника.

В 8.05 1/99-й гв. полк атаковал противника.

В 12.00 батальон повторил попытку овладеть траншеями, но залег перед проволокой и нес большие потери.

Потери: убито 65, ранено 147 человек (из 1/99-го гв. стр. полка).

Установлено: передний край обороны противника проходит от северной опушки леса восточнее Заполья и по западной окраине Топорино и оборудован инженерными заграждениями и другими оборонительными сооружениями.

3.2.1944 г. К 12.00 90-й гв. стр. полк вел бой на рубеже юго-западнее Топорино.

99-й гв. стр. полк в 13.00 овладел Топорино и вел бой на восточной окраине деревни.

95-й гв. стр. полк овладел высотами на перешейке между озерами Зароновское и Княжное, вел бой за Ковалево.

Потери: убито 75, ранено 178 человек.

4.2.1944 г. Овладели: 99-й гв. стр. полк — лесом 800 м западнее Малые Рубины; 95-й гв.

стр. полк — Ковалево—Субочево; 97-гв. стр. полк — рощей 800 и западнее Малые Рубины. К исходу дня закрепился на восточном берегу р. Пестуница.

Потери: убито — 94, ранено 365 человек[6].

* * *

О накале боев в зимние дни 1944 г. свидетельствуют следующие выдержки из «Журнала боевых действий 18-й гвардейской стрелковой дивизии»: 6.1.1944 г. — с 10.00 командиром дивизии и командирами полков проводилась рекогносцировка района озеро Лосвидо—Смоловка. 7.1.1944 г. — дивизия (без 58-го гв. стр. полка) с исходного положения Мариамполь; Ст. Двор в 5.30, пройдя по льду озера Лосвидо, находится в соприкосновении с противником на южном берегу озера и ведет бой за овладение лесом юго-западнее Могучего. Противник, обнаружив движение цепей, открыл сильный пулеметный огонь по боевым порядкам наступающих подразделений. 1/51-й гв. стр. полк, пройдя озеро Лосвидо, зацепился за южный берег у отдельного домика юго-восточнее Могучего, но, встретив сильное огневое сопротивление, залег и ведет бой с противником. 53-й гв. стр. полк, пройдя озеро Лосвидо за 51-м гв. полком, одним батальоном выбил противника из Могучего и закрепился на линии: Восточная опушка рощи западнее Могучего — юго-западная окраина Могучего. Стрелковые батальоны, переправившиеся на южный берег оз. Лосвидо, от огня противника несли большие потери, не имели возможности пополнять боеприпасы и эвакуировать раненых из-за сильного обстрела путей подхода к ним.

8.1.1944 г. 36-й гв. стр. корпус, к 2.00 18-я гв. стр. дивизия сдала участок Могучего — Сафонова 27-му гв. стр. полку 11-й гв. стр. дивизии и сосредоточилась в районе Гороватка—Харченки—Мал. Нивье—Ткачи и полностью перешла в оперативное подчинение командира 8-го гв. стрелкового корпуса.

12.1.1944 г. К исходу дня дивизия сосредоточилась в районе Симовщина—Слободка с задачей — ночной атакой овладеть Топорино.

13.1.1944 г. В 11.20 батальоны 58-го и 51-го гв. стр. полков начали сближение с противником. Пехота, накрытая сильным артогнем, залегла. Несколько групп ИЛ-ов, пытавшихся штурмовать передний край и артиллерийские позиции противника, попав под сильный огонь 3-й армии противника и потеряв при этом 2 самолета, серьезного воздействия оказать не смогла.

В 14.30 организована повторная атака. Продвинулись только на 100—150 м.

Потери: убито 56, ранено 186 человек.

Уничтожено до 200 солдат и офицеров противника...

С 14.1 по 4.2.1944 г. — никакого продвижения вперед. За эти дни по неполным данным убито 51 и ранено 134 человека.

4.2.1944 г. Части дивизии производили передислокацию. Днём беспрерывные атаки по реке Пестуница. Дивизия несет большие потери.

5.2.1944 г. В 12.30 58-й и 53-й гв. стр. полки перешли в атаку. Противник встретил беглым артиллерийским огнем. Пехота залегла. В 15.30 — повторная наша атака отбита.

Убито 84, ранено 307 человек.

6.2.1944 г. К исходу дня продвинулись на 150—300 м и вышли на линию Безымянная высота 400 м. восточнее Новоселки, отдельный сарай южнее Козлы.

Потери: убито 25, ранено 120 человек.

Уничтожено до 150 солдат и фицеров противника.

8.2.1944 г. В 22.00 получен приказ Штакора 8 на наступление в направлении Козельки с задачей овладеть Прокуды—Судники.

9.2.1944 г. Три атаки (в 7.30, 11.00, 15.00) успеха не имели из-за сильного артиллерийско-минометного огня противника. В 19.00 остатки личного состава 58-го гв. стр. полка ворвались в Пестуницу — 2. После контратаки противника были вынуждены отойти на исходный рубеж. Приданные пехоте танки 117-й танк. бригады в районе южнее Козлы потеряли 4 танка и отошли.

Потери: убито 110, ранено 601 человек[7].

В результате упорных боев, длившихся более месяца, наши войска преодолели вторую полосу немецкой обороны на витебском направлении, потеряв при этом 22 433 человека убитыми и ранеными[8].

К 10 февраля 11-я гвардейская армия оказалась перед новым рубежом, который немцы успели создать в 12—13 км к северо-западу от Витебска. Эта промежуточная оборонительная полоса проходила по линии Подборье—Шатрово. Здесь войска армии встретили вновь возросшее сопротивление гитлеровцев. К этому времени 11-я гвардейская армия не

только не имела сил для прорыва к Витебску и его освобождения, но и вообще для продвижения вперед.

1. К.Н. Галицкий. Годы суровых испытаний 1941–1944 гг. Москва, 1973 г. С. 430–431.
2. Там жа. С. 418.
3. Там жа. С. 422.
4. Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМАРФ), ф. 11, гв. А, спр. 5916, спр. № 578, л. 1–2.
5. Там жа, л. 2–12.
6. Там жа, ф. 1116 – 31-й гв. СД 11-й гв. А, воп. 1, спр. 48.
7. Там жа, ф. 1086 – 18-й гв. СД, воп. 1, спр. 32, с. 1–19.
8. Там жа, ф. 11 гв. А, воп. 5916, спр. № 578, л. 50.

Падрыхтаваў Р.Г.Пабярэжскі.

Ставка требовала немедленных действий

Осенние месяцы на Западном фронте прошли без существенных перемен. Стояла ужасная погода с моросящими дождями и туманами. Это не давало возможности вести систематическую воздушную и наземную разведку противника, занявшего новый оборонительный рубеж, который немецкое командование всячески усиливало живой силой и боевыми средствами.

Однако Ставка требовала немедленных решительных действий. Выполняя ее указания, войска Западного фронта силами четырех армий провели с 3 по 11 октября повторное наступление на оршанском направлении. За 9 суток упорных, затяжных боев наши войска продвинулись всего лишь на 5–35 км в глубину обороны противника.

С 12 октября эта операция была возобновлена. Гитлеровцы упорно цеплялись за каждый участок местности, бросали в бой все свои силы. 13 октября их авиация сделала 1200 самолето-вылетов, 14 октября – около 1300 самолето-вылетов с бомбометанием по нашим войскам.

Западный фронт продолжал испытывать большие трудности с подвозом горючего, боеприпасов, продовольствия. Железная дорога до Смоленска работала еще очень плохо, а машины на грунтовых дорогах тонули в осенней грязи.

В наступлении участвовало на этот раз очень мало танков. Без них бой развивался медленно. Пехоте было трудно преодолевать оборону противника.

Я сдал в Ставку тревожные донесения. Прежде всего фронту надо было оказать помощь готовыми к бою соединениями истребительной авиации за счет маневра с других фронтов или из резерва.

«Ведь нельзя же с имеющимися пятью истребителями надеяться надежно прикрывать наступающие войска, – писал я в одном из донесений. – Противник сманеврировал своей авиацией, нам также нужно совершить маневр истребительной авиацией с фронтов, где противник мало летает».

Я просил прислать хотя бы 130–150 танков Т-34 для действий с пехотой и направить в наступающие войска пополнение в 20–25 тыс. человек. Однако подкрепление продолжало поступать медленно. А Москва все требовала наступления во что бы то ни стало.

В октябре и ноябре войска фронта силами 5 армий 4 раза пытались провести наступательные операции севернее и южнее Днепра, но общее продвижение в глубину обороны противника достигло лишь 1,5–11 км.

На этом, казалось бы, следовало и остановиться, сделать большую паузу для серьёзной подготовки к предстоящим наступательным операциям, дать передышку войскам. Но нет, нас не хотели и слушать.

С 23 декабря 1943 г. по 6 января 1944 г., с 8 по 25 января и с 3 февраля по 16 февраля 1944 г. силами и средствами трех армий были снова проведены 3 наступательные операции на витебском направлении. Эти кровопролитные бои дали весьма малые результаты – в течение 44 суток войска продвинулись в глубину обороны противника на 15–18 км. Правда, Западный фронт своими активными действиями приковал значительные силы и средства противника к данному направлению. Безусловно, враг понес здесь большие потери, но и наши потери были немалыми.

Н.Н.Воронов. Незабываемое. М., 1964. С. 256–258.

Па шляху на Віцебск

И.В.Сталин был в хорошем расположении духа, и беседа наша носила почти непринужденный характер. Осведомившись о том, ознакомили ли меня с планами Ставки на белорусском направлении, Верховный заговорил о весьма положительной для нас общей ситуации на советско-германском фронте. При этом он сразу же отметил, что есть направления, где дела обстоят неважно. К числу таковых он отнес 1-й Прибалтийский фронт, 2 армии которого после успеха под Невелем оказались в мешке с крайне узкой горловиной.

— По неясным для меня причинам, — продолжал Сталин, — войска Первого Прибалтийского не могут добиться перелома в обстановке и развития ранее достигнутого успеха в направлении Городка и Витебска. А там мы можем изолировать 2 оперативно-стратегические группировки врага — северную и центральную, открыть себе ворота в Прибалтику и создать выгодные условия для освобождения всей Белоруссии. В Ставке обсуждался вопрос о смене командующего 1-м Прибалтийским фронтом. Принято решение назначить Вас на этот ответственный пост...

Слегка кивнув, И.В.Сталин продолжал:

— Мы решили передать 11-ю гвардейскую армию в состав войск 1-го Прибалтийского фронта и возложить на вас задачу разгромить городокскую группировку войск противника и в последующем овладеть Витебском.

* *
*

Прежде чем принимать конкретное решение о дальнейших действиях, мне хотелось возможно более глубоко и всесторонне изучить обстановку, но приказ Ставки обязывал без какой-либо паузы возобновить наступление. И вот в итоге напряженной работы появился боевой приказ от 23 ноября 1943 г. В нем ставилась общая задача разгромить 9-й и 6-й армейские корпуса немцев, овладеть Городком и Витебском. Для этого предлагалось использовать все силы фронта.

В целом глубина намеченной операции составляла 100 км, продолжительность — 6—7 суток, среднесуточный темп наступления — 13—15 км...

Успешное начало нашего наступления ошеломило противника. Вот как бывший начальник штаба 3-й немецкой танковой армии Гайдкемпер в своих воспоминаниях описывает реакцию на наш удар в стане врага:

«13 декабря Советы начали большое наступление с целью взять в клещи северное крыло нашей танковой армии. Зимнее сражение за Витебск... началось. Четыре советские стрелковые дивизии и приблизительно 45 танков нанесли удар с северо-востока по 129-й пехотной дивизии южнее озера Езерище. Одновременно 2 стрелковые дивизии и до 50 танков атаковали с юго-запада 20-ю танковую дивизию на рубеже озеро Бернево — озеро Черново. Правый фланг 129-й пехотной дивизии был оттеснен на 45 км. К вечеру противник вышел на шоссе Невель — Городок...»

В тяжелых условиях погоды и местности, при острой нехватке боеприпасов нам удалось окружить и в основном уничтожить вражеские войска в межозерье южнее Невеля, овладеть очень важным в оперативном отношении районом, который мог послужить трамплином для броска к Городку и Витебску...

Вечером 24 декабря Москва салютовала войскам 1-го Прибалтийского фронта, освободившим Городок. В приказе Верховного Главнокомандующего отмечалось: «Войска 1-го Прибалтийского фронта, развивая стремительное наступление, сегодня, 24 декабря, штурмом овладели городом и крупной железнодорожной станцией Городок, важным опорным пунктом обороны немцев на витебском направлении...»

После потери Городка враг в ночь на 25 декабря начал отводить свои 3-ю, 4-ю авиаполевые дивизии и 6-й армейский корпус на ранее подготовленный рубеж, охватывающий Витебск.

В течение всей зимы 1944 г. войска 1-го Прибалтийского фронта непрерывно наносили удары по врагу. В конце концов их наступательные возможности иссякли. Передышка стала необходимой не только для подготовки к новому наступлению, которое мы надеялись осуществить летом 1944 г., но и потому, что весна была в разгаре. Вот почему в марте, когда мы проводили очередную наступательную операцию против витебской группировки врага, я решил просить у Ставки разрешения на переход к обороне. Но надо было заручиться поддержкой соседа — командующего Западным фронтом генерала В.Д.Соколовского, войска которого участвовали в наступлении. Вызвав его по прямому проводу, я

предложил совместно позвонить Сталину, Василий Данилович, согласившись, что войскам необходима передышка, обращаться к Сталину не советовал: в Москве, мол, не хуже нас знают обстановку на фронтах...

2 апреля из Генштаба сообщили, что подписана директива о переходе войск 1-го Прибалтийского фронта к обороне.

И.Х.Баграмян. Так шли мы к победе. М., 1977. С. 261, 262, 270, 271, 275, 276, 283, 284, 287.

Войскі рвуцца да Віцебска

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання загадала войскам двух франтоў заходняга напрамку прарвацца да Віцебска і вызваліць яго. У асенне-зімовую кампанію 1943—44 гг. франты зрабілі шэраг спроб узяць горад. Жорсткія баі ішлі на паўднёвым усходзе каля шашы Смаленск-Віцебск і каля берагоў Лучосы. На паўднёвым усходзе наступаўшыя вымушаны былі спыніцца перад заронаўскім выступам умацаванняў «Мядзвежага вала», які прыкрываў Віцебск з трох бакоў.

Гэтыя баі на подступах да горада былі цяжкімі і кровапралітнымі. Толькі за 9 месяцаў на поўдні ад Віцебска загінулі 40 тыс. воінаў 33-й і 39-й армій Заходняга фронту. А на поўначы, на тэрыторыі Заронаўскага і Лётчанскага сельсаветаў, з 7 студзеня па 24 чэрвеня 1944 г. палягло 14 тыс. байцоў і камандзіраў 1-га Прыбалтыйскага фронту.

Наперадзе будзе аперацыя «Баграціён». А перад гэтым...

На горад — ударам з поўдня. За лініяй Віцебск—Орша—Магілёў усе імаверныя напрамкі наступальных аперацый савецкіх войск былі трывала прыкрыты магутнай сістэмай умацаванняў. Барацьба была ўпартай і цяжкай.

У лістападзе і снежні 1943 г. камандаванне Заходняга фронту некалькі разоў спрабавала аднавіць наступальныя аперацыі на віцебскім напрамку. Але вынікі былі нязначныя. Толькі злучэнні 33-й арміі змаглі цаной велізарных намаганняў прайсці 12 км і перарэзаць шашу Віцебск—Орша.

* * *

Са снежня 1943 г. па сакавік 1944 г. да Віцебска з поўдня сумесна з 39-й і 5-й настойліва спрабавала прабіцца 33-я армія Заходняга фронту, якая мела ў сваім саставе 5 стралковых карпусоў. На віцебскі напрамак 33-я армія была перакінута пасля цяжкага наступлення на Оршу ў кастрычніку 1943 г.

У кнізе генерал-лейтэнанта артылерыі С.Е.Папова «На агнявых рубяжах» ёсць раздзел «У баях за Віцебск». У ім аўтар прасочвае ход наступлення на горад не толькі артбрыгад 3-й гвардзейскай артылерыйскай дывізіі, але і 33-й арміі, у аператыўным падначаленні якой злучэнне знаходзілася са снежня 1943 да мая 1944 г.

Ніжэй — вытрымкі з гэтай кнігі.

* * *

Перад фронтам 33-й арміі праціўнік стварыў глыбока эшаланіраваную абарону. Тры добра абсталяваныя рубяжы надзейна прыкрывалі гэты важны ў стратэгічных адносінах горад.

Асабліва трывала быў падрыхтаваны першы рубеж, што складаўся з трох пазіцый, кожныя з якіх мела па 3 траншэі поўнага профілю. Немцы лічылі гэты рубеж непрыступным. Тут абараняліся добра падрыхтаваныя і добра укамплектаваныя 206-я, 246-я і 22-я ахоўныя пяхотныя дывізіі.

33-я армія мела задачу прарваць абарону праціўніка на паўднёвым усходзе ад Віцебска, разбіць фашысцкія дывізіі, забяспечыць увод у прарыў рухомай групы фронту, якая павінна была ўдарам з поўдня вызваліць Віцебск. На падрыхтоўку наступальнай аперацыі адводзілася ўсяго 4 дні.

На досвітку 26 снежня пасля артылерыйскай падрыхтоўкі часці 33-й арміі перайшлі ў наступленне. Аднак праціўнік, адкрыўшы агонь па пяхоце з усіх відаў зброі, вымусіў яе залегчы перад першымі сваімі траншэямі.

Адбылося гэта перш за ўсё таму, што артылерыя з-за недастатковай разведкі не змагла падавіць агнявыя сродкі і жывую сілу праціўніка. Больш таго, як высветлілася пазней, артылерысты нярэдка вялі агонь на ўчастках, дзе наогул не было ні ўмацаванняў, ні жывой сілы.

Камандуючы арміяй генерал-лейтэнант В.Н.Гордаў загадаў узмацніць разведку і ўдакладніць агнявыя задачы артылерыі. Удзень быў зроблены паўторны 10-мінутны

агнявы налёт на засечаныя варожыя кропкі. Стралковыя злучэнні зноў пайшлі ў атаку.

Да зыходу першага дня перадавыя часці арміі авалодалі дзвюма першымі траншэямі і ўклініліся ў варожую абарону на 1—2 км.

Студзеньскія баі набылі зацяжны характар. Кожны метр зямлі даставаўся вялікай цаной...

... Перад 33-й арміяй камандаванне фронту паўторна паставіла задачу авалодаць Віцебскам.

Раніцай 3 лютага пасля 40-мінутнай артылерыйскай падрыхтоўкі часці 65-га і 36-га стралковых карпусоў атакавалі праціўніка на ўчастку Старыцы—Дыманова. Пасля захопу першай траншэі пачалі рухацца ў заходнім напрамку, але пры падыходзе да апорных пунктаў Дом адпачынку Букштаны—Мяклова—Запруды сустрэлі вельмі моцнае супраціўленне і залеглі.

Артылерысты паўторна нанеслі магутны ўдар па гэтых пунктах. Услед за разрывамі снарадаў і мін пяхота пайшла ў атаку і вызваліла вёскі Старыцы, Букштаны, Мяклова...

Пасля цяжкіх кровапралітных баёў, прасунуўшыся на некалькі кіламетраў, часці 65-га і 36-га карпусоў выйшлі да ракі Лучоса.

Наступныя баі не далі жаданых вынікаў.

* * *

А як жа дзейнічалі ў гэтым наступленні на горад артылерысты? Вось радкі з таго ж раздзела «У баях за Віцебск».

Не зусім звычайныя задачы даводзілася вырашаць 107-й цяжкай гаўбічнай брыгадзе вялікай магутнасці. Яна дзейнічала не як брыгада разбурэння, а як артылерыя суправаджэння.

11 студзеня 1944 г. на перадавым назіральным пункце загінуў камандзір гэтай брыгады падпалкоўнік Георгій Ісакавіч Палумесны.

З раніцы гітлераўцы зноў атакавалі. Густымі ланцугамі ішлі пяхота і цяжкія танкі. Нашы байцы адступілі. Падраздзяленні 321-й стралковай дывізіі, мінуючы назіральны пункт камандзіра брыгады, пакінулі яго без прыкрыцця. Палумесны з групай разведчыкаў і сувязістаў працягваў кіраваць агнём батарэй. Атрымаўшы цяжкія раненні, афіцэр памёр на руках баявых таварышаў.

У студзеньскіх баях за Віцебск добра праявіла сябе 22-я гвардзейская цяжкая гарматная артылерыйская брыгада дывізіі. Яна ўдзельнічала ў падаўленні варожых артылерыйскіх батарэй у паласе наступлення 5-й арміі. З дапамогай артылерыстаў пехацінцы вызвалілі ад фашысцкіх захопнікаў некалькі буйных населеных пунктаў і саўгас «Крынкі». Камандзір гэтай брыгады гвардыі палкоўнік Петр Міхайлавіч Парадзелаў па-геройску загінуў у баі каля вёскі Гарасімаўка.

208 гвардзейскі артылерыйскі полк, які падтрымліваў 785-ы полк 144-й стралковай дывізіі, змагаўся ў складаных умовах. Яго разлікі вялі агонь прамой наводкай, не маючы перад сабой пяхотнага прыкрыцця.

Камандзір гарматы 2-й батарэі гвардыі старшына Г.Дзергачоў разам са сваім разлікам пад ураганным агнём вырваўся наперад, пераправіўся з гарматай на заходні бераг Лучосы. Адбіўшы 2 контратакі і знішчыўшы варожы танк, разлік на чале з Дзергачовым атрымаў загад адысці на ўсходні бераг і далучыцца да сваёй батарэі. Але ўвесь лёд быў падзяўбаны варонкамі ад мін. Дергачоў вырашыў пачакаць да вечара. Пад покрывам ночы артылерыстам удалося дацягнуць гармату амаль да сярэдзіны ракі, але тут лёд не вытрымаў, трэснуў і гармата пайшла на дно.

Байцы праявілі незвычайную вынаходлівасць. Гвардыі радавы В.Маслаў знайшоў некалькі бярвёнаў і змайстраваў на беразе калаўрот-паром. Старшына Дзергачоў спусціўся ў ледзяную ваду, замацаваў трос за баявую вось і падаў разліку каманду цягнуць гармату з вады. Праз некалькі мінут гармата была на лёдзе. У разабраным выглядзе яе адправілі ў артылерыйскую майстэрню. Праз некалькі дзён яе вярнулі на агнявыя пазіцыі.

У сакавіку і першай палавіне красавіка 3-я гвардзейская артылерыйская дывізія падтрымлівала баявыя дзеянні 5-й і 39-й армій. Стралковыя часці ва ўзаемадзеянні з артылерыстамі адбівалі контратакі, наносілі фашыстам значныя страты, паляпшалі свае пазіцыі...

Вызваліць Віцебск не ўдалося. З 16 красавіка камандаванне Заходняга фронту вымушана было перайсці да жорсткай абароны. Патрабаваўся час і новыя сілы для падрыхтоўкі да новага наступлення.

С.Е.Папоў. На агнявых рубяжах. Баявы шлях 3-й гвардзейскай артылерыйскай Віцебскай, Хінганскай Чырванасцяжнай, ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі прарыву рэзерву Вярхоўнага Галоўнакамандавання. М., 1971.

Тады ж, у лютым, праславілі сваю артдывізію воіны батарэі старшага лейтэнанта Л.П.Ціхмянава, за подзвіг пад Віцебскам удастоенага звання Героя Савецкага Саюза.

У.І.Галдзілаў.

Дакументы аб наступленні 33-й арміі

26 снежня 1943 года 33-я армія перайшла ў наступленне.

Задача войскам арміі ставілася баявым загадам № 0016. Праціўнік сустрэў наступаючыя часці арганізаваным агнём усіх відаў і контратакамі. Бой праходзіў ва ўмовах няспыннай мяцеліцы і моцнага снегападу, пры дрэннай бачнасці, што ўскладняла дзеянні войск.

Пераадольваючы супраціўленне праціўніка, падраздзяленні 42-й стралковай дывізіі авалодалі школай у вёсцы Назаранкі. На працягу дня праціўнік на розных участках пераходзіў у контратакі сіламі ад роты да батальёна з танкамі і самаходкамі. У выніку контратак з Мяклава сілаю да батальёна пяхоты праціўніку ўдалося адцясніць падраздзяленні 42-й стралковай дывізіі ад в. Назаранкі на заходнюю ўскраіну гаю, што на паўднёвы ўсход ад Асінаўкі. Атакай 42-й стр. дывізіі да 18.00 становішча было адноўлена. Пры гэтым падбіты 3 танкі і самаходныя гарматы.

На астатніх участках фронту войскі прасунуцца ўперад не змаглі і да зыходу дня вялі бой на ранейшых рубяжах. За дзень баёў знішчана да 680 салдат і афіцэраў праціўніка.

Войскі арміі літаральна ўгрызаліся ў абарону праціўніка, несучы пры гэтым вялікія страты. Толькі з 1 па 10 студзеня армія страціла забітымі 2122, параненымі — 8816 чалавек, прапала без вестак — 85, захварэла 307. Усяго — 11 330 чалавек.

13.1.1944 г. праціўнік 6 разоў пераходзіў у контратакі. Усе яны былі адбіты. Пры гэтым ён страціў 2 танкі, 1 самаходную гармату, знішчана да 600 салдат і афіцэраў.

Да 13 студзеня, трывала асядлаўшы шашу Віцебск — Орша на ўчастку Качынкі (15 км ад Віцебска), войскі арміі перайшлі да абароны, абсталявалі заняты рубеж.

У ноч на 2.2.1944 г. падраздзяленні 144-й, 222-й, 164-й і 274-й стр. дывізій занялі становішча, якое адпавядала баявому загаду. Артылерыя і мінамёты праціўніка найбольш актыўна вялі агонь з раёнаў Сялюты — Пароцькава — Бондзіна — Мосіна — Валосава.

3 лютага 1944 г. ўначы войскі арміі заканчвалі апошнія падрыхтаванні да наступальнай аперацыі. У 9.00 пасля 40-мінутнай артылерыйскай падрыхтоўкі 144-я, 222-я, 164-я і 274-я стралковыя дывізіі перайшлі ў наступленне. Прарваўшы абарону праціўніка, у выніку напружанага бою авалодалі Дымановым, Домам адпачынку, вёскамі Старынцы, Новікі, Качынкі, Макарава, усходняй ускраінай Мяклава.

222-я стр. дывізія, выбіўшы праціўніка з Качынкаў, авалодала Новікамі, ачысціла ад ворага лес на·захад ад Качынкаў, выйшла да ракі Лучоса і да 17.00 2 ротамі пераправілася ў раён Фёдараўка — Валосава, але контратакай праціўніка сілаю да батальёна пяхоты з групай танкаў і самаходных гармат была адкінута на ўсходні бераг.

З выхадам часцей арміі да Лучосы праціўнік з заходняга берага сустрэў іх арганізаваным артылерыйска-мінамётным агнём, а таксама агнём з танкаў і самаходных гармат і не дапусціў фарсіравання ракі Лучоса (на ўчастку на поўдзень ад Міхалёва, Фёдараўкі — Валосава).

Бой за ачышчэнне ўсходняга берага р. Лучоса працягваўся ўсю ноч. Перад войскамі арміі была пастаўлена задача: штурмавымі атрадамі фарсіраваць раку і да раніцы 4 лютага авалодаць плацдармам і заходнім берагам Лучосы і навесці цераз раку пераправу...

У 2-й палавіне дня 6.2.1944 г. авіяцыя праціўніка групамі па 28 і 35 бамбардзіроўшчыкаў (усяго 63 самалёты) зрабіла масіраваны налёт на баявыя парадкі 42-й, 144-й, 164-й стралковых дывізій і 36-й брыгады.

... У лютым, ведучы актыўныя наступальныя дзеянні, войскі 33-й арміі мелі задачу: ва ўзаемадзеянні з арміямі, якія наступалі з поўначы, акружыць і знішчыць віцебскую групоўку праціўніка.

Армія прарывала варожую абарону сіламі 4 стралковых дывізій на фронце ў 4,8 км. У наступленне былі ўведзены яшчэ 6 дывізій і стралковая брыгада. На фронце прарыву армія мела 137 гармат на 1 км. У час актыўных наступальных дзеянняў войскі выдаткавалі 515 900 снарадаў і мін. У выніку наступлення занята 19 км^2 тэрыторыі, вызвалена 10 населеных пунктаў, у глыбіню абароны праціўніка нашы войскі ўкліняліся на 3 км. Развіць поспех армія не змагла.

Злучэнні арміі на гэты час панеслі страты: забіта — 5175, паранена — 19 933, усяго страт — 25 877 чалавек.

Наступленне ішло з 1 па 15 лютага, з 16 па 28 лютага армія замацавалася на дасягнутых рубяжах. 29 лютага 1944 г. перайшла да абароны.

Архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Журнал баявых дзеянняў 33-й арміі, ф. 31 388, 14 681, воп. 8712, л. 5—12.

* * *

У ноч на 6.2.1944 г. 274-я стр. дывізія навяла пераправу цераз р. Лучоса на захад ад гаю Круглы, што знаходзіцца на поўдзень ад Букштан, і на досвітку 6.2.1944 г. 4 батальёнамі на лодках і па штурмавых мосціках фарсіравала р. Лучосу за 200 м на паўднёвы ўсход ад ускраіны пас. Жукі, ведучы бой за расшырэнне плацдарма.

6.2.1944 г. Забіта 46 чал.

7.2.1944 г. Забіта 43 чал.

9.2.1944 г. 961-ы і 965-ы стр. палкі спрабавалі перайсці ў атаку, але былі сустрэты і прыціснуты да зямлі моцным арт.-мінамётным агнём праціўніка. У 10.00 атакавалі вышыню 133,0, але сустрэтыя моцным агнём, заляглі. Паромныя лодкі разбіты. Забіта 92 чал.

10.2.1944 г. 961-ы і 965-ы стр. палкі ў 12.00 атакавалі праціўніка ў раёне вышыні 143,0 і на ўсходнім беразе Лучосы перад в. Перавоз. Дасягнулі яра на поўдзень ад пасёлка Жукі (150—100 м ад р. Лучоса) і заляглі пад ураганным арт.-мінамётным агнём праціўніка.

963-і стр. полк сумесна з левым суседам атакаваў праціўніка на ўсходнім беразе р. Лучоса на паўночны ўсход ад Перавоза.

274-я стр. дывізія страціла 75% асабовага саставу. Усе пасыльныя, якія накіроўваюцца на заходні бераг ракі, паранены ці забіты.

Архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Аператыўныя і баявыя данясенні 274-й стр. дывізіі і 33-й арміі, ф. 1569, воп. 1, спр. 48.

* * *

... 144-я стралковая дывізія ўступіла ў бой 3 лютага 1944 г., маючы 5169 чалавек, выйшла з бою 13 лютага, маючы 3024 чалавекі. За 10 дзён дывізія страціла: забітымі — 445, параненымі — 1559 чалавек.

... 612-ы стр. полк утрымліваў на заходнім беразе р. Лучоса невялікі шматок зямлі: 300—350 м на фронце і 100—150 м у глыбіню, які ганарова называўся плацдармам. Праціўнік, маючы вузел супраціўлення на флангах 612-га стр. палка ў раёне Жукі (на поўдзень) і Перавоз, абстрэльваў любую кропку плацдарма і пераправу. Да пераправы ўдзень падысці было нельга. Суседзі злева і справа таксама не перапраўляліся. Становішча 612-га стр. палка цяжкае. За 3 сутак полк страціў забітымі і параненымі 306 чалавек, у ротах засталіся 73 стралкі і 70 кулямётчыкаў.

Архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. З журнала баявых дзеянняў 144-й стралковай дывізіі 33-й арміі.

* * *

33-я армія, ведучы актыўныя наступальныя дзеянні зімой 1943—44 гг., задачу ўзяць Віцебск не выканала. Вораг аказаўся куды мацнейшым, чым меркавалася. Ён сустракаў нашу адважную пяхоту згубным агнём з-пад шматслойных накатаў дотаў і дзотаў. Але ні ў адной з дывізій не панікавалі. Здаралася, адбіўшы ў праціўніка вялікай крывёю ўчастак зямлі, не паспявалі замацавацца і вымушаны былі адысці. Але затым зноў, змучаныя, не паспеўшы перакусіць і абсушыцца, байцы ішлі літаральна на расстрэл, і зноў адбівалі гэты ўзараны снарадамі і мінамі кавалачак зямлі.

За 2 месяцы кровапралітных баёў армія прасунулася на некалькі кіламетраў, а страціла больш за 30 тыс. салдат і афіцэраў. Так, воіны 33-й арміі не змаглі прарваць умацаванні «Мядзведжага вала». Але яны расхісталі варожую абарону так, што ў чэрвені 1944 г. яна рухнула літаральна за лічаныя дні. Віцебская наступальная аперацыя закончылася амаль што маланкава. І ў гэтым немалая заслуга тых, хто зімой 1943—44 гг. біўся насмерць ля Дыманова і Лучосы і выканаў свой абавязак да канца. А значыць, у вызваленне нашага горада велізарны ўклад унеслі і воіны 33-й арміі.

І ўдарам з поўначы...

Адначасова з войскамі Заходняга фронту настойліва прабіваліся да Віцебска з боку Невеля часці і злучэнні 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем генерал-лейтэнанта І.Х.Баграмяна. У снежні 1943 г. войскі правага крыла гэтага фронту прарвалі добра ўмацаваную абарончую паласу праціўніка на поўдзень ад Невеля і разгромілі 129-ю, 211-ю пяхотныя і 20-ю танкавую дывізіі гітлераўцаў. За 5 дзён баёў з 15 па 20 снежня войскі

прасунуліся на 30 км у глыбіню варожай абароны, вызвалілі больш за 500 населеных пунктаў і выйшлі на подступы да Гарадка. 24 снежня злучэнні 11-й гвардзейскай арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта К.Н.Галіцкага авалодалі і гэтым умацаваным вузлом супраціўлення, які прыкрываў дарогу на Віцебск і перарэзалі чыгунку Віцебск – Полацк.

Далейшыя спробы савецкіх войск наблізіцца да Віцебска поспеху не мелі. Праціўнік трывала замацаваўся на зручных рубяжах і аказваў моцнае процідзеянне.

У 2-й палавіне красавіка штаб фронту атрымаў дырэктыву Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання перайсці да жорсткай абароны.

Падрыхтаваў А.І.Мацяюн.

Баявыя дзеянні 5-й арміі пад Віцебскам у студзені—сакавіку 1944 г.

Западный фронт, получивший совместно с 1-м Прибалтийским задачу разгромить в зимней кампании витебско-оршанскую группировку немецко-фашистских войск, приступил к ее выполнению, не имея превосходства над противником. Не выполнив полностью задачу по этой причине, войска фронта, и в их числе 5-я армия, однако, нанесли серьезное поражение противостоящему врагу.

* * *

В наступлении, предпринятом 5-й армией (командующий Н.И.Крылов) в начале января 1944 г., участвовали 5 стрелковых дивизий и 3 танковые бригады. Их поддерживала артиллерия 81-го стрелкового корпуса. Наиболее остро развивались события в полосе малочисленной 159-й стрелковой дивизии и 36-й стрелковой бригады.

В то утро валил обильный снег, и вскоре началась пурга. Полки пошли в наступление и смело форсировали по тонкому льду р. Лососино (севернее д. Копти). Однако дальше наступавшие смогли в течение дня продвинуться не более чем на километр.

* * *

Командир вновь прибывшей 277-й стрелковой дивизии полковник С.Т.Гладышев обосновался на командном пункте 36-й стрелковой бригады, наиболее ослабленной из наступавших соединений, в ночь на 8 января прямо с марша вывел на передовую 2 своих стрелковых полка – 850-й и 854-й. Третий – 852-й оставил во втором эшелоне.

Спустя сутки комдив повел свои полки совместно с 256-й и 213-й танковыми бригадами в наступление с плацдарма юго-восточнее Лобаны на запад в направлении Дыманово. Дружной атакой они выбили противника из дзотов, капониров и убежищ, погнали его по глубокому снегу к р. Лучеса.

В этом бою отличился 850-й стрелковый полк. Его 4-я рота во главе со старшим лейтенантом А.Д.Старостенко первая ворвалась в Дыманово, выбросила из него врага, оседлала шоссе Витебск – Орша. Вскоре туда подошел и весь полк.

Командование 3-й танковой армии немцев перебросило к Дыманово на автомашинах из-под Витебска 229-ю пехотную дивизию. Контратаковав прорвавшиеся полки 277-й стрелковой дивизии, она приостановила их наступление.

* * *

Захватом рокады Витебск – Орша был достигнут немаловажный успех. Вместе с тем, противник продолжал удерживать укрепленный район населенного пункта Крынки, расположенного в 5 км восточнее занятого Дыманово. Тем самым он угрожал левому флангу 5-й армии прорывом на север в направлении Еремино, что могло вынудить наши войска к отходу за линию железной дороги Витебск – Смоленск.

И командарм решил осуществить удар по врагу в направлении Крынки – Витебск.

Наступление началось в ночь на 15 января. Сильно похолодало, по снежному покрову гуляла поземка, мешая видеть вражеские позиции в районе Крынки. Но ни непогода, ни вражеский огонь не остановили атакующие части 159-й и 199-й стрелковых дивизий и 26-й танковой бригады 2-го гвардейского танкового корпуса.

Эта бригада уже не раз содействовала успеху стрелковых соединений 5-й армии. В ее составе на танке Т-34 «Боевая подруга» сражалась замечательная патриотка страны М.В.Октябрьская (смертельно ранена 15.01.44 г. при ночной атаке высоты 189,6).

В ходе ожесточенных январских боев воины 5-й армии освободили д. Крынки.

* * *

До самой весны не прекращали гитлеровцы попыток вернуть себе опорный пункт — высоту 189,6 у д. Шведы. В апреле они в последний раз двинулись на нее в атаку. Охватив высоту плотным кольцом, фашисты добрались до ее скатов. Но дальше не сделали ни шагу.

На вершине держала круговую оборону рота капитана И.С.Юсупова 491-го стрелкового полка. Она стойко отбивала все атаки противника. Однако оттеснить его от высоты оказалось нелегко.

В течение 3 суток командир полка майор Петин безуспешно контратаковал вражеские подразделения, окружившие роту капитана Юсупова. Не раз казалось, что рота погибла, но, как только гитлеровцы поднимались в атаку, на них с вершины обрушивался огонь из пулеметов и автоматов, летели гранаты. И враг скатывался вниз, оставляя десятки убитых и раненых.

Когда, нащупав слабое место в кольце противника, к защитникам высоты добрались темной ночью посланные майором Петиным офицер штаба полка капитан П.К. Доронин и 2 бойца-разведчика, они увидели, что героическая рота капитана Юсупова основательно поредела. Но ее воины по-прежнему были полны решимости отстоять свою позицию. Их очень обрадовал приход посланцев полка. Так велико было воодушевление, что даже тяжелораненые взялись за оружие.

Восстановление связи с ротой позволило майору Н.И.Петину организовать одновременный удар с подножья и вершины по врагу, засевшему на скатах. Гитлеровцы были сброшены с высоты, теперь уже навсегда.

* * *

В период с 21 по 23 марта части 277-й стрелковой дивизии овладели важными позициями, открывавшими путь к Витебску — сильно укрепленной высотой 181,3 и расположенном вблизи населенным пунктом Старина.

При штурме высоты особенно отличился рядовой 850-го стрелкового полка Андрей Коваленко. В один из решающих моментов боя он возглавил группу бойцов, которая прорвалась к вершине холма и гранатами выбила гитлеровцев из блиндажей. Горстка храбрецов стойко удерживала вершину до подхода своего батальона.

В бою за д. Старина также смело действовало отделение сержанта Махмета Утарова из 854-го стрелкового полка. Бесстрашно ворвавшись в первую вражескую траншею, бойцы этого отделения штыками и гранатами проложили себе путь ко второй. Однако попали под огонь крупнокалиберного пулемета. Стрелявшие гитлеровцы занимали позицию под сгоревшим танком. Комсомолец Утаров ползком подобрался к вражескому пулемету, метко брошенной гранатой уничтожил его.

По сигналу своего командира бойцы поднялись. Стремительный бросок — и отделение оказалось уже недалеко от деревни. Подошел сюда и весь взвод. В это время его командир был тяжело ранен бросившимися в контратаку гитлеровцами. Сам легко раненный, Утаров взял на себя командование взводом. Подразделение ворвалось в деревню. Подошедшим главным силам батальона осталось окончательно выбить гитлеровцев из Старины.

* * *

24 марта войска 5-й армии приостановили наступление. Активные действия предпринимались лишь на отдельных участках. А в середине апреля перешла к обороне, закрепившись на рубеже Мошенцы — Косачи — Дрыбино — Черкесы — Рублево, ее войска начали готовиться к предстоящим решительным сражениям за Витебск.

З кнігі «Н.И.Крылов, Н.И.Алексеев, И.Г.Драган. Навстречу победе. Боевой путь 5-й армии». М., 1970.

Подзвіг Шуры Лук'яненка

В июле 1966 г. ветераны бывшей 158-й Лиозненско-Витебской дважды орденов Красного Знамени и ордена Суворова дивизии вместе с комсомольцами московского завода имени Лихачева, где формировалось это соединение, сделали поездку по боевому пути, пройденному дивизией в годы Великой Отечественной войны. Туристов сопровождал бывший командир 879-го стрелкового полка, теперь полковник запаса Константин Алексеевич Томин.

Краеведы Королевской школы Витебского района еще раньше вели переписку с ветера-

нами дивизии генерал-майором в отставке Юрием Михайловичем Прокофьевым, Демьяном Ильичом Гончаровым, генерал-лейтенантом в отставке Иваном Семеновичем Безуглым и просили написать о боях и людях, которые отличились при освобождении нашей местности и города Витебска.

И.С.Безуглый познакомил следопытов с ветеранами 158-й стрелковой дивизии, командиром 879-го полка, освобождавшим Еремино. Следопыты встретились с К.А.Томиным и получили задание найти девушку, которая с 10 на 11 ноября 1943 г. в начале Витебской операции, провела танки из штаба дивизии в Еремино, где 879-й полк попал в окружение и мог погибнуть. Имя и фамилия проводницы были неизвестны.

Как только начались занятия в школе, краеведы включились в поиск героини, которая спасла жизнь многим солдатам и офицерам полка.

За 4 месяца поиска были опрошены сотни людей, жители деревень Еремино, Ковалево, Королево, Ранино, Лучиновка. Они узнали о многих случаях, когда наши люди помогали пройти танкам, но чтоб проводили для прорыва, таких не нашли. Казалось, что поиск зашел в тупик, но следопыты не теряли надежды на удачу.

Наступил новый 1967 г., а с ним и зимние каникулы. Однажды следопыты встретились с бригадиром деревни Лучиновка колхоза «Заветы Ильича» Николаем Арсентьевичем Пименовым, бывшим командиром взвода партизанского отряда. Он сказал, что колхозница Белисова из деревни Лучиновка видела, как на танке ехала через всю деревню Шура Лук'яненко, также колхозница из соседней деревни.

Вскоре встретились и поговорили с Белисовой. Она подтвердила, что это была действительно Шура, которая и сейчас живет в д. Второе Заболотье Лиозненского района. Там следопыты и нашли Александру Лукьяненко, которая подробно рассказала, как она проводила танки.

23 сентября 1967 г. в д. Еремино состоялась встреча ветеранов 158-й дивизии генерал-лейтенанта в отставке И.С.Безуглого, К.А.Томина, бывшего командира пулеметной роты 879-го полка Георгия Ивановича Рыбникова со школьниками. Тут же произошла встреча с Александрой Филипповной Лукьяненко.

Что же произошло в этот далекий фронтовой день?

8 октября 1943 г. 158-я стрелковая дивизия начала освобождение нашей Витебщины. 10 октября дивизия вышла на рубеж к г. Лиозно, который считался очень укрепленным на подступах к Витебску. Полки дивизии при поддержке танков ворвались в Лиозно. Бои шли за каждую улицу, каждый дом.

9 ноября была освобождена д. Красыня, полк Томина овладел шоссейной дорогой Лиозно – Витебск, врезался в оборону противника и оторвался от главных войск. В 17.00 первый батальон занял д. Еремино, но удержать ее было тяжело, так как враг подбросил новое подкрепление и все время контратаковал. Наши несли тяжелые потери, стойко отбиваясь от гитлеровцев. Кольцо сужалось. 879-й полк попал в окружение, находясь от дивизии на расстоянии 15 км.

О сложившемся положении К.А.Томин доложил по рации командиру дивизии Безуглому и просил дать для поддержки танки. Только они могут помочь вырваться из окружения. Безуглый приказал прислать проводника, который мог бы провести танки лесными тропами.

Вечером на окраину леса к командиру и начальнику штаба полка пришла девушка. Она сказала, что местная, и знает все лесные тропки, и, если ей доверят, то она сможет выполнить это задание.

В штаб дивизии Шуру Лукьяненко доставили ночью. Командование дало танки. Девушку, как проводницу, посадили на первую машину. Быстро сориентировавшись на местности, она повела танки через лес, который был между Ереминым и Ковалевым. Легкие машины прошли сразу, для тяжелых местами делали настил из бревен. Утром краснозвездные танки шумом моторов встревожили лесную тишину. К полку, который занял круговую оборону, пришло подкрепление. Боевые машины тут же вступили в бой. Полк прорвал кольцо окружения и продолжал вести тяжелые бои в направлении Витебска.

С тех ноябрьских дней прошло много лет. Александра Филипповна Лукьяненко живет в д. Второе Заболотье. До ухода на пенсию трудилась в колхозе «40 лет Октября». По ходатайству Совета ветеранов 158-й стрелковой дивизии за подвиг, совершенный в ноябре 1943 г., А.Ф.Лукьяненко была награждена медалью «За боевые заслуги». *А.Цярэнцева.*

Баі мясцовага значэння

З успамінаў Сямёнава, ветэрана 927-га палка 251-й стралковай дывізіі.

Наша 251-я стралковая дывізія (ёй камандаваў генерал-маёр А.Вольхін) уступіла ў бой за вызваленне Віцебскай вобласці з сярэдзіны кастрычніка 1943 г., і з таго часу мы літаральна ўгрызаліся ў абарону праціўніка, расхіствалі яе, прасоўваючыся да Віцебска метр за метрам. Пра гэта не паведамлялася ў пераможных рэляцыях, у гонар нас не давалі салютаў. У данясеннях пісалі: «Ідуць баі мясцовага значэння». Але гэтыя баі тым, хто застаўся жывым, запомніліся на ўсё жыццё. Ці ж можна забыць люты сорак чацвёртага! У ноч з 23-га на 24-е палкі дывізіі, адолеўшы супраціўленне праціўніка, дасягнулі траншэй наступнага рубяжа. Зямля раскісла, наша абмундзіраванне і валёнкі не прасыхалі ўжо некалькі дзён. Па начах, калі падмарожвала, яны рабіліся цвёрдымі, што камень, анучы прымярзалі да ног.

І вось у раёне населеных пунктаў Вішні, Шарова і Воспінкі, пра існаванне якіх многія і не чулі, мы былі спынены часцямі 256-й нямецкай пяхотнай дывізіі, якая мела, як высветлілася ў ходзе першых баёў, перавагу ў агнявых сродках і боепрыпасах, не кажучы ўжо пра тое, што знаходзілася яна на загадзя падрыхтаваных рубяжах.

Гітлераўцы сустрэлі нас ураганным агнём. Зусім безабаронныя перад шквалам агню і металу, байцы імкнуліся ўкрыцца хоць бы за якой купінкаю. Нарэшце, стралкам 923-га палка ўдалося зачапіцца на ўсходнюю ўскраіну в. Вішні, і тут жа адбіць 2 атакі ворага. Паспяхова прасоўваўся ўперад і 927-ы полк, якому была пастаўлена задача вызваліць вёску Рыжыкі.

Асабліва напружаным аказаўся бой 25-га лютага. Гітлераўцы ярасна абаранялiся, карыстаючыся любым выпадкам, каб контратакаваць буйнымі сіламі. Настаў такі крытычны момант, калі варожай пяхоце пры падтрымцы 10 танкаў і самаходных гармат удалося прарвацца на стыку 919-га і 927-га стралковых палкоў. Камандзір змушан быў кінуць сюды свой рэзерв — снайперскую стралковую роту і лыжны батальён. Нашы воіны адсеклі пяхоту ад танкаў і самаходак, акружылі і поўнасцю знішчылі яе. У той жа дзень праціўнік яшчэ пяць разоў контратакаваў нас, але быў адбіты на ўсіх участках. І ў наступныя дні, нягледзячы на ярасны артабстрэл і контратакі, фашыстам не ўдалося збіць нас з занятых рубяжоў. Пасля гэтага да 1 сакавіка на нашым участку ўстанавілася адноснае зацішша, фронт стабілізаваўся. А каб было лепш зразумець, які быў вынік тых т.зв. баёў мясцовага значэння на тым параўнальна невялікім кавалачку зямлі, скажу, што праціўнік страціў каля 3 тыс. салдат і афіцэраў, 4 танкі і 2 самаходныя гарматы, шмат іншай зброі.

Панеслі страты і палкі нашай дывізіі — забітымі амаль 200 чалавек і 1000 параненых. Тут загінулі камандзір 927-га стралковага палка палкоўнік Н.Нарадзіцкі, старшы лейтэнант Талкушын, лейтэнанты П.Шамякін, Я.Шаўчэнка, Ф.Буркулеў, малодшыя лейтэнанты А.Мамаеў, І.Чакмароў, Я.Ібрамчук. Усіх не пералічыш...

А потым была бітва за вызваленне Віцебска, у пачатку якой наша дывізія прыкрывала левы фланг 39-й арміі, забяспечваючы стык з 5-й арміяй генерала Крылова. За мужнасць і гераізм, праяўленыя воінамі 251-й стралковай дывізіі ў баях за Віцебск, ёй было прысвоена ганаровае найменне «Віцебская».

Ад Масквы — да Віцебска

З успамінаў Георгія Георгіевіча Блахіна, капітана ў адстаўцы.

В 1941 г. я был курсантом Московского Краснознаменного пехотного училища имени Верховного Совета РСФСР. 5 октября, когда фашистские войска вплотную подошли к столице, по боевой тревоге личный состав училища был направлен на фронт для защиты Москвы. Перед выступлением курсантских рот в заданный район обороны командир сводного полка начальник училища полковник С.И.Младенцев сказал нам: «Озверелый враг рвется к сердцу нашей Родины — Москве. Мы, чего бы это нам не стоило, должны преградить ему дорогу, защитить родную столицу. Наш долг — сражаться так, как сражались наши старшие товарищи, кремлевские курсанты всех наборов. Сейчас нет времени

принимать выпускные экзамены. Будете их сдавать на фронте, в боях с врагом!»

Нашему курсантскому полку отвели самый ответственный участок обороны в составе частей 16-й армии генерала Рокоссовского. В боях под Москвой я сильно обморозился и попал в госпиталь, из которого после лечения был направлен на должность командира роты в 1-ю Московскую пролетарскую гвардейскую стрелковую дивизию.

...И снова тяжелое ранение в голову и контузия под Юхновом. Потом были госпиталь и направление в резервный полк офицерского состава Западного фронта. После переподготовки на курсах усовершенствования я был назначен командиром разведывательной роты. К этому времени немцев отогнали далеко от Москвы, но родная Беларусь стонала под сапогами оккупантов.

6 октября 1943 г. был освобожден райцентр Лиозно Витебской области. Из резервного полка офицерского состава 33-й армии меня направили в распоряжение командира 36-го стрелкового корпуса, штаб которого располагался под Витебском, на территории нынешнего Октябрьского сельсовета.

В феврале 1944 г. меня назначили в 36-ю отдельную курсантскую стрелковую бригаду командиром отдельной разведроты. Бригада называлась курсантской потому, что её ядро составляли курсанты Орловского, Гомельского и Асинского пехотных училищ. В роте меня встретили дружной фронтовой семьей. В это время под Витебском шли тяжелые кровопролитные бои. Нашей бригаде была поставлена задача развить успех первого эшелона корпуса и выйти на шоссе Орша – Витебск в районе деревень Липовец – Дыманово. В результате трехдневных упорных боев части бригады задачу выполнили, вырвались на эту важную магистраль, но удержаться на занятых позициях под натиском контратак противника не смогли.

С 22 марта по 3 мая бригада из последних сил обороняла рубежи Мяклово – Макарово – Копти – Заходники – Перевоз – Волосово. Это были ежедневные изнуряющие бои, которые в сводках обычно назывались «боями местного значения». Бригада несла большие потери. Мы выполнили приказ – вырвали у немцев то злополучное шоссе и вплотную подошли к реке Лучеса.

В один из мартовских дней 1944 г. начальник разведки бригады капитан Пупыкин вызвал меня и приказал: «Нужен «язык», любой ценой!»

Придя в роту, я построил своих ребят, рассказал о поставленной задаче, а в заключение подчеркнул, что пойдут на задание только добровольцы. Желающих было много, пришлось отобрать самых опытных, назначил группы прохода, захвата, прикрытия.

Бойцы, отобранные на задание, сдали старшине роты Нагибову комсомольские билеты, награды, документы и личные вещи.

С наступлением темноты наша группа из 18 человек двинулась по траншеям и воронкам к переднему краю обороны противника. Мы знали, что вся эта местность простреливается фланговым пулеметным огнем. Бесшумно прошли опасную зону. Присели отдышаться. Вдруг на фоне неба метрах в ста мы увидели передвигающиеся фигуры немецких солдат. Они шли к полевой кухне, у которой возился верзила-солдат.

Я подозвал сержанта Сычова: «Будем его брать». В помощь сержанту назначил рядовых Верещагина и Воронина. Обговорили, как будут действовать в данной ситуации. Ребята стали подбираться к кухне. Все шло, как задумали. Но одного не учли – немецкий солдат оказался физически очень сильным. Ребята сходу не сумели его скрутить, даже кляп в рот не смогли засунуть. С испугу он заорал благим матом. В итоге ничего не оставалось делать, кроме как прикончить. Быстро сорвали с него погоны, забрали документы и полевую сумку. Я дал команду отходить. Успели отбежать метров триста, и тут... началось. Видимо крик нашего «кандидата в языки» был услышан. Поднялась стрельба, но мы, укрываясь в складках местности, без потерь вернулись к своим.

Убитый оказался вахмистром. Его документы представляли определенную ценность для разведотдела.

А сколько было таких ночных «прогулок» под Витебском через боевые порядки! Разве можно забыть те страшные бои за город?! К началу мая в нашей разведроте в строю оставалось всего около сорока человек, а бригада понесла такие потери, что была расформирована. Так и получилось, что под Витебском окончился ее боевой путь, начатый под Москвою.

На Лучосе мы стаялі

Мяклава, Букштаны, Новікі, Валосава. У канцы 1980-х і пачатку 1990-х гадоў я часта бываў тут з пошукавымі атрадамі. Каля гэтых вёсак за 10—12 км ад Віцебска яшчэ захаваліся нашы траншэі, акопы і нават сумнай памяці бліндаж-лавушка, прыстраляны брызантнымі снарадамі ворага, у якім загінулі рота сувязі і група афіцэраў штаба дывізіі. Тут праз 50 год у засыпанай зямлёй варонцы я знайшоў і пахаваў астанкі свайго камандзіра ўзвода, літоўца па нацыянальнасці, з якім не паспеў сустрэцца тады, зімой 1944-га. А было так.

Батарэю 45-мм гармат 1-га стралковага батальёна 961-га палка (7 чалавек, якія засталіся ад папярэдніх баёў) я прымаў у ходзе наступлення на Віцебск. Пакуль знаёміўся з першым разлікам, да пазіцыі другога, які быў з пяхотай, прарваўся нямецкі танк. Яго сустрэў камандзір узвода, што стаяў за прыцэлам, адзіны на батарэі афіцэр. Выстраліў ва ўпор. Ад выбуху загінулі ўсе — наш разлік і варожыя танкісты.

На тым плацдарме, ля Лучосы, навечна засталіся тысячы воінаў нашай 274-й стралковай дывізіі 33-й арміі. Тады больш пісалі пра перамогі і ўзнагароджвалі за іх. А тут нашы байцы таксама праяўлялі масавы гераізм у наступленні, хоць і няўдалым. Абарона немцаў пад Віцебскам аказалася не такой ўжо і непадрыхтаванай, як спачатку лічыла наша камандаванне.

* *
*

Тры дывізіі 36-га стралковага корпуса, у які ўваходзіла і наша 274-я, ад Асінторфскіх балот за адну ноч пад носам у немцаў прайшлі 30 км па вузкім калідоры і сканцэнтраваліся ў прамежку між вёскамі Крынкі і Копці. Прынялі раён абароны ад 39-й арміі. І адразу — на рэкагнасцыроўку.

У 5 гадзін 26 снежня 1943 г. нам зачыталі загад камандуючага 33-й арміяй генерала Гордава на прарыў да Віцебска. Была туманная марозная раніца. Па вузкім участку дывізія пайшла ў напрамку Лучосы. Нашы палкі вызвалілі Букштаны, Мяклава, Новікі. Але з першай атакі мы не ўзялі гэтыя апорныя пункты. Артпадрыхтоўка не дала належнага эфекту, танкам было нялёгка прайсці праз лясныя завалы і балоты. Аднак шашу Віцебск—Орша асядлалі. Дапамагла раптоўнасць — немцы нашага наступлення не чакалі.

Ужо за аўтастрадай ў цяжкае стновішча трапіў 965-ы стралковы полк. Яго перадавы батальён сходу ўвайшоў у «даліну смерці» ды і палёг там, зацісnуты кулямётным агнём з дотаў на ўзгорках. Да вечара з гэтай пасткі ўдалося толькі вынесці сцяг палка і вывесці жменьку людзей.

Кровапралітныя баі працягваліся. Па шашы да Віцебска далей Дыманава-1 прайсці не ўдалося. І вось новая задача: прарвацца ў горад цераз Лучосу. Ноч. Поспех спадарожнічаў нашаму 1-му стралковаму батальёну, якім камандаваў капітан В.І.Кражаў, пасля ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Лёд аказаўся моцным, і батальён, пераадолеўшы Лучосу, на плячах адступаючых немцаў уварваўся ў Валасова. Памятаю, як капітан Крыжаў, прыкрыўшыся плашч-палаткай, пры святле кішэннага фанарыка пісаў данясенне камандзіру палка: «Лучосу фарсіраваў, плацдарм захоплены, вяду бой за Валасова...» І перадаў яго старшаму сяржанту В.І.Баркову. Той, падбегшы да Лучосы, убачыў, што лёд ужо разбіты снарадамі. Баркоў кінуўся ў ледзяную ваду і хутка даставіў пакет.

Аднак праз 2 гадзіны, на досвітку, 20 варожых танкаў рынуліся на парадзелыя рады нашых стралкоў, якія яшчэ не паспелі замацавацца. Капітан Кражаў вырашае адвесці батальён у бок Лучосы... Плацдарм, на якім са сваімі воінамі замацаваўся наш адважны камбат, утрымліваўся да пачатку аперацыі «Багратыён».

У тыя цяжкія месяцы нашы палкі, прабіваючыся да Віцебска паміж вёскамі Дыманова-1 і Дыманова-2, пакідалі сотні забітых. Падраздзяленні часта змянялі. Камандаванне хацела як найхутчэй далажыць у Стаўку аб узяцці горада. Была такая размова камандзіра дывізіі з генералам Гордавым:

— Таварыш камандуючы, Зазыбы ўзялі.

— А Віцебск відаць?

— Не.

— Нашто мне тады вашы Зазыбы, калі Віцебск не відаць...

У 2-й палавіне сакавіка ў дапамогу на наш плацдарм камандаванне прыслала 36-ю асобную панцырную стралковую брыгаду, якая прыбыла з Туркменіі. Я назіраў за яе атакай на Валасова. Хлопцы ішлі ў поўны рост, 2—3-ма

ланцугамі. Наперадзе камандзір са сваім штабам. Ад агню не падалі — ахоўвалі панцыры. Але калі прыцэльную стральбу адкрылі нямецкія снайперы, рады пачалі хутка радзець. Перад самымі ўмацаваннямі брыгаду ўсю і палажылі.

У пачатку красавіка 1944 г. нас замяніла 164-я стралковая дывізія 39-й арміі. Мы былі адведзены на адпачынак і перафарміраванне. Перад аперацыяй «Баграціён» увайшлі ў склад 69-й арміі 1-га Беларускага фронту.

Дывізія вызваляла нашы новыя гарады і сёлы, брала Варшаву, Берлін, фарсіравала Буг, Віслу, Шпрэе. Ды ніколі нам не было так цяжка і мы не страцілі столькі людзей, як пад родным Віцебскам. Але ганаровага наймення гэтага горада не атрымалі. Мае саслужыўцы гаварылі: «Хто выжыў на Лучосе, той ў Берлін прыйдзе». Так і было. Перамогу адзначылі ў Берліне.

Як дарагія рэліквіі захоўваю я ў альбоме фотакарткі аднапалчан, якія прайшлі вогненнымі дарогамі ад Віцебска да сталіцы гітлераўскага рэйха. Адна з іх — нашага камандзіра палка Героя Савецкага Саюза гвардыі палкоўніка Пятра Віктаравіча Дарагорскага з надпісам: «Ветэрану Вялікай Айчыннай вайны, камандзіру артылерыйскай батарэі 45-мм гармат 961-га Чырванасцяжнага ордэна Суворова Брандэнбургскага палка 274-й Чырванасцяжнай ордэна Суворава Ярцаўскай стралковай дывізіі В.І.Селязнёву. У знак 30-годдзя нашай дружбы. 1974 г.»

В.І.Селязнёў, падпалкоўнік у адстаўцы, ураджэнец г. Віцебска.

Разведчык Іван Гарабец

У ходзе лістападаўскага 1943 г. наступленя 39-й арміі на Віцебск часці 17-й гвардзейскай дывізіі асядлалі шашу Смаленск—Віцебск. Атакі гітлераўцаў працягваліся. Вёска Забалоцце ўжо 4 разы пераходзіла з рук у рукі.

Недзе каля поўдня з-за тракту, перад якім знаходзіўся назіральны пункт генерала А.П.Квашніна, паявіліся адзіночкі і нават групы воінаў. Камандзір дывізіі загадаў вярнуць у вёску за тракт усіх, хто накіроўваецца ў тыл. Пры сустрэчы з байцамі я высветліў, што яны не адыходзілі, а выконвалі заданні па дастаўцы боепрыпасаў і наладжванні сувязі. Тут жа падышла група воінаў: 4 чалавекі неслі на плашч-палатцы параненага афіцэра. Сяржант далажыў, што за вёскай цяжка параніла камандзіра роты разведкі гвардыі капітана Гарабца.

У дывізіі добра ведалі праслаўленага разведчыка Івана Гарабца. Сярэдняга росту, каржакаваты хлопец з Жытоміршчыны вырас ад радавога да камандзіра асобнай роты разведкі. Разам са сваімі разведчыкамі капітан не раз хадзіў у тыл ворага.

Пад Віцебскам разведчыкам была пастаўлена задача прабрацца ў тыл праціўніка і разведаць яго сілы, перамяшчэнне каля пярэдняга краю і абавязкова здабыць «языка». Дзвюма групамі разведчыкі праніклі ў лясныя масівы на той бок пярэдняга краю. Доўга назіралі і чакалі ў засадах. На ўзлеску вялікі бліндаж і рух афіцэраў. Уначы вырашылі блакіраваць яго. Усё абышлося добра. Быў атакаваны штаб батальёна, і гвардзейцы прыхапілі обер-лейтэнанта.

На зваротным шляху воіны прыкмецілі, што гітлераўцы рыхтуюцца для контратакі на вёску, занятую нашымі падраздзяленнямі. Зручнае становішча было ў разведчыкаў. Яны амаль на флангу. Камандзір роты ўспомніў патрабаванне генерала — пазбягаць бою. «Але, па-першае, заданне ўжо выканана, — разважаў капітан, — а па-другое, нечаканая атака на нашы падраздзяленні будзе мець цяжкія вынікі». І ён вырашыў даць бой.

Аўтаматным агнём з тылу і фланга разведчыкі расстрэльвалі варожую пяхоту. Немцы ў паніцы разбягаліся ва ўсе бакі. Толькі асобным з іх удалося схавацца і адкрыць стральніну па нашых воінах, калі тыя ўжо адыходзілі. У апошні момант капітан заўважыў фашыста, які цэліўся ў яго з-за дрэва. Грымнуў выстрал, на нейкую долю секунды апякло цела, і востры боль пацягнуў яго да зямлі. Разведчыкі адразу падхапілі свайго камандзіра.

Пазней мы даведаліся, што ў санітарным батальёне галоўны хірург дывізіі Сямён Маісеевіч Якабсон прыняў смелае рашэнне не аперыраваць параненага, мяркуючы, што куля не пашкодзіла кішэчнік. Але папярэдзіў капітана, што ён павінен устрымацца ад яды.

І якое ж было здзіўленне хірурга, калі раніцой, аглядаючы хворага, ён пачуў яго заяву, што адчувае сябе добра і ўжо з'еў кацялок кашы. Праз 2 тыдні капітана выпісалі, а неў-

забаве ён дакладваў генералу аб прыбыцці для прахаджэння далейшай службы.

Шмат подзвігаў здзейсніў яшчэ наш гвардзеец на баявым шляху. Чатыры цяжкія раненні атрымаў ён на вайне. Баявыя ордэны і медалі ўпрыгожваюць яго грудзі. Дзень Перамогі разведчык сустрэў на аперацыйным стале пасля цяжкага ранення. Пасля вайны Іван Іванавіч Гарабец працаваў на Падольскім механічным заводзе майстрам.

А.Н.Шарабан, гвардыі палкоўнік, удзельнік баёў за Віцебск.

Успаміны А.Н.Шарабана захоўваюцца ў музеі воінскай славы в. Вароны Віцебскага раёна.

Пад вёскай Ермачкі

Гэта было ў снежні 1943 года. Наша 117-я стралковая дывізія атрымала загад закрыць адыход 16-й фашысцкай арміі, што рвалася з акружэння ў раёне Віцебска і Гарадка. Пазіцыю занялі каля вёскі Ермачкі. Тут заставаўся праход для варожых войск шырынёй 4—6 км. Гэты ўчастак і ўтрымлівала дывізія.

Вечарам праціўнік адкрыў ураганны агонь з усіх відаў зброі. Фашысты яшчэ разлічвалі выправіць сваё становішча. Услед за танкамі ішла пяхота.

Ворага мы сустрэлі як належыць. Да раніцы роўнае заснежанае поле ператварылася ў чорнае ворыва. Наша перамога каштавала 2419 чалавечых жыццяў. За гэты бой некалькі чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Першым з іх быў камандзір 117-й стралковай дывізіі генерал-маёр Е.Г.Каберыдзе. Ён не ведаў стомы, заўсёды знаходзіўся ў баявых парадках войск і паказваў асабісты прыклад мужнасці.

Запомніўся і наступны бой, які цягнуўся трое сутак. Я быў у той час парторгам палка, знаходзіўся разам з байцамі на пярэднім краі. І вось нечакана ў нашай траншэі паявіўся генерал Е.Г.Каберыдзе. У гэты час паблізу ўпала нямецкая міна, і я сваім целам накрыў камандзіра. Мы засталіся жывыя, але мне вырвала кавалак мяса ў правым баку, а генерала раніла ў галаву. Нас даставілі ў 173-і медсандат, там перавязалі. Генерал адмовіўся ад эвакуацыі ў тыл. На маю рану ён загадаў выразаць са свайго цела так званы лапік. Яго волю выканала ўрач Ніна Якаўлеўна Котар, цяпер яна жыве ў Смаленску.

Генерала ўжо няма ў жывых, але я адчуваю яго на сваім целе і ў душы.

За баявыя дзеянні па вызваленню Віцебска я быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Гэта быў мой трэці па ліку ордэн.

Д.Галубцоў, маёр у адстаўцы.

Архіў Віцебскага ваенкамата. Справа № 124. 1964—66 гг.

Прарыў

З успамінаў Уладзіміра Іванавіча Селязнёва, былога камандзіра ўзвода кіравання 120-міліметровых мінамётаў 961-га стралковага палка 274-й стралковай дывізіі

22.12.1943 г. дывізія атрымала загад зацемна ў другім эшалоне рухацца маршам да шашы Віцебск—Смаленск у раён Стасева. Каля вёскі Мяклава занялі агнявыя пазіцыі. На 27 снежня прызначаўся прарыў, які павінен быў падтрымаць Тацынскі танкавы корпус. Але танкі не паспелі, хоць экіпажы былі сфарміраваны і чакалі іх. Пайшлі без танкаў. Бралі з боем кожны ўзгорак. Выйшлі да шашы ў Дыманове-2, выбілі фашыстаў з 1-га і 2-га Ражнова.

Вельмі цяжкія былі баі за Шапуры, Сасноўку, а пра фарсіраванне Лучосы і казаць не трэба. Столькі таварышаў жыццё аддалі!

953-і штурмавы авіяполк у баях за Віцебск

На десятом километре шоссе Витебск—Москва стоит памятник — две бетонные стеллы и самолетный винт. На плитах — 84 фамилии пилотов и воздушных стрелков 953-го Витебского штурмового авиаполка, погибших при освобождении нашего города. Памятник стоит на том месте, где 3 февраля 1944 г. полк потерял восемь эпипажей.

Александр Синичкин. Исклеванный «мессерами» штурмовик горел, но тянул к своим. Стальным горохом по плоскостям сыпали пулеметные очереди, и будто кувалдой били по бронированному корпусу 20-мм снаряды авиа-

пушек. Вжавшись в бронеспинку и швыряя израненную машину из стороны в сторону, летчик кричал стрелку: «Володя, прыгай!» Стрелок не отвечал, потому что был убит. Но Синичкин не знал этого и, думая, что тот тяжело ранен, тянул горящую машину ближе к линии фронта. Задыхаясь от клубящегося дыма и закрывая лицо тлеющей перчаткой, он еще как-то ухитрялся увернуться от атак пары немецких истребителей. Они зависли совсем рядом — чуть повыше горящего ИЛа. Так, что были видны бесстрастные лица пилотов. Затем «сто-девятые» отвалили в бок и Синичкин снова приготовился к граду ударов. Но немцы ушли — возможно, у них просто кончились боеприпасы...

Пламя уже обжигает лицо, горят руки, плечи, меховые унты и совсем не просматривается земля, которая вдруг оказалась совсем рядом. От страшного удара его выбросило из кабины. Очнувшись, Синичкин увидел, как таял снег под горящим штурмовиком. Но, став на ноги, побрел к самолету и из последних сил вытащил из кабины неподвижное тело стрелка, скатился вместе с ним в глубокий овраг. Через мгновение рванули бензобаки, и обломки ИЛа просвистели у него над головой... В полубессознательном состоянии Синичкин взвалил на спину товарища, и, не понимая, что тот уже мертвый, потащил к лесу по обледеневшему снегу...

Эту картину наблюдали немецкие солдаты. И, видя мужество русского парня, не пристрелили там же, а отвезли в Витебский концлагерь. Там ему, можно сказать, повезло — какой-то немецкий врач передал нашему пленному врачу баночку мази и сказал: «Мажь этим, может, и выживешь. Хотя с такими ожогами долго не живут».

Но Синичкин выжил. Где-то к началу лета рана зарубцевалась, и, когда пленных угоняли из Витебска, ему удалось бежать. Как раз был налёт нашей авиации, и пока конвоиры отсиживались в щелях, он рванул к лесу... Ему даже удалось перейти линию фронта и вернуться в свою часть, где никто не смог признать в изможденном и обгоревшем человеке 19-летнего парня...

Владимир Федоровский. Самолет лежал на дне озера кверху шасси. Аквалангист подплыл к кабине и попытался сдвинуть плексиглазовый фонарь, но машину за 40 лет так засосало в ил и занесло песком, что для этого было необходимо размывать грунт. И всё-таки ему удалось вытащить из кабины что-то мягкое. На поверхности ребята увидели, что это были летные перчатки: от которых еще пахло бензином. Поиски сбитого штурмовика вели ребята из клуба «Искатель» ПТУ-96 г. Витебска. С помощью солдат местного гарнизона поисковцам удалось поднять на поверхность кабину стрелка, где нашли его обгоревшие кости, пистолет «ТТ» и томик романа Льва Толстого.

Зимой поисковцы выпилили в метровом льду огромную полынью и пытались поднять бронекорпус, но ничего не вышло. И только летом, когда на большом плоту установили лебедку и помпу, из воды медленно показался центроплан самолета. За бронеспинкой самолета лежали останки лётчика. Под комбинезоном, на гимнастерке у него был привинчен орден Красной Звезды, а в записной книжке целая пачка документов и фотографий. Но увы — все они, когда высохли, рассыпались в порошок. Сохранился лишь небольшой снимок размером 3 × 4 — фото матери летчика, с надписью на обороте: «На память дорогому братишке Володе от сестренки Жени». В комсомольском билете отчетливо читались имя и фамилия — Владимир Федоровский.

В архиве Министерства обороны СССР ребята установили, что он не вернулся с боевого задания 14 января 1944 г. После этого уже не составляло особого труда установить личность воздушного стрелка. Им оказался Михаил Аншуков. Похороны экипажа состоялись 1 июня 1985 г. в Витебске на воинском кладбище. Впереди — могила пилота, позади — стрелка. Так они и лежат, как летали — одним экипажем...

Благодаря постоянному вниманию, уделяемому разведке командованием армии, командиры соединений и частей всегда имели полные и точные данные о противнике и местности. Глубокий анализ полученных данных позволил выявить сильные и слабые стороны в обороне врага и на этой основе правильно решить основные вопросы замысла операции.

Отличительная особенность Витебской операции состоит и в том, что она развивалась по плану, но несколько с опережением его сроков. Это указывало на высокое качество планирования, его соответствие реально сложившемуся соотношению сил и средств и точную оценку боевых возможностей соединений армии. Точное и тщательное планирование в свою очередь являлось одним из условий, обеспечивающих успех операции. Однако командование армии не рассматривало план как догму и в отдельных случаях вносило в него коррективы.

По опыту прошлых боев командиры подразделений, частей и соединений знали, что неприятель обычно наносит контрудары под основание участка прорыва с целью закрыть образовавшуюся брешь в своей обороне. Поэтому своевременный ввод в бой резервов и вторых эшелонов имел решающее значение в срыве контратак противника. Так, вводом в бой во второй половине дня 23 июня 164-й стрелковой дивизии, усиленной танко-самоходным и истребительно-противотанковыми полками, войска армии сорвали контратаку врага, предпринятую им утром 24 июня.

Большое значение командование армии при наличии ограниченных сил придавало широкому маневрированию ими с целью наращивания силы удара в ходе боевых действий или отражения ударов противника. Роль маневра в наступлении можно проследить на примере действий бронетанковых частей армии.

В начале наступательной операции усилия всех танковых частей направлялись на осуществление прорыва подготовленной обороны противника. Однако к исходу дня выявилась угроза нанесения контрудара противником на правом фланге участка прорыва. Для парирования этого удара 28-я гвардейская танковая бригада и 957-й самоходно-артиллерийский полк перегруппировались в район Борисовки, Ступище. Во второй половине дня 24 июня, когда контратакующая группировка оказалась разгромленной, танковая бригада перегруппировалась в район Бутяжи для удара совместно с 17-й гвардейской стрелковой дивизией в направлении Комары (по тылам основных сил 53-го армейского корпуса). К исходу 24 июня бригада эту задачу выполнила, заняла рубеж Рудаки, Комары с целью отразить попытки противника вырваться из окружения.

735-й самоходно-артиллерийский полк дважды осуществлял перегруппировку вдоль фронта армии. Так, в ночь на 24 июня он совершил марш из населенного пункта Позняки в район Песочны для нанесения удара в направлении Островно. После того как лобовая атака населенного пункта не удалась, полк совместно с главными силами 91-й гвардейской стрелковой дивизии перегруппировался восточнее и нанес удар во фланг главной группировки противника.

Таким образом, несмотря на крайне ограниченное количество танковых частей в армии, они каждый раз участвовали в наиболее важных ударах по противнику. Продуманный маневр танковыми частями позволил полностью использовать в операции их большую ударную силу.

Успех наступательной операции был предопределен большой, многообразной и непрерывной партийно-политической работой, которую инициативно в ходе всех боевых действий проводили политорганы, партийные и комсомольские организации.

В дни боев непрерывно проводилась работа по приему в ряды партии. В Коммунистическую партию вступали лучшие воины, проявившие мужество и отвагу в боях с врагом.

В перерывах между горячими боями, на привалах, на маршах, при перегруппировках проводились партийные собрания, в том чис-

ле и открытые, на которые приглашался беспартийный актив.

Красноармейские собрания и митинги также использовались партийными организациями для вовлечения в активную жизнь воинов, готовящихся к вступлению в партию. Большое внимание уделяли комсомольские организации подготовке комсомольцев к вступлению в партию.

Прием в партию проводился в строгом соответствии с требованиями ЦК ВКП(б) об индивидуальном отборе: принимались наиболее отличившиеся в боях солдаты, сержанты, офицеры, которые на деле показывали свою преданность Родине. Одновременно с ростом рядов партии пополнялись и ряды комсомольских организаций.

Политико-моральное состояние наступавших войск было неизменно высоким и улучшалось по мере приобретения боевого опыта бойцами, сержантами и офицерами, впервые участвовавшими в бою и составлявшими значительный процент по отношению ко всему личному составу.

В агитационно-массовой работе, которой придавалось большое значение, любая, даже самая незначительная пауза между боями использовались для читки газет, для бесед, а когда части или подразделения на несколько часов оказывались в резерве или перебрасывались на другой участок, политработники стремились провести короткий митинг. Большое значение имели беседы, проводившиеся в случае объявления тому или иному подразделению, части или соединению благодарности. Отличившимся в боях воинам посылались поздравительные открытки. Награжденных орденами и медалями извещали по телефону и через посыльных. Рядовых, сержантов и офицеров, отличившихся в бою, фотографировали при развернутом знамени части, и фотокарточки с кратким описанием совершенного подвига посылали семье и по месту прежней работы. Перед отсылкой такие письма зачитывались личному составу подразделений. Все это значительно способствовало повышению политико-морального состояния воинов подразделений, улучшало их боевые качества.

Бои под Витебском носили стремительный характер, распадались на отдельные, подчас изолированные друг от друга очаги борьбы. В течение одного дня полку или дивизии ставилось несколько боевых задач, обстановка менялась чрезвычайно быстро. В этих условиях политработники должны были умело, самостоятельно, инициативно и безошибочно действовать, своевременно перестраиваться. Партийные кадры оказались достаточно опытными для решения этой задачи. Высокое политико-моральное состояние и воинское мастерство солдат, офицеров и генералов явились основными условиями победы, одержанной войсками 39-й армии над противником.

Витебская наступательная операция, как и многие другие операции Великой Отечественной войны, представляет собой одну из славных страниц нашей военной истории. Она явилась важной частью блестяще осуществленного стратегического плана по разгрому группы армий «Центр» в Белоруссии летом 1944 г.

Генерал-полковник И.И.Людников. 39-я армия в боях за Витебск. У кн. «Освобождение Белоруссии». М., 1970. С. 505—530. Друкуецца са скарачэннямі.

Пятая ў наступленні

У вызваленні Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў надзвычай важкі ўклад і 5-й арміі. Яе баявы шлях пралёг ад бітвы пад Масквой да ўдзелу ў разгроме японскай Квантунскай арміі на Далёкім Усходзе.

З першымі баямі на віцебскай зямлі 24 кастрычніка 1943 года камандуючым гераічнага аб'яднання прызначаецца генерал-лейтэнант М.І.Крылоў. У далейшым — двойчы Герой Савецкага Саюза, Маршал Савецкага Саюза, галоўнакамандуючы ракетнымі войскамі стратэгічнага прызначэння — намеснік Міністра абароны СССР.

Вось што пісаў генерал арміі І.Д.Чарняхоўскі, пад камандаваннем якога войскі 3-га Беларускага фронта прайшлі слаўны шлях ад Віцебска да Кенігсберга: «Проведенные 5-й армией операции по своему размаху, решительности действий, темпам движения, умелому маневру на поле боя и результатам являются поучительными операциями в современной войне. И важнейшая из этих операций — боевые действия при прорыве сильно укрепленной и глубоко эшелонированной обороны немцев южнее Витебска. Достаточно сказать, что из 8 дивизий 5-й армии, участвовавших в

прорыве, четыре получили почетное наименование «Витебские». Это — 63-я генерала Н.М.Ласкина, 97-я полковника Ф.Ф.Шишова, 159-я генерала Н.В.Калинина и 371-я генерала В.Л.Алексеенко стрелковые дивизии» («Навстречу победе». М., 1970. С. 5).

44-ы асобны дывізіён бронепаяздоў у баях за Віцебск

У баях за Віцебск удзельнічаў 44-ы асобны дывізіён бронепаяздоў, сфарміраваны ў Пермскай вобласці. У яго саставе былі бронепаязды № 673, 758.

Броневой дивизион прибыл в подчинение 43-й армии 1-го Прибалтийского фронта 22 февраля 1944 г. На своем вооружении имел 8 танковых пушек Ф-34 с броневыми башнями, 45-мм пушку на бронедрезине, 2 автоматические зенитные пушки, а также 16 крупнокалиберных и других пулеметов. Личный состав — 238 человек.

В тот же день дивизионом проведена разведка путей в сторону станции Городок и далее на Витебск до участка 534,5 км. Железная дорога оказалась исправной до участка 532 км, далее была разрушена: стыки рельсов подорваны, шпалы выворочены из своих гнезд. До конца марта личный состав обоих бронепоездов проявил настоящий подвиг, занимаясь труднейшими восстановительными работами в мороз и весеннюю распутицу, под обстрелом вражеской артиллерии.

С 23 по 28 июня 1944 г. бронедивизион принял участие в Витебской наступательной операции, поддерживая своим огнем ход наступления на город 145-й стрелковой дивизии 43-й армии.

В полосе наступления дивизии 24 июня гитлеровцы были выбиты с занимаемых рубежей и вынуждены начать отход, пытаясь закрепиться на Западной Двине, у Витебска. Бронепоезда из всех своих орудий открыли огонь по врагу. Под их прикрытием стрелки успешно двигались вперед вдоль железной дороги. Огонь корректировал выдвинувшийся вперед на 4 км капитан М.И.Толстых. Бронедивизион уничтожил 2 пушки, 3 миномета, 3 пулемета, 50 солдат и офицеров противника.

Герои этих боев получили заслуженные награды: командир дивизиона майор И.М.Александров — орден Александра Невского, его заместитель майор К.И.Ерин — орден Красной Звезды, командир бронепоезда № 673 капитан М.И.Толстых — орден Отечественной войны 2-й степени, командир бронепоезда № 758 капитан А.И.Гудков — орден Красной Звезды, командир отделения разведки старший сержант В.И.Акулов — орден Славы 3-й степени, наводчик орудия бронепоезда № 673 сержант П.П.Карасев — орден Красной Звезды.

С 27 июня личный состав бронедивизиона проводил восстановление разрушенных путей от 543-го км южнее станции Городок в сторону Витебска. В июне—октябре 1944 бронепоезд принимал участие в наступательных операциях по освобождению Латвии и Литвы, был удостоен почетного наименования «Клайпедский». Расформирован в декабре 1945 г.

И.А.Кондауров, г. Пермь.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 44-га асобнага дывізіёна бронепаяздоў, воп. 52262, спр. 3, 10, 14, 15, л. 12, 17, 28, 88.

І жылі, і ваявалі

Гэта расказ аб тым, як любілі жыццё, баявую салдацкую службу і як ваявалі артылерысты 8-й (7-й гвардзейскай) артдывізіі, удастоенай ганаровага найменння «Віцебская». Камандаваў дывізіяй генерал-маёр артылерыі Пётр Рыгоравіч Сцепаненка. 24 студзеня 1945 г. ён памёр ад ран і пахаваны ў Віцебску на Успенскай горцы. У горадзе яго імем названа вуліца.

Аўтар успамінаў пра воінаў сваёй дывізіі маёр у адстаўцы **Мікалай Парфір'евіч Раманаў**. З дывізіяй ён прайшоў ад пачатку яе фарміравання да канца Вялікай Айчыннай. Расказаць пра воінаў-артылерыстаў яму дапамаглі франтавыя сябры-пабрацімы.

Гвардзейцы! пад сцяг, на калена! 1943 г. для нашага 270-га артпалка азнаменаваўся шэрагам важных перамог і падзей. Полк удзельнічаў у такіх паспяховых наступальных аперацыях, як Ржэўска-Вяземская, Духаўшчынская і Гарадоцкая на Віцебскім напрамку.

У чэрвені 1943 г. нашаму артпалку было прысвоена ганаровае званне, і ён стаў называцца 164-м гвардзейскім гарматна-артылерыйскім. Вядома, што гвардзейскія часці накіроўвалі на самыя цяжкія ўчасткі фронту. Сярод салдат папулярным быў такі выраз: «Дзе гвардзейцы трымаюць абарону — ворагу не прайсці!»

На ўсё жыццё запомніўся дзень уручэння гвардзейскага сцяга. У полк прыбыў камандуючы артылерыяй 1-га Прыбалтыйскага фронту генерал Н.М.Хлебнікаў. На вялікай лясной паляне стройныя рады салдат і афіцэраў замерлі перад кумачовым сцягам. Камандзір палка палкоўнік М.І.Асокін, прыняўшы сцяг ад генерала, падаў каманду:

— Полк! Пад сцяг, на калена!

Тысячы людзей схіліліся перад воінскай святыняй і далі клятву. Словы гэтай клятвы рэхам разносіла па наваколлі, і здавалася, што сама наша зямля клянецца назаўсёды пахаваць у сваіх нетрах лютага ворага. Пасля ўрачыстага парада адбылося салдацкае свята са смачным абедам.

Нараджэнне 8-й артдывізіі. Праз 4 месяцы зноў важная падзея. Полк перавялі на новы ўчастак фронту. Мы прывыклі ўжо, што туды, дзе намячаецца наступленне, перакідваюць наш цяжкі артылерыйскі. А цяпер радасць была двайная: на базе нашага палка фарміравалася 28-я гвардзейская гарматна-артылерыйская брыгада. Яе ўзначаліў палкоўнік Мікалай Іосіфавіч Асокін. Брыгада складалася з 4 дывізіёнаў. Тры з іх былі ўзброены 155-мм гарматамі-гаўбіцамі з далёкасцю стральбы 16,6 км, а чацвёрты — 76-мм гарматамі процітанкавага прызначэння. Цяжкія гарматы перавозілі трактары, а 76-мм — амерыканскія аўтамабілі «шэўрале». Брыгада поўнасцю перайшла на механізаваную цягу.

Па такім жа ўзоры ствараліся 26-я артбрыгада, дзе камандзірам быў палкоўнік Г.І.Капітоненка, і 27-я артбрыгада на чале з Героем Савецкага Саюза палкоўнікам Дзядышкам. 26-я, 27-я і 28-я артбрыгады ўвайшлі ў склад 8-й гарматна-артылерыйскай дывізіі, камандзірам якой стаў генерал-маёр артылерыі П.Р.Сцепаненка. У дывізію ўваходзілі і такія падраздзяленні, як асобны разведвальны і паветрана-плавальны дывізіёны, аўтамабільны і іншыя.

8-я артдывізія — буйное механізаванае злучэнне, здольнае выконваць артылерыйскае забеспячэнне пры прарыве абароны праціўніка на значным участку фронту. Дывізія ў асноўным была ўзброена дальнабойнымі гарматамі, таму і яе асноўнае прызначэнне — знішчэнне артылерыі праціўніка. Пасля фарміравання дывізія прыбыла ў раён Віцебска.

Агонь па артылерыі праціўніка. Наступленне нашых войск у аперацыі «Баграціён» на паўночным захадзе ад Віцебска пачалося 23 чэрвеня 1944 г. Перад 8-й артдывізіяй стаяла задача падавіць артылерыю праціўніка ў паласе наступлення 43-й арміі.

Задоўга да наступлення вялася падрыхтоўка да контрбатарэйнай барацьбы. Пад Віцебскам упершыню ў 28-ю артбрыгаду паступілі аэрастаты. Новую справу асвойвалі ў баявой абстаноўцы. Для работы з аэрастатчыкамі быў прызначаны адзін з лепшых камандзіраў батарэй капітан Г.І.Любаўкін. Весялуны з гэтай нагоды жартавалі, што Гену выбралі таму, што ў выпадку неабходнасці яму хутчэй даскочыць да зямлі. Двухмятроваму Генадзю Іванавічу жарт падабаўся.

Нямецкая авіяцыя ўзмацніла паляванне за нашымі аэрастатамі. Але капітан Любаўкін заўсёды ўдала выходзіў з-пад абстрэлу. Пра яго подзвігі на паветраным шары ў часці складалі вершы, расказвалі смешныя гісторыі. За кемлівасць і выдумку яго празвалі нябесным вокам...

Карыстаючыся звесткамі разведкі, удалося высветліць, што ў паласе дзеяння 28-й артбрыгады нямецкая артылерыя групуецца ў раёне Сіроціна, вёсак Камлі — Ржаўка. За гэтымі раёнамі ўстанавілі назіранне. Кожная праява агнявой дзейнасці батарэй праціўніка адзначалася ў разведвальных дакументах.

Бой на ўчастку 43-й арміі пачаўся з таго, што на значнай прасторы моцныя атрады праводзілі разведку боем, якую немцы прынялі за пачатак наступлення. Таму на перадавыя атрады вораг абрушыў усю моц сваёй артылерыі, а на некаторых участках нават спрабаваў пераходзіць у контратакі. Гэта дало магчымасць пацвердзіць, што батарэі немцаў застаюцца на сваіх агнявых пазіцыях. З улікам абстаноўкі і метэазводак камандзіры батарэй унеслі апошнія карэктывы ў зыходныя даныя для стральбы па цэлях.

Ноччу перад наступленнем ішоў дождж. Да раніцы надвор'е палепшылася, але густы туман яшчэ доўга ахутваў пярэдні край.

Наступленне пачалося масіраваным ударам нашай артылерыі. Сотні гармат розных калібраў і мінамёты абрушылі на праціўніка магутны агонь. Артылерыя біла не толькі па пярэднім краі, але і на ўсю глыбіню нямецкай

абароны. Дзве гадзіны ішло знішчальнае пахаванне ворага ў беларускай зямлі. Калі за вогненным валам у атаку пайшлі наша пяхота і танкі, артылерыя праціўніка была поўнасцю паралізавана і маўчала.

На другі дзень нашы часці паглыбіліся ў абарону праціўніка на 15—20 км, батарэі мянялі агнявыя пазіцыі. Палкоўнік Асокін запрасіў камандзіраў дывізіёнаў маёраў Прыходзьку, Каліна, Зэкава і Распусціна праверыць на мясцовасці вынікі сваёй работы. На франтавым «козліку» па размытай дарозе яны прыехалі ў раён вёсак Камлі—Ржаўка. Тут стаялі 3 нямецкія батарэі. На месцы агнявых пазіцый — суцэльныя варонкі ад разрываў нашых снарадаў. Многія гарматы былі выведзены са строю прамым пападаннем. Фашысты ўцяклі з пазіцый, пакінуўшы параненых і забітых.

Па танках ворага. Ваенныя тэарэтыкі лічылі нямэтазгодным выкарыстоўваць для процітанкавай барацьбы нашы 152-мм гарматы-гаўбіцы таму, што ў іх недастатковая манеўранасць, марудная наводка, нізкі тэмп агню. Апрача таго, вялікую гармату праціўнік можа лёгка выявіць і знішчыць. Але іншы раз у час бою складвалася такая абстаноўка, што для барацьбы з танкамі ворага выкарыстоўваліся ўсе наяўныя сродкі, у т. л. і гарматы буйнога калібра. Такі прыклад быў на віцебскім напрамку.

Немцы ўзмоцнена рыхтаваліся адбіць наша наступленне. Будавалі глыбока эшаланіраваную абарону. На ўчастку ў раёне ст. Сіроціна гітлераўцы паставілі ў спецыяльна абсталяваныя акопы каля 20 танкаў. Гэта такая агнявая сіла, што аб наступленні тут і думаць нельга было. Спрабавалі выкурыць іх з акопаў снарадамі процітанкавых гармат — не выйшла. Балванкі адскоквалі ад тоўстай брані вежаў, як гарох ад сценкі. Пасылалі нашых штурмавікоў Іл-2 — і таксама без поспеху. Тады было прынята рашэнне паставіць на прамую наводку 1-ы дывізіён маёра Прыходзькі 28-й артбрыгады.

Камандзір дывізіёна разам з камбатамі правёў рэкагнасцыроўку мясцовасці, выбралі месца для гармат. На наступны дзень паказалі камандзірам і наводчыкам гармат танкі, якія трэба знішчыць. На кожную гармату выходзіла па 2—3 танкі. Потым уночы зрабілі акопы пад гарматы і перад наступленнем гарматы перацягнулі на пярэдні край.

Агонь па варожых танках павінны былі пачынаць па агульнай камандзе артпадрыхтоўкі ў 8 гадзін раніцы. Гэты графік быў парушаны з-за надвор'я — на досвітку ўся мясцовасць запоўнілася нерухомым туманам. Толькі каля 11 гадзін ён пачаў рассейвацца. Да танкаў было 600—700 м. Наводчыкі ўзялі іх на прыцэл. З хваляваннем чакалі каманды. Бачна толькі вежа, так што цэль невялікая, патрэбна ідэальная дакладнасць. Таму наводчыкаў падабралі самых вопытных, сапраўдных снайпераў.

Нарэшце, узвіліся 3 чырвоныя ракеты. Маёр Прыходзька падаў каманду — агонь! Раўнулі нашы гарматы, і ў бок ворага паляцелі балванкі вагой у паўцэнтнера. Вежы грозных «тыграў» зрываліся са сваіх гнёздаў, і адляталі ў бок на 15—20 м. За некалькі мінут усе баявыя машыны ворага засталіся без бронекаўпакоў і не змаглі процістаяць нашаму наступленню.

Агонь на сябе. Памятаю той выпадак, калі ў нашай 28-й гвардзейскай артбрыгадзе маёр І.П.Зэкаў выклікаў агонь на сябе. Вось як аб гэтым успамінаў сам Іван Пятровіч.

— Летам 1944 года войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта прасоўваліся ад Віцебска на захад. Мой дывізіён наступаў разам з 1188-м стралковым палком. Дарога ішла па лясістай мясцовасці. З пагоркаў віднеліся сялянскія хутары.

На адным з такіх хутароў, размешчаным у цэнтры круглай лясной паляны, мы трапілі ў акружэнне. Мы — гэта камандзір 1188-га стралковага палка са штабам і першым батальёнам і я, з 5 разведчыкамі і 2 радыстамі. Вечарам, пасля цяжкай дарогі, мы спыніліся на хутары пераначаваць. Мураваны двухпавярховы дом змясціў усіх: у стралковым батальёне наўрад ці засталася чвэрць асабовага саставу. Ён панёс немалыя страты ў баях пад Віцебскам, а папаўненне з-за імклівага руху наперад яшчэ не атрымаў. Былі на зыходзе патроны і гранаты. Гарматы майго дывізіёна рухаліся ўслед за намі за 5—7 км. Не густа было таксама са снарадамі.

І вось раніцой нечакана для нас з заходняга ўскрайку лесу немцы з 5 танкамі пайшлі ў атаку. «Тыгры» адкрылі агонь па дому, адразу ж з'явіліся забітыя і параненыя. Байцы выбеглі на двор, адны заляглі, другія кінуліся назад, але і з усходняга боку былі сустрэты аўтаматным агнём. Камандзір палка пад кулямі і асколкамі арганізоўваў абарону вакол сядзібы. Пехацінцы ліхаманкава акопваліся. Я са сваімі заняў пазіцыю за штабелямі дроў.

Пад шчыльным агнём немцаў колькасць забітых і параненых расла, іх зацягвалі ў падвальны паверх. Я звязаўся па рацыі з камбрыгам Асокіным і далажыў абстаноўку.

— Якое рашэнне ты прыняў? — спытаў ён.

— Пакуль немцы не дасягнулі дома, буду страляць са сваіх гармат. Каманду па батарэі я перадаў ужо. Але там мала снарадаў.

— А калі не спыніце фашыстаў? — пацікавіўся камбрыг.

— Тады выклічу агонь на сябе, — адказаў я, — толькі дапамажыце снарадамі.

— Ты вось што: трымай сувязь са мной і добра карэкціруй агонь.

Тым часам танкі, а за імі і аўтаматчыкі ўжо былі за 30 м ад занятай намі сядзібы. Праз радыста я перадаў на батарэі прыцэльныя ўстаноўкі і скамандаваў адкрыць агонь. Першы выбух уздыбіўся за варожым ланцугом. Я падкарэкціраваў прыцэл і прызначыў чатыры беглыя на кожную гармату. Снарады шчыльна накрылі гітлераўцаў. Адзін трапіў у «тыгр», і той з падбітай гусеніцай закруціўся на месцы. Астатнія танкі, павялічыўшы хуткасць, працягвалі рухацца да сядзібы.

Час у такіх умовах ляціць па асобных законах. Пакуль я перадаваў новую каманду на батарэі, танкі, змяўшы агароджу, уварваліся на двор. Адзін з іх ушчыльную наблізіўся да дома, і, накіраваўшы гармату ў акно падвальнага паверха, дзе знаходзіліся параненыя, выпусціў некалькі снарадаў, але загарэўся і сам. Аўтаматчыкі былі адсечаны ад танкаў і заляглі ў паўсотні метраў ад дома.

Пакуль мы адбіваліся ад гэтай групы немцаў, другая, без танкаў, атакавала нас з усходняга ўзлеску і ўжо прасочвалася на хутар. Для мяне нічога іншага не заставалася, як цераз Асокіна выклікаць агонь на сябе.

— Трымайся, сынок, — пачуў яго трывожны голас.

У крытычныя моманты ён называў камандзіраў дывізіёнаў сынкамі, хоць некаторыя з іх былі старэйшыя за яго.

Тут я ўпершыню за вайну зведаў сілу сваіх снарадаў. Да нямецкіх прывык, і яны не здаваліся ўжо надта страшнымі. Свае ж ірваліся з жудасным ровам і стогнам, з ледзянячым душу выццём асколкаў. Не, не дарма немцы баяліся нашых снарадаў, як чорт ладана, і называлі наш артабстрэл кашмарным пеклам.

Не ведаю, каго загінула больш — нашых ці немцаў, але мы вытрымалі абарону. Пехацінцы падбілі яшчэ адзін танк і знішчылі амаль усіх аўтаматчыкаў. Я баяўся, што за гэты агонь на сябе камандзір стралковага палка будзе моцна лаяцца. Страты ж ад сваіх снарадаў былі немалыя. Але той, выбраўшы хвіліну перадышкі, прыбег да мяне і паціснуў руку:

— Дзякую, пушкар, — сказаў ён. — Своечасова даў агеньчыку, а то быць бы нам усім на тым свеце ці ў палоне.

І адзін у полі воін. Ён быў старшыной 4-га дывізіёна 28-й артбрыгады. Прозвішча — Піліпенка. Гэта чалавек вялікай сілы, вострага розуму, кемлівы і адважны баец. Па роду службы і на вайне займаўся самымі мірнымі справамі: карміў і апранаў байцоў і камандзіраў, быў для іх клапатлівым і патрабавальным бацькам. А па складу характару заўсёды знаходзіў месца для праявы мужнасці і гераізму. Так здарылася і на другі дзень наступлення нашых войск з-пад Віцебска.

Дывізіён наступаў у напрамку Заходняй Дзвіны. Спачатку мы пераадольвалі ўпартае супраціўленне ворага і бездараж, а потым наш рух наперад затармазілі палонныя немцы. Іх набралася больш за сто, а здаць не было каму. Усе спяшаліся хутчэй фарсіраваць раку і замкнуць кола акружэння віцебскай групоўкі гітлераўцаў.

У гэты час да камандзіра дывізіёна маёра Жыронкіна падышоў старшына Піліпенка і папрасіў дазволу адвесці палонных у тыл. Камандзір дазвол даў. У дапамогу сабе Піліпенка ўзяў шаўца дывізіёна радавога Іванова. Яны пастроілі гітлераўцаў, адабралі ў іх папругі і зрэзалі гузікі на штанах. Мы шчыра смяяліся з гэтай працэдуры і не адобрылі выдумку старшыны. На нашы пярэчанні Піліпенка сказаў, што фашыст штука каварная, за ім трэба глядзець ды глядзець. Гэтак будзе спакайней: трымаючы штаны ў руках, вораг хутка не пабяжыць. І сапраўды, калі калона палонных рушыла, то нават самыя фанабэрыстыя фашысты прыгнулі спіны, ушчаперыўшыся абедзьма рукамі за ўласныя штаны.

Дывізіён рухаўся наперад, і толькі на другі дзень мы даведаліся, што на старшыну напалі немцы. Калона палонных мінула лес і выйшла на вялікую палянку, зарослую рэдкім хмызняком. Наперадзе крочыў старшына, ззаду палонных ахоўваў Іваноў. Група ўзброеных фашыстаў хавалася ў прыдарожных кустах.

Калі калона прайшла, шэсць немцаў напалі ззаду на Іванова. Ударам нажа ў спіну ён быў забіты. Палонныя зашумелі. Піліпенка

не паспеў павярнуцца, як на яго з крыкамі «Рус, сдавайсь!» накінулася некалькі палонных. У імгненне ўдарам прыклада ён параскідваў фашыстаў, і тут жа загаварыў яго аўтамат. Трапна кінутыя старшыной 2 гранаты ўціхамірылі гітлераўцаў. Восем немцаў было забіта. Старшына сабраў астатніх палонных. Цела радавога Іванова паклалі на плашч-палатку і немцы неслі яго наперадзе калоны.

Калі зямлю акутаў змрок, Піліпенка прывёў палонных у тыл і здаў каменданту. За мужнасць, праяўленую ў гэтым кароткім баі, старшына Піліпенка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Проста Валя. У адзін з веснавых дзён, калі на гліністых берагах ракі з'явіліся першыя кветкі маці-і-мачыхі, са штаба часці прыйшоў загад прысласць афіцэра для прыёму папаўнення. Самыя вялікія страты ў людзях у нас неслі сувязісты — ім даводзілася пад агнём ворага аднаўляць сувязь, пракладваць новыя лініі. Таму і за папаўненнем папрасіўся пайсці начальнік сувязі старшы лейтэнант Сяргей Ніскубін.

Сустракаць папаўненне — заўсёды радасная падзея для франтавікоў. Прыйдуць памочнікі, акрамя таго, ва ўсіх жыве надзея сустрэць землякоў. І якое ж было наша здзіўленне, калі Ніскубін прывёў адну-адзіную дзяўчыну. Дасюль у дывізіёне жанчын не было. Грубая, нязкладная ваенная форма рабіла яе, маленькую і худзенькую, падобнай на сына палка. У зямлянцы яна бойка далажыла начальніку штаба капітану Жукаву:

— Радавы Сідарава прыбыла ў ваша распараджэнне для праходжання далейшай службы на пасадзе повара. — Потым дадала. — Лепш завіце мяне проста Валя.

«Проста Валя» адразу прынесла нам шмат клопатаў. Дзе размясціць дзяўчыну? Давялося рабіць прыбудову да нашай штабнай зямлянкі.

Для ўзводаў кіравання не было асобнай кухні. Ежу гатавалі па аддзяленнях у вёдрах. З-за бездаражы было дрэнна з прадуктамі, таму Валю не адразу змаглі забяспечыць работай па спецыяльнасці. Але самае галоўнае, што Валя і слухаць не хацела пра небяспеку, якая неадступна вісіць над кожным з нас на фронце. Веснавое сонца выманьвала яе з падзямелля. Яна прыдумвала сабе занятак, толькі б пабыць на беразе ракі. Збярэ нашы ручнікі і нясе мыць. А то ловіць рыбу на кручок, зроблены са шпількі, ці проста загарае на сонцы.

Аднойчы пайшла на бераг ракі за кветкамі, а ў гэты час немцы зрабілі агнявы налёт на наша размяшчэнне. Ад разрываў снарадаў дрыжала зямля, тысячы асколкаў са свістам секлі паветра, ядавіты дым забіваў дыханне. Мы з трывогай спахапіліся, што ў зямлянцы няма Валі.

Як толькі артабстрэл спыніўся, пачалі шукаць. Валя ляжала на беразе ракі ў некалькіх метрах ад варонкі з-пад снарада. Асколак трапіў у нагу. Лужа крыві сведчыла аб сур'ёзным раненні. Побач з Валяй валяўся букецік жоўтых кветачак маці-і-мачыхі. Рану перавязалі і панеслі Валю ў медпункт часці. Калі праходзілі каля штаба дывізіёна, нехта асцярожна паклаў на насілкі яе рэчавы мяшок з няхітрымі салдацкімі пажыткамі. Валя кінула яго ў бок штаба і крыкнула:

— Чакайце, я яшчэ вярнуся!

Усе мы вельмі перажывалі. Кожны лічыў сябе ў нейкай ступені вінаватым у тым, што здарылася.

Артылерыйскія артабстрэлы нашага раёна немцы рабілі штодня. У адзін з налётаў снарад трапіў у кут зямлянкі. На шчасце, ніхто не пацярпеў, але мы былі вымушаны змяніць месцазнаходжанне штаба. Пераехалі на процілеглы бераг ракі, закрыты лесам ад назірання праціўніка.

На вайне часта даводзіцца перажываць непрыемнасці, таму яны і хутка забываюцца. Вось і пра Валю сталі ўспамінаць радзей, і толькі яе рэчавы мяшок, што вісеў на сцяне ў штабной палатцы, нагадваў пра непаслухмяную дзяўчыну.

Лета было ў разгары. Гарачы дзень хіліўся да вечара. Мы адпачывалі на беразе ракі, адбіваліся ад надакучлівых камароў, якіх тут было мноства. За гэтым заняткам і не заўважылі, як падышла дзяўчына. Яна нясмела спытала:

— Вы артылерысты?

Хтосьці нават ускрыкнуў:

— Рабяты, гэта ж наша Валя!

Валя пачала нас абдымаць і цалаваць. І заплакала ад радасці.

Мы не менш за Валю радаваліся яе вяртанню ў часць. Урачыста ўручылі яе рэчавы мяшок. Да таго часу ў нас з'явілася кухня, і Валя адразу ўключылася ў работу. Варыла няхітрую салдацкую страву — капусту ды кашу. Мы і не ведалі, калі яна спала, калі адпачывала. Раніцой устанем — снеданне гатова. Потым — абед і вячэра. У спёку і сцюжу, у абароне і наступленні Валя заўсёды магла

добра накарміць байцоў. Яе прысутнасць рабіла наш мужчынскі калектыў больш высакародным. Нават самыя мацёрыя мацюганшчыкі стараліся трымаць язык за зубамі. Хлопцы сталі больш сачыць і за сваім знешнім выглядам. Як-ніяк кожны з нас тры разы ў дзень хадзіў на «спатканне» з дзяўчынай.

Валя дайшла з намі ад Віцебска да Перамогі. У першыя мірныя дні мы згулялі яе вяселле.

Аднапалчанін. Гэтага смуглявага хлопца мы ласкава называлі сынам балгарскага народа. Ваня Кочанаў нарадзіўся ў Малдавіі, па нацыянальнасці балгарын.

З першых дзён вайны 16-гадовым хлопцам пакінуў родную хату, каб змагацца з фашызмам. Але на вайну 16-гадовых не бралі, і ён пайшоў працаваць на завод, а вечарамі вучыўся на шафёра.

У 17 гадоў Кочанаў становіцца салдатам. Восенню 1943 г. да 28-й гвардзейскай артбрыгады далучылі дывізіён 76-мм гармат. Адну з іх на амерыканскай машыне «шэўрале» вазіў радавы Кочанаў. Не было ў дывізіёне больш адважнага і вынаходлівага вадзіцеля, чым Ваня.

Івану Кочанаву даверылі на сваёй машыне даставіць у Віцебск труну з целам камандзіра дывізіі генерала П.Р.Сцепаненкі, які загінуў у адным з баёў на тэрыторыі Прыбалтыкі. Іван бачыў, як удзячныя жыхары горада, што самі зведалі ўсе жахі вайны, прыйшлі правесці ў апошні шлях баявога генерала. Тысячы людзей ішлі за труной чалавека, які шмат зрабіў для вызвалення Віцебска.

Аднойчы, калі Ваня падводзіў гармату да перадавой, нямецкі снарад трапіў у яго машыну. Выбуховай хваляй Кочанава выкінула з кабіны, а асколкам сур'ёзна параніла нагу. Фельчар перавязаў рану і даў каманду несці ў санітарную машыну. Тут баец заплакаў. Яго спыталі: «Што, баліць?» А ён сярдзіта глядзіць і кажа:

— Усё роўна ў шпіталь не паеду. Людзі без ног самалёты водзяць, і я з адной нагой змагу вадзіць машыну.

Медыцына была няўмольнай, і Валя лячыўся ў шпіталі, а потым вярнуўся ў сваю часць.

Пасля вайны Кочанаў яшчэ некалькі гадоў служыў у арміі.

* * *

8-я артылерыйская прайшла баявы шлях ад Віцебска да Рыжскага заліва. 8 мая 1945 года савецкія воіны пакідалі свае аўтографы на сценах рэйхстага, а дывізія яшчэ дапамагала нашым войскам граміць на Курляндскім паўвостраве прыціснутую да мора фашысцкую групоўку.

У канцы вайны 8-й гарматнай дывізіі было прысвоена гвардзейскае званне, і яна стала называцца 7-я гвардзейская Віцебская Чырвонасцяжная гарматна-артылерыйская дывізія.

Успаміны М.П.Раманава захоўваюцца ў музеі 43-й арміі СШ № 36 г. Віцебска.

Яны вызвалялі Віцебск

З успамінаў Д.І.Ганчарова, камандзіра 158-й дывізіі.

Дзям'ян Ільіч Ганчароў нарадзіўся ў 1896 г. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе.

158-й Лиозненской, дважды Краснознаменной ордена Суворова стрелковой дивизии, которой я командовал, выпала почетная задача овладеть городом Витебском.

Вот как это было.

В начале наступления дивизия получила задачу оборонять полосу в 24 км непосредственно перед городом, чтобы своими действиями сковать 4-ю авиаполевую и 206-ю пехотную дивизии немцев, не дать противнику перебрасывать свои части к месту прорыва 39-й армии.

Ночь перед наступлением с 22 по 23 июня стояла необыкновенно тихая, звездная. И только кое-где раздавались одиночные выстрелы, да противник беспрерывно освещал ракетами свой передний край, — видно было, что нервничал, ждал нашего наступления.

Бой за Витебск дивизия повела во 2-й половине дня 23 июня, когда наблюдением установили, что гитлеровцы со второй позиции начали выводить свои подразделения к линии прорыва.

Чтобы остановить отвод, мной было принято решение овладеть Бабиничами. После сильной артиллерийской подготовки рота особого назначения дивизии захватила насе-

ленный пункт и противник вынужден был вернуть на прежние позиции свои подразделения. Несколько позднее он предпринял ряд сильных контратак, но безуспешно.

В ночь с 23 на 24 июня части дивизии были перегруппированы к центру, на фронте в 5 км.

Утро 24 июня. На горизонте только что показалось оранжевое солнце. 6 часов. С командного пункта дивизии поднялась в воздух серия зеленых ракет. Проходит минута, и воздух тяжело и натужно содрогнулся от артиллерийских и минометных залпов. Выдвинутые заранее на прямую наводку орудия рушили неприятельские блиндажи и огневые точки, разметали в стороны проволочные заграждения.

У каждого радость от того, что наступил час возмездия! Закрадывалась в сердце и печаль — не все вернутся с поля боя.

Взвивается новая серия ракет. В атаку поднялась пехота, воздух прорезало мощное «ура». Противник упорно обороняется. Но уже к 12 часам дня его позиции были полностью прорваны. Отдельные подразделения полков дивизии вплотную подошли к городу. Окраина оказалась сильно укрепленной, перед линией окопов и блиндажей — в 2 ряда проволочные заграждения, перед ними сплошные минные поля.

Мною было принято решение — наступление временно приостановить. В течение ночи с 24 на 25 июня саперам дивизии вместе с разведчиками проделать в минных полях проходы, в полках подготовиться к штурму города.

Ранним утром 25 июня, после короткого артиллерийского и минометного налета, подразделения 881-го, 879-го и 875-го стрелковых полков поднялись в атаку и, ворвавшись в траншеи врага, навязали ему рукопашный бой. Схватки перекинулись в близлежащие дома. Противник цеплялся за каждый этаж. Но наши воины были хорошо подготовлены для уличных боев, и близость врага в городской черте их не пугала. Особенно упорные бои развернулись в районе мыловаренного завода, он несколько раз переходил из рук в руки.

С вступлением в город бой рассыпался на мелкие очаги. В созданных штурмовых группах, кроме автоматчиков участвовали саперы, им придавались пулемет, огнемет, 45- или 76-миллиметровое орудие. Группам ставилась задача не ввязываться в затяжной бой за каждый дом, блокировать его малыми силами, а основными наступать. Таким образом, по мере продвижения штурмовых групп бой гремел в самых различных местах города — и на флангах, и в тылу противника. Это вносило в ряды гитлеровцев панику, заставляло их покидать подготовленные к обороне здания.

К 12 часам полки дивизии вынуждены были прекратить активное наступление, в подразделениях оказались израсходованными все запасы гранат — основного вида оружия уличного боя.

К этому времени наибольшего успеха добился 879-й стрелковый полк, наступавший в центре дивизии. К 12 часам дня 25 июня он вышел к взорванному мосту через Западную Двину. Шедший с передовыми штурмовыми группами заместитель командира полка майор З.С.Марьенко доложил, что фермы погружены в воду, но могут быть использованы для переправы на противоположный берег стрелковых подразделений вместе с легкими противотанковыми орудиями и минометами

К 18 часам подвезены ручные гранаты, пополнены боеприпасами солдатские подсумки и штурм города возобновился. К сожалению, особого успеха он не имел, враг успел частично перегруппироваться и укрепиться. Дальнейший штурм решено было перенести на утро 26 июня, усилить штурмовые группы орудиями и огнеметами.

Командир 875-го стрелкового полка полковник Т.Ф.Токарев доложил, что 206-я пехотная дивизия противника, оказавшаяся сзади наших частей, начала организованный отход по сохранившемуся мосту на западный берег Двины. Спасение этого моста имело важное значение для дальнейшего наступления всего нашего фронта.

Было принято решение: свернуть полк во взводные колонны и, придав им противотанковые орудия, ночью овладеть мостом. Расчет по захвату строился на том, что в спешке немецкие подразделения должны принять наш приближающийся полк за свои отходящие части.

Так и получилось. Командир 875-го полка, как было приказано, начал наступление в сторону моста в 0 часов 30 минут 26 июня, т.е. вместе с отступающими немцами. Действия нашего передового батальона майора В.П.Казанцева были настолько неожиданными, что враг, не оказав никакого сопротивления, был обезоружен. Следующий наш батальон разоружил второй батальон противника. Таким

же образом были пленены последующие отходящие немецкие части.

Минут через сорок полковник Токарев доложил: «Полк мостом овладел. Нахожусь на мосту, захвачено 500 пленных, большое количество транспорта. Продолжаю наступление на товарную станцию».

Одновременно командир 879-го стрелкового полка полковник Г.Г.Савокин форсировал реку по обломкам другого, взорванного моста и штурмом, переходящим в рукопашную, овладел пассажирской станцией и вокзалом.

Командиру 881-го полка полковнику Я.И.Бронтшейну было приказано быстро выдвинуться в направлении полосы наступления 875-го стрелкового полка с задачей продолжать бои по очищению города, занять высоты западнее Витебска и оборонять их, если противник поведет наступление с запада. В 3 часа 26 июня части дивизии полностью овладели Витебском.

26.6.1944 г. капитан Д.В.Мясоедов во главе разведроты 881-го стрелкового полка ворвался в Витебск и установил над городом, на Доме специалистов (жилой дом напротив главного корпуса ветеринарного института), Красное Знамя. [В 1946—59 гг. Мясоедов на партийной, советской и хозяйственной работе в Сиротинском районе. Умер в 1964 г. В Витебске его именем названа улица, на здании Дома специалистов (ул. Доватора, 14/9) в честь подвига Мясоедова установлена мемориальная доска.]

Жителей в городе не было. Он был весь разрушен. Наши части захватили 69 складов с различным имуществом противника. Большинство из них были заминированы и начали взрываться.

26 июня из Витебска в сторону Смоленска дивизией направлено 3000 пленных немецких солдат и офицеров. 27 июня утром бой вновь возобновился южнее города — еще кое-где продолжали сопротивляться отдельные подразделения противника.

Только на высотах южнее Витебска 875-м и 879-м полками было пленено 2500 немецких солдат и офицеров, захвачено 200 автомашин с имуществом и продовольствием, 3000 лошадей с повозками.

Мы пополнились трофеями. Пришедшие в негодность автомашины и повозки были заменены новыми, трофейными, а сибирские мелкие лошади — сильными, бельгийской породы, создан резерв для последующих боев.

Дивизия еще не одерживала таких крупных побед! В сражении за старинный город Витебск все воины — и командиры, и солдаты, обогащенные опытом предыдущих боев, действовали исключительно самоотверженно и умело. Бой вели все: и штабные офицеры, и политработники, и журналисты газеты «За победу», и военная прокуратура, и интенданты.

Наши потери, по сравнению с противником, были минимальными. Ибо заранее предвидели жестокие уличные бои и еще в обороне готовились к ним. Хорошая подготовка офицерских кадров, высокая обученность солдатского состава венчали успех штурма.

Люди праздновали нашу победу. А мы 28 июня получили новый приказ. Несмотря на огромную физическую усталость, воины дивизии форсированным маршем вновь двинулись к новым боям за наши города и села, за освобождение от гитлеровского рабства других народов. Дивизия взяла твердое направление на Берлин. Мы шли на запад.

Успаміны захоўваюцца ў Музеі 39-й арміі ў СШ № 32 у Віцебску.

З успамінаў камандзіра 3-й батарэі 255-га асобнага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага дывізіёна 145-й стралковай дывізіі А.Е.Раманава

К вечеру 25 июня батарея, поддерживающая действия 599-го стрелкового полка, вышла на рубеж Тирасполя. Всю ночь продолжался бой с гитлеровцами, оборонявшимися в долговременных огневых точках, под которые были приспособлены подбитые танки и бронемашины.

В городе мы встретились с завалами на шоссейной дороге от разрушенных через железную дорогу мостов. Казалось, непроходимая зона для боевой техники. Но с помощью солдат стрелковых подразделений и танков 10-го учебного полка нам удалось преодолеть один за другим оба переезда и подойти с севера к железнодорожной станции Витебск.

Приближалось утро 26 июня. На станции стоял готовый к отправке железнодорожный состав. С ходу заняли огневые позиции. Первым выстрел по паровозу сделало орудие старшего сержанта Г.Ф.Воробьева. Груженный гитлеровцами состав не ушел.

В это время обратились ко мне разведчики батареи Василий Назаренко и Владимир Матвеев. «Хотим установить флаг на ближайшем здании». Я поддержал их идею и предложил

поднять красное полотнище на городском элеваторе — самом высоком здании на территории только что отвоеванной.

Хорошо помню одного из бесстрашных воинов батареи 19-летнего Василия Назаренко, у которого был свой счет к оккупантам. В калининской деревне у него на глазах фашистские палачи расстреляли отца.

Вскоре на полуразрушенном здании элеватора взвился красный флаг — символ освобождения города. Мы торжествовали.

Успаміны захоўваюцца ў фондзе музея 43-й арміі СШ № 36 г. Віцебска.

Ішла дывізія наперад

В музее 43-й армии (СШ № 36 г. Витебск) хранится послужной список 306-й дважды Краснознаменной Рипшевской стрелковой дивизии (2 машинописные страницы).

«В Витебской наступательной операции 43-й армии в июне 1944 г. 306-я КРСД наступала в главной группировке, штурмовала узел обороны немцев Шумилино и, неотступно преследуя противника, форсировала Западную Двину в районе Гнездилово, захватила плацдарм на южном берегу реки, чем обеспечила успешные боевые действия войск 1-го КСК 43-й армии. Указом Президиума Верховного Совета СССР от 10 июля 1944 г. за прорыв обороны противника в районе Шумилино и форсирование реки Западная Двина дивизия награждена орденом Боевого Красного Знамени».

Сформирована была в Московском военном округе в июне 1942 г. В августе прибыла в состав 1-го Краснознаменного стрелкового корпуса 43-й армии. В сентябре 1943 г. овладела сильно укрепленным Рипшевским узлом обороны противника.

Орденоносными за витебскую операцию стали все части дивизии. Этим же указом были удостоены орденов: Боевого Красного Знамени — 992-й, Кутузова 3-й степени — 938-й, Александра Невского — 935-й стрелковые полки и Кутузова 3-й степени — 1043-й артиллерийский полк.

Примером мужества и отваги являлся сам командир дивизии Герой Советского Союза генерал-майор М.И.Кучерявенко. Неоднократный героизм проявлял командующий артиллерией соединения полковник И.С.Худолеев: «При отражении контратак немцев восточнее Витебска, не ведая страха, лично прямой наводкой из 122-мм пушки уничтожил 3 «тигра» и обеспечил успешные действия частей дивизии».

22 воинам 306-й стрелковой, в том числе И.С.Худолееву, присвоено звание Героя ветского Союза.

От Витебска путь лежал на запад. Со ты, сержанты и офицеры дивизии участв ли в наступательных операциях 43-й армии Прибалтике, ликвидации группировки пр тивника в Курляндии.

«306-я КРСД не знала неудач и отступлений», — подчеркивается в послужном списке соединения, подписанным дважды Героем Советского Союза генералом армии А.П.Белобородовым.

Падрыхтаваў да друку У.І.Галдзілаў.

«Кацёл» ліквідаваны

Боевые действия в районе Витебска и их результаты привлекли к себе внимание мировой общественности. Советское правительство разрешило 35 иностранным корреспондентам посетить места боев. Их сопровождал заместитель командующего 39-й армией генерал-майор Н.И.Иванов.

Английский журналист А.Джейбок красочно описывал тогда увиденное им: «Мы направились в главный район окружения, занимавший около четырех миль в ширину и семь миль в длину. Со стороны заходящего солнца на фоне багрово-красного горизонта, волоча ноги, показалось около двухсот пленных фашистов. Одни босиком, другие оборванны, а в общем — все в плачевном виде. Это шествие напоминало финальную сцену из «Гамлета» и производило впечатление чего-то неправдоподобного. Дорога, ведущая в котел, на многие мили покрыта пылью и трупами лошадей. Белая зловещая пыль. А вот и людские трупы. Я никогда не думал, что мне придется увидеть поле боя после такого страшного кровопролития». (Цэнтральны архіў Мі-

ністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, ф. 48, воп. 4494, спр. 7, л. 88—89.)

Прошло еще несколько дней, и советские конвоиры провели по просторному Садовому кольцу в Москве свыше 57 тысяч немецко-фашистских солдат и офицеров, взятых в плен войсками Белорусских фронтов. Во главе их шагал генерал от инфантерии Гольвитцер, бывший командир 53-го армейского корпуса, комендант крепости Витебск, на стойкость которого так рассчитывали Гитлер и командование группы армий Центр».

Генерал-лейтенант В.Р.Бойко.
С думой о Родине. М., 1982.

Як «ускіпеў» «віцебскі кацёл»

У той час я быў камандзірам батарэі «кацюш» 4-га гвардзейскага мінамётнага палка. Прыгадваю адзін эпізод апошніх баёў пад Віцебскам і разгрому акружанай варожай групоўкі.

...Палкавыя разведчыкі на чале з гвардыі капітанам Уладзімірам Сакаловым услед за перадавым атрадам пераправіліся цераз Заходнюю Дзвіну і разам з танкамі ўвайшлі ў Бешанковічы, дашчэнту спаленыя немцамі пры адступленні. Машыну разведчыкі паставілі ў невялікім садзе пад яблынямі, усеянымі дробнымі і яшчэ няспелымі пладамі. Салдаты мыліся ля студні, а сяржант Пятроў схіліўся над радыёстанцыяй, услухоўваючыся ў піск марзянкі. З палка перадалі радыёграму: «Выбраць месца для сканцэнтравання палка». Пачалі вывучаць карту, спынілі выбар на раёне невялікай вёсачкі Забалоцце. Стаяла яна крыху ў баку ад бальшака і на першы погляд магла быць зручным месцам для размяшчэння палка.

— З'ездзім, паглядзім, а тады і вырашым, што рабіць, — сказаў капітан і даў каманду на выезд.

З цяжкасцю прадзіраючыся на старэнькім «газіку» між танкаў, бронетранспарцёраў і ўсюдыходаў (гэта перанацэльвалася на Камень і Ушачы танкавая брыгада), разведчыкі праз паўгадзіны дабраліся да Забалоцця. Выбранае месца ім спадабалася. Акуратныя хаткі патаналі ў густых садах, побач з вёскай шырокай паласой цягнуўся высокі хмызняк, а ад бальшака вяла вузкая, але ўезджаная дарога.

— Зусім нядрэннае месцейка, — радаваліся разведчыкі. — Тут можна размясціцца з камфортам. А маскіроўка такая, што лепей і не прыдумаеш.

Калі ў 2-й палавіне дня прыбыў полк, у вёсцы стала цесна і шумна. Фыркалі маторы машын, звонка пераклікаліся галасы байцоў, чуўся смех дзяцей, што прыбеглі з ляснога гушчару. На ўскраіне задымілі палявыя кухні, смачна запахла смажаным мясам. Заўсёды асцярожны камандзір палка загадаў так размясціць падраздзяленне, каб забяспечвалася кругавая абарона: мы павінны быць да ўсяго гатовыя.

Камандзір паглядзеў, як размяшчаюцца падраздзяленні, а потым па выкліку паехаў у штаб арміі.

Гвардзейцы паставілі свае «кацюшы» у садах пабатарэйна. А на ўскраіне вёскі разлікі супрацьтанкавых ружжаў і кулямётчыкі абсталявалі глыбокія акопы. Байцы працiралі ад пылу ўзбраенне і боепрыпасы, правяралі баявую тэхніку пасля маршу. Але як толькі асноўная работа была скончана і выстаўлена варта, іх цяжка было ўтрымаць ля машын. Усіх цягнула ў цэнтр вёскі, дзе раптам зайграў гармонік, пасыпаліся вясёлыя частушкі, а потым загучала танцавальная музыка. Ля баявых машын хадзілі вартавыя і з зайздрасцю прыслухоўваліся да дзявочых галасоў. Яшчэ б! Павесяліцца на фронце ў такой кампаніі ўдаецца не так часта. Жыццё ж працягвалася!

Весялосць была ў разгары, і ніхто не звярнуў увагі на аўтаматную траскатню на поўдзень ад вёскі (да страляніны франтавікі даўно прывыклі). Але там няспынна білі дзесяткі нямецкіх аўтаматаў, а потым недалёка раз-пораз грымнулі выбухі ручных гранат. Калі страляніна пачала нібы набліжацца, капітан Сакалоў пазваў пальцам сваіх разведчыкаў і пайшоў у штаб. А ў цэнтры вёскі звінела музыка. Начальнік штаба пасмяяўся над трывогай капітана, але дазволіў высветліць прычыну інтэнсіўнай перастрэлкі. Сакалоў сунуў у кішэню камбінезона пісталет, кіўнуў разведчыкам і пакрочыў цераз сады.

Доўга шлёпалі яны па зарослым травой і густым хмызняком балоце, пакуль выбіліся на дарогу. З боку Віцебска рухаліся калоны машын, пяхота і нават танкі. Капітан з прыкрасцю думаў, што дарэмна падняў разведчы-

каў, і хацеў вяртацца ў полк, але раптам яго ўвагу прыцягнуў незвычайны выгляд танкаў.

— Ды гэта ж нямецкія T-IV! І пяхота не наша. Вось гэта абстаноўка!

Разведчыкі падпаўзлі ўшчыльную да дарогі і на ўзбочыне ўбачылі перавёрнутыя «студэбекеры», пакарабачаныя 122-мілімітровыя гаўбіцы і трупы нашых салдат. Дык вось дзе стралялі і рваліся гранаты! Відаць, наша батарэя, даганяючы танкі перадавога атрада, раптоўна наткнулася на фашыстаў, не паспела развярнуцца і загінула ў няроўным баі. Як потым стала вядома, менавіта тут прарывалася з «катла» буйная групоўка гітлераўцаў на чале з генералам Пісторыусам, які змог сабраць у кулак падраздзяленні акружаных пад Віцебскам 206-й, 246-й, 197-й пяхотных, а таксама 4-й і 6-й авіяпалявых дывізій.

Два нямецкія бронетранспарцёры падышлі да хмызняку і заглушылі маторы. Тут жа з'явіліся гітлераўскія афіцэры і доўга пра нешта спрачаліся, тыцкаючы пальцамі ў тапаграфічную карту і паказваючы рукамі то на Забалацце, то на Машкі — другую вёску, размешчаную за 3—4 км на поўдзень.

Разведчыкі, што стаіліся ў хмызняку, здалёк чулі толькі асобныя словы, але ім ужо было зразумела: немцы хочуць ударам сабраных падраздзяленняў захапіць Забалацце і Машкі, перарэзаць бальшак Бешанковічы—Чашнікі, па якім прайшлі ўжо нашы перадавыя часці, і па лясах адысці на захад.

Тут сабраны салдаты амаль усіх радоў войск, — заўважыў капітан Сакалоў. — Вось сапраўдныя пехацінцы, тут жа побач артылерысты, танкісты і авіятары. Гармат і мінамётаў не відаць — іх, пэўна, кінулі ў балотах. Пяхота для нас не страшная, але варожыя танкі могуць нарабіць бяды...

Вестка, прынесеная разведчыкамі ў вёску, умомант рассеяла натоўп спевакоў і танцораў. Кароткая каманда «Разлікі, да гармат!» кінула байцоў на баявыя пасты. У гвардзейцаў пачуццё зухаватасці і маладога запалу змянілася звыклым, напружаным чаканнем бою. Ля рэактыўных установак разлікі выкладвалі запас снарадаў, на толькі што занятых назіральных пунктах былі разгорнуты прыборы і ўстаноўлена сувязь.

Батальон 652-го стрелкового полка, наш 421-й отдельный истребительный противотанковый дивизион, 3-я артбатарея, которой я командовал, взвод автоматчиков, взвод противотанковых ружей оказались полностью отрезанными от своих частей и окружены. Мы заняли огневые позиции.

Командир взвода лейтенант Шиянов выставил часовых, время уже было около 24 часов. Немцы пустили в ход свою агитмашину. Хорошо было слышно, как они через рупор уговаривали нас сдаться в плен без боя: «Вы окружены, и если хотите сохранить свою жизнь, сдавайтесь. В противном случае все до одного будете уничтожены».

Я дал команду орудийным расчетам занять свои места, быть готовыми к отражению немецкой атаки. И она не заставила себя ждать. Не успели наши орудия произвести и по одному выстрелу, как открыли огонь немецкие самоходки, стоявшие замаскированными на небольшой опушке леса, всего в каких-то 400 – 500 м. Они прямой наводкой уничтожили 2 наших расчета вместе с орудиями. Земля содрогалась от разрывов. Осколки со свистом пролетали над головой.

Огонь по нашим позициям продолжался около 20 минут...

Очнулся я от тишины. Стряхнул с себя землю, потряс головой, посмотрел на ноги — как будто цел. А кругом немцы! Они ходят небольшими группами по 5 – 6 человек, разыскивая живых или раненых наших бойцов, и тут же их пристреливают.

Перед моими глазами в нескольких метрах прополз младший лейтенант Пушкарев, с которым вместе учились в военном училище. Смолянин, чернобровый, с красивыми чертами лица, рослый, атлетического телосложения. Но в те минуты он был неузнаваем, весь в крови. Но он ползет, не думая о том, что кругом немцы. Я заметил, как у него из живота выпадают внутренности. Одной рукой зажимая огромную рану, он снова делает усилия ползти вперед. Вижу, подошли к нему немцы, окружили, что-то бормочут. Мой боевой товарищ сжав губы смотрит на фрицев, но помощи не просит. А в нескольких метрах еще 2 фрица приподняли нашего офицера под мышки, так у него была оторвана нога по самый пах.

В этот момент я, не дожидаясь, когда немцы подойдут и также будут издеваться надо мной, незаметно подтянул руку к кабуре, достал пистолет, приставил его к виску.

А в это время немцы обшаривали все карманы у Пушкарева. Ничего не найдя, они прикололи его штыком. А ведь было ему всего 21 год, он еще вчера мечтал о жизни, о скорой победе. Часто вспоминал о своей любимой девушке из Смоленска...

В этот момент, не колеблясь, я нажал на спусковой курок, но выстрела не последовало. Нажимаю еще раз и еще, — тишина, видимо, что-то с пистолетом. Вспомнил, что за поясом у меня есть «лимонка». Нащупал ее, но не смог удержаться и бросаю гранату в то место, где немцы расправлялись с Пушкаревым.

Раздался взрыв, я бросаюсь бежать в противоположную сторону, попадаю в глубокую воронку, на дне которой уже покоились трое наших солдат. Я подлез под один из трупов, еще двоих подтащил к себе ближе.

Так я пролежал день, немцы меня не заметили, а к вечеру с нашей стороны началась артподготовка. Снаряды один за другим падали и рвались рядом с воронкой. Земля колыхалась от оглушительных взрывов. Как только артподготовка утихла, до меня донеслось наше «ура». Я глубоко вздохнул и от радости подхватил призыв атаки. Но мой голос не долетал до верху. Я потерял сознание...

Очнулся, когда к воронке подошли наши солдаты из похоронной команды. Они меня и нашли среди погибших боевых товарищей.

Вскоре я разыскал свою часть. Встретил лейтенанта Алексея Шиянова и весь его взвод. Так я был рад, что они тоже чудом остались в живых.

Падрыхтаваў да друку У.І.Галдзілаў.

Баявая слава ідзе далёка

Мне, удзельніку вызвалення Віцебска, хочацца нагадаць пра адважнага сувязіста Мікалая Рыгоравіча Краўчанку. Ён нарадзіўся ў сяле Самацееўка Краснапольскага раёна Сумскай вобласці. Пра яго ў гады вайны пісалі дывізіённыя і армейскія газеты. Мікалай Рыгоравіч заслужыў таго, каб пра яго ведалі ўсе, асабліва там, дзе ён храбра ваяваў, вызваляючы нашу зямлю.

Летам 1944 г. ў раёне Віцебска савецкія войскі акружылі 5 варожых дывізій.

Каля сяла Сіроціна, недалёка ад ракі Заходняя Дзвіна, раніцой 22 чэрвеня завязаўся бой аднаго нашага стралковага батальёна (199-га палка 67-й дывізіі). У першыя ж хвіліны сувязь паміж батальёнамі і назіральным пунктам палка перарвалася. Сувязіст Мікалай Краўчанка са сваім напарнікам кінуліся

на яе аднаўленне. А ўсё навокал прастрэльвалася агнём ворага.

Калі наступіла раніца, бой разгарэўся з новай сілай. І зноў час ад часу знікала сувязь. І зноў бясстрашны воін Краўчанка хутка знаходзіў разрывы провада і аднаўляў сувязь. І раптам яго напаткала бяда. Побач разарваўся снарад і напарнік Краўчанкі ўпаў цяжка паранены. Трэба ратаваць таварыша, а варожы агонь не сціхае. І сувязь са штабам зноў прапала. Дым і пот заціпаюць зрок, зморaны так, што не ўтрымацца на нагах. Але таварыша ратаваў, нёс на сабе, пакуль не сустрэў санітараў. Перадаў параненага сябра і зноў вярнуўся да свайго баявога месца.

Нарэшце, пад ударамі наступаючага палка гітлераўцы змушаны былі адступіць. Вось калі Краўчанка змог перадыхнуць! І ён пайшоў па знаёмай лініі да штаба, 47 вузлоў налічыў, якімі павязаў кабель.

Камандаванне высока ацаніла подзвіг салдата, прадставіўшы яго да ордэна Славы 1-й ступені. На грудзях героя сувязіста заззяў трэці ордэн Славы.

Мікалай Рыгоравіч Краўчанка шчасліва завяршыў сваю салдацкую службу і вярнуўся ў родны калгас.

А.Ф.Кулакоў, падпалкоўнік у адстаўцы.

Парадніў нас Віцебск

З успамінаў Васіля Данілавіча Трампольца, былога начальніка радыёстанцыі 13 «Р» 494-га артпалка 164-й Віцебскай Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі, гвардыі сяржанта.

У 1984 г. атрымаў я прыемны ліст: «Паважаны Васіль Данілавіч! Запрашаем Вас на святкаванне 40-годдзя вызвалення горада Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

Адразу ж пачаў збірацца ў шлях. Вельмі хваляваўся — цэлых чатыры дзесяткі гадоў мінула, як быў у тым краі, за які біўся з ворагам, які вызваляў разам са сваімі баявымі сябрамі — аднапалчанамі. Змагу ж нарэшце паглядзець на мірны горад, прыгадаць што было тады...

На ўрачыстасцях мне далі слова. І я стаў расказваць пра аперацыю «Багратыён», пра байцоў, з якімі ваяваў побач. Сярод храбрых назваў бясстрашнага Джабара Талавіча Лігідава, ураджэнца Кабардзіна-Балкарыі. Сам Джабар вызначаўся не толькі нечуванай адвагаю, але і ўменнем ваяваць. Па рацыі мы не раз чулі, як немцы гаварылі пра яго: «Гэтага абавязкова ўзяць жывым»...

Ды не толькі ўзяць жывым Джабара, але і падавіць агонь яго разліка фашыстам не ўдалося — так умела і хітра ладзіў пазіцыі Лігідаў.

У ночы з 25 на 26 чэрвеня вялікая група гітлераўцаў спрабавала вырвацца з акружэння па шашы Віцебск — Лепель. На іх шляху разам з пехацінцамі стала грозная мінамётная батарэя. Бой быў суровы. У разліку Лігідава амаль усе мінамётчыкі выйшлі са строю. Джабар сам стаяў ля прыцэла і біў трапна па ворагу. Фашысты, страціўшы надзею прарвацца, сталі здавацца ў палон. На працягу 2 месяцаў баявых дзеянняў за вызваленне беларускай зямлі Джабар быў узнагароджаны 2 ордэнамі — Славы 3-й ступені і Чырвонай Зоркі.

І вось пасля майго выступлення падыходзіць да мяне плячысты, моцна збіты волат, з дабрадушнай абаяльнай усмешкай на бронзавым твары і зззяючымі вачыма. Падыходзіць і гаворыць:

— Не пазнаеш?!... Здорава ты мяне, брат, расхваліў. Не заслужыў я такога гонару.

— Джабар! Ці ж гэта ты?

І мы моцна абняліся. Сціснулі зубы, каб пры ўсіх не расплакацца. Але слёзы неяк самі паліліся з вачэй. І ніхто нас не асудзіў.

А потым мы доўга гаварылі. Джабар засыпаў мяне пытаннямі, а я расказаў яму, што пасля дэмабілізацыі з ордэнам Чырвонай Зоркі і 9 медалямі вярнуўся ў сваю родную станіцу на Доне. Працаваў механізатарам, вучыўся ў Растоўскім інстытуце народнай гаспадаркі. Цяпер — старшы інжынер.

Праз нейкі час выдавалася мне камандзіроўка ў Кабардзіна-Балкарыю. З каўказскай гасціннасцю, з душэўнай цеплынёй сустрэў мяне Джабар. Ужо праз нейкія хвіліны ўсё сяло даведалася — да Джабара прыехаў баявы брат.

Паказаў мой франтавы сябар сяло сваё — прыгожае, утульнае, вялікае.

— Я ж таксама будаўнік, — заўважыў ён. — Доўгі час працаваў у мехкалоне. Бачыш колькі новабудоўляў — новы млын,

масласырзавод. А далей кашара на тры тысячы авечак. У гэтых, ды і іншых новабудоўлях, ёсць мая праца. Мірным ордэнам «Знак Пашаны» адзначылі. Паспытаў пабыць на пенсіі, ды не сядзіцца. Зараз — начальнік участка будаўнічага механізаванага ўпраўлення. Хочацца так многа, брат, зрабіць для жыцця.

Я слухаў яго і думаў: «А калі б не было ў нас вось такой дружбы, агульных думак, вялікай волі змагання, ці змаглі б мы перамагчы...»

Шпіталі, якія размяшчаліся ў Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Нумар	Калі існаваў
15-ы ППШ	22.6 — 9.7.1941
25-ы ППШ	22.6 — 13.7.1941
214-ы ППШ	4.7.1941 — невядома
430-ы ЭШ	15.7.1944 — 30.12.1945
1081-ы ЭШ	1.12.1944 — 1.11.1945
1086-ы ЭШ	11.7.1944 — 1.10.1944
1496-ы ЭШ	1944 — 1.10.1944
1611-ы ЭШ	май 47 — 29.4.1948
1812-ы ЭШ	1.7 — 8.1944
1849-ы ЭШ	15.7 — 1.10.1944
1900-ы ЭШ	15.7 — 1.10.1944
1923-і ЭШ	15.7.44 — невядома
1967-ы	15.7 — невядома
2067-ы ЭШ	26.6.41 — невядома
2068-ы ЭШ	4.7 — 11.7.1941
2479-ы ЭШ	15.7 — 1.10.1944
2557-ы ЭШ	кастрычнік 44 — верасень 1945
2813-і ЭШ	1.11 — 1.12.1944
3354-ы ЭШ	19.7 — 1.10.1944
3371-ы ЭШ	19.7 — 1.10.1944
3428-ы ЭШ	1.8 — 1.10.1944
3437-ы ЭШ	14.7 — 10.9.1944
3461-ы СЭШ	1.7 — 1.10.1944
3473-і ЭШ	15.7 — 1.10.1944
3476-ы ЭШ	19.7 — 1.10.1944
3501-ы ЭШ	15.8 — 1.10.1944
3676-ы ЭШ	22.9.1944 — 9.11.1945
3822-і ЭШ	23.7 — 1.10.1944
4240-ы ЭШ	1.8.1944 — невядома
4115-ы ЭШ	18.9 — 31.7.1944
4381-ы ТППШ	5.7 — 8.7.1944
4716-ы ЭШ (ТППШ)	31.7 — 1.10.1944
4921-ы ЭШ	15.7 — 15.9.1944
4925-ы ЭШ	15.7 — 1.10.1944
5378-ы ЭШ	15.7 — 1.10.1944
5381-ы ЭШ	11.11.1944 — 1.12.1945
5762-і ЭШ	15.9.1944 — 20.10.1945
5865-ы ЭШ	1.7.1944 — 1.11.1945
Абласны шпіталь інвалідаў Айчыннай вайны	1945

СКАРАЧЭННІ

ППШ — палявы перасоўны шпіталь
ЭШ — эвакуацыйны шпіталь
ТППШ — тэрапеўтычны палявы перасоўны шпіталь
СЭШ — сартыровачна-эвакуацыйны шпіталь
ІШ — інфекцыйны шпіталь

Архіў Віцебскага гарваенкамата.

Па старонках газеты «Віцебскі рабочы»

1944 год.

4 сакавіка. «Масква, Крэмль, І.В.Сталіну. Любімы наш правадыр, бацька і настаўнік, Іосіф Вісарыёнавіч! У цяжкі час выпрабаванняў для нашай Радзімы, у 1942 г. ўсе свае зберажэнні — 10 тыс. руб. я ўнёс на танкавую калону імя гераічнай Савецкай Беларусі. Сёння ў гонар гераічнай Чырвонай Арміі і яе найвялікшых перамог на франтах Айчыннай вайны, у імя любові і ўдзячнасці да

Вас — геніяльнага палкаводца і натхніцеля перамог народаў СССР, я ўношу 1250 руб. на танкавую калону «Савецкі аграном». Аграном Віцебскага абласа І.М.Арэхаў».

6 красавіка. Невялікі калектыў работнікаў абласной газеты «Віцебскі рабочы» унёс на пабудову эскадрыллі самалётаў «Большевистская печать» 13 675 руб. Праз некалькі дзён з Масквы атрымана тэлеграма: «Прашу перадаць супрацоўнікам абласной газеты «Віцебскі рабочы» маё брацкае прывітанне і падзяку Чырвонай Арміі. І.Сталін».

22 ліпеня. На другі дзень пасля вызвалення Віцебска адкрыўся першы кіёск (Сянная плошча) па продажу газет, часопісаў, літаратуры. За час работы кіёскам прададзены дзесяткі тысяч экзэмпляраў «Правды», «Известий», «Комсомольской правды», рэспубліканскіх і абласной газет.

* * *

5 жніўня. Пасля выгнання фашыстаў з Віцебска ўзяліся за аднаўленне гарадскога дзетдома № 8; ачысцілі памяшканне ад смецця, уставілі вокны, набылі мэблю. Цяпер у дзетдоме знаходзіцца 19 дзяцей. Дзеці забяспечаны харчаваннем і вопраткай.

12 жніўня. Нямецкія варвары знішчылі гістарычныя каштоўнасці Віцебскага музея. Музей меў многа гістарычных дакументаў 17—20 ст., калекцыю старажытнай зброі, манет, прадметаў побыту і інш. Частку экспанатаў фашысты вывезлі, а частку знішчылі на месцы.

16 жніўня. Адкрыўся кінатэатр «Спартак». Першым дэманстраваўся кінафільм «Радуга». За 5 сеансаў гэты фільм паглядзелі звыш 2,5 тыс. віцяблян. У бліжэйшы час будуць дэманстравацца кінафільмы «Жди меня», «Антоша Рыбкин», «Кутузов», «Бой за Витебск».

18 жніўня. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за ўзорнае выкананне ўрадавых заданняў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у тыле праціўніка і праяўленыя пры гэтым адвагу і гератва і за асобыя заслугі ў развіцці партызанскага руху ў Беларусі групе партызан прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Сярод 27 узнагароджаных — А.Ф.Данукалаў, П.М.Машэраў, М.П.Шмыроў.

4 кастрычніка. У Віцебскім педагагічным інстытуце імя Кірава пачаліся заняткі. Фашысты разбурылі памяшканне інстытута, і ён часова размясціўся ў інтэрнаце. На фізіка-матэматычным, гістарычным і прыродазнаўчым факультэтах займаюцца 260 студэнтаў.

Аднаўленне чыгункі пад Віцебскам. 1944 г.

К.А.Абазоўскі.

І.А.Авекаў.

В.І.Аверчанка.

М.Альбер.

Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы і жыхары Віцебска, удзельнікі вызвалення горада ў 1944 г.

АБАЗОЎСКІ Канстанцін Антонавіч. Нарадзіўся 1.10.1919 г. ў в. Абухава Бешанковіцкага раёна. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут (1938), авіяцыйнае вучылішча (1943). У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну з мая 1943 г. на фронце. Удзельнічаў у вызваленні Паўночнага Каўказа, Крыма, Прыбалтыкі. Зрабіў 106 баявых вылетаў, знішчыў 16 самалётаў, 11 танкаў, 139 аўтамабіляў, 26 зенітных установак, 2 склады з боепрыпасамі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.10.1944 г. Загінуў 26.10.1944 г. ў Прыбалтыцы. У г.п. Бешанковічы яму пастаўлены помнік.

АВЕКАЎ Іван Аўдзеевіч. Нарадзіўся 19.5.1919 г. на ст. Асінаўка Дубровенскага раёна. Жыў і працаваў у Віцебску, з 1937 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў Харкаўскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў-назіральнікаў (1939), Адэскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1940). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Заходнім і Цэнтральным франтах. Удзельнік абароны Масквы, Тулы. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка капітан І.А.Авекаў да сакавіка 1942 г. зрабіў 178 баявых вылетаў, збіў асабіста 15 варожых самалётаў і 6 у групе, 23 самалёты знішчыў на аэрадромах. 20.3.1942 г. ў раёне Гжацка (зараз г. Гагарын Смаленскай вобласці) у паветраным баі з 7 варожымі самалётамі збіў 2 з іх, і яшчэ 1 пратараніў пасля таго, як яго самалёт быў падбіты. Загінуў у паветраным баі 17.4.1943 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 24.8.1943 г. Пахаваны ў г. Данкоў Ліпецкай вобласці.

АВЕРЧАНКА Васіль Іванавіч. Нарадзіўся 15.3.1917 г. ў в. Ісакаўка Заларынскага раёна Іркуцкай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1938 г. З кастрычніка 1941 г. на Калінінскім, Волхаўскім, 1-м Прыбалтыйскім франтах. Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў час прарыву варожай абароны і фарсіравання Заходняй Дзвіны ў Віцебскай вобласці. Група байцоў пад камандаваннем старшага сяржанта В.І.Аверчанка ў ліку першых пераправілася цераз раку і на захопленым плацдарме знішчыла 80 і захапіла ў палон 20 гітлераўцаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. Пасля вайны жыў у Іркуцкай вобласці. Памёр 27.7.1967 г.

АЛЬБЕР Марсель. Нарадзіўся 25.11.1917 г. ў Парыжы. Заслужаны лётчык Францыі. Скончыў авіяцыйную школу (1939). У 2-ю сусветную вайну змагаўся ў радах дэголеўскіх сіл «Змагарная Францыя». З 1943 г. ў СССР у складзе авіяпалка «Нармандыя — Нёман» 1-й паветранай арміі. Зрабіў 193 баявыя вылеты, збіў 23 самалёты праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 27.11.1944 г. Пасля вайны да 1947 г. капітан М.Альбер служыў у арміі.

АНДРЭ Жак. Нарадзіўся 25.2.1919 г. ў Парыжы. Заслужаны лётчык Францыі. Вучыўся ва універсітэце, скончыў лётную школу. З 1943 г. ў СССР у складзе знішчальнага авіяпалка «Нармандыя — Нёман» 1-й паветранай арміі. Удзельнік Віцебска-Аршанскай, Усходне-Прускай, Кёнігсбергскай аперацый.

Ж.Андрэ.

П.А.Арэф'еў.

Б.М.Афанасьеў.

М.М.Бабкін.

Зрабіў 113 баявых вылетаў, збіў 17 самалётаў праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.6.1945 г. Да 1969 г. ў французскай арміі, палкоўнік. Памёр 3.4.1988 г.

АРЭФ'ЕЎ Пётр Аляксеевіч. Нарадзіўся 25.6.1913 г. ў г. Старая Руса (цяпер г. Ноўгарад). У Чырвонай Арміі з 1942 г. Са студзеня 1943 г. на фронце. Камандзір эскадрыллі штурмавікоў капітан П.А.Арэф'еў вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў баях на Віцебска-Лепельскім напрамку. Па 3—4 разы ў дзень вадзіў групу (4—8 самалётаў) на штурмоўку варожых аб'ектаў у раёне Віцебска, Обалі, Бешанковічаў, Лепеля. На станцыі Обаль пад моцным зенітным агнём праціўніка група ўзарвала 2 варожыя эшалоны з боепрыпасамі і ваеннымі грузамі, на дарозе Віцебск — Бешанковічы знішчыла 40 аўтамашын, 20 павозак, 3 гарматы і каля 50 гітлераўцаў. За год баёў яго эскадрылля здзейсніла 572 баявыя вылеты, знішчыла і пашкодзіла 22 танкі, 8 самалётаў, больш за 40 аўтамашын, каля 300 павозак, 4 эшалоны, узарвала 6 складоў, 2 чыгуначныя масты, знішчыла больш за 100 гітлераўцаў. Маёр П.А.Арэф'еў здзейсніў 109 баявых вылетаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Пасля вайны жыў у Ташкенце, працаваў у грамадзянскай авіяцыі. Памёр у 1950 г.

АФАНАСЬЕЎ Барыс Міхайлавіч. Нарадзіўся 5.6.1920 г. ў г. Бранск. Скончыў Чугуеўскае лётнае вучылішча (1941). У Чырвонай Арміі з 1940 г. З красавіка 1943 г. на Калінінскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Б.М.Афанасьеў здзейсніў 367 баявых вылетаў, удзельнічаў у 23 паветраных баях, збіў 8 варожых самалётаў. 9.10.1943 г. па дарозе Бычыха — Віцебск вывіў вялікую колькасць тэхнікі і жывой сілы, па якой штурмавікі нанеслі ўдар. 10.10.1943 г. ў Віцебску сфатаграфаваў аэрадром з 19 самалётамі. 21.12.1943 г. разведаў пераправы на Заходняй Дзвіне ад Віцебска да Дзвінска, выявіў абарончыя рубяжы ўздоўж ракі, вялікую колькасць баявой тэхнікі праціўніка. 5.5.1944 г. ў Полацку сфатаграфаваў аэрадром з 40 самалётамі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.6.1945 г. Да 1960 г. у Савецкай Арміі, палкоўнік. Памёр 14.9.1976 г. Пахаваны ў г. Рыга.

БАБКІН Міхаіл Мікалаевіч. Нарадзіўся 24.1.1922 г. ў в. Старая Тойда Анінскага раёна Варонежскай вобласці. Скончыў Чкалаўскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1943). У Чырвонай Арміі з 1941 г. З ліпеня 1943 г. на 4-м Украінскім, 2-м Беларускім франтах. Намеснік камандзіра, штурман эскадрыллі штурмавога авіяпалка старшы лейтэнант М.М.Бабкін у Беларускай аперацыі 23 — 28.6.1944 г. здзейсніў 22 баявыя вылеты, знішчыў 5 гармат, 35 аўтамашын з ваенным грузам, 50 павозак, каля 120 гітлераўцаў. Вызваляў Віцебск, Гродна. За перыяд знаходжання на фронце з 22.6.1943 г. па сакавік 1945 г. здзейсніў 145 баявых вылетаў, нанёс вялікі ўрон праціўніку ў баявой тэхніцы і жывой сіле. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 18.8.1945 г. Пасля вайны ў Савецкай Арміі, маёр. Загінуў 8.12.1959 г. ў авіяцыйнай катастрофе.

БАГАМАЗАЎ Рыгор Іванавіч. Нарадзіўся 28.1.1918 г. ў в. Канавалава Валаконаўскага раёна Белгарадскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Скончыў Барысаглебскую ваенную авіяцыйную школу (1938), Ваенна-паветраную акадэмію (1956). У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце.

Р.І.Багамазаў.

С.Н.Багарад.

Р.Б.Багданаў.

М.Б.Барысаў.

Намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Р.І.Багамазаў да ліпеня 1943 г. зрабіў 350 баявых вылетаў, у 50 паветраных баях асабіста збіў 12 варожых самалётаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 2.9.1943 г. Пасля вайны працягваў службу ў Ваенна-паветраных сілах, звольніўся ў запас у 1969 г. ў званні палкоўніка. Жыў у Віцебску, працаваў на абутковай фабрыцы.

БАГАРАД Самуіл Нахманавіч. Нарадзіўся 17.8.1907 г. ў Віцебску. Скончыў Ленінградскі марскі тэхнікум (1935), служыў на флоце. У Вялікую Айчынную вайну камандзір падводнай лодкі. Вызначыўся ў баях на Балтыцы зімой 1944/45 гг., калі падводная лодка пад камандаваннем капітана 1-га ранга С.Н.Багарада за 2 паходы патапіла 7 варожых транспартаў агульным водазмяшчэннем каля 40 тыс. т. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 8.6.1945 г. Да 1961 г. служыў у Ваенна-марскім флоце, пасля выхаду ў адстаўку жыў у Рызе.

БАГДАНАЎ Рыгор Багданавіч. Нарадзіўся 4.2.1910 г. ў в. Марцюшы Гарадоцкага раёна. Жыў і працаваў у Віцебску. У Чырвонай Арміі з 1932 г. Са снежня 1941 г. на Заходнім, Цэнтральным, Варонежскім франтах. Камандзір батальёна старшы лейтэнант Р.Б.Багданаў вызначыўся ў верасні 1943 г. ў баях на поўнач ад Кіева: батальён з ходу фарсіраваў Дзясну, выйшаў да Дняпра і фарсіраваў раку, захапіў плацдарм, адбіў 10 контратак, заняў 2 населеныя пункты і ўтрымліваў іх да падыходу падмацавання. Памёр ад ран 1.10.1943. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 17.10.1943 г. пасмяротна.

БАРЫСАЎ Мікалай Барысавіч. Нарадзіўся 19.12.1918 г. ў в. Чорная Гразь Дзямідаўскага раёна Смаленскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. Скончыў Сталінградскае ваенна-палітычнае вучылішча (1941). У Вялікую Айчынную вайну са снежня 1941 г. на фронце. Вызначыўся ў баях пры акружэнні віцебскай групоўкі праціўніка. 23.6.1944 г. байцы стралковага батальёна пад камандаваннем маёра М.Б.Барысава пераадолелі тры лініі варожых умацаванняў і ўварваліся ў г.п. Шуміліна. 24.6.1944 г. батальён пад моцным агнём праціўніка фарсіраваў Заходнюю Дзвіну і захапіў плацдарм, што дало магчымасць савецкім войскам развіць наступленне і акружыць ворага. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. Да 1946 г. ў Савецкай Арміі. У 1949 г. скончыў партшколу пры ЦК КП(б)Б, у 1954 г. — Мінскі педагагічны інстытут. Быў на адміністрацыйнай і гаспадарчай рабоце. Памёр 10.7.1978 г.

БАТАЛАЎ Рыгор Міхайлавіч. Нарадзіўся 28.1.1915 г. ў Віцебску. Генерал-лейтэнант (1965). Скончыў Мінскае пяхотнае вучылішча (1937), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1952) і акадэмію Генеральнага штаба (1959). У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Данскім, Варонежскім, 2-м Украінскім франтах; начальнік аператыўнага аддзялення штаба дывізіі, потым камандзір стралковага палка, намеснік камандзіра дывізіі. Удзельнік баёў на Доне, пад Сталінградам, Белгарадам, удзельнік вызвалення Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.10.1943 г. за паспяховае фарсіраванне яго палком Дняпра на поўдзень ад Краменчуга, захоп і пашырэнне плацдарма на правым беразе ракі. Пасля вайны да 1971 г.

Р.М.Баталаў.

Г.П.Бахвалаў.

Ф.С.Берастаў.

І.С.Бескін.

служыў у Савецкай Арміі. Потым жыў у Кіеве.

БАХВАЛАЎ Георгій Паўлавіч. Нарадзіўся 10.1.1914 г. ў г. Санкт-Пецярбург. Працаваў геолагаразведчыкам. Скончыў Арэнбургскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1938). У Чырвонай Арміі з 1937 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім франтах. Да верасня 1943 г. здзейсніў 169 баявых вылетаў, у тым ліку 85 на разведку тылоў і пярэдняга краю абароны праціўніка, правёў 9 паветраных баёў, збіў самалёт праціўніка. Штурман эскадрыллі капітан Г.П.Бахвалаў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Беларусі. У красавіку 1943 г. праводзіў разведку чыгуначных станцый Гарадок, Віцебск і Полацк, сфатаграфаваў варожыя аэрадромы ў Полацку і Віцебску. 6.5.1943 г. ў час бамбардзіроўкі чыгуначнай станцыі Дрыса знішчыў зенітную гармату праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.2.1944 г. Да 1960 г. ў Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Памёр 29.9.1974 г.

БЕРАСТАЎ Фёдар Сяргеевіч. Нарадзіўся 10.1.1922 г. ў г.п. Глубокае Усходне-Казахстанскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1941 г. На фронце з верасня 1941 г. Вызначыўся ў баях пад Віцебскам. 22.6.1944 г. стралковае аддзяленне пад камандаваннем гвардыі сяржанта Ф.С.Берастава з боем пранікла ўглыб абароны праціўніка. Камандзір аддзялення закідаў гранатамі варожы дзот, знішчыў 3 кулямёты і 8 гітлераўцаў. 24.6.1944 г. ў ліку першых пераправіўся цераз р. Заходняя Дзвіна і ў рукапашным баі знішчыў каля 10 салдат праціўніка. Загінуў 27.10.1944 г. ў баі пры вызваленні г. Прыекуле (Латвія), дзе і пахаваны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

БЕСКІН Ізраіль Саламонавіч. Нарадзіўся 25.11.1895 г. ў Віцебску. У арміі з 1915 г. Генерал-лейтэнант артылерыі (1944). Скончыў Маскоўскія курсы цяжкай артылерыі РСЧА (1920), Вышэйшую артылерыйскую школу (1925), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1936). У грамадзянскую вайну ўдзельнік ліквідацыі мяцяжоў у Віцебскай і Смаленскай губернях, вызвалення ад японскіх акупантаў Хабараўска, Спаска, Валачаеўскі, Уладзівастока. Удзельнік баёў на Кітайска-Усходняй чыгунцы (1929), савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну прымаў удзел у вызваленні Гомеля, Рэчыцы, Калінкавіч, Бабруйска. Вызначыўся, будучы камандуючым артылерыі 70-й арміі 1-га Беларускага фронта, у час прарыву абароны ворага на р. Одэр каля г. Шчэцін (Польшча). Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.5.1945 г. Пасля вайны да 1953 г. служыў у Савецкай Арміі. Памёр 19.1.1964 г.

БЛАХІН Фёдар Цімафеевіч. Нарадзіўся 11.11.1903 г. ў в. Раманаўка Пільнінскага раёна Ніжагародскай вобласці. З сакавіка 1943 г. на фронце. Камандзір сапёрнага ўзвода старшы сяржант Ф.Ц.Блахін вызначыўся 26.6.1944 г. пры вызваленні Віцебска. У час бою на чале групы байцоў уварваўся на замініраваны мост цераз Заходнюю Дзвіну, за 2 хвіліны да выбуху перарэзаў бікфордаў шнур і абясшкодзіў міну. Дзякуючы яму мост быў уратаваны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. У гонар Ф.Ц.Блахіна на масту ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Ганаровы грамадзянін Віцебска. Жыў у г. Горкі. Памёр 30.7.1974 г.

МОСТ БЛОХИНА

...Среди пожарищ и руин
Текла Двина-река...
Июньским вечером Блохин
Был вызван в штаб полка.
А был приказ тяжел и прост,
И говорилось в нем:
— Не дать взорвать фашистам мост
И овладеть мостом!
Прохладой дышит ночь в лицо,
Ведет к мосту сержант бойцов.
Вот под ногой уже асфальт —
И вдруг зловещий окрик: «Хальт!»
Из тьмы ночной врагу летят
В ответ одиннадцать гранат,
И от зарядов провода
Глотает быстрая вода...
К мосту упорно рвется враг,
Но пятится назад:
Уже отбили пять атак
Одиннадцать солдат.
И вновь — атаки без конца,
Огонь со всех сторон...
Но тут прорвался к храбрецам
На помощь батальон.
Нет, после боя неспроста
Суровый генерал
Героев схватки у моста
Сердечно целовал.
Волною радостно река
Плескалась в берега,
А через мост пошли войска
На Запад, бить врага!
... От солнца блики на реке,
А в небе синева...
На строгой бронзовой доске
Суровые слова.

Ф.Ц.Блахін.

І.Р.Бумагін.

Нам скупо говорят они
Как мост и мир, и нас
В те годы грозные, в те дни
Солдат от смерти спас!

Лев Титов

БУМАГІН Іосіф Раманавіч. Нарадзіўся 17.10.1907 г. ў Віцебску. Працаваў у г. Біробіджан. У Чырвонай Арміі ў 1929—33 гг. і з мая 1941 г. На фронце з красавіка 1945 г. Камандзір кулямётнага ўзвода лейтэнант І.Р.Бумагін 24.4.1945 г. ў час штурму г. Брэслаў (Вроцлаў, Польшча) пад шквальным агнём адзін агнявы пункт ворага закідаў гранатамі, другі закрыў сваім целам. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 27.6.1945 г. У Віцебску яго імем названа вуліца.

ВАСІЛЕЎСКІ Ягор Васілевіч. Нарадзіўся 1.1.1921 г. ў в. Гарбачова Віцебскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1939), Адэс-

Мемарыяльная дошка Герою Савецкага Саюза Ф.Ц.Блахіну і мост яго імя.

Я.В.Васілеўскі.

А.К.Гаравец.

кую ваенную авіяшколу (1940), Ваенна-паветраную акадэмію (1955). У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з мая 1943 г. на Сцяпным, Варонежскім, 2-м Украінскім франтах, камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. Зрабіў 296 баявых вылетаў, правёў 64 паветраныя баі, збіў асабіста 21 варожы самалёт і 2 ў групе. Удзельнік баёў за Харкаў, Палтаву, Крамянчуг, вызвалення Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, вайну скончыў у Аўстрыі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.5.1946 г. Пасля вайны да 1958 г. служыў у Савецкай Арміі, потым працаваў камандзірам атрада, начальнікам штаба Віцебскага аэраклуба, лётчыкам-інспектарам Віцебскага абласнога камітэта ДТСААФ. Памёр 1.5.1991 г.

ГАРАВЕЦ Аляксандр Канстанцінавіч. Нарадзіўся 12.3.1915 г. ў в. Гараўцы (цяпер не існуе) каля в. Машканы Сенненскага раёна. Вучыўся ў Полацкім лясным тэхнікуме (1930—31), потым працаваў у Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1934), Ульянаўскую лётную школу (1935). Працаваў інструктарам аэраклуба ў г. Шахты Растоўскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1942 г. на Паўночна-Каўказскім, Варонежскім франтах. Зрабіў 74 баявыя вылеты, знішчыў 11 самалётаў ворага, 40 аўтамашын,

Мемарыяльная дошка А.К.Гараўцу на вуліцы, якая носіць яго імя.

Помнік Героям Савецкага Саюза У.І.Свідзінскаму і Р.С.Гарфункіну на тэрыторыі прыборабудаўнічага завода (вуліца Гагарына, 4).

24 павозкі з боепрыпасамі. Намеснік камандзіра эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Гаравец 6.7.1943 г. ў час Курскай бітвы ўступіў у бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў. Адзіны ў свеце лётчык, які ў адным баі збіў столькі самалётаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Зорынскія Двары Іўнянскага раёна Белгародскай вобласці. За гэты бой 28.9.1943 яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На 597-м км аўтамагістралі Масква — Сімферопаль, у Полацку, у вёсках Ског і Машканы Сенненскага раёна яму пастаўлены помнікі. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Віцебску, Полацку, Сянно, Багушэўску, саўгас у Сенненскім раёне, сярэдняя школа ў Машканах, Віцебскі аэраклуб.

З артыкула У.Хацянкова, надрукаванага ў газеце «Віцебскі рабочы» ад 25 снежня 1992 г.

Узляцеўшаму ў бессмяротнасць

Лейтэнант Аляксандр Канстанцінавіч Гаравец... імя і подзвіг гэтага лётчыка-знішчальніка, выхадца з сялянскай сям'і вёскі Машканы Сенненскага раёна, сталі легендарнымі. Яшчэ ніводнаму лётчыку ў свеце не ўдалося зрабіць тое, што яму...

6 ліпеня 1943 г. на другі дзень Курскай бітвы, група самалётаў 88-га гвардзейскага знішчальнага палка вярталася на свой аэрадром з раёна Уладзіміраўка — Альхаватка, дзе прыкрывала нашы войскі. Замыкаючым быў Гаравец. У раёне хутара Зорынскія Двары ён заўважыў дваццаць варожых бамбардзіроўшчыкаў. Не змог паведаміць аб гэтым сваім баявым сябрам, бо была сапсавана рацыя. Лётчык развярнуў машыну і адзін уступіў у бой з фашысцкімі сцярвятнікамі.

Першай жа чаргой ён збіў флагмана. Потым рухнулі на зямлю «юнкерсы». Дзевятага ён збіў у той момант, калі той знізіўся да брыючага палёту.

Але і сам лётчык трапіў пад агонь чатырох нямецкіх знішчальнікаў. Яго самалёт быў ужо па сутнасці бяззбройным — скончыліся боепрыпасы. Ён быў збіты бліз хутара Зорынскія Двары. А.К.Гараўцу пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. На 597-м кіламетры аўтамагістралі Масква — Сімферопаль, на мяжы Курскай і Белгародскай абласцей, недалёка ад месца гібелі героя яму ўстаноўлены помнік.

Подзвіг бясстрашнага авіятара ўвекавечаны на месцы, адкуль ён вылятаў на баявыя заданні. На полі калгаса «Серп і молат» каля сяла Доўгія Буды Бялоўскага раёна Курскай вобласці, дзе базіраваўся аэрадром 88-га гвардзейскага знішчальнага авіяпалка, устаноўлены памятны знак — паршнявы знішчальнік, які ўзняўся ўвысь, з нумарам 73 на фюзеляжы, што быў на самалёце А.Гараўца. На мармуровай пліце, устаноўленай каля падножжа знака, залатам гараць словы: «Тут знаходзіўся аэрадром, з якога 6 ліпеня 1943 г. вылецеў у свой апошні бой лётчык Гаравец Аляксандр Канстанцінавіч, які збіў у гэтым баі 9 варожых самалётаў і быў удастоены за гэты подзвіг звання Героя Савецкага Саюза».

На мітынг, прысвечаны адкрыццю памятнага знака, прыехалі шмат жыхароў Бялоўскага і суседніх раёнаў, а таксама госці з Сумскай вобласці, воіны Курскага гарнізона. Сярод прысутных — Марыя Аляксандраўна Калінічэнка і Марыя Мацвееўна Галаева. У ваенныя гады яны былі брыгадзірамі ў калга-

Помнік Герою Савецкага Саюза А.К.Гараўцу ў Віцебску.

Р.С.Гарфункін.

П.М.Герасіменка.

П.А.Глазуноў.

А.Е.Голубаў.

се, сябравалі з авіятарамі. Добра помняць яны Аляксандра Гараўца, заўсёды бадзёрага, вясёлага, які спяваў беларускія песні.

...Помняць на курскай зямлі Аляксандра Гараўца, яго непаўторны подзвіг.

ГАРФУНКІН Рыгор Саламонавіч. Нарадзіўся 6.8.1920 г. ў в. Янавічы (цяпер пгт) Віцебскай вобласці. Працаваў токарам на Віцебскім ігольным заводзе, з 1940 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну з верасня 1941 г. на фронце. Разведчык разведвальнага ўзвода 183-й танкавай брыгады 10-га танкавага корпуса 40-й арміі Варонежскага фронта радавы Р.С.Гарфункін 22.9.1943 г. пры вяртанні разведгрупы з тылу ворага загінуў, прыкрываючы адыход таварышаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 10.1.1944 г. пасмяротна.

ГЕРАСІМЕНКА Пракоп Міхайлавіч. Нарадзіўся 5.4.1918 г. ў с. Красная Папоўка Крамянскога раёна Луганскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім франтах. Вызначыўся ў баі пад Віцебскам. 22.6.1944 г. рота пад камандаваннем капітана П.М.Герасіменка прарвала ўмацаваную абарону праціўніка, захапіла вышыню каля в. Мядзведкі на паўднёвы захад ад Віцебска, адбіла некалькі контратак і ўтрымлівала вышыню да падыходу падмацавання. П.М.Герасіменка загінуў у гэтым баі, Пахаваны ў в. Барысаўка Шумілінскага раёна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. пасмяротна.

ГЛАЗУНОЎ Пётр Аляксеевіч. Нарадзіўся 20.2.1920 г. ў в. Петрачкі Віцебскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1938), Адэскую ваенную авіяцыйную школу (1940), Вышэйшыя лётна-тактычныя курсы (1947), Цэнтральныя лётна-тактычныя курсы ўдасканалення афіцэрскага саставу (1955). У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну з сакавіка 1943 г. на Паўднёва-Заходнім, 3-м Украінскім, 3-м і 2-м Прыбалтыйскіх, Ленінградскім франтах, зрабіў 138 баявых вылетаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Скончыў вайну намеснікам камандзіра штурмавога авіяпалка, да 1975 г. служыў у Савецкай Арміі. Памёр 8.3.1992 г.

ГОЛУБАЎ Анатоль Емяльянавіч. Нарадзіўся 29.8.1908 г. ў в. Нова-Маркаўка Варонежскай вобласці. Скончыў Адэскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1933), Ваенную акадэмію Генштаба (1949). У Чырвонай Арміі з 1930 г. У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Камандзір знішчальнага авіяпалка палкоўнік А.Е.Голубаў зрабіў 355 баявых вылетаў. Удзельнік вызвалення Віцебска, Оршы, Мінска. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.6.1945 г. Да 1955 г. ў Савецкай Арміі, генерал-маёр авіяцыі (1954). Памёр 29.1.1978 г.

ГРЫШЧАНКА Пётр Лук'янавіч. Нарадзіўся 1.8.1921 г. ў в. Кукавячына Віцебскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1939), Армавірскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1942), Вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы (1950), Ваенна-паветраную акадэмію (1955). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з сакавіка 1943 г., удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Берлінскай аперацыі. Камандзір звяна знішчальнага авіяпалка лейтэнант П.Л.Грышчанка правёў 78 паветраных

П.Л.Грышчанка.

А.І.Гуляеў.

М.С.Давыдаў.

В.А.Дзямідаў.

баёў, збіў 27 варожых самалётаў і аэрастат. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 1.7.1944 г. Пасля вайны да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі, потым жыў у Падмаскоўі. Памёр 21.2.1973 г.

ГУЛЯЕЎ Анатолій Іванавіч. Нарадзіўся 19.11.1920 г. ў в. Людзечня Венеўскага раёна Тульскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на фронце. Удзельнік баёў за вызваленне Беларусі, Літвы, Латвіі. Памочнік камандзіра стралковага ўзвода гвардыі старшы сяржант А.І.Гуляеў вызначыўся ў чэрвені 1944 г. каля в. Сіроціна Віцебскага раёна. У баі прыняў на сябе камандаванне ўзводам, які ў наступленні перарэзаў чыгуначную лінію Віцебск — Полацк: у ліку першых фарсіраваў Заходнюю Дзвіну. На плацдарме быў цяжка паранены, але не пакінуў поле боя. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. Пасля вайны жыў у Маскве. Памёр 15.2.1977 г.

ДАВЫДАЎ Мікалай Сяргеевіч. Нарадзіўся 2.11.1921 г. ў в. Вялікае Андосава Пільнінскага раёна Ніжагародскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З сакавіка 1943 г. на Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка гвардыі старшы лейтэнант М.С.Давыдаў вызначыўся пры вызваленні Віцебска, Оршы, Мінска і ліквідацыі мінскага «катла». Здзейсніў 187 баявых вылетаў, знішчыў 8 танкаў, 6 артбатарэй, 1 паравоз, 17 вагонаў, 21 аўтамашыну, 200 гітлераўцаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19.4.1945 г. Пасля вайны ў Савецкай Арміі, капітан. Загінуў у авіяцыйнай катастрофе 16.8.1949 г. Пахаваны ў г. Лунінец Брэсцкай вобласці.

ДЗЯМІДАЎ Васіль Аляксандравіч. Нарадзіўся 12.4.1921 г. ў Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1940), Омскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1942), Ваенна-паветраную акадэмію (1955). У Чырвонай Арміі з 1940 г., у Вялікую Айчынную вайну з сакавіка 1943 г. на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Камандзір звяна асобнага разведвальнага авіяпалка старшы лейтэнант В.А.Дзямідаў зрабіў 226 баявых вылетаў, удзельнічаў у 16 паветраных баях з варожымі знішчальнікамі. Вызначыўся 2.11.1944 г. ва Усходняй Прусіі, калі паранены, з падбітага самалёта сфатаграфаваў паласу абароны праціўніка і здолеў пасадзіць самалёт на сваёй тэрыторыі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 19.4.1945 г. Пасля вайны да 1961 г. служыў у Савецкай Арміі, потым вярнуўся ў Віцебск, з 1967 г. працаваў у Віцебскім аэрапорце. Памёр 12.7.1989.

ДРУЖЫНІН Міхаіл Іванавіч. Нарадзіўся 15.9.1920 г. у в. Дзям'янцава Цвярской вобласці. Скончыў Маскоўскае ваенна-палітычнае вучылішча (1944), Вышэйшы ваенна-педагагічны інстытут (1955), Ваенную акадэмію Генштаба (1962). У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1944 г. на 3-м Беларускім фронце. Старшы лейтэнант М.І.Дружынін вызначыўся ў 1944 г. пры вызваленні Віцебскай вобласці. 23.6.1944 г. ўзначаліў атаку батальёна, з 4 байцамі захапіў пераправу цераз р. Лучоса і ўтрымліваў яе да падыходу асноўных сіл. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. Пасля вайны працягваў службу ў

М.І.Дружынін.

А.П.Жасткоў.

С.І.Жукаў.

В.Г.Зайцаў.

арміі, генерал-палкоўнік (1978). Ганаровы грамадзянін Віцебска.

ЖАСТКОЎ Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся 26.7.1922 г. ў в. Слаўцава Мленкаўскага раёна Уладзімірскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Камандаваў кулямётным узводам 279-га гвардзейскага стралковага палка 91-й гвардзейскай стралковай Духаўшчынскай дывізіі. Гвардыі лейтэнант А.П.Жасткоў вызначыўся ў час Віцебска-Аршанскай аперацыі. 23.6.1944 г. ў час прарыву абароны ворага ўзвод у раёне в. Карпавічы падавіў 6 агнявых кропак і знішчыў каля 100 гітлераўцаў. Праследуючы праціўніка, фарсіраваў р. Лучоса і ўмацаваўся на яе левым беразе, чым забяспечыў пераправу палка. 24 чэрвеня каля в. Асінаўка ўзвод знішчыў 5 кулямётных кропак і 130 гітлераўцаў. 25 чэрвеня ў баі каля в. Камары на працягу дня адбіў 4 контратакі ворага, а потым перайшоў у атаку. У гэтым баі А.П.Жасткоў загінуў. Пахаваны ў в. Ваяводкі Віцебскага раёна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. пасмяротна. Яго імем названа вуліца ў Віцебску.

ЖУКАЎ Сцяпан Іванавіч. Нарадзіўся ў в. Пушча (цяпер у межах в. Пірагі) Расонскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваенную школу пілотаў (1942), Вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы (1952). У Чырвонай Арміі з 1941 г. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1943 г. на Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Беларусі, баёў у Германіі. Намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка старшы лейтэнант С.І.Жукаў зрабіў 170 баявых вылетаў, у тым ліку 80 у час вызвалення Беларусі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.5.1946 г. Пасля вайны да 1957 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні маёра. З 1967 г. жыў у Полацку. Памёр 24.7.1997 г.

ЗАЙЦАЎ Васіль Георгіевіч. Нарадзіўся 23.3.1916 г. ў г. Стаўрапаль. Скончыў Арцёмаўскі індустрыяльны тэхнікум (1936), Чкалаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча (1940). Са жніўня 1943 г. ў штурмавой авіяцыі на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Старшы лейтэнант В.Г.Зайцаў вызначыўся пры вызваленні Беларусі. 21.2.1943 г. ў раёне Віцебска знішчыў некалькі складоў з боепрыпасамі, на Заходняй Дзвіне — пераправу і каля 20 аўтамашын праціўніка. Усяго за гады вайны здзейсніў 350 баявых вылетаў, знішчыў 3 танкі, 60 гармат, 7 бліндажоў, 200 аўтамашын, 20 складоў з боепрыпасамі і гаручым, 60 вагонаў, шмат жывой сілы праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Пасля вайны да 1949 г. ў Савецкай Арміі, маёр. Памёр 30.9.1956 г.

ЗЯНЬКОВА Ефрасіння Савельеўна. Нарадзілася 22.12.1923 г. ў в. Ушачы Шумілінскага раёна. Скончыла сярэднюю школу і школу ФЗН, працавала на швейнай фабрыцы. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельніца патрыятычнага падполля, сакратар Обальскай падпольнай камсамольскай арганізацыі «Юныя мсціўцы», з верасня 1943 г. ваявала ў партызанскай брыгадзе імя В.І.Леніна на тэрыторыі Віцебскай вобласці. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 1.7.1958 г. Пасля вайны да 1967 г. працавала ў Віцебскім гарваенкамаце. Ганаровы грамадзянін Віцебска (1976). Памерла 19.4.1984 г.

Е.С.Зянькова.

І.І.Камінскі.

П.Я.Кандраценка.

П.В.Кандрацьеў.

КАМІНСКІ Іван Іларыёнавіч. Нарадзіўся 8.11.1919 г. ў в. Масоры Сенненскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1939), ваенную школу лётчыкаў у г. Энгельс (1941), Рэспубліканскую партшколу пры ЦК КП(б)Б (1948), ВПШ пры ЦК КПСС (1963). У Чырвонай Арміі з 1939 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, вызвалення Віцебска, Оршы, Магілёва, Мінска, Маладзечна, Літвы, Польшчы, баёў ва Усходняй Прусіі. Намеснік камандзіра эскадрыллі разведвальнага авіяпалка старшы лейтэнант І.І.Камінскі зрабіў 239 баявых вылетаў, сфатаграфаваў каля 27 тыс. км^2 ліній варожай абароны і ваенных аб'ектаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 29.6.1945 г. Звольніўся ў запас у званні капітана, з 1948 г. на партыйнай і савецкай рабоце ў Мінску. Памёр 6.10.1974 г.

КАНДРАЦЕНКА Пётр Ягоравіч. Нарадзіўся 1.1.1923 г. ў в. Ажогіна Дзямідаўскага раёна Смаленскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1940 г. З 1941 г. на Калінінскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Сапёр старшы сяржант П.Я.Кандраценка вызначыўся 23—27.6.1944 г. ў час прарыву варожай абароны і наступлення на паўночны захад ад Віцебска. Напярэдадні наступлення пад агнём праціўніка зрабіў 4 праходы ў мінных палях, абяскодзіў 387 мін. У час атакі першым уварваўся ў траншэю праціўніка і падавіў яго агнявую кропку. На дарозе Віцебск — Лепель знішчыў групу гітлераўцаў, 24 узняў у палон, размініраваў 22 трафейныя машыны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. Да 1973 г. працаваў на заводзе ў г. Салікамск Пермскай вобласці. Жыве ў Віцебску. Ганаровы грамадзянін Віцебска.

КАНДРАЦЬЕЎ Пётр Васілевіч. Нарадзіўся 20.6.1909 г. ў Віцебску. Скончыў Ленінградскую ваенна-тэарэтычную школу лётчыкаў (1933), Ейскую ваенна-марскую школу лётчыкаў. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг., у час якой памочнік камандзіра авіяпалка капітан П.В.Кандрацьеў зрабіў 66 баявых вылетаў, патапіў варожае судна з боепрыпасамі, спаліў на аэрадроме 7 самалётаў, знішчыў 2 паравозы , 7 аўтамашын. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 21.4.1940 г. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у абароне Ленінграда, знішчальны авіяполк пад яго камандаваннем за 5 месяцаў правёў 389 паветраных баёў, знішчыў 105 варожых самалётаў, 55 танкаў. Палкоўнік Кандрацьеў загінуў 1.6.1943 г. ў баі над Фінскім залівам. Яго імем названа вуліца ў Віцебску, пасёлак у Выбаргскім раёне Ленінградскай вобласці.

КАРПАЎ Уладзімір Васілевіч. Нарадзіўся 22.7.1922 г. ў г. Арэнбург. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1947), Літаратурны інстытут імя Горкага (1954). У Чырвонай Арміі з 1939. У Вялікую Айчынную вайну з лістапада 1942 г. на фронце. Камандзір узвода пешай разведкі лейтэнант У.В.Карпаў вызначыўся ў жніўні — верасні 1943 г. ў перыяд баёў у Духаўшчынскім раёне Смаленскай вобласці. Больш за 30 разоў з групай разведчыкаў пранікаў у варожы тыл, удзельнічаў у захопе 35 палонных. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.6.1944 г. Да 1965 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Друкуецца з 1945 г. Аўтар твораў пераважна вайскова-ваеннай тэматыкі: кнігі апавяданняў і аповесцей «Дваццаць чатыры гадзіны з жыцця разведчыка» (1960), «Камандзіры сівеюць рана» (1963), «Жылі-былі разведчы-

У.В.Карпаў.

кі» (1970), «Не мячом адзіным» (1979), раманы «Вечны бой» (1967), «Маршальскі жэзл» (1970, за абодва Дзяржаўная прэмія Узбекістана 1970), «Узяць жывым!» (1975; часткова апублікавана як аповесць «Такая работа», 1974), «Палкаводзец» (1982—84, Дзяржаўная прэмія СССР 1986), «Маршал Жукаў. Яго паплечнікі і праціўнікі ў гады вайны і міру» (кн. 1, 1992), кніга публіцыстыкі «Эстафета подзвігу» (1980). Ганаровы грамадзянін Ташкента.

З успамінаў У.В.Карпава

В Витебск с особым заданием

В книге Аркадия Шарипова «Черняховский» есть эпизод, когда командующий 3-м Белорусским фронтом Черняховский посылает разведчика в Витебск с особым заданием. Этим разведчиком был я.

«...Готовя войска к решительной операции по освобождению Белоруссии, Черняховский уделял особое внимание изучению противостоящей группировки противника. По его заданию начальник разведки фронта генерал-майор Алешин в полосе 39-й армии подготовил важную разведывательную вылазку в тыл противника. Непосредственным исполнителем ее он назначил старшего лейтенанта Карпова. Проинструктировав разведчика, Алешин предупредил его:

— Командующий фронтом придает большое значение разведывательным данным, которые вам предстоит добыть. Он хочет поговорить с вами.

...Черняховский их принял на командно-наблюдательном пункте. Крепко пожав руку Карпову и пригласив его сесть, он тепло сказал:

— Мне рекомендовали вас как одного из лучших войсковых разведчиков, с большим опытом. Задание, которое вам поручается, сложное, и от его выполнения будет зависеть многое.

— Товарищ командующий, я сделаю все, чтобы выполнить ваш приказ!

— Я верю вам, потому и поручаю столь ответственное задание. В Витебске вас ждут. Там наши товарищи подготовили ценные фотопленки со снимками вражеской обороны. Но передать нам не могут. (Подпольщики сумели сфотографировать чертежи и карты с «Медвежим валом», но по радио, естественно, план передать невозможно. — В.К.). После неудачного покушения на коменданта города генерала Гельмута немцы следят за каждым советским гражданином. От переднего края обороны до города — километров восемнадцать. По глубине эта тактическая зона, она насыщена немецкими войсками. Прыжок с парашютом исключается. Группой пробраться тоже трудно, — пояснил Черняховский, — поэтому пойдете один. Понимаете?

— Ясно, товарищ командующий...

Старший лейтенант Карпов ночью благополучно прошел через немецкие позиции и добрался до Витебска. Ему удалось разыскать нужных людей и получить от них сведения, за которыми его послали. В городе Карпова заподозрили патрульные. Они пытались его задержать, но ему удалось уйти. Ночью Карпов был уже вблизи от передовых позиций немцев. Отважный разведчик прошел их все, лишь в последней траншее наткнулся на немецкого часового. Он успел стукнуть часового рукояткой пистолета по голове раньше, чем тот поднял тревогу. Часовой упал. Когда Карпов уже выбежал из траншеи, гитлеровец, придя в себя, закричал. По Карпову открыли огонь вражеские пулеметы. Он упал наземь, пополз. Наша артиллерия обрушилась на врага. На пути оказалось проволочное заграждение. Как преодолеть его? Карпов стал пробираться сквозь заграждение. Вражеская пуля ранила его. Теряя сознание, он все же собрал силы и выбрался из колючей проволоки, пополз дальше... Очнулся Карпов уже в блиндаже у своих.

Отважный разведчик доставил нужные сведения.

Позже Карпов узнал, что по указанию командующего фронтом в полосе обороны корпуса его ожидали разведгруппы и вся артил-

лерия на этом участке была готова прикрыть его переход массированным огнем».

Как мне стало известно, разведданные о «Медвежьем вале» в порядке информации были переданы на соседние с 3-м Белорусским фронтом — 1-й Прибалтийский и 2-й Белорусский. А вот что об этом пишет маршал И.Х.Баграмян:

«...Я, будучи командующим 1-м Прибалтийским фронтом, встречал в разведывательных сводках фамилию старшего лейтенанта Карпова. И вот он, тот же самый лихой, смелый разведчик, теперь — известный писатель... Карпов написал очень хороший роман «Взять живым!», в котором он без прикрас показал суровую, опасную и труднейшую службу войсковой разведки... Достоверность, знание всех тончайших деталей боевой окопной жизни — одно из достоинств романа «Взять живым!» И основано это на том, что почти во всех описанных заданиях принимал участие сам автор. Владимир Карпов сражался не только на фронте, которым я командовал, он вел активные боевые действия и на соседнем, 3-м Белорусском, и, как мне известно, пользовался уважением командующего фронтом Ивана Даниловича Черняховского».

После войны я не раз бывал в этом городе, имеющем особое значение в моей жизни. При первом же посещении Витебска пытался найти «штрассе» и дом, где я встречался с подпольщиками. Но город за послевоенные годы так преобразился, что не только дом, а даже улицу не мог узнать — начиная с окраины, стоят многоэтажные новые дома, нет прежних узких улочек, все изменилось.

Но есть в городе одно место, которое я посещаю непременно при каждом приезде. Это бывшая гестаповская тюрьма. Здесь теперь музей. В подвале сохранились низкие длинные камеры, на стендах фотографии и описания подвигов замученных здесь разведчиков и партизан.

Глядя на них, я думаю о том, что и моя жизнь могла оборваться в этом жутком подземелье... Если бы не ушел от патруля. Если бы обнаружил часовой перед траншеей... Если бы затащили раненого под проволоку...

Вообще, много в жизни разведчика таких роковых «если».

Г.М.Каўтуноў.

В.А.Князеў.

КАЎТУНОЎ Георгій Мікітавіч. Нарадзіўся 26.5.1918 г. ў с. Арэхаўка Аляксееўскага раёна Самарскай вобласці. Скончыў Тбіліскае артылерыйскае вучылішча (1939), ваенныя акадэміі імя Фрунзе (1951), Генштаба (1956). З верасня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, Данскім, Сталінградскім, Варонежскім, Цэнтральным, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Беларусі, Літвы, Латвіі. Вызначыўся пры фарсіраванні Заходняй Дзвіны і разгроме полацка-віцебскай групоўкі праціўніка. 24.6.1944 г. артылерыйскі полк пад яго камандаваннем агнём забяспечыў пераправу цераз раку штурмавой групе пяхоты і пераправіў свае гарматы. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г Пасля вайны ў Савецкай Арміі, генерал-лейтэнант артылерыі (1965). Памёр 7.5.1987 г Ганаровы грамадзянін Віцебска.

КНЯЗЕЎ Васіль Аляксандравіч. Нарадзіўся 9.1.1920 г. ў г.п. Бобр Крупскага раёна Мінскай вобласці. Жыў у в. Княжыца Віцебскага раёна. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1938), Адэскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў (1940). У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік вызвалення Паўночнага Каўказа, Украіны, Беларусі. На фронце з першага дня вайны. Камандзір эскадрыллі знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант В.А.Князеў зрабіў 1088 баявых вылетаў, правёў 139 паветраных баёў, збіў 20 варожых самалётаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.8.1943 г. Пасля вайны да 1962 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні палкоўніка. Потым жыў у Адэсе. Памёр 22.7.1968 г. Яго імем названа вуліца ў Віцебску і Віцебская ўзорная аўтамабільная школа БелАСТТ (з 1987).

З успамінаў былога камісара палка маёра ў адстаўцы А.Жураўлёва

Вайна для малодшага лейтэнанта Князева, які служыў у авіяцыйным знішчальным палку пад Вінніцай, пачалася на чарговым бая-

Марсель Лефеўр.

Дз.І.Лугаўской.

вым дзяжурстве 22 чэрвеня 1941 г. У 5.15 звяно, якім камандаваў малады пілот, узляцела на перахоп двухматорнага нямецкага «Юнкерса—88».

З каманднага пункта ўзвілася ў неба сігнальная ракета, звяно нашых І-16, якіх любоўна ў той час называлі «ішачкамі», пакідаючы след у роснай траве, пайшлі на ўзлёт. У пары з камандзірам звяна быў М.Трэгубаў. Ён першым убачыў нямецкага разведчыка, што набліжаўся да камандзіра, паказаў рукой уверх. Але лётчык двухматорнага бамбардзіроўшчыка таксама ўбачыў нашы знішчальнікі, рэзка змяніў курс і пачаў набіраць вышыню, пэўна, спрабуючы ўцячы за хмары.

Не ўдалося. І-16 наблізіліся да яго, і Князеў першым даў доўгую чаргу з усёй бартавой зброі. Аднак і з пашкоджаным рухавіком праціўнік упарта ляцеў да выратавальных воблакаў. Князеў зрабіў другі заход, падышоў да разведчыка амаль ушчыльную і прашыў фюзеляж і кабіну ўцекача. «Юнкерс», быццам нехаця ўвайшоў у крутую спіраль, пакідаючы чорны шлейф дыму, панёсся да зямлі. Упаў ён у раёне горада Жмерынка...

Першы бой і першая перамога! А колькі іх было потым — і баёў, і перамог, і цяжкіх страт!

Вось некаторыя вытрымкі з баявых данясенняў палка:

«26 ліпеня 1941 г. ў групавым баі ў раёне Валадарская (Украіна) В.Князеў збіў «Хеншэль-126»;

28 ліпеня вылецеў на перахват разведчыка. Дагнаў яго і з першай атакі знішчыў...

15 жніўня ў раёне Хоцка расстраляў «Фоке-Вульф» — «раму»...

19 жніўня збіў у баі з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка 2 самалёты «Хейнкель-113». Яны ўпалі ў раёне с. Крынічкі»...

Асабліва запомніўся адзін з такіх палётаў — 20 лістапада 1941 г. Надвор'е так сабе, па-асенняму хмурнае. Вылецеў Князеў са сваім нязменным напарнікам Мікалаем Трэгубавым. Мяняючы курс палёту і вышыню, знішчальнікі выявілі на шашы калону аўтамашын. Зайшлі ў атаку, ударылі з усіх ствалоў. У немцаў пачалася неразбярыха і паніка: самалёты звaліліся ім на галаву нечакана. Потым было ўстаноўлена, што нашы лётчыкі знішчылі 14 аўтамашын, адну гармату, шмат салдат і афіцэраў.

Амаль з кожнага палёту ён вяртаўся з перамогай. Так, 17 мая 1942 г. ён збіў фашысцкі знішчальнік «Ме-109», 13 чэрвеня — «Фоке-Вульф-189», 19 жніўня — новая перамога. У раёне Маздока Князеў падпальвае два «Ме-109», а 4 верасня — яшчэ два «месеры». Пасля гэтых баёў у нашага земляка да ордэна Чырвонага Сцяга прыбавіўся ордэн Леніна, званне старшага лейтэнанта і назначэнне на пасаду камандзіра эскадрыллі...

У чэрвені 1944 г. гвардзейскі полк, у якім служыў Князеў, прыбыў на Беларускі фронт. Там, унізе, пад крылом дзесьці знаходзіліся яго родныя, пра лёс якіх ён нічога не ведаў. І калі ў канцы чэрвеня Віцебшчына была вызвалена ад акупантаў, камандзір палка дазволіў свайму баявому сябру на У-2 злятаць у родныя мясціны. Вечарам таго ж дня Князеў вярнуўся ў полк чарней хмары. Ён даведаўся, што маці, бацьку і дзвюх сясцёр фашысты вывезлі на прымусовыя работы ў Германію, а братоў — Міхаіла і Алега — расстралялі.

Вайна для В.А.Князева скончылася непадалёку ад Берліна. Тут ён стаў камандзірам знішчальнага авіяпалка.

У.І.Галдзілаў, А.І.Мацяюн.

ЛЕФЕЎР Марсель. Нарадзіўся 17.3.1918 г. ў Нармандыі, Францыя. Заслужаны лётчык Францыі. Скончыў лётную школу. З 1938 г. ў арміі. З 1941 г. ў радах «Змагарнай Францыі», удзельнічаў у баях супраць гітлераўцаў. З 28.11.1942 г. ў СССР у складзе авіяэскадрыллі «Нармандыя» (пазней авіяполк «Нармандыя — Нёман»). На фронце з сакавіка 1943 г.: лётчык-інструктар, камандзір эскадрыллі. Старшы лейтэнант Лефеўр удзельнік Віцебска-Аршанскай, Усходне-Прускай, Кёнігсбергскай аперацый. Зрабіў 105 баявых

вылетаў, правёў 30 паветраных баёў, збіў 11 самалётаў праціўніка. У адным з баёў самалёт Лефеўра загарэўся, але лётчык давёў яго да свайго аэрадрома. Ад цяжкіх апёкаў памёр 5.6.1944 г. ў Маскве. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.6.1945 г. Навечна залічаны ў спіс эскадрыллі знішчальнага авіяпалка. Яго імем названа вуліца ў г. Лез-Андэлі ў Нармандыі.

ЛУГАЎСКОЙ Дзмітрый Іванавіч. Нарадзіўся 17.11.1918 г. ў Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1938), Чкалаўскую (Арэнбургскую) школу пілотаў (1941). У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну з жніўня 1942 г. на Каўказскім, Паўночна-Каўказскім, 2-м Прыбалтыйскім франтах. Камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка капітан Дз.І.Лугаўской зрабіў 130 баявых вылетаў, знішчыў 10 варожых танкаў, 26 гармат і бронемашын, 80 аўтамашын з жывой сілай і грузам, 6 цыстэрн з гаручым, 4 пераправы. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 13.4.1944 г. Пасля вайны да 1959 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні палкоўніка. Жыў у Мінску. Памёр 2.5.1989 г.

ЛЯДСКІ Цімафей Сяргеевіч. Нарадзіўся 28.2.1913 г. на ст. Долінская, цяпер у межах г. Долінск Кіраваградскай вобласці. З 1935 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў у г. Энгельс (1939). У Вялікую Айчынную вайну з жніўня 1942 г. на 1-м Украінскім фронце; камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка гвардыі капітан Ц.С.Лядскі да канца жніўня 1944 г. зрабіў 115 баявых вылетаў на штурмоўку чыгуначных эшалонаў, скапленняў жывой сілы і тэхнікі праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Пасля вайны да 1959 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні падпалкоўніка. Жыў у Віцебску. Памёр у 1998 г.

НІКІФАРАЎ Пётр Паўлавіч. Нарадзіўся 29.7.1917 г. ў Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1938), Барысаглебскую ваенную школу лётчыкаў (1939). У Чырвонай Арміі з 1938 г. У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на 1-м, 2-м Украінскіх франтах. Удзельнік баёў пад Сталінградам, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Румыніі, скончыў вайну ў Чэхаславакіі. Штурман знішчальнага авіяпалка капітан П.П.Нікіфараў зрабіў 297 баявых вылетаў, правёў 69 паветраных баёў, збіў 20 варожых самалётаў. Пасля вайны да 1960 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні палкоўніка. Потым на гаспадарчай рабоце. Памёр 7.4.1971 г.

Ц.С.Лядскі.

П.П.Нікіфараў.

ПАЦЁМКІН Генадзь Фёдаравіч. Нарадзіўся 23.5.1923 г. ў г. Ачакаў Мікалаеўскай вобласці. На фронце з 1941 г. Камандзір стралковага батальёна гвардыі капітан Г.Ф.Пацёмкін вызначыўся пры вызваленні Віцебскай вобласці. 18.10.1943 г. павёў батальён у наступленне на моцны рубеж абароны праціўніка каля в. Фокіна Суражскага раёна. Пад агнём ворага байцы пераадолелі драцяныя загароды і ўварваліся ў траншэі гітлераўцаў. Г.Ф.Пацёмкін загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў Адэсе. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.6.1944 г пасмяротна.

Мемарыяльная дошка на доме, дзе ў 1957—95 гг. жыў Герой Савецкага Саюза Ц.С.Лядскі.

Г.Ф.Пацёмкін.

А.С.Пешчанка.

З франтавых пісем Г.Ф.Пацёмкіна родным

жнівень 1942 г.

Дарагая сястра! Не пісаў месяц, бо выконваў баявую задачу ў тыле ў немцаў і не ведаў нічога аб Радзіме, а тым больш не мог пісаць адтуль... Застаўся жывы, здаровы. Нават прадстаўлены да ўзнагароды за сякія-такія справы. Цяпер у Загорску, адпачываем. Папоўнім рады загінуўшых па-геройску ў баях і зноў на фронт, на бітву з фашыстамі.

Не ведаю, ці паспее дайсці сюды твой адказ. Што з бацькам? Дзе ён?..

3 красавіка 1943 г.

Добры дзень, дарагі бацька!

Не ведаю, ці атрымліваеш ты мае пісьмы, але пішу я даволі часта табе. А адказу ўсё няма і няма. Усе спадзяванні, што я атрымаю яго, ужо страціў. Чорт вазьмі, са жніўня мінулага года — ні аднаго слова! Сам разумееш, якія пачуцці ў мяне: тужліва на душы, што з усімі сувязь магу наладзіць, а з табой ніяк. Але я ўсё чакаю і чакаю, назло пошце. Што ж напісаць пра сябе? Жыву я па-ваеннаму... Бацька, ведай, сын твой не падвядзе цябе. Чырванець за мяне не прыйдзецца. Цяпер я ўжо капітан. Ты разумееш, што я ганаруся сваім званнем. Заслужана гэта. Бо ў баях я са жніўня 1941 г. Ясна, што гэта патрабуе ад мяне яшчэ большых ведаў, уменняў вадзіць байцоў у атаку, уменняў выхоўваць людзей, ведаць іх патрэбы і радасці, клапаціцца аб іх заўсёды больш, чым аб сабе, бо я камандзір, пакуль мае людзі са мной, пакуль я кіраю імі. А адзін у полі — не воін!

Як твае справы, пішы, бацька. Я чакаю, нягледзячы ні на што, чакаю з нецярпеннем! Ну, бывай. Моцна цісну руку і цалую.

Твой сын Генадзь.

27 верасня 1943 г.

Дзень добры, дарагая Юля!

Штосьці даўненька не атрымліваў тваіх пісем. У мяне, нягледзячы на вялікія цяжкасці, добры настрой: мы ж вызваляем Смаленшчыну, гонім фрыцаў, б'ём іх у хвост і ў грыву. Наступаць нялёгка, адчуваеш вялікае фізічнае напружанне, але дух маральны моцны. Гінуць сябры, лепшыя хлопцы кладуць свае галовы за Радзіму. Але ж прыемна ўсведамляць, што я — камандзір батальёна, што мы вызвалілі для Радзімы больш 30 вёсак... Як ненавідзіш фрыцаў, калі бачыш палаючыя вёскі, знясіленых жыхароў.

Мы ідзём наперад. Наперадзе — Віцебск...

Трымайся, сястра, перанось стойка ўсе цяжкасці. Мы жывём у вялікія дні. Трэба перацярпець усё, каб выгнаць фашысцкую нечысць з нашай зямлі.

ПЕШЧАНКА Андрэй Сямёнавіч. Нарадзіўся 6.12.1921 г. ў Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1941), Чарнігаўскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1942), Вышэйшыя афіцэрскія лётна-тактычныя курсы (1951). Да вайны працаваў у майстэрнях Віцебскага палітэхнікума і на заводзе імя Кірава. З 1941 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну з 1943 г. на 1-м і 2-м Украінскіх франтах, удзельнік вызвалення Украіны, Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі. Камандзір звяна штурмавога авіяпалка лейтэнант А.С.Пешчанка зрабіў 150 баявых вылетаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.5.1946 г. Пасля вайны да 1962 г. служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні палкоўніка, да 1991 г. на гаспадарчай рабоце.

ПОЛАЗАЎ Канстанцін Мікалаевіч. Нарадзіўся 22.6.1914 г. ў Віцебску. У Чырвонай Арміі з 1936 г. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1939). У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Цэнтральным, Сцяпным і 1-м Украінскім франтах. Удзельнік Львоўска-Сандамірскай, Пражскай і Берлінскай аперацый. Камандзір роты аўтаматчыкаў старшы лейтэнант К.М.Полазаў вызначыўся ў жніўні 1944 г. ў баях за г. Самбар (Украіна), дзе рота на чале з ім уварвалася ў горад

К.М.Полазаў.

Ралан дэ ла Пуап.

У.І.Свідзінскі.

І.П.Сівакоў.

і вяла бой з ворагам да падыходу асноўных сіл брыгады. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 10.4.1945 г. Пасля вайны жыў у в. Буявіна Калінінскага раёна Калінінскай (цяпер Цвярской) вобласці, да 1969 г. працаваў у калгасе. Памёр 10.9.1977 г.

ПУАП Ралан дэ ла. Нарадзіўся 28.7.1920 г. ў г. Ла-Гранж-Фор, Францыя. Заслужаны лётчык Францыі. У 2-ю сусветную вайну з 1940 г. ў руху «Змагарная Францыя», потым у складзе англійскіх войск. З лістапада 1942 г. ў СССР, ст. лейтэнант, камандзір эскадрыллі авіяпалка «Нармандыя — Нёман». Удзельнік Беларускай і Усходне-Прускай аперацый. Зрабіў 70 баявых вылетаў, збіў 15 варожых самалётаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 27.11.1944 г. Пасля вайны пачынальнік і куратар пластыкавай вытворчасці, заснавальнік унікальнага ў Еўропе воднага парку Марынлэнд (1970), асацыяцыі «Рымо» (1992) па ахове марскіх жывёл Міжземнага мора.

СВІДЗІНСКІ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся 8.5.1923 г. ў Віцебску. Да вайны працаваў слесарам на ігольным заводзе ў Віцебску. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Бранскім, Цэнтральным, 3-м Беларускім, 1-м Украінскім франтах. У 1942 г. скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. Камандзір стралковай роты гвардыі лейтэнант У.І.Свідзінскі вызначыўся ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра на поўнач ад Кіева. З групай байцоў пад агнём праціўніка дасягнуў процілеглага берага, захапіў і ўтрымаў плацдарм да пераправы батальёна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 17.10.1943 г. Загінуў у баі на тэрыторыі Германіі 25.3.1945 г. Пахаваны ў Львове. У Віцебску яго імем названа вуліца.

СІВАКОЎ Іван Пракопавіч. Нарадзіўся 15.6.1901 г. ў с. Іванаўка Чырвонагвардзейскага раёна Арэнбургскай вобласці. Скончыў пяхотную школу (1924), курсы «Выстрал» (1937). У Чырвонай Арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны і ліквідацыі бандытызму ў Дагестане і Кабардзіна-Балкарыі. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Данскім, Варонежскім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Камандзір 71-й гвардзейскай стралковай дывізіі вызначыўся ў Віцебска-Полацкай наступальнай аперацыі. Удзельнічаў у вызваленні Шуміліна, Сіроціна, Бешанковіч, Полаччыны. У гэтай аперацыі дывізія пад камандаваннем генерал-маёра І.П.Сівакова прайшла з баямі 148 км, вызваліла 255 населеных пунктаў. Загінуў 20.7.1944 г. ў баі на тэрыторыі Літвы. Пахаваны ў Віцебску. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.7.1944 г. пасмяротна. Імем героя названа вуліца ў Віцебску.

СІМОН Васіль Пятровіч. Нарадзіўся 12.4.1920 г. ў в. Вязовае Ахтырскага раёна Сумскай вобласці. Скончыў Харкаўскі універсітэт (1948). У Чырвонай Арміі з 1941 г. З сакавіка 1943 г. на Паўночна-Заходнім, Бранскім, 1-м Прыбалтыйскім франтах. Камандзір мінамётнага ўзвода лейтэнант В.П.Сімон вызначыўся ў Віцебска-Аршанскай аперацыі. 23.6.1944 г. ўдзельнічаў у прарыве абароны праціўніка каля в. Забалоцінка Віцебскага раёна. З групай байцоў на падручных сродках фарсіраваў Заходнюю Дзвіну. На захопленым плацдарме на працягу сутак адбіваў контратакі праціўніка. Званне Героя Савецка-

В.П.Сімон.

У.С.Смятанін.

І.П.Собалеў.

М.К.Спірыдзенка.

га Саюза прысвоена 22.7.1944 г. Жыў у г. Ахтырка Сумскай вобласці.

СМЯТАНІН Уладзімір Сяргеевіч. Нарадзіўся 2.7.1917 г. ў г. Паўлаград Днепрапятроўскай вобласці. У Чырвонай Арміі з 1938 г. На фронце з ліпеня 1941 г. Намеснік камандзіра стралковага палка гвардыі падпалкоўнік У.С.Смятанін вызначыўся пры акружэнні і разгроме віцебскай групоўкі праціўніка. 25.6.1944 г. полк пад яго камандаваннем адбіў 13 контратак варожай пяхоты і танкаў, якія спрабавалі вырвацца з віцебскага «катла», знішчыў каля 800 гітлераўцаў, 3 самаходныя гарматы. У.С.Смятанін двойчы ўзначальваў атаку. Цяжка паранены працягваў камандаваць палком. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Узварцы Віцебскага раёна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. пасмяротна. Імем героя названа вуліца ў Віцебску.

СОБАЛЕЎ Іван Паўлавіч. Нарадзіўся 11.11.1907 г. ў в. Шапуры Віцебскага раёна. Скончыў Ленінградскую ваенна-інжынерную школу (1931). У Чырвонай Арміі з 1927 г. На фронце з 1941 г. Камандзір матарызаванага пантонна-маставога батальёна падпалкоўнік І.П.Собалеў з батальёнам прайшоў шлях ад Сталінграда да Берліна і Прагі. Забяспечваў фарсіраванне водных рубяжоў на тэрыторыі РСФСР, Украіны, Прыбалтыкі, Румыніі, Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі. Вызначыўся ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра ў Днепрапятроўскай вобласці. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.10.1943 г. Да 1955 г. ў Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве ў Віцебску. Ганаровы грамадзянін Віцебска.

СПІРЫДЗЕНКА Мікалай Кузьміч. Нарадзіўся 12.1.1917 г. ў в. Беразуха Сіроцінскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1937), Барысаглебскую ваенную авіяцыйную школу лётчыкаў (1938), Ваенна-паветраную акадэмію (1950), Ваенную акадэмію Генеральнага штаба (1957). У Чырвонай Арміі з 1937 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну на Паўночна-Заходнім, Паўднёва-Заходнім, Заходнім і 2-м Беларускім франтах. Камандзір эскадрыллі, потым знішчальнага авіяпалка маёр М.К.Спірыдзенка з 22.6.1941 г. зрабіў 337 баявых вылетаў, удзельнічаў у 85 паветраных баях, збіў 15 варожых самалётаў асабіста і 6 у групе. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі. Генерал-маёр (1961). З 1962 г. выкладаў у ваеннай акадэміі. Звольніўся ў запас у 1970 г., жыў у Маскве. Памёр 26.12.1980 г.

ТЫШЭВІЧ Уладзімір Аляксандравіч. Нарадзіўся 29.5.1923 г. ў Віцебску. Скончыў Віцебскі аэраклуб (1940), Ваенна-паветраную акадэмію (1951). У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з ліпеня 1943 г., удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы. Лётчык-штурмавік старшы лейтэнант У.А.Тышэвіч зрабіў 144 баявыя вылеты, знішчыў 5 варожых самалётаў, 3 паравозы, 10 танкаў, больш за 50 аўтамашын, 6 артылерыйскіх батарэй, 8 мінамётаў, 9 зенітных агнявых пунктаў, 14 гармат, 4 бліндажы, 9 складаў, 27 чыгуначных вагонаў, шмат жывой сілы праціўніка. На акупіраваную ворагам тэрыторыю скінуў 120 тыс. лістовак. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.5.1946 г. Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі, звольніўся ў запас у званні палкоўніка, жыў і працаваў у Віцебску. Памёр 10.12.1980 г.

УГЛОЎСКІ Анатоль Яфімавіч. Нарадзіўся 24.7.1923 г. ў в. Лужавіца Вялікаўсцюгскага раёна Валагодскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 г. на Калінінскім, 1-м Прыбалтыйскім франтах. Радавы знішчальна-процітанкавага дывізіёна А.Я.Углоўскі 20.12.1943 г. ў баі з варожымі танкамі каля в. Халуднае на шашы Сураж — Віцебск кінуўся з гранатамі пад галаўны танк і падбіў яго, цаной свайго жыцця сарваўшы контратаку ворага. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.6.1944 г. пасмяротна. Пахаваны ў в. Вымна Віцебскага раёна. На месцы яго подзвігу ў 1978 г. ўстаноўлены помнік.

У.А.Тышэвіч.

А.Я.Углоўскі.

Адзін супраць «тыграў»

306-я стралковая дывізія сустрэла шалёнае супраціўленне праціўніка на загадзя падрыхтаваным рубяжы. Немцы імкнуліся любой цаной утрымаць у сваіх руках аўтамагістраль Сураж — Віцебск і падцягнулі сюды свежыя сілы, у тым ліку цяжкія і самаходныя гарматы. На працягу двух сутак у раёне вёскі Халуднае ішлі жорсткія, надзвычай напружаныя баі.

...Раніца 20 снежня 1943 г. На заходняй ускраіне вёскі Халуднае акапаўся ўзвод роты процітанкавых ружжаў, на бліжэйшай агнявой пазіцыі залёг і гвардыі радавы Анатоль Углоўскі. Тут, каля шашы, трымала абарону невялікая група савецкіх воінаў. На іх скіравалі агонь і пайшлі на штурм 4 «тыгры», 3 «фердынанды» і «пантэры». За імі наступала нямецкая пяхота. Здавалася, што такой сіле тут няма перашкоды. Калі пярэдні танк наблізіўся да пазіцый нашых воінаў, Углоўскі і яго сябры-бранябойшчыкі адкрылі агонь з процітанкавых ружжаў. Аднак кулі не маглі прабіць 100-мм лабавую браню танка ці падпаліць яго.

Ад узвода засталося толькі 6 воінаў, а танкі ідуць уперад, рушаць на акопы бранябойшчыкаў, каб прарвацца на пазіцыі пехацінцаў. І ў гэты момант насустрач «тыгру» падняўся з акопу Анатоль Углоўскі і кінуў гранату. Яна разарвалася пад днішчам «тыгра», другая граната разарвала левую гусеніцу. У паядынку з ворагам загінуў і сам Анатоль Углоўскі. *Т.В.Шкіндзер.*

ХАРУЖАЯ Вера Захараўна. Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з кіраўнікоў і арганізатараў патрыятычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзілася 27.9.1903 г. ў Бабруйску. Скончыла Цэнтральную савецка-партыйную школу ў Мінску (1923). Настаўнічала на Палессі (1919), удзельнічала ў складзе Камуністычнага батальёна ў барацьбе з атрадамі Булак-Балаховіча (1920), працавала ў Мазыр-



Магіла Героя Савецкага Саюза А.Я.Углоўскага і падбіты ім «тыгр».

В.З.Харужая.

І.Д.Чарняхоўскі.

скім і Бабруйскім павятовых камітэтах камсамола. Член КП(б)Б з 1921 г. У 1922—23 гг. у ЦК КСМБ, адначасова член рэдкалегіі газеты «Малады араты», супрацоўніца часопіса «Полымя», газеты «Чырвоная змена». З лютага 1924 г. на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі, з чэрвеня 1924 г. сакратар ЦК КСМЗБ, член ЦК КПЗБ. Згуртоўвала рэвалюцыйную моладзь вакол КСМЗБ, выступала ў нелегальным друку, арганізоўвала падпольныя сходы і нарады моладзі. Арганізатар выдання падпольнай газеты «Малады камуніст». За рэвалюцыйную дзейнасць была арыштавана 15.9.1925 г., асуджана да 8 гадоў турмы. На судовых працэсах выступала з прамовамі ў абарону КПЗБ, выкрывала дзейнасць польскіх улад у Заходняй Беларусі. З турмы вяла перапіску з сябрамі і роднымі, частка якой была сабрана ў кнізе «Лісты на волю» (1931), высока ацэненай Н.К.Крупскай. У выніку абмену палітвязнямі ў 1932 г. вярнулася ў БССР, жыла ў Мінску, для выдавецтва КПЗБ пісала адозвы, артыкулы, брашуры. У 1935—39 гг. працавала на Балхашбудзе, потым зноў у Беларусі, на партыйнай рабоце ў Целяханах, Пінску. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада В.З.Каржа. З вясны 1942 г. ў апараце ЦК КП(б)Б у Маскве, у верасні накіравана ў варожы тыл. Стварыла і ўзначальвала падпольны партыйны цэнтр у Віцебску (гл. артыкул «Подзвіг Веры Харужай у Віцебску»), перадавала камандаванню Чырвонай Арміі і партызанам звесткі пра ворага. 13.11.1942 г. была арыштавана. Пасля катаванняў расстраляна 4.12.1942 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 17.5.1960 г. Імем Веры Харужай у Віцебску названа вуліца. На ўшанаванне яе памяці ўстаноўлены помнік і мемарыяльная дошка.

Дзеці В.З.Харужай — Аня і Сяргей. 1948 г.

ЧАРНЯХОЎСКІ Іван Данілавіч. Нарадзіўся 29.6.1906 г. ў г. Умань Чаркаскай вобласці. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1944). Генерал арміі (1944). Скончыў Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі РСЧА (1936). У Чырвонай Арміі з 1924 г. У 1938—41 гг., у БВА — камандзір танкавага палка, намеснік камандзіра танкавай дывізіі. У Айчынную вайну з 1941 г. на Паўночна-Заходнім, Варонежскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім франтах: камандзір танкавай стралковай дывізіі, танкавага корпуса, камандуючы войскамі 60-й арміі. З красавіка 1944 г. камандуючы войскамі 3-га Беларускага фронту, якія ўдзельнічалі ў Беларускай аперацыі 1944 г., разам з 1-м Прыбалтыйскім фронтам здзейснілі Віцебска-Аршанскую аперацыю 1944 г., а з 1-м і 2-м Беларускімі франтамі Мінскую аперацыю 1944 г., стварылі мінскі «кацёл», у які трапіла больш чым 100-тысячная групоўка праціўніка, вызвалілі Віцебск, Оршу, Барысаў, Мінск, Ліду, Вільнюс, першымі ўварваліся ва Усходнюю Прусію, выйшлі на подступы да Кёнігсберга. Каля г. Мельзак І.Д.Чарняхоўскі быў смяротна паранены. Памёр 18.2.1945 г. Быў пахаваны ў Вільнюсе. У пачатку 1990-х гадоў перапахаваны ў г. Варонеж

(Расія). Каля в. Рэдзькі Дубровенскага раёна на месцы каманднага пункта І.Д.Чарняхоўскага ўстаноўлена мемарыяльная пліта. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і Віцебску.

З успамінаў генерал-палкоўніка А.П.Пакроўскага, былога начальніка штаба 3-га Беларускага фронту

«Мне пришлось быть начальником штаба фронта при нескольких командующих. Каждый из них умел принимать решения и доводить их до штаба фронта и штабов армий, но до солдата их идеи не всегда доходили. Черняховский же требовал доводить задачу до солдата в таком масштабе, чтобы тот, следуя суворовскому правилу, понимал «свой маневр». Идеи, сформулированные в решениях командующего, овладевали всеми воинами, находили у них признание и поддержку. Мне часто приходилось слышать из уст солдат и командиров: «С таким командующим не страшно в огонь и в воду».

От нового командующего мы, работники штаба фронта, ожидали упреков за неудачи в недавних наступательных операциях. Однако, ко всеобщему удовлетворению, услышать их никому не пришлось. Иван Данилович был очень вежливым, выдержанным, общительным. Хорошо понимал, когда нужно применять слова «я», и никогда этим не злоупотреблял. Он был человеком большого такта, в совершенстве владел собой, никогда не прибегал к унижающим достоинство воина разносам. С его приходом в штабе установилась спокойная, деловая обстановка. Исследование полководческой деятельности И.Д.Черняховского позволяет утверждать, что молодой генерал в совершенстве овладел военным искусством, и поэтому в нашей военной истории он по праву занял место среди видных полководцев.

Одной из вершин полководческого таланта И.Д.Черняховского является участие в планировании и проведении знаменитой операции «Багратион», в которой 3-й Белорусский фронт сыграл большую роль.

31 мая 1944 г. была получена директива Ставки Главного командования, довольно детально излагавшая группировку и задачи фронта. В ней указывалось: войскам 3-го Белорусского фронта во взаимодействии с войсками 1-го Прибалтийского и 2-го Белорусского фронтов разгромить вражескую группировку в районе Витебска, Орши и выйти на Березину. Для осуществления этой задачи предлагалось нанести два удара: один — на Богушевск, Витебск, другой — на Борисов.

Замыслы Черняховского были блестяще осуществлены войсками фронта. Наши армии освободили Витебск, Оршу, Минск, Вильнюс и вышли на границы Восточной Пруссии. Ивану Даниловичу правительство присвоило звание генерала армии и наградило второй звездой Героя Советского Союза».

З успамінаў палкоўніка ў адстаўцы Аляксея Камарова, былога ад'ютанта генерала І.Д.Чарняхоўскага

«Утром 18 февраля 1945 г. генерал И.Д.Черняховский выехал в боевые порядки 3-й армии, которой командовал генерал А.В.Горбатов. Перед этим я позвонил командиру корпуса, где мы должны были быть, и попросил, чтобы он выслал навстречу офицера связи.

Это была обычная поездка командующего фронтом. Он бывал в войсках очень часто, а перед каждым наступлением считал нужным собственными глазами увидеть состояние частей из соединений, проверить их готовность к выполнению боевой задачи.

Рискованными ли были эти поездки Ивана Даниловича? Конечно, рискованными. Война есть война, фронт есть фронт. А наш командующий к тому же буквально не признавал опасностей. Бывало, что я, выполняя обязанности адъютанта, старался предостеречь генерала. Он отвечал:

— Я командующий, а ты его адъютант. На нас смотрят тысячи глаз...

Когда И.Д.Черняховский был командиром танковой дивизии, он дважды ходил в атаку на танке. Командующий 60-й армией одним из первых форсировал бушующий огнем Днепр. Бесчисленное количество раз попадал под яростные бомбежки и еще более яростные артиллерийские обстрелы.

Недаром И.Д.Черняховскому дважды присвоено высокое звание Героя Советского Союза. Он был настоящим героем.

Вернусь, однако, к роковому дню, 18 февраля. На окраине города Мельзак нас встретил майор из корпуса. Время от времени то там, то здесь рвались вражеские снаряды. Фашисты часто обстреливали командный пункт корпуса.

Помнік Герою Савецкага Саюза М.П.Шмырову ў Віцебску (вуліца Чэхава).

Мы следовали за корпусной машиной. И вдруг сзади с грохотом разорвался снаряд. Один из осколков повредил руку водителя Виноградова. А Черняховский сказал, обращаясь ко мне:

— Алеша, я ранен. В левую лопатку...

Я бросился перевязывать командующего.

Иван Данилович скрипел зубами, полузакрывал глаза. Рана была большая. Радист стал связываться со штабом фронта. И тут я услышал последние слова И.Д.Черняховского:

— Душа, Алеша, я умираю...

Приехал командующий армией генерал А.В.Горбатов.

Черняховского доставили в ближайший медсанбат.

Иван Данилович был в сознании. Несколько раз пытался что-то сказать, но голос прерывался.

Весть о ранении командующего облетела фронт. Убежден, что ни одного воина скорбная весть не оставила равнодушным. Не говорю о себе — я был сам на грани потери сознания.

Какой это был большой, большой человек! Какой это был большевик! Какой это был замечательный полководец!»

Рана оказалась смертельной.

«Творцы победы: от рядового до маршала». М. 1987. С. 190—200. Друкуецца са скарачэннямі.

ШМЫРОЎ Мінай Піліпавіч (партызанскі псеўданім «Бацька Мінай»). Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 23.12.1891 г. ў в. Пунішча Віцебскага раёна. У арміі з 1913 г. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, баёў супраць войск Краснова, Карнілава, Юдзеніча, арганізатар першага партызанскага атрада ў Віцебскай губерні. З 1921 г. камандзір атрада па барацьбе з бандытызмам на Віцебшчыне, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. З 1923 г. на гаспадарчай рабоце ў Віцебскай вобласці. Член ЦВК БССР у 1935—38 гг. У Вялікую Айчынную вайну ў ліпені 1941 г. арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад у Суражскім раёне, які потым увайшоў у склад 1-й Беларускай партызанскай брыгады. З красавіка да лістапада 1942 г. камандзір брыгады, з лістапада 1942 г. ў ЦШПР. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.8.1944 г. Пасля вайны на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Віцебску. Дэпутат Вярхоўнага Савета Беларусі ў 1947—63 гг. Памёр 3.9.1964 г. У Віцебску яго імем названы вуліца, парк, ГПТВ, устаноўлены бюст, створаны мемарыяльны музей.

Поўныя кавалеры ордэна Славы

КАРЫКАЎ Парфірый Герасімавіч. Нарадзіўся 25.3.1923 г. ў Батыраўскім раёне Чувашскай АССР. Да вайны працаваў трактарыстам і камбайнерам. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, разведчык. Быў тройчы паранены. Пасля вайны скончыў Ваенную акадэмію бранятанкавых войск у Маскве (1956), служыў у Адэскай ваеннай

В.Ф.Ландычэнка.

А.К.Марозаў.

І.С.Шмея.

І.П.Янчанка.

акрузе, быў намеснікам камандзіра дывізіі. Звольніўся ў запас у званні палкоўніка, працаваў на аўтатранспартным прадпрыемстве ў Адэсе. У 1986 г. пераехаў у Віцебск, прымаў актыўны ўдзел у рабоце ветэранскіх арганізацый, у выхаванні моладзі. Узнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеней, ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме» 2-й ступені, медалямі.

ЛАНДЫЧЭНКА Віктар Фёдаравіч. Нарадзіўся 12.2.1922 г. ў в. Міхайлова Лёзненскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну на Варонежскім, Заходнім, 3-м Беларускім, 1-м Прыбалтыйскім франтах. Удзельнік вызвалення Віцебска. Камандзір аддзялення разведроты сяржант В.Ф.Ландычэнка вызначыўся ў баях на тэрыторыі Літвы і Латвіі. Пасля вайны працаваў у органах МУС у Віцебску, выйшаў у адстаўку ў званні капітана. Узнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеней, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1980 г.

МАРОЗАЎ Аляксандр Кліменцьевіч. Нарадзіўся 23.1.1906 г. ў в. Якубова Полацкага раёна. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце, потым у партызанах, з мая 1944 г. на 1-м Прыбалтыйскім фронце. Ордэнам Славы 3-й ступені ўзнагароджаны за падрыў 3 варожых цягнікоў, ордэнам 2-й ступені — за захоп варожай аўтакалоны 10.10.1944 г., ордэнам 1-й ступені — за знішчэнне кулямётчыкаў праціўніка, якія перашкаджалі наступленню савецкіх войск (8.4.1945, у гэтым баі быў цяжка паранены). Пасля вайны жыў у Віцебску, працаваў рабочым на заводзе будматэрыялаў. Памёр 9.9.1984 г.

ШМЕЯ Іван Сцяпанавіч. Нарадзіўся 29.6.1921 г. ў Віцебску. У Вялікую Айчынную вайну з чэрвеня 1941 г. на Заходнім фронце. Камандзір аддзялення разведкі малодшы сяржант І.С.Шмея вызначыўся ў баях на тэрыторыі Літвы (каля г. Шаўляй) і Усходняй Прусіі (каля Тыльзіта і пры штурме Кёнігсберга). Узнагароджаны ордэнамі Славы ўсіх трох ступеней. Пасля вайны жыў і працаваў у г. Дзяржынск Мінскай вобласці.

ЯНЧАНКА Ілья Платонавіч. Нарадзіўся 27.7.1913 г. ў в. Калмакова Гарадоцкага раёна. Працаваў у міліцыі. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Паўднёвым, 1-м, 3-м, 4-м Украінскіх франтах. Камандзір аддзялення аўтаматчыкаў, сцяганосец палка старшыня І.П.Янчанка вызначыўся пры вызваленні Украіны і Польшчы. Увосень 1944 г. ў час варожай контратакі вынес з акружэння сцяг палка. У студзені 1945 г., калі фашысты пры падтрымцы танкаў акружылі камандны пункт палка, падбіў танк, вёў агонь па фашыстах, выратаваў сцяг. Пасля вайны жыў у Віцебску, працаваў на чыгунцы. Узнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеней, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памёр у снежні 1996 г.

Жанчыны ў баях за Віцебск

Бойка Марыя Іосіфаўна

Удзельніца баёў пад Віцебскам у 1944 г. З канца лютага 1944 г. камандзір узвода разведчыкаў 5-га гвардзейскага стралковага корпуса.

Не успела Мария познакомиться со взводом, как тут же получила задание. Марии трудно было определить, кого послать через нейтральную полосу. Она сняла шинель, надела ватный бушлат, а сверху маскхалат, повесила на грудь бинокль и сказала: «Со мной идут старший сержант Барашков, рядовые Образович и Попов». Барашков подал ей автомат, взял свой, и они вышли из блиндажа.

День был хмурый, дул холодный ветер. Для разведчиков погода подходящая. Подобрались к немцам на пять метров. В один миг слева и справа разведчики метнули в траншею гранаты. Грохнули взрывы, и следом за взрывами парни прыгнули в траншею, навалились на оставшихся в живых офицеров. Мария лежала у края траншеи и била из автомата налево и направо, охраняя свою группу, не давая другим немцам опомниться. Так был взят «язык» из 75-го пехотного полка гитлеровцев...

В марте — апреле 1944 г. командование 5-го стрелкового корпуса 39-й армии, получая данные разведки, осуществило мощные наступательные действия. Были освобождены населенные пункты Еремино, Дрюково, Паречки, Вороны, и начались бои на подступах к Витебску. Разведчики гвардии лейтенанта Марии Бойко ходили в ночные поиски, совершали налеты на позиции врага, добывая «языков», вели наблюдения за перемещением войск противника.

За свои подвиги под Витебском Мария была награждена орденом Отечественной войны 1-й степени.

Теперь Мария Иосифовна Бойко-Клипель с семьей живет в Хабаровске. Ее муж, бывший офицер штаба 39-й армии Владимир Иванович Клипель, вернувшись с фронта, стал писателем. Награжден двумя орденами Красного Знамени и двумя орденами Отечественной войны, орденом Красной Звезды, медалями. Его книги «Медвежий вал», «Испытание на верность», «Солдатами не рождаются», «Однополчане» правдиво повествуют о боях за город Витебск.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстаны кнігі «М.А.Волошин. Разведчики всегда впереди». М., 1977; «Константин Овечкин. Время, полное тревог». Хабаровск. 1985.

Варнова Зоя Дзмітрыеўна

Разведчыца. Удзельніца баёў за Віцебск. Узнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны 2-й ступені.

— Семь классов окончила, и началась война. Устроилась токарем на горьковский завод. Но могло ли нам спокойно работаться? Какой был патриотический настрой! — все рвались на фронт. Зою Космодемьянскую фашисты зверски казнили, а мы тут, в тылу... Прибавила себе год и добилась-таки направления на фронт. Сразу попала в спецшколу радистов для разведки. По 18 часов в сутки отрабатывала ключ — передачу и прием. И, наконец, в январе 43-го попала под Ленинград. А через 25 дней ранило.

После госпиталя, когда ехала в часть, разговорилась в поезде, — попались тоже разведчики. Предложили служить в дивизионной разведке. Приехав на место, я попросилась в дивизионную...

«Весной 1944 г. готовилось освобождение Витебска. Была поставлена задача — овладеть сильно укрепленной высотой 222,9 — вспоминает в письме бывший однополчанин Варновой писатель В.И.Клипель. — Предстояло разведать боем систему огня, расположение артиллерийских батарей, степень сопротивления противника. Бой продолжался с необыкновенным упорством целую неделю. И в этих боях за рацией находилась молодой солдат Зоя Варнова — 18-летняя радистка. В жестоких боях она должна была работать, поддерживая связь с полком и дивизией, находясь в окопе под непрерывным обстрелом. Одно дело солдату с автоматом, он может найти разрядку напряженности в движении, в действии, и совсем другое работать в таких условиях с полным вниманием, словно никакого боя нет».

Война для старшего сержанта Варновой кончилась на Немане. Разгромив фашистский штаб и забрав документы и 2 офицеров, группа возвращалась к себе. Нужно было пройти 8 км, переправиться через реку. При подходе к своим попали на засаду, автоматная очередь прошила разведчицу.

В 1945 г. ей было 19 лет, имела 5 ранений и инвалидность.

Газета «Ленинский путь». 1983 г.

ЗМЕСТ

Да чытача 21

Віцебск (карты і артыкул) . . . . . 24 – 26

Зямля нашых продкаў 27

Сляды сівой даўніны (27). Дзядзінец і Верхні замак Віцебска ў 11 – 17 ст. (30). Гандлёва-рамесніцкі пасад Віцебска ў 10 – 13 ст. (37). Палітычная гісторыя (41). Рамяство і хатнія промыслы гараджан у 10 – 13 ст. (44). Гандаль у 9 – 13 ст. (50). Віцебская берасцяная грамата (53). Духоўны свет старажытнага віцьбіча (53). Дакументы сведчаць (55).

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 57

Палітычнае жыццё Віцебска ў 14 – 18 ст. (57). Дакументы сведчаць (65). Сярэднявечнае права на самакіраванне (68). Дакументы сведчаць (68). Віцебск у агні (74). Сацыяльна-эканамічнае развіццё Віцебска (75). Дакументы сведчаць (84). Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў 14 – 18 ст. (91). Дакументы сведчаць (100). «Чарцёж» Віцебска 17 ст. (101). Канфесійнае жыццё Віцебска ў 14 – 18 ст. (103). Дакументы сведчаць (109).

Віцебск у складзе Расійскай імперыі 111

Дакументы сведчаць (118). Вайна 1812 года ў Віцебску (131). Дакументы сведчаць (135). З мемуараў І.І.Дабрыніна (142). З мемуараў А.Пастарэ (143). Першыя крокі да капіталістычнага гаспадарання (144). Дакументы сведчаць (146). Віцебская чыгунка (148). Дакументы сведчаць (151). Развіццё асветы і народнай адукацыі ў Віцебску (165). Віцебскія гімназіі (173). Мужчынская Аляксандраўская гімназія (173). Жаночая гімназія ведамства ўстаноў імператрыцы Марыі (175). Жаночая Аляксееўская гімназія (175). Прыватныя гімназіі (176). Віцебская прыватная жаночая 8-класная з правамі ўрадавых гімназія А.А.Варварынай (176). Прыватная жаночая 7-класная з правамі ўрадавых гімназія К.М.Чарновай (176). Прыватная мужчынская 8-класная з правамі ўрадавых гімназія І.Р.Неруша (177). Віцебскія прагімназіі (177). Прыватная 4-класная жаночая яўрэйская прагімназія Д.С.Давыдавай (177). Прыватная 4-класная жаночая яўрэйская прагімназія Р.Л.Хаўкінай (178). Дакументы сведчаць (178). Музычнае і тэатральнае жыццё Віцебска (19 – пачатак 20 ст.) (182). Выдавецкая справа ў Віцебску (185). Віцебская вучоная архіўная камісія (185). Архітэктурна-планіровачнае развіццё Віцебска ў час яго знаходжання ў складзе Расійскай імперыі (186). Віцебск канца 18 – пачатку 19 ст. вачамі Юзафа Пешкі (198). Па старонках віцебскіх газет (201). Звязаны лёсам (202).

На крутым павароце гісторыі 223

Віцебск у час 1-й сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года (223). Дакументы сведчаць (225). Хроніка падзей газетным радком (231). Устанаўленне савецкай улады ў Віцебску (237). Дакументы сведчаць (239). Удзельнікі рэвалюцыйных падзей у Віцебску (245). Жыхары Віцебска – удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны (248). На шляху сацыялістычных пераўтварэнняў (251). Развіццё народнай адукацыі ў Віцебску ў 1917 – 41 гг. (263). Медыцына і ахова здароўя ў Віцебску ў 1917 – 41 гг. (267). Канфесійная палітыка савецкай улады ў Віцебску (269). Абарончыя таварыствы (271). Дакументы сведчаць (273). Першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі: па старонках віцебскіх газет (283). З успамінаў Героя Сацыялістычнай Працы ганаровага грамадзяніна Віцебска Марыі Ільінічны Мацэнка (286).

Вернутыя імёны 286

Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій (286). Пакалечанае жыццё (385). Прызнаць ворагам народа (386). Дакументы сведчаць (389).

Змест

Ішла вайна народная 391

Баі за Віцебск у 1941 г. (391). Дакументы сведчаць (393). Хроніка абароны Віцебска (403). Віцебскае народнае апалчэнне 1941 г. (405). Гарнізон уступае ў бой (406). Лёс 220-й мотастралковай дывізіі (407). Дакументы сведчаць (409). Контрудар 5-га і 7-га мехкарпусоў (410). Камандзір 153-й стралковай дывізіі (412). Абарону трымалі курсанты (412). Першы бой (413). За родную Беларусь (414). Яны абаранялі Віцебск (415). Подзвіг танкістаў (416). Конеў у Віцебску (416). Погляд з фашысцкага генштаба (418). Так пачыналася вайна (419). Вайна стукае ў дзверы (420). Першыя дні вайны (421). Пакідаў горад пад бомбамі (422). Сустрэлі ворага як след (422). Мы былі ў народным апалчэнні (424). У тыя першыя дні (424). Уперадзе чакаў Сураж (425). Цяжкія гады акупацыі (425). Дакументы сведчаць (432). З дзённіка нямецкага салдата (433). Віцебск пад ценем свастыкі (435). Лагеры смерці (436). Горкая праўда (438). Лагер катавання (439). Віцебскае гета (439). Бітва за жыццё (445). Чорныя дні Віцебска (448). Забівалі дзеля пацехі (448). Мы адпомсцім за вашы пакуты, дзеці (448). Што яны зрабілі з нашым Віцебскам (449). Кроў стыне ў жылах (449). У Віцебску пануе голад (449). Горад пакут (449). На зняволенай зямлі (450). Дзіцячыя дамы Віцебска (450). Я гэта бачыла сама (450). Што мы бачылі... (451). Правасуддзе здзейснілася (451). На нямецкай катарзе (451). Нанятыя хлусы (453). Дакументы сведчаць (454). Віцебскае падполле дзейнічае (456). Віцебскі падпольны абком КП(б)Б (464). Віцебскі падпольны гарком КП(б)Б (465). Віцебскі падпольны абком ЛКСМБ (465). Віцебскі падпольны гарком ЛКСМБ (466). Падпольныя патрыятычныя групы, якія дзейнічалі ў Віцебску і прыгарадзе (467). Важнейшыя канспіратыўныя кватэры падпольшчыкаў Віцебска (469). Подзвіг Веры Харужай у Віцебску (471). Падпольная група К.С.Акаловіч (478). Падпольная група В.М.Арлоўскага (479). Падпольная група І.А.Бекішава (480). Падпольная група А.Я.Белахвосцікава (480). Падпольная група Л.Дз.Бярозкінай (481). Падпольная група І.С.Вялава (483). Падпольная група В.А.Вярбіцкага (483). Падпольная група Г.К.Грабяньковай (484). Падпольная група М.І. Еўдакімава (484). Падпольная група М.А.Журынскай (485). Падпольная група Д.І.Земляковай (485). Падпольная група У.А.Казлоўскага (486). Падпольная група В.І.Кірыленкі (486). Падпольная група З.Ф.Кочатавай (487). Падпольная група В.С.Кулагінай (488). Падпольная група Т.А.Ламаносенка (489). Падпольная група А.І.Ліпці (490). Падпольная група М.А.Ляхоўскага (490). Падпольныя групы П.К.Ляхоўскага і А.В.Міхайлоўскай – Р.М.Гіро (491). Падпольная група Т.А.Марудава (492). Падпольныя групы Ф.К.Мехава і А.А.Гагулі (493). Падпольная група М.Л.Мурашкі і Р.Ф.Махнова (494). Падпольная група М.Я.Нагібава (494). Падпольная група А.А.Сакаловай (495). Падпольная група Саладухіных (495). Падпольная група М.К.Свечкінай (496). Падпольная група І.А.Сідарэнка-Пабудзея (496). Падпольная група П.С.Смірнова (497). Падпольна група Е.С.Спірыдонавай (497). Падпольная група В.Дз.Шалуха (498). Падпольная група Б.С.Шарэнды (498). Тут расстралялі віцебскіх падпольшчыкаў (499). Падпольшчыкам Віцебска прысвечаны (500). Дакументы сведчаць (501). З выступлення В.І.Лузгіна на пасяджэнні ЦК ВЛКСМ (510). Побач былі і здраднікі (510). Дапамагалі як маглі (514). Пауль Кёрнер-Шрадэр (515). Дзеці вайны (516). Піянеры і школьнікі Віцебска – удзельнікі патрыятычнага падполля і партызанскага руху (517). 1942 год – першая спроба вызваліць Віцебск (520). Віцебскія вароты (521). Да Віцебска – 4 кіламетры (522). Дакументы сведчаць (523). Надзея набывае крылы (523). 1943 год – пачатак 1944 г. – Чырвоная Армія набліжаецца да горада (525). Прарваць абарону не ўдалося (527). Ставка требовала немедленных действий (531). Па шляху на Віцебск (532). Войскі рвуцца да Віцебска (533). Дакументы аб наступленні 33-й арміі (535). І ўдарам з поўначы... (536). Баявыя дзеянні 5-й арміі пад Віцебскам у студзені – сакавіку 1944 г. (537). Подзвіг Шуры Лук'яненка (538). Баі мясцовага значэння (540). Ад Масквы – да Віцебска (540). На Лучосе мы стаялі (542). Разведчык Іван Гарабец

(543). Пад вёскай Ермачкі (544). Прарыў (544). 953-і штурмавы авіяполк у баях за Віцебск (544). З баявога задання не вярнуліся (546). На ўчастку прарыву (547). План аперацыі «Баграціён» (549). Вызваленне Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (551). Дакументы сведчаць (554). Віцебскі «кацёл» (560). Злучэнні і часці, якія былі ўзнагароджаны за вызваленне Віцебска (561). Воінскія злучэнні і часці, якія атрымалі ганаровае найменне «Віцебскія» (562). Дакументы сведчаць (563). Фарсіраванне Заходняй Дзвіны (567). Віцебскі «кацёл» (569). 39-я армія ў баях за Віцебск (579). Пятая ў наступленні (588). 44-ы асобны дывізіён бронепаяздоў у баях за Віцебск (589). І жылі, і ваявалі (589). Яны вызвалялі Віцебск (594). Ішла дывізія наперад (597). «Кацёл» ліквідаваны (597). Як «ускіпеў» «віцебскі «кацёл» (598). Батальён «Маладая гвардыя» (601). Гэта было пад Віцебскам (602). Вораг акружаны (602). Прыкаваны да пня (603). Фарсіраванне Заходняй Дзвіны (604). Витебск, 26 июня (604). З франтавых заметак Аляксандра Твардоўскага ў Віцебску (605). Лідзія Сейфуліна пад Віцебскам (607). Узнагароды малодшага лейтэнанта Якімава. Як трапіў у палон сам Гольвітцар (607). Чацвёртае раненне (609). З успамінаў В.Агароднікава, былога камандзіра ўзвода 176-га стралковага палка (610). Штурмуе Уладзімір Гуляеў (611). Вышыня 222,9 (612). Баявая слава ідзе далёка (613). Парадніў нас Віцебск (614). Шпіталі, якія размяшчаліся ў Віцебску ў гады Вялікай Айчыннай вайны (615). Па старонках газеты «Віцебскі рабочы» (615). Героі Савецкага Саюза — ураджэнцы і жыхары Віцебска, удзельнікі вызвалення горада ў 1944 г. (617). Поўныя кавалеры ордэна Славы (638). Жанчыны ў баях за Віцебск (640).

СУПРАЦОЎНІКІ РЭДАКЦЫЙ І СЛУЖБАЎ ВЫДАВЕЦТВА, ЯКІЯ ПРАЦАВАЛІ НАД КНІГАЙ

Група картаграфіі:
В.Ф.Надзененка, Г.Р.Шыкунова.

Рэдакцыя мастацка-тэхнічнага афармлення выданняў:
У.М.Жук (заг. рэдакцыі), *В.Г.Загародні, Т.В.Шабунька.*

Рэдакцыя фотаздымак і фотаілюстрацый:
Г.М.Бажанкоў (заг. рэдакцыі),
А.П.Дрыбас, С.А.Жукавень, В.У.Харчанка.

Прадстаўнікі грамадскасці і навукоўцы г. Віцебска, якія прымалі ўдзел у пошуках, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі:
В.І.Акуневіч, В.Л.Асіпенка, Я.І.Бардушка, П.П.Бяляўскі, У.І.Галдзілаў, Н.І.Дарафеенка, К.І.Зайко, У.М.Зайцаў, В.А.Космач, В.М.Кунцэвіч, В.М.Лайко, М.У.Пішчулёнак, М.С.Прусакоў, Л.У.Хмяльніцкая, Н.Г.Чарнышова.

Гарадская камісія шчыра дзякуе ўсім,
хто актыўна садзейнічаў стварэнню гэтай кнігі.

У кнізе змешчана 316 каляровых і
чорна-белых ілюстрацый, партрэтаў, карт.

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка горада Віцебска. Кніга 1-я.

Мастацкі рэдактар
Т.В.Шабунька.

Тэхнічныя рэдактары:
М.І.Грыневіч,
Н.М.Шэвель.

Карэктары:
В.М.Чудакова (заг. аддзела),
Ж.С.Берасневіч,
Л.А.Варабей,
Т.П.Гілевіч,
А.І.Клімовіч,
С.М.Красная,
В.А.Кульбіцкая.

Машынапісныя работы:
Г.Л.Анісімава,
Т.М.Саленік,
Л.І.Шыбаева.

Камп'ютэрная падрыхтоўка арыгінала-макета:
С.А. Макаёнак (заг. рэдакцыі);
інжынеры:
І.І.Драздова,
С.А.Стралкоўская;
аператары:
Р.У.Дзявочка,
Н.М.Зубкевіч,
Н.У.Мітраховіч,
І.А.Навіцкая,
Н.А.Стасевіч.

Падпісана да друку з арыгінала-макета 18.07.2002. Фармат 70×100 1/16. Гарнітура Кудрашэўская. Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 52,65. Ум. фарб.-адб. 62,4. Ул.-выд. арк. 69,07. Тыраж 5000 экз. Заказ 434.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 10 ад 10.11.2000. Рэспубліка Беларусь. 220072, Мінск, Акадэмічная, 15а.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Мінская фабрыка каляровага друку». Рэспубліка Беларусь. 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Віцебска: У 2-х кн. Кн. 1-я / Рэд. кал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; Маст. Э.Э.Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 2002. — 648 с.: іл.

П 15

ISBN 985-11-0246-6.

Кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных даных, замалёвак, артыкулаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца пра багатую гісторыю Віцебска, знакамітых людзей, герояў ратнай і працоўнай славы. Значная частка хронікі прысвечана старажытнай гісторыі Віцебска. Асаблівая ўвага ўдзелена падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Шырока паказаны падпольны рух. Змешчаны таксама спіс жыхароў Віцебска, якія былі беспадстаўна рэпрэсіраваны і рэабілітаваны. Кніга багата ілюстравана.

Для масавага чытача.

УДК 947.62
ББК 63.3 (4 Беи)

ISBN 985-11-0246-6